1Б036294
63(4Бел)
П15

ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ
ВЫДАННЕ
СТВАРАЕЦЦА
ПАВОДЛЕ
РАШЭННЯ
ЎРАДА
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

15036294
63.3(4Бел)
П15

ПАМЯЦЬ

ІВАЦЭВІЦКІ РАЁН

Ивацевичская
районная

МІНСК
БЕЛТА
1997

АДДЗЕЛ КРАЯЗНАЎЧАЙ
ЛІТАРАТУРЫ І БІБЛІЯГРАФІІ

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

В. П. КАСЬКО, Г. К. КІСЯЛЁЎ, У. М. МАКАР, В. І. МАРОЗ,
У. В. МАРОЗ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, Р. М. РАДЗЮК

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

У. М. МАКАР (старшыня), П. Г. ЖЫШКА, М. В. БАНАСЕВІЧ,
А. Ф. ВЕЛІКАСЕЛЕЦ, В. П. КАСЬКО, В. І. МАРОЗ,
Р. М. РАДЗЮК (нам. старшыні), І. А. ТАРАСЕВІЧ, Я. Д. ЯНЧАНКА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік), М. З. БАШЛАКОЎ, У. І. ЛЕМЯШОНАК

Укладальнікі:

М. В. БАНАСЕВІЧ, В. П. КАСЬКО, В. І. МАРОЗ, У. В. МАРОЗ

Мастак

Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-06-4

© БЕЛТА, 1997

На Выганашчанскім возеры.

10—9-е тысячагоддзі да н. э.	Першыя пасяленні людзей каля Бабровіцкага возера.
5—3-е тысячагоддзі да н. э.	Селішчы эпохі неаліту каля вёсак Дабрынёва, Любішчыцы.
VII—VI стагоддзі да н. э.	Селішчы жалезнага веку каля вёсак Любішчыцы, Дабромысль, Міронім.
VIII—X стагоддзі.	Пасяленні ўсходнеславянскага племені дрыгавічоў каля вёсак Сенькавічы, Бялавічы, Святая Воля, Корачын.
X—XII стагоддзі.	Існаванне Косаўскага гарадзішча.

Косаўскі палац.

1401 г.	Першае ўпамінанне пра в. Вяда ў спісе Вітаўта.
1485 г.	Першае пісьмовае ўпамінанне пра вёскі Гошчава і Бялавічы.
1494 г.	Аляксандр, вялікі князь літоўскі, падарыў Косава магнату Храбтовічу.
1519 г.	Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах пра Івацэвічы.
1526 г.	Пабудаваны ў Косаве першы касцёл.
1500—1559 гг.	Першыя пісьмовыя ўпамінанні пра вёскі Быцень, Дабромысль, Аброва, Любішчыцы, Гнойнае, Святая Воля, Целяханы.

Мемарыяльны камень ва ўрочышчы Мерачоўшчына, дзе стаяў дом, у якім нарадзіўся Т. Касцюшка.

1595 г.	Пабудавана першая праваслаўная царква ў в. Гошчава.
1690-я гады.	Пабудаваны дамініканскі манастыр і каталіцкі касцёл у в. Гошчава.
23 лістапада 1724 г.	Польскі кароль Аўгуст II надаў Святой Волі статус горада.
4 лютага 1746 г.	Нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, кіраўнік паўстання 1794 г.
1766 г.	У Быцені заснавана суконная мануфактура.

Святатроіцкая царква ў г. п. Целяханы.

1765—1775 гг.	Будаўніцтва Агінскага канала, які пралёг і па тэрыторыі Івацэвіччыны.
Сярэдзіна XIX ст.	На ўскраіне Косава ва ўрочышчы Мерачоўшчына пабудаваны палац.
1840 г.	У в. Няхачава адкрыта паштовая станцыя на шашы Масква — Варшава.
1856—1858 гг.	Выступленне прыгонных сялян у Быцені.

Помнік ахвярам фашызму ў в. Заполле.

1861 г.	Адкрыццё школы ў в. Гошчава.
1863—1864 гг.	Дзейнасць паўстанцаў К. Каліноўскага ў раёне.
1886—1887 гг.	Выступленні сялян вёсак Волька, Чамялы, Даманава, Гнойнае, Коханава, Квасевічы супраць памешчыкаў.
Кастрычнік 1905 г.	Бунт і дэманстрацыя прызыўнікоў царскай арміі ў Косаве.
1905 г.	Забастоўка ў Целяханах.

Партызанскія могілкі ва ўрочышчы Гута-Міхалін.

1907 г.	Дзейнасць сацыял-дэмакратычнай арганізацыі ў Міхаліне.
1915 г.	Акупацыя раёна кайзераўскімі войскамі.
1919 г.	Дзейнасць партызан Целяханскага баявога ўчастка супраць польскіх легіянераў.
1921—1939 гг.	Івацэвіччына ў складзе Польшчы.
1924—1939 гг.	Дзейнасць Косаўскага і Целяханскага райкомаў КПЗБ.
3 лютага 1927 г.	Расстрэл польскімі ўладамі мірнай дэманстрацыі рабочых і сялян у Косаве.

Помнік савецкім воінам і партызанам у скверы г. Івацэвічы.

1939 г., верасень—лістапад.	Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
Кастрычнік 1939 г.	Утварэнне Косаўскага раёна. Пачала выходзіць раённая газета «Чырвоная звязда».
1940 г.	Утварэнне ў раёне першых калгасаў у вёсках Любішчыцы, Яглевічы, Падстарынь, Бабровічы, Быч і інш.
26 чэрвеня 1941 г.	Акупацыя раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
Ліпень 1941 г.	Стварэнне Целяханскага партызанскага атрада.

На чыгуначнай станцыі Івацэвічы.

Жнівень — верасень 1941 г.	Стварэнне партызанскіх груп у Жытлінскім, Буленскім і Гута-Міхалінскім лясах.
Кастрычнік 1941 г.	Стварэнне Косаўскай антыфашысцкай арганізацыі.
Вясна 1942 г.	Стварэнне партызанскіх атрадаў імя Г. Дзімітрова, імя М. А. Шчорса, імя К. Я. Варашылава, N 112 і інш.
3 жніўня 1942 г.	Косаўскі бой — разгром нямецкага гарнізона партызанамі атрадаў імя Г. Дзімітрова, імя М. А. Шчорса, імя К. Я. Варашылава.

Цэнтральная плошча Івацэвіч.

Ліпень — жнівень 1942 г.	Масавае знішчэнне гітлераўцамі мірнага яўрэйскага насельніцтва ў Косаве, Івацэвічах, Быцені, Целяханах, Святой Волі.
Жнівень — верасень 1942 г.	Карная аперацыя акупантаў «Балотная ліхаманка» і знішчэнне вёсак Вяда, Красніца, Тупічыцы, Бабровічы, Зацішша разам з жыхарамі.
Красавік 1943 г.	Прыбыццё ў раён Брэсцкіх падпольных камітэтаў КП(б)Б, ЛКСМБ і штаба Брэсцкага партызанскага злучэння.

На тэрыторыі акцыянернага таварыства «Івацэвічдрэў».

Чэрвень — жнівень 1943 г.	Стварэнне ў раёне партызанскіх брыгад імя П. К. Панамарэнкі, «Савецкая Беларусь», імя Ф. Э. Дзяржынскага.
1 верасня 1943 г.	Стварэнне Косаўскага падпольнага РК ЛКСМБ.
2 лістапада 1943 г.	Бой партызан брыгады імя П. К. Панамарэнкі з карнікамі каля в. Бялавічы.
28 снежня 1943 г.	Пачатак выдання Брэсцкім абласным антыфашысцкім камітэтам газеты «За Родину».

Прадукцыя, праслаўляючая Целяханы.

10—12 ліпеня 1944 г.	Вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.
1944—1950 гг.	Аднаўленне народнай гаспадаркі.
1946—1950 гг.	Правядзенне суцэльнай калектывізацыі ў раёне.
1960-я гады.	Будаўніцтва торфапрадпрыемства «Беразоўскае» і шклозавода.
1987 г.	Будаўніцтва Івацэвіцкага завода жалезабетонных вырабаў.

Юныя таленты на фоне раённага Дома культуры.

1996 г.	У Івацэвічах здадзены будынак новай сярэдняй школы.
23 чэрвеня 1997 г.	Ураган, які пранёсся над Беларуссю, зачапіў сваім крылом Целяханы і наваколле.
1997 г., лістапад.	Здадзена ў вытворчасць кніга «Памяць. Івацэвіцкі раён».

ДА ЧЫТАЧА

Гісторыка-дакументальная Хроніка Памяці Івацэвіцкага раёна адлюстроўвае жыццё насельнікаў краю на працягу амаль тысячы гадоў. Гэта край цудоўнай прыроды з яе пушчамі і барамі, балотамі і лугамі, рэкамі і азёрамі, палямі і пашамі, багаццем лясных і водных дароў — грыбоў, ягад, лекавых раслін, рыбы і каштоўнай дзічыны. Гэта край гераічнай барацьбы яе людзей з ворагамі за сваю свабоду і шчасце. У гады ваеннага ліхалецця Вялікай Айчыннай у яго лясных абшарах знаходзілі прытулак тысячы народных мсціўцаў, якія адсюль наносілі адчувальныя ўдары па акупантах. Гэта зямля працавітых людзей. Пра іх гэта кніга. Яна пра мінулае і сучаснае, яна пра барацьбу і працу нашых людзей. Хроніка Памяці створана на аснове наяўных дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва ў г. Гродна, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Савецкай Арміі, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літоўскай ССР, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Баранавіцкага і Пінскага філіялаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі Рэспублікі Беларусь, друкаваных і рукапісных крыніц, мемуарнай літаратуры і ўспамінаў людзей-сведак падзей розных часоў.

Вялікі ўклад у падрыхтоўку і выданне кнігі ўнёс арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Дзяржкамітэта Рэспублікі Беларусь па друку, прадстаўнікі грамадскасці раёна, супрацоўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў, журналісты, работнікі мясцовых Саветаў, райваенкамата, краязнаўцы школ. Усім ім вялікая і шчырая падзяка.

150 36294

АДДЗЕЛ КРАЯЗНАЎЧАЙ
ЛІТАРАТУРЫ І БІБЛІЯГРАФІІ



ІВАЦЭВІЦКІ РАЁН размешчаны на поўначы Брэсцкай вобласці. Утвораны 15.1.1940 г. як Косаўскі. З 1947 г. — Івацэвіцкі раён. У 1957 г. да яго далучана частка Быценскага, у 1959 г. — амаль увесь Целяханскі раён. Плошча 3 тыс. кв. км, насельніцтва 71,6 тыс. чал. (1971). Гарады Івацэвічы і Косава, г. п. Целяханы, м. Быцень, 112 сельскіх населеных пунктаў. Падзяляецца на Целяханскі пасялковы савет і 18 сельсаветаў.

Насяляюць раён беларусы (94%), ёсць рускія, украінцы, палякі, яўрэі. Сярэдняя шчыльнасць 23,9 чал. на кв. км. Гарадское насельніцтва складае 19,8%.

Прамысловасць лясная, лесахімічная, дрэваапрацоўчая, будаўнічых матэрыялаў, паліўная, харчовая. Асноўныя прадпрыемствы: «Івацэвічдрэў», Даманаўскі гандлёва-вытворчы камбінат, спіртзавод, льнозавод, прыборабудаўнічы завод, Квасевіцкая фабрыка пуху і пер'я, Целяханскі завод сталярных вырабаў, завод ЖБВ, малаказавод, камбінат кааператыўнай прамысловасці, Целяханскі і Івацэвіцкі лясгасы, будаўнічыя арганізацыі.

Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і буракаводстве ў спалучэнні з ільнаводствам; вырошчваецца бульба і збожжавыя культуры. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 34% тэрыторыі. Да пачатку 1971 г. асушана 38,6 тыс. га балот і забалочаных зямель.

Па тэрыторыі раёна праходзіць чыгунка і шаша Брэст — Мінск і алімпійская магістраль Брэст — Масква. У 1971 г. было 24 сярэднія, 24 васьмігадовыя, 36 пачатковых школ, 15 дашкольных устаноў, 52 клубныя ўстановы, 68 масавых бібліятэк, 60 кінаўстановак, 6 бальніц, 31 фельчарска-акушэрскі пункт, санаторый «Палессе» і дзіцячы санаторый «Сасновы бор». Выходзіць раённая газета «Івацэвіцкі веснік» і прыватная газета.

Прыродныя ўмовы раёна

Паверхня раёна плоскаўзгорыстая на Пн і нізінная на Пд. Паўн. ч. раёна займаюць схілы Слонімскага ўзвышша і Баранавіцкая раўніна, паўд. — Прыпяцкае Палессе. 70% тэр. на выш. 150—170 м, 25% на выш. 140—150 м. Найвышэйшы пункт 190 м (за 4 км на З ад в. Міронім), самая нізкая адзнака 141 м (урэз воз. Гошча).

Геалагічная будова і карысныя выкапні. У тэктанічных адносінах паўн. ч. раёна прымеркавана да Івацэвіцкага пахаванага выступу Бел. антэклізы, паўднёвая ў межах Палескай седлавіны. Зверху залягаюць пароды антрапагенавага ўзросту магутнасцю 60—80 м, у ледавіковых лагчынах да 125 м. Складзены з флювіягляцыяльных і марэнных адкладаў сожскага ледавіка. Ніжэй залягаюць водна-ледавіковыя і марэнныя ўтварэнні бярэзінскага ўзросту. Антрапагенавую тоўшчу падсцілаюць неагенавыя і палеагенавыя пяскі, алеўраліты (да 40 м), пашыраныя на З раёна. Амаль паўсюдна развіты мелавыя магутнасцю 67 м (мел, мергель, пяскі), вендскія і рыфейскія да 170 м пясчана-гліністыя і ў меншай ступені вулканагенна-асадкавыя ўтварэнні. Магутнасць платформавага чахла 350—450 м. Паверхня крышт. фундамента на адзнаках 100—250 м ніжэй узр. мора. Вядомы 25 радовішчаў торфу з запасамі 128,4 млн. т (найб. балоты Сухое, Аброўскае, Стубла, Заялоўе, Пацарабы, Алешня); 2 радовішчы глін (Дубінаўскае з запасамі 109 тыс. м³ і Бульскае — 126 тыс. м³); Дуброўскае радовішча мелу (129 тыс. т); 2 радовішчы пяскоў (Быценскае і Добрынеўскае).

Клімат. Тэр. раёна адносіцца да 3-х агракліматычных раёнаў: паўн.-зах. частка да Гродзенска-Івацэвіцкага, паўн.-усх. — да Баранавіцка-Ганцавіцкага, паўд. ч. да Пінскага (гл. адпаведныя артыкулы). Сярэдняя т-ра студз. — 5,5, ліп. 18,2° С. Ападкаў 595 мм за год. Вегет. перыяд 198 сут. Метэаралагічныя паказчыкі гл. таксама ў арт. Івацэвіцкая метэаралагічная станцыя. **Гідраграфія.** Рэкі большай ч. раёна належаць да Прыпяцкага гідралагічнага раёна, паўн.-усх. ч. — да Нёманскага гідралагічнага раёна. На ПнУ Шчара с прытокамі Мышанка (правы) і Грыўда (левы), рэкі Бусяж і Косава (прытокі Грыўды), на ПдЗ — Жыгулянка (прыток Ясельды). Азёры Выганаўскае, Бабровіцкае, Гошча. У межах раёна Агінскі канал. Густата натуральнай рачной сеткі 0,43 км/км². Даўж. меліярацыйнай сеткі 5,5 тыс. км, у т.л. адрэгуляваных водаприёмнікаў больш за 15 км, магістральных і падвадных каналаў 1,2 тыс. км, загараджальных больш за 24 км, рэгуляцыйных каналаў 1,6 тыс. км. **Глебы.** Тэр. раёна ў межах Гродзенска-Ваўкавыска - Слонімскага аграглебавага падраёна (на Пн) і Ганцавіцка-Лунінецка-Жыткавіцкага аграглебавага падраёна (цэнтр. і паўд. ч. раёна). Глебы с.-г. угоддзяў (у %): дзярнова-падзолістыя 17,6, дзярнова-падзолістыя забалочаныя 22, дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя 14,3, поймавыя (алювіяльныя) 2,5, тарфяна-балотныя 43,6; паводле мех. складу (у %): сугліністыя 0,6, супясчаныя 28,6, пясчаныя 27,2, тарфяныя 43,6. Плоскасная эрозія на 6,2% пл. ворных зямель, у т.л. на 5,5% слабая.

Раслінны і жывёльны свет. Прыродная расліннасць належыць (з Пн на Пд) да Нёманска-Перадпалескай геабатанічнай акругі і Бугска-Палескай геабатанічнай акругі. Лугі невял. участкамі, пл. 40 тыс. га. Сухадолы займаюць 7,5%, нізінныя 71,6, заліўныя 20,9%, пераважна ў пойме Шчары. Пад лясамі, якія адносяцца да падзоны грабава-дубова-цемнахваёвых лясоў (паўн. ч. раёна) і шыракаліста-хваёвых лясоў (паўд. частка), 46% тэр. раёна. Найб. лясістасць на Пд раёна. Пераважаюць масівы па 800 га, найб. па 4,5 тыс. га (урочышчы Плоскае і Машнеўка). Склад лясоў (у %): хваёвыя 55,2, яловыя 3,7, дубовыя 1,3, чорнаальховыя 15,1, бярозавыя 22,9, ясянёвыя 0,2, таполевыя 0,2 і інш. 17% лясоў — штучныя насаджэнні. 25 балот (належаць да Кобрынска-Пружанска-Ганцавіцкага тарфянога раёна) пл. 70,2 тыс. га (часткова асушаныя), усе нізінныя. Асн. балотныя масівы: Сухое, Заялоўе, Стубла, Пацарабы, Алешня, Аброўскае, Пагоня, Краглевічы. З паляўніча-прамысл. жывёл водзяцца лось, алень, дзік, ліс, заяц-бяляк і заяц-русак, янотападобны сабака, вавёрка, чорны тхор, лясная куніца, воўк, выдра, крот, казуля, гарнастай, рысь.

Прыродакарыстанне і ахова прыроды. Пад с.-г. угоддзямі 34,1% тэр. (20% ворных зямель, 13,3 сенажацей і паш). Асн. землекарыстальнікі — 15 калгасаў (51 тыс. га с.-г. угоддзяў агульнага карыстання) і 16 дзяржгасаў (41,5 тыс. га с.-г. угоддзяў). Асушана амаль 42 тыс. га с.-г. угоддзяў. Сярэдні бал банітэту с.-г. угоддзяў 37, найвышэйшы 56, найніжэйшы 28. Спецыялізацыя калгасаў і дзяржгасаў — мяса-

малочная жывёлагадоўля з развітым ільнаводствам і буракасеяннем; пашыраны пасевы збожжавых культур і бульбы. Прадпрыемствы дрэваапрацоўчай, буд. матэрыялаў, харчовай прамысловасці. У раёне Івацэвіцкі лясгас, зоны адпачынку Косава, Добры Бор, Целяханы. У межах раёна гідралагічны заказнік Выганашчанскае, ч. Целяханскай запаведна-паляўнічай гаспадаркі; Барэцкая дуброва, Церабежскае насаджэнне карэльскай бярозы і Восаўскае насаджэнне карэльскай бярозы. З жывёл і раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларускай ССР, трапляюцца: арлан-белахвост, малая паганка, даўгахвостая няясыць, звычайны гогаль, чаротная рапуха, альдраванда пухіраватая, каменяломнік балотны, зубніца клубняносная, першацвет веснавы, званочак персікалісты, купальнік горны, наперстаўка буйнакветная, лілея царскія кучары. На 1.1.1982 у раёне 21,9 тыс. індывід. і 62 калект. члены т-ва аховы прыроды.

Ф. Ф. Бурак, Р. І. Лявіцкая, Г. П. Рудава, М. Ф. Янюк.
Энцыклапедыя прыроды Беларусі. Т. 2. Мн., 1983. С. 395–396.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна

Гарады — Івацэвічы, Косава, гарадскі пасёлак Целяханы.

Аброўскі сельсавет: вёска Аброва.

Амяльнянскі сельсавет: вёскі Амяльная, Глінная, Гошча, Коланск, Каранная.

Быценскі сельсавет: вёскі Быцень, Вуглы, Доўгае, Заполле, Зарэчча, Козіна, Манцюты, Міронім, Наліўкі, Пагор'е, Прыбарава, Рудня.

Волькаўскі сельсавет: вёскі Волька, Магіліцы, Чамялы.

Выганашчанскі сельсавет: вёскі Бабровічы, Выганашчы.

Дабромысленскі сельсавет: вёскі Глядзенне, Дабромысль, Закаплічча, Сялец, Сасновы Бор, Югалін.

Даманаўскі сельсавет: вёскі Вішнёўка, Дабрынёва, Даманава, Коханава.

Жытлінскі сельсавет: вёскі Власаўцы, Воля, Жытлін, Зыбайлы, Корачын, Сярадава, Хадакі, Яблонка.

Квасевіцкі сельсавет: вёскі Альба, Альшаніца, Верашкі, Ёдчыкі, Квасевічы, Скураты, Хрышчонавічы, Ятвезь.

Козіцкі сельсавет: вёскі Вулька-Аброўская, Козікі.

Косаўскі сельсавет: вёскі Бялавічы, Заполле, Старажоўшчына, Хадоркі.

Любішчыцкі сельсавет: вёскі Любішчыцы, Майск, Панкі, Плехава.

Мілейкаўскі сельсавет: вёскі Була, Бусяж, Галік, Галынка, Гладышы, Грыўда, Даргужы, Дубітава, Жамайдзякі, Куляшы, Лазаўцы, Мілейкі, Рацкевічы, Сакоўцы, Харошча.

Падстарынскі сельсавет: вёскі Азярцо, Боркі, Кушняры, Маціеўка, Падстарынь, Руда, Сенькавічы, Халап'я.

Рэчкаўскі сельсавет: вёскі Гутка, Краі, Рудня, Рэчкі.

Святавольскі сельсавет: вёскі Вялікая Гаць, Доўгая, Святая Воля, Турная.

Стайкаўскі сельсавет: вёскі Аляксейкі, Аўсто, Быч, Гошчава, Зялёны Бор, Міхнавічы, Няхачава, Размеркі, Стайкі, Юкевічы.

Целяханскі сельсавет: вёскі Вулька-Целяханская, Глінішча, Горталь, Краглевічы, Соміна.

Яглевіцкі сельсавет: вёскі Бараны, Галенчыцы, Гічыцы, Ёлкі, Яглевічы.

Спіс населеных пунктаў Івацэвіцкага раёна, якія не існуюць

Вяда, вёска ў Выганашчанскім с/с, спалена нямецкімі карнікамі 15.9.1942; **Грудопаль,** былы маёнтак, пасля вайны санаторый, закрыты; **Гута-Міхалін,** пасяленне ў Гута-Міхалінскім лесе, пабудовы спалены ў вайну; Зацішша, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, спалена нямецкімі карнікамі ў 1942; **Зенопаль,** былыя ўладанні ў Косаўскай гміне; **Касінова,** былы фальварак маёнтка Івацэвічы, існаваў да першай сусветнай вайны; **Красніца,** вёска ў Выганашчанскім с/с, спалена нямецкімі карнікамі 12.9.1942; **Мерачоўшчына,** былы фальварак каля Косава, сядзіба згарэла ў 1944; **Міхалін,** вёска на тракце Ружаны – Бяроза, спалена немцамі; **Някрасаўшчына,** пасяленне ля Івацэвіч; **Перадзелы,** былы фальварак у Целяханскай гміне; **Тупічыцы,** вёска ў Выганашчанскім с/с, спалена нямецкімі карнікамі 15.9.1942; **Янава,** былы фальварак Юндзіла ў Івацэвічах.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Першыя пісьмовыя ўпамінкі аб жыцці нашага краю знаходзяцца ў дакументах XIII—XV ст. Але ж было жыццё на нашых землях і раней, задоўга да нашай эры, да нашага пісьменства. Хто ж раскажа нам аб тым жыцці? Ёсць такі расказчык. Гэта — памяць курганная. На землях Івацэвіччыны, як і на ўсёй нашай Беларусі, ёсць многа помнікаў далёкага часу, якія гавораць аб нашых прашчурах, месцах іх пасяленняў, іх працы і звычаях. Гэта археалагічныя помнікі.

Рэчы, якія вывучаюцца археолагамі, могуць быць знойдзены ў старажытных пахаваннях ці ў месцах старажытных паселішчаў. У магільнікі яны папалі як вынік веры ў замагільнае жыццё, іх клалі побач з нябожчыкамі, каб яны служылі памерлым «на тым свеце».

Тэрыторыя Беларусі заселена яшчэ ў каменным веку. Археалагічныя помнікі з таго часу выяўлены і ў шэрагу месц нашага раёна. Самыя ранейшыя з іх адносяцца да эпохі мезаліту (X—VI тысячагоддзі да н. э.)

Старажытная стаянка эпохі мезаліту знойдзена на ўзбярэжжы Бабровіцкага возера ў 1963 годзе беларускім археолагам В. Ф. Ісаенкам і ім жа даследавана ў 1971 г. Затым стаянку даследавала Н. В. Шаблюк. Знаходзіцца яна на паўночна-ўсходнім напрамку ад вёскі Бабровічы на марэнным узгорку вострава даўжынёй каля 200 метраў, вышынёй 3—4 м над узроўнем вады. Пры раскопках тут знойдзены рэшткі шасці вогнішчаў, абкладзеных камянямі. Вакол іх сабрана больш 100 крамянёвых прылад працы свідэрскай культуры і 600 апрацаваных крамянёў (лістападобныя наканечнікі стрэл, свярдзёлкі і сярэдзінныя праколкі, зробленыя з пласцінак, нажы з бакавой рэтушшу і паглыбленнямі, звужаныя на канцы, папярочна рэтушаваныя разцы, масіўныя канцавыя скрабкі, скоблі). Трапляюцца таксама тыповыя для макралітычнай культуры грубыя разцы, міндалепадобныя сякеры, або разакі.

Праз паўкіламетра ад першай каля в. Бабровічы размяшчаецца другая стаянка мезалітычнага часу. Яна знаходзіцца на пясчаных патаўшчэннях берага. Выяўлена ў 1963 г. і даследавана ў 1971 г. В. Ф. Ісаенкам, а затым даследавана ў 1989 г. Н. В. Шаблюк і В. У. Шаблюк. Даследаваны культурны пласт да 0,25 м. Знойдзены канічныя і двухпляцовачныя нуклеусы свідэрскага тыпу, канцавыя скрабкі з высокіх пласцінак, вуглавыя і сярэдзінныя разцы, скоблі, 4 тронкавыя наканечнікі стрэл VIII—VI тысячагоддзяў да н. э. Выяўлены таксама фрагменты бытавой

керамікі, зялёна-паліванай кафлі, шкляны посуд, металічныя вырабы (ключ, долата, скобы, цвікі) XV—XVIII ст. Усё гэта сведчыць, што пасяленцы тут жылі доўга і ў розныя часы мелі розны занятак.

Здаўна людзі шукалі надзейныя месцы для паселішчаў. Лічылі за лепшае сяліцца на берагах рэк і азёраў. Гэта пацвярджаюць паселішчы неалітычнага часу. Рэшткі іх культуры: пласцінкі з крэменю, наканечнікі для стрэл можна знайсці на ўсім працягу нашых рэк Грыўды і Шчары.

Найбуйнейшая стаянка неалітычнага часу размешчана ва ўрочышчы Сежня, за 2 км на паўночны ўсход ад вёскі Любішчыцы, на правым беразе ракі Грыўда. Пры раскопках кургана былі знойдзены прадметы з керамікі, якія адносяцца да часоў неаліту, ляпная кераміка жалезнага веку, фрагменты вострадонных сасудаў, упрыгожаных ямачным і накольчатым арнаментам, якія адносяцца да другой паловы 3 тысячагоддзя да н. э., сякеры, разцы і інш. У цяперашні час паселішча папарварску разбурана. Паўночна-заходнюю частку яго займае кар'ер. Гэта ўжо сведчанне нашага бескультур'я для цывілізаваных пакаленняў.

Другая стаянка эпохі неаліту знойдзена каля вёскі Дабрынёва за 0,5 км на захад і паўночны захад ад вёскі па рацэ Грыўда. Тут знойдзены апрацаваны крэмень, а на поўначы паселішча — крамянёвыя наканечнікі для стрэл, востраканечнік, сярод знаходак мноства каменных прылад працы. У цяперашні час частка былой стаянкі ўзарана і засаджана лесам.

Помнікі эпохі неаліту часта спалучаюцца з помнікамі бронзавага часу. Так, на поўначы за 0,9 км ад вёскі Волька, непасрэдна каля левага берага р. Шчара, на паўразвеянай дзюне захаваліся рэшткі неалітычнага паселішча. Сустракаліся тут і знаходкі бронзавага веку. А на паўночнай ускраіне вёскі, каля краю берагавой тэрасы знойдзена паселішча бронзавага веку. Сляды старажытных паселішчаў з крамянёвымі вырабамі і розначасовай керамікай знойдзены на хвалістым левабярэжжы р. Шчары, а таксама на пойменнай дзюне яе правага берага.

На поўнач ад вёскі Міронім, на ўзвышшы, ва ўрочышчы Воўчы Вый таксама знойдзены сляды старажытных паселішчаў. Але большасць слядоў старажытных стаянак бронзавай эпохі — на рацэ Шчара: каля вёскі Магіліцы на правым беразе, каля вёскі Пагор'е (урочышчы Кальціца, Ніўка), Прыбарава (урочышча Палех), Углы (урочышча Асова), насупраць вёскі Дабромысль на правым размытым беразе Шчары (урочышча Купет), каля вёскі Быцень за 200 м ад Шчары (урочышча Полек). У фондах Пінскага краязнаўчага музея ёсць свідравальныя сякеры, знойдзеныя ў г. Косаве, в. Аброва і інш.

Сярод помнікаў эпохі жалеза часцей за ўсё сустракаюцца курганы. Каля вёскі Бялавічы на могілках размешчаны 4 курганы авальнай формы вышынёй да 60 см, а за ручаём Фядоска яшчэ чатыры вышынёй да 70 см. На захад ад в. Шчэрбацэвічы (ускраіна Бялавіч) знаходзіцца ўрочышча Хвойна. Там ёсць курган паўсферычнай формы вышынёй да 2 м. (У цяперашні час курганы перасечаны ямай, глыбіня якой 1,5 м, але зольны праслой не закрануты.)

Па дарозе на Бялавічы, на поўдзень ад вёскі Альшаніца, за могілкамі ў хваёвым бару можна ўбачыць сем курганоў, якія параслі хвоямі і ядлоўцам. На другім баку вёскі ёсць яшчэ адзін курган, вышынёй 1,6 м, дыяметрам 20 м. Цэлая група курганоў знаходзілася каля в. Гошчава, некалькі курганоў на могілках у в. Сенькавічы, 7 курганоў выяўлена паміж вёскамі Святая Воля і Доўгая, ва ўрочышчах Бярозкі і Сарочына каля в. Руда, у лесе

каля в. Хадакі, 2 курганы непадалёку ад в. Корачын (урочышча Боркі). За 1 км ад Косава існавала невялікае гарадзішча, вакол якога знаходзіліся два валы. Побач з гарадзішчам быў могільнік. У 1871—1872 гг. тут праводзіў раскопкі Іван Завіша, які даследаваў 5 курганоў. Гарадзішча зараз, па сутнасці, разбурана. Яго выбралі на будаўніцтва дарогі.

Праводзіліся таксама раскопкі каля г.п. Целяханы на ўзвышшы Лысая Гара. Тут было штучнае ўмацаванне. Пробны шурф культурнага слоя не выявіў. Усё навокал было некалі перакапана ў пошуках скарбаў.

Сляды раннефеадальных селішчаў эпохі Кіеўскай Русі выяўлены на заходняй ускраіне вёсак Пагор'е і Доўгая.

Найбольш старажытныя паселішчы людзей на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна адносяцца да X—VI тысячагоддзяў да н. э. У гэты час адбывалася паступовае пацяпленне пасля адступлення ледавіка з тэрыторыі Беларусі. І па меры яго адступлення ішло засяленне новых тэрыторый. У гэты час адбываецца аб'яднанне людзей у калектывы, плямёны, якія складалі адпаведныя археалагічныя культуры. У эпоху мезаліту на тэрыторыі раёна можна вылучыць паступовае існаванне некалькіх культур.

Найбольш старажытнай з'яўляецца свідэрская культура (сярэдзіна IX— пачатак VIII тысячагоддзя да н. э.). Плямёны ў той час жылі ва ўмовах тундры. Асноўным заняткам з'яўлялася паляванне на паўночнага аленя. Яно пакінула кароткачасовыя стаянкі адкрытага тыпу (паселішчы). Жытлы былі круглаватыя, шалашападобныя, паглыбленыя ў зямлю, з вогнішчам пасярэдзіне. Прылады працы выраблялiся з каменю, у асноўным з крэменю. Прыкладам такіх стаянак на тэрыторыі раёна з'яўляюцца паселішчы каля Бабровіч, Дабрынёва.

На змену скідальскай культуры прыйшлі плямёны нёманскай мезалітычнай культуры (VIII—V тысячагоддзі да н. э.). Гэтая культура ўзнікла ў выніку кантактаў нашчадкаў свідэрскіх плямёнаў з насельніцтвам іншых мясцовых культур. Прыкладам стаянкі гэтага тыпу з'яўляецца паселішча каля в. Дабрынёва, дзе гэтая культура прыйшла на змену свідэрскай.

У VI—V тысячагоддзях да н. э. на тэрыторыі раёна атрымала распаўсюджанне яніславіцкая культура. Насельніцтва займалася паляваннем, у меншай ступені — рыбалоўствам і збіральніцтвам. Людзі сяліліся на берагах вадаёмаў у наземных жытлах, якія абагравaліся агнішчамі-кастрышчамі. Прылады працы былі ў асноўным крамянёвымі. Выкарыстоўвалі таксама і касцяныя прылады працы.

Рэшткі прысутнасці чалавека на тэрыторыі раёна ў эпоху мезаліту былі знойдзены і каля в. Грыўда, на беразе аднайменнай ракі, дзе сустракаюцца крамянёвыя прылады працы таго часу.

З пачаткам неаліту прыкладна 5 тысяч гадоў да н. э. клімат стаў яшчэ больш цёплым і вільготным. На змену яніславіцкай культуры прыйшла нёманская культура (IV—III тысячагоддзі да н. э.). Насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам, у познім неаліце — земляробствам і жывёлагадоўляй. Жытлы былі наземнымі і будаваліся на берагах рыбных вадаёмаў. Найбольш значным помнікам гэтай культуры з'яўляецца стаянка каля в. Дабрынёва.

Недзе ў другой палове III тысячагоддзя да н. э. фарміруецца культура шнуравой керамікі (існавала да першай паловы II тысячагоддзя да н. э.). Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, жыло ў невялікіх паселішчах на берагах рэк і азёр. Жытлы былі слупавой канструкцыі, прамавугольныя наземныя ці крыху заглыбленыя, былі, відаць, і назем-

ныя зрубныя. Прыкладам такой стаянкі з'яўляецца паселішча каля Дабрынёва.

Стаянкі эпохі неаліту на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна ёсць каля г. Косава, вёсак Бялавічы, Любішчыцы, Чамялы, Прыбарава, Корачын. Рэшткі жыццядзейнасці чалавека гэтага часу знойдзены таксама каля в. Аброва.

З прыходам культуры шнуравой керамікі пачынаецца эпоха бронзы. Мяркуецца, што на тэрыторыі раёна атрымалі распаўсюджванне таксама прыбалтыйская і тшчынецкая культуры. Археалагічныя помнікі гэтага часу маюцца каля вёсак Волька, Дабромысль, Корачын, Любішчыцы, Міронім, Магіліцы, Аброва, Пагор'е, Прыбарава, Вуглы. Прылады працы і розныя рэчы гэтага часу знойдзены каля Косава, Целяхан, Быцені, Гічыц.

У пачатку I тысячагоддзя да нашай эры людзі навучыліся атрымліваць жалеза з балотных руд. На тэрыторыі раёна былі распаўсюджаны ў гэты час паморская культура і культура штрыхаванай керамікі. Аб гэтым сведчаць археалагічныя помнікі эпохі жалеза каля г. Косава, г.п. Целяханы, вёсак Святая Воля, Сярадава, Гошчава, Бялавічы, Жытлін, Альшаніца, Пагор'е, Сенькавічы, Хадакі і інш.

У перыяд жалеза пачынае ўзнікаць няроўнасць паміж людзьмі, а гэта вяло да спрэчак і ўзброеных сутычак. Таму ў гэты час ужо паяўляюцца ўмацаванні вакол паселішчаў, іх акружаюць валамі, равамі, драўлянымі агароджамі. Гэта назіраецца на гарадзішчы каля г. Косава.

Жалезныя прылады працы палепшылі ўмовы гаспадарання, далі магчымасць вырабляць больш прадукцыі, частку якой можна было накопліваць на больш працяглы час.

У першым тысячагоддзі да н. э. і пачатку нашай эры адбывалася злучэнне пэўных груп народаў зарубінецкай культуры, якія жылі на поўдні раёна, а старажытныя балты ў больш паўночных раёнах. У пачатку н. э. у басейне Верхняй Шчары паяўляюцца плямёны дрыгавічоў, якія былі ўсходнеславянскімі народамі.

Некалі ў X—XI ст. нашы землі ўваходзілі ў склад раннефеадальнай усходнеславянскай дзяржавы — Кіеўскай Русі. Частка зямель уваходзіла ў склад Тураўскага, пазней Пінскага княства, паўночная была бліжэй да Наваградчыны. Характэрнай з'яўляецца і сённяшняе ўжыванне назваў насельнікаў раёна: у паўднёвых раёнах жывуць палешукі, а паўночных жыхароў завуць ліцвінамі. Нават Тадэвуш Касцюшка, які жыў у Мерачоўшчыне пад Косавам, пісаў, што «нарадзіўся я ліцвінам».

З XIV ст. нашы землі ўваходзілі ў Вялікае княства Літоўскае.

П. Сітнік, М. Банасевіч.

У СКЛАДЗЕ КІЕЎСКАЙ РУСІ, ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Ужо ў глыбокай старажытнасці на Беларусі жылі розныя народы. У другой палове першага тысячагоддзя нашай эры землі сучаснай Беларусі пачалі засяляць славянскія плямёны, якія рухаліся з паўднёвага захаду. Тут яны сутыкнуліся з мясцовымі балцкімі плямёнамі. Гэта прывяло да славянізацыі апошніх. Утварыўся славянабалцкі субстрат. На яго аснове фарміраваўся старажытнабеларускі этнас.

Як згадваецца ў некаторых летапісах, паўднёвую і цэнтральную частку Беларусі (сюды адносіцца і Івацэвіцкая зямля) займалі дрыгавічы. Захад і поўнач займалі балты і яцвягі. Пранікненне яцвягаў на тэрыторыю нашага раёна пацвярджаецца і назвай паселішчаў. На захадзе

раёна ў Гута-Міхалінскім лесе існаваў з даўніх часоў пасёлак Яцвязь. У Вялікую Айчынную вайну ён быў знішчаны фашысцкімі акупантамі, але часткова адрадзіўся.

І. Сацута ў артыкуле «Хто такія яцвягі» (кн. «Берасцейскія карані», Брэст, 1993) піша, што яны, як адно з плямён заходнебалцкай групы, упамінаюцца ўжо ў X ст. У дагаворы 944 г. сярод паслоў князя Ігара, які заключаў дагавор з грэкамі, фігуруе «ятвяг Гунарэў», г. зн. прадстаўнік яцвяжскага князя Гунара. «Жылі яцвягі ў невялікіх паселішчах, каля якіх ставілі драўляныя ўмацаванні для абароны ад ворагаў». Займаліся паляваннем, рыбалоўствам, менш земляробствам. Часта наймаліся воінамі ў дружыны польскіх, літоўскіх, рускіх князёў. На яцвягаў рабілі паходы з Кіева князі Уладзімір, Яраслаў Мудры, галіцкія князі. Яцвягі ішлі і на Літву ў саюзе з галічанамі. У другой палове XIII ст. узмацніўся наступ крыжакоў і яцвягі адышлі на поўдзень. Вось тады ў нас і ўзніклі іхнія паселішчы.

Паўднёвая частка нашага краю знаходзілася пад уплывам пінскіх уладароў. Дрыгавічы засялялі раёны Усходняга і Заходняга Палесся. Да Заходняга Палесся (яго яшчэ называлі Літоўскім) адносілася і Гродзеншчына, у тым ліку і наша тэрыторыя. Пінчукоў звалі палешукамі, так і цяпер завуць жыхароў Прыпрыпяцця. І цяпер у іх захаваліся асаблівасці палескіх гаворак. Насельнікаў паўночнай часткі раёна здаўна называлі ліцвінамі, такую назву ў адносінах да іх і цяпер яшчэ ўжываюць палешукі. Гаворкі ліцвінаў адрозніваюцца ад паляшуцкіх і ў наш час. У XII—XIV ст. гэта была Турава-Пінская зямля. Пазней Пінск стаў галоўным горадам Пінскага княства.

«Дрыгавічы жылі пасярод лясоў і балот, — піша У. М. Ігнатоўскі, — дзе шмат было багнін, інакш кажучы, дрыгвы. Адсюль і пайшло іх імя». У «Аповесці старажытных часоў», гаворачы аб прыходзе славян з Дуная, іхняй легендарнай прарадзімы, і рассяленні іх на шырокай прасторы Усходняй Еўропы, аўтар гаворыць, што «...друзии седоша межы Припетью и Двиною и нарекомася дреговичи...». Па меркаванню вучоных, дрыгавічы займалі вялікую тэрыторыю, іх межы рассялення на поўначы па лініі Заслаўль, Лагойск, Барысаў, на ўсходзе — уздоўж ракі Асноўным па Дняпры, на поўдні — на поўдзень ад Прыпяці, на захадзе — па рацэ Заходні Буг. У старажытных дрыгавічоў (8—9 ст.) ужо выяўлялася маёмаснае расслаенне, мабыць, існавала племянное княжанне. У пазнейшы час першыя пісьмовыя крыніцы пра дрыгавічоў успамінаюць, што яны плацілі даніну Кіеўскай Русі. Дрыгавічы займаліся ўжо земляробствам, паляваннем, рыбнай лоўляй.

У канцы XII—пачатку XIII ст. адбываецца аб'яднальны рух літвінскіх плямёнаў, бо ў гэты час узмацняецца націск на Літву з усходу і з поўдня. На поўначы з'яўляюцца нямецкія рыцары (з 1229 — Тэўтонскі ордэн, з 1237 — Лівонскі), а з паўднёвага ўсходу адчувальнай была пагроза мангола-татарскага нашэсця. У літоўскіх і заходнерускіх землях выспелі эканамічныя і палітычныя ўмовы для ўтварэння адзінай моцнай дзяржавы, якой стала Вялікае княства Літоўскае, што дыпламатычнымі, шлюбнымі, захопнымі, добраахвотнымі шляхамі ўключыла ў сябе землі Заходняй Русі — нашы беларускія землі, у тым ліку і нашага раёна. Паступова ішло станаўленне Літоўска-Беларускай дзяржавы. І тут значную ролю адыгралі князі Міндоўг (1230—1263) і Вайшалк (1264—1316).

У «Аповесці пра Міндоўга і Вайшалка» (Галіцка-Валынскі летапіс) упамінаюцца некаторыя факты, якія сведчаць аб тым, што землі Івацэвіцкага раёна ў тыя часы былі тэрыторыяй, якая падпарадкоўвалася Наваградку.

У 1252 г. паміж Галіцкім князем Данілам і Наваградскім Міндоўгам адбылася вайна. Летапіс апавядае: «...Даніла дамовіўся з братам сваім (Васількам) і паслаў у Ляшскую зямлю да князёў ляшскіх, кажучы: «Надышоў час ісці хрысціянам на язычнікаў, бо яны ваююць паміж сабою». Ляхі абяцалі, але не стрымалі сваё слова. Даніла і Васількa паслалі Вікінта да яцвягаў, да жамойтаў і да немцаў у Рыгу, і ён падкупіў срэбрам і шматлікімі дарункамі яцвягаў і палову жамойтаў. Немцы ж адказалі Данілу так: «Дзеля цябе ўчынілі мір з Вікінтам, хоць ён шмат нашых загубіў. Нямецкія рыцары абяцалі прыйсці на дапамогу Таўцвілу. Даніла ж і Васількa пайшлі да Наваградка. Параіўшыся з братам сваім Васількам і са сваім сынам, Даніла брата свайго паслаў на Ваўкавыск, сына на Слонім, а сам пайшоў да Здзітава. Яны захапілі шмат гарадоў і вярнуліся дамоў». Здзітава цяпер знаходзіцца ў Бярозаўскім раёне на мяжы з Івацэвіцкім.

У 1253 зноў учыняўся паход Данілы Галіцкага на Наваградскую зямлю. «Даніла пайшоў з братам (сваім) Васількам, сынам Львом, з полаўцамі і сваім сватам Цягакам, і прыйшоў к Пінску. Князі ж пінскія былі няшчырыя, іх узялі з сабою на вайну паняволі. Літоўцы прыслалі вартавы атрад, і прыйшоў ён праз балоты аж да ракі Шчары». Наваградская зямля была разрабавана.

Гэтыя аповяды сведчаць, што Івацэвіччына была сведкам гэтых падзей. Яна ляжала між Слонімам і Пінскам, межавала са Здзітавам, праз яе цякла Шчара, таму аказвалася ў звязцы з названымі падзеямі. Гэтыя феадальныя міжусобіцы, безумоўна, наносілі вялізныя страты насельнікам краю, бо знішчалася дабро, жыллё, гінулі людзі, многіх забіралі ў палон і прадавалі ў няволю.

Пад 1236 г. у Валынскім летапісе Міндоўг лічыцца галоўным князем усяе Літвы. Але яго, як пазней і яго сына Вайшалка напаткаў трагічны лёс — яны былі забіты. Разгарнуліся зноў міжусобіцы, сваркі князёў за вярхоўную ўладу. І пасля 1293 г., калі ўладу ў свае рукі ўзяў князь Вітэнь (1293—1316), а за ім яго брат Гедымін, пачынаецца будаўніцтва моцнай Літоўска-Беларускай дзяржавы. За імі ва ўмацаванне гэтай дзяржавы важкі ўклад унеслі Альгерд (1345—1377) і Кейстут (1345—1379), Ягайла, Вітаўт і інш. У гэты перыяд новая дзяржава групуе літоўскія і заходнерускія (беларускія) землі. Калі пры Міндоўгу і Вайшалку сталіцаю дзяржавы быў Наваградак, то Гедымін пераносіць яе ў Вільню і на ўвесь гістарычны перыяд Вялікага княства Літоўскага яна адыгрывае гэту ролю. У гэты перыяд (XIV ст.) у склад ВКЛ увайшлі Полацк, Віцебск, Менск, княствы Лукомльскае, Друцкае, Тураў-Пінскае Палессе, Берасцейская зямля.

У дакументах XI—XIII ст. непасрэдна назваў гарадоў і вёсак на тэрыторыі, што складае цяпер Івацэвіцкі раён, не сустракаецца. Край быў лясісты, балотны, паселішчы былі нешматлікія і не вельмі буйныя, але яны існавалі і жыхары іх вялі гаспадарчую дзейнасць, абапіраючыся на свае звычаі, культурныя набыткі. Самае блізкае ад межаў раёна Здзітава (цяпер Бярозаўскі раён) упамінаецца пад 1252 годам. Праўда, легенды і паданні данеслі да нас аповяды аб існаванні жылых паселішчаў дрыгавічоў і ў нашым краі.

У той перыяд на паўднёвыя рубяжы маладой дзяржавы нярэдка нападалі татары. У 1362 г. яшчэ амаль за 20 год да Кулікоўскай бітвы адбылося нашэсце татар на паўднёвыя землі ВКЛ. Адбылася бітва на Падолі, у якой татары былі разбіты і доўга сюды не прыходзілі. Іншы раз іх орды даходзілі і да нашых мясцін. Легенда расказвае аб вялікай бітве татар

з русічамі каля паселішча на ўсходзе заходняга Палесся. У гэтай бітве загінуў татарскі хан. Яны пахавалі яго з вялікімі пашанамі і насыпалі вялікі курган. Нібыта ад таго, што ў ім пахавана цела хана, паселішча сталі называць Целяханы.

Неспакойным было жыццё на нашых землях. Ворагі нападалі з аднаго боку, а свае паны ўсё больш прыціскалі просты люд з другога. Да XIV ст. адносіць нас легенда аб дзейнасці каля дарогі са Здзітава ў Ваўкавыск нейкага мужнага воя Гошчы. Быў ён быццам бы княжацкім дружыннікам. За нейкую крыўду схаваўся ў лесе. Вакол яго сабраліся такія ж адважныя хлопцы, і яны доўга непакоілі княжацкіх дружыннікаў і купцоў. Нарэшце, Гошча распусціў дружыну, і многія яго паплечнікі пасяліліся на ўзвышшы паміж рэчкамі непадалёку ад свайго стана і заняліся гаспадаркай. Іх пасяленне стала называцца Гошчава.

У вёсцы Гошчава з даўніх часоў жыла легенда аб курганах, у якіх быццам бы пахаваны шведы (шведскія курганы). У сярэдзіне XIX ст. дасціпны мясцовы святар Лонгвін Фармасевіч зрабіў раскопкі гэтых курганоў і выявіў, што целы воінаў былі пахаваны ў паўсядзячым стане. Ён зрабіў выснову, што гэта не шведы, бо тыя былі хрысціянамі, якіх хаваюць у ляжачым стане, а, па яго думцы, гэта былі татары, бо мусульман хавалі паўсядзячымі. Дык чые ж гэта курганы? Шведскія ці татарскія? Адно зразумела, што гэта было пахаванне ворагаў, якія тапталі і руйнавалі нашую зямлю і ў ёй знайшлі сваю магілу.

Ёсць старажытная легенда аб заснаванні быццам яшчэ раней обрамі (аварамі) паселішча Аброва. Да даўніх часоў адносіць нас паданне аб існаванні старажытнага гарадзішча, якое было на поўнач ад Косава. У 1871—72 вучоны Ян Завіша вёў тут раскопкі. Пасля вайны даследавалі яго Ю. У. Кухарэнка, П. Ф. Лысенка, Л. Д. Побаль, П. А. Рапапорт. Авальная пляцоўка 60х42 м зарасла хвайняком. Умацавана 2 валамі вышынёй за 2 м. Культурны пласт 0,3 м. Рэшткі вогнішчаў на брукаванай пляцоўцы і фрагменты ляпнога посуду. Па археалагічных матэрыялах вучоныя адносяць яго да раннефеадальнага перыяду (X—XI ст.). Адна з легенд назву Косава звязвае з імем Касы, які быў кавалём і ў часы набегаў татар каваў зброю, якою жыхары біліся з ворагам. Калі людзі ішлі да яго, казалі, што ідуць да Касога, і месца, дзе ён жыў, паступова стала звацца Косава.

Шмат легенд бытуе аб існаванні паселішча на поўнач ад Івацэвічаў, быццам бы там быў гарадок, які згарэў у нейкае нашэсце. Старажылы яшчэ ў недалёкім мінулым паказвалі гэтае месца.

У 1413 г. цэнтральная тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага была падзелена на два вялікія ваяводствы — Віленскае (уваходзіла тэрыторыя Усходняй Літвы, Цэнтральнай і Усходняй Беларусі) і Трокскае (уключала паўночна-заходнія землі Літвы і Заходняй Беларусі). У пачатку XVI ст. з іх выдзеліліся Полацкае, Віцебскае, Наваградскае, Падляшскае ваяводствы. Па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформе 1564—66 гадоў уся тэрыторыя ВКЛ была падзелена на 8 ваяводстваў, якія дзяліліся на паветы. Тэрыторыя нашага раёна пачаткова адносілася да Наваградскага ваяводства. Да таго часу адбылося ўжо злучэнне ў саюз ВКЛ і Польшчы (Крэўская унія 1385) — кіраванне Вітаўта (1392—1430), Казіміра I (1440—1492), Аляксандра (1492—1506), Жыгімонта II Старога (1505—1548), Жыгімонта III (1548—1572). У перыяд да 1569 г. Літоўска-Беларуская дзяржава мела

яшчэ значную самастойнасць, якую амаль зусім страціла пасля Люблінскай уніі, калі была ўключана ў склад Рэчы Паспалітай, а ў маёмасным, духоўным і палітычным развіцці пасля Брэсцкай рэлігійнай уніі 1596 г. яшчэ больш аказалася пад уплывам Польшчы.

«Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.» яшчэ ў пэўнай меры захоўваў самастойнае вырашэнне многіх спраў развіцця княства без Кароны. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. перад кожным сеймам Рэчы Паспалітай склікаўся ў Слоніме (наш раён адносіўся да Слонімскага павета) сейм ВКЛ. На ім выпрацоўваліся інструкцыі, якія вызначалі мэты і задачы ўсіх паслоў княства на агульным сейме. Вышэйшымі дзяржаўнымі асобамі ВКЛ пры вялікім князю былі маршалак земскі і маршалак дворны, якія з'яўляліся ахоўнікамі парадку і этыкету пры двары, узброенымі сіламі кіраваў гетман найвышэйшы, дзяржаўную канцылярыю ўзначальваў канцлер і яго намеснік — падканцлер, дзяржаўнай казной загадваў падскарбій земскі. У ваяводствах вырашалі справы ваяводы, пры якіх кашталян узначальваў войска і апалчэнне, ключнік адказваў за спагнанне падаткаў і чыншу, канюшы назіраў за дзяржаўнай стайняй, лоўчы — за ляснымі і паляўнічымі ўгоддзямі. У павеце кіраўніком адміністрацыі быў староста, намеснікам яго — падстароста. Ніжэйшым звяном у мясцовым кіраванні былі дзяржаўцы, якія на месцах вяршылі суд і кіраванне.

Буйнейшым уласнікам зямлі ў XVI ст. была дзяржава. Як калектыўная ўласнасць, яна належала буйным феадалам.

Рост гарадоў, сёл і вёсак на Івацэвіцкай зямлі разгарнуўся ў XIV—XVI ст. Аб гэтым і расказваюць старажытныя пісьмовыя крыніцы.

М. К. Любаўскі ў кнізе «Абласное дзяленне і мясцовае кіраванне Літоўска-Рускай дзяржавы да часу выдання першага Літоўскага Статута» ўказвае, што ўжо ў запісе Вялікага князя Вітаўта ад 1401 г. упамінаецца «волостка Вяда». У заходняй частцы Пінскага павета, на поўнач ад ракі Ясельды, паміж Здзітаўскай і Вядскай пушчамі былі раскіданы пасяленні Вядскай воласці (раней гэта воласць уваходзіла ў склад Наваградскага княства), да якой належалі Вяда пры возеры Бабровіцкім, Бабровічы пры тым жа возеры, Коланск і, нарэшце, сяло Гаць.

Паўночна-ўсходняя частка цяперашняй тэрыторыі раёна ў XV ст. належала Клецкаму княству. Як указвае Любаўскі, «к Клецку тягло село Добромысл (ныне Слонимского уезда на р. Щаре) до пожалования его великим князем Казимиром пану Яну Немировичу; в 1518 году пан Ян Немирович, записывая своей жене третью часть отчины своей и куплю свою всю, поместил в запись между прочим на Полесье Добромысл и Нуловиды (ныне Миловиды Добромыслской волости Слонимского уезда). Сохраняли ли какую-нибудь связь эти именья с Клецком после того, как поступили во владение панов Немировичей, или нет, на это нам не удалось найти указаний в источниках; скорее всего, что не сохранили, и паны Немировичи с этих имений служили непосредственно великому князю в ополчении воеводства Виленского, наряду с самими Клецкими владениями».

Далей указваецца, што вялікі князь Аляксандр у 1505 г. ахвяраваў князю Васілю Львовічу Глінскаму двор у Слонімскім павеце Ласасіную «со всеми того двора слугами путными и людми тяглыми и со слободичи, што на воли седять, и с данники, и с куничники». Пасля здрады князя Глінскага кароль Сігізмунд аддаў Ласасінскі двор князю Сямёну Аляксандравічу Чартарыйскаму. Яшчэ раней, у 1485 г., Ласасін, Бялавічы і Гошчава былі падараваны вялікім кня-

зем Казімірам цвярскому князю Міхаілу Барысавічу, які збег з Русі ў Літву пасля паражэння войскаў маскоўскага князя Івана III у вайне з Вялікім княствам Літоўскім.

Са звестак, якія ўтрымліваюцца ў кнізе М. Любаўскага, зробленых на аснове запісаў у Літоўскіх метрыках і іншых актах, можна зрабіць вывад аб існаванні на тэрыторыі нашага раёна значных паселішчаў ужо ў XIII—XV ст. Гэта: Вяда (цяпер не існуе, спалена немцамі), Тупічыцы (цяпер не існуе, спалена немцамі), Бабровічы, Коланск, Гаць, Дабромысль, Гошчава, Бялавічы, Івацэвічы, Боркі і іншыя. Нават воласць Здзітаўская змяшчаецца ў актах у павеце Троцкім. Адсюль вынікае, што пэўны час і тэрыторыя нашага раёна адносілася да Троцкага павета, які займаў вялікую тэрыторыю. Як сведчыць М. Любаўскі, у канцы XV ст. значылася і сяльцо Івацэвічы Боркінскай воласці Слонімскага павета як маёнтак паноў Ілінічаў.

Першы ўпамінак аб Івацэвічах адносіцца да 1519 г. Назва Івацэвічы (ад старадаўняга Івачэвічы) узнікла ад імя Івач, які, як лічаць, быў заснавальнікам паселішча. Звесткі аб мястэчку Івацэвічы змешчаны ў актавых кнігах. У Літоўскай метрыцы за 1519 г. сустракаем акт аб перадачы маёнтка Івацэвічы гродзенскім купцам за даўгі. Але, як адзначалася, пасёлак пад такой назвай існаваў і раней, задоўга да гэтага. На поўнач ад сучасных Івацэвічаў каля р. Грыўда выяўлены рэшткі падмуркаў існаваўшага калісь пасёлка. Два разы аб маёнтку Івацэвічы гаворыцца ў кнізе «Рэвізія пушчаў і пераходаў звярыных у Вялікім княстве Літоўскім», якая была складзена ў 1559 г. старостаю Мсцібагоўскім Рыгорам Багданавічам Валовічам. Ён пісаў: «Найпервей починаеться граница пущи Загривецкое от реки Суроминки и местечка пана Викторина Ивацевича». Або яшчэ: «А рекою Гривдою миля до речки Радуши, делечи пущи его милости господарскую з землею пана Викторина именья его Ивачовского. А от того ставу, тою ж рекою Гривдою уверх до пущи Любисской». На геаграфічнай карце, складзенай каля 1600 г. Т. Макоўскім, пазначана: Івачэвічы. На пазнейшых картах Івачэвічы ідуць пад назвай Іванчэвіцэ.

У 1559 г. маёнтак Івацэвічы належаў пану Віктарыну. У дакуменце ад 8 красавіка 1560 г. уладальнікам названы яго сын Іван, у дакуменце ад 30 чэрвеня 1565 г. — Софія Віктарынава. У першай палове XVI ст. маёнтак Івацэвічы ўваходзіў у склад Слонімскага вялікакняжацкага ўладання. Сялянскія павіннасці складаліся: са «службы» (так называлася зямельная ўласнасць дворніча, адышоўшая да феадала), патрабавалася: дзякла — па 1 бочцы жыта (або замест яго 10 грошаў) і бочку аўса (без замены грашыма), воз сена або тры грошa, і сажань невада; акрамя таго, трымальніку маёнтка даваўся калач хлеба, 10 жмень ільну, вавёрка, адзін дзень у тыдзень сяляне павінны былі адпрацаваць на пана.

Да 1557 г. становішча сялян рэзка пагоршылася. Вядомы з дакументаў факт сведчыць аб барацьбе івацэвіцкіх сялян супраць феадальнага прыгнёту. У лістападзе 1560 г. селянін Івана Віктарына Станіслаў Белавус спаліў лесапільню гаспадара. Прычынай гэтага з'явілася правядзенне аграрнай рэформы — «Уставы на валокі» (1557). Пасля правядзення рэформы была ўстаноўлена пастаянная (10—20% ад вартасці зямельнай рэнты) грашовая павіннасць — чынш; паншчына была павялічана ў 2 разы: сем сялянскіх валок павінны былі апрацоўваць адну валоку фальварка. З кожнай валокі сяляне плацілі пазямельны падатак ад 6 да 21 гроша. Акрамя таго, яны давалі 1—2 бочкі аўса з валокі зямлі. «А калі за авёс будзе

загадана даваць грашыма, то за кожную бочку 5 грошаў, а за адвоз кожнай бочкі пяць грошаў. З тых жа вышэй названых валок, з кожнай валокі — адзін воз сена або тры грошы за сена, а за адвоз два грошы... Акрамя таго, з кожнай валокі зямлі павінны былі даваць гуся (або 1 1/2 грошы), 2 курыцы (або 16 пенязяў), 20 яек (або 4 пенязі)...».

У 1594 г. уладальнік Івацэвіч Сапега выдаў новую ўставу, па якой талака была павялічана ў тры разы і склала 12 дзён у год, дзякла выросла ў 2 разы: сяляне павінны былі даваць уладальніку па 2 бочкі аўса; па адной бочцы плацілі толькі сяляне вёсак Любішчыцы, Зарэчча, Азярцо, Панкі, Гічыцы, дзе былі дрэнныя землі.

Да 1631 г. Івацэвічы (у XVII ст. яны называліся Іванцэвічамі) уваходзілі ў склад маёнтка Харошчы Слонімскага павета, які належаў Стэфану Казіміру Кандзежаўскаму, а затым Марыі Халецкай. Становішча сялян прадаўжала пагаршацца. Калі ў 1557 г. паншчына складала два дні ў тыдзень з валокі зямлі, то ў першай палове XVII ст. патрэбна было «з кожнай паўвалокі аседлай зямлі аднаму чалавеку працаваць тры дні ў тыдзень, а ў час жніва з паўвалокі службовай павінны працаваць чатыры дні па два чалавекі, а два свабодных дні ім захоўваюцца», — адзначана ў дакуменце маёнтка Харошча за 1631 год. Калі ў першай палове XVII ст. паншчына складала тры дні ў тыдзень з валокі, то ў другой палове XVIII ст. яна дасягнула 10 дзён з валокі і 3,6 дня з дыма.

Але і гэтыя ўзросшыя павіннасці дапаўняліся новымі абавязкамі сялян: «Яны павінны, — запісана ў інвентары маёнтка Харошча... за 1631 г., — несці варту ў панскім двары па 1 чалавеку ў тыдзень з аседлай валокі, іх жонкі павінны працаваць на ўсякай праполцы, на ўборцы гародніны, а таксама прасці панскі лён і воўну. Палавіну мёду з сялянскіх вулляў, палявых і лясных борцяў яны павінны здаваць гаспадару...» Як бачым з гэтага дакумента, пчалярства і бортніцтва было распаўсюджана.



Фрагмент карты Вялікага княства Літоўскага Т. Макоўскага, 1613 г., на якой пазначаны Івацэвічы і Косава.

Узрастаючы феадальны прыгнёт выклікаў узмацненне сялянскай барацьбы. Сяляне неаднаразова звярталіся са скаргамі на злоўжыванні з боку адміністрацыі і паноў. Так, сяляне вёскі Любішчыцы скардзіліся каралю на празмернае абкладанне павіннасцямі. Кароль вымушаны быў выдаць у 1679 г. уставу, па якой вызначаліся абавязкі сялян на карысць дзяржавы. Згодна ўставы, насельніцтва павінна было плаціць у казну чынш у памеры 4 злотых 10 грошаў літоўскіх з адной валокі зямлі. Устава вызваляла іх ад нясення натуральных павіннасцей, уплаты мядовай даніны і пастаўкі фурманак.

У сувязі з новай скаргай сялян на ўзмацненне эксплуатацыі гэтая ўстава зноў была пацверджана ў 1720 г. Але хутка дзяржаўца Сапега патрабаваў ад сялян уносіць палову мядовай даніны натурай. Гэтае парушэнне ўставы выклікала пратэсты з боку сялян. У далейшым прычын для незадавальнення стала яшчэ больш. Сапегі пачалі прымушаць сялян адбываць паншчыну. Парушэнні «старыны» выклікалі хваляванні ў арандаваных Сапегамі сёлах. Натоўп узбуджаных сялян забіў памочніка войта, які патрабаваў выканання гэтых павіннасцей, і накіраваўся ў двор Боркі з намерам расправіцца з мясцовым адміністратарам Драздоўскім, якому ўдалося ўцячы. Атрымаўшы ваенную дапамогу і вярнуўшыся праз пэўны час, Драздоўскі арыштаваў кіраўнікоў паўстання. Ён іх бязлітасна катаваў, марыў голадам, паліваў на марозе вадою; некаторыя з іх памерлі ад знясілення. Суд, падтрымліваючы адміністрацыю, абавязаў сялян выконваць павіннасці згодна новага, устаноўленага староствам, інвентару. Хваляванне сялян было задушана.

Як сведчаць дакументы, землі, мястэчкі і вёскі на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна належалі буйным магнатам Дольскім, Вішнявецкім, Чартарыйскім, Тышкевічам, Храбтовічам, Сапегам, Трызнам, Агінскім, Хадкевічам, Пуслоўскім і інш. Яны былі не толькі буйнымі ўласнікамі, але і займалі важныя дзяржаўныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім. Так, Ян Хадкевіч (у 70-я гады XVI ст.) быў жамойцкім старостам і маршалкам земскім ВКЛ, Леў Сапега (пач. XVII ст.) — віленскім ваяводаю і канцлерам ВКЛ, Мікалай Трызна — вялікім літоўскім падскарбіем, Міхал Агінскі — гетманам ВКЛ, Мікалай Тышкевіч — смаленскім старостам.

У XVI ст. буйныя землеўладанні былі таксама гаспадарскай (велікакняжацкай ці каралеўскай) уласнасцю. Між феадаламі, якія імкнуліся пашыраць свае ўладанні, атрымліваць як мага большыя прыбыткі, ішла барацьба, часта яны не саромеліся ўрывацца ў гаспадарскія ўладанні. Рыгор Валовіч пры апісанні граніц пушчаў ВКЛ (1559) прыводзіць скаргі пасялян на дзеянні буйных магнатаў. Так, Слонімскія асочнікі скардзіліся на гошчаўскага ўладара Льва Абразцова, што ён «праз граніцу старадаўнюю перайшоўшы нямала яго пушчы гаспадарскае забраўшы, асадзіў там людзей 11 службаў». Такая ж скарга слонімскіх асочнікаў прыводзіцца на дзеянні абата Троцкага, уладальніка Аброва, што яго людзі таксама «пераходзячы граніцу, нямала пушчы караля забралі». Бортнікі Перавалоцкай пушчы каралеўскай скардзіліся, што ўладары суседнія Юндзіл і Тышкевіч іх, маўляў, у сваю пушчу «да бортных дрэваў не пускаюць», а «баяры каралеўскія Мізкгіры павету Слонімскага год 10 як уваходзяць у пушчу, лес рубаюць і поле раздзелваюць, а нас б'юць і грабяць і ў пушчу не пускаюць». Былі скаргі сялян і аб тым, што іх не пускаюць у пушчы, дзе яны мелі лес, дровы і сенажаці, борці, што іх пазбаўляюць магчымасці карыстацца імі, як гэта было раней.

У «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага» (1880—1895) апавядаецца аб мястэчку Быцень, што над р. Шчарай. Радавое мястэчка належала старажытнай сям'і Трызнаў. Мікалай Трызна, вялікі літоўскі падскарбій, які быў бяздзетным, апісаў сваім тастаментам (завяшчаннем) 30 ліпеня 1640 г. мястэчка і маёнтак кляштару базыльян, які быў заснаваны яго продкам Р. Трызнам для дачкі Еўфразіны ў 1607 г. Пазней нашчадкі Трызнаў Тызенгаўзы адсудзілі ў базыльян гэтыя ўладанні (1779).

У 1783 г. сярод сялян маёнтка Быцень было: 78% цяглых двароў, 3% чыншавых, 12% баярскіх і зямянскіх, 2% вольных. Прыкладна такі падзел існаваў і ў другіх маёнтках.

На тэрыторыі Івацэвіцкага раёна ў канцы XVIII ст. былі і прамысловыя прадпрыемствы. Толькі ва ўладанні Быцень у 1783 г. было іх 7: 1 вінакурнае, 5 мукамольных млыноў, маслабойня і капцільня. На гэтых прадпрыемствах працавалі як наёмныя рабочыя з сялян навакольных сёл, так і прыгонныя.

Пад канец XVIII ст. становішча сялян яшчэ больш пагоршылася. Па звестках за 1789 г. сяляне павінны былі плаціць з валокі 23 злотых і 16 грошаў чыншу, даваць адну бочку жыта, 1 воз сена, 1 гусь, 2 курыцы, 20 яек. Акрамя гэтага, з дыма неабходна было адрабіць 2 дні паншчыны ў тыдзень і 12 гвалтаў у год. Яны абавязаны былі па чарзе несці нядзельную варту. Па параўнанню з 1594 г. (прыкладна за 2 стагоддзі) чынш вырас больш чым у 26 разоў, паншчына — у два разы.

Івацэвіцкі раён у Заходняй Беларусі знаходзіцца як бы на скрыжаванні шляхоў з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень. Гэта, безумоўна, адбілася на яго жыцці ў даўнія часы. Вядома, што за ўвесь перыяд існавання Вялікага княства Літоўскага як самастойнай дзяржавы і ў складзе Рэчы Паспалітай яму давялося перажыць шмат войнаў, якія вяліся то з крыжакамі, то з татарамі, то з маскоўскімі князямі. Германскія рыцары з Тэўтонскага ордэна часта самастойна або па запрашэнню суседзяў разбуралі паўночныя землі Беларусі. Толькі пасля канчатковага паражэння ў Грунвальдскай бітве 1410 г., у якой рашаючай сілай былі беларускія, рускія і літоўскія палкі (а сярод іх і воі магнатаў нашага раёна), нашэсці крыжаносцаў спыніліся. Але ўвесь час неспакойнымі былі адносіны Літвы і Маскоўскага княства. Гэта прывяло да шэрагу спусташальных войнаў. У 1492 г. Іван III у саюзе з крымскім ханам Мэнглі Гірэем ішоў вайною на беларускія землі за «вотчыну сваю». Спусташальныя войны паўтараліся ў 1500, 1508, 1513, 1516, 1518, 1519, 1534, 1536, 1561, 1579—1582, 1609—1611, 1632—1634, 1654—1667 гадах. Праз нашы землі ў той час праходзілі польскія, рускія, літоўскія, татарскія войскі, якія неслі велізарныя шкоды і разбурэнні гаспадарцы, смерць людзям, стрымлівалі развіццё краю. Пасля кожнай навалы заставалася пустэча, якую трэба было зноў адраджаць і падымаць.

Беларусь пасля Люблінскай (1569) і Берасцейскай (1596) уніі канчаткова падпала пад нацыянальны і рэлігійны ўціск польскай дзяржавы, у руках якой была ўся ўлада. Ён належала зямля, сяляне, суд і права.

Вышэй гаварылася аб «валочнай памеры», што рэгламентавала сялянскае землекарыстанне і розныя павіннасці за яго. Акрамя «Уставы на валокі», былі і іншыя акты, якія ахоўвалі ўласнасць гаспадарскую і панскую. Цікавай з'яўляецца лясная ўстава, выдадзеная 27 лютага 1567 г. Па ёй вызначаліся абавязкі ляснічых па ахове лесу і лясных угоддзяў, меліярацыі лясной гаспадаркі і загадванню ніжэйшымі слугамі. Ляснічыя павінны былі аб'язджаць усе лясныя ўгоддзі, што

належалі каралю, і наглядаць, каб не было ніякай «шкоды ў зверы, бортным ці іншым дрэве». Ляснічы не меў права адпускаць нікому дрэва, годнае для будовы, без уласнаручнага подпісу гаспадара і павінен быў сачыць, каб высечка вялася толькі там, дзе вызначана лістом за подпісам гаспадара. Ляснічым забараняліся паляванне на звера для сябе, а таксама лясныя работы на сваю карысць. За карыстанне каралеўскімі сенажацямі ляснічыя павінны браць аброчную плату для каралеўскай казны. Тое ж за карыстанне бортнымі дрэвамі і рыбнымі тонямі, што ў каралеўскіх уладаннях. Яны збіралі чынш і з «вольных» людзей, што сяліліся каля каралеўскіх пушчаў. За сваю службу ляснічыя атрымлівалі ўтрыманне: 9 валок зямлі, з іх тры валокі на фальварак і 6 аселых валок для работ на фальварку. Акрамя таго, ляснічы атрымліваў з падданых, якія жылі на лясных валоках, па адной бочцы аўса з кожных 10 валок і па аднаму грошу ў год з кожнай валокі.

Аналізуючы арганізацыю заходнебеларускага сялянства ў XVI ст., М. Доўнар-Запольскі прыводзіць выдадзеныя ў 1569 г. інструкцыі рэвізорам, як клапаціцца аб гаспадарскім двары — усё ўлічыць, усё правяраць, каб за ўсё плацілася.

На гэта мы звярнулі ўвагу таму, што Івацэвіччына была лясным краем, дзе шмат пушчаў былі каралеўскай уласнасцю і на іх распаўсюджваліся названыя статуты і інструкцыі.

Пад канец XVI ст. складанымі сталі рэлігійныя праблемы. Каталіцтва ўкаранялася як дзяржаўная вера, уніяцтва яму падыгрывала, праваслаўе прыціскалася. Разгортвалася рэлігійная барацьба. Беларускія вярхі і шляхта адварочваліся ад веры продкаў і прымалі выгаднае для іхняй кар'еры каталіцкае веравызнанне. Нізы, папаўшы ў панскую няволю, усё ж захоўвалі свае звычаі і мову, сваю веру. Святар Гошчаўскай царквы Лонгвін Фармасевіч, які ў царкоўным летапісе апісвае гэты перыяд, адзначае, што беларускія паны, якія служылі пры каралеўскім двары, сталі перакідвацца ў каталіцкую веру, адказвацца ад сваёй мовы. Ён прыводзіць «Дзельчы акт», складзены на беларускай, у той час дзяржаўнай, мове ў 1614 г., дзе ўладальніца маёнтка Гошчава Ельжбета Тышкевічова-Савіцкая ставіць свой подпіс па-беларуску, а сыны Ян, Крыштоф — ужо папольску. Заўважана ў XVII ст. хуткае будаўніцтва касцёлаў, каталіцкіх каплічак, уніяцкіх храмаў. Яны ўзніклі ў Косаве, Быцені, Целяханах, Гошчаве, Святой Волі і іншых паселішчах. Будуюцца для каталіцкіх вернікаў кляштары: базыльян у Быцені, дамінікан у Гошчаве.

Праўда, польскія каралі вымушаны былі лічыцца ў пэўнай меры і з часткай магнатаў ВКЛ. Ім захоўваліся значныя прывілеі.

Разбуральная віхура пранеслася па Беларусі ў час Паўночнай вайны 1700—1721 гг. Не абмінула яна і Івацэвіцкі край. Пасля перамог над Польшчай шведскі кароль Карл X рушыў на Расію. Яго войскі прайшлі па Беларусі, спачатку кіруючы на Маскву, а пасля паражэння пад Лясной на Магілёўшчыне — на Палтаву.

Пад канец XVIII ст. Рэч Паспалітая пачала заняпадаць, слабець. Гэта выкарысталі суседнія дзяржавы: Прусія, Аўстрыя і Расія. Падзеі таго часу мелі водгук і ў нашым краі.

У 1794 г. было нацыянальна-вызваленчае паўстанне ў Польшчы, якім кіраваў Тадэвуш Касцюшка, што нарадзіўся 4 лютага 1746 г. у фальварку Мерачоўшчына каля Косава. Сям'я Касцюшкаў належала да дробнай шляхты. Яго бацька Людвіг Касцюшка арандаваў фальварак Мерачоўшчына за 54,500 злотых у Сапегаў, якія выплаціў яму граф Флемінг.

Быценскі кляштар базыльян

Кляштар існаваў у 1607—1845 гг. у мяст. Быцень. Заснаваны ўласнікам Быценя Р. Р. Трызнам для дачкі Еўфразіны, якая, аднак, пайшла да віленскіх базыльянак, таму быценскі кляштар стаў мужчынскім. Настаяцелі І. Кунцэвіч (да 1613), затым Катлубай, Д. Ціcовіч (да 1640), С. Стаўроўскі (да 1654). У 1615 г. папа рымскі даў кляштару прывілей на адкрыццё духоўнай школы (навіцыяту), у якой затым навучалася шмат дзеячаў уніяцкай царквы. У 1626 г. М. Трызна заснаваў у манастыры шпіталь на 10 месцаў. Навіцыят і шпіталь існавалі да 1830-х гадоў. Першыя будынкі кляштара былі драўляныя. У 1640 г. М. Трызна перадаў манахам мястэчка і маёнтак Быцень, заклаў каменную царкву (магчыма, сучасная Успенская царква), якая, відаць, была і сямейнай пахавальняй. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. кляштар даў прытулак базыльянам з Вільні, Полацка, Віцебска, Мінска. Настаяцель Б. Цярлецкі (часовы кіраўнік ордэна) вывез сюды з Віленскага Троіцкага манастыра цудатворны абраз Маці Боскай і іншыя царкоўныя каштоўнасці. Тут захоўваўся жыровіцкі абраз Маці Боскай, жыў уласнік абраза Маці Боскай І. Бражыц. Быценскі кляштар базыльян лічыўся адным з заможных у ордэне, яго фундушавы маёнтак Дзяткавічы (22 дамы, 30 валок ворнай зямлі, 4 валокі лесу) у 1613 і 1634 гадах яшчэ больш павялічаны. У 1775 г. падскарбі літоўскі надворны А. Тызенгаўз, нашчадак Трызнаў, адсудзіў у базыльян мястэчка. У 1712 г. навагрудскі гараднічы І. Баканоўскі запісаў кляштару в. Мілавіды. У пачатку XVIII ст. пры І. Пяткевічу (памёр у 1708) пабудавана Троіцкая царква — крыжовая ў плане, з 2-вежавым фасадам і паўкруглымі ў плане апсідай і трансептам. У 1730—1737 гг. у ёй абсталяваны разны іканастас і 11 алтароў. Да царквы прымыкаў 2-павярховы жылы корпус. З 1814 г. кляштару належаў маёнтак Гошчава. У часы скасавання уніяцкай царквы (1839) у Быценскі кляштар базыльянаў інтэрніравалі непакорных уніяцкіх святароў. Троіцкая царква і жылы корпус кляштара разбураны ў час першай сусветнай вайны. Захаваліся Успенская царква і абраз «Спас Уседзяржыцель» XVI ст.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 151.

Здань базыльянскай святыні

Зусім роўная мясцовасць, на якой адзінока стаіць невялічкая цэркаўка... Цяжка, нават немагчыма ўявіць, што некалі яна тулілася з аднаго боку да велічнага сабора, а з другога — да магутных кляштарных муроў. У XVII—XVIII ст. кляштарны комплекс ордэна базыльян быў адным з багацейшых і вядомых на Беларусі.



Царква Быценскага кляштара базыльян. Папярочны разрэз.

... У XVII ст. кляштарны комплекс у Быцені быў надзейна ўмацаваны. Пад час паўстання Б. Хмяльніцкага ў ім хаваліся уніяты нават з Украіны і іншых месцаў. З 1656 г. у Быценскім манастыры знаходзіўся кіраўнік базыльянскага ордэна Бенядзікт Тарлецкі. Тут захоўваліся таксама мошчы старца Сімяона Стаўроўскага, які быў настаяцелем манастыра з 1640 г.

Вялікая мураваная саборная царква, узведзеная пасля 1673 г. намаганнямі ігумена Іосіфа Пяткевіча. У 1710 г. храм быў асвячоны ў гонар свяшчэннамучаніка Іясафата (уніяцкага архіепіскапа І. Кунцэвіча, забітага пад час паўстання ў Віцебску ў 1623 г.).

Спадкаемца згаслага уніяцкага роду Трызнаў падскарбі надворны Рэчы Паспалітай Антоні Тызенгаўз у 1775 г. адабраў Быценскі

манастыр у базыльян і перадаў католікам. Верагодна, у гэты час саборны храм быў ператытулаваны ў гонар св. Тройцы. У 1839 г. каталіцкі кляштар — зноў прымусова — перададзены праваслаўным. Пры гэтым інвентар быў складзены на польскай мове ад 6 ліпеня 1839 г. Інвентар Быценскага манастыра, што належаў Літоўскай дыяцэзіі Слонімскага павета Гродзенскай губерні з апісаннем царквы, кляштарных і фальварковых будынкаў, вёскі ды інш. У гэтым інвентары паведамляецца, што «царква пад тытулам св. Тройцы вымураваная стараннем і накладам фундатара Мікалая Трызны». І далей — храм гэты «фігуры крыжовай», з паўкруглымі бакавымі фасадамі. Акрамя дзвюх вежаў, што аздабляюць галоўны фасад, ёсць яшчэ трэцяя, — над сярэдзінай царквы, якая ў выглядзе ліхтара абапіраецца на чатыры слупы. Сярэдняя мае восем акон і дае святло ўсёй царкве. Вежы накрытыя бляхай і маюць драўляныя крыжы, абітыя таксама бляхай. Унутры царква атынкаваная і пабеленая. Дах на ёй новы, гонтавы. За ўваходам у царкву ёсць бабінец у трох прыдзелах, «мураваны і скляпеністы», над ім узведзеныя хоры для пеўчых. 12 акон горных з кратамі, а на фасадных вежах чатыры акны і г. д.

Прыведзены ў адаптаваным выглядзе інвентарны спіс — каштоўны дакумент архітэктуры базыльянскага комплексу, бо ў 1915 г., пад час сусветнай вайны, царква была значна разбураная. Пра гэта сведчаць фотаздымкі помніка, зробленыя Віленскім таварыствам аматараў навук у 1930-я гг. Нейкі час храм заставаўся паўразбураным, але ўжо ў 1929 г. яго часткова аднавілі ды адпраўлялі службу. У другую сусветную вайну царква і манастырскі корпус былі зруйнаваныя канчаткова.

Абмерныя чарцяжы вялікай Троіцкай царквы і план на ўзроўні акон цэнтральнага нефа, папярочны разрэз па сяродкрыжжы ўпершыню апублікавала паводле матэрыялаў Віленскага таварыства аматараў навук А. Квітніцкая. Храм, пабудаваны як уніяцкі, меў мерыдыяльную арыентацыю алтаром на поўнач. Царква ў верхнім сячэнні ўяўляла выцягнуты па восі «поўдзень—поўнач» лацінскі крыж. З трох бакоў да квадрата сяродкрыжжа прылягалі паўцыркульныя апсіды, перакрытыя паўсферычнымі конхамі. Алтарная апсіда па памерах адпавядала апісанаму квадрату, бакавыя былі меншыя за квадрат. Прастора сяродкрыжжа перакрывалася васьмікантовым шатром з апорным кольцам, якое абапіралася на падпружныя аркі цэнтральнага квадрата. З папярочнага разрэзу храма бачна, што канструкцыя і форма вонкавага пакрыцця не адпавядалі дакладна скляпенням унутры яго. Шацёр над сяродкрыжжам звонку быў «апрануты» ў паўсферычны купал і завяршаўся светлавым ліхтаром з фігурным пакрыццём. Конхі над апсідамі звонку былі накрытыя кроквеннымі конуснымі дахамі, якія разам з асноўным купалам стваралі своеасаблівую закончаную кампазіцыю. Форма амаль ідэальнага тэтраконха, закладзеная ў аснову аб'ёмна-прасторавай структуры храма з паўднёвага боку, парушалася прыбудовай бабінца (квадратнага ў плане) і вузкага двухвежавага нартэкса, што і надавала плану выгляд лацінскага крыжа.

А. Квітніцкая слушна лічыла саборную царкву Быценскага манастыра характэрным прыкладам архітэктуры уніяцкіх храмаў, што ўяўляе сабой «своеасаблівы сплаў архітэктурных формаў каталіцкага храма і драўлянага праваслаўнага дойлідства, якое мае агульныя карані з расейскай архітэктурай, з ейнымі цэнтрычнымі драўлянымі храмамі». На нашу думку, архітэктоніка гэтага помніка сапраўды выцякае генетычна з чатырохзрубных крыжовых праваслаўных сабораў XVII ст., але не расійскіх, а беларускіх, з рэгіёна Падняпроўя і

Быценская капліца. Пабудавана ў 1654 г. пры базыльянскім кляштары. У 1845 г. пераўтворана ва Успенскую царкву.

Падзвіння, якія ў сваю чаргу аказалі ўплыў на фармаванне архітэктурных формаў расійскага, гэтак званага нарышкінскага барока. Будова, кампазіцыйныя і канструкцыйныя прыёмы сабора Быценскага манастыра асабліва блізкія да драўлянай уніяцкай Іллінскай царквы ў Віцебску, пабудаванай у 1746 г., якая таксама мела ў плане лацінскі крыж, незалежнасць канструкцый унутраных перакрыццяў ад вонкавай кампазіцыі пакрыцця.

Краязнаўца і гісторык культуры Станіслаў Лёранц, які даследаваў помнік у 1930-я гады, лічыў, што бакавыя нефы і двухвежавы фасад былі прыбудаваныя да сабора ўжо ў другой палове XVIII ст., але гэта толькі гіпотэза.

З інвентару 1839 г. вядома, што саборная царква з трох бакоў абгароджаная «мурам з цэглы без тынку», а чацвёрты бок замыкаў кляштар. Ён быў «у тры лініі мураваны, звонку не пабелены, на два паверхі ўзнесены, над лініямі маюцца склепы, кожная з тых ліній аднолькавай шырыні і амаль аднолькавай даўжыні. Дах новы, гонтавы. Пячных комінаў на кляштары 17". З гэтага апісання вынікае, што кляштарны будынак — двухпавярховы (са склепам), П-падобны ў плане, са скляпеністымі перакрыццямі і падвойнымі вокнамі. Акрамя келляў, у ім размяшчаліся трапезная з кухняй, бібліятэка ў заходнім крыле. Гэтыя тры памяшканні мелі цагляную падлогу, усе астатнія — драўляную. Ужо на той час бібліятэка была пустая. Кляштарны калідор злучаўся з сакрысціяй з правага боку прэсбітэрыя сабора, над якой размяшчалася скарбніца. З другога боку кляштар прымыкаў да зімовай царквы. На загад А. Тызенгаўза былі ўзведзеныя званіца і брама (каля 1775 г.) у стылі віленскага барока.

Ад велічнага некалі архітэктурнага ансамбля, здань якога паўстае перад намі з архіўных крыніц, на наш час уцалела толькі малая Спаса-Праабражэнская царква, якая занесена ў «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» без усялякага напаміну пра мінулае.

Т. Габрусь.

Спадчына, 1994. № 3. С. 71—74.

Быценскі манастыр і кнігапісанне

Мікола Нікалаеў у кнізе «Палата кнігапісання» (Мн., 1993) расказвае аб развіцці кнігапісання на Беларусі. Тут жа ён прыводзіць шэраг фактаў, якія тычацца дзейнасці Быценскага базыльянскага манастыра ў гэтай справе. У «Паміннiку», які пісаны ў 1686—1721 гг. і тычыцца ордэна базыльян, называецца адзін з яго верагодных складальнікаў айцец Ян Альшэўскі, протакансультар ордэна базыльян. Пра яго напісаў вядомы дзеяч ордэна базыльян Антон Завадскі:

«...Айцец Ян Альшэўскі, протакансультар ордэна. Той, хто гэту кнігу задумаў і ўласнай рукою закончыў на апошняй старонцы... Меў правую руку высахлую, бо яшчэ ў маладыя гады, калі пан, якому служыў, напаў на госця, ён госця прыкрываў і атрымаў рассечаныя шабляй жылы на руцэ, якраз каля далоні... (далей расказваецца, як скалечаны малады чалавек некаторы час рыхтаваўся да навук, потым вучыўся на дзякана, потым, каля 1700 г., сацыяльная камісія засведчыла, што пры сваім калецтве ён усё ж можа выконваць абавязкі святара і веды для гэтага мае дастатковыя... потым служыў у розных гарадах і манастырах. — М.Н.)... пісаў пра грамадзянскую вайну ў Вялікім княстве Літоўскім у адменнай кнізе, названай «Абрыс дамовай нешчаслівасці», перапісаў сваёй левай рукой «Матрылогіум», альбо «Меналогі» на кожны дзень цэлага года жыція святых. Пісаў асобную кнігу «Пахвала мітрапалітам, ад часу святога злучэння Літвы і Русі з рымскім касцёлам»... Памёр у Быцені 9 кастрычніка 1723 г.

Антон Завадскі скончыў пачатую Філарэтам Шукевічам і Янам Альшэўскім кнігу. В. Ластоўскі паведамляе пра Менскі Паменнік (Суботнік), які пачаў складаць у 1610 г. архімандрыт Паісій Сухоўскі: «Гэты «Суботнік» дакончыў толькі праз сто гадоў Антон Завадскі». З бібліятэчных запісаў на тытульным аркушы Паменніка можна рэканструяваць шлях гэтае кнігі: у 1729 г. перададзена з бібліятэкі Тараканскага манастыра ў бібліятэку манастыра Быценскага. Калі Антон Завадскі стаў вікарыем базыльянскага ордэна,

ён загадаў перанесці кнігу ў бібліятэку Жыровіцкага манастыра «яко безпячнейшую», што і было зроблена 26 лютага 1731 года...»

У рукапісных кнігах XVII—XVIII ст. ёсць запісы даходаў і расходаў, закупы, інвентары. Ёсць запіс планаў земляў маёнткаў, малюнкі, спісы з гістарычных дакументаў. У кнігі-архівы запісваліся і гістарычныя даследаванні. Такая кніга-архіў базыльянскага кляштара была складзена ў 60—90-я гады XVIII ст. у Быцені. У адным са спісаў паведамляецца аб папернях на беларускіх землях у XVI—XVII ст. Такая паперня існавала ў Быцені і была заснавана ў 1779 г. А. Тызенгаўзам і базыльянамі. Яна працавала і ў 1842 г.

З XVII ст. вядома 15 кнігапісцаў, якія працавалі ў розных манастырах. Большасць з іх — гэта манахі, дыяканы і святары. Адзін з кніжнікаў XVII ст. не назваў свайго прозвішча, але сціпла запісаў: «Сия же книжица списася в 1777 году месяца септембрия 10 числа трудолюбием многогрешного иероманаха чину св. Василия Великого в богоспасаемом монастыри Бытеньском начата быть...»

Быценскі манастыр быў у свой час пэўным культурным асяродкам.

Агінскі канал

Агінскі канал (Вялікі Пінскі канал, Порт Агінскага) — частка воднага шляху з Дняпра ў Нёман на тэрыторыі Пінскага, Івацэвіцкага і Ляхавіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці. Злучае раку Ясельда (прыток Прыпяці) і раку Шчара (прыток Нёмана). Даўжыня з Выганашчанскім возерам 54 км. Будаўніцтва пачалося ў 1765 годзе на сродкі магната М. К. Агінскага. Міхал Казімір Агінскі (1730—1800) быў дзяржаўным дзеячам Вялікага княства Літоўскага, кампазітарам, паэтам і мецэнатам. Пэўны час жыў у Слоніме, дзе пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, заснаваў оперны тэатр і капэлу, пачаў будаўніцтва названага яго імем канала. Канал будаваўся паводле ідэі, выказанай пінскім негацыянтам М. Бутрымовічам. Ён адкрываў магчымасці для экспарту лесу і іншых матэрыялаў праз балтыйскія порты, таму яго будаўніцтва было падтрымана Варшаўскім сеймам (1768), які пастанавіў падараваць Агінскаму мястэчка Лагішын і в. Мышкаўцы з прылеглымі землямі і дазволіў з пачаткам сплаву спаганяць мыта «па 8 злотых з вясла ці ад спіцы». У сувязі з вымушанай эміграцыяй Агінскага з-за яго ўдзелу ў Барскай канфедэрацыі 1771 г. (барацьба супраць караля Панятоўскага ў Польшчы і царскай Расіі) будаўнічыя работы працягваліся (з перапынкам) за дзяржаўны кошт: прыводзіліся ў парадак прылеглыя дарогі, ачышчаліся рэкі, у т. л. Нёман. У 1775 г. сейм абвясціў пачатак сплаву, але канал не быў яшчэ поўнасцю ўпарадкаваны. Пасля далучэння Беларусі да Расіі афіцэрамі Генеральнага штаба былі праведзены інструментальныя здымкі, рэкагнасцыровачныя работы, прамерана глыбіня канала і вызначана яго прапускная здольнасць. Да 1804 г. добраўпарадкаванне было закончана і канал стаў поўнасцю суднаходным. Меў 10 шлюзаў. Па Агінскаму каналу пераважна сплаўлялі лес з палескіх пушчаў; плыты, паводле сведчання відавочцаў (1820), расцягваліся «амаль на 30 міль у даўжыню, ад Ясельды да Слоніма». Перавозілі таксама збожжа, сыравіну на вотчынныя мануфактуры ў Целяханах.

Са з'яўленнем чыгуначных шляхоў значэнне Агінскага канала зменшылася. У гады першай сусветнай (1914—1918) і савецка-польскай (1920) войнаў канал апынуўся ў зоне ваенных дзеянняў, што прывяло да разбурэння гідратэхнічных збудаванняў. Навігацыя стала наладжвацца з 1926 г., поўнасцю канал адноўлены ў 1928 г. Да 1941 г. выкарыстоўваўся для лесасплаву, эпізадычна — для суднаходства. У Вялікую Айчынную вайну на канале адбыўся вялікі бой восенню 1942 г. паміж партызанамі атрада імя Шчорса і фашысцкімі карнікамі, якія страцілі больш 60 гітлераўцаў.

У вайну шлюзы і плаціны былі разбураны ці пашкоджаны. Спробы аднавіць у пасляваенны час не мелі поспеху, у выніку рэчышча абмялела і стала зарастаць, канал страціў гаспадарчае значэнне.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993. Т. 1. С. 32—33.

Нарадзіўся ў маёнтку Мерачоўшчына

КАСЦЮШКА Андрэй Тадэвуш Банавентура (30.11.1745—15.10.1817). Палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794.

Нарадзіўся ў небагатай сям'і беларускага шляхціца, фамільны маёнтак якога знаходзіўся ў в.Сяхновічы Кобрынскага пав. (цяпер Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл.). Выказана меркаванне, што ён нарадзіўся 4.2.1746. Гэту дату гісторык Т. С. Корзан назваў зыходзячы з запісаў у метрыцы, з якой відаць, што яго хрысцілі ў Косаўскім касцёле 12.2.1746. Аднак больш праўдападобна, што спачатку яго хрысцілі ў праваслаўнай царкве і назвалі Андрэем у гонар апостала Андрэя Першазваннага, свята якога прыпадае на 30 лістапада. Таму датай яго нараджэння можна лічыць 30.11.1745. Такое меркаванне грунтуецца на тым, што яго маці Фёкла (Тэкля) была праваслаўнай і паходзіла з вядомага на Беларусі роду Ратамскіх. У пасаг яна атрымала невялічкі маёнтак Дразы ў Барысаўскім пав. Яе родны брат Марцін быў падкаморым Аршанскага пав. Вядома, што Ратамскія разам з Агінскімі і інш. праваслаўнымі шляхціцамі Менскага ваяв. ахвяравалі грошы на будаўніцтва ў Менску на Верхнім рынку (Саборная плошча, цяпер Плошча Свабоды) праваслаўнага сабора Пятра і Паўла. Пра тое, што дзяцей, раней хрышчоных у праваслаўных цэрквах, потым паўторна хрысцілі ў каталіцкіх касцёлах або проста

Дом Касцюшкаў. З малюнка М. Кулешы «Мерачоўшчына». 2-я палова XIX ст.

складалі фіктыўныя каталіцкія метрыкі, сведчаць гістарычныя крыніцы (Холмская Русь. Историческая судьба русского забужья. Спб. 1887). Узаемны ўплыў каталіцызму, праваслаўя і уніяцтва — прычына таго, што на працягу ўсяго жыцця А. Т. Касцюшка абыякава ставіўся да рэлігійнага пытання, хоць і вучыўся ў каталіцкай канфесіянальнай школе.

Імкнучыся сказіць беларускае паходжанне К., нават у сучасных энцыклапедыях (польскай і Вялікай Савецкай) сцвярджаецца, што ён нібыта нарадзіўся на Валыні, якая ў 1569 была далучана да Польшчы, і тым самым прылічваюць яго да палякаў. Сам К. называў сябе літвінам, як называлі сябе ў той час усе беларусы. Былі спрэчкі і пра месца яго нараджэння. На думку адных біёграфаў, ён нарадзіўся ў в. Сяхновічы, што пацвярджаецца надпісам каля партрэта на медалі, зробленым у Парыжы ў 1818: Thaddeus Kósciuszko (Тадэвуш Касцюшка), а на адвароце — Natus an M. DCC. XLVI. Siechnowiez Ducat. Lithvie... obit an M. DCC. XVII (нарадзіўся ў 1746 Сяхновічы княства Літоўскае... памёр у 1817). Іншыя сцвярджаюць, што ён нарадзіўся ў маёнтку Мерачоўшчына каля г. Косава (цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.). Аднак у абодвух выпадках размова ідзе пра Беларусь, а не пра Валынь ці Польшчу. У гістарычных дакументах Беларусі прозвішча Касцюшка сустракаецца з 1458.

Продкі К. займалі сціплае становішча ў грамадстве. Яго прадзед Аляксандр Іван быў падсудкам, а дзед Амбражэй пісарам у Брэсцкім земскім судзе. Бацька Людвік ніякіх пасад не займаў, а меў званне мечніка Брэсцкага ваяв. і палкоўніка, хоць у арміі ніколі не служыў. У сям'і Тэклі і Людвіка Касцюшкаў было 4 дзяцей: Ганна, Юзаф, Кацярына і Андрэй Тадэвуш. Да 9 гадоў Андрэй Тадэвуш выхоўваўся дома, як і ўсе дзеці дробнамаянтковай шляхты, без якіх-небудзь гувернёраў і настаўнікаў, г. зн. яго ранняе дзяцінства прайшло ў беларускай вёсцы. У 9 гадоў яго аддалі ў школу манаскага ордэна піяраў у м. Любешава Пінскага пав., дзе ён вучыўся 5 гадоў, да 1760. Вывучаў лацінскую, польскую, французскую і нямецкую мовы, атрымаў пачатковыя

веды па матэматыцы. Пасля заканчэння школы ён вярнуўся ў родную в. Сяхновічы і 5 гадоў дапамагаў маці па гаспадарцы. Яго бацька ў 1758 быў забіты ўзбунтаванымі сялянамі. Матэрыяльнае становішча бацькоў К. было вельмі сціплае. Бацькаў маёнтак Сяхновічы за даўгі быў закладзены за 20 тыс. злотых. Ажаніўшыся з Тэкляй, Людвік прадаў яе маёнтак Дразы за 12 тыс. злотых і адначасова трымаў у закладзе фальварак Мерачоўшчыну. Большая частка Сяхновіцкага маёнтка (Вялікія Сяхновічы) была ўласнасцю іншай праваслаўнай лініі Касцюшкаў (Паўла Касцюшкі), а Людвіку належала в. Малыя Сяхновічы (19 сялянскіх двароў). Людвік жыў у Мерачоўшчыне, а гаспадарку ў Малых Сяхновічах вяла маці Андрэя Тадэвуша, а пасля яе смерці — брат Юзаф.

Значны ўплыў на лёс К. зрабіла выбранне ў 1764 на каралеўскі прастол ураджэнца Беларусі Станіслава Аўгуста Панятоўскага, пляменніка канцлера Вялікага княства Літоўскага Міхала Чартарыйскага. Сям'і К. спрыяў прыхільнік Чартарыйскіх пісар польны Вялікага княства Літоўскага Юзаф Сасноўскі, пазней ваявода полацкі. Дзякуючы яго пратэкцыі 18.12.1765 К. быў прыняты ў зноў створанае Варшаўскае ваеннае вучылішча (Рыцарскую школу, што называлася Кадэцкім корпусам Яго Каралеўскай Міласці і Рэчы Паспалітай), у якое прымалі толькі выхадцаў з багатых сем'яў. Прыкладна ў той жа час у корпусе кадэтаў вучыліся князі Казімір Сапега, Антон Радзівіл, Мацвей Яблонаўскі і магнаты Валовіч, Чацвярцінскі і інш. Ён быў заснаваны восенню 1764 і знаходзіўся ў распараджэнні самога Панятоўскага, які лічыўся яго шэфам. Непасрэдным начальнікам корпуса быў Адам Казімір Чартарыйскі. Налічвалася 80 кадэтаў (К. быў у спісе 79-м), пазней іх колькасць скарочана да 60. Кадэты падзяляліся на брыгады па 20 чалавек, у кожнай былі брыгадзір і падбрыгадзір. Яны займаліся страявой падрыхтоўкай, коннай яздой, вывучалі артылерыю, фехтаванне, тактыку, літаратуру і гісторыю, лацінскую, нямецкую, французскую мовы, арыфметыку, фізіку, геаметрыю і вышэйшую матэматыку, палітычную эканомію, маральныя навукі, танцы, маляванне. У 1767—68 навучальным годзе з кадэтаў была выдзелена спецыяльная група (займалася ваенна-інжынернымі дысцыплінамі), у якую быў уключаны і К.

Т. Касцюшка.

Асаблівая ўвага ў групе надавалася вывучэнню геаграфіі, трыганаметрыі і маляванню.

Упартыя заняткі і выдатныя здольнасці дазволілі К. стаць адным з лепшых кадэтаў, і 20.12.1766 ён атрымаў афіцэрскі патэнт і званне харунжага. Яшчэ ў час вучобы ён быў прызначаны на пасаду падбрыгадзіра з акладам у 72 злотых у месяц. Пра яго поспехі ў далейшай вучобе і службе сведчыць тое, што ў 1769 ён атрымліваў ужо 200 злотых у месяц.

Каб стаць больш дасканалым у ваенных навуках і асабліва ў ваенным і цывільным будаўніцтве, у 2-й палове 1769 К. па ўказанні і пры матэрыяльнай падтрымцы караля і князя Чартарыйскага выехаў на вучобу ў Францыю. У Парыжы ён браў урокі па ваеннай архітэктуры, артылерыі і тактыцы, наведваў заняткі ў Акадэміі жывапісу і скульптуры. Па рэкамендацыі Чартарыйскага вывучаў там будаўніцтва мастоў, шлюзаў, дарог, каналаў, плацін. Пяцігадовае знаходжанне ў Францыі па часе супала з рэвалюцыйнай сітуацыяй, што складвалася там. Велізарны ўплыў на яго зрабілі працы прагрэсіўных французскіх асветнікаў (Вальтэр, Мантэск'е, Ж. Ж. Русо), у якіх крытыкаваўся феадальны лад, асабліва «Вялікая Французская Энцыклапедыя» і пра-

цы Русо «Аб грамадскім дагаворы, або Прынцыпы палітычнага права» і «Меркаванні аб спосабе кіравання ў Польшчы і аб праекце яго змянення, складзеным у красавіку 1772 года». Гэта спрыяла фарміраванню ў К. рэспубліканскага светапогляду і засваенню ім новай грамадска-палітычнай думкі, якая абвяшчала найважнейшыя буржуазныя лозунгі — свабоду, роўнасць і брацтва.

Пасля кароткага падарожжа ў Англію, Італію, Швейцарыю і Германію летам 1774 К. вярнуўся ў Рэч Паспалітую. Аднак ні ў корпусе кадэтаў, ні ў арміі афіцэрскай пасады яму не прапанавалі. Яе ў той час можна было толькі купіць за 18 тыс. злотых. Такіх грошай у К. не было. Цяжкае матэрыяльнае становішча вымусіла яго пайсці хатнім настаўнікам да смаленскага ваяводы, а з 1775 да гетмана польнага Вялікага княства Літоўскага (з 1781 ваяводы полацкага) Юзафа Сасноўскага і вучыць маляванню і жывапісу яго дачок Людвіку і Кацярыну. Старэйшая Людвіка, равесніца К., закахалася ў яго, і ён адказаў ёй узаемнасцю. Яны вырашылі пажаніцца. Але бацькі Людвікі былі супраць шлюбу сваёй дачкі з бедным шляхціцам. Маладыя вырашылі абвянчацца ўпотай, але іх намер стаў вядомы бацьку і шлюб быў разладжаны. Лічаць, што тады і з'явілася вядомае выказванне гетмана: «Галубкі не для вераб'ёў, а дочкі магнатаў не для шляхцюкоў».

Не знайшоўшы сабе годнага занятку на радзіме, К. увосень 1775 зноў выехаў у Францыю, а адтуль — у Паўночную Амерыку, дзе якраз пачалася вайна супраць англійскага каланіяльнага ўладарніцтва, якая па сваёй сутнасці была буржуазнай рэвалюцыяй і выклікала да жыцця моцны дэмакратычны рух. Несумненна, рэвалюцыйныя ідэі барацьбы за незалежнасць і свабоду амерыканскага народа былі блізкія К. У жніўні 1776 ён прыбыў у Амерыку і 18 кастрычніка залічаны ў амерыканскую армію ў званні палкоўніка. На працягу 7 гадоў змагаўся ў радах амерыканскай арміі. Асабліва каштоўнымі былі яго веды як ваеннага інжынера, бо амерыканская армія, што складалася ў асноўным з фермераў і простых гараджан, мела вострую патрэбу ў прафесійных ваенных і ваенных інжынерах. Першым выпрабаваннем яго таленту было складанне праекта і будаўніцтва ўмацаванняў на берагах р.Дэлавер для аховы Філадэльфіі, дзе ў той час было сканцэнтравана кіраўніцтва барацьбой за незалежнасць і якая на працягу 10 гадоў была сталіцай дзяржавы. К. выдатна справіўся з заданнем, за што Савет Бяспекі штата Пенсільванія выдаў яму ва ўзнагароду пэўную грашовую суму. Вясной 1777 галоўная небяспека для Злучаных Штатаў навісла з поўначы, з Канады і Нью-Йорка, адкуль англічане рыхтаваліся разграміць армію паўстанцаў. У сувязі з гэтым рашэннем Кангрэса была ўтворана армія поўначы, у якую К. быў прызначаны галоўным інжынерам. Армія поўначы ў бітве пад Саратогай разбіла буйное злучэнне англійскіх войск. Гэта перамога, у значнай ступені дасягнутая дзякуючы добрым фартыфікацыйным умацаванням, пераадолець якія англічанам не ўдалося, стала пачатковым этапам паражэння Англіі ў вайне. Яна ўзняла дух амерыканскай арміі, павысіла яе аўтарытэт у Еўропе і садзейнічала афіцыйнаму прызнанню еўрапейскімі дзяржавамі дзяржаўнай самастойнасці ЗША. Пасля гэтай бітвы Дж.Вашынгтон у лісце ад 10.11.1777 пісаў старшыні Кангрэса, што К. «з'яўляецца чалавекам навукі і вышэйшых якасцей. Згодна з атэстацыяй, якую маю аб ім, заслугоўвае, каб мець яго на прыкмеце». У пачатку 1778 Кангрэс прыняў рашэнне стварыць крэпасці на ўзбярэжжы р. Гудзон. Вашынгтон прапанаваў на пасаду галоўнага інжынера кандыдатуру К., які і быў зацверджаны Кангрэсам. На працягу 2,5 года К. кіраваў будаўніцтвам самай вялікай крэпасці Злучаных Штатаў Вест Поінт, дзе пэўны час знаходзілася і штаб-кватэра Вашынгтона. Пасля паражэння на поўначы англічане наважыліся дамагчыся поспеху на поўдні, куды і былі перанесены галоўныя ваенныя дзеянні. Для арганізацыі аховы паўднёвых штатаў Кангрэс арганізаваў паўднёвую армію, галоўным інжынерам у якую быў прызначаны К. У паўднёвай арміі К. не толькі займаўся інжынернымі работамі (умацаваннямі, мастамі, пераправамі), але і камандаваў баявымі лінейнымі часцямі. За баявыя заслугі К., у ліку 3 іншаземцаў, атрымаў самую высокую баявую ўзнагароду ЗША — ордэн Цынцынаці і прыняты ў склад таварыства Цынцынатаў, ганаровым членам якога быў Вашынгтон. К. атрымаў таксама амерыканскае грамадзянства, пажыццёвую пенсію і зямельны надзел, а ў асабісты падарунак ад Вашынгтона — пару пісталетаў. У

Злучаных Штатах К. пасябраваў з многімі выдатнымі дзеячамі краіны. Ён актыўна ўдзельнічаў у палітычным жыцці, быў блізка знаёмы з многімі ваеннымі і палітычнымі дзеячамі, у т.л. з Т. Джэферсанам, аўтарам Дэкларацыі незалежнасці, абраным у 1800 прэзідэнтам ЗША. Ідэі амерыканскай рэвалюцыі поўнасцю супадалі з поглядамі К.

Вяртанне ў 1784 на радзіму было бязрадасным. Родны маёнтак у Сяхновічах быў абцяжараны даўгамі. Месца ў арміі Рэчы Паспалітай для аднаго з самых адукаваных і вопытных генералаў не знайшлося. У краіне панавала засілле каталіцкага духавенства і свавольства магнатаў, а народ знаходзіўся пад цяжкім прыгнётам прыгоннага права. Застаўшыся без спраў, баявы генерал на працягу 5 гадоў займаўся сельскай гаспадаркай у родных Сяхновічах. У апошняй чвэрці 18 ст. у Рэчы Паспалітай узмацніўся працэс разлажэння прыгонніцтва, актывізавалася дзейнасць прыхільнікаў рэформ дзяржаўнага ладу: С.Сташыца, Г. Калантая, К. Нарбута, І. Храптовіча і інш. У сувязі з рашэннем сойма павялічыць армію прыкладна ў 5 разоў (да 100 тыс. салдат і афіцэраў) К. прапанавалі пасаду камандзіра брыгады ў польскай арміі, хоць ён жадаў служыць у арміі Вялікага княства Літоўскага. У лісце ад 7.2.1790 ён прасіў генерала Несялоўскага вярнуць яго ў Вялікае княства Літоўскае: «Хіба Вы адмаўляецеся ад мяне і лічыце няздольным служыць Вам? Кім жа я з'яўляюся? Хіба я не літвін, Ваш зямляк, Вамі абраны? Каму павінен дзякаваць (за рэкамендацыю Брэсцкага сойміка), калі не Вам? Каго павінен абараняць, калі не Вас і сябе самога? Калі гэта Вас не кране для ўнясення прапановы пра мяне на сойме, каб вярнуўся, то я сам буду вымушаны, бачыць Бог, што-небудзь кепскае сабе ўчыніць! Таму, што злосць мяне бярэ: каб з Літвы ў Кароне служыў, калі вы не маеце трох генералаў. Калі вас вешаць на вяроўцы будуць гвалтаўнікі, тады толькі адумаецеся і пра сябе пачнеце клапаціцца». Нягледзячы на такі адчай, К. не ўдалося перавесціся з польскай арміі ў армію Вялікага княства Літоўскага.

14.7.1789 пачалася Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя, якая аказала рэвалюцыянізуючы ўплыў на многія еўрапейскія народы, у т.л. і Рэчы Паспалітай. Сойм Рэчы Паспалітай прыняў шэраг важных законаў, накіраваных на ўмацаванне органаў дзяржаўнай улады: у студзені 1791 закон аб кардынальных правах, які прадугледжваў прызнанне пануючага становішча за каталіцкай царквою, непарыўнасць саюзу Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, незалежнасць і суверэннасць Рэчы Паспалітай, свабоду слова і друку, у сакавіку 1791 закон аб соймiках, паводле якога беззямельная шляхта была пазбаўлена выбарчых правоў, у красавіку — закон аб гарадах, паводле якога за мяшчанамі прызнана права асабістай недатыкальнасці, права набыцця маёнткаў, пашыраліся і іншыя іх правы. Гэтыя законы сталі пачаткам буржу-



TADEUSZ KOSCIUSZKO

NACZELNIK NAYWYZSZY SILY ZBROYNEY NARODOWEY.

Oznaymuię ninieyszym Liftem Patentem Moim, komu o tym wiedzieć należy. Iż io maiąc fobie zaleconą dobrą applikacyą i zdatność do ſłużby Wyſkowey Obywatela Antoniego Ogryzm Niego byłego Namiestnika Kawaleryi Narodowey w Brygadzie Igicy Mato-Polskiey

z chęcie do dalſzych Rzpltey zachęcić uſług, umyśliłem mu Szarżę Chorążego w tymże Brygadzie przy tymże Namiestnikowey dać i konferować; iakoż ninieyſzym Liftem Patentem Moim, z należącemi do niey, według opiſu i uſtawy Rzpltey porciami, tudzież ze wſzyſtkiemi prerogatywami, aż do śmierci, lub poſtąpienia na wyżſzą Szarżę Woyſkową daię i konferuię. Co mianowicie Generałom, oraz wſzyſtkim wyżſzey, i niżſzey Rangi Oficyerom, a oſobliwie tejże Brygady ——— wiadomo czyniąc rozkazuię, aby pomienionemu Obywatelowi Antoniemu Ogryzmalskiemu Szarżę Chorążego w Brygadzie Igicy Mato Polskiey ——— maiącemu, z mieyſca i Praw do tego ſtopnia przyłączonych, odpowiadali, i aby od innych odpowiadano było, ſtarali ſię. Na co dla lepſzey wiary Ręką własną podpiſawſzy, Pieczęcią związku Narodowego ztwierdzam. Dan w Obarzeniu Mo, dnia 17 Miesiąca Lipca ——— 1794 Roku.

Kościuszko

Patent dla Obywatela Antoniego Ogryzmalskiego na Szarżę Chorążego tymżeż przy Bracy Namiestnikowey w Brygadzie Igicy Mato Polskiey

Афіцэрскі патэнт з подпісам Т. Касцюшкі.

азных рэформ у Рэчы Паспалітай. Завяршэннем іх стала прынятая 3.5.1791 Канстытуцыя Ustawa Rzadowa (Закон аб уладзе), паводле якой усталёўваліся новыя асновы арганізацыі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, пабудаваныя на прынцыпе падзелу ўлад. Дзяржаўны лад вызначаўся як канстытуцыйная манархія, але ўлада караля была абмежавана соймам (складаўся з палаты дэпутатаў і сената), якому належала заканадаўчая ўлада. Найбольш важным новаўвядзеннем была адмена «ліберум вета» і стварэнне адзінага ўрада для ўсёй Рэчы Паспалітай. Урад (называўся «Варты правоў») складаўся з караля як старшыні ўрада, кіраўніка каталіцкага духавенства — прымаса як старшыні камісіі асветы і 5 міністраў [паліцыі, пячаткі (унутраных спраў), ваеннага, фінансаў, замежных спраў], якіх прызначаў і здымаў кароль. На пасяджэнні ўрада маглі прысутнічасць з дарадчым голасам нашчадак прастола і старшыня (маршалак) сойма. Прадугледжвалася стварэнне судоў, незалежных ад адміністрацыі, і выданне новых цывільнага і крымінальнага кодэксаў. Канстытуцыя 3-га мая — гэта вынік кампрамісу класа феадалаў з буржуазіяй, якая нараджалася. Прагрэсіўныя дзеячы Рэчы Паспалітай бачылі ў Канстытуцыі толькі пачатак і падрыхтоўку да рэвалюцыйных пераўтварэнняў і цалкам яе падтрымлівалі. Як перакананы рэспубліканец і праціўнік усякай манархіі К. без ваганняў прыняў прысягу на вернасць Канстытуцыі 3-га мая і распарадзіўся, каб яе прынялі і падпарадкаваныя яму афіцэры, нягледзячы на тое, што Канстытуцыя прадугледжвала захаванне манархіі. Рэакцыйныя і клерыкальныя элементы разглядалі новую Канстытуцыю як здзейсненую рэвалюцыю. Вясной 1792 яны абвясцілі акт Таргавіцкай канфедэрацыі, выступілі супраць Канстытуцыі і звярнуліся за дапамогай да суседніх дзяржаў, учыніўшы тым самым акт дзяржаўнай здрады. Скарыстаўшы такую зачэпку, Расія аб'явіла вайну Рэчы Паспалітай. Фактычна гэта была нічым не прыкрытая агрэсія. У абарону Канстытуцыі выступілі слабыя і раз'яднаныя часці войск Рэчы Паспалітай. Адна з першых бітваў, у якой вызначылася дывізія пад камандаваннем К., адбылася каля в.Дубенкі на Заходнім Бугу. У гэтай бітве К., маючы пад сваім камандаваннем каля 5 тыс. салдат і афіцэраў, стрымаў націск 20-тысячнага рускага войска, што дало магчымасць усёй паўднёвай арміі пад камандаваннем князя Ю.Панятоўскага адысці на новыя пазіцыі. Аднак лёс гэтай кампаніі быў прадвызначаны, бо многія магнаты, шляхта і сам кароль перайшлі на бок таргавічан. Варшаву занялі таргавічане і царскія войскі. І хоць К. за ваенныя заслугі ў кампаніі 1792 быў узнагароджаны ордэнам «Віртуці Мілітары» і атрымаў званне генерал-лейтэнанта, ён 30.7.1792 у знак пратэсту супраць змовы таргавічан з каралём падаў у адстаўку і выехаў за мяжу. 26.8.1792 заканадаўчы Сход Францыі прысвоіў К. званне ганаровага французскага грамадзяніна.

Прагрэсіўныя дзеячы Рэчы Паспалітай у канцы 1792 і пач. 1793 пачалі рыхтаваць народнае паўстанне супраць таргавічан і замежных акупантаў. У жніўні 1793 К. пад чужым імем прыехаў у Гродна, дзе сустракаўся з генераламі Бышэўскім, Грахоўскім і інш. вайскоўцамі. Падрыхтоўкай да паўстання кіравала група патрыётаў, вымушаных пакінуць краіну і выехаць у Лейпцыг і Дрэздэн. Сярод іх былі Г.Калантай, І.Патоцкі і Касцюшка. На тэрыторыі Рэчы Паспалітай дзейнічалі тайныя саюзы і таварыствы прыхільнікаў паўстання, якія ўзначальвалі І.Дзялынскі, Я.Ясінскі і інш. К. разумеў, што пры слабасці гарадской буржуазіі і забітасці паднявольных сялян да барацьбы неабходна далучыць патрыятычна настроеную шляхту. Аднак гэта вяло да кампрамісаў і ў пэўнай ступені адштурхоўвала сялян ад актыўнай барацьбы, бо нават прагрэсіўная шляхта не хацела сацыяльнай рэвалюцыі, а імкнулася толькі да аднаўлення парадкаў у адпаведнасці з Канстытуцыяй 3-га мая. Гэта асабліва выявілася ў час паўстання.

24.3.1794 у Кракаве ўспыхнула паўстанне, у якім прынялі ўдзел шляхта, мяшчане і часткова сяляне. Паўстанне ўзначаліў К., абвешчаны «вышэйшым і адзіным начальнікам нашых узброеных сіл і кіраўніком усяго нашага паўстання». У гэты ж дзень быў абнародаваны «Акт паўстання грамадзян, жыхароў Кракаўскага ваяводства» і К. прысягнуў не выкарыстоўваць даверапую яму ўладу ў чыіх-небудзь асабістых інтарэсах, «а толькі для абароны цэласнасці граніц, вяртання самаўладдзя народа і ўстанаўлення ўсеагульнай свабоды». У «Акце...» выкрываліся подласць, ілжывасць і

вераломства царыцы Кацярыны II і прускага караля Фрыдрыха Вільгельма, адзначалася, што галоўнай мэтай Кацярыны II і Фрыдрыха было жаданне «распаўсюдзіць панаванне тыраніі» і задушэнне свабоды не толькі ў сваіх дзяржавах, але і ў суседніх народаў. «Акт...» яшчэ раз выкрыў перад усім светам паказны лібералізм Кацярыны II. Палітычнае кіраўніцтва паўстаннем ускладалася на Вышэйшы нацыянальны савет. Надзвычайнымі мясцовымі органамі былі Камісіі кіравання ў ваяводствах, якія ў сваю чаргу стваралі «дазорныя ўпраўленні». Кожнае ўпраўленне ахоплівала 1000—1200 сялянскіх гаспадарак. Ствараліся новыя рэвалюцыйныя суды, якія павінны былі разглядаць крымінальныя справы аб злачынствах, накіраваных супраць паўстання. Выданне «Акта...» мела выключнае значэнне для мабілізацыі прагрэсіўных сіл на барацьбу з унутранай рэакцыяй і замежнымі захопнікамі. «Акт...» абавязваў К. і Вышэйшы нацыянальны савет выпускаць як мага часцей праклямацыі і звароты да народа, паведамляць яму пра сапраўднае становішча спраў. У гэтым таксама выяўляліся дэмакратычныя прынцыпы паўстання і імкненне прыцягнуць да ўдзелу ў ім самыя шырокія масы народа. У першы ж дзень паўстання К. звярнуўся з адозвамі «Да арміі», «Да грамадзян», «Да духавенства», «Да жанчын». Кожная з іх глыбока эмацыянальна і пераканаўча заклікала стаць на абарону свабоды і айчыны. Энергічная ідэалагічная падрыхтоўка паўстання і арганізацыйная работа па ўцягненні простых людзей у барацьбу за свабоду напачатку мелі пэўны поспех. Каб далучыць сялян да паўстання, К. лічыў неабходным адмяніць прыгоннае права, таму Канстытуцыя 3-га мая, якая захоўвала саслоўную няроўнасць і прыгонную залежнасць сялян, не была яго ідэалам. Але «Акт...» не закранаў пытання пра аднаўленне Канстытуцыі, а канчатковае вызначэнне дзяржаўнага і грамадскага ладу адносіў да часу заканчэння рэвалюцыйнай вайны.

Усе, хто асабіста быў знаёмы з К., падкрэслівалі яго ваенны талент, высокую адукацыю, нястомную энергію і дастойную прастату. Падскарбі Вялікага княства Літоўскага, удзельнік паўстання, кампазітар М. К. Агінскі пісаў, што К. «карыстаўся вялікай пашанай усёй Еўропы, быў гразой для ворагаў і бажаством для народа; узвышаны да ранга Начальніка, не ведаў іншага гонару, як служыць Айчыне і змагацца за яе, які захоўваў заўсёды сціплыя паводзіны... не насіў ніякіх знакаў вышэйшай улады, хадзіў у сурдуце з дрэннага шэрага сукна і які меў стол сціпла забяспечаны, як кожны з яго простых афіцэраў».

Успрыняўшы вучэнне французскіх рэвалюцыйных і радыкальных пісьменнікаў, філосафаў і публіцыстаў, а таксама амерыканскіх буржуазных прагрэсіўных дзеячаў, К. выпрацаваў самастойную дзяржаўна-прававую канцэпцыю палітычнага і грамадскага развіцця Рэчы Паспалітай. Ідэалам ён лічыў грамадства, якое складалася з вольных сялян, уласнікаў зямлі, рамеснікаў, купцоў пры захаванні памешчыцкага землеўладання, заснаванага на свабодным найме рабочай сілы. Лепшую форму дзяржаўнага кіравання бачыў у рэспубліцы, тэарэтычныя асновы якой спрабаваў выкласці ў Паланецкім універсале. Аднак ажыццявіць гэтыя ідэі яму не ўдалося.

Ваенная і палітычная сітуацыя складалася не на карысць паўстання. У пачатку чэрвеня аб'яднаныя руска-прускія войскі (24 тыс. чалавек) у бітве каля мястэчка Шчакоціны прымусілі армію К. (12 тыс. чалавек) адступіць. 15 чэрвеня прускія войскі занялі Кракаў, і К. вымушаны быў пакінуць горад. У сярэдзіне ліпеня да Варшавы падышлі прускія войскі і рускі корпус пад камандаваннем генерала Ферзена. Гераізм абаронцаў Варшавы і ўмелыя дзеянні К. у жніўні — верасні прымусілі гэтыя войскі адысці ад горада. Аднак становішча паўстанцаў пагоршылася, калі Аўстрыя, пашыраючы тэрыторыю сваёй акупацыі, пачала наносіць удары з поўдня. К. спрабаваў адбівацца на ўсе бакі. У верасні ён прыбыў на Беларусь, каб сфарміраваць тут новыя атрады, а заадно наведаць родныя мясціны. Да гэтага часу на Беларусі дзейнічала ўжо некалькі атрадаў, якія падтрымлівалі паўстанне. Але ў верасні 1794 на тэрыторыю Заходняй Беларусі быў перакінуты моцны корпус пад камандаваннем А. Суворава. Нечаканае з'яўленне рускіх войск паставіла ў крытычнае становішча паўстанцаў пад камандаваннем Ю. Серакоўскага, якія панеслі цяжкія страты і пачалі адыходзіць на захад. Другі рускі корпус пад камандаваннем генерала Ферзена пачаў наступленне з паўднёвага захаду. Супраць яго К. выставіў

рэшткі атрада Серакоўскага і частку свайго рэзерву. На дапамогу яму павінна была падысці дывізія пад камандаваннем генерала Понінскага, але той не выканаў загаду К. і да месца бітвы дывізія не прыйшла. 10 кастрычніка корпус Ферзена ў бітве пад в. Мацяёвіцы нанёс паражэнне войскам паўстаўшых, а сам К., паранены ў галаву і левае сцягно, быў узяты ў палон. Паланенне К. выклікала катастрафічны ўпадак маральнага духу паўстання і прадвызначыла зыход усёй барацьбы.

Замест К. начальнікам узброеных сіл 12.10.1794 вышэйшы Савет прызначыў Томаша Ваўжэцкага. 4 лістапада войскі пад камандаваннем Суворава авалодалі ўмацаваным прыгарадам Варшавы Прагай, пасля чаго кароль Рэчы Паспалітай і яго прыхільнікі настаялі на капітуляцыі Варшавы. За паспяховае задушэнне паўстання Суворaў атрымаў як узнагароду ва ўласнасць з Брэсцкай эканоміі 13 279 прыгонных сялян.

Паражэнне паўстання 1794 было непазбежным, бо яго не падтрымалі шырокія масы сялянства. Слабай аказалася і буржуазія, а шляхецка-буржуазны блок, які кіраваў паўстаннем, імкнуўся не дапусціць рэвалюцыйнага выступлення гарадскіх нізоў і сялян. Акрамя таго, сабатаж і невыкананне распараджэнняў К., а часта і адкрытая здрада падрывалі сілы паўстання.

На працягу ўсёй сваёй палітычнай дзейнасці К. глыбока паважаў і быў паслядоўным прадаўжальнікам вызваленчых, антыфеадальных ідэй Ж. Ж. Русо, Ш. Мантэск'е, Т. Джэферсана і інш. прагрэсіўных дзеячаў. Яго светапогляд, грамадска-палітычныя і прававыя ідэі найбольш поўна былі выкладзены ў брашуры пад назвай «Ці могуць палякі дабіцца незалежнасці», выдадзенай на польскай мове ананімна ў Парыжы ў 1800, з фіктыўнымі ананімнымі данымі: «У Прыкопе на Доне». Мяркуецца, што запіс ідэй і разважанняў К. быў ажыццёўлены яго сакратаром Ю. Паўлікоўскім. Брашура ўяўляе сабой навуковы трактат, у якім разглядаюцца слабыя і моцныя бакі вызваленчага руху ў Рэчы Паспалітай. Складаецца з прадмовы, частак і заключэння. У прадмове аўтар папярэджвае сваіх землякоў, каб не спадзяваліся на замежную дапамогу, а калі хочуць «шчасця, гонару і славы... неабходна карыстацца сродкамі і сіламі, якія прырода дала чалавеку... пажадаем толькі — і мы станем свабоднымі, бо шаснаццацімільённы народ не можа быць народжаны для рабства». Вызначаючы колькасць насельніцтва ў 16 мільёнаў чалавек, К. меў на ўвазе не толькі палякаў, але і беларусаў, украінцаў і літоўцаў, якія насялялі ў той час Рэч Паспалітую. Ён адзначае, што першай прычынай заняпаду краіны з'яўляюцца страта народам сілы духу і веры ў свае сілы, а таксама антынародная палітыка магнатаў, калі яны пачалі «імкнуцца не да дабрабыту, а да задавальнення ганарыстасці магнацкіх прозвішчаў... Магнаты былі зацікаўлены ў тым, каб пераканаць нацыю ў яе нікчэмнасці і слабасці, упэўніць яе ў тым, быццам яна нічога не можа дасягнуць сваімі ўласнымі сіламі, без дапамогі суседняй дзяржавы, бо яны ўзбагачаліся, гандлюючы яе крывёю ля падножжа тронаў. Магнаты былі зацікаўлены ў аслабленні духу сваіх суайчыннікаў, у прыніжэнні іх годнасці для таго, каб, не ведаючы сваёй сілы, яны не маглі скінуць з сябе ганебнай апекі, у адваротным выпадку магнаты страцілі б увесь свой уплыў і аўтарытэт». З гэтых разважанняў К. відаць, што асноўнай прычынай заняпаду Рэчы Паспалітай ён лічыў класавыя супярэчнасці, асабліва эгаізм і прадажнасць магнатаў. Адначасова ён адзначаў, што ў краіне, дзе ёсць урадлівыя землі, сяляне амаль паміраюць ад голаду, слаба развіта прамысловасць, рамяство, навука, а «шляхта ўмела толькі тыраніць сялян». Правільна крытыкуючы ўвесь феадальна-памешчыцкі лад, К. не рабіў вываду пра неабходнасць яго ліквідацыі, а толькі падахвочваў памешчыкаў зрабіць некаторыя ўступкі сялянам, як гэта было выкладзена ў Паланецкім універсале. Заклікаючы народ да барацьбы за свабоду, аўтар звяртае ўвагу на вопыт барацьбы за незалежнасць народаў Швейцарыі, Галандыі, Паўночнай Амерыкі, якія ніколі не былі б паважанымі народамі, калі б не адбілі насільнікаў сваімі ўласнымі сіламі. Найбольш тыповым прыкладам ён лічыў барацьбу Францыі, супраць якой сабраліся ўсе каралі Еўропы, каб пакарыць гэту нацыю і аднавіць у ёй стары лад. На думку аўтара, французы не былі гатовыя ў ваенных адносінах, але, упэўненыя ў справядлівасці сваёй справы, яны выгналі непрыяцеля са сваёй айчыны і дасягнулі такой славы і магутнасці, што скідвалі троны або падрывалі іх устоі. К. выказаў думку, што ваенная навука не можа быць такой жа беспамылковай, як матэматычнае вылічэнне, а таму галан-

дцы змаглі адбіць у шмат разоў большыя сілы іспанцаў, швейцарцы — аўстрыйцаў, амерыканцы — англічан.

Разглядаючы магчымасць новага паўстання, аўтар сцвярджае, што сілы рэвалюцыі могуць павялічвацца за кошт вызваленчай барацьбы працоўнага народа суседніх дзяржаў: «Хіба рускі селянін, жорстка прыгнятаемы сваім памешчыкам, пры спрыяльных абставінах не кінецца з запалам супраць сваіх прыгнятальнікаў, імкнучыся разбіць сваё ярмо? Няўжо прыгнечаны казак не імкнецца зноў атрымаць свае свабоды?.. Прусак... пачынае разумець, што ён не быдла, што знаходзіцца ў распараджэнні казны. Некаторыя правінцыі з радасцю скінулі б сваё ярмо». У трактаце абвяшчаецца неабходнасць захавання і аховы права прыватнай уласнасці. Робіцца агаворка, што «хоць прынцыпы свабоды і роўнасці дапускаюць усіх аднолькава да займання ўрадавых пасад, аднак... я б жадаў, каб асобы, якія зоймуць месцы ва ўсіх магістратурах, былі абраны з ранейшых саслоўяў», гэта значыць з саслоўя шляхты. Усё гэта сведчыць аб тым, што К. і яго найбліжэйшыя паплечнікі выражалі ў першую чаргу інтарэсы буржуазна-шляхецкага блока і заклікалі да буржуазнай рэвалюцыі. «Рэвалюцыя праводзіцца не для таго, каб зняць усякую аброць са свавольства, наадварот, яна ставіць сабе за мэту ўстанавіць парадак, падпарадкаваць закону ўсякія правапарушэнні, прывучыць падпарадкоўвацца ўладам, устаноўленым нацыяй, ахоўваць уласнасць кожнага, якая складае аснову грамадства. Усім даецца аднолькавая свабода і роўныя правы, але нікому не дазваляецца ўчыняць злачынствы... Правасуддзе павінна быць гразой для злачынцаў, але не помстай; невінаватым жа яно служыць прытулкам. Тыя, хто думае, што важней не ўпусціць злачынцаў, чым стварыць бяспеку невінаватым, робяць жудасную памылку... Хто не паважае ўстаноўленай над ім улады, парушае правы нацыі, учыняе крыўды і грабяжы, той разбойнік і злодзей. Рэвалюцыя якраз і ставіць сабе за мэту выпраўленне заган, знішчэнне злачынстваў і ўкараненне ў сэрцы ўсіх грамадзян міласэрнасці і дабрадзейнасці». Аўтар адзначае таксама, што на яго радзіме сярод простага народа няма злачыннасці і можна бяспечна праходзіць праз велізарныя лясы пры адсутнасці мясцовай паліцыі, хоць народ там усюды жыве ў бядоце.

У сваіх разважаннях пра мараль, права, злачыннасць і правасуддзе К. асуджаў тэрор часоў Вялікай французскай рэвалюцыі, лічыў, што гэта выключная асаблівасць французскай нацыі або нават пэўнай «шайкі разбэшчаных злачынцаў». Ён прыхільнік строгага захавання прававых норм, устаноўленых у ходзе рэвалюцыі, адначасова выступае супраць самавольства з чыйго б там ні было боку. Яго маральныя і прававыя ідэі адпавядалі інтарэсам рэвалюцыйна настроеных сярэдніх слаёў і зыходзілі з прынцыпу карысці для вызвалення народа ад улады манархічных дзяржаў, якія падзялілі Рэч Паспалітую. На яго думку, настаў час шырокай асветы народа і яго актыўнага ўдзелу ў грамадскіх справах, чаму асабліва садзейнічае рэвалюцыя. Ён зазначае, што да рэвалюцыі французы не займаліся грамадскімі справамі, а «калі яны атрымалі права ўдзельнічаць у заканадаўстве, то пачалі вучыцца яму і думаць над інтарэсамі нацыі», бо заканадаўства патрабуе вялікіх ведаў. Справе палітычнай асветы народа і павышэння яго грамадскай актыўнасці садзейнічае свабода друку. З асветай народа разбураюцца і розныя палітычныя забабоны народа, такія, як вера ў выключнасць каралеўскай улады і шляхты. «Кожны ведае, што яны не валодаюць прывілеяваным розумам; чаму ж яны прысвоілі сабе права распараджацца лёсам нацый без іх волі?»

Усё гэта дазваляе зрабіць вывад, што па сваіх грамадска-палітычных і прававых поглядах К. стаяў на больш рэвалюцыйных пазіцыях, чым большасць буржуазных ідэолагаў таго часу. У

Раненне Касцюшкі. Гравюра.

трактаце разглядаецца і пытанне пра матэрыяльнае забеспячэнне паўстання. Адзначаецца, што прамысловасць — гэта сіла, якая творыць багацці і можа развівацца толькі пры свабодзе, гаворыцца аб прыродных багаццях краіны. Аднак «у час рэвалюцыі неабходна прыносіць ахвяры: трэба задавальняцца малым, калі мы хочам дабіцца свабоды». У заключэнні аўтар сцвярджае, што ў народа, які жадае свабоды і верыць у перамогу, ёсць усе падставы для дасягнення высакароднай мэты. Калі ўсе будуць мужна змагацца, то працiўнік, нават калі ён больш шматлікі, не зможа перамагчы. Увесь трактат прасякнуты духам аптымізму, верай у перамогу справядлівай справы. Трактат з'яўляўся тэарэтычнай і практычнай праграмай барацьбы народных мас за дэмакратыю і незалежнасць. Палітычныя і прававыя ідэі К. прадвызначалі новы кірунак у палітычнай барацьбе ў Рэчы Паспалітай і садзейнічалі падрыхтоўцы і зараджэнню рэвалюцыйнага дэмакратычнага руху ў Польшчы, на Беларусі і Украіне.

У апошнія гады свайго жыцця К. працягваў актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. У лісце да А. Чартарыйскага ён раіў звярнуць асаблівую ўвагу на народную асвету на Беларусі і ў Літве. Шэраг школ на Беларусі быў адкрыты менавіта па ініцыятыве Чартарыйскага, у т.л. вядомая Свіслацкая гімназія. К. прапаноўваў выдаць пастанову, каб кожны ўласнік у сваім маёнтку стварыў школу для сялян і ў адпаведнасці з агульным коштам маёнтка выдзяляў грошы на ўтрыманне настаўнікаў. Апрача таго, на гэтыя ж мэты варта было выдаткоўваць і спаганяемую з сялян царкоўную «дзесяціну». Рэкамендаваў ураду паклапаціцца пра адкрыццё рамесных вучылішчаў, дзе б навучаліся сталярнаму, цяслярскаму, кавальскаму, такарнаму, слясарнаму і інш. рамёствам. Каб лепш азнаёміцца з найбольш перадавымі метадамі школьнага навучання, К. у маі 1816 наведаў педагагічны інстытут у Івердоніі, дзе сустракаўся з яго стваральнікам, выдатным педагогам-дэмакратам Іаганам Генрыхам Песталоці. Як і Песталоці, меркаваў, што паляпшэнне жыцця працоўных можа быць дасягнута ў рамках існаваўшага тады ладу шляхам адукацыі і выхавання. К. пісаў таксама пра неабходнасць палепшыць умовы жыцця простых людзей, для чаго трэба паступова змяншаць паншчыну і заахвочваць выкарыстанне наёмных работнікаў на палявых работах, быць суровым да бадзяг, п'яніц, дармаедаў, якіх трэба выкарыстоўваць на грамадскіх работах, будаўніцтве дарог, каналаў, брукаванні вуліц у гарадах з выплатай памяркоўнай узнагароды. Ён раіў развіваць прамысловасць, адкрываць новыя фабрыкі: суконныя, папяровыя, металургічныя, шкляныя і інш., прапаноўваў прымаць меры, каб з цягам часу ўсе сяляне маглі вызваліцца ад залежнасці і атрымаць ва ўласнасць зямлю. Гэты ліст быў пасланы Чартарыйскаму, але фактычна ён адрасаваны ўсяму народу Рэчы Паспалітай і сведчыць, што галоўная мэта жыцця К. — садзейнічаць паляпшэнню жыццёвых умоў простага народа.

Памёр К. 15.10.1817 у Швейцарыі ў Салюры (каля г. Залатурна). Пахавалі яго там 19 кастрычніка. У 1818 астанкі К. урачыста перанесены ў Кракаў і змешчаны ў каралеўскім замку Вавелі. Яго смерць выклікала шырокі водгук ва ўсім свеце. У многіх краінах, дзе жылі эмігранты з былой Рэчы Паспалітай, ушанавалі памяць К. памінальнымі службамі ў касцёлах і сходамі.

Свой жыццёвы шлях К. прайшоў як сапраўдны народны герой, які стаў яшчэ пры жыцці легендарным. Імя К. увайшло ў гісторыю вызваленчага руху Амерыкі і Еўропы. Яго справу барацьбы за свабоду, дэмакратыю і гуманізм прадоўжылі інш. дзеячы. К. і яго паплечнікам не ўдалося дамагчыся вызвалення народа ад ланцугоў феадальнага прыгнёту і засілля манархічных дзяржаў, але яны абудзілі ў народзе дух барацьбы за свабоду, усялялі ў яго веру ў свае сілы.

Тв.: Рус. пер. — у кн.: Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. М., 1956. Т. 1. С. 493—584.

Літ.: D i h m J. Kosciuszko nieznfny. Wrocław etc., 1969. S. 20, 384; K o p c z e w s k i J.S. Tadeusz Kościuszko w historji tradycji. Warszawa, 1968. S. 140—142, 360; K o r z o n T. Kościuszko, biografia z dokumentów wysnuta. Kraków; Warszawa, 1894. S. 206; N i e m c e w i c z J.V. Pamietniki-czason moich. Paryż. 1848. S. 56; Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajow slowianskich. Warszawa, 1889. T. 10. S. 488; Volumina Legum. Kraków, 1889. T. 9. S. 203—204, 215—219.

Я. А. Юхо.

Друкуецца па кн.: Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мн., 1995. С. 226—235.

Трэці падзел Рэчы Паспалітай

Ажыццёўлены ў 1795 Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй з мэтай спыніць распаўсюджванне ідэй Вялікай французскай рэвалюцыі 1789—94 і зрабіць новыя тэрытарыяльныя захопы. Быў вынікам задушэння паўстання 1794.

Падзельны трактат падпісаны 24.10.1795: Расія захапіла заходнюю частку Беларусі (з г. Гродна, Навагрудак, Брэст), Заходнюю Валынь, Літву, Курляндыю; Аўстрыя — землі паўднёвай Польшчы, Прусія — астатнія тэрыторыі. Рэч Паспалітая перастала існаваць.

Я. Анішчанка.

Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 707.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь была гвалтоўна далучана да Расійскай імперыі. Гэта не прынесла ні спакою, ні росквіту нашаму краю. Сялянства па-ранейшаму цярпела пакуты ад памешчыкаў, шляхты, а цяпер яшчэ і ад царскіх чыноўнікаў.

У. М. Ігнатоўскі пісаў: «У Рэчы Паспалітай працоўныя масы Беларусі былі рабочым «быдлам», а ў царскай Расіі яны зрабіліся рабочым «скотом». Жыццё народных мас як у горадзе, так і ў вёсцы станавілася нецярпімым. Да гэтага дабавіліся ваенныя ліхалецці.

У 1812 г. велізарная армія Напалеона рушыла праз наш край на Расію. Гэтай армадзе трэба было харчавацца і яна падбірала ўсё: і правіянт, і цягло, і людзей для абслугі сваіх войскаў. Адступаючы, рускія войскі вялі жорсткія баі з насядаўшай французскай арміяй. Пасля Бярозы-Картузскай яны натыкнуліся на рускія часці і ў нашым раёне.

Старажылы ўспаміналі расказы, што каля вёскі Гошчава стаяў са сваім штабам генерал Собалеў. Дарэчы, гара, дзе гэта было, і цяпер носіць назву Сабалёўка. Праўда, вялікай бітвы тут не адбылося — рускім войскам давялося паспешліва адыходзіць. А калі французаў гналі ад Масквы, наш край яны абмінулі.

Гора, галеча, прыгнёт і паборы царскай адміністрацыі і памешчыкаў вымушалі сялян да супраціўлення.

Так, у 1816 г. у в. Любішчыцы адбылося хваляванне сялян, выкліканае ўціскам адміністрацыі. У прашэнні на імя віленскага ваеннага губернатара сяляне 14 вёсак, якія належалі маёнтку Быцень, пісалі аб сваіх пакутах за спробу паскардзіцца гродзенскаму губернатару і цару на бясчынствы аканома. 12 сялян гэтага маёнтка, якія падпісалі скаргу цару, былі арыштаваны. У маёнтак прыбылі казакі і многіх сялян пакаралі розгамі. Былі сярод іх жанчыны і старыя.

З пачатку XIX ст. усё больш праяўляўся заняпад сялянска-прыгонніцкай гаспадаркі. Беззямелле і малазямелле, частыя неўраджаі, узмацненне панскага прымусу рабілі жыццё сялян невыносным.

У сялянскіх гаспадарках і фальварках панавала трохполле. Аб гадавых пасевах як у памешчыцкай, так і сялянскіх гаспадарках у інвентары маёнтка Івацэвічы прыведзены наступныя звесткі: памешчык атрымаў за год 289 чвэрцяў азімага і 655 чвэрцяў яравога хлеба, у той жа час 152 сялянскія двары — 454 чвэрці азімага і 867 чвэрцяў яравога хлеба. (1 чвэрць у XIX ст. была роўна 8 пудам, гэта каля 128 кг.) Калі ўзяць збор яравых па культурах, то малюнак быў такім: памешчык атрымліваў пшаніцы 18 чвэрцяў, сяляне — 17, ячменю адпаведна 40 і 95, бульбы — 320 і 608. Ураджайнасць у сялянскіх гаспадарках ды і ў памешчыцкай была вельмі нізкай. У сярэднім за 10 год (1835—1845) яна склала на памешчыцкім полі: азімы хлеб — сам - 4, яравы — сам - 3, бульбы — сам - 5;

на сялянскім полі ўраджайнасць яравых у год складала сам - 3, азімых — сам - 3, бульбы — сам - 4.

У інвентары маёнтка Івацэвічы, які складзены 15 жніўня 1845 г., пералічаны наступныя павіннасці сялян (з сялянскага двара): паншчына ў тыдзень — 3 дні для мужчын і 2 дні для жанчын, згоны ў год — 40 дзён, шарваркі ў год — 12 дзён. З 1 красавіка да 1 кастрычніка сяляне павінны былі працаваць з 5 гадзін раніцы да захаду сонца, у астатні час года са світання да змяркання.

У 1859 г. быў складзены паверачна-люстрацыйны інвентар казённага маёнтка Гошчава. У ім адзначана, што маёнтак меў 1394 дзесяціны зямлі, прыгоднай для земляробства, 226 дзес. пад лесам, 41 дзес. няўдобіц, 54 дзес. належалі царкве. Прыгодныя для земляробства землі размяркоўваліся наступным чынам: сялянам належала 765 дзес., ферме Гошчава — 393,35 дзес., у запасе — 215 дзес., 0,95 дзес. агароднай зямлі было надзелена карчме пры в. Гошчава. За маёнткам лічылася 36 двароў участковых, 8 паўучастковых, 5 агародных і 4 бабылёў — усяго 182 душы мужчынскага полу; акрамя гэтага, была адна агародная гаспадарка паўаброчных людзей і 18 гаспадарак адстаўных салдат.

Акрамя земляробства, сяляне займаліся падзённымі заробкамі на Маскоўска-Варшаўскай шашы. У іх уладанні было 127 галоў рабочай жывёлы, 175 галоў буйной рагатай жывёлы і 352 — дробнай.

Падзённая праца рабочаму з канём (ці з валамі) складала 90 кап., пешаму — 31 кап. Звесткі аб гандлёвых цэнах у Слонімскім павеце ў 50-я гг. XIX ст. сведчаць, што адна чвэрць жыта каштавала 4 руб. 84 кап., пшаніцы — 7 руб. 79 кап., аўса — 3 руб. 37 кап., бульбы — 2 руб. 65 кап., мукі — 11 руб. 34 кап., грэчкі — 14 руб. 35 кап., пуд сена — 35 кап., пуд мяса — 2 руб. 65 кап. Каб купіць чвэрць мукі, пешаму рабочаму трэба было працаваць 40 дзён, коннаму — 13—14 дзён. Трэба ўлічваць, што неабходна было заплаціць дзяржаўныя падаткі і другія паборы, якія складалі значныя сумы.

У кнізе «Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі. Гродзенская губерня», выдадзенай у 1863 г. у Санкт-Пецярбургу, пра дарэформенныя часы гаварылася: «Пры паншчыннай сістэме памешчыкі прымушалі сялян працаваць у сваіх маёнтках; вынік быў вельмі нездавальняючым: сяляне не мелі ні сродкаў, ні часу апрацаваць свае палі, разараліся і ўпадалі ў жабрацтва, ад дрэннага гаспадарання землі іх зусім спусташаліся» (с. 21). Там жа гаворыцца, што па Слонімскаму павету за 1854—1859 гг. сярэдняя ўраджайнасць складала азімых — сам - 2,5, яравых — сам - 2,3, бульбы — сам - 3 $^{4}/_{5}$.

Характэрна, што многія сяляне ў выніку збяднення прасіліся перавесці іх у ніжэйшыя катэгорыі. Так, цяглыя сяляне Аляксей Іваноў Раўсес, Емяльян Восіпаў Валошчык з цяглых пераводзіліся ў агароднікі, а Пётр Рыгоравіч Кот з цяглых — у бабылі. У іх гаспадарках не было ўжо аніякай жывёлы. У паўцяглыя з цяглых пераводзіліся Сцяпан Раўгель, Іван Хвядосік, Максім Ляшок, Іван Куіс.

Некалькі «заможных абываценяў» у інвентары пераводзіліся ў вышэйшыя разрады. У Гошчаве гэта Восіп Фёдараў Хвядошчык, Бенядзікт Клімаў Гошчык, Павел Мартынаў Літоўчык. Сярод адстаўных і бестэрмінова адпускных салдат, якія ўтварылі самастойныя гаспадаркі, называюцца Франц Фядосік, Пётр Ліхарай, Савел Комсан, Тодар Дрозд і Іван Банасевіч, дзве салдаткі.

Барацьба народных мас няспынна нарастала, прымала ўсё больш востры характар. У пачатку лістапада 1856 г. адбылося выступленне сялян у маёнтку Быцень графоў Патоцкіх. Хваляванне ахапіла некалькі вёсак гэтага маёнтка: Даманава, Гнойна, Коханава, Рудня, Зарэчча, Кочына,

Доўгае, Дражна і інш. Сяляне адмаўляліся прыняць кніжкі, у якіх фіксаваўся памер паншчынных павіннасцей і розных плацяжоў. Яны заяўлялі, што «не жадаюць быць прыгоннымі сялянамі сваіх уладальнікаў, а хочуць быць казённымі». Сяляне адмаўляліся плаціць дзяржаўныя падаткі, ссыпаць збожжа ў запасны магазін, выходзіць на дваровыя работы. У маёнтак прыбыў земскі спраўнік. Сялянскія важакі, асабліва Кандрат Райка з вёскі Даманава, пераконвалі сялян не браць кніжак. Завадатара арыштавалі, але сяляне вызвалілі яго.

Неўзабаве ў Быцень прыбыў слонімскі павятовы прадвадзіцель дваранства з паліцэйскімі. Для супакаення сялян у маёнтак былі ўведзены дзве сотні казакоў, якія заставаліся там на працягу 8 месяцаў.

На гэтым барацьба сялян маёнтка Быцень не закончылася. Пасля ад'езду казакоў у ліпені 1857 г. сяляне вёсак Гнойна і Даманава (400 душ) адмовіліся выходзіць на паншчыну, заяўляючы, што ўжо дастаткова паслужылі, а зараз хочуць быць вольнымі. У Быцень зноў былі накіраваны войскі — 2 роты салдат.

А жыццё прадаўжалася. Развівалася прамысловасць і гандаль. Сялянства бурліла, чакаючы перамен, і не магло ўжо цярпець прыгон, эксплуатацыю і здзек уладаў.

У першай палове XIX ст. на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна існавала некалькі прамысловых прадпрыемстваў. Сярод іх мануфактура ў маёнтку Быцень, якая належала ўладальніку маёнтка. Вырабляла яна грубае сукно. Дзейнічала з 1812 да 1864 г. У 1860 г. на ёй працавала 50 рабочых, у асноўным з прыгонных сялян. Суконнае прадпрыемства існавала ў Косаве. Яго заснавалі ў 1794 г. браты Пінесы. Гэта была капіталістычная мануфактура. Аб'ём вытворчасці дасягаў 130 тыс. рублёў у год. Вотчынная суконная мануфактура ў Косаве, якая адкрылася ў 1825 г., існавала да 1855 г. У Косаве ж дзейнічала ў 50-х гадах і вінакурнае прадпрыемства, якое вырабляла ў год 17 тыс. вёдзер гарэлкі.

Аб узроўні гандлю на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна ў першай палове XIX ст. можна меркаваць па справаздачы гродзенскага губернатара за 1842 г. На тэрыторыі раёна дзейнічалі 19 кірмашоў; значным гандлёвым цэнтрам было мястэчка Косава, дзе збіралася 11 кірмашоў у год: у дзень Праабражэння Гасподня (6 жніўня) з абаротам 1350 руб., на Святога Духа з абаротам 1200 руб. (28 кастрычніка), 31 мая з выручкаю ў 1700 руб., а таксама пятроўскія, мікалаеўскія кірмашы. На кірмашы прывозілі хлеб, палатно, сукно, гліняны і драўляны посуд, жывёлу. Вывозіліся для продажу ў другія мясціны: хлеб, лён, пянька, льняное семя, авечая воўна, шкуры, жывёла і іншыя тавары. У вялікай колькасці вывозілася драўніна. У інвентары маёнтка Івацэвічы падаецца, што «...каля таго маёнтка працякае невялікая рака Грыўда, па якой сплаўляецца таварная драўніна да ракі Шчары». Галоўным прывазным прадуктам была соль. Яна дастаўлялася з Пінска —крымская і з Кёнігсберга — пруская.

19 лютага 1861 г. цар Аляксандр II аб'явіў маніфест аб адмене прыгону. Але ён не апраўдаў спадзяванняў сялянства, не ліквідаваў залежнасці сялян ад памешчыкаў. Рэформа была грабежніцкай. Сялянскія выступленні набывалі новы размах, праяўляючыся ў розных формах: выступленні супраць размежавання зямель, напады на аканомаў, высечка лесу, выпас жывёлы на панскіх землях і інш.

У бязлітаснае сутыкненне з уладамі перарасло выступленне сялян в. Выганашчы пры размежаванні іх зямель з угоддзямі памешчыка Пуслоўскага. Пракурор Віленскай судовай палаты ў паведамленні ў Часовую канцылярыю пры міністэрстве юстыцыі па разгляду асобых крымінальных спраў назваў гэта выступленне «на-

родным рухам, які накіраваны супраць урадавых улад». У адпаведнасці з палажэннем аб дзяржаўнай ахове арыштавана і пасаджана ў турму дзесяць «зачыншчыкаў». Такія ж выступленні адбыліся ў Чамялах, Гнойна, Квасевічах і іншых вёсках.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі, неабходнасць сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў, імкненне да нацыянальнай незалежнасці Польшчы ўскалыхнулі таксама Літву і Беларусь і прывялі да паўстання 1863—1864 гадоў.

М. Банасевіч, П. Сітнік.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВЫ АБ ПАКАРАННІ РОЗГАМІ СЯЛЯН ЗА ВЫСЕЧКУ КАЗЁННАГА ЛЕСУ Ў ГОШЧАЎСКАЙ ЛЯСНОЙ ДАЧЫ

1854—1855 гг.

У дакументе гаварылася, што група сялян в. Гошчава ў 1854—1855 гадах, сярод якіх значыліся Мікалай Луцыянаў, Іосіф Юрашчык, Пётр Ярочка, Фёдар Белы, Іосіф Ліхарай, Пракоп Кухарчык, Мікалай Юрашчык, Дзям'ян Белы, Мартын Ліхарай, Юзафат Ліхарай, здзейснілі самавольную высечку казённага лесу, за што былі прыцягнуты да адказнасці і па «паказанай імі колькасці, здзейсненай кожным з іх высечкі, спагнаўшы па роўнай частцы належачыя казне ленныя грошы за дравяны лес усяго дваццаць рублёў 80 капеек срэбрам, і грошы гэтыя накіраваць у мясцовае павятовае казначэйства для далічэння да лясных прыбыткаў, і звыш таго... з гэтых сялян старшых па гадах, менавіта Пракопа Кухарчыка, Мартына Ліхарая, Фёдара Белага, Мікалая Юрашчыка, Дзям'яна Белага, Юзафата Ліхарая пакараць розгамі праз ніжэйшых паліцэйскіх служыцеляў па сорак удараў (аставіць па месцы жыхарства)».

Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь у г. Гродна. Ф. 2. Воп. 27. Л. 1.

З ДАНЯСЕННЯ СЛОНІМСКАГА ЗЕМСКАГА СПРАЎНІКА ГРОДЗЕНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН МАЁНТКА БЫЦЕНЬ

8 лістапада 1856 г.

Ваше высокопревосходительство, сим почтительнейше донести честь имею, что во вверенном мне уезде у некоторых крестьян имения Бытень малолетних графов Потоцких обнаружился дух неповиновения, кои ослушиваются арендным своим владельцам, административному управлению и даже местным властям, во-первых, в неприятии ими книжек, которые по воле правительства велено раздать всем крестьянам, в коих разъяснено, сколько каждый из крестьян обязан уплачивать казенных податей, сколько ссыпать хлеба в сельский запасной магазин, сколько отбывать дворовых повинностей и прочее, во-вторых, чрез объявление ими, что они не желают быть крепостными крестьянами своих владельцев и хотят быть казенными, и в-третьих, что в настоящем времени некоторые из них и даже уже многие других деревень начали сильно волноваться и уклоняться от уплаты казенных податей, отказываться от ссыпки хлеба в запасной магазин.

Получив в том достоверное сведение, я тотчас отправился было в имение Бытень, а также в Дражну для личного в том моего удостоверения, а когда я сим убедился, что крестьяне из дер. Доманово первые обнаружили дух неповиновения в неприятии ими даваемых книжек, то, пригласив туда и местного приходскага священника, вместе с ним стали мы увещевать тех крестьян и настаивали, чтобы они непременно исполнили волю дворового начальства и взяли бы даваемые им книжки и во всем оному надлежащим образом повиновались, но они на таковые наши советы и предложения не хотели даже обращать внимания, решительно нам объявили, что книжек не возьмут. Некоторые даже из них дерзнули еще в присутствии нашем подстрекать других крестьян, говоря громким голосом, чтобы книжек ни под каким предлогом никто не имел бы брать, а в особенности один з их крестьянин Кондрат Райка более всех кричал и подстрекал к тому других крестьян, за что я его тут же приказал было посадить под арест, но после того, когда крестьяне мною были отпущены домой, то они же

сами посаженного мною под арест крестьянина Райка самовольно освободили и отправились домой, что уже с их стороны было величайшим самоволием и явным пренебрежением моей власти, когда же я о том узнал, то вторично распорядился посажением под арест не только крестьянина Райка, но вместе с ним двух других крестьян, способствовавших к освобождению его, кои и теперь содержатся под строгим караулом.

Таковое крестьян имения Доманово неповиновение с нарушением общего порядка и моей власти, считая важнейшим обстоятельством, я счел необходимым о том покорнейше донести начальнику губернии с испрошением разрешения насчет подвержения всех виновных строгому и примерному наказанию.

Причем долгом поставляю в.в.-п. доложить, что о том я сообщал было слонимскому предводителю дворянства, который съезжал туда на место и делал там же крестьянам увещевание и советовал им взять книжки, но они не хотели внимать на его советы и решительно объявили, что книжек не возьмут. Крестьяне же имения Доманово суть состояния хорошего и ни от своих арендных владельцев, ни же от административного управления всеми имениями малолетних Потоцких не испытывали никаких угнетений и ни от кого ничем не обижены.

Земский исправник
(подпись неразборчива).

Белоруссия в эпоху капитализма. Т. 1. Мн., 1983.

Быценскае выступленне сялян 1856—1857 гадоў

Прыгонныя сяляне маёнтка Быцень Слонімскага павета запатрабавалі пераводу іх у катэгорыю дзяржаўных. Гэта было адной з праяў крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы напярэдадні сялянскай рэформы 1861 г. Выступленне пашырылася на вёскі Гнойна (цяпер Вішнёўка), Даманава, Доўгае, Дражна, Зарэчча, Коханава, Кочына, Рудня і інш. Пачалося ў лістападзе 1856 г. пры раздачы сялянам па распараджэнню ўрада спецыяльных кніжак, у якіх фіксаваліся памеры паншчынных павіннасцей і розных плацяжоў. Знаходзячыся пад уплывам чутак аб нібыта існуючым царскім указе пра скасаванне прыгону, сяляне адмаўляліся прымаць гэтыя дакументы і заяўлялі, што «не жадаюць быць прыгоннымі сялянамі сваіх уладальнікаў, а хочуць быць казённымі». Многія вяскоўцы не выйшлі на паншчыну, спынілі выплату дзяржаўных падаткаў, адмовіліся ссыпаць збожжа ў хлебазапасны магазін. Яны не падпарадкаваліся ўгаворам земскага спраўніка, што прыбыў у маёнтак, сілай вызвалілі з-пад стражы свайго важака К. Райку. Для ўціхамірання сялян былі накіраваны паліцэйскі атрад, а потым 2 сотні казакоў, якія на працягу 8 месяцаў знаходзіліся на пастоі ў маёнтку. Аднак пасля іх адыходу 400 сялян вёсак Гнойна і Даманава зноў адмовіліся выходзіць на паншчыну. Улады вымушаны былі паслаць у маёнтак 2 роты салдат стралковага батальёна, пры дапамозе якіх пад асабістым кіраўніцтвам гродзенскага губернатара праведзена следства і ўчынена расправа. Частка сялян асуджана на катаржныя работы ў Сібір, іншыя здадзены ў рэкруты.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 151.

СА СКАРГІ СЯЛЯН ВЁСКІ ГОШЧАВА ГРОДЗЕНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ НА СВАЁ ЦЯЖКАЕ СТАНОВІШЧА

12 жніўня 1859 года адбыўся сельскі сход у Гошчаве 12-га Боркінскага сельскага таварыства, на якім гаварылася, што ў сувязі з тым, што ў іх мясцовасці дрэнныя сенакосныя ўгоддзі і жыццё цяжкае, сяляне рашаюць звярнуцца з просьбай да ўладаў. Яны пісалі: «Содержа не более 4 либо 6 штук рогатого скота и одной лошади, то платя оброк более 16 рублей, кроме податей, приходим в нищету и несостоятельность, пастбище находится в краю Паль, в поодаль села, куда затруднительно сгонять животных на пашу...»

Сяляне рашылі «домогаться распределения земли, сортировки и переоценки оной противу натурального местным обывателям качества оставить за нами только лишь оказавшуюся пахотную посредственную землю хотя бы менее теперешней пропорции, полую же зачис-

лить в отрубы леса, так же в отчуждение сенокосов вместо болотного в Нехачево, которое едва можно полагать пастбищным и вместо отведенных в урочище Перезрино, не возможной по выше изложенным причинам расчистке распределить на всякого домохозяина кусками из фермовой принадлежности, употребляемой косьбою в урочище Перезрино и об отводе пастбища соответственно требы вблизи деревни и кроме сего о дозволении пастьбы рогатого скота в прилегающих сей деревни казённых лесах».

Подписали крестьяне-домохозяева д. Гощево Василь Гордей, Алексей Хведосик, Язеб Хведосик, Василь Юращик, Семён Кот и другие.

Заключэнне люстратара: «Так измененные домогательства крестьян невозможно было удовлетворить».

Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь у г. Гродна. Ф. 31. Воп. 2. Спр. 1477. Л. 17—19.

Паўстанне 1863—1864 гадоў

Гэта было нацыянальна-вызваленчае паўстанне супраць царызму ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Падрыхтавана польскімі, беларуска-літоўскімі канспіратыўнымі арганізацыямі, створанымі ў канцы 1850 — пачатку 1860-х гадоў. Яны мелі сувязі з падпольнымі арганізацыямі ў Польшчы, з арганізацыяй расійскіх рэвалюцыянераў «Зямля і воля», якая рыхтавала сялянскае паўстанне.

Да канца 1861 г. у Польшчы арганізацыйна аформіліся два палітычныя лагеры — «белыя» і «чырвоныя». Праграму паўстання распрацаваў Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК) (створаны летам 1862 г. у Варшаве), які стаяў на пазіцыях правых «чырвоных». Праграма прадугледжвала аднаўленне польскай дзяржавы ў межах былой Рэчы Паспалітай, захаванне памешчыцкага землеўладання, выкуп дзяржавай зямлі, адведзенай пад сялянскія надзелы, перадачу сялянам ва ўласнасць без выкупу надзелаў, атрыманых паводле рэформы 1861 г., замену падушнага падатку падымным, ураўнаванне грамадзянскіх правоў сялян і шляхты, аднаўленне уніяцкай царквы і інш. Права беларускага, літоўскага, украінскага народаў на самавызначэнне фактычна адмаўлялася.

На Беларусі і ў Літве падрыхтоўку паўстання з восені 1861 г. узначальваў Камітэт руху, які дзейнічаў у Вільні незалежна ад Варшавы. Летам 1862 г. ЦНК падпарадкаваў яго і ўтварыў Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), на чале якога ў кастрычніку 1862 г. стаў Кастусь Каліноўскі. Ён узяў курс на самастойнасць і раўнапраўе ва ўзаемадачыненнях віленскага і варшаўскага цэнтраў, арыентаваўся на сялян як галоўную сілу рэвалюцыі, выступаў за перадачу ім усёй зямлі, права на самавызначэнне Беларусі і Літвы. Свае погляды па аграрных пытаннях ён часткова выказваў у газеце «Мужыцкая праўда». Аднак паўплываць на пазіцыі ЦНК не змог. Апошні не ўзгадніў з ЛПК нават рашэнне аб пачатку ўзброенага выступлення, прызначанага на 22.1.1863 г., калі былі выданы Маніфест і два аграрныя дэкрэты, у якіх выкладалася праграма паўстання. У такіх умовах ЛПК вагаўся, як аднесціся да нечаканага паўстання ў Польшчы, і толькі 1.2.1863 г. прыняў станоўчае рашэнне і ў сваім Маніфесце заклікаў насельніцтва Літвы і Беларусі падтрымаць яго. Пры гэтым ЛПК, ператварыўшыся ў Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі, быў вымушаны прыняць і апублікаваць праграму паўстання, вызначаную польскім нацыянальным урадам. З мэтай павесці паўстанне па памяркоўным шляху на пачатку сакавіка да яго далучыліся «белыя» і захапілі кіраўніцтва ў свае рукі. 11.3.1863 г. па ініцыятыве варшаўскіх «белых» быў расфарміраваны Часовы ўрад Літвы і Беларусі на чале з Каліноўскім і заменены Аддзелам кіраўніцтва правінцыямі Літвы. Кіраўніком яго прызначаны Я. Гейштар. У мясцовай рэвалюцыйнай арганізацыі «белыя» ўвялі сваіх прадстаўнікоў. Каліноўскі ацаніў гэтую акцыю «белых» як здраду рэвалюцыі, аднак быў вымушаны прыняць назначэнне на пасаду гродзенскага ваяводскага камісара. У канцы студзеня 1863 г. з Польшчы на Беларусь прыйшлі першыя паўстанцкія атрады (найбольшы з іх атрад Р. Рагінскага). У сакавіку — красавіку фарміраваліся мясцовыя атрады. У ліку найбуйнейшых акцый паўстанцаў на Беларусі былі захоп г. Горкі Магілёўскай губерні атрадам Л. Звяждоўскага з дапамогай студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута (24.4.1863) і Мілавідская бітва 21.5.1863 г. у Слонімскім павеце, у час якой лагер паўстанцаў (каля 800 чалавек) некалькі гадзін атакавалі царскія войскі (5 рот салдат з 4 гарматамі), але пацярпелі

вялікія страты і адступілі. У лютым—жніўні 1863 г. на тэрыторыі Беларусі адбылося 46 баёў і баявых сутычак з царскімі войскамі (2/3 з іх на Віленшчыне і Гродзеншчыне). Прыход «белых» да кіраўніцтва паўстаннем адмоўна адбіўся на адносінах да яго беларускіх сялян. Удзел у паўстанні польскіх памешчыкаў — сваіх спрадвечных прыгнятальнікаў — яны, асабліва пад уплывам афіцыйнай агітацыі, успрымалі як выступленне за аднаўленне прыгону. Царскія ўказы ад 1.3. і 2.11.1863 г., якія спынялі часоваабавязаныя адносіны сялян да памешчыкаў, пераводзілі сялян на абавязковы выкуп з паніжэннем выкупных плацяжоў на 20%, падмацоўвалі ілюзіі пра «цара-вызваліцеля». Толькі невялікая частка сялян Беларусі, пераважна казённых, падтрымала паўстанне; 70% паўстанцаў складала беззямельная і малазямельная шляхта.

Сярод расійскай грамадскасці, нават ліберальна-дэмакратычнай, паўстанне пад лозунгам аднаўлення Рэчы Паспалітай з далучэннем да яе Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны выклікала ўздым шавінізму. Праз дзяржаўныя ўстановы, царкву, школу, друк шавіністычная хваля шырока распаўсюджвалася ў Расіі і фактычна паралізавала агітацыю рэвалюцыйных дэмакратаў, перакрэсліла іх надзеі на ўсерасійскае сялянскае паўстанне. Гэтым быў вырашаны лёс паўстання ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Спадзяванні паўстанцаў на дапамогу заходніх дзяржаў таксама не спраўдзіліся.

На задушэнне паўстання на Беларусі і ў Літве ў маі 1863 г. быў накіраваны віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў. Жорсткімі рэпрэсіямі ён прымусіў «белых» памешчыкаў і вышэйшае каталіцкае духавенства адмовіцца ад падтрымкі паўстання. Многія яго актыўныя дзеячы былі арыштаваны, расстраляны, павешаны. У такіх умовах Каліноўскі ў чэрвені 1863 г. зноў быў запрошаны ў Вільню. У ліпені ён узначаліў Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы, які быў пераўтвораны ў выканаўчы аддзел Літвы, а 22 жніўня яму перадалі і паўнамоцтвы камісара Варшаўскага ўрада ў Вільні. У канцы лета 1863 г. Каліноўскі зноў стаў на чале паўстання на Беларусі і ў Літве, аднак дамагчыся пералому ў барацьбе ўжо не змог: да верасня 1863 г. паўстанне ў беларуска-літоўскім краі фактычна было задушана.

Царызм жорстка расправіўся з яго ўдзельнікамі. На Беларусі і ў Літве 128 чалавек пакараны смерцю, 12 483 высланы на катаргу і пасяленне ў Сібір. Маёнткі памешчыкаў, якія мелі дачыненне да паўстання, канфіскоўваліся і на льготных умовах прадаваліся царскім генералам і чыноўнікам, выхадцам з цэнтральных губерняў. Закрываліся або ператвараліся ў праваслаўныя цэрквы многія касцёлы. За ўдзел студэнтаў у паўстанні была закрыта адзіная на Беларусі ВНУ — Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Мясцовыя настаўнікі, медыцынскія работнікі, землямеры, чыноўнікі былі пераведзены на службу ў цэнтральныя губерні, а на іх месца адтуль запрошаны новыя. У краі быў устаноўлены рэжым выключных законаў, накіраваны на русіфікацыю.

У польскай і расійскай (у тым ліку савецкай) гістарыяграфіі паўстанне 1863—64 гадоў у цэлым ацэньваецца як польскае, не ўлічваюцца яго асаблівасці ў беларуска-літоўскім рэгіёне і тое, што напярэдадні і ў ходзе паўстання тут праявілася плынь беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на чале з Каліноўскім. У беларускай гістарыяграфіі яно ў дачыненні да Літвы і Беларусі як польскае не вызначаецца.

М. Біч.

Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 571—572.

* * *

КАЛІНОЎСКІ Кастусь (Вікенцій Канстанцін Сямёнавіч; 2.2.1838, в. Мастаўляны Беластоцкага ваяводства — 22.3.1864), лідэр беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, тэарэтык адраджэння беларускай дзяржаўнасці і культуры пачатку 1860-х гадоў, публіцыст, паэт, кіраўнік паўстання 1863—64 гадоў. Скончыў Свіслацкае дваранскае вучылішча (1855), Пецярбургскі універсітэт (1860). У Пецярбургу член рэвалюцыйнага гуртка З. Серакоўскага, удзельнік студэнцкага руху. У пачатку 1861 г. вярнуўся на Беларусь з мэтай падрыхтоўкі ўзброенага паўстання. У 1861—62 стварыў у Гродне і Гродзенскай губерні шэраг нелегальных рэвалюцыйных арганізацый, каардынаваў сваю дзейнасць з рэвалюцыйнымі сіламі Польшчы. Выступаў за шырокі ўдзел беларускіх сялян у барацьбе супраць самадзяржаўя і прыгонніцтва. Адзін са стваральнікаў восенню 1861 г. Камітэта руху — арганізацыйнага цэнтра «чырвоных» па падрыхтоўцы паўстання. З кастрычніка 1862 г.

старшыня Літоўскага правінцыяльнага камітэта. 1.2.1863 г. узначаліў Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі. У сакавіку 1863 г. адхілены «белымі» ад кіраўніцтва і накіраваны на пасаду рэвалюцыйнага камісара Гродзенскага ваяводства. Са жніўня 1863 г. зноў на чале ўзброенай барацьбы на ўсім абшары Літвы і Беларусі, старшыня Выканаўчага аддзела Літвы. У лютым 1864 г. арыштаваны, паводле рашэння ваенна-палявога суда павешаны на Лукішскай плошчы ў Вільні. Каліноўскі першы абгрунтаваў праграму барацьбы за палітычнае і духоўнае вызваленне беларускага народа і спрабаваў рэалізаваць свае ідэі стварэння дэмакратычнага ладу ў суверэннай Беларусі, у аснову якой пакладзены канстытуцыйны і парламенцкі вопыт ЗША, Францыі і інш. Выканаўчы аддзел Літвы ў час старшынства Каліноўскага называлі ўрадам («Літоўска-беларускі чырвоны жонд»), а самога Каліноўскага — «дыктатарам паўстання». Паўстанне ён разглядаў не як самамэту, а толькі як адзіна магчымы і таму непазбежны ў тагачасных умовах сродак дасягнення свабоды і незалежнасці Беларусі. Каліноўскі падзяляў думку Герцэна пра стварэнне ў далейшым федэрацыі незалежных дзяржаў свабодных славянскіх народаў. Ён адзін з выдаўцоў, аўтар і рэдактар першай у свеце газеты для сялян на беларускай мове «Мужыцкая праўда»; пісаў пад псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні». У 1863—64 ім выдаваліся таксама газеты «Сцяг свабоды», «Голас з Літвы», на старонках якіх праводзіліся ідэі сацыяльнай і нацыянальнай свабоды, неабходнасці аб'яднання беларускіх і літоўскіх зямель у суверэнную дзяржаву. Разам з братам В. Каліноўскім распрацаваў адну з першых канцэпцый гісторыі Беларусі (часткова выкладзена ў выдаваемых газетах), паводле якой беларускія і літоўскія землі мелі сваю самастойную гісторыю і разглядаліся ў адзінстве. Выступаў у абарону уніяцтва, супраць прымусовага пераводу беларускіх сялян у праваслаўе. З публіцыстычнай дзейнасцю Каліноўскага звязана развіццё на Беларусі рэвалюцыйнага дэмакратызму як самастойнай ідэалагічнай плыні. Садзейнічаў станаўленню беларускай літаратурнай мовы. Этапнай з'явай у гісторыі беларускай літаратуры сталі яго публіцыстыка («Лісты з-пад Шыбеніцы») і вершы («Марыська, чарнаброва галубка мая», прысвечаныя нарачонай Марыі Ямант, і «Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці» — развітанне з беларускім народам). Каліноўскі перакладаў на беларускую мову з польскай рэвалюцыйныя песні (мазурка Дамброўскага «Яшчэ Польшча не загінула» і інш.). Неацэнны яго ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці і культуры беларусаў. Разам з Ф. Скарынам ён — адзін з самых вядомых прадстаўнікоў беларускай нацыі ў свеце. Вобраз Каліноўскага шырока адлюстраваны ў розных відах мастацтва. У г.п. Свіслач яму пастаўлены помнік.

Тв.: У кн.: Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. 2-е выд. Мн., 1988; К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1988.

Літ.: Шалькевич В. Ф. Кастусь Калиновский: Страницы биографии. Мн., 1988.

В. Шалькевіч.

Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 358—359.

ДЗЕЯННІ ПАЎСТАНЦАЎ НА ІВАЦЭВІЦКАЙ ЗЯМЛІ

У падрыхтоўцы паўстання і яго правядзенні актыўны ўдзел прымаў Францішак Юндзіл, уладальнік маёнтка Югалін. Напачатку 60-х гадоў XIX ст., пасля выхаду з рускай арміі, ён жыў у Гродне і ўдзельнічаў у стварэнні і дзейнасці гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, важаком якой з'яўляўся Кастусь Каліноўскі. Яму было даручана весці падрыхтоўку паўстання ў Слонімскім павеце. На кватэры Юндзіла ў Гродне часта збіраліся рэвалюцыянеры і вырашалі многія пытанні сваёй дзейнасці. Адзін з удзельнікаў арганізацыі Э. Забалоцкі на допыце ў Віленскай асобай следчай камісіі ў сакавіку 1864 г. паказаў, што Ф. Юндзіл актыўна дапамагаў падрыхтоўцы паўстання. Ён здаў з ранейшай памешчыцкай касы 3000 рублёў серабром ваяводскаму касіру паўстанцаў Баготку. Калі пачалося паўстанне, Ф. Юндзіл стварыў паўстанцкі атрад, які дзейнічаў у Слонімскім павеце ў раёне Дабромысля і Югаліна. 20 мая 1863 г. Кастусь Каліноўскі пабываў у атрадзе

Юндзіла і іншых, якімі камандаваў Ляндэр, непадалёку ад паштовых станцый Мілавіды і Чамялы, і выдаў правадырам атрадаў Ляндэру, Юндзілу і другім кніжкі для вядзення рахункаў. Атрад Юндзіла прымаў удзел у рашаючай бітве паўстанцаў з царскімі войскамі пад Мілавідамі. Паўстанцы прымалі бой пад Косавам, ішлі пераходамі праз Любішчыцы, Чамялы, Сярадава і іншыя вёскі. На косаўскіх каталіцкіх могілках стаіць помнік у памяць пахаваных там удзельнікаў паўстання.

Пасля паражэння паўстання залютавала рэакцыя. Быў схоплены яго кіраўнік Кастусь Каліноўскі і пакараны праз павешанне. Перад гэтым ён яшчэ паспеў напісаць адозву да беларускага народа з віленскай турмы:

«Мужыкі, браты мае родныя!

З-пад шыбеніцы маскоўскае прыходзіцца мне пісаць да вас і можа астатні раз. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мне народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, але не жаль загінуць за тваю праўду...

Ваюй, народзе, за сваё чалавечае і народнае права, за сваю веру, за зямлю сваю родную...»

Францішак Юндзіл пасля задушэння паўстання пераправіўся праз Буг і ў кастрычніку 1864 г. прыбыў у Кракаў, дзе прадаўжаў удзельнічаць у патрыятычным руху. З-за хваробы пераехаў у Францыю, дзе і памёр у лютым 1865 г.

М. Банасевіч, П. Сітнік.

* * *

Пры ўездзе ў г. Косава з Івацэвіч з правага боку знаходзяцца могілкі. Іх у народзе называюць «польскія», бо хаваюць там католікаў. На гэтых могілках стаіць помнік, на якім напісана на польскай мове. У перакладзе на беларускую мову сказана наступнае: «11 лістапада 1928 г. у гадавіну 10-годдзя незалежнасці паўстанцам польскім, якія загінулі ў 1863 г. у павеце Косаўскім — жыхары павета». А ўнізе пастамента такі надпіс: «Тут спачывае прах паўстанцаў Красінскага, Лукашэвіча і незнаёмае прозвішча».

Хацелася даведацца, магчыма, паўстанец Лукашэвіч, які тут пахаваны, жыхар горада Косава? Там ёсць такое прозвішча. Але ў народзе легенда такая не захавалася. У той жа час у адной з кніг пра К. Каліноўскага чытаю: «Ваенны начальнік Слонімскага павета даносіў, што ў раёне вёсак Мілавіды, Шалевічы, Міхаліна з'явіліся моцныя групы паўстанцаў. Ён, не маючы дастаткова сіл для барацьбы з імі, атрымлівае з усіх бакоў ад святароў, памешчыкаў, чыноўнікаў паведамленні, што паўстанцы актыўна ажыццяўляюць дэкрэты рэвалюцыйнага ўрада. Так, 29 мая 1863 года начальнік паўстанцкага атрада, заняўшы вёску Дабромысль, «сабраным у царкве членам воласці аб'явіў маніфест польскага ўрада аб увядзенні сялян ва ўласнасць і ўраўненні ў правах саслоўі. Аб'ява зроблена сумесна з тутэйшым настая-



Помнік на магіле ўдзельнікаў паўстання К. Каліноўскага на могілках у Косаве. Пастаўлены ў 1928 г.

целем грэчаскага веравызнання Хрыневічам, затым прысутныя сяляне абавязаліся клятвай быць вернымі нацыянальнаму ўраду». Пад гэтым рашэннем падпісаліся паўстанец І. Лукашэвіч, старшыня воласці Ян Лазарчук і сяляне Змітрук, Шачэла і Капевехта» (Смірноў А. Кастусь Каліноўскі. Мн., 1963. С. 130).

Магчыма, гэта той паўстанец, што пахаваны на Косаўскіх могілках? А бітва ля Косава, ва ўрочышчы Марачоўшчына, адбылася 6 чэрвеня 1863 г. Тут супраць трох рот карнікаў змагаўся атрад В. Урублеўскага. Паўстанцы, нягледзячы на нечаканы напад і колькасную перавагу ворага, тройчы контратакавалі яго, а потым здолелі адысці з невялікімі стратамі. А 9 чэрвеня 1863 г. каля вёскі Сярадава атрад А. Духінскага і В. Урублеўскага прыняў бой з карнікамі.

Пад вёскай Мілавіды ў канцы мая 1863 г. адбылася самая буйная з бітваў паўстанцаў пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага на Беларусі. У

Надпіс на помніку паўстанцам К. Каліноўскага.

гэтай бітве ўдзельнічалі атрады з Ваўкавыскага павета Г. Старавінскага («Млотка»), з Гродзенскага А. Лянкевіча («Ляндэра»), з Навагрудскага — В. Міладоўскага, з Пружанскага — Ф. Уладака, са Слонімскага — Ф. Юндзіла. Узначальваў аб'яднаныя сілы паўстанцаў (каля 800 чалавек) палкоўнік А. Лянкевіч. З чэрвеня 1863 г. паўстанцкі лагер атакавалі царскія войскі. Але ва ўпартым баі панеслі цяжкія страты (да 240 чалавек), а паўстанцы — 218 чалавек. Аднак поспех паўстанцы не замацавалі. Ноччу з 3 на 4 чэрвеня яны пакінулі свой лагер.

У 1863 г. атрад паўстанцаў Кастуся Каліноўскага пабываў у в. Любішчыцы. У царкоўнай кнізе рукою мясцовага святара запісана: «17 мая ў 8 гадзін на дванаццаці паштовых тройках прыбылі ў вёску Любішчыцы ўзброеныя інсургенты. Яны пачалі званіць, разаслалі конных сабіраць па вёсках сялян у царкву...» Далей у кнізе сказана, што калі сяляне сабраліся ў царкве, святара ды начальства прымусілі «прачытаць маніфест». Гэта і быў дэкрэт нацыянальнага ўрада паўстання К. Каліноўскага аб надзеле сялян зямлей.

Падзеі паўстання 1863—1864 гг. адбываліся і непадалёку ад Івацэвіч, на Шыбельнай гары. Знаходзіцца яна за горадам пры дарозе з Івацэвіч на Косава. Тут, у лесе, пасля паражэння паўстання ў 1864 г. царскія карнікі павесілі 20 паўстанцаў. Тут жа яны былі і пахаваны...

В. Мароз.

ШЫБЕЛЬНАЯ ГАРА

Шыбельная гара — месца, адметнае ў гісторыі паўстання. І Шыбельнай яна называецца невыпадкова. Гара шыбеніц.

Калі ехаць з Івацэвіч у Косава, то за горадам, справа, знаходзіцца гэта самая гара. Засталася толькі сама гара, а сосны па загаду ўладаў не вельмі даўно высечаны з мэтай вынішчыць народную памяць аб паўстанні і жорсткай расправе царскіх карнікаў над паўстанцамі.

А лес той быў самы што ні ёсць гістарычны. У 1864 г. у ім, на соснах, царскія служкі вешалі паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. Трагічнае гэта месца засталося ў памяці народа, хоць і няма таго лесу на гары.

Успамінаецца мне 1948 год. Я жыў у Ску-

ратах на кватэры ў Цімафея Раманавіча Патрубача. Аднойчы на фурманцы мы ездзілі з ім у Івацэвічы — аўтобусы тады яшчэ не хадзілі. Чаго мы ездзілі — не памятаю. Ведаю, што гэта была нядзеля. Дзень быў сонечны, ясны, прыгожы, цёплы. Калі мы ехалі назад, то Патрубач затрымаў каня ля Шыбельнай гары і сказаў мне:

— Вікенцій Іванавіч, схадзіце ў гэты лес (ён быў недалёка ад дарогі) і паглядзіце: на соснах, у кары, устаноўлены іконкі на тых дрэвах, на якіх вешалі паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. Іконкі пазараслі карой, але яны бачныя.

Я пайшоў. Праўда, іконкі яшчэ можна было разгледзець, хоць яны былі заліты смалою. Колькі было соснаў з іконкамі, я не лічыў, але іх было шмат. Дрэвы былі старыя, не вельмі тоўстыя і не вельмі высокія, галлё на іх пачыналася неяк нізка над зямлёй. Можа таму, што людзі не ламалі іх, не секлі, бо дрэвы былі помнікамі ды яшчэ з абразамі.

Так нашы землякі выказалі сваю пашану, так увекавечылі змагароў за лепшую долю. Ад тых трагічных падзей, пэўна, і пайшла назва гары — Шыбельная. Лес на гары мог бы жыць і зараз. Сасна — дрэва даўгавечнае.

Шкада, што памяць у нас кароткая. А ўсё гэта ад нашага бяздушша, недасведчанасці, неінтэлігентнасці. І ўсё ж добра, што трагічнае месца народнай барацьбы за лепшую долю не сцерлася з памяці. Будзем спадзявацца, што некалі на Шыбельнай гары будзе ўзведзены помнік, годны паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. Ён і будзе напамінкам аб барацьбітах мінулага. Мінулага, без якога не бывае будучага.

В. Мароз.

* * *

МУРАЎЁЎ Міхаіл Мікалаевіч (5.10.1796, Масква — 12.9.1866), дзяржаўны дзеяч Расіі; душыцель нацыянальна-вызваленчага руху беларускага, польскага і літоўскага народаў, за жорсткасць празваны вешальнікам. З 1826 віцебскі віцэ-губернатар, з 1828 магілёўскі губернатар. Удзельнічаў у задушэнні паўстання 1830— 31 на Беларусі і ў Літве, варожа ставіўся да беларускай нацыянальнай культуры. З 1831 гродзенскі губернатар, з 1832 мінскі ваенны губернатар. У 1863—65 галоўны начальнік Паўночна-Заходняга краю, арганізатар і кіраўнік задушэння паўстання 1863—64 гадоў на Беларусі і Літве.

Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 505.

У парэформенныя часы

Пасля рэформы 1861 г., якая адкрыла шлях да развіцця капіталізму, у Слонімскім павеце, у тым ліку і на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна, пачалося некаторае развіццё прамысловасці. Заснаваныя раней суконныя, вінакурныя прадпрыемствы расшыраліся. Адно з косаўскіх суконных прадпрыемстваў у 1885 г. выпусціла звыш 1 тыс. сукна. На ім працавала больш 20 рабочых. На другім суконным прадпрыемстве, дзе працавала больш 30 рабочых, у 1898 г. пачала дзейнічаць паравая машына. У 1881 г. усе прамысловыя прадпрыемствы Слонімскага павета выпусцілі прадукцыі на 270 тыс. рублёў, у 1900 г. аб'ём прамысловай вытворчасці склаў 745 тыс. рублёў.

У другой палове XIX ст. на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна прамысловасць была прадстаўлена мукамольнай, суконнай і вінакурнай вытворчасцю. У 1900 г. Косаўская вінакурня дала прадукцыі на 13 тыс. рублёў. У гэтым жа годзе на ёй была ўстаноўлена паравая машына. У Івацэвічах уступіў у строй цагельны завод; на ім у 1900 г. працавала 200 чалавек. У 1867 г. у Косаве пачаў дзейнічаць млын, на якім у 1881 г. быў устаноўлены паравы рухавік. У 1900 г. сума яго вытворчасці склала 5 тыс. рублёў. У 1885 г. была заснавана яшчэ адна суконная мануфактура, якая ў 1896 г. выпусціла прадукцыі на 25 тыс. рублёў. На той час там працавала 50 чалавек.

У 1900 г. у Быцені адкрылася новае мукамольнае прадпрыемства, якое мела паравую машыну і давала ў год прадукцыі на 1 тыс. рублёў.

На прамысловых прадпрыемствах прымянялася жаночая і дзіцячая праца, якая аплачвалася значна ніжэй мужчынскай.

На гаспадарчае развіццё раёна ў XIX ст.

значны ўплыў аказалі транспартныя артэрыі: шаша Брэст — Масква, Агінскі канал, у 1871 г. уступіла ў строй чыгунка Брэст — Масква, на якой дзейнічалі станцыі Даманава, Івацэвічы, Косава-Палескае.

Пасля адмены прыгоннага права галоўнай галіной эканомікі Беларусі заставалася сельская гаспадарка. У парэформенны час працягвала панаваць латыфундная памешчыцкае землеўладанне.

Велізарная колькасць сялянских двароў мела надзелы ад 2 да 5 дзесяцін. Сяляне вымушаны былі арандаваць зямлю ў памешчыкаў за адработкі. Пражыткам прыгоннай сістэмы былі сервітуты. У Гродзенскай губерні сервітутамі карысталіся больш палавіны сялянскіх двароў.

Капіталістычныя адносіны пачалі развівацца не толькі ў панскай, але і ў сялянскай гаспадарцы. У вёсцы ўзмацніўся працэс сацыяльнага расслаення сялянства. Расла колькасць беззямельных двароў. Беззямельныя і малазямельныя сяляне вымушаны былі наймацца да памешчыкаў і сельскіх багацеяў, ператварацца ў наёмных рабочых.

Барацьба сялян за зямлю прадаўжалася. Яна прымала форму самавольнага захопу памешчыцкіх сенажацяў, паш, высечкі лясоў. Беднасць застаўляла сялян адказвацца ад платы дзяржаўных падаткаў. Узрастала нядоімка. Тады ў сялян апісвалі жывёлу, гаспадарчы інвентар, пабудовы.

У канцы 1883 г. сяляне в. Квасевічы ўчынілі патраву на лузе памешчыка Пуслоўскага, за што былі прысуджаны да штрафу ў памеры 482 руб. 24 красавіка 1884 г. судовы прыстаў Банасевіч і павераны Пуслоўскага Пліс мелі намер апісаць сялянскую маёмасць, але сяляне схавалі жывёлу ў лесе. На другі дзень удалося жывёлу знайсці і здаць пад нагляд сельскага старасты і соцкага. На 31 мая быў прызначаны продаж жывёлы. Але сяляне зноў схавалі яе.

Асабліва актыўнае супраціўленне ўладам аказалі Рыгор Паўлоўскі, Сямён Паўлоўскі, Фадзей Голуб, Міхаіл Грэцкі, Мікалай Голуб і Антаніна Паўлоўская. У вёску прыехала каля 200 паліцэйскіх. Было арыштавана 12 чалавек.

Асаблівай вастрыні барацьба народных мас дасягнула ў часы першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. Сялянскія выступленні пачаліся ўжо ў 1904 г. Восенню 1905 г. пачаліся хваляванні навабранцаў. 15—16 кастрычніка 1905 г. у мястэчку Косава адбылося выступленне 900 прызыўнікоў. Вялікі натоўп жыхароў мястэчка прайшоў па вуліцы з крыкамі «Далоў паліцыю, бі яе!». Навабранцы ўварваліся ў паштовае аддзяленне, парвалі тэлефонныя правады, сарвалі са сцяны партрэт цара і растапталі яго. Паліцыя адкрыла агонь: было забіта і паранена некалькі чалавек. Прызыў у армію быў часова спынены.

У ліпені 1906 г. адбыліся хваляванні салдат 151-га Пяцігорскага палка, які знаходзіўся ў Картуз-Бярозе, за 29 км ад Івацэвіч. Салдаты наладжвалі мітынгі, пагражалі афіцэрам расправай за лютае абыходжанне і катаванні.

Царскія ўлады трымалі народ і ў цемнаце. Школы былі рэдкасцю. Беларуская мова забаранялася. Гісторыя краю не вывучалася. У 1897 г. на ўвесь Слонімскі павет было ўсяго 46500 пісьменных, што складала 20% насельніцтва. У трох сярэдніх навучальных установах займалася толькі 110 вучняў, ды і сярод тых 44% былі дзецьмі дваран. Сельскіх прыходскіх вучылішчаў у 1857 г. было ўсяго 18. У іх займалася 250 вучняў. Адзін вучань прыходзіўся на 330 сялян.

Адвечнай пакутаю і смяртэльнай небяспекаю для беларусаў была салдатчына. Нашы землякі ўдзельнічалі ва ўсіх ваенных авантурах Расіі і асабліва ў руска-турэцкіх і каўказскіх войнах. Селянін з Гошчава нават меў медаль «За покорение Западного Кавказа (1850—1864)».

Без войнаў імперыя жыць не магла.

У жніўні 1914 г. разгарэлася першая сусветная вайна. Па мабілізацыі ў войска былі забраны самыя моцныя мужчынскія рукі. Гэта адразу адчулася ў сялянскіх гаспадарках. Але найбольшая бяда звалілася на жыхароў раёна, як і ўсіх жыхароў Заходняй Беларусі, у 1915 г., калі немцы разгарнулі наступленне і руская армія вымушана была адступаць. Насельніцтву пад прымусам зброі было загадана пакідаць свае селішчы і перабірацца ў цэнтральныя губерні Расіі. З вёсак пацягнуліся абозы сялян з бедным набыткам, дзецьмі, старымі і нямоглымі. Дзе-нідзе частка іх грузілася ў эшалоны, а найбольш моцныя прадаўжалі шлях

на сваіх падводах. Засталіся кінутыя хаты, зараслі быльнягом палі. У гарадах і вёсках гаспадарылі кайзераўскія салдаты.

На ўсходніх рубяжах нашага раёна наступленне немцаў было спынена. Фронт устанавіўся ўздоўж Агінскага канала — праходзіў праз Целяханы, Вульку-Целяханскую, Выганашчы, Выганаўскае возера. Немцы ўзвялі ўздоўж лініі фронту жалезабетонныя ўмацаванні, рускія пабудавалі драўляныя зямлянкі. Фронт стаяў тут да восені 1918 г. Толькі пасля лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі акупанты сталі пакідаць наш край. Замест іх да ўлады рваліся палякі. Польшчу падтрымлівалі Англія і Францыя.

У час акупацыі немцы разгарнулі драпежніцка-гаспадарчую дзейнасць. Іх прывабілі нашы лясы. Яны пабудавалі вузкакалейныя чыгункі ад станцыі Івацэвічы на Святую Волю, Целяханы, Красніцу і ад станцыі Косава-Палескае ў лясныя масівы Гуліна, Міхаліна, Ружанскай пушчы. Будавалі чыгункі рускія ваеннапалонныя, якіх пад канвоем ганялі з Косава, дзе быў іхні лагер. Гэтыя вузкакалейкі разгалінаваліся па лясах і пушчах. Пачаўся масавы вываз да чыгуначных станцый Івацэвічы і Косава-Палескае вячыстых дубоў, сасны, елкі, бярозы. Паблізу станцыі запрацавалі лесапільныя заводы.

Нялёгкім быў лёс нашых людзей, якія аказаліся ў бежанстве. Пакінуўшы ўласную сялянскую гаспадарку, яны ўладкоўваліся на работу дзе толькі была магчымасць — сталі наёмнымі работнікамі на фабрыках, заводах, чыгунцы, у багацеяў-сялян. Не соладка, але жылі, дзякуючы тым людзям, якія іх прытулілі ў далёкіх губернях Расіі. Многія ў бежанстве загінулі. Многія прыжыліся ў чужых краях і дамоў не вярнуліся.

Успыхнула Лютаўская, затым Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. Падзеі іх не кранулі непасрэдна наш Івацэвіцкі край, бо ён быў бязлюдны. Але выхадцы з нашага раёна, якія былі ў войску ці працавалі на заводах у бежанстве, аказаліся ўцягнутымі ў водаварот тых дзён. Вясковы хлопец з вёскі Радстарынь Іван Васілевіч, будучы вайскоўцам, адразу стаў на бок рэвалюцыі і ўдзельнічаў у бітвах грамадзянскай вайны на Беларусі то з немцамі, то з палякамі, то з бандамі Булак-Балаховіча. З царскіх акопаў перайшлі на палі грамадзянскай вайны Рыгор Здановіч з Бычы, Фёдар Мурашка з Размерак, Іван Мультан з Някрасаўшчыны і Мацвей Ермачок з в. Доўгае, якія пасля сталі генераламі.

Пасля завяршэння вайны з палякамі бежанцы пачалі вяртацца дамоў. Непрыветна сустрэлі іх родныя мясціны. Жыццё трэба было аднаўляць з нічога.

М. Банасевіч, П. Сітнік.

Замак паслярыцарскіх часоў

Архітэктурная спадчына мінуўшчыны — замкі, палацы, храмы, комплексы разнастайных забудоў, якія захаваліся на Берасцейскай зямлі, — гэта невычарпальная крыніца фантазіі, узоры мастацкай дасканаласці, а таксама сведчанне таго, што культура нашага краю развівалася не ў адрыве ад заходнееўрапейскай культуры.

У XIX ст. адраджаюцца даўнія архітэктурныя традыцыі, а па сутнасці запазычваюцца асобныя стылістычныя элементы мінулага з тым, каб уваскрэсіць колішняе харство ў новых будаўнічых матэрыялах. Гэта прывяло да стварэння цікавага архітэктурнага напрамку — «гістарызму», які вызначаўся якраз некрытычным выкарыстаннем самых розных стыляў: готыкі, барока, ракако, класіцызму і інш. Пабудовы ў стылі неаготыкі (несапраўднай готыкі) паяўляюцца на Беларусі ўжо ў пачатку XIX ст.

Адзін з ранніх неагатычных помнікаў у валікоцах г. Косава. У 1838 г. тут, ва ўрочышчы Мерачоўшчына, ваявода Казімір Пуслоўскі пачаў узводзіць палац. «Будаўніцтва вялося на шырокую нагу. Былі запрошаны італьянскія майстры. Распрацоўкай праектаў палаца і парка займаўся архітэктар Ф. Яшчолд, удзел у будаўнічых работах прымаў В. Марконі. Праект палаца вылучаўся арыгінальнасцю і зграбнасцю ліній.

Да таго часу рыцарскія трубы ўжо даўно сваё адтрубілі, і замест вузкіх байніц на свет божы глянулі шырокія створкавыя вокны і вітражы. Але Пуслоўскі не быў бы ваяводам, калі б не загадаў па вуглах галоўнага фасада ўзвесці гранёныя вежы, падобныя да вартавых. Яны мажна ўраслі ў зямлю і падперлі сваімі плячыма ўнутраныя пакоі, прыдатныя больш для баляў і паланезаў, чым для крапасных гармат. Ваявода не паспеў давесці справу да канца. Палац дабудаваў яго сын Вандалін Пуслоўскі» (А. Савелічаў. Нёман, № 2, 1968. С. 192).

У 40-х гадах мінулага стагоддзя на Мерачоўскім узгорку ўзняўся, як бы залунаў над зямлёю, белы палац. Калі знялі рыштаванні, стала асабліва прыкметна, што майстры дамагліся свайго. Складаўся палац з цэнтральнага двухпавярховага корпуса і бакавых крылаў, злучаных з ім вузкімі галерэямі. Бакавыя фасады мелі вялікія контрфорсы, падобныя да вежаў. Матывы неаготыкі шырока выкарыстаны пры аздабленні фасадаў: зубцы-завяршэнні асноўных аб'ёмаў, вузкія спічастыя аркі дзвярных і аконных праёмаў і інш. Парадныя залы на другім паверсе былі размаляваны мастаком Жмуркам, фасады мелі высакаякасную тынкоўку.

«Праз які час гаспадаром палаца стае Ляон Пуслоўскі, спадчыннік ваяводы. Праматаўшы ўсё, ён вымушаны быў прадаць палац і сумежныя з ім землі за семсот тысяч рублёў купцу Аляксандраву. Пашанцавала купцу ў гэтым пагадненні, і ў падзяку ён падараваў Косаўскай царкве звон, а палац, ужо за двайную цану, перапрадаў князёўне Ганне Трубяцкой, жонцы князя Пятра Трубяцкога. Затым уладарамі палаца былі княгіня Абамалек і прынц Пётр Альдэнбурскі. І ў рэшце рэшт палац стае маёмасцю казны» (А. Савелічаў).

У першую сусветную вайну ён быў разрабаваны немцамі, загінулі сад і аранжарэя. Сам палац захаваўся. Але не выстаяў у чарговай навале — згарэў у Вялікую Айчынную вайну.

Нават і зараз, пакалечаны і абгарэлы, ён уражвае прыгажосцю і зграбнасцю форм. Рэстаўрацыя Косаўскага палаца дазволіла б стварыць мемарыяльны комплекс. Справа ў тым, што гэтыя мясціны славуты не толькі архітэктурным помнікам. Аднапавярховы драўляны дом, дзе жыў Т. Касцюшка, стаяў на беразе р. Косаўка ля падножжа замкавай гары. У гады Вялікай Айчыннай вайны згарэў, застаўся адзін фундамент.

В. Лялько.

Берасцейскія карані, Брэст, 1993.



Замак Пуслоўскіх у Мерачоўшчыне каля Косава.

Дакументы сведчаць

З ЦАРКОЎНАПРЫХОДСКАГА ЛЕТАПІСУ ВЁСКІ ГОШЧАВА

1881 год. У Гошчаве пануе моцная смяротнасць ад натуральнай воспы. Яна адбылася ў выніку таго, што ўжо некалькі год запар воспа нікому не прывівалася, за выключэннем толькі тых, хто мог заплаціць за гэта фельчару. Калі ўжо адкрылася моцная эпідэмія, тады толькі пачалі прывіваць воспу.

У 1882 годзе ў вельмі моцнай ступені былі паўсюдна развіты: адзёр, шкарлятына, дыфтэрыя.

У 1881 годзе ў Гошчаўскім царкоўным прыходзе (Гошчава, Размерка, Быч, Сярадава) жыло 1638 чалавек. Нарадзілася 64. Памерла 77. Сярод памёршых да 1 года — 5, да 5 год — 4, да 10 год — 18, да 15 год — 3. Астатнія старэйшыя. Ад воспы памерла 44 дзіцяці.

1882 год. Нарадзілася 92. Памерла 63. Дзяцей да 10 год — 38.

1883 год. Нарадзілася 70. Памерла 43. Дзяцей да 10 год — 23.

1886 год. Нарадзілася 78. Памерла 44. Дзяцей да 10 год — 28.

1888 год. Нарадзілася 88. Памерла 73. Дзяцей да 10 год — 45.

1890 год. Нарадзілася 100. Памерла 102. Дзяцей да 10 год — 66.

1891 год. Нарадзілася 79. Памерла 53. Дзяцей да 5 год — 33.

1894 год. Нарадзілася 94. Памерла 65. Дзяцей да года — 21, ад года да пяці — 18.

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Ф. 8264, Спр. 117—118. С. 139—160.
Пераклад на беларускую мову.

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ СЛОНІМСКАГА І ВАЎКАВЫСКАГА ПАВЕТАЎ А. А. ФЁДАРАВА НАЧАЛЬНІКУ ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Н. В. ЮГАНУ АБ НАПАДЗЕ СЯЛЯН в. ГНОЙНА НА ПРЫКАЗЧЫКА І ВАРТАЎНІКОЎ ПРЫ БУДАЎНІЦТВЕ ВАДАСХОВІШЧА НА СПРЭЧНАЙ ЗЯМЛІ

20 кастрычніка 1884 г.

Секретно

Предместником моим от 20 мая 1880 г. № 180. В деле указанного донесения не имеется, донесено было вашему высокоблагородию, что крестьянами дер. Гнойно и Доманово Слонимского уезда, в числе до 200 душ обоего пола, оказано было самоуправство, выразившееся в том, что они самовольно разбросали строившуюся караулку для сторожей, наблюдавших за скоплением воды при казённой плотине на том основании, что постройка производилась будто бы на принадлежащей им земле, тогда как земля, где производилась караульная будка, назначена была в 1877 г. в ведение казны под Гривденское водохранилище. С тех пор крестьяне неоднократно препятствовали работам на указанном месте: портили насыпи, ломали инструменты. Каждый раз возбуждалось против них преследование, но до наказаний дело не доходило за силой всемилостивейшего манифеста 15 мая 1883 года. В приезд в сем месяце гродненского губернатора в Слонимский уезд помощник начальника Гродненского отделения Ковенского округа путей сообщения, инженер надворный советник Лашкевич заявил его превосходительству о невозможности в виду самоуправства крестьян производства работ в Гривденском водохранилище, и действительный статский советник Потемкин II-го сего октября посетил дер. Гнойно, лично говорил с крестьянами около 3 часов, разъясняя им, что принадлежавшая им земля приобретена в казну по высочайшему повелению, что им за землю уплачены деньги и что они безусловно подчинятся высочайшей воле и не будут препятствовать казенным работам. Крестьяне отвечали его превосходительству, что им денег не надо, им нужна земля, так как иначе не могут существовать, и просили им в то же время дать еще год отсрочки, для того чтобы ходатайствовать об оставлении земли в их владение. Губернатор в этом последнем ходатайстве отказал, а обещал со своей стороны хлопотать об отводе крестьянам дер. Гнойно соответственно количеству земли вместо отчужденной в казну в другом месте и, уезжая, приказал Лашкевичу немедленно приступить к работе. 13 числа сего месяца инженером Лашкевичем наняты были 20 человек рабочих из дер. Добрынево и под наблюдением приказчика еврея Баруха Шлифера приступлено было к земляным работам при Гривденском водохранилище на отчужденной земле. Крестьяне дер. Гнойно толпой около 50 человек, при участии женщин и детей, прибыв на место работ, прогнали рабочих, избили

приказчика еврея Баруха Шлифера и сторожа водохранилища, крестьянина Василия Ядченя, разорили произведенные земляные работы, переломали тачки и вместе с досками затопили в воде.

Таким образом работы на Гривденском водохранилище в настоящее время приостановлены. Об изложенном самоуправстве крестьян деревни Гнойно составлен протокол и передан мировому судье.

Дано о сем вашему высокоблагородию, присовокупляю, что приставлено в департамент полиции.

Подлинник подписал [...] капитан Фёдоров.

З ДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА ГРОДЗЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў СЛОНІМСКІМ І ВАЎКАВЫСКІМ ПАВЕТАХ НАЧАЛЬНІКУ ЎПРАЎЛЕННЯ АБ СУПРАЦІЎЛЕННІ СЯЛЯН в. ВОЛЬКА ДАБРОМЫСЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ СЛОНІМСКАГА ПАВЕТА МЯСЦОВЫМ УЛАДАМ ПРЫ РАЗМЕЖАВАННІ ЗЯМЕЛЬ

21 мая 1886 г.

19 чысла гэтага мая меркавалася правесці размежаванне зямель паміж сялянамі в. Волька Дабромыслькай вол. Слонімскага п. і памешчыкам маёнтка Рэгінова таго ж павета Станіславам Юндзілам. Для чаго ў абазначаную вёску прыбылі міравы пасрэднік 1-га ўчастка з землямерам Баярскім, павятовы спраўнік, два станавых прыстава з 5 паліцэйскімі ўраднікамі, мясцовы валасны старшына і каля 50 чалавек соцкіх і дзесяцкіх. Ледзь толькі хацелі прыступіць да работ, як сяляне названай вёскі са сваімі жонкамі і дзецьмі выйшлі на месца размежавання і, нягледзячы ні на якія ўгаворы, не дапусцілі землямера да работ. Спраўнік, бачачы такое супраціўленне, арыштаваў 8 чалавек сялян-падбухторшчыкаў і загадаў адправіць іх у г. Слонім, але ледзь толькі загад спраўніка пачаў прыводзіцца ў выкананне, як натоўп сялян в. Волька накінуўся на канвой і вызваліў сваіх аднавяскоўцаў, якія кінуліся бегчы ў лес. Пры гэтым у агульнай звалцы сяляне пабілі ўраднікаў, сотнікаў і дзесятнікаў. Урадніку Васюкевічу хтосьці з натоўпу ўкусіў палец, другому, Санчыку, абарвалі пагон. Такім чынам дапушчанае зямельнае размежаванне не было прыведзена ў выкананне.

Даносячы аб гэтым в. в. б. далучаю, што копія з гэтага данясення мною разам з гэтым за № 178 адпраўлена ў Дэпартамент паліцыі. Сапраўдны подпіс і верна: Ротмістр Фёдараў.

Беларусь у эпоху капіталізму. Мн., 1983. С. 237.

З ДАНЯСЕННЯ МІРАВОГА ПАСРЭДНІКА СЛОНІМСКАГА ЎЕЗДА ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ГУБЕРНАТАРУ АБ СУПРАЦІЎЛЕННІ СЯЛЯН в. ЧАМЯЛЫ КАМОРНІКУ ПРЫ АДМЕЖАВАННІ СПРЭЧНЫХ УРОЧЫШЧ У КАРЫСЦЬ ПАМЕШЧЫКА

30 жніўня 1887 г.

Ввиду сообщения губернского по крестьянским делам присутствия от 1 июня 1887 г. за № 3601, что споры крестьян д. Чемелы с владельцем имения Бытень гр. Потоцким разрешены в высших инстанциях, мною поручено было 1-го текущего года августа за № 1010, состоящему при съезде землемеру Боярскому, согласно сообщению присутствия от 13 апреля 1885 г. за № 2560, приступить к новому обходу границ крестьянского надела д. Чемелы и привести в исполнение решение мирового съезда от 20 июня 1881 г. номер ст. 304, отмежевав спорные уроч. Гнилая Березина и Березовец пространством 369 дес. 180 саж. в пользу помещика гр. Потоцкого. Когда работы по обходу границ близились к концу, землемер Боярский донес мне, что крестьяне отказываются дать рабочих для отмежевания спорных урочищ Гнилая Березина и Березовец, тогда распорядившись вызовом рабочих из других деревень и прибыв на место в уроч. Гнилая Березина с 24 человеками, я застал толпу крестьян, которым разъяснил значение моих действий как лица, приводящего в исполнение судебное решение, и объяснил последствия каких бы то ни было беспорядков во время работ. Крестьяне оспаривали правильность сказанного решения и в толпе слышны были голоса, что работам воспрепятствуют и урочищ отрезать в пользу помещика не дадут. Когда первый межевой знак был поставлен и рабочий с вехой направлен был по направлению следующего знака, крестьяне толпой его удержали, тогда я повел рабочего сам на место, причем здесь имел случай, когда несколько крестьян пытались вырвать веху, чтобы воспрепятствовать работам, но мне, однако, удалось восстановить порядок увещеванием и работы продолжались беспрепятственно как в этот день, так и в следующий, пока всё урочище было пройдено, крестьяне же и их поверенные с места работ удалились. Поверенный гр. Потоцкого г-н Кличевский и землемер администрации имения Ержикович, при-

сутствующие при обходе, выказали уступчивость и по просьбе моей добровольно прирезали крестьянам более половины пространства, присужденного владельцу уроч. Гнилая Березина.

Предстояло затем обойти и исключить из пользования крестьян уроч. Березовец, представляющее в настоящее время значительную площадь мелких зарослей из-под вырубленного леса, частью уже распаханное и превращенное в пахоть. Обход этого урочища начался от границы казённого леса в расстоянии приблизительно 3 вер. от деревни.

Когда приступлено было мною 25 августа к постановке второго межевого знака, из кустов зарослей бросились женщины и мужчины, а числом около 30 человек, веху вырвали у рабочих мужчины, а женщины стали на том месте, где следовало ставить граничный знак с курганом. Один из мужчин, вырвавших веху, был задержан, но освобожден толпой и скрылся, выяснить его личность не представилось возможным, и назвать свою фамилию он отказался. Будучи поставленным в необходимость оставить межевые работы, я телеграммой просил исправника прибыть на место и оказать мне содействие.

27 августа совместно с исправником я отправился в уроч. Березовец, на полпути от деревни к месту работ мы обогнали толпу мужчин человек 50, все они были вооружены палками, когда мы спросили крестьян, для какой надобности у них палки, толпа ответила, что палки у них для защиты от собак. Прибыв на место работ, мы застали толпу мужчин и женщин около 100 человек, женщины с грудными детьми и беременные стояли впереди. Как у женщин, так и у мужчин в руках были палки. Межевой знак, поставленный 25 числа, оказался уничтоженным. После увещеваний наших разойтись и дать мне возможность продолжить работу толпа отвечала нам бранью и угрозами, а когда исправник с двумя приставами, конными урядниками, сотскими и десятскими пытался очистить место для возобновления уничтоженного знака, то толпа бросилась на урядников, нанося удары палками и сучьями. Действия полиции оказались 27 числа безуспешными, причём два урядника получили ушибы и ссадины около глаз.

На следующий день, 28 августа, прибыл на место, где оказано было сопротивление, судебный следователь для производства следствия, толпа крестьян вновь собравшихся была несколько меньше, но оказала нам такое же упорное вооружённое сопротивление, как и накануне, однако после долгих усилий полиции удалось толпу отстранить и межевые работы, начатые в 2 часа пополудни, продолжались до вечера. По случаю праздников работы приостановлены мною до понедельника, 31 августа.

Сообщая о вышеизложенном в. в. п., имею честь присовокупить, что по окончании межевых работ по д. Чемелы, если межевые знаки, поставленные 28 августа, окажутся не уничтоженными, мною будет сообщено дополнительно.

Мировой посредник Штейн.

Белоруссия в эпоху капитализма. Т. 1. Мн., 1983. С. 242—245.

Паштовая станцыя ў Няхачаве. Пабудавана ў 1840-я гады. Рэстаўрыравана ў 1980 г.

Гістарычныя дзеячы

ГАМАЛІЦКІ Міхаіл Лявонавіч (22.11.1791, в. Бялавічы — 2.2.1861). Беларускі ўрач, гісторык, літаратар. Доктар медыцыны (1815), прафесар (1824). Скончыў Віленскі універсітэт (1815) і працаваў у ім (1816—27). Член Віленскай археалагічнай камісіі (з 1857). Даследаваў гісторыю Вільні і заходніх зямель Беларусі, беларускую філалогію, гісторыю і археалогію, займаўся літаратурнай дзейнасцю.

ХРУЦКІ Канстанцін Вікенцьевіч (18.1.1855, в. Корачын Івацэвіцкага р-на — 14.2.1969), герой руска-турэцкай вайны 1877—78. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1885). У 1875—81 у арміі, старшы унтэр-афіцэр лейб-гвардыі Праабражэнскага палка, удзельнік вызвалення г. Варна, штурму крэпасці Плеўна. Вызначыўся пры абароне перавалу на Шыпцы. У 1885—1915 сельскі настаўнік у Гродзенскай губ. У 1915—18 у Маскве, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі.

К. В. Хруцкі.

У 1919 за рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны ў Омску карнікамі Калчака і прыгавораны да расстрэлу. Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй працаваў у Сібіры, з 1923 у Новарасійску. Узнагароджаны 2 Георгіеўскімі крыжамі, ордэнамі Леніна і «Знак Пашаны», ордэнам Георгія Дзімітрова (НРБ). Пахаваны ў Новарасійску.

Паўстанцы з Квасевіч

Адным з самых буйных сялянскіх выступленняў у 1880—90-я гады на Беларусі было выступленне сялян вёскі Квасевічы. Матывам для выступлення паслужыў канфлікт паміж сялянамі гэтай вёскі і памешчыкам Пуслоўскім за права карыстацца лугам, які знаходзіўся якраз на мяжы паміж уладаннямі пана і сялянскімі землямі.

Пры размежаванні зямель адразу ж пасля адмены прыгоннага права ў 1861 годзе за сялянамі замацоўвалася права карыстацца выпасамі ў панскіх лясах і ўрочышчах «Фядоска», «Алясец», «Лужа», «Кусенія» і парослым алешнікам лугам у верхнім цячэнні ракі Фядоска. Прыкладна ў канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя луг гэты быў вызвалены ад алешніку, і магнат Ф. У. Пуслоўскі пачаў выкарыстоўваць яго як сенакосны, забараніўшы сялянам пасвіць на ім жывёлу. А ў 1878 г. пры новым размежаванні зямель ужо канчаткова завалодаў ім, замацаваўшы сваё права на ўладанне юрыдычна. Тады сяляне паскардзіліся ў міністэрства ўнутраных спраў. І хоць па рашэнню міністэрства скарга яшчэ 4 снежня 1879 г. «оставлена без последствий», бо, як гаварылася, яна была «проверена местным дознанием и оказалась вымышленной», сяляне працягвалі пасвіць там жывёлу.

Летам 1881 года памешчык Пуслоўскі за «потраву луга» падаў на сялян у суд. Міравы суддзя Слонімскага павета вынес рашэнне: «взыскать с крестьян д. Квасевичи в пользу помещика Пусловского 337 р.». Довады сялян, якія прысутнічалі на судзе, не былі прыняты. Але сяляне не здаваліся. Яны згаварыліся не плаціць штраф. І калі ў пачатку лютага 1882 г. у вёску прыехалі павятовы спраўнік і судовы прыстаў, каб апісаць маёмасць, а пасля прадаць яе з аўкцыёну, сяляне не дазволілі гэта зрабіць. Аб падзеях у в. Квасевічы дырэктар дэпартамента дзяржаўнай паліцыі Плеве ў запісцы ад 16 лютага 1882 г. паведаміў ужо самому цару. На рапарце рукою Аляксандра III напісана: «Читал». А ў хуткім часе ў вёску былі накіраваны два эскадроны драгун «для восстановления силы закона и в помощь полиции». Можна толькі здагадвацца, як рэгулярныя войскі «восстанавливали силу закона» над бяззбройнымі сялянамі.

Тым часам сяляне не здаюцца і зноў жа шукаюць праўду ў царскім судзе. Вядомы і прозвішчы сялянскіх паслоў. Гэта Сямён

Паўлоўскі, Фадзей Голуб і Міхаіл Грэцкі. Невядома, чым закончыўся суд, але на наступны год сяляне зноў пагналі пасвіць жывёлу на той луг.

Магнат Пуслоўскі, якому толькі ў Мінскай губерні належала 90 тысяч дзесяцін зямлі, у другі раз падае ў суд. Міравы суддзя Слонімскага павета, а затым і з'езд міравых суддзяў прысудзілі «з сялян в. Квасевічы... на карысць памешчыка Пуслоўскага за патраву яго луга 482 р.». Але сяляне і зноў не пажадалі пагадзіцца з рашэннем суда. І тады 24 красавіка 1884 г. судовы прыстаў з'езда міравых суддзяў Слонімскай акругі Банасевіч прыбыў з даверaным Пуслоўскага Плісам «для описи движимого имущества ответчиков». Былі апісаны конь, некалькі кароў, свіней і авечак. Продаж іх быў назначаны на 31 мая.

Наступілі трывожныя дні. Вёска бурліла. Управіўшыся па гаспадарцы, сяляне сыходзіліся вечарамі да карчмы і там гаманілі, раіліся, шукалі рашэнне. Раніцай 31 мая прыстаў Банасевіч з некалькімі дзесяцкімі з суседніх вёсак прыехаў у Квасевічы. Але жывёлы ў хлявах не было. Тады паліцыянт загадаў паклікаць старасту і дзесяцкага. Яны пачалі палохаць сялян суровай карай. Тыя здаліся і сказалі, што жывёла пасецца ва ўрочышчы «Кухля». Прыстаў і дзесяцкія накіраваліся туды. За імі рушыў узбуджаны натоўп сялян. Рыгор Зяленя, які стаяў ля карчмы, крыкнуў, звяртаючыся да жанчын: «Вазьміце кіі і дайце ім. Чаго яны тут ходзяць?!». Але людзі ўстрымаліся ад нападу.

Доўга лазілі царскія служкі па балотнай твані, але жывёлы так і не знайшлі. Вярнуўшыся ў вёску, пачалі зноў хадзіць па хлявах і ў Ігната Собаля знайшлі ў адрыне за сенам авечак. Па загаду прыстава дзесяцкія пачалі вывалакваць іх з хлява. Але тут жанчыны кінуліся на дзесяцкіх. На дапамогу падаспелі мужчыны. Асабліва стараліся Рыгор і Сямён Паўлоўскія, Фадзей і Мікалай Голубы, Міхаіл Грэцкі. Бачачы, што выканаць задуманае не ўдасца, прыстаў асабіста звярнуўся да кожнага селяніна-адказчыка. Але тыя ўсе ў адзін голас заявілі: «Не аддадзім жывёлы, мы пасем яе на сваёй зямлі». Склаўшы аб усім гэтым пратакол, прыстаў з дзесяцкімі пакінулі вёску.

21 ліпеня 1884 года слонімскі павятовы спраўнік рапартаваў гродзенскаму губернатару: «Прадстаўляючы пры гэтым копію акта з прычыны ўзброенага супраціўлення сялян в. Квасевічы Косаўскай воласці, якое аказалі мне яны пры прывядзенні ў здзяйсненне судовага рашэння, маю гонар давесці да ведама вашага правасхадзіцельства, што сяляне названай вёскі яшчэ ў 1882-м годзе аказалі падобнае супраціўленне і былі ўціхаміраны толькі пры дапамозе войск...

Пасылка войск у Квасевічы ў самы кароткі тэрмін уяўляецца неабходнай для таго, каб зламаць, як мага хутчэй, моцную ўпартасць сялян гэтай вёскі, аднавіць сярод іх павагу да ўлады, зусім імі страчаную, і не падаць згубнага прыкладу для сялян суседніх паселішчаў. Насельніцтва в. Квасевічы даволі значнае, у ёй цяпер налічваецца 238 душ мужчынскага полу і 286 — жаночага».

Улады забілі трывогу. Такога ў павеце ды і па ўсёй губерні даўно ўжо не было. Цэлая плойма судовых і паліцэйскіх чыноўнікаў на чале з судовым следчым І участка Слонімскага павета наляцелі на вёску Квасевічы. Пачалося следства.

18 чэрвеня Сямён і Рыгор Паўлоўскія, Фадзей і Мікалай Голубы, Міхаіл Грэцкі, Рыгор Зяленя былі арыштаваны і пасаджаны ў Косаўскую валасную турму... Яны абвінавачваліся па 273 артыкуле ч. 1 Улажэння аб пакараннях, які пагражаў ім пазбаўленнем волі тэрмінам ад года і 4 месяцаў да 2 год, як «зачинщикам к неисполнению государственных повинностей». У вёску прыехала каля 200 дзесяцкіх і некалькі ўраднікаў. Сяляне (20 чалавек), якіх абвінавацілі ў патраве луга, зноў наадрэз адказаліся выдаць апісаную жывёлу. Тады пачаліся пошукі жывёлы па ўсім наваколлі. На ўскрайку лесу ў хмызняках знайшлі статак свіней. Тады станавыя прыставы загадалі дзесяцкім гнаць яго ў Косава. Натоўп сялян, узбуджаны і гнеўны, пачаў збіраць каменні і шпурляць па дзесяцкіх. Па меры таго як гэтая шумная працэсія прыбліжалася да вёскі, сялян усё большала, і каменні градам сыпаліся на дзесяцкіх. Фёдар Шчытляк, Дзям'ян Ясюк, Зміцер і Мірон Голубы, Фама Бабей кінуліся на дзесяцкіх з палкамі і адбілі статак. Такога павароту падзей царскія служкі ніяк не чакалі. Пачалася сапраўдная вайна.

Паліцэйскім з вялікім намаганнем усё ж

такі ўдалося арыштаваць памянёных сялян, а таксама дзвюх жанчын Марыну Собаль і 90-гадовую Пелагею Собаль. Фёдар Шчытляк, Зміцер і Мірон Голубы, Дзям'ян Ясюк як злосныя парушальнікі былі тут жа адпраўлены ў Слонімскую павятовую турму. Ім прад'явілі абвінавачанне па 266 артыкуле Улажэння аб пакараннях. Гэты артыкул прадугледжваў розныя віды пакарання ўдзельнікаў супраціўлення ўладзе ў залежнасці ад іх «актыўнасці». Так, самае цяжкае пакаранне, да якога прыгаворваліся «зачыншчыкі», было пазбаўленне ўсіх грамадскіх правоў са ссылкаю ў Сібір, ці «отдача в исправительные арестантские отделения сроком до трех лет».

Фама Бабей, Марына Собаль, а таксама Пелагея Собаль пакідаліся пад нагляд паліцыі.

Праз некалькі дзён у вёску былі ўведзены рэгулярныя войскі. Следчыя зноў узяліся за сваю гнюсную справу. У сяло прыехаў сам гродзенскі губернатар і пракурор Гродзенскага акруговага суда. Былі арыштаваны яшчэ 12 чалавек. Сяляне вымушаны былі заплаціць штраф. Магнат Пуслоўскі і на гэты раз выйграў судовы працэс. Ды, відаць, інакш і не магло быць: царская крэпасць была яшчэ даволі моцнай, і судовая машына зрабіла сваю справу. Генерал-губернатар аб'явіў губернатару г. Гродна «шчырую ўдзячнасць».

На жаль, засталося невядомым, чым закончыліся судовыя працэсы над арыштаванымі сялянамі.

А. Зайка.

Забастоўка ў Целяханах

Падзеі 9 студзеня 1905 года (расстрэл у Пецярбургу мірнай дэманстрацыі па загаду цара) ускалыхнулі ўсю Расійскую імперыю і паслужылі пачаткам рэвалюцыі 1905—1907 гг. Забастовачны рух імкліва шырыўся па ўсёй краіне.

5 сакавіка 1907 г. 250 рабочых Целяханскай Гуты не выйшлі на працу. У той жа дзень пінскі павятовы спраўнік рапартам данёс мінскаму губернатару: «5 сакавіка рабочыя шкляного завода братоў Чарніховых і К°, які размешчаны ў мястэчку Целяханы, спынілі работы, прад'явіўшы адміністрацыі завода наступнае: 1) павелічэнне заработнай платы; 2) прадастаўленне рабочым права карыстацца бясплатна дровамі для ацяплення; 3) бясплатнае карыстанне лазняй; 4) наём пастаяннага для рабочых фельчара; 5) назначэнне і звальненне са згоды рабочых; 6) памяншэнне на адну гадзіну рабочага дня; 7) выдача рабочым казённых інструментаў.

Вядома, што па закону працягласць рабочага дня павінна была быць не болей 11 з паловай гадзін. Але закон гэты ўсяляк парушаўся, і рабочы дзень нярэдка цягнуўся да 12—13 гадзін. Афіцыйна рабочы дзень на заводзе ў Целяханах пачынаўся ў 6 гадзін раніцы, але падсобныя рабочыя — баначнікі, адносчыкі, акладчыкі — павінны былі прыходзіць у 4 гадзіны, каб выбраць з печаў учарашні посуд, аднесці яго ў шліфавальны цэх, падмесці і памыць рабочае месца майстра, пачысціць трубкі, а пасля работы падрыхтаваць яму матэрыялы і інструменты да наступнага дня.

Найбольшы па працягласці рабочы дзень быў у качагараў і машыністаў пры паравых машынах. Пачынаўся ён з пяці гадзін раніцы і цягнуўся да сямі з паловай вечара. Пры гэтым работнікі не мелі права «отходить от вверенных их досмотру котлов и завтракали и обедали в котельном помещении».

Дробны шкляны пыл, які выдзяляўся пры шліфоўцы, насіўся ў паветры, і людзі ўдыхалі яго. Вось чаму так многа было хворых на сухоты. Большасць на заводзе складалі дзеці. Вось звесткі, якія склаў старшы фабрычны інспектар мінскай губерні па шклозаводзе «Целяханы» за 1904 год. «Малалетніх: мужчынскага полу — 34; жаночага полу — 5; падлеткаў: мужчынскага полу — 45; жаночага полу — 19; дарослых: мужчынскага полу — 112; жаночага полу —19...».

Зараблялі дзеці і жанчыны па 15 капеек у дзень. Ды ўсё гэта мала турбавала ўладальнікаў завода. Вось што адзін з іх цынічна патрабаваў ад улад у часопісе «Шклозаводчык» (№ 2, ст. 4, 1907 г.): «Па ўмовах шкляной вытворчасці падлеткі павінны быць дапушчаны на начныя работы і пры тым (таму што яны працуюць разам з майстрамі і не могуць быць аддзеле-

ны ў якую-небудзь асобную групу) павінны працаваць столькі часу, колькі працуюць майстры».

Мала таго, што дзеці працавалі амаль увесь дзень, гэты заводчык хацеў, каб яны яшчэ працавалі і ноччу. Далей. Вядома, што з увядзеннем газагенератарных печаў у якасці паліва пачалі выкарыстоўваць адыходы лясной гаспадаркі — сухастой, павал, гарбылі, абрэзкі (якраз у гэты час пачаў працаваць і лесапільны завод). Цэлыя горы драўніны былі назапашаны на тэрыторыі завода. А людзі мерзлі ў бараках і не мелі права пакарыстацца дровамі: за ўсё павінны былі плаціць.

З-за цеснаты ў бараках (шмат рабочых было з навакольных вёсак) было шмат хвароб. Нельга было памыцца: за лазню адміністрацыя завода патрабавала грошы.

... Але звернемся зноў да 5 сакавіка 1907 года. На другі дзень забастоўкі на завод прыехаў участковы фабрычны інспектар. З ім сустрэлася дэлегацыя рабочых. І хоць адміністрацыя завода згаджалася задаволіць 1-ы, 3-ы, 4-ы, 6-ы пункты патрабаванняў, аднак рабочыя стаялі на сваім і не выйшлі на працу. Аб згуртаванасці і добрай арганізаванасці рабочых гаворыць і той факт, што забастоўка працягвалася без ўсякага насілля і разбою. І рабочыя перамаглі. Уладальнікі завода вымушаны былі задаволіць усе патрабаванні рабочых. Прыкладна 20 сакавіка зноў задымілі печы на шклозаводе «Целяханы».

А. Зайка.

Косаўскі бунт

Мястэчка Косава, 15 кастрычніка 1905 года. Сюды з навакольных вёсак на прызыўны пункт ішлі ці ехалі фурманкамі сотні навабранцаў. Чуліся гармонікі і песні, якія перарываліся несуцешным плачам маці. Толькі што скончылася паражэннем для Расіі руска-японская вайна, і невядома, што чакала іх дзяцей. Начавалі, дзе хто змог, а найбольш на вуліцы, пад адкрытым небам.

З раніцы наступнага дня і да самага вечара ішоў дождж, дзьмуў пранізлівы вецер, было холадна. То тут, то там чуліся незадаволеныя галасы: «Нашто назбіралі людей і трымаеце, як сабак, на вуліцы?». Абурэнне расло, каля 1000 навабранцаў разам са сваякамі сабраліся на гандлёвай плошчы мястэчка. З'явіліся прамоўцы, з ліку «некоторых призывников из христиан, возвратившихся с заработков из Севастополя, Петербурга и других фабричных местностей», як дакладваў слонімскі павятовы спраўнік гродзенскаму губернатару. Яны і заклікалі браць уладу ў свае рукі.

Паліцэйскія спрабавалі разагнаць удзельнікаў мітынгу. Тады пачулася: «Далоў паліцыю, бі яе!». І адразу ў царскіх служак паляцелі камяні. Стражнікі пачалі страляць у паветра. Натоўп, рассеяўшы паліцэйскіх, ламаючы на сваім шляху гандлёвыя лаўкі, рынуўся да пошты, маючы на мэце захапіць таксама валасное ўпраўленне і станавую кватэру — атрыбуты царскай улады ў горадзе. Людзі ўварваліся на пошту, выламаўшы дзверы, вокны, сарвалі і растапталі партрэт гасудара ўсяе Русі Аляксандра III. Спраўнік аддаў каманду падначаленым страляць у людзей. Вось што ён піша, пахваляючыся, свайму начальніку — гродзенскаму губернатару:

«Построивши чинов полиции в одну шеренгу, я открыл огонь по толпе, которая от неожиданности и от криков, надо полагать, раненых, подалась назад. Заметив сильное замешательство в толпе, я приказал обнажить шашки и с криком «ура» бросился на толпу, которая разбежалась по всем улицам местечка».

У той вечар 32 чалавекі былі затрыманы паліцыяй, на наступны дзень не з'явіліся на прызыў каля 70 чалавек. Відаць, столькі было параненых і пакалечаных.

А. Зайка.

Сацыял-дэмакраты Міхаліна

Пасля паражэння першай рускай рэвалюцыі рэзка пагоршылася становішча рабочых. Узмацніліся рэпрэсіі з боку царскіх улад і жандарска-паліцэйскі нагляд. Але падпольная рэвалюцыйная дзейнасць не спынялася.

Архіўныя дакументы данеслі да нашых

дзён некаторыя звесткі з тых гадоў, а іменна — стварэнне ў 1908 годзе сацыял-дэмакратычнай рабочай групы на Міхалінскім шклозаводзе.

Шклозавод размяшчаўся ва ўрочышчы Міхалін, былой Косаўскай воласці. Ён быў адкрыты памешчыкам Пуслоўскім у 1845 годзе. Прадукцыя завода — простае і ліставое аконнае шкло — выпускалася ў невялікай колькасці і для яго вытворчасці была толькі адна печ. Паступова прадпрыемства набывала магутнасць. У 1884 годзе меўся ўжо рухавік у дзве конскія сілы і, акрамя адной галоўнай печы, дзейнічалі 16 пабочных. Да 1910 года магутнасць рухавіка была ўжо ў 30 конскіх сіл. Змянілася і прадукцыя. Сталі выпускаць аптэкарскі хімічны посуд.

Колькасць рабочых у розныя гады вагалася ад 100 да 200 чалавек і больш. Шырока прымянялася жаночая і дзіцячая праца. У 1884 годзе з 90 чалавек, якія працавалі на заводзе, было 24 хлопчыкі ва ўзросце да 15 гадоў і 18 жанчын. Большасць рабочых шклозавода — гэта сяляне з навакольных вёсак, але былі і з іншых месц, якія працавалі і раней на прамысловых прадпрыемствах. Жорсткая эксплуатацыя, адсутнасць элементарных умоў для працы і жыцця падымалі рабочых на барацьбу.

У пачатку 1908 года на Міхалінскім шклозаводзе паступова стала ствараццa сацыял-дэмакратычная рабочая група. У сярэдзіне года ў гэтай групе налічвалася каля 30 членаў. Усяго ж на заводзе ў той год працавала 176 чалавек.

Актывісты групы вялі сярод рабочых завода агітацыйна-прапагандысцкую работу. Яны распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, арганізоўвалі маёўкі ў лесе, спявалі рэвалюцыйныя песні, збіралі грошы на мэты партыі. Аднак стварэнне групы не было даведзена да канца. Жандарскія шпікі напалі на след падпольшчыкаў, пачаліся арышты. 28 верасня 1908 года арыштавалі чатырох найбольш актыўных рабочых, а 10 лістапада — яшчэ аднаго арганізатара групы. Пасля гэтых арыштаў узмацніўся нагляд за рабочымі завода, была арганізавана ўнутраная агентура. Неўзабаве яна даведалася, што нелегальная літаратура, якая распаўсюджваецца сярод рабочых, закапана ў лесе.

Да снежня 1908 года расследаванне дзейнасці пяці арыштаваных рабочых было закончана. Міністр унутраных спраў, пазнаёміўшыся з матэрыяламі следства, рашыў: «Выслаць у Валагодскую губерню пад адкрыты нагляд паліцыі: Голуба на тры гады, а астатніх на два гады кожнага, лічачы тэрмін для ўсіх з 30 лістапада 1908 года».

В. Кісялёва.

1917

1941

НА ЗЛОМЕ ЧАСУ

Невымернае гора Івацэвіцкай зямлі і яе людзям прынесла першая сусветная вайна 1914—1918 гг. Лінія фронту ў асноўным праходзіла па Агінскім канале. Першым ударам для дзесяткаў тысяч людзей была эвакуацыя, бежанства ў расійскія губерні. Насельніцтва, а гэта былі ў першую чаргу жанчыны, дзеці і старыя, высялялася прымусова і нярэдка пакідала родныя, абжытыя мясціны ў тым, у чым стаяла. У лепшым выпадку ўдавалася ўзяць з сабою небагатыя пажыткі ці карову.

У зону бедстваў для тых, хто не паспеў ці не захацеў эвакуіравацца, ператваралася прыфрантавая паласа як з аднаго, так і з другога боку фронту. Вёскі выпальваліся, дамы і пабудовы выкарыстоўваліся для земляных умацаванняў. Гаспадарчая дзейнасць спынялася. Ацалелае насельніцтва выкарыстоўвалася як рабочая сіла на абслугоўванне войскаў. На акупіраванай немцамі тэрыторыі ішло бязлітаснае вынішчэнне лясоў і вываз драўніны ў Германію. І расійскія і нямецкія ваенныя ўлады праводзілі масавыя рэквізіцыі ў насельніцтва жывёлы, фуражу, харчовых прадуктаў. Народ быў даведзены да галечы і адчаю.

Спецыфіка франтавой і перадфрантавой паласы, аддаленасць Івацэвіцкага краю ад прамысловых цэнтраў і буйных гарадоў наклала пэўны адбітак на грамадска-палітычнае жыццё людзей. Тут не адбывалася важных рэвалюцыйных зрухаў сярод пасяленцаў. Ваенныя ўлады жорстка распраўляліся з усякім вальнадумствам як сярод салдат, так і сярод мірнага насельніцтва.

Нямецкая акупацыя змянілася польскай інтэрвенцыяй, якая прынесла новыя беды насельніцтву. Тэрор захопнікаў выклікаў жорсткае супраціўленне мясцовага насельніцтва. Пачаўся актыўны партызанскі рух. Партызаны і мірнае насельніцтва аказвалі вялікую дапамогу Чырвонай Арміі ў вызваленні свайго і суседніх раёнаў ад польскіх інтэрвентаў.

Пасля паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай і яе адступлення Івацэвіччына, як і іншыя раёны, апынулася ў складзе Польскай дзяржавы. Пачалася паласа барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне Заходняй Беларусі, якая не спынялася да 17 верасня 1939 г.

Змагары супраць чужынцаў

У гады грамадзянскай вайны на Беларускім Палессі шырыўся партызанскі рух як супраць нямецкіх, так і супраць польскіх акупантаў. Аб падзеях 1919 г. у вёсках Краі, Гутка, Рэчкі расказвае ў сваіх допісах Іван Якаўлевіч Краўцоў, супрацоўнік філіяла Цэнтральнага ваенна-марскога музея «Кранштацкая крэпасць».

Працуючы ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Савецкай Арміі над вывучэннем гісторыі партызанскай вайны ў Беларускім Палессі, аўтар гэтых замалёвак выявіў спіс байцоў партызанскага атрада Целяханскага баявога ўчастка. 1 чэрвеня 1919 г. 91 чалавек быў залічаны ў склад 66-га палка 8-й стралковай дывізіі (штаб палка ў той час знаходзіўся на станцыі Лоўча) і прыняты на харчовае забеспячэнне ў названай харчовай часці. Паўторна імёны ўсіх партызан былі пералічаны ў загадзе ад 5 ліпеня таго ж года, згодна з якім яны здымаліся з харчовага забеспячэння і выключаліся з саставу палка. У абодвух выпадках значылася, што «спіс дадзены ваенным кіраўніком партызанскага атрада тав. Зуевым».

Загады былі рукапіснымі, пісаліся чарнілам, дзесьці падмоклі, таму прозвішчы асобных партызан цяжка прачытаць дакладна. Але даволі часта паўтараюцца аднолькавыя прозвішчы: Канановіч, Калесніковіч, Кот, Лукашэвіч, Домась, Леановіч, Абрамчук, Барсук, Дзягцярык, Пазняк, Мялік, Латышэвіч... Далейшае вывучэнне загадаў па 66-му палку дазволіла выявіць спісы яшчэ двух партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі на Піншчыне ў 1919 г. Гэта «Валішча-Хварасцянскі» і «Каўняціна-Мокрадуброўскі» атрады. У баявых данясеннях камандзіраў рот і батальёнаў палка ёсць шмат паведамленняў аб сумесных дзеяннях чырвонаармейскіх падраздзяленняў і партызан супраць легіянераў Пілсудскага.

На маё пісьмо ў Целяханскі пасялковы Савет адгукнуўся мясцовы краязнаўца Мікалай Якаўлевіч Дзягцярык. «Так, — пісаў ён мне, — названыя ў вашым пісьме партызаны з'яўляюцца ўраджэнцамі нашых месцаў. Некаторыя з іх яшчэ жывыя і пражываюць у вёсках Краі, Гутка, Рэчкі, Горталь і іншых. Вам абавязкова трэба з імі сустрэцца».

Яшчэ да асабістай сустрэчы я наладзіў пісьмовую сувязь з партызанамі 1919 г. Прыйшлі пісьмы з вёскі Краі ад Ілы Яфімавіча Абрамчука, Мікалая Сцяпанавіча Арцюха, Мікалая Зіноўевіча Кананoвіча, Паўла Іванавіча Лукашэвіча, а таксама ад Міхаіла Якаўлевіча Барсука з Гуткі, Мікалая Рыгоравіча Мяліка, Данілы Андрэевіча Лукашэвіча, Яфіма Васільевіча Ката і Васіля Васільевіча Ката з Рэчак, Лукаша Васільевіча Мяліка з г.п. Целяханы.

Да паездкі ў «Рэчкаўскую рэспубліку» я пазнаёміўся з адпаведнай літаратурай. На жаль, нічога не знайшоў аб партызанскай барацьбе на Піншчыне ў 1919—1920 гг. Падумалася: магчыма, у Брэсцкім гісторыка-краязнаўчым музеі ёсць што-небудзь аб патрыятычным руху на Палессі? Знаёмлюся з экспазіцыямі музея. На жаль, нічога не знаходжу аб барацьбе мясцовых патрыётаў супраць польскіх легіянераў. А між тым, забягаючы крыху наперад, скажу, што з лютага па ліпень 1919 г. палескія партызаны толькі сваімі ўласнымі сіламі паспяхова адбівалі ўсе атакі акупантаў на лініі Агінскага канала ад Целяхан да Лагішына. Партызаны ж вёсак Краі, Гутка і Рэчкі на месцы ўтварылі сапраўдную Рэспубліку са сваімі органамі савецкай улады, сваімі кіраўнікамі, сваёй узброенай абаронай.

З Брэста накіроўваюся ў вёску Рэчкі. Там у адзін з ліпеньскіх дзён 1978 г. і адбылася сустрэча ў доме былога партызанскага камандзіра Васіля Міхайлавіча Пазняка з салдатамі 1919 г. Да позняй ночы запісваў успаміны жывых удзельнікаў вайны: В. М. Пазняка, В. В. Ката. М. М. Фядзьковіча, А. М. Шляжкі, Р. А. Ката, Я. В. Ката, Я. А. Ката, Д. А. Латышэвіча, В. Р. Мяліка, М. Р. Мяліка.

У наступныя дні сустрэўся з іншымі ветэранамі партызанскага руху 1919 г., якія пражываюць у вёсках Краі, Гутка, Горталь і ў г.п. Целяханы. Мае субяседнікі дапоўнілі наяўныя архіўныя дакументы і дапамаглі аднавіць у неабходных дэталях гісторыю партызанскай вайны супраць палякаў. На ўскраіне Рудні ў хаце партызана грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў Іосіфа Вікенцьевіча Шляжкі адбылася сустрэча з партызанамі 1919 г., яго аднафамільцамі Сця-

панам Вікенцьевічам, Сцяпанам Васільевічам, Васілём Пятровічам, Іванам Міхайлавічам, Аляксандрам Мікалаевічам і Станіславам Пятровічам, а таксама Сямёнам Сцяпанавічам Канановічам, Іванам Іванавічам Махорам, Максімам Васільевічам, Майсеем Кузьмічом Хомічамі і партызанскай сувязной 1919 г. Алесяй Мікалаеўнай Хоміч, Раманам Максімавічам Махорам.

* * *

Да лютага 1919 г. нямецкія войскі пакінулі населеныя пункты Пінскага павета. Вольна ўздыхнулі сяляне-палешукі і прыступілі да арганізацыі мяцовых органаў улады. А 18 лютага ў аператыўнай зводцы штаба Заходняй арміі паведамлялася: «Кобрынскі напрамак. Польскія легіянеры ў германскай форме ў складзе каля тыс. пяхоты з кулямётамі, 200 кавалерыстаў і браніраваным поездам перайшлі ў наступленне ўздоўж чыгункі Кобрын — Пінск і авалодалі Драгічынам; перадавыя часці праціўніка занялі Іванава; чырвоныя адышлі да Юхнавіч, 25 вёрст на захад ад Пінска».

У аддаленых ад чыгункі мястэчках асобы польскага паходжання пачалі арганізоўваць узброеныя легіёны. Такім шляхам быў арганізаваны атрад легіянераў у м. Целяханы. Ён паставіў перад сабой мэту: захапіць і далучыць да Польшчы навакольныя вёскі з беларускім насельніцтвам. У зборніку дакументаў «Барацьба за савецкую ўладу ў Беларусі» са спасылкай на інфармацыю Неўэнскага радыё (Германія) за 13 лютага 1919 г. сказана, што «... пры з'яўленні польскіх легіянераў беларускія сяляне бяруцца за зброю і ствараюць паўстанцкія атрады» (Мн., 1968. Т. 1. С. 533). Зразумела, што германскае радыё мела на ўвазе шматлікія выпадкі стварэння ў Беларусі патрыятычных партызанскіх атрадаў накшталт таго, які быў створаны ў вёсцы Краі пад камандаваннем М. Р. Мяліка.

Некалькі слоў пра самога партызанскага камандзіра. Нарадзіўся Мікалай Рыгоравіч у маі 1890 года ў вёсцы Рэчкі ў беднай сялянскай сям'і з 9 чалавек. Пасля заканчэння чатырох класаў дапамагаў бацькам у хатняй гаспадарцы. У маі 1916 года яго прызвалі на службу ў царскую армію. Служыў у 64-м Валакаламскім палку на Хадынцы ў Маскве, а потым, пасля кароткага ваеннага абучэння, быў накіраваны на фронт у раён станцыі Залессе пад Смаргонню. Там аднойчы з выступлення пуцілаўскага рабочага на салдацкім мітынгу даведаўся аб звяржэнні самадзяржаўя. Быў накіраваны на пазіцыі па Агінскім канале каля Целяхан. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вярнуўся дамоў. Салдацкае акопнае жыццё, ваенная загартоўка ў хуткім часе спатрэбіліся ў барацьбе з новым ворагам — пілсудчыкамі.

Партызанскі атрад М. Р. Мяліка, у якім налічвалася каля 100 байцоў, быў падзелены на ўзводы. Іх камандзірамі сталі Рыгор Майсеевіч Кананоўіч з вёскі Краі, Васіль Міхайлавіч Пазняк і Міхаіл Васільевіч Крываль (абое з Рэчак), Павел Лявонцьевіч Калесніковіч з вёскі Пучыны.

І. Краўцоў.

За біяграфіямі — лёс краю

АРЦЮХ Дзяніс Сцяпанавіч (1895 — 1970). Нарадзіўся ў в. Краі ў беднай сялянскай сям'і. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Вызначаўся волатаўскай сілай. Удзельнічаў у многіх баях з легіянерамі, абараняючы «Краі-Гутка-Руднянскую рэспубліку», навучаў маладых партызан ваеннай справе, пасылаўся на сувязь з камандаваннем Чырвонай Арміі на станцыю Лоўча і ў Лунінец. У Вялікую Айчынную вайну дапамагаў партызанам.

БАРСУК Васіль Андрэевіч (1900 — 17.3.1988). Нарадзіўся ў в. Гутка. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Разам са сваім бацькам Андрэем Людвікавічам і братам Уладзімірам (памёр у 1961 г.) абараняў у 1919 г. зону «Краі-Гутка-Руднянскай рэспублікі». Удзельнічаў і ў сумесных баях партызан у м. Лагішын і ў в. Валішча ў 1919 г. супраць легіянераў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

БАРСУК Міхаіл Якаўлевіч (10.1.1902 — люты 1990). Нарадзіўся ў в. Гутка ў сям'і батрака, працаваў у памешчыка. Удзельнік грама-

М. М. Вількоўскі.

дзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Разам з партызанамі ў 1919 г. абараняў ад палякаў вёскі Краі і Гутка.

У гады фашысцкай акупацыі быў сувязным партызанскага атрада імя В. У. Куйбышава, удзельнічаў разам з атрадам у вызваленні Целяхан у 1944 г.

ВІЛЬКОЎСКІ Марцін Міхайлавіч (15.3.1897 — 7.8.1978). Нарадзіўся ў в. Пучыны. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Вясной 1919 г. разам са сваімі аднавяскоўцамі Калесніковічам Емяльянам Іванавічам, Ладыгам Антонам Сідаравічам выратаваў чырвонага камандзіра Г. Зуева — арганізатара партызан в. Пучыны. Партызанскае аддзяленне гэтай вёскі хутка ўлілося ў партызанскі атрад Целяханскага баявога ўчастка і ўдзельнічала ва ўсіх баях з легіянерамі каля вёсак Краі, Рудня, Гутка, Валішча, Мокрая Дуброва, мястэчка Лагішын. Пасля адступлення Чырвонай Арміі М. М. Вількоўскі ўступіў у Лунінцы добраахвотнікам у яе рады і быў накіраваны ў Петраград у 42-і фінляндскі полк чыгуначнай аховы...

ГАЛАВАЧ Лазар Пятровіч (1894—1964). Нарадзіўся ў в. Гутка. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Адзін з арганізатараў партызанскага руху, член рэўкома «Краі-Гутка-Руднянскай рэспублікі». Арганізаваў навучанне і ўзбраенне маладых партызан, актыўна ўдзельнічаў у баях супраць акупантаў.

КАНАНОВІЧ Васіль Міхайлавіч (1893—1919). Нарадзіўся ў в. Краі. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Прызваны ў 1914 г., у 1917 трапіў у палон, у 1918 з палону ўцёк. Вярнуўшыся дамоў, арганізоўваў савецкую ўладу, а з узнікненнем пагрозы польскай акупацыі стаў вясной 1919 г. адным з арганізатараў мясцовага партызанскага атрада. Быў выбраны членам рэвалюцыйнага камітэта «Краі-Гутка-Руднянскай рэспублікі», быў адным з камандзіраў партызанскай роты. У жорсткім баі з белапалякамі ва ўрочышчы «Клетка» паблізу в. Краі паранены трапіў у палон да легіянераў, якія па-зверску закатавалі яго (на целе было заўважана 13 штыкавых ран, у дзевяці месцах палосамі была садрана скура з яшчэ жывога). Пахаваны ў в. Краі.

КАНАНОВІЧ Максім Яфімавіч (1892—1944). Нарадзіўся ў в. Краі. Удзельнік першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Член КПСС з 1929 г. Вярнуўся з фронту дамоў летам 1917 г., актыўна дзейнічаў па ўстанаўленні савецкай улады. Адзін з арганізатараў партызанскага атрада Целяханскага баявога ўчастка, член рэўкома «Краі-Гутка-Руднянскай рэспублікі». У рэўкоме займаўся наладжваннем сувязей з часцямі Чырвонай Арміі і Цэнтральнай савецкай уладай Беларусі. Летам 1919 г. разам з часцямі Чырвонай Арміі адыходзіў на ўсход, удзельнічаў у баях з палякамі. Пасля грамадзянскай вайны да 1921 г. служыў у Чырвонай Арміі. Затым працягваў барацьбу супраць панскай Польшчы, некалькі разоў пераходзіў граніцу для арганізацыі на яе тэрыторыі падпольнай барацьбы. У 1935 г. працаваў палітруком вучэбнага пункта Асаавіяхіма Чырвонаслабодскага раёна Мінскай вобласці. Загінуў на фронце ў 1944 г.

З успамінаў дачкі М. Я. Канановіча

...Палякі спалілі наш дом, праследуючы за бацьку, не пакінулі нам ні ежы, ні абутку, ні вопраткі. Трое дзяцей памерлі пасля гэтага, а я і мой старэйшы брат усё гэта здолелі перацярпець і выжыць. Суседзі падтрымалі нас з маці. Туліліся ў зямлянцы пад строгім наглядам. З кожным прыездам паліцыі нас штрафавалі: то плота няма, то комін разваліўся, то ён не пабелены, то няма прыбіральні... Штрафы не было з чаго плаціць, нават лапцей не мелі, і маці наймалася адрабляць за штрафы.

Праз нейкі час бацька паявіўся, але аб гэтым ведала толькі маці. Пры выбарах у сейм ён перадаў ёй бюлетэні, каб раздала іх надзейным людзям і каб яны прагаласавалі за народных выбраннікаў.

Усе рэвалюцыйныя выступленні ў акрузе польскія ўлады прыпісвалі майму бацьку, таму нас пастаянна мучылі і трэслі. Колькі разоў маму заводзілі ў турму, а нас з братам вяртавалі, лічачы, што да нас ноччу прыйдзе бацька. Неяк у Целяханах забілі войта. Маці пасля гэтага тры дні пратрымалі ў турме.

І вось аднойчы ноччу стук у акенца: думалі, паліцыя. З вуліцы голас: «Ганна, адчыні, гэта я — твой муж!» Але асцярожная маці адказала: «Ніякага мужа ў мяне няма ўжо даўно». Ноч была месячная, маці разгледзела, што гэта бацька. Яна выйшла са мною ў сені — тады ў нас была ўжо сякая-такая хата. «Ці ёсць у цябе хлеб?» — спытаў бацька. «З вечара засталася печаная бульба», — адказала маці. Бацька хутка забраў бульбу і сказаў, каб маці заўтра прынесла яму паесці і прывяла з сабою дзяцей. І дадаў: «У нас вельмі важнае заданне, можа, я ўжо больш не ўбачу вас». Ён назваў пароль і сказаў прыйсці ў непраходнае тады ўрочышча Стрэлава.

Назаўтра па адным пайшлі мы ў лес, там я сустрэлася з братам, і абое пайшлі ў назначанае месца, таксама і маці. Калі яна сустрэла патрэбнага чалавека і назвала пароль, ён знік, а потым выйшаў бацька. Абдымкі, пацалункі. Гэта шчаслівае імгненне і дасюль не магу забыць. Я ў бацькі на каленях, ён мяне моцна прыціскаў да сябе, казаў, каб я вучылася ў школе, што ў будучым мы ўсе станем савецкімі людзьмі і павінны быць пісьменнымі.

І зараз я хаджу да таго месца сустрэчы ў Стрэлава, горка плачу. Некаторыя «пілсудчыкі» ў школе мяне заўсёды папракалі бацькам і называлі бальшавіцкім шчанюком. А дарослую мяне ўжо нідзе не прымалі на работу, толькі іншы раз — на лесанарыхтоўкі. Ды і там, калі працавалі дацямна і раптам загукае сава, леснікі і кажуць: «Гэта твой бацька крычыць. Гэты бандыт табе сігнал падае...»

Бацька шмат разоў пераходзіў савецка-польскую граніцу, дастаўляў падпольшчыкам зброю, літаратуру і арганізоўваў людзей на барацьбу з панамі. Цяпер нам зусім не давалі спакою, маці і брата месяцамі трымалі ў турме, мучылі на допытах, а я заставалася адна. Неяк бацька ў апошні раз прыйшоў і сказаў маці: «Калі мяне доўга не будзе, то сходзіш у Бабровічы і спытаеш пра мяне ў Крата Георгія. Ён табе скажа, што са мной, жывы я яшчэ ці ўжо няма ў жывых».

Пазней мы даведаліся, што аднойчы пры пераходзе граніцы ад нас у СССР бацька быў паранены. Пасля ўз'яднання з СССР у 1939 г. ён пісаў у пісьмах, што хутка прыедзе. Але чаканая сустрэча так і не адбылася: грымнула вайна. Бацька загінуў на фронце ў 1944 г. Фашысты таксама помсцілі за бацьку — у 1941 г. спалілі нашу хату як бальшавіцкай сям'і.

Радуе тое, што памяць пра бацьку захоўваецца ў народзе. На тэрыторыі нашага сельсавета стаіць помнік усім загінуўшым у Вялікай Айчыннай вайне, і на ім значацца імёны маіх бацькі, брата і мужа, якія аддалі сваё жыццё за нашу Айчыну. Маці памерла ў 1974 г. Хацелася б, каб наша моладзь ведала гісторыю, вывучыла гераічныя справы бацькоў і дзядоў.

КАНАНОВІЧ Рыгор Майсеевіч (1894—1945). Нарадзіўся ў в. Краі ў сям'і селяніна. Удзельнік першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1915 г. быў прызваны ў царскую армію, ваяваў супраць аўстра-венграў, быў узяты імі ў палон, з якога вярнуўся дамоў у 1918 г. Вясной 1919 г. як былы франтавік актыўна ўдзельнічаў у стварэнні партызанскага атрада Целяханскага баявога ўчастка, стаў камандзірам узвода. Удзельнічаў ва ўсіх баях па абароне ад палякаў «Краі-Гутка-Руднянскай рэспублікі». У час карнай акцыі польскіх улад супраць былых партызан, якая праводзілася ў 1922 г., Р. М. Кананоўіч быў схоплены карнікамі і за аказанае ім супраціўленне збіты да паўсмерці. У гады Вялікай Айчыннай вайны сувязны партызанскага атрада; яго сыны Уладзімір (1922) і Міхаіл (1924) былі партызанамі атрада Баруцкага і 208-га партызанскага палка.

КАЛЕСНІКОВІЧ Дзмітрый Сямёнавіч (1896—1947). Нарадзіўся ў в. Пучыны. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Удзельнічаў у баях з палякамі ў складзе партызанскага атрада Целяханскага баявога ўчастка: быў кулямётчыкам, навучыў кулямётнай справе мясцовых партызан — сваіх землякоў. Летам 1919 г. уступіў у Чырвоную Армію, служыў у Петраградзе — ахоўваў Мурманскую чыгунку. У 1920 г. удзельнічаў у баях супраць палякаў. Удзельнічаючы ў аперацыі савецкіх войскаў Заходняга фронту 1920 г., з баямі

Д. Г. Леановіч.

Дз. В. Лукашэвіч.

Д. А. Латышэвіч.

прайшоў ад Бярэзіны да Варшавы. Пасля грамадзянскай вайны вярнуўся дамоў, працаваў на сельскай гаспадарцы.

Са жніўня па снежань 1919 г. курсант палкавой школы. З канца 1919 г. у Сібіры на ахове і абароне чыгуначных мастоў у раёнах Чэлябінска, Омска, Уфы, Ачынска, вызваленых ад калчакоўскіх войскаў. У 1920 г. накіраваны на Заходні фронт ваяваць супраць палякаў, але ў дарозе захварэў на тыф. Вясною 1920 г. дэмабілізаваны з Чырвонай Арміі па хваробе. Нелегальна перайшоў граніцу з Польшчай, вярнуўся дамоў. У гады вайны 1941—1945 гг. быў партызанскім сувязным.

ЛАТЫШЭВІЧ Даніла Андрэевіч (1897 — 14.10.1981). Нарадзіўся ў в. Рэчкі ў сям'і селяніна. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ваяваў супраць палякаў у мясцовым партызанскім атрадзе, абараняючы «Краі-Гутка-Руднянскую рэспубліку», затым з іншымі партызанамі адыходзіў у складзе Чырвонай Арміі на Лунінец — Мазыр. З 24.7.1919 г. чырвонаармеец 42-га фінляндскага стралковага палка чыгуначнай аховы ў Петраградзе.

ЛЕАНОВІЧ Даніла Герасімавіч (1897—1978). Нарадзіўся ў в. Краі. Удзельнік першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Прызваны ў армію ў 1916 г. Ваяваў у Карпатах, быў там паранены. У 1917 г. вярнуўся дамоў. У 1918 г. быў пагнаны немцамі ў Германію, адкуль у канцы таго ж года вярнуўся. У 1919 г. разам з малодшым братам Мікалаем абараняў ад палякаў родныя мясціны. У 1942—1944 гг. ваяваў у складзе партызанскага атрада імя Баруцкага, быў узнагароджаны медалямі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў лесніком Крайскага лясніцтва Целяханскага лясгаса. У тым жа атрадзе разам з бацькам ваяваў сын Міхаіл, 1925 г. нараджэння.

ЛЕАНОВІЧ Мікалай Герасімавіч (май 1900—22.5.1977). Нарадзіўся ў сям'і селяніна ў в. Краі, скончыў 4 класы сельскай школы. У 1919 г. уступіў у партызанскі атрад Целяханскага баявога ўчастка. Удзельнік баёў з палякамі ў раёне вёсак Краі, Гутка, Рудня. У ліпені 1919 г. з баямі ў саставе адной з часцей Чырвонай Арміі адступіў у Расію. 24 ліпеня 1919 г. залічаны ў 42-і фінляндскі чырвонаармейскі полк, штаб якога размяшчаўся ў Петраградзе. У гады фашысцкай акупацыі — сувязны партызанскага атрада імя Баруцкага. Пасля вайны працаваў у калгасе.

ЛУКАШЭВІЧ Дзмітрый Васільевіч (4.5.1899 — 3.8.1985). Нарадзіўся ў в. Краі ў сям'і бедняка, непісьменны. Удзельнік грамадзянскай вайны. Абараняў ад палякаў вёскі Краі, Гутка, Рэчкі, Дабраслаўка. У в. Пагост уступіў у Чырвоную Армію і быў накіраваны ў Смаленск. Пасля перанесенага захворвання сыпным тыфам восенню 1919 г. вярнуўся дамоў. У пачатку студзеня 1921 г. быў прызваны ў польскую армію, у якой праслужыў 18 месяцаў. З 1940 г. працаваў у леспрамгасе.

ЛУКАШЭВІЧ Павел Іванавіч (1897 — 11.6.1979). Нарадзіўся ў в. Краі. Удзельнік першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У канцы 1917 г. быў інтэрніраваны немцамі разам з іншымі франтавікамі в. Краі (Іосіф Пятровіч Лукашэвіч, браты Мікалай Міхайлавіч і Якаў Міхайлавіч Палячкі) і змешчаны ў лагер ваеннапалонных. Працаваў у каменяломнях. У лістападзе 1918 г. разам з аднавясцоўцамі вярнуўся ў Петраград, а адтуль — у Краі. Вясною 1919 г. уступіў у партызанскі атрад Целяханскага баявога ўчастка, удзельнічаў ва ўсіх баях супраць легіянераў, у тым ліку і ў першым баі, калі загінулі партызаны в. Краі Кананович Васіль Міхайлавіч і Хамушка Кандрат Сямёнавіч.

Удзельнік сумесных баёў Валішча-Хвараснянскага і Мокрадубраўскага партызанскіх атрадаў пад в. Валішча і ў м. Лагішын. У 1922 г. у час карнай акцыі легіянераў быў схоплены карнікамі, жорстка пабіты і пасаджаны ў целяханскі пастарунак. У 1942—1944 гг. дапамагаў партызанам, быў сувязным, у яго хаце амаль пастаянна кватаравалі 7—8 партызан. Яго сын Павел загінуў на р. Одэр у 1945 г. Пасля вайны ўдзельнічаў у аднаўленні гаспадаркі.



М.Р.Мялік.

З успамінаў П. І. Лукашэвіча

З усяго перажытага на ўсё жыццё запомніліся два перыяды гісторыі: Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. на фронце і наша партызанская эпапея ў 1919 г. Многія аматары, апісваючы рэвалюцыйныя падзеі, ідэалізуюць той перыяд, не ведаючы сапраўдных фактаў і прычын таго, што адбылося. Расхвальваецца роля бальшавікоў, рэвалюцыянераў, быццам бы здолеўшых сагітаваць салдат на звяржэнне царызму. Канечне, рэвалюцыйная агітацыя адыграла сваю ролю, наблізіла рэвалюцыю. Але галоўная прычына ў тым, што салдаты за тры гады крывавай бойні зразумелі, што канец ёй і адзінае выратаванне ад пагібелі — звяржэнне манархізму. Толькі такім чынам будзе пакладзены канец тым страшэнным пакутам, якія выпалі на долю народа. Вось чаму на фронце мы з радасцю сустрэлі паведамленне аб адрачэнні цара і перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе. Пайшлі мітынгі, братанне з нямецкімі салдатамі, шчырыя выказванні салдат за мір...

І вось пасля палону я зноў дома. Але тут новая барацьба — на гэты раз супраць легіянераў. Барацьба жорсткая, непрымірымая, калі нават сярод мясцовых жыхароў-палякаў, многія з якіх былі адурманены прапагандай «за вялікую Польшчу» і самі ў атрадах легіянераў ваявалі супраць сваіх аднавяскоўцаў-беларусаў. Так зрабілі многія мясцовыя палякі з Целяхан, Лагішына, іншых вёсак і мястэчкаў. Адчувальнымі былі страты ў партызан і чырвонаармейцаў, забыць імёны якіх недапушчальна. Многія з партызан 1919 г. загінулі не толькі ад рук легіянераў, але і ад бандыцкіх куль пазней. Вось імёны загінуўшых таварышаў, каго яшчэ памятаю:

АНДРЫЕВІЧ Герасім Адамавіч, в. Валішча, загінуў у 1920 г. пры вызваленні Крыма ад урангелеўцаў.

АЎРУСЕВІЧ Сямён Фёдаравіч, в. Валішча, загінуў у час грамадзянскай вайны ў 1919 г.

БУНКЕВІЧ Іван Іванавіч, м. Лагішын, расстраляны легіянерамі ў 1919 г.

ІАЎЛЕЎ Мікалай Маркавіч, м. Лагішын, загінуў у 1919 г. у Петраградзе пры выкананні баявога задання.

ЛАЗЮК Даніла Мікалаевіч, в. Хворасна, камандзір партызанскага ўзвода, закатаваны ў польскай турме ў 1921 г.

ЛАЗЮК Лявон Сцяпанавіч, в. Хворасна, памёр ад тыфу ў 1920 г.

ЛАЗЮК Мацвей Іванавіч, в. Хворасна, загінуў у кастрычніку 1919 г. пры абароне Петраграда ад Юдзеніча.

ЛАЗЮК Павел Мацвеевіч, в. Хворасна, памёр ад тыфу ў 1919 г.

ЛАЗЮК Рыгор Іванавіч, в. Хворасна, закатаваны ў польскай турме ў 1923 г.

ЛАЗЮК Сава Паўлавіч, в. Хворасна, памёр ад тыфу ў 1919 г.

ЛАБАЧЭЎСКІ, м. Лагішын, забіты палякамі ў 1919 г.

ЛАПАЦІН Цімафей Кузьміч, в. Лышча, загінуў на фронце ў Сібіры ў 1919 г.

РАЛІНСКІ Іван Данілавіч, в. Валішча, загінуў у баі з легіянерамі ў 1919 г.

СЯРЭДЗІЧ Аляксандр Іосіфавіч, в. Валішча, загінуў пры ўзяцці Перакопа (Крым) у 1920 г.

ЦЭВАН Мацвей Яфімавіч, в. Валішча, загінуў у 1919 г. на фронце грамадзянскай вайны.

Заўвага. Некаторых з загінуўшых партызан 1919 г. П. І. Лукашэвіч змог успомніць толькі па імёнах, але назваў іх блізкіх і сваякоў. Па гэтых звестках аўтару радкоў удалося высветліць астатняе. Дапамог і спіс партызан 1919 г., які захаваўся ў РДВА (Расійскі дзяржаўны ваенны архіў).

МЯЛІК Мікалай Рыгоравіч (май 1900 — 15.3.1983). Нарадзіўся ў в. Рэчкі ў сям'і селяніна-беднякa, скончыў 4 класы сельскай школы. Удзельнік першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. застала яго пад Смар-

гонню, каля станцыі Залессе. Затым быў накіраваны на фронт пад Целяханы ў палявую батарэю, якая размяшчалася ў в. Горталь. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся дамоў, у занятыя немцамі Рэчкі.

У лістападзе — снежні 1918 г. адыходзячых немцаў сталі замяняць легіянеры з мясцовых польскіх шляхціцаў. 13 лютага 1919 г. легіянеры з Целяхан зрабілі налёт на в. Краі, забілі сялянку Лукашэвіч Варвару Васільеўну, пачалі рабаваць жыхароў вёскі. Даведаўшыся аб гэтым ад верхавога, які прыбыў у в. Рэчкі з в. Краі, Мялік і іншыя былыя франтавікі (15 чалавек) са зброяй паспяшаліся пазмагацца з «пілсудчыкамі». На дапамогу былым франтавікам прыбылі таксама атрады партызан з вёсак Рудня і Пучыны. Партызаны сустрэлі ворага агнём на выездзе з в. Краі. Рабаўнікі атрымалі належны адпор, кінулі нарабаванае і са стратамі ўцяклі ў Целяханы.

З успамінаў М. Р. Мяліка

... Мы пераканаліся, што ў асобе легіянераў мы набылі вельмі каварных, бязлітасных і нябачных раней заваёўнікаў і душыцеляў народа, якія не спыняюцца ні перад якімі зверствамі і здзекамі.

Такая абстаноўка прадыктавала неабходнасць стварэння партызанскага атрада. Неяк так атрымалася, што ў першым нашым баі з легіянерамі я аддаваў баявыя распараджэнні сваім узброеным аднавяскоўцам, праявіў уласную ініцыятыву. Таму пры выбары камандзіра атрада назвалі маё прозвішча. Так я стаў камандзірам атрада, падзеленага на ўзводы. Кожным узводам, які складаўся ў асноўным з партызан адной вёскі, камандавалі: в. Краі — Кананоўіч Рыгор Майсеевіч, в. Пучыны — Калесніковіч Павел Лявонцьевіч і Калесніковіч Павел Іванавіч, в. Рудня — Шляжка Сцяпан Вікенцьевіч, в. Рэчкі — Пазняк Васіль Міхайлавіч і Гарбачоў Міхаіл. Камандзірамі аддзяленняў сталі: з в. Краі — Кананоўіч Максім Васільевіч, з в. Вулька-Целяханская — Мялік Лука Васільевіч, з в. Пучыны — Калесніковіч Іпаліт Ніканавіч і Вількоўскі Яўстафій Адамавіч, яшчэ з в. Краі — Лукашэвіч Іосіф Пятровіч і Арцюх Андрэй Максімавіч і іншыя. Даведаўшыся аб паяўленні часцей Чырвонай Арміі, я паслаў разведчыка на станцыю Лоўча-2, а пазней і цэлую партызанскую дэлегацыю на станцыю Малькавічы. Камандзір 66-га палка былы палкоўнік Міхайлаў уніклуў у наша становішча і прыслаў на дапамогу ў наш атрад інструктараў Зуева, Крутава, Макарава, Тарасава з групай кулямётчыкаў, тэлефаністаў, кавалерыстаў, сувязістаў — не менш за 30 чалавек. На другі дзень у Гутку прыбыў камісар 66-га сп Баклееў, які прапанаваў выбраць камандзіра атрада. «А ў нас ужо ёсць камандзір, — хорам адказалі партызаны. — Гэта наш франтавік Мялік Мікалай». Так я і камандаваннем Чырвонай Арміі быў зацверджаны камандзірам атрада Целяханскага баявога ўчастка.

Мы прадумалі і ажыццявілі неабходныя меры па абароне сваёй партызанскай рэспублікі. Былі падноўлены і заняты старыя акопы, якія праходзілі адразу за в. Краі ў бок Целяхан. У акопах, а таксама ў маёнтку Буды, ва ўрочышчы Клеткі і іншых небяспечных месцах кругласутачна дзяжурылі пасты і заставы партызан. У склад выбранага народам рэўкома нашай «Краі-Гутка-Рэчкаўскай рэспублікі» ўвайшлі Галавач Лазар Пятровіч, Кананоўіч Максім Яфімавіч, Кананоўіч Васіль Міхайлавіч, Крываль Міхаіл Васільевіч, Арцюх Міхаіл Сцяпанавіч, Лукашэвіч Іосіф Пятровіч, Кананоўіч Рыгор Майсеевіч.

... У чэрвені 1919 г. палякі канчаткова вырашылі расправіцца з партызанамі, накапіўшы сілы, пацяснілі слабыя часці Чырвонай Арміі на Палессі. Аб вялікім наступленні на партызан, якое рыхтавалі легіянеры, нам своечасова паведамілі дзяўчаты-сувязісткі, якія прыбеглі ў Краі з Целяхан. Мы адышлі да в. Дабраслаўка. Там адбыўся бой з палякамі. Мы адступілі ў в. Пагост, адтуль у Лоўчу. І вось тут па загадзе 66-га сп партызан майго атрада паставілі на забеспячэнне ў палку. Шмат якія партызаны дабравольцамі ўступілі ў 66-ы полк і працягвалі змагацца, большасць жа маіх землякоў пажадала перабрацца дамоў да сваіх сем'яў, каб працягваць барацьбу супраць акупантаў у сябе падпольна. Я застаўся з другімі партызанамі ў палку і быў назначаны наводчыкам першай гарматы на браняпоездзе...

ХАЛАДОВІЧ Дзмітрый Іванавіч (5.12.1879 — 31.12.1964). Нарадзіўся ў в. Гутка ў сям'і бедняка, непісьменны. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі вярнуў-

ся дамоў. Вясной 1919 г. уключыўся ў партызанскую барацьбу супраць палякаў у складзе атрада Целяханскага баявога ўчастка. Разам з партызанамі ўдзельнічаў у баях за вёскі Краі, Гутка, Рэчкі, а таксама каля Валішча і Хворасна. У 1920 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію, ваяваў супраць палякаў, дайшоў да Вісты і Варшавы. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі сям'я Д. І. Халадовіча была партызанскай. Сын Іван, 1922 г. нараджэння, — інвалід вайны. Сын Максім, 1925 г. нараджэння, загінуў пры вызваленні ад фашыстаў Лагішына. Партызаны атрымлівалі ў гэтай сям'і выпечаны хлеб, начлег, іншую дапамогу. Пасля вайны Д. І. Халадовіч займаўся аднаўленнем гаспадаркі, карыстаўся заслужаным аўтарытэтам.

ХАМУШКА Кандрат Сямёнавіч (? — 1919). Нарадзіўся ў в. Краі. Партызан атрада Целяханскага баявога ўчастка, адзін з арганізатараў партызанскага руху ў сваёй мясцовасці супраць палякаў. У час наступлення акупантаў на в. Краі ва ўрочышчы Клетка сумесна з В. М. Канановічам уступіў у няроўны бой. Паранены трапіў у палон і быў закатаваны легіянерамі. Пахаваны ў в. Краі.

ХОМІЧ Майсей Кузьміч (25.10.1899 — 21.8.1986). Нарадзіўся ў в. Рудня, скончыў 4 класы сельскай школы. Удзельнік грамадзянскай вайны і кампаніі 1939 г. па абароне Польшчы ад фашыстаў. У 1919 г. удзельнічаў у барацьбе супраць палякаў, абараняючы вёскі Краі, Гутка, Рудня і ў іншых баях, выконваў баявыя заданні чырвоных камандзіраў-інструктараў партызан Крутава і Зуева. Пасля акупацыі мясцовасці палякамі прызваны ў 1920 г. у польскую армію; адслужыў у ёй два гады. З нападзеннем фашыстаў на Польшчу прызваны другі раз. 14.9.1939 г. трапіў у палон да немцаў. Вызвалены з палону савецкімі войскамі ва Усходняй Прусіі. Служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе «Перамога» («Рассвет»).

Заўвага. У ліку партызан, што змагаліся ў 1919 г., былі і іншыя члены яго сям'і: бацька, Хоміч Кузьма Дзмітрыевіч (1871—1935), і брат, Хоміч Мікалай Кузьміч (1902—1968).

ХОМІЧ Максім Васільевіч (31.12.1895 — 22.2.1976). Нарадзіўся ў в. Рудня, скончыў 2 класы сельскай школы. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У лютым 1919 г. стаў партызанам. Па заданні чырвоных інструктараў Зуева і Крутава навучаў маладых партызан-дабравольцаў валоданню зброяй і правілам вядзення бою, удзельнічаў у баях з палякамі каля в. Краі, маёнтка Буда, каля в. Рэчкі і інш. З прыходам польскіх акупантаў працяглы час, да аб'яўлення амністыі, хаваўся з іншымі былымі партызанамі ў лесе. У час вайны 1941—1945 гг. дапамагаў партызанам. Партызанамі былі, а затым ваявалі на фронце тры яго сыны: Сцяпан — 1921 г., Васіль — 1923 г. і Мікалай — 1924 г. нараджэння. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў у калгасе.

А. І. Шабацька.

П. М. Шабацька.

ШАБАЦЬКА Аляксей Ігнатавіч (1900 — 21.4.1957). Нарадзіўся ў в. Краі. У складзе партызанскага атрада Целяханскага баявога ўчастка, абараняў ад палякаў зону «Краі-Гутка-Руднянскай рэспублікі» ў 1919 г. Актыўна змагаўся як падпольшчык супраць панскай Польшчы. 1 мая 1927 г. арыштаваны за прыналежнасць да КПЗБ, прыгавораны да пяці гадоў турэмнага зняволення. З турмы выйшаў 13 лістапада 1931 г. і да 1939 г. лічыўся палітычна ненадзейным, праследаваўся дэфензівай, падвяргаўся збіванню, што прывяло да падрыву здароўя. Дапамагаў аднавяскоўцам у наладжванні пасляваеннага жыцця ў сваёй мясцовасці.

ШАБАЦЬКА Піліп Міхайлавіч (24.11.1904 — 14.12.1989). Нарадзіўся ў в. Гутка, адукацыю атрымаць не ўдалося. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Вясною 1919 г. уступіў у партызанскі атрад, удзельнічаў у баях, дастаўляў боепрыпасы партызанам. З верасня 1942 г. да 16.7.1944 г. сувязны партызанскага атрада імя Молатава (камандзір А. П. Чарткоў), узнагароджаны

медалямі «Партызану Айчыннай вайны 2-й ступені» і інш.

ШЛЯЖКА Міхаіл Іванавіч (? — 1942). Нарадзіўся ў в. Рудня. Партызан атрада Целяханскага баявога ўчастка. У 1919 г., будучы ў партызанах, забяспечваў сувязь партызанаў з камандаваннем Чырвонай Арміі, штабам 66-га стралковага палка, які размяшчаўся на станцыі Лобча, выконваў заданні ваенрука партызанскага атрада Г. Зуева, прысланага ад камандавання Чырвонай Арміі. Пасля грамадзянскай вайны працаваў на сельскай гаспадарцы. Удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Схоплены фашыстамі і расстраляны ў 1942 г.

ШЛЯЖКА Якаў Вікенцьевіч (1898 — 1975). Нарадзіўся ў в. Рудня. Удзельнік грамадзянскай вайны. У складзе партызанскага атрада Целяханскага баявога ўчастка ваяваў супраць войскаў панскай Польшчы. Пасля баёў каля Лагішына і Дабраслаўкі разам з іншымі партызанамі адышоў да Лунінца, дзе добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію. У ліпені 1919 г. адбіваў напор войскаў панскай Польшчы каля Турава і пад Давыд-Гарадком, удзельнічаў у наступленні на Мінск (1920). У баях кантужаны. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі ў 1921 г. вярнуўся дамоў. З братам Іосіфам вымушаны быў хавацца ад праследаванняў польскіх карнікаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны дапамагаў партызанам.

Спіс партызан Целяханскага баявога ўчастка, пастаўленых на забеспячэнне ў 66-м палку 8-й стралковай дывізіі 15.6.1919 г.*

АБРАМЧУК Адам, в. Краі.

АБРАМЧУК Алесь Васільевіч, в. Краі.

АБРАМЧУК Антон Васільевіч, в. Краі; у 1943 партызан, памёр ад ран.

АБРАМЧУК Іван Дзям'янавіч, в. Горталь, з ліпеня 1919 у РСЧА, потым жыў на радзіме, праследаваўся польскімі ўладамі.

АБРАМЧУК Зіновій Дзям'янавіч, в. Горталь, з ліпеня 1919 у РСЧА, у 1939 — лейтэнант.

АБРАМЧУК Ілья Яфімавіч, н. у 1900, в. Краі, у Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны.

АЛЁХ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1900, в. Краі.

АЛЁХ Сцяпан Якаўлевіч, в. Краі, франтавік, загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

АРЦЮХ Андрэй Максімавіч, в. Краі, камандзір аддзялення партызан.

АРЦЮХ Дзяніс Сцяпанавіч.

АРЦЮХ Ілья Іванавіч, в. Краі (1883 — 1920), у 1919 член партызанскага рэўкома.

АРЦЮХ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1900, в. Краі, у Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскага атрада.

АРЦЮХ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1891, в. Краі, франтавік, у 1919 член партызанскага рэўкома, асуджаны да 3 гадоў турмы пры Польшчы, у Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны.

БАГДАНОВІЧ Карп Мікітавіч, н. у 1902, в. Горталь.

БАГДАНОВІЧ Сяргей Міхайлавіч, в. Горталь, з ліпеня 1919 нач. каманды разведчыкаў 66 сп.

БАНДАРЧУК Аляксей Станіслававіч, в. Горталь, у 1919 схоплены і забіты палякамі.

БАРСУК Андрэй Людвікавіч, в. Гутка.

БАРСУК Васіль Андрэевіч.

БАРСУК Марта Пятроўна, в. Гутка, у 1919 была паранена ў баі з легіянерамі.

БАРСУК Марцэля Пятроўна, в. Гутка.

БАРСУК Мікалай Васільевіч, в. Гутка.

БАРСУК Міхаіл Якаўлевіч.

БАРСУК Уладзімір Андрэевіч, в. Гутка.

ВАЙЗУКЕВІЧ (Гайцюкевіч) Пётр, в. Турная.

ВАСІЛЬЕЎ Фёдар.

ВІЛЬКОЎСКІ Астап Яўстафіевіч, в. Гутка.

ВІЛЬКОЎСКІ Дзіянісій Міхайлавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

ВІЛЬКОЎСКІ Марцін Міхайлавіч.

ВІШНЕЎСКІ Цімафей, в. Рэчкі.

ГАЛАВАЧ Лазар Пятровіч.

ГАЛАВАЧ Пётр Емяльянавіч, в. Пучыны (1894 — 1951), франтавік.

ГАРБАЧОЎ Міхаіл, в. Рэчкі, у 1919 камандзір партызанскага ўзвода.

ДЗЕМ'ЯНЧУК Міхаіл Якаўлевіч, в. Горталь.

ДЗЯГЦЯРЫК Аляксей Савіч, н. у 1900, в. Гутка.

ДОМАСЬ Васіль Міхайлавіч, в. Рэчкі, франтавік, са жніўня 1919 у 42 пча, потым у 15-й Мурманскай стралковай брыгадзе.

ДОМАСЬ Дзмітрый Міхайлавіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча, потым у 15-й Мурманскай стралковай брыгадзе, з 1921 — дома.

ДОМАСЬ Іван Антонавіч, в. Рудня, са жніўня 1919 у 42 пча, з 1921 — дома.

ДОМАСЬ Павел Андрэевіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча.

---

* Складзены паводле матэрыялаў РДВА. Ф. 3229. Воп. 1. спр. 83. Л. 118; Ф. 18 788. Воп. 1. Спр. 7. Л. 30, 36.

ДОМАСЬ Павел Пятровіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча, франтавік.

ДОМАСЬ Рыгор Міхайлавіч, в. Рэчкі, франтавік, са жніўня 1919 у 42 пча.

ДОМАСЬ Сцяпан Мікалаевіч, в. Рудня, са жніўня 1919 у 42 пча, у 1940 дэпутат Савета, расстраляны немцамі ў 1942.

ДОМАСЬ Якаў Аўгусцінавіч, н. у 1899, в. Рудня.

ЕРМАКОВІЧ Антон Пракопавіч, н. у 1900, в. Гутка, са жніўня 1919 на бронецягніку 66 сп 8 сд, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЕРМАКОВІЧ Іван Трафімавіч, в. Краі, са жніўня 1919 у 42 пча.

ЗІНЕВІЧ Аляксей Адамавіч, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЗЛОЎСКІ Васіль Пятровіч, в. Рэчкі.

КАЗЛОЎСКІ Піліп Пятровіч, н. у 1902, в. Рэчкі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Андрэй Данілавіч, в. Ліпнікі, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Антон Іванавіч, в. Пучыны (1885—1951), франтавік.

КАЛЕСНІКОВІЧ Ануфрый Андрэевіч, в. Ліпнікі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Афанасій Васільевіч, в. Ліпнікі, з ліпеня 1919 у РСЧА, прапаў без вестак.

КАЛЕСНІКОВІЧ Афанасій П., в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Дзіянісій Паўлавіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Дзмітрый Сямёнавіч.

КАЛЕСНІКОВІЧ Емяльян Антонавіч, в. Пучыны (1880—1920), франтавік.

КАЛЕСНІКОВІЧ Емяльян Іванавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча, памёр у Петраградзе.

КАЛЕСНІКОВІЧ Емяльян Пятровіч, в. Ліпнікі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Іван, в. Ліпнікі, у 1919 забіты ў баі з палякамі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Іван Антонавіч, в. Пучыны (1885—1941), франтавік.

КАЛЕСНІКОВІЧ Іван Васільевіч, в. Пучыны, памёр у 1943.

КАЛЕСНІКОВІЧ Ігнат Пятровіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Ігнат Яфімавіч, в. Краі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Іпаліт Ніканавіч, н. у 1898, камандзір узвода партызан у 1919, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Кандрат Васільевіч, в. Ліпнікі, забіты ў баі каля в. Краі ў 1919.

КАЛЕСНІКОВІЧ Кандрат Мікалаевіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Канстанцін Антонавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Касьян Антонавіч, в. Пучыны, забіты бандытамі ў 1948.

КАЛЕСНІКОВІЧ Кірыл Іванавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча, памёр у Петраградзе.



М. С. Арцюх.

КАЛЕСНІКОВІЧ Лаўрэнцій Яфімавіч, в. Ліпнікі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Майсей Трафімавіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Максім Яфімавіч, в. Краі, у 1919 член партызанскага рэўкома.

КАЛЕСНІКОВІЧ Мікіта Майсеевіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Мірон Антонавіч, в. Рудня, у 1919 быў паранены.

КАЛЕСНІКОВІЧ Міхаіл Антонавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 на бронецягніку 8 сд.

КАЛЕСНІКОВІЧ Павел Іванавіч, в. Пучыны, франтавік, камандзір узвода ў 1919.

КАЛЕСНІКОВІЧ Павел Лявонцьевіч, в. Пучыны, франтавік, камандзір узвода партызан у 1919.

КАЛЕСНІКОВІЧ Пётр Герасімавіч, в. Пучыны (1898—1976), са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Піліп Рыгоравіч, н. у 1895, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Пракоп Сямёнавіч, в. Пучыны, у ліпені 1918 старшыня Савета в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Радзівон Антонавіч, в. Пучыны, камандзір узвода партызан 1919, з ліпеня 1919 у РСЧА, памёр у 1973.

КАЛЕСНІКОВІЧ Радзівон Рыгоравіч, в. Пучыны, у 1919 быў паранены ў баі з палякамі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Рыгор Антонавіч, в. Рудня.

КАЛЕСНІКОВІЧ Рыгор Іванавіч, в. Пучыны, з ліпеня 1919 у РСЧА, курсант школы 42 пча, прапаў без вестак.

КАЛЕСНІКОВІЧ Рыгор Піліпавіч, в. Пучыны, франтавік, са жніўня 1919 на бронецягніку 8 сд.

КАЛЕСНІКОВІЧ Сільвестр Ігнатавіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Сцяпан Ніканавіч, н. у 1900, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Сямён Рыгоравіч, в. Пучыны, памёр у 1937, з ліпеня 1919 у РСЧА, у школе 42 пча.

КАЛЕСНІКОВІЧ Сяргей Сцяпанавіч, в. Краі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Фёдар Якаўлевіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Харытон Антонавіч, н. у 1903, в. Пучыны, са жніўня 1919 у РСЧА.

М. З. Кананоўіч.

М. А. Кот.

Я. А. Кот.

Я. В. Кот.

КАЛЕСНІКОВІЧ Ціхан Іванавіч, в. Пучыны.

КАЛЕСНІКОВІЧ Цярэнцій Іванавіч, в. Ліпнікі.

КАЛЕСНІКОВІЧ Цярэнцій Мікітавіч, в. Пучыны, франтавік.

КАЛЕСНІКОВІЧ Якаў Ігнатавіч, в. Пучыны, франтавік.

КАЛЕСНІКОВІЧ Яфім Данілавіч, в. Ліпнікі, памёр у 1926.

КАНАНОВІЧ Агей Пятровіч, в. Рудня, н. у 1899, са жніўня 1919 у 42 пча.

КАНАНОВІЧ Васіль Іванавіч, в. Краі, забіты ў 1919 у баі з палякамі.

КАНАНОВІЧ Васіль Міхайлавіч.

КАНАНОВІЧ Дзіянісій Андрэевіч, в. Рэчкі, франтавік.

КАНАНОВІЧ Максім Яфімавіч.

КАНАНОВІЧ Мікалай Зіноўевіч, н. у 1899, в. Краі.

КАНАНОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, в. Краі, н. у 1902, са жніўня 1919 у 42 пча, у Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны.

КАНАНОВІЧ Мікалай Піліпавіч, в. Краі.

КАНАНОВІЧ Рыгор Майсеевіч.

КАНАНОВІЧ Сцяпан Трафімавіч, в. Краі.

КАНАНОВІЧ Сямён Сцяпанавіч, в. Краі.

КАНАНОВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, в. Краі.

КАНАНОВІЧ Усцін Майсеевіч (Вікенцьевіч), н. у 1900, в. Краі.

КАНАНОВІЧ Якаў Андрэевіч, в. Рэчкі, франтавік.

КАРЖАНОВІЧ Лазар Ільіч, в. Краі.

КАЦЭБА Іван В.

КЛІМАВЕЦ Андрэй Сцяпанавіч, в. Проскіні, у 1919 быў паранены каля в. Пучыны.

КЛІМЧУК Пётр, в. Гутка, у 1919 забіты пры нападзе легіянераў.

КОЗЕЛ Дзмітрый Данілавіч, в. Доўгае, са жніўня 1919 у 42 пча.

КОРЗУН Карней Паўлавіч, в. Ліпнікі (в. Лышча), са жніўня 1919 у 42 пча.

КОРЗУН Мікалай.

КОТ Аляксандр Лукашавіч, в. Рэчкі.

КОТ Андрэй Сцяпанавіч, в. Рэчкі, франтавік.

КОТ Васіль Васільевіч, в. Рэчкі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КОТ Васіль Міхайлавіч, в. Рэчкі.

КОТ Іван Сямёнавіч, в. Рудня.

КОТ Ігнат Іванавіч, в. Рудня (1900—1963).

КОТ Ілья Васільевіч, в. Рэчкі.

КОТ Іосіф Рыгоравіч, в. Рэчкі.

КОТ Мікалай Аўксенцьевіч, н. у 1899, в. Гутка, у Вялікую Айчынную вайну сувязны партызан.

КОТ Мікалай Тамашавіч, в. Рэчкі, франтавік.

КОТ Мікалай Фаміч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча.

КОТ Міхаіл Тамашавіч, в. Рэчкі, франтавік.

КОТ Павел Станіслававіч, в. Рудня.

КОТ Павел Сцяпанавіч, в. Рэчкі.

КОТ Павел Уладзіміравіч, в. Рудня, памёр у 1978.

КОТ Піліп Пятровіч, в. Рэчкі, франтавік.

КОТ Рыгор Андрэевіч, н. у 1895, в. Рэчкі, франтавік.

КОТ Рыгор Васільевіч, в. Рэчкі.

КОТ Стафан Андрэевіч, н. у 1900, в. Рэчкі.

КОТ Сямён Сцяпанавіч, в. Рэчкі, франтавік, са жніўня 1919 у 42 пча.

КОТ Трафім Тамашавіч, в. Рэчкі.

КОТ Якаў Аўксенцьевіч, н. у 1894, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча, партызан Вялікай Айчыннай вайны.

КОТ Якаў Канстанцінавіч, в. Рэчкі.

КОТ Якаў Сцяпанавіч, в. Рэчкі, франтавік.

КОТ Яфім Васільевіч, н. у 1895, в. Рэчкі, франтавік, праследаваўся польскімі ўладамі як падпольшчык, у 1939—1940 сакратар Рэчкаўскага с/с, у Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны.

КРУГЛЕНЯ Рыгор Рыгоравіч, в. Гутка, забіты ў 1919 палякамі ў Целяханах.

КРЫВАЛЬ Антон Рыгоравіч, в. Гутка.

КРЫВАЛЬ Кірыл, в. Гутка, забіты ў 1919 пры нападзе легіянераў.

КРЫВАЛЬ Лука Іванавіч, в. Краі.

КРЫВАЛЬ Мікалай Васільевіч, в. Краі.

КРЫВАЛЬ Міхаіл Васільевіч, в. Рэчкі, у 1919 член партызанскага рэўкома.

КРЫВАЛЬ Навум Рыгоравіч, в. Гутка.

КРЫВАЛЬ Уладзімір Кірылавіч, н. у 1896, в. Гутка, франтавік, расстраляны ў 1941 немцамі.

КРЫВАЛЬ Якаў Васільевіч, в. Гутка.

КРЫВЕЦКІ Лука Якаўлевіч, в. Горталь, са жніўня 1919 у 42 пча, памёр ад тыфу ў 1921.

КРЫВЕЦКІ Тахвіла Іванавіч, в. Рудня-Целяханская, н. у 1896, франтавік.

КРЫВЕЦКІ Уладзімір Майсеевіч, в. Горталь, з ліпеня 1919 у 66 сп 8 сд.

КРЫВЕЦКІ Феафіл Іванавіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча.

КРЫВЕЦКІ Фёдар Рыгоравіч, в. Горталь, расстраляны палякамі ў 1919.

КУЛЕШ Мікалай Кузьміч, в. Дабраслаўка.

КУНІЦКІ Ціхан Іванавіч, в.Ліпнікі.

КУРАТНІК Юрый Іосіфавіч, н. у 1900, в. Краі.

КУРАТНІК Фёдар Данілавіч, в. Краі.

ЛАДЫГА Антон Сідаравіч, в. Пучыны, памёр у 1976.

ЛАДЫГА Герасім Іванавіч, в. Пучыны.

ЛАДЫГА Дзяніс Майсеевіч, н. у 1901, в. Пучыны.

ЛАДЫГА Захар М., в. Пучыны.

ЛАДЫГА Майсей Мікалаевіч, в. Пучыны.

ЛАДЫГА Мікалай Францавіч, в. Пучыны.

ЛАДЫГА Мікіта Майсеевіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча, памёр ад тыфу на зброевым заводзе за Уралам.

ЛАДЫГА Міхаіл Данілавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча, у Вялікую Айчынную вайну загінуў у партызанах.

ЛАДЫГА Трафім Кірылавіч, в. Пучыны, у 1920 памёр ад тыфу.

ЛАДЫГА Піліп Іванавіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

ЛАДЫГА Піліп Якаўлевіч, в. Пучыны, са жніўня 1919 у 42 пча.

ЛАНЕЦКІ, в. Рэчкі, з 1920 жыў у Польшчы.

ЛАТЫШЭВІЧ Васіль Іосіфавіч, в. Рэчкі.

ЛАТЫШЭВІЧ Даніла Андрэевіч.

ЛАТЫШЭВІЧ Дзіянісій Якаўлевіч, в. Рэчкі.

ЛАТЫШЭВІЧ Дзмітрый, в. Рэчкі.

ЛАТЫШЭВІЧ Ігнат Восіпавіч, в. Рэчкі, франтавік, са жніўня 1919 у 42 пча.

ЛАТЫШЭВІЧ Ігнат Якаўлевіч, в. Рэчкі.

ЛАТЫШЭВІЧ Міхаіл Антонавіч, в. Рэчкі, франтавік, з ліпеня 1919 на бронецягніку 8 сд.

ЛАТЫШЭВІЧ Рыгор Якаўлевіч, н. у 1899, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча, курсант палкавой школы.

ЛЕАНОВІЧ Антон Васільевіч, в. Краі, франтавік.

ЛЕАНОВІЧ Даніла Герасімавіч.

ЛЕАНОВІЧ Мікалай Герасімавіч.

ЛЕАНОВІЧ Якаў Міхайлавіч, в. Краі.

ЛІНКЕВІЧ Іван Станіслававіч, в. Пучыны, памёр у 1944, са жніўня 1919 у 42 пча, з 1922 — дома.

ЛУКАШЭВІЧ Варвара Васільеўна, в. Краі, забіта ў 1919 пры нападзе легіянераў.

ЛУКАШЭВІЧ Дзмітрый Васільевіч.

ЛУКАШЭВІЧ Іосіф Пятровіч, в. Краі, асуджаны ў Польшчы да 4 гадоў турмы, памёр у 1945, у 1919 член партызанскага рэўкома, у 1939—1940 дэпутат Савета, у Вялікую Айчынную вайну — партызан.

ЛУКАШЭВІЧ Павел Іванавіч.

ЛЯХ Сцяпан Кандратавіч, в. Краі.

ЛЯХ Юрый Мікітавіч, в. Краі.

ЛЯХ Яфім Мікітавіч, в. Краі.

МІНОХ Мікалай, в. Рэчкі.

МІСЮРА Мікалай Канстанцінавіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча, з 1921 — дома.

МІСЮРА Мікалай Пятровіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча, прапаў без вестак.

МІХАЛЕВІЧ Кандрат Каленікавіч, в. Ліпнікі (1893—1962), франтавік.

МОХАР Емяльян Андрэевіч, в. Рудня.

МОХАР Іван Іванавіч, н. у 1901, в. Рудня.

МОХАР Пётр Максімавіч, в. Рудня, у 1920-я падпольшчык, у Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны.

МОХАР Радзівон Андрэевіч, в. Рудня.

МОХАР Раман Максімавіч, н. у 1901, в. Рудня.

МОХАР Сцяпан Максімавіч, в. Рудня.

МЯЛІК Васіль Рыгоравіч, в. Рэчкі, у 1919 паранены ў баі з палякамі.

МЯЛІК Лука Васільевіч, н. у 1895, в. Вулька Целяханская, франтавік, у 1923 у пінскай турме, чл. КПЗБ з 1926, падпольшчык, у Вялікую Айчынную вайну — партызан.

МЯЛІК Мікалай Рыгоравіч.

НАВУМОВІЧ Канстанцін Іванавіч, в. Рудня.

НАВУМЧЫК Сямён Ульянавіч, н. у 1902, в. Рудня.

ПАЗНЯК Васіль Мікалаевіч, в. Краі.

ПАЗНЯК Васіль Міхайлавіч, н. у 1888, в. Рэчкі, франтавік, камандзір узвода партызан у 1919.

ПАЗНЯК Кандрат Мікалаевіч, н. у 1900, в. Краі, у 1919 паранены ў баі з палякамі.

ПАЗНЯК Міхаіл Паўлавіч, в. Рэчкі.

ПАЗНЯК Павел Міхайлавіч, в. Рэчкі (1897—1976), франтавік, з ліпеня 1919 у РСЧА.

ПАЗНЯК Рыгор Міхайлавіч, н. у 1900, в. Краі.

ПАЛЯЧОК Васіль Максімавіч, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча.

ПАЛЯЧОК Васіль Міхайлавіч, в. Краі, са жніўня 1919 у 42 пча.

ПАЛЯЧОК Мікалай Міхайлавіч, в. Краі, франтавік, камандзір узвода ў 1919.

ПАЛЯЧОК Сцяпан Андрэевіч, н. у 1893, в. Краі.

ПАЛЯЧОК Сямён Мікалаевіч, н. у 1902, в. Краі.

ПАЛЯЧОК Якаў Міхайлавіч, в. Краі, франтавік.

ПАЎЛОВІЧ Іван Ульянавіч, н. у 1899, в. Рудня.

ПАЎЛОВІЧ Мартын Мікалаевіч, в. Рудня, у 1939—1940 дэпутат Савета, у 1942 расстраляны немцамі.

ПЕРАХОДЗЬКА Марк Андрэевіч, в. Рудня, у 1942 расстраляны немцамі.

Р. І. Струнеўскі.

С. В. Шляжка.

ПУЗАЧ Міхаіл, в. Рэчкі, са жніўня 1919 у 42 пча.

РЭДЗЬКА Васіль Аляксеевіч, н. у 1900, в. Краі.

РЭДЗЬКА Ілья Максімавіч, в. Краі.

РЭДЗЬКА Мікалай Дзмітрыевіч, в. Рудня, забіты ў Вялікую Айчынную вайну.

РЭДЗЬКА Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1894, в. Краі, франтавік.

РЭДЗЬКА Сцяпан Максімавіч, в. Краі.

СТАСЬКЕВІЧ Андрэй, в. Рэчкі, у 1922 жорстка збіты карнікамі.

СТАСЬКЕВІЧ Іван Іванавіч, в. Рэчкі.

СТАСЬКЕВІЧ Ігнат Іванавіч, н. у 1899, в. Рэчкі, з ліпеня 1919 у РСЧА, потым жыў у Крыме.

СТАСЬКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1888, в. Рэчкі, франтавік, з ліпеня 1919 у РСЧА.

СТАСЬКЕВІЧ Павел Андрэевіч, в. Рэчкі, памёр у 1976, са жніўня 1919 у 42 пча.

СТАСЬКЕВІЧ Рыгор Тодаравіч, в. Рэчкі, франтавік.

СТАСЬКЕВІЧ Сымон Іванавіч, в. Рэчкі, франтавік.

СТАСЬКЕВІЧ Сцяпан Андрэевіч, в. Рэчкі, франтавік, у 1919 паранены ў баі з палякамі.

СТАСЬКЕВІЧ Сямён Андрэевіч, в. Рэчкі.

СТАСЬКЕВІЧ Яфім Іванавіч, в. Рэчкі.

СТРУНЕЎСКІ Зіновій, в. Горталь, у 1942 кінуты пад цягнік немцамі як партызанскі сувязны.

СТРУНЕЎСКІ Мікалай Рыгоравіч, в. Рэчкі.

СТРУНЕЎСКІ Рыгор Іванавіч, в. Горталь, партызан і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

СТРУНЕЎСКІ Яфім Мікалаевіч, в. Вулька, з ліпеня 1919 у РСЧА, загінуў у грамадзянскую вайну.

СТРУНЕЎСКІ Яфім Рыгоравіч, в. Рэчкі, франтавік, са жніўня 1919 у 42 пча, у 1946 забіты бандытамі.

СУКАЧ Аляксей, в. Лышча, у 1919 схоплены і расстраляны палякамі.

УЮНЧЫК Аляксей Паўлавіч, в. Горталь.

ФЕДЗЬКОВІЧ Мікалай Кузьміч, в. Рэчкі, камандзір узвода партызан у 1919.

ФЕДЗЬКОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1900, в. Рэчкі.

ФЕДЗЬКОВІЧ Ціхан, в. Рэчкі.

ХАЛАДОВІЧ Дзмітрый Іванавіч.

ХАМУШКА Кандрат Сямёнавіч.

ХОМІЧ Алеся Мікалаеўна, в. Рудня, у 1919 партызанская сувязная.

ХОМІЧ Майсей Кузьміч, в. Рудня.

ХОМІЧ Максім Васільевіч.

ХОМІЧ Кузьма Дзмітрыевіч, в. Рудня.

ХОМІЧ Мікалай Кузьміч, в. Рудня.

ХОМІЧ Павел Міхайлавіч, в. Рудня, са жніўня 1919 у 42 пча.

ЦЭВАН Іосіф.

ШАБАЦЬКА Аляксей Іванавіч, в. Гутка.

ШАБАЦЬКА Аляксей Ігнатавіч.

ШАБАЦЬКА Мікалай Міхайлавіч, н. у 1898, в. Гутка, у Вялікую Айчынную вайну браў Кёнігсберг.

ШАБАЦЬКА Міхаіл Андрэевіч, в. Краі, у 1922 люта збіты карнікамі.

ШАБАЦЬКА Піліп Міхайлавіч.

ШАБАЦЬКА Якаў Міхайлавіч, в. Гутка, падпольшчык 1925, партызан Вялікай Айчыннай вайны.

ШАРУК Афанасій Васільевіч, са жніўня 1919 у 42 пча, курсант палкавой школы.

ШЛЯЖКА Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1900, в. Рэчкі.

ШЛЯЖКА Васіль Пятровіч, в. Рудня.

ШЛЯЖКА Іван Міхайлавіч, в. Рудня.

ШЛЯЖКА Іосіф Вікенцьевіч, н. у 1899, в. Рудня, дэпутат Савета.

ШЛЯЖКА Лявонцій Іванавіч, в. Рудня.

ШЛЯЖКА Мікіта, в. Рэчкі, з мая 1919 у лазарэце 66 сп 8 сд на ст. Лоўча.

ШЛЯЖКА Міхаіл Іванавіч.

ШЛЯЖКА Пранц Іосіфавіч, в. Рудня.

ШЛЯЖКА Станіслаў Пятровіч, в. Рудня.

ШЛЯЖКА Сцяпан Васільевіч, н. у 1898, в. Рудня, з ліпеня 1919 у РСЧА.

ШЛЯЖКА Сцяпан Вікенцьевіч, н. у 1898, в. Рудня, франтавік, са жніўня 1919 у 8 сд, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ШЛЯЖКА Сямён Іванавіч, в. Рудня.

ШЛЯЖКА Якаў Вікенцьевіч.

ЯКІМОВІЧ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1900, в. Горталь, з ліпеня 1919 у РСЧА.

ЯРМАЛОВІЧ Іван Іванавіч, в. Рэчкі, з ліпеня 1919 у РСЧА, прапаў без вестак у грамадзянскую вайну.

Падрыхтаваў І. Краўцоў.

Заўвага: РДВА — Расійскі дзяржаўны ваенны архіў; РСЧА — Рабоча-сялянская Чырвоная Армія; франтавік — удзельнік 1-й сусветнай вайны; 42 пча — 42-і полк чыгуначнай абароны ў Петраградзе, куды былі накіраваны ў ліпені — жніўні многія партызаны Целяханскага баявога ўчастка; 66 сп 8 сд — 66-ы стралковы полк 8-й стралковай дывізіі; прапаў без вестак — не вярнуўся ў родную вёску пасля грамадзянскай вайны; дэпутат Савета — дэпутат сельсавета ў 1939—1941 гг.

Дакументы сведчаць

За баявымі данясеннямі — падзеі вайны

1 красавіка 1919 г.

Штаб праціўніка — у в. Парэчча, у доме № 132 і звязан тэлефонам з вёскамі Рудкі, Велясніца, Мерчыцы, Ставок. У Целяханах тры гарматы, некалькі кулямётаў, два эскадроны кавалерыі і каля роты пяхоты. 29 сакавіка прыходзіла кавалерыя ў вёскі Сакалоўка, Валішча, Хворасна, але з Хворасна была выбіта разведкай партызанскага атрада, пасля чаго на некалькі гадзін праціўнік затрымаўся ў в. Валішча, у якой займаўся зборам хлеба, сала, яек, аўса і сена. Мост (цераз Агінскі канал) ахоўвае малая група легіянераў пры адным кулямёце...

Камандзір 9-га пагранпалка Зацяплінскі.

5.4.1919 г.

На світанні г.ч. каля 400 легіянераў з Лагішына абышлі в. Каўняціна... Партызаны біліся да той пары, пакуль мелі патроны. На гэтым фронце праціўнік сёння адначасова вёў наступленне на Краі з Целяхан. У маёй прысутнасці было забіта некалькі легіянераў... Насельніцтва, што знаходзіцца ў стане вайны з палякамі, слёзна просіць падмацавання, зброі і патронаў.

Кампалка Зацяплінскі, камісар Гейман

26.4.1919 г.

Камбрыгу — і ў Лунінец. Часці 66 палка г.ч. змянілі часці 150 палка ў 19 гадз... Правей 1-й роты, займаючай в. Пагост, у в. Валішча ёсць партызанскі атрад з мясцовых сялян, так званы Лагішынскі... Супраць в. Целяханы стаіць партызанскі атрад, т. зв. Целяханскі. У Лагішынскі і Целяханскі атрады выслалі інструктараў, якія прывядуць атрады ў парадак, растлумачаць задачу і будуць заклапочаны яе выкананнем. Адтуль вывозяцца лішнія ўзбраенні і боепрыпасы, аднаўляецца сувязь.

Камандзір 66 СП Н. Міхайлаў, камісар Ф. Баклееў.

27.4.1919 г.

Часці 66 палка ў 21 гадз. 30 мін. трэці раз пайшлі ў наступленне, якое ўвянчалася поспехам... Адступаючы праціўнік праследуецца намі.

Камандзір 66 палка Н. Міхайлаў, камісар Ф. Баклееў.

З РЭЗАЛЮЦЫІ СЯЛЯНСКАГА СХОДУ

30.4.1919 г.

Насельніцтва горача дзякуе 66 палку за адбіццё атакі праціўніка і за дастойныя гонару чырвонаармейца паводзіны палка.

8.5.1919 г.

Гэтага чысла з боем у 4 гадз. 35 мін. занялі вёскі Каўняціна, Гарадзішча, Мокрая Дуброва, Лышча, Пучыны, а разведка заняла м. Лагішын. Страт няма. Праціўнік у паніцы ўцёк за Агінскі канал.

Камандзір 66 СП Н. Міхайлаў, камісар Ф. Баклееў.

15.5.1919 г.

У ноч на 12 мая праціўнік зрабіў набегі на вёскі Краі і Гутка, занятыя партызанамі.

Камандзір 66 СП Н. Міхайлаў, камісар Ф. Баклееў.

16.5.1919 г.

Праціўнік зрабіў набегі на маёнтак Буды і забраў жывёлу.

За камандзіра 66 СП — пам. камандзіра Харэўскі, камісар Ф.Баклееў.

27.5.1919 г.

11 гадз. Звесткі ад партызанаў: праціўнік наступае каля Агінскага канала, заняў вёскі Гутка і Краі, ідзе на Рэчкі, Рудня, Пучыны.

17 гадз. 34 мін. Партызаны ўступілі ў бой з палякамі каля Агінскага канала, палякаў да 150 чал. Праціўнік спаліў вёскі Краі і Гутка. У партызанаў ёсць раненыя. Прышліце да мяне адну роту з кулямётамі.

Пам. камандзіра 66 СП Харэўскі, камісар Ф. Баклееў.

28.5.1919 г.

... У 23 гадз. 27 мая, па данясенню партызан (атрада М. Р. Мяліка) — праціўнік адхлынуў на Целяханы.

Харэўскі, Ф. Баклееў.

2.6.1919 г.

У 23 гадз. 1 чэрвеня праціўнік заняў спаленыя ім вёскі Краі і Гутка сілаю 200 штыкоў і 150 кавалерыстаў, на світанні збіраецца наступаць на в. Рэчкі. У в. Рэчкі скапіліся партызаны, ім прыдадзен адзін кулямёт. Пад кіраўніцтвам інструктара палка будзе прыняты бой.

Н. Міхайлаў, Ф. Баклееў.

Заўвага. На другі дзень палякі былі выбіты з гэтых вёсак партызанамі. 14 чэрвеня партызаны ўдзельнічалі ў баі за Лагішын, нанеслі ўрон палякам. А на наступны дзень загадам па 66-м сп партызаны Целяханскага баявога ўчастка былі пастаўлены на забеспячэнне ў палку. Вёскі Краі, Гутка і маёнтак Буды пакінуты праціўнікам, сталі нейтральнай зонай. Вёска Рэчкі занята партызанскім атрадам, які знаходзіцца пад наглядам нашага камандзіра 5-й роты.

Даведка. Камандзірам 5-й роты тады быў ураджэнец Масквы Іван Князеў, 1895 г. нараджэння, удзельнік першай сусветнай вайны. У ліпені 1919 г. па дакументах 66-га сп ён ужо лічыўся камандзірам 2-га батальёна. 18 лістапада прыняў камандаванне 1-м батальёнам, а 5 снежня таго ж года назначаны памочнікам камадзіра 66-га палка. Вызначаўся смеласцю, умела ацэньваў становішча і прымаў правільныя рашэнні. Вось што І. Князеў паведаміў свайму баявому сябру Івану Шыбанаву пра бой з легіянерамі (лістапад 1919 г.) пад Барысавам, калі 1-ы батальён пад камандаваннем І. Князева ўзяў у палон 278 чалавек, а таксама захапіў 6 кулямётаў, 34 вінтоўкі, 13 патронных двухколак, 2 паходныя кухні з коньмі, 4 кані, 1 воз з харчамі, 2 сялянскія вазы з рэчамі польскіх салдат: «Паляка́ў было не менш як 500... А ў мяне толькі 179 штыкоў. Мы ім усыпалі! Прыязджала камісія, нейкае начальства, паглядзець на месцы, які я манеўр зрабіў. Усе мяне расхвальвалі. Ванюша! Ёсць загад аб назначэнні мяне камандзірам палка ў другім месцы. Шкада будзе пакідаць 66-ы полк. Тут кожнага ведаешь, на што ён здольны. Прыязджай у госці. Твой І. Князеў».

У майскіх зводках 1919 г. адзначалася, што 5-я рота 66-га сп размяшчалася ў в. Дабраслаўка, маючы вартавую ахову ў вёсках Пучыны і Лышча.

Усе партызаны 1919 г. пры сустрэчах і гутарках з аўтарам гэтых радкоў успаміналі камандзіра 5-й роты І. Князева, з якім яны разам адбівалі атакі пераўзыходзячых войскаў панскай Польшчы.

7.6.1919 г.

Размяшчэнне: Лагішынскі партызанскі атрад — вёскі Валішча, Хворасна, Рэчкі, Буды, Гутка і Краі; разведка на Целяханы; задача — перашкаджаць разведцы праціўніка.

Заўвага. З пералічаных вёсак бачна, што ў Лагішынскі партызанскі атрад з пачатку чэрвеня 1919 г. уваходзілі і партызаны Целяханскага баявога ўчастка, якія сумесна дзейнічалі супраць палякаў.

12.6.1919 г.

Па данясенню камандзіра партызанскага атрада. Сёння раніцай ланцугі праціўніка падышлі да в. Валішча, адкрыўшы моцны агонь па вёсцы. Партызаны адказалі ім тым жа. Ланцугі праціўніка адрынуліся, змяшаліся і разбегліся ў розныя бакі, падбіраючы і выносячы параненых. У нас страт няма. Мы праследавалі легіянераў да Агінскага канала.

14.6.1919 г.

Лоўча. З шасці гадзін 14 чэрвеня ланцугі праціўніка сталі сцягвацца з розных бакоў да Лагішына. Прыкладна чалавек 100 з кулямётамі і бамбамётамі наступалі з боку вёсак Зубкі і Анісаўка. Чалавек 50 з кулямётамі — з боку в. Твардоўка. Трэцяя група ў 150 чалавек — з боку вёсак Мокрая Дуброва і Валішча. Апошні ланцуг увайшоў у Лагішын і напаў на паўроту 8-й роты, размешчаную бліжэй да в. Шпаноўка. Паўрота адкрыла ружэйна-кулямётны агонь па праціўніку, які згубіў каля 20 забітых, было і шмат параненых. Але тут нашы кулямёты закідалі гранатамі, кулямётчыкі адступілі на ўчастак 1-й роты.

Затым з флангаў і тылу праціўнік стаў акружаць 1-ю роту. Мясцовыя багачы-палякі Лагішына білі па нас з вокнаў і закідвалі гранатамі. На вуліцах мястэчка ішоў бой. Камандзіры Мікалай Іваноў і Аляксей Дравасекаў асабіста ва ўпор з кулямётаў расстрэльвалі палякаў з крыкамі: «Памрэм за Савецкую ўладу, але не здадзімся!» Палякі занялі Вышку (яўрэйскія могілкі), адрэзаўшы шлях да адступлення на Каўняціна і М. Дуброву. Чырвонаармейцы пад агнём кінуліся ў атаку, а кулямёты білі па іх. Пайшоў рукапашны штыкавы бой.

Камандзіра 8-й роты Дравасекава, які кіраваў штыкавым боем, лёс не высветлены. Нязначнай колькасці чырвонаармейцаў 1-й і 8-й рот з памочнікам камандзіра 1-й роты Маславым удалося прарвацца і злучыцца з 4-й ротай.

Праціўнік пры наступленні быў апрануты ў цывільную вопратку, яго кулямёты акуратна замаскіраваны. Легіянеры былі прыведзены ў Лагішын у розны час мясцовымі палякамі па толькі іх вядомых сцяжынках.

На ўчастках партызанскага атрада на працягу ўсяго 14 чэрвеня ішоў моцны бой. Праціўнік, пакінуўшы некалькіх забітых і параненых, адступіў. Праціўнік таксама дзейнічаў пад выглядам партызанаў. Ёсць забітыя і параненыя і ў партызан.

Харэўскі, пам. ваенкома Аксёнаў.

16.6.1919 г.

Лоўча. Лагішын заняты намі 15 чэрвеня ў 21 гадзіну фланговым абходам. Злева ішлі 1-я, 4-я роты і партызаны з вёсак Мокрая Дуброва, Забораўцы і Рэчкі. У тыл мястэчка заходзілі партызаны Валішчанскага атрада. Шпіёнамі легіянеры былі папярэджаны аб нашай атацы і адступілі. У Лагішыне затрыманы і расстраляны два мясцовыя жыхары, якія стралялі па нашых чырвонаармейцах 14 чэрвеня.

16 чэрвеня ў 5 гадзін 30 мінут Лагішын намі пакінуты, мы адышлі на лінію Каўняціна — Мокрая Дуброва, бо для абароны мястэчка мала сіл. Партызаны катэгарычна патрабавалі адпачынку і разышліся па дамах, бо трое сутак нічога не елі. Маса шпіёнаў на кожным кроку, адчуваем варожасць насельніцтва, у асноўным палякаў. Параіўшыся з ваенкомам Ждановічам і камандзірамі атрадаў, рашылі адысці на больш зручныя пазіцыі, дзе і замацаваліся.

Н. Міхайлаў, Ф. Баклееў.

Падрыхтаваў І.Краўцоў.

У СКЛАДЗЕ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Косаўскі павет

Тэрыторыя Івацэвіцкага раёна ў розныя часы ўваходзіла ў адміністрацыйныя адзінкі ў залежнасці ад тэрытарыяльнага дзялення той дзяржавы, у складзе якой была: ці то Вялікага княства Літоўскага, ці Рэчы Паспалітай, ці Расійскай Імперыі.

У лютым 1919 г. заходняя частка Беларусі, у тым ліку і Івацэвіцкі край, была акупіравана войскамі Польскай буржуазнай рэспублікі, якая аб'явіла сябе ў лістападзе 1918 г. незалежнай дзяржавай пасля больш чым 120-гадовай залежнасці ад Аўстра-Венгрыі, Прусіі і Расіі, якія падзялілі яе ў канцы XVIII стагоддзя. На занятых Польшчаю тэрыторыях былі ўтвораны ваяводскія ўпраўленні, павятовыя старастаты, гмінныя праўленні. Гміна, як самастойная адміністрацыйная адзінка, валодала ўсімі юрыдычнымі правамі, складалася з аднаго ці некалькіх мястэчак, пасёлкаў, вёсак, хутароў, фальваркаў і інш., уваходзіла ў склад павета, а той уваходзіў у склад ваяводства.

Назва гміны вызначалася назвай населенага пункта, на тэрыторыі якога знаходзілася гміннае праўленне. Членамі гміны з'яўляліся асобы, якія мелі польскае грамадзянства і пражывалі на тэрыторыі гміны не менш за месяц. Кантралюючым органам гміны з'яўлялася гмінная рада, члены якой называліся раднымі, а распарадчым і выканаўчым органам было праўленне гміны на чале з войтам.

У функцыі гміннага праўлення ўваходзілі распрацоўка бюджэту, здача ў арэнду нерухомай маёмасці, збор штрафаў і падаткаў, рэгістрацыя ваеннаабавязаных і інш.

Тэрыторыя гміны дзялілася на грамады, якія ахоплівалі кожны населены пункт. Кіруючым органам у грамадзе з'яўляўся грамадскі сход, на якім выбіраўся солтыс і яго намеснік.

18 сакавіка 1921 г. быў заключаны мірны дагавор паміж Польшчай і Расійскай Федэрацыяй, па якому Заходняя Беларусь аказалася пад уладаю польскіх паноў, якія ператварылі яе ў сваю калонію — «крэсы ўсходнія».

З мэтай правядзення каланіяльнай палітыкі кіруючыя колы Польшчы сталі насаджваць там свой адміністрацыйны апарат. Для кіравання Палескім ваяводствам, у якое ўваходзіў і Івацэвіцкі раён, распараджэннем Рады міністраў Польшчы 21 сакавіка 1921 г. быў прызначаны ваявода, які сканцэнтраваў у сваіх руках усе рычагі кіравання ваяводствам. Ён ажыццяўляў адміністрацыйную ўладу і нагляд над грамадска-палітычным рухам, асветай, аховай здароўя, сацыяльным забеспячэннем, над дзейнасцю адміністрацыйных устаноў.

АБ НАСЕЛЬНІЦТВЕ І ТЭРЫТОРЫІ ПАВЕТА

Косаўскі павет быў утвораны 6 лістапада 1920 года з гмін: Боркі, Косава, Ружаны, Пескі — Слонімскага павета, Святая Воля, Целяханы — Пінскага павета. З 6 лістапада 1920 г. па 18 лістапада 1920 г. Косаўскі павет уваходзіў у склад Брэсцкай акругі, з 18 лістапада — Палескай акругі, а з 4 лютага 1921 г. быў далучаны да Палескага ваяводства.

Вёскі Міхнавічы, Воля, фальварак Бараны адышлі да гміны Боркі-Гічыцы; вёска Юкавічы гміны Боркі-Гічыцы — да гміны Святая Воля; вёска Дзмітрычы гміны Пескі — да гміны Святая Воля; вёска Сакалоўка гміны Целяханы — да гміны Пажэчы Пінскага павета.

Такім чынам, у Косаўскім павеце было 6 гмін: Косаўская, Ружанская, Пескаўская,

Святавольская, Целяханская і Боркa-Гічыцкая.

Косаўскі павет межаваў з Ваўкавыскім, Слонімскім, Баранавіцкім паветамі Навагрудскага ваяводства, Драгічынскім, Лунінецкім, Пінскім і Пружанскім паветамі Палескага ваяводства.

Паўночна-заходняя частка Косаўскага павета, куды ўваходзілі Косаўская і Ружанская гміны, была гарыстай, а астатняя тэрыторыя — раўніннай. Балоты размяшчаліся ў паўночным напрамку Боркі-Гічыцкай, Свята-Вольскай і Целяханскай гмін. Праз паўночную частку Боркі-Гічыцкай і Косаўскай гмін працякала рака Грыўда, на мяжы Косаўскага і Пружанскага паветаў — рака Ясельда. Па тэрыторыі павета працякалі рэкі Жыгулянка, Зяльвянка, Мутвіца. Тут жа размешчаны азёры Бабровіцкае, Выганаўскае, Вулька-Целяханскае, Корачынскае, Чорнае, Агінскі канал.

Па звестках перапісу 1931 г., плошча Косаўскага павета складала 3561,4 кв. км. Пражывала ў ім 83 696 чалавек. Шчыльнасць насельніцтва — 107,5 чалавека на 1 кв. км. Па нацыянальнаму складу насельніцтва размяркоўвалася наступным чынам: беларусаў — 68 083 чалавекі, палякаў — 8456, украінцаў — 132, рускіх — 686, яўрэяў — 6300 жыхароў, іншых нацыянальнасцей — 39.

Калі прааналізаваць становішча сялян Целяханскай гміны ў 1920 г., то паўстае карціна беднасці і гаспадарчай адсталасці. У Целяханах пражывала тады 210 мужчын, 214 жанчын, дзяцей да 15 год — 384. На ўвесь пасёлак мелася ўсяго 33 кані, 63 каровы і 18 свіней. Усяго целяханцы апрацоўвалі 252 гектары ворнай зямлі. Не лепшым было і становішча вёсак Вулька, Выганашчы, Соміна, Горталь, Краглевічы, Краі, Рэчкі, Рудня, Гутка і інш. У Выганашчах, напрыклад, на 259 чалавек насельніцтва было толькі 29 коней і 49 кароў. У Краях, дзе жыло 550 чалавек, мелася 50 коней. Яшчэ горш выглядала жыццё ў Святавольскай гміне. У вёсцы Аброва, дзе насельніцтва складала 190 мужчын, 270 жанчын і 300 дзяцей, было ўсяго 42 кані і 25 кароў і апрацоўвалася 142 гектары ворнай зямлі. У той час яшчэ не ўсё насельніцтва вярнулася з бежанства, куды яно вымушана было пайсці ў 1915 г. пры наступленні немцаў у першую сусветную вайну.

У той жа час ішло фарміраванне органаў мясцовай улады. У пратаколе пасяджэння гміннай рады ў Святой Волі 16 лістапада 1919 г. адзначаецца, што пры выбарах войта з 10 радных 6 прагаласавалі за Яна Шалюціна з Аброва, столькі ж за

На вуліцах Косава. 1930-я гады. Гэты і некаторыя іншыя здымкі з жыцця сялян Косаўскага павета зрабіў у 1935—1937 гадах жыхар Косава Іосіф Шыманчык. У 1945 г. ён пераехаў у Польшчу, пасяліўся ў г. Лодзь. У 1989 г. даслаў у Косава мясцоваму музею 65 фотаздымкаў. Частка з іх была выкарыстана для стэнда «Косава у 30-я гады і побыт жыхароў Палесся» і ўключана пазней стваральнікамі кнігі ў Хроніку Памяці.

намесніка войта Мікалая Ярмаловіча з вёскі Вялікая Гаць.

Цэнтрам павета было мястэчка Косава. У ім размяшчаліся адміністрацыйныя органы ўлады: павятовае староства і аддзелы, міравы суд і паліцэйская камендатура, школьны інспектарат. У 1938 г. у Косаве налічвалася 3708 жыхароў. Было некалькі гасцініц, з якіх самая вялікая купецкая, на 8 ложкаў.

У цэнтры гарадка размяшчалася царква. Павятовае староства і аддзелы размяшчаліся ў былым палацы графаў Пуслоўскіх, што ў Мерачоўшчыне.

З невялікіх мястэчак павета варта адзначыць Ружаны, у якіх налічвалася ў 1938 г. 4250 жыхароў. Тут размяшчаліся гміннае праўленне, пошта, тэлеграф, аптэка. Дзейнічалі майстэрні па вырабу сумак, ваўняных коўдраў і скуры.

Чыгуначная станцыя Івацэвічы напамінала буйное сяло. У ім пражывала 1860 чалавек. Размяшчалася гміннае і паштова-тэлеграфнае праўленні. Маёнтак і лясы каля Івацэвіч, дзе вадзіліся ласі, належалі графу Юндзелу. Івацэвічы злучыліся вузкакалейкаю з Целяханамі і вёскаю Святая Воля, у якой пражывала 1029 чалавек. Яна размяшчалася на ўскраіне балота Пагоня і была абкружана лесам графа Пуслоўскага. У вёсцы была драўляная царква, пабудаваная ў 1749 г. гетманам Агінскім.

На тэрыторыі павета знаходзіліся чыгуначныя станцыі Косава-Палескае і Бронная Гара. Працягласць дарог складала 1364 км, з іх 946 км брукаваных.

ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ПАВЕТА

Косаўскі павет адносіўся да тэрыторый, якія з'яўляліся адсталай ускраінай Польшчы. Эканоміка яго насіла рысы, характэрныя для паўкаланіяльных раёнаў. Прамысловасць у павеце амаль не развівалася, калі не лічыць некалькіх невялікіх прадпрыемстваў. Пераважная большасць насельніцтва крыніцы свайго існавання знаходзіла ў сельскай гаспадарцы.

Агульная колькасць насельніцтва павета складала 83 696 чалавек, з іх 71 291 займаліся сельскай гаспадаркай. У садоўніцтве і лясной гаспадарцы было занята 957 чалавек, у прамысловасці — 5874, у гандлі — 1885, ва ўстановах транспарту — 999, у грамадскіх арганізацыях і рэлігійных установах — 1021, у народнай асвеце — 326, у ахове здароўя — 264, як наёмная сіла ў хатняй гаспадарцы — 396, у іншых прафесіях — 683 чалавекі.

У 1920 г. у Целяханскай гміне не было ні аднаго прадпрыемства, калі не лічыць смалакурню. У Целяханах быў касцёл, але не было ксяндза. Быў праваслаўны свяшчэннік, але не было царквы. У школе навучалася ўсяго 20 дзяцей з 384. У Святавольскай гміне царква дзейнічала толькі ў Аброве, але не было ні адной школы. З прадпрыемстваў быў адзін ветраны млын.

Дробныя прамысловыя прадпрыемствы, якія пачалі ўзнікаць пазней, займаліся перапрацоўкай мясцовай сыравіны і прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Наяўнасць лясоў Ружанскай пушчы, Гута-Міхалінскіх урочышчаў, Целяханскай зоны спрыяла развіццю лесараспрацовак і ўзвядзенню невялікіх лесапільных заводаў.

У 1922 г. акцыянерным таварыствам «Целяханы» быў адкрыты лесапільны завод у маёнтку Жэчкі. У 1923 г. у Косаве адкрыўся лесапільны завод пад назваю «Тартак». У Броннай Гары ў 1924 г. — завод Боркена-Гегена. Граф Пуслоўскі, які валодаў вялікімі ляснымі плошчамі, адкрыў у 1925 г. лесазавод у маёнтку Плянта -Гацка. У 1929 г. на лесаэксплуатацыі Плянта-Гацка працавала 200 чалавек. Граф Кароль Пуслоўскі ў 1920 г. адкрыў лесазавод у Целяханах, які затым арандавала таварыства «Лерхор». У 1925 г. у Ружанах быў адкрыты завод таварыства лясной

прамысловасці «Блізна». У 1920 г. у Івацэвічах дзейнічаў лесазавод «Віс» з 23 рабочымі, а ў Целяханах — завод кампаніі «Гуральгор» з 50 рабочымі. Заводы працавалі на мясцовай сыравіне, бязлітасна знішчаючы дзяржаўныя і прыватныя лясы. На адраджэнне лясоў, знішчаных нямецкімі акупантамі ў першую сусветную вайну і польскімі акупантамі ў 1920 — 1930-я гады, спатрэбіліся многія дзесяцігоддзі.

Лесапільныя заводы былі абсталяваны невялікімі лакамабілямі. Рабочых было нямнога. Напрыклад, на заводзе ў Жэчках у 1933 г. працавала 5 чалавек. На Косаўскім заводзе «Тартак» у 1934 г. было занята 46 рабочых, на заводзе Плянта-Гацка ў 1937 г. — 38. Да 287 рабочых працавалі на дзяржаўных заводах. На лесапільным заводзе фірмы «Рамболь» у Івацэвічах працавала ў 1929 г. 48 рабочых, на заводзе «Лерхор» у 1933 г. — 12 рабочых.

Большай часткай збыт лесаматэрыялаў праводзіўся на мясцовым рынку. Але лесазаводы Пуслоўскіх вывозілі сваю прадукцыю ў Германію, а завод Боркена-Гегена — нават у Англію. Прадукцыя заводаў па колькасці была невялікай. Напрыклад, косаўскі завод «Тартак» выпускаў у год да 2500 куб. м лесаматэрыялаў, завод «Гуральгор» — да 4000 куб. м, завод «Лерхор» да 8500 куб. м. Інтэнсіўную лесаэксплуатацыю ў маёнтку Пескі вялі фірмы «Рамболь» і Астраханскага.

Да прадпрыемстваў, якія перапрацоўвалі сельскагаспадарчую сыравіну, адносіліся млыны. У 1922 г. у павеце дзейнічала 6 паравых млыноў, на якіх працавала 14 рабочых, і 10 ветраных млыноў з 10 рабочымі.

У 1924 г. налічвалася 12 сезонных цагельных заводаў.

У маёнтку Пескі графіні Ірэны Пуслоўскай дзейнічала вінакурня, на якой працавала ў 1934 г. 20 рабочых.

Прамысловыя прадпрыемствы і ўстановы атрымлівалі электраэнергію ад установак у Івацэвічах, Песках, Ружанах і Целяханах, магутнасць якіх дасягала 100 кілават. У Косаве на асвятленне вуліц і ўстаноў расходавалася ў год да 5000 кВт.

Прадпрыемствы павета, і да таго маламоцныя, падкошваліся эканамічным крызісам, у час якога звальняліся рабочыя, скарачаўся рабочы час. У канцы 1929 г. спынілася лесаэксплуатацыя фірмы «Рамболь» у Песках. Пазбавіліся работы каля 50 чалавек. Івацэвіцкі завод гэтай жа фірмы працаваў з-за адсутнасці сыравіны толькі 5 месяцаў. Завод таварыства «Лерхор» працаваў у 1933 г. 6 месяцаў.

Рабочыя працавалі ў цяжкіх антысанітарных умовах па 10—15 гадзін у суткі, атрымліваючы мізэрную зарплату — 1—2 злотых, 1 злоты 30 грошаў і нават 80 грошаў. Рабочыя цярпелі ад самавольства ўладальнікаў прадпрыемстваў, якія адмаўляліся прымаць на работу членаў прафсаюзаў, заяўляючы, што «камуністы на рабоце не патрэбны». Вялікім бедствам для рабочых было беспрацоўе. У 1936 г. у павеце налічвалася 200 беспрацоўных, якія не мелі сродкаў для існавання. У 1935 г. зарэгістравана 125 беспрацоўных, з якіх толькі 78 атрымлівалі дапамогу.

Рабочыя змагаліся за свае правы, арганізоўвалі забастоўкі. У чэрвені 1927 г. успыхнула забастоўка рабочых Ружанскай пушчы, выкліканая 12-гадзінным рабочым днём і нізкай зарплатай (1 злоты 50 грошаў). Рабочыя патрабавалі павышэння зарплаты да 2 злотых. Забастовачны рух узмацніўся ў час эканамічнага крызісу 1929—1933 гг. 21 лютага 1933 г. у лясніцтве Міхалін забаставала 60 рабочых. 13 сакавіка 1933 г. там жа забаставала 200 возчыкаў, якія патрабавалі павышэння зарплаты. 5 красавіка 1933 г. забаставала 40 рабочых лесапільнага завода «Лерхор», якія патрабавалі 8-гадзіннага рабочага дня. У 1934 г. камуністы шырока разгарнулі агітацыйную работу за арганізацыю забастовак. У выніку гэтага ў Івацэвічах заба-

ставала 306 рабочых лесапільных заводаў. Іх падтрымалі 150 рабочых, якія працавалі на ўрэгуляванні ракі Грыўда. Прычынаю забастоўкі паслужыла парушэнне законаў уладальнікамі заводаў, нізкая заработная плата (для рабочых 1 злоты 40 грошаў — 1 злоты 60 грошаў, для работніц — 80 грошаў), нерэгулярная выплата зарплаты, жабрацтва. Забастоўка працягвалася з 9 чэрвеня да 17 ліпеня 1936 г.

Косаўскі павятовы староста на перамовах з прадстаўнікамі прафсаюза заявіў: «Калі не спыніце забастоўку, я выклічу рабочых з навакольных вёсак і гаспадароў з Косава. Для мяне яны лепшыя, бо яны плацяць падаткі».

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Асноўную ролю ў эканоміцы павета адыгрывала сельская гаспадарка. Па звестках за 1931—1932 гг. 47,3% зямельнай плошчы павета было занята сельскагаспадарчымі ўгоддзямі. Пад ворнымі землямі налічвалася 61 705 га, пад садамі і агародамі — 1266 га, пад лугамі — 61 803 га, пад пашаю — 29 377 га, пад лясамі — 129 977 га (38,3%). У 1935—1936 гг. у павеце налічвалася 266 160 га прыватных зямель, 89 817 га дзяржаўных, 2282 га царкоўных.

Структура земляробства ў павеце характарызавалася наступнымі данымі: гаспадарак, якія мелі да 1 гектара зямлі, было 675 і ім належала ўсяго 433 гектары; землеўладальнікаў з 1—3 гектарамі было 4080 і належала ім 8359 гектараў; гаспадароў, якія валодалі ад 3 да 5 гектарамі, было 4539, а валодалі яны 17 985 га зямлі; па 5—7 га мелі 2905 гаспадарак, якім належала 17 286 гектараў; па 7—10 гектараў мелі 2236 сялян, ім належала 18 786 гектараў; па 10—15 гектараў мелі 1292 селяніна агульнай плошчай 15 474 гектары; па 15—20 га валодалі 408 гаспадарак і ім належала 6899 га; па 20—30 га валодалі 287 гаспадарак, а па 30—50 гектараў зямлі мелі 84 гаспадаркі. У 1932 г. 61 гаспадарка мела звыш 50 гектараў, а зямлі ў іх было 141 962 га (у асноўным лясы — 86 370 гектараў).

У вёсках буржуазна-памешчыцкай Польшчы ішоў працэс класавага расслаення сялянства. Да кулацкіх гаспадарак адносіліся тыя, што валодалі ад 20 да 75 гектараў зямлі. У такіх гаспадарках было па 3—4 кані. Кулакі карысталіся наёмнаю сілаю. Серадняцкія гаспадаркі валодалі па



Селянін каля сваёй хаты.

7—20 га зямлі, мелі па 1—2 кані, 2—3 каровы. Наёмную сілу прымянялі ў перыяд сезонных работ. Бядняцкія гаспадаркі валодалі па 2—7 гектараў зямлі. Большасць іх мела 1 каня, 1—2 каровы. Каб пракарміцца, члены сем'яў бядняцкіх гаспадарак вымушаны былі прырабляць у памешчыкаў, асаднікаў, кулакоў. У Косаўскім павеце пераважалі бядняцкія гаспадаркі (каля 80%).

Буйныя зямельныя плошчы належалі памешчыкам. У графа Уладзіслава Пуслоўскага ў маёнтку Плянта-Гацка налічвалася 19 462 га зямлі. У памешчыцы Марыі Слізнёвай у маёнтку Харошча было 976 га зямлі. У памешчыка Мечыслава Пініскага — 5930 га. У маёнтку Гута-Міхалін уласнікаў Пінеса і Гардона налічвалася ў 1928 г. 5460 га, з іх лесу 2400 га, ворнай зямлі 60 га, лугоў і пашы 190 га. У маёнтку было 50 галоў жывёлы. Былі сельскагаспадарчыя машыны: жняярка, малатарня. У маёнтку ішоў працэс капіталізацыі. Быў адкрыты лесапільны завод з 40 рабочымі і шкіпінарная майстэрня з 10 рабочымі.

Па звестках за 1931—1932 гаспадарчы год у павеце вырошчваліся наступныя сельскагаспадарчыя культуры: пшаніцы было пасеяна 536 га, на якіх атрымана ўраджайнасць па 4,3 цэнтнера і збор склаў 2268 цэнтнераў; жыта было пасеяна 24 842 га, якія далі па 4,4 цэнтнера зерня, а ўсяго — 109 794 цэнтнеры; ячменю было пасеяна 3373 га, якія далі ўраджайнасць па 5,3 цэнтнера; 6299 га аўса пры ўраджайнасці 4,4 цэнтнера далі збор у 27 920 цэнтнераў. Бульбы было пасаджана 9723 га, якія далі па 79 цэнтнераў клубняў. Усяго па 3,9 цэнтнера даў кожны з 2037 га пасеваў грэчкі; амаль удвая большай была ўраджайнасць проса — па 6,9 цэнтнера з га, што дало магчымасць сабраць значную колькасць гэтай крупяной культуры.

У 1931—1932 гады ў павеце налічвалася жывёлы: коней — 14 251, кароў (буйной рагатай жывёлы) — 37 374 галоў, свіней — 18 695 галоў, авечак — 23 220 галоў, коз — 97.

На плечы сялян непасільным цяжарам клаліся падаткі. За кошт падатковых паступленняў ад насельніцтва ўтрымліваліся апарат павятовых і гмінных устаноў, школы, бальніцы, дарогі павета. У бюджэце Косаўскага павета на 1935—1936 г. выдаткі складалі 247 490 злотых. З іх на ўтрыманне адміністрацыйнага апарату асігнавалася 48 904 злотых, на ўтрыманне дарог — 73 606 злотых, на народную асвету — 44 063

У сялянскай хаце.

злотых, на ахову здароўя — 24 990 злотых, сацыяльнае забеспячэнне — 13 088 злотых, на культурнае будаўніцтва — 672 злотых, на падтрыманне грамадскага парадку — 3175 злотых. Даходы ў бюджэце складалі 275 631 злотых, у тым ліку ад падаткаў прыкладна 180 тысяч злотых. З насельніцтва здымаліся ўраўняльны, зямельны, дарожны, гмінны, ваенны падаткі, а таксама падаткі ад шыльд і афіш, грамадскіх відовішчаў, утрымання гасцініц, дадаткаў да дзяржаўных збораў і інш. Здымаліся з насельніцтва шматлікія штрафы: калі не пабелены дымаход, няма каля хаты супрацьпажарных прылад, няма званка на дузе ў запрэжцы, калі нечакана каля плоту вырас корань табакі, які выявіў паліцэйскі, калі не накрываецца калодзеж і інш.

Вялікую ролю ў эканамічным развіцці павета адыгрывалі шарваркі, гэта значыць, працоўныя павіннасці насельніцтва па рамонту і будаўніцтву дарог, мастоў, школьных будынкаў і г.д. У 1935—1936 гг. адпрацавана насельніцтвам 13 884 дні на суму 176 486 злотых. Насельніцтва часта прыцягвалася да выканання працоўнай павіннасці за падатковую запазычанасць. У 1935—1936 гг. народ адпрацаваў на рамонце дарог за запазычанасць па падатках на суму 1297 злотых. Дзяржаўныя сродкі на развіццё эканомікі гмін не асігнаваліся. Насельніцтва само ўтрымлівала сябе.

СТАН АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

Кіраўніцтва аховай здароўя ў павеце ажыццяўляў павятовы ўрач, які працаваў у павятовым аддзеле — органе мясцовай улады ў павеце. Увесь павет быў раздзелены на чатыры ўрачэбныя раёны з цэнтрамі ў Святой Волі, Косаве, Івацэвічах і Целяханах, дзе знаходзіліся амбулаторыі. За наведанне амбулаторыі бралася плата ў 1 злоты. Раённыя ўрачы вялі барацьбу з інфекцыйнымі захворваннямі, ажыццяўлялі санітарны нагляд за школамі, вялі прыём хворых у амбулаторыях.

У 1936 г. урачэбнай практыкай у павеце займаліся 13 урачоў (адзін урач на 6480 жыхароў), 9 акушэрак (адна акушэрка на 353 парадзіхі).

У 1935 г. прырост насельніцтва склаў 3183 чалавекі, смяротнасць — 1095 чалавек, з іх 274 грудныя дзіцяці. Натуральны прырост насельніцтва склаў 2087 чалавек. Прычынамі смяротнасці насельніцтва ў гэты час былі: па старасці — 158 чалавек,

Фрагмент вяселля.

ад запалення лёгкіх — 154, ад туберкулёзу — 144 чалавекі. Антысанітарны стан населеных пунктаў часта з'яўляўся прычынаю ўспышкі захворвання сыпным тыфам (25 выпадкаў у 1935 г.).

У павеце дзейнічалі дзве аптэкі. У 1930 г. на 23 006 чалавек была адна аптэка. Лекі каштавалі дорога, таму насельніцтва шырока карысталася народнымі метадамі лячэння, прыбягала да замоў.

Урачы скардзіліся на недахоп сродкаў, адпушчаных на ўтрыманне бальніц і амбулаторый.

У павеце дзейнічалі дзве бальніцы. Павятовая бальніца ў Косаве, пабудаваная ў 1922 г. камітэтам па барацьбе з эпідэміямі, мела 30 ложкаў, з іх 8 — для хірургічных хворых, 16 — для тэрапеўтычных, 4 — для інфекцыйных і 2 — для парадзіх. За лячэнне ў бальніцах бралася ў суткі ад 2 да 4 злотых 50 грошаў. Кошт харчавання аднаго хворага ў суткі складаў 45 грошаў.

У Ружанах была бальніца на 19 ложкаў. За лячэнне тут збіралася плата ад 5 да 6 злотых у суткі. Ружанская бальніца была пабудавана ў 1872 г. яўрэйскаю абшчынаю; у 1923 г. яна была перададзена таварыству аховы здароўя.

Сярэдняе прабыванне хворых на лячэнні ў бальніцах не перавышала 8 дзён. Высокая плата за лячэнне адпужвала хворых, не давала магчымасці цалкам падлячыцца. У бальніцу пападалі хворыя ў безнадзейным стане, таму павялічвалася смяротнасць. У 1931 г. запазычанасць хворых за лячэнне склала 19 384 злотых. Бедныя ды сярэднія слаі насельніцтва, па сутнасці, не мелі магчымасці лячыцца.

Урачы ў бальніцах скардзіліся, што не могуць справіцца з лячэннем нават невялікай колькасці хворых. Пры бальніцах не было аперацыйных пакояў і хірургічных інструментаў, не было патрэбнага абсталявання. У 1936 г. для Косаўскай бальніцы быў упершыню куплены мікраскоп за 909 злотых, прычым на яго пакупку дадзена дзяржаўная датацыя ў 800 злотых. На ўтрыманне ж бальніц дзяржаўных датацый не выдзялялася. У 1936 г. утрыманне павятовай бальніцы ў Косаве абыходзілася ў 25 334 злотых, а ад хворых, якія плацілі за лячэнне, паступіла 18 908 злотых. Лячэнне і ўтрыманне лячэбных устаноў праводзілася за кошт насельніцтва.

ШКОЛЬНАЯ СПРАВА І РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРЫ

Нацыянальная палітыка ўрада буржуазна-памешчыцкай Польшчы прыводзіла да закрыцця беларускіх школ, спрыяла росту непісьменнасці насельніцтва. Непісьменнае насельніцтва лягчэй было трымаць у паслушэнстве. Узровень

Нявеста ў намітцы.

У полі.

пісьменнасці насельніцтва быў вельмі нізкім. Органы ўлады адкрывалі ў асноўным пачатковыя школы.

У 1935—1936 гг. у Косаўскім павеце была такая сетка школ: аднакласных — 65, у іх працавалі 33 настаўнікі і навучалася 2495 дзяцей; двухкласных — 19, у іх працавалі 40 настаўнікаў і навучалася 8395 дзяцей; у пяці трохкласных школах працавалі 26 настаўнікаў, якія навучалі 2075 дзяцей; чатырохкласнай была адна школа, у якой 6 настаўнікаў навучалі 429 дзяцей; у адной шасцікласнай школе вучылася 239 дзяцей і працавалі 4 настаўнікі; у сямікласных школах працавалі 14 настаўнікаў і навучалася 884 дзіцяці.

Усяго ў павеце было 95 школ, з якіх у наёмных памяшканнях размяшчалася 54. У 95 школах працавалі 163 настаўнікі. З 13 269 дзяцей школу наведвалі толькі 11 930.

Навучанне ў школе вялося на польскай мове. Беларуская мова была забаронена. Часта не хапала вучэбных дапаможнікаў. Настаўнікі празмерна нагружаліся. На аднаго настаўніка ў 1935 г. прыпадала 78 вучняў. Ва ўсім павеце не было ні адной школы з сярэднім навучаннем. У Косаве дзейнічала трохкласная гандлёвая школа, якую ўтрымлівала таварыства распаўсюджвання прафесіянальных ведаў. Вучылася ў ёй 59 чалавек і было 11 настаўнікаў. У Мерачоўшчыне знаходзілася дзяржаўная сельскагаспадарчая школа.

Нацыянальнае прыгнечанне выклікала абурэнне народных мас. Бацькі хацелі, каб іх дзеці вучыліся на роднай мове. У 1929 г. жыхары вёсак Гошчава і Сенькавічы падалі школьнаму інспектару заяву аб навучанні іх дзяцей на беларускай мове і адкрыцці беларускіх школ. Аднак органы ўлады адмовіліся выканаць іх просьбу. Тады ў Гошчаве адбылася антыўрадавая дэманстрацыя падлеткаў. У вёсцы Рудня гміны Целяханы ў 1928 г. насельніцтва адмовілася пасылаць дзяцей у польскую школу і патрабавала настаўніка-беларуса.

Недахоп школ, дарагоўля падручнікаў і сшыткаў, адсутнасць адзення ў дзяцей, занятасць іх у сельскай гаспадарцы, жабрац-



Дом Касцюшкаў у Мерачоўшчыне.

тва бацькоў — усё гэта вяло да паўсюднай непісьменнасці насельніцтва. Прыкладам таму былі прызыўнікі войска, сярод якіх у 1936 г. было 39% непісьменных.

У запушчаным стане знаходзілася культура. Сродкі, якія адпускаліся на яе ў павеце, ішлі на ўтрыманне бібліятэкі пры Косаўскім магістраце і на падтрымку парадку ў доме-музеі Тадэвуша Касцюшкі ў Мерачоўшчыне. Астатнія культурна-асветніцкія мерапрыемствы сярод насельніцтва праводзіліся грамадскімі арганізацыямі.

У 1930 г. было створана «Таварыства дома імя Т. Касцюшкі» ў Косаве, якое рашыла пабудаваць у Косаве Народны дом імя Касцюшкі. Гэтаму таварыству дазвалялася адкрыць у горадзе перасоўны кінатэатр. Праўда, адкрыццё перасоўнага кінатэатра натыкнулася на працяглую бюракратычную валакіту, якая завяршылася, нарэшце, выданнем праз палескага ваяводу дазволу. У ім агаворваліся варункі, пры якіх можна дэманстраваць фільмы перасоўнай кінаўстаноўкай на тэрыторыі павета. Абавязкова, прадпісвалася дазволам, кожнае кінатэатральнае прадстаўленне павінна быць узгоднена з мясцовым паліцэйскім пастарункам. Фільмы, якія будуць дэманстравацца, павінны мець пасведчанне, выданае праз міністэрства ўнутраных спраў. Ставіць фільмы могуць толькі асобы, лаяльныя да існуючых улад. Імі былі вызначаны начальнік паштовага аддзела ў Косаве Юзэф Віхарэк і механік жыхар Косава Міхаіл Каляда. Калі б узнікла неабходнасць замены гэтых асоб, то зрабіць гэта можна толькі з дазволу ваяводскага праўлення. Забаранялася выкарыстанне аб'яў аб пастаноўцы фільмаў для рэкламных мэт прадпрымальніцтва. За дазвол на дэманстрацыю фільмаў кінаперасоўкай патрэбна было заплаціць 40 злотых.

У 1936 г. у павеце налічвалася 28 бібліятэк. У іх налічвалася 2234 тамы кніг. З 83 696 чалавек насельніцтва кнігамі карысталіся толькі 1936, што складала 2% насельніцтва.

Уся культурна-асветніцкая работа вялася ў так званых святліцах, невялікіх клубах, якія знаходзіліся пры грамадскіх арганізацыях. У 1930 г. у павеце было 45 святліц, якія ўтрымліваліся стралецкім саюзам, саюзам гурткоў сельскай моладзі, добраахвотным саюзам пажарнай аховы і інш. Пры святліцах дзейнічалі харавыя гурткі (у 1930 г. — 12) і 19 тэатральных

Жанчыны ў час набажэнства ў царкве.

гурткоў. У 1936 г. насельніцтва павета ўпершыню ў жыцці з вялікім інтарэсам удзельнічала ў святе песні, якое праводзілася ў Косаве, Целяханах, Івацэвічах.

Работа святліц і бібліятэк была скіравана на апалячванне насельніцтва, на барацьбу з усякім праяўленнем нацыянальнай свядомасці.

У павеце дзейнічалі арганізацыі пажарнікаў, сельскагаспадарчыя гурткі, гурткі пчаляроў, свінаводаў, рыбакоў і інш. Былі таварыствы гараджан-хрысціян, па барацьбе з туберкулёзам, апекі над магіламі, падтрымкі чытачоў і інш.

У грамадска-палітычным жыцці і культурна-асветніцкім руху значную работу праводзілі кампартыя і камсамол Заходняй Беларусі, Беларуская сялянска-рабочая грамада, Беларускі рабоча-сялянскі пасольскі клуб, Таварыства беларускай школы, Саюз студэнтаў-беларусаў і інш.

За сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне

У выніку захопу Заходняй Беларусі буржуазнай Польшчай беларускі народ аказаўся раздзеленым на дзве часткі. На ўсходніх землях Беларусі ішло будаўніцтва сацыялізму, развівалася эканоміка і культура, паляпшаўся дабрабыт народа. На заходнебеларускіх землях усталявалася ўлада польскіх памешчыкаў і буржуазіі, панавалі эксплуатацыя працоўных і нацыянальнае бяспраўе.

Працоўныя Заходняй Беларусі вялі актыўную барацьбу за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз'яднанне з БССР. У кастрычніку 1923 г. была створана Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая ўзначаліла гэту барацьбу. У Косаўскім павеце камуністычныя арганізацыі дзейнічалі ўжо ў 1922 г. Цэнтрам іх яднання была вёска Яглевічы, жыхары якой Антон Клютко, Рыгор Бахур, Мікалай Перавалоцкі, Максім Муца арганізавалі ячэйкі КПЗБ у Борка-Гічыцкай і Косаўскай гмінах і аб'ядналі іх у падрайкомы: Івацэвіцка-Яглевіцкі, Любішчыцка-Падстарынскі, Гошчаўска-Аляксейкаўскі. Паліцыя, даведаўшыся аб стварэнні падрайкомаў, пачала арыштоўваць камуністаў. Але тыя, хто пазбег арышту, працягвалі работу. А пазней былі арганізаваны яшчэ 4 падрайкомы: Галіцкі і Харошчанска-Буленскі ў Косаўскай гміне, Козіцкі ў гміне Борка-Гічыцкай і Пескаўскі ў гміне Пескі. У 1924 г. Пескаўскі падрайком далучыўся да Бярозаўскага райкома КПЗБ Пружанскага павета.

У сярэдзіне 1924 г. на канферэнцыі ў вёсцы Яглевічы быў выбраны Косаўскі райком КПЗБ, які падпарадкоўваўся Баранавіцкаму акруговаму камітэту. У яго склад уваходзілі таксама падрайкомы Целяханскі, Святавольскі і Ганцавіцкі. Адным з актыўнейшых членаў Косаўскага райкома быў Аляксандр Свяргун, камсамолец з 1920 г.

Пасля стварэння Косаўскага райкома ўзмацнілася рэвалюцыйная агітацыя сярод насельніцтва. Павялічылася колькасць вывешаных лозунгаў і распаўсюджаных лістовак, якія дастаўляліся з Баранавіцкага акруговага камітэта. Па начах члены райкома збіраліся на сходы каля могілкавай капліцы ў Косава, у вёсцы Галік, у лесе. Агітацыйна-прапагандысцкая работа камуністаў была настолькі дзейснай, што на райком працавалі ўсе служачыя праўлення Борка-Гічыцкай гміны, пачынаючы з войта і канчаючы кур'ерам. Лозунгі пісаліся і захоўваліся ў памяшканні гміннага праўлення. Паліцыя і не падазравала, што орган мясцовай улады ўдзельнічае ў антыўрадавай дзейнасці.

Адначасова с арганізацыяй КПЗБ дзейнічалі і камсамольскія ячэйкі ў вёсках Галік, Яглевічы, Косаўскі РК КСМЗБ. Партыйна-камсамольскія арганізацыі Косаўскага павета былі цесна звязаны з арганізацыямі Баранавіцкага, Ваўкавыскага, Пінскага, Пружанскага і Слонімскага паветаў. Рэвалюцыйны рух у павеце станавіўся ўсё больш масавым. З 1 ліпеня 1925 г. пачаліся масавыя арышты камуністаў, якія працягваліся да 1 снежня 1925 г. За гэты час было арыштавана 54 члены Івацэвіцкага, Яглевіцкага, Любішчыцка-Падстарынскага, Гошчаўска-Аляксейкаўскага падрайкомаў КПЗБ.

Але 5 жніўня 1926 г. у вёсцы Бабровічы, 6

верасня ў вёсцы Аляксейкі, 28 верасня ў вёсцы Азарычы былі вывешаны лозунгі і расклеены лістоўкі — на месцы арыштаваных станавіліся новыя байцы.

У 1925 г. была створана арганізацыя пад назвай Беларуская сялянска-рабочая грамада, якая стаяла на пазіцыях нацыянальна-вызваленчага руху. У праграме Грамады былі адлюстраваны патрабаванні шырокіх народных мас, і ў першую чаргу сялянства, а менавіта: права народа на самавызначэнне, аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у адзінай рэспубліцы, вызваленне сялянства ад падаткаў, барацьба за 8-гадзінны рабочы дзень, дапамога беспрацоўным і г.д. Грамада стваралася пад непасрэдным кіраўніцтвам КПЗБ. Так, на сходзе Косаўскага райкома ў вёсцы Яглевічы ў 1926 г. камуністам было даручана арганізаваць гурткі Грамады. Грамада прымала самы актыўны ўдзел ва ўсіх палітычных кампаніях КПЗБ.

У лістападзе 1926 г. гурткі Грамады і ячэйкі КПЗБ падрыхтавалі дэманстрацыю, прысвечаную гадавіне Кастрычніка. Напярэдадні 7 лістапада камсамолкі з вёскі Яглевічы Кацярына і Алена Клютко і Вольга Бахур вышылі сцяг. Але ў ноч на 5 лістапада паліцыя правяла вобыск і арыштавала дзяўчат, а сцяг канфіскавала. Аднак вечарам 6 лістапада селянін вёскі Новая Гаць Сідар Басалай прынёс да краўца чырвонае палотнішча і папрасіў сшыць сцяг.

Усім гурткам Грамады былі разасланы пісьмы с заклікам прыняць удзел у дэманстрацыі. А каб адцягнуць увагу паліцыі, камітэт Грамады прызначыў на наступны дзень пасяджэнне ў аддаленых гуртках. І ў нядзелю большая частка паліцэйскіх раз'ехалася для ўстанаўлення нагляду над гурткамі. А ў вёску Святая Воля ішлі людзі. Да трох гадзін дня на плошчы каля могілак сабралася каля 300 чалавек. Узвіўся чырвоны сцяг. Дэманстранты заспявалі «Інтэрнацыянал». А потым абвясцілі лозунгі: «Няхай жыве Кампартыя!», «Няхай жыве Беларусь!». Паліцыянт загадаў разысціся. Але ніхто яго не слухаў. Прамоўца, які выступіў на мітынгу, расказаў аб значэнні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Былі раскіданы лістоўкі.

Грамада вяла барацьбу за паўсядзённыя патрабаванні сялян. У яе гурткі ўлівалася ўсё больш народу. Бурны рост Грамады, яе поспехі ў кіраўніцтве барацьбой працоўных мас супраць эканамічнага, нацыянальнага і палітычнага прыгнёту сур'ёзна ўстрывожылі ўрад. Таму ў ноч з 14 на 15 студзеня 1927 г. па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі пачаліся адначасова масавыя вобыскі і арышты. На працягу двух дзён было арыштавана больш за 400 чалавек. У адказ на рэпрэсіі абураныя працоўныя арганізавалі дэманстрацыі і сходы пратэсту.

З лютага 1927 г. на рынку Косава сабраліся людзі з навакольных вёсак на дэманстрацыю пратэсту супраць разгрому Грамады. Каля 1500 сялян з чырвонымі сцягамі і надпісамі: «Вызваліць усіх палітзняволеных!» і спяваннем «Інтэрнацыянала» прайшлі па вуліцах. На мітынгу выступіў сакратар Целяханскага падрайкома КПЗБ Мікалай Дзягцярык. Паліцыя адкрыла стральбу па дэманстрантах, 6 чалавек было забіта, некалькі дзесяткаў паранена, 7 чалавек арыштавана.

На другі дзень адбылося пахаванне забітых, якое вылілася ў магутную маніфестацыю супраць дэспатызму паліцыі. Калі былі праведзены арышты актыву Грамады ў Ружанах, то больш за тысячу сялян прыбылі да паліцэйскага ўчастка і патрабавалі вызваліць арыштаваных.

У вёсцы Гошчава ў адказ на расстрэл дэманстрацыі каля 30 падлеткаў прайшлі па вёсцы з чырвоным сцягам і спяваннем рэвалюцыйных песень.

У канцы лютага Косаўскі райком КПЗБ набыў шапірограф, а да 8 сакавіка надрукаваў лістоўкі. 8 сакавіка на перакрыжаванні шашы ў вёсцы Любішчыцы сабраліся на дэманстрацыю людзі. Неслі сцягі, спявалі рэвалюцыйныя песні.

Работа Косаўскага райкома ўзмацнялася. У лютым — сакавіку 1928 г. паліцыя арыштавала яго членаў. Але ў другім паўгоддзі 1928 г. склад РК быў адноўлены. Наладжана сувязь з Баранавіцкім акруговым камітэтам КПЗБ. У гэты час Косаўскаму райкому падпарадкоўвалася сем падрайкомаў.

Гэтыя арганізацыі актыўна ўдзельнічалі ў распаўсюджванні лістовак і лозунгаў супраць урадавага зместу.

У чэрвені 1929 г. каля вёсак Кушняры і Падстарынь адбылася канферэнцыя райкома, на якой быў выбраны прэзідыум. Працягваў

работу і Косаўскі райком КСМЗБ, якому падпарадкавалася 5 груп камсамольскіх ячэек. Актыўна дзейнічала камсамольская ячэйка ў вёсцы Размеркі.

У ліпені 1931 г. пракаціласа хваля арыштаў членаў Косаўскіх райкомаў КПЗБ і КСМЗБ. Кіраўніцтва дзейнасцю ўцалелых ячэек, якія знаходзіліся ў вёсках Яглевічы і Галенчыцы, ажыццяўляў Целяханскі райком КПЗБ. У жніўні 1932 г. зноў пракаціласа хваля арыштаў. І адразу Целяханскі райком стаў аднаўляць работу Косаўскага райкома. Праз два месяцы члены Косаўскага райкома праводзілі антыпадатковую работу сярод сялян і распаўсюджвалі лістоўкі. У верасні 1933 г. выйшаў з турмы арыштаваны за ўдзел у Косаўскай дэманстрацыі Піліп Пестрак. Ён падтрымліваў сувязь з інструктарам ЦК КПЗБ Аляксандрам Багданчуком і пры яго дапамозе прыступіў да аднаўлення дзейнасці Косаўскіх райкомаў КПЗБ і КСМЗБ. Праз некаторы час на дарогах паявіліся лістоўкі, на вуліцах вёсак і мястэчак — чырвоныя сцягі. Дзейнасць райкома стала яўнай. І паліцыя, высачыўшы Пестрака, рашыла яго арыштаваць. Яму ўдалося схавацца ў Пінску, але ў лютым 1934 г. яго ўсе-такі арыштавалі. Аднак работа Косаўскага райкома працягвалася. 1 мая 1934 г. адбылася дэманстрацыя ў вёсцы Даргужы.

Партыйныя арганізацыі Косаўскага павета вызначаліся высокаю ініцыятываю. Іх работа была масавай. Яны адгукаліся на любыя масавыя выступленні працоўных, спяшаліся з дапамогаю. Так, для падтрымкі возчыкаў Ружанскай пушчы камуністы Ружанскага райкома арганізавалі дружыны самааховы з 40 чалавек. Акрамя палітычнай свядомасці, яны неслі масам агульныя веды і арганізавалі сярод сялян гурток па ліквідацыі непісьменнасці. Пад кіраўніцтвам камуністаў арганізавана вялася барацьба сялян вёскі Альшаніца супраць камасацыі (хутарызацыі). Улады вымушаны былі прыслаць у дапамогу каморнікам значны атрад паліцыі.

Да студзеня 1929 г. на тэрыторыі гмін Борка-Гічыцкай, Святой Волі і Целяхан дзейнічала звыш 20 ячэек КПЗБ, якія падпарадкоўваліся Косаўскаму райкому. Ураган арыштаў, які пранёсся ў студзені 1929 г., спыніў дзейнасць ячэек. Схаваўшыся ад арыштаў, таварышы па барацьбе ўстанавілі сувязь з Пінскім акруговым камітэтам і арганізавалі ячэйкі КСМЗБ. Затым было арганізавана яшчэ некалькі ячэек і Целяханскі гарком КПЗБ, які прыступіў да арганізацыі сельскіх ячэек. У канцы 1930 г. ён быў рэарганізаваны ў Целяханскі райком КПЗБ. Цэнтр яго знаходзіўся ў Целяханах, затым быў перанесены ў Гічыцы.

Целяханскі райком адносіўся да ліку актыўных арганізацый Косаўскага павета. У Целяханах дзейнічала піянерская арганізацыя. Ва ўсіх сельскіх ячэйках былі арганізаваны групы самаабароны з 50 чалавек. Райком меў шапірограф, на якім у Целяханах друкаваліся лістоўкі, якія затым распаўсюджваліся па ячэйках. Тут падтрымлівалася барацьба сялян з уладамі, якія забаранялі пасьбу жывёлы ў панскіх і дзяржаўных лясах. Бараноўскі ляснічы скардзіўся, што пры выпасе жывёлы ў лясах наносіцца шкода, і вельмі часта сяляне абдзіраюць лазу, з якой затым плятуць лапці. Гэтая скарга на жытлінцаў была даведзена нават да ведама косаўскага старосты.

У 1931 г. Целяханскі райком актыўна рыхтаваўся да святкавання 1 Мая. Але ў красавіку паліцыя выявіла архіў райкома, што паслужыла падставай да ліквідацыі апошняга. 24 красавіка 1931 г. у сваім данясенні палескаму ваяводзе косаўскі староста дакладваў, што Целяханскі райком спыніў сваё існаванне. Аднак хутка ён быў адноўлены. Апошнім месцам яго базіравання была вёска Вулька. Але арышты працягваліся, дзейнасць райкома слабела, шмат якія камуністы былі заключаны ў турмы і ў канцлагер Бяроза-Картузская.

У гады эканамічнага крызісу, калі рэвалюцыйны рух развіваўся асабліва бурна, камуністы, якія ў верасні 1933 г. вярнуліся з турэмнага зняволення і пражывалі ў Івацэвіцкай гміне, арганізавалі ў 1934 г. Любішчыцкі райком КПЗБ, які стварыў ячэйкі ў вёсках Гічыцы, Яглевічы, Яблонка, Панкі і іншых, аднавіў перарваную ў выніку арыштаў работу. Найбольш актыўнай была ячэйка ў вёсцы Гічыцы. Арышты камуністаў працягваліся няспынна. Дзейнасць райкома амаль замірала. У сакавіку 1935 г. з драгобыцкай турмы вярнуўся камуніст Аляксандр Свіргун, які прыступіў да наладжвання кантактаў. 22 чэрвеня 1935 г. у вёсцы Уласаўцы была праведзена канферэнцыя, на якой быў выбраны склад Любішчыцкага райкома. У чэрвені 1935 г. у

Гічыцы прыехала інструктар ЦК КПЗБ Софія Мікушка пад псеўданімам Вішнеўская Марыя, Надзя. На праведзеных ёю канферэнцыях Свіргун быў назначаны членам Слонімскага АК КПЗБ, але ў ліпені таго ж года паліцыя арыштавала Мікушка і Свіргуна. Да найбольш актыўных ячэек Косаўскага павета адносіліся ячэйкі ў вёсцы Яглевічы, дзе членамі былі Вольга Бахур, Сцяпан Пытляк, у вёсках Азярцо, Любішчыцы і інш.

Ячэйка ў вёсцы Азярцо на 1 Мая 1929 г. вывесіла каля царквы сцяг. У вёсцы Любішчыцы ячэйка КПЗБ дзейнічала з 1927 г. 14 красавіка 1929 г. у сувязі з падрыхтоўкай да 1 Мая ў вёсцы адбыўся сход трох ячэек КПЗБ. На 8 сакавіка 1932 г. члены ячэйкі распаўсюджвалі лістоўкі.

Актыўнай была ячэйка КПЗБ у вёсцы Уласаўцы, якая дзейнічала з 1931 г. Члены ячэйкі вялі актыўную антыпадатковую палітыку, у выніку якой органы ўлады для падаўлення антыпадатковага выступлення сялян вымушаны былі выслаць эскадрон улан у вёску Жытлін.

Пад 1934 г. у Польшчы актывізаваліся рэакцыйныя элементы. У 1934 г. быў адкрыты канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай, куды заключалі найбольш актыўных палітычных дзеячаў. У 1933 г. у Косаўскім павеце быў створаны спецыяльны камітэт барацьбы з камунізмам. Дзейнічаў інстытут навуковага даследавання камунізму, дзейнічалі саюзы легіянераў, асаднікаў, стральцоў і іншыя, якія вялі барацьбу з вызваленчым рухам. Рэпрэсіі паліцыі, ізаляцыя рэвалюцыйных элементаў, вярбоўка моладзі ў прафашысцкія і правыя арганізацыі — усё гэта вяло да аслаблення рэвалюцыйнага руху. Калі ў 1936 г. дзеючых партыйных арганізацый было 76, а членаў у іх — 202, то на канец 1937 г. засталося 27 арганізацый. Гэтаму спрыяла рашэнне Камінтэрна аб роспуску Кампартый Польшчы і Заходняй Беларусі ў сувязі з несправядлівым абвінавачаннем у здрадзе.

Косаўскі староста ў кастрычніку 1938 г. даносіў палескаму ваяводзе, што ў Косаўскім павеце няма райкома КПЗБ, дзейнасць камуністычных арганізацый амаль спынілася.

Але камуністы прадаўжалі барацьбу. Яны арганізавалі гурткі МОПР, а таксама распаўсюджвалі газету «Шлях перамогі», праводзілі вярбоўку моладзі на вайну ў Іспаніі.

Нельга не адзначыць ролі ў нацыянальна-вызваленчым руху ў павеце арганізацый Таварыства беларускай школы, Беларускага рабоча-сялянскага пасольскага клуба. Вызначалася актыўнасцю дзейнасць пасла сейма Івана Грэцкага, які падвяргаўся няспыннай слежцы з боку паліцыі, аб чым сведчаць шматлікія даносы паліцэйскіх чыноў.

Упартаю і працяглаю была барацьба працоўных Косаўскага павета за свае сацыяльныя і нацыянальныя правы. На працягу амаль 20 год Кампартыя Заходняй Беларусі заставалася кіраўніком і арганізатарам гэтай барацьбы. І тым не менш у жніўні 1938 г. яна была беспадстаўна абвінавачана і распушчана, а большасць яе членаў падвергнута беспадстаўным палітычным рэпрэсіям.

Матэрыял падрыхтавалі па дакументах Брэсцкага абласнога дзяржаўнага архіва
М. Банасевіч, В. Мароз.

Адозвы палымянае слова

Трэцяга лютага 1927 г. у адказ на расправу ўрада Пілсудскага з членамі легальнай арганізацыі працоўных Заходняй Беларусі — Беларускай сялянска-рабочай грамады — рабочыя саматужных майстэрняў і сяляне Косава і навакольных вёсак выйшлі на масавую дэманстрацыю пратэсту.

Дэманстрацыя была расстраляна. Але кроў яе ахвяр шырока ўскалыхнула народныя масы. Тады ж у Вільні была надрукавана і распаўсюджана сярод рабочых і сялян адозва, у якой Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі заклікаў рабочых і сялян да актыўных выступленняў супраць расстрэлу ўдзельнікаў рэвалюцыйнай дэманстрацыі ў Косаве.

Кожны радок адозвы, над якой стаяць гарачыя словы «Супраць крывавага расстрэлу ў Косаве. Далоў фашысцкіх катаў!», гучыць нібы набат, які знаходзіў дарогу да сэрца кожнага прыгнечанага няпраўдай і насіллем беларуса. «Фашысцкая дыктатура наносіць усё

новыя і новыя ўдары па працоўных, — гаворыцца ў адозве. — Масавыя арышты і разгромы рабоча-сялянскіх арганізацый ахапілі ўсю краіну. Рабоча-сялянскія масы не маглі спакойна глядзець на зверствы белага тэрору. Яны заявілі свой публічны пратэст супраць бяспраўя і насілля і дружна ўзняліся на абарону сваіх арганізацый і сваіх правадыроў. Рабочыя і сяляне адказалі на атаку фашыстаў рэвалюцыйным пратэстам, забастоўкамі і дэманстрацыямі, патрабуючы вызвалення арыштаваных паслоў і ўсіх палітычных вязняў. Адказам фашысцкіх катаў былі кулі і штыкі».

Далей у адозве гаворыцца, што ў Косаве рабоча-сялянскія масы ў некалькі тысяч чалавек дэманстравалі сваю салідарнасць з арыштаванымі таварышамі, пратэставалі супраць зверстваў фашысцкіх тэрарыстаў. «Урад выслаў супраць няўзброеных рабочых і сялян паліцыю і ўзброеныя банды фашысцкіх арганізацый — асаднікаў і стральцоў, — паведамляе ў сваім дакументе ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі. Фашысцкія каты — найміты памешчыкаў і капіталістаў — далі некалькі залпаў у няўзброеныя масы ўжо тады, калі дэманстранты самі пачалі разыходзіцца. Чатыры чалавекі забіты на месцы, некалькі дзесяткаў паранена, з іх некалькі чалавек тут жа памерлі. Ціхія вуліцы Косава былі заліты крывёю рабочых і сялян. Забойцы трыумфавалі. Пачаліся арышты і катаванні».

Цэнтральны Камітэт КПЗБ растлумачваў людзям, чым было выклікана такое крывапраліцце. Польскія каты бачылі канец свайму панаванню. Яны дрыжэлі ад страху перад магутнай салідарнасцю працоўных. Вось чаму яны расстрэламі і турмамі, катаргамі і катаваннямі, кулямі і штыкамі імкнуліся затрымаць магутную хвалю нарастаўшага рэвалюцыйнага руху. Іх задача — раз'яднаць працоўныя масы і разбіць па частках рэвалюцыйны рух.

«Але дарэмныя надзеі фашысцкіх катаў. Працоўныя масы Заходняй Беларусі не дадуць сябе справакаваць, як не дадуць і запалохаць сябе», — гаворыцца ў Адозве. Звяртаючыся да рабочых і сялян, ЦК КПЗБ заклікаў іх: «Пратэстуйце супраць крывавай Косаўскай расправы магутнымі тысячнымі дэманстрацыямі, прымайце на масавых мітынгах і сходах рэзалюцыі супраць расстрэлу рабочых і сялян». Цэнтральны Камітэт звяртаўся таксама да салдат з наступнымі словамі: «Салдаты, не страляйце ў вашых братоў — рабочых і сялян, якія змагаюцца за сваё і ваша вызваленне з-пад ярма капіталу. Беражыце вашы кулі для катаў і прыгнятальнікаў працоўных мас!».

Адозва ЦК КПЗБ заканчваецца палымяным заклікам да барацьбы: «Усе пад чырвоныя сцягі Кампартыі, пафарбаваныя крывёю косаўскіх рабочых і сялян! Вечная памяць таварышам, загінуўшым ад рук фашысцкіх катаў! Гонар косаўскім рабочым і сялянам, якія крывёю замацавалі свой саюз! Далоў фашысцкую дыктатуру! Няхай жыве рабоча-сялянскі савецкі ўрад! Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!».

М. Рымач.

Незабыўны дзень, незабыўныя ахвяры...

3 лютага 1927 г. у Косаве адбылася дэманстрацыя працоўных. Дзень гэты — незабыўны дзень салідарнасці рабочых і сялян, іх рашучасці змагацца за светлую будучыню, назаўсёды застаўся ў маёй памяці. Гераізм, самаадданасць удзельнікаў дэманстрацыі ўскалыхнулі не толькі Заходнюю Беларусь, але і ўсю Польшчу.

Дэманстрацыя была накіравана супраць прыгнёту польскіх акупантаў. Яна праходзіла пад кіраўніцтвам акруговага і Косаўскага раённага камітэтаў КПЗБ. Больш за паўтары сотні камуністаў і камсамольцаў узначалілі шэсце, сталі яго авангардам.

Над калонамі дэманстрантаў развяваліся чырвоныя сцягі, гучалі рэвалюцыйныя песні. Калі ж паліцыя пачала страляць у дэманстрантаў, прагучаў заклік: «Не даць сцягоў у рукі ворагам!». Тады ўдарыў кулямёт. Шэсць чалавек аддалі сваё жыццё за свабоду, больш 30 былі паранены. Я памятаю загінуўшых таварышаў па барацьбе: Міхаіла Сямёнавіча Еўтуха, Пятра Сямёнавіча Гаўруса, Мікалая Трафімавіча Таптала, Сяргея Сямёнавіча Вераб'я, Івана Іванавіча Кучука.

Дэманстрацыя была расстраляна. Турмы запоўніліся яе ўдзельнікамі. Здзекі, катаванні,

нечалавечыя ўмовы жыцця перанеслі мае таварышы — змагары за народную долю — А. Г. Свяргун, М. Ф. Трында, А. М. Уласавец, Г. Н. Здановіч, К. Д. Талочка, Н. Я. Дзягцярык, А. І. Касавец і многія іншыя.

М. Колтун, удзельнік Косаўскай дэманстрацыі 1927 г.

Слова пра Піліпа Пестрака

Знаёмства маё з Піліпам Сямёнавічам Пестракам пачалося даўно, уласна кажучы, завочна — па першаму зборніку яго вершаў «На варце» ў 1940 г. Тады шмат што з яго вершаў запала ў маю хлапечую душу (было мне семнаццаць). Уяўляўся чалавек мужны, адданы свайму народу барацьбіт, бясстрашны рэвалюцыянер-падпольшчык, нязломны вязень турэмных засценкаў Пілсудскага. Менавіта такім характарызаваў яго мой старэйшы брат Міхал, які, будучы скарбнікам ячэйкі ТБШ у вёсцы Сенькавічы, часта сустракаўся з Пестракам. Прадоўжылася маё знаёмства з Піліпам Сямёнавічам ужо пасля Айчыннай вайны, калі я працаваў у івацэвіцкай раённай газеце і завочна вучыўся ў БДУ на філалагічным факультэце. У 1958 г. я абараніў дыпломную работу па тэме «Жыццёвы і творчы шлях Піліпа Пестрака даваенаёўскага перыяду». У час працы над ёю мне давялося «прайсці» па даўніх сцежках паэта, сустрэцца і гутарыць з ім і яго паплечнікамі, пазнаёміцца з шэрагам архіўных дакументаў, што тычацца яго. Усё гэта і лягло ў аснову артыкула.

Піліп Сямёнавіч Пестрак нарадзіўся 27 лістапада 1903 г. у вёсцы Сакоўцы былога Косаўскага павета ў беднай сялянскай сям'і. У сем гадоў пачаў вучыцца ў Бусяжскім двухкласным вучылішчы і да пачатку імперыялістычнай вайны скончыў пяць яго аддзяленняў. У 1915 г. сям'я Пестракаў разам з іншымі бежанцамі апынулася на Паволжы — у сяле Максімаўка Бузулукскага павета Самарскай губерні.

Позняй восенню 1921 г. пасля 6-тыднёвага падарожжа сям'я Пестракаў дабралася з бежанства ў сваю родную вёску Сакоўцы. Непрыветна сустрэла радзіма. Тут усё было ў занядбе. «Чартапалох узнімаўся да самых стрэх, — расказваў мне аб тым часе Аляксандр Пестрак — малодшы брат Піліпа. — Наша невялікая хаціна, здавалася, у зямлю ўрасла, не пазнаць было яе. На палях, наўкола вёскі, разрослася густы бярэзнік. Адусюль дыхала пустэчай. Людзі, якія, падобна нам, вярнуліся сюды з бежанства нядаўна, сланяліся нібы прывіды. Худыя, у лахманах. І за што было рукі зачапіць? З чаго пачаць? Халодным здаваўся свой родны кут, мачыхай выглядала радзіма...»

Жахлівыя дні перажывалі сакаўчане пасля вяртання з бежанства. Ад недаядання, знясілення на людзей накідвалася розная немач. Найбольш даваў аб сабе знаць тыф. Не абмінуў ён і маленькую хатку Пестракаў. Хутка памерлі брат Піліпа Васіль, сястра Вера, а потым, у 48 гадоў, і бацька — Сямён Паўлавіч Пестрак.

Перацярпеўшы некалькі тыфозных прыступаў і крыху аправіўшыся ад хваробы, Піліп на 19-м годзе жыцця пайшоў з меншым бра-

Помнік у памяць дэманстрацыі 1927 г.

там Міколам шукаць заробку, каб хоць як-небудзь аблегчыць існаванне сям'і. Пачалі працаваць на лесапільні Броннай Гары, што ў Бярозаўскім раёне.

Нялёгкай была работа, мізэрны заробак. Пры 10—14-гадзіннай працы ён складаў усяго 35—55 працэнтаў таго, што атрымлівалі рабочыя Варшавы. Каб што-колечы выкраіць з яго для сям'і, самім даводзілася жыць галаднавата. Рабочыя лесапільні туліліся на голых нарах, спалі і пад нарамі. Не абыходзілася і без вострых захворванняў.

Нягледзячы на такое быццё, Піліп Пестрак імкнуўся трымаць сябе бадзёра. З цягам часу пачаў разумець, што не адыходам ад жахлівай рэчаіснасці здабудзе сабе шчасце працоўны чалавек, а ўпартай барацьбой супраць яе носьбітаў, барацьбой разам з іншымі людзьмі.

Няроўная, жорсткая барацьба беларускага народа на «крэсах усходніх» за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне разгарнулася з першых жа гадоў пасля гвалтоўнага адрыву заходнебеларускіх зямель ад Савецкай Беларусі. Косаўшчына (былы Косаўскі павет) багата рэвалюцыйна-вызваленчым рухам. Тут у гарніле рэвалюцыйнай барацьбы, у падполлі фарміраваўся, рос і гартаваўся паэт-барацьбіт, паэт-трыбун Піліп Сямёнавіч Пестрак.

Душой рэвалюцыйнай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі ў гады польскай акупацыі з'яўлялася КПЗБ. На Косаўшчыне партыйныя ячэйкі пачалі інтэнсіўна стварацца пачынаючы з 1923 г. Да 1926 г. у населеных пунктах павета іх было ўжо каля ста. У Косаве дзейнічаў подпольны райком КПЗБ.

Чым жа займаўся ў гэты перыяд П. С. Пестрак?

Ужо на першым годзе працы на броннагорскай лесапільні ён трапіў на падазрэнне адміністрацыі прадпрыемства толькі за тое, што «тэн хлоп Пестрак» занадта многа штосьці чытае ў нядзельныя дні, ды нейкія там размовы ўсё заводзіць з «работнікамі». Відавочна, «бардзо выкшталцоны». А такія працадаўцам былі непатрэбны. І начальства пастаралася хутка пазбавіцца ад яго.

Пазбаўлены кавалка хлеба, Піліп вымушаны быў вярнуцца дамоў, у галодныя Сакоўцы, тоячы ў душы нянавісць да прыгнятальнікаў, да тых, хто штодня прыносіў працоўным незлічоныя крыўды. Сям'я жыла бедна, маці была зусім знясіленая. І ён зноў пайшоў у пошукі заробку. А знайсці яго ў той час было няпроста: хлопца-беларуса не хацелі прымаць на прадпрыемствы. Ды і іх было нямнога. Нарэшце пашчасціла: у 1923 г. ён стаў служыць лесніком у купца-лесапрамыслоўца.

На лесніковай службе Піліп выношвае план уцёку ў Савецкі Саюз. Летам 1924 г. ён здзяйсняе сваю задуму: пакідае службу і ідзе на ўсход. Але не наканаваў яму лёс такім чынам пазбавіцца ад панскай няволі. На граніцы яго затрымалі і па этапу прыгналі дахаты. Тут — месячнае зняволенне, першыя допыты, першыя гумавыя дубінкі ў паліцэйскім засценку ў Косаве.

Той час, калі Піліп Сямёнавіч адбываў месяц «казы» (валаснога арышту), не прайшоў бясследна. Ён шмат перадумаў, сустрэўся з людзьмі, якія паказалі яму шлях да вызвалення — шлях рэвалюцыйнай барацьбы.

1926 год. Косаўскі падпольны райком КПЗБ накіраваў П. Пестрака працаваць у павятовы камітэт Беларускай сялянска-рабочай грамады ў якасці афіцыйнага скарбніка (казначэя). Кожны дзень у легальны камітэт Грамады прыходзілі людзі. Яны прыносілі пратаколы сялянскіх сходаў і нізавых арганізацый БСРГ, скаргі сялян на несправядлівасці памешчыкаў і асаднікаў, панскіх леснікоў. Сюды ж прыносілі і грошы, сабраныя арганізацыямі БСРГ, ТБШ і МОПРа. Народныя сродкі трэба было неадкладна накіроўваць па вызначанаму рэчышчу — на дапамогу палітвязням, на дапамогу падпольнаму друку.

Неафіцыйна працуючы юрыдычным кансультантам Грамады, Пестрак меў шмат сустрэч з людзьмі, гутарыў з імі, вывучаў сітуацыю, раіў, як лепей паступаць.

Яго словы паўсюдна ў павеце, ды і за яго межамі, гучалі прызыўным набатам да змагання. Дарэчы, аб гэтай накіраванасці грамадскай дзейнасці яскрава сведчыць першы надрукаваны ў часопісе «Родныя гоні» верш «Наперад, гэй...» (Вільня. № 5. 1927).

Да родных ніў пальецца спеў
З прызывам усіх да працы,
Дагэтуль шчасця хто не меў,
Пайдзі яго шукаці.

І з гучным зовам зашуміць

Наш лес многавяковы —
Там сонца праўды заблішчыць,
Асвеціць пушчы сховы.

Наперад, гэй, хутчэй, хутчэй
Да тэй жаданай мэты,
Хай сонца блісне нам святлей,
Асвеціць шлях асветы.

Напісаны ён у в. Сакоўцы і датаваўся 20 чэрвеня 1926 г. Пасля надрукавання, нібы гімн, разляцеўся па ўсёй Заходняй Беларусі. У яго заключнай страфе гучаў прамы заклік да барацьбы:

Уставай, галодны беларус,
Служыць радзімай справе.
Скінь з плеч прыгоны і прымус,
Здабудзь дарогу к славе.

... 1927 г. увайшоў у гісторыю Заходняй Беларусі як год ашалелага наступлення пілсудчыкаў на жыццёвы ўзровень, палітычныя, сацыяльныя і нацыянальныя правы працоўных польскай калоніі, якой была тады Заходняя Беларусь. У тым годзе была разгромлена Грамада, пачаўся і разгром КПЗБ. Але народ не падаў духам, хваля яго супраціўлення не спадала. Паўсюдна праходзілі палітычныя дэманстрацыі, мітынгі пратэсту. Арганізавана рыхтавалася падобная акцыя і ў Косаўскім павеце. Як член райкома, актыўны ўдзел у гэтай справе прымаў і Піліп Пестрак. Палітычная дэманстрацыя пратэсту супраць разгрому Грамады адбылася. Вось як аб гэтай падзеі сведчыў у абвінаваўчым акце дзейнасці Косаўскага РК КПЗБ з канца снежня 1925 г. да чэрвеня 1927 г. памочнік павятовага пракурора Я. Кораб-Карповіч:

«3 лютага 1927 года ў Косаве на рынку зграмадзіўся велізарны натоўп сялян з навакольных вёсак са сцягамі і антыўрадавымі надпісамі на іх. Наступныя надпісы на плакатах былі на беларускай мове: «Вызваліць усіх палітычных вязняў!», «Прэч вайну з СССР!», «Няхай жыве сусветная рэвалюцыя і пралетарыят!», «Няхай жыве Камуністычная партыя Заходняй Беларусі!» (Брэсцкі аблдзяржархіў. Ф. Р-69. Л. 15).

Найміты Пілсудскага кроўю захліснулі дэманстрацыю Косаўшчыны: пяць чалавек было забіта на месцы, больш за 30 паранена.

Як і трэба было чакаць, пасля масавых выступленняў працоўных, услед за падзеямі ў Косаве, масоўкі прайшлі ў Любішчыцах, Святой Волі, Вульцы-Аброўскай, Козіках і іншых населеных пунктах; у павеце пачаліся арышты падпольшчыкаў. Рэакцыя лютавала. Арыштаваны быў і Піліп Пестрак. Пасля дэфензівы малады рэвалюцыянер быў кінуты ў турму, дзе знаходзіўся шэсць месяцаў пад следствам. Вырваўшыся на волю, ён зноў акунаецца ў падпольную дзейнасць. З грудзей вырываюцца радкі верша «На ветры» (1936):

Я па днях цэлы тыдзень ляжаў у гумне,
А начамі мерыў падпункты,
І стрэхі шапталі паролямі мне,
Раджаліся песні і бунты...

Асцярожна хадзіў Пестрак па роднай зямлі. Хадзіў і сеяў добрае насенне, верыў — яно дасць дружныя ўсходы. Хадзіў і сеяў, а за ім чорнаю вужакаю поўзалі найміты пілсудчыкаў.

1929 г. Пестрака арыштоўваюць. Дэфензіва, допыты і катаванні. Затым суд і турма. Пяць гадоў турэмнага зняволення, пяць гадоў за сырымі мурамі гродзенскага астрога.

Трапіўшы за астрожныя краты, Піліп Пестрак не паў духам. За турэмнымі сценамі ён бярэцца за пяро, каб словам паэта размаўляць са сваім народам, словам-громам працягваць барацьбу.

У сырых і цёмных лёхах гродзенскай, затым лукішкінскай і пружанскай турмаў ствараліся палымяныя радкі паэтычных твораў, якія, вырваўшыся на волю, даходзілі да сэрцаў і свядомасці працоўнага чалавека.

Былому члену Косаўскага райкома КПЗБ, жыхару в. Яглевічы пэўны час давялося разам з П. Пестракам сядзець у гродзенскім астрозе. Ён успамінаў:

«... На прагулках у турэмным двары сустракаўся з нашым паэтам Піліпам Пестракам. Прызнанне паэта ён атрымаў ужо ў 1930 годзе сярод усіх палітвязняў турмы. Ведалі яго як паэта і на волі, вершы перадаваліся туды з людзьмі, якія выходзілі з астрога».

У турме, як і раней на волі, паэт не цярпеў смутку. Як заклік да нястомнай барацьбы, гучалі ў казематах яго словы з паэмы «Ганцы»:

Мацуйся, мой браце, у крывавым змаганні
За вольнасць радзімай забітай зямлі.

Няўжо ж нам заўсёды мадзець у стагнанні,
Жыць тым, што вякі падняволля далі.

П. С. Пестрак не разумеў сябе па-за грамадствам. Яго лірычны герой — мужны, да канца адданы справе рэвалюцыянер. Яму не страшныя «шабляў бліск і ляск капытаў, нагаек свіст у руках наймітаў». Яго не палохаюць страшныя мукі ў паліцэйскай катоўні. Ён, скатаваны да непрытомнасці, смела глядзіць у вочы катам і на іхняе пытанне: «Хто ты?» адказвае выклікам:

Хто я? Я — рымскі гладыятар,
Я — паншчыны катаўскай бунтар,
Я — Камуны Парыжскай аратар,
Я — цяперашніх дзён пралетар!

Кат, памерымся ж на сілы!
У маім сэрцы — грамада —
Лес камінаў і стрэх прагнілых —
І кату я іх не аддам.
(«Сціхніце, зоры», 1935).

Уплыў палымяных вершаў Пестрака на людзей быў відавочным. Яны рэвалюцыянізавалі масы. Моцна ўкараняліся яго творы на радзіме — Косаўшчыне. Тут яго ведалі і называлі «наш паэт». У вёсках Сакоўцы, Бусяж, Грыўда, Була, Харошча, Сенькавічы, Квасевічы і іншых вершы паэта часта дэкламаваліся на маладзёжных вечарынах; да некаторых вершаў аматары падбіралі мелодыі і тады гучэлі яны вечарамі на вясковай вуліцы:

Мы — зары палымяная раць,
Мы — агонь непамернага бунту,
Мы — ідзем разбіваць і зіяць,
Руйнаваць свет стары аж да грунту...

Мужны голас заходнебеларускіх літаратараў усё больш непакоіў польскія ўлады, якія рыхтавалі расправу над імі.

23—29 сакавіка 1936 г. адбыўся судовы працэс над паэтамі і пісьменнікамі Заходняй Беларусі. На судзе ў якасці абаронцы права на стварэнне літаратурнага фронту выступіў Піліп Пестрак. Звяртаючыся да суддзяў, ён заявіў (цытую па часопісу «Полымя», № 9. 1945. С. 106):

«Так, мы — паэзія бунту, бо мы не можам не бунтавацца. Вы стварылі такія ўмовы, што нават ксёндз Казімір Сасек бунтуе. Вы называеце нас крамольнікамі за тое, што мы клічам да бунту. Вялікі польскі патрыёт Жэромскі, які аплакваў польскіх паўстанцаў, таксама ў вачах рускага царызму быў крамольнікам. Вы называце нас імгліцай. З імгліцы фармуюцца зоры. А чым ноч цямней, тым ясней гараць зоры...».

Судовая расправа, учыненая над палітвязнем Пестракам і яшчэ пятнаццаццю яго пабрацімамі, не прымусіла паэта змоўкнуць. Голас яго гучаў яшчэ больш магутна і прызыўна:

Пружынься, крок мой цвёрда,
Шумі,
Хто ж паход, —
Хто ж, як не мы,
Галаву падыме горда,
Каб узысці на эшафот?!
Гары, у кім песні не астылі
Ў паходах-штурмах на Бастылію!
(«Пасля прысуду», красавік 1936).

Памыліліся каты, спадзеючыся новым прысудам адбіць ахвоту ў Пестрака і другіх прагрэсіўных літаратараў тварыць магутнае слова, што клікала на барацьбу за свабоду свайго народа. Гэтае слова гучала да вераснёўскіх дзён 1939 г.

Ф. Хаванскі.

Праз выпрабаванні

Наш бурны век не скупіўся на выпрабаванні. Нямала выпала іх на долю Рыгора Мікалаевіча Здановіча. Рэвалюцыя застала яго пад Смаргонню, на захопленай немцамі тэрыторыі. З вялікімі цяжкасцямі прабіраўся праз лінію фронту да сваіх у сяло Лебядзень Тамбоўскай вобласці, дзе жылі ў эвакуацыі бацькі. Там у 1918 годзе разам з братам Канстанцінам уступіў дабравольцам у Чырвоную гвардыю. Байца накіроўваюць у харчатрад. Адразу пасля вяртання ў родную Быч Рыгора Мікалаевіча выклікаў да сябе ў Мерачоўшчыну «пан староста». Папярэдзіў:

— Тут табе не Саветы. Калі што — хутка дух бальшавіцкі выб'ем... На кожным кроку давалі паны адчуць простаму селяніну, што

ён не чалавек, што ён — мужык, быдла, бяспраўны і паднявольны.

— Не можа быць, — думаў Рыгор Мікалаевіч, — каб людзі змірыліся з такім становішчам. Многія ж былі ў Расіі, бачылі новае жыццё.

Неўзабаве праз Івана Аляксандравіча Раўбецкага ён пазнаёміўся з аднымі з першых арганізатараў камуністычнай ячэйкі ў Яглевічах — Мікалаем Перавалоцкім, Іванам Бахурам, Антонам Клютко. А ў 1924-м Рыгора Здановіча прымалі ўжо ў рады КПЗБ. На партыйны сход сабралася чалавек 14.

Камуністы вялі сярод насельніцтва вялікую агітацыйную работу, распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, вывешвалі на рэвалюцыйныя святы сцягі і транспаранты. Выкарыстоўваліся і легальныя сродкі ўплыву на масы. К таму часу амаль ва ўсіх вёсках былі створаны арганізацыі Беларускай сялянска-рабочай грамады. Камуністы ішлі ў Грамаду, арганізоўвалі яе дзейнасць. Хутка ў доме Канстанціна Трацяка адкрылася народная бібліятэка, пачаў працаваць драматычны гурток, які паставіў некалькі спектакляў. Адзін з іх — па купалаўскай «Паўлінцы».

З прыходам да ўлады Пілсудскага рэакцыя перайшла да асабліва жорсткага падаўлення ўсяго жывога, светлага, перадавога. Забаранілі і Грамаду. Буру гневу і пратэсту выклікаў у людзей фашысцкі тэрор. Баранавіцкая акруговая канферэнцыя КПЗБ прыняла рашэнне правесці 3 лютага 1927 г. у Косаве масавую палітычную дэманстрацыю. У першых радах дэманстрантаў ішоў і Р. М. Здановіч.

Кулямі сустрэлі пілсудчыкі мірнае шэсце. Пасля першых стрэлаў застаўся ляжаць на бруку Рыгор Здановіч. Куля пашкодзіла галёначную косць. Толькі ў пяць гадзін вечара даставілі яго ў бальніцу. Ніхто не зрабіў чалавеку нават перавязкі. Праз тры дні наведаўся ўрач. Але і ён дапамогі ніякай не аказаў. На вачах у Рыгора Мікалаевіча памерлі раненыя Міхаіл Яўтух і Пётр Гарус.

Тры месяцы ляжаў у бальніцы Рыгор Здановіч. Тры месяцы дзяжурыў каля яго паліцэйскі. І тры месяцы ніхто яго не лячыў. Выбраўшы зручны момант, падышоў да Рыгора Здановіча фельчар Калаур. Сказаў:

— Прасіся на аперацыю ў Брэст. Тут толькі чакаюць, калі ў цябе адкрыецца газавая гангрэна. А тады — пішы прапала...

У просьбе не адмовілі. Блізкія аплацілі кошт праезду Рыгора і суправаджаючага яго паліцэйскага, а таксама кошт аперацыі. Адляжаў яшчэ тры месяцы ў брэсцкай бальніцы. Адтуль — у пружанскую турму. Выпусцілі да суда пад залог у 200 злотых. Дамоў з'явіўся на мыліцах, без нагі.

Але і гэта не зламала яго волю да барацьбы.

— Не ўсіх жа паны арыштавалі, — думаў, лежачы ў ложку, Рыгор Мікалаевіч. — Засталіся ж таварышы і на свабодзе. Трэба яшчэ цясней гуртавацца.

Не забылі пра Рыгора і яго баявыя сябры. Неяк летам завіталі ў хату Здановічаў дзяўчаты з Яглевіч Вольга Бахур, Алена Клютко. Пасядзелі, пагутарылі, пазнаёмілі з тым, як ідуць справы ў падпольшчыкаў. Вольга Бахур прынесла з сабою важны партыйны дакумент.

— Пісьмо гэтае, — сказала яна, — трэба тэрмінова перадаць у вёску Скураты Івану Казімірчыку. Нам несці яго далей небяспечна. Хто можа гэта зрабіць?

Выклікалі сакратара ячэйкі Івана Раўбецкага. Ён узяўся сам выканаць заданне. Адправіўся Іван у дарогу ў звычайны будзённы дзень. Але адзеўся па-святочнаму: новыя боты, касцюм, чыстая белая кашуля. І гэта, відаць, выклікала падазрэнне ў паліцэйскага Кордзюка. Раўбецкага затрымалі. Да паўсмерці збілі ў пастарунку. Іван не сказаў нічога. 6 гадоў турмы — такі быў яму прысуд. Бычанскую арганізацыю КПЗБ узначаліў Рыгор Здановіч.

У 1928 г. пачаліся масавыя арышты. Повадам паслужыла тое, што нехта ў Хадаках забіў лесніка. Хапалі ўсіх тых, на каго падала хоць малейшае падазрэнне ў падпольнай дзейнасці. Узялі і Рыгора Мікалаевіча. Чатыры гады турмы атрымаў ён за прыналежнасць да КПЗБ.

— Гэта былі гады, аб якіх цяжка ўспамінаць, — расказваў Рыгор Мікалаевіч. — Страшныя, жудасныя гады... Неяк адміністрацыя рашыла прыраўняць нас, палітвязняў, да крымінальнікаў. У знак пратэсту мы аб'явілі галадоўку. Узначалілі яе кіраўнікі турэмнага камітэта Піліп Пестрак, Ежы Кавальскі. Восем дзён ніхто нічога не браў у рот. Наглядчыкі надумалі карміць нас сілком. У час адной такой «кармёжкі» задушылі нашага таварыша Скульчыка.

Быў я і ў карцэры. Падлога заліта вадой. Ні

сесці, ні легчы. Якіх толькі здзекаў не чынілі над намі паны! Але бунтарскі дух наш заставаўся нязломным.

Вялікае жыццё пражыў Рыгор Мікалаевіч Здановіч. Увесь час знаходзіўся на пярэднім краі. Пасля вызвалення з турмы працягваў барацьбу з панамі, у гады Вялікай Айчыннай вайны — партызаніў. Потым аднаўленне разбуранай гаспадаркі, праца ў калгасе...

Такія яны людзі, такія сэрцы ў сапраўдных патрыётаў. Пакуль яны могуць біцца, яны б'юцца для людзей, для іх шчасця.

М. Радзюк.

Жыццё, абарванае куляй «сваіх»

Першыя ўрокі палітычнай барацьбы Мікола Перавалоцкі прайшоў яшчэ ў бежанстве. Там уступіў у часці асобага назначэння, а затым і ў камсамол. Камуністы мясцовай ячэйкі парэкамендавалі 16-гадовага юнака спачатку сакратаром Навахапёрскага сельсавета, а пазней — сакратаром камітэта беднаты вёскі Жыліна. Тут і напаткала Мікалая вестка аб тым, што бежанцы атрымалі магчымасць вярнуцца ў родныя мясціны.

Карп Асіпік у 1918 г. добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію, ваяваў супраць Калчака, Юдзеніча, Урангеля. Уступіў у партыю бальшавікоў. На радзіму вярнуўся ў 1921 г. і адразу наладзіў сувязь з мясцовымі падпольшчыкамі.

Карпу Асіпіку споўнілася 28 гадоў, Мікалаю Перавалоцкаму — 18. Яны сталі сябрамі. Мікалай даведаўся ад старэйшага таварыша, што тэрыторыю ад Івацэвіч да Пінска нават буржуазная прэса называла «Целяханскай савецкай рэспублікай». Гаспадарамі тут заставаліся беларускія партызаны. Перавалоцкі папрасіў Асіпіка пазнаёміць яго з партызанамі. У хуткім часе Міколу запрасілі на нелегальны партыйны сход, а праз некаторы час даверылі першае заданне.

У 1922 г. Польшча рыхтавалася да выбараў у сейм і сенат. Галасаванне было прызначана на лістапад. Камуністычная партыя рашыла ўдзельнічаць у выбарах. Знаходзячыся на нелегальным становішчы, камуністы ішлі на выбары пад «страхой» Саюза пралетарыяту горада і вёскі. Цэнтры Саюза знаходзіліся ў Варшаве і Вільні. Менавіта там знаходзілася наглядная агітацыя для правядзення перадвыбарнай работы. Кіраўнікі падполля паслалі ў Вільню Міколу Перавалоцкага і Пятра Уласаўца. Дарэчы, дэфензіва называла апошняга не інакш як «савецкім камісарам, прадстаўніком Масквы ў Заходняй Беларусі».

Паездка была ўдалай, агітацыйную літаратуру падпольшчыкам даставілі. Паколькі наглядная агітацыя лічылася легальнай формай выказвання поглядаў партыі, Перавалоцкі прыклеіў адзін плакат на станцыі Івацэвічы. Аднак паліцыя палічыла змест плаката антыдзяржаўным і рашыла правучыць Мікалая. Яго арыштавалі, пасадзілі ў драгічынскую турму і выпусцілі на свабоду толькі пасля выбараў. У турме ён пазбавіўся яшчэ двух зубоў.

...Арганізацыйна КПЗБ афармілася ў кастрычніку 1923 г. на першай нелегальнай нарадзе ў Вільні. Першым сакратаром Косаўскага раёна быў выбраны Мікалай Лаўрынавіч Перавалоцкі.

Чуткі аб стварэнні новай партыі хутка распаўсюдзіліся па раёну. Да камуністаў пацягнуліся людзі. Натуральна, аб новай партыі стала вядома і дэфензіве. У пачатку 1924 г. Перавалоцкага арыштавалі і на 20 месяцаў кінулі спачатку ў пінскую, а затым у гродзенскую турму. Прыпісвалі яму сувязь з партызанамі, стварэнне на Косаўшчыне Таварыства беларускай школы, арганізацыю забастовак лясных рабочых, падбухторванне сялян да нявыплаты падаткаў. Самым цяжкім абвінавачаннем у тыя гады лічылася папулярызацыя Краіны Саветаў.

Маючы данясенні шпікоў, у якіх утрымліваліся ўяўленні, але ніводнага неабвержанага доказу, Гродзенскі крымінальны суд быў вымушаны вызваліць падсуднага з-пад варты. Апынуўшыся к канцу 1926 г. на волі, Мікола ў хуткім часе быў уведзены ў склад Баранавіцкага акружкома КПЗБ.

За перыяд з 1920 г. па 1926 г. хлопец пражыў пяць арыштаў, зняволенне ў пружанскай,

драгічынскай, пінскай і гродзенскай турмах. На Перавалоцкага была складзена анкета наступнага зместу: «Перавалоцкі Мікалай Лаўрынавіч нарадзіўся 6 верасня 1903 г. у вёсцы Яглевічы Косаўскага павета Палескага ваяводства. Моцны, каржакаваты, валасы чорныя, пышныя, рост сярэдні, твар авальны, вочы карыя, нос прамы, у роце не хапае васьмі зубоў, спакойны...». Як бачым, у 23-гадовага хлопца ўжо не хапала васьмі зубоў. Пастараліся ў дэфензіве.

Прайшло некалькі месяцаў і Міколу зноў арыштоўваюць. Каб уратаваць падпольшчыка ад турмы, у канцы 1926 г. яго пасылаюць у Мінск у партыйную школу.

Па заканчэнні партшколы Мікола Перавалоцкі, цяпер ужо «Янка», у другіх месцах «Крапіва», «Тарас» удала перайшоў у раёне Пінска дзяржаўную граніцу і прыйшоў у роднае Палессе. За год тут многае змянілася. Некаторыя нізавыя арганізацыі КПЗБ былі разгромлены дэфензівай. У асобных вёсках былі створаны новыя ячэйкі партыі і камсамола. У пачатку 1928 г. была склікана акруговая партканферэнцыя, на якой Перавалоцкага абралі сакратаром Пінскага акружкома КПЗБ. І вось пад кіраўніцтвам новага сакратара ўсе 16 райкомаў Пінскага акружкома запрацавалі паўнакроўна і энергічна. Тым часам у Пінску разгарэўся канфлікт паміж рабочымі запалкавай фабрыкі і яе ўладальнікам. Рабочыя патрабавалі павышэння на 20 працэнтаў заработнай платы. Па рашэнню Пінскага гаркома і са згоды акружкома КПЗБ рабочыя аб'явілі забастоўку і пасля працяглай барацьбы перамаглі.

У маі 1928 г. у Пінск прыбыла ўпаўнаважаная ЦК КПЗБ Фаіна Цагельніцкая — «Яўгенія». Ад імя кіраўніцтва партыі яна прапанавала склікаць акружную партыйную канферэнцыю. Канферэнцыя аднагалосна выбрала дэлегатамі на першы з'езд КПЗБ Мікалая Перавалоцкага, Фаіну Цагельніцкую і Аляксандра Цупрыка. Першы з'езд выбраў Цэнтральны камітэт, у склад якога быў уведзены і Перавалоцкі.

На некалькі дзён Перавалоцкага затрымалі ў прадстаўніцтве ЦК КПЗБ. Тут ён атрымаў адрасы явачных кватэр і паролі. Разам з тым яго рэкамендавалі сакратаром Брэсцкага акружкома КПЗБ. Атрымаўшы пашпарт на імя Жоржа Чывіліса, ураджэнца горада Вільні, Перавалоцкі перайшоў знаёмай сцежкай граніцу і накіраваўся ў Івацэвіцкі раён. Ноччу дабраўся да вёскі Выганішча, у якой жыў яго знаёмы Павел Саўцін. Праз яго запрасіў на сустрэчу Пятра Уласаўца. Пётр з вялікай цікавасцю ўспрыняў інфармацыю аб першым з'ездзе КПЗБ, узяў літаратуру, дамовіўся аб сувязі.

На наступны дзень Перавалоцкі цягніком выехаў з Баранавіч у сталіцу Польшчы, 10 жніўня 1929 г. прыехаў у Брэст. У Варшаве Мікалая папярэдзілі, што на Брэстчыне добра адпрацавана сетка віжаў і дзейнічае вопытны правакатар. Таму Перавалоцкі рашыў на явачныя кватэры не ісці, а наведацца да старога знаёмага Уладзіміра Шандрука. Той працаваў азеляніцелем, што дазваляла яму быць у курсе ўсіх гарадскіх спраў. Перавалоцкі таксама ўладкаваўся ў брыгаду Шандрука азеляніцелем горада.

І ўсё ж па даносу правакатара яго ў сёмы раз арыштавалі, але ўжо на Косаўшчыне. Разам з ім схапілі больш за 200 падпольшчыкаў. Пад суд аддалі 71 чалавека. Судовы працэс праходзіў у Гродне. Урадавая прэса прыпісвала падсудным не толькі камуністычную дзейнасць, але і тэрор, удзел у партызанскім руху 20-х гадоў.

ЦК КПЗБ вырашыў ператварыць гродзенскі працэс у арэну палітычнай барацьбы. Галоўная роля адводзілася Мікалаю Перавалоцкаму і яго верным саратнікам — Пятру Уласаўцу, Аляксандру Свергуну, Аляксандру Дулько, Міхаілу Дзягцярыку і многім іншым. Перавалоцкі павінен быў прызнацца, што ён член КПЗБ, сакратар акружкома і даказаць, што гэта не злачынства. З такой задачай Перавалоцкі справіўся бліскуча. Аднак гэта не перашкодзіла суду вынесці падпольшчыкам даволі суровыя прыгаворы. Мікалай Перавалоцкі быў прыгавораны да 15 гадоў пазбаўлення волі і адпраўлены ў турму Драгобыча.

Са свайго вопыту Мікалай ведаў, што, каб выжыць, не зламацца, неабходна паставіць перад сабою мэту. Такой мэтай стала вучоба. Дарэчы, яшчэ ў пачатку 20-х гадоў Кампартыя Польшчы, а за ёй і КПЗБ заклікалі ператварыць фашысцкія турмы ў камуністычны

універсітэт. Мікалай Лаўрынавіч узначаліў вучэбны працэс у драгобыцкай турме.

Прайшлі пяць пакутлівых гадоў. Заставалася яшчэ дзесяць. Але тут адбылося непрадбачанае. Нічога яму не растлумачыўшы, Перавалоцкага раптам даставілі ў баранавіцкую турму. Разам з ім сюды было пераведзена 40 вядомых падпольшчыкаў для абмену з асуджанымі палякамі, украінцамі, якія знаходзіліся ў Савецкім Саюзе.

Цырымонія абмену адбылася каля станцыі Негарэлае 15 верасня 1935 г. На савецкім баку адбыўся вялікі мітынг. Вязняў польскіх турмаў даставілі ў Мінск. У хуткім часе Мікалая Перавалоцкага і Веру Харужую, якая таксама аказалася ў групе абмену, накіравалі працаваць у партыйную школу КПЗБ.

Здавалася, нішто не прадказвала трагедыі. Аднак сярэдзіна 30-х гадоў — гэта абстаноўка даносаў, жудаснага псіхозу, шпіёнаманіі і насілля. Савецкая рэпрэсіўная машына знішчэння не прымусіла сябе доўга чакаць. Спачатку Мікалаю адмовілі ў пераводзе з членаў КПЗБ у рады ВКП(б), а 19 снежня 1935 г. выключылі з КПЗБ і вывелі з прадстаўніцтва КПП і КПЗБ пры Камінтэрне. Перавалоцкі выехаў у Данбас і пачаў працаваць у абкоме будаўнікоў. У пачатку 1936 г. зноў вярнуўся ў Маскву і ўладкаваўся рабочым на завод імя Сталіна.

Побач з Мікалаем Лаўрынавічам працаваў Аляксандр Собада. Ён напісаў у НКВД запіску: «Перавалоцкі загадкавы і падазроны чалавек». Другі рабочы, Рыгор Старасцін, дадаў: «Перавалоцкі паводзіць сябе замкнута». Але нават пры канвеернай сістэме знішчэння людзей такіх звестак аказалася недастаткова. Таму 4 верасня 1936 г. Д. І. Маркаў (прозвішча хутчэй за ўсё несапраўднае) даносіў: «Перавалоцкі з'яўляецца сынам буйнога кулака, у вёсцы Яглевічы меў 40 гектараў зямлі і карыстаўся наёмнай працай». Гэтую лухту не складана было праверыць, але, відаць, у гэтым ніхто не быў зацікаўлены. Прыпісалі Перавалоцкаму ўдзел у так званай Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, членаў якой называлі беларускімі левымі эсэрамі. Перавалоцкі не меў ніякага дачынення да дзейнасці гэтай арганізацыі. Але і гэтай выдумкі пра яго ніхто не праверыў. Мікалая Лаўрынавіча абвінавачваюць у сувязі з пасламі ад КПЗБ у польскім сейме — Тарашкевічам, Валошыным, Рак-Міхайлоўскім. У той час яны былі ўжо рэпрэсіраваны. Таму за былую сувязь з імі людзей арыштоўвалі, не прад'яўляючы ніякіх абвінавачванняў. Але, бадай што, самым нахабным было абвінавачванне Перавалоцкага ў тым, што ён шмат разоў вызваляўся з польскіх турмаў. Следчым было гэта не зразумела. У сталінскія лагеры, як вядома, людзі па сем разоў не траплялі. Не ўсе выжывалі і пасля аднаго зняволення.

Мікалай Лаўрынавіч Перавалоцкі прыйшоў на Берасцейшчыну, каб несці людзям волю і шчасце. Сам жа спазнаў іх надзвычай мала. Вірлівае жыццё рэвалюцыянера абарвалася жорстка і недарэчна, як недапетая песня. Яго расстралялі 6 лістапада 1937 г., калі «Вялікаму Кастрычніку» споўнілася 20, а яму, Міколу, — 34 гады.

Матэрыял падрыхтаваны паводле кнігі В. Ласковіча «Прысуд адменены». Брэст, 1993.

Дарогаю да святла...

Пасля вяртання з бежанства Мікалай Лявонавіч Кузьміч уключыўся ў рэвалюцыйную барацьбу за лепшую долю і ў сваёй вёсцы Козіна ўзначаліў падпольную групу, стаў прыкметнай асобай на Быценшчыне. Ён наладзіў сувязь са Слонімскім і Навагрудскім падполлем і вёў шырокую рэвалюцыйную работу сярод насельніцтва. Але не спалі і польскія ўлады. У час арыштаў, якія пракаціліся ў кастрычніку 1925 г., быў арыштаваны і М. Л. Кузьміч, зняволены затым у навагрудскай турме.

5 жніўся 1926 г. М. Л. Кузьміч быў прыгавораны Навагрудскім акруговым судом на пяць гадоў турэмнага зняволення.

Той прыгавор зацвердзілі Вілейскі апеляцыйны і Варшаўскі Вярхоўны суды. Мікалай Лявонавіч Кузьміч апынуўся ў турме на Лукішках у Вільні.

У лістападзе 1926 г. палітзняволеныя Лукішскай турмы аб'явілі галадоўку. Адміністрацыя прыбегла да жорсткіх мер. Тады, 26 снежня 1926 г., у мэтах самаабароны

палітзняволеныя на чале з Мікалаем Кузьмічом арганізавалі бунт. У камерах узніклі барыкады. З пажарных шлангаў турэмшчыкі залілі камеры, а ўварваўшыся ў іх, збівалі вязняў. Пазней быў суд, які вынес прыгавор: «7 кастрычніка 1927 года... На аснове абвінаваўчага заключэння ад 19 мая 1927 года жыхары Вілейскага павета вёскі Путнікі Антон Дварэцкі, гміны Быцень Слонімскага павета Васіль Гудзік, вёскі Козіна Мікалай Кузьміч і другія абвінавачваюцца ў тым, што 9 снежня 1926 года ў горадзе Вільня ў другім павільёне Лукішскай турмы па папярэдняй змове, дзейнічаючы свядома і сумесна, аказалі супраціўленне і адмовіліся выканаць распараджэнне адміністрацыі ісці ў бальніцу для прыняцця ежы.

Калі наглядчыкі і паліцэйскія імкнуліся зайсці ў камеры, вязні аказалі супраціўленне шляхам барыкадавання дзвярэй, збівалі цвёрдымі прадметамі службовых асоб, кусалі ім рукі, сыпалі ў вочы пясок, чым наносілі цялесныя пашкоджанні наглядчыкам і паліцэйскім...».

Суд прыгаварыў М. Л. Кузьміча да трох гадоў турэмнага зняволення. Разам з папярэднім прыгаворам тэрмін павялічыўся да 8 гадоў.

Аб перажываннях, думках, імкненнях, барацьбе за турэмнымі кратамі расказваюць нам пісьмы Кузьміча з турмы на волю. Іх было каля 100. Каб дасканала іх зразумець, трэба было ўмець чытаць між радкоў, бо за кожнаю фразаю сачыла турэмная цэнзура.

23 мая 1926 г. Мікалай Кузьміч пісаў:

«Мілая Анюта! Паведамляю, што 10 мая атрымаў абвінаваўчае заключэнне. Напісаў заяву на «казённага» адваката, таму што наймаць «свайго» нам не па сіле... Свята правялі лепш, чым чакалі. Спадзяёмся на надыход лепшых часоў...»

Наступнае пісьмо датавана 18 ліпеня 1926 года:

«Нюшанька! Наконт таго, як паступіць з адвакатам, я вам напісаў. Па праўдзе кажучы, яны мне не патрэбны, ні «казённыя», ні «свае». Ведаю, што наша становішча цяжкае, і яны нам не дапамогуць. Узяць добрага адваката ў нас грошай не хопіць, а браць абы-якога лепш не трэба».

А вось радкі з пісьма за 17 жніўня 1926 г.:

«Добры дзень, дарагія тата і мама! Нашы надзеі на маё вызваленне не здзейсніліся. Мяне асудзілі да пяці гадоў зняволення строгага рэжыму, але я не падаю духам... Яны не даказалі маёй віны, але гэта не змяніла справы. Да гэтага я яшчэ верыў у «справядлівасць» суда, але калі ўбачыў яго па-сапраўднаму, то ўсё зразумеў. А гэта добра...»

26 лістапада 1926 г. М. Л. Кузьміч пісаў сваёй сястры:

«Нютачка! 20 студзеня 1927 года зноў будуць судзіць за так званы «бунт». Жыццё сумнае, але мы прывыклі. Іншы раз спяваем і танцуем. Патрэбна ж нечым смутак разганяць... Многа часу аддаю заняткам па самаадукацыі.

Як у вас з вечарынкамі? Ці рыхтуецеся вы да ігрышчаў?»

«Вам ужо вядома, — паведамляў Кузьміч 30 студзеня 1927 г., — я знаходжуся ў другой турме, тут жа ў Вільні, куды перавялі нас, некалькі чалавек, перад судом...»

Так ён пасля Лукішак аказаўся ў Стэфанскай турме. «Жыццё не салодкае, — піша ў чарговым пісьме Кузьміч, — але не падаем духам... Мы прывыклі да ўсяго... Вось з харчаваннем справа дрэнная».

Сапраўды, пытанне харчавання ў турэмнай камуне заўсёды заставалася галоўным. Цяжкія ўмовы турэмнага жыцця прымушалі згуртоўвацца зняволеных, што вельмі не падабалася адміністрацыі, якая выкарыстоўвала не толькі фізічныя метады ўздзеяння на вязняў, але і духоўныя.

20 лютага 1927 г.

«Дарагая Нюшанька! Вельмі прыемна было атрымаць слоўнік. Рады, што ёсць такія, хто спачувае нам. Гэта надае нам сілы ў бядзе, якая звалілася на невінаватыя галовы... Ты гаварыла пра французскі самавучыцель, гэта карысная і даступная рэч. Ты ж ведаеш, з добрымі кнігамі я дружу. Чакаем амністыі. Яна яшчэ далёка, але дачакаемся».

13 сакавіка 1927 г.

«Вясна. У нас цёпла. Бачу праз акно чыстае поле, кветкі нашых лугоў. Як хочацца на волю...»

23 кастрычніка 1927 г.

«Нютачка! Дзякую за высланыя 10 злотых. Як добра мець хоць невялікія, але свае грошы. На многае разлічваць не магу, я ж не ў заробках знаходжуся... Мы ведаем, што грошы, якія

атрымліваем, гэта ад рабочых і сялян, хоць яны самі такія ж бедныя, як і мы, перабіваюцца з хлеба на ваду. Тут і хочацца якраз падзякаваць ім за гэта... У нас вельмі холадна. Хацеў бы аб гэтым забыць, дык не забудзеш. Хвалююся за ўсіх вас. Ці здаровыя вы? Як мама, тата?»

6 мая 1928 г.

«Добры дзень, дарагая Нютачка! Тваё сумнае пісьмо атрымаў. Смерць бацькі мяне вельмі засмуціла. Вельмі шкада, што я не мог быць з ім у апошнія яго хвіліны. Дзякуй, што прыслала фотакартку, дзе я ўбачыў бацьку ў апошні раз... Я не магу выказаць усяго гора, якое напаткала нас. Але гора трэба перажыць... Прашу цябе, прышлі мне самавучыцель нямецкай мовы, тэорыю славеснасці і падручнік фізікі. Калі маеш адрас Марочкі, напішы яму і папрасі, каб выслаў кнігі: «Капітал» Маркса ў апрацоўцы Берхарна, «Гісторыю сацыялізму» Фінгерта, «Развіццё сацыялізму» Венескунтава, «Палітычную эканомію» Любімава, «Навейшую беларускую хрэстаматыю». У час зацішша тут можна імі карыстацца...»

12 жніўня 1928 г.

«З Вільні мяне перавялі на захад Польшчы ў г. Грудзендз. Не палохайся, усё перажыву. Праз вокны бачу яблыні, якія напамінаюць мне роднае Козіна. А цяпер паслухай. Напішы ў Варшаву ў выдавецтва «Кніга», хай вышлюць табе каталог, пасля чаго заадрасуй на мяне наступныя выданні: «Асновы сацыялізму», «Сацыяльная рэвалюцыя» Каўцкага, «Усеагульная гісторыя», «Грамадская сацыялістычная барацьба» Веста, «Гісторыя матэрыялізму», «Эканамічная навука» К. Маркса ў апрацоўцы Каўцкага, «Парыжская камуна», «1905 год» Ставінскага, «Камуністычны маніфест» у апрацоўцы Кольскага, «Палітычная эканомія» Багданава, «Дзяржава і рэвалюцыя» У. І. Леніна».

Цяжка меркаваць, ці атрымаў Кузьміч гэтыя кнігі, бо ў наступных пісьмах ён пра іх не ўспамінаў.

14 лютага 1930 г.

«Розныя паведамленні ты мне даслала. Пазаўчора атрымаў пісьмо ад Гудзіка. Паведамляе, што многіх цягне паехаць з роднай зямлі ў Аргенціну. На мой погляд, гэта непажаданая з'ява... Ад'язджаюць лепшыя, тыя, хто не можа прымірыцца з існуючымі парадкамі ў Заходняй Беларусі. Але яны выходзяць з першых радоў барацьбы. Барацьба за лепшае жыццё тут, на месцы, — вось наша мэта.

Яны думаюць, што ў Аргенціне печаныя галубкі будуць падаць з неба. Хутчэй скулу ў бок дастануць, бо ў Аргенціне буржуазія, як і ўсюды, эксплуатуе працоўных...»

У сярэдзіне 1931 г. Кузьміча пераводзяць у самую змрочную турму ў Равічах, дзе знаходзіўся цвет рэвалюцыйнага падполля Польшчы, Заходняй Беларусі, Украіны. Пісьмы адтуль ішлі ўсё больш трывожныя. Кузьміча адольвалі хваробы. Але ён не здаваўся. У яго лістах адчуваўся аптымізм і імкненне да барацьбы, да непакорнасці злу.

Вясною 1932 г. Мікалай Кузьміч выйшаў на «волю». Прыехаўшы ў родную вёску, адразу ўключыўся ў падпольную работу. Ужо на другую ноч пасля прыезду на беразе Шчары сустрэўся са сваімі людзьмі, уключыўся ў работу камуністычнага падполля на Быценшчыне. Але ворагі сачылі за кожным яго крокам і зноў навісла пагроза арышту. Паўстала пытанне аб пераходзе яго ў СССР, што і адбылося восенню 1932 г. Да 1935 г. працаваў у Беларускім рэспубліканскім аддзеле МОПРа.

Ішоў час. Ад Мікалая Лявонавіча зрэдку прыходзілі пісьмы. Апошняе прыйшло з Ніжняга Тагіла. Потым усё абарвалася...

В. Ласковіч.

Выйшлі на вуліцу жанчыны

Адну з яркіх старонак у летапіс барацьбы за лепшую долю і шчасце ўпісалі жанчыны вёскі Любішчыцы. Жаночая дэманстрацыя 8 сакавіка 1927 г. была арганізавана ў Любішчыцах Баранавіцкім акруговым камітэтам КПЗБ як водгук на расстрэл Косаўскай палітычнай дэманстрацыі.

У Баранавіцкім краязнаўчым музеі ёсць успаміны былога другога сакратара акруговага камітэта КПЗБ Фёдара Барысавіча Пірышкі, у якіх ён піша: «Пасля расстрэлу Косаўскай дэманстрацыі Баранавіцкі камітэт КПЗБ разгарнуў шырокую кампанію пратэсту супраць разгрому Грамады, арыштаў паслоў і грамадоў-

цаў, расстрэлу Косаўскай дэманстрацыі. Бурная дэманстрацыя была праведзена ў Слоніме, Баранавічах, Нясвіжы. У Косаўскім павеце гэтую кампанію прымеркавалі да Міжнароднага жаночага дня. Праведзена шырокая тэхнічная акцыя: распаўсюджванне адозваў, вывешванне чырвоных сцягоў».

А вось паведамленне са справаздачы штаба 9-й ваеннай акругі аб дзейнасці КПЗБ: «У справаздачным перыядзе КПЗБ праявіла незвычайна інтэнсіўную дзейнасць. У ноч з 7 на 8 сакавіка 1927 года вывешаны па дарозе паміж вёскай Яглевічы і чыгуначнай станцыяй Івацэвічы камуністычны транспарант з наступным надпісам: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся! Далоў фашызм Пілсудскага і яго дыктатуру! Далоў крывапіўцаў! Далоў расстрэлы! Свабода жанчынам! Няхай жывуць Саветы! Няхай жыве 8 сакавіка! Няхай жыве КПЗБ! Няхай жыве ўз'яднанне жанчын у радах КПЗБ! Наперад жанчыны! У барацьбе здабудзем свае правы!» Такі ж транспарант быў вывешаны 8 сакавіка па дарозе каля вёскі Размеркі Косаўскай гміны.

Многія сяляне, якія ішлі на дэманстрацыю ў Любішчыцы, бачылі транспаранты, сэрцы людзей біліся радасна і напаўняліся рашучасцю. Людзі ведалі, што за ўдзел у дэманстрацыі рызыкуюць свабодай, а можа і жыццём. Вельмі ж свежымі былі косаўскія падзеі. Не паспелі яшчэ зажыць раны ахвяр тых пабоішчаў, не паспела яшчэ асесці зямля на магілах загінуўшых у іх. Тым не менш з усіх вёсак ішлі і ішлі сяляне ў Любішчыцы, каб сказаць сваё цвёрдае слова. Яны ведалі, што агенты дэфензівы будуць высочваць іх. Але імкненне да свабоды, мара заваяваць сабе і сваім дзецям шчаслівае, вольнае жыццё, права «людзьмі звацца» былі мацнейшымі за страх перад паліцыяй.

А паліцэйскія на самай справе не спускалі вачэй з вёскі Любішчыцы. Сярод дакументаў, якія захоўваюцца ў фондах Брэсцкага абласнога дзяржархіва, ёсць рапарт косаўскай паліцыі аб ходзе дэманстрацыі 8 сакавіка ў Любішчыцах. Па сведчанню ўчастковага паліцэйскага, дэманстрацыя пачалася ад дома Сцяпана Снітко. Тут сабраўся натоўп жыхароў Любішчыц і сялян навакольных вёсак. Да сабраўшыхся, як паведамляецца ў рапарце, выйшаў са сваёй хаты Сцяпан Снітко, з ім некалькі незнаёмых паліцэйскаму дзяўчат. Яны прычапілі да дрэўка чырвонае палотнішча і, перш чым калона накіравалася ад перакрыжавання ў бок царквы па Шасэйнай вуліцы, перад сабраўшыміся выступіў прамоўца, якога паліцэйскі не пазнаў. Дый ці мог паліцэйскі запомніць прамоўцу. Як сведчаць успаміны ўдзельніка дэманстрацыі, члена КПЗБ Антона Карпавіча Чымбара, што захоўваюцца ў сярэдняй школе вёскі Любішчыцы, «паліцэйскія, якія былі ў вёсцы, не асмеліліся выступіць супраць дэманстрантаў і схаваліся на могілках». Яны добра разумелі, што лепш назіраць за падзеямі здалёк, бо былі бяссільнымі перад такою масаю людзей. Ва ўспамінах Ф. Б. Пірышкі чытаем: «У дзень 8 сакавіка 1927 года ў вёсцы Любішчыцы сабралася каля 700 сялян з навакольных вёсак».

Усхваляванымі і поўнымі надзей разыходзіліся па хатах пасля дэманстрацыі любішчане. Была ў іх і трывога. Ведалі людзі, што не даруе паліцыя гэту дэманстрацыю. І на самай справе праз некалькі дзён пачаліся арышты. Вядома, усіх удзельнікаў дэманстрацыі арыштаваць было немагчыма, вось чаму паліцыя ў першую чаргу забірала тых, чые прозвішчы былі занесены ў тайныя спісы дэфензівы як палітычна ненадзейных.

Той жа Ф. Б. Пірышка пісаў: «Было арыштавана 200 чалавек, у тым ліку арыштавалі сакратара падпольнага райкома КПЗБ Пятра Уласаўца, члена рэўкома Аляксандра Свергуна, каменданта дэманстрацыі Антона Касаўца і іншых».

Улады разлічвалі запалохаць людзей арыштамі, задушыць свабодалюбівае імкненне народа. Але яны не ведалі, якія гарачыя і мужныя сэрцы палескіх жанчын, як гатовы яны стаць на абарону сваіх мужоў, братоў і сыноў.

У сваіх успамінах Ф. Б. Пірышка пісаў: «Калі арыштаваных, закаваных у кайданы, вялі праз вёску Любішчыцы, жанчыны на чале з Марыяй Чымбар і Марыяй Мінюк аказалі супраціўленне. Са словамі «Не дамо сваіх дзяцей на самавольства катам!» яны кінуліся на ахову.

У справаздачы штаба 9-й ваеннай акругі паведамляецца: «У час арышту Сцяпана Снітко жыхары вёскі Любішчыцы аказалі паліцэйскім

калектыўнае супраціўленне. Двое паліцэйскіх былі абражаны дзеяннем і толькі прыбыццё падмацавання дало магчымасць арыштаваць Снітко. У сувязі з гэтым здарэннем былі прыцягнуты да крымінальнай судовай адказнасці 49 жанчын і 6 мужчын...»

Я. Бутрым.

Жыццё ў барацьбе

У 1915 г. у час першай сусветнай вайны пры наступленні немцаў жыхары Быценскай воласці, зняўшыся з родных месцаў, рушылі абозамі на ўсход. Лёс раскідаў іх па Тамбоўскай, Саратаўскай, Курганскай, Ніжнегародскай і іншых губернях Расійскай імперыі. Адны парабкавалі ў буйных землеўладальнікаў, другія рабочымі працавалі на транспарце, фабрыках і заводах. Там яны сустрэлі Лютаўскую, а затым Кастрычніцкую рэвалюцыі 1917 г. Здавалася, наступіць мір і ўсе яны вернуцца ў свае родныя мясціны. Але грамадзянская вайна адкінула іх мары яшчэ на 4—5 гадоў.

Нарэшце закончыліся войны і звязаныя з імі ліхалецці і быценцы сталі вяртацца ў родныя сёлы, у родныя хаты. Большасць бежанцаў сустрэлі папялішчы, бур'ян ды крапіва. Яна і стала першым харчам. Шмат клопату лягло на плечы няшчасных людзей — трэба было будаваць жыллё, адраджаць пладароддзе запушчанай зямлі. Не ўсе вярнуліся: хто склаў сваю галаву ў войнах і калатэчах, хто па старасці ці хваробах назаўсёды застаўся ляжаць у зямлі на чужбіне, а хто і прыжыўся на новым месцы.

Польская ўлада на «крэсах усходніх» непрыязна адносілася да «быдла», імкнулася прынізіць, пакрыўдзіць, даказаць сваю перавагу. У цяжкім становішчы аказалася працоўная моладзь: яна не толькі не мела работы і сродкаў для існавання, але і перспектывы на іх атрыманне. У гарадах панавала беспрацоўе, вёска задыхалася ад малазямелля, перанасялення, адсутнасці заработкаў. Усё гэта паслужыла падставай да яднання. У Быцені была створана ў 1923 г. падпольная ячэйка КПЗБ. Старшынёю яе быў абраны Кузьміч Мікалай Лявонавіч, сакратаром — Ляўчук Іван Рыгоравіч. У склад быценскай ячэйкі ўвайшлі жыхары вёсак Козіна, Зарэчча, Прыбарава, Доўгая, Вуглы, Рудня.

У нялёгкіх умовах падполля партыйная ячэйка змагалася супраць нацыянальнага прыгнёту і паланізацыі, дабівалася адкрыцця школ на беларускай мове навучання, вяла агітацыю супраць несправядлівых падаткаў, прыгнёту памешчыкаў і асаднікаў, што захапілі нашы землі.

У лютым 1925 г. Быценскі падрайком КПЗБ распаўсюдзіў лістоўкі ў казармах ваеннага лагера, на чыгуначнай станцыі Лясная. 1 мая зноў распаўсюдзілі лістоўкі з рэвалюцыйнымі заклікамі. Польская паліцыя ўзмацніла слежку, засылку правакатараў, пачала арышты камуністаў. Па даносу правакатара Целішчава раніцай 20 кастрычніка 1920 г. былі арыштаваны быценскія падпольшчыкі. Барановіцкая турма, допыты, катаванні. Следства працягвалася дзевяць месяцаў. 5 жніўня 1926 г. Навагрудскі акруговы суд за рэвалюцыйную дзейнасць прыгаварыў быценцаў на 4—5 гадоў пазбаўлення волі з пазбаўленнем палітычных правоў на 10 гадоў. Сярод іх:

Грынчык Аляксей Восіпавіч з Быцені, Галашэўскі Васіль Паўлавіч з Быцені, Гудзік Васіль Васільевіч з Быцені, Яфімік Васіль Фёдаравіч з Вуглоў, Кузьміч Мікалай Лявонавіч з Козіна, Каліноўскі Іван Фёдаравіч з Зарэчча, Ламейка Іван Антонавіч з Зарэчча, Ляўчук Іван Рыгоравіч з Зарэчча, Ляўчук Сцяпан Сцяпанавіч з Рудні, Нікіцік Іван Міхайлавіч з Козіна, Райко Іван Васільевіч з Зарэчча, Страковіч Васіль Міхайлавіч. Суржынскі Павел Паўлавіч з Быцені, Падгорны Міхаіл Андрэевіч з Манцют.

Пацягнуліся для іх гады складанага жыцця ў турмах Вільні, Варшавы, Грудзенца, Равіча. Усе яны былі ва ўзросце ад 21 да 35 гадоў, за выключэннем 42-гадовага П. П. Суржынскага.

Віленская турма на Лукішках у адзіночках, камерах і карцэрах змяшчала 300 палітзняволеных, якія былі прыгавораны да суровага турэмнага зняволення. Начальнікам турмы быў царскі служака Казімір Барташэвіч, які некалі быў памочнікам начальніка петраградскай турмы «Красты». Адносіны да зняво-

леных тут былі асабліва суровымі і зняважлівымі.

І ў турэмных засценках палітзняволеныя не спынялі барацьбу. Адстойваючы свае правы, часта аб'яўлялі галадоўкі. У знак пратэсту супраць надзявання наручнікаў і пабояў зняволеныя турмы на Лукішках 9 снежня 1926 г. аб'явілі чарговую галадоўку. У ёй удзельнічалі каля 200 чалавек, у тым ліку і нашы землякі М. Л. Кузьміч, В. В. Гудзік, І. Р. Ляўчук. Калі адміністрацыя турмы сілаю спрабавала зламаць супраціўленне вязняў і арганізавала штурм турэмных камер, зняволеныя забарыкадаваліся ў іх.

За актыўны ўдзел у арганізацыі супраціўлення турэмным уладам Вілейскі акруговы суд 7 кастрычніка 1927 г. дабавіў Кузьмічу і Гудзіку па тры гады турэмнага зняволення.

У 1928 г. у Польшчы адбыўся дзяржаўны пераварот і некаторыя палітычныя зняволеныя атрымалі частковую амністыю. У 1929—1931 гг. яны вярнуліся ў родныя мясціны, але зноў аказаліся пад пільным паліцэйскім наглядам, бо прадаўжалі змаганне.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве новага жыцця, у гады Вялікай Айчыннай вайны змагаліся з фашыстамі ў радах Чырвонай Арміі або ў тыле ворага ў партызанах ці падполлі.

Па-рознаму склаўся лёс патрыётаў. М. Л. Кузьміч, В. В. Гудзік і А. І. Грынчык нелегальна перайшлі польска-савецкую граніцу ў 1932 г. і там іх сляды згубіліся. Не выключана, што яны сталі ахвярамі ГУЛАГаў.

В. П. Галашэўскі загінуў у 1943 г., В. Ф. Яфімік і І. А. Лаҳейка расстраляны нямецкімі акупантамі. С. С. Ляўчук памёр у вілейскай турме ў 1928 г., І. В. Райко, вярнуўшыся з турмы ў 1929 г., працягваў небяспечную падпольную работу. Зноў арыштоўваўся ў 1932 г. і 1936 г. У пачатку вайны адышоў на ўсход і працаваў на шахтах Кузбасвугалю. Вярнуўшыся ў родную вёску Зарэчча, у 1946 г. выбіраўся старшынёй Зарэчанскага сельсавета, а затым працаваў на быценскай пошце. П. П. Суржынскі памёр у 1948 г. Яго дачка Ефрасіння ў 1939 г. выбіралася старшынёю Быценскага сельсавета, была дэпутатам Народнага Схода ў Беластоку ў кастрычніку 1939 г., а затым дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. В. М. Страковіч у 30-я гады працаваў на сваёй сялянскай гаспадарцы, з верасня 1939 г. настаўнічаў у сваёй вёсцы Доўгая. З пачаткам вайны адышоў на ўсход і працаваў у Чувашыі, а ў 1942 г. быў прызваны ў армію і ваяваў на Ленінградскім фронце. Пасля вяртання дамоў у 1944 г. доўга хварэў і ў 1946 г. памёр. Лёсы многіх удзельнікаў рэвалюцыйнай барацьбы на Быценшчыне пакуль не вывучаны.

З кагорты змагароў

Мы стаім каля разложыстага дуба, якому, пэўна, каля паўтысячы гадоў. Пагаварылі, а цяпер вось на нейкую хвіліну між намі маўчанне. І ў гэты момант я чамусьці параўноўваю свайго субяседніка з гэтым дубам-асілкам, сведкам далёкага мінулага.

Людзі ж шмат у чым падобныя на дрэвы. Адны, як вербы, лёгка прыжываюцца без карэння на любым новым месцы і ў ветраную непагадзь гэтак жа лёгка ламаюцца. Другія, як арэшнік, на выгляд тонкія, кволыя і не так ужо даўгавечныя, але гнуткія і ўстойлівыя. Трэція, як гэты дуб, — каржакаватыя, моцна ўросшыя каранямі ў родную зямлю, — яны мужна пераносяць усе буры і навалы.

На долю Міхаіла Аляксандравіча Крыўшы выпаў нялёгкі жыццёвы шлях. Бацька яго, парабак графа Юндзела, як і многія іншыя абязоленыя, у 1914-м, калі выбухнула першая сусветная вайна, выехаў з сям'ёй у Расію. Там, на станцыі Графскай Варонежскай губерні, пасля смерці бацькі і пачаўся працоўны шлях трынаццацігадовага Мішы. Спачатку працаваў рассыльным у мясцовым чыгуначным камітэце па нарыхтоўцы паліва для паравозаў, потым — спецкур'ерам.

— Ішоў дваццаты год. Па ініцыятыве камісара Іваннікава з ліку найбольш свядомых маладых рабочых, — расказвае Міхаіл Аляксандравіч, — на станцыі была створана камсамольская ячэйка. Тады ж у камсамол прынялі і мяне. Гэта быў такі час, калі лютавалі

голад і тыф, наляталі казацкія банды. Начамі мы дзяжурылі па ахове чыгуначных саставаў. Тады і атрымаў першую загартоўку.

У родныя мясціны сям'я Крыўшаў вярнулася ў дваццаць першым. А на радзіме — ні кала, ні двара. Давялося ісці прасіцца да мясцовай графіні ў парабкі. Тая выслухала, падставіла ўсім па чарзе руку цалаваць. Міша ад такой «міласці» адмовіўся, і разгневаная пані прагнала яго за дзверы. Праўда, маці сабе і старэйшаму сыну работу выпрасіла. Сям'і далі сякое-такое жыллё ў падвальным, сырым памяшканні.

Праз які год па просьбе старэйшага брата, які працаваў кавалём, адміністратар маёнтка дазволіў узяць Мішу вучнем у кузню. Здольны, не па гадах фізічна моцны, ён за кароткі час не толькі добра авалодаў спецыяльнасцю, але і паспеў зблізіцца з іншымі парабкамі, расказваў ім аб Расіі, рэвалюцыі, савецкай уладзе.

Глытнуўшы паветра свабоды, ён не можа змірыцца з парадкамі на роднай Беларусі, ненавідзіць рабскую атмасферу ў маёнтку графіні. Хутка збліжаецца з членам КПЗБ Мікалаем Трындам. Заходзячы па справах у кузню, Мікалай Трында звяртаў увагу на маладога плячыстага каваля, які расказваў сваім падручным нешта вельмі важнае, але змаўкаў, калі з'яўляўся хто-небудзь незнаёмы. Сустрэчы хутка перараслі ў дружбу, а затым і ў сумесную падпольную работу. Міхаіл Крыўша ўступае па рэкамендацыі тав. Трынды ў члены КПЗБ, арганізоўвае і ўзначальвае мясцовую партячэйку, у якую ўваходзяць парабкі Іван Матусевіч, Павел Цярэшка і Макар Шчытляк.

Поле дзейнасці ячэйкі не абмяжоўвалася толькі маёнткам. Развешвалі на відных месцах чырвоныя сцягі, раскідвалі лістоўкі, змест якіх выкрываў сутнасць буржуазна-памешчыцкага ладу тагачаснай Польшчы, праводзілі агітработу сярод насельніцтва бліжэйшых вёсак.

У святы Першамая і Кастрычніка парабкі маёнтка апраналіся ў самае лепшае, у гамонцы падкрэслівалі салідарнасць з рускімі працоўнымі, выказвалі веру ва ўз'яднанне Заходняй Беларусі з братамі за кардонам. Гэта бянтэжыла паноў, прыводзіла іх у шаленства.

Пасля разгрому пілсудчыкамі Косаўскай палітычнай дэманстрацыі ў 1927 г. пачаліся масавыя арышты не толькі членаў КПЗБ, але і членаў легальнай у той час арганізацыі — Беларускай рабоча-сялянскай грамады. Арыштавалі і Міхаіла Крыўшу. Закаваных, гналі падпольшчыкаў у Косава на допыты дэфензівы. Аляксандр Бахур, Рыгор і Аляксандр Асіпікі, Васіль Куратнік і іншыя былі закаваны папарна. Міхаіла садыст Вуціцкі прыкаваў да свайго веласіпеда.

Пад штуршкамі і ўдарамі прыкладаў паліцэйскіх ішлі змардаваныя барацьбіты дванаццаць кіламетраў да Косава, каб зазнаць там яшчэ больш суровыя катаванні.

У 1929 г. Міхаіл Аляксандравіч праходзіць па судовай справе «Працэс 60-ці», абвінавачваецца Гродзенскім акруговым судом у дзейнасці супраць польскай улады. На гэтым жа працэсе судзілі і такіх вядомых у раёне падпольшчыкаў, як А. Т. Перавалоцкі, П. М. Уласавец, А. І. Касавец, А. Р. Свяргун, В. М. Куратнік і інш.

Для таго, каб вырваць з турмы для далейшай падпольнай работы хоць частку камуністаў, арганізацыяй МОПР былі запрошаны на працэс пяць знакамітых адвакатаў Польшчы. Дзякуючы іх выступленням і хвалі народнага пратэсту многія вязні, у тым ліку і Крыўша, былі вызвалены. Аднак вызваленне не давала права на працу. Даводзілася перабівацца на выпадковых заработках.

Пазбягаючы новых арыштаў і ў пошуках работы Міхаіл Крыўша, Мікалай Трында, Мікалай і Насця Цімашэвічы ў 1935 г. едуць у Варшаву. Крыўша і Трында працуюць там у яўрэйскіх фірмах і не спыняюць рэвалюцыйнай дзейнасці. У момант нападу гітлераўскай Германіі на Польшчу яны вяртаюцца ў Івацэвічы. Напярэдадні прыходу Чырвонай Арміі арганізуюць рэўком, у склад якога ўваходзяць падпольшчыкі Свяргун, Талочка, Уласавец, Вішнеўская і Крыўша. Разам з іншымі падпольшчыкамі яны абяззбройваюць польскую паліцыю і яе памагатых.

Пасля верасня трыццаць дзевятага года М. Крыўша актыўна ўдзельнічае ва ўстанаўленні савецкай улады ў раёне. Яго выбіраюць дэпутатам Івацэвіцкага пасялковага Савета, потым прызначаюць загадчыкам камунальнай гаспадаркі.

У канцы мая 1941 г. Міхаіл Аляксандравіч едзе ў камандзіроўку ў Мінск. Там і застае яго вайна. Праз некалькі дзён ён у складзе 449-га

асобнага аўтабатальёна адбівае атакі фашыстаў пад Оршай.

Горыч адступлення, сум па сям'і не зламалі волю загартаванага падпольшчыка. На аўтамашыне ён кругласутачна падвозіць боепрыпасы да перадавых пазіцый, а ў тыл — раненых байцоў.

... Масіраваны налёт нямецкай авіяцыі не дазваляў байцам аўтабатальёна дастаўляць снарады артылерыстам, якія адбівалі танкавыя атакі пад Ельняй. Правесці машыны са снарадамі пад бомбамі выклікаліся тры добравольцы, у тым ліку і М. Крыўша. Рызыкуючы жыццём, пятляючы па незнаёмай мясцовасці, два вадзіцелі ўсё ж такі даставілі каштоўны груз артылерыстам. Танкавая атака была адбіта. За гэты рызыкоўны маршрут М. Крыўша і яго таварышы былі ўзнагароджаны медалямі «За адвагу».

Баі за Рослаўль, Юхнава, Малаяраславец, Падольск — гэта баявы шлях Міхаіла Аляксандравіча Крыўшы. Ён ваяваў на фронце да самага разгрому немцаў пад Масквой. А ў адным з наступальных баёў варожая міна ўзарвала яго машыну. Кантузія і пералом ног. Доўгае лячэнне ў шпіталі. Вяртацца на фронт больш не давялося...

М. Пархомік.

Змагаліся за праўду

З успамінаў Івана Ягоравіча Калеснікава

Успамінаю зіму 1925 г. Мне 15 гадоў і, здаецца, што я зусім ужо дарослы, а значыць, прыйшоў час знайсці работу. Падаўся на лесазавод Блок-Быцень. Але там адмовілі: на ўсіх работы не хапіла.

Нічога не засталося, як наняцца пастухом у вёсцы Міронім да мясцовага кулака Мікалая Меляшкевіча. Жыў я ў той час на хутары ў кіламетры ад вёскі, хутка пазнаёміўся з моладдзю. Мне пашчасціла: маімі новымі сябрамі сталі камсамольцы Фёдар Жылінскі і Іван Ладыка. Фёдар з'яўляўся сакратаром камсамольскай арганізацыі. Ад яго стаў я атрымліваць першыя даручэнні. У мяне на хутары хавалася нелегальная літаратура і лістоўкі, якія я, калі гэта трэба было, дастаўляў па прызначэнню. Праз шэсць месяцаў мяне прынялі ў камсамол, што вызначыла мой далейшы лёс.

Ніколі не забуду той лютаўскі дзень, калі мы, пяцёра хлопцаў на чале з Фёдарам Жылінскім, накіраваліся ў Косава для ўдзелу ў палітычнай дэманстрацыі. Быццам сёння бачу перад сабой чырвоныя палотнішчы з заклікамі да ўз'яднання з Савецкай Беларуссю, палымянага прамоўцу сакратара Целяханскага падрайкома партыі Мікалая Дзягцярыка, словы паміраючага камсамольскага важака Пятра Гаруса: «Нас гінуць адзінкі, астаюцца ж мільёны. Не пакідайце пачатай справы!» Менавіта ў той дзень, 3 лютага 1927 г., я пакляўся на ўсё жыццё змагацца за праўду, свабоду, шчасце простага народа.

А гады праходзілі як дні. Некаторы час працаваў на лесазаводзе Блок-Быцень, дзе рабочы дзень працягваўся ад 10 да 12 гадзін. У 1929 г. уладкаваўся на лесазавод у Стоўбцах, які належаў фірме «Англія-Еўропа». Пасля трох месяцаў катаржнай работы мы, рабочыя, арганізавалі забастоўку з патрабаваннем павялічыць заработную плату. Скончылася тым, што зачыншчыкаў забастоўкі звольнілі з работы, і я вымушаны быў пакінуць Стоўбцы.

Вярнуўшыся дамоў, зноў стаў працаваць на заводзе Блок-Быцень. Адразу ж адчуў, што за мною ўстаноўлены нагляд, а калі і тут памкнуўся арганізаваць выступленне рабочых, дык адразу быў звольнены з работы.

Беспрацоўны і палітычна ненадзейны, я зноў вымушаны быў вярнуцца на сельскую гаспадарку. У маёй маці было два гектары зямлі ды гектар сенажацяў, і я заняўся сялянскай працай, вынікі якой ва ўмовах разбуральнага крызісу ледзь давалі магчымасць жыць надгаладзь.

Што асабліва адчувалі мы, юнакі, у той час, дык гэта цягу да ведаў. Я стаў займацца ў сямігодцы. Але не яна, а самаадукацыя з'явілася для нас сапраўднай школай палітычнай асветы. Мы выпісвалі і чыталі такія прагрэсіўныя выданні, як газеты «Сіла» і «Сельраб», часопіс «Вікно», вывучалі творы Маркса, Энгельса, Леніна.

І вось наступіў 1930 год, які вызначыў усё маё далейшае жыццё: я стаў членам

Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Сакратаром партячэйкі быў Фёдар Аляксандравіч Макарэвіч, акрамя мяне членам яе з'яўляўся Сцяпан Салонка з Манцют, якога праз год арыштавалі. А ў 1932 годзе арыштавалі І. Ф. Макарэвіча, абвінаваціўшы ў шпіянажы на карысць СССР і правядзенні сярод польскіх салдат антыўрадавай агітацыі.

Наша самаадукацыя праходзіла паралельна і неадрыўна ад рэвалюцыйнай падпольнай работы. Помню, у той час на тэрыторыі Слонімскага павета, куды ўваходзіла і Быценская гміна, праводзіліся манеўры польскай арміі. Перад нашай партячэйкай стаяла задача прасачыцца ў салдацкую масу і растлумачваць салдатам агрэсіўную сутнасць палітыкі буржуазна-памешчыцкай Польшчы, выхоўваць у іх дух класавай свядомасці. Цікавіліся мы планамі і мэтамі, якія ставіліся манеўрамі непадалёку ад граніцы з СССР. Фёдару Макарэвічу ўдалося нават раздабыць план манеўраў. Больш года прасядзеў пасля гэтага пад следствам сакратар нашай партячэйкі, перш чым яго выпусцілі з-за адсутнасці ўлік.

Пазней, пасля некалькіх звальненняў з розных месцаў работы, Ф. А. Макарэвіч перайшоў граніцу і апынуўся ў СССР. Я застаўся працаваць у сваім раёне. У нас ужо склалася даволі моцная арганізацыя. Сапраўднымі важакамі ў сваіх вёсках вакол Быцені сталі Антон Фёдаравіч Лукшын і Іван Аляксандравіч Ляўчук з Прыбарава, Мікалай Іосіфавіч Банасевіч з Рудні, Васіль Іванавіч Ермаловіч з Заполля, Мікалай Мікалаевіч Лукашык з Козіна, Уладзімір Міхайлавіч Страковіч з Манцют. Да самага роспуску КПЗБ яны з'яўляліся сакратарамі партыйных ячэек, арганізоўвалі і ўзначальвалі забастоўкі. Адной з самых працяглых з іх была забастоўка рабочых, якія працавалі ў капіталіста Рамбіля.

Трэба сказаць, што на тэрыторыі Быценскай гміны было шмат лясоў, якія, можна сказаць, літаральна раскрадаліся, бо драўніна ўся пастаўлялася за мяжу. Праца ж людзей была неймаверна цяжкай, а аплата яе — мізэрнай. У другой палавіне лістапада 1935 г. мы аб'явілі забастоўку. Нашым патрабаваннем было павелічэнне заработнай платы. Вельмі перашкаджалі ў дасягненні пастаўленай мэты штрэйкбрэхеры. Але пасля настойлівай растлумачальнай работы яны адступілі. Забастоўка працягвалася больш двух месяцаў і закончылася перамогай. Акрамя павелічэння платы за працу, было вырашана пабудаваць для рабочых завода Блок-Быцень інтэрнат. Згодна з заключаным новым працоўным дагаворам кантралёрам за яго захоўваннем быў прызначаны камуніст Міхаіл Ануфрыевіч Фурс.

Тады ж, 20 лістапада, мяне выклікалі ў Акунінава, дзе знаходзіўся сакратар Слонімскага акруговага камітэта камсамола Сяргей Восіпавіч Прытыцкі. Я зрабіў яму даклад аб правядзенні і выніках забастоўкі. Тады ж па яго прапанове мяне абралі сакратаром партячэйкі, членамі якой сталі Аляксандр Міхайлавіч Маслоўскі і Канстанцін Аляксандравіч Макарскі. Праз тры месяцы з таварышамі арганізаваў 5 ячэек КПЗБ, а праз паўгода ў навакольлі Быцені была арганізавана яўрэйская партячэйка і дзве камсамольскія.

Барацьба працягвалася. Паспяхова завяршылася новая забастоўка на Блок-Быцені. Зарплата возчыкаў была павышана на 70 працэнтаў, а лесарубаў — на 20. Былі пабудаваны для рабочых тры баракі.

Барацьба рабочых і сялян Быценшчыны мела вялікае значэнне для ўздыму рэвалюцыйнага руху ў навакольных вёсках.

Нам радасна ўсведамляць, што нас не змаглі зламаць ні катаванні ў дэфензіве, ні турэмныя засценкі. Мне асабіста давялося шмат працярпець у адной з самых жудасных польскіх турмаў — Бярозе-Картузскай. Штодзённыя здзекі і катаванні дапамаглі пераадольваць мне мае таварышы — Нядзельскі, сакратар Лодзінскага акруговага камітэта кампартыі Польшчы, стары партыйны кіраўнік Лібер Мушынскі, камсамолец з Львова Якуб Панцэр, Сцяпан Пацяруха з Пружан, Вольф Ваўкавыскі з Беластока, Мікалай Вярбіцкі і Іван Галка з Акунінава. Пасля Бярозы-Картузскай мяне чакала яшчэ адна турма — Слонімская, дзе ўжо знаходзіліся Іван Малец са Слоніма і сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі Давід Фенгінберг. Хутка мяне абралі сакратаром турэмнага камітэта. Мы працягвалі змаганне аж да вызвалення Чырвонай Арміяй.

Дні барацьбы

З успамінаў Аляксандра Рыгоравіча Свергуна

А. Р. Свяргун нарадзіўся 30.12.1903 г. у в. Гічыцы Івацэвіцкага раёна. У КПЗБ уступіў у 1923 г. У 1923—1927 гг. быў членам Косаўскага раённага і Слонімскага акруговага камітэтаў КПЗБ. За рэвалюцыйную дзейнасць быў зняволены польскімі ўладамі на 10 гадоў турмы. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. дэпутат Народнага Схода Заходняй Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну быў у Чырвонай Арміі, а з 1943 г. — удзельнічаў у партызанскім руху. Памёр 31.7.1971 г.

Пасля васьмігадовага турэмнага зняволення ў сакавіку 1935 г. ЦК КПЗБ накіраваў мяне працаваць у Косаўскую раённую партыйную арганізацыю, якая ў выніку была амаль цалкам разгромлена дэфензівай. Але нядоўга прыйшлося пабыць на волі. 31 жніўня 1935 г. па даносу правакатара я зноў быў схоплены паліцыяй і засуджаны на шэсць гадоў турмы.

Пасадзілі мяне ў пружанскую турму. Тут адбывалі пакаранне пераважна маладыя падпольшчыкі, якія яшчэ не мелі вопыту рэвалюцыйнай барацьбы. Не было ў турме і рэвалюцыйнай арганізацыі, не паступалі сюды газеты і кнігі, не дазвалялася больш аднаго разу ў месяц пісаць і атрымліваць пісьмы. Такім чынам, зняволеныя былі пазбаўлены сувязі з жыццём на волі.

Апынуўшыся ў такім становішчы, я пачаў звязвацца са зняволенымі, расказваць ім пра тое, як у другіх турмах змагаюцца за паляпшэнне сваіх бытавых умоў. Акрамя вусных гутарак, тайна ад наглядчыкаў на тонкай курыльнай паперы пісаў даклады на палітычныя тэмы, у якіх даваў парады зняволеным, як трэба змагацца з адміністрацыяй за свае правы.

Мае прапановы былі падтрыманы ўсімі зняволенымі, і асабліва моладдзю, большасць якой былі камсамольцамі. Неўзабаве ўсе адна-душна запатрабавалі ад турэмнай адміністрацыі допуску ў турму газет, кніг, а таксама паляпшэння харчавання і бытавых умоў. Нашы патрабаванні былі задаволены.

Многія падпольшчыкі Пружанскага павета трапілі ў турму па даносу вядомага правакатара Ноткі. Але вось праз некаторы час гэты шпік невядома з якой мэтай апынуўся разам з намі. Гэтая вестка маланкай абляцела турму. Палітзняволеныя рашылі адпомсціць панскаму прыслужніку. Гэтую справу ўзяла на сябе наша чацвёртая камера. І вось аднойчы ў час прагулкі Нотку збілі да паўсмерці. За гэта адміністрацыя турмы ўсіх зняволеных нашай камеры пазбавіла на месяц газет, пасылак. Мяне пасадзілі на сем сутак у карцэр. Акрамя гэтага, супраць нас была ўзбуджана крымінальная справа, і ўсе мы былі асуджаны яшчэ на шэсць месяцаў турмы кожны. Але не гэта было самым жахлівым. Ужо ў драгобыцкай турме ў 1938 г. да нас дайшла вестка аб тым, што рашэннем Камінтэрна распушчана Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Гэта быў для ўсіх палітзняволеных, добрасумленных членаў КПЗБ адзін з самых цяжкіх удараў. Абвінавачанне КПЗБ у здрадзе было несправядлівым, правакацыйным.

За родную мову! За беларускую школу!

У культурна-асветніцкім жыцці Івацэвіцкага краю, як і ўсёй Беларусі, заўсёды важнае месца займала змаганне за родную мову і беларускую школу. Гэта барацьба заўсёды зліваласа з барацьбою за выжыванне спачатку пад імперскім уціскам Расіі, а на пачатку XX стагоддзя пад акупацыяй панскай Польшчы.

У той час, як у Савецкай Беларусі наглядалася буйное развіццё беларушчыны — працавалі нацыянальныя школы, выдаваліся беларускія газеты, часопісы, кнігі, да пачатку 30-х гадоў мова актыўна ўкаранялася ў дзяржаўных арганізацыях і ўстановах, станавілася дзяржаўнай моваю, зусім іншае адбывалася ў Заходняй Беларусі. Чатырохмільённае насельніцтва, што апынулася ў складзе Польшчы, пазбаўлялася ўсякіх правоў на сваё культурнае развіццё. Імкнучыся апалячыць беларускае насельніцтва, польскія ўлады ў

першую чаргу пачалі ліквідоўваць беларускія школы. Калі ў 1920 г. у Заходняй Беларусі іх было больш за 500, то ўжо ў 1925 г. не засталося ніводнай. Ліквідаваны былі таксама беларускія гімназіі і семінарыі. Аднак народ не хацеў адказвацца ад сваіх культурных нацыянальных крыніц і павёў рашучае змаганне за родную мову і беларускую школу. Пэўную ролю ў гэтай справе адыграла Беларуская сялянска-рабочая грамада. Пад яе ўплывам развівала сваю дзейнасць Таварыства беларускай школы, якое ўзнікла яшчэ ў пачатку 20-х гадоў як культурна-асветніцкая арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі. Паступова ТБШ вырасла ў масавую арганізацыю, якую актыўна выкарыстоўвала ў сваёй дзейнасці КПЗБ. У 1928 г. ТБШ аб'ядноўвала каля 500 гурткоў. У кожным з іх было да 30 членаў. Яны павялі шырокую дзейнасць за беларускую школу, за дэмакратызацыю народнай адукацыі, супраць рэакцыйнай сутнасці школьнага заканадаўства ўрада буржуазнай Польшчы, стваралі гурткі самадзейнасці, бібліятэкі, курсы для дарослых, закладвалі прыватныя беларускія школы і інш. Іх дзейнасць падтрымлівалі і беларускія дэпутаты ў польскім Сейме і Сенаце, якія аб'ядноўваліся ў Беларускім сялянска-рабочым пасольскім клубе (БСРПК).

Шматлікія дакументы і факты сведчаць аб шырокім размаху дзейнасці ТБШ на Івацэвіччыне. Гэтая патрыятычная дзейнасць праследавалася польскімі ўладамі. Многія актывісты ТБШ былі кінуты ў турмы.

У кастрычніку 1929 г. косаўскі староста Стэфан Чарноцкі даносіў палескаму ваяводзе ў Брэсце, што пасол Сейма Ян Грэцкі прыбыў з Вільні ў Косава і заявіў сакратару РК КПЗБ, што пасольскі клуб рыхтуецца да выступлення на сесіі Сейма і сабірае для гэтага розныя матэрыялы. Адначасова ён выдаў даручэнне акруговай управе ТБШ у Косаве пачаць арганізацыю гурткоў ТБШ у раёне. Далей староста паведамляў, што «старшыня акруговай управы ТБШ у Косаве запрошаны моладдзю вёскі Жытлін Борка-Гічыцкай гміны для стварэння там гуртка. 25 кастрычніка той прыбывае ў Жытлін з мэтаю стварэння гурткоў ТБШ у вёсках Хадакі, Власаўцы, Козікі, Вулька-Аброўская і іншых вёсках, дзе да гэтага часу такія гурткі не арганізаваны». Дадамо, што пасол Грэцкі Іван Міхайлавіч, як паведамляе БСЭ, быў уражэнцам і жыхаром Косава. У 1927 г. быў арыштаваны і пасаджаны ў турму. У сакавіку 1928 г. завочна выбраны дэпутатам польскага Сейма і ў маі як дэпутат вызвалены з турмы. Быў членам беларускай дэпутацкай фракцыі барацьбы за інтарэсы сялян і рабочых «Змаганне» і адным з кіраўнікоў гэтай арганізацыі. 30 жніўня 1930 г. быў арыштаваны і зняволены на 8 гадоў. У выніку абмену вязнямі з 1932 г. жыў у Мінску.

У другім допісе ваяводзе той жа староста даносіў аб актыўнай дзейнасці Сенькавіцкай арганізацыі ТБШ, у склад якой уваходзілі члены камсамольскай ячэйкі Хаванскі Міхаіл



Каля вясковай школы ў в. Выганашчы. 1925 г.

Іларыёнавіч (сакратар), Хаванскі Рыгор, Хаванскі Кірыл, Кухценя Іван і Шэлест Мікалай. Яны распаўсюджвалі беларускую літаратуру, наладжвалі прадстаўленні, змагаліся за беларускую школу. У 1929 г. жыхары Сенькавіч патрабавалі прыслаць у школу беларускага настаўніка. Яны адказаліся пасылаць дзяцей на навучанне польскаму настаўніку на чужой для іх мове.

Актыўную работу праводзілі гурткі ТБШ у вёсках Квасевічы, Альшаніца, Хрышчонавічы, Гошчава, Куляшы, Рудня і інш. Іх культурна-асветніцкая дзейнасць пад кіраўніцтвам КПЗБ і Грамады часта набывала палітычны характар, што выклікала злобу польскіх улад. На сходы гурткоў ТБШ прысылалі паліцыянтаў. Яны таксама нязменна прысутнічалі пры вечарынах з канцэртамі на беларускай мове. Дарэчы, такія канцэрты з удзелам самадзейных артыстаў забаранялася праводзіць у клубах, школах і іншых грамадскіх месцах. Таму месцам вечарын часта былі сялянскія гумны, хаты ці іншыя будынкі. Усачыць за дзейнасцю ТБШ паліцыі часта не ўдавалася. Так, яна не змагла перашкодзіць выступленню моладзі вёскі Гошчава, якая ў 1929 г. наладзіла дэманстрацыю 30 юнакоў і патрабавала вывучэння беларускай мовы.

Аднак праследаванні прыхільнікаў захавання і развіцця беларускай нацыянальнай ідэі толькі ўзмацнялі яе. Польскія ўлады сталі ўсё часцей прымяняць рэпрэсіўныя меры супраць дзейнасці ТБШ. У лютым 1931 г. намячалася правядзенне з'езда ТБШ у Вільні. 19 лютага «ў памяшканні акруговай управы ТБШ у Косаве адбыўся сход, на якім вызначаны дэлегатам на нелегальны з'езд у Вільні жыхар вёскі Квасевічы Кругляеўскі Аляксандр, — пісаў у справаздачы за люты 1931 г. павятовы староста. — Акрамя дэлегата акруговай управы на з'езд таксама былі абраны і дэлегаты некаторых гурткоў ТБШ, а менавіта: Грэцкі Аляксандр з крыла ТБШ вёскі Квасевічы, Радкевіч Юзэф — Размеркі, Палешук Юзэф — Юкевічы, Шэлест Мікалай — Сенькавічы, Левашэня Рыгор — Куляшы, Руды Аляксандр — Варанілавічы». Далей паведамлялася, што ўсе яны былі арыштаваны паліцыяй і на з'езд ТБШ не дапушчаны. У сувязі з гэтым многія арганізацыі ТБШ накіравалі пратэсты віленскаму старосце. У гэтых пратэстах выказвалася абурэнне дзейнасцю ўлад супраць дзеячаў ТБШ.

У жніўні 1929 г. польскія ўлады ўчынілі рэвізію ў памяшканні Косаўскай акруговай управы ТБШ, у час якой было знойдзена 14 экземпляраў нелегальнай літаратуры. У прыватнасці, Зварот галоўнага камітэта Таварыства дапамогі насельніцтву беларускіх земляў, якія пацярпелі ад неўраджаю, «Ліст да беларускіх сялян і рабочых», Статут названага Таварыства на беларускай і польскай мовах, брашура «Казка аб вадзе». Павятовы староста Стэфан Чарноцкі, паведамляючы аб гэтым ваяводзе, просіць прыцягнуць вінаватых да адказнасці за захоўванне і распаўсюджванне названай літаратуры. Што ж так напалохала польскія ўлады ў адозве дапамагчы сялянам паўночна-заходніх зямель Заходняй Беларусі, цярпеўшых голад ад неўраджаю? Выкрыццё вынікаў каланіяльнай палітыкі буржуазнай дзяржавы, заклік насельніцтва да з'яднання ў аказанні дапамогі.

«...Голад і галеча, бесперашкоднае глумленне над вёскай, хваробы і няшчасці былі адвечнымі і сталымі спадарожнікамі сярмяжнага селяніна...» — гаварылася ў адозве. Там жа было і пра неабходнасць адзінства сялянства і рабочых у барацьбе за сваю лепшую долю. Таму лепшыя прагрэсіўныя выданні закрываліся, а нядоля людская замоўчвалася.

Значную ролю ў нацыянальным самазахаванні адыгрываў Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб, дзеячы якога падвяргаліся праследаванню і слежкы. Вось што з гэтае прычыны даносіў косаўскі староста намесніку ваяводы 9 сакавіка 1930 г.: «БСРПК пры дапамозе пошты рассылае да асобных дзеячаў адозву, выдадзеную праз БСРПК у лютым б. г., якая пачынаецца словамі «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» Пасол Іван Грэцкі арганізаваў распаўсюджанне яе праз кіраўніка павятовага сакратарыята БСРПК у Косаве Сцяпана Лаўрынчыка і інструктара РК КПЗБ Дзмітрыя Ёвіка. Ім рэкамендавалася арганізаваць пратэсты і збор подпісаў пад імі супраць уціску беларускага насельніцтва праз фашысцкі ўрад Пілсудскага, супраць белага тэрору, які ўжываецца да беларускіх школ і ТБШ, супраць арыштаў і закрыцця беларускай гімназіі ў Клецку, супраць шарваркаў, высокіх падаткаў, супраць са-

мавольстваў польскай дэфэнзівы, камасацыі, ліквідацыі сервітутаў і г. д.».

3 снежня 1929 г. паліцыя правяла вобыскі ў памяшканні сакратарыята БСРПК у Косаве і пабудовах яго сакратара Мікалая Пестрака, у час якіх былі знойдзены пісьмы і адозвы з антыдзяржаўным зместам, якія прынёс пасол Іван Грэцкі. Мікалай Пестрак быў арыштаваны і змешчаны ў пружанскую турму.

У 30-я гады праследаванні змагароў за беларускую школу і мову ўзмацніліся — польскія ўлады закрывалі ўправы і гурткі ТБШ, кіраўнікоў арыштоўвалі і судзілі. Уладамі кантралявaліся малейшыя праяўленні беларускасці. У 1934 г. яшчэ існавала адзіная беларуская гімназія ў Вільні, хаця і яе дзейнасць ушчамлялася. Дык вось, 7 студзеня 1934 г. косаўскі староста даносіў ваяводзе, што «вучаніца беларускай гімназіі ў Вільні імя Славацкага Козел Еўдакія, жыхарка вёскі Яглевічы, якая прыехала да бацькоў на святочныя канікулы, прывезла з сабою з Вільні 25 беларускіх календароў, якія прадавала па 50 грошай за штуку. Козел расказала Красоўскай (член Яглевіцкай арганізацыі КПЗБ), што такія календары, а таксама беларускія кніжкі былі разданы вучням дырэкцыяй гімназіі...». За распаўсюджанне беларускай літаратуры Козел сурова папярэдзілі.

За перыяд з 1928 па ліпень 1930 г. была забаронена дзейнасць 6 акруговых управаў і 300 гурткоў ТБШ. У 1937 г. дзейнасць ТБШ была забаронена. І ўсё ж у развіцці і захаванні беларускай мовы і культуры дзейнасць ТБШ і яе кіраўнікоў Б. А. Тарашкевіча, І. С. Дварчаніна, нашага земляка І. М. Грэцкага, П. М. Мятлы, Р. Р. Шырмы, А. К. Лябецкай і іншых пакінула значны след.

У сённяшняй рэчаіснасці абставіны склаліся так, што з'явілася патрэба зноў ствараць ТБШ. Дарэчы, яны няблага пачалі сваю святую справу абароны беларускай мовы і беларускай школы.

М. Банасевіч.

Роднае слова

З успамінаў былога падпольшчыка і настаўніка В. Шурубейкі

Надзённай, духоўнай патрэбай сталі сёння для кожнага чалавека перыядычныя выданні друку — газеты і часопісы. Для нас, беларусаў, асабліва дарагія выданні на роднай мове. Мне, чалавеку старэйшага пакалення, добра вядома, колькі сіл аддалі лепшыя сыны нашага народа барацьбе за паўнапраўнае існаванне беларускай мовы наогул і друкаванне газет і часопісаў на роднай мове ў прыватнасці.

Успамінаю той, ужо далёкі час, калі на беларускай зямлі гаспадарылі польскія паны. Беларуская мова была ў загоне і заняпадзе, улады адносіліся да яе з пагардай і здзекам. Актывісты маёй роднай вёскі Сярадава, а таксама вёсак Гошчава, Размеркі, Быч і іншых дамагаліся ад польскага ўрада прызнання нашай мовы і адкрыцця беларускай школы ў Сярадаве. У польскім заканадаўстве быў такі пункт, у якім гаварылася, што, калі бацькі 40 дзяцей школьнага ўзросту пажадаюць вучыць іх на роднай мове, то ўлады павінны адкрыць такую школу. І вось мы, актывісты, сабралі 40 заяў бацькоў і падалі іх уладам. Але тыя запатрабавалі, каб подпісы бацькоў былі засведчаны войтам гміны. Войт жа адмовіўся гэта зрабіць і кпліва сказаў: «У вас ёсць свой камітэт, няхай ён вам засведчвае гэтыя подпісы».

Мы скардзіліся на войта ў староства, якое было ў Мерачоўшчыне, але дарэмна. Подпісы бацькоў засталіся незасведчанымі і ўсе нашы клопаты аб адкрыцці беларускай школы былі дарэмнымі. Дарэчы, наша скарга на войта захоўваецца цяпер у дзяржархіве ў горадзе Баранавічы.

А камітэт, аб якім гаварыў войт, сапраўды ў Сярадаве існаваў. Такія камітэты ствараліся ў беларускіх вёсках членамі Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Грамада, створаная беларускімі дэпутатамі ў польскім сейме, хутка расла, сяляне ахвотна ўступалі ў яе рады. У Сярадаве камітэт Грамады сабраўся ў маёй хаце. Я быў найбольш пісьменным сярод таварышаў, таму выконваў абавязкі сакратара камітэта. Мы выпісвалі газеты і часопісы на беларускай і ўкраінскай

мовах, чыталі іх і даводзілі змест да насельніцтва. Члены камітэта былі цесна звязаны з падполлем.

Звычайна мы чыталі газеты і часопісы жыхарам на вячорках. Збіраць сходы сялян было вельмі цяжка, бо аб правядзенні сходу патрэбна было загадзя пісьмова паведаміць у староства. Тады на сход абавязкова прысылалі паліцэйскага. А вячоркі кантраляваліся рэдка, і на іх збіралася амаль уся вёска.

Мы чыталі сялянам не толькі артыкулы перыядычнага друку, але і лепшыя творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Памятаю, якое захапленне ў чытачоў выклікаў твор Кандрата Крапівы «Біблія».

Грамада расла. Рэвалюцыйныя настроі мацнелі. У вёсках праходзілі дэманстрацыі пратэсту супраць прыгнёту паноў. Самая магутная з іх была 3 лютага 1927 г. у Косаве.

Польскі ўрад прыняў жорсткія меры супраць Грамады. Аднойчы ноччу паліцыя зрабіла ў мяне вобыск. Усю беларускую літаратуру

В. З. Харужая.

забралі, а мяне арыштавалі. Затым Грамада была разгромлена.

З вялікай радасцю сустрэлі мы ў верасні 1939 г. Чырвоную Армію. Сяляне атрымалі, нарэшце, магчымасць вучыць сваіх дзяцей на роднай мове. Беларускае слова атрымала роўнае права сярод моў іншых народаў нашай шматнацыянальнай краіны. Я стаў настаўнікам у нашай пачатковай школе, дзе няспынна гучала роднае слова.

Усё жыццё ў барацьбе

Імя палымянай рэвалюцыянеркі, сапраўднай патрыёткі сваёй Бацькаўшчыны Веры Захараўны Харужай добра вядома на Беларусі. У 20-я гады сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі, член ЦК КПЗБ, член ЦК камсамола Польшчы Вера Захараўна вядзе актыўную падпольную работу, бясстрашна змагаецца за лепшую долю і шчасце беларускага народа. 1939 год. Вызваленне. Заходнія вобласці Беларусі ўваходзяць у склад БССР. І зноў Вера Захараўна Харужая ідзе туды, дзе цяжэй, дзе яе энергія і вопыт найбольш патрэбны. Яна зноў едзе ў Заходнюю Беларусь, каб дапамагчы тут наладзіць новае, вольнае жыццё. Восенню 1939 г. яна прыязджае ў г. п. Целяханы і ўладкоўваецца жыць у доме № 39 па вуліцы Савецкай. Тут яна актыўна вядзе палітычную і растлумачальную работу сярод насельніцтва.

У памяць аб В. З. Харужай у г. п. Целяханы і цяпер захаваўся домік, дзе яна жыла. На ім — мемарыяльная дошка. У Целяханскай школе-інтэрнаце ёсць музей імя В. З. Харужай. Яе імя носіць адна з вуліц пасёлка.

Летам 1940 г. Вера Харужая была пераведзена на работу ў Пінск. Тут яе заспела вайна. З першых дзён ваявала супраць фашыстаў у атрадзе В. Каржа. У першым жа баі загінуў яе муж. У жніўні 1941 г. Вера Захараўна перапраўляецца за фронт, а ў верасні 1942 г. зноў накіроўваецца ў варожы тыл і ўзначальвае падпольную групу ў Віцебску. Там фашысты арыштавалі яе і ў снежні 1942 г. закатавалі.

М. Калада.



Мемарыяльная дошка на доме ў Целяханах.

Настаўніца з вёскі Магіліцы

«Памятаю, як у нашай вёсцы Магіліцы ў 1923 г. была адкрыта школка, — расказвае Падгорны Фама Іванавіч. — Яна размясцілася ў невялікай хатцы насупраць могілак. У школе жыў і вучыў настаўнік Якубоўскі, родам з Дзятлава. Праз два гады, у 1925 г., яго замяніла Вераніка Трапачынская. Яна ў нас працавала 4 гады. Вучылі ўсё на польскай мове. Займаліся ў дзве змены. Дзяцей тады ў вёсцы было многа.

Вераніка Трапачынская была добраю настаўніцай, добрым чалавекам, але што мне найбольш запомнілася — гэта яе малюнкі. Яна была добрым мастаком. Хадзіла з дзецьмі на Шчару і там на прыродзе малявала і нас вучыла. Памятаю, у яе пакойчыку пры школе вісела карціна «Ноч і дзень». Ноч — чорны конь імчыцца, толькі іскры ляцяць з-пад капытоў, дзень — белы конь. Яны даганяюць адзін аднаго. Гэту карціну яна малявала сама».

Хто ж яна, гэтая настаўніца, што так добра захавалася ў памяці сваіх вучняў і праз 70 гадоў?

Цяпер яна вядомая польская пісьменніца. Нарадзілася Вераніка Трапачынская-Агарак 8 студзеня 1908 г. у Львове. Паходзіла з рабочых. У 20—30-я гады настаўнічала ў Заходняй Беларусі, у прыватнасці ў в. Магіліцы.

У час другой сусветнай вайны ўдзельнічала ў руху Супраціўлення ў Польшчы. Пасля вайны працавала ў друку і на радыё. З-пад яе пяра ў 1954 г. выйшаў на польскай мове аўтабіяграфічны раман «Лясныя долы» пра жыццё і рэвалюцыйную барацьбу ў Заходняй Беларусі. Героямі ў ім з'яўляюцца жыхары вёскі Магіліцы, яе знаёмыя. З любоўю апісвае яна тутэйшыя мясціны, нашу прыроду, тое, што было ёй люба, што вабіла яе. Гэты твор у 1958 г. пераклаў на беларускую мову Максім Лужанін. Другім творам Веранікі Трапачынскай-Агарак з'яўляецца гістарычны раман «Салдаты Касцюшкі» (1952—1956). Яго галоўны герой Тадэвуш Касцюшка, наш зямляк з Мерачоўшчыны, а таксама салдаты дывізіі імя Т. Касцюшкі Войска Польскага. Ёю напісаны і іншыя творы.

Памерла Вераніка Трапачынская-Агарак 10 мая 1957 г.

В. Мароз.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ НАЧАЛЬНІКА ПРУЖАНСКАЙ ТУРМЫ ВІЦЭ-ПРАКУРОРУ 5-ГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАГА АКРУГОВАГА СУДА

1 верасня 1929 г.

Пение, крики и суматоху заключенных камер N 4 и 6 16 августа 1929 г. организовали самые главные подстрекатели, как-то: в камере N 4 — Пестрак Филипп, Тринда Николай, Петух Николай, Толочко Константин, Лахей Александр, Рак Марк, а в камере N 6 — Храповицкий Павел. Заключенные камеры N 4 во главе с вышеназванными договорились через окно с заключенными камеры N 6 при помощи тайно переданных грипсов. В камере N 6 заправлял Храповицкий. Пестрак и Храповицкий признались в написании требований, которые были предъявлены в оригинале пану прокурору. Почти все пункты представленных требований идентичны с требованиями камеры N 6, что свидетельствует о сговоре заключенных этих камер.

16 августа 1929 г. после проверки, когда пан прокурор посетил камеру N 4 в связи с криком и пением, заключенные камеры N 4 очень надменно, с криком, приняв вызывающую позу, угрожающе махали руками в направлении пана прокурора, меня и надзирателей, несколько раз заявляли, что все требования должны быть удовлетворены, в противном случае они не прекратят шума, пения и голодовки. Своим поведением выделились Тринда Николай, Пестрак Филипп, Петух Николай, Лахей Александр, Толочко Константин (размахивали руками над головой пана прокурора).

Когда в последующие дни голодовки я с доктором посетил камеру, то заключенные вслед мне и надзирателям кричали: «Палачи, кровопийцы, паразиты, вон из камеры!» Первыми

кричали и ругались Пестрак, Трында, Лахей, Толочко, Рак Марк, Петух, Крот Лукаш, а за ними и другие.

23 августа заключенные камеры N 4 в количестве 16 человек — Пестрак, Петух, Толочко, Трында, Лахей, Рак, Крот Лукаш, Маркевич, Артюх, Тимошевич, Ярута Василий, Власовец, Крот Григорий, Кокоша, Полещук, Голодко — устроили баррикаду, которую убрать добровольно отказались. Когда же надзиратели подошли к окнам, заключенные загородили окна сенниками и поэтому администрация по указанию пана прокурора применила силу для удаления препятствий, мешающих входу в камеру. Через окно при помощи пожарного насоса на заключенных, собравшихся у баррикады и поддерживающих заграждение, была направлена струя воды. Большинство заключенных этой камеры отскочило от дверей и укрылось в углу камеры, прикрываясь одеялами и сенниками, а заключенные Толочко, Трында, Пестрак, Марк Рак продолжали ходить по камере, призывая к сопротивлению. Эти заключенные через решетки окон камеры N 4 бросали в надзирателей различные мелкие предметы. Выброшено 10 плиток, одно зеркальце, 3 эмалированные миски, 5 чернильниц. В камере заключенные были вооружены обломками инвентаря, которые потом они побросали.

24 августа во время смены белья Крот Лукаш толкнул ногой старшего надзирателя Белевича и надзирателя Петровского, оскорблял их, затем при переводе в камеру N 6 плюнул в лицо надзирателю Петровскому и сквернословил.

25 августа, когда надзиратель Гурский открыл камеру N 6 и вызывал заключенного Маркевича к врачу на обследование, Рак Марк, требуя, чтобы надзиратель ушел из камеры, схватил крышку от параши и нацелился в надзирателя Гурского, но бросить ее помешал старший надзиратель Савицкий.

Начальник тюрьмы Я. Блонский.

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобл. Ф. 55. Воп. 1. Спр. 128. Л. 17–18.

СПРАВАЗДАЧА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДЫ МІНІСТЭРСТВУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ У ВАРШАВЕ АБ ЛІКВІДАЦЫІ РК КПЗБ І КСМЗБ У КОСАВЕ

7 верасня 1929 г.

У сувязі з тэлефонаграмай і справаздачай... паведамляю, што пасля ліквідацыі ў 1928 г. КПЗБ у Косаве, якую ўзначальваў яе сакратар Даніла Букшта з Галенчыц Борка-Гічыцкай гміны і знікненню яго, гэты райком у канцы 1928 г. быў зноў адноўлены. Сакратаром райкома быў назначаны Мікалай Горбач з Даманава Баранавіцкага павета, а сакратаром РК КСМЗБ у Косаве — Аляксандр Лахей з Любішчыц Борка-Гічыцкай гміны. Райком [...] праводзіў слабую дзейнасць, за тое ж сакратар РК КСМЗБ Аляксандр Лахей разгарнуў шырокую арганізацыйную дзейнасць у раёне, за што ў снежні 1928 г. быў арыштаваны і пасаджаны ў турму. У першай палове 1929 г. райком [...] на чале з Мікалаем Горбачам зноў аднавіў падрыўную работу. На месца арыштаванага Аляксандра Лахея прызначылі Уладзіміра Савіцкага з Косава. Вызначана арганізацыйная структура райкома і пачата аднаўленне кантактаў партыйных і разгромленых адзінак. У выніку нарад, праведзеных вядомымі падрыўнымі дзеячамі: Мікалаем Горбачам з Даманава, Івана Мальчыка з Азярца, Уладзіміра Савіцкага з Косава, Васіля Лося з Сенькавіч, Міхала Якуцэні з Гладышаў і Івана Молаша з Галенчыц устаноўлены сувязі з Баранавіцкім і Слонімскім АК КПЗБ, членам гэтага ж АК Лейзерам Куніцай з Ружан, партыйны псеўданім «Макс». Затым устаноўлена, што Косаўскі РК распаўсюдзіць сваю дзейнасць на наступныя тэрыторыі: падраён N 1 у Косаве на тэрыторыю Косаўскай гміны, падраён N 4 у Даманаве Баранавіцкага павета на тэрыторыю Дабромысльскай гміны, падраён N 2 у Сенькавічах Борка-Гічыцкай гміны з вёскамі Сенькавічы, Аляксейкі, Руда, Кушнеры і з гміны Косаўскай — Юкевічы, Быч, Размеркі і Гошчава; падраён N 5 Азярцоўска-Любішчыцкі з вёскамі Азярцо, Падстарынь, Боркі і Любішчыцы Борка-Гічыцкай гміны, падраён N 5 у Галенчыцах з вёскамі Галенчыцы, Воля, Яглевічы і Гічыцы, падраён N 6 у Вульцы Аброўскай з вёскамі Вулька Аброўская Святавольскай гміны, Власаўцы, Хадакі, Жытлін, Корачын, Зыбайлы Борка-Гічыцкай гміны. Падраёны Святавольскі N 7 і Целяханскі N 8 не былі арганізаваны.

У перыяд ад студзеня да красавіка б.г. гэты райком выканаў наступныя акцыі: у сувязі са святкаваннем гадавіны смерці Леніна, якая прыпадала на 21 студзеня, вывешаны транспаранты з камуністычнымі заклікамі: 1) ноччу на 25.1. б. г. на дарозе каля вёскі

Хрышчонавічы Косаўскай гміны і 2) 26.1. б. г. на дарозе Косава — Аўсто ў напрамку Івацэвіч на адлегласці 1 км ад Аўсто...

У сувязі з арыштам Баранавіцкім следчым аддзелам у сакавіку б.г. Івана Райко з Даманава Мікалай Горбач, баючыся арышту, не прадпрымаў ніякай дзейнасці, таму на месца сакратара Косаўскага РК КПЗБ назначаны член партыі Міхаіл Якацэня з Гладыш Косаўскай гміны, які наладзіў кантакт з членам Слонімскага АК КПЗБ Лейзерам Куніцай, пс. «Макс» з Ружан і з Уладзімірам Савіцкім з Косава, а таксама з Мікалаем Горбачам, пс. «Кароткі» з Даманава. Якуцэня, не бачачы для сябе ніякай матэрыяльнай выгоды, не выканаў некалькі даручэнняў АК, а таксама не склікаў раённых канферэнцый, таму пасля двух месяцаў пасля выбрання яго месца зноў заняў Мікалай Горбач.

Акцыя 1 мая б. г. на тэрыторыі Косаўскага РК КПЗБ і КСМЗБ была самастойна праведзена ячэйкамі, таму што не былі скліканы раённыя канферэнцыі. Вывешаны транспаранты з камуністычнымі заклікамі: 1) ноччу на 30.4. б.г. на дарозе Косава — Івацэвічы Борка-Гічыцкай гміны, 2) ноччу на 1 мая на тэлефонным слупе пры чыгунцы Івацэвічы — Даманава Борка-Гічыцкай гміны, 3) ноччу на 1.5. б.г. на прыдарожным дрэве ў лесе каля дарогі Харошча — Руда Борка-Гічыцкай гміны, 4) ноччу на 1.5. б.г. на тэлефонным дроце пры дарозе з Косава на Ружаны за 7 км ад Косава, 5) ноччу на 2.5. б.г. і 6) днём 6.5. б.г. на дрэве пры могілках царквы ў в. Гаі Борка-Гічыцкай гміны.

Толькі ў чэрвені б. г. Мікалай Горбач наладзіў кантакт з АК і склікаў раённую канферэнцыю на Тройцу, якая адбылася з удзелам члена Баранавіцка-Слонімскага АК КПЗБ і праходзіла ў жыце каля вёскі Кушняры-Падстарынь Борка-Гічыцкай гміны. На той канферэнцыі ўстаноўлена новая арганізацыйная структура райкома, г.зн. — выбралі прэзідыум, члены якога павінны былі непасрэдна весці падпольную работу на тэрыторыі раёна. У прэзідыум райкома КПЗБ былі выбраны: Мікалай Горбач як сакратар і члены: Марк Агейчык, Іван Молаш, Васіль Лось і асоба з Бялавіч, сляпы на адно вока. У прэзідыум РК КСМ выбралі Міцю з Сенькавіч, Валодзю з Юкевіч, Рыгора Мулярчыка з Азярца і Уладзіміра, члена гуртка ТБШ з Бялавіч.

Дэлегат Баранавіцка-Слонімскага АК КПЗБ заўважыў на той канферэнцыі няправільны напрамак працы райкома і нелаяльнае выступленне некаторых удзельнікаў канферэнцыі, якія жадалі адкрыцця эміграцыі ў Расію скампраметаваных членаў кампартыі і г.д. Па выніках гэтай канферэнцыі сакратарыят Баранавіцка-Слонімскага АК КПЗБ накіраваў Косаўскаму райкому цыркуляр, у якім указаў на недахопы ў раёне, і што для аздараўлення абставін, якія пануюць, у раён будзе прызначаны спецыяльны дэлегат АК. Цыркуляр гэты разам з транспартам камуністычнай літаратуры, прызначанай для Косаўскага і Ружанскага РК, якую атрымаў з АК 11.6. б. г. тэхнік Ружанскага РК КСМ Васіль Шыло, быў перахвачаны. Копію гэтага цыркуляра я прапанаваў у свой час.

26.7.29 г. атрымана канфідэнцыяльная вядомасць, што Марк Агейчык з Любішчыц атрымаў ад Мікалая Горбача з Даманава транспарт камуністычнай літаратуры для распаўсюджання ў райкоме і прыхоўвае яе ў сябе, таму было загадана неадкладна правесці рэвізію, у час якой у Марка Агейчыка знойдзена 10 штук камуністычных адозваў і яго арыштавалі. Марк Агейчык, сын Івана і Алены, 29 год, жанаты, пражывае ў Любішчыцах Борка-Гічыцкай гміны. У час допыту прызнаў віну прыналежнасці да КПЗБ, у падрыўной дзейнасці з 1927 г. і выдаў некаторых членаў кампартыі, а менавіта Мікалая Горбача з Даманава, Аляксандра Лахея з Любішчыц і многа іншых. Названы выдаў увесь склад падраёна ў Азярцах, да якога належала 5 ячэек: N 1 у Борках, N 2 у Любішчыцах, N 3 у Падстарыні, N 4 у Азярцы, N 5 у Любішчыцах-Ашыкоўцах Борка-Гічыцкай гміны. Гэты падраён уваходзіў у склад Косаўскага райкома, сакратаром якога быў Мікалай Горбач. Сакратаром падраёна ў Азярцы быў Іван Мулярчык, які зараз хаваецца. Агейчык прызнаўся, што ячэйка ў Азярцы вывесіла камуністычны транспарант 1 мая б. г. каля царквы ў Гаі, а ячэйка ў Борках вывесіла другі транспарант на тэлефонным слупе на чыгуначнай лініі Івацэвічы — Даманава. Прызнаўся, што ўдзельнічаў у раённай канферэнцыі каля вёскі Падстарынь-Кушняры каля лесу пры ўдзеле дэлегата ад Слонімскага АК на праваслаўную Тройцу. Акрамя яго на гэтай канферэнцыі былі Мікалай Горбач, Іван Молаш, Рыгор Мулярчык, Васіль з Сенькавіч, трох астатніх Агейчык не ведае. Дадаў, што на гэтай канферэнцыі абмеркаваны пытанні: справаздачы з месц, справаздачы аб палітычнай сітуацыі ў свеце і асабліва ў Польшчы, пра МОПР, рэарганізацыю РК, дзе вырашана ліквідаваць пасаду сакратара падрайкомаў, а выбраць прэзідыум РК, члены якога будуць абслугоўваць увесь

райком. Назваў прозвішчы членаў выбранага прэзідыума косаўскага райкома КПЗБ і КСМ. Агейчык паведаміў, што частку камуністычнай літаратуры, якую атрымаў ад Мікалая Горбача, раскідаў ва ўрочышчы Перавалока, дзе працуюць некалькі соцень работнікаў на будаўніцтве каналаў, частку аддаў Антону Чымбару для перадачы «Міці» ў Сенькавічах, астатак затрымаў у сябе, які забралі ў яго ў час рэвізіі. Агейчык паведаміў таксама, што хаваў у сябе Івана Мулярчыка і Уладзіміра Савіцкага з Косава, якія збеглі перад арыштам. Тады прыбыў да яго дэлегат АК КПЗБ са Слоніма пад пс. «Яраш», які раіўся з эмігрантамі і сказаў ім, што не будуць перапраўлены праз граніцу, бо Расія не прымае, а будуць яны прымацаваны да другога рэгіёна, дзе павінны працаваць у інтарэсах кампартыі. Савіцкага дэлегат абяцаў выслаць да Вільні.

Антон Чымбар, сын Карпа і Марыі, 22 года, халасцяк, з вёскі Любішчыцы Борка-Гічыцкай гміны прызнаў сябе вінаватым і паведаміў, што ў КПЗБ уцягнуў яго Марк Агейчык з Любішчыц зімою б. г. і залічыў членам мясцовай ячэйкі. У час рэвізіі ў яго знойдзена каля 4-х фунтаў (1600 гр.) камуністычнай літаратуры розных праяў на польскай мове, якую, як паведаміў, атрымаў ад Марка Агейчыка і хаваў да часу з'яўлення паліцыі. Чымбар добраахвотна выдаў прыхоўваемую літаратуру.

Рыгор Мікуліч, сын Аляксандра і Тэклі, 27 год, з Падстарыні Борка-Гічыцкай гміны прызнаў сябе вінаватым і паведаміў, што ў партыю ўцягнуў яго Мікалай Гладун (цяпер у Расіі). Паведаміў, што ў апошні час выконваў абавязкі сакратара ячэйкі ў Падстарыні, якая належала да Азярцоўскага падраёна, на чале якога стаяў Іван Мулярчык. Прызнаўся, што два месяца таму ўдзельнічаў у падраённай канферэнцыі, якая адбылася за Падстарыняй у полі. Акрамя яго былі на той канферэнцыі Іван Мулярчык, адзін член кампартыі з Борак і адзін з Халап, якіх не ведае. На канферэнцыі выступаў Іван Мулярчык, даручаючы весці агітацыю сярод навабранцаў у войска, каб там праводзілі агітацыю ў інтарэсах кампартыі і напомніў аб рэгулярнай аплаце членскіх узносаў, а таксама вучыў, як трэба працаваць для партыі.

Васіль Каляда, сын Івана і Алены, 26 год, халасцяк, значыцца ў справе ліквідацыі КПЗБ з лютага 1928 года, з Азярца Борка-Гічыцкай гміны, цяпер сакратар ячэйкі ў Азярцы, актыўны і вопытны член кампартыі, вінаватым сябе не прызнаў.

Мікалай Горбач, сын Івана і Кацярыны, 25 год, халасцяк, які пражывае ў Даманаве Дабромыслькай гміны Баранавіцкага павета, быў пад следствам за вывешванне камуністычнага транспаранту на дарозе з Даманава да Быцені, цяперашні сакратар Косаўскага РК КПЗБ, прызнаў сябе вінаватым, выдаў архіў райкома, які складаўся з камуністычнай літаратуры (брашур) на польскай мове, і ахарактарызаваў работу райкома, а таксама выдаў шэраг членаў кампартыі. Ён належаў да КПЗБ з пачатку 1927 г. Уцягнуў яго ў гэтую арганізацыю Сцяпан Снітко, вядомы пад клічкай «Троцкі» з Любішчыц, які залічыў яго членам ячэйкі ў Даманаве. Летам 1927 г. на канферэнцыі, якая адбылася ў Бычы Косаўскай гміны пры ўдзеле Івана Раўбецкага, Лаўрэна з в. Галік і сакратароў другіх падраёнаў Горбач быў выбраны сакратаром падраёна. Зімою 1928 г. пасля ўстанаўлення кантактаў і пачатку рэарганізацыі Косаўскага РК праз Аляксандра Лахея з Любішчыц быў назначаны сакратаром Косаўскага РК КПЗБ, а Лахей застаўся сакратаром Косаўскага РК КСМ. Паведаміў, што ў склад Косаўскага РК КПЗБ уваходзіла 5 падраёнаў: Даманаўскі, Любішчыцкі, Сенькавіцкі, Яглевіцка-Галенчыцкі і Косаўскі. Заявіў, што пасля арышту Аляксандра Лахея ён замест яго наладзіў кантакт з Баранавіцка-Слонімскім АК, куды некалькі разоў ездзіў на яўку па камуністычную літаратуру. Паролем служыла газета «Экспрэс» або «Кур'ер чырвоны», якую трымаў у руцэ і хадзіў па школьнаму двару ў Слоніме, куды прыбыў невядомы яму пад пс. «Мітка». Пасля пытання, якая гадзіна і атрымання пароля, атрымаў загад чакаць у Слоніме да вечара на паўторнае спатканне. Вечарам той «Мітка» (пс. «Мітка» — гэта Міська Феактын, сакратар АК КСМ, які быў арыштаваны праз Слонімскую паліцэйскую камендатуру ў снежні 1928 г. у час ліквідацыі, праведзенай у сувязі з забойствам канфідэнта Мароза) з'явіўся з невядомаю яму яўрэйкаю і прадставіў яе як члена АК (пс. «Мандалінка»), якія разам даручылі яму арганізацыю Косаўскага РК. Акрамя гэтага, Горбач назваў 2-х членаў Баранавіцка-Слонімскага АК: «Рудольфа» і «Ёрша», аднак прозвішчы іх не былі ўстаноўлены, і яны не былі арыштаваны. Затым Горбач прызнаўся, што на праваслаўную Тройцу б. г. па заданню «Ёрша» склікаў канферэнцыю Косаўскага РК, якая адбылася ў жыце пад лесам паміж вёскамі Падстарынь і Кушняры, на якой акрамя яго і «Ёрша» былі некалькі сакратароў падрайкомаў КПЗБ і КСМ. На той канферэнцыі былі абмеркаваны справы канспірацыі,

пытанні арганізацыйныя, паведамленні з месц, палітычнае і эканамічнае становішча ў Польшчы і за граніцаю, аб тым, што Расія не прымае скампраметаваных членаў КПЗБ і г. д. Члены Косаўскага РК скардзіліся «Ярашу», што Расія прымае толькі яўрэяў, а хрысціян не хоча прымаць, на што «Яраш» адказаў, што ў Косаўскім РК пануе антысемітызм і т. п. У канцы канферэнцыі ўзнята пытанне аб ліквідацыі падраёнаў і на месца тых сакратароў выбралі прэзідыум РК... «Ёрш» рэкамендаваў правесці 1 жніўня маніфестацыю ў Івацэвічах з удзелам рабочых лесапільных заводаў, аднак гэтая прапанова не была прынята. Акрамя гэтага «Ёрш» прапанаваў правесці сярод рабочых лесапілак агітацыю, каб дэлегаваць 2-х рабочых у Слонім. Аднак гэта па невядомых прычынах не было зроблена. Горбач таксама паведаміў, за два тыдні да 1 жніўня ездзіў у Слонім за камуністычнай літаратурай, прывёз яе каля 4-х фунтаў, якую раздаў Марку Агейчыку і Антону Шабану для распаўсюджвання. Пасля арышту ўсіх трох ад Шабана і Горбача забралі большую частку літаратуры, а ад Агейчыка невялікую колькасць, бо па даручэнню Горбача значную частку ён раскідаў на «Перавалоцы», дзе працавалі некалькі соцень рабочых на капанні канаваў...

Сяргей Грэчны, сын Траха і Кацярыны, пс. «Сялёдка», 23 год, халасцяк, які пражываў у Вольцы Аброўскай Святавольскай гміны Косаўскага павета прызнаў віну прыналежнасці да КПЗБ, да якой летам б. г. прыцягнуў яго Іван Тымашэвіч, пс. «Іцко», які быў сакратаром падраёна, а Грэчнага прызначыў кур'ерам. Грэчны разносіў літаратуру да Власаўцаў і Зыбайлаў Борка-Гічыцкай гміны і паведаміў, што ў Власаўцах атрымаў яе Панас Міхнюкевіч, а ў Зыбайлах — Антон Колтун. Пасля праверкі аказалася, што прызнанне яго не праўдзівае і што ён гэтым скрывае сапраўдных членаў кампартыі, а выдае людзей не вінаватых, на якіх мае злосць, г. зн. асабістую помсту.

Антон Шабан, сын Аляксея і Яўфіміі, 23 год, халасцяк, які жыве ў Даманаве Дабромысльскай гміны Баранавіцкага павета, віну прыналежнасці да КПЗБ не прызнаў, але прызнаўся, што сімпатызуе гэтай арганізацыі і меў кантакты з Мікалаем Горбачам, які даў яму на захаванне камуністычную літаратуру, якую ў час арышту добраахвотна аддаў.

Міхаіл Якуцэня, сын Андрэя і Агафіі, 22 гады, халасцяк, відны член кампартыі, які пражывае ў Гладышах Косаўскай гміны і павета, прызнаў сваю віну прыналежнасці да КПЗБ, даў абцяжарваючы матэрыял на Лаўрэна Мікалайчыка і Паўла Дзядюшку з в. Галік, з якімі меў кантакт з 1925 г. Паведаміў, што пасля арышту названых выконваў абавязкі сакратара падраёна в. Галік і меў сувязь з Уладзімірам Савіцкім, які быў вядомы яму як сакратар Косаўскага падраёна РК КПЗБ. Далей прызнаўся, што пасля Мікалая Горбача два месяцы быў сакратаром Косаўскага РК КПЗБ, але з-за таго, што не склікаў канферэнцый і не праводзіў падрыўной дзейнасці, перад 1.5. б. г. на яго месца і без яго ведання быў выбраны зноў Горбач. Акрамя гэтага, паведаміў, што пры пасрэдніцтве Уладзіміра Савіцкага з Косава атрымаў сувязь з Ружанамі, адкуль затым Лейзар Куніца (пс. «Макс») даў яму пароль да Слонімскага АК КПЗБ, куды ездзіў два разы, аднак не атрымаў сувязі. Першы раз атрымаў на дарогу ад Куніцы 5 злотых. Прызнаўся таксама да ўдзелу ў канферэнцыі каля Падстарыні. На гэту канферэнцыю выклікаў яго Савіцкі з Косава. Якуцэня апісаў увесь ход гэтай канферэнцыі так, як і іншыя яе ўдзельнікі. Перад допытам Якуцэня ўласнаручна напісаў паказанні аб сваёй падрыўной дзейнасці і прыналежнасці да кампартыі на рускай мове.

Іван Молаш, сын Томаша і Кацярыны, 24 год, халасцяк, які пражываў у Галенчыцах Борка-Гічыцкай гміны, прызнаўся ў прыналежнасці да КПЗБ з вясны 1927 г., у якую ўцягнуў яго Даніла Букшта, які зараз хаваецца. Па яго даручэнню Молаш павінен быў трымаць кантакт і дарогу партыйнай сувязі з Іванам Мулярчыкам з Азярца і Пятром Лішкам з Козікаў, які са снежня 1928 г. быў у турме за падрыўную дзейнасць. Пасля ўстанаўлення партыйных кантактаў з названымі Молаш насіў нейкія даручэнні ў канверце ад Мулярчыка да Лішкі, на якім па-руску было напісана «экстраннае». Акрамя гэтага, паведаміў, што пасля ўцёку Данілы Букшты да Расіі прыходзілі да яго ў розны час розныя асобы, якіх не ведаў, і пыталіся пра дарогу ў Любішчыцы і т. п. Прызнаўся, што Іван Мулярчык даваў яму даручэнне паехаць да Васіля ў Власаўцы і паведаміў яму, што на Тройцу будзе раённая канферэнцыя, на якую Васіль павінен паклікаць нейкага «Сялёдку», але ці выканаў гэта даручэнне Васіль, не ведае, бо «Сялёдкі» на канферэнцыі не было. Молаш прызнаўся, што ўдзельнічаў у канферэнцыі каля Падстарыні і быў выбраны ў прэзідыум Косаўскага РК КПЗБ, а таксама апісаў ход яе, як і іншыя ўдзельнікі. Прызнаўся, што як член прэзідыума РК павінен быў атрымліваць інструкцыі ад Марка Агей-

чыка. Таксама прызнаўся, што Косаўскі РК КПЗБ налічваў 8 падраёнаў, але нумароў і месца іх ён не ведаў. З тых падраёнаў 7 і 8-мы, г. зн. Святавольскі і Целяханскі, не мелі кантактаў з РК.

Іван Тымашэвіч, сын Івана, пс. «Іцка», 26 год, жанаты, пражываючы ў Вольцы Аброўскай Святавольскай гміны вінаватым сябе да прыналежнасці да КПЗБ не прызнаў і заявіў, што праз асабістую помсту на яго нагаварыў Грэчны (пс. «Сялёдка», што пры праверцы аказалася праўдаю...

Рыгор Макар, сын Івана і Марыі, 26 год, пражываючы ў Любішчыцах-Ашыкоўцах Борка-Гічыцкай гміны прызнаўся ў прыналежнасці да КПЗБ і заявіў, што ўцягнуў яго зімою 1927 г. Сушка Рыгор Іванавіч і залічыў у Любішчыцкую ячэйку, у якую ўваходзілі Рыгор Макар, Антон Касавец, Васіль Казак, Сцяпан Снітко і Рыгор Сушка. Браў удзел у дзвюх канферэнцыях, у якіх удзельнічалі ўсе вышэйпамянёныя. Запомніў, што на канферэнцыях абмяркоўваліся пытанні аб аплаце членскіх узносаў і канспірацыі. На канферэнцыі запрашаў яго Рыгор Сушка. На апошняй канферэнцыі, калі Снітко і Касавец былі яшчэ на волі, яму даручылі арганізаваць у Любішчыцах на Ашыкоўцах ячэйкі КСМ, што пры дапамозе Рыгора Сушкі выканаў і стаў сакратаром. У гэтую ячэйку ўцягнуў Ігната Крата з Любішчыц і Івана Макарэвіча, які цяпер служыць у войску. Літаратуру атрымліваў ад Рыгора Сушкі, з якім утрымліваў пастаянны кантакт, а пасля яго арышту з Аляксандрам Лахеем з Любішчыц, які, як казаў, выконваў тады функцыі сакратара падраёна ці таксама раёна. Лахей даручыў яму ўцягваць новых членаў у ячэйку. Пасля арышту Лахея завязаў сувязь з Макарам Агейчыкам, з якім меў кантакт аж да яго арышту. У час рэвізіі ў Макара знойдзены 4 адозвы, якія атрымаў ад Марка Агейчыка.

У час арыштаў пералічаных знойдзена: у Марка Агейчыка 10 лістовак рознага зместу; у Антона Чымбара, які добраахвотна выдаў 131 лістоўку рознага зместу, якія атрымаў ад Марка Агейчыка; у Мікалая Горбача 6 лістовак рознага зместу, якія аддаў дабравольна; у Антона Шабана 40 лістовак рознага зместу, якія аддаў дабравольна; у Рыгора Макара знойдзена 4 лістоўкі, у астатніх арыштаваных не знойдзена нічога.

Следствам устаноўлена, што ўсе члены кампартыі павінны былі плаціць узносы членскія па 50 грошай у месяц.

Сярод названых рашэннем косаўскага следчага суддзі былі пасаджаны ў турму Мікалай Горбач, Міхаіл Якуцэня, Марк Агейчык, Іван Молаш, Васіль Каляда, Рыгор Мікуліч, Антон Чымбар, Рыгор Макар. Антон Шабан павінен быў унесці залог у 500 злотых, Сяргей [Грэчн..?] 300 злотых, а раз іх не ўплаціл, то былі пасаджаны ў турму. Іван Тымашэвіч быў адпушчаны пад нагляд паліцыі.

Сакратар ячэйкі ў Борках Міхаіл Сямашка ў час арышту ўцёк, але праз некалькі дзён сам з'явіўся да косаўскага павятовага следчага суддзі, рашэннем якога быў вызвалены пад нагляд паліцыі. Хаваюцца ад арышту члены праўлення Косаўскага РК КПЗБ Васіль Лось з Сенькавіч і Уладзімір Савіцкі з Косава, які выконваў таксама абавязкі сакратара Косаўскага падраёна N 1, далей Іван Мулярчык з Азярца — сакратар падраёна N 3 Азярцо — Любішчыцы, а таксама відны дзеяч КПЗБ Рыгор Мулярчык з Азярца.

Ваявода.

Пераклад з польскай мовы М. Банасевіча.

З ДАНЯСЕННЯ ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДЫ ПАЛІТЫЧНАМУ ДЭПАРТАМЕНТУ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ПОЛЬШЧЫ

25 верасня 1929 г.

...Пацвярджаецца вядомасць аб прыналежнасці пасла Грэцкага да КП, а менавіта: пасол 11 дня б. г. сустрэўся ў Косаве з членам ячэйкі в. Скураты і пытаўся ў яго пра сакратара Косаўскага РК КПЗБ Ёвіка. У той жа дзень пасла бачылі разам з членам КПЗБ Піліпам Максімчыкам (сляпы) з Бялавіч.

Ад Цярэшкі Пракопа, члена КПЗБ, які ўцёк у СССР, прыйшло пісьмо да родных, у якім скардзіцца на цяжкія жыллёвыя ўмовы і сцвярджае, што прыйдзецца яму там памерці і не пабачыць сям'ю...

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 696. Л. 26.

З ІНФАРМАЦЫІ КОСАЎСКАГА СТАРОСТЫ ПАЛЕСКАМУ ВАЯВОДЗЕ Ў АДДЗЕЛ ДЗЯРЖАЎНАЙ БЯСПЕКІ

24 снежня 1929 г.

Пан Начальнік дзяржаўнай бяспекі.

19 снежня б. г. невядомы... з в. Даргужы Косаўскай гміны, накіраваны праз Піліпа Герасімовіча, які жыве ў в. Гладышы Косаўскай гміны, з'явіўся да раённага інструктара КПЗБ і ўручыў яму наступную камуністычную літаратуру: 1) пракламацыі, надрукаваныя на каляровай паперы з віншаваннямі рабочых і сялян Савецкай Беларусі, з заклікам самавызначэння Заходняй Беларусі і далучэння яе да Савецкай Беларусі; 2) адозву ЦК КСМЗБ на рускай мове, якая пачынаецца словамі: «Все на боевую демонстрацию 7 ноября в связи с 12-й годовщиной Октябрьской революции под знамёнами КПЗБ и КСМЗБ» з заканчэннем рэвалюцыйнага закліку, з подпісам: Вільня, кастрычнік 1929 г.; 3) адозву Акруговага камітэта чырвонай дапамогі Заходняй Беларусі на польскай мове са словамі: «12-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі — дзень барацьбы ў абарону СССР», «Усе на забастоўку, мітынгі і дэманстрацыі 7 лістапада!», «Усе ў рады МОПРа», «Усе да акцыі дапамогі палітычным зняволеным», «Прэч з белым тэрорам. Прэч з ваеннымі падрыхтаваннямі», «Няхай жыве СССР», «Прэч з фашысцкай дыктатурай», «Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад!»; 4) адозва на беларускай мове, якая пачынаецца словамі: «7 лістапада ўсе на дэманстрацыі, мітынгі пад сцягамі камуністычнай партыі». Па даручэнню сакратара АК КПЗБ Баранавічы — Слонім установлена наступная арганізацыйная сістэма: ліквідавана становішча сакратара райкома, раён дзяліўся на 5 груп.

I группа: кіраўнікамі яе з'яўляюцца жыхары вёскі Бялавічы — Піліп Максімчык і Уладзімір Трында. Сюды ўваходзяць ячэйкі Бялавічы, Гошчава, Вялікі Галік, Скураты, Квасевічы, Ёдчыкі. Вядомымі дзеячамі з'яўляюцца Собаль Іван і Мікалай з Квасевіч, Сцяпан Цярэшка з Ёдчыкаў і Аляксей Шыян з Гошчава.

II група: кіраўнік Уладзімір Паляшук з Юкевіч. Ячэйкі Юкевічы, Старажоўшчына, Хадоркі, Руда, Аляксейкі, Быч, Сярадава, Размеркі. Віднейшыя дзеячы: Здановіч Рыгор, Пятух Міхаіл з Бычы, Радкевіч Юзеф з Размерак, Казушчык Іван са Старажоўшчыны.

III група: Сенькавічы. Ахоплівае тэрыторыю падраёнаў Сенькавічы, Азярцо, Галенчыцы. Кіраўнік групы Ёвік Дзмітрый Сенькавіч, пс. «Вера». Ячэйкі: Сенькавічы, Кушняры, Падстарынь, Азярцо, Боркі, Любішчыцы, Галенчыцы, Воля, Гічыцы. Віднейшыя дзеячы: Хаванскія Міхал, Рыгор і Кірыл з Сенькавіч і Рыгор Мулярчык з Азярца.

IV група: Хадакі. Т.зв. «Палеская», якая дзейнічае на тэрыторыі гмін Святая Воля і Целяханы ў кантакце з Пескаўскай гмінай. Кіраўнік групы Міхаіл Колтун, пс. «Сялёдка» з Хадакоў. Сюды ўваходзяць вёскі: Хадакі, Власаўцы, Жытлін, Корачын, Зыбайлы, Вулька Аброўская, Аброва. Відныя дзеячы: Васіль Власавец з Власаўцаў, Міхнюкевіч Фёдар з Зыбайлаў, Тумашэвіч Іван з Вулькі Аброўскай і Лучыц Рыгор з Аброва.

Ячэйкі ў Яглевічах, Харошчы і Заполлі часова спынены за невыкананне заданняў партыі і падазрэнне ў правакацыі.

Сядзібаю інструктара райкома з'яўляецца в. Сенькавічы. Ст. Ёвік Дзмітрый (сакратар РК КПЗБ і КСМ).

...Дарога партыйнай сувязі для перасылкі літаратуры ідзе з АК праз асаду Комін Слонімскага павета (былы паліцыянт Лашко Аляксандр) в. Даргужы Косаўскай гміны, Піліп Герасімовіч (Гладышы), інструктар РК у Сенькавічах, далей праз в. Быч (Рыгор Здановіч) да Хадакоў (Борка-Гічыцкая гміна) да кіраўніка групы Міхаіла Колтуна («Сялёдка») і далей праз Бабровічы і Выганашчы (гміна Целяханская) да Расіі.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 696. Л. 9.

З ДАНЯСЕННЯ КОСАЎ-ПАЛЕСКАГА ПАВЯТОВАГА СТАРОСТЫ ВАЯВОДЗЕ Ў БРЭСЦЕ АБ БУНЦЕ СЯЛЯН ВЁСКІ АЛЬШАНІЦА КОСАЎСКАЙ ГМІНЫ

17 чэрвеня 1930 г.

Пан Начальнік Аддзела грамадскай бяспекі.

Пасол БСРПК Грэцкі Іван, які знаходзіцца на тэрыторыі Косаўскага павета, даведаўшыся аб намеры правядзення камасацыі ў вёсцы Альшаніца Косаўскай гміны, распачаў моцную

акцыю супраць гэтага асабіста і пры дапамозе ячэйкі КПЗБ у Альшаніцах сярод жыхароў вёскі Альшаніца.

13 бягучага месяца па выкананні распараджэння акруговай земскай управы ў Брэсце павятовая земская ўправа ў Косаве прыступіла да правядзення абмеру зямель вёскі Альшаніца ў сувязі з узбуйненнем зямельных участкаў, аднак у выніку падбухторванняў пасла Грэцкага, а таксама накаторых жыхароў вёскі Альшаніца насельніцтва выступіла калектыўна і не дапусціла землямераў да правядзення абмераў. У выніку гэтага 14 б. м. у 7 гадзін на месца адправіўся павятовы камендант Дз. П. разам з аддзяленнем паліцыі колькасцю 30 чалавек. У час пачатку абмену на месца з'явілася каля 50 жанчын і 20 мужчын, якія спрабавалі крыкамі, рознай лаянкай і пагрозамі ў адрас урада, паліцыі і нанятых рабочых не дапусціць пачатку абмеру. Паколькі натоўп набываў усё больш пагрозлівы стан і займаў тэрыторыі, на якіх трэба было правесці абмеры, натоўп быў рассеяны паліцыяй без выкарыстання зброі, а падпальшчыкі і ўпартыя затрыманы. На месцы прысутнічаў павятовы староста.

Насельніцтва вёскі Альшаніца, пераканаўшыся, што выступленні супраць уладаў па нагавору агітатараў не прывядуць да дабра, супакоілася і згадзілася з камасацыяй зямель і нават 16 чэрвеня б. г. сяляне вёскі Альшаніца прыслалі рабочых для далейшых абмераў зямель. У вёсцы пануе поўны спакой.

Намеснік старосты
Ст. Рудніцкі.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1352. Л. 19.

З ІНФАРМАЦЫІ КОСАЎСКАГА СТАРОСТЫ ПАЛЕСКАМУ ВАЯВОДЗЕ АБ СТАНОВІШЧЫ Ў ЦЕЛЯХАНСКІМ РК КПЗБ

24 чэрвеня 1931 г.

У м. Целяханы існуе гарадскі камітэт, сакратаром якога з'яўляецца жыхар м. Целяханы шавец Цераспольскі, які мае цесны кантакт з Пінскім АК. У Целяханах існуюць тры партыйныя ячэйкі, 1 піянерская, 1 мопраўская. Да ліквідацыі райкома, г. зн. да 27.4.1931 г. у прэзідыум уваходзіў Шымель Ландман, які адначасова быў сувязным сельскага раёна і арганізацыйным інструктарам. Райком разам з гаркомам мае цяпер 21 арганізаваную ячэйку. У красавіку АК насіўся з намерам раздзелу гэтага РК на два раёны з прычыны вялікай колькасці ячэек, аднак на раённай канферэнцыі 20.4. б. г. пры ўдзеле дэлегата АК абмежаваліся на выбарах да «тройкі» яшчэ двух членаў з Выганашч Дзмітрыя Клімава і Майсея Амельянчука, які цяпер мае кантакт з гаркомам, дзе пасля арышту «тройка» не была яшчэ выбрана. У хуткім часе адбудзецца канферэнцыя і выбары «тройкі». Целяханскі райком абслугоўвае Целяханскую гміну, Святавольскую, усходнюю частку Борка-Гічыцкай, пачынаючы ад Яглевіч да чыгункі Косаў—Івацэвічы—Даманава, а таксама заглыбляецца на тэрыторыю Пінскага павета.



Будаўніцтва моста цераз раку Грыўда каля в. Любішчыцы. 1936 г.

Усе ячэйкі маюць арганізаваныя групы самааховы, так зв. «пяцёркі». У выступленнях маюць наказ ужываць толькі каменні, пясок, палкі і г. п. Агнястрэльнай зброі не ўжываць, пакуль не будзе правакацыі з боку паліцыі. Зброяй валодаюць члены «пяцёркі», кожны на сваю руку. Баявыя групы меліся выступіць 1 мая б. г. у Целяханах у час намечанай дэманстрацыі, аднак у выніку арыштаў дэманстрацыя не адбылася. Увогуле агнястрэльнай зброі без загаду вышэйшых партыйных улад нельга ўжываць.

Павятовы староста
Станіслаў Волк.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1756. Л. 3.

З ДАНЯСЕННЯ КОСАЎСКАГА СТАРОСТЫ ПАЛЕСКАМУ ВАЯВОДЗЕ

20 сакавіка 1931 г.

Атрымана канфідэнцыяльнае паведамленне, што ў вёсцы Козікі Борка-Гічыцкай гміны існуе арганізацыйная адзінка КПЗБ, у склад якой уваходзяць жыхары гэтай вёскі: Саевіч Іван Пятровіч (клічка «Жучок»), Краўчэня Міхаіл Нікіфаравіч, Лішко Марк Дзянісавіч, Краўчэня Лукаш Міхайлавіч, Шэрка Іосіф Рыгоравіч, Шэрка Марк Яўгенавіч, Шэрка Васіль Аляксандравіч, Шэрка Лукаш Данілавіч. Названыя амаль кожны дзень збіраюцца ў хаце Саевіча Івана Пятровіча і там пры закрытых вокнах засядаюць да позняй ночы, чытаючы нейкую кніжку, якую тут жа хаваюць, калі з'явіцца хтосьці чужы.

23 лютага 31 года ў хаце Саевіча Івана адбыўся сход, на якім акрамя мясцовых членаў былі дзве асобы з вёскі Власаўцы, дзве асобы з вёскі Жытліна, з вёскі Вулькі Аброўскай Тымашэвіч Іван Аляксандравіч і Дзямід Міраноўскі, а таксама з вёскі Гічыцы, невядома прозвішча, Алясандр, высокага росту, брунет і другая асоба невядомага прозвішча і імя. Сход закончыўся пад раніцу 24 лютага 1931 г. 2 сакавіка Саевіч Іван, Краўчэня Лукаш і Лішко Марк выехалі з Козік у Галенчыцы і вярнуліся ў Козікі пад ранак 4 сакавіка. Іншы раз сходы праходзяць у доме Шэрка Савы, які спачувае КПЗБ.

Краўчэня Лукаш выконвае функцыі партыйнага кур'ера. У вёсцы Вулька Аброўская існуе арганізацыйная адзінка КПЗБ, у склад якой уваходзяць жыхары гэтай вёскі: Грэчны Васіль Трафімавіч, Куцко Мікалай Дзмітравіч, Тымашэвіч Іван Аляксандравіч, Міраноўскі Дзямід Іванавіч, Куцко Іван Якімавіч, Куцко Гаўрыла Лукіч, Куцко Дзямід Сцяпанавіч.

Гэтая ячэйка мае кантакты з Жытлінам, Козікамі, Власаўцамі і Гічыцамі.

Павятовы староста
Станіслаў Волк.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1846. Л. 8.

Польскія салдаты на пероне чыгуначнай станцыі Івацэвічы.

ДА ЖЫЦЦЯ НОВАГА, САВЕЦКАГА

1.9.1939 г. нападзеннем фашысцкай Германіі на Польшчу пачалася другая сусветная вайна 1939—1945 гг. 17.9.1939 г. Савецкі ўрад аддаў загад войскам Чырвонай Арміі ўзяць пад ахову жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якое амаль 20 гадоў змагалася за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз'яднанне з БССР. Працоўныя з радасцю сустрэлі савецкія войскі. Як і ў іншых раёнах Заходняй Беларусі, у Івацэвіцкім краі былі створаны органы народнай улады — павятовыя і валасныя часовыя ўпраўленні. Выбраны 22.10.1939 г. Народны сход Заходняй Беларусі 28.10.1939 г. абвясціў Савецкую ўладу на тэрыторыі Заходняй Беларусі, звярнуўся да Вярхоўнага Савета СССР з просьбай прыняць Заходнюю Беларусь у склад СССР і з'яднаць яе з БССР. 2.11.1939 г. нечарговая 5-я сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР; 12.11.1939 г. нечарговая 3-я сесія Вярхоўнага Савета БССР пастанавіла прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР. У заходніх абласцях, у т. л. і на Івацэвіччыне, пачалося сацыялістычнае будаўніцтва.

У першую чаргу была праведзена нацыяналізацыя прыватнай уласнасці багатых людзей і зямлі. Пачалася калектывізацыя, культурнае будаўніцтва, адкрываліся нацыянальныя школы, бібліятэкі, хаты-чытальні, наладжвалася кінаабслугоўванне насельніцтва. Вялікая работа праводзілася па паляпшэнні аховы здароў'я. Ліквідоўвалася беспрацоў'е. Моладзі была адкрыта дарога ў сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Мацавалася ўлада, арганізоўваліся партыйныя, камсамольскія і піянерскія арганізацыі. Партыйна-класавы падыход ва ўсіх сферах жыцця і прымусовая ў сваёй аснове калектывізацыя выклікала напружанасць у грамадстве. Яе ўзмацнілі масавыя беспадстаўныя палітычныя рэпрэсіі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, што мела свае негатыўныя вынікі, звязаныя з расколам грамадства.

Тэрытарыяльнае размежаванне Косаўскага павета

З уз'яднаннем Заходняй Беларусі і Беларускай ССР Косаўскі павет, які адносіўся да Палескага ваяводства, увайшоў у склад Брэсцкай вобласці. У павеце, які стаў называцца ўездам, былі праведзены тэрытарыяльныя пераўтварэнні. У дакладной запісцы старшыні часовага ўпраўлення г. Косава С. Латышава ад 17 снежня 1939 г. паведамляецца пра тое, што папярэдні план падзелу Косаўскага павета прадугледжвае ўтварэнне на яго тэрыторыі трох раёнаў з цэнтрамі ў Косаве, Ружанах і Целяханах.

У Целяханскі раён цалкам уключаліся Целяханская і Святавольская воласці, у якіх пражывала 21 800 чалавек. Далучаліся населеныя пункты Сакалоўка і Клятная Пінскага ўезда. Усяго ў Целяханскім раёне налічвалася 22 850 жыхароў, плошча яго складала 1349 кв. км.

Стварэнне асобнага Целяханскага раёна аргументавалася тым, што населеныя пункты Целяханскай і Святавольскай валасцей вельмі аддалены ад культурных цэнтраў, што адмоўна сказвалася на іх культурным і гаспадарчым развіцці.

Такім чынам, у Целяханскі раён уваходзілі 32 населеныя пункты. Зямельныя ўгоддзі складалі 115 085 га, з якіх сялянскім гаспадаркам належала 42 810 га. Пад царкоўнымі землямі было занята 797 га, памешчыцкімі — 29 559, дзяр-

жаўнымі — 24 553 га. Ворная зямля займала 11 422 га, сенажаці — 12 297, балоты — 1320, лес — 424 га. Па нацыянальнаму складу насельніцтва размяркоўвалася наступным чынам: беларусы — 26 027, яўрэі — 1280, палякі — 589 чалавек. Да буйных населеных пунктаў належалі Целяханы (2611 чалавек), Святая Воля (1349), Вялікая Гаць (1372), Аброва (1342), Вулька-Целяханская (1119), Выганашчы (1608), Бабровічы (938), Краі (979), Краглевічы (839).

З прамысловых прадпрыемстваў тут дзейнічалі лесазавод, дзве смалярні, паравы млын і маслабойня. Шасэйных дарог не было. З Івацэвічамі раён звязваўся вузкакалейнай чыгункай. У раёне працавала 21 школа. Пастановай бюро Целяханскага РК КП(б)Б і райвыканкома ад 30 лютага 1940 г. утворана 11 сельскіх Саветаў.

Косаўскі раён уключаў у сябе населеныя пункты Косаўскай і Івацэвіцкай валасцей з цэнтрам у г. Косаве, дзе пражывала тады 3850 чалавек, а ўсяго ў раёне налічвалася 35 553 жыхары. Тэрыторыя раёна займала 994 кв. км. У складзе яго было 100 населеных пунктаў, у якіх была 9031 гаспадарка. Плошча зямельных угоддзяў складала 77 901 га, з якіх сялянам належала 33 101 га, цэрквам — 1061, памешчыкам — 6665, дзяржаве — 30 997 га. Па нацыянальнаму складу насельніцтва размяркоўвалася наступным чынам: беларусы — 28 875, палякі — 3458, яўрэі — 3200.

У горадзе Косава налічвалася 526 дамоў. Тут дзейнічалі электрастанцыя, лесазавод, чатыры млыны, чарапічна-бетонны завод. Для насельніцтва былі адкрыты клуб, бальніца, амбулаторыя, ветэрынарны пункт, 3 школы, пошта.

У раёне працавалі лесапільныя, мукамольныя, смалакурна-шкіпінарныя, чарапічна-бетонныя прадпрыемствы, а таксама маслабойня і прадзільная. Млыны былі пабудаваны ў Косаве, Бусяжы, Альбе, Івацэвічах, Міхнавічах. Зямельныя ўгоддзі размяркоўваліся наступным чынам: ворыўныя землі — 24 196 га, сенажаці — 4371, лясы — 28 769, балоты — 15 126, паша — 2362 га.

Галоўныя культуры, што вырошчваліся на палетках, — жыта, пшаніца, ячмень, бульба, лён, авёс, грэчка.

Буйнейшымі населенымі пунктамі лічыліся: Косава — 3850 жыхароў, Івацэвічы — 2250, Бялавічы — 1154, Гошчава — 1245, Любішчыцы — 1868, Ква-

Дэпутаты Святавольскага сельсавета. Сакавік 1940 г.

севічы — 840, Була — 850 чалавек. У раёне налічвалася 2239 хутароў, 16 маёнткаў. Дзейнічалі 44 пачатковыя, адна сярэдняя і дзве няпоўныя сярэднія школы.

Ружанскі раён склалі навакольныя гораду населеныя пункты. У 1940 — 1941 гг. у створаных раёнах праводзілася шырокая работа па гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву. Сяляне надзяляліся былымі памешчыцкімі і царкоўнымі землямі. Пачыналася калектывізацыя гаспадарак. Першыя калгасы былі створаны ў Любішчыцах, Яглевічах, Падстарыні, Бычы, Бабровічах, Амяльной і інш. вёсках.

22 чэрвеня 1941 года мірная стваральная праца была спынена нападам гітлераўскай Германіі. І аднавілася яна пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у ліпені 1944 года.

М. Банасевіч, В. Мароз.

Быценшчына, год 1940

Быценскі раён з цэнтрам у г. Быцень створаны ў 1940 г. Быў ён у асноўным сельскагаспадарчы, але меліся тут і некаторыя прамысловыя прадпрыемствы: лесапільны завод Блок-Быцень, на якім працавала 130 рабочых, вінакурны завод у Грудопалі, 10 млыноў малой магутнасці і 4 смалакурныя заводы. З устанаўленнем савецкай улады ўсе прадпрыемствы перайшлі ў рукі дзяржавы, частка — прамысловай кааперацыі. Землі памешчыкаў і асаднікаў атрымалі бедныя сяляне. Толькі па Дабромысленскай воласці было раздадзена 4422 га лугоў, 730 га ворнай зямлі, 34 кані і 253 каровы з маладняком.

Раён выглядаў бедна. У ім налічвалася 6280 сялянскіх гаспадарак, на кожную з якіх прыпадала ў сярэднім па 5—6 га ворнай зямлі і сенакосаў. 2678 сялян не мелі коней і нават простага сельскагаспадарчага інвентару. Значная частка сельскагаспадарчых угоддзяў дрэнна апрацоўвалася і давала мізэрны ўраджай — 5—7 цэнтнераў збожжа з гектара. Усяго ў раёне было 97 912 га сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку ворнай зямлі — 28 943 га, сенакосаў — 14 425 га, астатняя зямля была занята лесам і хмызнякамі. Па няпоўных звестках, на той час у раёне было 10 789 кароў, 6240 свіней, 5514 авечак. Сеялі жыта, авёс, грэчку, бульбу. На вясну 1940 г. было пасеяна 19 620 га яравых культур, у тым ліку збожжавых 6230 га, бульбы і гародніны — 4874 га. Азімымі было занята больш за 7 тыс. гектараў.

Вясной 1940 г. гаспадаром у сельскай гаспадарцы быў яшчэ селянін-аднаасобнік. Калгасы толькі зараджаліся. Была створана машынна-трактарная станцыя, у якой вясною было 6 трактароў, а восенню іх колькасць падвоілася.

У пошуках выхаду з адсталасці вёскі сяляне ўсе больш сталі задумвацца аб стварэнні калектыўных гаспадарак, дзе можна было шырока выкарыстоўваць сельскагаспадарчую тэхніку. Напрадвесні 1940 года 94 сялянскія гаспадаркі вёскі Гнойнае падалі заявы аб арганізацыі ў іхняй вёсцы калгаса. Улады пагадзіліся з такой просьбай. Тады ж былі створаны калгасы ў вёсках Вуглы і Добры Бор. Яны абагулілі сельгасінвентар, цяглавую сілу, насенне. Паступалі заявы аб жаданні аб'яднацца ў сельскагаспадарчыя арцелі ад сялян вёсак Пагор'е, Міронім, Гавенавічы, Колбавічы і інш. Але былі і выступленні шэрагу сялян з заможнай часткі вёскі супраць калектывізацыі. Як паведамлялася ў справаздачы Быценскага РК КП(б)Б, за перыяд з 25 студзеня па 7 красавіка 1940 г. у вёсцы Вуглы былы солтыс Яфімік Пётр разам з цесцем Шулярыкам Кандратам запалохвалі сялян, якія ўступілі ў калгас, што яны паўміраюць з голаду, а будзе, маўляў, вайна, вернуцца паны і з вас будуць скуру драць. Селянін

вёскі Добры Бор Андрэй Карпік, калі стала пытанне аб адвядзенні для калгаса агульнага масіву зямлі, заявіў: «Хто паедзе з калгаснікаў на маю паласу араць, усіх парубаю сякераю».

Прамысловыя прадпрыемствы (лесазавод, вінакурня, млыны, смалакурні) давалі нямнога прадукцыі, былі яны маламоцнымі. Таму ўлады прадпрымалі меры па іх умацаванні і расшырэнні. Пачалі ствараццa прамысловыя арцелі. У вёсцы Даманава арганізавана вобада-калёсная арцель, у якой працавалі 35 чалавек, у вёсцы Быцень — шавецкая арцель, у якой было аб'яднана 29 чалавек, 40 чалавек аб'ядналіся ў кравецкую арцель. Рыхтавалася арганізацыя бандарнай арцелі.

Раён валодаў значнымі запасамі торфу. Арганізоўвалася яго здабыча на паліва.

У Быценскім раёне пражывала ў той час 30 488 чалавек, у асноўным беларусы. Жылі палякі і яўрэі. Агульнаадукацыйны ўзровень насельніцтва быў вельмі нізкім. Таму партыйныя і савецкія арганізацыі ўдзялілі вялікую ўвагу народнай асвеце і культуры. У 1940 годзе ў раёне працавала 39 школ, з іх 4 няпоўныя сярэднія і 35 пачатковых. Было 36 беларускіх школ і 3 польскія. Усяго па раёну школу наведвала 6389 дзяцей, неахопленымі школай заставалося яшчэ 476 дзяцей. У школах працавала 105 настаўнікаў, але сярод іх не было ні аднаго з вышэйшай педагагічнай адукацыяй, а 33 настаўнікі з сялян не мелі нават агульнай сярэдняй адукацыі. Прымаліся меры па ўмацаванню матэрыяльнай базы школ, адкрываліся новыя пачатковыя школы.

Для ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ствараліся вячэрнія школы і курсы. Ужо ў 1940 г. ў раёне працавалі 42 вячэрнія школы, у якіх навучаліся 1992 чалавекі. Важным з'яўлялася таксама адкрыццё хат-чытальняў, чырвоных куткоў на сяле для актывізацыі культурна-асветніцай работы.

На нізкім узроўні знаходзілася ахова здароўя. У раёне была толькі адна бальніца. Мала было фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Дрэнна была наладжана сувязь. З 11 сельсаветаў тэлефонную сувязь мелі толькі 6. Не мелі тэлефоннай сувязі і многія арганізацыі і ўстановы. У запушчаным стане была сетка дарог. Намячалася будаўніцтва шасэйных дарог Даманава — Быцень — Слонім і Быцень — Брэст, а таксама мастоў цераз раку Шчару. У сістэме кааператыўнага гандлю былі створаны 4 сельпо, якія аб'ядноўвалі 35 гандлёвых кропак. Паступова рос тавараабарот і нарыхтоўкі сельгаспрадукцыі.

Не багатую спадчыну атрымала маладая савецкая ўлада на Быценшчыне. Аднак намаганнямі працавітага народа ўжо ў 1940 г. былі закладзены першыя вянкі фундамента для будучага эканамічнага і культурнага развіцця гэтага краю.

В. Мароз, М. Банасевіч.

Целяханшчына, год 1940

Як жа ішло развіццё Целяханшчыны, калі яна была самастойным раёнам, расказваюць шматлікія дакументы, якія захоўваюцца ў Брэсцкім абласным дзяржаўным архіве. У справаздачы Целяханскага РК КП(б)Б за перыяд з 17 верасня 1939 г. да 6 красавіка 1940 г. даецца такая кароткая характарыстыка раёна: «На тэрыторыі Целяханскага раёна адным з важнейшых багацця ў з'яўляецца лес, масіў якога складае плошчу 42 250 га. З прамысловых прадпрыемстваў ёсць: лесапільных заводаў — 3, паравых млыноў — 3, з якіх адзін прамысловы з удасканаленым абсталяваннем, да дзесятка смалакурных заводаў.

Тэрыторыя раёна ў двух напрамках пе-

расякаецца вузкакалейнаю чыгункаю, якая адыгрывае даволі вялікую ролю ў эканамічным жыцці раёна ў сэнсе транспарціроўкі грузаў прамысловага характару. Акрамя таго, раён перасечаны воднаю магістраллю, якая звязвае Целяханы з абласным цэнтрам — г. Пінск.

Ва ўсіх 32 населеных пунктах і 600 хутарах сяляне займаюцца выключна земляробствам, калі не лічыць невялікіх раздробленых рамёстваў: сталярнага, бандарнага, цяслярнага. Ворных зямель па раёну налічваецца 10 856 га. У выніку забалочанасці ў раёне пераважае малазямелле. Якасць зямель надзвычай нізкая, глебы пясчаныя і падзолістыя, якія патрабуюць шмат натуральных угнаенняў і асабліва старанной апрацоўкі. У раёне вырошчваюцца культуры: жыта, авёс, грэчка, у абмежаванай колькасці ячмень і ў яшчэ меншай колькасці пшаніца. Бульба высяваецца таксама ў невялікай колькасці. Тэхнічныя культуры амаль не вырошчваліся, калі не лічыць нязначных плошчаў, якія засяваліся льном і каноплямі, што вырошчваліся выключна для асабістых патрэб сялян. Сама апрацоўка зямлі праводзілася прымітыўным спосабам, жалезны плуг № 5 лічыўся найвышэйшай тэхнікай, ужывалася таксама драўляная барана і саха».

Цяглавай сілай былі коні і валы. У той перыяд у сялянскіх гаспадарках было 313 коней, 2745 плугоў, 2300 барон, 38 пружынных барон, 14 культыватараў, 4 сеялкі і 2652 вазы. Сяляне гадавалі 13 944 галавы буйной рагатай жывёлы, 5507 свіней і 826 авечак.

Да верасня 1939 г. на тэрыторыі раёна было сем маёнткаў, якім належала 1600 га зямлі.

З гэтай характарыстыкі бачна, што Целяханшчына была бедным, закінутым краем, а жыццё людзей бядотным і жабрацкім. Патрабаваліся вялікія намаганні, каб разварушыць патэнцыял, які меўся тут, і пабудаваць развітую гаспадарку. І гэта работа разгарнулася. У 1940 г. былі прыняты намаганні па ўмацаванню наяўных лесапільных і смалакурных прадпрыемстваў, наладжвалася вытворчасць цэглы і гонты, разгарнуліся лесанарыхтоўкі, былі створаны кравецкія і шавецкія арцелі, прымаліся меры па пашырэнню пасяўных плошчаў і паляпшэнню метадаў гаспадарання ў вёсцы. Ужо да мая 1940 г. у раёне было створана шэсць калгасаў, у якія аб'ядналіся 396 сялянскіх гаспадарак. У калгасы імя Сталіна (в. Бабровічы) уступіў 161 селянін, імя Карла Маркса — 33, «Шлях да камунізму» (в. Коланск) — 87, імя Молатава (в. Амяльная) — 46, імя «17 Верасня» — 46, «Серп і молат» — 23 гаспадаркі. Вясною 1940 г. калгасы пасеялі 733 гектары яравых. Амаль ва ўсіх гаспадарках былі створаны фермы буйной рагатай жывёлы. Гэта былі першыя крокі да новай формы гаспадарання. Па выніках года калгаснікі атрымалі па 2—4 кг збожжа, 2—19 кг бульбы, 1—2 рублі грашыма на працадзень. Старанна працавалі калгаснікі. У калгасе «Шлях да камунізму» Максім Камяк на сенакосе замест 0,5 га па норме выкошваў па 0,9 га. Калгаснік Рыгор Клімовіч з сельгасарцелі «Серп і молат» на ворыве конным плугам выконваў норму на 150 працэнтаў, а калгасніца Колас Марыя з арцелі імя К. Маркса дасягала 180 працэнтаў выпрацоўкі нормы на жніве сярпом.

Значную дапамогу сялянам аказвала МТС, у якой было ўжо 9 трактароў.

У 1939—1940 гг. была праведзена пэўная работа па развіццю культуры і народнай асветы. У раёне працавала 5 няпоўных сярэдніх і 20 пачатковых школ, у якіх навучаліся 4019 хлопчыкаў і дзяўчынак, з іх у пачатковых класах — 3613 дзяцей і ў 5—6-х класах — 406 вучняў. Дзейнічалі 23 беларускія школы, адна польская і адна яўрэйская. Праўда, цяжкім было стано-

вішча з педагагічнымі кадрамі: са 115 настаўнікаў толькі двое мелі вышэйшую адукацыю і 35 сярэднюю, 70 працэнтаў настаўнікаў не мелі нават сярэдняй адукацыі.

Сур'ёзная ўвага ўдзялялася ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва.

Безумоўна, не ўсё ішло гладка ў вырашэнні складаных задач гаспадарчага і культурнага развіцця. Як адзначаецца ў дакументах партыйных і савецкіх органаў, у пачатку 1940 г. часта зрываліся лесанарыхтоўкі, нізкай была прадукцыйнасць працы на лесапільных заводах. Дрэнна былі вывучаны мясцовыя рэсурсы для арганізацыі вытворчасці тавараў народнага спажывання. Дапускаліся ў калгасах прыпіскі аб выкананні тых або іншых работ.

ЕФРАСІННЯ ПАЎЛАЎНА СУРЖЫНСКАЯ

Яна спакойна сядзіць за сталом. Валасы пакрыла густая сівізна, на твары таксама адбітак пражытых гадоў — маршчынкі збаразнілі яго, толькі вочы маладыя, вясёлыя, жывыя... Як і тады, калі Ефрасінні Паўлаўне — Фросі — было дзевятнаццаць годоў. Падпольшчык Іван Ягоравіч Калеснікаў сустрэў дзяўчыну на вуліцы, адвёў яе ўбок.

Загаварыў прама:

— Будзе табе ад падпольшчыкаў даручэнне. Сяргея Прытыцкага за забойства правакатара прысудзілі да расстрэлу. Трэба сабіраць подпісы ў яго абарону. Згодна?

Іван Ягоравіч пастаяў хвіліну моўчкі, як бы аб нечым раздумваючы, потым дадаў:

— Бацька твой цябе нам парэкамендаваў. Ну а бацька — чалавек надзейны, на верны шлях хоча цябе вывесці.

З таго часу для Фросі пачалося неспакойнае, поўнае трывог і хваляванняў жыццё. Даручэнні даваліся адно за адным.

Ішла грамадзянская вайна ў Іспаніі. Дзяўчына хадзіла па хатах сваіх аднасяльчан, сабірала сродкі ў дапамогу тым, хто змагаўся супраць фашыстаў. Саджалі ў турмы падпольшчыкаў — насіла ім і перадавала перадачы, весткі з волі. Распаўсюджвала лістоўкі, нелегальную літаратуру.

Бацька Павел Паўлавіч часам жартаваў:

— А Лукішак не баішся?

З яго расказаў Фрося ведала, што ўяўляюць сабой Лукішкі —адна з самых страшных турмаў буржуазнай Польшчы, дзе Павел Паўлавіч Суржынскі, член КПЗБ з самага пачатку яе стварэння, правёў не адзін год. Бацьку адказвала цвёрда:

— Не. Я ў цябе ўдалася, тата.

... Радасным быў верасень 1939 года. Новае, незвычайнае, вялікае ўваходзіла ў лёс людзей, у іх жыццё.

Над палямі плавала павуцінне бабінага лета, дні стаялі пагодныя, сонечныя. Ефрасіння Паўлаўна вярталася з Беластока, з Устаноўчага схода, на якім было прынята рашэнне аб уз'яднанні Заходняй Беларусі ў адзіную беларускую дзяржаву.

Яе абралі старшынёй сельсавета. Гэта было для дзяўчыны нечаканасцю. Звярнулася да Калеснікава:

— Чаму мяне? Ёсць жа больш вопытныя, што прайшлі школу барацьбы. А мне ўсяго дваццаць трэці...

Іван Ягоравіч усміхнуўся:

— Людзі ведаюць, каго выбіраць. Вераць яны табе, бачаць, як ты для агульнай справы стараешся. Ды ты не бойся, адну не пакінем, разам новае жыццё будзем будаваць.

А яно, гэта новае жыццё, стукалася ў дзверы штодзённа, ставіла розныя задачы і пытанні, якія рашаць трэба было неадкладна.

Зайшоў неяк у сельсавет дзядзька ў доўгай світцы, пакамячыў у руках шапку з аўчыны і звярнуўся да Ефрасінні Паўлаўны:

— Справа такая вось. Памешчыкі паўцякалі, дык можа зямліца іх будзе прадавацца? Вось каб нядорага гэта, хоць бы гектары са два ...

Ефрасіння Паўлаўна не вытрымала, рассмяялася.

— Прыходзь, дзядзька, праз тыдзень. Дарам табе зямлю дамо, ды не два гектары, а колькі трэба.

У маёнтку пана Стампоўскага сабралася ўсё сяло. Хвалявaліся, гарачыліся, радаваліся. А калі старшыня сельсавета аб'явіла, што дом пана Стампоўскага — харомы цэлыя — з гэтага дня будзе належаць яго былой парабчанцы Алене Грынчык, натоўп аж ускалыхнуўся. Разыходзячыся, разважалі: — Вось гэта ўлада. Сапраўды народная. Наша ўзяла.

Мянялася жыццё — мяняліся людзі. Поўнаўладнымі гаспадарамі адчулі яны сябе на сваёй зямлі.

Тыя, хто некалі стараўся абысці пастарунак бокам, абы не папасціся на вочы каменданту, зараз прыходзілі ў сельсавет, як у свой уласны дом. Што б ні здарылася — ведалі, трэба шукаць падтрымкі і дапамогі ў Суржынскай. Яна — свая, з такога ж мужыцкага роду, як і ўсе, і ў той жа час яна прадстаўнік улады, таксама сваёй, рабоча-сялянскай улады — дэпутат сельскага, абласнога і Вярхоўнага Савета дэпутатаў працоўных рэспублікі.

У саракавым восенню здарылася няшчасце — згарэла ўся цяпер Першамайская вуліца. Яе тады называлі Гаравой, ці ад таго, што саламяныя стрэхі часта злізвалі пажары, ці можа нават ад таго, што ніколі людзі шчасця не мелі, у горы жылі.

Цэлая сялянская дэлегацыя з'явілася ў сельсавет. За чым прыйшлі, Ефрасіння Паўлаўна зразумела і распытваць не стала. Толькі і сказала:

— Савецкая ўлада ў бядзе не пакіне.

Будавалі сабе сяляне хаты з бясплатнага лесу, куплялі рэчы першай неабходнасці па зніжаных цэнах.

А потым была вайна, горкія дарогі адступлення, эвакуацыя ў далёкі Бузулук. І работа, работа вялікая, цяжкая, патрабуючая поўнай аддачы сіл і энергіі.

Ефрасіння Паўлаўна працуе інспектарам па матэрыяльнаму забеспячэнню сем'яў ваеннаслужачых. Лёгка сказаць —забяспечыць. А ў той час самай складанай задачай было: чым

Е. П. Суржынская з С. В. Прытыцкім у Мінску ў час сесіі Вярхоўнага Савета БССР. 1939 г.

забяспечыць? І ўсё ж такі Ефрасіння Паўлаўна знаходзіла выхад. Умела яна падысці да людзей, закрануць самыя тонкія струны іх сэрцаў. Людзі дзяліліся, чым маглі...

Адразу пасля вызвалення роднага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Ефрасіння Паўлаўна актыўна ўключаецца ў работу па аднаўленню разбуранай вайной гаспадаркі. Шмат энергіі аддае арганізацыі калгасаў.

Савецкага дэпутата называюць слугой народа. Ефрасіння Паўлаўна верна служыла свайму народу.

У дзевяць гадзін раніцы адчыняліся дзверы Быценскага сельсавета. І ў гэты ж час з'яўляліся першыя наведвальнікі. Слухала Ефрасіння Паўлаўна іх уважліва, любое пытанне старалася вырашыць адразу ж, не адкладваючы ў доўгую скрынку. І людзі пакідалі сельсавет задаволенымі. Праўда, не ўсе. Не ўсе, гэта тыя, хто ў любой справе шукае сабе асабістай карысці. З такімі размова кароткая, прынцыповая:

— Улада для ўсіх адна. Усе перад ёю роўныя.

Вечарамі Ефрасіння Паўлаўна чытае лісты ад дзяцей. Сын Валодзя рыбачыць на Камчатцы, дачка Ларыса вучыцца ў медыцынскім. Лісты — гэта адпачынак ад работы. Работы, нават стома ад якой прыемная, бо для людзей яна, праца гэтая, для іх шчасця і радасці. А было гэта яшчэ ў 1967 г.

М. Радзюк.

Ад беззаконня да прававой дзяржавы

Нават сёння, на парозе XXI стагоддзя, калі сталі даступнымі архівы і напісана шмат па гэтай тэме, цяжка дакладна сказаць, колькі чалавек і па чыёй віне пацярпела ад беспадстаўных палітычных рэпрэсій, якія пачаліся ў Івацэвіцкім раёне, як і па ўсёй Заходняй Беларусі, у 1939 г.

Некаторым нашым землякам, як, напрыклад, Івану Іванавічу Васілевічу, што нарадзіўся ў вёсцы Падстарынь, генералу, партыйнаму і дзяржаўнаму дзеячу Мікалаю Лаўрэнавічу Перавалоцкаму — сакратару Косаўскага падпольнага райкома КПЗБ і іншым, якія воляю лёсу апынуліся за межамі Заходняй Беларусі, давялося адчуць работу сталінскай рэпрэсіўнай машыны яшчэ да 1939 г. Разам з тысячамі невінаватых яны панеслі пакутніцкую смерць.

Аб лёсе І. Васілевіча можна даведацца з артыкула Т. Холадавай «Адзін са ста пяцідзесяці чатырох», апублікаванага ў кнізе «Прысуд адменены», Брэст, 1993 г. Нарадзіўся Іван Іванавіч у чэрвені 1895 г. у вёсцы Падстарынь у звычайнай сялянскай сям'і. Бацька яго меў чатыры дзесяціны зямлі на сям'ю з 12 чалавек. Іван быў дапытлівым, таму бацька аддаў яго ў гарадское чатырохкласнае вучылішча, якое хлопчык скончыў у 1912 г. Але вучыцца ў Слонімскай гімназіі, куды яго па рэкамендацыі настаўнікаў і намаганнях бацькоў залічылі, не змог, быў выключаны праз паўгода за чытанне нелегальнай літаратуры.

Вярнуўся ў вёску, стаў пасвіць кароў. У 1914 г. скончыў двухкласную лясную школу. У лютым 1915 г. мабілізаваны на ваенную службу. Быў радавым, затым яго, як пісьменнага салдата, накіравалі ў вучэбную каманду, а далей у Чугуеўскае ваеннае вучылішча. У якасці унтэр-афіцэра на фронце камандаваў ротай, у 1916 г. быў цяжка паранены.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. актыўна выступаў супраць Часовага ўрада, за што быў арыштаваны. Пасля вызвалення партыя бальшавікоў накіроўвае яго для арганізацыі Чырвонай гвардыі ў Тульскую вобласць, дзе ў бежанстве знаходзілася яго сям'я. Тут сустрэў рэвалюцыю, удзельнічаў ва ўсталяванні савецкай улады, камандаваў атрадам Чырвонай гвардыі, удзельнічаў у падаўленні мяцяжу ў Тульскай губерні, словам, стаў адданым бальшавіком.

Потым Іван Васілевіч накіроўваецца ў Беларусь. Вось што ён пісаў у сваёй аўтабіяграфіі: «У 1918 г. быў камандзіраваны ў распараджэнне Літбела. Арганізоўваў савецкую ўладу ў Гродзенскай губерні. Быў намеснікам старшыні Слонімскага рэўкома і губваенкома той жа губерні... У 1918 г. назначаюся ў распараджэнне 16-й арміі». У падпарадкаванні Васілевіча ў той час было некалькі тысяч воінаў. А было яму ўсяго 24 гады.

Потым была вайна з палякамі ў складзе 146-га палка 17-й стралковай дывізіі 16-й арміі. Пад Вільняй быў паранены, трапіў у палон, але змог уцячы. Пэўны час зноў камандаваў ротай, а затым стаў камісарам батальёна, праз месяц — камісарам палка. Прыйшлося адступаць, потым, у 1920, наступаць. На рацэ Вілії Васілевіч быў паранены ў нагу, але поля бою не пакінуў. У баях за Барысаў быў кантужаны. За бой пад мястэчкам Зэльва атрымаў першую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга. 11 ліпеня разам з палкамі 17-й і 27-й дывізій увайшоў у Мінск. А далей шлях ляжаў у родныя мясціны — Слуцк, Ясельду, Пружаны. Потым жорсткія баі на Вісле — і адступленне. За бой на рацэ Буг узнагароджаны УЦВК сярэбраным гадзіннікам.

Далей пачалася звычайная армейская служба, кар'ера ваеннага. Разань, акадэмічныя курсы РСЧА, Забайкалле, дзе служыў камісарам дывізіі, Казань, дзе быў камандзірам і камісарам палка. Потым спецыяльныя курсы пры ўсходнім факультэце Ваеннай акадэміі, кітайскае аддзяленне — і праца саветнікам у Кітаі ў вайсковых часцях Гаміндана. Пасля вяртання з усходу — курсы вышэйшага камандназа складу пры акадэміі імя Фрунзе.

Потым Далёкі Усход, камендант умацаванага раёна, а з 1936 г. — камандзір і камісар 26-га стралковага корпуса Асобай Далёкаўсходняй арміі. У тым жа годзе — ордэн Леніна. Гэта была апошняя прыступка яго ваеннага шляху. У 1937 г. яго арыштуюць, а ў 1938 г. расстраляюць. Васілевіч аказаўся адным з 154 начальнікаў-камдываў, знішчаных па загаду Сталіна.

Пацярпелі і яго сваякі — 8 лютага 1940 г. бацьку, маці, брата Цімафея з жонкай і іх траіх дзяцей вывезлі ў Архангельскую вобласць. Там іх напаткаў горкі лёс.

Пастановай Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 4 красавіка 1957 г. Васілевіч Іван Іванавіч рэабілітаваны пасмяротна з-за адсутнасці складу злачынства. Звестак аб прывядзенні прысуду ў выкананне ў матэрыялах Ваеннай калегіі няма...

А мы жылі і не ведалі, што ў нашай краіне хтосьці можа быць незаконна асуджаны, рэпрэсіраваны. І толькі пасля смерці Сталіна пачалася амністыя, а пазней рэабілітацыя.

Успамінаю пачуцці некаторай разгубленасці, расчаравання, калі нам, студэнтам Брэсцкага педінстытута, наладзілі сустрэчу з Алесем Звонакам і другімі рэабілітаванымі паэтамі. Яны чыталі вершы ў атмасферы ўзрушанасці, шчымлівай любві да Радзімы. Пасля сустрэчы доўга нельга было заснуць. Роздум-пытанне не давала спакою: «А што, калі б гэта сталася са мной ці з маім бацькам, маці, блізкімі?» Страхам напаўнялася сэрца. Заспакойвала толькі тое, што людзі, якія перад намі выступалі, разумелі маладую аўдыторыю. Расказваючы аб сваім незвычайна трагічным лёсе, яны нікога не абвінавачвалі, сцвярджалі, што і арышт, і адбыванне незаконнага пакарання — памылка, якая выпраўлена камуністычнай партыяй і ўрадам... І вось перада мною больш за сотню папак з прозвішчамі рэпрэсіраваных і затым рэабілітаваных грамадзян нашага раёна. З песні слоў не выкінеш. Трэба аб'ектыўна глядзець праўдзе ў вочы, якой бы горкай і страшнай яна не была. Рэпрэсіраваць, караць, высяляць пачалі ў нашым раёне ў 1939 г., калі пачыналі будаваць новае жыццё. Тады ж прыйшлі да нас словы: кулак, падкулачнік, канфідэнт, класавы вораг, рэвалюцыйна настроены народ і контррэвалюцыя.

Пры гэтым асабліва не разбіраліся. Вось адзін характэрны лёс. Бахур Васіль Сцяпанавіч з усёй сям'ёй быў высланы ў Архангельскую вобласць як «асаднік». Асаднікамі былі польскія легіянеры-пілсудчыкі, якіх на землях Заходняй Беларусі пасля 1921 г. рассялялі польскія ўлады за заслугі перад Рэччу Паспалітай. Бахур жа не быў ні легіянерам, ні асаднікам. Ён нарадзіўся ў 1886 г. у вёсцы Любішчыцы. У 27-гадовым узросце ў пошуках заробку выехаў у Амерыку. За сем гадоў знямоглай працы зарабіў крыху грошай і ў 1920 г. вярнуўся дамоў. Ажаніўся. За зароблены гро-

Мемарыяльная дошка ў в. Падстарынь.

шы купіў у вёсцы Руда 15 гектараў зямлі і абзавёўся на ёй гаспадаркай. Паступова набыў двое коней, завёў 6 кароў і іншую сялянскую маёмасць. Працавалі на гаспадарцы ўсёй сям'ёй, таму мелі такі-сякі дастатак.

Марознай лютаўскай раніцай 1940 г. да дома Васіля Сцяпанавіча пад'ехала фурманка. Разам з фурманам былі два чырвонаармейцы. Сабралі ўсіх — гаспадара, жонку, шасцёра дзяцей — і павезлі ў Івацэвічы. Ніхто прычын арышту не тлумачыў. Потым пагрузілі ў таварны вагон і павезлі. Так сям'я Бахура аказалася ў Халмагорскім раёне Архангельскай вобласці ў племсаўгасе. Тут і працавалі ўсю вайну як рэпрэсіраваныя пасяленцы. Дома ўсю маёмасць «канфіскавалі», а прасцей расцягнулі. Гаспадар не дажыў да вяртання на радзіму — вельмі пакутаваў ад несправядлівасці і памёр. Дзяцей выгадавала маці. Усе вярнуліся ў родны кут, толькі адзін сын Васіля Сцяпанавіча Сцяпан, якога ў 1942 г. прызвалі ў армію, загінуў у 1943 г. на фронце.

Такі вось лёс. Безумоўна, з прыходам Чырвонай Арміі прыйшла, усялілася надзея ў кожны дом. Дзеці ішлі ў школу. Вучыліся на роднай мове. Сяляне атрымлівалі зямлю. Усе цягнуліся да грамадскага жыцця. А тое, што ў людзей адбіралі ўсю маёмасць, арыштоўвалі і судзілі без следства, пачыналі вывозіць у далёкія краі, — было незразумелым.

Так, першая сусветная вайна, Кастрычніцкая рэвалюцыя ўскалыхнулі мірны ўклад жыцця ўсіх народаў былой царскай Расіі. Бежанства, вяртанне, здань і рэальнасць камуністычных ідэй распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе — пачынаўся сусветны пажар.

У 1923 г. на тэрыторыі раёна, як і па ўсёй

Заходняй Беларусі, былі створаны камуністычныя партыйныя ячэйкі. Адразу ж многія іх члены паспыталі бізуноў і катаванняў польскай дэфензівы, допытаў у мясцовых пастарунках і пакаранняў у панскіх турмах. Членам КПЗБ здавалася, што варта толькі граніцу перайсці, як яны апынуцца на волі ў самай справядлівай дзяржаве. Але ж там, на волі, іх сустракалі як падасланых польскіх шпіёнаў. Атрымлівалася замкнёнае кола: чалавек аказваўся паміж молатам і кавадлам.

Нарэшце наступіў памятны верасень 1939 г. Не паспела Чырвоная армія ўвайсці ў некаторыя вёскі, як там знайшліся людзі, якія ўчынялі расправу з панскімі чыноўнікамі. Так, у вёсцы Гошчава за суткі да прыходу Чырвонай Арміі быў закатаваны пракурор Польшчы Кучынскі — без суда, без следства.

Перачытваючы сотні папак — асабовых спраў — рэабілітаваных грамадзян, зноў вяртаемся да 1956 г. Тады на партыйна-камсамольскіх сходах без каментарыяў быў прачытаны даклад «Аб культе асобы і яго наступствах». Аднак даклад не даў адказу, чаму такое стала магчымым. На Сталіна ўзвалілі ўсе грахі. Аднак ні ў дакладзе, ні пазней у партыйных дакументах не было ні слова сказана аб такіх паняццях, як дэмакратыя, шматпартыйнасць, апазіцыя, без якіх, як мы бачым, немагчыма свабоднае жыццё чалавека. Не было такога паняцця, як прававая дзяржава. І ўсё ж, на наш погляд, працэс пайшоў ужо тады... Першы крок належыць М. С. Хрушчову. Менавіта яму хапіла мужнасці зрабіць, яго розуму зразумець, што без такога кроку немагчыма рухацца наперад.

Пасля хрушчоўскай «адлігі» нашчадкі «розуму, сумлення і гонару» спрабавалі рабіць замаразкі. Але рух да прававой дзяржавы ўжо нельга было замарозіць. Асабліва гэта тычылася духоўнай сферы. Схаваць уваскросшых літаратурных герояў у архіпелаг ГУЛАГ было ўжо немагчыма. Рух да прававой дзяржавы працягваўся. І цяпер, хоць у вялікіх муках, ён набывае ўсё больш адчувальны размах у нашай суверэннай Рэспубліцы Беларусь. Адной з праяў гэтага руху і з'яўляецца аднаўленне справядлівасці ў адносінах да бязвінна пакалечаных лёсаў людзей, вяртання ім добрых імёнаў. Успомнім іх пайменна, бо ў нашай памяці — заклад таго, што гэта больш ніколі не паўторыцца.

В. Касько.

Не быў здраднікам

Пісьмо, апублікаванае ў газеце «Кастрычнік» за 22 снежня 1990 г.

Дзесяцігоддзямі хавалі ад нас праўду аб нявінна асуджаных. Сярод іх наш бацька і дзед Сцяпан Антонавіч Ганчарук. Нарадзіўся ён у вёсцы Гошчава у 1900 г. Быў бедным селянінам. У гады панскай Польшчы меў дробную гаспадарку, пракарміцца з якой сям'і з шасцярымі дзяцьмі было няпроста. Пасля вызвалення ў 1939 г. Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй Сцяпан Ганчарук стаў актывістам па ўстанаўленні савецкай улады, наладжванні новага жыцця. Але пачалася вайна. Фашысты ўстанавілі «новы парадак». У вёсцы арганізавалася падполле, з якім меў кантакт і Сцяпан Ганчарук. Падполлем кіраваў Васіль Майсейчык. У яго ўваходзілі Андрэй Бандарык, Якаў Валошчык і многія іншыя.

Немцы ўмацоўвалі сваю ўладу: солтысам (старастам) стаў адзін з жыхароў вёскі (прозвішча яго ведаем, але не будзем называць). Ён угаварыў Сцяпана быць яго намеснікам, той згадзіўся на гэта толькі тады, калі атрымаў дазвол падполля.

Па расказах многіх партызан і падпольшчыкаў Сцяпан Ганчарук удзельнічаў у многіх аперацыях супраць акупантаў: сабраныя для фашыстаў хлеб і матэрыялы здаваў партызанам, перадаваў разведданыя, распаўсюджваў лістоўкі, знішчаў тэлефонную сувязь. Ён добра ведаў усіх падпольшчыкаў, сем'і партызан, але нікога не выдаў, а наадварот, адводзіў ад іх падазрэнні пры налётах паліцыі.

11 ліпеня вёска была вызвалена ад немцаў. Сцяпана Ганчарука назначылі старшынёю сельсавета. А праз тыдзень на яго ў органы НКУС паступіў данос. У ім паведамлялася аб тым, што С. Ганчарук з'яўляўся агентам каменданта косаўскай паліцыі. Цікавы «агент», які ведаў усё падполле, яго справы і нікога не патрывожыў.

Але час тады быў суровы, і следчыя НКУС выбілі ў яго «прызнанне», што і з'явілася асновай для прыгавору. С. Ганчарука асудзілі на 25 гадоў зняволення.

Былыя партызаны і падпольшчыкі з Гошчава напісалі пісьмо-пратэст у Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР аб несправядлівым агаворы С. Ганчарука. Пасля гэтага іх дапытвалі ў ваеннай пракуратуры Брэста, і ў самой вёсцы вялося следства. Затым нашага бацьку і дзядулю адшукалі ў адным з лагераў і даставілі ў Брэст, дзе адбыўся перасуд. Але ўсё роўна яго не апраўдалі, а толькі скарацілі тэрмін да пяці гадоў. Дамоў ён так і не вярнуўся, памёр у брэсцкай турме, аб чым ёсць і дакументальнае пасведчанне, якое захоўвалася ў ягонай жонкі, у нашай маці і бабулі.

Мінула шмат часу з той пары, а імя нашага бацькі і дзядулі застаецца заплямленым, хоць усе старыя людзі ў вёсцы гавораць, што пацярпеў ён дарэмна. Жывуць яшчэ некалькі партызан і падпольшчыкаў, якія памятаюць С. Ганчарука з таго ваеннага часу. Гэта — былы работнік міліцыі, жыхар Івацэвіч Канстанцін Мітрафанавіч Кот, жыхары Гошчава Пётр Іосіфавіч Лукашук, Пётр Лявонавіч Ярчак, Мікалай Васільевіч Банасевіч, жыхар Белаазёрска Бярозаўскага раёна Іван Антонавіч Гойшык.

Добра ведаў Ганчарука Віктар Антонавіч Хараўчук, які жыве ў Рызе, і іншыя людзі. Калі мы пытаемся ў іх, за што быў рэпрэсіраваны наш бацька і дзед, то яго здрадніцтва яны адмаўляюць. Але мы хочам дабіцца таго, каб невінаватасць нашага роднага чалавека была пацверджана законным дакументам аб рэабілітацыі. Для гэтага мы ўжо звярнуліся ў адпаведныя органы з просьбай падняць яго асабовую справу і перагледзець яе так, як гэта патрабуе справядлівасць і час[1].

С. Шынкевіч, А. Шынкевіч, Я. Ганчарук,
Т. Ганчарук, В. Ганчарук, в. Гошчава.

Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій, рэабілітаваныя ў 1961—1996 гадах[2]

АБРАМОВІЧ Іосіф Іванавіч, н. у 1891, в. Пяшковічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. Да арышту працаваў шаўцом у г. Івацэвічы, арыштаваны 23.3.1940, асуджаны на 5 гадоў.

АБРАМЧУК Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1912, в. Глінная. Арыштаваны 14.9.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ.

АБРАМЧУК Зіновій Емяльянавіч, н. у в. Соміна. Арыштаваны ў 1952. Расстраляны. Яго сям'я ў складзе 8 чалавек (бацькі, брат і дзеці) сасланы ў Акмолінскую вобл. на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

АБРАМЧУК Майсей Ільіч, н. у 1890, в. Соміна Івацэвіцкага р-на, працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 13.12.1940, асуджаны на 8 гадоў.

АБРАМЧУК Рыгор Андрэевіч, н. у 1882, в. Глінная. Арыштаваны 10.9.1940. Асуджаны на 8 гадоў.

АБРАМЧУК Фёдар Рыгоравіч, н. у 1904, в. Глінная. Арыштаваны 14.9.1040. Асуджаны на 8 гадоў.

АГРЭНІЧ Арцём Васільевіч, н. у 1914, в. Гошча. З сям'ёй (7 чалавек) выселены ў 1940 у Архангельскую вобл.

АНІШЧЫК Пётр Іванавіч, н. у 1909, в. Була Івацэвіцкага р-на. Арыштаваны 23.2.1940, асуджаны на 8 гадоў.

АНІШЧЫК Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1913, в. Зарэчча. Арыштаваны 15.12.1939. Асуджаны 5.7.1940 на 5 гадоў.

АНТОНІК Дзяніс Аляксеевіч, н. у 1889, в. Була. Арыштаваны 1.10.1939, працаваў на сельскай гаспадарцы. Зняволены ў ППЛ тэрмінам на 8 гадоў.

АНТОНІК Іван Паўлавіч, н. у 1898, в. Була. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 3.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

АРАНОВІЧ Макс Самуілавіч, н. у 1915. Укладчык дошак Целяханскага лесазавода. Арыштаваны 26.9.1940, асуджаны 28.5.1941 на 8 гадоў. Рэабілітаваны да 1992 г.

АРЦЮХ Андрэй Максімавіч, н. у 1892, в. Краі. Арыштаваны 14.8.1940, асуджаны 10.8.1940 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 28.4.1989. Яго сям'я ў складзе 5 чалавек (жонка і чацвёра дзяцей) былі высланы ў Акмолінскую вобл. (Казахстан).

АСІНСКІ Кароль Феліксавіч, н. у 1880. Арыштаваны ў в. Сенькавічы 19.9.1939, асуджаны на 5 гадоў.

АСІНШЧАЎ Іван Іванавіч, н. у 1888, г. Кіраваград. Працаваў рахункаводам на Івацэвіцкім

[1] Ганчарук С. А. рэабілітаваны.
[2] Рэабілітацыя працягваецца.

лесапільным заводзе. Арыштаваны 4.8.1949, асуджаны на 10 гадоў.

АСІПІК Васілій Лявонцьевіч, н. у 1900, в. Любішчыцы. Працаваў цесляром на чыгунцы. Арыштаваны 30.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

АСІПІК Павел Паўлавіч, н. у 1899, в. Яглевічы. Працаваў майстрам падсочнага лесу, жыў у Яглевічах. Арыштаваны 13.12.1944, асуджаны на 3 гады.

АФОНІК Аляксандр Аляксандравіч з в. Быцень. Арыштаваны ў 1940. Яго сям'я ў складзе 5 чалавек (жонка і чацвёра дзяцей) была вывезена ў 1940 на пасяленне.

БАБІЛОЎСКІ Сямён Сцяпанавіч, н. у 1903, в. Горталь. Арыштаваны 9.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

БАГДАНОВІЧ Зіновій Васільевіч, н. у 1906, м. Целяханы. Працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 22.3.1940, асуджаны на 8 гадоў.

БАКІЕВІЧ Клаўдзія Уладзіміраўна, н. у 1925, г. Косава. Асуджана ў 1945 на 10 гадоў.

БАРЫСЕВІЧ Алена Іванаўна, н. у 1907, г. Косава. Асуджана ў 1946 на 5 гадоў.

БАРЫСЕВІЧ Кірыл Сямёнавіч, н. у 1892, в. Азарычы Целяханскай воласці. Працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 4.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

БАРЫСЕВІЧ Міхаліна Восіпаўна, н. у 1888, в. Жамайдзякі. З шасцярымі дзяцьмі выселена ў 1952.

БАРЫСЕВІЧ Уладзіслава Андрэеўна, н. у 1900, в. Падруша Віленскай губерні. Працавала акушэркай, жыла ў в. Святая Воля. Арыштавана 9.1.1940, асуджана на 8 гадоў.

БАСАЛАЙ Арцём Васільевіч, н. у 1898, в. Вялікая Гаць. З сям'ёй 5 чалавек выселены ў 1940 за межы Беларусі.

БАСАЛАЙ Іван Андрэевіч, н. у 1897, в. Святая Воля. З сям'ёй 10 чалавек выселены ў снежні 1939 на спецпасяленне ў Архангельскую вобл.

БАСАЛАЙ Фёдар Фёдаравіч, н. у 1903 у в. Вялікая Гаць. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 10.6.1946 на 10 гадоў.

БАТУРА Іосіф Іосіфавіч, н. у 1896, в. Самадураўшчына Мінскага р-на. Быў асаднікам у асадзе Руда Івацэвіцкага р-на. Арыштаваны 19.9.1939, асуджаны на 5 гадоў.

БАХУР Аляксандр Емяльянавіч, н. у 1883, в. Яглевічы. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.5.1940, асуджаны на 5 гадоў.

БАХУР Васіль Сцяпанавіч, н. у 1886, в. Руда. З сям'ёй 8 чалавек выселены 10.2.1940 у Архангельскую вобл.

БАХУР Ціхан Ціханавіч, н. у 1895, в. Боркі. З сямёй 6 чалавек выселены ў 1939 за межы Беларусі.

БАХУРА Іван Іванавіч, н. у 1909, в. Любішчыцы. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.5.1940, асуджаны на 8 гадоў.

БАЧАРОУСКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1914, в. Няхачава. Працаваў пуцявым абходчыкам на ст. Косава. Арыштаваны 12.12.1944, асуджаны на 5 гадоў.

БЕЛАБЛОЦКІ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1893, в. Заполле Косаўскага р-на, член КПЗБ, працаваў рабочым на Целяханскім лесазаводзе, жыў у м. Целяханы. Арыштаваны 22.3.1940, асуджаны на 8 гадоў.

БІНКЕВІЧ Мікалай Дамінікавіч, н. у 1877. Асуджаны 6.9.1949 да 2 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

БІНКЕВІЧ Сцяпан Фёдаравіч, ляснік з лясніцтва Навіны каля Целяхан. З сям'ёй 7 чалавек вывезены ў 1939 за межы Беларусі.

БІРУКОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1907. Ляснік. З сям'ёй выселены на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. у 1940.

БОГУШ Міхаіл Пятровіч, н. у 1901, в. Була. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 23.2.1940, асуджаны на 5 гадоў.

БРЫЛЬ Іван Макаравіч, н. у 1901, в. Любішчыцы. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 17.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

БУДЗЕШ Казімір Пятровіч, н. у 1903, в. Папсох Малы Келецкага ваяводства. Працаваў настаўнікам СШ у в. Малочыкі Івацэвіцкага р-на. Арыштаваны 11.11.1939, асуджаны на 8 гадоў.

БУЧЫНСКАЯ Вольга Міхайлаўна, н. у 1900. З дочкамі Ганнай і Янінай, сынам Мікалаем з Косава выселены ў 1940 за межы Беларусі.

БЯЛЯЎСКІ Іосіф Іванавіч, н. ў 1908, в. Збродзіца Келецкага ваяводства. Жыў у в. Сенькавічы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 4.1.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ВАКУЛЬЧЫК Сяргей Цімафеевіч, н. у 1904, в. Клятная. Арыштаваны 14.9.1940 у в. Глінная, асуджаны на 8 гадоў.

ВАКУЛЬЧЫК Цімафей Трафімавіч, н. у 1887, в. Клятная. Арыштаваны 10.9.1940 у в. Глінная, асуджаны на 5 гадоў.

ВАСІЛЕВІЧ Максім Карпавіч, н. у 1885, в. Падстарынь. Арыштаваны 28.5.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ВАСІЛЕВІЧ Навум Рыгоравіч, н. ў 1884, в. Яглевічы. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 15.1.1945, асуджаны на 3 гады.

ВДОВІН Іосіф Фёдаравіч, н. у 1901, в. Власаўцы. Разам з сям'ёй 10.2.1940 выселены на спецпасяленне ў Архангельскую вобл.

ВІЛЬЧЫНСКІ Фелікс Станіслававіч, н. у 1893. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы, жыў у асадзе Дражна Быценскай воласці. Арыштаваны 25.12.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ВЫСОЦКАЯ Надзея Восіпаўна, н. у в. Панкі. З сям'ёй 4 чалавекі выселена ў 1940.

ВЫСОЦКІ Іван Іванавіч, н. у в. Панкі. З сям'ёй выселены ў 1939 за межы Беларусі.

ВЯРЖБІЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1897, хут. Смалярня Косаўскага ўезда. Выселены з сям'ёй 5 чалавек у лютым 1940 за межы Беларусі. 8.9.1941 амнісціраваны як польскія грамадзяне.

ВЯРЫШКА Мікалай Іванавіч, н. у 1868, в. Аўсто. Высланы з сям'ёй у лютым 1940 у Архангельскую вобл. Вызвалены ад спецпасялення 1.9.1941.

ГАЛАШЭЎСКІ Мацвей Анціпавіч, н. у 1900, в. Зарэчча. Працаваў загадчыкам шавецкай майстэрні, жыў у г. Баранавічы. Арыштаваны 20.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ГАЛОЎЧЫК Зінаіда Фёдараўна, н. у 1883, в. Краглевічы. Вывезена з сям'ёй.

ГАЛЯК Рыгор Сямёнавіч, н. у 1904, в. Коланск Івацэвіцкага р-на. Працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 6.11.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ГАНЧАРУК Сцяпан Антонавіч, н. у 1900, в. Гошчава. Арыштаваны ў 1944. Асуджаны на 25 гадоў.

ГАРДЗЕЙКА Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1928 у в. Рацкевічы. Да арышту жыў у г. Слонім. Асуджаны 18.10.1947 на 10 гадоў.

ГАРДЗЕЙКА Анастасія Фёдараўна, н. у 1909, в. Лазаўцы. Выслана з трыма дзецьмі 18.8.1951 за межы Беларусі.

ГАРАШЧАНКА Людміла Барысаўна, н. у 1900, г. Івацэвічы. У 1940 выслана з сям'ёй ў Архангельскую вобл.

ГАЦУКОВІЧ Ксенія Нікіфараўна, н. у 1913, в. Коланск. Выслана ў 1938 за межы Беларусі.

ГАЦУКОВІЧ Яўгенія Антонаўна, н. у 1938, в. Коланск. Выслана за межы Беларусі.

ГЕМБАР Арцём Мікалаевіч, н. у 1886, в. Падстарынь Косаўскага р-на. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1944, асуджаны на 3 гады.

ГЕНГОЦЭК Адам Іосіфавіч, н. у 1898. Працаваў на ўласнай гаспадарцы, жыў у асадзе Дзеткавічы Быценскай воласці. Арыштаваны 30.9.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ГЖАШКЕВІЧ Баляслаў Іванавіч, н. у 1908, в. Грунц Варшаўскага ваяв. Працаваў машыністам млына, жыў у в. Ямічна Быценскага раёна. Арыштаваны 22.12.1944, асуджаны на 5 гадоў.

ГІРЧЫК Сцяпан Антонавіч, н. у 1908, в. Аўсто Івацэвіцкага р-на. Працаваў сталяром Івацэвіцкай сталярнай майстэрні. Асуджаны 8.4.1946 на 5 гадоў, адбыў пакаранне і быў сасланы ў Краснаярскі край. Вызвалены 27.5.1954.

ГЛАДУН Рыгор Рыгоравіч, н. у 1904, в. Доўгая. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 3.12.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ГОРБАЧ-РАК з в. Бабровічы. Сям'я (7 чалавек) выселена 20.6.1941 у Алтайскі край. Галава сям'і Рак Міхаіл Маркавіч 20.6.1941 зняты з эшалона ў Оршы і арыштаваны. 27.1.1942 расстраляны.

ГРАБУН Данііл Кліменцьевіч, н. у 1911, в. Міронім Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены ў 1954.

ГРЫНЧЫК Міхаіл Антонавіч, н. у 1889, в. Зарэчча. Майстар па будаўніцтве плацін. Арыштаваны 20.10.1939, асуджаны на 5 гадоў.

ГРЫНЮК Аляксандр Станіслававіч, н. у 1907. Начальнік райканторы сувязі. Арыштаваны 10.7.1940, асуджаны 9.1.1941 на 5 гадоў.

ГРЫШКЕВІЧ Уладзімір Канстанцінавіч, н. у 1899. Арыштаваны ў Бабровічах 15.1.1940. Асуджаны на 8 гадоў.

ГУДЗІК Павел Мікалаевіч, н. у 1904, в. Быцень Івацэвіцкага р-на. Працаваў дзяжурным па ст. Даманава Брэст-Літоўскай чыгункі. Асуджаны 8.9.1945 на 15 гадоў катаржных работ. Вызвалены 12.7.1954.

ГУЗНІЧОК Юзаф Міхайлавіч, н. у 1887, г. п. Целяханы. Працаваў на ўласнай гаспадарцы, жыў па месцы нараджэння. Арыштаваны 24.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ГУРЦЭВІЧ Вікторыя Станіслававўна, н. у 1917, в. Зацішша Івацэвіцкага р-на. Працавала ў Косаўскай райканторы сувязі сартавальнай пошты. Асуджана на 15 гадоў катаржных работ 18.4.1945. Вызвалена 15.1.1955.

ГУРШЦЭЛЬ Веніямін Ашэравіч, н. у 1915, г. п. Целяханы. Працаваў нарыхтоўшчыкам Іванаўскай канторы. Арыштаваны 23.3.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ГУЦКІ Казімір Якаўлевіч, н. у 1923. Каваль Целяханскага лесазавода. Арыштаваны ў Целяханах 26.9.1940. Асуджаны 28.5.1941 на 8 гадоў.

ГУШЧА Эміль Яўгенавіч, н. у 1893, в. Бурсукова Града. Працаваў старшым бухгалтарам леспрамгаса, жыў у г. Івацэвічы. Арыштаваны 16.5.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ДАВЫДЗІК Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1905, в. Даманава. Працаваў стрэлачнікам на ст. Даманава. Асуджаны 21.5.1946 на 10 гадоў. Вызвалены 7.1.1995.

ДАРЭЎСКІ Станіслаў Аляксандравіч, н. у 1909, в. Мілавіды Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 30.4.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ДЗЕМІДОВІЧ Ілья Рыгоравіч, н. у 1900, в. Галік Івацэвіцкага р-на. Пражываў у в. Сакоўцы і працаваў рахункаводам у калгасе «Перамога». Асуджаны 23.5.1951 на 25 гадоў. Вызвалены ў 1956.

ДЗЯМКЕВІЧ Альберт Карлавіч, н. у 1918, г. Краснаярск. Да арышту працаваў на Целяханскім лесазаводзе № 17. Арыштаваны 26.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ДЗЯМЧЫЛА Купрыян Якаўлевіч, н. у 1898, мяст. Моталь Іванаўскага р-на. Да арышту працаваў заг. агульнага аддзела Целяханскага райвыканкома. Асуджаны 29.11.1940 на 8 гадоў. Памёр у месцы зняволення 10.1.1943.

ДРАГУН Міхаіл Іванавіч, н. у 1883, в. Востраў Астроўскай гміны. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы ў в. Кулікі Быценскага р-на. Арыштаваны 12.9.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ДЫЛЬКО Юзэфа Казіміраўна, н. у 1912, г. Грозны. Да арышту працавала выкладчыкам фізкультуры ў СШ № 1 г. Косава. Арыштавана 20.3.1940, асуджана на 8 гадоў.

ЕДНАШЭЎСКІ Эдуард Мацвеевіч, н. у 1896, в. Бабец Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на

сваёй гаспадарцы ў вёсцы Баравікі. Арыштаваны 19.9.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ЕЗЕРКОЎСКІ Тэафіль Казіміравіч, н. у 1899. З жонкай і траімі дзецьмі выселены з в. Святая Воля 10.2.1940 у Архангельскую вобл. Рэабілітаваны 7.12.1993.

ЕРМАКОВІЧ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1912, в. Малочкі Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 25.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ЕРМАЛОВІЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1909, в. Малочкі Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 29.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ЕРМАЧОК Іван Рыгоравіч з в. Чамялы. 29.5.1946 асуджаны на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

ЕФІМОВІЧ Мікалай Адамавіч, н. у 1907, в. Глінная Целяханскага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 10.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЁВІК Дзмітрый Іванавіч, н. у 1904, в. Сянкевічы Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў рабочым на бойні. Арыштаваны 4.10.1939. 26.8.1940 зняволены на 8 гадоў.

ЖУКЕВІЧ Ніна Іванаўна, н. у 1925, г. Косава. Да арышту працавала ў Косаўскай школе. Асуджана 25.5.1945 на 10 гадоў.

ЗВАДА Антон Мацвеевіч, н. у 1904, **Ніна Іванаўна** (жонка) і трое дзяцей выселены ў 1940 з в. Бялавічы за межы Беларусі.

ЗІНЕВІЧ Адам Канстанцінавіч, н. у 1915, в. Папоўка Багурусланскага павета Самарскай губерні. Жыў у вёсцы Стайкі Івацэвіцкага раёна. Арыштаваны 22.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЗМАГІНСКІ Іван Ігнатавіч, н. у 1900, г. Ігумень Мінскай вобл. Да арышту працаваў бухгалтарам у маёнтку Целяханы. Арыштаваны 2.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЗУБІК Павел Рыгоравіч з сям'ёй выселены 10.2.1940 у Архангельскую вобл. Вызвалены 2.11.1941.

ЗЫБАЙЛА Пётр Васільевіч, н. у 1906, в. Зыбайлы. Арыштаваны ў 1937.

ЗЫГМУНТ Іосіф Войцехавіч, н. у 1900. Настаўнік Гортальскай школы. Арыштаваны 19.12.1939. Асуджаны на 8 гадоў.

ЗЭМБЕЛЯ Францішак Мурэевіч, н. у 1872. З жонкай Марыяй Францаўнай і траімі дзецьмі высланы з в. Вялікае Поле Быценскай гміны на пасяленне ў Емянецкі раён 25.2.1940.

КАВАЛЕВІЧ Мікалай Яфімавіч, н. у 1888, в. Выганашчы. Фельчар. Арыштаваны ў Бабровічах 16.2.1941. Асуджаны 18.6.1941 на 5 гадоў.

КАВАЛЕВІЧ Сцяпан Антонавіч, н. у 1899, в. Стрэч Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў дзяжурным па чыгуначнай станцыі Баранавічы. Арыштаваны 3.3.1941, асуджаны на 8 гадоў.

КАВАЛЕЎСКАЯ Лідзія Адамаўна, н. у 1896. Да арышту была хатняй гаспадыняй у г.п. Целяханы. Арыштавана 13.12.1944, асуджана на 4 гады.

КАЗЛОЎСКІ Васіль Пятровіч, н. у 1885. З сям'ёй (7 чал.) выселены з в. Рэчкі ў 1940.

КАЗЛОЎСКІ Казімір Данатавіч, н. у 1902, ураджэнец м. Грыўна. Да арышту працаваў загадчыкам Івацэвіцкай бальніцы. Арыштаваны 5.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КАЗЛОЎСКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1890, г. Ленінград. Да арышту працаваў тэхнікам-будаўніком Быценскай школы і жыў у в. Быцень. Асуджаны 10.2.1941 на 8 гадоў. Памёр у месцы зняволення 26.2.1942.

КАЛАДЗЕЙЧУК Тадэвуш Восіпавіч, н. у 1913. Настаўнік в. Харошча. Арыштаваны 9.10.1939. Асуджаны на 8 гадоў.

КАЛЕСНІКІ Мікалай Паўлавіч, Павел Пятровіч, Вера Антонаўна з в. Хадоркі выселены за межы Беларусі.

КАЛЯДА Іван Мікітавіч, н. у 1887, в. Вялікая Гаць. Арыштаваны 12.3.1945, асуджаны 12.3.1946 на 7 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Прыгавор адменены 6.11.1965.

КАЛЯДА Мікіта Ціханавіч, н. у 1887, в. Вялікая Гаць Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 12.3.1946.

КАРАЛЕВІЧ Іван Адамавіч, н. у 1905. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы ў в. Каранная Івацэвіцкага р-на. Арыштаваны 14.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КАРАЛЕВІЧ Флор Адамавіч, н. у 1907. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы ў в. Каранная Івацэвіцкага р-на. Арыштаваны 14.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КАРВЯКОЎСКІ Емяльян Мікалаевіч, н. у 1894, в. Міронім Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены ў 1954.

КАРПОВІЧ Мікалай Ануфрыевіч, н. у 1894 у в. Глінная. Асуджаны 27.5.1949 на 10 гадоў.

КАРЧМАР Гдаль Захаравіч, н. у 1899. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы ў г.п. Целяханы. Арыштаваны 11.7.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КАСЦЕЛЬНІК Агнешка Іванаўна, н. у 1910, в. Быцень. Выселена з чатырма дзецьмі за межы Беларусі.

КЛІМАЎ Іван Аляксандравіч, н. у 1886. З сям'ёй выселены 10.1.1940 з в. Выганашчы ў Архангельскую вобл.

КЛІМЕЦ Сцепаніда Мікалаеўна, н. у 1906. Выселена з дзецьмі ў 1941 у Алтайскі край.

КЛІМОВІЧ Ціхан Пятровіч, н. у 1884, в. Сакалоўка Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.4.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КОЗІК Аляксей Еўдакімавіч, н. у 1908, в. Доўгая Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КОРЗА Фёдар Аляксандравіч, н. у 1879. З жон-

кай і пяцярымі дзецьмі выселены ў 1940 з в. Быцень за межы Беларусі.

КОТ Максім Андрэевіч, н. у 1898, в. Быч Косаўскага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 13.12.1944, асуджаны на 3 гады.

КОТ Павел Сцяпанавіч з сям'ёй выселены ў 1940 з в. Рэчкі ў Архангельскую вобл.

КОЦІК Антон Сцяпанавіч, н. у 1907, з в. Падстарынь. Асуджаны ваенным трыбуналам войскаў НКВД Брэсцкай вобл. 30.3.1945. Брэсцкім абласным судом прыгавор адменены 16.3.1970 з-за адсутнасці складу злачынства.

КОЦІК Кірыл Барысавіч, н. у 1908, в. Падстарынь Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў лесарубам. Асуджаны на 10 гадоў. Адбыў тэрмін пакарання і пакінуты ў ссылцы ў г. Караганда.

КРАГЕЛЬ Яўген Якаўлевіч, н. у 1916, в. Стрыгінь Косаўскага павета. Асуджаны на 10 гадоў. Вызвалены. Лёс невядомы.

КРАЕЎСКІ Аляксандр Вікенцьевіч, н. у 1897. Працаваў на сваёй гаспадарцы, жыў у асадзе Златова Быценскай воласці. Арыштаваны 20.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

КРАТАШЫНСКІ Іосіф Сільвестравіч, н. у 1880, с. Хрысцінаўка Кіеўскай вобласці. Да арышту працаваў вартаўніком вадаёма ў в. Гаць Быценскага р-на. Арыштаваны 27.7.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КРОТ Трафім Фёдаравіч, н. у 1894, в. Бабровічы. Рыбак. Арыштаваны 21.12.1940. Асуджаны 28.5.1941 на 8 гадоў.

КРУК Аляксандр Мікалевіч, н. у 1911, в. Стрыгінь Косаўскага павета. Асуджаны на 10 гадоў. Вызвалены. Лёс невядомы.

КУДРАВЕЦ Адам Лаўрэнцьевіч, н. у 1892. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 28.3.1940, асуджаны на 5 гадоў. Яго сям'я ў складзе 5 чалавек была выселена ў 1941 у Казахстан.

КУЗЬМІЧ Віталій Васільевіч, н. у 1914, в. Быцень. Працаваў таксатарам праектнага аддзела лесаўладкавання ў м. Бела-Вежа Гайнаўскага раёна. Арыштаваны 3.11.1940, асуджаны на 8 гадоў.

КУЗЬМІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1885, в. Заполле. Асуджаны 20.6.1940 на 8 гадоў. Рэабілітаваны да 1992.

КУІС Іван Піліпавіч, н. у 1912, в. Аўсто Косаўскага р-на. Да арышту працаваў цесляром на чыгуначнай станцыі Івацэвічы. Асуджаны 21.11.1945 на 5 гадоў.

КУЛІНІЧ Васіль Варфаламеевіч, н. у 1917, в. Паляна Барысаглебскага раёна Тамбоўскай вобл. Жыў у в. Жытлін Івацэвіцкага р-на. Асуджаны 15.4.1946 на 8 гадоў. Вызвалены 19.4.1954, са ссылкі — 12.4.1956.

КУЛЬГАВЕНЯ Ніна Іосіфаўна, н. у 1928, в. Гладышы Косаўскага р-на. Да арышту працавала ў Косаўскім райпрамкамбінаце рабочай. Асуджана 5.10.1945 на 10 гадоў. Вызвалена 27.2.1954.

КУПРЫЯНЧЫК Сцяпан Аляксеевіч, н. у 1892, в. Вулька Целяханскай воласці Косаўскага павета. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 9.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

КУРЛЕНЯ Васіль Сямёнавіч, н. у 1912, в. Даманава. Рабочы будаўнічай канторы. Арыштаваны 20.4.1936, асуджаны 19.9.1936 на 5 гадоў.

КУЧУРА Антон Данілавіч, н. у 1911, в. Міронім. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены ў 1954.

КУЧУРА Вікенцій Вікенцьевіч, н. у 1903, в. Міронім. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены 11.11.1954.

ЛАДЫКА Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1916, в. Міронім. Арыштаваны 15.12.1940, асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 30.9.1989. Сям'я (3 чал.) была выселена ў Акмолінскую вобл., вярнулася дамоў у 1946.

ЛАЗОЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1919. Працаваў рабочым на лесазаводзе ў г. Івацэвічы. Арыштаваны 4.5.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЛАПЧУК Ціхан Андрэевіч, н. у 1906, в. Падстарынь Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў лесарубам. Асуджаны на 10 гадоў. Адбыў тэрмін і пакінуты на пасяленні ў г. Караганда.

ЛАУШ Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1902. Працаваў старшым падатковым інспектарам Быценскага райфінаддзела. Асуджаны 18.10.1947 на 4 гады. Вызвалены са ссылкі 17.5.1954.

ЛІПСКІ Вільгельм Іосіфавіч, н. у 1891, г. Кракаў. Да арышту працаваў натарыусам у г. Косава. Арыштаваны 14.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЛОЙКА Алена Антонаўна, н. у 1912. З траімі дзецьмі выселена ў 1940 з в. Міронім за межы Беларусі.

ЛОЙКА Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1887, в. Міронім. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены ў 1954.

ЛОЙКА Іван Мацвеевіч, н. у 1908, в. Міронім. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены ў 1954.

ЛОЙКА Мікалай Вікенцьевіч, н. у 1894, в. Міронім. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.9.1949 на 10 гадоў. Вызвалены ў 1954.

ЛОЙКА Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1910, в. Міронім. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 29.6.1940 на 8 гадоў. Амнісціраваны ў 1941.

ЛУКАШЭВІЧ Феадосія Іванаўна, н. у 1902. З траімі дзецьмі вывезена ў 1940 з в. Выганашчы ў Акмолінскую вобл.

ЛУЧЫЦ Рыгор Васільевіч, н. у 1896, в. Аброва Целяханскага р-на. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 8.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЛЯЎЧУК Іван Пятровіч, н. у 1893, в. Прыбарава. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 26.11.1945 на 15 гадоў катаржных работ. Вызвалены ў 1955.

ЛЯЎЧУК Рыгор Рыгоравіч, н. у 1893. Высланы ў 1940 з жонкай і чацвярымі дзецьмі з в. Прыбарава ў Акмолінскую вобл.

ЛУШЧЫК Хрысціна Яўстафіеўна, в. Доўгая. Выслана ў 1941 за межы Беларусі.

ЛЯШКЕВІЧ Альберт, н. у 1918. Заточнік піл

Целяханскага лесазавода. Арыштаваны 26.9.1940. Асуджаны 28.5.1941 на 8 гадоў.

ЛЯШКО Мікалай Ігнатавіч, н. у 1911, в. Даманава. Арыштаваны 9.2.1946, асуджаны на 8 гадоў.

МАЙХЕР Людвік Рыгоравіч, н. у 1900. Стораж на Быценскай плаціне. Арыштаваны 9.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

МАКАРЭВІЧ Канстанцін Ціханавіч, н. у 1884, в. Быцень. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 26.7.1940, асуджаны на 8 гадоў.

МАКАРЭВІЧ Любоў Аляксееўна, н. у 1923, в. Быцень. Працавала настаўніцай пачатковых класаў. Арыштавана 21.10.1944, асуджана на 3 гады.

МАКАРЭВІЧ Фёдар Аляксандравіч, н. у 1909, в. Быцень. Асуджаны 27.8.1935 на 5 гадоў.

МАНЬКО Логін Данілавіч, асуджаны на 25 гадоў. Адбываў тэрмін з 5.12.1948 да 7.5.1955.

МАРОЧКА Канстанцін Фёдаравіч і яго сям'я ў ліпені 1940 вывезены ў Акмолінскую вобл.

МАРТЫНЧЫК Афанасій Іларыёнавіч, н. у 1907, в. Стайкі Косаўскага р-на. Працаваў рабочым на Івацэвіцкім спіртзаводзе. Арыштаваны 13.12.1944, асуджаны на 3 гады.

МАТУСЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1906. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

МЕЛЬЦАР Гірш Лейб Абрам Беркавіч, н. у 1907. Працаваў цырульнікам у Целяханах. Арыштаваны 10.7.1940, асуджаны на 8 гадоў.

МЕЛЯШКЕВІЧ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1884, в. Міронім. Асуджаны 1.7.1941 на 8 гадоў.

МІГНО Міхаіл Майсеевіч, н. у 1904, в. Аброва. Працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 8.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

МІЗІНСКІ Карл Пятровіч, н. у 1902. Працаваў сталяром на лесазаводзе г.п. Целяханы. Арыштаваны 27.12.1940, асуджаны на 5 гадоў.

МІРАНОЎСКІ Савелій Іванавіч, н. у 1905, в. Жытлін Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 4.7.1946 на 10 гадоў.

МЛЫНЕЦ Аляксандра Канстанцінаўна і яе трое дзяцей выселены з в. Альба ў Архангельскую вобл. З 1940 на спецпасяленні.

МОЛАШ Іван Трафімавіч, н. у 1908, в. Гічыцы Івацэвіцкага р-на. Жыў у в. Воля, працаваў у калгасе. Асуджаны 30.10.1950 на 25 гадоў. У 1953 тэрмін пакарання зменшаны да 7 гадоў.

МОРАЛЬ Тэрэза Рыгораўна, в. Доўгая. Выслана у 1941 за межы Беларусі.

МЯЛІК Зіновій Фёдаравіч, н. у 1899, п. Целяханы. Заг. базы райспажыўсаюза. Арыштаваны 22.1.1945. Асуджаны на 5 гадоў.

НАВІЦКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1900, м. Целяханы. Працаваў начным вартаўніком на водным участку. Арыштаваны 7.4.1940, тэрмін зняволення не ўказаны.

НАЛІЎКА Анастасія Іванаўна, НАЛІЎКА Іван Уладзіміравіч з в. Даманава вывезены на спецпасяленне ў Казахскую ССР у 1940.

НАУМОВІЧ Восіп Іванавіч, н. у 1891. З яго сям'ёй (7 чал.) выселены з в. Рудня 10.2.1945 у Архангельскую вобл.

НАУМОВІЧ Уладзімір Іванавіч. З сям'ёй (6 чалавек) выселены з в. Рудня ў 1940 у Архангельскую вобл.

НІКАЛАЕЎ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1924, в. Бялавічы. Арыштаваны ў маі 1944 у партызанскім атрадзе імя Дзімітрова па неабгрунтаванаму абвінавачанню. Рэабілітаваны Беларускім ваенным пракурорам 13.4.1994.

НІКІЦІК Іван Міхайлавіч, н. у 1894, в. Козіна. Асуджаны 27.8.1935.

НОВІК (САЛОМЕНІК) Вольга Ігнатаўна, в. Падстарынь, вывезена з сям'ёй у Акмолінскую вобл.

ОСІПІК Павел Паўлавіч, н. у 1899, в. Яглевічы. Працаваў майстрам падсочкі лесу. Арыштаваны 13.12.1944, асуджаны на 3 гады.

ОСНІШЧАЎ Іван Іванавіч, н. у 1888. Рахункавод Івацэвіцкага лесазавода. Арыштаваны 4.8.1949, асуджаны на 10 гадоў.

ПАДГОРНЫ Рыгор Іванавіч, н. у 1895, в. Коханава Быценскай воласці. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 16.7.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ПАЗНЯК Андрэй Міхайлавіч, н. у 1875, в. Азарычы Целяханскага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1940, зняволены на 5 гадоў.

ПАЛЬЧЫНСКІ Юльян Міхайлавіч, н. у 1892, г. п. Целяханы. Працаваў слесарам-механікам Целяханскага лесапільнага завода. Арыштаваны 17.7.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ПАЛЯШЧУК Іосіф Мікітавіч, н. у 1906, в. Юкевічы. Асуджаны ў 1950 на два гады пазбаўлення волі.

ПАЛЯШЧУК Павел Аляксандравіч, в. Быцень. Высланы на спецпасяленне 13.4.1940, вызвалены 18.3.1946.

ПАЎЛОВІЧ Ганна Архіпаўна, н. у 1906. З сям'ёй (3 чал.) выселена з в. Панкі ў 1940 за межы Беларусі.

ПАШКЕВІЧ Ігнат Лявонавіч, н. у 1884. З сям'ёй (3 чал.) у 1940 выселены з в. Коланск за межы Беларусі.

ПЕТРАШКО Іван Пятровіч, н. у 1884, хут. Скупец Дабромысленскай воласці. Жыў на хут. Франопаль Быценскага р-на. Арыштаваны 23.3.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ПІГУЛЕЎСКАЯ Леакадзія Уладзіславаўна, н. у 1889, г. п. Целяханы. Хатняя гаспадыня. Асуджана 3.10.1945 на 4 гады.

ПІСКУНОВІЧ Браніслаў Сямёнавіч, н. у 1912, в. Каранная Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 13.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ПІСКУНОВІЧ Станіслаў Адамавіч, н. у 1907, п. Лагішын Пінскага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы, жыў у в. Каранная. Арыштаваны 16.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ПРОЦ Панцялей Лявонцьевіч, н. у 1897. Пра-

цаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 28.9.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ПУКАЛА Анастасія Васільеўна, н. у 1891. З пяцярымі дзецьмі выселена за межы Беларусі 2.6.1940.

ПУКАЛА Васіль Рыгоравіч, н. у 1889, в. Прыбарава. Арыштаваны 15.1.1939, асуджаны 2.7.1940 на 5 гадоў.

ПУШКО Аврам Іванавіч, н. у 1874, в. Красніца. Арыштаваны ў 1939. Яго жонка **ПУШКО Кацярына Несцераўна** была выселена ў г. Архангельск.

БАБЧЭНЯ Аляксандра Іосіфаўна, н. у 1924, в. Заполле. Да арышту працавала машыністкай хімлясгаса ў г. Івацэвічы. Асуджана 20.7.1945 на 10 гадоў. Вызвалена 19.1.1951.

РАБЧЭНЯ Ілья Мікалаевіч, н. у 1907, в. Серадава Косаўскага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.11.1940, асуджаны на 8 гадоў.

РАГОЖ Якаў Сяргеевіч, н. у 1904, в. Аброва. Арыштаваны 8.9.1940. Асуджаны 16.6.1941 на 8 гадоў.

РАЎБЕЦКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1924, в. Быч. Арыштаваны пры нелегальным пераходзе граніцы з Польшчы ў СССР. Асуджаны 26.4.1937 на 5 гадоў.

САВЕЛЬЕЎ Мікалай Захаравіч, н. у 1896. Рабочы Івацэвіцкага лесазавода. Арыштаваны 4.8.1949. Асуджаны 4.3.1950 на 10 гадоў.

САВІЦКІ Франц Станіслававіч, н. у 1894. Стораж Косаўскага лясгаса. Арыштаваны 26.7.1940. Асуджаны на 8 гадоў.

САВІЧ Дамініка Аляксееўна, н. у 1896. З сям'ёй выселена ў 1940 з в. Гаць як сям'я лесніка пры Польшчы.

САГАНОВІЧ Мікіта Сцяпанавіч, н. у 1884. З сям'ёй (7 чал.) у 1941 вывезены з в. Вялікая Гаць у Архангельскую вобл. на спецпасяленне як сям'я лесніка пры Польшчы.

САГАНОВІЧ Якаў Васільевіч. З жонкай і дваімі дзецьмі выселены ў 1939 з в. Вялікая Гаць за межы Беларусі.

САГАНОВІЧ Яфім Міхайлавіч, н. у 1904, в. Турная. Арыштаваны ў в. Глінная 10.9.1940. Асуджаны на 8 гадоў.

САЛОНКА Іосіф Рыгоравіч, н. у 1873, в. Манцюты Быценскай воласці. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 16.12.1939, асуджаны на 5 гадоў.

САЛОНКА Пётр Міхайлавіч, н. у 1907, в. Даманава. Арыштаваны пры пераходзе граніцы з Польшчы ў СССР. Асуджаны 27.8.1935 на 5 гадоў.

САЎЧУК Фёкла Іванаўна, н. у 1898. З дваімі дзецьмі ў 1940 выселена за межы Беларусі.

СЕБЯКІН Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1910. Асуджаны Вярхоўным судом Комі АССР 22.5.1945 на 10 гадоў. 10.10.1955 прыгавор адменены.

СТАСЕВІЧ Адольф Сігізмундавіч, н. у 1892, в. Гошчава. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 12.12.1944, асуджаны на 3 гады.

СТАСЕВІЧ Хрысціна Сцяпанаўна, н. у 1889. Выслана за межы Беларусі.

СТОЛЯР Слава Генахаўна, н. у 1912, г.п. Целяханы. Краўчыха. Арыштавана 4.2.1940. Асуджана на 8 гадоў.

СТОПНІЦКАЯ Хелена Паўлаўна і шэсць членаў яе сям'і вывезены ў 1940 з в. Рудня на спецпасяленне ў Архангельскую вобл.

СТРАКОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1911. Жыў у в. Быцень, працаваў паштальёнам. Арыштаваны 4.12.1939, асуджаны на 8 гадоў.

СТРАКОВІЧ Васіль Іосіфавіч, н. у 1879, в. Паперня Быценскай воласці. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў.

СТРУКОЎСКІ Сяргей Фёдаравіч, н. у 1907. Да арышту жыў у г. п. Целяханы. Загадчык слясарнай майстэрні райпрамкамбіната. Асуджаны 11.10.1946 на 8 гадоў. Вызвалены ў снежні 1952.

СТРУНЕЎСКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1895, г. п. Целяханы. Святар. Арыштаваны ў пачатку 1949, асуджаны на 25 гадоў.

СУХАНОСІК Андрэй Лявонцьевіч, н. у 1896, в. Быч Косаўскага р-на. Да арышту працаваў пуцявым абходчыкам. Арыштаваны 5.12.1944, асуджаны на 5 гадоў.

СЯЛЕДЧЫК Мікалай Якаўлевіч, н. у 1902, в. Міронім. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Асуджаны 20.6.1940 на 8 гадоў. Вызвалены 15.12.1947.

СЯРГЕЙЧЫК Вольга Піліпаўна і тры яе дачкі выселены ў 1940 з в. Дабромысль за межы Беларусі.

ТАТАРАВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1904. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы ў в. Каранная. Арыштаваны 14.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ТРУЦЬКО Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1903. З жонкаю і чацвярымі дзецьмі ў 1941 вывезены з в. Козікі на пасяленне ў Алтайскі край.

ТРУЦЬКО С. Ф., расстраляны 21.10.1942.

ТУР Максім Максімавіч, н. у 1904, в. Горкі Косаўскага р-на. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 4.10.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ТУРЦЭВІЧ Іосіф Васільевіч, н. у 1905, в. Вуглы Быценскага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ТУРЧЫН Барыс Мікалаевіч, н. у 1882, в. Кулябшы. 24.12.1948 асуджаны на 8 гадоў.

ТУТЦЫЙ Казімір Якаўлевіч, н. у 1923. Працаваў кавалём на целяханскім лесазаводзе. Арыштаваны 26.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ТЫСЕВІЧ Каленік Міхайлавіч, н. у 1904, в. Аброва Целяханскага р-на. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 8.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ФІРАНЧУК Аляксандра Восіпаўна, н. у 1903. З пяцярымі дзецьмі вывезена ў 1940 у Акмолінскую вобл., дзе пражывала да 1947.

ФІРАНЧУК Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1907, в. Быцень. Працаваў цесляром на будаўніцтве Быценскага клуба. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ФІРАНЧУК Фёдар Дзянісавіч, н. у 1898, в. Зарэчча, асуджаны ў 1939.

ФУРСА Ганна Іванаўна, н. у 1907. З чацвярымі дзецьмі выслана ў 1940 з в. Зарэчча ў Казахстан.

ФУРСА Фёдар Адамавіч, н. у 1898, в. Козіна. Працаваў загадчыкам склада Быценскага лесакамбіната. Асуджаны 16.8.1946 на 4 гады. Вызвалены 28.10.1948.

ХАВАНСКІ Аляксей Васільевіч з шасцю членамі сваёй сям'і выселены ў 1951 з в. Руда за межы Беларусі.

ХАВАНСКІ Дзмітрый Рыгоравіч з сям'ёй 11 чал., выселены ў 1940 з в. Руда за межы Беларусі.

ХАВАНСКІ Павел Пятровіч, н. у 1908. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы ў в. Стайкі Косаўскага р-на. Арыштаваны 23.8.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ХАВАНСКІ Рыгор Амбросьевіч, н. у 1906. З жонкай і траімі дзецьмі выселены 29.2.1940 з в. Сенькавічы за межы Беларусі.

ХАЛАДОВІЧ Іосіф Дзмітрыевіч, н. у 1903, г.п. Целяханы. Арыштаваны 7.10.1939. Асуджаны на 8 гадоў.

ХАМЕНЯ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1913, в. Козіна. Арыштаваны 24.2.1945. Асуджаны на 10 гадоў.

ХАРКО Фёдар Паўлавіч (Пятровіч), н. у 1895, в. Дабромысль. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 15.11.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ХАЎСТОВІЧ Антон Пятровіч, н. у 1904, в. Заўшыца Слуцкага р-на Мінскай вобл. Да арышту працаваў рабочым на лесараспрацоўках, жыў у в. Выганашчы. Арыштаваны 25.4.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЦВІНЕР Юзаф Антонавіч, н. у 1898, в. Маркова Пшаводскага павета. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы, жыў на хутары Смалярня Косаўскага павета. Арыштаваны 3.1.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЦІМАШЭВІЧ Міхаіл Максімавіч, н. у 1905, в. Вулька-Аброўская. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 10.3.1941, асуджаны на 8 гадоў.

ЦЫВІНСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1907, в. Глінная Івацэвіцкага р-на. Да арышту працаваў настаўнікам. Арыштаваны 13.9.1940, асуджаны на 8 гадоў 23.5.1941.

ЧАСАК Пётр (Павел) Восіпавіч, н. у 1912, г. Лодзь. Да арышту працаваў рабочым на лесапільным заводзе, жыў у г. Івацэвічы. Арыштаваны 19.9.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ЧЫЖЭЎСКІ Іосіф Міхайлавіч, н. у 1893, в. Быхава Люблінскага ваяв. Да арышту жыў у в. Альшаніцы. Арыштаваны 18.11.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ШАБАН Аляксандр Пятровіч, н. у 1887. З сям'ёй (9 чалавек) выселены ў 1940 з в. Даманава ў Казахстан.

ШАБАН Канстанцін Аляксеевіч, н. у 1909, в. Даманава. Арыштаваны пры пераходзе граніцы з Польшчы ў СССР. Асуджаны 19.7.1936 на 3 гады. Вызвалены 11.4.1939.

ШАБАН Мікалай Аляксандравіч, н. у 1915, в. Даманава. Да арышту працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.11.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ШАБАН Мікалай Дзмітрыевіч, н. у 1907, в. Даманава. Арыштаваны пры нелегальным пераходзе граніцы з Польшчы ў СССР. Асуджаны 19.7.1936 на 3 гады. Вызвалены 11.4.1939.

ШАВЕЛЬ Піліп Іларыёнавіч, н. у 1897, в. Сялец. Працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 15.11.1939, асуджаны на 8 гадоў.

ШАЛАХМАН Мардух Шаломавіч, н. у 1891, г. п. Целяханы. Да арышту быў уладальнікам крамы. Арыштаваны 10.7.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ШАЎКУН Мікалай Фёдаравіч, н. у 1907, в. Кушняры. Да арышту працаваў кавалём лесазавода № 13 на станцыі Івацэвічы, асуджаны 30.4.1945 на 10 гадоў. Пакінуты ў ссылцы ў г. Караганда.

ШАЎЧУК Васіль Кузьміч, н. у 1905, в. Глінная. Арыштаваны 14.9.1940. Асуджаны на 8 гадоў.

ШАЎЧУК Кузьма Міхайлавіч, н. у 1879, в. Глінная. Асуджаны ў 1940 на 8 гадоў.

ШУЛЬГА Елізавета Лук'янаўна, н. у 1902. З траімі дзецьмі выселена ў 1941 з в. Даманава ў г. Кіраў.

ШЫРАЕЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1888, в. Аброва. Арыштаваны 14.12.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ШЫРЛЕЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1888, г. Ананьеў Херсонскай губерні. Да арышту працаваў на сваёй гаспадарцы, жыў у вёсцы Аброва. Арыштаваны 14.12.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ШЫШ Аляксей Максімавіч. З сям'ёй (6 чал.) выселены ў 1940 з в. Аўсто ў Архангельскую вобл.

ЮРКЕВІЧ Аркадзь Аляксандравіч, н. у 1905, Святая Воля. Арыштаваны 13.9.1940, асуджаны на 5 гадоў.

ЯКАБСАН Мікалай Андрэевіч, н. у 1904, в. Аброва. Да арышту працаваў настаўнікам у в. Выганашчы. Асуджаны 14.6.1941 на 8 гадоў.

ЯКАЎЧУК Уладзімір Іванавіч, н. у 1923, в. Дабромысль. Асуджаны на 10 гадоў.

ЯКУТОВІЧ Фама Мікалаевіч, н. ў 1896, г. п. Целяханы. Ляснік. Арыштаваны 2.4.1940, асуджаны 9.7.1940 на 8 гадоў.

ЯКУТОВІЧ Юльян Мікалаевіч, н. у 1901, г. п. Целяханы. Настаўнік. Арыштаваны 4.4.1940, асуджаны на 8 гадоў.

ЯНУШКЕВІЧ Марыя Васільеўна і 5 членаў яе сям'і выселены ў 1940 з в. Корачын у Архангельскую вобл.

ЯФІМОВІЧ Мікалай Адамавіч, н. у 1905, в. Глінная. Арыштаваны 10.9.1940, асуджаны на 8 гадоў.

Спіс склалі М. В. Банасевіч, В. П. Касько, А. В. Башчук (Самусік), А. Ф. Велікаселец на падставе матэрыялаў раённай камісіі па садзейнічанні захавання правоў і інтарэсаў рэабілітаваных і ўвекавечанні памяці ахвяр палітычных рэпрэсій.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

640 дзён пражылі ў мірнай стваральнай працы жыхары Івацэвіцкага раёна пры савецкай уладзе. Каля 5 гадзін раніцы 22 чэрвеня 1941 г. нямецкія лётчыкі скінулі першыя бомбы і на тэрыторыі нашага раёна, спрабуючы знішчыць чыгуначны мост на рэчцы Жыгулянка. Так пачалася самая жорсткая вайна апошняга стагоддзя.

На Брэсцкім напрамку супраць чатырох дывізій арміі генерала А. А. Карабкова абрушыліся 10 дывізій правага крыла групы армій «Цэнтр», у тым ліку чатыры танкавыя. Паўсюдна вораг у некалькі разоў пераўзыходзіў нашы войскі ў жывой сіле і тэхніцы. Раптоўнасць удару прывяла да разгубленасці і замяшання ў некаторых вайсковых часцях, якія з-за палітыкі тагачаснага кіраўніцтва краіны былі не гатовы да рашучых дзеянняў, раз'яднаны і хутка страцілі кіруемасць. У інфармацыі першага сакратара Брэсцкага абкома КП(б)Б Тупіцына М.Н. ад 25.6.1941 г. у ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б, у прыватнасці, гаварылася:

«...У Косаўскім раёне быў размешчаны Асобны полк АРГК. 23 чэрвеня, калі абласное кіраўніцтва пераехала туды, то застала такі стан: матэрыяльная частка знаходзілася ў Косаве, байцы ў лагерах пад Баранавічамі (150 км ад Косава), боепрыпасы адсутнічалі, у камандзіра палка не хапала шафёраў і трактарыстаў».

23 чэрвеня ў баявыя дзеянні ўступіла 205-я матарызаваная дывізія палкоўніка Ф. Ф. Кудзюрава, якая размяшчалася ў Бярозе, і к канцу дня заняла абарону на рацэ Ясельда. Разам з ёй дзейнічаў 14-ы механізаваны корпус. 24 чэрвеня вораг прарваў абарону нашых войск і па Варшаўскай шашы рушыў у напрамку Івацэвіч.

Адыходзячы з Жабінкі праз Пружаны, 25 чэрвеня часці 30-й танкавай дывізіі (камандзір С. І. Багданаў) вялі жорсткія баі на рубяжы Косава — Івацэвічы, а затым рэшткі дывізіі працягвалі баі на рацэ Шчара. Канчаліся снарады і гаручае, папаўнення ж не было. Танкісты прарываліся праз матарызаваныя падраздзяленні нямецкіх войскаў, якія рухаліся па Брэст-Маскоўскай шашы. У раёне вёскі Сярадава да шашы выбралася савецкая «трыццацьчацвёрка» і з ходу ўдарыла па нямецкім танку, з якога знесла вежу. Так і застыў ён на абочыне шашы да канца вайны.

Калі 22 чэрвеня па радыё была перададзена Заява Савецкага ўрада аб вераломным нападзе на нашу краіну фашысцкай Германіі, мясцовыя грамадзянскія і ваенныя ўлады Косаўскага, Быценскага і Целяханскага раёнаў (цяпер гэта тэрыторыя Івацэвіцкага раёна) разгарнулі актыўную работу па арганізацыі адпору ворагу.

Ствараліся атрады самаабароны, згодна з аб'яўленай мабілізацыяй пачалі працаваць прызыўныя пункты. 23 чэрвеня непадалёку ад Косава ва ўрочышчы «Выгода» ў Гулінскім лесе разгарнуўся мабілізацыйны пункт для жыхароў Косаўскай зоны. Сфарміраваныя групы мабілізаваных адпраўляліся ў напрамку вёскі Сенькавічы з мэтай выхаду да Баранавіч. Туды ж накіроўваліся атрады і з другіх пунктаў. На жаль, дайсці па прызначэнні яны не змаглі. 24 і 25 чэрвеня шлях ім перакрылі перадавыя часці нямецкай арміі.

26 чэрвеня 1941 г. раён быў поўнасцю акупіраваны фашысцкімі войскамі. Многія яго жыхары, прызваныя па мабілізацыі, не змаглі прарвацца на ўсход, вярнуліся ў свае вёскі. Лясныміі дарогамі і сцежкамі рухаліся на ўсход асобныя падраздзяленні, групы байцоў, якія аказаліся ў акружэнні. На месцы баёў і ў лясных гушчарах многія акружэнцы пакідалі зброю. Тыя, хто аказаўся параненым ці хворым, прасіліся да сялян, каб застацца ў іх у якасці работнікаў. Колькасць такіх павялічвалася з часам за кошт тых байцоў, што ўцякалі з палону. Іх у вёсках называлі «васточнікамі», а самі яны маскіраваліся пад зняволеных з працоўных лагераў, якія ў 1940—41-м гадах будавалі аэрадромы і ваенныя ўмацаванні. Сяляне раёна давалі ім прытулак і рэгістравалі ў акупантаў як наёмных работнікаў. Такім чынам у раёне аселі сотні ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія затым сталі на шлях партызанскай барацьбы з нямецкімі акупантамі.

На часова захопленых тэрыторыях фашысты ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым, так званы «новы парадак». Сутнасць яго зводзілася да ліквідацыі савецкага грамадскага ладу, разграблення нацыянальнага багацця, заняволення і знішчэння большай часткі нашых людзей.

Насаджаўся і падтрымліваўся такі парадак масавым тэрорам, які ажыццяўлялі атрады СС, СА, СД, розныя карныя службы і паліцэйскія фарміраванні. На акупіраваных тэрыторыях у раёнах ствараліся ортскамісарыяты і мясцовыя ўправы на чале з бургамістрамі, старастамі, солтысамі. Усе гэтыя сілы былі накіраваны на ажыццяўленне рэпрэсіўных мер па зняволенні мясцовага насельніцтва. Адразу пасля акупацыі раёна фашысты і іх памагатыя паліцаі пачалі жорсткую расправу з мясцовым актывам. У гарадах і вёсках без суда і следства людзей расстрэльвалі, вешалі, палілі цэлымі сем'ямі. У Косаве стварылі гета, куды сагналі сотні яўрэйскіх сем'яў са старымі і дзецьмі, затым іх вывезлі ў Мерачоўшчыну і расстралялі. Не сціхалі стрэлы ў кар'еры каля Івацэвіч, у раёне мястэчка Быцень і вёскі Целяханы, дзе амаль штодня расстрэльвалі савецкіх людзей. Карныя атрады здзяйснялі групавыя расстрэлы ні ў чым не вінаватых мірных жыхароў у вёсках Заполле, Дубітава, Гошчава, Святая Воля, Козікі і іншых.

За гады акупацыі было знішчана ў Косаўскім раёне 3112 чалавек, у Быценскім — 1816, у Целяханскім — 3226 мірных грамадзян.

Акупанты разагналі і разграбілі створаныя да вайны калгасы ў вёсках Любішчыцы, Быч, Падстарынь, Яглевічы, Бабровічы, Коланск, Амяльная, Гнойнае, Вуглы, Коханава і іншых, сялян абклалі рознымі паборамі, ганялі на розныя работы. Праводзіліся шматлікія аперацыі па вывазе савецкіх людзей, асабліва моладзі, на прымусовыя работы ў Германію. З усіх населеных пунктаў раёна было вывезена больш за дзве тысячы чалавек. З вёсак Дубітава, Рацкевічы, Грыўда, Була, Харошча, Стайкі, Гошчава, Заполле, Бялавічы гітлераўцы забралі ў Германію па 35—80 чалавек.

Аднак з першых дзён акупацыі раёна фашысты сустрэлі народнае супраціўленне. Мясцовы актыў, акружэнцы-ваеннаслужачыя арганізоўвалі патрыятычныя групы, якія пачалі антыфашысцкую ба-

рацьбу. А на Целяханшчыне ўжо з ліпеня 1941 года пачаў дзейнічаць падпольны райком КП(б)Б, які ўзначалілі сакратары І. І. Квінта і Я. Р. Корнеў, але праіснаваў ён толькі да верасня. За гэты час ён правёў некаторую работу па арганізацыі падполля ў Целяханскім раёне, быў створаны Целяханскі партызанскі атрад.

Нягледзячы на жорсткі тэрор, ужо ў ліпені — жніўні 1941 г. патрыятычныя групы з былых членаў КПЗБ, камсамольцаў і актывістаў узніклі ў Косаве, вёсках Быч, Гошчава, Сярадава, Скураты, Святая Воля, Хадакі і іншых населеных пунктах раёна. Затым падполле стала хутка пашырацца. У гады вайны яно дзейнічала ў 44 населеных пунктах Косаўскага раёна. Толькі ў гэтым раёне ў антыфашысцкіх ячэйках было аб'яднана 236 патрыётаў.

У пачатку ліпеня 1941 г. патрыятычную групу ў Косаве стварае былы член КПЗБ Мікалай Фёдаравіч Трында. Прайшоўшы праз турмы панскай Польшчы, змагаючыся за савецкую ўладу на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ён набыў багаты вопыт канспірацыі і падпольнай работы, што вельмі спатрэбілася ў ваеннае ліхалецце. Праз яго ў антыфашысцкую дзейнасць уключаліся патрыёты, у тым ліку з вёскі Дубітава Віктар Радзюк, з вёскі Гошчава Васіль Майсейчык, з вёскі Квасевічы Лука Паўлоўскі, з вёскі Скураты Якаў Казімірчык, з вёскі Падстарынь Канстанцін Талочка і іншыя. Затым з групай наладзілі сувязь былыя камандзіры Чырвонай Арміі Мікіта Селюкоў і Дзмітрый Дзмітрыеў, якія ўцяклі з палону і жылі ў Косаве. У красавіку 1942 года Дзмітрыеў і Селюкоў па рашэнні антыфашысцкага камітэта пайшлі ў лес і сталі арганізатарамі партызанскага атрада імя Дзімітрова.

Рашэннем ЦК КП(б)Б ад 30 ліпеня 1941 г. для арганізацыі падпольнай работы ў Ружанскім, Пружанскім, Косаўскім раёнах былі накіраваны ўпаўнаважаныя ЦК КП(б)Б І. П. Урбановіч, які да вайны працаваў старшынёй Ружанскага пасялковага Савета, і І. І. Жышко, які працаваў яго намеснікам. Яны звязаліся з антыфашысцкімі групамі, што дзейнічалі на тэрыторыі названых раёнаў, і аб'ядналі іх пад кіраўніцтвам міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі». У склад гэтага камітэта ўваходзілі І. П. Урбановіч (сакратар), М. Е. Крыштафовіч, Я. М. Афанасьеў, І. І. Жышко, А. М. Дурэйка, А. І. Мініч, М. Ф. Трында. Камітэт разгарнуў работу па актывізацыі антыфашысцкай дзейнасці патрыятычных груп сярод насельніцтва, накіроўваючы людзей на сабатаж мерапрыемстваў ворага, на разгортванне партызанскай барацьбы.

Восенню і зімой 1941 — 1942 гг. актыўную работу па арганізацыі супраціўлення акупантам праводзіла партыйна-камсамольская група ў вёсцы Сярадава, якую ўзначальваў палітрук Чырвонай Арміі Фёдар Бяляеў. Вясной 1942 г. Бяляеў вывеў у лес групу акружэнцаў, якая ўключылася ў партызанскую барацьбу.

Актыўную дзейнасць праводзіла Яглевіцкая падпольная камсамольская арганізацыя на чале з Віктарам Клютко. Маладыя патрыёты збіралі зброю, боепрыпасы, медыкаменты, накіроўвалі ў лес групы моладзі для ўступлення ў рады народных мсціўцаў. Віктар Клютко быў схоплены фашыстамі і павешаны ў Івацэвічах.

Падпольныя антыфашысцкія арганізацыі паўсюдна збіралі зброю, якую затым перадавалі партызанскім атрадам. Яны ўдзельнічалі ў стварэнні партызанскіх атрадаў, а затым ажыццяўлялі разведку і аказвалі партызанам дапамогу ў баявых справах.

Першыя партызанскія групы пачалі дзейнічаць на тэрыторыі раёна ўжо ў 1941 годзе. Так, на Жытліншчыне ў ліпені ўзнікла патрыятычная група мясцовых актывістаў з вёскі Хадакі пад кіраўніцтвам былога члена КПЗБ Мікалая Харытонавіча Колтуна. У верасні яна аб'-

ядналася з групай акружэнцаў на чале з лейтэнантам Чырвонай Арміі Аляксеем Пятровічам Чартковым з Лухавіцкага раёна Маскоўскай вобласці. Утварыўся партызанскі атрад, якому партызаны прысвоілі 112-ы нумар (у той дзень ішоў сто дванаццаты дзень вайны). Партызаны сталі непакоіць паліцэйскія гарнізоны, мясцовых прыслужнікаў акупантаў, весці растлумачальную работу сярод насельніцтва. У далейшым гэты атрад стаў базавым для разгортвання партызанскага руху на Жытліншчыне.

У лесе Воўчыя Норы, у Буленскім лесе першыя партызанскія групы таксама ўзніклі ў ліпені 1941 года. У сумежных Слонімскім, Быценскім і Косаўскім раёнах дзейнічала група Фідрыка Дудко, у якой былі аб'яднаны мясцовыя патрыёты і ваеннаслужачыя-акружэнцы. Адной з першых іх аперацый быў разгром нямецкай аўтамашыны на дарозе Жыровічы — Косава. 30 чэрвеня з байцоў-акружэнцаў утварылася група лейтэнанта Пятра Васілевіча Пранягіна. У верасні гэтыя групы за Быценню аб'ядналіся ў адзін атрад.

Тады ж з'явіліся першыя групы партызан у Ружанскай пушчы і Гута-Міхалінскім лесе. З пачаткам вайны ў Ружанскай пушчы пачала дзейнічаць група камандзіраў і байцоў Чырвонай Арміі на чале з лейтэнантам Аляксандрам Журбой. У ліпені з ёй звязалася група савецкіх работнікаў пад кіраўніцтвам М. Е. Крыштафовіча. У той жа час там узнікла яшчэ некалькі партызанскіх груп.

Дзякуючы рознабаковай дзейнасці антыфашысцкіх падпольных арганізацый зімой 1941—42 гг., з вясны 1942 г. пачаўся рост партызанскіх атрадаў і актывізацыя іх дзейнасці на тэрыторыі раёна.

Косаўская раённая антыфашысцкая арганізацыя, якую ўзначальваў камітэт у складзе М. Ф. Трынды (падпольная мянушка «Майскі»), А. М. Мініча («Волкаў») і В. Ц. Радзюка, вясной 1942 г. нацэліла падпольшчыкаў на вывад у лес вялікай колькасці ваеннаслужачых-акружэнцаў і мясцовых актывістаў, якія ўцалелі ад расправ акупантаў і здраднікаў. З іх узніклі новыя партызанскія атрады і папоўніліся рады ўжо існуючых.

У красавіку 1942 г. у Гута-Міхалінскім лесе ўзнік атрад імя Г. Дзімітрова, камандзірам якога быў выбраны афіцэр Іван Мірашнічэнка, а яго намеснікамі — Дзмітрый Дзмітрыеў і Мікіта Селюкоў. Там жа ў маі з асобных партызанскіх груп утварыліся атрад імя Варашылава (камандзір І. С. Зайкоў) і ў Ружанскай пушчы атрад імя Сталіна, які аб'яднаў групы Журбы, Крыштафовіча, Дарафеева, Масалава і іншых. Да канца мая ў атрадзе было 125 партызан, асноўным месцам дыслакацыі стаў Гута-Міхалінскі лес.

У маі 1942 г. партызанскія атрады і групы, якія дзейнічалі ў лясах вёсак Була і Воўчыя Норы, аб'ядналіся ў буйны атрад імя Шчорса. Камандзірам гэтага атрада стаў П. В. Пранягін, камісарам — Р. В. Дудко, начальнікам штаба — К. Е. Мерзлякоў. Ужо ў чэрвені гэты атрад каля вёскі Дубітава правёў бой з карнікамі і косаўскімі паліцаямі, актывізаваў дыверсійную работу на камунікацыях ворага.

У Жытлінскіх лясах значна папоўніўся партызанскі атрад № 112 — 21 ліпеня 1942 г. з ім аб'яднаўся партызанскі атрад В. М. Манахава, які дзейнічаў у раёне Песак. Аб'яднанаму атраду быў захаваны нумар 112.

Вясной і летам 1942 г. партызаны здзейснілі шэраг буйных аперацый супраць ахоўных гарнізонаў акупантаў, а таксама на чыгуначных і шашэйных магістралях.

Актывізаваліся дзеянні партызан на Быценшчыне, дзе дзейнічаў партызанскі атрад імя Чапаева (камандзіры М. С. Фядотаў і Я. Ф. Гусеў). Узмацнілі дзейнасць народныя мсціўцы ў Целяханскай зоне. Такім чынам, у 1942 г. партызанскі рух

набыў у раёне даволі шырокі размах.

Каардынацыю дзейнасці падпольных арганізацый і партызанскіх атрадаў ажыццяўляў міжраённы «Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі», які ў ліпені 1943 г. быў рэарганізаваны ў Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт. Кіраўніком камітэта ўвесь час быў І. П. Урбановіч («Максім»). Камітэт знаходзіўся ў Ружанскай пушчы і Гута-Міхалінскім лесе, а з ліпеня 1943 г. размяшчаўся пры партызанскай брыгадзе імя П. К. Панамарэнкі. Ён меў сваю друкарню, дзе выпускаліся лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро на беларускай, рускай, польскай і нямецкай мовах, выдавалася газета «За Радзіму». Усяго было надрукавана 168 тысяч лістовак і выдадзена 48 нумароў газеты.

Пры ўдзеле антыфашысцкага камітэта ў ноч на 3 жніўня 1942 г. партызанскімі атрадамі імя Шчорса, імя Дзімітрова і імя Варашылава была падрыхтавана і праведзена смелая аперацыя па разгроме нямецка-паліцэйскага гарнізона ў г. Косаве. Да таго часу ў партызан былі ўжо значныя сілы. Толькі атрад імя Шчорса налічваў больш за 500 байцоў, меў на ўзбраенні 40 кулямётаў, столькі ж аўтаматаў, 45-міліметровую гармату. Фашысцкі гарнізон Косава пастаянна тэрарызаваў мясцовае насельніцтва, перакрываў падыходы да шашы Брэст — Слонім і да чыгункі Брэст — Масква. У ім, акрамя буйных сіл фашысцкіх войскаў, былі моцныя паліцэйскія фарміраванні. Таму аперацыя па разгроме гарнізона старанна рыхтавалася. Напярэдадні бою падпольшчыкі знішчылі тэлефонную сувязь паміж Косавам і Івацэвічамі, Слонімам, Ружанамі, Няхачавам, зрабілі на дарогах завалы. Агульнае кіраўніцтва аперацыяй ажыццяўляў камандзір атрада імя Шчорса П. В. Пранягін. Косаўскі гарнізон быў разбіты, рэшткі акупантаў пакінулі горад, які на працягу месяца знаходзіўся пад кантролем партызан. У баі за Косава загінулі партызаны У. А. Вараб'ёў, Я. Г. Ісаеў, В. М. Кузняцоў, Карым Ісмаілаў, Тамілін.

Мемарыяльная дошка ў Косаве.

Пасля Косаўскай аперацыі атрад імя Шчорса ажыццявіў рэйд з Воўчых Нораў у раён Выганашчанскага возера. Па шляху, размясціўшыся каля в. Дабромысль, звязаўся з атрадам № 112. Сумеснымі сіламі партызаны ажыццявілі смелую аперацыю па захопе і знішчэнні моста на рацэ Шчара і разграмілі гарнізон у вёсцы Чамялы. У аперацыі на мосце былі захоплены і знішчаны грузавая і легкавая аўтамашыны. У час далейшага руху атрад імя Шчорса сустрэўся з вялікімі сіламі карнікаў у раёне Выганашчанскага возера і Агінскага канала. Моцны бой адбыўся на 10-м шлюзе Агінскага канала, дзе засела добра ўзброеная рота гітлераўцаў. Партызаны разграмілі фашыстаў і захапілі багатыя трафеі.

Калі асноўны склад атрада імя Шчорса ў колькасці 900 чалавек пакідаў Буленскі лес, для далейшай арганізацыі партызанскай барацьбы там засталася 53-я група гэтага атрада, камандзірам якой быў прызначаны капітан Мікалай Уладзіміравіч Бабкоў, камісарам — Мікалай Мікалаевіч Уведзенскі. Яны згуртавалі партызан, якія засталіся у атрадзе «Савецкая Беларусь». За кароткі час, да канца 1942 г., партызаны гэтага атрада правялі шмат бліскучых аперацый, сярод якіх разгром гарнізонаў у вёсках Трыбушкі, Сасноўка, Акунінава, засада ў вёсцы Харошча, дыверсійныя акты на камунікацыях ворага. У лістападзе 1942 г. народныя мсціўцы атрада ўрачыста прынялі партызанскую прысягу.

Да восені 1942 г. у раёне былі знішчаны паліцэйскія гарнізоны ў вёсках Була, Боркі, Вялікая Гаць, нешматлікія групы паліцаяў з вёсак разбегліся або ўцяклі ў буйныя гарнізоны. Практычна ўся сельская мясцовасць кантралявалася народнымі мсціўцамі.

Гэта вельмі занепакоіла акупантаў, фашысцкае камандаванне распрацавала план правядзення карнай аперацыі пад кодавай назвай «Міхель» супраць партызан атрадаў імя Шчорса, імя Дзімітрова, імя Варашылава і іншых, што дзейнічалі на тэрыторыі Косаўскага, Бярозаўскага, Ружанскага і Пружанскага раёнаў, а таксама супраць мірнага насельніцтва. З 30 жніўня да 4 верасня сіламі 3-га батальёна 11-га паліцэйскага палка СС, двух матарызаваных узводаў жандармерыі, узвода супрацьтанкавых гармат і мясцовых паліцэйскіх сіл яны абрушыліся на вёскі партызанскай зоны, блакіравалі дарогі ў Буленскім і Гута-Міхалінскім лясах, нанеслі ўдары па партызанскіх лагерах. У адказ партызаны ўдарылі па варожых флангах і тылах і, вырваўшыся з кальца акружэння, адышлі ў суседнія лясы. 4 верасня карнікі атрымалі загад на правядзенне аперацыі «Трохвугольнік», у ходзе якой у Кобрынскім, Маларыцкім, Пінскім раёнах і ў раёне Брэста загубілі 44 837 чалавек, у асноўным мірных грамадзян.

У верасні 1942 г. гітлераўцы правялі ў раёне яшчэ адну карную аперацыю пад кодавай назвай «Балотная ліхаманка — Поўдзень — Захад», у ходзе якой населеным пунктам і жыхарам былі нанесены вялікія страты. Гэта была сёмая па ліку карная аперацыя, якая праводзілася з 25 жніўня па 20 верасня 1942 г. згодна з загадам рэйхсфюрэра СС Гімлера сіламі СС і паліцыі «Остлянд», паліцыі парадку Беларусі, паліцыі бяспекі і СД, камандуючага вермахта «Остлянд». У аперацыі ўдзельнічалі першая матарызаваная брыгада СС, 23-і паліцэйскі полк, 8 асобных ахоўных батальёнаў, 5 матарызаваных узводаў жандармерыі, 3 зондэркаманды СС і іншыя падраздзяленні акупантаў. Карнікі мелі загад: усе вёскі, якія знаходзяцца ў балоцістых і лясных раёнах, дзе будзе праводзіцца аперацыя, знішчыць. У нашым раёне аперацыя разгарнулася на поўнач і поўдзень ад чыгункі Бяроза — Баранавічы, паміж рэкамі Шчара і Грыўда, азёрамі Выганашчанскае і Бабровіцкае. У гэты час праз зону блакады ішоў рэйдам партызанскі атрад імя Шчорса. Дзейнічаючы з засад невялікімі групамі, партызаны наносілі гітлераўцам страты ў жывой сіле і тэхніцы. 13 верасня ў рукапашным баі каля Агінскага канала партызаны знішчылі роту СС, захапілі вялікую колькасць аўтаматычнай зброі і вінтовак, шмат боепрыпасаў. У гэтым баі загінула 5 партызан.

У ходзе аперацыі «Балотная ліхаманка» асабліва жорсткая расправа напаткала жыхароў лясных вёсак. 15 верасня разам з людзьмі былі знішчаны вёскі Вяда (87 двароў і 217 чалавек), Красніца (16 двароў і 96 жыхароў), Тупічыцы (43 двары і 143 чалавекі). У час карных аперацый у вёсках Бабровічы загінула 676 чалавек, Выганашчы — 31, Зацішша — 125, Вялікая Гаць — 123, Галенчыцы — 23, Гічыцы —

42, Вулька Аброўская — 21, Уласаўцы — 64, Хадакі — 92, Жытлін — 128, Зыбайлы — 260, Козікі — 39, Святая Воля — 436, Корачын — 108 чалавек. Неадноўленыя вёскі Вяда, Красніца, Тупічыцы нашага раёна ўвекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

Буйная карная аперацыя пад кодавай назвай «Альтона» ў другой палове снежня 1942 г. была праведзена на тэрыторыі Быценскага і Целяханскага раёнаў сіламі 14-га паліцэйскага палка СС, спецкамандамі паліцыі бяспекі і СД і іншымі карнымі групамі. У загадзе групэнфюрэра СС генерал-лейтэнанта паліцыі Готберга ўказвалася: «Праз стараст і іншых падыходзячых асоб устанавіць асоб, якія спачуваюць партызанам, і знішчыць іх як яўрэяў і цыган. Асобныя падраздзяленні маюць права бязлітасна распраўляцца з асобнымі вёскамі, якія прыхільна ставяцца да ворага». На працягу тыдня гітлераўцы беспаспяхова спрабавалі акружыць і знішчыць партызан, а затым учынілі крывавую расправу над мірнымі жыхарамі, загубіўшы сотні нявінных жыццяў.

Але ніякія карныя аперацыі не маглі знішчыць партызанскага руху. Наадварот, ён шырыўся і рос, у яго ўліваліся ўсё новыя сілы. Гэтаму спрыяла таксама і сувязь мясцовых партызанскіх атрадаў з Вялікай Зямлёй. Аднак трэба адзначыць, што мясцовыя партызанскія атрады ў асноўным у 1941 г. і першай палове 1942 г. дзейнічалі самастойна пры падтрымцы насельніцтва, якое забяспечвала народных мсціўцаў ваенным рыштункам, харчаваннем, адзеннем. Групы, якія пасылаліся за лінію фронту для ўстанаўлення сувязі, звычайна назад не вярталіся.

Якраз у перыяд разгортвання карных аперацый супраць партызан у верасні 1942 г. у раёне вёсак Вялікая Гаць і Аброва высадзілася дэсантная група пад кіраўніцтвам Іосіфа Піліпавіча Топкіна. Яна мела добрае ўзбраенне, рацыі, сувязь з Масквою. Група прыбыла з мэтай каардынаваць дзеянні мясцовых партызанскіх атрадаў, паведамляць аб іх дзейнасці ў Цэнтр, наладзіць сувязь партызан з Беларускім штабам партызанскага руху (БШПР) для забеспячэння іх узрыўчаткай і боепрыпасамі.

Пасля блакады і аблавы вярнуліся ў Гута-Міхалінскі лес атрады і групы, якія адыходзілі да Выганашчанскага возера. Працягваў рэйд толькі атрад імя Шчорса, а ў паўночнай частцы раёна прадоўжылі дзейнасць атрады імя Дзімітрова, «Савецкая Беларусь», імя Чкалава, імя Кірава. Партызаны атрадаў імя Варашылава, імя Сталіна ў час блакады разбіліся на групы, адны з якіх уліліся ў гуцінскія атрады, другія адышлі на ўсход. У партызанскі атрад імя Дзімітрова, якім пасля вяртання з пінскіх балот стаў камандаваць Дзмітрый Сямёнавіч Дзмітрыеў, улілася група Сяргея Руціча з былога атрада імя Варашылава.

У Буленскім лесе актывізавалася дзейнасць партызанскага атрада «Савецкая Беларусь» пад камандаваннем У. М. Бабкова. На Быценшчыне дзейнічаў атрад 113-ы, у Гута-Міхалінскім лесе размясціліся дэсантныя групы Ф. Новікава, М. Чэкана, В. Сіліна.

Зноў з Гута-Міхалінскага і Буленскага лясоў актывізаваліся ўдары партызан па камунікацыях ворага і яго гарнізонах. Пад новы 1943 год партызаны атрада імя Дзімітрова разгромілі паліцэйскі гарнізон у вёсцы Шчытна, захапілі два кулямёты, 13 вінтовак, два пісталеты, дакументы.

З новай сілай разгарнулася партызанская барацьба ў 1943 годзе. Рады народных мсціўцаў папаўняліся ўсё новымі байцамі. Актывізаваліся аперацыі на камунікацыях ворага, што перашкаджала планамернаму перамяшчэнню войск ворага, наносіла страты жывой сіле і тэхніцы. Падпольныя антыфашысцкія арганізацыі паспяхова вялі работу сярод насельніцтва па зрыву



Партызанскія зямлянкі ва ўрочышчы Хаваншчына паблізу в. Корачын Жытлінскага сельсавета. Тут базіраваліся Брэсцкія падпольныя абкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, штаб Брэсцкага партызанскага злучэння.

мерапрыемстваў акупантаў, забяспечвалі партызан разведданымі, харчамі, медыкаментамі, адзеннем, даставалі зброю і боепрыпасы.

Аналізуючы жыццё людзей пры акупацыйным рэжыме, акрамя ваеннага, спынімся і на цывільным, паўсядзённым укладзе жыцця жыхароў раёна. Жыццё не прыпынялася і ў тыя суровыя, поўныя небяспекі дні. Большасць насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай. Людзі апрацоўвалі зямельку, збіралі ўраджай, плацілі кантынгент (так новыя ўлады называлі сельгаспадатак). Жыццё, маладое жыццё, брала сваё і ў тыя доўгія тры ваенныя гады. Бацькі аддавалі дачок замуж, жанілі сыноў. Дзяўчаты збіраліся на пасядзелкі, пралі, ткалі палатно. Вечары праводзілі пры лучыне на прыпечках. Дзеці хадзілі ў школу. Старажылы ўспамінаюць, што ў вёсках працавалі пачатковыя школы. А ў г. Косава была адкрыта новымі ўладамі сямігодка. У сямейным альбоме Марыі Уладзіміраўны Рамашчанкі (дзявочае прозвішча Грыб), жыхаркі г. Косава, захавалася фатаграфія калектыва настаўнікаў (працавала 12 настаўнікаў, дырэктарам Косаўскай школы быў Іосіф Рыгоравіч Ермаловіч) і фатаграфія выпускнікоў 1943 г. Косаўскай сямігодкі, прыкладна 30 чалавек. Адкрыццю новых беларускіх школ у раёне садзейнічала і тое, што ў тыя цяжкія для краіны часы знаходзіліся людзі, якія пад выглядам адраджэння нацыянальнай ідэі змагаліся за адраджэнне беларускасці і беларускай мовы. Так, у раёне працавала Еўдакія Антонаўна Козел, выпускніца Віленскай беларускай гімназіі, якая яшчэ пры панскай Польшчы праследавалася польскімі ўладамі за тое, што змагалася за адраджэнне беларускай мовы. Гэтай жа справай яна працягвала займацца і пры нямецкай акупацыі. У вёсцы Яглевічы працавала настаўніцай пачатковай школы яе малодшая сястра Кацярына Антонаўна Козел. Яна па савецкіх падручніках вучыла дзетак чытаць, пісаць і лічыць. А Еўдакія Антонаўна, карыстаючыся прыхільнасцю прэзідэнта БНР Радаслава Астроўскага, садзейнічала адкрыццю беларускіх школ не толькі ў Косаўскім, але і ў сумежных раёнах.

Дакладную колькасць школ, якія працавалі пры акупацыі ў раёне, устанавіць цяпер цяжка. Па словах былых настаўнікаў вядома, што ў г. Косава быў створаны раённы аддзел адукацыі. Загадчыкам райана працаваў Міхаіл Турчын, інспектарам — Грыдэнка.

Так, дзякуючы талерантнасці і працавітасці беларускага селяніна, здабываўся хлеб надзённы і для партызан, якія дзейнічалі на тэрыторыі раёна, і для новых акупацыйных улад. Менавіта дзякуючы цярпімасці, любві да роднай зямлі працягвалася жыццё беларускага селяніна-мужыка, які сваёй працай здабываў сабе хлеб, вопратку, абутак, з'яўляўся для народных мсціўцаў і рэзервам, і тылам.

Важную ролю ў далейшым развіцці партызанскага руху адыграла прыбыццё ў красавіку 1943 г. у вобласць Брэсцкага абласнога камітэта партыі, які асталяваўся на тэрыторыі нашага раёна ва ўрочышчы «Хаваншчына» на Жытліншчыне. Разам з ім прыбылі абласны камітэт камсамола і рэдакцыя газеты «Заря». Быў створаны штаб Брэсцкага партызанскага злучэння, які ўзяў на сябе кіраўніцтва ўсімі партызанскімі сіламі ў вобласці. Камандзірам злучэння быў прызначаны сакратар абкома КП(б)Б С. І. Сікорскі, камісарам — С. Я. Ягораў, начальнікам штаба — П. В. Пранягін. Рэдактарам абласной газеты «Заря» быў зацверджаны В. Ф. Каліберaў.

Камандаванне партызанскага злучэння правяло арганізацыйнае ўмацаванне партызанскіх атрадаў. Большасць з іх былі аб'яднаны ў партызанскія брыгады. Па рашэнні ЦК КП(б)Б і БШПР з усходніх раёнаў рэспублікі прыбылі сюды новыя партызанскія атрады і брыгады — атрад імя М. Сільніцкага, 99-я партызанская брыгада імя Гуляева, 8-я брыгада С. Жуніна і іншыя. Штаб партызанскага злучэння аб'ядноўваў 11 брыгад і 12 асобных партызанскіх атрадаў, больш за 13 тысяч партызан.

З красавіка — чэрвеня 1943 г. на тэрыторыі нашага раёна сталі дзейнічаць партызанскія брыгады імя Дзяржынскага, імя Панамарэнкі, «Савецкая Беларусь», 8-я і 99-я партызанскія брыгады. Дзейнічалі самастойныя партызанскія атрады імя Шчорса, імя Кутузава, імя Катоўскага (другога складу), імя Чапаева, імя Варашылава, групы Топкіна — Ліньковa і іншыя.

Памятны знак на месцы базіравання падпольных абкомаў і штаба Брэсцкага партызанскага злучэння.

Паходам праз наш раён у Беластоцкую вобласць у кастрычніку 1943 года рухалася партызанскае злучэнне Капусты. У час паходу яго атрады папаўняліся патрыётамі з вёсак нашага раёна, асабліва з Целяханскай зоны. Пазней некаторыя яго атрады і групы базіраваліся ў Ружанскай пушчы і Гута-Міхалінскім лесе.

З вясны 1943 г. партызанскія атрады нашага раёна праз дыверсійна-разведвальныя групы атрымалі сувязь з Масквой, з камандаваннем Чырвонай Арміі. У маі на Міхалінскім полі была падрыхтавана пляцоўка для прыёму самалётаў, і 29 мая там прызямліўся транспартны самалёт, які даставіў з Вялікай Зямлі медыкаменты, боепрыпасы, зброю і газеты. Але здарылася непапраўнае: пры ўзлёце ў зваротны шлях самалёт зачапіўся за вершаліны дрэў і загарэўся. На шчасце, ніхто з лётчыкаў і пасажыраў (у асноўным параненых партызан) не пацярпеў, да ўзрыву самалёта яны паспелі выбрацца з яго. Праз некаторы час на той жа пляцоўцы прызямліўся другі самалёт, які забраў параненых і лётчыкаў і паспяхова перавёз іх за лінію фронту. Пазней самалёты ўжо не садзіліся, а скідвалі для партызан грузы на парашу-



Хата, у якой знаходзіўся падпольны абком ЛКСМБ.

тах. Невялікая пляцоўка для прыёму самалётаў існавала і ў раёне Жытліна. Ужо ў 1943 г. партызаны сталі атрымліваць дапамогу ўзбраеннем, боепрыпасамі, медыкаментамі.

Восенню 1943 года былі адноўлены партыйныя і камсамольскія камітэты. На акупіраванай тэрыторыі пачаў дзейнічаць Быценскі падпольны РК КП(б)Б (з 4 лістапада 1943 г. да 12 ліпеня 1944 г.). Яго сакратарамі былі Р. Дз. Румянцаў, І. Я. Пархоўчанка. Райком КП(б)Б выдаваў газету «На разгром ворага». У чэрвені — ліпені 1944 г. узнавіў сваю дзейнасць Косаўскі РК КП(б)Б (сакратар П. Р. Кавалёў). Целяханскі РК КП(б)Б дзейнічаў у ліпені — верасні 1941 г. (сакратары У. І. Квінта і Я. Р. Корнеў) і з 16 ліпеня 1943 г. да 10 ліпеня 1944 г. (сакратары П. С. Кананович, А. А. Хацкевіч).

Значны ўплыў на ажыўленне дзейнасці камсамольска-маладзёжнага падполля зрабіла аднаўленне падпольных камітэтаў ЛКСМБ, якія дзейнічалі да вызвалення раёна ў ліпені 1944 года. Быценскі падпольны райком камсамола дзейнічаў з 27 кастрычніка 1943 г.(сакратары А. С. Бухман, З. С. Дубрава, Дз. Ц. Бабанаў). Косаўскі падпольны РК ЛКСМБ працаваў з 1 верасня 1943 г. (сакратары С. М. Дурэйка, М. І. Сіняўскі, М. П. Чарных, Ф. І. Савін). Целяханскі падпольны РК ЛКСМБ аднавіў сваю работу 25 мая 1943 г. (сакратары М. М. Палякоў, У. І. Шырын).

Праваліліся спробы акупацыйных улад уцягнуць моладзь у антысавецкія арганізацыі БНС (Беларуская народная самадапамога) і СБМ (Саюз беларускай моладзі). Маладыя людзі сталі цясней гуртавацца вакол падпольных антыфашысцкіх і камсамольскіх арганізацый і весці барацьбу супраць захопнікаў. З іх дапамогай знішчалася тэлефонная сувязь паміж гарнізонамі, рабіліся завалы на дарогах, наладжвалася разведка. Асаблівай актыўнасцю вызначалася ў гэты перыяд дзейнасць падпольных камсамольскіх арганізацый у вёсках Скураты (сакратар Вера Лушчык), Святая Воля (сакратар Іван Корзан), Целяханы (В. Віктаровіч), Гошчава (Пётр Лукашук), Падстарынь і іншых, якія былі надзейнымі памочнікамі партызан.

На тэрыторыі раёна практычна была адноўлена савецкая ўлада. У многіх вёсках ад яе імя дзейнічалі партызанскія камендатуры. Гарнізоны акупантаў былі толькі ў Косаве, Івацэвічах, Быцені, Целяханах і ўздоўж чыгункі Брэст — Мінск. Але яны не маглі кантраляваць становішча ў раёне. Вузкакалейка Івацэвічы — Целяханы з 1943 года бяздзейнічала. Ляцелі пад адхон эшалоны ворага на чыгуначных магістралях, узрываліся аўтамашыны, гарэлі масты, блакіраваліся і абстрэльваліся гарнізоны, знішчаліся фашысты ў адкрытых баях. Калі ў лістападзе 1943 г. карнікі з Няхачава паспрабавалі прарвацца ў вёску Бялавічы, то іх сустрэлі партызаны брыгады імя Панамарэнкі і цалкам знішчылі на Бялавіцкім полі. Такі ж лёс напаткаў акупантаў на Міхалінскім тракце пры спробе прарвацца ў кантралюемую партызанамі зону. А таксама на Жытліншчыне, дзе вясной 1944 г. вялі баі з карнікамі партызаны брыгады імя Дзяр-

жынскага. Гарэла зямля пад нагамі акупантаў, людзі не сумняваліся — час вызвалення няўмольна набліжаўся.

Нарабаванае фашыстамі дабро часта захоплівалі партызаны, раздавалі трафеі насельніцтву. У 1943 г. фактычна была сарвана палітыка акупантаў па адпраўцы моладзі на прымусовыя работы ў Германію. Праваліліся спробы фашыстаў набраць маладых людзей у ваенныя фарміраванні. Асабліва буйны быў наплыў моладзі ў партызанскія атрады ў маі 1943 г., калі акупанты намячалі масавы вываз моладзі. У маі — жніўні 1943 г. сотні маладых байцоў з вёсак раёна папоўнілі рады народных мсціўцаў. Толькі з вёскі Гошчава ў гэты перыяд на шлях партызанскай барацьбы сталі каля 50 юнакоў і дзяўчат.

Вялікае значэнне па дэзарганізацыі перавозак ворага на чыгуначных магістралях у час Курскай бітвы і пачатку вызвалення Беларусі мела «рэйкавая вайна», якая праводзілася адначасова ўсімі сіламі партызан Беларусі. У жніўні — кастрычніку 1943 г. партызанамі раёна былі ўзарваны сотні чыгуначных рэек. На тэрыторыі раёна ў ходзе гэтай аперацыі фактычна была выведзена са строю чыгунка ад Жыгулянкі да Шчары. Некалькі дзён спатрэбілася гітлераўцам, каб аднавіць на ёй рух. Але кожную ноч, а то і ўдзень, чуліся выбухі на чыгунцы. Так, у жніўні 1943 г. дыверсійная група Карасёва з атрада імя Дзімітрова днём выйшла на чыгунку на ўчастку каля Броннай Гары і падрыўнік Рыгор Ткач узарваў эшалон з самалётамі. Паравоз і 16 платформаў з самалётамі аказаліся ў балоце. Рыгор Ткач быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Падрыўная група Сяргея Руціча з гэтага атрада знішчыла больш за 20 эшалонаў ворага.

Можна прывесці мноства прыкладаў гераічных подзвігаў народных мсціўцаў, здзейсненых у барацьбе з нямецкімі захопнікамі на тэрыторыі раёна. З першых дзён вайны актыўна змагалася з фашыстамі сям'я Васіля Гойшыка з вёскі Воля. Калі Васіля гітлераўцы расстралялі, яго жонка Вольга і 14-гадовы сын Коля пайшлі ў партызаны. 24 красавіка 1944 г. пры ўзрыве варожага эшалона Коля загінуў. Бюро Брэсцкага абкома ЛКСМБ прыняло спецыяльную пастанову «Аб гераічнай смерці камсамольца-падрыўніка Мікалая Гойшыка».

Яшчэ раней, у кастрычніку 1942 г., цаной свайго жыцця ўзарваў нямецкі эшалон патрыёт-партызан з вёскі Быч Павел Андрыяшка. Такі ж подзвіг здзейсніў 3 красавіка 1944 г. важак гошчаўскіх падпольшчыкаў падрыўнік атрада імя Дзімітрова Міша Юрашчык. Гераічна загінуў Яўген Ісаеў пры забеспячэнні атакі партызан атрада імя Дзімітрова ў час разгрому Косаўскага гарнізона 2 жніўня 1942 г. Падымаючы партызан у атаку ў час Бялавіцкага бою з карнікамі 2 лістапада 1943 г., аддалі сваё жыццё сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б Іван Іванавіч Баброў, камісар брыгады імя Панамарэнкі Канстанцін Дзям'янавіч Талочка, член Косаўскага падпольнага райкома камсамола Канстанцін Пятровіч Гардзейчык. Гераічнай смерцю ў баі з карнікамі ў кастрычніку 1943 г. загінулі камандзір партызанскага атрада № 112 Аляксей Пятровіч Чарткоў і камісар Міхаіл Фёдаравіч Паршын. Падпольшчыкі Раіса Пшанай і Пётр Рэвянькоў узарвалі ў Івацэвічах афіцэрскую сталовую, пад абломкамі якой знайшлі смерць 27 афіцэраў вермахта. Шмат выдатных баявых спраў на рахунку патрыёта Паўла Іванавіча Паўлоўскага з Воўчых Нораў, партызана атрада № 112, а затым групы Лінькова Сашы Каспяровіча з вёскі Быч і многіх іншых партызан і падпольшчыкаў.

У перыяд фашысцкай акупацыі пагроза знішчэння вісела над многімі сем'ямі патрыётаў. Таму сотні іх шукалі прытулак і збавенне ў лясах каля партызанскіх атрадаў. Партызанскім атрадам даводзілася

Лясная школа ў партызанскім лагеры, урочышча Хаваншчына.

ствараць спецыяльныя сямейныя лагеры, дзе размяшчаліся старыя і дзеці, і браць іх пад сваю ахову. У гэтых лагерах вялікая ўвага аддавалася дзецям. Для іх навучання адкрываліся лясныя школы. Такія школы дзейнічалі пры партызанскіх атрадах імя Калініна, імя Дзімітрова, імя Кірава.

Пры партызанскіх брыгадах і атрадах ствараліся таксама санітарныя часці і лясныя шпіталі. Часта без належнага аперацыйнага інструменту і абязбольваючых сродкаў партызанскія ўрачы і фельчары рабілі складанейшыя аперацыі. Партызану Раману Цыбульку, параненаму ў Косаўскім баі, ампутацыю нагі ўрач І. А. Парэцкі зрабіў звычайнай пілой. Шмат жыццяў выратаваў партызанскі ўрач У. М. Талкачоў. З павагай успамінаюць былыя партызаны і жыхары раёна партызанскіх урачоў К. І. Міхеткіна, Ф. І. Салаўя, В. А. Лакомцава, Е. С. Саета, П. А. Андрыянава, Мукасея, Герлінга, Смаленскага і іншых. Недахоп медыцынскіх сродкаў партызанскія медыкі кампенсавалі за кошт рэцэптаў народнай медыцыны і лясной аптэкі, якая давала шмат лекавых раслін. Дапамогу партызанам у здабыванні медыкаментаў аказвалі падпольшчыкі.

Вясной 1944 г., калі пад ударамі Чырвонай Арміі вораг вымушаны быў адступаць, падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі прымалі меры для наладжвання жыцця пасля выгнання акупантаў. Агульным клопатам стала паспяховае правядзенне веснавой сяўбы і забеспячэнне збору добрага ўраджаю. Каб засеяць усе сялянскія палеткі, да вяскоўцаў падключыліся партызаны; яны дапамагалі сялянам, асабліва ў спаленых вёсках, насеннем і рабочай жывёлай. Часта той вясной на палях за плугам можна было бачыць побач з сялянамі і людзей са зброяй за плячыма. Партызанская брыгада імя Дзяржынскага перадала сялянам вёсак Жытлін, Корачын, Уласаўцы, Зыбайлы, Яблонка, Козікі 300 пудоў ячменю, 150 пудоў аўса, 1500 пудоў бульбы. Брыгада «Савецкая Беларусь» перадала для пасеву 200 пудоў ячменю, 200 пудоў аўса, 1500 пудоў бульбы. Партызаны 8-й брыгады С. Г. Жуніна перадалі сялянам Целяханскай зоны 230 коней, якія былі выкарыстаны на веснавых палявых работах. Вясной сяўба ва ўсіх вёсках была праведзена паспяхова.

У 1944 г. Чырвоная Армія ажыццявіла шмат буйных аперацый па разгроме фашысцкіх войск і выгнанні іх з савецкай зямлі. Партызаны ў гэты перыяд таксама вялі цяжкія баі з карнікамі, разам з насельніцтвам перажывалі дні блакады. У маі 1944 г. у час карнай аперацыі мадзьярскіх часцей на зону Гута-Міхалінскага лесу партызаны праявілі мужнасць і адвагу, паўсюдна адбіваючы атакі карнікаў. Партызанскія атрады раёна прымалі ўдзел у Здзітаўскай абароне ў Бярозаўскім раёне. Яшчэ раней, 4 красавіка 1944 г., буйныя сілы карнікаў абрушыліся на партызан Жытлінскіх лясоў. Жыхары вёсак партызанскай зоны адышлі ў лясы пад прыкрыццё партызан. Мужна змагаліся з карнікамі партызаны брыгады імя Дзяржынскага, наносячы ворагу значныя страты.

Магутным быў удар партызанскіх атрадаў па чыгункі Брэст—Мінск у час «рэйкавай вайны» ў чэрвені 1944 г., напярэдадні Беларускай наступальнай

аперацыі «Баграціён». Участак чыгункі ад Даманава да Бярозы быў поўнасцю выведзены са строю. Разам з партызанамі іншых раёнаў быў нанесены ўдар па чыгунках Брэст—Пінск, Слонім—Баранавічы. Актыўны ўдзел у гэтых аперацыях прымалі 8-я і 99-я брыгады, якія прыбылі з усходніх раёнаў Беларусі. 8-я брыгада Жуніна толькі за адну ноч 20 чэрвеня знішчыла 758 рэек і тры кіламетры ліній сувязі.

Вынікі дзейнасці партызан супраць нямецкіх акупантаў былі даволі ўнушальныя. Прывядзём толькі некаторыя лічбы, якія сведчаць пра баявыя справы некаторых брыгад і атрадаў. Партызаны брыгады імя Панамарэнкі за перыяд яе існавання пусцілі пад адхон 442 эшалоны ворага, знішчылі 2796 рэек і 708 кіламетраў сувязі, разбілі 212 аўтамашын і 7 танкаў. Партызанская брыгада імя Дзяржынскага за час свайго існавання знішчыла пры аварыях 225 эшалонаў з жывой сілай, тэхнікай і ваеннымі матэрыяламі, 1819 вагонаў, платформаў і цыстэрнаў, 210 паравозаў, узарвала 4841 рэйку на чыгунцы. За кароткі час дзеянняў на тэрыторыі нашага раёна з 2 снежня 1943 г. да 12 ліпеня 1944 года партызанамі атрада імя Сільніцкага ў выніку дыверсій знішчана 27 варожых эшалонаў, 13 паравозаў і 100 вагонаў, падбіта з ПТР 98 паравозаў. Атрадам «Савецкая Беларусь» пушчаны пад адхон 226 эшалонаў, падарваны 90 аўтамашын, знішчана 13 гарнізонаў.

23 чэрвеня 1944 г., праз тры гады пасля пачатку вайны, часці трох Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў ва ўзаемадзеянні з войскамі 2-га Прыбалтыйскага і 1-га Украінскага франтоў разгарнулі грандыёзную стратэгічную наступальную аперацыю, якая завяршылася 29 жніўня поўным вызваленнем тэрыторыі Беларусі.

9—12 ліпеня разгарнуліся баі за вызваленне нашага раёна. Партызанскія атрады занялі пазіцыі, каб перарэзаць нямецкім войскам шляхі адыходу па найбольш бяспечных для іх маршрутах. Брыгада імя Панамарэнкі і дзеючыя побач з ёй атрады занялі рубяжы па лініі вёсак Заполле—Бялавічы—Альшаніца—Квасевічы—Ёдчыкі і перарэзалі шляхі для адступлення ворага праз Гута-Міхалінскі лес на Бронную Гару і Бярозу. Брыгада імя Дзяржынскага і суседнія партызанскія падраздзяленні перакрылі дарогі для выхаду акупантаў на Івацэвічы, а таксама на Пескі і Бярозу.

У другой палове ночы 8 ліпеня часці 146-га гвардзейскага стралковага палка вызвалілі вёску Сялец і раніцай разгарнулі наступленне на Мілавіды і Вольку. 9 ліпеня 295-ы стралковы полк вызваліў вёску Пагор'е, а 10 ліпеня — вёскі Доўгая і Рудня.

10 ліпеня часці 48-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр Г. М. Корчыкаў) 20-га стралковага корпуса 28-й арміі ва ўзаемадзеянні з 99-й партызанскай брыгадай імя Дз. Ц. Гуляева вызвалілі г.п.Целяханы і прадоўжылі наступленне на захад. У той жа дзень было вызвалена мястэчка Быцень, а таксама вёска Любішчыцы. Раніцай 11 ліпеня былі вызвалены вёскі Панкі і Яглевічы. У той жа дзень разгарнуліся баі за Івацэвічы, якія поўнасцю былі ачышчаны ад праціўніка 12 ліпеня.

11 ліпеня войскі 19-й механізаванай брыгады У. В. Яршова і 75-га самаходна-артылерыйскага палка палкоўніка П. Я. Карпенкі вызвалілі г. Косаў і вёскі Косаўскай зоны. У жорсткіх бітвах з ворагам загінулі многія тысячы воінаў-вызваліцеляў.

Радасна і ўрачыста сустракалі жыхары раёна воінаў Чырвонай Арміі. Вымучаныя фашысцкай няволяй, яны з надзеяй глядзелі ў будучыню. Але вораг быў яшчэ не дабіты, і больш сямі тысяч жыхароў раёна ўліліся ў рады Чырвонай Арміі,

прадоўжылі вызваленчы шлях. Больш за дзве тысячы з іх не вярнуліся дамоў, ляжаць у магілах на зямлі тых краін, якія выратавалі ад фашысцкага зняволення. У іх памяць у населеных пунктах раёна ўзведзены абеліскі, на іх залатымі літарамі выбіты імёны тых, хто аддаў сваё жыццё за свабоду роднай зямлі.

Незлічоны ўрон раёну нанеслі акупанты. Матэрыяльныя страты вылічваюцца дзесяткамі мільёнаў рублёў. Былі знішчаны ўсе прамысловыя прадпрыемствы, спалены тысячы жылых дамоў, забіты тысячы ні ў чым не вінаватых мірных жыхароў.

Пасля 12 ліпеня 1944 г. з небывалай сілай і энтузіязмам разгарнулася аднаўленне і далейшае развіццё разбуранай гаспадаркі.

М. Банасевіч.

Крывавы пачатак

Тады, у самым цяжкім 41-м, і пачаўся адлік тых пакутных 1418 дзён і начэй, якія цаной неймаверных ахвяр спакваля набліжалі да перамогі.

Пра тое, наколькі імклівым было наступленне ворага ў першыя дні вайны, сведчаць нешматлікія дакументы, данясенні, дзённікавыя запісы, якія захоўваюцца ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. У адным з такіх дакументаў мы знайшлі ўпамінанне пра Івацэвічы. Яго аўтар — ваеннаслужачы Макараў. Падзеі развіваліся настолькі імгненна, што Макараў (на жаль, у данясенні, выкананым алоўкам на лістку са звычайнага блакнота, воінскае званне Макарава не ўказваецца) ледзь паспяваў адлюстроўваць ход баявых дзеянняў. Кароткія запісы датаваны ўсяго трыма днямі, але ахопліваюць адлегласць ад Брэста да Баранавіч. Яны не могуць не хваляваць, таму мы прыводзім іх цалкам, гэтыя разведданясенні ў штаб 4-й арміі.

Разведзводка № 1. Штарм 4, узлесак на поўнач ад Запруд, на 20.00 22.6.41 г. Паслана ў 21.00 22.6.

1. Нямецкія войскі ў 4.00 22.6.41 адкрылі нечакана артпадрыхтоўку па Брэсту (па крэпасці і Паўднёвым гарадку). У 3.50 прайшлі першыя самалёты над Брэстам і ў 4.30 бамбілі Кобрын (аэрадром, ваенны гарадок).

2. Праціўнік фарсіраваў Буг у раёне Вялічкавічы (8 км на паўднёвы захад ад Волчына), у раёне Мухавец (5 км на поўдзень ад Брэста і ў 8.15, фарсіраваўшы Буг, заняў востраў крэпасці, а ў 10.00 заняў Матыкалы, Брэст.

У 4.30 вёў аўтаматычны агонь па Дубіцы, 4 км на поўнач ад Дамачава. У 17.30 у раёне Дамачава прарвалася група танкаў.

23.6.41. Размова з камандзірам кулямётнай роты мотапалка з Паўднёвага гарадка Брэст — адыходзілі, хто як мог, вывез 8 кулямётаў, з іх засталося тры.

Учора была затрымана аўтамашына з ваеннаслужачымі ў чырвонаармейскай форме. Калі падышлі да машыны, тыя, хто сядзеў у ёй, пачалі кідаць гранаты. Мною было загадана адкрыць агонь з ручнога кулямёта, у выніку людзі на машыне былі знішчаны. Аказаліся немцамі, пераапранутымі ў чырвонаармейцаў.

3. На працягу дня праціўнік бамбіў двойчы КП штаба 4-й арміі і часці арміі, адыходзячыя ад Кобрына на Івацэвічы. Авіяцыя праціўніка бамбіла і абстрэльвала разрыўнымі кулямі раён Кобрына, Картуз-Бярозу (запальваючымі бомбамі) і Івацэвічы. На поўдзень ад Пружан быў збіты нямецкі самалёт. Вывад: праціўнік у асноўным дзейнічае сваёй знішчальнай і бамбардзіровачнай авіяцыяй, часткова прымяняючы танкі.

Разведзводка № 2. Штарм 4, узлесак, 5 км на захад ад Сіняўкі, да 20.00 24.6.41.

Праціўнік на працягу дня 23.6., ведучы бой у асноўным знішчальнай і бамбардзіровачнай авіяцыяй, выкарыстоўваючы танкі, да зыходу дня выйшаў на рубеж Картуз-Бяроза.

24.6. З 6.00 да 10.00 праціўнік з перапынкамі бамбіў Баранавічы і рабіў налёты на калону часцей. Зенітнымі кулямётамі былі збіты два варожыя самалёты».

Вось і ўсё. На гэтым данясенні заканчваюцца. Дый ці да іх было ў тым, незразумелым не тое што салдатам, а і афіцэрам, хаосе, калі гітлераўцы, пакідаючы ў сваім тыле пазбаўленыя сувязі, без матэрыяльных часцей і харчовага забеспячэння роты, батальёны, палкі і дывізіі нашых байцоў, імкліва рваліся на ўсход.

Што сталася з аўтарам разведданясенняў Макаравым? Загінуў? Трапіў у акружэнне? А можа, падзяліўшы лёс тых некалькіх соцень абарваных ад шматдзённых блуканняў па лясах і балотах галодных салдат і афіцэраў, якія прабіваліся ў напрамку Пінска, назаўсёды застаўся ляжаць, як і яго таварышы па зброі, на невялічкім пятачку — ад Дабрынёва паміж Грыўдай і Шчарай і шашой Брэст—Масква.

А здарылася гэта, згодна з архіўнымі дакументамі, 30 чэрвеня 1941 года. Тады ад масіраваных удараў артылерыі, авіяцыі і танкаў загінулі дзвесце нашых байцоў. Аднак ці толькі дзвесце? Па ўспамінах дабрынёўцаў, сведак тых жудасных падзей, значна больш...

На многія пытанні пра падзеі тых дзён сёння цяжка адказаць. А вось перадаць расказы відавочцаў пра той бой каля Дабрынёва, бой не на жыццё, а на смерць, — наш святы абавязак.

ГОРБАЧ Вера Іосіфаўна, 1926 года нараджэння:

— Іх, нашых салдацікаў, у алешніку было вельмі многа, амаль пад кожным кустом ляжалі пасля таго бою. Звозілі потым іх вазамі за вёску, дзе былі ямы для бульбы. Ой, байцоў было многа, вінтовак больш за 200. Былі і паперкі, і фотаздымкі, і медальёны, але ці да іх тады было! Я кароў тады пасвіла, гадзін 12 дня было. Фронт ужо далёка быў, а нашы салдаты, што ў акружэнне трапілі, дзесьці ад Воўчых Нораў прабіваліся на пінскія балоты. Але не было ў іх правадніка, шмат патанула.

Добра помню, як наш аднавясковец па прозвішчу Гарбачык клаў па 10 чалавек на воз і звозіў да ямы, што была выкапана ля могілак. Калі б ведалі, што будзем пры савецкай уладзе жыць, хіба ж не захавалі дакументы? У мяне тры кнігі пра народную творчасць ад загінуўшых засталіся, дык маці сказала: «Прыйдзе Барысік, солтыс, і расстраляе». Спалілі нават іх.

КАЗЛЕНЯ Мікалай Мікалаевіч, 1934 года нараджэння:

— Алешнік каля дарогі, што на Даманава, да дамбы займаў тады 1,5—2 гектары. Тут і спыніліся нашы салдаты на прывал, пачалі гатаваць ежу. А ў вёсцы цыганка жыла, яна і пабегла ў Даманава на станцыю ды немцам паведаміла пра нашых. Тры дні потым збіралі целы байцоў.

ГОРБАЧ Канстанцін Пятровіч, 1930 года нараджэння:

— Я і сам дастаў з балота 12 чалавек. Дакументы ўжо заплылі вадой...

ЖУРКО Іосіф Мікалаевіч:

— Калі пачалася страляніна, пачалі рвацца снарады, салдаты нашы ў карчы схаваліся. А з боку станцыі ўжо танкі рушылі да іх...

ГОРБАЧ Ніна Якаўлеўна, 1924 года нараджэння:

— А да таго, як салдаты ў алешніку размясціліся, мой бацька дапамагаў ім перапраўляцца праз Грыўду. Зачапіў вяроўкай сваю чайку (лодку) і цягнуў...

ГОРБАЧ Мікалай Георгіевіч, 1925 года нараджэння:

— Было ўсё так. Тут блізка была цэлая армія, якую перахапілі немцы. Былі карты і маршрут адступлення на пінскія балоты. Фарсіравалі нашы салдаты Грыўду з Плехава і іншых хутароў. Бралі драўляныя шчыты, звязвалі абмоткамі і цягнулі імі — туды-сюды. Рака была шырынёй метраў да трыццаці. Днём ляталі фашысцкія самалёты, таму перапраўляліся толькі ноччу. Каля дарогі быў алешнік. Ішлі да яго адусюль: па дарозе, праз агароды, а салдатаў там было, як у тым мурашніку. У алешніку спыніліся на начлег. Цыганка заявіла, іх адразу ачапілі. Нашы на хацелі здавацца, спадзяваліся, што прарвуцца, а ў гітлераўцаў танкі, самалёты... З гармат ударылі, вёску

запалілі, людзі пачалі разбягацца. Можа гадзіны дзве ішоў бой. На другі дзень трэба было хаваць. Спёка такая стаяла. Пайшлі мужыкі, падлеткі. Помню, хавалі палкоўніка. Каго ў адну яму, каго ў другую. Хто так і застаўся на балоце, а хто — у полі. Скончылася вайна, каго дзе знайшлі — у труны склалі і на могілках пахавалі. Частку ў Даманава адсюль перавезлі. А загінула там не менш за паўтысячы, я ў гэтым запэўніваю.

ГОРБАЧ Вера Іосіфаўна:

— Мы ў той канец вёскі, што да Грыўды бліжэй, кароў выгналі, бо не было дзе пасвіць. Скрозь потым былі трупы — ад дарогі да рэчкі. Нізка самалёты ляталі, на стрэхах немцы кулямёты ўстанавілі, іншыя нас з разораў зганялі — у касках, з закасанымі рукавамі. Плач, енк стаяў усюды. Побач з намі чацвёра нашых салдат ляжалі, адзін гранату ў бок немцаў кінуў, нікога не забіла. Чацвярых іх і пранізалі штыкамі фашысты...

Мы стаім на ўскрайку дабрынёўскіх могілак. Дзе-нідзе віднеюцца зарослыя пагоркі і ямкі. Адсюль целы салдат выкопвалі і перавозілі ў Даманава. На мемарыяльнай пліце значыцца толькі пяцьдзесят невядомых, сярод якіх 41 салдат і 9 афіцэраў. 13 салдацкіх прозвішчаў мы знайшлі ў Падольскім архіве. А дзе астатнія?..

А. Велікаселец, В. Жывіневіч, М. Рымач.

Незабыўныя дні

З успамінаў Ф. А. Асташэнкі*

Герой Савецкага Саюза Фёдар Апанасавіч Асташэнка ў чэрвені 1941 г. удзельнічаў у першых баях Чырвонай Арміі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці ў якасці намесніка камандзіра 2-й Арлоўскай Чырванасцяжнай дывізіі.

...У пачатку чэрвеня 1941 года загадам па 4-й арміі я быў назначаны кіраўніком групы па рэкагнасцыроўцы другога рубяжа брэсцкіх апорных пунктаў. У яе склад уваходзілі памочнік начальніка штаба артылерыі дывізіі капітан В. Я. Чарткоўскі, падраздзяленне сапёраў, тапаўзвод армейскага артпалка, а таксама ўзвод станковых кулямётаў і стралковае аддзяленне для аховы маёмасці і дакументаў...

21 чэрвеня наша група знаходзілася ў в. Турная. Калі а пачатку пятай гадзіны раніцы 22 чэрвеня вартавы разбудзіў мяне і паведаміў, што на граніцы чуваць кананада і раздаюцца моцныя выбухі, я не сумняваўся, што пачалася вайна.

Аб'явіўшы трывогу асабоваму складу, загадаў падрыхтавацца да выхаду ў Брэст. Каля сямі гадзін раніцы мы дасягнулі скрыжавання шашэйных дарог у некалькіх кіламетрах на поўдзень ад мястэчка Чарнаўчыцы. Тут я сустрэў зборную групу байцоў, некалькі камандзіраў і грузавую машыну, на якой знаходзіліся раненыя...

... Пад вечар праціўнік выбіў нашу роту з Чарнаўчыц і заняў гэты населены пункт. З раёна Жабінкі чутны быў шум боя. Было ясна, што праціўнік выйшаў у наш тыл і пагражае акружэннем.

Мы рашылі адыходзіць уздоўж шашы на Жабінку, злучыцца з атрадам Козыра і там сумесна абмеркаваць план дзеянняў. Аднак атрад Козыра мы не знайшлі — Жабінка была ў руках гітлераўцаў. За 2—3 кіламетры на паўночны захад мы выявілі скопішча нашых танкаў. Гэта былі часці 22-й танкавай дывізіі...

У 23 ці 24 гадзіны прыбыў афіцэр сувязі 28-га корпуса, які перадаў вуснае распараджэнне камандзіра корпуса — падрыхтавацца разам з 22-й танкавай дывізіяй да наступлення раніцай 23 чэрвеня на Брэст. Афіцэр сувязі вельмі спяшаўся і ў заключэнне сказаў:

— Хутка атрымаеце пісьмовы загад камандзіра корпуса. З яго даведаецеся аб месцазнаходжанні корпуса.

Аднак ні я, ні камандзір танкавай дывізіі ніякага загаду не атрымалі ні ноччу, ні раніцай наступнага дня. Наступаць на Брэст нашымі сіламі без сувязі з часцямі корпуса і арміі, не маючы дакладна сфармуляванай задачы, мы, безумоўна, не маглі.

23 чэрвеня ў 8 гадзін раніцы ў размяшчэнне нашай абароны нечакана для нас па палявой дарозе заехала «эмка», у якой знаходзіліся тры немцы — разведчыкі. Палонныя паказалі,

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977. С. 115—122.

што іх дывізія з Жабінкі накіроўваецца ў Пружаны...

Генерал Пуганаў прыняў рашэнне ў 16.00 зняцца з пазіцый і, рухаючыся праз Кобрынскі аэрадром, выйсці на Маскоўскую шашу, абмінаючы горад, які да гэтага часу быў ужо заняты ворагам.

...Аэрадром выклікаў у нас прыгнечанае ўражанне. Мы не сустрэлі ні адной жывой душы, убачылі каркасы згарэўшых самалётаў, разбураныя і ахопленыя агнём казармы і склады. Ні паліва, ні боепрыпасаў, на жаль, не знайшлі.

З аэрадрома танкі пачалі рухацца па палявой дарозе праз вёску. Тут яны зноў сутыкнуліся з варожымі танкамі. Разгарэўся сустрэчны бой. Хутка да 50 самалётаў-пікіроўшчыкаў пачалі бамбіць нашы баявыя парадкі. У гэтым баі гераічна загінуў генерал-маёр Пуганаў і многія іншыя танкісты. Былі страты і сярод асабовага складу майго атрада.

...Каля 22 гадзін рушылі ў дарогу. Там даведаліся, што Пружаны заняты праціўнікам. Пасля невялікага прыпынку выступілі ў напрамку Малеч — Бяроза.

24 чэрвеня з узыходам сонца выйшлі да чыгункі на паўночны захад ад Малечы. Тут сустрэлі артполк 205 матарызаванай дывізіі. Камандзір палка паведаміў, што і Бяроза занята немцамі. Асноўныя сілы 205 мотадывізіі адыходзяць за раку Ясельду па мосце на поўнач ад мястэчка Сялец.

Услед за артпалком пайшоў мой атрад і атрад Конанава. Гадзін у 12 мы былі ўжо на паўночным беразе Ясельды. Пасля пераправы мост спалілі...

205 мотадывізія поўнасцю захавала сваю штатную арганізацыю. Камандаваў ёю вопытны і храбры камандзір — палкоўнік Ф. Ф. Кудзюраў. Да таго часу яна налічвала да 4000 байцоў, мой атрад — больш за 600 і атрад Конанава каля 400. Гэта ўжо была сіла...

Раніцай 25 чэрвеня Кудзюраў рашыў зняцца з абароны на Ясельдзе і рухацца на Ружаны — Слонім. Заставацца тут ужо не мела сэнсу — немцы былі ўжо далёка ўперадзе.

Каля 12 гадзін дня галаўны полк дывізіі выйшаў на шашу ў 2—3 кіламетрах на поўдзень ад Ружан; астатнія часці, у тым ліку мой атрад і атрад Конанава, былі на падыходзе. Над Ружанамі з'явіліся тры нашы бамбардзіроўшчыкі ТБ-3, пачалі бамбіць шашу, па якой рухалася мотапяхота праціўніка. Калона была рассеяна.

Адбамбіўшы, самалёты пачалі разварочвацца. У гэты час у паветры з'явіліся тры «месершміты» і, выкарыстаўшы тое, што бамбардзіроўшчыкі ляцелі без прыкрыцця, падпалілі іх...

Пасля бою стала ясна, што шлях на Слонім адрэзаны. Палкоўнік Кудзюраў з нашай агульнай згоды прыняў рашэнне рухацца ў напрамку Косава.

Пры падыходзе да горада ў 7 гадзін вечара мы ўстанавілі, што там знаходзіцца да батальёна варожай мотапяхоты з 3—5 танкамі. Мы выбілі іх з Косава... Раніцай 26 чэрвеня выступілі ў напрамку Масілавічы—Жыровічы. За гэтыя дні мой атрад значна павялічыўся.

Між тым праціўнік выявіў нас. Вырашана было з наступленнем вечара прарваць акружэнне ў паўднёвым напрамку, вывесці войскі ў вялікі лес, што ў 10—12 км на паўднёвы захад ад Быцені. Прарыў удаўся з параўнальна невялікімі стратамі. Рух такой вялікай масы войск без агнявых сродкаў быў вельмі цяжкім. Мы рашылі разбіць атрад на некалькі частак і пасля фарсіравання ракі Грыўды на ўчастку Івацэвічы — Даманава прабівацца праз пінскія балоты.

След вайны

24 чэрвеня 1941 г. адбыўся паветраны бой над тэрыторыяй Івацэвіцкага раёна, які вялі лётчыкі 212-га далёкабамбардзіровачнага палка. У гэтым баі, як сведчыць архіўная даведка, «загінуў экіпаж бамбардзіроўшчыка ў складзе лётчыка лейтэнанта Даўгаленкі І. М., стралка-бамбардзіра лейтэнанта Савенкава В.І. і стралка-радыста малодшага сяржанта Сінельнікава С.В.».

Падбіты самалёт упаў у раку Грыўда каля вёскі Даманава. Выпадкова жыхары вёскі Рыгор Зарэцкі і яго сын Уладзімір натыкнуліся на рэшткі самалёта ў рацэ Грыўда, а таксама на лётчыка, пры якім захаваўся планшэт з

І. М. Даўгаленка.

дакументамі. З іх стала вядома, што лётчыкам з'яўляўся Іван Мікалаевіч Даўгаленка, якому ў той час было толькі дваццаць дзевяць гадоў. Яго бацькаўшчына — вёска Бобрыкава Ровенскага раёна Варашылаўградскай вобласці, а архіўныя звесткі сведчаць, што І. М. Даўгаленка быў камандзірам звяна 212-га асобнага далёкабамбардзіровачнага палка.

Лётчык-герой пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Даманава. Астанкі ці якія-небудзь яшчэ сляды двух іншых членаў экіпажа знайсці не ўдалося.

Першыя партызаны Целяханшчыны

У кнізе «Партызанскія фарміраванні Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 — ліпень 1944)» паведамляецца, што асобны Целяханскі партызанскі атрад, які дзейнічаў з чэрвеня да верасня 1941 г., панёс у баях з карнікамі страты, асобныя групы яго спрабавалі выйсці за лінію фронта, і далейшы лёс іх невядомы. Камандзір атрада Уладзімір Іванавіч Квінта загінуў.

Гэта сціплая інфармацыя падштурхнула звярнуцца да ўспамінаў удзельнікаў тых падзей, каб аднавіць і пашырыць звесткі пра першых партызан Целяханшчыны.

Сталася так, што ў красавіку 1941 г. па прызыву ваенкамата мы аказаліся на будаўніцтве аэрадрома ў Кобрыне. Там і застала нас вайна. Толькі 25 чэрвеня мы дабраліся да сваёй вёскі Выганашчы. Праходзячы праз Целяханы, бачылі, што там няма ўжо прадстаўнікоў савецкай улады, але і не было яшчэ акупантаў. Супрацоўнікі раённых службаў, актывісты адышлі разам з часцямі Чырвонай Арміі. Сярод адыходзячых на ўсход быў і Андрэй Васілевіч Крываль. Вось што ён мне пазней расказаў:

— Я працаваў участковым міліцыянерам у Святавольскім сельсавеце Целяханскага раёна. Жыў у вёсцы Доўгая. Заставацца на акупіраванай тэрыторыі было небяспечна, таму рашыў адыходзіць на ўсход. Са мной пайшлі мае аднавяскоўцы Мікалай і Рыгор Козікі. Па шляху да нас далучыўся Васіль Макар з Любішчыц. Так мы дайшлі да райцэнтра Чырвоная Слабада. Тут 3 ліпеня пачулі прамову Сталіна. Многія партыйныя і савецкія работнікі ўспрынялі яе як загад да арганізацыі партызанскага руху. Мы вярнуліся ў сяло Леніна на Піншчыне, дзе знаходзіўся Пінскі абком партыі. Там і былі сфарміраваны першыя партызанскія атрады, у тым ліку і наш Целяханскі ў колькасці 25 чалавек. Камандзірам яго быў назначаны другі сакратар райкома партыі Уладзімір Іванавіч Квінта, яго намеснікам — загадчык раённай ашчадкасы Андрэй Антонавіч Хацкевіч. У атрад увайшлі адказныя работнікі раёна Шырокаў, Ананенка, Гуляеў, Бандарэнка, Асіповіч, Землянін і мясцовыя жыхары Васіль, Мікалай і Рыгор Козікі, Аляксандр Мініч, Трафім Сліж, Падашэўскі і я (прозвішчы астатніх не помню).

6 ліпеня 1941 г. на палутарцы мы адправіліся ў Целяханскі раён. Па дарозе натыкнуліся на калону немцаў, вымушаны былі знішчыць аўтамашыну і пешшу пайсці ў Целяханскія лясы. Першы свой лагер абсталявалі ва ўрочышчы Стойла на поўнач ад вёскі Доўгая. Тут наш атрад раздзяліўся на дзве групы. Квінта ўзяў з сабою былых ваенных — ураджэнцаў усходніх раёнаў і накіраваўся ў Клятнянскія лясы.

Наша група, якая складалася ў асноўным з мясцовых жыхароў, засталася на месцы. Яе ўзначаліў А. А. Хацкевіч. Неўзабаве да яе далучыліся мясцовыя жыхары, якія хаваліся ад фашыстаў: Міхаіл Басалай, Васіль Козік, браты Васіль, Міхаіл і Мікалай Стральчукі.

Мы апынуліся ў цяжкім становішчы: не было прадуктаў харчавання, не хапала зброі і боепрыпасаў, паліцэйскія сачылі за нашымі сем'ямі.

5 жніўня 1941 г. нам паведамілі сувязныя, што на нас рыхтуецца напад. У гэты час акупанты і паліцаі праводзілі кампанію па знішчэнні ў раёне камуністаў, актывістаў і яў-

рэяў. 6 жніўня яны схапілі ў полі нашага сувязнога Фёдара Басалая і прымусілі яго клікаць нас за прадуктамі, але мы на правакацыю не пайшлі. Тады карнікі рушылі ў лес і ў перастрэлцы паранілі Рыгора Васілевіча Козіка, а потым яго прыстрэлілі. Вярнуўшыся ў вёску, расстралялі яго жонку, жонку В. В. Козіка і брата Р. В. Козіка інваліда Аляксея. Пасля гэтых страт група Хацкевіча перайшла ў Крайскія лясы.

Амаль адначасова з налётам на групу Хацкевіча каля вёскі Доўгае быў здзейснены напад карнікаў на групу Квінта ў Клятнянскіх лясах. Гэта прымусіла групу перабрацца ва ўрочышча Вастваснаўка на поўдзень ад вёскі Гутка. Тут па наводцы здрадніка з Гуткі паліцаі і гітлераўцы падабраліся да партызанскага лагера і адкрылі агонь, паранілі Асіповіча і забілі Земляніна. Але партызан Ананенка кулямётным агнём адбіў атаку карнікаў і выратаваў групу, якая пасля гэтага таксама перабралася ў Крайскія лясы.

Пазней Квінта са сваёй групай пайшоў на ўсход. Група Хацкевіча раздзялілася на дзве. Сам ён адышоў у Ленінскі раён, а мы, мясцовыя, калі сціхлі рэпрэсіі, схавалі зброю і на зіму разышліся па вёсках, каб з вясны зноў уключыцца ў барацьбу.

Такім чынам, у верасні 1941 г. Целяханскі асобны атрад спыніў сваё існаванне.

А. М. Дурэйка.

Група Хацкевіча трапіла ў атрад «Пятровічы» Пінскага злучэння. У пачатку 1943 года А. А. Хацкевіч узначаліў падпольны Целяханскі райком КП(б)Б.

Уладзімір Іванавіч Квінта не загінуў. Яго група дабралася да Смаленскай вобласці і перад фронтам была рассеяна. Сам ён, паранены, трапіў у палон. Пасля вайны вярнуўся ў Целяханы, дзе працаваў старшынёй крухмалапатачнай арцелі, а затым дырэктарам Целяханскай МТС. Апошнія гады жыў у г. Слонім, дзе ў 1988 годзе памёр ва ўзросце 93 гадоў.

Такі лёс першых партызан Целяханшчыны 1941 года.

Г. Лукашэвіч.

Стварэнне і дзейнасць антыфашысцкага камітэта

СА СПРАВАЗДАЧЫ МІЖРАЁННАГА АНТЫФАШЫСЦКАГА «КАМІТЭТА БАРАЦЬБЫ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ» БРЭСЦКАМУ АБКОМУ КП(Б)Б АБ ДЗЕЙНАСЦІ КАМІТЭТА З 6 ВЕРАСНЯ 1941 г. ДА КАСТРЫЧНІКА 1942 г.

Не раней 19 чэрвеня 1943 г.

Згодна з рашэннем ЦК КП(б)Б тт. Урбановіч Іосіф Паўлавіч і Жышко Іван Іосіфавіч былі накіраваны ў Брэсцкую вобласць для стварэння падпольнай арганізацыі і арганізацыі партызанскай барацьбы ў тыле праціўніка.

З-за лініі фронту таварышы адправіліся 16 жніўня 1941 г. і прыбылі ў Ружанскі раён 6 верасня 1941 г... У Ружанскім раёне ствараецца падпольная арганізацыя на чале з раённым кіраўніцтвам: Урбановіч І.П., Жышко І.І. і Дурэйка А.М.

...У верасні 1941 г. адбылася сустрэча з тав. Крыштафовічам М.Е., старшынёй сельсавета Пружанскага раёна Брэсцкай вобл.; у лістападзе 1941 г. — з тав. Афанасьевым Е.М., начальнікам Камянецкага РА НКДБ Брэсцкай вобл., і Лапіным І.П., супрацоўнікам аддзялення НКДБ таго ж раёна, якія былі азнаёмлены з указаннем ЦК КП(б)Б аб рабоце ў тыле праціўніка і накіраваны ў свае раёны для правядзення работы па лініі падпольнай арганізацыі і стварэння партызанскіх атрадаў.

Разам з гэтым была пачата работа ў Шарашоўскім, Поразаўскім і Косаўскім раёнах.

У сувязі з павелічэннем маштаба работы, выхаду яе за межы раёна ў красавіку 1942 г. быў створаны «Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі» ў складзе: Урбановіч І.П. — сакратар камітэта, Афанасьеў Е.М. — начальнік асобага аддзела, Крыштафовіч М.Е. — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі, лейтэнант Журба А. — адказны за дыверсійную рабо-

ту, Жышко І.І. — член камітэта, інструктар. Задача камітэта — кіраўніцтва раённымі падпольнымі арганізацыямі, стварэнне партызанскіх атрадаў і кіраўніцтва імі.

Раённымі падпольнымі арганізацыямі была праведзена велізарная работа па ўзбраенні членаў арганізацыі, аказанні дапамогі партызанскім атрадам у іх узбраенні; па лініі дыверсійнай работы (разбурэнне сувязі, знішчэнне маёнткаў з хлебам і жывёлай), зрыву планаў вывазу людзей у Германію і адпраўкі харчавання немцам, па атраднай і франтавой разведцы, па знішчэнні здраднікаў Радзімы.

У Ружанскім раёне ў сучасны момант налічваецца да 170 членаў арганізацыі. Усе ўзброены, маюць 9 кулямётаў, 10 аўтаматаў, ППД, 30 СВТ. Арганізацыя аказала вялікую дапамогу ўзбраеннем, боепрыпасамі і ўзрыўчаткай партызанскім атрадам імя Дзімітрова, імя Кірава, імя Чкалава, атраду № 112...

...Косаўскі раён (сакратар тав. Трында, член раённага камітэта тав. Мініч). Арганізацыя налічвае 75 чалавек, 50 працэнтаў арганізацыі ўзброены.

Поразаўская і Косаўская арганізацыі, а таксама іх кіраўнікі Трында, Мініч, Радзюк, Паддубны актыўна працавалі па выкананні задач арганізацыі і ў асаблівасці па стварэнні партызанскіх атрадаў, іх узбраенні і забеспячэнні работы атрадаў.

Створаныя арганізацыі ў Слонімскім і Бярозаўскім раёнах перададзены па тэрытарыяльнасці, першая — Баранавіцкаму абкому КП(б)Б, другая —групе Новікава, які прысланы ЦК КП(б)Б па спецзаданні.

У выніку праведзенай раённымі падпольнымі арганізацыямі работы ў красавіку 1942 года створаны партызанскія атрады: атрад лейтэнанта Гарланава да 200 чал., лейтэнанта Борыса да 200 чал., атрад імя Дзімітрова да 200 чал., атрад Паддубнага да 170 чал., атрад Камбуратава да 100 чал., атрад імя Шчорса да 500 чал. і атрад Чарткова. Камітэт аказваў атрадам усямерную дапамогу, накіроўваў іх дзейнасць галоўным чынам па лініі дыверсій. Аднак, не маючы выбуховых рэчываў, атрады праводзілі дыверсіі прымітыўным спосабам (разбор лініі, падкоп шпал і інш.). З узмацненнем аховы дарогі гэты спосаб дыверсіі стаў выключна цяжкім, у выніку чаго за вясну 1942 г. атрадам удалося пусціць пад адхон толькі 20 эшалонаў. У сувязі з гэтай цяжкасцю атрады прыйшлося ў большасці сваёй выкарыстоўваць на засадах. За лета 1942 года атрадамі было знішчана 57 аўтамашын. Былі разгромлены гарнізоны праціўніка. 7 чэрвеня 1942 г. атрадам лейтэнанта Гарланава былі разгромлены жандармерыя, паліцыя, гміна ў в.Руднікі Пружанскага раёна. Тым жа атрадам быў знішчаны нямецкі пастарунак у в.Войтаў Мост Шарашоўскага раёна, атрадам імя Дмімітрова — паліцыя в.Шчытна Ружанскага раёна. 2 жніўня 1942 г. быў разгромлены гарнізон г.Косава. У бітве супраць гарнізона ўдзельнічалі тры атрады — імя Шчорса, імя Дзімітрова, імя Варашылава. Гарнізон быў поўнасцю знішчаны. Горад і наваколлі яго на працягу амаль месяца знаходзіліся ў руках партызан.

У жніўні—кастрычніку 1942 г. нямецкім камандаваннем супраць парзызан былі праведзены ваенныя аперацыі з вялікай колькасцю войск. Гэтыя аперацыі прывялі некаторыя атрады да раздзялення (атрад лейтэнанта Гарланава, лейтэнанта Борыса). Як вынік гэтага, частка партызан самавольна пайшла на ўсход. Выдзяліўся атрад імя Шчорса і таксама пайшоў на ўсход...

Восенню 1942 г. была ўстаноўлена магчымасць выкарыстання снарадаў для дыверсій на транспарце. Камітэт прымаў усе меры для максімальнага выкарыстання снарадаў, узмацнення дыверсійнай работы на чыгунках, умацавання партызанскіх атрадаў. Лік пушчаных пад адхон эшалонаў пачаў хутка расці.

У палавіне кастрычніка 1942 г. адбылася сустрэча тав. Жышко з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Ганенкам. Гэта быў першы вынік нашых працяглых і ўпартых намаганняў атрымаць сувязь з Заходнім фронтам, таму што без гэтага было выключна цяжка працаваць, тым больш кіраваць справай партызанскай барацьбы ў глыбокім тыле праціўніка. Праз некаторы час камітэт звязаўся з атрадам асобага прызначэння Ваенсавета Зах. фронта. Паводле дамоўленасці з камандзірам гэтага атрада камітэт пачаў працаваць сумесна з атрадам па кіраўніцтве партызанскімі атрадамі. Атрыманне хаця і нязначнай матэрыяльнай падтрымкі (тол, узрывальнікі) ад атрада асобага прызначэння і маральны ўплыў сувязі з Зах. фронтам спрыялі таму, што дыверсійная работа партызанскіх атрадаў стала больш эфектыўнай, палепшыліся дысцыпліна і парадак у атрадах.

Выраслі і ўзмацнелі партызанскія атрады: атрад «Савецкая Беларусь», якім камандаваў капітан Бабкоў, налічваў 424 чал., атрад імя Дзімітрова (камандзір тав. Дзмітрыеў) — 176 чал., атрад імя Кірава (кам. тав. Дарафееў) — 170 чал., атрад імя Чкалава (кам. тав. Масолаў) — 170 чал., атрад Чарткова — 30 чал., атрад Макарэвіча — 150 чал.

Разам з указанай вышэй работай камітэт надаваў выключна важнае значэнне друкаванай

прапагандзе. У той час, калі гебельсаўскае варыва ўсё больш і больш імкнулася пасеяць сярод людзей паніку, няўпэўненасць у вяртанні Савецкай улады, распаўсюджвала дзікую хлусню на СССР, трэба было супрацьпаставіць гэтаму шырокую бальшавіцкую прапаганду і агітацыю.

З першых дзён свайго існавання камітэт паставіў задачу — арганізаваць выдавецтва..., збіраць шрыфт і пішучыя машынкі і ўвогуле множыльныя апараты. За кароткі час была сабрана невялікая колькасць шрыфту, набыта пішучая машынка. Камітэт пачаў выдаваць матэрыялы на машынцы і ў друкарні...

Сакратар камітэта	УРБАНОВІЧ
Нач. асобага аддзела	АФАНАСЬЕЎ
Заг. аддзела прапаганды	КРЫШТАФОВІЧ
Член камітэта, інструктар	ЖЫШКО

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С. 565—569.

Камандны склад партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ П. К. ПАНАМАРЭНКІ

Дзейнічала на тэрыторыі Косаўскага, Бярозаўскага, Ружанскага і Слонімскага раёнаў. Створана ў чэрвені 1943 г. згодна з загадам па партызанскім злучэнні Брэсцкай вобласці з партызанскіх атрадаў імя Г. Дзімітрова, імя А. В. Суворава, імя С. М. Кірава, імя В. П. Чкалава, «Савецкая Беларусь», дыверсійнай групы М. Ф. Новіка. У ліпені — жніўні былі створаны партызанскія атрады імя Дз. Пажарскага (пазней А. І. Калупаева) і імя М. Ф. Гастэлы. 29 жніўня 1943 г. з яе былі выдзелены атрады імя А. В. Суворава, імя В. П. Чкалава, імя Дз. Пажарскага ў склад новай фарміруемай брыгады «Савецкая Беларусь».

Камандаванне брыгады: Урбановіч Іосіф Паўлавіч (чэрвень — ліпень 1943, в.а.), Сенькін Мікалай Уладзіміравіч (ліпень 1943 — ліпень 1944).

Камісары: Пацяруха Сцяпан Піліпавіч (чэрвень — ліпень 1943), Талочка Канстанцін Дзям'янавіч (верасень — лістапад 1943, загінуў), Крыштафовіч Мірон Емяльянавіч (лістапад 1943 — ліпень 1944).

Начальнікі штаба: Дарафееў Рыгор Кузьміч (ліпень — верасень 1943), Коваль Цімафей Спірыдонавіч (верасень 1943 — ліпень 1944).

11 ліпеня 1944 г. брыгада ў складзе атрадаў імя Г. Дзімітрова, «Савецкая Беларусь», імя Кірава, імя Гастэлы агульнай колькасцю 1537 партызан злучылася з Чырвонай Арміяй.

Атрад імя Г. Дзімітрова

Дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага, Ружанскага, Бярозаўскага раёнаў. Створаны ў красавіку 1942 г. на базе груп Дз. С. Дзмітрыева — М. І. Селюкова. У маі да атрада далучылася група А. Д. Масквіна, у лістападзе — група партызан з Бярозаўшчыны, якія раней былі ў атрадзе імя Варашылава. Да ліпеня 1943 г. дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 453 партызаны.

Камандзіры: Дзмітрыеў Дзмітрый Сямёнавіч (красавік — май 1942), Мірашнічэнка Іван Паўлавіч (чэрвень — верасень 1942), Дзмітрыеў Дзмітрый Сямёнавіч (верасень 1942 — снежань 1943), Сямёнаў Мікалай Дзмітрыевіч (снежань 1943 — ліпень 1944); камісары: Захараў Іван Раманавіч (ліпень — верасень 1942), Сямёнаў Мікалай Дзмітрыевіч (верасень 1942 — снежань 1943), Савін Фёдар Іванавіч (снежань 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Дзмітрыеў Дзмітрый Сямёнавіч (чэрвень — верасень 1942), Масквін Аляксей Дзмітрыевіч (верасень 1942 — чэрвень 1943), Талалуеў Аляксандр Сяргеевіч (чэрвень 1943 — ліпень 1944).

Ф. І. Савін.

Нараджэнне атрада

З успамінаў Дз. С. Дзмітрыева

Вечарам 13 красавіка 1942 г. мы з Мікітай Селюковым зайшлі на падворак Адама Філіповіча ў Косаве. Ён чакаў нас і запрасіў у хату. Моўчкі ў падпечку разгроб бульбу і выцягнуў адтуль напалавіну напоўнены рэчавы мяшок.

— Тут усё неабходнае на першы выпадак — бінокль, компас, тапаграфічныя карты, бялізна, нож, біклага...

Філіповіч быў членам Косаўскага антыфашысцкага камітэта і ўдзельнічаў у падрыхтоўцы выхаду людзей у лес. Мы з Селюковым (нам удалося ўцячы з палону) сталі членамі падпольнага камітэта. Жылі ў Косаве. Я працаваў поварам у турме, а Мікіта — у мясцовага святара званаром пры царкве. Адам Ануфрыевіч Філіповіч дапамог мне пашыць паўпаліто з салдацкага шыняля, а штаны, іншае адзенне і боты даў Антон Дылько, з якім я сябраваў.

Доўга ў доме Філіповіча мы не затрымаліся. Ён вывеў нас на ўскрай горада, адтуль мы выйшлі на дарогу, якая вяла ў Бялавічы.

На ўмоўленае месца мы прыйшлі раней прызначанага часу. Толькі пасля поўначы з'явіўся наш праваднік В. І. Казімірчык («Бяроза»). Ён прынёс дзве вінтоўкі, патроны ў процівагазавай сумцы, дзве гранаты РГД, плашч-палатку і вузялок з харчамі.

Помнік партызанам у Гута-Міхаліне.

Уладзімір перадаў нас па сувязі Якаву Казімірчыку («Якубу»), які вывеў на месца збору груп. Тут мы і сустрэлі раніцу 14 красавіка 1942 г. Мне ніколі не забыць гэту дату, бо яна лічыцца днём нараджэння нашага атрада. Праўда, на той дзень ён складаўся ўсяго з двух чалавек — мяне і Селюкова. Здарылася ж, што ні Віктара Радзюка, ні іншых груп мы не дачакаліся ні на наступны дзень, ні праз тыдзень. Прыйшлося зноў прабірацца ў Косава, каб разведаць абстаноўку. Адтуль накіраваліся на Скуратоўскія хутары. На хутары М. І. Юрэвіча набралі харчоў і раніцай 29 красавіка апынуліся ў невялікім лясочку паміж дарогамі Косава — Бялавічы і Косава — Гошчава каля смалакурнага завода. Адтуль трапілі, нарэшце, на хутар «Бярозы», які вывеў нас на сустрэчу з іншымі групамі.

30 красавіка мы, нарэшце, сабраліся разам. Было тут некалькі мясцовых жыхароў з вёсак Альшаніца, Бялавічы, Юрчыкі, Альба, Заполле, Квасевічы і іншых, але ў асноўным гэта былі былыя воіны Чырвонай Арміі, якія аказаліся на акупіраванай тэрыторыі. У іх ліку — Васіль Пятровіч Копцеў, у мінулым настаўнік, удзельнік першых пагранічных баёў, які атрымаў некалькі раненняў. Ён прайшоў праз фашысцкія лагеры і жыў пасля ўцёку з палону ў жыхара в. Альшаніца Іосіфа Кучука. З Заполля прыйшоў былы намеснік палітрука роты, які затым вырас да намесніка камісара партызанскай брыгады імя Панамарэнкі па камсамолу...

Мы асталяваліся ва ўрочышчы Стублы Гута-Міхалінскага лесу. У маі правялі агульны сход усіх партызан. Камандзірам атрада выбралі Івана Мірашнічэнку, які меў ваенны вопыт, быў вышэй па званні, удзельнічаў у фінскай вайне. Я стаў намеснікам Мірашнічэнкі, а Селюкоў — яго намеснікам па гаспадарчай частцы.

У чэрвені мы сабраліся ўсе разам зноў, каб даць назву свайму атраду. Па прапанове палітрука І. Р. Захарава партызаны аднадушна вырашылі прысвоіць атраду імя выдатнага балгарскага рэвалюцыянера Георгія Дзімітрова...

Атрад «Савецкая Беларусь»

Дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага, Быценскага, Слонімскага раёнаў. Створаны 1 верасня 1942 г. з партызан 53-й групы атрада імя Шчорса і групы П. І. Паўлоўскага з Воўчых Нораў. У лістападзе ў яго ўлілася група Я. Ф. Гусева (больш за 60 чалавек) з атрада імя В.І.Чапаева, у студзені 1943 г. — група Асея (26 чалавек) з атрада «Паддубнага». Да чэрвеня 1943 г. дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 530 партызан.

Камандзіры: Бабкоў Мікалай Уладзіміравіч (верасень 1942 — ліпень 1943), Уласаў Віктар Аляксеевіч (ліпень 1943 — ліпень 1944); камісары: Увядзенскі Мікалай Мікалаевіч (верасень — снежань 1942), Гусеў Якаў Фёдаравіч (студзень — лістапад 1943), Пыцель Георгій Дзмітрыевіч (лістапад 1943 — сакавік 1944), Жураўлёў Міхаіл Мяфодзьевіч (красавік — ліпень 1944); начальнікі штаба: Жураўлёў Міхаіл Мяфодзьевіч (верасень 1942 — красавік 1943), Сенькін Мікалай Уладзіміравіч (красавік — ліпень 1943), Васюк Пётр Дзмітрыевіч (ліпень 1943 — ліпень 1944).

Камандзір
З успамінаў П. В. Пранягіна

У паўночных раёнах вобласці акрамя атрада імя Суворава, накіраванага туды штабам злучэння, дзейнічала шмат іншых атрадаў. Самым буйным у тых месцах быў атрад «Савецкая Беларусь». Ён налічваў больш за 300 чалавек. Камандаваў ім Мікалай Уладзіміравіч Бабкоў. Сярод партызанскіх камандзіраў гэта была самая каларытная фігура. Ён вылучаўся як ростам, так і саліднасцю і, несумненна, сваімі камандзірскімі здольнасцямі і храбрасцю.

У атрадзе імя Шчорса, як я ўжо ўпамінаў, Бабкоў паявіўся ў ліпені 1942 г., пасля ўцёку з палону. Напачатку быў бледным, худым, ледзь трымаўся на нагах, але ў атрадзе стаў хутка набірацца сіл і пад канец таго ж месяца ўвайшоў у норму. Пасля ён удзельнічаў у Косаўскай і Гавенавіцкай баявых аперацыях, дзе зарэкамендаваў сябе з самага добрага боку, і я прызначыў яго намеснікам камандзіра 53-й групы.

Пасля вераснёўскай блакады з 53-й групы і часткі атрада імя Чапаева, якія засталіся ў ваўчанорскіх лясах, пры садзеянні Косаўскага антыфашысцкага камітэта быў утвораны атрад «Савецкая Беларусь», камандзірам якога і стаў Бабкоў. Пад яго кіраўніцтвам атрад правёў шмат буйных баявых аперацый. Слава аб атрадзе і яго камандзіры расла з кожным днём.

Атрад імя С. М. Кірава

Дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага, Ружанскага, Пружанскага, Бярозаўскага раёнаў. Сфарміраваны 23 лютага 1943 г. па ініцыятыве Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі» з асобных груп В. В. Янушкі («Паддубнага»), Іванова, С. І. Цвяткова, І. К. Дарафеева, А. А. Дьшлевіча і іншых, якія дзейнічалі ў Поразаўскім і Ружанскім раёнах. Да 19 ліпеня праводзіў баявыя аперацыі самастойна. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 325 партызан.

Камандзіры: Нішчанкоў Канстанцін Барысавіч (люты — май 1943, загінуў), Дарафееў Рыгор Кузьміч (май — ліпень 1943), Самуйлік Аляксандр Іванавіч (ліпень 1943 — ліпень 1944); камісары: Пачабутаў Аляксандр Фаміч (люты 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Дарафееў Рыгор Кузьміч (люты—май 1943), Кузняцоў Канстанцін Іванавіч (ліпень 1943 — ліпень 1944).

Арганізацыя атрада

З гісторыі партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі, складзенай партызанкай Ю.Кленкінай і праверанай камандзірам брыгады Сенькіным і нач. штаба Ковалем *

Калі ў верасні 1942 г. пачалася буйнейшая на Брэстчыне карная аперацыя нямецкіх акупантаў, партызанскія атрады імя Сталіна, імя Варашылава, імя Кірава разбіліся на дробныя групы па 10—15 чалавек, каб вырвацца з блакады Ружанскай пушчы і Гута-Міхалінскага лесу. Усе яны атрымалі загад пасля блакады вярнуцца на месца свайго размяшчэння. Але праз месяц у лістападзе 1942 г. на ўмоўленае

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. С. 307. Л. 41—47.

месца з'явіліся не ўсе групы. Адны з іх, выйшаўшы з блакады, пайшлі на ўсход да лініі фронту, другія ўліліся ў іншыя атрады.

23 лютага 1943 г. прадстаўнікі антыфашысцкага камітэта Урбановіч і Афанасьеў сабралі рэшткі атрадаў імя Кірава, імя Варашылава і імя Сталіна, і на іх базе быў створаны адзіны атрад імя Кірава. У яго ўвайшлі групы Паддубнага, Дарафеева, Цвяткова, Гарламава і іншыя. У пачатку арганізацыі атрад налічваў 75 чалавек. Яго камандзірам стаў Нішчанкоў Канстанцін Барысавіч (загінуў у маі 1943, па недарэчнасці быў застрэлены камандзірам спецгрупы Ліньковым). Узбраенне атрада было слабым — тры ручныя кулямёты, сем аўтаматаў, астатняе — трохлінейныя вінтоўкі. Але атрад разгарнуў баявую дзейнасць. Па даных на 1 чэрвеня 1943 г. яго байцы вялі адкрытыя баі, пусцілі пад адхон 10 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка.

Пасля гібелі Нішчанкова камандзірам атрада быў прызначаны Аляксандр Іванавіч Самуйлік, які да гэтага быў камандзірам роты ў атрадзе імя Дзімітрова.

А. І. Самуйлік — верны сын беларускага народа, з юнацкіх гадоў змагаўся за свабоду і незалежнасць Беларусі, за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, за што сядзеў у турмах панскай Польшчы. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі працаваў старшынёй сельскага Савета ў Іванаўскім раёне. У перыяд акупацыі актыўна ўключыўся ў барацьбу з фашысцкімі захопнікамі. У атрадзе імя Дзімітрова з дня яго арганізацыі быў байцом-падрыўніком, мінёрам, камандзірам групы, затым узвода і роты.

Стаўшы камандзірам атрада імя Кірава, перабудоўвае ўсю яго работу, накіраваўшы яе на больш актыўную баявую дзейнасць, наладжвае дысцыпліну. На рахунку атрада было шмат баявых спраў.

Атрад імя М. Ф. Гастэлы

Стаў фарміравацца на базе груп В. Р. Сіліча і М. Ф. Новіка, якія дзейнічалі па заданні ЦК КП(б)Б у Косаўскім і Слонімскім раёнах са студзеня 1943 г. У студзені камандзір групы В. Р. Сіліч загінуў, а яе асабовы склад уліўся ў групу М. Ф. Новіка. 19 ліпеня група М. Ф. Новіка ўвайшла ў склад партызанскай брыгады імя Панамарэнкі, да канца жніўня вырасла да 67 чалавек і была аформлена ў атрад імя М. Ф. Гастэлы. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 125 партызан.

Камандзіры: Кандрацьеў Рыгор Захаравіч (жнівень — лістапад 1943), Масквін Аляксей Дзмітрыевіч (лістапад 1943 — красавік 1944), Чэкан Мікалай Андрэевіч (красавік — ліпень 1944); камісар — Саўчанка Цімафей Іванавіч (жнівень 1943 — ліпень 1944); начальнік штаба — Дубін Павел Якаўлевіч (жнівень 1943 — ліпень 1944).

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»

Дзейнічала на тэрыторыі Косаўскага, Бярозаўскага, Ружанскага, Гайнаўскага, Камянецкага, Поразаўскага, Драгічынскага раёнаў.

Створана ў жніўні 1943 г. загадам па партызанскаму злучэнню Брэсцкай вобласці на базе атрадаў імя А. В. Суворава, імя В. П. Чкалава, імя Дз. Пажарскага (пазней імя А. І. Калупаева), вылучаных з брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Толькі ў верасні — снежні 1943 г. брыгада знішчыла больш за 60 аўтамашын, 21 эшалон ворага, больш за 750 рэек, 12 мастоў. У красавіку 1944 г. вяла цяжкія баі на Здзітаўскай пераправе. Пры спробе ворага авалодаць пераправай партызаны з 4 да 11 красавіка вялі абарончыя баі.

Пры падыходзе часцей Чырвонай Арміі брыгада ўстанавіла сувязь з войскамі 28-й арміі і 12 ліпеня 1944 г. злучылася з войскамі 197-га стралковага палка каля в. Няхачава агульнай колькасцю 863 партызаны.

Камандзір — Бабкоў Мікалай Уладзіміравіч (жнівень 1943 — ліпень 1944); камісар Масалаў Пётр Іванавіч (верасень 1943 — ліпень 1944); начальнік штаба — Дарафееў Рыгор Кузьміч (жнівень 1943 — ліпень 1944).

Атрад імя А. В. Суворава

У лютым 1942 г. каля г. Баранавічы ваеннаслужачымі, якія не выйшлі з варожага тылу, была арганізавана партызанская група на чале з А. Л. Лявонцьевым. У маі 1942 г. яна прыбыла ў Буленскі лес, дзе злучылася з групай П. Агнёва і была ўключана як 54-я група ў

атрад імя М. А. Шчорса. У красавіку 1943 г. згодна з загадам штаба партызанскага злучэння Брэсцкай вобласці 54-я група ператворана ў самастойны партызанскі атрад імя А. В. Суворава. У чэрвені — жніўні 1943 г. дзейнічаў у складзе брыгады імя П. К. Панамарэнкі, са жніўня — у брыгадзе «Савецкая Беларусь». На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 297 партызан.

Камандзіры: Лявонцьеў Андрэй Лявонцьевіч (красавік — чэрвень 1943), Машын Васіль Рыгоравіч (чэрвень — ліпень 1943, в.а.), Казакоў Канстанцін Емяльянавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944), Серы Іван Дзяменцьевіч (ліпень 1944); камісары: Казакоў Канстанцін Емяльянавіч (красавік — ліпень 1943), Болтрык Мікалай Мікалаевіч (ліпень 1943 — люты 1944), Аксёнаў Іван Рыгоравіч (люты — сакавік 1944, в.а.), Серы Іван Дзяменцьевіч (сакавік — чэрвень 1944), Дакучаеў Мікалай Георгіевіч (ліпень 1944); начальнікі штаба: Машын Васіль Рыгоравіч (красавік — ліпень 1943), Баранаў Фёдар Мікалаевіч (ліпень — снежань 1943), Лаўрэнцьеў Валянцін Уладзіміравіч (снежань 1943 — ліпень 1944).

Атрад імя В. П. Чкалава

Арганізаваны 4 сакавіка 1943 г. па ініцыятыве Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі» з асобных партызанскіх груп П. І. Масалава, С. Г. Бокшы, «Віктара», Х. Камуратава, Я. Г. Беражняка, якія дзейнічалі ў Косаўскім, Ружанскім, Пружанскім раёнах. Баявыя аперацыі да ліпеня ажыццяўляў самастойна. З 19 чэрвеня да 28 жніўня 1943 г. ў складзе брыгады імя П. К. Панамарэнкі, са жніўня — у брыгадзе «Савецкая Беларусь».

На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 237 партызан.

Камандзіры: Масалаў Пётр Іванавіч (сакавік — жнівень 1943), Астроўскі Сяргей Захаравіч (лістапад 1943 — май 1944), Каленнікаў Якаў Ксенафонтавіч (чэрвень — ліпень 1944); камісары: Камуратаў Хрыстафор (сакавік — чэрвень 1943, загінуў), Беражняк Якаў Гур'евіч (ліпень 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Храбрых Мікалай Захаравіч (сакавік — ліпень 1943, загінуў), Сцяпанаў Мікалай Сяргеевіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944, загінуў), Задора Пётр Кузьміч (чэрвень — ліпень 1944).

Атрад імя А. І. Калупаева

Утвораны 27 ліпеня 1943 г. у брыгадзе імя Панамарэнкі з партызан выдзеленых атрадам «Савецкая Беларусь». Да 5 красавіка 1944 г. — атрад імя Дз. Пажарскага, затым яму прысвоена імя камандзіра атрада А. І. Калупаева, які загінуў у сакавіку 1944 г.

Група партызан атрада імя А. І. Калупаева брыгады «Савецкая Беларусь».

Партызаны атрада імя А. П. Чарткова вывучаюць трафейную гармату.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 289 партызан.

Камандзіры: Калупаеў Аркадзь Ісакавіч (ліпень 1943 — красавік 1944, загінуў), Вінаградаў Барыс Мікалаевіч (сакавік — ліпень 1944); камісары: Талочка Канстанцін Дзям'янавіч (ліпень — жнівень 1943), Вінаградаў Барыс Мікалаевіч (жнівень 1943 — сакавік 1944), Кляцоўка Рыгор Максімавіч (сакавік — ліпень 1944); начальнікі штаба: Коваль Цімафей Спірыдонавіч (ліпень — верасень 1943), Кляцоўка Рыгор Максімавіч (верасень 1943 — сакавік 1944), Раманенка Уладзімір Іларыёнавіч (красавік — ліпень 1944).

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ Ф. Э. ДЗЯРЖЫНСКАГА

Дзейнічала на тэрыторыі Косаўскага, Бярозаўскага, Целяханскага раёнаў.

Створана ў снежні 1943 г. згодна з загадам штаба партызанскага злучэння Брэсцкай вобласці на базе асобных атрадаў імя В. М. Молатава, імя М. І. Калініна, імя М. Ф. Сільніцкага. Адначасова быў арганізаваны атрад імя А. П. Чарткова. Брыгада вяла баі з ворагам, ратавала насельніцтва ад знішчэння і вывазу на катаргу. Толькі ў ліпені — жніўні 1943 г. атрады, якія ўвайшлі ў брыгаду, пусцілі пад адхон 20 эшалонаў, падарвалі 3 чыгуначныя і 12 шасэйных і дарожных мастоў, 25 аўтамашын. У красавіку 1944 г. брыгада ўдзельнічала ў Здзітаўскай абароне і баях з гітлераўцамі ў час іх карнай аперацыі супраць партызан Жытлінскай зоны. 12 ліпеня 1944 г. брыгада ў складзе 1040 партызан злучылася з Чырвонай Арміяй.

Камандзір — Манахаў Васіль Міхайлавіч (снежань 1943 — ліпень 1944); камісар — Кавалёў Павел Рыгоравіч (снежань 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Баранаў Фёдар Мікалаевіч (снежань 1943 — май 1944), Жураўлёў Аляксандр Рыгоравіч (май — ліпень 1944).

Атрад імя В. М. Молатава

Сфарміраваны ў красавіку 1942 г. як 112-ы атрад каля в. Хадакі Косаўскага раёна з груп былых ваеннаслужачых, якія ўзначальвалі А. П. Чарткоў, П. І. Клюеў, М. Г. Арцёменка. У ліпені да яго далучыўся атрад В. М. Манахава, які быў створаны ў жніўні 1941 года з жыхароў Пескаўскага сельсавета Бярозаўскага раёна і трапіўшых у акружэнне ваеннаслужачых. У кастрычніку 1942 г. атраду прысвоена імя В. М. Молатава. Да снежня 1943 г. дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 250 партызан.

Камандзіры: Чарткоў Аляксей Пятровіч (красавік 1942 — кастрычнік 1943, загінуў), Манахаў Васіль Міхайлавіч (кастрычнік — снежань 1943), Зорын Сяргей Мікалаевіч (снежань 1943 — ліпень 1944); камісары: Бяляеў Фёдар Аляксандравіч (кастрычнік 1942 — люты 1943), Коўтун Макар Іванавіч (красавік — чэрвень 1943), Паршын Міхаіл Фёдаравіч (чэрвень — кастрычнік 1943, загінуў), Белякоў Іван Міхайлавіч (кастрычнік 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Манахаў Васіль Міхайлавіч (ліпень 1942 — кастрычнік 1943), Лапацін Віктарын Васілевіч (кастрычнік — снежань 1943), Гусеў Аркадзь Сямёнавіч (снежань 1943 — студзень 1944), Адаменка Іван Яўлампіевіч (студзень — ліпень 1944).

Атрад імя А. П. Чарткова

Утвораны ў снежні 1943 г. з асабовага складу, які быў выдзелены атрадам імя В. М. Молатава. Актыўна дзейнічаў на камунікацыях ворага, у адкрытых баях з карнікамі. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 226 партызан.

Камандзір — Лапацін Віктарын Васілевіч (снежань 1943 — ліпень 1944); камісары: Качаргін Генадзь Іосіфавіч (снежань 1943 — сакавік 1944), Церашэнкаў Іван Міхайлавіч (сакавік — ліпень 1944); начальнікі штаба: Церашэнкаў Іван Міхайлавіч (снежань 1943 — сакавік 1944), Залесаў Іван Лаўрэнцьевіч (сакавік — ліпень 1944).

Атрад імя М. І. Калініна

Пачаў фарміравацца ў лютым 1943 г. з рэзерву сямейнай групы атрада імя В. П. Чкалава. У маі 1943 г. група загадам па партызанскаму злучэнню Брэсцкай вобласці арганізацыйна афармлена ў атрад. Да снежня дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 216 партызан.

Камандзіры: Кавальскі Пётр Мамертавіч (май — снежань 1943), Ляпічаў Фрол Карнеевіч (снежань 1943 — ліпень 1944); камісар — Бяляеў Фёдар Аляксандравіч (май 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Кашталян Іван Паўлавіч (май 1943 — красавік 1944), Арцёменка Макар Рыгоравіч (красавік — ліпень 1944).

Атрад імя М. Ф. Сільніцкага

Арганізаваны ў жніўні 1943 г. па распараджэнні БШПР з асабовага складу, які выдзелены атрадамі імя М. Ф. Сільніцкага 25-й брыгады імя П. К. Панамарэнкі і імя С. М. Кірава 37-й брыгады імя А. Я. Пархоменкі Мінскай вобласці.

У верасні 1943 г. перадыслацыраваўся ў Брэсцкую вобласць і быў уключаны ў склад партызанскага злучэння. Да снежня дзейнічаў самастойна, а затым быў уключаны ў брыгаду імя Ф. Э. Дзяржынскага. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 159 партызан.

Камандзіры: Чарнышоў Іван Ігнатавіч (жнівень — снежань 1943), Шчарбакоў Мікалай Якаўлевіч (снежань 1943 — ліпень 1944); камісары: Сіняўскі Мікалай Іванавіч (жнівень 1943 — студзень 1944), Гусеў Аркадзь Сямёнавіч (студзень — май 1944), Круглоў Васіль Іванавіч (май — ліпень 1944); начальнікі штаба: Дарагаўцаў Уладзімір Аляксеевіч (жнівень 1943 — студзень 1944), Круглоў Васіль Іванавіч (студзень — май 1944), Верашчагін Васіль Лаўрэнцьевіч (май — ліпень 1944).

8-я ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Дзейнічала на тэрыторыі Ганцавіцкага, Целяханскага, Быценскага, Косаўскага раёнаў.

Створана ў снежні 1943 г. у Магілёўскай вобласці (Круглянскі раён) згодна з распараджэннем БШПР на базе атрадаў 36, 12, 40, 15-га. У снежні 1943 г. — студзені 1944 г. здзейсніла рэйд у Ганцавіцкі, затым Косаўскі раёны, дзе ўвайшла ў склад Брэсцкага злучэння. Паводле задач, пастаўленых аператыўнай групай пры ваенным савеце 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, дзейнічала ў тыле ворага. Наносіла ўдары па камунікацыях, зрывала ваенныя перавозкі, скоўвала манеўры войскаў 2-й нямецкай арміі. Толькі ў красавіку — чэрвені 1944 г. партызаны падбілі 71 аўтамашыну ворага, знішчылі 5 мастоў на чыгункі Брэст — Баранавічы, падарвалі і пашкодзілі 27 нямецкіх эшалонаў. У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. ў працэсе «рэйкавай вайны» штурмам захапілі чыгуначны ўчастак каля ст. Косава-Палескае і падарвалі больш за 750 рэек.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 9—11 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 1146 партызан.

Камандзір брыгады — Жунін Сяргей Георгіевіч; камісар — Пятроў Васіль Аляксеевіч (снежань 1943 — ліпень 1944); начальнік штаба — Мацеж Канстанцін Іванавіч (снежань 1943 — ліпень 1944).

99-я ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ ДЗ. Ц. ГУЛЯЕВА

Створана ў студзені 1943 г. ў Глускім раёне Мінскай вобласці. У снежні 1943 г. — студзені 1944 г. перадыслацыравана ў Целяханскі раён і дзейнічала на тэрыторыі Косаўскага, Целяханскага, Іванаўскага і Лагішынскага раёнаў. У красавіку 1944 г. удзельнічала ў баях з карнікамі на р. Ясельда. На Агінскім канале партызаны брыгады пабудавалі пераправу і ўтрымлівалі яе да падыходу Чырвонай Арміі. Разам з часцямі Чырвонай Арміі ўдзельнічала ў вызваленні Целяхан і в. Краглевічы. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 19 ліпеня 1944 г. у складзе трох атрадаў колькасцю 415 партызан (атра-

Група камандзіра складу 99-й партызанскай брыгады імя Дз. Ц. Гуляева.

ды імя К. Я. Варашылава, М. Ц. Грабко, імя Н. Н. Воранава).

Камандзіры брыгады: Кулікоўскі Іван Міхайлавіч (студзень — люты 1943), Чайкоўскі Андрэй Ціханавіч (люты — верасень 1943), Якавенка Уладзімір Кірылавіч (верасень 1943 — ліпень 1944); камісары: Чайкоўскі Андрэй Ціханавіч (люты — верасень 1943 і верасень 1943 — ліпень 1944), Панцялеенка Мікалай Канстанцінавіч (сакавік — верасень 1943); начальнікі штаба: Сярэдзін Васіль Максімавіч (люты 1943 — студзень 1944), Каракулін Васіль Мікалаевіч (студзень — ліпень 1944).

АСОБНЫЯ ПАРТЫЗАНСКІЯ АТРАДЫ

Партызанскі атрад імя М. А. Шчорса

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Косаўскага, Пружанскага, Ружанскага, Бярозаўскага, Быценскага, Целяханскага, Слонімскага і іншых раёнаў. Арганізаваны ў маі 1942 г.

У ліпені 1941 г. у Быценскім раёне ўтварылася партызанская група з ваеннаслужачых і мясцовых патрыётаў на чале з А. В. Фідрыкам (загінуў) і Р. А. Дудко. Неўзабаве сюды прыбыла група ваеннаслужачых пад кіраўніцтвам П. В. Пранягіна. Восенню абедзве групы аб'ядналіся пад кіраўніцтвам П. В. Пранягіна. У маі 1942 г. група Пранягіна і групы Федаровіча, Ф. Казанцава, М. Вазнясенскага і А. Л. Лявонцьева, якія дзейнічалі ў Косаўскім і Слонімскім раёнах, аб'ядналіся ў партызанскі атрад імя М. А. Шчорса. Летам 1942 г. налічваў 534 партызан. Меў на ўзбраенні акрамя аўтаматаў і вінтовак каля 40 кулямётаў, гармату. У маі — жніўні 1942 г. пусціў пад адхон некалькі эшалонаў ворага. За час існавання атрада партызаны знішчылі 10 прадпрыемстваў, складоў, 12 вузлоў сувязі, разгромілі 17 гарнізонаў, паліцэйскіх участкаў, управ, у тым ліку ў ноч на 3 жніўня 1942 г. з атрадамі імя Дзімітрова і імя Варашылава гарнізон у г.Косаве, 1 верасня камендатуру ў в.Чамялы і мост цераз раку Шчару. 11 верасня правялі бой на 10-м шлюзе Агінскага канала. На чыгунках партызаны атрада падарвалі 127 эшалонаў ворага, 1062 рэйкі, 33 масты.

Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 30 сакавіка 1944 г. у складзе 340 партызан.

Камандзіры атрада: Пранягін Павел Васілевіч (май 1942 — красавік 1943), Канавалаў Міхаіл Пятровіч (красавік — верасень 1943), Гужэўскі Віктар Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — сакавік 1944); камісары: Дудко Рыгор Андрэевіч (май — ліпень 1942), Кавалёў Павел Рыгоравіч (жнівень — лістапад 1942), Авецісян Аруцюн Самсонавіч (лістапад — снежань 1942, в.а.), Жарыкаў Сцяпан Сяргеевіч (снежань 1942 — люты 1943), Ягораў Сяргей Ягоравіч (люты — красавік 1943), Рэва Рыгор Якаўлевіч (красавік — лістапад 1943), Несцярэнка Васіль Аляксандравіч (лістапад 1943 — сакавік 1944); начальнікі штаба: Мерзлякоў Карп Емяльянавіч (май 1942 — красавік 1943), Гужэўскі Віктар Фёдаравіч (красавік — кастрычнік 1943), Зуеў Дзмітрый Ягоравіч (лістапад 1943 — сакавік 1944).

113-ы партызанскі атрад

Дзейнічаў на тэрыторыі Быценскага і Целяханскага раёнаў.

Створаны ў маі 1942 г. з ваеннаслужачых-акружэнцаў і ўцёкшых з палону. У маі — чэрвені 1942 г. партызаны ачысцілі большую частку Быценскага раёна ад жандарскіх і паліцэйскіх пастоў, валасных управ. Праводзілі дыверсіі на чыгуначным участку Івацэвічы —

Быцень. 1 верасня 1942 г. група партызан (20 чалавек) удзельнічала з атрадам імя Шчорса ў разгроме камендатуры ў в. Чамялы і знішчэнні моста цераз Шчару. У верасні — кастрычніку 1942 г. атрад вёў баі з карнікамі, уз'яднаўся з атрадам В.А.Васільева.

Камандзіры: І. Кулакоў (загінуў), А. Шмакаў, І. С. Качамараў; камісары: А. Шмакаў, Ф. Ф. Сметкін.

113-ы асобны атрад

Дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага, Быценскага, Целяханскага, Ганцавіцкага раёнаў. Сфарміраваны ў кастрычніку 1942 г. як дыверсійны з партызан, вылучаных 112-м атрадам. У чэрвені 1943 г. быў расфарміраваны, частка партызан перададзена асобнаму дыверсійна-разведвальнаму атраду І. П. Топкіна, асноўны склад уліўся ў атрад В. М. Молатава. У дзень расфарміравання налічваў 90 партызан.

Камандзір — Арцёменка Макар Рыгоравіч (кастрычнік 1942 — ліпень 1943); камісар — Качаргін Генадзь Іосіфавіч (кастрычнік 1942 — ліпень 1943); начальнік штаба — Церашанкоў Іван Міхайлавіч (кастрычнік 1942 — ліпень 1943).

Асобны атрад І. П. Топкіна

Дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага, Быценскага, Целяханскага, Бярозаўскага, Слонімскага раёнаў.

У верасні 1942 г. штаб Заходняга фронту дэсантаваў у Косаўскім раёне дыверсійна-разведвальную групу (38 чалавек) пад камандаваннем капітана Топкіна І. П. Тут яна папоўнілася мясцовымі жыхарамі і аформілася ў атрад, які праводзіў баявыя дзеянні на чыгуначных участках Брэст — Баранавічы, Брэст — Пінск. У кастрычніку 1942 г. — чэрвені 1943 г. каардынаваў дыверсійна-разведвальную дзейнасць партызанскіх атрадаў «Савецкая Беларусь», імя Дзімітрова, імя Молатава, 113-га і іншых. У ліпені 1944 злучыўся з Чырвонай Арміяй.

Камандзіры: Топкін Іосіф Піліпавіч (верасень 1942 — ліпень 1943), Алісейчык Васіль Васілевіч (люты 1943 — ліпень 1944); камісары: Алісейчык Васіль Васілевіч (верасень 1942 — люты 1943), Цвяткоў Васіль Апанасавіч (люты 1943 — ліпень 1944).

Асобны Целяханскі атрад

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Целяханскага раёна. Створаны ў пачатку ліпеня 1941 г. з партыйна-савецкага актыву Целяханскага раёна і мясцовых жыхароў. Атрад дзейнічаў да верасня 1941 г., у баях з карнікамі панёс значныя страты. Асобныя групы спрабавалі выйсці за лінію фронту. Далейшы іх лёс невядомы.

Камандзір — Квінта Уладзімір Іванавіч (загінуў).

Асобны атрад імя К. Я. Варашылава

Дзейнічаў у Косаўскім і Бярозаўскім раёнах. Створаны ў маі 1942 г. па ініцыятыве Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі» з партызанскіх груп Л. Р. Здановіча, былога члена КПЗБ, ваеннаслужачых на чале з І. С. Зайковым, членаў Блудзенскай падпольнай камсамольскай арганізацыі і іншых. Партызаны атрада ўдзельнічалі ў аперацыях на чыгунцы і шашы, у Косаўскім баі 2 жніўня 1942 г. У жніўні — верасні 1942 г. ў баях з карнікамі ў час карных аперацый «Міхель» і «Балотная ліхаманка» атрад быў рассеяны. Асноўная частка яго складу выйшла ў Пінскую вобласць, дзе ўлілася ў атрад імя В. І. Чапаева. Частка яго байцоў улілася ў атрад імя Г. Дзімітрова. У верасні 1942 г. атрад налічваў 69 партызан.

Камандзір — Зайкоў Іван Сцяпанавіч (май — верасень 1942); камісар — Муштарыеў Харыс (май — верасень 1942).

Асобны атрад імя І. В. Сталіна

Летам 1941 г. у Ружанскім раёне з мясцовых жыхароў арганізаваліся групы партызан пад кіраўніцтвам М. Е. Крыштафовіча і В. Ф. Місюлі. Хутка сюды прыйшлі групы ваеннаслужачых, якія выходзілі з акружэння пад камандаваннем А. Журбы, П. І. Масалава, Ф. П. Гарланава, Р. К. Дарафеева і іншых. Згодна з рашэннем Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі» ў маі 1942 г. гэтыя групы аб'ядналіся ў атрад, якому далі імя Сталіна. Да канца месяца ён вырас да 125 партызан. Партызаны вялі баі па ліквідацыі варожых гарнізонаў, праводзілі дыверсіі на дарогах. Пасля баёў з карнікамі ў час блакады восенню 1942 г. дзейнічаў асобнымі групамі, якія затым уліліся ў атрады «Савецкая Беларусь», імя С. М. Кірава, імя В. П. Чкалава.

Камандзір — Галаванаў Фёдар Паўлавіч; камісар — Масалаў Пётр Іванавіч; начальнік штаба — Дарафееў Рыгор Кузьміч.

Асобны атрад імя М. І. Кутузава

4 жніўня 1943 г. па заданні ЦК КП(б)Б у Любанскі раён Мінскай вобласці прыбыла арганізатарская група Т. А. Шунько. У верасні яна перадыслацыравалася ў Бярозаўскі раён. 17 лістапада папоўнілася асабовым складам, які выдзеліла брыгада «Савецкая Беларусь», і аформілася ў самастойны партызанскі атрад імя М. І. Кутузава. Атрад дзейнічаў у Косаўскім, Бярозаўскім і іншых раёнах. Злучыўся з Чырвонай Арміяй 11 ліпеня 1944 г. у колькасці 107 партызан.

Камандзір — Машын Васіль Рыгоравіч; камісар — Шунько Тарас Андрэевіч; начальнік штаба — Паленаў Леанід Іванавіч.

Атрад імя В. І. Чапаева

Дзейнічаў на тэрыторыі Косаўскага і Быценскага раёнаў. Створаны ў студзені 1942 г. з разрозненых груп ваеннаслужачых. З красавіка 1942 г. вёў актыўную дзейнасць па ліквідацыі варожых гарнізонаў і ўпраў 10 жніўня 1942 г. сумесна з атрадам імя Шчорса разграміў гарнізон і кулямётную школу ў в. Гавенавічы Быценскага раёна. У жніўні — верасні вёў баі з карнікамі 1-й мотапяхотнай брыгады СС, правёў 6 цяжкіх і працяглых баёў у акружэнні, знішчыў 421 салдата праціўніка. З акружэння выходзіў асобнымі групамі. Група на чале з Я. С. Гусевым (больш за 60 чалавек) улілася ў асобны атрад «Савецкая Беларусь», другая на чале з М. С. Фядотавым выйшла ў Пінскую вобласць і ўлілася ў партызанскую брыгаду імя Леніна. У верасні 1942 г. у атрадзе было 207 чалавек.

Камандзір — Фядотаў Мікалай Сцяпанавіч; камісар — Гусеў Якаў Фёдаравіч; начальнік штаба — Мулаянаў Галімзан Мулаянавіч.

Асобны атрад імя Р. І. Катоўскага (другога складу)

Дзейнічаў у Антопальскім, Дзівінскім, Косаўскім раёнах.

Сфарміраваны ў маі 1944 г. на базе разведвальнай і дыверсійнай груп, якія дзейнічалі ў тыле ворага пасля злучэння ў сакавіку 1944 г. асноўных сіл асобнага атрада імя Р. І. Катоўскага з часцямі Чырвонай Арміі. Дзейнічаў да ліпеня 1944 г. у складзе 91 партызана.

Камандзір — Пазднякоў Іван Іванавіч; камісар — Касымаў Камэн Мірсалікавіч; начальнік штаба — Бураў Аляксандр Фёдаравіч.

Арганізатары і кіраўнікі партызанскага і антыфашысцкага руху ў раёне

ДЗМІТРЫЕЎ Дзмітрый Сямёнавіч, нарадзіўся 6 ліпеня 1914 г. у беднай сялянскай сям'і ў с. Цернаўка Кастрычніцкага раёна Нікалаеўскай вобласці. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Івацэвіцкім раёне. У 1936 — 1938 гг. служыў у войсках МВД. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939 — 1940 гг. На другі дзень Вялікай Айчын-

най вайны быў прызваны ў дзеючую армію і ўдзельнічаў у баях пад Смаленскам. Кантужаны, трапіў у палон. Калі везлі ў Германію, уцёк з поезда каля в. Няхачава Івацэвіцкага раёна і дабраўся да в. Гошчава. Уладкаваўся на работу ў турэмную сталовую ў Косаве. У кастрычніку 1941 г. звязаўся з мясцовым падполлем і рыхтаваў былых ваенных да пераходу ў партызаны. 13 красавіка 1942 г. з групай патрыётаў пайшоў у лес, дзе быў начальнікам штаба партызанскага атрада, з верасня 1942 г. — камандзірам. У сувязі з раненнем і хваробай у студзені 1944 г. адпраўлены самалётам на лячэнне ў Маскву. Пасля лячэння Брэсцкі абком КП(б)Б накіраваў Дз. С. Дзмітрыева намеснікам старшыні Косаўскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

ЖУНІН Сяргей Георгіевіч, нарадзіўся ў Калінінскай вобласці 18.8.1906 г. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай і Брэсцкай абласцях. Герой Савецкага Саюза. У Чырвонай Арміі з 1928 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім фронце. З ліпеня 1941 г. у партызанах: арганізатар атрадаў у Круглянскім і Шклоўскім раёнах. Камандзір 8-й партызанскай брыгады. У 1943 г. здзейсніў рэйд у Брэсцкую вобласць, дзейнічаў на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна. У 1944—1950 гг. на савецкай рабоце ў Брэсце і Мінску. Памёр 27 студзеня 1977 г.

КАВАЛЁЎ Павел Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1905 г. на хутары Мокрая Яльмута Пралетарскага раёна Растоўскай вобласці. Адзін з кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці. З 1925 г. у органах НКУС. У партызанах з чэрвеня 1942 г.: з жніўня 1942 г. камісар партызанскага атрада імя М.А.Шчорса, з красавіка 1943 г. — партызанскага атрада імя С. М. Будзёнага, у снежні 1943 г. — ліпені 1944 г. — партызанскай брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага, адначасова член Ганцавіцкага, у чэрвені — ліпені 1944 г. сакратар Косаўскага падпольнага райкомаў КП(б)Б. Пасля вайны П.Р.Кавалёў на партыйнай і гаспадарча-адміністрацыйнай рабоце. Памёр 11 лістапада 1974 г.

КОЛТУН Мікалай Харытонавіч, нарадзіўся 15 жніўня 1903 г. у в. Хадакі Івацэвіцкага раёна. Адзін з арганізатараў партызанскага атрада 112-ы (пазней імя А. П. Чарткова). Член

Дз. С. Дзмітрыеў.



М. Х. Колтун.



М. Е. Крыштафовіч.

КПЗБ з 1927 г. Адбываў пакаранне ў польскіх турмах за рэвалюцыйную дзейнасць. З верасня 1939 г. да ліпеня 1941 г. — старшыня Жытлінскага сельсавета. У кастрычніку 1941 г. з яго ўдзелам створана першая партызанская група на Жытліншчыне, якая да вясны 1942 г. выросла ў партызанскі атрад. Быў начальнікам разведкі атрада 112-ы, а затым спецгрупы Ліньков. Пасля вызвалення раёна працаваў інструктарам і намеснікам старшыні райвыканкома, старшынёй калгаса, старшынёй сельсавета.

КРЫШТАФОВІЧ Мірон Емяльянавіч (падпольная мянушка «Кузьма»), нарадзіўся ў в. Піняны Пружанскага раёна 18.8.1899 г. Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці ў Айчынную вайну. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1925 — 1929 гг. зняволены ў турму. У 1931—1935 гг. вучыўся ў Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцей Захаду ў Маскве. У 1935—1938 гг. сакратар Гродзенскага, Навагрудскага, Беластоцкага, Слонімскага, Брэсцкага акруговых каміт-



Мемарыяльная дошка К. Дз. Талочку ў в. Падстарынь.

тэтаў КПЗБ, інструктар ЦК КПЗБ. У Айчынную вайну з 1941 г. у партызанах; з верасня 1941 г. сакратар Пружанскага антыфашысцкага камітэта, з мая 1942 г. загадчык аддзела Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі», з ліпеня 1943 г. нам. сакратара Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта; адначасова з лістапада 1943 г. камісар партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. З ліпеня 1944 г. старшыня Пружанскага райвыканкома. У 1947—1961 гг. старшыня і нам. старшыні Брэсцкага аблвыканкома. Ганаровы грамадзянін г. Брэста. М. Е. Крыштафовіч памёр 10 мая 1985 г.

МАНАХАЎ Васіль Міхайлавіч, нарадзіўся 15.7.1915 г. у с. Мардоўскія Паркі Мардоўскай АССР. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім фронце. У партызанах з ліпеня 1941 г.: камандзір групы, са жніўня 1941 г. — атрада, у снежні 1943 г. — ліпені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага. У 1944—1975 гг. на савецкай і гаспадарчай рабоце. В.М.Манахаў памёр 25 лістапада 1988 г.

СЕНЬКІН Мікалай Уладзіміравіч, нарадзіўся 22.12.1917 г. у в. Шчыпань Рагнедзінскага раёна Бранскай вобласці. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці. З 1938 г. у Чырвонай Арміі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939 — 1940 гг. У партызанах з верасня 1942 г.: камандзір узвода, начальнік штаба атрада, у ліпені 1943 г. — ліпені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. З 1944 г. старшыня Высокаўскага райвыканкома, у Брэсцкім аблвыканкоме. Памёр у 1976 г.

ТАЛОЧКА Канстанцін Дзям'янавіч, нарадзіўся ў 1903 г. у в. Падстарынь Івацэвіцкага раёна. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднойчы арыштаваны польскімі ўладамі. У 1939—1941 гг. старшыня Івацэвіцкага пасялковага Савета. У партызанах з ліпеня 1941 г.: камандзір групы, камісар атрада, у верасні — лістападзе 1943 г. камісар партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Загінуў у баі 1 лістапада 1943 г. каля в.Бялавічы. Яго імем названы вуліцы ў Івацэвічах і в. Быцень Івацэвіцкага раёна.

УРБАНОВІЧ Іосіф Паўлавіч (падпольная мянушка «Максім»), нарадзіўся 3.4.1907 г. у в. Шэйпічы Пружанскага раёна. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці. З 1930 г. сакратар Баранавіцкага, Брэсцкага акруговых камітэтаў КПЗБ. У 1931—1934 гг. за рэвалюцыйную дзейнасць уладамі буржуазнай Польшчы зняволены ў турму. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі старшыня Ружанскага пасялковага Савета. Са жніўня 1941 г. у тыле ворага. Адзін з арганізатараў раённых антыфашысцкіх арганізацый, сакратар Ружанскага раённага антыфашысцкага камітэта, ініцыятар стварэння, з 1942 г. сакратар Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі», які ў 1943 г. рэарганізаваны ў Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт. У чэрвені — ліпені 1943 г. камандзір партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Арганізатар разгрому гарнізона ў Косаве 2.8.1942 г. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 20.7.1944 г.

Яго імем названы вуліцы ў Косаве, Пружанах і Ружанах, у в. Варанілавічы. На магіле І. П. Урбановіча ў Гута-Міхаліне, а таксама ў Ружанах пастаўлены помнікі.

ЧАРТКОЎ Аляксей Пятровіч, нарадзіўся ў 1920 г. у Лухавіцкім раёне Маскоўскай вобласці. 15 чэрвеня 1941 г. скончыў Калінкавіцкае ваеннае вучылішча і ў званні лейтэнанта быў накіраваны на заходнюю граніцу. З першых дзён вайны ўдзельнічаў у баях з акупантамі. Трапіў у палон, здзейсніў пабег і з групай байцоў прыйшоў у Ружанскую пушчу, затым каля вёскі Корачына злучыўся з мясцовай групай патрыётаў. Патрыёты арганізавалі партызанскі атрад пад назвай 112-ы. А. П. Чарткоў быў выбраны камандзірам атрада. У кастрычніку 1943 г. у баі з карнікамі каля вёсак Гутава і Крэмна Драгічынскага раёна загінуў. Пасля яго гібелі атрад 112-ы стаў звацца атрадам імя А. П. Чарткова. Імем героя названы калгас на Жытліншчыне, вуліца ў Івацэвічах.

І. П. Урбановіч.

А. П. Чарткоў.

ЯКАВЕНКА Уладзімір Кірылавіч, нарадзіўся 12.4.1919 г. у Жытомірскай вобласці. Адзін з удзельнікаў партызанскага руху на Брэстчыне. У 1939—1941 гг. у Чырвонай Арміі. У партызанах з лістапада 1941 г.: камандзір узвода, атрада, а з верасня 1943 г. камандзір партызанскай брыгады 99-й імя Гуляева, якая дзейнічала на Целяханшчыне да ліпеня 1944 г.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА 4-ГА ПАСЯДЖЭННЯ МІЖРАЁННАГА АНТЫФАШЫСЦКАГА «КАМІТЭТА БАРАЦЬБЫ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ» БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

19 ліпеня 1942 г.

4. Слухалі тав. Жышко аб знішчэнні хлеба з ураджаю 1942 г. у нямецкіх маёнтках і іншых нямецкіх хлебазаводах. Тав. Жышко ўказаў на тое, што ў былых маёнтках немцы прымусілі сялян засеяць усю зямлю, а таксама ўся зямля былых асаднікаў абнасеена. Гэты хлеб будзе звозіцца ў маёнткі, і нашай баявой задачай з'яўляецца знішчыць гэты хлеб, які прызначаны нямецкай дзяржаве. Акрамя гэтага, на тэрыторыі Брэсцкай вобласці ёсць многа смалакурняў і маслазаводаў, якія эксплуатуюцца на карысць немцаў і якія трэба знішчыць.

Пастанавілі: Ва ўсіх былых маёнтках, куды немцы звязуць хлеб, увогуле ўвесь хлеб спаліць, а таксама знішчыць або вывесці са строю ўсе смалакурні, маслазаводы і іншыя прадпрыемствы, якія эксплуатуюцца немцамі. Выкананне гэтага задання ўскласці на партызанскія атрады і групы, а таксама на раённыя камітэты падпольных арганізацый.

5. Слухалі тав. «Максіма» (Урбановіч І. П. — *Рэд.*) аб арганізацыі дыверсійных груп з членаў падпольнай арганізацыі ў кожным раёне. Тав. «Максім» указаў на рост падпольнай арганізацыі і на ўсе магчымасці накіраваць работу арганізацыі на дыверсіі, а таму неабходна стварыць у кожным раёне дыверсійныя групы.

Пастанавілі: Абавязаць сакратароў райкомаў стварыць у кожным раёне дыверсійныя групы. Кожнай групе асобна давесці план работы. На кожную праведзеную работу скласці акт і прадставіць камітэту...

Сакратар «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі» «МАКСІМ»

Загадчык аддзела агітацыі і прапаганды «КУЗЬМА»

З БАЯВОГА ЖУРНАЛА КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ ДЗІМІТРОВА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ ПРА БАЯВУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ АТРАДА З 27 МАЯ ДА 11 ЛІСТАПАДА 1942 г. (ПАВОДЛЕ ЗАПІСАЎ У БАЯВЫМ ЖУРНАЛЕ АТРАДА)

27—28 мая. Разбіта на Ваўкавыскай шашы аўтамашына. Забіта 6 немцаў. Выканаўцы: камандзір Сямёнаў, група 6 чал.

20—23 чэрвеня. Разабраны пуці, пушчаны пад адхон эшалон з грузам; рух спынены на 2 сутак на чыгункі Нурэц — Чаромха. Выканаўцы: Івойлаў і Ісаеў.

20—25 ліпеня. Спалена смалакурня ў в. Нядзелька Ружанскага раёна. Выканаўцы: група Ягорава (4 чал.).

25—26 ліпеня. На тэрыторыі Косаўскага раёна парэзана 2 км тэлефоннай сувязі на лініях Косава — Няхачава, Косава — Івацэвічы, Косава — Бронная Гара. Выканаўцы: група Ягорава (5 чал.).

27—28 ліпеня. Спалены два масты на шашы Косава — Няхачава. Выканаўцы: група Масквіна (10 чал.).

1—2 жніўня. Спалены мост на дарозе Косава — Бронная Гара цераз р. Жэгулянка. Выканаўцы: група Тубельцава (4 чал.).

2—3 жніўня. Боем захоплены г. Косава. Знішчаны гарнізон (60 немцаў і 150 паліцэйскіх). Вораг пакінуў горад. Спалена смалакурня. Выканаўцы: партызаны атрада разам з атрадамі імя Шчорса і імя Варашылава.

12—13 жніўня. Узяты нарыхтаваныя немцамі на млыне 400 пудоў жыта ў Косаве; астатняе збожжа раздадзена сялянам; на скурзаводзе ўзяты воз шкур. Выканаўцы: партызаны пад кіраўніцтвам штаба.

17—18 жніўня. На Косаўскім млыне змолата для атрада 400 пудоў жыта; астатняя мука раздадзена сялянам.

27—28 жніўня. На чыгуначным перагоне Бронная Гара — Картуз-Бяроза пушчаны пад адхон цягнік ворага; узарваны пуці, выведзены са строю паравоз і 3 вагоны, рух спынены на 16 гадзін. Выканаўцы: камандзір Ягораў, група 16 чал.

8—9 верасня. Забрана ў Косаўскім млыне 700 пудоў збожжа і раздадзена сялянам. Выканаўцы — партызаны атрада на чале са штабам.

26 верасня—11 лістапада. На вузкакалейцы Любяшоў—Іванава захоплены эшалон з сельскагаспадарчымі прадуктамі і праведзены партызанамі пад чырвоным сцягам 40 км па тыле ворага. Збожжа раздадзена сялянам. Эшалон з 5 вагонамі скінуты ў р. Піну. Рух на чыгунцы спынены на 48 гадзін. Выканаўцы: дыверсійная група Ягорава.

27—29 кастрычніка. На дарозе Міхалін — Сялец спалены мост на р. Ясельда даўжынёй 103 м. Выканаўцы: Група Муштарэева (10 чал.).

23—30 кастрычніка. На чыгунцы Слонім — Баранавічы пушчаны пад адхон эшалон з жывой сілай паміж раз'ездамі Альберцін і Іса; разбіты 1 паравоз і 2 вагоны, колькасць ахвяр не ўстаноўлена; рух спынены на 24 гадзіны. Выканаўцы — 1-я дыверсійная група камандзіра Голдышава, мінёр Пукемаў.

29—30 кастрычніка. На дарозе Гута — Міхалін Косаўскага раёна ўзрывам разбіта 1 аўтамашына, у час бою забіта 10 немцаў, узяты 1 кулямёт, 8 вінтовак і дакументы, 1 немец узяты ў палон. Выканаўцы: камандзір Сямёнаў, група 12 чалавек.

У гэты перыяд пад прозвішчам Ягораў жыў Самуйлік Аляксандр Іванавіч, будучы камандзір атрада імя Кірава.

З ДЗЁННІКА КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ Г. ДЗІМІТРОВА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ ПРА БАЯВУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ У ЖНІЎНІ — ЛІСТАПАДЗЕ 1943 г.

24 жніўня 1943 г. Знішчаны эшалон на ўчастку Бронная Гара — Бяроза ў 21 гадзіну; разбіты паравоз, 12 платформаў з аўтамашынамі, 2 платформы з самалётамі і 20 вагонаў з ваеннай маёмасцю. Рух спыніўся на 21 гадзіну. Вызначыліся мінёры Серада і Ткач, партызаны Емяльянаў, Собаль, Бянько.

3 верасня 1943 г. Скінуты пад адхон эшалон з ваеннай маёмасцю на перагоне Няхачава — Івацэвічы. Выканала група Ката, мінёр Спіцын, байцы Кавалевіч, Гоган, Шыманчык, Голуб.

11 верасня 1943 г. На перагоне Бронная Гара — Бяроза перарваны эшалон; адарвана 10 вагонаў. Камандзір групы Губараў, мінёр Серада, байцы Бянько М., Собаль І., Бянько А., Емяльянаў, Брум, Банасевіч...

21 верасня — 30 кастрычніка 1943 г. Знішчана ваеннай сувязі 9,5 км на шашы Брэст — Масква (Кобрынскі раён). Камандзір групы Ільін, байцы Волкаў, Гоган, Міхальчук, Аляксееў, Собаль, Ярчак, Шытаў, Макаранка.

14 кастрычніка 1943 г. У 11.00 на ўчастку Бронная Гара — Няхачава адбыўся ўзрыў міны. Разбіты паравоз, 1 вагон з вайсковай маёмасцю, 1 паражняк. Рух спынены на 12 гадзін. Камандзір аддзялення Герасімаў, мінёр Спіцын, байцы Кавалевіч, Гоган, Шыманчык, Андрыяшка.

1 лістапада 1943 г. У 6.30 на ўчастку Бронная Гара—Бяроза-Картузская ўзрывам было знішчана 50 рэек. Выканаўцы: камандзір узвода Фёдараў, партызаны Гардзейчык, Віткоўскі, Шуляк, Гусеў, Фёдараў.

13 лістапада 1943 г. На шашы Брэст—Масква на ўчастку Галіцы—Бармуты ў 13.00 узарвана аўтамашына. Выканаўцы: камандзір аддзялення Віктар Скарына, байцы Барушка, Бурвін, Карпенка, Каракоў, Кузьмар.

18 лістапада 1943 г. У 23.00 на шашы Брэст—Пінск мінаю ўзарвана легкавая машына паміж ст. Драгічын і мяст. Драгічын. Камандзір аддзялення Выскрабенцаў, мінёры Купракоў, Юрашчын.

22 лістапада 1943 г. На шашы Брэст—Масква была падарвана машына. Выканаўцы: камандзір аддзялення Скарына Віктар, байцы Барушка, Бурвін, Карпенка, Каракоў, Кузьмар.

23 лістапада 1943 г. На шашы Брэст—Масква ў 15.00 адбыўся ўзрыў, у выніку чаго разбіта машына. Выканаўцы: камандзір аддзялення Гардзейчык, байцы Ігнаценка, Ткачэнка, Казімірчык, Рудзько.

З КНІГІ ЎЛІКУ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА 112-га БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ З КРАСАВІКА ДА ЛІСТАПАДА 1942 г.

Атрад арганізаваўся ў красавіку 1942 года. Заснавальнікамі атрада з'явіліся 7 чалавек, якія да арганізацыі атрада займаліся ўзбраеннем і барацьбой з дробнымі групамі паліцыі, солтысамі і т.п. У красавіку месяцы налічвалася 30 чалавек, у маі — 70 чалавек. Затым аб'ядналіся з атрадам Манахава В.М., у якім знаходзілася 55 чалавек. Усе былі ўзброены (3 кулямёты, астатнія вінтоўкі і дастатковая колькасць патронаў). Атрад павялічыўся да 130 чалавек. У атрадзе арганізавалі партыйную і камсамольскую арганізацыі, якія займаліся сумесна з камандаваннем згуртаваннем атрада. У чэрвені месяцы 35 чалавек пайшлі на ўсход, нягледзячы на нашы ўказанні працаваць у глыбокім тыле. Атрад зноў папоўніўся да той жа колькасці. У жніўні месяцы для сувязі з цэнтрам была паслана на ўсход група, у канцы жніўня ўдалося звязацца з дэсантнай групай, накіраванай у наш раён, якая ўзяла атрад у падпарадкаванне і разбіла на два атрады. Зброяй і боепрыпасамі атрад (у цэнтралізаваным парадку) ніадкуль не папаўняўся —карысталіся трафейным...

Камандзір атрада ЧАРТКОЎ
Нач. штаба атрада МАНАХАЎ

АПЕРАЦЫІ, ПРАВЕДЗЕНЫЯ АТРАДАМ

Дата	Месца аперацыі	Што зроблена	Хто кіраваў і ўдзельнічаў
25.5. 1942	Брэст-Маскоўская чыг., раён Картуз-Бярозы Брэст-Маскоўская чыг.	Пушчаны пад адхон варожы эшалон, разбіта 20 вагонаў з боепрыпасамі	Манахаў В.М., Качарын І.
27.5. 1942	паміж ст. Івацэвічы – Косаў	Пушчаны пад адхон варожы эшалон. Разбіта 20 вагонаў з вугалем і 10 вагонаў з боепрыпасамі	Бяляеў Ф.А.– кам., Арлоў С., Шчукін, Андрыяшка П., Пытляк В., Пытляк М., Кубанаў, Гаўрылаў, Брутаў Г., Лысенка І., Петчанка, Часновіч, Аляксееў, Макар, Міхайлаў, Каралёў, Лапацін, Боцін, Дзянісаў, Піскун.
31.10. 1942	Паміж ст. Лясная – Даманава	Пушчаны пад адхон варожы эшалон, разбіта 8 цыстэрнаў з бензінам	Арлоў С.Д. – кам., байцы: Іваноў, Аляксееў, Давыбараў, Каспяровіч С., Бяршкоў.
9.9. 1942	Паміж ст. Івацэвічы – Быцень	Пушчаны пад адхон варожы эшалон. Разбіта 35 вагонаў, з іх 10 вагонаў з аўтамашынамі	Арлоў, Іваноў, Салаўёў, Шчукін.

Дата	Месца аперацыі	Што зроблена	Хто кіраваў і ўдзельнічаў
10.9. 1942	У раёне ст. Няхачава Брэст-Маскоўскай чыг.	Узарвана чыгунка	Чарткоў А. П. – кам., Гусеў, Гаўрылаў, Міхайлаў.
29.9. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. паміж ст. Косава – Івацэвічы	Пушчаны пад адхон варожы эшалон. Разбіта 40 вагонаў з аўтамашынамі, з іх 13 з прадуктамі, 10 платформаў з танкамі	Манахаў В. М –кам., Салаўёў, Бутаў, Каспяровіч С., Фамін Д.
5.10. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. паміж ст. Косава – Бронная Гара	Пушчаны пад адхон варожы эшалон: 20 вагонаў з вугалем, 9 з жывой сілай, 6 з боепрыпасамі.	Манахаў – кам., Салаўёў, Андрыяшка П., Плаксін, Каспяровіч С., Каспяровіч І.
19.10. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. паміж ст. Няхачава – Івацэвічы	Знішчаны поўнасцю састаў з цыстэрнамі	Салаўёў – кам., Андрыяшка, Плаксін, Лапацін, Якімаў, Каспяровіч С, Баюшкін.
21.4. 1942	У р-не Антопаля	Пушчаны пад адхон варожы эшалон, разбіты 1 вагон, 7 вагонаў сышлі з рэек. Рух затрыманы на 2 сутак	Зорын – кам., Кубанаў, Лапшын, Міхайлаў.
27.10. 1942		Пушчаны пад адхон варожы эшалон, разбіты 1 паравоз, 26 вагонаў з вугалем	Зорын – кам., Кубанаў, Паршын, Пашкоў, Ганзюк, Пытляк, Кастылёў.
18.10. 1942	У раёне в. Быч	Пушчаны пад адхон эшалон з жывой сілай. Разбіты паравоз, 2 вагоны з жывой сілай	Салаўёў – кам., Плаксін, Каспяровіч С., Лапацін, Андрыяшка, Баюшкін, Якімаў.
16.11. 1942	У раёне ст. Даманава	Пушчаны пад адхон эшалон з вугалем. Разбіты 2 паравозы, 7 вагонаў	Зорын – кам., Кубанаў, Мельнікаў, Ганзюк, Кастылёў.
23.11. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. 965-ы км	Пушчаны пад адхон варожы эшалон, разбіты 1 паравоз, 2 платформы, затрыманы рух на 24 гадзіны	Каспяровіч І.
17.11. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. у раёне ст. Даманава	Пушчаны пад адхон эшалон, разбіты 2 вагоны	Арлоў.
23.11. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. паміж ст. Івацэвічы – Даманава	Пушчаны пад адхон эшалон. Разбіты: 1 паравоз, 9 вагонаў з боепрыпасамі	Зорын – кам., Кубанаў, Ганзюк, Кастылёў, Дравецкі, Пытлякі.
1.9. 1942	Брэст-Маскоўская чыг. паміж ст. Косава – Івацэвічы	Пушчаны пад адхон эшалон. Разбіта 40 вагонаў, з іх 10 з боепрыпасамі, 5 з жывой сілай, 5 з аўтамашынамі, 10 з прадуктамі, 1 з коньмі	Аляксееў, Курынны, Фамін, Іваноў.
1.11. 1942	У раёне в. Козікі	Захоплены і спалены вузкакалейны эшалон з лесаматэрыяламі. Згарэла 1 паравоз, 14 платформаў з лесам, 1 пасажырскі вагон і 4 вугальныя платформы	

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944). Мн., 1967. Т.1. С.460—464.

Зямля палала

З успамінаў В. А. Цвяткова, былога камісара партызанскага атрада І. П. Топкіна

У верасні 1942 г. атрад спецпрызначэння пад камандаваннем Іосіфа Піліпавіча Топкіна вылецеў у глыбокі тыл ворага... Наша асноўная задача была ў тым, каб здабываць звесткі для Чырвонай Арміі аб праціўніку ўдалечыні ад лініі фронту, парушаць планамерную работу чыгуначных камунікацый у трохвугольніку Брэст — Баранавічы — Лунінец і аказваць дапамогу ў разгортванні партызанскага руху ў заходніх абласцях Беларусі.

Атрад быў невялікі, але шматнацыянальны. У яго склад уваходзілі рускія, беларусы, украінцы, палякі, армяне... Камандзіры і байцы прайшлі ў пераважнай большасці суровую школу вайны, удзельнічалі ў баях на франтах або выконвалі заданні па захопе палонных. Выключэнне складалі дзяўчаты-радысткі Вера Дзерунова і Ліда Цянутава, якія ляцелі на заданне адразу пасля заканчэння курсаў радыстак.

Высадка праходзіла ў пінскіх балотах у раёне Спораўскага возера дванаццаццю рэйсамі самалёта ІЛ-2. Дэсантаванне асабовага складу, боепрыпасаў, харчу пачалося ў ноч на 6 верасня 1942 г. і працягвалася больш за два тыдні. У той перыяд на тэрыторыі Пінскай і Брэсцкай абласцей ужо існавалі партызанскія атрады, але не аб усіх мы мелі дастатковыя звесткі. Месца прызямлення выбралі па карце воддаль ад населеных пунктаў. Аднак першыя дзве групы з двух самалётаў на чале з камандзірам і камісарам атрада прызямліліся ў кіламетры ад вёскі Вялікая Гаць на невялікай палянцы. Месца аказалася зручным, і камандзір вырашыў часова арганізаваць тут лагер, каб сустрэць астатнія групы. Але апоўдні 8 верасня ў вёску прыбыў нямецкі полк СС, падраздзяленні якога пад вечар атакавалі наш лагер. Невялікай групе дэсантнікаў прыйшлося прыняць бой у нязручных умовах. Знаходзячыся ў паўакружэнні, байцы змагаліся самаддана, нанеслі праціўніку страты і арганізавана адышлі...

22 верасня апошнюю групу, якую выкінулі з самалёта ў раёне вёскі Вялікая Гаць, немцы абстралялі ў паветры і забілі камандзіра аддзялення сяржанта Міхаіла Доніна. Усе выкінутыя з групай грузавыя мяшкі з зімовай экіпіроўкай, боепрыпасамі і харчамі трапілі ў рукі праціўніка. Гэта стварыла атраду дадатковыя цяжкасці. Але і праціўнік быў збіты з толку: з'яўленне кожную ноч савецкіх самалётаў у раёне Спораўскага возера давала яму падставу меркаваць пра значныя сілы рэгулярных часцей Чырвонай Арміі, якія былі выкінуты ў яго тыле. Гэта пацвярджалі і дзеянні партызан на чыгункі.

Першае арганізаванае выступленне супраць акупантаў правялі групы пад камандаваннем старшага лейтэнанта Васіля Алісейчыка і ваентэхніка Барыса Гусева. 28 верасня ў 8 гадзін раніцы яны ўзарвалі чыгуначны састаў на вузкакалейцы паблізу Вялікай Гаці. Паравоз і некалькі вагонаў з эсэсаўцамі былі разбіты і абстраляны. 2 кастрычніка групы лейтэнантаў Івана Губанкова і Пятра Першына пусцілі пад адхон вайсковы эшалон на перагоне Косава — Бронная Гара. У выніку былі разбіты паравоз, шмат вагонаў і платформа з жывой сілай і тэхнікай, якія накіроўваліся на фронт. 5 кастрычніка група Аляксандра Мірскова зноў узарвала вайсковы эшалон каля вёскі Вялікая Гаць, дзе па-ранейшаму размяшчаўся эсэсаўскі полк. Пад адхон паляцелі два паравозы і тры вагоны, чацвёрты вагон з гітлераўцамі нашы байцы абстралялі.

Чуткі аб нашых першых поспехах хутка распаўсюдзіліся па навакольных вёсках. У гэты час нямецкія войскі праводзілі буйныя карныя аперацыі супраць партызан у раёне Слоніма. Некаторыя партызанскія атрады, якія размяшчаліся ў ружанска-пружанскіх лясах, вымушаны былі адысці на поўдзень у целяханскія лясы. Спецатрад быў добра ўзброены, меў сувязь з Цэнтрам... Мы развейвалі фашысцкую маню аб тым, што Чырвоная Армія разбіта, Масква ўзята і што Савецкі Саюз хутка спыніць сваё існаванне...

З часам атрад устанавіў цесныя сувязі з мясцовымі партызанамі і насельніцтвам. Яны асабліва ўзмацніліся пасля таго, як камандаванне атрада сустрэлася з кіраўніцтвам міжраённага антыфашысцкага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі», які дзейнічаў у Брэсцкай вобласці...

Сумесная работа з антыфашысцкім камітэтам давала станоўчыя вынікі. Па рацыі мы

паведамлялі на Вялікую зямлю пра абстаноўку ў тыле ворага ў зоне дзеяння нашага атрада, пра барацьбу партызан і падпольшчыкаў, а адтуль атрымлівалі зброю і боепрыпасы, зводкі Саўінфармбюро, палітычную літаратуру.

У снежні 1942 г. замест адпраўленага на Вялікую зямлю цяжка параненага капітана Топкіна Цэнтр назначыў камандзірам старшага лейтэнанта В.В.Алісейчыка, вопытнага і храбрага афіцэра, які працягваў весці работу з падпольнымі групамі і атрадамі, у т.л. польскімі.

Да красавіка 1943 г. намі была ўстаноўлена цесная сувязь з нізавымі арганізацыямі «Звёнзэк валькі збройнэй». Нягледзячы на нядобразычлівыя адносіны да нас вышэйшага камандавання гэтай арганізацыі, падпарадкаванай польскаму эмігранцкаму ўраду, радавыя члены яе актыўна дапамагалі партызанам...

У маі 1943 г. у Брэсцкай вобласці пачаў дзейнічаць падпольны абком партыі на чале з С. І. Сікорскім. Ён узначаліў усенародную барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі вобласці, пачаў арганізоўваць з дзеючых атрадаў Брэсцкае партызанскае злучэнне.

У гэты ж час спецатрад згодна з загадам Генеральнага штаба Чырвонай Арміі быў ператвораны ў аперцэнтр па разведцы (камандзір Г. М. Лінькоў). Для яго ўмацавання з мясцовых партызанскіх атрадаў выдзялялася частка партызан і ўлівалася ў зноў створаныя атрады і групы аперцэнтра. Адным з такіх атрадаў, якія размяшчаліся ў раёне Слоніма, стаў камандаваць В. В. Алісейчык. Я ж заставаўся камісарам аперцэнтра (намеснікам камандзіра па палітчастцы) і адначасова быў прызначаны камандзірам зноў сфарміраванага атрада, які перамясціўся ў раён Іванава...

Да перамогі ішлі разам

У Івацэвіцкім раёне ў гады фашысцкай акупацыі дзейнічала разгалінаваная сетка антыфашысцкага падполля, якое падмацоўвала, пашырала, рабіла найбольш выніковай дзейнасць партызанскіх атрадаў, было іх базай у папаўненні атрадаў зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі, з'яўлялася крыніцай атрымання разведданых, яднала партызан з усімі жыхарамі раёна.

У кароткай справаздачы Косаўскага раённага антыфашысцкага камітэта ад 15 жніўня 1943 г. гаварылася:

«Косаўскі раённы камітэт заснаваны ў маі 1942 г. У склад раённага камітэта ўваходзяць Трында М.Ф., Мініч А.М., Радзюк В.Ц. Арганізацыя налічвае 95 чалавек членаў, камсамольцаў 41. Вінтовак 40, патронаў 1500. Членаў арганізацыі, якія пайшлі ў партызанскія атрады, 10...

Расстраляна немцамі членаў арганізацыі 7, адзін арыштаваны. Аказана дапамога партызанскім атрадам: 5 кулямётаў, 14 аўтаматаў, 13 000 патронаў вінтовачных, 300 пэпэўдаўскіх, 162 вінтоўкі, 43 пісталеты, 14 гранат, 45 кілаграмаў выбуховых рэчываў. Арганізацыя забяспечвае атрады разведкай па ўсіх лініях...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3704. Воп. 1. С. 8. Л. 5).

За гэтымі лаканічнымі радкамі небяспечнае, поўнае рызыкі жыццё і дзейнасць многіх патрыётаў, якія збіралі і хавалі зброю, каб потым перадаць яе партызанам, ішлі ў фашысцкае пекла, каб атрымаць звесткі, што цікавілі партызан, армейскую разведку, шукалі лякарствы і перавязачныя матэрыялы, паперу і множыльную тэхніку, распаўсюджвалі лістоўкі, каб людзі ведалі праўду пра становішча на фронце.

У сваім данясенні Брэсцкаму абласному антыфашысцкаму камітэту ад 10.12.1943 г. сакратар Косаўскага раённага антыфашысцкага камітэта «Майскі» (падпольная мянушка М. Ф. Трынды) даваў падрабязную характарыстыку становішча ў раёне:

«Косаўскі раён складаецца з 69 населеных пунктаў, з іх 15 размешчаны за чыгункай Брэст — Баранавічы. Ліквідаваны немцамі поўнасцю 6 пунктаў...

Прамысловых прадпрыемстваў у раёне 11, з іх у Косаве 2 млыны, 1 маслазавод. У Івацэвічах 2 млыны, 2 лесапільныя заводы, 1 смалакурны завод, нямецкая дарожна-будаўнічая фірма «ТОДТ», нямецкая чыгуначная фірма «Боэрман», 2 сельскагаспадарчыя маёнткі: у Івацэвічах і Мерачоўшчыне.

У Косаўскім раёне размешчана 5 варожых гарнізонаў: у Івацэвічах, Няхачаве, Косаве,

Гошчаве і Любішчыцах з агульнай баявой сілай 710 чалавек. Акрамя гэтага, уздоўж чыгункі на ўчастку Няхачава – Івацэвічы размешчаны гарнізоны чыгуначнай аховы ў колькасці 6 баявых пунктаў з асабовым складам ад 15 да 80 чалавек.

Нямецкія ўстановы ў Івацэвічах: павятовая ўправа з аддзеламі – касавым, зямельным, меліярацыйным, юрыдычным, загсам, пашпартным аддзелам, фінаддзелам, адукацыі, аховы здароўя, біржы працы, аховы лясоў (форшуцкаманда), управа безгаспадарчымі маёнткамі (ландвірташфт), аддзел дзяржаўных нарыхтовак, беларускі банк, ваенна-гаспадарчы прадстаўнік раёна (зондэрфюрэр).

У Косаве: валасная ўправа з аддзяленнямі: касавым, картачна-харчовым, мельдунковым, біржы працы, безгаспадарчых зямель, будаўнічага, лясной аховы, цэнтральнага гандлёвага таварыства для ўсходу.

Усяго служыць немцам у раёне 71 чалавек...

У раёне працуюць 57 антыфашысцкіх ячэек...»

У дадатак да гэтай інфармацыі прыкладаўся спіс вёсак, дзе працавалі антыфашысцкія ячэйкі, а таксама праводзіліся рэпрэсіўныя дзеянні акупантаў. Напрыклад, па гораду Косаву ўказвалася , што ў ім была 1 ячэйка, у якой працавалі тры антыфашысты, было расстраляна немцамі 1229 чалавек і вывезена ў Германію 149 чалавек. Працавалі ў нямецкіх установах 298 чалавек. У вёсцы Юрчыкі дзейнічалі дзве падпольныя арганізацыі з 12 чалавек. Акупанты расстралялі 12 патрыётаў і 15 вывезлі ў Германію. 27 чалавек расстралялі і 37 чалавек вывезлі ў Германію з вёскі Дубітава, 12 чалавек расстралялі і 33 вывезлі ў Германію з вёскі Гошчава, пдпаведна 32 і 50 – з вёскі Заполле. Усяго па былому Косаўскаму раёну гітлераўцы расстралялі 2015 чалавек і вывезлі на прымусовыя работы ў Нямеччыну 1103 чалавекі (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3704. В. 7. С. 8. Л. 17, 21).

Па звестках на канец 1943 г. у былым Косаўскім раёне дзейнічала 57 антыфашысцкіх ячэек, у якіх было аб'яднана 263 патрыёты. Акрамя таго, было шмат памочнікаў і спачуваючых, якія ўсяляк садзейнічалі падпольшчыкам у іх справах. У 1944 г. антыфашысцкае падполле яшчэ больш пашырылася. Напрыклад,



Мемарыяльная дошка на доме ў Косаве.

толькі ў вёсцы Гошчава налічвалася каля 30 патрыётаў. Сярод іх – Майсейчык В.Д., Лукашук П.І., Ляшок У.Я., Раманава А.А., Бандарык А.А., Хараўчук В.А. і іншыя.

Ужо пад канец 1943 г. ў антыфашысцкіх групах вёскі Бялавічы было 13 чалавек арганізаваных патрыётаў. Узначальваў іх Уладзімір Якаўлевіч Трында. У студзені 1944 г. пасля гібелі Мікалая Фёдаравіча Трынды ён узначаліў Косаўскі антыфашысцкі камітэт. Больш за 20 антыфашыстаў змагаліся ў падпольных групах вёскі Падстарынь. Сярод іх Гулевіч А.А., Васілевіч Я.М., Круцель А.Я. і іншыя. Буйныя падпольныя арганізацыі былі ў вёсках Квасевічы, Заполле, Скураты, Куляшы і іншых вёсках раёна.

У справаздачы партызанскага атрада імя Сільніцкага брыгады імя Дзяржынскага даецца высокая ацэнка дзейнасці падпольшчыкаў Няхачава. Прыводзяцца звесткі пра С.Т.Буксу: «...стары 56 гадоў тав. Букса Сямён Трафімавіч працаваў на чыгунцы, ст. Няхачава (Косава-Палескае), першым наладзіў у Няхачаве сувязь з партызанамі, адначасова, працуючы на чыгунцы, арганізаваў падпольную групу з 5

чалавек, якая вугальнымі мінамі рвала паравозы...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. С. 312. Л. 199—203). Калі навісла пагроза арышту, Букса С. Т. са сваёй сям'ёй і таварышамі перабраўся ў лес. У гэтай групе актыўна дзейнічаў Аляксей Кулак, які ўзарваў на чыгуначнай станцыі вадакачку, але загінуў і сам.

Актыўна дзейнічалі падпольшчыкі-антыфашысты ў вёсцы Святая Воля. Яны вялі разведку ў гарнізоне, здзяйснялі дыверсіі на вузкакалейнай чыгунцы, перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты і іншае.

Невядомы падпольшчык у лісце І. М. Корзану, члену Святавольскага антыфашысцкага падрайкома, пісаў: «Ваня, я табе шлю справаздачу аб здачы зброі, якая паступіла з нашай вёскі.

Здалі ў атрад імя Молатава ў маі 1943 г. Галінскаму разам з Крывалем А. 35 патронаў савецкіх і 1 гранату Ф-1, Каленіку Дзмітрыю 1 мадзьярскую гранату і 1 ракету.

У атрад імя Чарткова 10 штук гранат, 2 магазіны да «дзесяцізарадкі» і 65 штук патронаў савецкіх і 18 патронаў мадзьярскіх.

У атрад імя Баруцкага 2 вінтоўкі... два дыскі поўных да кулямёта і 46 патронаў...»

У справаздачы партызанскай брыгады імя Панамарэнкі сярод лепшых агентаў і сувязных атрада імя Дзімітрова названы Мяхведзь Ігнат Данілавіч з вёскі Бялавічы, Галаўко Іван і яго дачка Ніна з хутара Барсукі, Яўгенія Крыштопік з вёскі Заполле. Як сведчыць архіўны дакумент, Мяхведзь І. Д. перадаў партызанам 10 вінтовак, 1 аўтамат ППД, тысячу патронаў. Падпольшчык з Заполля Зайка Васіль Амбросьевіч перадаў партызанам 5 вінтовак, 2 аўтаматы, тры наганы, 25 гранат.

Многія служыцелі праваслаўнай царквы ў тыя цяжкія часы таксама былі разам з патрыётамі. Так, святар Гошчаўскай царквы Мікалай Сцяпанавіч Дзем'яновіч і яго брат, дзьякан гэтай царквы Яўген Сцяпанавіч неаднаразова аказвалі дапамогу партызанам, ратавалі людзей. Па просьбе камандавання атрада імя Дзімітрова айцец Мікалай, карыстаючыся санам, наведваў Брэст, дзе даставаў пісчую і капіравальную паперу, здабываў патрэбныя звесткі. Калі па даносе здрадніцы фашысты арыштавалі 20 сельскіх актывістаў і ім пагражала смерць, Мікалай Сцяпанавіч адправіўся ў Івацэвіцкае гестапа і пераканаў немцаў, што яго прыхаджане не бальшавікі і не партызаны, здолеў запэўніць, што яны не вядуць барацьбу з немцамі, хоць ведаў, што некаторыя з іх звязаны з партызанамі. Дзякуючы айцу людзі вярнуліся дамоў. Калі ворагі адступалі з вёскі, яны сагналі ў хату шмат жыхароў для знішчэння. І зноў Мікалай Сцяпанавіч выратаваў іх ад смерці.

Як на ўсялякай вайне, шмат ахвяр было і на пакутнай Івацэвіцкай зямлі. Фашысцкія вылюдкі цалкам знішчылі ў партызанскіх зонах вёскі Вяда, Красніца, Тупічыцы, Зыбайлы разам з жыхарамі, амаль з усімі людзьмі — Зацішша і Бабровічы. Усяго ў вёсках раёна па няпоўных даных было знішчана больш за 2300 двароў, каля трох тысяч чалавек, без уліку ахвяр фашысцкіх гета.

...Гінулі змагары-падпольшчыкі, але заставалі вернымі справе вызвалення роднай зямлі. Так, кінуты ў слонімскую турму член антыфашысцкага камітэта з вёскі Гошчава Іван Антонавіч Еўтух выбраў смерць, не выдаўшы таварышаў. Гестапаўцы зацкавалі яго аўчаркамі. Гераічнай смерцю загінуў важак яглевіцкай моладзі антыфашыст Віктар Клютко, якога фашысты павесілі на івацэвіцкай плошчы. У івацэвіцкім кар'еры былі расстраляны дзесяткі патрыётаў, сярод якіх быў падпольшчык з Волі Васіль Гойшык, бацька героя-партызана Колі Гойшыка. Трапіўшы ў засаду, у няроўным баі з паліцаямі быў забіты арганізатар антыфашысцкага падполля на Косаўшчыне Мікалай Фёдаравіч Трында. Аддаў жыццё за свабоду роднай зямлі арганізатар антыфашысцкага руху на Брэстчыне Іосіф Урбановіч. Іх подзвіг не можа быць забыты.

Агульная барацьба воінаў на фронце, партызан і падпольшчыкаў у тыле ворага дзень за днём набліжалі перамогу.

М. Банасевіч.

Скуратоўскія падпольшчыкі

З успамінаў сакратара падпольнай камсамольскай арганізацыі вёскі Скураты Веры Лушчык

Часта прыгадваецца мне вёска Скураты ў грозны ваенны час, час нашай маладосці.

...Трэці год фрыцы гаспадарылі на нашай зямлі. Мае землякі, мае аднагодкі прыціхлі, баяліся збірацца разам. Здавалася, страх перад жорсткасцю акупантаў загнаў іх па сваіх кутках. Але ў апушчаных вачах столькі было смутку і святой нянавісці за гора, якое прынесла вайна ім і іх блізкім! Гэта нянавісць і згуртавала нас на барацьбу з ворагам (перажытае мною дае права на такое сцвярджэнне). У чэрвені 1943 г. сямёра смельчакоў стварылі падпольную камсамольскую арганізацыю. Членамі яе сталі Ніна Лушчык, Марыя Казімірчык, Лідзія Бурвіна, Іван Казімірчык, Яўгенія Голуб, Люба Балашова і я. Устанавілі сувязь з партызанскім атрадам імя Дзімітрова брыгады імя Панамарэнкі. Атрымлівалі адтуль заданні. Збіралі звесткі аб акупантах, падпілоўвалі тэлефонныя слупы, раскідвалі лістоўкі... Усё гэта рабіць, вядома, было небяспечна. Ведалі, што нас чакае, калі накрыюць камсамольскі сход. Вёска ж наша побач з Косавам, дзе быў буйны нямецкі гарнізон і паліцэйская каманда. Збіраліся часта і ў нашай хаце. Не раз перад намі выступаў сакратар падпольнага райкома ЛКСМБ Фёдар Савін. Адчувалі: небяспека ходзіць побач з намі. Неяк сама сабой узнікла ідэя: пабудаваць зямлянку ў Гута-Міхалінскім лесе, непадалёку ад партызанскага лагера. Так і зрабілі. Наладжвалі там сходы, сустрэчы. Трапіць у зямлянку можна было толькі праз пасты. Пропускам служыў пароль. З партызанскага атрада выдзелілі нам пішучую машынку. На ёй і друкавалі тэксты лістовак.

З неспакойных, небяспечных дзён тых прыгадваюцца дні восені таго ж 1943 г. Перададзеная трывожная вестка — на чарзе адпраўка ў Нямеччыну скуратоўскай моладзі — прымусіла нас на нейкі час падацца ў вёску Юрчыкі, там перачакаць бяду. Неяк вечарам сабраліся разам пасля копкі бульбы. Ніна Лушчык забіла трывогу, маўляў, чуе яе сэрца нешта нядобрае, лепш пераначаваць бы ў кустах. Палічылі мы гэта за панікёрства і ледзьве не паплаціліся за гэта. На досвітку вёску акружылі шчыльным кальцом паліцаі. Нас схапілі, толькі Ніна выратавалася, схаваўшыся ў хляве. Не знайшлі яе фрыцы, не пашкодзілі, хоць шомпаламі «прадзіравілі» ўсю салому. Пашанцавала сяброўцы, не інакш.

Адвезлі нас спярша ў Косава, затым у Івацэвічы. Загналі ў нейкі барак. Праз краты (у некаторых месцах шкло было павыбіта) разгаварыліся мы з ахоўнікамі, не то мадзьярамі, не то чэхамі. Устанавілі з імі кантакт. Яны абяцалі нам дапамагчы, параілі, як лепш выкарыстаць сітуацыю. Мы так і зрабілі. Калі падагналі вагоны-«цялятнікі», мы разам з іншымі нешчасліўцамі зайшлі туды. Некалькі хвілін затрымаліся. Пакінуўшы свае торбачкі з рэчамі і накінуўшы на галовы хусткі, выйшлі з вагона. Апынуліся сярод масы людзей. Ахоўнікі стрымалі сваё слова. Нас яны не затрымалі.

Мы пайшлі ў горад. Ніколі не былі ў Івацэвічах. Арыентавацца было няпроста. Пераначавалі. Ранкам пачалі шукаць карацейшы шлях да Скуратоў. Пятлялі, хаваючыся ад сустрэчы з выпадковымі паліцаямі. Затым прытулак знайшлі ў Гулінскім лесе. Зноў спатрэбіліся нам хусткі. Толькі на гэты раз не ад ворагаў захутваць свой твар. На палянцы — хоць касою касі — столькі рассыпалася белых грыбоў. Назбіралі іх поўныя хусткі. «Уцякаць бы хутчэй», — думаецца цяпер, аналізуючы тую сітуацыю. Тады ж мы былі маладыя, рызыкоўныя, верылі ў лепшае. Толькі выйшлі з лесу на дарогу, што да Няхачава вяла, новы цуд: мая бабуля і цётка крочылі па ёй. Лёс гэта, ці што іншае, хто ж яго ведае. Спяшаліся яны да чыгуначнай станцыі Косава-Палескае з надзеяй сустрэць цягнік, што вёз людзей у Нямеччыну, нас, пры шчаслівым выпадку, пабачыць. Сустрэча на дарозе была такой радаснай!

Мы зноў уключыліся ў барацьбу. Мне як сакратару даводзілася сустракацца з сакратаром падпольнага абкома ЛКСМБ Лыжыным, які не раз прысутнічаў на нашых камсамольскіх сходах. Выконвалі многія яго даручэнні.

Радасць для нас абвясціў 1944 г. Адразу пасля вызвалення тэрыторыі ад гітлераўскіх захопнікаў наша камсамольская арганізацыя актыўна ўключылася ў аднаўленне народнай гаспадаркі. На рахунку спраў моладзі была і радыёфікацыя нашай вёскі. Радасці і гордасці не было канца.

Давай Косава!

З успамінаў камандзіра партызанскага атрада імя М. А. Шчорса П. В. Пранягіна*

У канцы ліпеня 1942 г. у наш лясны лагер у Воўчых Норах у суправаджэнні групы байцоў прыбыў незнаёмы мне чалавек. Гэта быў Сяргей Ягоравіч Ягораў, член абласнога камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі.

Сяргей Ягоравіч прабыў у нас некалькі дзён. Мы шмат гаварылі пра бліжэйшыя планы атрада. І вось тады ён выказаў такую думку:

— Ваш атрад налічвае добрых паўтысячы чалавек. Гэта ж моц. Чаму б вам не разграміць які-небудзь буйны нямецкі гарнізон. Уяўляеце, які гэта выкліч рэзананс!

Сапраўды, наш атрад быў буйны, акрамя вінтовак у нас было каля 40 кулямётаў, прыкладна столькі ж аўтаматаў, шмат гранат. Гонарам атрада была артылерыя. Праўда, прадстаўлена яна была адным 45-міліметровым ствалом. Але ўсё ж гэта была артылерыя. З гарматай лягчэй было рашаць баявыя задачы...

З нашымі сіламі сапраўды можна і трэба было правесці якую-небудзь буйную баявую аперацыю. Я назваў Ягораву Косава.

Сяргей Ягоравіч уважліва паглядзеў на мяне, з хвіліну памаўчаў, а потым сказаў:

— Ці добра ты прадумаў сваю прапанову? Як-ніяк, а косаўскі гарнізон налічвае больш за 300 добра ўзброеных гітлераўцаў. Праціўнік закапаўся ў зямлю. Ён будзе абараняцца, а нам прыйдзецца наступаць.

У размову ўмяшаўся Дудко:

— Разлічваем на рашучыя і раптоўныя дзеянні, на тое, што праціўнік наўрад ці дапусціць думку, што мы адважымся атакаваць яго ў горадзе.

— З вашымі довадамі нельга не згадзіцца, — адказаў Ягораў.

Мы яшчэ доўга гаварылі аб будучай аперацыі па разгроме косаўскага гарнізона. Ягораў параіў нам уключыць у распрацоўку баявой аперацыі кіраўнікоў Косаўскага антыфашысцкага камітэта Мікалая Фёдаравіча Трынду і Канстанціна Дзям'янавіча Талочку.

— Гэтыя людзі пры буржуазна-памешчыцкай Польшчы, — сказаў ён, — прайшлі суровую школу падпольнай барацьбы. Яны акажуць вам вялікую дапамогу. Выкарыстайце таксама ў распрацоўцы аперацыі начальніка штаба атрада імя Дзімітрова Дзмітрыя Сямёнавіча Дзмітрыева...

Мы прыступілі да падрыхтоўкі аперацыі. Перш за ўсё правялі старанную разведку гарнізона, склалі падрабязны план горада і нанеслі на карту месцы размяшчэння жандармерыі, паліцыі, складоў зброі, казармаў, агнявых кропак.

За два дні да аперацыі была праведзена нарада каманднага складу атрадаў імя Шчорса, імя Дзімітрова і імя Варашылава. У ёй удзельнічалі члены абласнога Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі, а таксама Ружанскага і Косаўскага антыфашысцкіх камітэтаў. Яны ўнеслі шмат слушных прапаноў. Асабліва вялікі клопат аб падрыхтоўцы да аперацыі выявіў І. П. Урбановіч...

На нарадзе быў распрацаваны і зацверджаны дэталёвы план разгрому варожага гарнізона ў горадзе Косава. Камандаваць аб'яднанымі сіламі трох атрадаў было даручана мне. Для ўдзелу ў аперацыі ад атрада імя Шчорса выдзялялася 360 чалавек, ад астатніх двух — 120 чалавек.

Наступленне запланавалі на 2 жніўня. Пачатак атакі — на досвітку, сігнал — гарматны выстрал. Зыходныя пазіцыі для наступлення вырашылі заняць ноччу. Захоўвалі найстражэйшую сакрэтнасць, баявую задачу падраздзяленням прапаноўвалася паставіць на маршы.

Устанавілі размежавальныя лініі і аб'екты для атак паміж атрадамі. Выставілі моцныя заслоны з боку варожых гарнізонаў Слоніма, Ружан, Івацэвіч, Няхачава. Прадугледзелі знішчэнне сувязі. Быў устаноўлены адзіны пароль.

Ноччу ўвесь шлях мы прайшлі з вялікімі перасцярогамі і да ўмоўнага часу занялі зыходныя пазіцыі. Камандны пункт разам з гарматай размясцілі на бліжэйшай вышыні на поўнач ад Косава. Сувязныя данеслі аб гатоўнасці груп да наступлення, аб тым, што заслоны выстаўлены, тэлефонная сувязь перарэзана, а на лясных дарогах з боку Няхачава і Івацэвіч зроблены завалы.

Ідуць хвіліны напружанага чакання. І вось пачало развідняцца, сталі бачны цэлі, чакаць

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кнігі П. В. Пранягіна «У самай граніцы».

больш было нельга. Даю каманду Сашы-артылерысту: «Па камендатуры — агонь!»

Першы выстрал скаланае паветра, затым другі, трэці... З усіх бакоў застракаталі кулямёты, аўтаматы. Чутны крыкі «ўра!». Атрад імя Дзімітрова наступаў з боку Бялавіч, ад Скуратоўскіх хутароў, атакаваў будынак паліцыі і гарадской управы. Атрад імя Варашылава — крыху правей. Аб'ект яго атакі — клуб, дзе размяшчаліся гітлераўцы. Шчорсаўцы наступалі з усходняга боку і атакавалі будынак жандармерыі і нямецкіх пагранічнікаў (у Косаве стаяла нямецкае пагранічнае падраздзяленне, недалёка ад гарнізона праходзіла ўстаноўленая фашысцкімі захопнікамі граніца паміж Усходняй Прусіяй і Вайсрутэніяй — так яны называлі Беларусь).

Стральба то нарастала, то сціхала. Чуліся крыкі: «У атаку! Ура!»

Хутка над аб'ектамі, якія атакаваліся партызанамі, узвіліся языкі полымя.

Сталі паступаць данясенні аб выкананні баявой задачы. Наша гарматная стральба, рашучая атака ашаламілі праціўніка, прывялі яго ў замяшанне. Атрады амаль бесперашкодна ўварваліся ў горад, сталі займаць квартал за кварталам, выбілі немцаў з многіх занятых імі будынкаў.

Але хутка непрыяцель адышоў ад замяшання, стаў адчайна адбівацца. З нашага боку з'явіліся параненыя і забітыя. Мне данеслі, што, атакуючы агнявую кропку, загінуў камандзір аддзялення малодшы сяржант Карым Ісмагілаў... Загінулі Аляксандр Тамілін, Сцяпан Блюменфельд, Андрэй Нейдзераў. Штурмуючы гарадскую ўправу, загінулі камандзір узвода атрада імя Дзімітрова Уладзімір Вараб'ёў, байцы Васіль Кузняцоў і Яўген Ісаеў.

З пачатку нашага наступлення прайшло ўжо дзве гадзіны, а бітва не сціхала. Асабліва жорсткая схватка разгарэлася ў цэнтры Косава. Прымаю рашэнне перамясціць камандны пункт і гармату ў цэнтр горада, каб дапамагчы артылерыйскім агнём зламаць апошнія ачагі супраціўлення. Падаспелі дачасна. Некалькі абарончых кропак артагнём знішчылі з блізкіх дыстанцый.

У партызанскага кастра (злева направа) П. В. Пранягін, С. Я. Ягораў, Р. А. Дудко.

Нарэшце страляніна сціхла. Гарнізон поўнасцю разгромлены. Горад у нашых руках.

У бітве за Косава партызаны знішчылі больш за 80 немцаў і паліцэйскіх, 11 узялі ў палон. Значнай частцы фашыстаў удалося ўцячы ў Івацэвічы. Невялікая група паліцэйскіх спрабавала схавацца ў бальніцы. Пад выглядам хворых яны ўлягліся на ложкі. Але гэтая хітрасць ім не дапамагла.

Час падыходзіў да 10 гадзін раніцы. Хоць вораг быў разбіты, доўга заставацца ў горадзе мы не маглі. У Косава ў любы час маглі падысці буйныя варожыя сілы. Над горадам з'явіліся нямецкія самалёты, сталі абстрэльваць нас з кулямётаў.

Пакінуўшы прыкрыцце, партызаны накіраваліся ў свае лагеры... Немцы, якія з'явіліся з Івацэвіч пасля адыходу партызан, хуценька агледзелі разбіты гарнізон і адышлі назад. А партызаны больш за месяц, да буйной блакады ў верасні 1942 г., трымалі ў горадзе сваю камендатуру.

Агінскі бой

Вялікі бой паміж партызанамі атрада імя М.А.Шчорса і нямецка-фашысцкімі захопнікамі адбыўся на Агінскім канале ў Целяханскім раёне 13 верасня 1942 г.

У час правядзення гітлераўцамі карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» праз зону блакады ішоў баявым рэйдам у Пінскую вобласць партызанскі атрад імя Шчорса, які прыняў на сябе ўдар карнікаў. Першая сутычка партызан з гітлераўцамі адбылася 10 верасня ў вёсцы Дабромысль Косаўскага раёна. 11 верасня партызанскі атрад вёў 10-гадзінны бой

з намнога большымі сіламі праціўніка каля в. Вяда Целяханскага раёна, а затым арганізавана адышоў. Выкарыстоўваючы лясістабалоцістую мясцовасць і знішчыўшы частку свайго абозу, партызаны адарваліся ад ворага і вырашылі прабівацца да Агінскага канала, які злучаў Выганаўскае возера з ракой Шчара. На досвітку 13 верасня партызанскі атрад выйшаў да 10-га шлюза Агінскага канала, які быў захоплены карнікамі (каля 100 гітлераўцаў). Група партызан перайшла ўброд Шчару, ударыла ў фланг праціўніка і прымусіла яго адысці. Адначасова асноўныя сілы партызан атакавалі ворага і ў выніку 5-гадзіннага бою знішчылі больш за 60 карнікаў, прабіўшы сабе выйсце з блакады. Партызаны захапілі 2 кулямёты, 5 аўтаматаў, 15 вінтовак, вялікую колькасць боепрыпасаў. У ходзе бою загінулі 5 партызан.

Смелая аперацыя

З успамінаў В. А. Цвяткова, камісара дыверсійна-разведвальнага атрада І. П. Топкіна*

...Мы накіроўваліся з нашага неабжытага, але гасціннага лагера за чыгунку ў Булінскія лясы разам з Іосіфам Паўлавічам Урбановічам і Іванам Іосіфавічам Жышко. Я ўзяў з сабой лейтэнанта Пятра Першына, сяржанта Аляксандра Мірскога і кулямётчыка Канстанціна Мурэхіна. Прыхапілі крыху толу і мін. Цвёрда рашыўшы з Топкіным узяць пад сваё камандаванне невялікія атрады «Савецкая Беларусь» і імя Кірава, якія выдзеліліся з буйнога атрада імя Шчорса, які ў свой час адышоў на ўсход з асноўным складам, мы дамовіліся з камандзірам, што я дэталёва азнаёмлюся з гэтымі атрадамі і вызначу, якая ім неабходна на першы час матэрыяльная дапамога.

Асабліва зацікавіў нас атрад «Савецкая Беларусь» пад камандаваннем былога лётчыка бамбардзіровачнай авіяцыі капітана Мікалая Уладзіміравіча Бабкова. Па сцвярджэнні Урбановіча, Бабкоў быў выключна смелым камандзірам, які правільна разумеў задачу, што стаяла перад ім, і не сядзеў, склаўшы рукі, а сістэматычна наносіў то тут, то там рознай сілы ўдары па ворагу. У гэтым атрадзе камісарам быў камуніст Мікалай Мікалаевіч Вазнясенскі. Добрая слава ў атрадзе хадзіла пра памочніка начальніка штаба Мікалая Уладзіміравіча Сенькіна і камандзіра групы Паўла Іванавіча Паўлоўскага.

Чыгунку Брэст — Баранавічы перайшлі без бою і на трэці дзень прыбылі ў атрад «Савецкая Беларусь». Ён размяшчаўся ў раёне Воўчых Нор. Мне спадабалася адносна добрая маскіроўка лагера, умелая расстаноўка аховы і суровы парадак. Адчувалася, што кіруюць атрадам людзі, якія маюць ваенную падрыхтоўку.

Прыём быў вельмі цёплы. Нас сустрэлі, што называецца, з раскрытымі абдымкамі. Бабкоў, які аказаўся не па гадах грузным, але дужым чалавекам, сціснуў мяне сваімі рукамі, бы жалезнымі кляшчамі, так, што я думаў назаўсёды развітацца з жыццём. Сардэчным было знаёмства і з астатнім камандным складам.

...Мы абмеркавалі пытанні сумеснай работы, узаемадзеяння з другімі атрадамі, рашылі задачы па правядзенні баявых аперацый на чыгунках Ваўкавыск — Баранавічы і Брэст — Баранавічы, па актывізацыі разведкі.

Рашылі прыступіць да дзеянняў неадкладна. На першую аперацыю падабралі моцную групу, каб паспрабаваць не толькі ўзарваць эшалон, але і захапіць «языка».

— Пойдзе рота Ісаева і група Паўлоўскага, — рашыў камандзір.

...Пад раніцу 25 лістапада ўдарная група прыбыла ў раён станцыі Даманава і наладзіла днёўку ў лесе. Разведчыкі наглядалі за дарогай, а калі сцямнела, Ісаеў, Першын, Паўлоўскі і яшчэ два партызаны вярхом на конях накіраваліся да заходняга семафора. Яго чырвоны агеньчык свяціўся, як яскравая зорка на бязвоблачным небе.

Спыніліся непадалёку ад будкі стрэлачніка. Пакінуўшы коней з партызанамі, Ісаеў, Першын і Паўлоўскі пайшлі да будкі. Непадалёк чулася нямецкая гаворка. Час ад часу прамень кішэннага ліхтарыка прабягаў па насыпе. Паступова ён аддаліўся ў бок семафора. Ахова правярала пуці перад падыходам чарговага эшалона.

Першым падпоўз да будкі Ісаеў і заглянуў у акно. За фіранкай нічога не праглядвалася. Да-

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кнігі В. А. Цвяткова «Своими глазами» (Мн., 1972. С. 93—99).

тыкнуўшыся рукой да памочнікаў, даў зразумець, каб адзін заставаўся на месцы, а другі ішоў за ім. Наблізіліся да дзвярэй. Ісаеў рашуча адкрыў іх і ўскочыў у будку. За ім Першын. Каля сценкі сядзелі двое. Раптам яркі прамень асляпіў партызан, і яны не адразу разабраліся, хто стрэлачнік, а хто ахоўнік. Прамаруджванне магло павярнуцца супраць нападаючых. Рашалі секунды. Гітлеравец, апамятаўшыся ад нечаканасці, пацягнуўся да аўтамата, але тут атрымаў моцны ўдар прыкладам па галаве і пачаў асядаць на падлогу. Стрэлачніка схапіў Першын. Трывожна зазваніў тэлефон. Ісаеў спытаў:

— Што гэта значыць?

— Напэўна, дзяжурны па станцыі, — нерашуча адказаў стрэлачнік.

— Пачакае! — распарадзіўся Ісаеў, працягваючы вязаць прыглушанага немца.

— Раю адказаць, інакш прыйдзе ахова.

Ісаеў падняўся і зняў трубку.

— Слухаю, — цяжка дыхаючы, прамовіў Ісаеў.

— Якога чорта ты не падыходзіш да тэлефона? — пачуў ён усхваляваны крык. — Адкрывай семафор, да цябе ідуць. Падыходзіць нешта важнае. Глядзі ў мяне... — і рушыла серыя нецэнзурных слоў.

— Добра, — адказаў Ісаеў і павесіў трубку. І, ужо звяртаючыся да стрэлачніка, злосна кінуў:

— Каго ты чакаеш, службіст?

— Дарэмна крыўдзіш, таварыш! Абставіны прымушаюць працаваць. Не з голаду ж дохнуць дзецям? Бачыш, пад аховай знаходзімся. — Ён паказаў вачыма на звязанага гітлераўца. — А па часці папярэджання, дык гэта значыць — чакаецца важны цягнік. Зараз павінны падысці супрацоўнікі службы бяспекі для нагляду. Баяцца, каб не пусцілі эшалон на эшалон.

— Ну, добра, ідзі адкрывай семафор. Пра нас пакуль ні слова. Данясеш тады, калі будзеш упэўнены, што эшалон выйшаў са станцыі. Ачухаецца фашыст, пацвердзіць, што ты ні ў чым не вінаваты. Пакінем яго пад адхонам.

Развітаўшыся са стрэлачнікам, Ісаеў адчыніў дзверы і з дапамогай Першына павалок з будкі ахоўніка. Стрэлачнік адкрыў семафор.

Разведчыкі без шуму адпаўзлі ад чыгункі, ускочылі на коней і памчаліся да ўдарнай групы...

З дзотаў уздоўж палатна з невялікімі перапынкамі страчылі кулямёты. А тым часам да палатна прабіралася падрыўная група Паўлоўскага. Да падыходу заставалася некалькі мінут. Трэба спяшацца. Але на тым месцы, дзе трэба было паставіць міну, стаялі немцы...

Аперацыя аказалася пад пагрозай зрыву. Удалечыні ўжо чуваць гудок паравоза, паказаліся агні, а гітлераўцы не рухаліся з месца і, здавалася, чакалі смельчакоў, якія паўзлі да палатна.

Першын падрыхтаваў зарад... Агні хутка павялічваліся. Адлегласць паміж цягніком і мінёрамі няўмольна скарачалася...

Першын і Паўлоўскі кінуліся на палатно. Амаль побач з аховай пад стук колаў на стыках паклалі зарад і скаціліся пад адхон. Іх заўважылі. Адзін з ахоўнікаў даў чаргу з аўтамата. Другі стаў падбірацца да зарада, каб абрэзаць шнур. Меткая куля Паўлоўскага паклала яго на паўдарозе. З ускрайку лесу адкрыла агонь па ахоўніках група Ісаева. А цягнік ужо зусім побач. Першын з сілаю тузануў за шнур. Раздаўся выбух. Пад адхон пайшоў паравоз, вагоны сталі напаўзаць адзін на другі...

...Па праверaных даных, у выніку крушэння забіта больш за 150 нямецкіх лётчыкаў. Параненых было ў два разы больш.

У імя перамогі

З успамінаў былога разведчыка партызанскага атрада імя А. П. Чарткова М. Х. Колтуна

З першых дзён акупацыі нашага раёна гітлераўцы пачалі расправу над патрыётамі. У Жытліне схапілі Кандрата Сівеню, збілі яго, завезлі ў Івацэвічы і там расстралялі. У Гічыцах расстралялі Максіма Цімашэвіча і яго жонку Аніссю, у Галенчыцах Івана Молаша і Букшту. У Козіках расстралялі 15 чалавек.

Я ў першыя дні вайны па заданні райкома партыі дзяжурыў з групай таварышаў у раёне Косава. Нам была пастаўлена задача весці нагляд і, у выпадку фашысцкага дэсанта, знішчаць парашутыстаў.

Хуткае прасоўванне немцаў перашкодзіла нам адысці на ўсход з часцямі Чырвонай Арміі.

Дома, у вёсцы Хадакі, ужо гаспадарылі немцы і іх прыспешнікі — здраднікі. Яны прызначылі старасту і 7 паліцэйскіх. Надзейныя людзі папярэдзілі, што акупанты наладзілі ў мяне на дворышчы кругласутачную засаду.

Я пайшоў у лес. Праз некалькі дзён да мяне далучыліся Макар Іванавіч Колтун і Мікалай Сяргеевіч Кузьменя.

Мы адразу ж пачалі наладжваць сувязь з насельніцтвам. У Хадаках актыўна дапамагалі нам Пракоп Міраноўскі і Яўстафій Кулініч, ва Уласаўцах — Аляксандр Удовін, Іван Клютко, Васіль Зыбайла, у Жытліне — Мікалай і Уладзімір Саўчукі, Даніла Сівеня, у Корачыне — Іван Кулініч, Мікалай Клютко, у Зыбайлах — Андрэй і Сямён Ялоўскія, Ігнат Міхнікевіч, у Яблонцы — Аляксандр Зыбайла, Адам Перавалоцкі, у Волі — Васіль Гойшык, у Сярадаве — Мікалай Кот, Аляксандр Слясарчык, Рыгор Шыян, у Яглевічах — Васіль і Мікалай Пытлякі, Мікалай і Віктар Клютко, у Галенчыцах — Андрэй Макарэвіч, у Козіках — Марк Лішко, у Івацэвічах — Гардзей Іванавіч Пшанай і яго дачка Рая, Антон Дзем'янчук.

18 лістапада 1941 года ў раёне Жытліна мы сустрэліся з групай чырвонаармейцаў пад камандаваннем лейтэнанта Аляксея Пятровіча Чарткова і аб'ядналіся для сумесных дзеянняў. Праз тыдзень да нас далучыўся Сяргей Дзям'янавіч Арлоў. У лютым 1942 года прыйшоў Васіль Макар з вёскі Любішчыцы. Гэтай невялікай групай правялі першую ваенную зіму. Галоўным нашым клопатам у гэты час была падрыхтоўка да стварэння партызанскага атрада. Падбіралі людзей па вёсках, здабывалі зброю.

З 1 красавіка 1942 года атрад пачаў хутка расці, да нас ішлі група за групай — мясцовы актыў і збегшыя з палону байцы. Першай прыбыла група ў колькасці 7 чалавек з вёскі Яглевічы. Узначалілі яе Васіль і Мікалай Пытлякі. Затым прыйшлі 5 байцоў на чале з лейтэнантам Іванам Міхайлавічам Цярэшчанкавым. За імі 15 чалавек з вёскі Сярадава на чале з малодшым палітруком Фёдарам Аляксандравічам Бяляевым. З вёскі Руда прыйшлі 5 чалавек на чале з Гудзіліным. Пазней у атрад улілася яшчэ адна вялікая група — 40 чалавек на чале з Паўлам Бутовічам. Працуючы на шашы ў в. Няхачава, палонныя чырвонаармейцы раптоўна напалі на ахову, перабілі немцаў і, забраўшы зброю, прыйшлі да нас.

Патрыёты, якія рашылі са зброяй у руках змагацца з захопнікамі, усё прыбывалі і прыбывалі — з вёсак Хадакі, Уласаўцы, Жытліна і другіх населеных пунктаў. З вёскі Быч прыйшлі Каспяровічы — бацька, тры сыны і дачка.

Да мая 1942 г. у атрадзе налічвалася ўжо 140 чалавек! Камандзірам атрада быў выбраны А. П. Чарткоў, камісарам — Ф. А. Бяляеў, начальнікам штаба крыху пазней быў выбраны Васіль Міхайлавіч Манахаў, група якога прыйшла ў наш атрад у маі. Мне даручана было ўзначаліць разведку.

Калі зімой наша група займалася ў асноўным падрыхтоўкай да арганізацыі атрада, вылаўлівала паліцаяў, то вясной мы рашуча расшырылі поле сваёй дзейнасці, маштабы баявых аперацый.

Было вырашана адзначыць 1 Мая магутным ударам па чыгункі. Узрыўчаткі ў нас не было. Лапатамі падкапалі адзін бок чыгуначнага палатна на перагоне Івацэвічы — Няхачава. Эфект быў выдатны: пад адхон паляцелі паравоз і 8 вагонаў з боепрыпасамі.

Першы буйны поспех натхніў нас. На працягу мая — ліпеня атрад разграміў паліцэйскія ўчасткі ў вёсках Чамялы, Святая Воля, Стрыгінь, Пескі. Спалілі драўляны мост праз раку Шчару на магістралі Брэст — Масква.

Навучыліся выплаўляць тол са снарадаў, а ў якасці ўзрывальніка выкарыстоўвалі нямецкія гранаты з доўгай драўлянай ручкай і шнурам. Такімі самаробнымі мінамі знішчылі некалькі эшалонаў.

Партызанскі рух станавіўся ўсё больш масавым. Новыя і новыя сотні людзей уліваліся ў рады народных мсціўцаў. Да восені 1942 года па суседстве з намі дзейнічалі ўжо некалькі партызанскіх атрадаў. У раёне Гута-Міхаліна дыслацыраваўся атрад імя Дзімітрова, у Буленскіх лясах — атрад імя Шчорса, а пазней — «Савецкая Беларусь».

У верасні гітлераўцы кінулі супраць партызан да 45 тысяч карнікаў. Але іх планы пацярпелі правал. Партызаны з дапамогай сувязных даведаліся пра планы праціўніка, умела выходзілі з акружэння, заходзілі яму ў тыл і нападалі на ворага там, дзе ён нас не чакаў.

У гэтай аперацыі вораг страціў не адну сотню сваіх салдат. Раззлаваныя няўдачамі, фашысты сталі вымяшчаць сваё зло на мірным

насельніцтве. Спалілі шмат вёсак, а вёскі Вяда, Красніца, Тупічыцы, Зыбайлы, Заціпша знішчылі разам з жыхарамі. Так яны думалі запалохаць народ, пазбавіць партызан падтрымкі насельніцтва. Не выйшла! Рады народных мсціўцаў раслі з кожным днём. Атрады пераўтварыліся ў брыгады — магутныя баявыя адзінкі, якія сталі наносіць яшчэ больш адчувальныя ўдары.

Пазней, калі ў наш раён прыбыла спецгрупа палкоўніка Льдова, я быў уключаны ў яе склад начальнікам разведкі. У шмат якіх баявых і разведвальных аперацыях прыйшлося прымаць удзел.

...У жыцці на маю долю выпала нямала цяжкіх удараў. Пры панскай Польшчы за ўдзел у камуністычным руху я быў асуджаны на сем гадоў турэмнага зняволення. За гэты час памерлі мая жонка і дачка. Нямецкія вылюдкі арыштавалі маю другую сям'ю, калі я пайшоў у лес, трымалі як заложнікаў, а потым расстралялі жонку і дачку. І я жыў тады адною думкаю — помсціць, бязлітасна помсціць фашызму і за сваю сям'ю, і за гора, якое яны прынеслі майму народу. Разам са мною змагаліся мой сын Мікалай і прыёмны сын Міша Сівеня...

Ляцелі пад адхон эшалоны

З успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада імя Г. Дзімітрова Дз. С. Дзмітрыева

У нашым атрадзе з першых дзён яго арганізацыі дзейнічалі дыверсійныя групы, задачай якіх было паралізаваць работу варожых камунікацый. Спачатку, каб пусціць пад адхон поезд, падрыўнікі разбіралі пуці, затым, здабыўшы тол, сталі ставіць міны спачатку націскнога дзеяння, а пазней на шнур ці шомпал.

Вызначылася дыверсійная група, якая выросла затым у роту. Камандаваў ёй Сяргей Руціч. На яго рахунку было больш за 30 пушчаных пад адхон варожых эшалонаў, шмат аўтамашын, падарваных і разбітых на шашы, удзел у дзесятках баёў з акупантамі і іх памагатымі. Пра подзвігі маладых патрыётаў Сяргей Руціч расказаў у сваёй кнізе «Навекі юныя». Ён узнагароджаны ордэнам Леніна.

У роце Руціча лідэрам па колькасці пушчаных пад адхон эшалонаў з'яўлялася дыверсійная група Віктара Скарыны. У яе ўваходзілі Аляксей Барушка, Іван Віткоўскі, Іван Бурвін, Вано Карэлі, Мікалай Казімірчык і другія. Група праводзіла аперацыі на чыгунцы то ў Косаўскім, то ў Бярозаўскім раёнах, а то дабіралася і да Дзівінскага. Віктар Фёдаравіч Скарына ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I і II ступені.

23 жніўня 1943 г. у баі каля вёскі Квасевічы быў смяротна паранены камандзір першай роты Георгій Сцяпанавіч Майсееў. Падрыўнік Рыгор Ткач пакляўся адпомсціць за смерць свайго любімага камандзіра. Сваю клятву ён стрымаў. Дыверсійная група, дзе падрыўнікамі былі Рыгор Ткач і Мікалай Емяльянаў, выйшла на чыгунку паміж станцыямі Косава-Палескае і Бронная Гара. Ноччу немцы спынялі рух паяздоў, затое днём пускалі іх на вялікай хуткасці. Выхаду не было — трэба ставіць міну днём. Дакладна вывучыўшы пераходы патрулёў паміж гарнізонамі, спадзеючыся на паніжаную пільнасць немцаў — ну хто асмеліцца днём на вачах ахоўнікаў наблізіцца да чыгункі — падрыўнікі рушылі ў дарогу. Калі сонца ўжо добра паднялося, партызаны між карчоў лазы папаўзлі да чыгункі. Патрулі прайшлі да Бронай Гары, назад будуць праз дзве гадзіны. Гэты час трэба выкарыстаць. Вось міна пастаўлена. Працягнуты шнур. Хутка паказаўся эшалон. Ён набліжаўся да месца ўстаноўкі міны. І Рыгор з усяе сілы пацягнуў на сябе шнур, і ... грымнуў выбух. З трэскам і скрыгатам папаўзлі з

Р. К. Ткач.

М. Емяльянаў.

высокага насыпу пад адхон паравоз і платформы з самалётамі. 16 самалётаў, якія везлі гітлераўцы на рамонт, засталіся ў беларускім балоце.

Рыгор Ткач прыбыў у наш атрад летам 1942 года, удзельнічаў у баі за Косава, змагаўся пад Бялавічамі, быў паранены, удзельнічаў у знішчэнні 15 варожых эшалонаў. Ратныя подзвігі адважнага партызана адзначаны ордэнам Леніна.

Гераічны подзвіг на чыгунцы здзейсніў мужны патрыёт з Гошчава Міша Юрашчык. Сёмы свой эшалон ён падарваў разам з сабой. Апынуўшыся ў засадзе, Міша быў паранены і, каб не трапіць у рукі ворага, мінай узарваў сябе перад падыходзячым поездам. Пасмяротна ён узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалём «За адвагу».

Дыверсійныя групы атрада днём і ноччу блакіравалі чыгунку і шашу Брэст—Баранавічы. У адзін з вераснёўскіх дзён 1943 года група Дзмітрыя Сінькова, у якую ўваходзілі Зайка Іван, Міхайлік Васіль, Макаранка Уладзімір, Зайка Васіль і Максімчык Іван заклалі міну паблізу станцыі Косава-Палескае, дзе побач паралельна праходзіць шаша Брэст—Баранавічы. Узрыўной хваляй падняло паравоз і выкінула пад шашу. На другі дзень па вёсках пайшоў жарт: «Фашысцкім паравозам застаецца ездзіць толькі па шашы».

Высокай баявой актыўнасцю вызначалася група падрыўнікоў Пятра Серады. Гэта быў мужны хлопец родам з Запарожжа. У 1942 годзе, кантужаны, ён трапіў у палон і аказаўся ў лагеры ў Германіі. Знясільваючая праца і голад касілі рады палонных. Спробы пабегу не ўдаваліся. А тут у лагер з'явіліся вярбоўшчыкі ў казакі для барацьбы з партызанамі, абяцалі добры харч, адзенне і зброю. «Вось табе і шанс пабегу», — падумаў Серада і згадзіўся стаць казаком. З ліку тых трыццаці завербаваных вязняў ён аказаўся на Броннай Гары на ахове лесапільнага завода. Хутка выйшаў на партызанскіх сувязных, праз якіх затым з сябрам дабраўся ў наш атрад. Стаў мінёрам у групе Карасёва, а калі таго перавялі палітруком роты, стаў камандзірам дыверсійнай групы. У гэтай групе былі старыя вопытныя партызаны Рыгор Ткач, Мікалай Емяльянаў, Аляксандр Карэцкі і мясцовыя хлопцы з веснавога папаўнення Ігнат Собаль і Міша Бянько з Квасевіч, Мікалай Банасевіч з Гошчава, Аляксей Дробат з Куляшоў. 12 эшалонаў пусціла гэта група пад адхон, адзін з іх — на стрэлках станцыі Косава-Палескае. Пётр Серада праз агентурную разведку вёў перагаворы з казакамі гарнізона на Броннай Гары, і ўсе яны разам з камандзірам (есаулам) прыйшлі ў атрад.

Актыўна дзейнічалі і іншыя групы. Так, напрыклад, мінёр Іван Віткоўскі ўзарваў 12 эшалонаў, Сцяпан Астапчук — 9, Мікалай Казімірчык — 18, Аляксей Купракоў — 8, Пётр Ярчак — 6.

Усяго партызанамі нашага атрада было пушчана пад адхон 160 варожых эшалонаў. Пры аварыях было знішчана 184 паравозы, разбіта 934 вагоны, платформы, цыстэрны.

Актыўную баявую дзейнасць праводзілі нашы бранябойшчыкі. Так, напрыклад, Іван Гойшык і Аляксандр Дрозд з ПТР вывелі са строю сем паравозаў.

Былі і страты. Загінулі нашы таварышы мінёры Леанід Бяссонаў, Павел Бабышкін, Аляксей Астапчык, Дзмітрый Панашчык, Іван Мацвяеня, Мікалай Крысько, Міхаіл Мароз, Мікалай Майсеенка і іншыя.

Як гэта было

З успамінаў былога камандзіра партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі М. У. Сенькіна*

Сапёрны батальён, у якім я служыў, з мая 1940 года прымаў удзел у будаўніцтве ўмацаванага раёна.

22 чэрвеня немцы адкрылі ўраганны агонь па размяшчэнні нашых рот...

Захопленыя знянацку воіны батальёна ўступілі ў бой каля станцыі Семяцічы, вёсак Мельнікі і Казённа-Мошчаная. Сувязі са штабам дывізіі, а таксама з суседзямі ў нас не было. Не хапала боепрыпасаў і транспартных сродкаў. Стрымліваючы націск ворага і змагаючыся да апошняга патрона, наша часць прабівалася ў пункт збору дывізіі да вёскі Агароднікі Высокаўскага раёна. У гэтых баях гераічна загінулі лейтэнанты Аляксандр Ордзін,

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кнігі «Буг в огне» (Мн., 1977. С. 226—233).

Дзмітрый Рамашат, Сяргей Чмутаў і сотні байцоў...

З групай у складзе 18 чалавек мы прабіліся да станцыі Гайнаўка, якая падверглася знішчальнай бамбардзіроўцы. Зноў прынялі бой, двойчы кідаліся ўрукапашную. Тут страцілі 9 чалавек. Сталі адыходзіць на Слонім.

2 ліпеня мы выйшлі да ракі Зальвянка... І вось ідзём праз раку, а потым па топкім балоце. Ідзём па чыстым полі на кулямёты і мінамёты ворага. Большасць загінула. Мяне параніла ў галаву і моцна кантузіла. Палон...

Уцёкі мы здзейснілі ў красавіку 1942 года. Мы — гэта малодшы лейтэнант В. А. Галубкоў, лейтэнант М. Б. Савоська, лейтэнант Разанаў (два апошнія перад вайной закончылі Калінкавіцкае ваеннае вучылішча). Пры пераадоленні драцяных загарод Разанаў загінуў. Ішлі пешшу. Ішлі доўга. Перажылі шмат нягод. Толькі ў верасні 1942 г. трапілі на зямлю Беларусі.

На Кракоцкіх хутарах Слонімскага раёна ўліліся ў групу партызан, сярод якіх былі Іван Раманаў, Міхаіл Бадальян, Міхаіл Лойка, Фёдар Парубай, Якаў Гуляеў. Яны хаваліся тут пасля вялікай аблавы гітлераўцаў у Буленскіх лясах. У лістападзе блакада была знята. Камандзір атрада «Савецкая Беларусь» М. У. Бабкоў загадаў усім групам, раз'яднаным на час блакады, зноў сабрацца ў Буленскіх лясах.

Трэба адзначыць, што цэнтрам арганізацыі партызанскага руху на тэрыторыі Косаўскага, Пружанскага, Ружанскага, Бярозаўскага і Поразаўскага раёнаў з'яўляўся Брэсцкі абласны падпольны антыфашысцкі камітэт, які ўзначальваў Іосіф Паўлавіч Урбановіч («Максім»).

У чэрвені 1943 года камандзір атрада «Савецкая Беларусь» і я як начальнік штаба гэтага атрада былі выкліканы ў штаб да С. І. Сікорскага. Пасля працяглай гутаркі ён прапанаваў на базе атрадаў «Савецкая Беларусь», імя Кірава, імя Дзімітрова, імя Гастэлы, імя Чкалава, імя Суворава стварыць партызанскую брыгаду са штабам у Гута-Міхалінскіх лясах. Пры яе штабе павінны былі працаваць абласны і раённы антыфашысцкія камітэты, выпускацца газета «За Радзіму» і лістоўкі.

Камандзірам брыгады быў назначаны М. У. Бабкоў, камісарам — я, начальнікам штаба — Р. К. Дарафееў.

М. У. Сенькін.

І. І. Баброў.

У ліпені ці жніўні 1943 года ў сувязі з тым, што брыгада аказалася вялікай і ёю цяжка ўпраўляць, а таксама ў прадбачанні будучага рэйду ў Белавежскую пушчу, брыгаду «Савецкая Беларусь» (па прапанове І. І. Баброва) раздзялілі на дзве — «Савецкая Беларусь» і імя Панамарэнкі.

Мяне назначылі камандзірам брыгады імя Панамарэнкі. Камандзірам брыгады «Савецкая Беларусь» застаўся М. У. Бабкоў.

Гэтыя брыгады кантралявалі частку Слонімскага, Косаўскага, Пружанскага, Ружанскага, Бярозаўскага і Поразаўскага раёнаў. Закрывалі шляхі перасоўвання акупантаў па чыгунках Брэст — Масква, Ваўкавыск — Слонім і па шашах Ружаны — Пружаны, Косава — Слонім, Косава — Ружаны.

Дыверсійныя групы здзяйснялі аперацыі ў Камянецкім, Высокаўскім, Кляшчэльскім, Гайнаўскім раёнах і ў гарадах Пружаны, Ружаны, Бяроза, Слонім, Косава і г.д.

Нярэдка партызаны вялі адкрытыя баі з акупантамі.

Не забыць мне бою каля в. Бялавічы Івацэвіцкага раёна. У ім фашысты былі разбіты...

Дорага дасталася партызанам перамога. Смерцю героя загінуў Іван Іванавіч Баброў. Смяртэльна паранены быў камісар брыгады Канстанцін Дзям'янавіч Талочка. Цяжкія раненні атрымалі камісар атрада імя Дзімітрова Фёдар Савін, начальнік штаба атрада Аляксандр Талалуеў, а таксама восем бясстрашных байцоў-партызан...

Неяк у 1943 г., вяртаючыся з задання, мы рашылі адпачыць у размяшчэнні атрада імя Дзімітрова. Дзімітроўцы прынялі нас гасцін-

на — накармілі, расказалі пра абстаноўку ў раёне і далі транспарт. У Буленскі лес з намі павінен быў ехаць работнік падпольнага антыфашысцкага камітэта Аляксандр Мініч («Волкаў»). Не паспелі мы ад'ехаць і пяці кіламетраў, як нарваліся на засаду. Бачачы, што фашысты імкнуцца акружыць нас, я загадаў заняць кругавую абарону, але тут, на няшчасце, быў паранены ў грудзі навылёт кулямётчык Аляксей Бызаў. Трэба было абараняцца і ратаваць таварыша... Бачачы перавагу сіл ворага, мы з боем адышлі за палатно вузкакалейкі, а затым удала адарваліся ад праціўніка.

Позна вечарам, мокрыя, выйшлі да вёскі Юрчыкі. На хутары нам сказалі, што немцы занялі ўсе вёскі, якія акружаюць Гута-Міхалінскі лес, Сялецкі тракт, Сялец, Шчытно.

Параіўшыся, рашылі прабівацца ў Буленскі лес. Праўда, да яго кіламетраў пятнаццаць, а людзі змучыліся.

Мініч ведаў многіх сялян, якія дапамагалі партызанам, і прапанаваў адпачыць на хутары ў Антона Мікалаевіча Пестрака або Міхаіла Антонавіча Бакаўца.

Пестрак аказаўся рухавым, год пяцідзесяці мужчынам. Даведаўшыся ў Мініча, што мы за людзі і як цяжка паранены наш таварыш, ён азнаёміў нас з абстаноўкай.

— Гітлераўцы рашылі напасці на атрад Дзімітрова; з гэтай мэтай яны з Бярозы прыслалі падмацаванне гарнізону горада Косава. Каля палка іхняй пяхоты размясцілася ў вёсках Юрчыкі, Квасевічы, Бялавічы, Хрышчонавічы, Шчытно. Яны блакіравалі Сялецкі тракт, чыгунку Бяроза — Івацэвічы і хочуць прачасаць Гута-Міхалінскі лес. Мясцовыя паліцэйскія расказваюць, што партызаны замініравалі дарогу Юрчыкі — Міхалін — Сялец, на ўсіх дарогах зрабілі завалы, пабудавалі дрэва-земляныя кропкі і звязалі іх акопамі ў поўны профіль. Сёння ўвесь дзень ішоў бой... Немцы страцілі тры танкі, дзве аўтамашыны, шмат параненымі і забітымі, а пастаўленай мэты не дасягнулі. Вялікая група спынілася і ў нашай вёсцы Лазаўцы.

Пакуль Антон Мікалаевіч расказваў, яго жонка падрыхтавала нам падсілкавацца. Старэйшая дачка Ліда абмыла і перавязала рану Бызаву. Партызаны засыналі седзячы. Адчувалася знямога.

Знаходзячыся ў паўкіламетры ад фашыстаў, мы ўсё ж рашылі застацца ў Антона Мікалаевіча, папярэдне расставіўшы варту. Прымаючы нас, Пестрак рызыкаваў сваім жыццём, жыццём шасцярых дзяцей. Але савецкі патрыёт як мог дапамагаў партызанам у іх свяшчэннай барацьбе за Радзіму.

У 1943 годзе Антон Мікалаевіч са сваёй сям'ёй пайшоў у партызаны.

З Міхаілам Антонавічам Бакаўцом з вёскі Галік Івацэвіцкага раёна я пазнаёміўся ў 1943 годзе. Ён дастаўляў партызанам разведданыя, дапамагаў зброяй, адзеннем, харчаваннем, але ўсё гэта можна назваць кропляю ў моры ў параўнанні з тым, што Бакавец зрабіў для Радзімы ў 1944 годзе.

Адкатваючыся пад ударамі Чырвонай Арміі на захад, нямецка-фашысцкія захопнікі ў сваіх гнюсных мэтах выкарысталі беларускіх нацыяналістаў, якія прыбылі ў абозе фашысцкай арміі.

У снежні 1943 года гітлераўцы стварылі так званую «беларускую цэнтральную раду», на чале якой паставілі былога слуцкага памешчыка Радаслава Астроўскага. Гэтая фашысцка-нацыяналістычная кліка пачала мітусню па стварэнні батальёнаў, якія павінны былі змагацца з часцямі Чырвонай Арміі і весці барацьбу супраць партызан.

І вось я прапанаваў Міхаілу Антонавічу пайсці служыць у такі батальён у горад Косава, каб забяспечыць нас усімі матэрыяламі разведкі.

У штыкі сустрэў Бакавец маю прапанову, раззлаваўся, амаль што не назваў мяне здраднікам, і толькі калі зразумеў, як патрэбны там наш чалавек, супакоіўся.

— Для Радзімы не пашкадую і жыцця, — заявіў ён. — Зраблю, таварыш камбрыг, усё, што загадаеце.

За час сваёй службы Міхаіл Антонавіч загітаваў і накіраваў у партызаны моладзь з вёсак Скураты, Дубітава і Ружаны, якая трапіла на службу да фашыстаў. Дзякуючы яму, камандаванне брыгады мела поўныя даныя пра косаўскі гарнізон. Праз Міхаіла Антонавіча, які стаў загадчыкам склада боепрыпасаў, мы атрымалі многа зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў...

Дакументы сведчаць

З БАЯВОГА ЖУРНАЛА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ М. А. ШЧОРСА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ АТРАДА НА ЧЫГУНАЧНЫХ КАМУНІКАЦЫЯХ ПРАЦІЎНІКА Ў 1942 ГОДЗЕ

Не пазней 28 красавіка 1943 г.

1942 год

22 жніўня абстралялі цягнік, які ішоў з захаду на ўсход з боепрыпасамі і жывой сілай праціўніка. У выніку забіта 17 і паранена 9 чалавек. Аперацыяй кіраваў камандзір атрада тав. Пранягін.

26 жніўня. У ноч на 26 жніўня разабраны чыгуначны пуць на Брэст-Маскоўскай лініі (Ізвяно) і парвана сувязь на адлегласці 50 м. Спалена чыгуначная будка. У тую ж ноч на Брэст-Маскоўскай шашы парвана сувязь на [адлегласці] 200 м і забіты 1 гітлеравец. [Аперацыямі] кіраваў нач. штаба...

19 кастрычніка на чыгункі Пінск — Лунінец пушчаны пад адхон воінскі эшалон. У выніку крушэння пашкоджаны паравоз, разбіты тры пасажырскія вагоны і знішчана 50 гітлераўцаў, у тым ліку 13 вышэйшых афіцэраў лётнага складу. У аперацыі прымалі ўдзел 3-ці і 4-ы ўзводы 54-й групы пад кіраўніцтвам Лопанцава і Сотчанкі...

6 лістапада на чыгункі Брэст — Баранавічы пушчаны пад адхон воінскі эшалон з жывой сілай праціўніка. У выніку крушэння пашкоджаны паравоз, разбіта 6 пасажырскіх вагонаў, забіта і паранена 100 гітлераўцаў. У аперацыі ўдзельнічалі: Казакоў, Кавалёў, Іцін, Бабкоў, Качкаха, Мадыстаў, Дронаў, Усаў, Прыходзька і Якубчык (54-я група)...

13 лістапада на чыгункі Брэст — Баранавічы пушчаны пад адхон эшалон з ваенным грузам. У выніку пашкоджаны паравоз і разбіта 7 вагонаў. У аперацыі ўдзельнічалі Кавалёў Аляксандр, Масальскі і Лукашык (54-я група).

17 лістапада на чыг. Слонім — Баранавічы пушчаны пад адхон эшалон з жывой сілай праціўніка. У выніку крушэння пашкоджаны паравоз і разбіта 6 вагонаў, забіта і паранена 150 гітлераўцаў. Удзельнічалі Пархоменка, Панасеня, Бабкін, Рамачоў і Вінаградаў (54-я група)...

25 красавіка 1942 г. разабрана чыгуначнае палатно на ўчастку чыг. Брэст — Чаромха і пушчаны пад адхон эшалон праціўніка з ваенным матэрыялам. Разбіта 7 платформаў і пашкоджаны паравоз. Рух на гэтай лініі быў прыпынены на 18 гадзін. У аперацыі прымалі ўдзел: Гаюшкін, Сінькоў, Снегіроў і Цішчанка (54-я група).

10 чэрвеня 1942 г. разабрана чыгуначнае палатно на чыг. Слонім —Баранавічы і пушчаны пад адхон вайсковы эшалон праціўніка з ваенным матэрыялам. Разбіта 7 платформаў і пашкоджаны паравоз. Рух на гэтай лініі быў прыпынены на 18 гадзін. У аперацыі ўдзельнічалі: Лявонцьеў (кіраўнік), Усаў, Лапанцаў, Данілюк, Вінаградаў, Панасеня, Бабкін (54-я група).

14 чэрвеня 1942 г. пушчаны пад адхон варожы эшалон, які ішоў на фронт з жывой сілай праціўніка і боепрыпасамі. У выніку крушэння знішчаны: 1 паравоз, 2 вагоны з жывой сілай, 17 вагонаў з пераправачнымі сродкамі і пашкоджана 9 вагонаў з боепрыпасамі. Забіта 65 гітлераўцаў. Рух цягнікоў на гэтай лініі быў прыпынены на 2 сутак. Месца пуска — Каколіцкі лес, Ружанскі раён. Удзельнікі: Бялых Н. П., Тунікаў І. А., Мерзлякоў П. І., Грачоў Н. І., Талкачоў Ф. Ф., Казанцаў Ф. П., Казак В. П., Драхлоў С. Т. (52-я група)...

22 чэрвеня 1942 г. у раёне Даманава — Івацэвічы пушчаны пад адхон воінскі эшалон праціўніка, які ішоў на фронт. Знішчаны: 1 паравоз, 7 вагонаў з боепрыпасамі, 4 вагоны з жывой сілай, пашкоджана 6 вагонаў з тэхнікай. Удзельнічалі: Бялых Н. П., Тунікаў І. А., Ваганаў Н. Ф., Манушкін І. І., Пянягін І. І., Кавалёў І. Г., Ажыгулаў М. Б., Хрысціянаў П. П., Драхлоў Сцяпан Трафімавіч, Курскі Іван Міхайлавіч, Каржалых Рыгор Фам., Носікаў Дзмітрый Дзмітр., Жураўлёў Рыгор Мік., Казанцаў Фёдар Пр. (52-я група), Лі Іван Аляксеевіч, Шувалаў Васіль Дзм. і Міхееў Н. І.

25 чэрвеня 1942 г. у раёне Даманава—Івацэвічы пушчаны пад адхон воінскі эшалон праціўніка, які ішоў на фронт. У выніку крушэння знішчаны: 1 паравоз, 16 вагонаў з жывой сілай, пашкоджана 5 вагонаў. Забіта каля 200 гітлераўцаў. Удзельнікі: Казанцаў Ф., Бялых Н., Тунікаў, Грачоў, Талкачоў, Казак, Драхлоў, Ажыгулаў, Калёнаў, Талочка Канстанцін (52-я група).

9 ліпеня 1942 г. у раёне чыг. ст. Бяроза-Картузская пушчаны пад адхон варожы эшалон з жывой сілай і тэхнікай. Знішчаны 1 паравоз і 6 вагонаў, шмат [вагонаў] пашкоджана. Удельнікі: Іваноў Т., Басалаеў І., Дзівіцкі (52-я група).

10 жніўня 1942 г. здзейснена крушэнне воінскага эшалона праціўніка ў раёне Бярозы-Картузскай, які ішоў на фронт з вугалем і пераправачнымі сродкамі. Знішчаны 1 паравоз, разбіта 8 вагонаў і пашкоджана 15 платформаў.

16 жніўня 1942 г. у раёне Бярозы-Картузскай пушчаны пад адхон воінскі эшалон з жывой сілай праціўніка. Знішчаны: 1 паравоз, 9 вагонаў з салдатамі, пашкоджана 11 вагонаў...

30 жніўня 1942 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарвана чыг. палатно. Рух цягнікоў на гэтай лініі быў затрыманы на 12 гадзін. Кіравалі аперацыяй камандзір групы Лявонцьеў і камандзір 4-га ўзвода Сотчанка (54-я група).

26 верасня 1942 г. на ўчастку чыг. Быцень — Лясная ўзарваны воінскі эшалон, які ішоў на ўсход з вугалем. Знішчаны паравоз, 14 вагонаў, пашкоджана 4 вагоны. Удзельнічалі: Бялых Н. П., Белавусаў Вас.Андр., Хомаў Максут, Мікіцюк Ал. Дзм., Якунін Анат., Казак Вікт., Пянягін Іван, Ціхон Міхаіл, Жураўцаў Іван, Цюлюбееў Колдас, Гаранін Вас., Трухін Міх. (52-я група).

28 верасня 1942 г. на ўчастку чыг. Слонім — Лясная ўзарваны эшалон... праціўніка, які ішоў на фронт з харчаваннем і абмундзіраваннем. Знішчаны: паравоз, 9 вагонаў, 7 вагонаў пашкоджана...

29 верасня 1942 г. на ўчастку чыг. Слонім — Лясная ўзарваны эшалон... з жывой сілай. Знішчаны паравоз і 11 вагонаў, 6 вагонаў пашкоджана. Забіта і паранена да 300 гітлераўцаў...

31 верасня 1942 г. на ўчастку чыг. Быцень — Лясная ўзарваны... эшалон з ваеннай тэхнікай (танкі, артылерыя). Знішчаны паравоз і 12 вагонаў, пашкоджана 6 вагонаў...

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1967. Т.1. С.559—562.

З ДЗЁННІКА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ В. П. ЧКАЛАВА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ З 2 ЛІПЕНЯ ДА 7 КАСТРЫЧНІКА 1943 г.

2 ліпеня 1943 г. на чыг. Брэст — Чаромха ўзарваны эшалон з боепрыпасамі. Разбіты 1 паравоз, 9 вагонаў. Затрыманы рух на 20 гадзін. Удзельнічалі: Калеснікаў, Рутман, Ціхаміраў, Непагодзін.

28 ліпеня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарвана 28 рэек. Затрыманы рух на 13 гадзін. Удзельнічала дыверсійная група пад кіраўніцтвам Калеснікава.

1 верасня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарвана 20 рэек. Затрыманы рух на 10 гадз. Удзельнічаў узвод пад камандаваннем камандзіра роты Калеснікава.

9 верасня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарвана 40 рэек. Кіраваў камандзір роты Калеснікаў.

11 верасня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарвана 30 рэек. Удзельнічаў узвод пад кіраўніцтвам Калеснікава...

14 верасня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарваны эшалон з боепрыпасамі і абстраляны. Разбіты 1 паравоз, 9 вагонаў. Затрыманы рух на 17 гадз. Удзельнічалі: Калеснікаў, Канакоў, Бязрукаў, Бонк, Кудрашоў, Плаух.

15 снежня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарваны эшалон з жывой сілай праціўніка. Забіта 60 салдат і афіцэраў. Затрыманы рух на 13 гадзін.

18 верасня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарваны эшалон з ваеннай тэхнікай праціўніка. Разбіты паравоз і 11 вагонаў. Затрыманы рух на 42 гадзіны.

30 верасня 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарваны воінскі эшалон з ваеннай тэхнікай. Разбіты паравоз, 5 вагонаў. Затрыманы рух на 18 гадзін. Удзельнічалі Калеснікаў, Арцёмаў.

30 верасня 1943 г. на чыгунцы Брэст — Баранавічы ўзарвана 40 рэек...

7 кастрычніка 1943 г. на чыг. Брэст — Баранавічы ўзарваны эшалон з жывой сілай праціўніка. Разбіты 1 паравоз і 8 вагонаў. Забіта 74 немцы. Затрыманы рух на 21 гадз. Удзельнічалі: Калеснікаў, Арцёмаў, Бязрукаў, Канакоў, Смакоцін, Жданюк.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1978. Т.2, кн.2. С.300—301.



Група партызан пад час традыцыйнай сустрэчы ў Гута-Міхаліне. 1957 г.

СПРАВАЗДАЧА САКРАТАРА КОСАЎСКАГА АНТЫФАШЫСЦКАГА КАМІТЭТА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ М. Ф. ТРЫНДЫ АБ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЙ І БАЯВОЙ РАБОЦЕ АНТЫФАШЫСЦКІХ І КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, СТВАРЭННІ НОВЫХ ПАДПОЛЬНЫХ ЯЧЭЕК, АКАЗАННІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ПАРТЫЗАНСКІМ АТРАДАМ АНТЫФАШЫСЦКІМІ ПАДПОЛЬНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ Ў 1943 ГОДЗЕ

10 снежня 1943 г.

Перададзена антыфашыстамі ў партызанскія атрады наступнае: прадуктаў збожжавых: жыта — 323 пуды, ячменю — 20 пуд., аўса — 95 пуд., грэчкі — 7 пуд. Усяго: 445 пуд.

Прадуктаў ядомых: крупы — 8 кг, масла каровінага — 15 кг, мёду — 2 кг, гароху — 40 кг, цукру — 3 кг, пышак — 10 [кг], сала — 4 кг, сушаныя фрукты — 1 кг, рубашак (верхніх) — 2, ануч — 3 пары, шапак — 1, цёплых рубах — 8, шалікаў — 1, хустак — 1, кажухоў — 1, валёнак — 1 пара.

Табакі — 2,5 кг, папярос — 5 пачак, яек — 283 шт., палатна на маскхалаты — 94 м.

Медыкаментаў: хірургічных нажніц — 3 шт., бінтоў — 16 шт., ёду — 1 флакон і іншыя медыкаменты.

Палітмасавая работа

1. Праведзена 40 гутарак у арганізацыях на розныя тэмы, якія датычацца нашай работы па ўсіх відах.

2. З насельніцтвам праведзена 40 мітынгаў на тэму: «Вынікі летніх баёў РККА», даклад тав. Сталіна. Праведзена [растлумачальная] работа супраць варожай ваеннай мабілізацыі і вывазу [насельніцтва] у нямецкую няволю.

3. Праведзена растлумачальная работа па падрыхтоўцы насельніцтвам схронаў у лесе і складоў харчавання, абмалоце ўраджаю і прыхоўванні яго.

4. Праводзілі распаўсюджванне газеты «Заря», зводак Саўінфармбюро, брашур і г.д.

Дыверсійная работа антыфашысцкіх ячэек

Зрэзана тэлефонных слупоў — 357, знішчана ізалятараў — 580, пашкоджана тэлефоннага праваду — 18 км, спалена мастоў — 2, спалена пабудоў — 5, прадпрыемстваў — 1, знішчаны 2 аўтамашыны і 2 прычэпы, спалена жыта — 40 копнаў, узарвана трактароў — 1, узарвана паравозаў — 3, узарвана вадакачак — 1, разбурана шашы — 50 м. Спалены вайсковы склад — 1, у якім згарэў легкавы аўтамабіль і вагон выраблены скуры і бялізны.

Ахоплена населеных пунктаў антыфашысцкімі ячэйкамі — 44, ячэек старэйшага ўзросту і маладзёжных — 69, агульная колькасць членаў — 320 чалавек.

За 1943 год арганізавана новых ячэек: старэйшых узростаў — 29 ячэек, членаў — 136; маладзёжных — 7 ячэек, членаў моладзі — 37. Усяго ячэек — 36, членаў — 173.

Перададзена ў распараджэнне кіраўніцтва камсамола з арганізацый 45 чал.

Перададзена партызанам: кулямётаў — 6 (шэсць), вінтовачных патронаў 13 455 (тры-

наццаць тысяч чатырыста пяцьдзесят пяць), патронаў для ППД — 3 тыс. (тры тыс.), вінтовак — 177, аўтаматаў — 14, пісталетаў — 44, гранат — 16, выбуховых рэчываў — 45 кг.

Антыфашысцкія арганізацыі аказваюць дапамогу партызанскім атрадам разведкай, аказваюць садзеянне ў арганізацыі агентурнай разведкі, забяспечваюць вартай дарогі ў час перамяшчэння партызан...

Камсамольскія арганізацыі налічваюць ячэек — 14, з колькасцю членаў 68 і 30 сімпатызуючых, якія маюць на ўзбраенні 1 кулямёт, 20 вінтовак (спраўных), 30 вінтовак без затвораў, 2 тыс. вінтовачных патронаў, 80 гранат, 2 «дзесяцізарадкі» і паўвоза толу...

Сакратар райкома Майскі.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1974. Т. 2, кн. 2. С.535—536.

СА СПРАВАЗДАЧЫ САКРАТАРА СВЯТАВОЛЬСКАГА АНТЫФАШЫСЦКАГА ПАДРАЙКОМА ЦЕЛЯХАНСКАГА РАЁНА ДЗ. М. КАЛЕНІКА ПІНСКАМУ АБКОМУ КП(б)Б АБ ПРАВЕДЗЕНАЙ РАБОЦЕ ЗА ПЕРЫЯД З 3 ЛІСТАПАДА 1942 г. ДА 24 ЛІПЕНЯ 1943 г.

29 студзеня 1944 г.

З лістапада 1942 г. па прапанове Каленіка Дзмітрыя М. былі створаны падраённы камітэт па барацьбе з фашысцкімі акупантамі і сельскія камітэты ў вёсках заходняй часткі Целяханскага раёна. У склад падраённага камітэта ўвайшлі наступныя асобы: сакратаром Каленік Дзмітрый Мацвеевіч (псеўданім Паўлаў Іван), па падборы і выхаванні кадраў — Корзун Іван Міхайлавіч (псеўданім Юр'еў Аляксандр), па агітацыі і захаванні літаратуры — Каленік Сцяпан Іванавіч (псеўданім Раманаў Антон), сувязныя Куратнік Васіль Мацвеевіч, па разведцы і агітацыі ў Целяханах — Галоўчык Аляксандр Кандратавіч. Ад часу стварэння падраённага камітэта праведзена цяжэйшая работа па нанясенні ўдараў па ворагу і аказанні ўсякага роду дапамогі партызанскім атрадам. Нягледзячы на цяжкія ўмовы работы ў акружэнні фашысцкіх шпіёнаў, выканана наступнае: выкрыццё планаў фашысцкай арганізацыі — службы «самааховы», выкрыццё добраахвотнага набору ў паліцыю, выкрыццё фашысцкай арганізацыі БНС, устанаўленне разведкі ва ўсіх фашысцкіх установах, настаўленне моладзі супраць выезду ў Германію, настаўленне народа супраць фашыстаў, выканана шмат работ па выданні і распаўсюджанні літаратуры, створана паліцэйская ячэйка ў пастарунку Святая Воля.

У мэтах абсяжнай масавай работы 20 сакавіка 1943 г. створаны падраённы камітэт камсамола, сакратаром якога прызначаны Корзун Іван М.

Па дыверсіі выканана наступнае: у красавіку 1943 спалены 2 масты на вузкакалейцы Целяханы—Янаў. Перарывалася шмат разоў тэлефонная сувязь у напрамку Янаў—Целяханы. Звалена 30 слупоў, спалены мост на Янаўскай чыгунцы. Па аказанні дапамогі партызанскім атрадам у ваенным матэрыяле і медыкаментах было аддадзена ў атрады 10 вінтовак, 500 патронаў, 1 ППД (аўтамат), 3 гранаты, 2 патранташы, 1 бінокль, 220 патронаў, 3 лясныя планы і сумка для планаў, 2 бусолі, здадзена вялікая колькасць медыкаментаў і перавязачных матэрыялаў, таксама здадзена вялікая колькасць папярос, запалак, спірту і г.д.

Камсамольскія дыверсійныя групы падраённай камсамольскай арганізацыі сакратара Корзуна Івана Міхайлавіча выканалі наступныя работы: 15 лістапада 1942 г. звалена 6 тэлефонных слупоў на вузкакалейнай чыгунцы Святая Воля—Целяханы. 16 сакавіка 1943 г. звалена 10 тэлефонных слупоў на дарозе Святая Воля — Целяханы — Янаў. Адначасова расшыты мост і пушчаны пад адхон паравоз з вагонамі. 18 сакавіка 1943 г. звалена 18 слупоў тэлефоннай сувязі ў напрамку Янава. 20 сакавіка 1943 г. спалены малакавоз з усім яго абсталяваннем у Святой Волі. 3 мая 1943 г. звалена 8 слупоў у напрамку Целяхан. 4 мая 1943 г. быў расшыты чыгуначны пуць і пушчаны пад адхон паравоз на чыгунцы Святая Воля — Вялікая Гаць, прычым расшыты пуць у напрамку Целяхан, што дало затрымку руху на некалькі гадзін. 6—7 чэрвеня 1943 года спалены 2 чыгуначныя масты ў напрамку Целяхан. 10 чэрвеня 1943 г. расшыта чыгунка ў напрамку Целяхан і аказана дапамога сем'ям, якія ўцякалі ў лес. 11 чэрвеня 1943 г. расшыта чыгунка ў напрамку Івацэвіч. 12 чэрвеня... звалена 40 слупоў тэлефоннай сувязі і спалены чыгуначны мост. 13 чэрвеня 1943 г. спалены чыгуначны мост і расшыты чыг. пуць. 15 чэрвеня 1943 г. расклеена вялікая колькасць адозваў да паліцыі. 24 ліпеня 1943 г. расклеена вялікая колькасць афішак. 15 ліпеня 1943 г. звалена 15 слупоў у напрамку Целяхан. Пры садзейнічанні арганізацыі затрыманы 2 паравозы, якія да гэтага часу знахо-

На мітынгу ў Гута-Міхаліне запальваюць вечны агонь ля помніка партызанам. 1965 г.

дзяцца ў Целяханах. Спалены пабудовы, падрыхтаваныя для прыёму хлеба. Праведзена ўзмоцненая агітмасавая работа згодна з загадам «Ні грама хлеба немцам!». Аказана дапамога сем'ям забітых немцамі. Раздадзена 210 кг солі, 6 т сена з фашысцкіх запасаў. У далейшым адной дыверсійнай групай камсамольцаў здадзена 477 патронаў, 18 гранат, 3 вінтоўкі, 2 падсумкі. На адным участку было звалена 32 слупы тэлефоннай сувязі, расшыта 2 км чыгункі, ... пушчаны пад адхон паравоз з вагонамі. Другой групай здадзены 2 вінтоўкі, 1 самазарадка, 2 гранаты, 2 бусолі, 150 патронаў, 30 кг мёду, 20 пачак сахарыну. У дапамогу партызанскім сем'ям здадзена 200 кг хлеба, 100 кг крупы, таксама іншыя прыналежнасці...

Сакратар камітэта Каленік.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1973. Т.2, кн.1. С.551—552.

З ЗАГАДУ № 66 КАМАНДАВАННЯ БРЭСЦКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ АБ АДБІЦЦІ ФАШЫСЦКАЙ КАРНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ, ГЕРАІЗМЕ АСАБОВАГА СКЛАДУ ПАРТЫЗАНСКІХ БРЫГАД І АТРАДАЎ У ПЕРЫЯД БАЁЎ З 3 ДА 10 КРАСАВІКА 1944 г. І БАЯВЫХ ЗАДАЧАХ ПАРТЫЗАН У БАРАЦЬБЕ З КАРНІКАМІ

10 красавіка 1944 г.

У пісьме Старшыні Саўнаркома БССР і сакратара ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнкі да брэсцкіх партызан ад 7 красавіка 1944 г. гаворыцца: ЦК КП(б)Б улічвае, што для брэсцкіх партызан наступаюць цяжкія дні з-за канцэнтрацыі нямецкіх войск, і ЦК спадзяецца, што партызаны Брэсцкай вобласці ў гэтых цяжкіх умовах праявяць неабходную вытрымку, упартасць і не дадуць крывавым захопнікам ажыццявіць іх намер па знішчэнні насельніцтва і задушэнні партызанскага руху.

І сапраўды, з 3 красавіка 1944 г. праціўнік павёў на нас наступленне з пяці напрамкаў: Івацэвічы, Няхачава, Картуз-Бяроза, Драгічын і Іванава, пусціў на нас звыш 13 тысяч пяхоты і конніцы, вялікую колькасць артылерыі, авіяцыі, а таксама танкі.

Камандна-палітычны склад брыгад і атрадаў правільна зразумеў адказнасць задачы, якая стаяла парад намі, здолеў згуртаваць вакол сябе камуністаў і камсамольцаў, баявы актыў і абаперціся на іх.

Правільна і ўмела арганізаваў барацьбу з ворагамі, давёўшы своечасова да свядомасці кожнага партызана складанасць баявой задачы, і падняў адказнасць партызан перад Радзімай, перад беларускім народам. Вось ужо восем дзён нашы партызаны на чале са свамі баявымі камандзірамі ўпарта і мужна б'юцца з ворагамі, якія пераходзяць дзесяткі разоў у наступленне. За гэты час праціўнік страціў толькі забітымі звыш 500 салдат і афіцэраў пры самай нязначнай страце з нашага боку.

У гэтых баях у барацьбе з ворагам вызначыўся сваім гераізмам і разуменнем свайго

абавязку перад Радзімай увесь асабовы склад брыгады «Савецкая Беларусь», брыгады імя Дзяржынскага, атрада імя Будзённага, атрада падпалкоўніка Кастрова і атрада імя Макарэвіча.

Камандаванне брыгады «Савецкая Беларусь» у асобе камандзіра капітана Бабкова, камісара брыгады Масалава, іншых камандзіраў і ўсяго радавога складу паказала непераўзыдзеныя ў нашай рэчаіснасці цуды і доблесць у барацьбе з гітлераўскімі нягоднікамі.

Гэта брыгада, яе слаўныя байцы, камандзіры і палітработнікі на працягу пяці дзён трымаюць у сваіх руках здзітаўскую пераправу, нягледзячы на тое, што па іх прамой наводкай і ва ўпор на працягу ўсіх гэтых дзён вядуць самы інтэнсіўны агонь тры батарэі цяжкай артылерыі, чатыры мінамётныя батарэі і танкі, дзесяткі самалётаў скідваюць бомбы і больш за дзве тысячы немцаў штурмуюць пераправу і толькі па паўторным загадзе злучэння брыгада адышла нязначна на новы рубеж абароны ў дзотах, пакінуўшы на пераправе групы для прыкрыцця, якія не даюць праціўніку арганізаваць пераправу.

За ўмелае кіраўніцтва, за храбрасць і адвагу ў барацьбе з нямецкімі акупантамі ўсяму асабоваму складу брыгады «Савецкая Беларусь», брыгадзе імя Дзяржынскага, атраду імя Будзённага, асабоваму складу атрада падпалкоўніка Кастрова, атраду імя Макарэвіча аб'яўляю падзяку.

За ўмелае кіраўніцтва сваімі часцямі, храбрасць і мужнасць, за ўзорнае выкананне баявых заданняў злучэння прадстаўляю да вышэйшай урадавай узнагароды камандзіра брыгады «Савецкая Беларусь» Бабкова Мікалая Уладзіміравіча, камісара брыгады Масалава Пятра Іванавіча, нач. штаба брыгады Дарафеева [Рыгора Кузьміча], камандзіра брыгады імя Дзяржынскага Манахава Васіля Міхайлавіча, камісара брыгады Кавалёва Паўла Рыгоравіча, нач. штаба брыгады Баранава [Фёдара Мікалаевіча], камандзіра атрада імя Будзённага Мерзлякова Карпа Емяльянавіча, камісара Каламійцава Паўла Канстанцінавіча і нач. штаба атрада Шакава Рыгора Васільевіча.

Загадваю: 1) Біць фашысцкіх захопнікаў, якія спрабуюць задушыць партызанскі рух і знішчыць беларускі народ. Біць фашыстаў, не дапускаючы іх у размяшчэнне нашых брыгад і атрадаў, біць з тылу, з флангаў, з засад, на шляхах іх руху, выкарыстоўваючы выгадныя для гэтага рубяжы. Біць гадаў у месцах іх часовага размяшчэння, не даючы ім спакою ні днём, ні ноччу.

2) З мэтай устанаўлення задум праціўніка і прынятня адпаведных контрмер весці ўзмоцненую разведку праціўніка ўсімі спосабамі; не адрываючыся ад яго, не губляючы яго з віду, імкнучыся захапіць «языка»...

3) Камандзірам брыгад і атрадаў прадставіць да ўрадавых узнагарод байцоў і камандзіраў, якія вызначыліся сваёй храбрасцю, спрытнасцю і ўменнем у барацьбе з наступаючым зараз на нас праціўнікам.

Слава героям-партызанам, якія загінулі ў баях з нямецкімі акупантамі!

Смерць нямецкім захопнікам!

Загад зачытаць усяму асабоваму складу брыгад і атрадаў.

За камандзіра партызанскіх атрадаў Брэсцкай вобл.

Нач. штаба злучэння Пранягін.

Партызанскія лістоўкі

Партызанскія лістоўкі часоў Вялікай Айчыннай вайны... Надрукаваныя на пішучай машынцы, напісаныя ад рукі, зачытаныя да дзірак, яны захоўваюцца ў архівах і музеях як бясцэнныя рэліквіі.

«Прачытай і перадай другому», — напісана ў канцы многіх з іх. У страшныя гады фашысцкага акупацыйнага рэжыму людзі чыталі іх з хваляваннем і перадавалі адзін аднаму як вялікую каштоўнасць.

У ліпені—жніўні 1941 г. было надрукавана 36 лістовак розных назваў агульным тыражом адзін мільён 782 тысячы экзэмпляраў. У ліпені таго ж года ў беларускіх лясах з'явіліся лістоўкі са зваротам Савета Народных камісараў БССР і ЦК КП(б)Б да беларускага народа.

«Свабодалюбівы і гераічны беларускі народ! Люты і нахабны вораг узняў жалезны бот над сонечнымі палямі, над квітнеючымі прасторамі нашай зямлі... Наша вайна супраць фашыстаў ёсць вайна за жыццё, за свабоду, за мірную творчую працу ўсяго чалавецтва...»

Калі партызанскі рух набыў шырокі размах, падпольныя партыйныя арганізацыі

атрымалі магчымасць ствараць падпольныя друкарні на месцах. Надрукаваныя ў іх лістоўкі з'яўляліся магутнай зброяй барацьбы з ворагам. На ўсіх трох этапах «рэйкавай вайны» лістоўкі заклікалі разбураць камунікацыйныя лініі, знішчаць варожыя цягнікі, паведамлялі аб аперацыях партызан.

У лістоўцы Брэсцкага падпольнага абкома, выдадзенай 2 чэрвеня 1943 года, пісалася: «Партызаны! Свабодалюбівыя беларусы! Вы чуеце грукат цягніка па вашай зямлі. Гэта не ваш цягнік, а фашысцкі. Ён вязе разбойнікаў з фашысцкай Германіі. Ён вязе танкі, артылерыю, боепрыпасы, гаручае і г.д. Для чаго вязе ўсё гэта праклятыя фашыст? Для таго, каб забіць вашых бацькоў, матак, вашых родных дзяцей, каб разбурыць ваш горад, вёску, дом. Што ж рабіць? Трэба рваць дарогі. Няхай яны стануць магілай для кожнага акупанта. Ушчэнт разбіваць нямецка-фашысцкія эшалоны! Не прапускаць іх на фронт!»

Лістоўкі падпольнага абкома КП(б)Б Брэсцкай вобласці, у склад якой уваходзіў Косаўскі раён, вельмі часта давалі звесткі пра ўдалыя аперацыі партызан.

Падводзячы вынік двухгадовай барацьбы савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі, Брэсцкі абком КП(б)Б выпусціў лістоўку, у якой паведамлялася: «...Народныя мсціўцы-партызаны знішчылі дзесяткі тысяч гітлераўцаў, пусцілі пад адхон тры тысячы варожых цягнікоў, знішчылі 895 складоў з узбраеннем, узарвалі 3263 чыгуначныя і шасэйныя масты, знішчылі шмат тысяч аўтамашын, бронемашын і танкаў».

27 мая 1944 года, калі ўжо частка Беларусі была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у лістоўцы Брэсцкага антыфашысцкага камітэта пісалася: «На аднаўленне разбуранай гітлераўцамі народнай гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад нямецкіх акупантаў, дзесятая сесія Вярхоўнага Савета СССР адпусціла 16 мільярдаў рублёў. Значная частка гэтай сумы даўно ўжо адлічана для Беларусі...»

Не было такой падзеі ў Вялікую Айчынную вайну, на якую б не адгукнуліся партыйныя і камсамольскія органы Беларусі ў сваіх лістоўках і газетах... Нягледзячы на невялікі памер і лаканічнасць выкладання, кожная з іх уяўляла сабою твор з глыбокім зместам, які адыграў у барацьбе з ворагам ролю баявой зброі.

Я. Бутрым.

З ЛІСТОЎКІ МІЖРАЁННАГА АНТЫФАШЫСЦКАГА «КАМІТЭТА БАРАЦЬБЫ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ» БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ З ЗАКЛІКАМ ДА МОЛАДЗІ АБ УСТУПЛЕННІ Ў РАДЫ ПАРТЫЗАН

Красавік 1943 г.

Смерць нямецкім акупантам!

Моладзь Беларусі!

Ужо 22 месяцы як Чырвоная Армія вядзе гераічную нечуваную ў гісторыі барацьбу з праклятым ворагам нашай Савецкай Радзімы — з нямецкім фашызмам. За гэты час Чырвоная Армія не толькі адбіла наступленне нямецкіх варвараў, але і нанесла ім знішчальныя ўдары. Толькі за чатыры месяцы і 20 дзён наступлення Чырвоная Армія прайшла на захад ад 600 да 700 км. Дзесяткі гарадоў, тысячы сёл і вёсак вызвалены ад нямецкіх людаедаў. Найлепшыя нямецкія палкі і дывізіі загінулі пад Масквой, Ленінградам і Сталінградам. Каб пакрыць гэтыя велізарныя страты, Гітлер выскрабае ўсе свае астаткі ў людзях сярод нямецкага насельніцтва. Акрамя гэтага, праводзіць мабілізацыю сярод усіх акупіраваных народаў, у тым ліку сярод беларускай моладзі.

Беларускія фашысты з так званага «Беларускага камітэта» і «Беларускай рады»... узялі на сябе місію арганізаваць беларускія баявыя групы і нават корпус пад кіраўніцтвам нямецкага генеральнага штаба з беларускай моладзі для барацьбы з партызанамі.

Гэтыя сапраўдныя здраднікі беларускага народа рабілі паслугі ўсім урадам, якія прыгняталі беларускі народ. І ў апошні раз з усіх сіл (крывёю сыноў беларускага народа) хочуць прыслужыцца Гітлеру, які ператварыў нашу родную квітнеючую Беларусь у магільнік, а сотні тысяч вёсак, сёл і гарадоў у папялішчы. Якую мэту праследуе гэта мабілізацыя? Мэта ясная. У першую чаргу для барацьбы з народнымі мсціўцамі, героямі-партызанамі, якія выконваюць свой свяшчэнны абавязак перад Радзімай і трымаюць пад абаронай мірнае насельніцтва. Па-другое, дапамагаць гітлераўскім катам рабаваць і забіваць насельніцтва

Беларусі без адрознення пола і ўзросту, паліць хаты, сёлы і гарады. Па-трэцяе, гнаць у Нямеччыну на катаржныя работы сваіх братоў і сясцёр.

Моладзь Беларусі! Ваша месца не ў гітлераўскай арміі, не ў яе паліцыі, не ў «беларускіх» групах і карпусах, не быць катамі сваіх братоў і сясцёр, бацькоў і маці. «Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі» заклікае ўсю моладзь Беларусі замест таго, каб служыць людаеду Гітлеру, ісці ў лясы, у партызанскія атрады на барацьбу з заклятым ворагам нашай Савецкай Радзімы — гітлераўска-гестапаўскай бандай. Гітлеру не дапамагаць, а помсціць за пралітую кроў нашага народа, за разбураныя гарады і спаленыя сёлы. Бярыце прыклад са слаўных байцоў Чырвонай Арміі, якія сваім гераізмам у барацьбе з нямецкімі акупантамі пад Масквой, Ленінградам, Сталінградам, Севастопалем і Адэсай пакрылі сябе неўміручай славай. Бярыце прыклад са слаўных чырвоных партызан, якія вядуць гераічную барацьбу з прыгнятальнікамі нашай свяшчэннай Радзімы...

Смерць нямецкім акупантам і іх прыспешнікам! Далоў фашысцкую мабілізацыю на [тэрыторыі] Беларусі! Няхай жыве гераічная Чырвоная Армія, чырвоныя партызаны і партызанкі!

Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле зб.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1973. Т. 2, кн.1. С. 305—306.

Як ворагі бралі самалёт

З успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада імя Г. Дзімітрова Дз. С. Дзмітрыева

У маі 1943 г. партызаны Гута-Міхалінскага лесу падрыхтавалі на Міхалінскім полі аэрадром для прыёму самалётаў з Вялікай зямлі. У канцы мая транспартны самалёт прызямліўся, экіпаж перадняваў, а вечарам другога дня, забраўшы 20 параненых партызан, узняўся ў паветра. Але адбылося непрадбачанае — зачапіўся за вершаліны дрэў і загарэўся. Экіпаж не разгубіўся: пры пасадцы хутка вынеслі з палаючага самалёта параненых, і самалёт узарваўся. Рэшткі яго ляжалі ў лесе. А ў верасні 1943 года штаб партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі атрымаў паведамленне, што гітлераўцы і паліцыя з Бярозы і Сяльца рыхтуюцца забраць гэты самалёт. Каб перашкодзіць гэтаму, камандзір брыгады імя Панамарэнкі Мікалай Уладзіміравіч Сенькін з атрадаў імя Г. Дзімітрова і імя С. М. Кірава арганізаваў ударную групу партызан і сам узначаліў яе. У намечаны дзень за тры кіламетры ад самалёта была зроблена засада. Чакаць прыйшлося доўга. Камбрыг прымасціўся пад галіністай велізарнай елкай. Твар яго быў засяроджаным і суровым. Мікалай Уладзіміравіч, якому было крыху болей за 25 гадоў, любіў вайсковую дысцыпліну, прамату і чэснасць. Ён ніколі дарэмна не абнадзейваў і не падманваў таварышаў. Сенькін быў знаходлівы, кемлівы і пісьменны ў ваенных справах камандзір, хутка арыентаваўся ў любой абстаноўцы і без панікі прымаў правільнае рашэнне. Яго любілі і байцы, і камандзіры.

— Штосьці доўга не з'яўляюцца нашы «прыяцелі», — заўважыў камбрыг.

— Бачна, грунтоўна рыхтуюцца, — выказваю я сваю думку.

Ад дазору, выстаўленага да моста праз Ясельду, адкуль чакалі фашыстаў, аддзяліўся коннік і па лесе накіраваўся ў наш бок.

— Таварыш камбрыг! — неўзабаве дакладваў дазорны, — каля двухсот гітлераўцаў перайшлі мост і ў суправаджэнні танкеткі рухаюцца ў бок засады.

— Падрыхтавацца да бою! — загадаў Сенькін.

Засада партызан уяўляла сабой шырока разведзеныя клешчы, у якія ўжо ўваходзіла танкетка. Грымнулі тры выстралы з нашага боку. Танкетка спынілася. А над галовамі партызан штосьці глуха грымнула. Гэта танкетка пачала абстрэл нашых пазіцый. Але другі залп супрацьтанкавых ружжаў паразіў яе, з машыны паваліў густы дым. Бой працягваўся. Камбрыг разумеў, што нельга падымаць людзей у атаку, пакуль гітлераўцы не ўвайшлі ў клешчы. Ён загадаў моцнага агню не адкрываць, дражніць ворага рэдкай стралянінай, каб заманіць іх у пастку.

І фашысты рвануліся ўперад, але, мабыць, затым здагадаліся, што ім пагражае, — некалькі адышлі назад і занялі абарону. Аднак замацавацца тут яны не змаглі. Партызаны зноў ударылі па фашыстах і прымусілі іх адступіць. Праследавалі ворага да самага моста праз

Ясельду. І толькі калі з бліндажоў каля моста загаварылі цяжкія кулямёты, праследаванне было спынена. На зваротным шляху партызаны падабралі зброю забітых ворагаў.

— Што, атрымалі самалёт? — радаваўся Сяргей Руціч, разглядваючы пакалечаную танкетку. — Не толькі нашага не ўзялі — сваё пакінулі!

— Немцы паспрабуюць забраць трупы сваіх, — выказаў здагадку Сенькін. — Хутчэй за ўсё зробяць гэта заўтра. Мы іх павінны сустрэць, як мае быць, яшчэ разок...

— Заўтра асабоваму складу атрадаў імя Дзімітрова і імя Кірава быць тут не пазней шасці гадзін раніцы, а сёння камандзіру кіраўцаў пакінуць у засадзе ўзвод, — загадаў камандзір.

На другі дзень, як і меркавалася, гітлераўцы зноў паспрабавалі прарвацца ў лес. Партызаны загадзя замініравалі дарогу. Аднак разведка праціўніка прасоўвалася цяпер па лесе, і раптоўны ўдар партызанам нанесці не ўдалося. Тым не менш, і на гэты раз фашысты вымушаны былі адступіць.

Бой у Харошчы

З успамінаў былога камандзіра партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі М. У. Сенькіна

...10 красавіка 1943 г. акупанты, паліцыя і «самаахова» акружылі в. Харошча, у якой знаходзілася на начоўцы частка партызан атрада «Савецкая Беларусь». Пачаўся бой жменькі партызан з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Пачутая партызанамі стральба падняла на ногі ўвесь лагер, які быў размешчаны на ўскрайку лесу. Конная разведка данесла, што праціўнік акружыў вёску і вядзе бой з нашымі людзьмі. У лагеры заставалася 40 партызан. Было прынята тэрміновае рашэнне: зрабіць засаду на шляхах адыходу праціўніка. Камандаванне гэтай аперацыяй было даручана мне, тады начальніку штаба атрада.

Група байцоў 4-й роты была паслана ў паўднёвую частку вёскі, каб абстраляць вёску і стварыць уражанне, што партызаны будуць наступаць з паўднёвага боку. Асноўная сіла размясцілася з паўночнага боку на тракце Харошча — Грыўда і чакала, калі праціўнік будзе выязджаць з вёскі.

Гітлераўцы (каля 50 чалавек), баючыся, каб іх не акружылі, сталі паспешна ад'язджаць на аўтамашынах, а паліцыя і самаахова пешшу дабіраліся да гарнізона.

Пры выездзе з вёскі кулямётны агонь з засады быў для іх поўнай нечаканасцю. Першая машына адразу ж ахапілася полымем, потым — другая. Гітлераўцы, не зрабіўшы ні аднаго выстрала, кінуліся бегчы, але ўсюды іх сустракаў кулямётны агонь.

Акупанты ў вёсцы больш ніколі не з'яўляліся.

Дарагой цаной

З успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада імя Г. Дзімітрова М. Дз. Сямёнава

31 кастрычніка 1943 г. камбрыг Мікалай Уладзіміравіч Сенькін выклікаў да сябе камандзіраў, камісараў і начальнікаў штабоў атрадаў імя Дзімітрова і імя Кірава.

— Далажыце абстаноўку, — звярнуўся ён да Васіля Варсунова.

— Па даных разведчыка Уладзіміра Трынды, у Няхачава прыбыў полк карнікаў. Разам з мясцовым гарнізонам яны збіраюцца 1 лістапада захапіць вёскі Заполле і Бялавічы. Іх мэта — разграміць партызанскія камендатуры ў гэтых вёсках, захапіць жывёлу, прадукты харчавання, а працаздольнае насельніцтва вывезці ў Германію, — строга па-ваеннаму далажыў Варсуноў.

Пасля даклада Варсунова камандзіры нейкі час раіліся. Было вырашана камандзірам атрадаў да чатырох гадзін раніцы вывесці партызан у Бялавічы. Атрад Самуйліка павінен быў заняць абарону ў канцы вёскі з боку Косава. Майму атраду была пастаўлена задача блакіраваць цэнтр вёскі з боку вёскі Заполле, а каменданцкаму ўзводу Пятра Круглова трымаць абарону Бялавіч з боку лесу.

Раніцай конная разведка Паўла Пасюкова далажыла, што гітлераўцы знаходзяцца на маршы паміж вёскамі Няхачава і Заполле. К гэтаму часу жыхары вёскі Бялавічы, папярэджаныя партызанамі, пакінулі свае хаты.

У поўдзень на ўзвышшы каля Заполля паказаліся карнікі. Яны ўстанавілі там гарматы, мінамёты і цяжкія кулямёты.

Вёска Бялавічы цягнулася прыкладна на два кіламетры. Адным канцом яна ўпіралася ў лес, другім — у поле.

Карнікі накіравалі сваю ўдарную групу ў складзе двух батальёнаў па зараснікаў, якія цягнуліся да першых хат Заполля. Яны імкнуліся адрэзаць партызан ад лесу і акружыць іх.

Мы зразумелі намер ворага, але аб адступленні ніхто не думаў, хаця адчувалі, што для некаторых партызан гэты бой будзе апошнім...

Пры штабе брыгады знаходзіліся сакратар абкома партыі Іван Іванавіч Баброў, камісар брыгады Канстанцін Дзям'янавіч Талочка, сакратар антыфашысцкага камітэта Іосіф Урбановіч, работнікі абкома камсамола.

— Ідуць, — скрозь зубы прагаварыў Аляксандр Талалуеў. —Відаць, нейкая сабака данесла, што мы ў Бялавічах.

З двух бакоў карнікі падышлі да Бялавіч зусім блізка, але да цэнтра рухаліся з асцярогай.

Над галовамі партызан завылі міны, снарады, сыпаўся град асколкаў.

Загарэліся першыя хаты. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі гітлераўцы рванулiся да цэнтра вёскі, але іх атака была адбіта партызанамі. Вораг пабег і ад засады кіраўцаў у канцы сяла. Фашысты павярнулі сваю групу, якая наступала на цэнтр сяла, да лесу, каб адрэзаць партызан ад яго.

Да ворага падыходзіла падмацаванне з Івацэвіч і Косава. Гітлераўцы ўзмацнілі артылерыйска-мінамётны агонь. Асноўныя сілы ворага ўпэўнена напіралі на пазіцыі камендацкага ўзвода Пятра Круглова. Каля дзвюх гадзін кіпеў бой. Да камандзіра брыгады прыбег сувязны ад Круглова і далажыў:

— Фашысты рвуцца ў вёску. Атрад ледзь стрымлівае іх націск...

Сенькін добра разумеў, што трэба ўводзіць у бой свой рэзерв і атрад імя Дзімітрова, якія павінны былі наступаць па чыстым полі. Камбрыг ведаў, што значыць такое наступленне... Але момант патрабаваў рашучых дзеянняў.

— Сувязны дзімітраўцаў! — крыкнуў Сенькін. — Перадай камандзіру: адна рота застаецца на месцы, астатнія няхай тэрмінова пачынаюць атакаваць ворага.

Затым камбрыг скамандаваў свайму рэзерву:

— Хлопцы, за мной! — і кінуўся наперад.

Партызанскае «ўра!» грымнула нечакана.

Наступленне атрадаў па чыстым полі было такім імклівым, што карнікі не паспелі апамятацца, як мы былі на іх пазіцыях. Пачалася рукапашная.

Узоры адвагі і гераізму паказалі камандзіры. Першымі да фашыстаў уварваліся камісар Фёдар Савін, начальнік штаба Аляксандр Талалуеў, намеснік камісара Дзмітрый Сінькоў, палітрук другой роты Міхаіл Чаркасаў, ардынарац камісара Сцяпан Гардзейчык. Фашысты пачалі адступаць.

З захаду партызаны Сенькіна таксама ўступілі ў рукапашную з фашыстамі. За некалькі гадзін бою густы зараснік ператварыўся ў пустэчу: валялася паламанае галлё, апаўшая лістота была заліта крывёю людзей.

Каля Сенькіна ўпаў камісар брыгады Канстанцін Дзям'янавіч Талочка.

— Памiраю я, камбрыг. Шкада, што не ўбачу нашай перамогі. Бывайце, родныя,.. знішчайце... — пасінелыя губы яшчэ нешта шапталі, але голасу ўжо не было чуваць.

Сенькін абняў сябра, прыціснуў да сябе...

Перамога дасталася нялёгка. У баі загінуў таксама сакратар абкома партыі І. І.Баброў, былі паранены І.П.Урбановіч, Фёдар Савін, Аляксандр Талалуеў, Дзмітрый Сінькоў, Якаў Махаў, Васіль Зайка і іншыя.

Праз усе выпрабаванні

З успамінаў былога партызанскага ўрача У. М. Талкачова

Нарадзіўся я на Магілёўшчыне ў 1918 годзе. Бацька ў грамадзянскую вайну быў у Чырвонай Арміі, а калі вярнуўся, то браты ўжо падзялілі зямлю, і яму надзела не дасталося. Пайшоў служыць — быў сакратаром сельсавета, рахункаводам у леспрамгасе, а з арганізацыяй калгаса ў 1939 годзе яго прызначылі рахункаводам.

Я ў 1937 годзе закончыў Магілёўскі медпалітэхнікум і паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут. Але ў 1939 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. Трапіў служыць у

Лідскі акруговы ваенны шпіталь фельчарам. Тут мяне застала вайна.

Гэта было жудасна. Ужо ў першы дзень над горадам няспынна кружылі нямецкія самалёты, скідвалі бомбы, абстрэльвалі жылыя кварталы. Асабліва даставалася ваеннаму гарадку. 24 чэрвеня стала ясна, што туды прыйдуць фашысты. Трэба было эвакуіраваць сем'і камандната складу. Суправаджаць жонак і дзяцей ваеннаслужачых начальнік шпіталя Бухман загадаў мне. Да Мінска рухаліся на аўтамашыне пад няспынным абстрэлам з самалётаў. У палаючы Мінск, які ўвесь час бамбіла нямецкая авіяцыя, прыбылі 25 чэрвеня. Днём рашылі рухацца на Барысаў, бо ў Мінску спыняцца не было сэнсу. Яго ўжо пакідалі ваенныя і мірныя жыхары.

Яшчэ перад Мінскам у лесе нашу машыну спынілі два палітрукі з мэтай праверкі дакументаў у мужчын. У мяне ніякіх дакументаў не было, бо начальнік шпіталя пра гэта не падумаў, калі адпраўляў нас з палаючай Ліды. А там тварылася страшнае. Ужо ў 5 гадзін раніцы 22 чэрвеня немцы разбамбілі чыгуначную станцыю, аэрадром, два пасажырскія цягнікі. 22, 23, 24 чэрвеня я не адыходзіў ад аперацыйнага стала ў шпіталі, куды бясконца паступалі параненыя. Іх аперыравалі, перавязвалі. Я асісціраваў пры аперацыях, рабіў перавязкі. У перапынках паміж аперацыямі перакусваў, спаў жа ўрыўкамі не больш 2—3-х гадзін у суткі ў начны час. У такіх абставінах пры эвакуацыі ніхто і не падумаў аб дакументах.

Мяне палічылі за дэзерціра, адабралі вінтоўку, папругу з падсумкамі і загадалі сяржанту расстраляць. Адвялі ў поле метраў за 30, а тут жанчыны, якіх я суправаджаў, акружылі палітрукоў і нешта ім даказвалі. Мяне вярнулі назад, аддалі вінтоўку і падсумкі і накіравалі ў лес, дзе ўжо сабралася вялікая група чырвонаармейцаў з розных часцей (іх лічылі ўцекачамі).

26—27 чэрвеня сфарміравалі роту са 150 чалавек і накіравалі ў бок Барысава. Пад абстрэлам авіяцыі дайшлі да Смалявіч. У цемнаце заўважылі некалькі танкаў і аўтамашын. Калі падышлі ўшчыльную, убачылі на танках крыжы. Кінуліся наўцёкі ад пасёлка. Па нас ліўся агонь з кулямётаў. Беглі па балоце, дзе былі распрацоўкі торфу. Дабраліся да нейкай вёсачкі. Рота рассыпалася на групкі. Нас сабралася 4 чалавекі, пераначавалі ў лесе і накіраваліся ў напрамку Віцебска. Ішлі ляснымі і прасёлачнымі дарогамі. Аднойчы на ўскрайку лесу прыляглі адпачыць, а праз паўгадзіны з'явіліся нямецкія матацыклісты, якія размясціліся невялікімі групамі. Адны ад'язджалі, другія прыбывалі. Мы затаіліся ў хмызняку. Мучыў голад і смага. На чацвёрты дзень выйшлі з лесу. Немцаў ужо не было. Каля 10 ліпеня зайшлі ў вёску, каб хоць чым-небудзь падсілкавацца. Першая сустрэчная жанчына нас папярэдзіла, што вакол гітлераўцы і нам трэба ўцякаць. Пры выхадзе з вёскі ўсё ж натыкнуліся на іх. Трапілі ў палон... Смалявічы, Маладзечна, Ліда, Граева, Сувалкі — такі наш цярністы і крывавы шлях. Колькі нашых сяброў, прыстрэленых катамі, засталося на ім! Нарэшце аказаўся ў стацыянарным канцэнтрацыйным лагеры Гамерштэйн у Германіі. Мяне накіравалі ў шпіталь для ваеннапалонных (рэвір) санітарам. Быў канец лістапада 1941 года. Да сакавіка 1942 года з 28 тысяч палонных у лагеры засталося каля пяці тысяч. Паміралі ад голаду, тыфу і розных іншых хвароб. У снежні 1941 года пакаціў і мяне сыпняк. Але выжыў...

У сакавіку 1942 г. мяне і сябра Даманскага з-пад Маладзечна ў групе з 20 чалавек паслалі на сельскагаспадарчыя работы да памешчыка Клеменса. Жылі мы ў двух пакоях: 12 чалавек, што працавалі ў Клеменса, — у адным пакоі, 8, што працавалі ў яго суседа, — у другім. На вокнах былі жалезныя рашоткі, у калідоры — параша, а за сцяной два ахоўнікі са зброяй. Пад іх наглядам хадзілі на работу.

5 мая 1942 г. мы з Даманскім вырвалі прут з рашоткі і выкінуліся з акна. Да нас далучыліся яшчэ трое. Стала пяцёра.

Мы ішлі на ўсход начамі, абмінаючы населеныя пункты і хутары. Ішлі палямі, лясамі, лугамі, а не дарогамі. У Польшчы адзін таварыш адстаў. Нас засталося чацвёра. Падзяліліся па двое — адны пайшлі на Маладзечна, другія — на Баранавічы. Чатыры разы натыкаліся на нямецкія пасты. На 72-я суткі пайшлі днём. Навокал былі суцэльныя лясы. Пад вечар натыкнуліся на партызан. Было гэта ў Любанскім раёне.

Партызанскі атрад (камандзір Уладзімір Ярома) складаўся ў асноўным з байцоў Чырвонай Арміі, якія выйшлі з акружэння ці збеглі

з палону. У ім было ўжо больш за 130 чалавек. Мяне накіравалі ў санслужбу атрада. Удзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях і як баец, і як медык. Быў пры падрыве чыгуначнага моста на станцыі Пціч. Граміў паліцэйскі гарнізон у вёсцы Ламавічы Акцябрскага раёна, хадзіў на чыгунку на падрыў эшалонаў, на «рэйкавую» вайну (тут быў паранены ў нагу). У гэтым атрадзе прабыў з ліпеня 1942 г. да 31 жніўня 1943 г.

З верасня 1943 года палова атрада на чале з І.І.Чарнышовым згодна з загадам БШПР перадыслацыравалася ў Косаўскі раён на Жытліншчыну. Наш атрад імя Сільніцкага ўключылі ў брыгаду імя Дзяржынскага. На Косаўшчыне прымаў удзел ва ўсіх аперацыях атрада. Адначасова ўзначальваў санітарную часць. Даводзілася лячыць не толькі партызан, але і жыхароў вёсак Жытлін, Корачын, Хадакі, Уласаўцы, Зыбайлы. Прыходзілася нават прымаць роды і рваць зубы.

11 ліпеня 1944 г. злучыліся з Чырвонай Арміяй, а 25 ліпеня мяне накіравалі ў Косаўскі райздраўаддзел дзяржаўным санітарным інспектарам. У Косаўскім раёне лютавалі тыф, дызентэрыя, дыфтэрыя, адзёр, туберкулёз, малярыя. Лякарстваў не было. Многія вёскі былі спалены. Людзі жылі ў зямлянках. У такіх умовах цяжка было аказваць дзейсную медыцынскую дапамогу. Але медыкі рабілі ўсё, што маглі.

У вызвалены Мінск з эвакуацыі вярнуўся мой медыцынскі інстытут. З 1 лістапада 1944 г. я прадоўжыў у ім вучобу і ў 1947 годзе закончыў з адзнакай. Нягледзячы на шматлікія прапановы застацца на рабоце ў Мінску, пасля пераехаць у Брэст ці зноў у Мінск, рашыў назаўсёды звязаць сваё жыццё з Косавам. Няпоўны год пасля інстытута працаваў загадчыкам амбулаторыі, а з 1 красавіка 1948 г. галоўным урачом Косаўскай гарадской бальніцы. 25 гадоў прабыў на гэтай пасадзе. Працаваў потым загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення, затым ардынатарам-тэрапеўтам да 1 студзеня 1990 г., хаця на пенсію выйшаў у 1978 годзе...

Мы — на брэсцкай зямлі!

З успамінаў У. К. Якавенкі, былога камандзіра 99-й партызанскай брыгады імя Дз. Ц. Гуляева

У снежні 1943 — студзені 1944 года 99-я партызанская брыгада імя Дз. Ц. Гуляева перадыслацыравалася з Глускага раёна ў Целяханскі і была ўключана ў склад Брэсцкага партызанскага злучэння. У час пераходу на Брэстчыну брыгада правяла некалькі баёў.

На нашым шляху ляжаў Агінскі канал і далей раённы цэнтр Целяханы з добра ўмацаваным апорным варожым гарнізонам.

Перш чым рухацца далей, трэба было агледзецца. У бліжэйшыя вёскі былі пасланы разведчыкі, каб вывучыць усе больш-менш прыгодныя для руху брыгады дарогі.

Пакуль збіралі і ўдакладнялі разведданыя і распрацоўвалі варыянты дзеянняў атрадаў, прыйшлося на пэўны час затрымацца ў буйным сяле Горталь, паблізу ад Целяхан, і тут адбылася нечаканая сустрэча: у штаб брыгады прыйшлі патрыёты з групы сакратара Целяханскага падпольнага райкома партыі Андрэя Антонавіча Хацкевіча. Яны пазнаёмілі нас з абстаноўкай у раёне, вывелі на сувязь са штабам мясцовай партызанскай брыгады пад камандаваннем Уладзіміра Антановіча.

Вось аб чым мы даведаліся. У целяханскім гарнізоне налічвалася звыш 200 добра ўзброеных гітлераўцаў. У цэнтры гарадскога пасёлка, паблізу канала, быў галоўны апорны пункт з некалькіх дзотаў. Разведчыкі з брыгады Антановіча паведамілі, што акупанты ў Целяханах апошнія дні да чагосьці ўзмоцнена рыхтуюцца, прасілі камандаванне ў Пінску прыслаць ім падмацаванне, але ім было адказана.

На другі дзень пад вечар падраздзяленні брыгады былі ўшчыльную падцягнуты да Целяхан. Мы занялі ўсе хутары на адлегласці аднаго — паўтара кіламетра. На адным з хутароў адбылася нарада камандзіра складу. Прысутнічалі камандаванне брыгады і камандзіры атрадаў — Уладзімір Жлобіч, Уладзімір Каткоў і Віктар Харахурын. Мы прынялі рашэнне атакаваць гарнізон. Распрацавалі план аперацыі.

Спачатку ідзе ў атаку на фашысцкі гарнізон добра ўзброеная ўдарная група. Затым

на галоўны апорны пункт гарнізона павядуць наступленне роты атрада імя Варашылава. Астатнія атрады з абозам брыгады пройдуць у лясы на захад ад Целяхан і пры неабходнасці падыдуць на дапамогу атакуючым.

Добра ўзброеную ўдарную групу з сарака чалавек узначаліў начальнік разведкі брыгады Аляксандр Чацверыкоў.

І штурм пачаўся.

Падышоўшы да Целяхан метраў на чатырыста, ударная група пакінула коней, разгарнулася ў баявы парадак і ў белых маскіровачных халатах павяла наступленне на мост праз канал. За ім была цэнтральная частка пасёлка. Да канала байцам удалося падысці незаўважанымі. Партызаны заляглі.

З боку Целяхан раздаўся адзіночны выстрал. Затым застракатаў кулямёт.

У адказ — шчыльны ўраганны агонь: запрацавалі аўтаматы і кулямёты партызан. Ускінулася і раскацілася магутнае «ўра!». Перастрэлка то нарастала, то заціхала.

Нарэшце ад Чацверыкова прыскакаў разведчык і паведаміў:

— Фашысты адступаюць!

Гэта ад націску чатырох дзесяткаў партызан?

Не верылася. Але данясенне аказалася верным. У дзеянне быў уведзены атрад імя Варашылава, яго роты развярнуліся, злучыліся з ударнай групай Чацверыкова і пачалі займаць цэнтральную частку пасёлка. Гітлераўцы трымаліся ў сваім добра ўмацаваным логаве нядоўга, так, «для парадку», каб было што далажыць начальству. Рашыўшы, што супраць іх выступілі «буйныя сілы партызан», акупанты кінулі гарнізон і ўцяклі ў Пінск.

Разам з атрадамі 99-й брыгады ў Целяханы ўступілі групы партызан з брыгад, якімі камандавалі Уладзімір Антановіч і С.Г.Жунін.

Наступіла ноч. Насельніцтва Целяхан выйшла на вуліцы, радасна вітаючы партызан...

Жыхары Целяхан, як і ўсё насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі, мелі вялікую патрэбу ў солі. Вялікія запасы яе захоўваліся на складзе камендатуры... Захопленыя партызанамі соль і іншыя прадукты былі размеркаваны сярод насельніцтва...

Некалькі дзён мы правялі ў Целяханах...

Прыйшоў час і расставацца.

Разам з камісарам брыгады Андрэем Чайкоўскім і двума разведчыкамі я накіраваўся ў штаб злучэння партызанскіх атрадаў Брэсцкай вобласці... Нам паказалі зямлянку Сяргея Іванавіча Сікорскага — сакратара падпольнага абкома партыі, камандзіра злучэння...

Мы падрабязна азнаёмілі Сяргея Іванавіча з тым, што ўяўляе сабой наша брыгада, які яе асабовы склад, узбраенне, настрой байцоў і камандзіраў, расказалі, як прайшлі вялікі шлях уздоўж фронту ад Мазыра амаль да Брэста. Падзяліліся сваімі планамі дыверсій на камунікацыях ворага...

— Заставайцеся пакуль у раёне Моталя, — сказаў Сяргей Іванавіч. ...Ішоў ліпень 1944 г. Штаб злучэння партызанскіх атрадаў Брэсцкай вобласці даручыў нашай 99-й брыгадзе абарону дзесяткаў населеных пунктаў, размешчаных на паўночным і паўднёвым захадзе ад райцэнтра Целяханы. Акрамя гэтага, да прыходу Чырвонай Арміі мы павінны былі ўтрымліваць пераправу праз Агінскі канал у раёне вёскі Выганашчы, а таксама вялікі тракт Пінск — Івацэвічы з боку Целяхан. Палавіна гэтай адзінай у лясіста-балотных месцах дарогі, па якой магла прайсці ваенная тэхніка, была ў руках ворага. Буйныя ўмацаваныя гарнізоны ланцугом цягнуліся па гэтай дарозе на поўдзень.

Да таго часу гітлераўцы зноў захапілі Целяханы, стварылі гарнізоны ў вёсках Краглевічы, Азарычы, Лагішын. Яны імкнуліся вызваліць ад партызан тракт у бок ад Івацэвіч, разбіць партызанскія атрады і расправіцца з мірным насельніцтвам бліжэйшых вёсак. Акупанты наладжвалі засады на партызан і праводзілі налёты на вёскі.

Трэба было загнаць гітлераўцаў у гарнізоны. Да ўмацаваных гітлераўцамі населеных пунктаў камандаванне брыгады выставіла па адной роце. Засады дзень і ноч знаходзіліся ў лесе каля гарнізонаў...

Аднойчы гітлераўцы рашылі паспрабаваць, ці моцныя партызаны, якія заселі ў лесе, што прылягаў да Целяхан.

Падраздзяленне, у якім налічвалася больш за 220 салдат, рушыла ў бок Івацэвіч. Партызан было значна менш, але сустрэлі яны гітлераўцаў трапным і шчыльным агнём. Некалькі варожых салдат было забіта, дзесяткі паранены.

Пасля гэтай спробы фашысты заселі ў гарнізоне, сістэматычна радзіруючы камандаванню ў

Пінск, што з усіх бакоў акружаны партызанамі, не маюць прадуктаў і не могуць іх нарыхтаваць. У радыёграмах у адказ гітлераўскае камандаванне абвінавачвала камандаванне гарнізонаў у баязлівасці, патрабавала актыўных дзеянняў супраць партызан, нарыхтоўкі прадуктаў для фронту і адпраўкі працаздольных беларусаў у Германію. Але выканаць гэтыя патрабаванні акупанты не маглі.

У рэшце рэшт прыфрантавой жандармерыі было даручана разабрацца на месцы, наколькі сур'ёзная партызанская блакада.

Душным ліпеньскім днём жандарскі палкоўнік з афіцэрамі на дзвюх легкавых машынах у суправаджэнні грузавіка з салдатамі аховы выехаў з Пінска ў Целяханы.

Паспяхова дабраўшыся да сяла Азарычы, палкоўнік зрабіў вымову начальніку гарнізона і рушыў далей па тракце — у бок Целяхан... Падобнай смеласці партызаны не чакалі...

І раптам ціхі крык дазорнага:

— На дарозе машыны!

Партызаны роты Рыгора Лагойкі, якія былі ў засадзе, сустрэлі іх агнём...

Грузавая машына і адна легкавая загарэліся, і выратаваць іх не ўдалося. А адна легкавая, цэленькая і зусім новая, была дастаўлена ў брыгаду...

У апошніх аперацыях супраць акупантаў нам асабліва актыўна дапамагала насельніцтва. Так, атрады нашай брыгады з дапамогай мясцовых жыхароў разабралі вузкакалейную чыгунку Івацэвічы — Целяханы — Азарычы. Рэльсы і шпалы скінулі ў балота. Жалезабетонныя доты, пабудаваныя ўздоўж Агінскага канала, забілі бярвеннямі і замініравалі. Знішчылі мы і масты на тракце.

У той час, калі асноўныя сілы дзейнічалі ў раёне Целяхан, нашы штурмавыя ўзводы і падрыўныя групы працягвалі наносіць удары па чыгункі і шашы Брэст — Лунінец...

10 ліпеня 1944 г. сумесным ударам чырвонаармейцаў і партызан быў вызвалены райцэнтр Целяханы, а затым і ўвесь раён.

Разгром

З успамінаў былога сакратара Целяханскага падпольнага райкома партыі А. А. Хацкевіча

Андрэй Антонавіч Хацкевіч да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў загадчыкам Целяханскай цэнтральнай ашчаднай касы. У перыяд часовай акупацыі Беларусі быў актыўным удзельнікам партызанскага руху на тэрыторыі раёна. Як сакратар Целяханскага падпольнага райкома партыі ён кіраваў шматлікімі баявымі аперацыямі партызан. 24 студзеня 1944 г. партызанскія брыгады імя Куйбышава і імя Дзяржынскага разграмілі нямецкі гарнізон у пасёлку Целяханы.

У лясным масіве паміж Бабровічамі і Вялікай Гаццю знаходзіўся штаб Целяханскага падпольнага райкома партыі. Тут (у канцы 1943 года) адбылося пасяджэнне, якое абмеркавала меры па прадухіленні вывазу ворагам народнага дабра з тэрыторыі раёна. Неўзабаве партызанская разведка данесла, што на 24 студзеня 1944 года фашысты намецілі вываз з Целяхан нарабаванага дабра. У штабе вырашылі: чаго б гэта ні каштавала, а перашкодзіць акупантам ажыццявіць намер. Трэба сказаць, што Целяханскі гарнізон налічваў каля 150 уласаўцаў, 70 паліцаяў. Гэтымі добра ўзброенымі сіламі кіравалі фашысты. Гарнізон быў умацаваны абароннымі збудаваннямі.

У вызначаны дзень два аддзяленні атрада імя Баруцкага партызанскай брыгады імя Куйбышава пад камандаваннем Васіля Фёдаравіча Віктаровіча і Мікалая Якаўлевіча Дзягцярыка замініравалі ўчастак дарогі Целяханы — Пінск. Каля вёскі Азарычы партызаны прытаіліся ў засадзе. Каля дзвюх гадзін дня з боку Пінска паказалася калона аўтамашын. Першая машына, на якой ехала каля 20 гітлераўцаў, узляцела ў паветра ад партызанскай міны. Па астатніх машынах партызаны адкрылі дружны агонь. Пачаўся бой.

У гэты час з баявога задання вярталася група партызан атрада імя Чарткова. Яны прыйшлі на дапамогу сваім сябрам па зброі. Гітлераўцы, пакінуўшы забітых і параненых, развярнулі непашкоджаныя машыны і памчаліся назад у Пінск.

Не паспеў яшчэ закончыцца гэты бой, як другая група народных мсціўцаў з атрада імя Баруцкага партызанскай брыгады імя Куйбышава ўвайшла ў Целяханы з паўночнага боку і адкрыла агонь па ворагу. Гэтай групай камандаваў я.

У нямецкім гарнізоне ўзнікла паніка. Відаць, тут стала вядома, што з усходу рухаецца на

Целяханы 208-ы полк партызанскай брыгады імя Дзяржынскага. Гітлераўцы, паліцаі, уласаўцы вырашылі рататаваць сваю шкуру і, кінуўшы нарабаванае, на аўтамашынах памчаліся ў Пінск. Каля в.Краглевічы партызаны іх абстралялі, але здраднікі і іх кіраўнікі бою не прынялі.

Каля сямі гадзін вечара партызаны занялі Целяханскі гарнізон. Радасць ад перамогі была тым большай, што сярод партызан не было забітых і нават цяжка параненых.

Трафеі былі багатыя. У паніцы ворагі кінулі ўсё, што было нарабавана ў народа, зброю, медыкаменты.

Больш гадзіны страцілі партызаны на тое, каб прывесці ў прытомнасць загадчыцу аптэкі Бахенскую. Апрытомнеўшы, яна паказала драўляныя скрынкі, у якія партызаны склалі медыкаменты. Тры фурманкі з медыкаментамі целяханскай аптэкі былі вывезены ў лясныя лагеры. Запас іх выратаваў потым жыццё не толькі многім партызанам, але і мірным жыхарам навакольных вёсак.

Партызаны адбілі ў ворага каля 200 тон хлеба, 150 тон солі. Гэтыя дэфіцытныя прадукты харчавання ў асноўным былі раздадзены мірнаму насельніцтву, а часткова вывезены ў партызанскія лагеры.

У нямецкім маёнтку было захоплена каля 20 коней, 35 кароў, 40 свіней, сельскагаспадарчы інвентар, дынама-машына магутнасцю 1200 кілават, два калёсныя трактары, абсталяванне з тэлеграфнай станцыі, каля трох тон правадy, шэсць пішучых машынак, паравая машына і іншае абсталяванне млына, шмат розных каштоўнасцей. Усё гэта стала народным здабыткам.

Каля трох тыдняў знаходзіліся партызаны ў Целяханах. Усе гэтыя дні мірныя жыхары ішлі і ішлі да сваіх абаронцаў. Мы дзяліліся з імі хлебам, соллю. Яны ж дапамагалі нам вывозіць з Целяхан трафеі. З іх дапамогай была перавезена ў Жытлін паравая машына і там пушчаны ў ход партызанскі млын, надзейна захаваны дынама-машына і іншае абсталяванне.

Фашысты неаднаразова спрабавалі адбіць Целяханы. Але іх спробы заканчваліся няўдачай. Гэтаму спрыяла тое, што ў гэты час каля Целяхан базіраваліся 208-ы полк партызанскай брыгады імя Дзяржынскага, атрады з брыгад імя Куйбышава, Жуніна, Якавенкі.

І толькі калі вораг пачаў няспынна бамбіць пасёлак, партызаны вырашылі пакінуць яго. Гэта быў клопат пра мірных жыхароў, пра іх жытло.

Партызанскі парад

З успамінаў былога камісара партызанскага атрада імя А. П. Чарткова І. М. Церашэнкава*

...У першых чыслах снежня 1943 г. на базе атрада імя Молатава, які налічваў у сваіх радах 333 партызаны, была сфарміравана брыгада імя Дзяржынскага. Яе камандзірам назначылі В. М. Манахава, камісарам — П. Р. Кавалёва і начальнікам штаба — Ф. М. Баранава.

Аднаму з атрадаў прысвоілі імя А. П. Чарткова. І пранеслі гэта імя чарткоўцы, як сцяг, яшчэ праз многія жорсткія баі, пакуль беларуская зямля не была ачышчана ад фашысцкіх захопнікаў. Камандзірам атрада імя Чарткова стаў Віктар Лапацін, начальнікам штаба, а затым камісарам назначылі мяне.

Партызанамі зноў створанага атрада ў баях, на чыгунцы і на мінах знішчана не адна сотня гітлераўцаў; пушчана пад адхон 46 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай і знішчана пры гэтым 46 паравозаў і 304 вагоны; разбіта 83 броне- і аўтамашыны; падарваны танк; падбіта з процітанкавых ружжаў 109 паравозаў і абстраляна пяць эшалонаў; падарвана 1338 рэек; знішчана дзесяткі кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Да гэтага далёка не поўнага пераліку баявых спраў трэба дадаць дзеянні партызан па захаванні ўраджаю, каб ён не дастаўся захопнікам. Абарона жыхароў населеных пунктаў ад вывазу ў фашысцкую Германію таксама ўваходзіла ў наш святы абавязак. Партызаны праводзілі вялікую палітычную работу сярод насельніцтва вёсак і ў сямейных лагерах, дзе пад іх аховай знаходзілася 485 чалавек.

Наступіла вясна 1944 года. Набліжалася Міжнароднае свята працоўных усяго свету — 1 Мая. Партызанскія групы і падраздзяленні

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кнігі «Буг в огне» (Мн., 1965. С.317—319).

дакладвалі аб выкананні заданняў у гонар наступаючага свята.

1 Мая. 11 гадзін раніцы. На лясной паляне, па дарозе, якая вяла з Івацэвіч у вёску Корачын, шумна і весела. Сюды прыйшлі партызаны і дэлегаты ад мясцовых жыхароў для ўдзелу ў партызанскім парадзе. Прыбыў на гэта свята ў нашу брыгаду і камісар Брэсцкага партызанскага злучэння Сяргей Ягоравіч Ягораў. Усё было як там, за фронтам, на Вялікай зямлі: трыбуна, на ёй старэйшыя камандзіры, дэлегаты ад мясцовага насельніцтва. Стройныя рады партызан выстраіліся паротна. З вышыні бязвоблачнага неба ярка свяціла сонца, і ў вершалінах дрэў ціха шумеў веснавы ветрык.

Мітынг адкрыў камісар брыгады Павел Рыгоравіч Кавалёў. З прывітальнымі прамовамі выступілі: камісар злучэння С. Я. Ягораў, камандзір брыгады В. М. Манахаў, камандзір атрада В. В. Лапацін і многія іншыя партызаны. Прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС і Беларускаму штабу партызанскага руху.

Пасля мітынгу пачаўся парад. Наперадзе — сцяганосцы неслі тры баявыя чырвоныя сцягі, вышытыя майстэрскімі рукамі Надзі Саўчук з в. Жытлін. Не раз схіляліся палотнішчы над магіламі паўшых герояў. Не раз партызаны хадзілі з імі ў бой. За сцягамі везлі гармату, тую самую, пры захопе якой загінуў наш камандзір Аляксей Чарткоў. Затым рота за ротай паўз трыбуну з моцным «ура!» ішлі народныя мсціўцы...

... У першыя дні ліпеня атрад імя Чарткова аказваў садзейнічанне разведцы адной з часцей 28-й арміі ў раёне вёскі Любішчыцы. 10, 11 і 12 ліпеня ўвесь атрад, дзейнічаючы ў складзе брыгады, вёў свае апошнія цяжкія баі з адступаючымі часцямі гітлераўцаў у раёне вёсак Вулька Бараноўская, Яблонка. Адбіваючы па некалькі атак у дзень, партызаны не дапусцілі адступлення гітлераўцаў па лясной дарозе ад Івацэвіч на Пескі.

12 ліпеня ў Івацэвічах атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі, а праз некаторы час яго асабовы склад уліўся ў рады савецкіх войскаў.

...У вёсцы Жытлін стаіць манументальны помнік слаўным беларускім партызанам. На мармуровай дошцы першым выведзена імя адважнага камандзіра А. П. Чарткова. Калгас гэтай вёскі носіць яго імя. У гарадскім пасёлку Івацэвічы ёсць вуліцы, названыя імёнамі Аляксея Чарткова і Колі Гойшыка. Імя А. П. Чарткова носіць таксама адна з вуліц на станцыі Фруктовая Лухавіцкага раёна Маскоўскай вобласці, дзе жывуць родныя героя...

Свой староста

Уладзімір Якаўлевіч Трында прачнуўся ад моцных выбухаў. Звінела шкло ў вокнах. У першы момант не зразумеў, што здарылася. Узрывы працягваліся, былі зусім недалёка. Трында ў адно імгненне апрануўся і выскачыў на вуліцу. У многіх месцах горада шугалі бліскавіцы полымя. У небе кружылі самалёты.

Так для Уладзіміра Якаўлевіча пачалася вайна. 21 чэрвеня 1941 г. яго, інспектара Косаўскага райфінаддзела па падатках, паслалі на абласную нараду ў Брэст. І нарада не адбылася...

Толькі на пяты дзень вайны Трында трапіў у родную вёску Бялавічы. Тут яго чакалі новыя выпрабаванні. Па даносе здрадніка амаль усіх камсамольцаў сабралі ў палявую жандармерыю ў Няхачаве, а адтуль вывезлі ў Слонім і пасадзілі за калючы дрот. У сярэдзіне ліпеня ўдалося вырвацца з фашысцкага лагера і зноў вярнуцца ў Бялавічы.

Неяк восенню Уладзімір Трында паехаў у Косава на млын. Вяртаючыся назад, нечакана сустрэўся з Мікалаем Трындам, — мясцовым актывістам, які быў добра знаёмы Уладзіміру Якаўлевічу па сумеснай падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Размова была кароткай.

— Добра было б, каб на службе ў акупантаў быў наш чалавек, —сказаў Мікалай. — Калі ж у Бялавічах будзе старастам такі, як Славута, то можа любога выдаць. А нам трэба як мага больш ведаць пра ворага...

У лютым 1942 г. Уладзіміра Трынду выклікалі ў жандармерыю ў Косава.

— Нам стала вядома, што вы добра служылі Саветам, — пачаў размову гітлераўец. — Цяпер будзеце служыць нам...

Уладзімір Якаўлевіч успомніў размову з Мікалаем Трындам. «Адразу згаджацца нельга, — мільганула думка. — І адмаўляцца рэзка — таксама, бо западозраць у непрыхільнасці да іх у тым і другім выпадку». Так Уладзімір Трында стаў старастам у Бялавічах. Клопатаў прыбавілася. На кожным кроку падпільноўвала небяспека. Акупанты давалі ўсё новыя і новыя заданні. То людзей трэба з падводамі паслаць на прымусовыя работы, то збіраць па вёсцы малако і адвозіць яго ў Косава.

У сакавіку 1942 г. на кватэру да Уладзіміра зайшоў Мікалай Трында. На твары яго быў неспакой.

— Сястру маю арыштавалі, павезлі ў Германію, — паведаміў ён. — Шукаюць і мяне. Даводзіцца хавацца. Праз Якава і Уладзіміра Казімірчыкаў трэба тэрмінова перадаваць звесткі. Яны ведаюць каму. Сувязь будзем трымаць пастаянна. Праз верных людзей.

Неўзабаве здарылася непрадбачанае. Да адной дзяўчыны з Бялавіч зачасціў камендант з Броннай Гары. Мясцовыя падпольшчыкі рашылі знішчыць яго. Зрабіць гэта ціха па дарозе з Бялавіч не ўдалося: у каменданта была ахова. У сутычцы загінула некалькі патрыётаў.

На другі дзень у вёску прыехалі фашысты і паліцаі. Сагналі ўсіх людзей. У адну шарэнгу паставілі мужчын, у другую — жанчын і дзяцей.

Было адно пытанне:

— Хто мае сувязь з бандытамі?

Для адказу на яго далі пяць мінут. Калі мінуў гэты час, пытанне было паўторана. А потым:

— Не знойдзем бандытаў, будзем страляць вас.

На маўчаўшых людзей былі накіраваны аўтаматы. Што рабіць? Загінуць людзі. Наперадзе мужчын стаяў стараста Уладзімір Трында. Амаль побач — аднавясковец, стары чалавек Фёдар Раманоўскі. Пераглянуліся з Трындам. Раманоўскі, відаць, усё зразумеў, выйшаў уперад:

— Гэтых бандытаў бачыў я, — сказаў ён.

— Дзе ж?

— Заўчора я ездзіў у лес па дровы. А вось там, за насыпам, і сустрэў.

— Хто са знаёмых быў? — пацікавіўся паліцай.

— Са знаёмых не прыкмеціў. Усе чужыя, узброеныя. Я моцна напужаўся.

— Колькі іх было?

— Многа... Бачыў — у глыб лесу падаліся...

Карнікі паклікалі ў бок старасту, пытаюць:

— Скажыце, Вася Валах, Канстанцін Дзюрыч і Іосіф Шыманчык маюць сувязь з партызанамі?

— Не, што вы, паночкі... Дык гэта ж багатыя людзі. А Іосіф Шыманчык, напрыклад, зусім глухі. Які з яго партызан!

Выклікалі з шарэнгі Шыманчыка і самі ўпэўніліся ў яго глухаце.

Карнікі, прыгразіўшы жыхарам, што яны сюды вернуцца і абавязкова пакараюць бандытаў, паехалі. Уладзімір Трында ўздыхнуў з палёгкай.

...Аднойчы ў вёсцы нечакана з'явіліся фашысты (гэта было ў канцы 1942 г.). Уладзімір Трында знаходзіўся дома. Праз акно ўбачыў, што ў двор увайшоў немец. Ён якраз разбіраў наган для чысткі. Хуценька ўсё схаваў, выбег на ганак сустрэць «госця». У гэты ж самы момант з Альшаніц у Бялавічы рухаўся конны атрад партызан. Трэба неадкладна папярэдзіць, што ў вёсцы вораг. Кіўнуў жонцы. Яна зразумела яго. З вядром выйшла са двара і падалася да хаты Ігната Мяхведзя. Той быў на падворку — калоў дровы.

— Нашы з Альшаніц едуць, — сказала жанчына. — Бяжы напрамкі, папярэдзь, што ў вёсцы немцы...

Сувязны Ігнат Мяхведзь па загуменні дабраўся да кустоў і знік.

Партызаны былі папярэджаны аб небяспецы і павярнулі назад.

...Да першага лістапада 1943 г. Уладзімір Трында быў старастам у Бялавічах. Пасля Бялавіцкага бою ён пайшоў у партызаны: заставацца на гэтай пасадзе далей было немагчыма.

С. Кажадуб.

Сям'я патрыётаў

На вяку Канстанціна Васілевіча Стральчэні Вялікая Айчынная была трэцяй вайной, якую давялося перажыць. Яшчэ ў 1916 г. царскім салдатам узяў ён у рукі зброю. Затым праз год стаў байцом Чырвонай гвардыі. Потым служыў у харчовым атрадзе, працаваў на заводзе выбуховых рэчываў у Сергіева-Самарску, а вярнуўшыся з бежанства дамоў, удзельнічаў у камуністычным падполлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1939 г. былога чырвонагвардзейца і падпольшчыка прызначылі намеснікам старшыні Быценскага сельпо.

... Першым з сям'і Стральчэняў стаў партызанам старэйшы сын Канстанціна Васілевіча — Аляксандр. Гэта быў мужны дваццацігадовы юнак, у любую мінуту гатовы пастаяць за сябе і таварыша. Ён са сваім сябрам Мікалаем Шавелем збіраў зброю. Хлопцы хавалі яе ў лесе і перадавалі партызанам. У час адной з такіх вылазак яны трапілі ў рукі фашыстаў. Нямецкі афіцэр, даведаўшыся, што «русішэ юнгэ» збіралі зброю, нават дапытвацца не стаў, з якой мэтай гэта рабілі. Загад яго быў кароткім: «Расстраляць!».

Аляксандра і Мікалая вывелі за вёску Міронім і загадалі капаць для сябе яму. Што рабіць? Юнак з-пад ілба сачыў за фашыстамі. Толькі адзін з іх трымаў вінтоўку напагатове, у астатніх сямі зброя была за плячыма, і яны не звярталі на хлопцаў ніякай увагі. «Трэба дзейнічаць. Не ўсё роўна, як загінуць», — рашыў Саша. Набраўшы поўную рыдлёўку пяску, ён сыпануў ім у вочы салдату побач з ім. Той дзіка ўскрыкнуў і прысеў.

Хлопцы рванулі ў бок лесу. Стрэлы раздаліся не адразу: пакуль немцы ачухаліся і зразумелі, што да чаго, Аляксандр і Мікалай ужо знаходзіліся ў паўсотні крокаў ад хвойніка. Але гэта яшчэ не было выратаваннем. Дзесяткі куль прасвісталі побач, узнімаючы сухі пясок. Адна з іх смяротна параніла Мікалая. Той толькі паспеў крыкнуць таварышу: «Бяжы!», а сам паваліўся ніцма на зямлю. Аляксандр жа дабег да лесу і знік у сасняку.

Ужо ў партызанскім атрадзе ён пакляўся адпомсціць ворагу за смерць сябра.

Слова сваё Аляксандр Стральчэня стрымаў. Ён пусціў пад адхон больш за дзесяць нямецкіх эшалонаў.

У 1943 г. у вёсцы Сяргеевічы, што на Слонімшчыне, пяцёра партызан-падрыўнікоў, сярод якіх быў і Аляксандр, трапілі на засаду. Бой быў няроўны: пяцёра партызан супраць вялікага заслону нямецкіх салдат і наймітаў-паліцаяў. Жывымі засталіся толькі двое. Аляксандр Стральчэня з двума таварышамі геройскі загінуў у гэтым баі.

Радзіма па заслугах адзначыла подзвіг маладога патрыёта, пасмяротна ўзнагародзіўшы яго ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу».

Цяжка прыйшлося сям'і Канстанціна Васілевіча Стральчэні, калі мясцовыя паліцаі даведаліся, што яго сын Аляксандр знаходзіцца ў партызанах. Не раз наляталі яны з вобыскам у надзеі схапіць юнака. Не раз прыходзілася Канстанціну Васілевічу і яго жонцы Ніне Макееўне з дзецьмі хавацца ў лесе.

Калі ў вёсцы была створана падпольная антыфашысцкая арганізацыя, Канстанцін Васілевіч стаў яе актыўным членам. Як партызанскі сувязны, ён часта наведваў Быцень, Даманава, іншыя навакольныя вёскі і дастаўляў адтуль партызанам разведвальныя звесткі.

Аднойчы па заданні партызанскага атрада ён з жонкай Нінай Макееўнай узяў кірунак на Даманава, каб там атрымаць ад Рыгора Зарэцкага чатыры вінтоўкі, 250 патронаў, дзве гранаты. На зваротным шляху, пад'язджаючы да чыгуначнага пераезду, убачылі нямецкага вартавога, якога раней не было. Назад вяртацца было позна. І Канстанцін рашуча ўдарыў каня пугай.

— Хальт! — загадаў вартавы, калі падвода параўнялася з ім. Ён дастаў з кішэні шыняля пачку лістовак і падаў іх Канстанціну.

«Нямецкімі войскамі ўзята Вязьма» — гэтыя словы вялікімі літарамі выдзяляліся на паперы.

— Расія — капут, — паспешліва загаварыў Стральчэня, кладучы лістоўкі пад сена. «Толькі б не ўздумаў правяраць, што вязу», — была ў галаве думка.

Але вартавы нават і не збіраўся правяраць. Ён неяк дзіўна паглядзеў на Стральчэню і раптам сказаў на ламанай рускай мове: «Не, Расія не капут, Дойчланд капут, мая Югаславія капут...».

Вестка пра смерць сына Сашы дайшла да Стральчэняў праз тыдзень... А на раніцу дру-

гога дня гаспадар аб'явіў, каб збірала жонка дзяцей у дарогу — знаходзіцца ў вёсцы было небяспечна.

Загінуўшага Аляксандра Стральчэню замянілі ў партызанскім страі бацька і брат Васіль. Шаснаццацігадовы Васіль Стральчэня стаў разведчыкам. Але і ён не дажыў да светлага Дня Перамогі — загінуў незадоўга да злучэння з Чырвонай Арміяй. Мужнасць юнака адзначана медалём «За адвагу». Ордэнам Чырвонай Зоркі адзначаны баявыя справы і Канстанціна Васілевіча...

М. Рымач.

Памылка лазутчыцы

З успамінаў былога начальніка санітарнай службы атрада імя М. Ф. Сільніцкага брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага Брэсцкага злучэння У. М. Талкачова

Баявыя будні партызанскага атрада імя Сільніцкага, які з верасня 1943 г. дзейнічаў у раёне вёскі Жытлін, былі напоўнены трывогай і нечаканасцямі. Нам даводзілася весці не толькі адкрытыя баі з фашыстамі. Вораг, імкнучыся знішчыць партызан, засылаў у атрады лазутчыкаў, здраднікаў.

Памятаю, як позняй восенню 1943 года ў атрад прыйшла дзяўчына з-пад Брэста. Назвала сябе Верай.

Ёй прапанавалі працаваць санітаркай у медсанчасці, але яна адмовілася. Затое з ахвотай згадзілася быць падсобнай рабочай на кухні.

Атрад не меў яшчэ пастаяннай базы (мы прыйшлі ў гэтыя мясціны з Любанскага раёна Мінскай вобласці), таму кухня знаходзілася пад адкрытым небам. На кастры гатавалася ежа, побач стаялі сталы і лавы, збітыя з абгабляваных дошак.

Пахмурнай раніцай прыйшоў я на кухню, каб зняць пробу прыгатаванай на снеданне ежы. У адным з катлоў грэлася вада, колер якой мяне здзівіў — ён быў ружовы. Мы ўжо прывыклі да карычневага адцення вады, якую бралі з калодзежа, выкапанага на тарфяніку.

— Што гэта за вада такая ў катле? — спытаў у Веры.

— Бульбу на абед варыць будзем, — адказала яна.

І тут маю ўвагу прыцягнула кофта малінавага колеру, якая сушылася пасля мыцця непадалёку. Відаць, падумаў я, мылі яе ў тым жа катле, дзе збіраліся варыць бульбу.

Разам з Іванам Кавалёвым, які дзяжурыў на кухні, мы вылілі ружовую ваду з катла, прымусілі Веру добра вымыць яго.

Хутка гэты эпізод забыўся. Але за Верай пільна назіралі і ў час работы, і ў час адпачынку. Праз некаторы час у атрадзе імя Калініна, які дыслацыраваўся ў раёне вёскі Спорава, была арыштавана дыверсантка, у якой знайшлі тры парашкі цыяністага калію. Гэты мацнейшы яд яна хавала, каб атруціць партызан атрада. На допыце лазутчыца прызналася, што яна завербавана фашыстамі, прайшла курс навучання ў школе дыверсантаў. Там яна пазнаёмілася з Верай, якая з такім жа заданнем прыбыла ў наш атрад.

Камандаванне атрада імя Калініна паведаміла аб лазутчыцы камандзіру Брэсцкага партызанскага злучэння С. І. Сікорскаму. Ён аддаў загад арыштаваць здраднiцу.

Дыверсантку схапілі, абшукалі. Знайшлі два парашкі цыяністага калію. Дзе ж трэці? І тут усплыў у памяці эпізод з ружовай вадой у катле. Дыверсантка прызналася, што высыпала парашок у тую ружовую ваду. І калі б не памыла ў гэтым катле кофтачку (маўляў, мёртвым будзе ўсё роўна), то невядома, як тады б скончылася справа. Цыяністы ж калій не мае ні колеру, ні паху.

Так быў раскрыты чарговы план ворагаў па знішчэнні партызанскіх мсціўцаў.

Незабыўныя дні

З успамінаў былога партызана атрада імя В. М. Молатава І. Янушкевіча

Мусіць, у кожнага чалавека, які перажыў вайну, ёсць незабыўныя падзеі і выпадкі. Быў май 1942 года. Я, член патрыятычнай групы, з групай партызан выйшаў на сустрэчу з сакратаром падпольнай камсамольскай ячэйкі вёскі Яглевічы Віктарам Клютко. Ён прывёў салдат-акружэнцаў для папаўнення партызанскага атрада.

Пасля гэтай сустрэчы прайшло некалькі дзён. І вось я ў Івацэвічах. Бачу, фашысты, гру-

ба лаючыся, зганяюць гараджан. Прабраўся бліжэй. На машыне ўбачыў дваіх знявечаных чалавек. Рукі скручаны дротам. І раптам нібы ток прашыў маё цела: у адным з іх я пазнаў Віктара. «Хутчэй да сваіх! Трэба папярэдзіць. А што, калі Віктар на допыце не вытрымаў, расказаў аб усім?..», — трывожныя думкі падганялі, не давалі спакою. Аднак хваляванні былі дарэмнымі. Віктар вытрымаў катаванні, не прадаў сяброў, памёр, як сапраўдны патрыёт.

У якасці сувязнога ездзіў я ў Мінск, Оршу. Не, былі гэта не проста паездкі. Гэта быў шлях, звязаны са смяротнай небяспекай, з рызыкай. У студзені 1943 г. я стаў партызанам атрада імя Молатава.

... Першая баявая аперацыя. Група партызан з 14 чалавек выйшла на вузкакалейку паміж Гічыцамі і Козікамі. Замініравалі чыгунку. Сталі чакаць. У хуткім часе павінен быў прайсці састаў з папаўненнем для Целяханскага гарнізона. Састаў набліжаўся да замініраванага ўчастка дарогі. Выбух. Мы адкрылі кулямётна-аўтаматны агонь. Уцячы ўдалося нямногім акупантам...

Медаль «За адвагу» — такой узнагароды я ўдастоены за ўдзел у партызанскім руху.

Шмат было сутычак з ворагам, шмат паходаў. А ў 1944 годзе я стаў байцом Чырвонай Арміі. Ваяваў у складзе войск 3-га Беларускага фронту, удзельнічаў у штурме Кёнігсберга. Радзіма ўзнагародзіла мяне ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём «За адвагу» і іншымі.

Перажыў радасць перамогі. Гэта быў дзень, які, нягледзячы на плынь жыцця, ніколі не забываецца. Ён і цяпер жыве ў сэрцы — Дзень Перамогі 1945 года. У мірны час пастаянна ў працы, каб квітнела наша Бацькаўшчына.

Сустрэча з Васілём Казловым

З успамінаў былога партызана атрада імя А. П. Чарткова В. К. Пытляка

У жніўні 1942 года наш 112-ы партызанскі атрад перадыслацыраваўся з Корачынскіх у Самычынскія лясы. У гэты час атрад узначальваў Аляксей Пятровіч Чарткоў, камісарам быў Фёдар Аляксандравіч Бяляеў, начальнікам штаба — Васіль Міхайлавіч Манахаў. У атрадзе налічвалася 150 чалавек. Мы ўжо нямала зрабілі, змагаючыся супраць фашысцкіх захопнікаў. Аднак атрад не мог дзейнічаць мэтанакіравана, у поўную сілу. Неабходна была сувязь з Вялікай зямлёй, як тады называлі тэрыторыю краіны, не акупіраваную ворагам, з Брэсцкім антыфашысцкім камітэтам. Адзіны радыёпрыёмнік, які быў у атрадзе, працаваў вельмі дрэнна, і мы ніяк не маглі выйсці на сувязь.

Каб наладзіць гэтую сувязь, група нашага атрада вырашыла ісці ў Любанскі раён Мінскай вобласці, дзе знаходзілася партызанскае злучэнне пад камандаваннем Васіля Іванавіча Казлова і якое мела сувязь з Масквой. Аб гэтым нам паведаміў Іван Іосіфавіч Жышко, член Брэсцкага антыфашысцкага камітэта, які прыбыў у наш атрад. У групу ўвайшлі камісар атрада Ф. А. Бяляеў, І. І. Жышко, партызаны С. Арлоў, М. Колтун, В. Самойлаў, Т. Іваноў і я.

Гэта заданне наша група атрымала ў час фашысцкай блакады. Прабірацца ў вызначаны раён было складана. Таму на Агінскі канал паміж Выганашчанскім возерам і новым 10-м шлюзам мы трапілі толькі 16 верасня. Адсюль да Любанскага раёна напрасткі 150 кіламетраў. Аднак, каб пераадолець такую адлегласць, нам спатрэбіўся не адзін тыдзень, бо ўвесь час даводзілася абыходзіць фашысцкія гарнізоны і паліцэйскія ўчасткі. Але дайшлі нармальна.

Бяляеў і Жышко не раз падоўгу гутарылі з В. І. Казловым. Аддалі яму дакументы, якія забралі ў забітага намі фашыста. Як высветлілася, гэта быў палкоўнік, адказны за барацьбу з партызанамі ў нашай мясцовасці (мы нямецкай мовы не ведалі і самі не маглі атрымаць гэтую інфармацыю, хоць і праглядалі дакументы).

— Мы гэтага фашыста тут, на Міншчыне, ужо даўно шукалі, каб пусціць у расход, а вы так вось мімаходзь яго забілі. Малайцы! — разглядаючы дакументы нямецкага палкоўніка, казаў тады Бяляеву і Жышко кіраўнік Мінскага партызанскага злучэння В. І. Казлоў.

Тут мы не толькі дамовіліся аб сувязі, але і атрымалі патроны, расфасаваную ўзрыўчатку. Мы яе ўзялі столькі, колькі змаглі

панесці. Словам, мы неслі добрыя звесткі ў атрад.

Свой атрад мы знайшлі ў Корачанскіх лясах. Пасля блакады ён скараціўся амаль удвая. Тут мы атрымалі страшную вестку аб тым, што фашысты знішчылі вёскі Красніца, Вяда, Тупічыцы, Баровічы. Цяжка было на душы. Але трэба было працягваць барацьбу. І мы яе вялі, помсцілі фашыстам за іх зверствы на нашай зямлі.

Помста

Пасля акупацыі вёскі Падстарынь неўзабаве пад кіраўніцтвам Канстанціна Дзям'янавіча Талочкі была арганізавана і пайшла ў лес група з 11 патрыётаў. У ёй быў таксама Канстанцін Лявонавіч Талочка, а брат яго Васіль дачасу заставаўся ў вёсцы за сувязнога.

Праз некаторы час фашыстам стала вядома аб сувязях жыхароў вёскі з партызанамі. Быў схоплены сувязны Іван Букшта. Нечалавечыя катаванні перанес ён, але нічога не сказаў пра сваіх таварышаў. Калі яго вялі па вуліцы з допыту, паспеў перадаць Васілю Талочку, каб уцякаў у лес. Не паспеў Васіль зрабіць і некалькіх крокаў пасля гэтага, як яго спыніў паліцай:

— Дзе жыве Васіль Талочка?

Васіль паказаў у бок сваёй хаты, да якой было з паўсотні метраў, а сам падаўся ў суседні двор і па-за хлявамі пашыбаваў у бок лесу. Увайшоўшы ў густы хвойнік, азірнуўся: там, дзе стаяла бацькава хата, у неба ўздымаліся клубы дыму.

...Зімой 1942 г. партызанскі атрад рухаўся ў напрамку вёскі Багданаўка. На світанні ў разведку паслалі дваіх. Старшым быў Канстанцін Талочка. Праз некаторы час пачулася страляніна — засада. Не ведаючы размяшчэння ворага і яго колькасці, атрад адышоў у лес. На другі дзень стала вядома, што ў Багданаўцы знаходзіліся буйныя сілы ворага. Прыняўшы бой на сябе, разведчыкі выратавалі і захавалі атрад, яго месцазнаходжанне.

...Канстанціна хавалі ў той жа дзень. Разведчыка нельга было пазнаць. Ён увесь быў паколаты. Яму выкруцілі рукі... Аб чым тады думаў Васіль, калі развітваўся з братам? Усяго некалькі дзён назад ён з братам чысціў зброю і, зразумела ж, спадзяваўся яшчэ доўга жыць, дачакацца перамогі...

Потым мы прачытаем у дзённіку Васіля Талочкі: «Я не асуджаю цябе, камандзір атрада Зуеў, за тваё рашэнне. Для мяне Косця быў братам, для цябе — байцом. Ты меў права пасылаць яго на самыя цяжкія заданні, меў права і патрабаваць ад людзей берагчы сваё жыццё дзеля святой справы — барацьбы супраць ворагаў, дзеля помсты фашызму, у імя будучай перамогі...».

У чэрвені 1942 г. група партызан атрымала заданне пусціць пад адхон варожы эшалон, які будзе ісці на фронт. Выбралі ўчастак дарогі непадалёку ад вёскі Боркі, дзе да чыгуначнага палатна падступала кустоўе. Узрыўчаткі не было, і партызанам неабходна было на месцы стыку развесці рэйкі і такім чынам пусціць эшалон пад адхон.

Ноч была цёмная. Толькі ненадоўга разрываліся хмары і адтуль пабліскваў месяц. Тады можна было разгледзець мясцовасць, паназіраць за аховай.

Бясшумна ўзабраўся Васіль Талочка на насып. Прыклаўся вухам да рэйкі. Чулася далёкае пастукванне колаў па стыках рэек. Эшалон ішоў з боку Брэста. Трэба дзейнічаць хутка і бясшумна. Хлопцы ламамі адарвалі рэйку, адсунулі яе ўбок, а самі адпаўзлі ў кустоўе і сталі чакаць. На насыпе застаўся толькі Васіль. І калі паказаліся агні паравоза, усё мацней застукалі колы, партызан убачыў непадалёку нейкую постаць. Якраз бліснуў месяц і асвяціў нямецкага салдата, што крочыў па палатне чыгункі. «Яшчэ хвіліна, і фашыст заўважыць дыверсію... Усё прапала... Не... гэтага нельга дапусціць», — мільгалі ў галаве Васіля думкі. І калі ахоўнік падышоў бліжэй, партызан стрэліў у яго ва ўпор, а сам пакаціўся з насыпу. З усіх бакоў па чыгунцы ўшчалася страляніна, але цягнік ужо ляцеў пад адхон. Трэск, шум, крыкі змяшаліся ў адно цэлае. Успыхнуў пажар, які было відаць за некалькі кіламетраў...

Шмат разоў хадзіў Васіль Талочка на чыгунку. Разам са сваімі сябрамі пусціў пад адхон 17 эшалонаў ворага.

...Летам 1944 года родная зямля была вызвалена ад ворагаў, але для Васіля Лявонавіча

вайна не закончылася. Артылерыстам у радах дзеючай арміі ішоў ён на захад.

Шмат было баёў. Цяжкіх, кровапралітных. Асабліва на польскай зямлі.

Аднак усё перажыў, усё вытрымаў баец Васіль Талочка.

...Мінаюць гады. І зноў чытаем запісы Талочкі: «Часам ноччу я прачынаюся ад тупога ныючага болю ў сэрцы. І доўга не магу заснуць. Боль у сэрцы. Ён напамінае аб мінулым... Смерць мінула цябе. І гэта было авансам на будучае, якое павінна быць апраўданнем перад загінуўшымі...».

Ю. Камяк.

Справа ўсенародная

З успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада імя М. А. Шчорса, начальніка штаба Брэсцкага партызанскага злучэння П. В. Пранягіна

У заходніх абласцях партызанскі рух нарадзіўся ў своеасаблівых умовах.

Не паспеўшы эвакуіравацца, мясцовыя жыхары — былыя падпольшчыкі, члены КПЗБ, савецка-партыйны і камсамольскі актыў — схаваліся ў лясах або ў надзейных людзей. У той жа час у брэсцкіх лясах засталася частка байцоў і камандзіраў Савецкай Арміі, якім не ўдалося прабіцца за лінію фронту. Гэтыя дзве сілы (ваеннаслужачыя і мясцовыя патрыёты) сталі аб'ядноўвацца ў партызанскія групы і атрады. Байцы і камандзіры валодалі ваеннымі ведамі, а савецкія актывісты добра ведалі мясцовыя ўмовы. Гэтыя абставіны і патрыятызм пераважнай большасці мясцовага насельніцтва дазволілі партызанскім групам і атрадам нашай вобласці ўжо ў першыя дні акупацыі ўступіць у актыўную ўзброеную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У Андрэеўскіх і Рапалаўскіх лясах Быценскага раёна арганізавалася партызанская група на чале з Аляксандрам Уласавічам Фідрыкам. У яе ўваходзілі І. С. Казялецкі, С. А. Абрагімаў, Л. Мухатдзінаў, В. А. Грабун, С. В. Чабатар, І. А. Сушко, Віктар Фідрык, Уладзімір Фідрык, В.Філенчык, Л. С. Серы, В. Л. Міхальчык і іншыя. Ужо ў ліпені 1941 года партызаны знішчылі на дарозе Жыровічы — Косава дзве грузавыя аўтамашыны, пры гэтым было забіта 6 паліцаяў і 5 гітлераўцаў.

У верасні група Фідрыка аб'ядналася з групай ваеннаслужачага Рыгора Андрэевіча Дудко. Камандзірам стаў А.У.Фідрык, а палітруком — Р. А. Дудко. На працягу восені нашы байцы знішчылі некалькі аўтамашын і каля 20 фашыстаў. Партызаны мелі радыёпрыёмнік, які Віктар Фідрык і Іван Пятрушка захапілі ў немцаў у вёсцы Заверша. Пра ўсё пачутае з Вялікай зямлі яны расказвалі жыхарам бліжэйшых вёсак.

Позняй восенню 1941 года немцы акружылі атрад Фідрыка — Дудко ў лесе паблізу вёскі Русакова. У няроўным баі (партызан было 18 чалавек, а ў праціўніка да 80 салдат) А. У. Фідрык загінуў.

Неўзабаве ў тыя лясы прыбылі і мы. Нас было 12 чалавек. Камандаванне аб'яднанай групай было даручана мне, Р. А. Дудко застаўся палітруком. У цяжкі зімовы перыяд 1941 — 1942 гг. партызаны не складалі зброі: у баях і засадах знішчылі 13 гітлераўцаў. Вясною мы актывізавалі баявую дзейнасць. Групамі пад кіраўніцтвам Р. А. Дудко і М. Пашчанкава з засад было знішчана ці абстраляна некалькі аўтамашын, забіты 21 салдат праціўніка.

У сакавіку ў Ваўчанорскіх і Акунінаўскіх лясах арганізаваліся яшчэ тры партызанскія групы.

У канцы красавіка мы ўстанавілі з імі сувязь. На нарадзе, якая адбылася 25 красавіка 1942 года, было вырашана аб'яднаць чатыры групы ў адзін партызанскі атрад, які назвалі імем Шчорса — героя грамадзянскай вайны. Камандзірам выбралі мяне, камісарам — Дудко. З мэтай дэзарганізацыі праціўніка групам прысвоілі нумары: 51-я, 52-я, 53-я, 54-я. Камандзірам 51-й групы зацвердзілі Федаровіча, 52-й — Фёдара Казанцава, 53-й — Мікалая Вазнясенскага, 54-й — Андрэя Лявонцьева. Месцам дыслакацыі атрада часова вызначылі лес Воўчыя Норы.

... Пасля азнаямлення з асабовым складам зноў утворанага атрада мы распрацавалі план знішчэння дробных паліцэйскіх гарнізонаў, якія скоўвалі нашы дзеянні, наладжвалі на партызан засады, праводзілі нацысцкую палітыку, грабілі і тэрарызавалі насельніцтва.

У кароткі час былі разгромлены паліцэйскія ўчасткі ў Сасноўцы, Трыбушках,

Мяжэвічах. Фашысцкіх служак, якія былі ў буйных гарнізонах, партызаны справацыравалі на выступленне і далі па заслугах. Так была разгромлена ў маі 1942 года калона з 80 паліцаяў, якая рухалася з Косава на Дубітава. Пакінуўшы на полі бою 9 трупаў, у тым ліку свайго каменданта, паліцэйскія ўцяклі.

Знішчыўшы дробныя нямецкія гарнізоны, партызаны расшырылі зону сваіх дзеянняў. З вялікай тэрыторыі немцы не атрымлівалі цяпер ні грама хлеба, мяса і малака. Партызаны адбіралі статкі жывёлы, частку іх забіралі для атрада, астатніх раздавалі сялянам.

Яшчэ ў красавіку атрад асвоіў спосаб арганізацыі крушэння чыгуначных паяздоў з дапамогай простых сродкаў: гаечнага ключа і лапы для выцягвання кастылёў. Некалькі крушэнняў было ажыццёўлена пад кіраўніцтвам і пры асабістым удзеле камісара атрада Дудко і камандзіра 54-й групы А. Л. Лявонцьева. Усяго атрадам імя Шчорса за перыяд з красавіка да ліпеня 1942 года было знішчана 9 воінскіх эшалонаў. Тады вораг узмацніў ахову чыгунак, і мы сталі асвойваць падрыўную тэхніку, выкарыстоўваючы выплаўлены ці выдзеўбаны са снарадаў і авіябомбаў тол і капсулы-дэтанатары ад гранат. З ліпеня 1942 да красавіка 1943 года такім метадам было падарвана 24 эшалоны. Бясстрашнымі і вынаходлівымі былі нашы падрыўнікі П. І. Паўлоўскі, Рыгор Завіруха, Рыгор Патароча, Натан Лікер, Іоня Цырынскі, Мікалай Ботрык, Міхаіл Сейфер, Эрых Штэйн, Беразін і іншыя.

Ачышчэнне значнай тэрыторыі вобласці ад паліцэйскіх участкаў, актыўныя баявыя дзеянні і правільныя ўзаемаадносіны з насельніцтвам стварылі спрыяльныя ўмовы для хуткага росту партызанскіх атрадаў. У Воўчыя Норы няспынна прыбывалі ваеннаслужачыя, якія ўцяклі з палону, і грамадзянскія асобы, якія хаваліся ад праследавання фашыстаў. Тут неяк само па сабе ўзнікла нешта накшталт ваенкамата. Назва «Ваўчанорскі ваенкамат» устаялася сярод насельніцтва навакольных вёсак, і патрэбных людзей яно накіроўвала па адрасу... У маі 1942 года ў атрад увайшлі чатыры былыя ваеннапалонныя: армянін Арцём Авітасьян, грузін Сяргей Атарашвілі, чаркес Мурат Гаджаеў і рускі Васіль Гаранін. Усе яны аказаліся сапраўднымі патрыётамі, стойкімі і мужнымі. Гэта чацвёрка паказвала яскравы прыклад дружбы паміж народамі Савецкага Саюза.

З невялікімі групамі прыйшлі ў ліпені 1942 года ваеннаслужачыя Ф. К. Ляпічаў і А. І. Жураўлёў. Іх далучылі да атрада, захаваўшы за імі самастойнасць, і прысвоілі ім адпаведна нумары 55 і 56. Хутка гэтыя ўзводы папоўніліся новымі байцамі, і колькасць іх была даведзена да 70—80 партызан...

У сувязі з хуткім колькасным ростам атрада і няспыннымі баямі вельмі важна было забяспечыць партызан зброяй і боепрыпасамі. Шмат узбраення мясцовыя патрыёты сабралі яшчэ ў 1941 годзе. Яны перадавалі яго нам. Выключная заслуга ў гэтай справе належыць Паўлу Іванавічу Паўлоўскаму і яго сям'і, карэнным жыхарам Воўчых Нор, Дзям'яну Заходжаму, Аляксандру Уласавічу Фідрыку, яго сынам Уладзіміру, Віктару і ўсёй яго выдатнай сям'і. Іх па праву можна назваць арганізатарамі партызанскага руху ў гэтым кутку Брэстчыны. Нашымі першымі сувязнымі і памочнікамі былі мясцовыя жыхары — Нічыпар Ляшок з вёскі Даманава, Іван Сцяпанавіч Мазайла з вёскі Дзеравянчыца, Іван Парфёнавіч Семянюк з вёскі Вайцэвічы (замучаны ў трыбушкоўскай паліцыі ў снежні 1941 года), Ігнат Піліпавіч Валюкевіч з вёскі Вербалоты (загінуў у партызанах у час аблавы ў маі 1942 года).

У ліпені 1942 года па прапанове Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта была прынята партызанская прысяга ў атрадах імя Кірава, імя Дзімітрова, імя Шчорса, імя Чапаева, а таксама створаны партыйныя або партыйна-камсамольскія групы. Гэта садзейнічала арганізацыйнаму ўмацаванню атрадаў і павышэнню баяздольнасці партызан.

Да канца ліпеня 1942 года ў атрадзе імя Шчорса налічвалася больш за 500 узброеных байцоў і камандзіраў. На ўзбраенні, акрамя вінтовак, былі дзве 40-міліметровыя гарматы, каля 40 кулямётаў, прыкладна столькі ж аўтаматаў, гранаты. З такой сілай трэба і можна было правесці буйную баявую аперацыю. Такая аперацыя ў выніку поспеху, па-першае, натхніла б асабовы склад атрада, умацавала яго духоўныя сілы, унесла б упэўненасць у перамогу нашай справы; па-другое, паказала б насельніцтву сілу партызанскага руху, падняла аўтарытэт народных мсціўцаў; па-трэцяе, унесла б замяшанне ў рады нямецкіх захопнікаў і прымусіла б іх трымаць на акупіраванай

тэрыторыі вялікую колькасць узброеных сіл, што спрыяла б поспеху нашых войск на фронце. Выбар выпаў на Косава, дзе знаходзіўся буйны гарнізон немцаў і паліцэйскіх. Аперацыю рыхтавалі і праводзілі сумесна з атрадамі, якія размяшчаліся ў Гута-Міхалінскіх лясах — імя Дзімітрова і імя Варашылава... Ад атрада імя Шчорса павінна было ўдзельнічаць у баі 360 байцоў, ад атрада імя Дзімітрова — 70 і ад атрада імя Варашылава — 50. Кіраўніцтва боем даручылі мне...

Партызаны ў Воўчых Норах

Паводле справаздачы камандзіра партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі М. У. Сенькіна і начальніка штаба брыгады Ц. С. Коваля*

Падрыхтоўка партызанскага руху ў Буленскіх лясах вялася з восені 1941 года. У навакольных вёсках Косаўскага і Слонімскага раёнаў асела нямала байцоў-акружэнцаў, адны з якіх сталі работнікамі ў сялян, другія нават «прыжаніліся» і аселі ў вёсках. Але пачуццё адказнасці перад Радзімай не давала ім спакою. Тым часам у лесе з'явілася група былых байцоў Чырвонай Арміі ў колькасці 9 чалавек, кіраўніком якой быў Аляксандр Рыла.

Неўзабаве група Рылы выступіла са зваротам да ўсіх акружэнцаў, заклікаючы іх уступіць у рады народных мсціўцаў. Хутка ў ёй з'явіўся капітан Бабкоў, а да мая 1942 года — яшчэ 20 былых чырвонаармейцаў і мясцовых актывістаў. 28 красавіка гэта група, у складзе якой было 15 чалавек, злучылася з атрадам Мікалая Сафонава, а затым і з групамі Пранягіна і Орліна. Орлін Васіль Іванавіч — падпольнае прозвішча патрыёта з Падстарыні Канстанціна Дзям'янавіча Талочкі. Некалькі слоў пра гэтага мужнага і бясстрашнага чалавека.

Канстацін Талочка, які працаваў да вайны старшынёй Івацэвіцкага пасялковага Савета, каб пазбегнуць расправы, пэўны час хаваўся ў лесе, часта ноччу наведваў вёску, наладжваў сувязі з былымі сябрамі па вызваленчай барацьбе ў Заходняй Беларусі, з байцамі-акружэнцамі. У красавіку 1942 года ён пазнаёміўся з Іванам Каленавым па прозвішчы Кіго. Затым яны стварылі сваю партызанскую групу. (У 1943 годзе К. Талочка быў прызначаны камісарам партызанскай брыгады імя Панамарэнкі. Загінуў у Бялавіцкім баі з карнікамі 2 лістапада 1943 г.).

Да канца красавіка 1942 года ў Буленскім лесе партызанскія групы мелі ў сваім складзе да 200 чалавек з добрай зброяй.

Першымі акцыямі партызан была ачыстка лесу ад узброеных банд леснікоў, прызначаных немцамі ў леснічоўкі Воўчыя Норы, Чыжыкі, Рафалаўка. Гэтыя «ахоўнікі лесу» займаліся ў асноўным высочваннем патрыётаў і здачай іх немцам. Таму давялося хутка ачысціць лес ад такой нечысці. У ходзе гэтых аперацый партызаны здабылі значную колькасць зброі і боепрыпасаў.

Пасля ачысткі лесу ад фашысцкіх наёмнікаў партызанам прыйшлося заняцца знішчэннем паліцэйскіх гарнізонаў у вёсках Падстарынь, Боркі, Була, Сенькавічы і іншых, якія прылягалі да лесу. Паліцаі, каб выслужыцца, па-зверску знішчалі патрыётаў, забіралі сялянскі набытак.

21 красавіка 1942 года група партызан, у якую ўваходзілі Васюк, Курносаў, Пялевін, пасля разгону служак Рафалаўскай леснічоўкі ў вёсцы Рафалаўка сутыкнуліся з паліцаямі, якія ішлі на засаду супраць партызан. Народныя мсціўцы раптоўнай атакай прымусілі іх ратавацца ўцёкамі.

3 мая 1942 года група партызан пад кіраўніцтвам Васіля Іванавіча (Талочка К. Дз.) напала на «самаахову» Падстарыні. У кароткай бітве быў забіты намеснік каменданта Івацэвіч, усе паліцаі разбегліся. 7 мая быў знішчаны гарнізон у в.Була, а 12 мая — у в. Боркі. Былі разагнаны гарнізоны ў Акунінаве, Сучках, Плешках.

У баях з паліцаямі і «самааховай» партызаны захапілі некалькі ручных кулямётаў, аўтаматаў, займелі два станковыя кулямёты «максім». За кароткі час ад акупантаў і іх наймітаў быў ачышчаны ўвесь прыбуленскі край.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 307а.

Фіктыўны шлюб

У маі 1943 года ў Брэсцкай вобласці пачаў дзейнічаць падпольны абком партыі на чале з С. І. Сікорскім. Ён размяшчаўся ў Івацэвіцкім раёне. З дзеючых атрадаў арганізавалася партызанскае злучэнне. Дыверсійная дзейнасць партызан узмацнілася пасля прыходу ў раён спецатрада Р. М. Лінькова, які стаў дзейнічаць у трохвугольніку чыгуначных ліній Брэст—Баранавічы, Баранавічы—Лунінец. У той жа час атрад згодна з загадам штаба Заходняга фронту быў пераўтвораны ў аператыўны цэнтр па разведцы. У аператыўным цэнтры былі створаны новыя групы і атрады з ліку мясцовых партызан.

Для аператыўнай перадачы інфармацыі пра рух паяздоў і перавозку жывой сілы і ваеннай тэхнікі па Брэст-Маскоўскай чыгунцы было вырашана ў вёсцы Міхнавічы ўстанавіць рацыю. Месца падабралі паміж чыгуначнай і шасэйнай дарогамі, паміж чыгуначнымі станцыямі Івацэвічы і Косава-Палескае. Разведзводкі перадавалі прысланыя з Вялікай зямлі радысткі, дзевятнаццацігадовыя Вера Дзерунова і Ліда Цянутава.

У хуткім часе солтыс вёскі Міхнавічы Ф. Туркіневіч, які працаваў на партызан, падрыхтаваў для Веры Дзеруновай пашпарт і яна некалькі тыдняў жыла ў вёсцы на кватэры ў Аляксея Іванавіча Белага. Аднак акупанты ўключылі Веру ў спісы для адпраўкі ў Германію. Яна збегла з эшалона і далей актыўна дзейнічала ў Пінскім падполлі.

І зноў дапамог солтыс Ф. Туркіневіч і начальнік пашпартнага стала ў Івацэвічах Г. Пшанай, аформіўшы пашпарт на другую радыстку —Ліду Цянутаву. Пад імем Антаніны Ларынай яна жыла ў Ганны Яфімаўны Русак і лічылася яе пляменніцай, якая прыехала са Смаленскай вобласці. А каб пазбегнуць адпраўкі Ліды ў Германію, рашылі выдаць яе замуж за Аляксея Белага. «Жаніх» і «нявеста» згадзіліся аформіць фіктыўны шлюб і жыць сумесна. Распісаліся ў Слоніме. Жаніху было сорак гадоў, нявесце — дзевятнаццаць. Ліда пасялілася ў доме «мужа». А рацыя стаяла ў хляве Ганны Русак, роднай сястры солтыса Ф. Туркіневіча. Так сталі працаваць на перамогу Аляксей і Ліда. Ліда ўважліва сачыла за рухам варожых воінскіх эшалонаў, якія ішлі на фронт і назад, і здабытыя звесткі перадавала ў штаб Заходняга фронту. Трымала сувязь і са штабам спецатрада.

Пасля вызвалення Івацэвіцкага раёна Лідзія Аляксандраўна Цянутава паехала ў свой родны горад Іванава, што ў Расіі. Працавала ў інстытуце. Выйшла замуж. А. І. Белы пасля вайны выехаў у Баранавіцкі раён, ажаніўся, стаў чыгуначнікам.

М. Каляда.

Паміж двух агнёў

У кнізе «У Прынёманскіх лясах», дзе змешчаны ўспаміны падпольшчыкаў і партызан, кіраўнік Слонімскага падпольнага міжрайпартцэнтра былой Баранавіцкай вобласці М. Т. Аніщчык у артыкуле «Мужнасць, адвага, гераізм» пісаў: «Калі немцы стварылі ў Мінску так званую «Беларускую раду» на чале з вядомым здраднікам Р. Астроўскім, важна было ведаць, што ж там прадпрымаюць і плануюць. Для гэтага патрэбен быў свой чалавек у яго акружэнні.

У Слоніме жыла настаўніца Еўдакія Казлова, якая была знаёма з Астроўскім. Пасля нашай гутаркі з ёй жанчына згадзілася паехаць у Мінск і па магчымасці стаць асабістым сакратаром «прэзідэнта», каб сістэматычна інфармаваць партызан аб усіх крокаў і намерах «рады».

Наш план удаўся. Е. Казлова пранікла ў акружэнне «прэзідэнта» і сумленна выконвала адказнае даручэнне. Але толькі адзінкі ведалі аб гэтым у вайну і ў першыя мірныя гады».

...Сям'я ў бацькоў Еўдакіі была вялікая — шасцёра дзяцей. Бацьку Антону Фёдаравічу ў спадчыну дастаўся кавалак зямлі. Ён прадаў яе і вырашыў вучыць дзяцей. У 1938 годзе Дуся закончыла Віленскую беларускую гімназію і тады ж паступіла на гуманітарнае аддзяленне Віленскага універсітэта. Займалася толькі год. У верасні 1939 г., калі Заходняя Беларусь была далучана да БССР, горад Вільна аказаўся па той бок граніцы. Да вайны Казлова настаўнічала спачатку ў пачатковай школе ў Яглевічах, а потым у сярэдняй — у Косаве. Але

планы маладой настаўніцы пераблытала Вялікая Айчынная вайна. Ужо праз некалькі дзён у райцэнтры былі гітлераўцы. Што будзе рабіць, чым займацца ў час нямецкай акупацыі, Казлова не ведала. Але ўсім сэрцам адчувала, што трэба змагацца.

У першыя дні вайны Дуся разам з сяброўкамі знайшла сабе сапраўдны занятак. На ўскраіне Івацэвіч размясціўся лагер ваеннапалонных. Калі насталі халады, Казлова сабірала ў людзей цёплае адзенне і тайком заносіла за калючы дрот. Восенню ёй удалося вывесці з лагера да двух дзесяткаў палонных. А калі ў Жытлінскіх лясах з'явіліся партызаны, Дуся стала сувязной.

Летам 1942 года падпольшчыкі з Івацэвіч паведамілі аб тым, што на сувязную Казлову данеслі немцам. У Яблонцы будзе засада. Трэба неадкладна пакінуць Яглевічы. Але куды пайсці? І Дуся вырашыла паехаць у Слонім. Яшчэ раней яна даведалася, што там адкрылася прагімназія. З дапамогай знаёмых Казлова ўладкавалася на работу, звязалася з мясцовым падполлем. Аказаў садзеянне ў гэтым кіраўнік Слонімскага падпольнага антыфашысцкага камітэта Іван Дарафеевіч Міско. І тут, у Слоніме, Казлова апынулася сярод двух агнёў. Працуючы ў прагімназіі, маючы зносіны з рознымі людзьмі, яна многае даведалася аб намерах і планах акупацыйных улад у горадзе, здабывала звесткі аб мясцовым нямецкім гарнізоне і праз сувязных перадавала іх партызанам.

У лістападзе 1943 года Казлова атрымала зусім незвычайнае заданне. Неяк у пачатку верасня таго ж года ў Слонім прыязджаў «прэзідэнт» так званай «Беларускай рады» Р. Астроўскі. І Дуся аднойчы сказала таварышам па падполлі, што добра ведае яго. Тут і ўзнікла думка паслаць Казлову ў логава ворага. Намер ажыццявіць было няпроста. Сама сумнявалася. Аднак рашылася.

Напісала пісьмо Астроўскаму. У хуткім часе атрымала адказ: прыязджай. І Казлова паехала. Гэта было ў канцы 1943 года. Дарогаю шмат перадумала. Больш як пяць гадоў мінула з таго часу як яна займалася ў Віленскай беларускай гімназіі. Астроўскі тады быў дырэктарам. Нават неяк выклікаў яе да сябе і, ведаючы слабое матэрыяльнае забеспячэнне гімназісткі Казловай, спытаў, чаму яна не напісала прашэнне аб дапамозе.

— Уладкавалі мяне працаваць статыстам у школьны аддзел «рады», — расказвала Еўдакія Антонаўна. — Жыла на тэрыторыі новага беларускага «ўрада». Натуральна, бачыла, што робіцца наўкол, старалася запамінаць. На сувязь да мяне прыязджаў падпольшчык Мікалай Ціхан. Усё, пра што даручалася даведвацца, старалася выканаць...

Так, Дуся старалася. Ужо ў мірны час яна аднойчы сказала: «Я і зараз не магу паверыць, што была такой смелай, бясстрашнай і ў той жа час непрыкметнай сярод супрацоўнікаў «рады».

Сапраўды, кожны дзень рызыкуючы жыццём, Казлова не думала аб небяспецы. Дзейнічала асцярожна і вынаходліва. Калі праходзіў усебеларускі «кангрэс», Дуся дастала дакументы для некалькіх падпольшчыкаў, якія пабывалі на гэтым «форуме» ў Мінску. Друкарскія машынкі, папера, сакрэтныя даныя з «рады» праз сувязных даходзілі да народных мсціўцаў.

Для сустрэчы з падпольшчыкамі і партызанамі Казлова некалькі разоў прыязджала да бацькоў у Яглевічы. У вёсцы Размеркі, напрыклад, на кватэры В. К. Радкевіч яна сустракалася з сакратаром Слонімскага падпольнага райкома партыі М. Т. Анішчыкам і кіраўніком Слонімскага падпольнага антыфашысцкага камітэта І. Д. Міско.

Калі гарматныя залпы наступаючых савецкіх войск сталі чутнымі ў Мінску, «Беларуская рада» спешна зматала манаткі і эвакуіравалася на захад. У дарозе Казловай удалося ўцячы і ў хуткім часе дабрацца да роднай хаты. Гэта было ў канцы ліпеня 1944 года. Раён ужо вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

С. Кажадуб.

Аляксандр Самуйлік: падрыўнік і камандзір

Дзяцінства і юнацтва Аляксандра Іванавіча Самуйліка прайшло ў вёсцы Мохра Іванаўскага раёна. Толькі ў 15 гадоў сын селяніна Івана Самуйліка змог пайсці вучыцца грамаце. Але нядоўга працягвалася вучоба, хоць і быў Аляксандр адным з самых здольных вучняў. Выключылі за палітычную ненадзейнасць. Аляксандр стаў актыўным памочнікам членаў КПЗБ, выконваў заданні партыйнай партячэйкі. Буржуазны суд прыгаварыў яго да шасці гадоў паз-

баўлення волі. Гады зняволення Самуйлік правёў у турмах Пінска, Гродна, Седлеца.

Адразу пасля вызвалення заходніх абласцей Беларусі Аляксандр Самуйлік зноў актыўна ўключыўся ў работу. Аднавяскоўцы выбралі яго старшынёй выканкома сельскага Савета. Але мірнае жыццё працягвалася нядоўга. 22 чэрвеня 1941 года Аляксандр Самуйлік развітаўся з жонкай і сынам, упэўнена сказаў: «Не бядуйце, расстаёмся ненадоўга».

Ён тады яшчэ і сам верыў, што адбылася нейкая памылка, непаразуменне, што ўсё хутка стане на сваё месца. Але калі ў вёсцы Заполле пад Косавам сустрэў змучаных, параненых у баях чырвонаармейцаў, што адступалі ад граніцы, зразумеў — вайна. Разам з групай акружэнцаў пайшоў у Ружанскія лясы.

А. І. Самуйлік і яго таварышы пачалі збіраць вінтоўкі, кулямёты, снарады, пакінутыя на месцы баёў. У красавіку 1942 г., калі ў Косаўскім раёне арганізаваўся атрад імя Г. Дзімітрова, Аляксандр Самуйлік быў назначаны камандзірам аддзялення падрыўнікоў. Не хапала толу. Вось тады і спатрэбіліся прыхаваныя ў лесе боепрыпасы. Вырашылі паспрабаваць выплавіць тол са снарадаў, але як гэта зрабіць, ведалі толькі са слоў. Аляксандр Самуйлік загадаў байцам аддзялення адысці ва ўкрыцце, а сам застаўся разбіраць смяротна небяспечныя снарады. Аперацыя па здабычы толу ўдалася. Пазней тол навучыліся выплаўляць, справа пайшла хутчэй. Неўзабаве падрыўная група Самуйліка мела ўжо 400 кілаграмаў

А. І. Самуйлік.

узрыўчаткі. Акупанты, занепакоеныя размахам партызанскага руху, кінулі ў раён дыслакацыі партызан карнікаў. Народныя мсціўцы вымушаны былі адысці ў пінскія балоты.

Набліжалася 25-я гадавіна Вялікага Кастрычніка. Група падрыўнікоў Аляксандра Самуйліка накіравалася да чыгункі ў раён станцыі Камень-Кашырскі. Дэталёва быў распрацаваны план дзёрзкай аперацыі — захапіць варожы эшалон і здзейсніць на ім па тылах праціўніка чырвоны рэйд у гонар Кастрычніка... Партызаны накіраваліся ў бок г.п. Любяшоў.

Ішоў мокры снег, холад прабіраў да касцей, народныя мсціўцы, затаіўшыся, чакалі варожы эшалон. Наступіла раніца 6 лістапада 1942 года. На чыгуначным палатне партызаны ўбачылі абходчыка. Калі той наблізіўся да іх, партызаны выйшлі са свайго ўкрыцця. Абходчык расказаў, што хутка пройдзе эшалон з нарабаваным дабром, які звычайна ахоўваюць 30 уз-

Група былых партызан, што ўдзельнічалі ў захопе варожага эшалона. Здымак 1980 г.

броеных гітлераўцаў. Далей падзеі разгортваліся наступным чынам: партызан Леанід Бяссонаўскі надзеў форму абходчыка і выйшаў насустрач эшалону, здалёк настойліва махаючы флажком. Поезд пачаў збаўляць скорасць і спыніўся. З вагонаў выскачыла варта. Партызаны з двух бакоў адкрылі па ёй агонь з кулямёта і аўтаматаў. Большасць варты была скошана кулямі, астатнія ўзнялі рукі. Падрыўнікі на тэндэры паравоза прымацавалі чырвоны сцяг, поезд рушыў далей. Дзесяткі кіламетраў праехалі партызаны, раздаючы на прыпынках сялянам прадукты, нарабаваныя фашыстамі ў насельніцтва. На адной станцыі партызаны правялі мітынг, на якім з палымянай прамовай выступіў Аляксандр Іванавіч.

Гэта быў пачатак подзвігу А. І. Самуйліка, якога партызаны называлі беларускім Чапаем не за знешняе падабенства, а перш за ўсё за бязмежную адвагу і смеласць. Ён быў прызначаны ў атрадзе імя Дзімітрова камандзірам узвода, затым — роты. Арганізатарскі талент Аляксандра Самуйліка асабліва праявіўся, калі ў ліпені 1943 года ён стаў камандзірам партызанскага атрада імя Кірава. У ліпені 1944 года ў газеце Брэсцкага антыфашысцкага камітэта «За Родину» паведамлялася, што партызаны-кіраўцы на працягу года пусцілі пад адхон больш за 100 варожых эшалонаў, знішчылі 40 варожых аўтамашын. А ўсяго атрад Самуйліка знішчыў больш за 150 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка, узарваў 32 масты (у тым ліку 12 чыгуначных), 5 танкаў, дзесяткі аўтамашын.

За доблесць і мужнасць, праяўленыя ў партызанскай барацьбе, адважны падрыўнік і таленавіты камандзір А. І. Самуйлік быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

М. Васілеўскі.

Два таварышы

У вёсцы Вулька-Целяханская ў гады ваеннага ліхалецця жылі два таварышы. Абодва з 1924 года нараджэння. Гэта Аляксей Мелік і Фёдар Каланчук. Пасляваенныя жыццёвыя дарогі разлучылі іх, яны раз'ехаліся. Адзін — у Слонім, другі — у Крывы Рог. Але жыве памяць землякоў, тых, хто разам з імі ваяваў у тыя даўнія гады.

У 1943 годзе, каб пазбегнуць адпраўкі ў Германію, хлопцы вырашылі лепш пайсці служыць у гарнізон і застацца ў родных мясцінах, а пры першай магчымасці перайсці да партызан.

Абодва, перамагаючы сябе, з'явіліся ў Целяханскі гарнізон. Здаровых маладых хлопцаў узялі з ахвотай — у вёсцы Азарычы арганізоўваўся паліцэйскі ўчастак і не хапала паліцаяў.

Аляксей і Фёдар настойліва шукалі сувязь з партызанамі. Нарэшце, яны выйшлі на сувязных. Праз іх сустрэліся з партызанам дыверсійнай групы атрада імя Баруцкага Дзмітрыем Каленікам, з якім і абгаварылі ўсе пытанні.

Жыў я тады на хутары, у лесе, метраў за дзвесце ад вузкакалейкі, якая злучала вёску Святая Воля і райцэнтр Іванава. Сувязны атрада імя Молатава, затым атрада імя Чарткова, я выконваў пэўныя заданні партызан. Каленік пра гэта ведаў. У мяне з ім адбылася размова. Я даў пароль. Дамовіліся аб сустрэчы з Аляксеем і Фёдарам.

Адбылася яна нечакана. Вярнуўшыся з чарговага адказнага задання (знішчылі 30 тэлефонных слупоў, парэзалі дрот на кавалкі), я моцна спаў. Чую: нехта будзіць. Прачынаюся і бачу нахілены нада мной устрывожаны, спалоханы твар маці. «Паліцаі, клічуць цябе», — прашапталі яе збялелыя губы. Разгубіўся спачатку і я: можа, падумаў, пасля нашай начной «работы» яны на след натрапілі? Затым разважыў: арыштаваць мяне соннага было б больш проста, тут нешта іншае. Выйшаў. Паліцаі назвалі маё прозвішча, пазней і пароль. Яны трывожыліся: магчыма, будзе пагоня. Я супакоіў сваю разгубленую маці, даў наказ ёй маўчаць пра ранніх візіцёраў, пры патрэбнасці сказаць, што пайшоў у Целяханы плаціць за шыццё патэнт (працаваў тады краўцом).

Мае новыя знаёмыя, пакідаючы сваё месца работы, прыхапілі з сабой тры вінтоўкі, паўтары сотні патронаў, некалькі гранат. Падзяліліся са мной зброяй. Па дарозе далучыўся да нас сувязны з маёй падпольнай групы Іван Леановіч, і ўзялі мы накірунак у трэцюю спецроту...

Два землякі ваявалі ў атрадзе імя Чарткова, праявілі сябе выдатнымі байцамі. Пазней, пасля вызвалення нашага раёна, абодва ўліліся ў дзеючую армію, дабівалі фрыцаў у іх логаве.

Вярнуліся салдаты дамоў. Не сустрэла Аляксея Мяліка сям'я — маці, жонка, маленькае дзіця. Карнікі пасля пераходу Аляксея да партызан схапілі родных і знішчылі. Гараваў моцна салдат. А жыць трэба было. Стварыў новую сям'ю. Увесь час працаваў лесніком Целяханскага лясгаса. Адсюль удзельніка вайны праводзілі на пенсію.

У. Сагановіч.

Удзячны лёсу

...У Выганашчах Паўла Фёдаравіча Сауціна ведаў кожны. З многімі равеснікамі яго разлучыла вайна. А іх было шмат у вёсцы. Разам з імі яшчэ пры пілсудчыках ён батрачыў у паноў, а калі Заходняя Беларусь стала савецкай, узначаліў у сваёй вёсцы рэвалюцыйны камітэт. У час Вялікай Айчыннай вайны, а больш дакладна з 15 жніўня 1941 года да 10 ліпеня 1944 года Павел Фёдаравіч — партызан атрада імя Будзённага. Амаль тры гады хадзіў ён партызанскімі сцежкамі, вядомымі толькі яму аднаму.

Разведчык, сувязны... Ніякіх тут табе пакетаў і паперак. Усё са слоў, усё ў памяці... За ўсе гады партызанскай барацьбы не было ніводнага выпадку, каб Павел Фёдаравіч што-небудзь забыў ці паблытаў.

Успамінаецца Сауціну кароткі, але жорсткі бой з фашыстамі за Выганашчанскім возерам непадалёку ад вёскі Свяціца. Вораг не вытрымаў партызанскага ўдару і ў паніцы адступіў. А дапамаглі партызанам наладзіць «сустрэчу» фашыстам іх надзейныя разведчыкі, сярод іх быў і Павел Фёдаравіч Сауцін.

Не пазбегнуць бы адважнаму партызану расправы ўлетку 1943 года, каб не яго выратавальніца Марыя Струнеўская, якую ён потым так і не змог аддзячыць. Аднак помніў яе ўсё жыццё...

Сабраўшы неабходныя звесткі, Павел накіраваўся ў зваротны шлях. Ужо на выхадзе з Целяхан Сауціна спынілі паліцаі, праверылі дакументы і загадалі ісці разам з імі ў камендатуру...

«Няўжо канец? — мільганула думка ў галаве партызана. — Акрамя сувязных, пра мяне ніхто не ведае... Ці не здраднік сярод іх затаіўся?».

У камендатуры Сауціна адразу павялі на допыт. Гітлеравец, што сядзеў за сталом каля акна, нейкі час разглядваў Паўла. Тут жа каля стала сядзела і перакладчыца. Яшчэ маладая, прыгожая жанчына. Павел пазнаў яе. Гэта была Марыя Струнеўская — тутэйшая жыхарка. Ведала і яна Сауціна, але віду не падала.

Першае пытанне, якое задаў фашыст, яшчэ больш насцярожыла Сауціна.

— Да каго прыходзіў? Прозвішчы, адрасы? Якое заданне далі партызаны? І без падману, бо ведаеш, што цябе чакае?

Допыт працягваўся. А Павел стаяў на сваім, маўляў, да сваяка прыходзіў у Целяханы. Гэта яшчэ больш злавала акупанта. Але перакладчыца штосьці ўпэўнена і настойліва яму гаварыла. У нейкі момант ён нават пачаў спрачацца з Марыяй. А потым усё ж пагадзіўся з ёю. З недаверам і злосцю, аднак адпусціў разведчыка.

А са сваей выратавальніцай Паўлу так і не прыйшлося сустрэцца.

Пасля вызвалення раёна Павел Фёдаравіч больш года працаваў старшынёй Выганашчанскага сельсавета, а потым узначальваў групу па барацьбе з бандытызмам...

С. Кажадуб.

Партызанская сувязная

Хлопчык гадоў трынаццаці нясмела пераступіў парог аптэкі.

— Ці магу я бачыць цёцю Раю? — спытаў ціха наведвальнік.

Дзяўчына страпянулася. У словах быў умоўны пароль.

— Так, — адказала васемнаццацігадовая «цёця» Рая, — гэта я.

Хлопчык перадаў запіску і знік.

«Сёння чакай сувязнога каля свайго дома паміж 11 і 12 гадзінамі ночы. Стары», — прачытала Рая лаканічную фразу.

Ва ўмоўлены час яна сустрэла партызанскага сувязнога з Уласаўцаў Аляксандра Удовіна і перадала яму пакет з медыкаментамі, бінтамі, ватай. Такія сустрэчы сталі частымі. Рая Пшанай, а гэта была яна, ужо доўгі час мела сувязь з партызанамі, выконвала іх даручэнні.

Працавала ў аптэцы пад прыкрыццем бацькі Гардзея Пшаная, які быў начальнікам Івацэвіцкага пашпартнага стала і таксама трымаў сувязь з партызанамі.

Потым дзяўчыну папрасілі ўладкавацца на работу на біржу працы, дзе больш людзей і магчымых сувязей. Пры дапамозе бацькі справа была зроблена. Каштоўныя звесткі сталі паступаць ад яе ў штаб спецатрада, якім камандаваў палкоўнік Льдоў (Г. М. Лінькоў). Часта наведваў яе з даручэннямі той знаёмы хлопчык, партызанскі разведчык Міша Сівеня.

У Івацэвічах была нямецкая сталовая, дзе харчаваліся афіцэры і салдаты, а вечарамі наладжваўся іх адпачынак. Партызаны даўно хацелі знішчыць гэту сталовую. Раі даручылі знайсці надзейнага выканаўцу. Яна звярнула ўвагу на маладога хлопца Пятра Рэвянькова, які працаваў у сталовай электраманцёрам. Пагаварылі, і Пётр даў згоду, бо лічыў за сорам сядзець склаўшы рукі. Падрыхтоўка да аперацыі пачалася. На хутар каля вёскі Яглевічы сувязны Іван Рыгоравіч Пякарскі даставіў з атрада міну з гадзіннікавым механізмам і 8 кілаграмаў толу. Некалькі дзён спатрэбілася, каб узрыўчатка па частках была перанесена на месца, — Рэвянькоў даставіў яе ў падвал сталовай.

Вечарам 18 кастрычніка 1943 года ў сталовай, як заўсёды, было людна.

Рэвянькоў непрыкметна праслізнуў у падвал і паклаў на толавы зарад міну з заведзеным гадзіннікавым механізмам. Аднак выйсці непрыкметна не ўдалося — каля ўваходу з'явіліся салдаты. Пётр з вялікай цяжкасцю вылез праз акенца падвала і толькі адбег некалькі метраў, як ударная хваля збіла яго з ног, а за ёй страшны выбух скалануў навакольле. На месцы сталовай ляжалі кучы цэглы і бярвенняў.

Пётр Рэвянькоў дабраўся да лесу і стаў партызанам. Удзельнічаў у многіх баявых аперацыях. У адной з іх каля горада Іванава ў баі з карнікамі Пётр загінуў.

...У Івацэвічах на рагу Камсамольскай і Паштовай вуліц працуе «дзяжурны магазін». Ён стаіць на месцы нямецкай сталовай. Хто-хто, а Раіса Гардзееўна Пшанай заўсёды перажывае мінуты хвалявання на гэтым месцы.

М. Каляда.

Цаной жыцця

У лясной вёсцы Жытлін стаіць помнік партызанам. Першым на ім высечана імя Аляксея Пятровіча Чарткова...

Гэты малады 22-гадовы лейтэнант, камандзір кулямётнага ўзвода, сустрэў вайну на заходняй граніцы каля Брэста. Баі, адступленне. З групай байцоў трапіў у акружэнне. Аднак палону ўдалося пазбегнуць. Каля в. Жытлін у верасні 1941 г. ён стварыў першую партызанскую групу. Група перарасла ў атрад.

У жніўні 1942 г. камандаванне атрада вырашыла захапіць невялікі састаў на вузкакалейцы, якая злучала Івацэвічы і Целяханы. На ім акупанты падвозілі боепрыпасы для сваіх гарнізонаў. Аднак пры нападзе аказалася, што акупанты везлі рабочых за лесаматэрыяламі. Адпусціўшы рабочых, партызаны селі на поезд і паехалі ў гарнізон в. Святая Воля. Акупанты ніяк не чакалі партызан сярод белага дня. Захоплены знянацку гарнізон быў разгромлены. А партызаны вярнуліся ў атрад з багатымі трафеямі.

Шмат легенд хадзіла пра гэты атрад і яго камандзіра.

У кастрычніку 1943 г. атрад Чарткова пайшоў у Драгічынскі раён на баявое заданне — разграміць поезд на чыгунцы Брэст—Пінск. У час пераходу партызаны даведаліся, што карная экспедыцыя ідзе паліць вёскі партызанскага краю. Камандзір Аляксей Чарткоў прымае рашэнне сустрэць нязваных гасцей агнём. Партызаны арганізавалі засаду паміж вёскамі Гутава і Вавулічы. Сустрэўшы раптоўны агонь, акупанты кінулі машыны і пачалі адступаць. Аднак за імі ішлі новыя ланцугі карнікаў. Эсэсаўцы прынялі баявы парадак і пайшлі ў атаку на значна меншыя сілы партызан. Партызаны не адступілі. У такі крытычны момант уратаваць становішча мог толькі гераізм і асабісты прыклад і бясстрашша камандзіра. Аляксей Чарткоў і Міхаіл Паршын паднялі людзей у атаку. Партызаны захапілі гармату, кулямёты, шмат іншай зброі. Карнікі павярнулі назад. Аднак у гэтай жорсткай схватцы загінулі Аляксей Чарткоў і Міхаіл Паршын.

Пасля вайны пачалі шукаць родных героя-камандзіра. І вось з Лухавіцкага раёна Маскоўскай вобласці прыйшло пісьмо ад Пятра

Іванавіча Чарткова, бацькі Аляксея... На радзіму камандзіра паехалі яго баявыя сябры — Мікалай Колтун, Іван Цярэшчанкаў, Вольга Гойшык, маці партызана-героя Колі Гойшыка. Хвалюючай і незабыўнай была гэта сустрэча! Пётр Іванавіч і Вольга Гаўрылаўна нічога не ведалі пра лёс свайго сына. Афіцыйнае паведамленне — прапаў без вестак...

Так бацька і маці Чартковы, крок за крокам, даведаліся пра жыццё і подзвіг свайго сына і, безумоўна ж, прыехалі на яго магілу. Як родных, сустрэлі іх на Жытлінскай зямлі. З той сустрэчы завязалася дружба паміж беларускай вёскай на Івацэвіцкай зямлі і саўгасам на Маскоўскай зямлі, дзе працавалі бацькі Аляксея.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР перадаў бацькам на захаванне ордэнскую кніжку сына да ордэна Чырвонага Сцяга, пасведчанне да медаля і медаль «Партызану Айчыннай вайны I ступені».

М. Банасевіч.

Маладыя патрыёты

Аляксей Гулевіч

Юны мсцівец Аляксей Антонавіч Гулевіч нарадзіўся і жыў у вёсцы Падстарынь. У гады акупацыі Аляксея Гулевіча называлі «легендарным камсоргам», пра юнака хадзілі расказы, падобныя на легенды.

У першыя дні вайны Аляксей часта выходзіў за вёску, аднойчы ў яме ён убачыў пабітую перавернутую гармату, а побач — два аўтаматы. Гэты ваенны скарб юнак схаваў у лесе.

У хуткім часе ў вёсцы быў створаны невялікі лагер ваеннапалонных. Аляксей прыходзіў да калючага дроту, прыносіў людзям ежу. А ў канцы ліпеня 10 савецкіх салдат збеглі. Юнак схаваў іх у склепе, а праз тыдзень ноччу адвёў у лес. Потым з палону збеглі яшчэ некалькі чалавек. Іх Аляксей таксама пераправіў у лес. А калі ў пачатку восені на шашы была абстраляна рота фашыстаў, усюды загаварылі пра партызан. Ніхто тады і падумаць не мог, што ціхі на від Алёша мае да іх адносіны. А тым часам Аляксей Гулевіч стаў адным з актыўных сувязных партызанскага атрада «Савецкая Беларусь». У навакольных вёсках тады ствараліся падпольныя антыфашысцкія арганізацыі з цэнтрам у Івацэвічах. Аляксей і падтрымліваў сувязь цэнтра з атрадам. А каб адвесці ад сябе падазрэнне, пачаў хадзіць на заняткі ў Івацэвіцкую школу.

Быў Аляксей і разведчыкам, і сувязным, і падрыўніком, і камсоргам. Па вечарах у вёсцы праводзіў камсамольскія сходы. Гаварыў ён мала, але сэрцы запальваў надоўга. Потым даваў заданне, і ўсе разыходзіліся.

Пасля аднаго з такіх сходаў восенню 1942 года ён і Саша Лазарчук пачалі прабірацца да чыгункі. Застылі метрах у трыццаці ад насыпу. Чуваць крокі ахоўнікаў. Час бяжыць. Наперадзе бачны агеньчыкі, якія марудна то разыходзіліся, то сыходзіліся зноў. Аляксей не вытрымлівае, паўзе.

— Куды ты? — шэпча Сашка.

— Рызыкну...

— Разам.

Аднак Алёша знікае ў цемры. Праз нейкі час вяртаецца і цягне за сабой шнур: «Парадак!». А дзесьці ўдалечыні ўжо стукае коламі ваенны эшалон. Вось з-за павароту паказваецца прамень пражэктара, які бяжыць па рэйках. Аляксей ірвануў шнур, і быццам мільганула маланка, пачуўся страшэнны выбух.

Узрыў піларамы, гаража, лакамабіляў на лесазаводзе, млына — у гэтых дыверсіях таксама прымаў удзел Алёша. А неўзабаве быў узарваны і будынак валаснога ўпраўлення. Гэту аперацыю Аляксей здзейсніў разам з Піліпам Глушэнем...

Пачаліся аблавы. Былі схоплены многія подпольшчыкі. Сярод іх — Панкова. Яе доўга катавалі. Не вытрымаўшы болю, яна выдала некаторых патрыётаў, у тым ліку і Аляксея. Месяц катавалі Аляксея Гулевіча. Усе здзіўляліся яго стойкасці. Раздзетага, яго падвешвалі да слупа і білі, заціскалі пальцы ў дзвярах, заганялі пад ногці іголкі.

«Я памру, але партызан вы не ўбачыце», — адзінае, што сказаў катам мужны патрыёт. А зімняй ноччу 1944 года Аляксея Гулевіча вывезлі ў поле за Івацэвічы і там расстралялі...

М. Каляда.

Коля Гойшык

Коля Гойшык нарадзіўся 28 студзеня 1928 г. ў вёсцы Воля каля Івацэвіч. У пачатку вайны чатырнаццацігадовы піянер адразу ж актыўна ўключыўся ў барацьбу з фашысцкімі захопнікамі. Збіраў зброю і боепрыпасы, распаўсюджваў сярод насельніцтва лістоўкі, выконваў заданні разведкі партызан. Пасля расстрэлу бацькі, былога старшыні Яблонкаўскага сельсавета, сям'я Колі Гойшыка ідзе ў лес, у партызаны. Юнака залічваюць у камсамольска-дыверсійную групу 112-га партызанскага атрада брыгады імя Дзяржынскага.

Мікалай Гойшык удзельнічаў у падрыве сямі варожых эшалонаў. У красавіку 1944 года ён адправіўся на чарговае баявое заданне. На гэты раз замініраваць рэйкі чыгункі не ўдалося. І тады Мікалай з мінай кінуўся пад эшалон. Так загінуў юны партызан Коля Гойшык. Пасмяротна Коля Гойшык узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

Непадалёку ад месца гібелі юнага героя каля вёскі Міхнавічы яму ўстаноўлены помнік. У Івацэвічах ёсць дом-музей Мікалая Гойшыка. Яго імем названа адна з вуліц райцэнтра.

У Івацэвічы да маці Колі Гойшыка прыязджала шмат юных гасцей, каб даведацца пра яго жыццё і барацьбу. Сюды прыходзіла і шмат пісьмаў. Вольга Андрэеўна ахвотна сустракала піянераў, камсамольцаў, выязджала да іх па запрашэннях, адказвала на іх пісьмы.

І перад піянерамі паўставала жыццё юнага героя.

...За акном — ноч. Цёмная, восеньская. Вецер свішча ў голых галінках яблынь, што растуць каля хаты, вые ў коміне. Коля не спіць, круціцца з боку на бок. Маці толькі што патушыла лямпу, але спаць не кладзецца. Яна чакае бацьку. А яго сёння нешта доўга няма.

Але вось у шыбіну пастукалі. Ціхенька, тры разы. Гэта ён. Вольга Андрэеўна хуценька падымаецца з услончыка, бразгоча клямкай, і ў хату ўваходзіць бацька.

Не запальваючы агню, ён сядае з маці ля акна і штосьці шэпча. Да Колевага слыху даносяцца словы:

— Сёння пад вечар у Івацэвічы прыбыў эшалон з эсэсаўцамі. Відаць, рыхтуюць наступленне на партызан. Трэба папярэдзіць нашых. Інакш будзе бяда...

І зноў бразнула клямка.

Коля нейкі час маўчыць, а затым падымаецца на ложку.

— Мама, куды тата пайшоў?

Доўга ў тую ноч гаварыла маці з сынам, шчыра, сур'ёзна, як з дарослым. Коля таксама падзяліўся сваёй тайнай — ён знайшоў і закапаў каля лесу некалькі каробак патронаў, кулямёт. У яго ёсць рэвальвер. Усё гэта ён збіраецца аддаць партызанам...

Так і сталася, зброю, якую ён сабраў, аддаў партызанам, стаў іх сувязным. Пад выглядам хлопчыка-сіраты або пастушка ён хадзіў па вёсках, па станцыях. Нічога не прамінаў яго пільны погляд. А колькі партызанскіх лістовак расклеіў ён на вуліцах Івацэвіч і навакольных сёл!

Уся сям'я Гойшыкаў чым магла дапамагала партызанам.

Аднойчы, калі Васіль Дзям'янавіч, бацька Колі, выконваў важнае даручэнне народных мсціўцаў у Івацэвічах, яго выдаў фашыстам адзін з паліцаяў. Доўга катавалі Гойшыка гітлераўцы. Але ні слова не пачулі ад яго.

Зімовай раніцай Васіля Дзям'янавіча, збітага, босага, са звязанымі рукамі, эсэсаўцы вывелі на ўскраіну гарадка. У марозным паветры раздалося некалькі стрэлаў. Не стала партызана-патрыёта, не стала мужнага чалавека, які не здрадзіў сваёй Радзіме.

У той жа дзень у вёску Воля выехала вялікая група фашыстаў і паліцаяў, каб арыштаваць сям'ю Гойшыкаў. Вольга Андрэеўна яшчэ здалёк убачыла, як з дарогі ў бок хутара паварочваюць фурманкі, і ўсё зразумела.

— Сынок, трэба ўцякаць.

М. В. Гойшык.

— А як жа бабулька? — збянтэжана прамовіў Коля.

— І бабуля з намі. Мо дабяжым. Лес жа блізка...

Яны выбеглі на двор з другога боку хаты, адкуль былі не бачны фашыстам. Марозны вецер біў у твар, ногі патаналі ў снезе. Бабуля знемаглася.

— Не, я нікуды не пайду, дзеткі, — сказала яна. Уцякайце, любыя, уцякай, дачушка, уцякай, унучак. Вам яшчэ жыць ды жыць. А мне ўжо дзевяты дзесятак...

Бабуля паспела вярнуцца ў хату. Уварваўшыся ў хату, фашысты сталі выпытваць, дзе дачка з унукам. Ад удараў бабуля страціла прытомнасць.

Разграбіўшы хату, гітлераўцы падпалілі яе. Сабраўшы сілы, бабуля выпаўзла з палаючай хаты, але каля парога на двары і памерла.

А Вольга Андрэеўна з Колем дабраліся да лесу. Прайшоўшы некалькі кіламетраў, заначавалі на хутары ў знаёмых. На другі дзень іх падабралі партызаны.

І пра смерць бацькі, і пра смерць бабулі Коля даведаўся ў лесе...

Неўзабаве камсамольская арганізацыя атрада прыняла Колю ў свае рады. Хутка ён быў залічаны ў камсамольскую дыверсійную групу Дзмітрыя Шмураткі. Група мела ўжо немалы вопыт дыверсійнай работы. І вось заданне: узарваць эшалон на ўчастку Пінск—Гарадзішча. Гэта была першая аперацыя, у якой прымаў удзел Коля Гойшык. Выканаць заданне аказалася няпроста. Ноччу паязды не хадзілі, а днём падысці да чыгункі было немагчыма — вакол адкрытая мясцовасць.

І тады Коля сказаў:

— Давайце я адзін днём падкладу міну пад рэйкі.

Усе пераглянуліся.

— Ну, чаго вы? Я пастушком прыкінуся. Мне не прывыкаць...

Ён узяў торбу, перакінуў цераз плячо, паклаў у яе міну. Размахваючы лазінай, ён як ні ў чым не бывала накіраваўся па сцежцы да чыгуначнага палатна. Група ж залягла непадалёк ад чыгункі, каб пры неабходнасці прыкрыць адыход таварыша.

Сябры бачылі, як ён падпоўз да палатна, як спрытна працавалі яго рукі. Праз мінуту-дзве міна пастаўлена. І ў гэты час з боку Гарадзішча

Помнік М. Гойшыку ў в. Міхнавічы.

прагучаў паравозны гудок. Калі поезд дайшоў да месца, дзе стаяла міна, «пастушок» пацягнуў за шнур. Грымнуў аглушальны выбух. Пад адхон паляцелі паравоз і 12 вагонаў...

Праз некалькі дзён «пастушок» Мікола Гойшык такім жа чынам пусціў пад адхон яшчэ два варожыя эшалоны.

У верасні 1943 г. атрад атрымаў заданне выйсці да вёскі Крамно Драгічынскага раёна, каб спыніць варожы эшалон з прадуктамі харчавання, які ідзе на фронт. Але прыбыўшы ў Крамно, партызаны даведаліся, што туды накіроўваецца атрад карнікаў. Партызаны занялі пазіцыі ў засадзе. У час бою мужна змагаўся Коля Гойшык. Карнікі былі разбіты. Партызаны захапілі гармату і іншыя трафеі. Але ў баі загінуў камандзір атрада Аляксей Чарткоў і камісар Міхаіл Паршын.

У шмат якіх баявых аперацыях удзельнічаў юны партызан, паказваючы ўзоры мужнасці і кемлівасці...

24 красавіка 1944 года павінна была адкрыцца першая камсамольская канферэнцыя партызанскай брыгады імя Дзяржынскага.

Напярэдадні Коля Гойшык папрасіўся на заданне, каб у гонар канферэнцыі ўзарваць варожы эшалон. Камандаванне пайшло яму насустрач. З ім папрасіўся і яго сябра Аляксей Савошчык...

Імжыў цёплы красавіцкі дожджык. Ён шапацеў па густых галінках елак і хвоек, гучна капаў на мінулагодняе лісце бярэзніку, што ляжала на сцяжынцы, па якой ішлі юныя падрыўнікі. Лес кончыўся, наперадзе паказаўся чыгуначны насып. Навокал цішыня. Раптам яе парушыў прыглушаны стрэл, і ў паветра ўзнялася ракета. Потым другая... трэцяя. У гэты момант на захадзе пачуўся шум цягніка, часу не заставалася. Трэба паўзці на чыгунку. А побач па ёй, пускаючы ракеты, праходзяць ахоўнікі. Выбраўшы хвіліну, калі ахоўнік прайшоў міма, Коля кінуўся на палатно. Але цягнік імкліва прыбліжаўся. Паставіць міну не было часу, і юны патрыёт кінуўся з мінай на рэйкі. Страшэнны выбух скалануў паветра. Пад адхон паляцелі вагоны, танкі, гарматы.

Гэта быў восьмы эшалон, узарваны Мікалаем Гойшыкам. Восьмы і апошні. Амаль двое сутак расчышчалі ворагі чыгуначнае палатно...

Назаўтра на лясной паляне сабраліся 450 камсамольцаў — дэлегатаў канферэнцыі. Не было толькі тут іх баявога сябра...

Ён стаіць цяпер у бронзе непадалёку ад месца, дзе здзейсніў свой неўміручы подзвіг.

Віктар Клютко

З успамінаў В. Пытляка, былога памочніка па камсамолу камісара атрада імя А. П. Чарткова

Ужо ў ліпені 1941 года ў хмызняку за царквою адбыўся першы падпольны сход камсамольцаў вёскі Яглевічы. На яго прыйшло 11 чалавек. Не з'явіўся толькі Іван Галус. Тады ж і вырашылі выключыць Галуса з камсамола. На сходзе выбралі камітэт камсамольскай арганізацыі, у які ўвайшлі Віктар Клютко, Іван Прымак, Іван Пытляк, Нюра Кузьміна, Васіль Пытляк. Каб змагацца, патрэбна была зброя, і сход вырашыў, што кожны камсамолец павінен займацца яе зборам. Віктар з Іванам Прымаком даставалі авіяцыйны кулямёт і патроны да яго, 10-зарадную вінтоўку і два пісталеты. Гэта былі першыя крокі перад сапраўднай барацьбой.

Камсамольская арганізацыя з кожным днём актывізавала сваю работу. Ад рукі пісаліся лістоўкі, якія падпольшчыкі распаўсюджвалі ў вёсках і Івацэвічах, наладжвалі сувязь з былымі ваеннапалоннымі, якія хаваліся ў сялян, з актывістамі іншых вёсак. А неўзабаве мы звязаліся з партызанскай групай Аляксея Чарткова.

В. С. Клютко.

У лістападзе 1941 года ў гумне бацькоў Нюры Кузьміной адбылося расшыранае пасяджэнне камітэта арганізацыі, на якім прысутнічалі партызаны Мікалай Міхайлаў і Сяргей Арлоў. На гэтым пасяджэнні была вызначана галоўная задача нашай арганізацыі — вывучаць людзей і рыхтаваць іх да выхаду ў лес, да актыўнай партызанскай вайны. Тады мы размеркавалі, дзе і каму праводзіць гэту работу. Віктару Клютко і Івану Прымаку выпаў самы цяжкі ўчастак — Івацэвіцкі гарнізон. Але са сваёй задачай яны справіліся выдатна: хутка арганізавалі надзейную сувязь і праз сувязных звязаліся з турмой, дзе знаходзіліся ваеннапалонныя, даставалі бланкі дакументаў. З турмы ім удалося вывесці пяць чалавек і перадаць партызанам.

Вясна 1942 года пачалася масавым разгортваннем партызанскага руху. У лес пайшло новае папаўненне, падрыхтаванае падпольшчыкамі. Віктар Клютко ўзначаліў падпольную камсамольскую арганізацыю вёскі.

Камітэт камсамола ў Яглевічах стаў сапраўдным штабам, адкуль рассылаліся партызанскія лістоўкі, ішло ў партызаны праверанае папаўненне. Віктар быў душой усёй арганізацыі.

У маі сувязныя накіравалі да Віктара двух савецкіх ваеннапалонных, якія ноччу ўцяклі з поезда, што вёз іх у Германію. Віктар схаваў іх і звязаўся з партызанамі. Пакуль прыйшло рашэнне, як быць з імі, здарылася бяда — адзін з палонных аказаўся правакатарам. Ён здаўся гестапаўцам і выдаў Віктара.

Віктара арыштавалі і адвезлі ў Косаўскае гестапа. Трое сутак фашысцкія каты дапытвалі і катавалі маладога патрыёта. Яны патрабавалі, каб ён выдаў сваіх таварышаў, расказаў аб сувязях арганізацыі. За гэта абяцалі яму жыццё і ўзнагароду. Але дарэмна. Кожны раз яны чулі адзін адказ:

— Я вам нічога не скажу.

Страціўшы надзею зламаць дух і волю маладога патрыёта, гітлераўцы пасля жорсткіх катаванняў вынеслі прыгавор: «Павесіць!»

Мужнага юнака фашысты прывезлі на расправу ў Івацэвічы. На плошчу перад паліцэйскім гарнізонам яны сагналі сотні людзей з пасёлка, навакольных вёсак.

Акрываўлены, змучаны, спакойна крочыў Віктар пад штыкамі здраднікаў да шыбеніцы.

Яшчэ раз камендант Неграбецкі прапанаваў Клютко назваць сваіх сяброў, абяцаўшы за гэта захаваць жыццё.

— Не дачакацца вам гэтага, гады! — ускрыкнуў Віктар. — Усіх не перавешаеце!

Так у росквіце гадоў аддаў жыццё за Радзіму яе верны сын, мужны патрыёт, яглевіцкі камсамолец Віктар Клютко.

Міхаіл Юрашчык

У падрыўнікі Міша пайшоў добраахвотна. Ён адчуваў нейкім незвычайным пачуццём подых чыгункі ў любое надвор'е і беспамылкова выбіраў месца і час для ўзрыву варожых эшалонаў. Нягледзячы на сваю маладосць, мінёр Юрашчык заваяваў у атрадзе імя Дзімітрова вялікую павагу, лічыўся майстрам сваёй справы.

З той пары, калі ў родныя мясціны прыйшлі ворагі, Міша рызыкаваў жыццём кожны дзень. Узначальваючы падпольную камсамольскую арганізацыю роднай вёскі Гошчава, юнак разам з сябрамі знішчаў дробныя групы фашыстаў, паліў масты, рэзаў і абрываў правады тэлефоннай сувязі. Не раз падпольшчыкі глядзелі смерці ў вочы.

... У пачатку сакавіка 1944 г. Міша ішоў на чыгунку ў апошні раз...

Гэта было так. Першыя веснавыя дні выдаліся халоднымі, завірушнымі. Група падрыўнікоў набліжалася да чыгункі. Агледзелі мясцовасць.

— Снегу мнагавата, — прашаптаў Міша камандзіру. — Але нічога, і не ў такіх умовах працавалі...

Чакалі цягніка доўга. Вейкі і бровы пакрыліся шэранню, ногі і рукі мароз зрабіў нягнуткімі, драўлянымі. Нарэшце, доўгачаканы, ледзь чутны гул цягніка.

— Пара, Міша, — сказаў камандзір.

Юрашчык папоўз наперад, да чыгуначнага палатна. Гэтыя дзвесце метраў здаліся доўгімі. Пераадолеўшы іх, Міша прадоўжыў яшчэ больш небяспечную справу. Мёрзлая зямля не паддавалася востраму кінжалу. Міша чуў, як набліжаўся эшалон. Трэба спяшацца, спяшацца, спяшацца... Стала горача. І калі куля апаліла грудзі, Міша не адразу зразумеў, што акружаны шчыльным кальцом гітлераўцаў. Ён абняў родную зямлю чырвонымі, нягнуткімі ад марозу пальцамі і з апошніх сіл ірвануў загваздку ўзрывальніка...

Пасмяротна Міхаіл Канстанцінавіч Юрашчык узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалём «За адвагу».

Не дзеля славы

У першыя ж дні вайны ў вёсцы Святая Воля вакол Дзмітрыя Мацвеевіча Каленіка згуртаваліся яго сябры, знаёмыя Мікалай Козік з вёскі Доўгая, Сцяпан Каленік з Малой Гаці, Піліп Грэчны са Святой Волі.

Група вырашыла прабірацца на ўсход. Але дайшлі да вёскі Хатынічы пад Ганцавічамі і там сутрэліся з двума супрацоўнікамі целяханскай міліцыі Раманавым і Марозавым. Тыя прапанавалі вярнуцца дамоў і весці падпольную барацьбу з ворагам. Так у вёсцы Святая Воля ўзнік падпольны камітэт, кіраўніком якога выбралі Дзмітрыя Мацвеевіча Каленіка. На Івана Міхайлавіча Корзана была ўскладзена адказнасць за падбор і выхаванне кадраў падполля.

Падпольшчыкі Раман Чуйко, Піліп Грэчны, Аўдоцця, Мікалай і Рыгор Козікі, Аляксандр Галоўчык, Васіль Куратнік, Сідар Басалай, Андрэй Крываль і іншыя арганізоўвалі дыверсіі ў тыле ворага, распаўсюджвалі лістоўкі сярод насельніцтва.

У 1942 г. немцы звезлі ў Святую Волю вялікую колькасць сена. Рыхтавалі да адпраўкі па вузкакалейцы. Падпольны камітэт даручыў Васілю Іванавічу Каленіку знішчыць нарабаванае. Ноччу ён падкраўся да сціртаў сена і падпаліў іх.

У цэнтры вёскі Святая Воля гітлераўцы пабудавалі вышку, з якой далёка навокал праглядваліся мясціны. Вышку таксама неабходна было знішчыць. Гэтае заданне падпольшчыкаў выканаў камсамолец Платон Фядковіч: выбраўшы цёмную ноч, ён запаліў фашысцкае збудаванне.

Дыверсіямі на вузкакалейцы, па якой акупанты вывозілі нарабаванае, займаліся Рыгор Мамчыц, браты Пётр і Рыгор Сагановічы, Іван Корзан, Мікалай Каленік. Спалілі падпольшчыкі і малаказавод.

Аднак барацьба не абыходзілася без ахвяр. Аляксандры Куратнік падпольны камітэт даручыў узарваць паліцэйскае ўпраўленне. Аляксандра вырашыла зрабіць гэта праз свайго знаёмага паліцэйскага Пашкевіча. Ёй удалося «пасябраваць» з Пашкевічам і схіліць яго, як ёй здавалася, на свой бок. У вызначаны час яна прынесла яму міну, якую ён павінен быў пакласці ва ўпраўленні. Але Пашкевіч вёў двайную гульню. Міну ён аддаў немцам, паведаміў усе падрабязнасці сваіх сустрэч з падпольшчыцай.

Фашысты адразу прыехалі ў вёску Малая Гаць і арыштавалі Аляксандру і ўсю яе сям'ю. Бацьку, маці, двух братоў і дачку расстралялі. Подпольшчыцу доўга катавалі. Хацелі даведацца, ад каго Аляксандра атрымала заданне. Мужная патрыётка нікога не выдала.

У. Каленік.

Лёс Мікалая Трынды

Мікалай нарадзіўся ў сям'і печніка і быў самы малодшы з пецярых дзяцей. У першую сусветную вайну сям'я эвакуіравалася на ўсход, у Разанскую вобласць. Там і памерла маці Мікалая. Бацька вырашыў вярнуцца на радзіму, у Косава. Забраў з сабой сыноў Антона і Мікалая. Сястра Аня засталася ў Расіі. У Косаве малады хлопец уступае ў камсамол і ў хуткім часе ўзначальвае Косаўскі РК КСМЗБ. Прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні Косаўскай палітычнай дэманстрацыі 3 лютага 1927 года. 28 лютага 1928 г. Мікалая арыштавалі. У наступным годзе адбыўся суд — разам з ім судзілі і сорак яго таварышаў. Абвінавачванне было адно — прыналежнасць да КПЗБ. Пасля прыгавору асуджаныя запелі «Інтэрнацыянал». Сем гадоў знаходзіўся Мікалай у турме, адбываў тэрмін у Гродна, Равічах. У турме выкладаў зняволеным матэматыку, вучыўся сам. Прымаў удзел у сямідзённай галадоўцы ў знак пратэсту супраць здзекаў над палітычнымі зняволенымі. У 1935 г. Мікалай выйшаў на волю і зноў заняўся рэвалюцыйнай работай. Па распараджэнні Палескага ваяводы ў 1936 г. быў арыштаваны. Патрыёта заключылі ў Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер. Тут ён правёў 14 цяжкіх месяцаў. Здзекі, пабоі, дрэннае харчаванне... З канцлагера Трында выйшаў хворы, амаль сляпы. Пачаліся новыя нягоды. На працу нідзе не бралі як «палітычна ненадзейнага».

І вось, нарэшце, доўгачаканы верасень 1939 года! Для такіх патрыётаў, як Мікалай Трында, гэта было сапраўднае збавенне ад жорсткіх умоў жыцця, настала свабода ў выказванні сваіх поглядаў, свабода будаўніцтва новага жыцця. Мікалай працуе загадчыкам прамысловага камбіната. Сястры Ані ў Маскву ён пісаў: «...Ты просіш прыехаць хоць на некалькі дзён. Не магу. Для нас тут кожны работнік дарагі... Работы вельмі шмат. Атрымаў заданне да 1 снежня пусціць усе прадпрыемствы...».

Затым Мікалая Трынду пераводзяць у Высока-Літоўск на іншую гаспадарчую работу. Аня прыехала да брата. Тут і сустрэлі яны вайну. Прарвацца на ўсход не ўдалося. Вярнуліся ў Косава. Мікалай наладзіў сувязі з патрыятычна настроенымі людзьмі. Дом, дзе жыла Аня, стаў явачнай кватэрай.

Пад выглядам скупкі табаку Мікалай хадзіў па вёсках, ствараў антыфашысцкія ячэйкі. Так з'явіліся антыфашысцкія ячэйкі ў

вёсках Скураты, Бялавічы, Куляшы, Няхачава, Хорашча.

Пазнаёміўся Мікалай з ваеннапалоннымі, што працавалі ў Косаве і навакольных вёсках. На кватэры свайго брата Антона сустрэўся з Дзмітрыем Дзмітрыевым, былым ваеннапалонным, які ўцёк з палону і ўладкаваўся поварам у косаўскай турме. Ужо ў кастрычніку 1941 г. была створана падпольная антыфашысцкая група. Мікалай Фёдаравіч Трында быў прызначаны сакратаром Косаўскага падпольнага антыфашысцкага камітэта. Найпершай сваёй задачай патрыёты лічылі стварэнне партызанскага атрада. Падбіралі людзей, збіралі зброю, медыкаменты.

Вясной 1942 г. гэта было здзейснена — у лес былі выведзены першыя партызаны, якія ў далейшым стварылі атрад імя Г. Дзімітрова на чале з камандзірам Дзмітрыем Дзмітрыевым і Мікітам Селюковым.

Мікалай часта бываў у атрадзе. Даставіў партызанам радыёпрыёмнік, дапамог наладзіць сувязь з насельніцтвам. У хуткім часе схапілі сястру Ганну з сынам і адправілі ў Германію. Заставацца ў Косаве было небяспечна, і Мікалай пайшоў у лес да сваіх сяброў-партызан. Прымаў удзел у баявых аперацыях атрада.

...11 мая 1944 г. Мікалай Трында разам з партызанам Палешчуком накіраваўся ў вёскі. Задача была ранейшай — праводзіць растлумачальную работу з насельніцтвам. Раніцай з

М. Ф. Трында.

в. Дубітава накіраваліся ў лес. Па чыімсьці даносе конныя паліцэйскія пачалі праследаванне партызан. Завязалася перастрэлка. Паляшчук быў забіты. Трында адстрэльваўся, пакуль былі патроны. Апошнюю кулю пакінуў для сябе... Паліцэйскія, раззлаваныя, што не ўзялі партызана жывым, пачалі здзекавацца над мёртвым целам. Была адсечана галава, выкручаны рукі і ногі...

...Сяляне пахавалі герояў на месцы іх гібелі. А ў 1945 г. астанкі М. Ф. Трынды былі перанесены ў Косава і пахаваны ў скверы каля гарсавета.

Патрыёт узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені.

В. Мароз.

Памяці паэта-партызана

Доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі, удзельнік партызанскага руху на Быценшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны М. М. Грынчык даслаў у кнігу «Памяць» ліст пра маладога партызанскага паэта Віктара Васілевіча Галаднова. «Таленавіты хлопец з Расіі, — піша М.Грынчык, — пакутнік і герой, загінуў у апошнія дні перад вызваленнем у слонімскай турме. Прападзе бясследна хлопец, калі мы не ўспомнім пра яго цяпер...»

У пачатку ліпеня 1944 г. каля Пятралевіцкай гары, што на паўночнай ускраіне старажытнага Слоніма, разам з арыштаванымі сябрамі быў расстраляны 18-гадовы партызанскі паэт Віктар Васілевіч Галадноў. Ён нарадзіўся ў Краснадарскім краі, да вайны вучыўся ў Навачаркаскім палітэхнікуме, там пачынаў друкавацца ў мясцовых газетах.

Пакутлівыя дарогі бежанства прывялі яго разам з бацькам у 1943 г. ў мястэчка Быцень. Тут ён неўзабаве звязаўся з мясцовай падпольнай «пяцёркай», затым друкаваўся ў партызанскіх выданнях пад псеўданімам «Ёрш». Асаблівае захапленне сярод сяброў выклікаў яго прарочы верш «Рускія ў Берліне», прысвечаны перамозе над ненавісным ворагам.

Аднак па даносе правакатара Нікіціна (суседа па кватэры) у маі 1944 г. ён быў арыштаваны і адпраўлены ў слонімскую турму, дзе і загінуў у апошнія дні перад вызваленнем. Да нас выпадкова дайшлі толькі два вершы Віктара, астатнія, у тым ліку і аповесць, змешчаныя ў рукапісным тоўстым «чорным сшытку», былі забраны пад час арышту і зніклі ў гестапаўскім засценку.

Верш «Погорье», які друкуецца ніжэй, носіць дакументальны характар, ён напісаны па слядах гераічнага бою каля вёскі Пагор'е двух партызан атрада «Савецкая Беларусь» Антона Лукашыка з Прыбарава і Сашы Ятчэні з цэлым атрадам карнікаў 17 красавіка 1944 г., на другі дзень Вялікадня.

Верш «Сустрэча на досвітку» лірычнага плана — тут паэзія кахання, маладосці цесна спалучаецца з рамантыкай подзвігу, з героікай партызанскай барацьбы, з тэмай вернасці і адданасці Радзіме. Сваім патрыятычным пафасам, духам нязломнасці і свабодалюбства вершы гэтыя надзвычай дакладна перадаюць атмасферу свайго непаўторнага гераічнага часу. Разам з тым гэта светлая памяць тым, хто не дачакаўся Дня Перамогі.

М. Грынчык.

З вершаў В. Галаднова

ПОГОРЬЕ

Я знаю, товарищи, в этот день
Ваши лица покрыла суровая тень...
В рядах не нашёлся ещё боец:
Отчизны сын, герой-молодец.
Спустилась украдкою на глаза
Тяжёлая, скорбная горя слеза...
Хотя и погиб, не забудется он —
Верный товарищ, герой — Антон.
Врага разобьём и в счастливый час
Вспомним Антона ещё не раз.

Ясный день, немая тишь,
Тихо дремлют хаты,
Облепил в реке камыш
Мели, перекаты.
И смеётся в поле ржица,
Как у зеркал молодица.

В стороне за вёской гам,
Выстрелы порою,
«Полицаи» по кустам
Сжимают героев.
Пару храбрых партизан
Взять живьём — приказ им дан.

— Окружили нас...Но что ж?
Бой неравный примем! —
Врёшь, живых нас не возьмёшь...
Руки не подымем! —
Бьются хлопцы, враг силён,
Окружил со всех сторон.

Видит Саша — друг в крови:
«Ранен, не иначе!»
Предан дружеской любви
Бьётся ещё жарче.
— Верь, Антон, я не спущу,
За тебя, друг, отомщу!

Нет ответа, смолк Антон,
И сомкнулись веки,
Свищут пули со сторон,
Оббивают ветви.
Окопался штыком Саша:
«Покажу, как бьются наши!»

— Слышь, Антон, не умирай...
Положись на «брата»,*
За родимый милый край
Бей их с автомата!
Но Антон лежит, молчит,
Алой струйкой кровь бежит.

«Пятьдесят два...один я!»
— Не робей, ребята! —
Шлёт по стане воронья
Саша с автомата.
Враг сжимается кольцом,
Бьётся Саша молодцом.

«Не один, коль держит так:
Двадцать наберётся!»
Не возьмут враги никак:
Славно парень бьётся!
Бой уж близится к концу,
Пот струится по лицу.

Отступил враг, кусты жжёт,
Присмирели каты.
Саша к другу вновь ползёт
И берёт гранаты.
Не горят кусты, природа
Верна лишь сынам народа.

Свищут пули...Началось!..
Фрицу нужно славы...
Вороньё вновь поднялось,
С ними фриц их «бравый».
Вновь в атаку фриц ведет
Полупьяный жалкий сброд.

«Вновь идут...Передохнули?»
— Подходите «хваты»! —
Кувыркаяся, сверкнули
В воздухе гранаты.
Фриц вперед всех убежал,
Как осина задрожал.

*Так партызаны называлі 10-зарадны паўаўтамат.

Грохот. Дым. Осколков свист.
Звон в ушах ужасный.
Задрожал фриц словно лист:
Результат прекрасный!
Будто пятки кто припёк,
Друг за дружкой наутёк.

Дал для смеха и вразмах
Саша вслед с десятки.
Да зачем? Так силён страх!..
Бегут без оглядки.
И несутся, точно лани,
Покидая поле брани.

Подбирать свои потери
Выслали Погорье,
Сами в избы позасели...
Эх! Вояки-горе! —
Славный ты урок задал! —
Старик-фурманщик сказал.

СВИДАНИЕ УТРОМ
(Весенние мотивы)

Треплет ветер рыженькой
Кудри шаловливо,
И несётся вдаль он
Над рекою живо.

Смотрит и печалится
Милая девчонка,
Как глумятся «фрицы»
Над её сторонкой.

Не горюй ты, девушка,
Родина сильна,
Разочтёмся, милая,
С ними мы сполна!

— Не простим мы, милая,
Слёзы твоих глаз!
Не печалься ж, девица,
Положись на нас.

— Мы народа мстители,
Мы его сыны,
Нам всего дороже
Счастие страны.

Нам всего дороже
Радость твоих глаз!
Улыбнись же, милая,
На прощанье раз...

Улыбнулась девица,
Парень руку сжал,
В стороне за вёскою
Подали сигнал.

— Приходил почаще бы
Ты ко мне, Иван?!
Поглядел на девицу
Юный партизан.

Подобрал Саша гранаты,
Закурил со стариком,
На плечо два автомата,
И спросил его мельком:
— Сколько их?
— Лежали семь,
Два убиты, слышь, совсем!

— Что с тобою, фриц? Больной?
Что вздыхаешь часто?
Он спешит скорей домой:
Чувствует «ужасно».
Лишний говор всяк поймёт:
У него болит живот!

Саша к хлопцам возвратился,
Обо всём им рассказал,
Рассказал, как с врагом бился,
Вызвал множество похвал.
Слава вечная бойцам,
Бравым хлопцам-молодцам!

— Не скучай, увидимся!
Счастье впереди,
Жизнь ещё пред нами;
Плакать погоди...

— Вам задача, девушки:
Друга утешать,
Чтоб весёлый, радостный
Шёл друг воевать,

— Чтоб за родину
Твёрдо друг стоял,
Чтоб в минуту трудную
Вас он вспоминал!..

И смотрела девица
Милому в глаза, —
— Славный мой, хороший,
Верно ты сказал!..

Много их за Родину
Бьётся, как Иван,
Честных и пригожих
Юных партизан.

Любят они Родину,
Девушку свою,
Молодые, храбрые,
Грозные в бою!

Распрощалась девушка,
Ушёл паренёк;
Поднималось солнышко,
Золотя Восток.

И душистый майский
Плыл рекой туман,
Скрылся в лесу сизом
Юный партизан.

Ім было семнаццаць...

На працягу многіх гадоў краязнаўцы Гошчаўскай сярэдняй школы збіралі звесткі пра сваіх землякоў — былых франтавікоў і партызан. Іх успаміны змешчаны на старонках рукапіснай кнігі «Подзвіг». Немагчыма чытаць іх без хвалявання. З пажаўцелых фотаздымкаў глядзяць на нас прыгожыя суровыя твары салдат, якія выстаялі ў жорсткай вайне.

У свае шаснаццаць гадоў Пётр Лукашук узначаліў адну з антыфашысцкіх груп, якія ўзніклі ў Гошчаве. Падпольшчыкі збіралі зброю, расклейвалі лістоўкі, вялі разведку. А затым 50 аднавяскоўцаў уліліся ў атрад імя Дзімітрова, які дыслацыраваўся ў Гута-Міхалінскім лесе. Быў сярод іх і Рыгор Белы. Аднойчы група смельчакоў, у якую ён уваходзіў, зрабіла засаду на шашы каля вёскі Квасевічы. Хутка з боку Ружан з'явіўся грузавік з акупантамі. Партызаны адкрылі па ім знішчальны агонь.

Праз нейкі час у атрад паступілі звесткі, што 50 карнікаў накіраваліся рабаваць насельніцтва. Вырашылі сустрэць іх каля вёсак Бялавічы і Заполле. Бой быў цяжкі, фашысты адчайна супраціўляліся... Тады партызаны кінуліся ў рукапашную.

Змагаўся ў гэтым атрадзе і Пётр Яўтух. Нямала смелых учынкаў здзейсніў ён. Але, вяртаючыся з разведкі, натыкнуўся юнак на гітлераўцаў. Яны хацелі захапіць яго жывым. Цяжка паранены, Пеця адстрэльваўся. Апошнюю кулю ён пусціў у сябе...

Пры выкананні задання гераічна загінуў падрыўнік Міхаіл Юрашчык. Калі з боку Броннай Гары паказаўся цягнік, Міша кінуўся на чыгунку. Але паставіць міну не паспеў. Ахова заўважыла яго. Успыхнулі ракеты. Застрачылі кулямёты. Юнак стаў адыходзіць. Калі пагоня была ўжо зусім блізка, аглушальны выбух скалануў наваколле. Партызан узарваў сябе і фашыстаў, але жывым у рукі не даўся.

Цяжка перажыў страту сябра-аднавяскоўца Мікалай Банасевіч. Ён прыйшоў у атрад семнаццацігадовым юнаком. Быў залічаны ў дыверсійную групу. Вопытныя падрыўнікі хоць і кпілі з узросту Мікалая, але карпатліва вучылі яго дыверсійнай справе.

Першае баявое хрышчэнне атрымаў хлопец на чыгунцы Слонім — Баранавічы каля вёскі Гавенавічы. Аперацыя прайшла ўдала.

Тым часам акупанты ўзмацнілі ахову чыгункі. Спынялі ноччу паязды на станцыях, а ранкам на павышанай хуткасці адпраўлялі іх у шлях, пускалі праверачныя дрызіны, штурхалі перад паравозам платформы з баластам. Але да перасцярог ворага прыстасоўваліся і народныя мсціўцы. Група падрыўнікоў, у якой дзейнічаў Мікалай Банасевіч, узарвала эшалон на станцыі Косава-Палескае, у 50 метрах ад гарнізона. У хуткім часе смельчакі пусцілі пад адхон тры таварнякі на перагоне Няхачава — Івацэвічы, столькі ж — у раёне рэчкі Жыгулянкі.

У чэрвені 1944 г. атрад атрымаў загад: прыняць удзел у «рэйкавай вайне».

Змяркалася. Выйшлі ва ўрочышча Еўціна, на ўчастак чыгункі паміж Няхачавам і Броннай Гарой. За два кіламетры ад зыходнай пазіцыі размяшчаліся нямецкія гарнізоны. Да іх наблізіліся групы прыкрыцця.

Сігналам да пачатку аперацыі павінен быў стаць узрыў поезда. Час ішоў, але на чыгунцы стаяла цішыня. Стала світаць. Чакаць было нельга. Раптам узвіліся ракеты. Застрачылі кулямёты — групы прыкрыцця ўдарылі па ўмацаваннях гарнізона. У той жа час партызаны рушылі на палатно. У кожнага напагатове толавыя шашкі, узрывальнікі з бікфордавым шнурам.

Пяць кіламетраў пашкоджанай чыгункі — такі вынік гэтай грандыёзнай аперацыі.

А праз дзень радысты паведамілі: пачалося вызваленне Беларусі.

Тысячы народных мсціўцаў уліліся ў рады Чырвонай Арміі, каб гнаць ворага далей. Партызан Фёдар Пархоменка і на фронце застаўся разведчыкам.

Гэта было ў Польшчы. Фёдар і два яго сябры атрымалі заданне прабрацца ў нямецкі тыл і падпаліць танкі. Байцы асцярожна праніклі ў варожае размяшчэнне. Выканалі ўсё, што было загадана. Але на зваротным шляху іх заўважыў працаўнік, адкрыў агонь. Жывым застаўся толькі Пархоменка.

Дарогі вайны... Якімі б яны ні былі доўгімі і нялёгкімі, але і на іх часам сустракаліся аднавяскоўцы. Так, у Венгрыі, каля горада Дэбрэцэна, сустрэліся гошчаўскія хлопцы — Аляк-

сандр Васілеўскі, Аляксей Гардзейчык, Павел Яўтух.

Прайшлі з баямі ўсю Еўропу Мікалай і Пётр Васілеўскія, Уладзімір Валошчык, Пётр Серада, Іван Андрыяшка, Васіль Бандарык, Міхаіл Шыян, Аляксей і Іван Белыя, Іван Фядосік, Іван Раўбецкі...Нашы дарагія землякі, салдаты Айчыннай вайны.

Л. Руціч.

Яны былі вывезены ў Германію

З нашага раёна, у асноўным у 1942—1943 гг., на прымусовыя работы было вывезена каля 570 чалавек. З іх 304 чалавекі — непаўналетнія вязні канцлагераў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання. Непасрэдна ў канцлагерах знаходзілася 15 чалавек. Сярод іх — Надзея Лявонцьеўна Калдушка з Івацэвіч, якая паспытала пекла Асвенціма, Аляксей Антонавіч Стэпусь з Косава, які быў вывезены ў канцлагер Дахаў у жніўні 1941 г. з Пружанскага раёна, і іншыя.

Моладзь і дзяцей сілком вывозілі з розных населеных пунктаў раёна. А найбольш — з Косаўскай зоны, з вёсак Була, Харошча, Грыўда... Большасць вывезеных працавалі ў Германіі на розных работах у сельскай гаспадарцы, на заводах, фабрыках. Ім, як правіла, давалі самую цяжкую і непрэстыжную работу, прымушалі нярэдка працаваць, як кажуць, ад цямна да цямна. Чуткі аб гэтым даходзілі і да нашага раёна ад першых вывезеных на прымусовыя работы ў Германію. Таму многія не хацелі ехаць на падняволную працу ў чужую краіну, уцякалі, хаваліся, калі немцы і паліцаі наладжвалі аблаву ў той ці іншай вёсцы для вярбоўкі моладзі. Напрыклад, група дзяўчынак з вёскі Була некалькі сутак прасядзела ў тутэйшых балотах, ратуючыся ад вывазу ў Германію. Ім пашанцавала: іх не знайшлі. Аднак працяглае знаходжанне ў балотнай вадзе адбілася пазней на іх здароўі. І ўсё ж асноўную частку моладзі і падлеткаў фашысты і іх памагатыя забіралі. Так, былі вывезены ў Германію Марыя Паўлаўна Герман з в.Харошча (1926 г.н., працавала на заводзе), Вера Васілеўна Худзінская з г. Косава (1929 г.н., працавала на швейнай фабрыцы), Пётр Мікалаевіч Слінка з в. Любішчыцы (1929 г.н., працаваў на аўтазаводзе ў Аўстрыі), Клаўдзія Аляксееўна Вашэйка з в. Рацкевічы (1927 г.н., працавала на авіязаводзе ў Германіі), Іван Васілевіч Мальцаў, Алена Іванаўна і Уладзімір Германавіч Езапчукі з Івацэвіч, Еўдакія Гардзейчык і Еўдакія Гоган з Гошчава, Аляксей Трацяк з Бычы і многія іншыя. А былі і такія, хто добраахвотна выехаў у Германію, гэта, як правіла, завербаваныя ў 1941 г., іх улік не наладжаны.

Г. Якжык.

Пекла Асвенціма

З успамінаў былога вязня канцлагера Асвенцім Н.Калдушы (Пясецкай), жыхаркі г.Івацэвічы

1943 год. Стаяла цёплае сонечнае надвор'е. Радавацца б жыццю, прыродзе. А для нас гэта былі чорныя дні. Прайшла чутка, што з нашай вёскі Стайкі забіраюць на прымусовыя работы ў Германію дзесьці сорак падлеткаў, у тым ліку і мяне. Хутка гэтая чутка стала рэальнасцю.

Як якую жывёлу, пагрузілі нас у таварныя вагоны на чыгуначнай станцыі Івацэвічы і павезлі на захад. Слёзы, адчай, страх і невядомасць — вось што перажывалі мы.

Сям'я наша была шматдзетная — пяцёра нас, дзяцей, было, і адзін аднаго меншы. Я — самая старэйшая. Таму бургамістр Івацэвіч ужо хацеў задаволіць просьбу маіх бацькоў аб тым, каб мяне не забіралі ў Германію, каб я дапамагала бацькам па гаспадарцы. Аднак наш вясковы староста настаяў на тым, каб мяне забралі. Маўляў, бацькі мае яшчэ маладыя і са сваёй гаспадаркай самі ўправяцца, а Германіі патрэбна маладая рабочая сіла.

...Прывезлі нас у Варшаву. Адсюль пачалі размяркоўваць на работу ў Германію. Разам з іншымі маімі аднавяскоўцамі трапіла на фабрыку ў г.Вальфан. Выраблялі там шчоткі, і мы былі накіраваны на падсобныя работы. Я ніяк не магла змірыцца з нялёгкай падняволнай працай. І не толькі я. Таму дзесьці праз два тыдні разам з Соняй Каліноўскай, Надзяй Доўстай, Вольгай Козік мы ўцяклі з гэтай фабрыкі, спадзеючыся дабрацца дадому. Але ў

той жа дзень нас злавілі, і хутка я і мае сяброўкі па ўцёках аказаліся ў лагеры смерці — Асвенціме.

Я атрымала і паласатае лагернае адзенне, і свой нумар — 68 975. Яго выкалалі на руцэ. Месяц — каранцін. А потым лагер і падняволь-ная цяжкая работа: капалі канавы пад меліярацыю, як нам гаварылі. Жылі ў бараках у поўнай антысанітарыі, увесь час паўгалодныя. Кармілі ж два разы на суткі: у абед паўлітра поліўкі, а вечарам 250 грамаў хлеба. Першае ўражанне ад канцлагера — жудаснае. Паўсюдна знямоглыя, нібы шкілеты, людзі. Невыносны смурод ад спаленых у печах людзей. На тэрыторыі канцлагера дзень і ноч працавалі два крэматорыі, з комінаў-трубаў якіх валіў чорны дым. Крэматорыі стаялі адзін насупраць аднаго, а паміж імі праходзіла чыгунка. Па ёй падвозілі сюды для спальвання людзей — перш за ўсё яўрэяў, хворых, знямоглых. Іх на смерць забіралі часцей за ўсё надвячоркам ці ноччу, забіралі ў асноўным з рэвіра (бальніцы), які размяшчаўся ў 25-м — перадсмяротным — бараку. Усе, хто быў у гэтым лагеры, былі рана ці позна асуджаны на смерць у крэматорыі. Жылі, пакуль маглі рабіць, бы тыя валы. Але ж трапіць у гэты 25-ы барак, значыць чакаць хуткай, немінучай смерці. Бо менавіта тут канцэнтраваліся хворыя і знясіленыя вязні.

Лёс распарадзіўся так, што ўжо ў першыя месяцы знаходжання ў канцлагеры я аказалася ў гэтым бараку. І толькі выпадковасць ды спагада чалавечая, а можа і воля божая выратавалі мяне ад немінучай смерці. А было гэта так.

Тут, у канцлагеры, я захварэла на тыф. (Калі забіралі мяне на прымусовыя работы ў Германію, то ў нашай вёсцы шмат хто хварэў на гэтую хваробу, магчыма, яшчэ там заразілася, а можа тут, у канцлагеры. Дакладна сказаць не магу.) Тэмпература невялікая. Слабасць. І ты ўжо — не работнік, хоць усведамляеш, што гэта — амаль смерць.

Ляжалі мы ў гэтым бараку ў чым маці нарадзіла і чакалі гібелі, чакалі абходу нямецкага доктара, пасля якога звычайна забіралі чарговых ахвяр. І вось ён з'явіўся. Высокі, худы. Разам з медсястрой. Усіх выстраілі ў шарэнгу, нягледзячы на тое, што многія ледзь-ледзь трымаліся на нагах ад хваробы і знямогласці.

Я наогул была высокай і худой. А тут яшчэ хвароба даканала. Так што засталіся, як кажуць, амаль адны косці ды скура.

Падышоўшы да мяне, нямецкі доктар адразу сказаў:

— Кранкэн?

— Не, — тут жа адказала медсястра Зося, яна была палячка. — Тут іншая прычына.

Доктар яшчэ раз падазрона агледзеў мяне і рушыў далей, тыкаючы пальцам то ў аднаго, то ў другога вязня і выкрыкваючы адно і тое ж слова «кранкэн?» — гэта значыць, хворы.

— Ты веш, цо доктур мувіў? — падышоўшы да маіх нараў, пытаецца потым у мяне медсястра Зося.

— Не, — адказваю.

— Цябе — у крэматорый.

Не было гэта для мяне навіною, але ж усё ў мяне задрыжала. Прашу Зосю, каб тая адправіла мяне заўтра на работу ў лагер. Гэта значыць, дала заключэнне, што я ачуняла і магу ў поўную сілу працаваць.

— Не будзе тэмпературы — выпішу цябе ў лагер, — адказала Зося.

Тэмпература ў мяне не спала, і назаўтра градуснік паказваў 37,6. Што рабіць? І я вырашыла адагнаць тэмпературу на градусніку да 36,6.

Зося неяк падазрона паглядзела на мяне, але нічога не сказала і адправіла ў лагер.

А вечарам таго ж дня амаль усе з барака № 25 былі адпраўлены ў крэматорый. Лёс пашкадаваў мяне на гэты раз і, мусіць, даў дадатковыя сілы для барацьбы за выжыванне. Я больш не трапіла ў рэвір (бальніцу), працавала з тэмпературай і неяк непрыкметна ачуняла ад тыфу. Я заўсёды маліла Бога за выратаванне, дзякую медсястры — палячцы Зосі.

Прабыла я ў Асвенціме яшчэ амаль паўтара года. Наглядзелася на здзекі фашыстаў над людзьмі.

Калі нашы войскі падышлі да Кракава, нас, вязняў з канцлагера Асвенцім, хто яшчэ застаўся ў жывых, пачалі эвакуіраваць далей, у глыб Германіі. Я была ў апошняй партыі і трапіла ў канцлагер у горадзе Берген-Бельзен. Тут я знаходзілася са студзеня 1945 г. Была вызвалена англійскімі войскамі.

Становішча вязняў у гэтым лагеры было не менш жахлівае, чым у Асвенціме. Праўда, тут не палілі людзей у крэматорыях. Аднак яны масава гінулі кожны дзень ад голаду і эпідэмій.

Здаралася, па тры дні не давалі ніякай ежы, не давалі вады. Перакрывалі водаправоды. Рабілі ўсё, каб тыя, хто тут знаходзіўся, як мага хутчэй памерлі.

Кожны вечар, перш чым легчы на нары, вязні гаварылі адзін аднаму свае дамашнія адрасы на Радзіме. Рабілася гэта для таго, каб тыя, хто выжыве, перадалі родным аб тых, хто памёр тут. Ужо дайшло да таго, што ні ў кога не было ўпэўненасці ў тым, пераначуе ён чарговую ноч ці засне назаўсёды.

Я выжыла. Хоць, калі вызвалялі нас англічане, ад знямогласці ўжо і радавацца не магла. Толькі міжволі цяклі слёзы.

Пасля вызвалення працавала ў падсобных гаспадарках розных нашых вайсковых часцей, якія былі на тэрыторыі Германіі і Польшчы. 26 лютага 1948 г. была накіравана ў распараджэнне праверачна-фільтрацыйнай камісіі, якая працавала тады ў г.Волаў, што ў Польшчы, і толькі ў сакавіку 1948 г. вярнулася ў родную вёску Стайкі.

Вязень № 188 340

З успамінаў Івана Дзям'янавіча Прымака, ураджэнца в. Яглевічы

У 1943 г., у канцы снежня, за падпольна-дыверсійную дзейнасць супраць акупантаў я быў арыштаваны і адпраўлены ў турму Слоніма. Пасля допытаў, у лютым 1944 г. накіравалі ў канцлагер Калдычаэва Баранавіцкай вобласці. 6 чэрвеня 1944 г. мяне разам з іншымі вязнямі перавезлі ў Асвенцім, дзе я знаходзіўся амаль да самага вызвалення Польшчы. Ужо былі чутны разрывы савецкіх снарадаў, калі нас спешна грузілі ў эшалоны і адпраўлялі далей у фашысцкае пекла — Бухенвальд, а праз некаторы час перавезлі ў канцлагер Дора, дзе я, нарэшце, і быў вызвалены амерыканскімі войскамі. На мне рабілі медыцынскі эксперымент па распаўсюджванні хваробы Боткіна... Але Бог даў выжыць і перажыць усё, што нават не прысніцца ў самым страшным сне. Пасля ўсіх перанесеных пякельных мук усё жыццё лічыў сябе двойчы народжаным...

В. Касько.

Праз жахі фашысцкіх засценкаў

Цяжкія выпрабаванні перанёс у сваім жыцці жыхар з вёскі Быцень Канстанцін Міхайлавіч Маслоўскі.

У 1943 г. баранавіцкае гестапа схапіла яго разам з іншымі савецкімі людзьмі і кінула ў лагер смерці Калдычэва. Адтуль вязняў перавезлі ў Асвенцім. Давялося зведаць жахі, якія пераносіў не кожны чалавек. На левай руцэ вязняў фашысты выпальвалі парадкавы нумар — так лягчэй было вылюдкам лічыць свае ахвяры. 165 599 — такі нумар дастаўся К. М. Маслоўскаму.

Праз паўгода нейкую колькасць вязняў перавезлі ў Бухенвальд. Сярод іх быў і Канстанцін Міхайлавіч. Не думаў ён ужо застацца ў жывых — кожны дзень сілы слабелі.

У красавіку 1945 г. лагер быў вызвалены наступаючымі войскамі. Намаганнем волі вязень прымусіў сябе падняцца, выйшаў да людзей. Руская жанчына дала яму хлеба, чарачку віна. Сама плакала, слёз не хаваючы ад іх, амаль не падобных на людзей...

К. М. Маслоўскага, як і іншых вязняў, забралі ў шпіталь, доўга лячылі. Толькі восенню 1945 г. вярнуўся ён дахаты. Родная зямля, сям'я, праца дапамаглі забыць жахі фашысцкіх засценкаў. І толькі думка пра мір на зямлі ніколі не пакідала былога вязня, прымушала гаварыць з людзьмі аб мінулым.

— Вайна не павінна паўтарыцца, — гаворыць Канстанцін Міхайлавіч.

В. Булыка.

Былое застаецца ў сэрцы

З успамінаў былога вязня Асвенціма Ганны Фёдараўны Трынды

Ганна Фёдараўна Трында — ураджэнка нашага раёна, да вайны жыла ў Маскве. У чэрвені 1941 г. прыехала ў Косава наведаць брата Мікалая Фёдаравіча Трынду, дзе яе і застала вайна. Тут яна ўключылася ў антыфашысцкі рух. Была арыштавана і вывезена ў лагер смерці — Асвенцім.

...Перад нашай падпольнай арганізацыяй стаяла важная і адказная задача — любымі сродкамі выратоўваць людзей. Гэтай справе мы аддавалі ўсе свае сілы. Многія з жанчын і дзяцей, якія, здавалася, былі асуджаны на смерць, вярталіся да жыцця. Але далёка не заўсёды, нягледзячы на ўсе старанні, удавалася захаваць жыццё нашым таварышам.

Сярод соцень тысяч замучаных і спаленых у Асвенціме жанчын асабліва вялікае ўражанне пакінулі ў маёй памяці некалькі трагічных фігур.

Марыя Загорская — польская пісьменніца. Я пазнаёмілася з ёй, як толькі трапіла ў лагер. Неяк надвячоркам, калі вязняў пастроілі ў шарэнгі на пляцы перад баракамі, побач са мной стала Загорская са сваёй сяброўкай варшавянкай Марыяй Ясінскай. Абедзве добра валодалі рускай мовай. Мы разгаварыліся. Яны прапанавалі трымацца разам. Я з радасцю згадзілася.

Вечарамі мы ляжалі ў душнай цемнаце блока, прыціснуўшыся адна да адной, і гаварылі аб тым, што праўда і справядлівасць павінны перамагчы, што фашызм асуджаны на гібель.

Усіх нас разам з партыяй турэмнікаў ганялі на работу: насіць з Аўшвіца (Асвенціма) за тры кіламетры вялізныя трох'ярусныя ложкі, якія ставілі ў лагерныя рэвіры (бальніцы). Слабыя, худыя жанчыны браліся за такі ложак па некалькі чалавек і, надрываючыся, пад прымусам цягнулі яго на руках усе тры кіламетры па асенняй, размытай дажджамі дарозе.

Пажылой і хворай Загорскай не пад сілу была такая работа. Спатыкаючыся, цяжка дыхаючы, яна ледзь ішла пад цяжкім грузам. Фашысты падганялі, білі яе.

У той жа дзень Загорская звалілася ад цяжкай дызентэрыі. Як і ўсіх хворых, Загорскую на дзень вынеслі з барака і паклалі на мокрую зямлю. Я з Ясінскай вынесла матрац і падклала пад яе.

— Ганна, не трэба ўжо клапаціцца. Глядзі сябе. Мне мала засталося жыць. Шкада толькі, што не напішу сваю кнігу...

Марыя Загорская марыла, калі застанецца жывой, напісаць кнігу пад назвай «У каго адбіраюць міску і лыжку». Так рабілі каты з тымі, каго адпраўлялі ў газавыя камеры.

Не прыйшлося Марыі Загорскай напісаць сваю кнігу, якая б асудзіла фашызм.

...Яшчэ адна засмучаная цень узнікае перад вачыма. Гэта яўрэйка Маля Цыметбаўм, прыгожая, з гарачым і мужным сэрцам. Ніхто з нас не ведаў, хто яна і адкуль родам. Стаўшы членам падпольнай антыфашысцкай арганізацыі лагера, яна разам з намі рызыкавала сваім жыццём.

Невядома, пры якіх акалічнасцях Маля пазнаёмілася з юнаком з мужчынскага лагера. Ён быў паляк. Звалі яго Эдзікам. Яны патаемна сустракаліся каля лагернай агароджы з калючага дроту і на адлегласці размаўлялі паміж сабой. Аднойчы ноччу ім удалося ўцячы з лагера. Аб'явілі трывогу. Праз два тыдні ўцекачоў злавілі і прыгналі назад у лагер. Іх чакала смяротнае пакаранне.

У той жа дзень на шырокім турэмным двары ўзвялі шыбеніцу. Малю падвялі да месца пакарання. Дзяўчына стаяла нерухома, спакойна і мужна чакала, калі ёй накінуць на шыю пятлю. Фашысты тым часам зганялі туды вязняў. Калі ўсе прыгатаванні закончыліся, Маля раптам пахіснулася і ўпала на зямлю. Каты кінуліся яе падымаць, але позна было ўжо. Дзяўчына была мёртвая. Вешаць не было каго.

Як потым расказалі нам, Маля лязом брытвы, схаванай у сукенцы, перарэзала сабе вены на левай руцэ, і пакуль фашысты рыхтаваліся да паказальнага пакарання, сышла крывёю. Так мужна загінула Маля Цыметбаўм.

У той жа час у мужчынскім лагеры тысячы зняволеных, якіх сагналі на плошчу, былі сведкамі пакарання паляка Эдзіка, што марыў разам з Маляй Цыметбаўм аб светлым дні вызвалення.

І сёння, у мірны час, як прывіды, паўстаюць перада мной вязні Асвенціма. Перажытага нельга забыць. Яно навечна засталося ў памяці і сэрцы.

Вёскі Івацэвіцкага раёна, знішчаныя нямецка-фашысцкімі акупантамі разам з жыхарамі

Вёска Вяда

Знаходзілася за 4 кіламетры на паўночны захад ад вёскі Бабровічы. Вядома з 1433 г. Перад вайной у ёй жылі 217 чалавек. 15 верасня 1942 г. у час карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» фашысты загубілі 217 жыхароў, вёску (87 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. У 1965 г. у памяць аб загінуўшых жыхарах пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

Вёска Красніца

Знаходзілася за 3 кіламетры на захад ад вёскі Выганашчы (цэнтра сельсавета). Перад вайной у ёй жыло больш за 90 чалавек. 10 верасня 1942 г. у час карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» фашысты (8-ы і 10-ы палкі 1-й матарызаванай брыгады СС) загубілі 90 жыхароў, вёску (16 двароў) спалілі, маёмасць разрабавалі, жывёлу забралі. Пасля вайны не адрадзілася. У 1950 г. на месцы вёскі пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

Вёска Тупічыцы

Знаходзілася за 4 кіламетры на паўднёвы захад ад вёскі Бабровічы Выганашчанскага сельсавета каля возера Бабровіцкае. Вядома з 1552 г. Перад вайной у ёй жылі 143 чалавекі. 15 верасня 1942 г. у час карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» фашысты загубілі 143 жыхары, вёску (43 двары) спалілі, маёмасць разрабавалі. Пасля вайны не адрадзілася. У 1965 г. непадалёку ад былых вёсак Вяда і Тупічыцы ў памяць аб загінуўшых жыхарах пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

Вёска Бабровічы

Знаходзіцца каля Бабровіцкага возера. Вядома з XV стагоддзя, маюцца археалагічныя помнікі старажытнасці. Да вайны было 164 двары і 707 жыхароў. У верасні 1942 г. у час карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» фашысты загубілі 676 жыхароў і спалілі ўсе 164 двары. Маёмасць і жыхароў калгаса імя Сталіна разрабавалі. Пасля вайны астатнія жыхары адрадзілі вёску.

Вёска Зыбайлы

Да вайны было 42 двары і 260 жыхароў. У красавіку 1942 г. карнікі, уварваўшыся ў вёску, амаль усіх жыхароў загубілі, а сялянскія сядзібы спалілі. Пасля вайны аднавілася.

Вёска Заціша

Знаходзілася за 0,5 км на поўнач ад вёскі Сярадава Яглевіцкага сельсавета. Перад вайной у ёй жыло 235 чалавек. 10 верасня 1942 г. у час карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» фашысты спалілі 125 жыхароў і вёску (37 двароў). Пасля вайны не адрадзілася. У 1967 г. на месцы вёскі пастаўлены абеліск.

Помнік на месцы спаленай вёскі Красніца.

АБАГУЛЬНЕНЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА АХВЯРЫ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗЛАЧЫНСТВАЎ ПА КОСАЎСКІМ РАЁНЕ

№ п/п	Сельсоветы	Расстреляно		Повешено людей	Сожжено людей	Вывезено в Германию	Всего жертв
		людей	военнопленных				
1	Яглевичский	76		2		12	90
2	Альбинский	55				72	127
3	Гривденский	86				231	317
4	Бусежский	32				148	180
5	Стайковский	23				97	120
6	Белавичский	40				85	125
7	Гощевский	124			92	66	282
8	Ольшанский	7	4			40	51
9	Сеньковичский	38	4			117	159
10	Коссовский г/с	1726				217	1943
11	Ивацевичский	350				100	450
12	Подстаринский	30				45	75
13	Любищицкий	56				99	155
14	Житлинский	46				56	102
15	Яблонковский	282			39	81	402
Всего		2971	8	2	131	1466	4578

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 514. Воп. 1. Спр. 321. Л. 3.

І яны з вогненных вёсак...

Ёсць у Хатыні могілкі спаленых беларускіх вёсак. Прывезена туды зямля і з нашага раёна — з тых месцаў, дзе некалі былі вёскі Красніца, Вяда і Тупічыцы, з адноўленай вёскі Бабровічы.

Праходзяць гады. Грозныя ваенныя дні ўсё больш аддаляюцца ад нас. Але памяць аб вайне нязгасна. Яна ў сэрцы тых, хто толькі нейкім цудам выйшаў з яе пекла, каго расстрэльвалі, спальвалі... а ён выжыў.

Першай загінула Красніца — вёсачка з васемнаццаці хат. Засталася ў жывых толькі адна маленькая дзяўчынка. Выпаўзла з агню ў лес.

Потым бяда прыйшла ў суседнія вёскі.

Вось што давялося пачуць толькі ў Бабровічах.

...Чырку Станіславу Ігнатавічу ў сорак другім было дванаццаць. У той страшны дзень ён ішоў з сябруком Чырко Пецем з выгану дамоў, каб паесці. На ўскраіне лесу ім сустрэўся аднавясковец і прагнаў іх назад у балота. Хлапчукі не ведалі, што творыцца ў вёсцы, і пад вечар вярнуліся са статкам дамоў. А вёска гарэла, фашысты расстрэльвалі людзей. Некаторыя схаваліся ў сцірту саломы. Але яна раптам загарэлася, і людзі, у тым ліку і Стась, пабеглі ў дыме да хмызняку. Так ім удалося выратавацца. Доўга блукаў Стась па лесе. Беспрытульны, ён хадзіў па вёсцы Выганашчы, а затым яго забралі добрыя людзі ў вёсцы Доўгая. У той жудасны дзень былі забіты Стасевы бацька, маці, сястра, два браты. Трэці брат загінуў на фронце.

...Чырко Марыі Фёдараўне ўдалося выпаўзці з агню. У яе была перабіта кісць рукі. На двары застаўся ляжаць яе брат з перабітымі нагамі. Ён не выжыў, памёр ад ран.

...Туманік Веры Васілеўне куля прайшла праз сківіцу.

...Петрукевіч Вольга Рыгораўна разам з маці, бацькам, сёстрамі і братам паўзла па бульбяных барознах, а па іх стралялі. Тут жа і былі забіты бацька, тры сястры і брат. А Вольга цяжка паранена. Куля прабіла шыю, выйшла праз падбародак. Вялікае гора зведаў і яе муж Уладзімір Іванавіч: у яго загінула сем братоў і сястра.

...Дубінка Яфім Фёдаравіч у той жудасны дзень страціў жонку і дзяцей.

...Петрукевіча Васіля Еўдакімавіча з групай мужчын вораг пагнаў у абозе з прадуктамі. За Калескай гарой, у Зелянежы, была фашысцкая стаянка. Туды і кіраваўся абоз. На Калескай гары зрабілі прыпынак. І раптам фашысты сталі страляць у мужчын. Петрукевіч кінуўся між падвод. Бег, падаў, поўз. Кулі свісталі побач. Але яму пашанцавала. Ён апынуўся, не помнячы як, далёка ў гушчары.

...Крата Антона Міхеевіча фашысты гналі ў групе іншых мужчын у бок вёскі Вяда. Антон зразумеў, куды іх гоняць. Кінуўся ў кусты, скінуў на хаду плашч, каб заблытаць ворага. Стаіўся за алешынай. Стралялі наскрозь па кустах. Ён жа прыкінуўся мёртвым. Але калі страляць перасталі, ціха папоўз...

Памяць...Святая памяць. Яна жыве на нашай шматпакутнай зямлі ў адноўленых вёсках, у абелісках, што стаяць на месцы былых вёсак, якія так і не адрадзіліся. Жыве памяць і ў дзецях тых людзей, якім удалося выжыць, уцалець пад агнём і кулямі. Імёнамі загінуўшых яны называюць сваіх дзяцей.

Жыве ў Выганашчах Іван Мікалаевіч Куратнік, адзін з лепшых калгасных трактарыстаў. У яго вялікая сям'я: жонка, шасцёра сыноў, дзве дачкі, восем унукаў і ўнучак.

Ёсць у Івана Мікалаевіча і Юлі Андрэеўны сыны Сярожа, Толя і дачка Аня. Так назвалі бацькі сваіх дзяцей у памяць тых, хто загінуў у Тупічыцах: братоў Івана Мікалаевіча Сярожы і Толі і сястрычкі Ані...

Так, Іван Мікалаевіч Куратнік нарадзіўся ў Тупічыцах. Але ж усіх тутэйшых жыхароў фашысты расстралялі ў агульнай вялізнай яме, якую людзі самі сабе пад прымусам выкапалі...

9 чэрвеня 1941 г. пятнаццацігадовы Ваня Куратнік пакінуў родную вёску на беразе Бабровіцкага возера і паехаў на Урал у школу ФЗН. Не паспеў і пісьма напісаць дахаты: пачалася вайна. Тры гады нічога не ведаў Ваня пра лёс сваіх родных і землякоў. За гэты час ён скончыў школу ФЗН, курсы танкістаў і год адваяваў на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У сорак чацвёртым, калі Беларусь была поўнасцю вызвалена, ён напісаў сваім пісьмо. Але родныя не адказалі. Пісьмо Куратніка знайшоў адзін яго зямляк, дэмабілізаваны па раненні ў тым жа 1944 г. Вось гэты зямляк і расказаў Івану ў сваім пісьме пра яго родных, пра тое, што здарылася з Тупічыцамі...

Думаў Іван, што такога гора не перанясе. Нават шукаў геройскай гібелі ў баі з фашыстамі. Там, у Тупічыцах, у той агульнай яме былі расстраляны яго маці, браты, сястра, дзед. Бацька загінуў на Калескай гары. Падрабязнасці паведаміла Івану яго цётка, што жыла ў Выганашчах. Цяжка кантужаны быў танкіст Куратнік ужо ў Берліне. Пасля шпіталя яго дэмабілізавалі. Куды ж падацца салдату? Баявы таварыш даў яму адзін адрас у Кіраваградскай вобласці, угаварыў Івана ехаць туды. Ды і сам разумеў салдат: цяжка, невыносна будзе яму на Радзіме.

Дарога ішла праз Брэст, Івацэвічы. Не змог, не меў права былы танкіст праехаць родныя мясціны і не пабачыць тое месца, дзе абарвалася жыццё яго родных.

І ён прыйшоў на магілу сваіх родных і землякоў. І стаў жыць, будавацца, гадаваць дзяцей. А імёны ім даў загінуўшых братоў і сястры. І зноў жывуць на гэтай зямлі Сярожа, Толя, Аня Куратнікі...

...Была вёска Тупічыцы. Яна стаяла ўздоўж азёрнага берага...

Побач стаяла вёска Вяда. Яе вуліца ўпіралася ў азёрны бераг. Усіх яе жыхароў фашысты вывелі за сяло, у балота, і там расстралялі.

Невялічкая, сярод лесу, у прыгожым, красным, як казалі нашы продкі, месцы прытулілася вёсачка Красніца...

І толькі Бабровічы аднавіліся, разрасліся, сталі гаманлівымі.

Зямля гэтых вёсак звініць у званах Хатыні.

М. Купрэеў.

Ноч жахаў

З успамінаў жыхаркі в. Даманава Таццяны Пятроўны Макарэвіч

У мяне быў брат Курленя Лаўрэн Пятровіч. Мы проста звалі яго Лаўрык. Было яму 20 гадоў. Да вайны працаваў загадчыкам хаты-чытальні і бібліятэкарам у Даманаве. Я там працавала прыбіральшчыцай.

Як пачалася вайна, да прыходу немцаў мы ўсе кнігі склалі ў вялікую скрыню і закапалі ў агародзе.

У час вайны ў Даманаве па хатах стаялі немцы. Я працавала на чыгунцы. Спачатку яны нас не чапалі.

Помнік загінуўшым жыхарам вёскі Бабровічы.

Трагедыя ў вёсцы здарылася ў снежні 1942 г., калі тут з'явіўся карны атрад. Немцы ўзялі ў солтыса спіс савецкіх актывістаў і варожа настроеных да акупантаў. Карнікі прайшлі па хатах і арыштавалі ўказаных у спісе. У ліку арыштаваных быў і Лаўрык. Гэта быў вельмі дабрадушны хлопец, з гумарам. Ніколі нікога не пакрыўдзіў. Быў паважлівы да людзей.

Як цяпер памятаю той трагічны зімовы вечар. Было гэта 22 снежня 1942 г. Калі карнікі зайшлі ў хату, Лаўрык ляжаў на лаўцы. Я вязала яму рукавіцы. Фашысты загадалі Лаўрыку збірацца. Я сказала ім: «Я ж яму яшчэ рукавіц не зрабіла, холадна яму будзе, ды і яды сабяру». Немцы адказалі: «Нічога не трэба, гэта ненадоўга», і, усміхаючыся, пайшлі.

У тую ж ноч забралі Курленю Фёдара Сямёнавіча, Скіндзера Іосіфа Іванавіча, Салонка Міхаіла Андрэевіча. І яшчэ людзей з вёскі Гнойнае. Усіх іх прывялі ў хату Шабан Настассі Сільвестраўны. Тут іх катавалі, здзекаваліся з іх, а ў пяць гадзін раніцы расстралялі.

Гэта была ноч жахаў. Ніхто не спаў. Нямецкія патрулі не дазвалялі нікому выходзіць на вуліцу. Чуліся стрэлы.

Раніцай я прыйшла да тае хаты, дзе трымалі арыштаваных. Але іх ужо не было ў жывых. Некалькі змардаваных хлопцаў пераводзілі ў другую хату.

А 23 снежня расстралялі сям'ю Мархеляў: маці, бацьку, двух сыноў. Пасля гэтага карны атрад пакінуў вёску і паехаў распраўляцца з вёскамі Коханава і Заполле.

... Мой бацька бачыў мёртвага Лаўрыка. Ён ляжаў без ботаў, ногі шчыльна заматаны анучамі. Гаспадыні хаты, дзе іх мучылі, ён аддаў ключы ад нашага хлява і сказаў: «Цёця, перадайце ключы нашым». Тут усіх іх каля гэтай хаты закапалі ў брацкай магіле, а сям'ю Мархеля ў другой, непадалёку ад гэтай.

Крыху пазней мы знайшлі ў кішэні Лаўрыкавага пінжака запіску. Пінжак вісеў у хаце гаспадыні. Ён спрабаваў напісаць алоўкам развітальныя радкі:

«Прощайте, дорогие хлопцы, девчата. Прощайте соседи, старые, малые. Больше увидеться нам не придется. Бо мне, молодому, погибнуть придется».

Суджана жыць

У вёсцы Бабровічы стаіць сціплы абеліск. Такіх шмат на нашай беларускай зямлі. Я часта спыняюся каля яго, з хваляваннем чытаю надпіс: «У верасні 1942 года было знішчана нямецка-фашысцкімі захопнікамі 676 савецкіх грамадзян і спалена вёска Бабровічы».

У тую восеньскую раніцу 1942 г. разам з імі быў і Антон Міхеевіч Крот, адзіны сведка, якому пашчасціла вырвацца з калоны асуджаных на смерць.

Антон Міхеевіч добра памятае апошнюю раніцу перад расстрэлам. Над комінамі хат віліся дымкі, скрыпелі калодзежныя журавы. Было ціха. Мірны малюнак парушылі карнікі ў чорных мундзірах — эсэсаўцы.

Старых, жанчын, дзяцей пагналі, павалаклі

да хлявоў. Застракаталі кулямёты. Хлявы з людзьмі падпальвалі. Жудасны крык вяскоўцаў падымаўся ў неба.

Мужчын павялі расстрэльваць за вёску. У адной з груп ішоў і Антон Крот. Група набліжалася да возера. Было зразумела — хутка смерць... Каля Антона Міхеевіча ішоў даўгавязы паліцэйскі з вінтоўкай у руках. Выбраўшы хвіліну, Антон піхнуў канваіра і скочыў у кусты. Над галавой прасвісталі кулі. Антон Міхеевіч упаў, зноў падняўся, бег, што было сілы. Нарэшце выстралы засталіся ззаду.

Калі сцямнела, Антон Міхеевіч прыйшоў у вёску. Дагаралі рэшткі хат і хлявоў. Гэта была ўжо не вёска, гэта была магіла аднавяскоўцаў, дзе засталася і яго сям'я...

...Два гады партызаніў Антон Міхеевіч у атрадзе імя Катоўскага. Не аднойчы прыходзілася глядзець смерці ў вочы... Выжыў.

Пасля вызвалення раёна працаваў старшынёй Целяханскага пасялковага Савета, старшынёй калгаса «Радзіма». Аднаўлялася родная вёска Бабровічы, загойваліся душэўныя раны...

А. Каленік.

Барбарка

Палессе. Брэстчына. На ўсход ад Івацэвіч. Чэрвень 1970 г. Азёры. Лес, пералескі. Буйная зеляніна лугоў і палёў. То сонца, то церушлівая хмарнасць, то грымоты і лівень.

Замест вёскі Красніца — проста лес, ужо немалады. І помнічак каля дарогі — па цэлай вёсцы людзей...

Дзе былі Тупічыцы, там стаяць самотныя грушы і ледзь не да жудасці незвычайныя, абгарэлыя дубы, што будуць дажываць свой доўгі век ужо без людзей...

Тое месца, дзе была калісьці вёска Вяды і дзе цяпер пясок, трава і рэшткі дрэў, якія калісьці раслі ў садах і на вуліцы, мы бачылі здалёк, з узгорка, на якім стаіць самотны абеліск са словамі і лічбамі.

Пасля зноў было возера Бабровіцкае. Невыказная ласкавая шэрасць цёплай, амаль зусім спакойнай вады. Навокал — пена пасля нядаўніх баранчыкаў, бела-стракатымі на цёплай шэрасці палоскамі. Мы вярталіся ў імклівай маторцы, над намі тарахцеў верталёт геолагаў, знаёмых старшыні калгаса, які вадзіў нас па гэтых мясцінах.

Там, дзе раней былі Бабровічы, цяпер растуць маладыя бярозы, буяе трава. З-за купіны выскачыў заяц. Пустэча.

У новых, збудаваных на другім месцы Бабровічах мы зноў, як і ў іншых паселішчах, як і ўчора і пазаўчора, запісвалі расказы ацалелых.

Высока зверху — над светлым пакоем калгаснай бібліятэкі, дзе мы слухалі людзей, над новай вялікай вёскай, над усім гэтым азёрналясным кутком заходняга Палесся — да самых касмічных арбіт жыве, бушуе ў сонцы наша перамога, у свеце наспяваюць новыя небяспекі, ідзе змаганне за тое, каб яны не прыйшлі.

А ўнізе, у глыбіні народнага жыцця, у жыццядайнай прастаце яго крынічаць раны памяці, якія нічым не загоіш...

... Вось і яшчэ адна з гэтых народных ран.

Расказвае Барбарка, шасцідзесяцігадовая Барбара Адамаўна Слесарчук. Гаворыць з дзіўнай і сцішнаватай усмешкай — нібыта страшную казку, незвычайна далёкую, перажытую вельмі даўно. Гаворыць часамі амаль што зусім як казачніца — нараспеў, з паўторамі, што не здаюцца лішнімі, і па-мясцоваму, — на трох ці чатырох мовах адразу: беларуска-ўкраінска-руска-польскай.

«... Гэта як нас білі? Білі... Ажно цяжко расказваць. Хазяіна ўпэрэд забілі. Зажглі ў клуні. Я так перабалела. Чацвёра дзяцей, пятым была бярэменна. Запалілі часоў у пяць, пад вечар. Немец прыйшоў, выгнаў. Адзін мой хлопец пасвіў скаціну, а трое са мною. Мая хата была туды далей, дзе цяпер калгасны двор. Немец прыйшоў, выгнаў. Сабраліся мы ў хату, баб пятнаццаць. Немцы ідуць, абгледзелі. Бабы сядзяць, як бы оўцы, у хаце. Думалі: можа толькі мужыкоў пабылы, а жанчын не будуць біць. Адна, Астапава маці, кажа:

— Нас жывых запаляць. Не схацеў нас пабыты немец. Жывых папаліць.

А я выйшла з хаты:

— Уцякайма, жанчыны, уцякайма!...

А дзве дзевачкі ў мяне і мальчык. Оны, бабы, не схацелі ўцякаць, а я пайшла.

Немцы стаялі, кругом сэло цэп'ю абнялі, тут

цэп і там цэп, і па сяле хадзілі немцы. Так много. Я выйшла на кусты ў Багацце. Я не думала жыць. Але думала, куб ён не глядзеў, куб нам от так чэрапа паздымала, куб мы сваю смерць відалі.

— Бяжым туды, каб мы не бачылі сваёй смерці! Дзе куля ў галаву люб у плечы, кажу, нам пападзе, то легчэ нам, а то так трудна дажыдаць, каб нас білі. От, каб мы відалі сваю смерць...

Ніхто не схацеў, а я ўзяла і сама пабегла. Я пабегла, пачала бегчы з Астапавага двара, нашага суседа. Ад таго суседа пабегла, а ўжо людзей кулямётамі сякуць — і з таго канца, і з таго, людзі падаюць, падаюць. Ужэ і ногі мае не пабяжаць, куды ўжэ мне бяжаць — узяла я пад сараем лягла.

І так сарай, і так сарай, і так, а я лягла за калодцэм. Дзяцей панакутвала лебядой, панакутвала, вот і ляжу я, і ляжу... Ажно немцы там ці паліцыянты, толькі вады нап'юцца ды «А-а-ах!» —скажа. А я ляжу, ляжу, ляжу... Кулі свішчуць, ляцяць. Ну, мяне ўбіла! Слышу — не, ніц не больна. І ляжу, і ляжу...

І вот дзеці мае. Мальчык — два гады было Васілю. Не заплакаў! Маленькі — два гады, тыждзень было на трэці.

— Мамо, — кажа, — уцякаймо, уцякаймо! Нас, мамо, не заб'юць!

— Ох, — кажу я, — сынок, зараз бегчы пакінем, адкінем ногі у тую старану і у тую, пакінем белы свет, святая нядзелька. Зара паб'юць, зара.

— Не, мамо, нас не паб'юць!..

Гэта ж два гады!.. О, ён і сёння слесарам у мяне на ГРЭСе работае. Такі чалавек!..

А тая дзевачка, шэсць год, кажа:

— Вот відзіш, мамо, дажэ мальчык гаворыць, што нас не паб'юць. Убэгаймо!

От і пабеглі. Пад сараем ляглі...

От так, цямнець стало. Як огні, лямпы запальваюць. Ляжымо. Немец аднаго сарая падпаліў. Спічкамы. Опяць одного, бачу я, спічкамы. У сіняй адзежы два немцы стаяць. Ляжу, ляжу, ляжу, ляжу...З дзецьмі ляжу, ляжу, і — маўчаць! Это так от! — абы мне не пагібнуць, ці што? Малы хлопец і не заплакаў! О!.. І так от ляжу! Ажно там гарыць крыша. Згарэла. І немцы стаяць два. Бы стаўбы сінія. І сцены пачалі гарэці. І пачала ўжо зямля гарэці. Гэто каля самай зямлі тое зелле пачало гарэці. А я ў сярэдзіне ляжу. І студава мне пячэ. Гэто благодара, што, бывала, тчэм сукно з авэчок, зам'ятае. Такэ, было, пальто злажыла. А колі б я ў кофтачцы была — згарэла б. Толькі платка скінула, косы ўсе абсмаліліся. А тут от мне пальто шкварыцца, гарыць, а яго то пяском, то так. Дзевочка, чатыры гады, вішчы-ыць! — спэклася. А я ужэ то так, то так. От-от-от погыбаю! От я погыбаю. А воны стояць, немцы. Не хацела, каб забыло мяне ляжачую. От, мусово мне на немца ўзайці, каб мяне ўжэ гэта ўбіў. Ужэ няма спасення —пячэ. Хай, думаю, заб'е. Толькі ўстану на немца ісці — о, два стаяць, — дзеці завішчалі, а я — бух, упала. Так і ляжу.

І так от, памаленьку, так от і гляджу: чы воны пайшлы, чы не. Ужэ пачало вот-вот гарэць полымя, і студа, і студа. Сматру гэто —пайшлі, пайшлі немцы! А я яшчэ мінутачку паляжала, думаю, хай дольшэ адойдуць. І я за адзежу ўсіх дзяцей як узяла і дзёрнула далей, у канец агня... У-у-у!..

Ляжым на поплаўцы Астапавым. Ужэ так от трэсло, трэсло сільно нас, о!.. А я ужэ думала: «На ўсёй дзярэўні адна я асталася». Давай я ужэ узяла за дзеці, то аднэ сюда пасадзіла, два гады, а то, чатыры гады, дзевочку, сюда, а там яшчэ ззадзі ідзе. Пошла, пошла, пошла...

А куды от я?

От, на выганаўскую дарогу цаляю, да Выганішч. Куды мне, думаю, дзеціся? Мая матка з Выганішч. Думаю: там у мяне дзядзька е. Мо возьме мяне? Бо і дабіваціму нас, ужэ думаю, у нашай дзярэўні. Можа, нада ужэ нас выбіці. «Партызан!..» Мо зашчыталі ужэ, што у саракавым гаду у калхозе былі. Усё гэта казалі на нас : «Камуніст!..» Можа нас за гэтым дабіваюць. Вот!..

Ужэ ўзяла я, пошла, пошла да Выганішч.

Не зайшла.

Сяду дзе-небудзь на пянёк... Іду, іду...Як упаду — як паляцяць мае дзеці цераз галаву ўсе. «А-ах!» — адно галаву пачэшуць. І не плачуць. От гора пазналі!..»

У расказ жанчыны ўрываецца вельмі нядаўні ўспамін. Сёння ўранні ў Целяханах пачутыя словы. Скупыя, мужчынскія. Гаворыць калгаснік-пенсіянер Андрэй Куратнік:

«...А сын у мяне астаўся. У трупах. Маці мая, калі яе расстралялі, упала на яго, і так трохі закрыла. Ранілі хлопца ў бок. Адсунуўся ён метраў пяцьдзесят ад ямы і заснуў. Назаўтра

прыйшлі — яшчэ пяць выстралаў па яме далі. А ён дванаццаць дзён праляжаў у стажочку. Дзевяць гадоў было. Не піўшы, не еўшы. Партызаны знайшлі яго, мне наказалі...»

Цётка Барбара гаворыць далей:

«...Зайшлі мы да Выганішч. Ужэ васкрасенне. Другое васкрасенне настала, той тыдзень ужо прайшоў. Прыйшла я, а ужо майго дзядзьку, мае мацеры брата, застрэлілі.

«От, — думаю, — і мая жалаба, от ён мяне і пажалее...»

Дзядзіна кажа:

— У-у, ужэ так табе, можэ, не надо жыці на свеце, ужэ табе самой у агонь надо бегчы. Дзяцей у цябе многа, да ты бярэменна яшчэ —дзе табе проці зімы!

Самі ў лес выязджалі, хаваліся, а мяне не бралі. А я ў той хаце ляжу да ужэ, як мы, пастарыннаму, памалюся:

«Дай мне, госпадзі, сладкі сон! Ці ужэ як жывая застануся, ці каб я не слыхала, каб я ужэ пагібла з гэтымі дзецьмі, заснула ужэ навек...»

От ужэ партызаны выйшлі адтуль, з Бярэзіны, сільны, сільны отряд. З Вяды быў знаёмы чалавек, пагаварыў са мною, пагаварыў.

— Не бойцеся, — кажа, — не дапусцім немцаў, каб вас пабілі...

Даждаліся мы другога васкрасення.

— От, цётко, — кажу я дзядзінай, — мне сон які сніўся. Плохі, плохі! Я ужэ, здаецца, у старцах пахадзіла, хлеба насабірала сумочку. Іду, іду, у глазах пачарнела. У тую хату зайду, а пяць хат міну і опяць зайду. Так жалко, што столькі свайго хлеба многа пакінула. Да хазяіна, да скаціну. Лошадзі не было, быкі былі. Тры каровы былі, дзве каровы і цёлка. Да Хаценіч пагналі, на Ганцавічы, у тую старану. Наплакалася я, наглядзелася...От як!

Ну, а дзядзіна мая кажа:

— А мне харашо спалася...

От, чэсна вам гавару, жанчына. Трэсачок тых не дае, зварыць. «ідзі ў кусты», — кажа. От людзі якія ёсць, госпадзі! Урэдна была, багата, сільна багата была! Чыгуніка просіш — чыгуніка не дасць.

У Красніцу хадзю ужэ, мэду нанасіла я, і табе, і сабе. Ужэ думаю: «Хай мяне пчолы... Можа, памру». Яй-богу. Закручуся у якія латы. А мёду, мёду, мёду, мёду было!.. У вядры нясу, нясу з Красніцы. Гэта — як яе спалілі. Я ужо сабе туды прайдуся. Можа, заб'юць. Як не дабіваціму ць, то не дабіваціму ць. А ужэ по тры дні кончылася дабіванне. Ужэ я мэду нанасіла і ужэ сабе кватэру шукаю. Мы ужэ тыждзень сядзелі там, ужэ яна, дзядзіна, кажа:

— Шукай кватэру. З-за цябе, недабійку, і каб нас не пабілі немцы...

У Лабановіча кватэру знайшла, у Аляксеевай маткі, у беднае жаночыны вынайшла.

Сабе думаю: «Пайду я картошкі, хвасолі прынясу».

Пайшла я сабе за тымі прадуктамі, сабе ў Красніцу. А дзеці тама, у Выганішчах.

Нясу я, да гары даходжу — у-ю-юй! — ужэ Выганішчы гараць! Ужэ гараць Выганішчы, з палімёта строчаць!.. Выганішчы га-а-араць!.. Сільны такі вецер, што чалавека з ног валяе. Яны зайшлі ад Бабровіч, з таго канца, о, ад моста. Ужэ вецер і ко-оціць! Цераз дзесяць хат кідала агонь.

Я плачу:

— Ужэ мае дзеці рукі мне апрасталі. Дзе мае дзеці?..

Ужэ пабегла я у Бярэзіну, куды усе людзі пабеглі. Нашла адну жанчыну, кажу:

— Мо мае дзеці відалі?

Гаворыць:

— Відалі. Пабеглі. Гэта Насця на плечы Васіля пасадзіла, панесла ў Бярэзіну. Далёка!..

І я туды. Шукала, шукала, мо ад дванаццаці часоў, знайшла — ужо сонца заходзіла. Знайшла я. І сваіх, і Бартановых дзяцей знайшла, пяць штук. Ужэ знайшла, сарай згарэў — картошкі напякла, накарміла іх, тыя чужыя і свае...

І вот я думаю: «Куды мне дзеціся?»

Пайшла ў балота. Сяджу. Ужо знайшла спічкі. Надрала палосся, лапці плесці. І сяджу я там, у Надлеві, ад Выганішч кіламетраў тры, ад Бабровіч — чатыры. Я ужэ знайшла, дзе з мужам касіла, дзе нашы пакосы. Ужэ не магу, так мне абідно... Ужэ, думаю, пайду пад чужыя стажкі, бо вельмі мне жаль... Дзе касілі, дзе граблі з мужам сена...

Пайшла пад чужыя стажкі. Сяджу.

Ужэ давай картошку чысціць... А тут — зара немцы бягуць!.. Людзі гукаюць, гукаюць на балоце.

Думаю:

«Чаго-то яны гукаюць? Гэта так, можа. Можа, маці дзеці пагубіла, можа, дзеці маці загубілі ды шукаюць?..»

У-ух!.. Ажно вылятаюць да мяне два паліцыянты. Выскачылі з-за куста, за мяне — цап! Ужэ мяне ўзялі. Да ужэ майго хлопца, восем гадоў:

— Сынок, дзе твой бацька?

— Няма, забілі бацька майго.

Ужэ забілі немцы Рамана майго.

— Паночак, я сама з голаду, з холаду загіну, адно вы мяне не беце. Я не хачу, каб вы мяне білі. Хай я сама прападу з дзецьмі...

Ён кажа:

— Дзе больш людзі?

— Пабеглі на лес.

— Ідзі на воз!

А самі пайшлі.

Каб я пайшла на той воз, да таго бабровіцкага паліцая, што ўсіх дабіваў, што паказваў, дзе хто захаваўся, — ён застрэліў бы мяне, убіў бы. Сільно бабровіцкіх людзей ён выбіваў. Я-то не папала да яго. Яны пайшлі за кусты, а я тожа за кусты. Вы мяне не бачыце, а я вас! І я ў такі цёмны пабегла луг — такі луг, што чарот там, папаратнік, усяго там. Я туды пабегла і ляжу там. Ляжу ужэ. Яны усіх людзей вызбіралі, ужо ціха стала...

Толькі партызаны беглі. Беглі партызаны, маім дзецям мяса варанага далі. Наеліся мае дзеці — вады! Ужэ гэты, што два гады:

— Вады, вады, вады, вады!..

А вада павысыхала мо на метар, нідзе няма напіцца. Цямнее. Ужэ гэты мальчык, што восем лет.

— Вазьмі, — кажу, — мачы свае ў чыгунчык.

Напаілі.

— Не, — кажа, — мамо, не укусная вада. Ідзі шукай укуснае вады! Ідзі!..

Няма нідзе вады. Плакаў той, плакаў...Лягла я. І спічкі е, агню наклау бы. Ой!.. Ды вады плача. Я вот чэсна гавару вам. Выкапала такую ямачку, выкапала во. «Як на сырой зямлі чалавек пвляжыць, — думаю, — то умрэ». Выдрала мох, выдрала. Бо малыя. «Як жа я вас накармлю, як адзену?..» От, я ямачку выкапала у балоце, да самай тарфы, усе мы на яе і паклаліся. Вот ужэ забалеюць, васпаленіе возьме, ужэ яго і не будзе на свеце, хоч адно мне рукі асвабодзіць...

І от жыве. Дажэ ні чуць-чуць не забалеў!

І выйшла я апяць з таго балота.

— Хадзем, — кажу, — дзеці, у Целяханы, хай нас дабіваюць. Дзеці не схацелі.

— Куды хочаш, мамо, нас у свет вядзі, адно не хадзем да тых немцаў і да паліцаяў!..

У Вялікай Гаці кватэру нашла. Сталі паліці Гаць. Гэто ужэ я тады у парцізанах была. Сядзела, сядзела, сядзела, траву сушыла, дзетак травой ахутала. Здароўе пацярала, раўматызм дастала. От як!..

Дзеці пагадавала, пагадавала. Пайшлі па гасударскай рабоце усюды. Дзеці па свеце, а я сабе... Вот, спасіба, пенсію даюць ужэ. Оўцы дагладала. Тысячы авэчок нагадавала, дзесяць лет на ферме стаяла. Дзеці работалі.

От, усё сваё страданіе пераказала. Можа, я што і залішне што сказала? Я няграматная. Ізвініця».

Друкуецца па кн.: Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У. Я з вогненнай вёскі... Мн., 1983. С.7—12.

Месцы масавых расстрэлаў савецкіх грамадзян у Івацэвіцкім раёне

Деревня Климовка — 1500 чел., июнь 1942 г.

Деревня Чижики — 29 партизан, сентябрь 1942 г.

Деревня Гривда — 88 чел., сентябрь 1942 г.

Между деревень Голик и Голынка — 18 чел., сентябрь 1942 г.

Деревня Козики — 21 чел., июль 1942 г.

Деревня Святая Воля — 23 чел., август 1941 г.

Деревня Гать — 150 чел., август 1941 г.

Гор. поселок Телеханы — 1000 чел., 1941 — 1944 гг.

Урочище «Гречище» — 1200 чел.

Гор. поселок Ивацевичи (у дороги на г. Коссово) — 1000 чел., 1942—1943 гг.

Деревня Добренево — 200 чел. военнопленных, 30 июля 1941 г.

Деревня Мироним — 29 чел., октябрь 1942 г.

Деревня Рудня — 980 чел., июль 1942 г.

Поселок Бытень — 60 чел.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 772. Л. 18—19.

Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак.

Злачынствы нямецкіх акупантаў у Івацэвіцкім раёне

Тэрыторыя сучаснага Івацэвіцкага раёна ахоплівае былыя Косаўскі, значную частку Быценскага і Целяханскага раёнаў. Усюды нямецка-фашысцкія акупанты праводзілі палітыку генацыду ў адносінах да мясцовага насельніцтва. Пра гэта сведчаць шматлікія дакументы аб злачынствах нямецкіх акупантаў на нашай зямлі.

КОСАЎШЧЫНА

У акце, складзеным 10 сакавіка 1945 г. «Аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў і іх памагатых у Косаўскім раёне Брэсцкай вобласці» адзначана, што з першых дзён прыходу «немцы ўвялі рэжым крывавага тэрору над мірным насельніцтвам — здзекі, катаванні і забойствы, насаджалася сістэма гаспадарання, што называлася немцамі «новы парадак». Для яўрэяў былі арганізаваны гета ў Косаве, Івацэвічах, Мерачоўшчыне, Целяханах, Святой Волі. З гета яўрэяў пад аховай немцаў ці паліцаяў выводзілі на самыя цяжкія работы, выдавалі ж толькі 200 грамаў хлеба на дзень.

«25 жніўня 1942 г., — гаворыцца ў дакументах, — тых, хто застаўся ў жывых у гета, гестапаўцы расстралялі ў 200 метрах ад замка Мерачоўшчына. Паводле паказання відавочцы, жыхара г. Косава гр. Крупінскага, у гэты дзень каля замка было расстраляна больш за 1400 чалавек».

А вось яшчэ адзін дакумент: «Акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у г. Косаве», які складзены 25 студзеня 1945 г. У ім адзначаецца, што пры перавозцы яўрэяў з Косаўскага гета ў Мерачоўшчыну 25 жніўня 1942 г. насельніцтва «ад грудных дзяцей да нямоглых старых...пагружаліся на аўтамашыну навалам — як дровы», аб чым сведчыць той жа відавочца шафёр Крупінскі, які вазіў гэтых людзей.

Людзей, якіх звезлі на расстрэл, прымушалі распранацца і гналі іх па дошках над ямаю, а ў той момант расстрэльвалі з кулямётаў і аўтаматаў.

У пачатку верасня 1942 г. у 500 метрах ад г. Косава на шашы на Няхачава былі расстраляны яшчэ 200 чалавек, якія пазбеглі расстрэлу ў жніўні і пэўны час хаваліся. Відавочцам гэтага злачынства, як адзначаецца ў дакументах, быў жыхар Косава Казімір Ульянавіч Улітка.

Месцам шматлікіх расстрэлаў мірных грамадзян Косаўскага раёна было ўрочышча Ялавастае. За красавік 1942 г. тут расстраляна 11 мірных грамадзян, сярод якіх былі Даніла Кавалевіч і два яго сыны, быццам бы за сувязь з партызанамі. У далейшым там адбываліся частыя расстрэлы мірных грамадзян. «Усяго ва ўрочышчы Ялавастае расстраляна немцамі каля 150 чалавек мірных грамадзян», — гаворыцца ў акце аб злачынствах немцаў у г. Косаве.

За час нямецкай акупацыі ў г. Косаве было знішчана акупантамі 1726 мірных грамадзян, сярод якіх было шмат дзяцей, жанчын і старых. Акрамя гэтага, немцы вывезлі на прымусовыя работы ў Нямеччыну 217 касаўчан.

Так акупанты дзейнічалі паўсюдна. У Івацэвічах яны расстралялі больш за 350 мірных грамадзян, а пры адступленні спалілі пасёлак і вывезлі ў няволю больш за 100 чалавек насельніцтва. У Яглевіцкім сельсавеце было расстраляна і павешана 78 чалавек, з якіх у вёсцы Гічыцы ў чэрвені 1942 г. расстраляна 9 чалавек, а 3 красавіка 1944 г. — 37 чалавек. У верасні 1942 г. у вёсцы Галенчыцы было расстраляна 23 чалавекі.

У акце аб нямецкіх злачынствах на тэрыторыі Грыўдзенскага сельсавета ад 30 студзеня 1945 г. адзначаюцца шматлікія акцыі акупантаў па знішчэнні мірных грамадзян. У верасні 1942 г. карным атрадам СС № 44 у вёсцы Була расстраляна 38 чалавек, у вёсцы Дубітава — 27 чалавек, у вёсцы Грыўда — 11 чалавек. У сакавіку 1943 г. у вёсцы Харошча косаўскімі паліцаямі было расстраляна 10 чалавек. Усяго па Грыўдзенскім сельсавеце немцы расстралялі 86 чалавек і вывезлі ў нямецкае рабства 231 чалавека.

Пра расстрэлы мірных грамадзян сведчыць акт № 12, складзены ў Бялавіцкім сельсавеце. Вось жудасная «бухгалтэрыя»: за гады вайны ў сельсавеце расстраляна 40 і вывезена на прымусовыя работы ў Нямеччыну 85 чалавек.

Шмат фактаў фашысцкіх злачынстваў у Яблонкаўскім сельсавеце прыводзіцца ў акце ад 22 студзеня 1945 г. Указваецца, што ўжо ў пачатку акупацыі нямецкія захопнікі забралі ў жыхароў вёсак сельсавета жывёлу, хлеб,

адзенне. Сялян ганялі на розныя цяжкія работы пад суровым наглядам. На лесанарыхтоўках быў моцна пакалечаны селянін Іван Гойшык. У 1942 г. немцы схапілі на вуліцы і расстралялі Аляксандра Гойшыка за тое, што не меў пры сабе дакументаў, арыштаванага Васіля Цока павесілі, а Лук'яна Гойшыка кінулі ў турму, дзе закатавалі. У красавіку 1943 г. акупанты схапілі на вуліцы Івана Янушкевіча і расстралялі за сувязь з партызанамі. Пасля здзекаў расстралялі і яго сям'ю — маці, жонку і дваіх дзяцей.

17 сакавіка 1943 г. карнікі поўнасцю спалілі вёску Зыбайлы разам з жыхарамі. У студзені 1944 г. яны акружылі вёску Яблонка, схапілі больш за 60 чалавек і вывезлі ў Германію. Грамадзянку Софію Янушкевіч вывезлі ў Германію, а траіх яе дзяцей спалілі ў хаце. 20 сакавіка 1944 г. карнікі 10 дзён лютавалі ў вёсцы Яблонка, забілі Мікалая Зыбайлу, яго сям'ю, шмат іншых сем'яў. У сакавіку спалілі вёску. Тады ж спалілі вёску Воля. Усяго ў Яблонкаўскім сельсавеце немцы знішчылі 320 мірных грамадзян, 68 вывезлі ў Германію.

Злачынствам фашыстаў не было мяжы. 10 верасня 1942 г. карны атрад спаліў разам з жыхарамі вёску Зацішша. Поўнасцю спалены вёскі Корачын, Хадакі, Жытлін, Уласаўцы і іншыя, усяго па Косаўскім раёне — 10 вёсак.

БЫЦЕНШЧЫНА

За час акупацыі Быценскага раёна гітлераўцамі было знішчана 1097 жылых дамоў і 2086 гаспадарчых пабудоў, 785 сельскагаспадарчых машын і прылад, 328 коней, 1075 кароў і шмат іншай жывёлы. Усяго 914 сялянскім гаспадаркам прычынены страты на суму 71 622 615 рублёў. Напрыклад, страты гаспадаркі Мікалая Самусіка з Быцені склалі 101 800 рублёў (дом, гаспадарчыя пабудовы, конь, 3 каровы, 3 цялушкі). Страты Івана Ляўчука з Прыбарава, Антона Касніковіча з Магіліц, Ульяны Савончук з Волькі склалі па 80—90 тысяч рублёў.

Вялікія страты былі нанесены гаспадарцы калгасаў, якія толькі што стварыліся ў 1940—1941 гг. Яны вылічваліся ў 24 130 тысяч рублёў, у тым ліку па калгасах імя Сталіна (в. Гнойнае) — 6112 тысяч рублёў, імя Молатава (в. Вуглы) — 5256 тысяч рублёў, імя Калініна (в.Коханава) — 1550 тысяч рублёў.

Значныя страты былі нанесены школам, установам культуры, аховы здароўя. Страты Быценскай няпоўнай сярэдняй школы вылічваліся ў 145 тысяч рублёў, Волькаўскай, Прыбараўскай, Запалянскай, Коханаўскай, Доўгаўскай, Міронімскай, Вуглоўскай — у 50—115 тысяч рублёў. Праваслаўнай царкве ў Быцені былі нанесены страты ў 288 860 рублёў. Установы аховы здароўя панеслі страты на суму 613 тысяч рублёў.

Але ніякім падлікам не паддаюцца злачынствы акупантаў над мірным насельніцтвам. Факты, якія прыводзяцца ў шматлікіх дакументах, прымушаюць уздрыгануцца, поўняць сэрца нязгасным болем за здзекі фашысцкіх выродкаў над нашымі людзьмі.

«Ужо ў пачатку акупацыі, — успамінае жыхар вёскі Дабрынёва С. В. Падчэня, — 30 ліпеня 1941 г., каля Дабрынёва Даманаўскага сельсавета акупанты расстралялі 200 ваеннапалонных і 19 мірных грамадзян, у тым ліку 8 дзяцей ва ўзросце ад 1 да 16 гадоў».

Жыхары вёскі Міронім Е. Д. Саванец і В. Найдзёнік расказалі, што ў кастрычніку 1942 г. з Баранавіч прыехаў атрад жандараў, якія выклікалі па спісе 29 чалавек і расстралялі іх. Тое ж учыніў карны атрад СС у вёсцы Доўгая з 11 ваеннапалоннымі, якія жылі ў сялян. У той жа вёсцы 10 ліпеня 1944 г. пры адступленні акупанты замініравалі дарогу і спецыяльна паслалі на міны вяскоўцаў М. І. Кавальчука і П. Ермачка, якія падарваліся на іх.

18 лістапада 1944 г. было адкрыта месца масавага пахавання каля мястэчка Быцень. Экспертнай камісіяй было ўстаноўлена, што ў магіле знаходзілася 60 трупаў (49 мужчын, 8 жанчын і 3 дзяцей), расстраляна 48 яўрэяў і 12 актывістаў. Паводле паказанняў сведак расстрэлы тут праводзіліся некалькі разоў у 1941 г. і ў 1942 г., трупы звальваліся ў глыбокі стары акоп, закідваліся пластом зямлі ў 50 см і калючым дротам.

30 снежня 1944 г. былі адкрыты дзве другія магілы каля вёскі Рудня ў двух кіламетрах ад Быцені. Экспертнай камісіяй установлена, што ў першай магіле было пахавана 900 чалавек расстраляных (350 мужчын, 420 жанчын, 130 дзяцей), у другой 80 чалавек (45 мужчын, 20 жанчын і 15 дзяцей).

Пры апытанні насельніцтва выявілася, што там 25 ліпеня 1942 г. праводзіўся масавы расстрэл яўрэяў. Да выкапанай ямы немцы

падвозілі людзей на аўтамашынах, прымушалі іх распранацца і класціся ў яму тварам уніз. Чэргамі з аўтаматаў і кулямётаў расстрэльвалі іх, а затым на забітых прымушалі класціся жывых і зноў расстрэльвалі.

У актах аб раскрытых магілах расказваецца, што трупы былі голыя, ляжалі тварам уніз, уперамешку мужчыны, жанчыны і дзеці (5 пластоў). Сляды куль былі ў розных месцах цела.

Святар Быценскай царквы В. І. Голаднеў расказаў, што ў пачатку 1944 г. яго сын Віктар быў арыштаваны жандарамі і пасаджаны ў турму пры слонімскім СД па падазрэнні ў падпольнай літаратурнай дзейнасці. Там ён падвяргаўся частым катаванням і перад прыходам Чырвонай Арміі 6 ліпеня 1944 г. быў расстраляны.

У маі 1943 г. з г. Слоніма ў Быцень прыехала група вярбоўшчыкаў для набору моладзі на работу ў Германію. У памяшканні клуба наладзілі канцэрт для прыманкі моладзі, але тая не ішла. Тады ноччу паліцаі сагналі ў клуб 200 чалавек, забілі вокны і дзверы, паставілі ахову, а раніцай пагналі іх у Слонім, а адтуль вывезлі ў Германію.

Адтуль, з Германіі, з лагера «Нортак А/С» жыхар вёскі Міронім Мікалай Грабун пісаў: «...невядома чаго я дачакаюся, кожны дзень толькі і ведай, што працуй, нават у нядзелю. Прыходзіцца працаваць у дзень па 16 гадзін».

Усяго за тры гады акупацыі гітлераўцы знішчылі 1593 мірных грамадзян раёна, сярод іх 503 жанчыны і 300 дзяцей. На прымусовыя работы ў Германію было вывезена 799 чалавек. Захаваўся спіс 1017 яўрэяў, замучаных гітлераўцамі. Фашысцкаму тэрору ў раёне падверглася 2615 чалавек. Па Дабромысленскім сельсавеце было расстраляна 65 і вывезена ў Германію 73, у Быценскім сельсавеце расстраляна 1034 чалавекі і вывезена ў Германію 60, у Даманаўскім сельсавеце расстраляна 62 і вывезена 35, у Доўгаўскім адпаведна 82 і 73, у Волькаўскім закатавана 27 чалавек.

ЦЕЛЯХАНШЧЫНА

Жудасныя злачынствы ажыццявілі нямецка-фашысцкія акупанты на Целяханскай зямлі. Як сведчаць дакументы і ўспаміны насельніцтва былога Целяханскага раёна, знішчэнню падвергліся тысячы мірных ні ў чым не павінных людзей, матэрыяльныя страты склалі дзесяткі мільёнаў рублёў вартасці таго часу, былі знішчаны сотні жылых дамоў, гаспадарчых пабудоў, шмат тэхнікі, гаспадарчага набытку.

У акце ад 21 красавіка 1945 г., складзеным па выніках расследавання злачынстваў нямецкіх акупантаў і іх памагатых у Целяханскім раёне, за час акупацыі было расстраляна, замучана і спалена 3184 мірныя жыхары. На работы ў Нямеччыну было вывезена 384 чалавекі.

Ужо ў першыя дні акупацыі гітлераўцы вылоўлівалі адступаючых байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і на месцы іх расстрэльвалі. Так, у Целяханах каля чыгуначнага моста было расстраляна 6 чалавек, каля касцёла — 3, ва ўрочышчы Грэчышча — 2, у вёсцы Азарычы — 8, у Выганашчах — 11 і г.д.

На паляне ва ўрочышчы Грэчышча на поўнач ад Целяхан выяўлены 32 магілы, у якіх было закапана 1200 расстраляных мірных грамадзян.

Каля бальніцы, дзе размяшчалася жандармерыя, выяўлена 15 ям, дзе былі пахаваны 35 чалавек. Яны перанеслі страшныя катаванні, у многіх разбіты чэрап, знявечаны твар, перабіты рукі, ногі, рэбры.

На ўсходнім беразе Агінскага канала выяўлена 10 ям, у якіх было пахавана 40 мірных грамадзян, расстраляных фашысцкімі выродкамі. Пахаванне 22 мірных грамадзян было выяўлена каля праваслаўных могілак.

У вёсцы Святая Воля ва ўрочышчы Завір'е ў брацкіх магілах пахаваны 325 закатаваных жанчын, старых і дзяцей. Відавочцы расказвалі, што многіх дзяцей закапвалі жывымі.

Страшная трагедыя адбылася ў вёсках Вяды, Тупічыцы, Бабровічы, Красніца. Карныя атрады гітлераўцаў у верасні 1942 г. акружылі гэтыя вёскі, сагналі людзей у будынкі, закалацілі іх і, прашыўшы аўтаматнымі і кулямётнымі чэргамі, падпалілі. Такім чынам у гэтых вёсках было знішчана 1280 мірных жыхароў.

У Пінскім філіяле Брэсцкага абласнога дзяржаўнага архіва захоўваюцца пайменныя спісы расстраляных, павешаных і замучаных мірных грамадзян і вывезеных на прымусовыя работы ў Германію жыхароў Целяханскага раёна. У вёсцы Вулька гітлераўцы знішчылі 54

мірных грамадзян, у Горталі — 9, у Вульцы-Аброўскай — 27, у Коланску — 11 і г.д. У спісах змешчаны прозвішчы больш за паўтары тысяч яўрэяў, сярод якіх абсалютная большасць жанчын, старых і дзяцей. Называюцца цэлыя сем'і па 5—7 чалавек, дзе большасць — дзеці.

Велізарныя матэрыяльныя страты былі прычынены гаспадарцы і культуры Целяханскага раёна.

У перадваенны час сяляне шэрагу вёсак раёна аб'ядналіся ў калгасы. Акупанты разагналі іх, гаспадаркі разрабавалі. Страты калгаса імя Карла Маркса (в. Клятная) склалі 2 781 735 рублёў. Калгасу «Шлях да камунізму» (в.Коланск) прычынены страты ў памеры 3 237 006 рублёў, калгасу імя Сталіна (Бабровічы) — 4746 тысяч рублёў і г.д.

Сотні сялянскіх гаспадарак былі разбураны, жыллё спалена, жывёла і маёмасць знішчана. 177 гаспадарак Святавольскага сельсавета панесла страты ў суме 13 728 189 рублёў. У Выганашчанскім сельсавеце пацярпелі 382 гаспадаркі, страты якіх склалі 38 649 642 рублі. Страты сялянскай гаспадаркі Пушылы А. Р. склалі 390 тысяч рублёў, Мяліка Н. В. — 339 308 рублёў.

М. Банасевіч, В. Мароз.

Дакументы сведчаць

З АКТАЎ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ І ІХ САЎДЗЕЛЬНІКАЎ У КОСАЎСКІМ І ЦЕЛЯХАНСКІМ РАЁНАХ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

10 сакавіка 1945 года. г. Косава

Мы, што падпісаліся ніжэй, камісія ў складзе старшыні камісіі Кавалёва Паўла Рыгоравіча, сакратара Косаўскага райкома КП(б)Б; членаў камісіі: Дзмітрыева Дзмітрыя Сямёнавіча, нам. старшыні райвыканкома; Грыбава Васіля Сямёнавіча, начальніка РА НКУС, Мельчакова Івана Мікалаевіча, начальніка РА НКДБ, Грынгаўса Майсея Якаўлевіча, заг. райздрава, Савенкава Аляксея Паўлавіча, сакратара камісіі, галоўнага бухгалтара райспажыўсаюза склалі гэты акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў у Косаўскім раёне за перыяд акупацыі з 26 чэрвеня 1941 года да 14 ліпеня 1944 года.

З першых дзён прыходу немцы ўстанавілі рэжым крывавага тэрору над мірным насельніцтвам, здзекі, катаванні, забойства як сістэма гаспадарання называлася немцамі «новы парадак».

Для мірнага насельніцтва яўрэйскай нацыянальнасці былі арганізаваны гета ў гор. Косаве, пасёлку Івацэвічы і ў замку Мерачоўшчына. Насельніцтва гета выганялася на работы. Цяжкая знясільваючая праца пры харчаванні 200 грамаў хлеба ў дзень даводзіла людзей да змардавання і смерці. Тых жа, хто застаўся ў жывых, 25 жніўня 1942 года гестапаўцы расстралялі ў 200 метрах ад замка Мерачоўшчына. Паводле паказання відавочцы, жыхара гор. Косава гр. Крупінскага за гэты дзень каля замка было расстраляна больш за 1400 чалавек.

У першых чыслах верасня 1942 г. гестапаўцамі былі расстраляны ў 500 метрах ад гор. Косава па шашы да чыгуначнай станцыі больш за 200 чалавек мірнага насельніцтва, пра што сведчыць відавочца, жыхар гор. Косава гр.Улітка Казімір Ульянавіч.

Вясной і летам 1942 г. немцы праводзілі расстрэлы мірных жыхароў ва ўрочышчы Ялавастае...

У пасёлку Івацэвічы немцы наводзілі свой фашысцкі парадак, яны закрылі ўсе культурна-бытавыя ўстановы, большую частку жыхароў пасёлка выгналі са сваіх дамоў на вуліцу, разграбілі ўсю іх маёмасць, пазбавілі насельніцтва ўсякіх правоў. Але затое немцы пабудавалі ў пасёлку дзве турмы і вісельню, арганізавалі камендатуру і паліцэйскі ўчастак. Нямецкае камандаванне выдала загад, які забараняў насельніцтву выходзіць з хат пазней 17 гадзін. Грамадзянка Цітко Кацярына, якая выйшла з дому ў 17 гадзін, была застрэлена нямецкім вартавым у 10 метрах ад свайго дома. Гестапаўцы штодзённа здзекаваліся, мучылі, забівалі і вешалі мірных савецкіх грамадзян, турмы былі запоўнены вязнямі, праз павешанне [пакараны] грамадзяне Цона, Мінчук, Клютко і многія іншыя. Усяго ў параўнальна невялікім пасёлку Івацэвічы за перыяд акупацыі было расстраляна, замучана больш за 350 чалавек

мірных грамадзян. Пры адступленні немцы спалілі пасёлак і пагналі на прымусовыя работы ў Германію больш за 100 чалавек насельніцтва.

Немцы ў сваёй звярынай злобе да беларускага народа знішчылі не толькі асобных грамадзян, але і цэлыя сем'і — старых, жанчын і дзяцей. Яны не толькі расстрэльвалі, а спальвалі ў вогнішчах жывымі жыхароў цэлых вёсак.

Так, 17 сакавіка 1943 года немцамі поўнасцю спалена вёска Зыбайлы разам з яе жыхарамі. Жывыя людзі цэлымі сем'ямі былі закрыты ў сваіх дамах і спалены, а тых, хто спрабаваў уцякаць, хапалі і жывымі кідалі ў агонь. 10 верасня 1942 года карнікамі атрада «СС» была поўнасцю спалена вёска Заціішша, усіх жыхароў вёскі гітлераўцы сагналі ў адзін хлеў, зачынілі іх і спалілі жывымі. Поўнасцю спалены вёскі Корачын, Жытлін, Хадакі, Уласаўцы, Гічыцы, Яблонка, Галенчыцы, Ёлкі і іншыя, усяго 16 вёсак.

У раёне немцамі знішчана 1481 жылы дом і 1880 халодных пабудоў, якія належалі грамадзянам. Немцы забралі ў сялян 4000 коней, 7270 кароў, больш за 4000 свіней, 11 669 галоў авечак і коз, больш за 21 тысячу галоў птушкі, а таксама вялікую колькасць запасаў сельскагаспадарчых прадуктаў.

За перыяд акупацыі ў Косаўскім раёне немцамі расстраляна, спалена і павешана 3104 чалавекі мірных грамадзян, вывезена на катаржныя работы ў Нямеччыну 1466 чалавек мясцовых жыхароў. Віноўнікамі вышэйназваных злачынстваў у Косаўскім раёне з'яўляюцца: начальнік жандармерыі Косаўскага раёна немец Лянге, начальнік паліцыі Дэмша і Вальчак, бургамістр г.Косава Шыгідзіеў, бургамістр раёна белаэмігрант Славінскі, камендант самааховы горада Косава Жук Іван, камендант паліцыі Байбак Васіль Кандратавіч, памочнік каменданта паліцыі Мальчык Іван Емяльянавіч і іншыя.

Целяханы, 21 красавіка 1945 года

Целяханская раённая камісія садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай Камісіі па выяўленні і ўстанаўленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе старшыні Пярова Мацвея Дзям'янавіча, адказнага сакратара Сцяпанавай Аляксандры Іванаўны, членаў камісіі Юдзіцкага Яўгена Мацвеевіча, Зубкова Гаўрылы Ціханавіча і Лумельскай Марыі Барысаўны з удзелам прадстаўніка УНКДБ Целяханскага раёна Белікіна Аляксандра Мікітавіча і ўрача ў асобе члена камісіі Лумельскай Марыі Барысаўны правялі даследаванне фактаў знішчэння савецкіх людзей нямецка-фашысцкімі акупантамі на тэрыторыі Целяханскага раёна Пінскай вобласці ў перыяд нямецкай акупацыі.

Матэрыяламі следства, аглядам месцаў знішчэння і пахавання, а таксама шляхам апытання відавочцаў камісія ўстанавіла:

На працягу ўсяго перыяду варожай акупацыі на тэрыторыі мястэчка Целяханы і ўсяго Целяханскага раёна нямецка-фашысцкія захопнікі праводзілі як масавыя, так і індывідуальныя сістэматычныя знішчэнні савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян.

Папіраючы міжнародныя законы, нямецка-фашысцкія вылюдкі замучылі і расстралялі савецкіх ваеннапалонных байцоў і афіцэраў, якія трапілі ў палон: у мястэчку Целяханы каля чыгуначнага моста — 6 чалавек, каля касцёла — 3 чалавекі, ва ўрочышчы «Грэчышча» — 2 чал., у вёсцы Клятная — 2 чал., у вёсцы Азарычы — 8 чал., у в.Выганашчы — 11 чалавек. Устаноўлена, акрамя гэтага, шмат выпадкаў забойства нямецкімі вылюдкамі ваеннапалонных на дарогах на тэрыторыі ўсяго раёна.

Шматлікія месцы пахавання, выяўленыя камісіяй як у райцэнтры, так і ў іншых населеных пунктах раёна, сведчаць аб планамерным забойстве нямецка-фашысцкімі катамі жанчын, старых і падлеткаў.

У райцэнтры і наваколлі, а таксама на тэрыторыі раёна камісія абследавала магілы ахвяр фашысцкага тэрору:

1. На паляне ва ўрочышчы «Грэчышча», на поўнач ад мястэчка Целяханы, выяўлены 32 магілы розных памераў... у якіх закапана звыш 1200 мірных грамадзян — жанчын, старых, дзяцей. Расстрэлы праводзіліся цэлымі партыямі 5 і 6 жніўня 1941 года (пратаколы апытання сведак-відавочнікаў прыкладваюцца).

2. Каля бальніцы, у якой у час акупацыі размяшчалася нямецкая жандармерыя, выяўлена 15 ям з лікам закапаных 35 ахвяр; выяўлены факты закопвання ў ямы замучаных і расстраляных грамадзян СССР з раструшчанымі чарапамі, абязвечанымі тварамі, знявечанымі трупамі, з расціснутымі грудзінымі клеткамі, вывіхамі і паломкай рук, ног і рэбраў; устаноўлены факты закопвання жывога дзіцяці і яшчэ жывых ахвяр.

3. З усходняга боку Агінскага канала на стрэльбішчы выяўлена 10 ям, у якіх пахаваны каля 40 чалавек індывідуальна замучаных і расстраляных савецкіх грамадзян.

4. Каля праваслаўных могілак пры дарозе нямецкія каты расстралялі і закапалі 22 савецкіх мірных грамадзян.

5. У м.Святая Воля на паўночны захад ад станцыі пры вузкакалейцы ва ўрочышчы «Завір'е» выяўлены 4 брацкія магілы... з лікам пахаваных там 325 чалавек жанчын, старых, дзяцей і падлеткаў, прычым пры апытанні сведак-відавочцаў устаноўлены факты закопвання жывых ахвяр (пратаколы апытання сведак і эскізы-замалёўкі мясцовасці прыкладаюцца).

6. У верасні 1942 года нямецка-фашысцкія вылюдкі знішчылі ўсіх жыхароў населеных пунктаў Бабровічы, Вяда, Тупічыцы і Красніца, прычым значную частку людзей спалілі жывымі ў пабудовах, і ўстаноўлена шмат выпадкаў, калі дзяцей і падлеткаў кідалі ў агонь жывымі (пратаколы апытання сведак-відавочцаў прыкладаюцца). Такім чынам, у названых вёсках знішчана 1280 мірных грамадзян — жанчын, старых, дзяцей і падлеткаў. Трупы іх пераважна згарэлі ў агні.

Асноўваючыся на матэрыялах следства, апытання відавочцаў, агляду месцаў пахавання ахвяр фашысцкага тэрору, Камісія ўстанавіла, што нямецкае камандаванне і ўрад за перыяд часовай акупацыі ў м. Целяханы і на тэрыторыі Целяханскага раёна знішчылі мірных савецкіх грамадзян шляхам расстрэлу 3093 чалавекі, у тым ліку жанчын і дзяцей спалена жывымі 95 чалавек.

Усяго расстраляна, замучана і спалена па раёне 3184 чалавекі. У нямецкае рабства вывезена 384 чалавекі.

Галоўнымі віноўнікамі і выканаўцамі ўсіх вышэйпералічаных злачынстваў з'яўляюцца шэфы жандараў, вайсковых гарнізонаў і зондэрфюрэры: зондэрфюрэры Кетлер, Рыпер, Фрэбель, Шальтэн, Лаўрын, Філкен; каменданты жандармерыі: Коваль Ганс, Шнайдэр, Хазе Ота, Пергандэ; жандары: Вудзіч Ота — кат-забойца, Запельман, Шузенгайм Роберт, Гавенда, Ліпшэн, Галенкі, Карл Ота і Цынк Мікалай — перакладчык...

Перад вызваленнем

З успамінаў А. І. Самуйліка, былога камандзіра партызанскага атрада імя С. М. Кірава

У баявым загадзе, што атрымалі мы са штаба брыгады, гаварылася: у ноч з 19 на 20 чэрвеня 1944 года выйсці на чыгуначную магістраль Брэст—Мінск (Бронная Гара—Івацэвічы) для правядзення трэцяга, заключнага этапа «рэйкавай вайны». Такое ўказанне далі ЦК КП(б)Б і Беларускі штаб партызанскага руху ўсім атрадам і асобным групам.

ЦК КП(б)Б яшчэ 24 чэрвеня 1943 года прыняў пастанову «Аб разбурэнні чыгуначных камунікацый ворага метадам «рэйкавай вайны», якую адобрылі ўсе падпольныя арганізацыі.

У злучэнні накіравалі інструктараў-мінёраў. На самалётах дастаўлялася ў глыбокі тыл узрыўчатка, боепрыпасы і іншыя грузы. Лётчыкі зрабілі 90 самалёта-вылетаў, прымалі непасрэдны ўдзел у нанясенні бомбавых удараў па мастах на чыгунках.

Першы раз масавыя дыверсіі партызаны здзейснілі ў ноч з 3 на 4 жніўня 1943 года.

Другі этап «рэйкавай вайны» пад кодавай назвай «Канцэрт» пачаўся 19 верасня 1943 года. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі неслася рэха ўзрываў. Немцы вымушаны былі ў два разы павялічыць колькасць дывізій для аховы чыгункі. Згодна са звесткамі гітлераўскага генеральнага штаба іх налічвалася на 1 кастрычніка 1943 г. чатырнаццаць. Такім чынам мсціўцы сваімі дзеяннямі аслабілі групу армій «Цэнтр», дэзарганізавалі дастаўку зброі і боепрыпасаў. «Рэйкавая вайна» ўзняла дух партызан, усяго насельніцтва рэспублікі.

Напярэдадні трэцяга этапа вечарам я загадаў усім сабрацца на асабліва важнае заданне. Праз паўгадзіны мы ўжо рухаліся да ўчастка чыгункі Бяроза-Картузская—Няхачава. Прайшлі кіламетраў 12—15 і зрабілі кароткі прывал. На падыходзе да дарогі выслалі наперад разведку. Хутка разведчыкі вярнуліся і далажылі, што дотаў не выявілі, але ахова моцная, асабліва моста праз раку Жыгулянку.

Узважыўшы абстаноўку, я прыняў рашэнне паслаць аддзяленне ў правы бок ад моста. Паставіў перад партызанамі задачу: пры паступленні сігнала адкрыць агонь і адвесці

ўвагу гітлераўцаў. Мы ж асноўнымі сіламі павінны рухацца да чыгункі.

Ноч была месячная. З узлесся віднеўся шэры насып... Нясцерпнымі здаваліся мінуты чакання.

Ва ўмоўлены час у небе ўзвілася чырвоная ракета. Мы паспяшаліся да палатна. І ў гэтую самую мінуту з боку моста застрачылі фашысцкія мінамёты і кулямёты. Аднак, трапляючы ў балота, многія міны не разрываліся. Партызаны заляглі і адкрылі агонь у адказ. Раптам у паветры пачуўся гул самалёта. Гэта быў савецкі штурмавік. Уздрыганула зямля ад скінутых ім авіябомб. Немцы ад нечаканасці разгубіліся, і гэта аблегчыла выкананне пастаўленай перад намі задачы.

Асабліва вызначыліся Аляксей Жданаў, Сяргей Цвяткоў, Міхаіл Несцяровіч, Іван Ягораў, Рыгор Саланевіч, Сяргей Галаваненка, Віктар Разуванаў, Фёдар Нярэцін, Міхаіл Янушка, Андрэй Жыжка, Цімафей Янушка, Мікалай Палейка. Ім была аб'яўлена падзяка.

Разам з намі грамілі гітлераўцаў байцы і камандзіры разведгрупы «Стойкія». У названай аперацыі кіраўцы вывелі са строю звыш 200 рэек.

Паспяхова дзейнічалі таксама партызаны атрадаў імя Дзімітрова, імя Чкалава, «Савецкая Беларусь» і іншыя. Народныя мсціўцы ў гэтую ноч узарвалі на тэрыторыі Брэстчыны звыш дзвюх тысяч рэек. У выніку рух нямецкіх цягнікоў быў спынены на трое сутак.

Да лета 1944 г. мы ўжо мелі вялікі вопыт вядзення «рэйкавай вайны». Хачу падкрэсліць, што яна ішла не толькі паэтапна, а штодзённа.

Штаб варожай групоўкі ў сваім данесе ў

Старонка «Последних известий» — выдання Брэсцкага антыфашысцкага камітэта.

Берлін адзначаў, што «пачатак разгрому армій «Цэнтр» быў пакладзены дзеяннямі 240 тысяч партызан Беларусі, якія за адну ноч з 19 на 20 чэрвеня ўзарвалі ў 10,5 тысячы месцаў чыгунку і парушылі ўсю транспартную сістэму».

Вызваленне

Аперацыя «Баграціён» пачалася 23 чэрвеня 1944 года. А двума днямі раней па ўсіх чыгунках Беларусі пранёсся шквал «рэйкавай вайны». За адну ноч партызаны і падпольшчыкі вывелі са строю ўсе чыгуначныя камунікацыі, паралізаваўшы тыл гітлераўскіх армій. Гэта быў уступ да поўнага вызвалення беларускай зямлі ад гітлераўцаў. У нашым раёне на Брэст-Маскоўскую чыгунку ад станцыі Блок-Быцень да Броннай Гары выйшлі тысячы партызан. Пасля дадзенага імі «канцэрта» чыгуначнае палатно ператварылася ў кучы рэек і шпал. Рух цягнікоў спыніўся. А на ўсходзе ўжо падрыхтаваліся да ўдару войскі трох Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў.

Наступленне Чырвонай Арміі было імклівым. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне гітлераўскай армады на беларускім выступе, ім, усё ж, прыйшлося ўцякаць. З ліпеня быў вызвалены Мінск, 8 ліпеня — Баранавічы, і фронт падышоў да межаў Івацэвіцкага раёна.

Насустрач наступаючым часцям Чырвонай Арміі партызанскія брыгады выслалі групы праваднікоў і разведчыкаў для інфармавання

аб становішчы ў раёне і пры неабходнасці — для рамонту дарог і перапраў.

Першыя часці Чырвонай Арміі ўступілі на зямлю нашага раёна ў ноч з 8 на 9 ліпеня і авалодалі вёскай Сялец. Пачаліся баі з акупантамі.

У гісторыі 99-й партызанскай брыгады імя Гуляева ўпамінаецца, што ў 24 гадзіны 9 ліпеня разведчык даставіў пакет у штаб брыгады. У ім гаварылася:

«Камандзіру партызанскай брыгады 99 імя Гуляева тав. Якавенку.

Мая часць размяшчаецца ў в. Выганашчы. Да 6.00 10 ліпеня 1944 г. канцэнтруюся ў в. Вулька. Наношу ўдар па гарнізоне мяст. Целяханы з паўночнага захаду і паўночнага ўсходу, прашу дзейнічаць з паўднёвага ўсходу і паўднёвага захаду. Рашэнне паведаміце праз сувязнога. Вашы дзеянні павінны быць рашучымі і энергічнымі. Сігнал артпадрыхтоўкі — серыя чырвоных ракет. Сігнал атакі — серыя белых ракет. Мой КП — вышыня 162,8.

Жадаю поспеху. З гарачым прывітаннем камандзір вайсковай часці гвардыі маёр Махоцін».

Атрымаўшы такое данясенне, камандзір брыгады Якавенка ў 3 гадзіны 30 хвілін 10 ліпеня аддаў партызанскім атрадам загад наступнага зместу:

«Перадавыя часці Чырвонай Арміі падышлі ўшчыльную да раённага цэнтра Целяханы, сканцэнтраваліся ў в. Вулька. Праціўнік заняў абарону па ўсёй сістэме, раней абсталяванай, сілай 360 чалавек, на ўзбраенні 36 кулямётаў, 4 мінамёты, вінтоўкі.

Часць Чырвонай Арміі пры падтрымцы артылерыі наступае на гарнізон мяст. Целяханы з паўночнага ўсходу і паўночнага захаду. Наша задача наступаць і адрэзаць шляхі адыходу праціўніка з паўднёвага ўсходу і паўднёвага захаду. ЗАГАДВАЮ:

Камандзіру атрада імя Воранава лейтэнанту Харахорынаву з наяўным асабовым складам і ўзбраеннем перакрыць дарогу мяст. Целяханы — Краглевічы, не даць магчымасці прарвацца праціўніку на вёску Краглевічы. Рубеж для засады — 800 м на Пд ад мяст. Целяханы. Зыходнае становішча заняць да 6.00 10 ліпеня 1944 г. Камандзіру атрада імя Варашылава тав. Жлобічу перакрыць адыход праціўніка з паўднёвага захаду. Роце пад камандаваннем тав. Каткова з паўднёва-заходняга боку наступаць разам з часцямі Чырвонай Арміі. Роце пад камандаваннем тав. Рачко заняць перакрыжаванне дарог на в. Амяльная, Глінная, Целяханы з задачай не дапусціць падмацавання праціўніку.

Зыходны рубеж заняць да 6.00 10 ліпеня 1944 г. Атраду імя Грабко на чале з камандзірам атрада тав. Назаравым перакрыць дарогі Краглевічы — Азарычы, Краглевічы — Коланск. Задача: 1. Знішчыць адступаючага праціўніка. 2. Не дапусціць падмацавання. Засяродзіцца да 6.00 10 ліпеня 1944 г. Праз сувязных указанні будуць дадзены дадаткова. Мой КП — ускраіна лесу, 600 м на паўднёвы захад ад мяст. Целяханы. Сігнал артпадрыхтоўкі — серыя чырвоных ракет, наступлення — дзве белыя ракеты. Пароль — 7".

У 6 гадзін падраздзяленні занялі зыходныя рубяжы. Але праціўнік ноччу 10 ліпеня падцягнуў у гарнізон падмацаванні. Патрабавалася дадатковая разведка. Бой разгарэўся ў 10 гадзін.

Як адзначаецца ў гісторыі 99-й партызанскай брыгады імя Гуляева, пасля жорсткай артпадрыхтоўкі ў мястэчка ўварваліся пехацінцы і партызаны роты Каткова. Немцы пачалі адступленне ў напрамку в. Краглевічы. «Увесь цяжар бітвы па знішчэнні адыходзячай з мястэчка групоўкі праціўніка кладзецца на групу атрада імя Воранава, якою камандаваў сам камандзір атрада тав. Харахорын (група складалася з 23 чалавек)... Бой пачаўся з коннай разведкай, якая была знішчана і рассеяна. Праз некалькі хвілін жменьцы смельчакоў прыйшлося весці адчайны непасільны бой з у многа разоў пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Мужнасць і гераізм праявіў камандзір атрада Харахорын, які асабістым прыкладам вёў байцоў, адбіў некалькі атак...»

У баявым данясенні штабу батальёна 138-га гвардзейскага стралковага палка ў 19 гадзін 10 ліпеня 1944 года камандзір партызанскай брыгады Якавенка і начальнік штаба Каракулін паведамлялі, што 1-ы стралковы батальён 138-га гвардзейскага стралковага

палка 48-й гвардзейскай стралковай дывізіі ва ўзаемадзеянні з 99-й партызанскай брыгадай авалодалі мястэчкам Целяханы і знішчылі гарнізон у складзе 360 чалавек немцаў і ўласаўцаў. Праціўнік страціў 250 чал. забітымі і 35 чал. палоннымі. Былі вызвалены вёскі Краглевічы і Азарычы. У час аперацыі рота гітлераўцаў спрабавала прарвацца з Азарыч да Целяхан, але была разбіта партызанамі. У ходзе баёў узяты трафеі: 2 ротныя і 2 батальённыя мінамёты, 6 станковых кулямётаў, 30 ручных кулямётаў розных сістэм, 40 аўтаматаў, 148 вінтовак, 2 аўтамашыны, 60 коней.

10 ліпеня целяханцы сустрэлі сваё вызваленне. На працягу ўсяго перыяду акупацыі лепшыя сыны Целяханшчыны мужна за гэта змагаліся. І цяпер яны помняць тых, хто змагаўся за незалежнасць Радзімы. Тым, хто загінуў у гэтым змаганні, у цэнтры пасёлка высіцца манументальны помнік.

Адначасова з баямі на целяханскай зямлі 10 ліпеня перадавыя часці Чырвонай Арміі падышлі да мястэчка Быцень і рашучай атакай выбілі з яго акупантаў. Вось так, наступленнем з усходу, разгарнулася вызваленне раёна.

10 ліпеня 48-я гвардзейская стралковая дывізія генерал-маёра Корчыкава выйшла на подступы да Івацэвіч. З поўдня ў абход ворага наступала па напрамку чыгуначнай станцыі Косава-Палескае 20-я стралковая дывізія. Заняўшы вёску Падстарынь, у напрамку вёскі Руда наступалі часці 54-й гвардзейскай дывізіі, а з боку вёсак Харошчы і Дубітава на Косава наступалі падраздзяленні 96-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Усе гэтыя дывізіі ўваходзілі ў склад 20-й арміі, якой камандаваў генерал Лучынскі. Пазней ён даслаў у музей Косаўскай сярэдняй школы схему баёў за вызваленне Косава.

11 ліпеня войскі 19-й механізаванай брыгады палкоўніка Яршова і 75-га самаходнага артылерыйскага палка падпалкоўніка Карпенкі 28-й арміі разгарнулі наступальныя баі ў Косаўскай зоне.

Камандзір вайсковай часці П.І.Сіменка так піша пра вызваленне Косава: «Косава вызвалялі многія салдаты і афіцэры... Мы ўварваліся ў Косава разам з танкістамі. Дамы гарэлі...»

Па ўспамінах мясцовых жыхароў, немцы ў апошні час кідаліся ў паніцы, баючыся акружэння. Калона танкаў і аўтамашын спрабавала прарвацца на Бронную Гару, але шлях ім перакрылі партызаны.

Першымі ўвайшлі ў Косава разведчыкі. Па іх адкрыў агонь кулямётчык з адзінага ўцалелага ў горадзе двухпавярховага будынка ў цэнтры. Разведчыкі выклікалі на яго агонь артылерыстаў, і кулямёт змоўк. Без вялікіх баёў горад Косава пад вечар 11 ліпеня быў вызвалены. Войскі рушылі на захад у напрамку вёсак Скураты, Альшаніца, Бялавічы, Заполле, Квасевічы, Ёдчыкі.

Перад наступленнем Чырвонай Арміі партызанскія атрады занялі пазіцыі, каб перарэзаць нямецкім войскам шляхі адыходу па выгадных для іх маршрутах. Брыгада імя Панамарэнкі і атрады, якія дзейнічалі побач з ёю, занялі абарончыя рубяжы па лініі вёсак Заполле – Бялавічы – Альшаніца – Квасевічы – Ёдчыкі і перарэзалі немцам шляхі адступлення праз Гута-Міхалінскі лес на Бронную Гару і Бярозу. 11 ліпеня партызанам прыходзілася па некалькі разоў адбіваць атакі немцаў, якія спрабавалі прабіцца ў вёскі Заполле, Бялавічы, Квасевічы. Не дабіўшыся поспеху, яны вымушаны былі адступаць на Ружаны і Пружаны.

З поўдня партызанская брыгада імя Дзяржынскага і суседнія партызанскія падраздзяленні перакрылі дарогу для выхаду акупантаў на Івацэвічы, а таксама на Пескі і Бярозу.

Сумесным ударам 48-й гвардзейскай стралковай дывізіі і партызан да раніцы 12 ліпеня былі выбіты немцы з Івацэвіч.

Завяршылася вызваленне раёна ад фашысцкага ігa. Настаў час аднаўлення разбуранай гаспадаркі, спаленых сёл, мястэчак, горада. А Чырвоная Армія, у рады якой уліліся тысячы жыхароў раёна, прадоўжыла баі за поўнае вызваленне роднай зямлі і канчатковы разгром фашысцкай Германіі. Да поўнай перамогі заставалася яшчэ дзесяць месяцаў.

М. Банасевіч.

У баях за Івацэвічы

З успамінаў камандуючага 28-й арміі генерала арміі А. А. Лучынскага

10 ліпеня 1944 года Масква дваццаццю артылерыйскімі залпамі салютавала доблесным войскам 1-га Беларускага фронту, якія фарсіравалі раку Шчару і вызвалілі гарады Слонім і Лунінец.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з фашыстамі, загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага была аб'яўлена падзяка войскам 28-й арміі.

Пасля фарсіравання ракі Шчары 28-я армія пачала вызваленне Івацэвіцкага раёна. Усю ноч з 10 на 11 ліпеня часці 3-га гвардзейскага і 20-га стралковага карпусоў праследавалі адступаючага праціўніка. У 5 гадзін раніцы войскі выйшлі на ўсходні бераг Грыўды.

Гэтак жа паспяхова дзейнічала і 54-я гвардзейская дывізія, якая раптоўна захапіла в.Руда і прымусіла кінуцца наўцёкі 88-ы полк фашыстаў. Гэтым яна дапамагла 96-й дывізіі без асаблівых страт вызваліць ад акупантаў г.Косава.

Цяжэй прыйшлося байцам 48-й гвардзейскай дывізіі, якая вызваляла Івацэвічы. Абарону тут трымалі рэзервовыя часці 2-й нямецкай арміі, якія мелі 12 танкаў і некалькі артылерыйскіх батарэй. Акрамя гэтага, фашысты выбралі для абароны зручную пазіцыю за выгібам р. Грыўда.

Аціаніўшы абстаноўку, камандзір 20-га стралковага корпуса маёр Швараў накіраваў 20-ю стралковую дывізію пад камандаваннем палкоўніка Несцярэнкі ў абход Івацэвіч з поўдня. Немцы не вытрымалі націску з фланга і пачалі адыход па шашы ў напрамку Бярозы.

Каля 18 гадзін 11 ліпеня 48-я гвардзейская дывізія генерал-маёра Корчыкава пры дапамозе 20-й стралковай дывізіі вызваліла Івацэвічы.

З успамінаў генерал-маёра Г. М. Корчыкава

48-я гвардзейская Крыварожская Чырванасцяжная ордэнаў Суворава і Кутузава стралковая дывізія 20-га стралковага корпуса 28-й арміі 1-га Беларускага фронту ўдзельнічала ў баях за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У ходзе наступальных баёў з гітлераўцамі яна прайшла шлях ад Бярэзіны да Буга ў напрамку Пружынішча, Халопенічы, Любань, Чырвоная Слабада, ст. Буды, Івацэвічы, Бяроза-Картузская, Брэст. Аб тых баях успамінаў камандзір дывізіі генерал-маёр Г. М. Корчыкаў.

24 чэрвеня 1944 года наша дывізія прарвала абарону праціўніка на захад ад Пружынішчаў і Уюнішчаў і разгарнула наступленне на захад. Абарона праціўніка была добра падрыхтаванай. Участак, дзе прыйшлося наступаць дывізіі, быў вельмі забалочаны, абаронныя ўмацаванні на ім немцы ўзводзілі на паверхні: стваралі дзве сценкі на адлегласці прыкладна аднаго метра адна ад другой, прамежак засыпалі зямлёй. Такія абарончыя пункты давалі магчымасць немцам весці кругавую абарону, наступаць праз такую сістэму было цяжка. Каб пераадолець балоцістыя ўчасткі, нашы воіны рабілі «макраступы». Праз забалочаныя лясы, дзе не было дарог, сапёры рабілі грэблі — валілі дрэвы, укладвалі бярвенні адно да другога, змацоўвалі іх. Гвардзейцы называлі такую дарогу «балалайкай». Ехаць па ёй было не зусім зручна, аднак задачу мы выконвалі. Трэба адзначыць, што калі такая мясцовасць была для войскаў вельмі цяжкай, то для партызан, якіх тут звалі «народныя мсціўцы», яна служыла добрым укрыццём, і гітлераўцы баяліся тут паказвацца, бо на кожным кроку іх падпільноўвала меткая куля партызан. Нашым наступаючым часцям прыйшлося пераадольваць і шмат вялікіх і малых рэк, меліярацыйных каналаў і тарфяных балот. Кожны зручны рубеж гітлераўцы выкарыстоўвалі для супраціўлення, каб затрымаць наша наступленне.

У тым далёкім 44-м годзе лета было гарачае. Дажджоў было мала, дарогі дазвалялі рухацца хутка (праўда, толькі не па той мясцовасці, пра якую гаварылася раней).

Шмат непрыемнасцей дастаўляла нам гітлераўская авіяцыя. Іх самалёты імкнуліся «прыхапіць» нашы часці дзе-небудзь у лесе ці ў балоце, на вузкай дарозе ці грэблі, дзе нельга было звярнуць убок.

Але нішто не магло стрымаць нашага імклівага наступу. Мы вялі баі і днём, і ноччу, не даючы фашыстам спакою. Вораг зведаў сілу нашых удараў і нашага баявога майстэрства.

Там, дзе нельга было атакаваць у лоб, мы ажыццяўлялі абход, заходзілі ў тыл, перарэзвалі яму шляхі адыходу і грамілі без літасці. Узятыя ў палон гітлераўскія ваякі ад страху лапаталі «Гітлер капут».

Так, пераадольваючы адзін рубеж за другім, вызваляючы адно сяленне за другім, мы да 6 ліпеня наблізіліся да межаў Івацэвіцкага раёна.

...130-ы гвардзейскі стралковы полк, які складаў рэзерв камандзіра 20-га корпуса, забяспечваючы левы фланг корпуса, вёў жорсткі бой з гітлераўцамі, якія імкнуліся вырвацца з акружэння пад Пінскам. Каб не даць праціўніку вырвацца з-пад нашага ўдару згодна з загадам камандзіра корпуса мною быў высланы адзін батальён на Целяханы па маршруце Навасёлкі, Раздзялавічы, Выганашчы, Целяханы. 12 ліпеня гэты батальён і прыдадзеная яму гарматная батарэя 98-га гвардзейскага артылерыйскага палка дывізіі павінны былі далучыцца да палка ў Івацэвічах. Такім чынам, гэты батальён дзейнічаў у адрыве ад свайго палка з 8 да 12 ліпеня. Падышоўшы да Целяхан, батальён сустрэўся з партызанамі, і яны сумесным ударам разгромілі там варожы гарнізон.

Баі за Івацэвічы насілі жорсткі характар. Выкарыстаўшы момант, што наша артылерыя адстала, праціўнік змог арганізаваць абарону.

10 ліпеня часці дывізіі фарсіравалі Шчару і разгарнулі жорсткі бой у раёне меліярацыйных каналаў. 146-ы гвардзейскі стралковы полк забяспечваў левы фланг дывізіі. Перад фронтам дывізіі абаранялася падраздзяленні 508-га пяхотнага палка 292-й пяхотнай дывізіі ворага. Перад тым, як нашы часці выйшлі ў гэты раён, гітлераўцы падкінулі сюды на браняпоездзе батальён 508-га палка з задачай абысці нашы часці і ўдарыць з фланга. Па звестках мясцовых жыхароў, якія ўцяклі з Івацэвіч, на гэтым рубяжы знаходзіліся часці СС і падраздзяленні штурмавога батальёна 2-й арміі.

Івацэвічы — вузел шашэйных дарог і чыгункі Брэст—Баранавічы. Яны замыкалі адзіную дарогу з паўночна-заходняй часткі пінскіх балот. З поўначы і паўночнага ўсходу райцэнтр адгароджаны ракою Грыўда, з усходу прыкрыты густой сеткай меліярацыйных каналаў. Абарона праціўніка тут складалася з дзвюх палос: знешняй і ўнутранай. Знешняя паласа праходзіла па паўднёва-заходнім беразе р. Грыўда да паўночнай ускраіны Івацэвіч і далей па паўднёвым беразе да паўночнай часткі лесу, што на ўсход ад Івацэвіч.

Г. М. Корчыкаў.

З усходу па ўскраіне лесу на захад ад меліярацыйных каналаў унутраная паласа праходзіла непасрэдна па ўскраінах райцэнтра. Абедзве паласы складаліся з траншэй поўнага профілю, прыкрытых драцянымі загароджамі з двума радамі колляў і міннымі палямі. Другая паласа ўключала ў сябе дзоты і доты на асноўных напрамках і ў глыбіні Івацэвіч. На танканебяспечных напрамках былі ўкопаны надаўбы і пастаўлены супрацьтанкавыя міны.

На працягу ночы 11 ліпеня 1944 г. 138-ы гвардзейскі стралковы полк авалодаў Любішчыцамі, Зарэччам, 143-і гвардзейскі стралковы полк — Галенчыцамі. З выхадам часцей на чыгунку на захад ад Панкоў і Яглевіч праціўнік павёў атакі з паўднёва-заходняй часткі Івацэвіч супраць 143-га гвардзейскага стралковага палка. Каб забяспечыць левы фланг дывізіі, 146-му палку было загадана заняць абарону ў раёне Яглевіч фронтам на поўдзень. У другой палове дня ішлі жорсткія баі з батальёнам праціўніка, падтрыманым 5—8 танкамі. У 18 гадзін 146-ы гвардзейскі стралковы полк быў уведзены ў бой у напрамку в. Бараны. Моцным ударам у напрамку Яглевічы—Міхнавічы 146-ы полк авалодаў Баранамі і перарэзаў Варшаўскую шашу на паўднёвы захад ад Івацэвіч. 138-ы полк фарсіраваў р.Грыўда і завязаў бой на паўночнай ускраіне Івацэвіч, а 143-і полк уварваўся на станцыю Івацэвічы. Гітлераўцы, кідаючы зброю, боепрыпасы, з цяжкімі стратамі адышлі на захад. У іх было падбіта 2 танкі, 2 бронетранспарцёры, разбіта 2 гарматы. Захоплена 10 кулямётаў, 2 гарматы і 5 складаў з харчаваннем і боепрыпасамі.

12 ліпеня першы батальён 146-га палка злучыўся са сваім палком і ў цесным узаема-

дзеянні з партызанскай брыгадай імя Гуляева знішчыў і рассеяў па лясах і балотах да 500 гітлераўцаў і венграў, якія складалі гарнізон Целяхан. Батальён захапіў два грузавікі з рознымі грузамі, легкавушку, тры матацыклы і два склады з боепрыпасамі і харчаваннем. Да 15 гадзін, наступаючы ўздоўж Варшаўскай шашы, часці выйшлі на захад ад Сярадава (243 полк), паўднёвы захад ад Міхнавіч (138 полк) і Бараноў (146 полк). Праціўнік аказваў лютае супраціўленне пяхотай і танкамі (да 10 бронеадзінак) і браняпоездам, узрываючы масты і чыгуначнае палатно. Працягваючы граміць ворага, часці дывізіі авалодвалі адным рубяжом за другім і вызвалілі Сярадава, Пескі, ст.Косаў, Рачыцу, Агароднікі, Самойлавічы, Стрыгінь. Вораг замацаваўся на Ясельдзе...

Разведка ішла наперадзе

З успамінаў былога начальніка разведкі 48-й гвардзейскай дывізіі, палкоўніка ў адстаўцы В. Рахманава

...Фашысты адчайна супраціўляліся, імкнучыся замацавацца, стрымаць наша наступленне. Асабліва вялікую надзею ўскладала варожае камандаванне на раку Шчару — тут яны ўзвялі ўмацаванні, перакінулі сюды мадзьярскую кавалерыю.

Днём 9 ліпеня нашы перадавыя атрады выйшлі на зыходны рубеж і пачалі баі на заходняй дузе Шчары.

Тут успамінаецца адзін з прыкладаў сяброўскай дапамогі, якую заўсёды аказвалі нам партызаны. Тады камандаванне партызанскімі атрадамі накіравала да нас чатырох партызан, якія добра ведалі мясцовасць. Яны прапанавалі правесці нашы часці ў тыл ворага. Партызаны разам з начальнікам разведкі дывізіі, які знаходзіўся на камандным пункце каля вёскі Дабромысль, абмеркавалі ўсе дэталі аперацыі. Камандзір дывізіі генерал-маёр Г. М. Корчыкаў адобрыў задуму і прыняў рашэнне паслаць у абход пазіцый ворага атрад 138-га гвардзейскага стралковага палка.

Пачалося хуткае фарміраванне атрада, аснашчанага лёгкай зброяй, які з дапамогай праваднікоў-партызан павінен быў да раніцы 10 ліпеня выйсці ў вызначаны пункт на захад ад абарончага рубяжа акупантаў. Сувязь з атрадам павінна была трымацца па рацыі.

У ноч на 10 ліпеня атрад рушыў у дарогу...

Раніцай, калі ўзышло сонца, нарэшце загаварыла радыёстанцыя атрада, — яны ішлі ўсю ноч, такую кароткую ў пачатку ліпеня, ішлі, не спыняючыся, і апынуліся на заходнім рубяжы, у тыле ворага.

Гэты мабільны атрад, каардынаваны з агульнага цэнтра наступлення дывізіі, спрыяў паспяховаму наступленню палкоў з фронту: імклівыя атакі з тылу прымусілі ворага паспешна адступаць на Івацэвічы — фашысты баяліся акружэння.

На ўсім участку Брэсцкай шашы — ад усходняй да заходняй дугі Шчары — часці 48-й гвардзейскай дывізіі правялі паспяховае наступленне, нанеслі значныя страты праціўніку і не далі яму магчымасці замацавацца на вельмі зручных для абароны рубяжах.

А разведчыкі, толькі што фарсіраваўшы Шчару, пайшлі далей. Група гвардыі старшага сяржанта Ф.Рыжанкова выйшла ў раён Івацэвіч. Яшчэ на падыходах да горада ад мясцовых жыхароў разведчыкі даведаліся, што ў ім ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка да абароны. Сюды ж з фронту падыходзілі калоны танкавых і пяхотных часцей, мадзьярская конніца.

Фашысты мелі намер у Івацэвічах паспрабаваць затрымаць наступленне нашай дывізіі і рыхтавалі горад да працяглай абароны, адначасова вывозячы з яго розную маёмасць, абсталяванне.

Разведчыкі атрымалі дакладныя звесткі аб усіх прыгатаваннях ворага. Ад іх пільнага вока не схавалася і калона фашысцкіх салдат, якая 10 ліпеня накіравалася ў лясны масіў на паўднёвым захадзе ад горада. Гэтыя звесткі былі перададзены ў штаб дывізіі. Як паказалі захопленыя потым палонныя, гэта калона была другім батальёнам 508-га палка 292-й пяхотнай дывізіі праціўніка, які паспешна быў перакінуты на бронецягніку ў Івацэвічы. Батальён павінен быў абысці нашы войскі з поўдня і ўдарыць па іх з фланга.

Але манеўр быў раскрыты, і вораг страціў

магчымасць нанесці нечаканы ўдар. Генерал Г. М. Корчыкаў, атрымаўшы радыёданясенні разведчыкаў Ф. Рыжанкова, правёў некаторую перагрупоўку часцей дывізіі. І пачалося далейшае наступленне.

11 ліпеня нашы войскі ўжо вялі жорсткія баі за вызваленне горада Івацэвічы. Контратака з паўднёвага фланга была адбіта. Паспяхова развівалася наступленне і на галоўным напрамку — ворагу не дапамаглі ні ўмацаванні, ні штурмбатальён 2-й нямецкай арміі, які быў перакінуты сюды на ўмацаванне абароны. Супраціўленне было зламана, і ў другой палове дня фашысты пачалі паспешна адступаць.

На ўчастку ад Івацэвіч да станцый Косава-Палескае і Бронная Гара паспяхова дзейнічала група разведчыкаў з дывізійнай роты пад камандаваннем старшага сяржанта Афанасьева... Яго група ўвесь час «вісела» на плячах у праціўніка, брала палонных з яго адыходзячых ар'ергардных заслонаў, перадавала ў штаб дывізіі каштоўныя звесткі.

На гэтым участку нашы разведчыкі, спрабуючы абысці ворага па лясах на поўдзень ад Брэсцкай шашы, некалькі разоў сустракалі групы беларускіх партызан, атрымлівалі ад іх звесткі аб ворагу, часам узаемадзейнічалі ў правядзенні асобных аперацый...

Па дарогах былых баёў

З успамінаў удзельніка вызвалення раёна жыхара г. Прылукі Чарнігаўскай вобласці В. Грычаноўскага

10 ліпеня 1944 г. з групай байцоў, якую я ўзначальваў, мы захапілі ўчастак дарогі Брэст—Масква каля вёскі Любішчыцы. Наш 138-ы гвардзейскі стралковы полк 48-й Крыварожскай стралковай дывізіі вёў упартыя баі з фашысцкімі захопнікамі за гэту важную магістраль. Ачысціўшы яе ад акупантаў, мы тым самым садзейнічалі акружэнню вялікай нямецкай групоўкі войск пад Мінскам.

...Мы ішлі па непралазных балотных і лясных мясцінах. Нарэшце, выйшлі да ракі Грыўда. Успыхнуў кароткі, жорсткі бой, і наша група пераправілася на другі бок ракі. Пабеглі да вёскі. Крайнія хаты і пабудовы вёскі гарэлі. Праз агонь мы дайшлі да цэнтра вёскі.

Любішчыцы былі вызвалены ад захопнікаў. Памятаю, што першым чалавекам, які нас сустрэў каля царквы, быў нехта Барадзін. Ён дапамог накарміць байцоў, арганізаваць іх адпачынак.

Даўно гэта было. Але ў памяці падзеі тых дзён захоўваюцца так ясна, як быццам адбыліся ўчора... Можа таму так цягне нас, былых воінаў, у тыя мясціны жорсткіх баёў з ворагам. Мне ўдалося пабываць у вёсцы Любішчыцы восенню 1976 года...

Ішоў полк на захад

З успамінаў палкоўніка ў адстаўцы В. Кучаравенкі

...Наш 138-ы гвардзейскі Чырванасцяжны Берлінскі стралковы полк 48-й гвардзейскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава Крыварожскай стралковай дывізіі гераічна змагаўся на працягу ўсёй вайны. У цяжкіх баях мы прайшлі шлях ад Масквы да Берліна...

Наш полк удзельнічаў у выгнанні ворага з Беларусі. Пасля вызвалення Ганцавіцкага раёна мы з цяжкімі баямі рухаліся да Івацэвіч. Неўміручай славай пакрылі сябе салдаты і афіцэры пры вызваленні гэтага невялікага населенага пункта, важнай чыгуначнай станцыі.

Артылерысты капітана Рэутава ў баявым парадку падраздзяленняў прамой наводкай знішчылі дзве гарматы праціўніка. Разведчыкі палка пад камандаваннем Пярвухіна праніклі ў тыл ворага і знішчылі там два мінамёты. Сапёры капітана Міронава гранатамі ўзарвалі дзот на ўскраіне горада. Такія адначасовыя дзеянні салдат забяспечылі іншым воінам палка магчымасць уварвацца ў Івацэвічы, штурмаваць дамы, знішчаць фашыстаў агнём і штыком.

Вораг панёс вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы, ён вымушаны быў пакінуць горад і рухацца ў напрамку Бярозы.

Вялікую дапамогу ў вызваленні Івацэвіч аказалі партызаны, партызанкі, мірнае насельніцтва. Яны паказвалі нам агнявыя кропкі праціўніка, яго месцазнаходжанне, дапамагалі дастаўляць боепрыпасы на перадавую...

Група салдат і афіцэраў 138-га стралковага палка, удзельнікаў вызвалення Івацэвіч і раёна. Здымак 1945 г.

З архіва ў Падольску

У Падольскім архіве пад Масквой знаходзіцца шмат дакументаў аб падзеях ліпеньскіх дзён 1944 г., калі сіламі 20-й, 48-й, 50-й, 54-й, 55-й і 96-й гвардзейскіх стралковых дывізій быў вызвалены Івацэвіцкі раён. З данясенняў, зводак, загадаў, спісаў страт эпізод за эпізодам паўстае хроніка жорсткіх баталій, якія разгарнуліся на берагах Шчары і Грыўды...

ЗВЕСТКІ АБ ПРАРЫВЕ АБАРОНЫ І ПРАСЛЕДАВАННІ ПРАЦІЎНІКА ЧАСЦЯМІ 48-Й ГВАРДЗЕЙСКАЙ СТРАЛКОВАЙ КРЫВАРОЖСКАЙ ДЫВІЗІІ Ў НАПРАМКУ БРЭСТ—КОБРЫН

Згодна з рашэннем камдыва 146-ы гвардзейскі стралковы полк, абыходзячы шашу злева, пяхотай павёў наступленне ў напрамку в.Сялец і, пераадолеўшы балоты, у другой палове ночы 8 ліпеня авалодаў вёскай.

Раніцай гэтага ж дня 143-і гвардзейскі стралковы полк ва ўзаемадзеянні з суседам справа пры садзейнічанні 146-га гвардзейскага стралковага палка выйшаў на поўдзень ад шашы ў раёне Дабромысля і пасля жорсткага бою авалодаў Мілавідамі, працягваючы наступленне ў напрамку вёсак Смольна і Волька.

Адначасова з дзеючымі ў вярхоўях Шчары часцямі дывізіі накіраваны з Навасёлак 138-ы гвардзейскі стралковы полк з батарэяй 98-га гвардзейскага артпалка вядзе наступленне на поўдзень ад возера Выганашчанскае ў раёне Агінскага канала па лініі Навасёлкі — Раздзялавічы — Целяханы — Святая Воля. 19 ліпеня часці дывізіі, фарсіраваўшы заходнюю дугу ракі Шчара, вялі бой у раёне меліярацыйных каналаў.

Паводле паказанняў палонных 508-га пяхотнага палка 292-й пяхотнай дывізіі ў Івацэвічы да наяўных там войск тэрмінова падкінуты на браняпоездзе батальён пяхоты з задачай абысці нашы часці і нанесці ім паражэнне з флангаў. Паводле звестак мясцовага насельніцтва ў Івацэвічах знаходзяцца таксама часці «СС».

Пазней тут былі захоплены палонныя з матарызаванага батальёна 2-й арміі, тэрмінова перакінутага для падмацавання дзеючых нямецкіх часцей у паласе дывізіі.

Да зыходу дня 10.7.1944 г. 138-ы гвардзейскі стралковы полк фарсіраваў раку Грыўда і авалодаў в.Любішчыцы, 134-ы гвардзейскі стралковы полк авалодаў в.Галенчыцы.

З раніцы 11 ліпеня, з выхадам часцей на рубяжы чыгуначнага палатна каля вёсак Панкі і Яглевічы, праціўнік павёў контратаку з паўднёва-ўсходняй часткі ст.Івацэвічы супраць 143-га гвардзейскага стралковага палка. У другой палове дня нашы часці, ведучы жорсткі бой з контрнаступаючым праціўнікам сіламі батальёна пяхоты і 5—6 танкаў, поспеху не мелі.

Да 18 гадзін 11.7. рашэннем камдыва быў уведзены з левага фланга дывізіі ў напрамку в.Бараны 146-ы гвардзейскі стралковы полк, які да гэтага прыкрываў дывізію ад удараў з поўдня. Ён рашучымі дзеяннямі авалодаў Баранамі і перарэзаў Варшаўскую шашу на паўднёвы захад ад Івацэвіч. Адначасова 138-ы гвардзейскі стралковы полк фарсіраваў раку Грыўда і завязаў баі на паўночнай ускраіне Івацэвіч, а 134-ы гвардзейскі стралковы полк уварваўся на станцыю Івацэвічы. Праціўнік, кідаючы зброю і боепрыпасы, з цяжкімі стратамі адступіў у заходнім напрамку.

У баях за Івацэвічы праціўнік страціў забітымі і параненымі да 200 салдат і афіцэраў, два танкі і столькі ж бронетранспарцёраў, 10 кулямётаў, дзве гарматы і прадуктовы склад.

Да раніцы 12 ліпеня 1/138-га гвардзейскага стралковага палка, які дзейнічаў на працягу 8, 9, 10 ліпеня ў раёне Целяхан, ля в.Яглевічы злучыўся са сваім палком. Ён сумесна з дзеючай там 99-й партызанскай брыгадай імя Гуляева знішчыў і рассеяў па балотах больш за 500 немцаў і венграў, якія складалі гарнізон у Целяханах, забяспечыўшы такім чынам актыўныя дзеянні нашых часцей у вярхоўі ракі Шчара з поўдня.

...Вось так развіваліся дзеянні на поўдні і паўднёвым усходзе нашага раёна. Аб тым, якія былі ў тыя ліпеньскія дні баявыя абставіны ў паўночна-заходняй і паўночнай яго частцы, сведчаць наступныя зводкі:

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА № 104 295-ГА ГВАРДЗЕЙСКАГА СТРАЛКОВАГА ПАЛКА

Праціўнік, адыходзячы на захад, затрымліваецца на асобных рубяжах, прыкрываючыся танкамі і артылерыяй. 295-ы гвардзейскі стралковы полк, праследуючы яго ў напрамку Вуглы, Пагор'е, Наліўкі, Доўгае, Козіна, Рудня, да 12.07.44 г. заняў Рудню. Праследаванне распачата ў 14.00 9.07.44 г., у 18.00 фарсіравалі раку Шчара на поўдзень ад Вуглоў. З баямі полк вызваліў Пагор'е і заняў кругавую абарону, у 5.00 10.07.44 прайшоў Наліўкі, у 7.00 — Доўгае, у 9.00 — Плянт і да 12.00 заняў з боем Рудню, пасля чаго пачаў прасоўвацца ў напрамку адзнакі 172.4. У 14.00 полк быў абстраляны моцным артылерыйска-мінамётным і кулямётным агнём праціўніка з боку Заполля, пасля чаго заняў абарону: 1-ы стралковы батальён —адзнака 6096 А фронтам на паўночны захад, 3-і стралковы батальён — адзнака 6094 Б фронтам на паўночны захад, 2-і стралковы батальён — адзнака 6094 В фронтам на захад.

Пры фарсіраванні ракі Шчара на супрацьтанкавай міне падарвалася адна 45-міліметровая гармата. Полк мае страты: 7 забітых, 19 параненых. Пры ўзяцці Рудні захоплены трафеі: адна спраўная легкавая машына, два 81-міліметровыя мінамёты, 8 лёгкіх кулямётаў, спалены два танкі.

Начальнік штаба 295-га гвардзейскага стралковага палка падпалкоўнік Піскуноў.

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА № 089 ШТАБА 291-ГА ГВАРДЗЕЙСКАГА СТРАЛКОВАГА ПАЛКА ДА 20.00 11.7.1944 г.

1. З 15.00 да 18.00 10.7.44 праціўнік дробнымі групамі аўтаматчыкаў і снайпераў, якіх падтрымлівалі адзіночныя танкі і самаходныя гарматы, спрабаваў утрымаць рубеж 170.9. Кулямётным, мінамётным і артылерыйскім агнём нашых падраздзяленняў быў рассеяны і, несучы страты, у 10.00 пачаў адыход у паўднёва-заходнім кірунку.

Авіяцыя праціўніка адзіночнымі самалётамі і асобнымі групамі (2—3 самалёты) вяла разведку нашых тылоў.

2. З 18.00 10.7.44 артылерыя (тры батарэі) вяла агнявы бой з праціўнікам на рубяжы адзнакі 170 непадалёк ад в.Заполле.

У 19.00 10.7.44 выбілі праціўніка з займаемага рубяжа і пачалі праследаванне ў напрамку в.Харошча. У 21.00 падраздзяленні 291-га гвардзейскага стралковага палка сканцэнтраваліся ў раёне адзнакі 167.2. З 6.00 11.7.44 зрабілі марш па маршруце Чыжыкі—Харошча і да 18.00 сканцэнтраваліся ў раёне Сенькавіч, 5 км на ўсход ад Косава.

Страты: забітых няма, параненых — 3 чалавекі.

Трафеі: 5 гармат, 5 трактароў.

* * *

У апошняй зводцы міжволі звяртае на сябе ўвагу такі радок: забітых няма, параненых — 3 чалавекі. Але так здаралася далёка не заўсёды. Вось перад намі спіс беззваротных страт сяржанцкага і радавога складу 96-й гвардзейскай стралковай Ілавайскай Чырванасцяжнай дывізіі. Толькі адзін спіс, у якім значыцца 16 чалавек. Растаўчанін Васіль Аленін, украінец Ціхан Пітомец, казах Джанібек Сардыбекаў, адэсіт Іван Дзмітрук, армянін Гайдула Аміраў, узбек Турсункул Атабаеў... Яны, як і яшчэ дзесяць іх таварышаў, загінулі ў час баёў 8—11 ліпеня і былі пахаваны, згодна сведчанню ў дакуменце, у в.Козіна. І так па кожнай дывізіі, кожным палку, кожным батальёне. Мы бачылі гэтыя доўгія спісы. Каля Волькі склалі свае галовы Яфім Куснараў і Аляксандр Цімафееў, каля Аляксеек — Васіль Анюгін і Емяльян Макарэвіч, каля Быцені — Іона Зайка і Мікалай Яфімаў, каля Руды — Фёдар Пясчанскі і Арсен Ушакоў. Ужо ў Івацэвічах дагнала варожая куля Анатоля Бялова з Яраслаўля і Антона Калыхаева з Нікалаева, Юрыя Лабачова з Куйбышава і Базара Нарзулаева з Кашка-Дар'і. 17 байцоў страціў за перыяд з 9 да 12 ліпеня 67-ы стралковы полк, 10 —265-ы стралковы полк.

Канечне, страты далёка не абмяжоўваліся такой колькасцю загінуўшых. Так, 48-я гвардзейская стралковая Крыварожская дывізія толькі за час баёў з 10 чэрвеня да 18 ліпеня 1944 г. не далічылася 61 афіцэра. Многія з іх, як і сотні салдат і сяржантаў, знайшлі свой апошні прытулак на івацэвіцкай зямлі... А да поўнай перамогі над ворагам заставалася яшчэ доўгіх дзесяць месяцаў.

А. Велікаселец, В. Жывіневіч, М. Рымач.

Зорка героя

У баях на рацэ Проня вызначыўся корпус, якім камандаваў Мікалай Мікалаевіч Мультан. 25 чалавек атрымалі тады званне Героя Савецкага Саюза.

Мікалай Мікалаевіч Мультан нарадзіўся 24 лістапада 1900 г. у беднай сялянскай сям'і ў в.Някрасаўшчына Івацэвіцкага раёна. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1927 г. скончыў Беларускую аб'яднаную ваенную школу імя ЦВК БССР, Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба. Удзельнік баёў пад Масквой, за вызваленне Калініна, Смаленска, Магілёва, Гродна, штурму Кёнігсберга.

У баях пад Леніна ў кастрычніку 1943 г. М. М. Мультан камандаваў 42-й стралковай дывізіяй.

У лістападзе 1943 г. М. М. Мультан назначаецца камандзірам 69-га стралковага корпуса, у склад якога ўваходзілі 42-я і 222-я Смаленскія стралковыя дывізіі. Абедзве гэтыя дывізіі з-пад вёскі Леніна былі перакінуты на Проню і ўдзельнічалі ў прарыве абароны нямецкіх войскаў у чэрвені 1944 г. Перад корпусам ставілася задача: прарваць абарону праціўніка на ўчастку фронту Пералогі — Галавічы і авалодаць апорным пунктам фашыстаў у вёсцы Галавічы і вышынёй 182,2 , якая знаходзілася на захад ад вёскі. У далейшым корпус павінен быў наступаць у напрамку в. Чарняўка і далей да Дняпра, каб фарсіраваць раку і захапіць плацдарм.

У дзень наступлення 23 чэрвеня 1944 г. 222-я стралковая дывізія ў час артылерыйскай падрыхтоўкі фарсіравала Проню і заняла зыходнае становішча для атакі. Затым пры падтрымцы артылерыі атакавала праціўніка і авалодала яго апорным пунктам у вёсцы Галавічы. Да сярэдзіны дня прарвала першую пазіцыю абароны праціўніка і з ходу атакавала другую пазіцыю. Для развіцця дасягнутага поспеху і завяршэння прарыву галоўнай паласы абароны нямецкіх войск М. М. Мультан увёў у бой 42-ю стралковую дывізію, якая, не марудзячы, адразу сваім ударам зламала супраціўленне фашыстаў на трэцяй пазіцыі і авалодала вёскай Трылесіна.

На другі дзень бою корпус Мультана працягваў наступленне і прымусіў ворага адыходзіць. Галоўныя сілы корпуса пачалі праследаваць фашыстаў, а перадавыя часці пайшлі наперад, знішчаючы на сваім шляху дробныя групы фашыстаў. 42-я дывізія ў гэты час раптоўным ударам авалодала Чарняўкай, фарсіравала раку Бася і захапіла плацдарм.

Пасля разгрому праціўніка на гэтай рацэ войскі корпуса накіраваліся да Дняпра. Перадавыя часці 42-й стралковай дывізіі прарваліся

праз баявыя часці ворага, імкліва выйшлі да Дняпра, першымі фарсіравалі яго і захапілі плацдарм у раёне вёскі Дабрэйка. На захоплены плацдарм па наведзеным сапёрамі мосце былі перакінуты асноўныя сілы корпуса, якія паспяхова завяршылі наступальную аперацыю. Удалыя дзеянні корпуса М. М. Мультана забяспечылі выкананне баявой задачы ўсёй арміяй па вызваленні Магілёва.

За ўмелае кіраўніцтва корпусам у час прарыву абароны праціўніка на Проні і Басі, фарсіраванне Дняпра і праяўлены гераічны подзвіг пры выкананні баявой задачы Мікалаю Мікалаевічу Мультану Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР ад 21 ліпеня 1944 года было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Да сакавіка 1959 г. М. М. Мультан знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі. Пасля звальнення ў запас і да апошніх дзён свайго жыцця ён выконваў вялікую работу па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. На грамадскіх пачатках загадваў інспекцыяй па кантролі пры Ленінградскім гарвыканкоме і з'яўляўся старшынёй ваенна-навуковага таварыства пры ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава. Памёр М. М. Мультан 19 верасня 1975 г.

М. М. Мультан.

М. Л. Ермачок.

У музеі савецка-польскай баявой садружнасці (вёска Леніна Магілёўскай вобласці) захоўваецца сцяг 42-й стралковай дывізіі, якой камандаваў М. М. Мультан. Пра баявыя дзеянні слаўных воінаў дывізіі і яе камандзіра, а пасля камандзіра корпуса, расказваюць работнікі музея моладзі, турыстам, замежным гасцям. Імя слаўнага сына беларускага народа М. М. Мультана навечна запісана залатымі літарамі ў гераічны летапіс Вялікай Айчыннай вайны.

І. Стальмашонак.

Генерал-маёр з вёскі Доўгае

Мацвей Лук'янавіч Ермачок нарадзіўся 18 кастрычніка 1903 г. у вёсцы Доўгае. Тры гады пахадзіў у школу хлопчык, а ў 1915 г. сям'я Ермачкоў адправілася ў бежанства. Па дарозе Мацвей страціў старэйшага брата і маці. У г. Траецк з дапамогай дырэктара мужчынскай гімназіі М. М. Андрусевіча Мацвей Ермачок стаў вучнем гімназіі і правучыўся ў ёй да 1919 г. Восенню 1920 г. у г.Кунгур Пермскай губерні ён стаў ваенным і застаўся ім на ўсё жыццё.

Ермачок служыў у атрадзе асобага прызначэння, затым у кавалерыйскай часці, адкуль яго накіравалі на вучобу ў Маскву ў школу чырвоных камандзіраў на кавалерыйскае аддзяленне.

Пасля двух гадоў вучобы М. Л. Ермачок атрымлівае назначэнне камандзірам узвода 7-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі, якая ў той час размяшчалася на Беларусі ў г. Рэчыца Гомельскай вобласці. Пазней служыў камандзірам кулямётнага эскадрона 39-га Церскага кавалерыйскага палка, якім камандаваў Г. К. Жукаў.

У пачатку 30-х гадоў М. Л. Ермачка накіроўваюць на аднагадовыя курсы па падрыхтоўцы камандзіраў для бранятанкавых войск, з якімі лёс зводзіць яго назаўсёды. Ён працуе выкладчыкам, вучыцца ў бранятанкавай акадэміі, нясе ваенную службу ў Ташкенце, Ленінградзе і іншых гарадах былога Саюза.

Мацвей увесь час марыў наведаць родныя мясціны, але яны ў той час былі ў складзе Польшчы. І толькі ў 1940 г. яму ўдалося пабываць у роднай вёсцы, сустрэцца з роднымі і знаёмымі. Гэта была апошняя сустрэча яго з роднай вёскай.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Палкоўнік М. Л. Ермачок служыў тады ў Казані, працуючы намеснікам начальніка танкавага вучылішча па вучэбнай частцы. З болем пачуў вестку аб акупацыі Беларусі нямецкімі войскамі. Не раз прасіўся на фронт, але атрымліваў адказ. Нарэшце ў лістападзе 1942 г. яго

прызначылі начальнікам штаба, а затым намеснікам камандзіра танкавай брыгады дзеючай арміі. У 1943 г. Ермачок быў прызначаны камандзірам 79-й танкавай брыгады, якой прыйшлося прайсці гарніла бітвы на Курскай дузе. Адбіўшы атакі гітлераўскіх «тыграў», танкісты Ермачка разам з іншымі часцямі перайшлі ў контрнаступленне.

За выдатнае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі на Курскай дузе палкоўнік М. Л. Ермачок быў узнагароджаны ордэнам Кутузава II ступені.

Пасля былі баі на паўднёвым напрамку ў раёне г. Мелітопаля, бітва за Крым, у час якой камандзір танкавай брыгады Ермачок умела камандаваў танкістамі, што аказаліся ў акружэнні. У ходзе цяжкіх баёў былі панесены значныя страты, цяжкае раненне атрымаў і Мацвей Лук'янавіч Ермачок. Дзесяць месяцаў урачы ратавалі яму жыццё. Дзякуючы ім мужны воін змог зноў стаць у строй.

У снежні 1944 г. генерал-маёр Ермачок назначаецца намеснікам камандзіра 9-га гвардзейскага Дняпроўска-Рымнікскага механізаванага корпуса 6-й гвардзейскай танкавай арміі. Ён удзельнічае ў баях за вызваленне Венгрыі, Аўстрыі і Чэхаславакіі.

Пасля перамогі над Германіяй працягваў змагацца з японскімі самураямі ў Маньчжурыі, дзе ён камандаваў ужо танкавым корпусам.

За баявыя заслугі ў барацьбе з ворагамі нашай Айчыны наш зямляк быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Суворава, Кутузава, Чырвонага Сцяга, шматлікімі медалямі.

Пасля вайны генерал Ермачок — камандзір механізаванай дывізіі ў Забайкаллі, камандзір бранятанкавых войск Адэскай ваеннай акругі, начальнік Кіеўскага танкавага вучылішча. На апошняй пасадзе працаваў 10 гадоў. Ён карыстаўся глыбокай павагай сярод саслужыўцаў, любоўю салдат і курсантаў. Яго кватэра ў Кіеве заўсёды была адчынена для ўсіх, хто не забываў беларускага камандзіра з вёскі Доўгае каля ракі Шчара.

В. Мароз.

Аўтограф на рэйхстагу

З успамінаў былога партызанскага сувязнога, франтавіка Ф. А. Асіпіка з в. Любішчыцы

У ліпені 1944 г. я, як і многія мае аднавяскоўцы, апрануў салдацкую форму. Трапіў у 1350-ю стралковую дывізію, якая ў складзе часцей 1-га Беларускага фронту пачала вызваленне Польшчы. Да гэтага часу адна з мацнейшых гітлераўскіх армій — «Цэнтр» — перастала існаваць. Але немцы яшчэ шалёна супраціўляліся. Прыходзілася выбіваць іх з кожнага дома, падвала. Памятаюцца хмары цаглянага пылу, гар і сажа, перамешаныя з дымам ад выстралаў гармат, якія закрывалі неба.

Так склалася, што стаў я санітарам, потым санінструктарам. Выносіў з поля бою параненых. У тыя дні даведаўся пра гібель майго 18-гадовага брата Сямёна, кулямётчыка. Невыказным болем аддалася ў сэрцы гэта страта.

«Хутчэй наперад!» — гэтай думкай жыў тады кожны салдат. Штурмавыя батальёны пад шквальным агнём ворага фарсіравалі Віслу. Хутка была вызвалена Варшава. А яшчэ праз некаторы час нашы часці ступілі на нямецкую зямлю і рушылі ў Шчэцінскім напрамку. Кровапралітныя баі былі на Памеранскім вале... Потым нашу дывізію перакінулі на Берлін. Неўзабаве да нас дайшла вестка, што фашысцкае логава капітулявала!

Я трапіў у Берлін 15 мая, ужо пасля Перамогі. Горда лунаў чырвоны сцяг над рэйхстагам. На яго сцяне сярод шматлікіх надпісаў пакінуў і я свой аўтограф...

В. Мароз.

Берлін, май 1945

З успамінаў былога франтавіка П. Луцкіна

...З цяжкімі баямі мы штурмавалі Одэрскі плацдарм. Узялі невялікі гарадок Кюстрын. Наш зампаліт сказаў нам:

— Арлы! Мы адабралі ў фрыцаў ключ ад іх сталіцы. Цяпер нам засталося толькі ўставіць яго ў шчыліну.

1 мая я быў ужо ў Берліне. З боем бралі кожны дом, кожны паверх, кожны пакой. Рэйхстаг быў акружаны шырокім каналам. Пераправіцца цераз яго было амаль немагчыма. Вораг бесперапынна вёў агонь... Цэлую ноч ішоў бой у рэйхстагу.

2 мая ў Берліне наступіла нязвыклая на фронце цішыня. Баі спыніліся. Над рэйхстагам

чырванеў сцяг нашай Радзімы. А праз некалькі дзён да нас прыйшла яшчэ адна радасная вестка: «Германія капітулявала!»

Узбуджаныя воіны крычалі «ўра!», абдымаліся, стралялі ўгару. Штыкамі і нажамі сталі распісвацца на сценах рэйхстага. Я таксама пакінуў свой подпіс: «Луцкін, 1945 г.»...

Старонкі жыцця

...Уладзіміра Шалюціна з в. Аброва прызвалі ў армію ў перадваенным 1940-м. Спачатку была Кандалакша, што ў Мурманскай вобласці. А потым — Новы Пецяргоф, Выбарг, Луга. І баі, жорсткія баі. Мотастралковая часць, у якую ўваходзіў радавы Шалюцін, панесла вялікія страты. Месцы загінуўшых займалі новыя воіны. Горад Луга пераходзіў з рук у рукі некалькі разоў.

Неймаверна цяжкімі былі дні блакады Ленінграда.

Пад канец 1942 г. радавога Шалюціна параніла. Далей былі шпіталі ў адным месцы, другім. Вярнуцца ў строй ён ужо не змог.

Скончылася вайна, ды не скончыліся выпрабаванні. У родныя месцы Уладзімір Шалюцін прыбыў у 1946 годзе. На калясцы з ручным прыводам ён ездзіў у хату-чытальню, дзе пачаў працаваць. Не здаваўся хваробе франтавік. Працягваў лячыцца ў хатніх умовах. І вось стаў на ногі!

Пазней Уладзіміра Іванавіча Шалюціна выбралі старшынёй сельскага Савета. Арганізоўваў калгас, што не кожнаму тады падабалася. Былі людзі, што хацелі яго запалохаць. Вытрымаў.

Пасля вучобы стаў старшынёй мясцовага калгаса, дырэктарам саўгаса імя Чапаева. Звыш двух дзесяцігоддзяў — на кіруючай рабоце.

Затым пенсія. І заўсёды ў ветэрана знаходзіўся час на грамадскую работу.

Р. Віктараў.

Праз усе выпрабаванні

Міхаілу Горбачу не споўнілася яшчэ і васемнаццаці, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Хлопцу не сядзелася дома. Міхаіл пазнаёміўся з надзейнымі людзьмі. Яны давалі Горбачу заданні. Міхаіл здабыў сабе вінтоўку і сур'ёзна рыхтаваўся стаць партызанам. Аднак здарылася непрадбачанае — хлопца схапілі фашысты і вывезлі ў Германію. Працаваў у вугальнай шахце.

Больш за год знаходзіўся Міхаіл у Нямеччыне. Думка аб вяртанні на радзіму не пакідала яго. У 1943 г. Горбач уцякае з шахты і прабіраецца дамоў у Беларусь. Доўгай і цяжкай была дарога. Нямногія з тых, хто ўцякаў з няволі, дабіраліся да родных мясцін. А яму пашчасціла, можа таму, што вельмі любіў свой родны край, сваю зямлю, вёску Дабрынёва.

У кастрычніку 1943 г. на Кобрыншчыне Горбач сустрэўся з земляком Міхаілам Ламейкам і стаў партызанам атрада імя Катоўскага, членам дыверсійнай групы. Шэсць варожых эшалонаў паляцела пад адхон ад удалых аперацый падрыўніка.

Не толькі на чыгунку хадзіў Міхаіл. Смела змагаўся з ворагам у адкрытых баях, двойчы хадзіў з заданнем за лінію фронту.

Пасля злучэння з Чырвонай Арміяй стаў яе байцом. Камандзір кулямётнага разліку 38-й стралковай дывізіі М. Горбач вызваляў Брэстчыну, удзельнічаў у баях пад Варшавай, дзе 14 кастрычніка 1944 г. быў цяжка паранены — застаўся без нагі.

Радзіма ўзнагародзіла Міхаіла Горбача ордэнам Айчыннай вайны, чатырма баявымі медалямі.

А. Падаляка.

Па старонках раёнкі

Пасля вызвалення раёна ад гітлераўскіх акупантаў да поўнай перамогі над фашысцкай Германіяй заставалася яшчэ восем месяцаў. Але аднаўленчае жыццё ў раёне ўжо пачалося. Людзі з радасцю і нястомнай энергіяй узяліся за справу. Летапісцам падзей таго часу стала косаўская раённая газета «Чырвоная звязда». Уздым з руін гаспадаркі раёна, наладжванне мірнага ўкладу жыцця людзей — гэтым тэмам быў прысвечаны кожны нумар раёнкі.

Вось ён, перада мной, першы нумар «Чырвонай звязды». Датаваны ён ужо чацвяргом 27 ліпеня 1944 года... Злева над назвай газеты словы «Смерць нямецкім акупантам!». Спра-

ва — просьба да чытача: «Прачытаў — перадай другому».

Нумар быў выпушчаны на рускай мове і пачынаўся ён са звароту Косаўскага РК КП(б) Беларусі і раённага Савета дэпутатаў працоўных «Да працоўных Косаўскага раёна». Партыйныя і савецкія органы раёна звярталіся да рабочых, сялян, інтэлігенцыі з заклікам усімі сіламі дапамагаць краіне і фронту, зрабіць усё для таго, каб у самыя сціслыя тэрміны ўзнавіць заводы, МТС, школы, бальніцы, жылыя будынкі, усё, што неабходна для паўнакроўнага жыцця. Адначасова размова ішла пра абавязак кожнага чалавека акружыць увагай і клопатам сем'і загінуўшых воінаў і партызан, а таксама інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Пад зваротам подпісы: сакратар РК КП(б)Б Кавалёў, старшыня выканкома райсавета Манахаў.

І тут жа, на першай старонцы, невялічкая заметка пра тое, што сяляне в. Яблонка прыступілі да рамонту школы, па ўласнай ініцыятыве падвозілі лес, рамантавалі дах, прыводзілі ў парадак класы.

Аналагічныя інфармацыі змешчаны на другой старонцы «Чырвонай звязды». У адной з іх паведамляецца аб тым, што ў Косаве пушчаны млын, загадчык якога Фама Трында ўласнаручна перабраў абсталяванне і вось ужо, пачынаючы з 15 ліпеня, перапрацаваў 88 339 кілаграмаў збожжа. Ніжэй — паведамленне аб тым, што ўжо з першых дзён пасля вызвалення раёна пачаў дзейнічаць дзіцячы дом у райцэнтры. Яго выхаванцы — дзеці тых, хто загінуў ад рук гітлераўскіх катаў. Так, маці Валодзі Волкава фашысты расстралялі за сувязь з партызанамі, бацька ваяваў на фронце. А вось у чатырохмесячнай дзяўчынкі Галі Ігошынай з родных не засталося нікога. Усяго, гаварылася ў заметцы, у дзіцячым доме знаходзіцца 25 выхаванцаў, для якіх арганізавана добрае харчаванне, абсталяваны пакоі для гульняў і адпачынку.

Другі нумар «Чырвонай звязды» выйшаў 22 жніўня на беларускай мове. Першая старонка адкрывалася перадавым артыкулам «Усе сілы на дапамогу фронту». У ім паведамлялася, што працоўныя раёна пачалі масавы збор збожжа ў фонд Чырвонай Арміі, а таксама разгарнулі датэрміновую здачу сельгаспрадукцыі ў лік дзяржаўных паставак. У раёне з вялікім уздымам прайшлі выбары дэлегатаў на абласную нараду сялян. Жыхары вёскі Заполле Бялавіцкага сельсавета далі наказ свайму дэпутату Восіпу Зайку перадаць, што яны датэрмінова выканаюць усе пастаўкі і да новага навучальнага года адрамантуюць школу.

На другой старонцы газеты дырэктар Косаўскага райпрамкамбіната І. С. Саменка паведамляў, што камбінат распачаў сваю работу 28 ліпеня, ужо працуюць тры кузні, сталярная і абозна-будаўнічая майстэрні, механічна-слясарны, бандарны і бляшаны цэхі. Пушчана ў ход электрастанцыя, адноўлены цагельныя заводы ў Івацэвічах і Бялавічах, хутка пачнуць працаваць два млыны: паравы ў Любішчыцах і вадзяны ў Бусяжы. Арганізоўваўся цэх па вырабе алею на Косаўскім млыне. На ўзнаўленні народнай гаспадаркі актыўна працавалі Ілья і Мацвей Шчуркі, механік Т. Г. Глінскі, былая партызанка Чэслава Альшына.

Наступныя нумары раённай газеты сведчылі, што жыццё ў раёне ўваходзіла ў сваю каляіну. З 1 верасня пачаліся заняткі ў 35 пачатковых школах. Паведамлялася, што 31 кастрычніка будуць адкрыты 2 сярэднія і 5 няпоўных сярэдніх школ. Усяго ў раёне за парты сядуць каля 5 тысяч вучняў. Праяўляўся клопат аб здароўі людзей. У Косаве адкрыліся амбулаторыя і бальніца, працавалі дзве інфекцыйныя і столькі ж стаматалагічных бальніц, некалькі фельчарскіх пунктаў. Быў наладжаны амбулаторны прыём у Івацэвічах, адкрываліся медпункты ў Грыўдзе і Любішчыцах.

Чацвёрты нумар «Чырвонай звязды», датаваны 13 верасня, пачынаўся з аб'яўлення тыдня пад лозунгам: «Хлеб — фронту». Ніжэй прыводзіліся прыклады патрыятычнага ўдзелу сялян у гэтым тыдні. Так, 70-гадовы Фёдар Перавалоцкі на сходзе сялян вёскі Яглевічы сказаў, што ўносіць у фонд абароны адну карову і 12 пудоў жыта, а збожжапастаўкі ў колькасці 30 пудоў ён ужо выканаў. Іван Клюткo здаў ужо 96 кг збожжа, былы партызан Васіль Пытляк унёс 300 рублёў. Жыхары в. Панкі Г. Ф. Дубіна і А. С. Белы здалі па 120 кг зерня, пра што паведамляў на старонках газеты дэлегат першай абласной нарады сялян Астап Малышаў. Не засталася ў баку ад гэтай патрыятычнай кампаніі і моладзь. Камсамольцы разгарнулі збор прадуктаў для выхаванцаў Косаўскага дзетдома і ўжо перадалі дзецям 100 кг збожжа,

2180 кг бульбы, 15 кг мёду, 695 яек, многа гуркоў, памідораў, капусты, масла, тварагу. Шмат увагі аддала гэтаму пытанню камсорг Альбінскага сельскага Савета Надзея Цярэшка.

А вось шчырае пісьмо Алены Ялоўскай з Зыбайлаў:

«Мне 19 гадоў, — пісала дзяўчына, — а я выглядаю намнога старэйшай. У час акупацыі працавала на заводзе. Калі фашысты спалілі вёску, у яе агні згарэлі мой бацька Рыгор Максімавіч і маці Алена Восіпаўна, сястра Маруся. Была ў партызанскім атрадзе, а цяпер буду працаваць дзеля перамогі».

Ніжэй у нумары паведамлялася аб аказанні дапамогі сем'ям загінуўшых. Прадукты харчавання атрымалі Браніслава Вольская з Косава і Вольга Бабей з Альшанскага сельсавета.

Газета паведамляла, што 25 верасня ў Косаўскім клубе лектарам ЦК КП(б)Б Бахуравым прачытана першая пасля вызвалення публічная лекцыя на тэму «Ваенна-палітычнае і міжнароднае становішча СССР». Слухалі яе 150 чалавек. З раёнкі вядома, што напярэдадні 27-й гадавіны Кастрычніка быў пушчаны смалакурны завод у Івацэвічах. У Косава з Альбінскага сельсавета прыбыў абоз з 45 фурманак са збожжам. На пярэднім возе з чырвоным сцягам былі камсамольцы Алена Піваварчык, Любоў Ганчар, Надзя Кукса і Аляксандр Пархута. Паведамлялася пра паспяховае выкананне збожжапастаўак жыхарамі Альбінскага і Стайкаўскага сельсаветаў, пра ўдзел Косаўскага райпрамкамбіната ў абласной выстаўцы і пра аднаўленне работы клуба ў Івацэвічах, пра збор хлеба для дывізій, якія вызвалялі Брэсцкую вобласць. У заметцы «Тавары для насельніцтва» гаварылася, што ў раён завезена тавараў і прадуктаў на 344 тысячы рублёў, з іх 5 тон солі, амаль на чатыры тысячы рублёў мыла і на 18 тысяч — запалак, трыкатажныя вырабы і абутак. Праз газету было адрасавана пытанне старшыні гарсавета і загадчыку камунальнага аддзела пра тое, калі будзе працаваць у райцэнтры лазня, узніміліся пытанні арганізацыі мастацкай самадзейнасці. У дзевятым нумары «Чырвонай звязды» паведамляўся цікавы факт — сялянка в.Яблонка Паўліна Данілаўна Пытляк зберагла ў час акупацыі чырвоны сцяг сельсавета, які перадала адразу ж пасля вызвалення.

29 кастрычніка ў Косаве быў праведзены першы суботнік, на якім 100 чалавек за 5 гадзін дасталі з руін 6500 штук цэглы, вымуравалі 12 квадратных метраў будучай лазні.

Святочны нумар газеты, прысвечаны 27-й гадавіне Кастрычніка, адкрыўся паведамленнямі аб працоўных здзяйсненнях жыхароў раёна. Здадзена звыш задання ў фонд Чырвонай Арміі 370 тон збожжа. Селянін в.Падстарынь Андрэй Касавец асабіста здаў 257 кілаграмаў хлеба. За кароткі тэрмін — не больш 3-х месяцаў — Косаўскі райпрамкамбінат выпусціў прадукцыі на 86 747 рублёў. Да свята ў раёне пачалі працаваць гукавая кінаўстаноўка, партыйны і педкабінеты, адкрывалася гарадская бібліятэка.

25 лістапада 1944 г. газета расказала пра першы раённы камсамольскі сход, які прайшоў чатыры дні назад. На ім кожны камсамолец узяў абавязацельства здаць у фонд Чырвонай Арміі 100 кілаграмаў бульбы і гародніны. Камсамольцам вёскі Скураты былі ўручаны камсамольскія білеты. Ад імя скуратоўскай камсамольскай арганізацыі яе сакратар Ніна Лушчык заявіла, што яны даюць слова здаць у фонд фронту 2 тоны бульбы, 2 цэнтнеры збожжа і столькі ж гароху. Камсамолец Уладзімір Мажэйка выказаў гатоўнасць здаць у фонд Чырвонай Арміі 200 кілаграмаў бульбы.

А ўжо ў наступным сваім нумары ад 30 лістапада «Чырвоная звязда» інфармавала сваіх чытачоў аб прайшоўшым на мінулым тыдні першым раённым партыйным сходзе.

Наступны, 17 нумар газеты, адкрываўся «шапкай» «Больш увагі арганізатарскай і палітычнай рабоце ў вёсцы». Змяшчалася пісьмо з фронту Васіля Данілковіча, які звяртаўся да сваіх бацькоў і ўсіх землякоў з заклікам ударнай працай дапамагаць хутчэйшай перамозе. Дырэктар лесазавода В. Внук расказваў, як па ініцыятыве стаханаўцаў Мікалая Рахавецкага, Паўла Алізарчыка і іншых нарошчваецца магутнасць завода, што да канца года пачне працаваць у поўную сілу лесацэх.

У апошнім, 20 нумары газеты ад 27 снежня 1944 года друкаваліся абавязацельствы рабочых і служачых райпрамкамбіната, якія на сваім сходзе падтрымалі пачын калектыву Мінскага радыёзавода аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва работнікаў мясцовай прамысловасці і абавязаліся павысіць

прадукцыйнасць працы на 20 працэнтаў, павялічыць выпуск ганчарных вырабаў, забяспечыць заводы глінай і дровамі, павысіць колькасць працуючых на іх за кошт жанчын і вучняў. Адзначалася, што 1944 год прынёс шмат працоўных поспехаў раёну, у тым ліку на 104 працэнты быў выкананы раённы план нарыхтовак лесаматэрыялаў.

Так, прайшлі гады, многае сцерлася ў памяці ўдзельнікаў тых хвалюючых і цяжкіх дзён. Аднак засталіся пажоўклыя старонкі раённай газеты, дзе зноў і зноў ажывае вірлівае жыццё нашых людзей пасля вызвалення.

М. Рымач.

ПЕРШЫ РАЁННЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД

25 лістапада ў памяшканні выканкома райсавета дэпутатаў працоўных адбыўся першы сход камуністаў раёна, прысвечаны вывучэнню даклада і загада т.Сталіна, а таксама абмеркаванню пастаноў ЦК і Абкома КП(б)Б аб разгортванні палітмасавай работы ў вызваленых ад нямецкай акупацыі раёнах.

Сход адкрыў сакратар РК КП(б)Б т.Кавалёў...

Удзельнікаў сходу вітала дэлегацыя сялян перадавога Стайкаўскага сельсавета. Старшыня дэлегацыі т.Кулецкі, вітаючы партыйны сход, заявіў:

— Мы прыйшлі вітаць удзельнікаў першага раённага партыйнага сходу ад імя ўсіх сялян Стайкаўскага сельсавета... У падзяку за сваё вызваленне сяляне сельсавета датэрмінова выканалі план пастаўкі дзяржаве хлеба і бульбы, здалі ў фонд Чырвонай Арміі 45 445 кг хлеба і 75 500 кг бульбы. Мы не паслабім нашу дапамогу фронту і дапаможам Чырвонай Арміі дабіць раненага фашысцкага звера ў яго ўласным логаве.

Са словам у адказ выступіў сакратар РК КП(б)Б т.Дзербан. Ён пажадаў сялянам Стайкаўскага сельсавета яшчэ больш працаваць на карысць Радзімы, аказваць яшчэ большую дапамогу фронту.

Затым слова для даклада было прадастаўлена сакратару РК КП(б)Б т.Кавалёву.

У спрэчках выступіла 8 камуністаў.

Партыйны сход прыняў разгорнутую пастанову, у якой намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па разгортванні палітмасавай і культурна-асветнай работы ў раёне.

Чырвоная звязда. 1944. 30 ліст.

ПЕРШАЯ РАЁННАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

18 і 19 лютага ў Косаве ў памяшканні гарадскога клуба адбылася першая раённая камсамольская канферэнцыя. На канферэнцыі прысутнічала 65 дэлегатаў з рашаючым голасам...

Канферэнцыя заслухала справаздачны даклад сакратара РК ЛКСМ Беларусі т.Савіна аб выніках работы камсамольскай арганізацыі раёна за справаздачны перыяд.

— ... У перыяд нямецкай акупацыі камсамольцы і перадавая несаюзная моладзь ішлі ў першых радах барацьбітоў супраць ненавісных акупантаў за чэсць і незалежнасць нашай радзімы, — сказаў т.Савін. — Звыш 1000 чалавек моладзі нашага раёна, сярод якіх было 400 камсамольцаў, з'яўляліся байцамі партызанскіх атрадаў, бязлітасна помсцілі ворагу за яго крывавыя здзекі над нашым народам. 33 падпольныя камсамольскія арганізацыі аказвалі партызанскім атрадам неацэнную дапамогу разведкай і зборам неабходных матэрыялаў аб праціўніку.

Гераічная Чырвоная Армія вызваліла наш раён з фашысцкага ярма. З першых жа дзён камсамольцы ўзяліся за аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі, мабілізуючы на гэту агульнанародную справу ўсю несаюзную моладзь. Камсамольцы і моладзь з'явіліся ініцыятарамі рамонту дарог і мастоў, аднаўлення школ і хат-чыталень...

У спрэчках па справаздачным дакладзе РК ЛКСМ Беларусі выступіла 19 дэлегатаў...

Закрытым тайным галасаваннем канферэнцыя выбрала пленум РК ЛКСМБ у складзе 23 членаў і 5 кандыдатаў і рэвізійную камісію ў складзе 5 чалавек.

* * *

На пленуме РК ЛКСМБ першым сакратаром РК ЛКСМБ абраны Савін Фёдар Іванавіч, другім — Коршунава Антаніна Ягораўна; загадчыкам учоту райкома — Шчаглова Клаўдзія Іосіфаўна.

Чырвоная звязда. 1945. 23 лютага.

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы.
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў вашай любові
да нашай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра вас у нас назаўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечнае яркае сонца над ёю!

АХВЯРЫ ВАЙНЫ

Партызаны, падпольшчыкі, удзельнікі антыфашысцкага руху, асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем'яў і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

Горад Івацэвічы*

У Айчынную вайну 1941 – 1945 гг. загінулі 362 чалавекі, з іх не вярнуліся з фронту 215 чалавек.

АБРАМОВІЧ Шымель, н. у 1885, расстраляны ў 1942 ва ўрочышчы Жвіроўня каля Івацэвіч.

АЙЗЕНБЕРГ, расстраляны ў 1942.

БАГУЦКІ Стэфан, н. у 1902, расстраляны немцамі ў 1943 у г. Косава за ўзрыў нямецкай сталовай у Івацэвічах.

БАСАНЗОН Фейга, н. у 1880.

БАСАНЗОН Фейда, н. у 1880.

БАСАНЗОН Хама.

ВАЙНШТЭЙН Абрам, н. у 1916.

ВАЛАЧКОВА Аляксандра.

ВАЛАЧКОВА Надзея, загінула 26 чэрвеня 1941 у Івацэвічах пры бамбёжцы.

ВАЛЫНСКАЯ Хава, н. у 1870.

ВАЛЫНСКІ Іцка, н. у 1875.

ВЕЙЦГЛАНДАР і яго жонка.

ВІШНЕЎСКІ Мечыслаў, расстраляны ў Косаве.

ВЫСОЦКІ, яго жонка і два сыны.

ВЯРСТАК Анатоль Іосіфавіч, н. у 1927, партызан, забіты немцамі 29 лютага 1944 каля Няхачава.

ВЯСЁЛЫ Закім, н. у 1876, расстраляны ў 1942 у Івацэвічах.

ГВАЗДОВІЧ Ванда, загінула пры бамбёжцы 26 чэрвеня 1941.

ГВАЗДОВІЧ Міхаіл, н. у 1905.

ГОЙШЫК Іван.

ГРЭШКАВІЧ Міхаіл, н. у 1905.

ЕСЯЛЕВІЧ Закім, н. у 1896.

ЕСЯЛЕВІЧ Ісак, н. у 1932.

ЕСЯЛЕВІЧ Рая, н. у 1936.

ЕСЯЛЕВІЧ Сара, н. у 1905.

ЗАКГЕЙМ і члены яго сям'і:

ЗАКГЕЙМ Земба, н. у 1901, жонка,

ЗАКГЕЙМ Абрам, н. у 1939, сын,

ЗАКГЕЙМ Ісак, н. у 1940, сын,

ЗАКГЕЙМ Рая, н. у 1932, дачка.

ЗАНІМ Абрам, н. у 1905.

ЗЕМБА Іван.

КАЛАДКЕВІЧ, расстраляны ў 1942 у г. Косава.

КАПЫЛЯНСКІ, яго жонка і дзіця.

КАРАЛІЦКІ Ф., н. у 1880.

КАСТКЕВІЧ Уладзіслаў, н. у 1902.

КІРЫЛЮК Яўген.

КРАСНАСТАЎСКІ Васіль, н. у 1905.

КУЛІНІЧ Васіль Іванавіч, расстраляны ў Калдычэўскім канцлагеры.

КУЛІШЭЎСКІ Міхаіл, н. у 1907.

КУНІК, расстраляны ў 1942 у Івацэвічах.

КУНОЎСКІ, яго жонка і дачка.

ЛЕФЛЕР Лія Самуілаўна, н. у 1909.

ЛЕФЛЕР Навум Самуілавіч, н. у 1917.

ЛЕФЛЕР Песія Ісакаўна.

ЛЕФЛЕР Этэль Самуілаўна, н. у 1912.

ЛЕФЛЕР Навум Самуілавіч, н. у 1917.

ЛІЎШЫЦ.

МАТЭЦКІ і яго жонка.

*Асноўная колькасць ахвяр г. Івацэвічы — жыхары яўрэйскай нацыянальнасці, расстраляныя фашыстамі ў 1942 г. ва ўрочышчы Жвіроўня.

МАХАРЭНСКІ Шымель, н. у 1902.
МЕДРЫН Ярыша, н. у 1905.
МЕЛЬЯНЧУК Мацвей Якаўлевіч, н. у 1892, расстраляны 14 лютага 1943 на Шыбельнай Гары.
МІЛЮКОЎСКІ Іван, н. у 1910.
МІЛЮШЭЎСКІ.
МОРДАШ Гершка, н. у 1905.
МУЛЬТАН Марыя Сцяпанаўна, н. у 1910.
МУЛЬТАН Надзея Сцяпанаўна.
МУЛЬТАН Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1905, партызан атрада імя Чарткова, загінуў у баі з карнікамі 11 кастрычніка 1943.
МУЛЬТАН Агаф'я Андрэеўна.
МУЛЬТАН Алена, н. у 1926.
МУЛЬТАН Васіль Сцяпанавіч,
МУЛЬТАН Вера Сцяпанаўна — члены партызанскай сям'і, расстраляныя фашыстамі ў 1943.
МУЛЬТАН Уладзімір Сцяпанавіч.
НОВІК, яго жонка і дзве дачкі.
НЫСЕЛЬ Хая, яе муж, дзве дачкі і сын.
ОСПІШЧАЎ Дзіма, загінуў пры бамбёжцы 26 чэрвеня 1941.
РАГОТНЕР Абрам, н. у 1880.
РАГОТНЕР Сара, н. у 1890 і яе сын.
РАМАНЮК Іван, н. у 1876.
РАХАВЕЦКІ Уладзімір, расстраляны ў 1943.
РОТФАРТ, яго жонка і сын.
РУЖАНСКІ.
САРЫНСКІ Абрам, н. у 1900.
СЛАВІНСКАЯ Галя, загінула пры бамбёжцы 26 чэрвеня 1941.
СЛОНІМСКІ Шлёма, н. у 1920.
УСТЫМАЎ Ісак, н. у 1895.
УЧШТЭЙН Ісак, н. у 1885.
УЧШТЭЙН Мара, н. у 1887.
ФАЕРМАН Ісак, н. у 1895.
ФАЕРШТЭЙН, н. у 1905.
ФАЕРШТЭЙН, н. у 1936.
ФАЕРШТЭЙН Шамель, н. у 1905.
ФАЙНБЕРГ Абрам, н. у 1895.
ФЯДЗЮК Іван, н. у 1909.
ХАРЫТАНЮК Аляксандр Андрэевіч, арыштаваны 6 студзеня 1943 за ўзрыў нямецкай сталовай у Івацэвічах. Загінуў у Калдычэўскім лагеры.
ЦІТКО Кацярына, забіта немцамі ў Івацэвічах.
ЦУКЕР Анатоль, н. у 1905, урач, забіты ў Івацэвічах.
ЧАРКОЎСКІ Іосіф, н. у 1880.
ЧМЫР Іван, расстраляны ў 1943 за ўзрыў нямецкай сталовай ў Івацэвічах.
ШАПІРА, н. у 1890.
ШАПІРА Ілья.
ШВАРЦ Франц, н. у 1892.
ШМЯЛЁЎ Ціхан Васілевіч, загінуў у Калдычэўскім лагеры ў 1943.
ШЫМАНСКІ Томаш,
ШЫМАНСКАЯ Іра — усе расстраляны немцамі ў 1943 у Івацэвічах;
ШЫМАНСКАЯ Софія.
ШЫМАНСКІ Іван, н. у 1928.
ШЫМАНСКІ Тадэвуш.
ШЫМАНСКІ Фэнік.
ШЫМАНСКІ Юрый.
ШЫМАНСКАЯ Кацярына, н. у 1940.
ШЫМАНСКАЯ Марыя, н. у 1900.
ШЫМАНСКІ Віктар, н. у 1935.
ШЫМАНСКІ Іван, н. у 1928.
ШЫМАНСКІ Сцяпан, н. у 1926.
ШЫМАНСКІ Сямён, н. у 1895.
ШЫМАНСКІ Уладзік, н. у 1926.
ЮЗВІС Уладзіслаў, н. у 1902.
ЯБЛОНСКІ Іван, н. у 1895, забіты фашыстамі ў Косаве.
ЯНОВІЧ Рыўка, н. у 1900.
ЯНОВІЧ Шлёма, н. у 1890.

ГОРАД КОСАВА

АСІНСКАЯ і яе сям'я.
БУРАЧКОЎСКАЯ Юзэфа.
БУРАЧКОЎСКАЯ Юзэфа Іосіфаўна, н. у 1940.
БУРАЧКОЎСКАЯ Эмілія Іосіфаўна, н. у 1930.
БУРАЧКОЎСКАЯ Яніна Іосіфаўна, н. у 1927.
БУРАЧКОЎСКІ Іосіф.
БЯГАНСКІ Іосіф.
ВАЛЮСІНСКАЯ і яе сям'я.
ВІШНЕЎСКАЯ Антаніна Аляксандраўна.
ЖЫЛІНСКІ Іосіф, н. у 1900.
МЕЛЯШЧУК Данута (дзіця).
МЕЛЯШЧУК Станіслаў, н. у 1915.
ПАЛЯШЧУК Іван Іванавіч, н. у 1898.
ПАЛЯШЧУК Казімір Іванавіч, н. у 1930.
ПАЛЯШЧУК Люцыян Іванавіч, н. у 1928.
ПАЛЯШЧУК Софія, н. у 1895.
ПТАХ Баляслаў, н. у 1905.
ПТАХ Яніна, н. у 1910.
РОЙША Альбін, н. у 1900, ксёндз.
РУСЕЦКАЯ Зінаіда Яфімаўна, н. у 1940.
РУСЕЦКАЯ Ніна Яфімаўна, н. у 1933.
РУСЕЦКАЯ Юлія Кузьмінічна, н. у 1908.
РУСЕЦКІ Канстанцін Яфімавіч, н. у 1935.
РУСЕЦКІ Яфім Ільіч, н. у 1897.
САБАЛЕЎСКІ Аляксандр, н. у 1900.
СТРАЖЭЦКАЯ Марыя.
ТЫЧЫНСКІ Тадэвуш.
ЦЭМЕНЯ Алена Фамінічна, н. у 1908.
ЦЭМЕНЯ Павел, н. у 1910.
ЦЭМЕНЯ Фама, н. у 1880.
ЦЭМЕНЯ Фёдар Фаміч, н. у 1900.

АБРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБРОВА

ЗАГІНУЛІ Ў ПАРТЫЗАНАХ

КАЛТУНЕВІЧ Іван Якаўлевіч.
ЛЮШКЕВІЧ Пётр Міхайлавіч.

МІГНО Мікалай Міхайлавіч.
ЦЫМБАЛІСТ Мікалай Аляксандравіч.

РАССТРАЛЯНЫ ФАШЫСТАМІ
ГАЛІНСКІ Васіль Мікалаевіч.
ГРЭЧНЫ Іван Мікітавіч.
КРЫШТОПЧЫК Іван Аляксандравіч.
КРЫШТОПЧЫК Якаў Міхайлавіч.
ЛУЧЫЦ Максім Іванавіч.
ЛЮШКЕВІЧ Дзмітрый Ціханавіч.
ТЫСЕВІЧ Емяльян Васілевіч.
ШЫНДЗІЧ Міхаіл Савіч.

АМЯЛЬНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБРАМЧУК Ілья Іванавіч, н. у 1903 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

АБРАМЧУК Рыгор Ціханавіч, н. у 1902 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

БАЛАКІР Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1904 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

ЕФІМОВІЧ Аляксандр Радзівонавіч, н. у 1903 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

ІЛЬЧУК Васілій Кузьміч, н. у 1925 у в. Коланск, закатаваны ў в. Азарычы Даманавіцкага раёна ў 1944.

КАМЯК Максім Гаўрылавіч, н. у 1913 у в. Коланск, расстраляны ў 1941.

КАРАЛЕВІЧ Фральян Адамавіч, н. у 1909 у в. Каранная, расстраляны каля г. п. Целяханы ў 1943.

КУДРАВЕЦ Ігнат Васілевіч, н. у 1918 у в. Коланск, расстраляны ў 1941.

КУРАТНІК Васіль Міхайлавіч, н. у 1912 у в. Амяльная, расстраляны ў 1941.

КУРАТНІК Іван Васілевіч, н. у 1901 у в. Коланск, расстраляны ў 1941.

МАРЦІНКОЎСКІ Міхаіл, н. у 1908 у в. Каранная, расстраляны ў г. п. Целяханы ў 1943.

МАСЬКО Якаў Іосіфавіч, н. у 1917 у в. Коланск, расстраляны ў 1941.

РОІК Кірыл Міхайлавіч, н. у 1900 у в. Амяльная, расстраляны ў 1941.

САБКО Рыгор Дзям'янавіч, н. у 1895 у в. Гошча, расстраляны ў г. п. Целяханы ў 1943.

САБКО Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1914 у в. Гошча, расстраляны каля в. Выганашчы ў 1944.

САБКО Якаў Акімавіч, н. у 1900 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

ТАРЛЕЦКІ Адам Сямёнавіч, н. у в. Коланск, расстраляны ў 1944.

ТАРЛЕЦКАЯ Марыя Рыгораўна, н. у 1902 у в. Коланск, расстраляна ў 1944.

ТАТАРЧУК Рыгор Майсеевіч, н. у 1912 у в. Коланск, расстраляны ў 1941.

ЦІВІНСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1909 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

ЦІВІНСКІ Яфім Іванавіч, н. у 1890 у в. Глінная, расстраляны ў 1944.

ШАЎЧУК Павел Іванавіч, н. у 1904 у в. Глінная, расстраляны ў 1941.

БЫЦЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЫЦЕНЬ

АСІПЧЫК Іван Іванавіч, н. у 1925, сувязны партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Русакова Слонімскага раёна.

АСІПЧЫК Мікалай Якаўлевіч, н. у 1881, расстраляны ў студзені 1943.

ВАЎЧОК Гаўрыла Гаўрылавіч, н. у 1921, расстраляны ў в. Быцень.

ВАЎЧОК Уладзімір Гаўрылавіч, н. у 1924, расстраляны ў в. Быцень.

ГАЛАШЭЎСКІ Васіль Паўлавіч, н. у 1905, загінуў ў 1942.

ГРЫНЧЫК Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1908, расстраляны ў в. Быцень.

ЕРМАЧОК Мікалай Іванавіч, н. у 1913, расстраляны ў в. Быцень.

ЕРМАЧОК Мікалай Іосіфавіч, н. у 1905, расстраляны ў верасні 1942.

ЕРМАЧОК Мікалай Сямёнавіч, н. у 1926, расстраляны ў в. Быцень у 1942.

КУЗЬМІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1900, партызан, загінуў у 1944.

КУЗЬМІЧ Мікалай Васілевіч, н. у 1927, расстраляны ў в. Быцень.

ЛУКАШЫК Мікалай Іосіфавіч, н. у 1932, расстраляны ў в. Быцень.

МАКАРЭВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. у 1908, расстраляны ў 1943.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1894, расстраляны ў 1942.

МАКАРЭВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1898, расстраляны ў 1942.

МАКАРЭВІЧ Фама Сільвестравіч, н. у 1900, расстраляны ў 1942.

МАСЛОЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1923, расстраляны ў в. Быцень.

МАСЛОЎСКІ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1905, расстраляны ў в. Быцень.

МАСЛОЎСКІ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1925, расстраляны ў в. Быцень.

МАСЛОЎСКІ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1911, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Воўчыя Норы.

ПАЦЭВІЧ Леанід Мікалаевіч, н. у 1928, падарваўся на міне.

САВІЦКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1926, падарваўся на міне.

САКУНОЎ Васіль Нічыпаравіч, н. у 1914, партызан, загінуў у 1944.

САЛЯНІК Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1918, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Русакова Слонімскага раёна.

СТРАКОВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1911, партызан, загінуў у 1941.

ФУРСА Пётр Фёдаравіч, н. у 1932, падарваўся на міне.

ШКЛЯРЫК Віктар Мікалаевіч, н. у 1927, падарваўся на міне.

ВЁСКА ВУГЛЫ

ГІЗЮК Іван Васілевіч, н. у 1915, загінуў у 1943.

ГІЗЮК Раман Іванавіч, н. у 1900, партызан, загінуў у 1943.

СТРАЛЬЧЭНЯ Рыгор Юр'евіч, н. у 1907, партызан, загінуў у 1943, пахаваны каля в. Міронім.

ТУРЦЭВІЧ Андрэй Андрэевіч, н. у 1923, партызан, загінуў у 1943, пахаваны каля в. Міронім.

ТУРЦЭВІЧ Уладзімір Ануфрыевіч, н. у 1919, партызан, загінуў у 1943.

ВЁСКА ДОЎГАЯ

ГРАБУН Васіль Фёдаравіч, н. у 1921, загінуў у 1943.

ЕРМАЧОК Васіль Міронавіч, н. у 1911, партызан, загінуў у снежні 1941.

КАВАЛЬЧУК Міхаіл Паўлавіч, падарваўся на міне.

НАЛІЎКА Галіна Міронаўна, расстраляна.

СТРАЛЬЧЭНЯ Аляксандр Канстанцінавіч, н. у 1923, партызан, загінуў у 1943.

СТРАЛЬЧЭНЯ Васіль Канстанцінавіч, н. у 1927, партызан, загінуў у 1944.

СТУДЗЯНІЧНІК Іван Іванавіч, н. у 1915, сувязны, партызан, загінуў у 1941.

ШАВЕЛЬ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1923, партызан, загінуў у 1943.

ЯТЧЭНЯ Васіль Пракопавіч, н. у 1922, партызан, загінуў у 1943.

ЯТЧЭНЯ Уладзімір Пракопавіч, н. у 1917, партызан, загінуў у 1944.

ВЁСКА ЗАПОЛЛЕ

БАНАСЕВІЧ Іван Міхайлавіч, н. у 1923, загінуў у 1944.

КУЗЬМІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1904, загінуў у 1944.

НЯДЗЕЛЬЧЫК Васіль Адамавіч, н. у 1927, загінуў у 1944.

НЯДЗЕЛЬЧЫК Васіль Васілевіч, н. у 1905, расстраляны.

НЯДЗЕЛЬЧЫК Павел Мікалаевіч, н. у 1916, расстраляны.

САВІЦКІ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1927, расстраляны.

СЯЛЕДЧЫК Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1907, загінуў у 1941.

ТАРАСЮК Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1910, загінуў у 1942.

ВЁСКА ЗАРЭЧЧА

ГАЛАШЭЎСКІ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1912, загінуў у 1943.

КАЛІНОЎСКІ Аляксандр Васілевіч, н. у 1905, расстраляны.

А. К. Стральчэня.

М. Ф. Шавель.

КАМАР Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1905, загінуў у 1943.

ЛАМЕЙКА Іван Антонавіч, н. у 1896, расстраляны.

ЛАМЕЙКА Іван Міхайлавіч, н. у 1905, расстраляны.

ЛАМЕЙКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1924, расстраляны.

МАСАЛЬСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1909, расстраляны.

НОВІК Фёдар Іванавіч, н. у 1915, расстраляны ў 1943.

САЛОНКА Анастасія Іванаўна, н. у 1938, расстраляна.

САЛОНКА Валянціна Іванаўна, н. у 1940, расстраляна.

САЛОНКА Іван Яфімавіч, н. у 1913, расстраляны ў 1943.

САЛОНКА Лідзія Іванаўна, н. у 1942, расстраляна.

САЛОНКА Мікалай Іванавіч, н. у 1936, расстраляны.

САЛОНКА Надзея Іванаўна, н. у 1934, расстраляна.

САЛОНКА Соф'я Іосіфаўна, н. у 1914, расстраляна ў 1943.

СЕРАДА Ганна Іванаўна, н. у 1938, расстраляна.

СЕРАДА Іван Іванавіч, н. у 1933, расстраляны ў 1943.

СЕРАДА Іван Паўлавіч, н. у 1894, расстраляны ў 1943.

СЕРАДА Праскоўя Мікалаеўна, н. у 1898, расстраляна ў 1943.

СКІНДЗЕР Іван Аляксандравіч, н. у 1900, расстраляны.

ВЁСКА МАНЦЮТЫ

ГОРБАЧ Павел Піліпавіч, н. у 1915, расстраляны ў 1944.

КУЗЬМІЧ Антон Аляксеевіч, н. у 1910.

КУЗЬМІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1923.

Т. М. Найдзёнік.

КУЗЬМІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1923, расстраляны ў 1941.

КУЗЬМІЧ Фёдар Мікалаевіч, н. у 1928, сувязны партызан, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Воўчыя Норы.

ЛУНЬ Васіль Мікалаевіч, расстраляны ў в. Быцень.

САЛОНКА Сцяпан Раманавіч, н. у 1905, партызан, загінуў у 1942.

СТРАКОВІЧ Аркадзь Васілевіч, н. у 1920, загінуў у 1941.

СТРАКОВІЧ Вікенцій Мікалаевіч, н. у 1907, загінуў у 1943.

СТРАКОВІЧ Віктар Мікалаевіч, н. у 1902, загінуў у 1943.

СТРАКОВІЧ Віктар Міхайлавіч, н. у 1907, расстраляны.

СТРАКОВІЧ Іосіф Паўлавіч, н. у 1912, расстраляны.

СТРАКОВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. у 1905, загінуў у 1941.

СТРАКОВІЧ Максім Іванавіч, н. у 1906, расстраляны ў 1944.

СТРАКОВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1926, расстраляны.

СТРАКОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1894, расстраляны ў 1944.

СТРАКОВІЧ Ульяна Іосіфаўна, н. у 1909, расстраляна ў 1943.

СТРАКОВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1911, партызан, загінуў.

СТРАКОВІЧ Фёкла Паўлаўна, н. у 1912, расстраляна.

ВЁСКА МІРОНІМ

ГРАБУН Васіль Аляксандравіч, н. у 1913, загінуў у в. Прусаўшчына Слонімскага р-на ў 1943.

ГРАБУН Васіль Ігнатавіч, н. у 1927.

ГРАБУН Вольга Пятроўна, н. у 1912.

ГРАБУН Галіна Іванаўна, н. у 1926.

ГРАБУН Іван Пятровіч, н. у 1900.

ГРАБУН Кацярына Паўлаўна, н. у 1935.

ГРАБУН Любоў Іванаўна, н. у 1930.

ГРАБУН Марыя Іванаўна, н. у 1924.

ГРАБУН Павел Васілевіч, н. у 1912.

ГРАБУН Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1924, загінуў у в. Прусаўшчына Слонімскага р-на ў 1943.

НАЙДЗЁНІК Віктар Тарасавіч, н. у 1925.

НАЙДЗЁНІК Софія Максімаўна, н. у 1878.

НАЙДЗЁНІК Тарас Міхайлавіч, н. у 1880.

СЯЛЕДЧЫК Алена Васілеўна, расстраляна.

СЯЛЕДЧЫК Мікалай Дзмітрыевіч, н. у 1900.

ЧАБАТАР Марыя Іванаўна, н. у 1922, расстраляна.

ЧАБАТАР Соф'я Вікенцьеўна, н. у 1915, расстраляна.

ВЁСКА ПРЫБАРАВА

ГРЫНЧЫК Васіль Іванавіч, н. у 1902, партызан, расстраляны фашыстамі.

ГРЫНЧЫК Соф'я Васілеўна, н. у 1912, расстраляна.

ЛУКАШЫК Антон Фёдаравіч, н. у 1910, партызан, загінуў у 1943.

ВЁСКА РУДНЯ

ЛАМЕЙКА Марыя Сцяпанаўна, н. у 1910, расстраляна.

ЛАМЕЙКА Рыгор Сямёнавіч, н. у 1912, расстраляны.

ШАРЭЙКА Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1886, расстраляны ў в. Ямічна.

Жыхары мястэчка Быцень яўрэйскай нацыянальнасці, якія былі расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі

АБРАМОВІЧ Лея, н. у 1880.

АБРАМОЎСКАЯ Дзіна, н. у 1898.

АБРАМОЎСКАЯ Ента, н. у 1914.

АБРАМОЎСКАЯ Фрэйда, н. у 1880.

АБРАМОЎСКІ Шая, н. у 1941.

АБРАМОЎСКІ Шлёма, н. у 1887.

АБУЛЬНАГІЙ Міня, н. у 1900.

АБУЛЯНСКАЯ Гінда, н. у 1930.

АБУЛЯНСКАЯ Крэйна, н. у 1914.

АБУЛЯНСКАЯ Ленка, н. у 1880.

АБУЛЯНСКАЯ Рыўка, н. у 1932.

АБУЛЯНСКАЯ Сара, н. у 1895.

АБУЛЯНСКІ Бэрка, н. у 1880.

АБУЛЯНСКІ Ісак, н. у 1929.

АБУЛЯНСКІ Нейх, н. у 1895.

АБУЛЯНСКІ Хаім, н. у 1920.

АБШТЭЙН Брайна, н. у 1888.

АБШТЭЙН Гірша, н. у 1911.

АБШТЭЙН Моўша, н. у 1913.
АБШТЭЙН Юдэль, н. у 1915.
АЙЗЕНБЕРГ Абрам, н. у 1929.
АЙЗЕНБЕРГ Хаім, н. у 1885.
АЙЗЕНБЕРГ Хая, н. у 1890.
АЙНШТЭЙН Абрам, н. у 1920.
АЙНШТЭЙН Гірш, н. у 1928.
АЙНШТЭЙН Яўсей, н. у 1920.
АЙНШТЭЙН Зельда, н. у 1922.
АЙНШТЭЙН Іосіф, н. у 1928.
АЙНШТЭЙН Іоха, н. у 1895.
АЙНШТЭЙН Лея, н. у 1932.
АЙНШТЭЙН Моўша, н. у 1891.
АЙНШТЭЙН Сіма, н. у 1892.
АЙНШТЭЙН Хая, н. у 1870.
АЛЕЙНІК Рыўка, н. у 1910.
АЛЕЙНІК Гэля, н. у 1936.
АЛЬТМАН Венцыян, н. у 1898.
АЛЬТМАН Бася, н. у 1898.
АРБУЗ Абрам, н. у 1910.
АРБУЗ Моўша, н. у 1938.
АРБУЗ Хана, н. у 1912.
АСОЎСКАЯ Мірыям, н. у 1897.
АСОЎСКАЯ Хая Эйдэм, н. у. 1902.
АСОЎСКІ Арон, н. у 1900.
АСОЎСКІ Гірш, н. у 1921.
АСОЎСКІ Ізраіль, н. у 1932.
АСОЎСКІ Ісак, н. у 1925.
АСОЎСКІ Моўша, н. у 1928.
АСОЎСКІ Перац, н. у 1920.
АСОЎСКІ Рахіль, н. у 1930.
АСТРОЎСКАЯ Мнуха, н. у 1895.
АСТРОЎСКАЯ Сара, н. у 1893.
АСТРОЎСКАЯ Хая, н. у 1865.
БАБРОВІЦКІ Ізраіль, н. у 1865.
БАРАН Абрам, н. у 1900.
БАРАН Малка Ліба, н. у 1900.
БЕЙЗЕР Абрам, н. у 1928.
БЕЙЗЕР Ісак, н. у 1932.
БЕЙЗЕР Ліба, н. у 1900.
БЕЙЗЕР Сара, н. у 1930.
БЕРАЗНЯК Ента, н. у 1908.
БЕРАЗНЯК Лейба, н. у 1900.
БЕРАЗНЯК Мема, н. у 1900.
БЕРАЗНЯК Раіна, н. у 1935.
БЕРГАЗІН Ітка, н. у 1917.
БЕРГАЗІН Іцка, н. у 1867.
БЕРГАЗІН Хана, н. у 1870.
БЕРАНШТЭЙН Абрам, н. у 1880.
БЕРАНШТЭЙН Мірыям, н. у 1880.
БЕРАНШТЭЙН Хая, н. у 1925.
БЕРАНШТЭЙН Ціпа, н. у 1875.
БЕРАНШТЭЙН Юдэс, н. у 1900.
БЕРГАЗІН Іцка, н. у 1867.
БЕРГАЗІН Хана, н. у 1870.
БЕРГАЗІН Ітка, н. у 1917.
БЕРГЕР Гінда, н. у 1905.
БЕРГЕР Іцка, н. у 1870.
БЕРГЕР Кальма, н. у 1929.
БЕРГЕР Мордуў, н. у 1903.
БЕРГЕР Нохім, н. у 1905.
БЕРГЕР Рыўка, н. у 1927.
БЕРГЕР Сара, н. у 1927.
БЕРГЕР Цыўя, н. у 1934.
БЕРГЕР Этлер, н. у 1905.
БЕРГЕР Якаў, н. у 1900.
БЕРКНЕР Лея, н. у 1928.
БЕРКНЕР Рыўка, н. у 1925.
БЕРКНЕР Хана, н. у 1930.
БЕРКНЕР Юдзіс, н. у 1900.
БЕРНШТЭЙН Зэйля, н. у 1890.
БРАНШТЭЙН Кейля, н. у 1907.
БРАНШТЭЙН Кейля, н. у 1937.
БРАНШТЭЙН Моўша, н. у 1934.
БРАНШТЭЙН Самуіл, н. у 1914.
БРАНШТЭЙН Якаў, н. у 1903.
БРОДЗЕРЗАН Лейзер, н. у 1935.
БРОДЗЕРЗАН Наталя, н. у 1880.
БРОДЗЕРЗАН Нахама, н. у 1870.
БРОДЗЕРЗАН Фаня, н. у 1900.
БРЭЖБЕРГ Цука, н. у 1910.
БРЭСКІН Давід, н. у 1900.
БРЭСКІН Лёва, н. у 1933.
БРЭСКІНА Хінка, н. у 1888.
БРЭСКІНА Шэйна, н. у 1905.
БРЭСКІНА Этля, н. у 1938.
БУЛЯНСКАЯ Ліба, н. у 1913.
БУЛЯНСКІ Міхаль, н. у 1877.
БУНЯВІЦКАЯ Гінда, н. у 1890.
БУНЯВІЦКАЯ Голда, н. у 1920.
БУНЯВІЦКАЯ Цыта, н. у 1918.
БУНЯВІЦКІ Айзік, н. у 1875.
БУНЯВІЦКІ Ізраіль, н. у 1916.
БУШАЛЕВІЧ Мірыям, н. у 1882.
БУШАЛЕВІЧ Шыма, н. у 1870.
БЫТЭНСКАЯ Ф-а, н. у 1890.
БЫТЭНСКАЯ Фейга Л., н. у 1895.
БЫТЭНСКАЯ Хана, н. у 1927.
БЫТЭНСКАЯ Хейна, н. у 1905.
БЫТЭНСКІ Гітэль, н. у 1925.
БЫТЭНСКІ Глейзер, н. у 1926.
БЫТЭНСКІ Мордух, н. у 1888.
БЫТЭНСКІ Шая, н. у 1903.
БЯРКОВІЧ Любоў, н. у 1990.
БЯРКОВІЧ Моўша, н. у 1900.
БЯРКОВІЧ Фаня, н. у 1930.
БЯРКОВІЧ Хана, н. у 1925.
ВАЙЕР Іосіф, н. у 1925.
ВАЙЕР Міра, н. у 1930.
ВАЙЕР Хаім, н. у 1895.
ВАЙЕР Хана, н. у 1897.
ВАЙЕР Юзэфа, н. у 1934.
ВАЙНШТЭЙН Арон, н. у 1916.
ВАЙНШТЭЙН Ісак, н. у 1870.
ВАЙНШТЭЙН Муля, н. у 1872.
ВАЙНШТЭЙН Рахіль, н. у 1918.

ВАЙНШТЭЙН Калман, н. у 1865.
ВАЙХЕНДЭР Ліпек, н. у 1918.
ВАШЭНБЕРГ Бенцыян, н. у 1918.
ВАШЭНБЕРГ Хала, н. у 1890.
ВАШЭНБЕРГ Шая, н. у 1885.
ВІЛЕЙЧЫК Лезер, н. у 1885.
ВІЛЕЙЧЫК Міна, н. у 1885.
ВІЛЕЙЧЫК Сара, н. у 1925.
ВІЛЕНСКАЯ Гена, н. у 1916.
ВІЛЕНСКАЯ Герна, н. у 1882.
ВІЛЕНСКАЯ Рыўка, н. у 1904.
ВІЛЕНСКАЯ Сара, н. у 1900.
ВІЛЕНСКАЯ Хая, н. у 1912.
ВІЛЕНСКІ Абрам, н. у 1890.
ВІЛЕНСКІ Бэрка, н. у 1918.
ВІЛЕНСКІ Іцка, н. у 1906.
ВІЛЕНСКІ Моўша Хаім, н. у 1870.
ЫШНІЦКАЯ Найма, н. у 1885.
ВЛАНСКІ Моўша, н. у 1865.
ВОЛГАНЕК Баша, н. у 1925.
ВОЛГАНЕК Велевел, н. у 1925.
ВОЛГАНЕК Лілія, н. у 1940.
ВОЛГАНЕК Міша, н. у 1908.
ВОЛГАНЕК Сара, н. у 1880.
ВОЛГАНЕК Тоша, н. у 1910.
ВОДНІК Абрам, н. у 1905.
ВОДНІК Войцех, н. у 1880.
ВОДНІК Нафталій, н. у 1900.
ВОДНІК Соня, н. у 1915.
ВОДНІК Хаім, н. у 1895, урач.
ВОЛЯ Соша, н. у 1910.
ВЯНГРОЎСКАЯ Асла, н. у 1929.
ВЯНГРОЎСКАЯ Двейра, н. у 1897.
ВЯНГРОЎСКАЯ Сара, н. у 1930.
ВЯНГРОЎСКАЯ Фейга, н. у 1903.
ВЯНГРОЎСКАЯ Хана, н. у 1928.
ВЯНГРОЎСКІ Моўша, н. у 1927.
ВЯНГРОЎСКІ Моця, н. у 1925.
ВЯНГРОЎСКІ Нохівен, н. у 1901.
ВЯНГРОЎСКІ Рахіль, н. у 1877.
ВЯНГРОЎСКІ Эстэр, н. у 1903.
ВЯСОЛА Рахіля, н. у 1890.
ГАЛЬШДЭЙН Пеша, н. у 1897.
ГАЛЬТЭР Галя, н. у 1927.
ГАЛЬТЭР Завер, н. у 1890.
ГАЛЬТЭР Лейба, н. у 1939.
ГАЛЬТЭР Моўша, н. у 1939.
ГАЛЬТЭР Хаім, н. у 1900.
ГАЛЬТЭР Хая, н. у 1905.
ГАЛЬТЭР Шлёма, н. у 1932.
ГАЛЬТЭР Эстра, н. у 1902.
ГАЛЬТЭР Юзік, н. у 1929.
ГАРЭРШТЭЙН Гінда, н. у 1895.
ГАРЭРШТЭЙН Двейра, н. у 1905.
ГАРЭРШТЭЙН Іосіф, н. у 1903.
ГАРЭРШТЭЙН Матус, н. у 1881.
ГАРЭРШТЭЙН Мінах, н. у 1912.
ГАРЭРШТЭЙН Моўша, н. у 1934.
ГЕЛЬДБАЎМ Леон, н. у 1895.
ГЕЛЬДБАЎМ Хая, н. у 1912.
ГЕМЯЛІНСКАЯ, н. у 1907.
ГЕМЯЛІНСКАЯ, н. у 1936.
ГЕМЯЛІНСКІ, н. у 1900.
ГЕРНІХОЎСКАЯ Хая, н. у 1870.
ГЕРНІХОЎСКІ Хаім, н. у 1908.
ГІНЗБУРГ Лейба, н. у 1905.
ГІНЗБУРГ Этля, н. у 1905.
ГІМЕЛЬФАРБ Арон, н. у 1883.
ГІМЕЛЬФАРБ Іцка, н. у 1886.
ГЛАЗЕР Арон, н. у 1923.
ГЛАЗЕР Завель, н. у 1921.
ГЛАЗЕР Зелік, н. у 1906.
ГЛАЗЕР Мейра Хаіма, н. у 1868.
ГЛАЗЕР Мішка, н. у 1910.
ГЛАЗЕР Пешка, н. у 1910.
ГЛАЗЕР Тамара, н. у 1905.
ГЛАЗЕР Таня, н. у 1936.
ГЛАЗЕР Фейга, н. у 1930.
ГЛАЗЕР Хаім, н. у 1908.
ГЛАЗЕР Шыфра, н. у 1910.
ГЛАЗЕР Эля, н. у 1890.
ГЛАЗЕР Эля, н. у 1936.
ГЛАЗЕР Эстэр, н. у 1928.
ГЛАЗЕР Якаў, н. у 1928.
ГОЛЬДЗІН Геша, н. у 1930.
ГОЛЬДЗІН Гітэль, н. у 1905.
ГОЛЬДЗІН Давід, н. у 1897.
ГОЛЬДЗІН Самуіл, н. у 1865.
ГОЛЬДЗІН Хая, н. у 1932.
ГОЛЬДФАЙН Давід, н. у 1900.
ГОЛЬМАН Іоха, н. у 1910.
ГОЛЬМАН Фаня, н. у 1941.
ГОРДАН Голда, н. у 1910.
ГОРДАН Лілія, н. у 1939.
ГРЫНФЕЛЬД Хаім, н. у 1904.
ГЯРЧЭЎСКІ Давід, н. у 1910.
ДАБЖЫНСКІ Юзаф, н. у 1900.
ДАЛЬМАН Давід, н. у 1918.
ДАЛЬМАН Соня, н. у 1910.
ДАЛЬМАН Хаім, н. у 1942, на ўтрыманні.
ДАРЭЎСКАЯ Рахіль, н. у 1885.
ДАРЭЎСКІ Велевель, н. у 1925.
ДАРЭЎСКІ Самсон, н. у 1885.
ДАРЭЧЫНСКАЯ Брэйна, н. у 1922.
ДАРЭЧЫНСКАЯ Лея, н. у 1890.
ДАРЭЧЫНСКІ Мішка, н. у 1925.
ДАРЭЧЫНСКІ Юдэль, н. у 1924.
ДАРЭЧЫНСКІ Хаім, н. у 1885.
ДАЎЭР, н. у 1887.
ДАЎЭР, н. у 1910.
ДАЎЭР, н. у 1912.
ДАЎЭР, н. у 1914.
ДАЎЭР, н. у 1916.
ДЗЕРАЧЫНСКАЯ Рыўка, н. у 1942.
ДЗЕРАЧЫНСКАЯ Сара, н. у 1916.
ДЗЕРАЧЫНСКАЯ Фрэйда, н. у 1880.

ДЗІДКОЎСКАЯ Куня, н. у 1912.
ДЗІДКОЎСКАЯ Ліпа, н. у 1910.
ДЗІДКОЎСКАЯ Сара, н. у 1938.
ДЗІДКОЎСКАЯ Цыра, н. у 1890.
ДЗІДКОЎСКІ Эля, н. у 1867.
ДЗІДКОЎСКІ Юдэс, н. у 1897.
ДЗІДКОЎСКІ Янкель, н. у 1913.
ДЗІСНЕЎСКІ Абрам, н. у 1870.
ДЗІТКОЎСКАЯ Дэйна, н. у 1888.
ДЗІТКОЎСКАЯ Лаша, н. у 1923.
ДЗІТКОЎСКАЯ Ліба, н. у 1895.
ДЗІТКОЎСКАЯ Мера, н. у 1932.
ДЗІТКОЎСКАЯ Рыва, н. у 1930.
ДЗІТКОЎСКАЯ Сара, н. у 1925.
ДЗІТКОЎСКАЯ Сара Пер., н. у 1910.
ДЗІТКОЎСКАЯ Сара Хая, н. у 1888.
ДЗІТКОЎСКАЯ Хана, н. у 1890.
ДЗІТКОЎСКАЯ Хая, н. у 1928.
ДЗІТКОЎСКАЯ Шая, н. у 1928, навучэнка.
ДЗІТКОЎСКІ Абрам, н. у 1910.
ДЗІТКОЎСКІ Бома, н. у 1920.
ДЗІТКОЎСКІ Дзіма, н. у 1910.
ДЗІТКОЎСКІ Іцка, н. у 1876.
ДЗІТКОЎСКІ Моўша, н. у 1885.
ДЗІТКОЎСКІ Моўша, н. у 1932.
ДЗІТКОЎСКІ Самуіл, н. у 1928.
ДЗІТКОЎСКІ Шлёма, н. у 1890.
ДОБЕС Бася, н. у 1912.
ДОБЕС Давід, н. у 1910.
ДОБЕС Хава, н. у 1937.
ДРАЖНЕР Гімель, н. у 1925.
ДРАЖНЕР Гімель, н. у 1932.
ДРАЖНЕР Іцка, н. у 1892.
ДРАЖНЕР Рахіль, н. у 1895.
ДРАЖНЕР Цывель, н. у 1927.
ДРАЖНЕР Этлі, н. у 1929.
ДУКСІН Давід, н. у 1938.
ДУКСІН Хаім, н. у 1942.
ЕСЯЛЕВІЧ Лазар, н. у 1900.
ЕСЯЛЕВІЧ Рыўка, н. у 1936.
ЕСЯЛЕВІЧ Этля, н. у 1906.
ЖУХАВІЦКАЯ Альта, н. у 1870.
ЖУХАВІЦКАЯ Віхна, н. у 1910.
ЖУХАВІЦКАЯ Герца, н. у 1905.
ЖУХАВІЦКАЯ Гіця, н. у 1934.
ЖУХАВІЦКАЯ Пайка, н. у 1930.
ЖУХАВІЦКАЯ Рыва, н. у 1932.
ЖУХАВІЦКАЯ Сара, н. у 1934.
ЖУХАВІЦКАЯ Сімка, н. у 1928.
ЖУХАВІЦКАЯ Хая, н. у 1870.
ЖУХАВІЦКАЯ Этля, н. у 1930.
ЖУХАВІЦКІ Абрам, н. у 1865.
ЖУХАВІЦКІ Абрам, н. у 1895.
ЖУХАВІЦКІ Насон, н. у 1905.
ЖЫЛЕЎСКАЯ Фрада, н. у 1873.
ЖЫЛЕЎСКІ Гірш, н. у 1938, на ўтрыманні.
ЖЫЛЕЎСКІ Мордух, н. у 1872.
ЖЫЛЕЎСКІ Шлёма, н. у 1908.



Помнік на магіле ахвяр фашызму кала в. Рудня Быценскага сельсавета. Тут пахавана каля 2 тысяч мірных жыхароў в. Быцень, расстраляных у 1941—1942 гг.

ЖЫЛЕЎСКІ Якаў, н. у 1910.
ЗАЙДЭНГАРТ Геня, н. у 1939.
ЗАЙДЭНГАРТ Збішэк, н. у 1939.
ЗАКГЕЙМ Аба, н. у 1916.
ЗАКГЕЙМ Міра, н. у 1914.
ЗАКГЕЙМ Міхель, н. у 1885.
ЗАКГЕЙМ Моця, н. у 1918.
ЗАКГЕЙМ Рахіля, н. у 1913.
ЗАКГЕЙМ Сара, н. у 1898.
ЗАКГЕЙМ Сара, н. у 1926.
ЗАКГЕЙМ Шэва, н. у 1942.
ЗАКГЕЙМ Эстэр, н. у 1888.
ЗАЛАТНІЦКАЯ Альта, н. у 1883.
ЗАЛАТНІЦКІ Давід, н. у 1908.
ЗАЛМАН Еўна, н. у 1925.
ЗАЛМАН Мера, н. у 1927.
ЗАЛМАН Рыўка, н. у 1900.
ЗАЛМАН Сара, н. у 1890.
ЗАЛМАН Сара Разаль, н. у 1880.
ЗАЛЬЦМАН Абраша, н. у 1938.
ЗАЛЬЦМАН Арон, н. у 1905.
ЗАМАСЧЫК Давід, н. у 1870.

ЗАМОСЧЫК Хася Сара, н. у 1870.
ЗАРЭЦКАЯ Баша, н. у 1907.
ЗАРЭЦКАЯ Ліба, н. у 1932.
ЗАРЭЦКАЯ Мнуха, н. у 1895.
ЗАРЭЦКІ Абрам, н. у 1905.
ЗАРЭЦКІ Абрам, н. у 1932.
ЗАРЭЦКІ Іцка, н. у 1934.
ЗАРЭЦКІ Хаім, н. у 1934.
ЗАРЭЦКІ Хаім Аб., н. у 1875.
ЗУМАН Абрам, н. у 1918.
ЗУМАН Сара, н. у 1890.
ІНДЭРМАН Сара, н. у 1893.
ІНДЭРМАН Хая Рыва, н. у 1890.
ІОСІЛЕВІЧ Вельвель, н. у 1939.
ІОСІЛЕВІЧ Ліба, н. у 1936.
ІОСІЛЕВІЧ (ЕСІЛЕВІЧ) Міахім, н. у 1905.
ІОСІЛЕВІЧ Рышка, н. у 1912.
КАВЕНСКАЯ Песя, н. у 1915.
КАВЕНСКАЯ Фрэйда, н. у 1895.
КАВЕНСКІ Шлёма, н. у 1888.
КАЛУЖСКАЯ Рахіля, н. у 1900.
КАЛУЖСКІ Ісак, н. у 1936.
КАЛУЖСКІ Іцка, н. у 1910.
КАЛУЖСКІ Хаім, н. у 1870.
КАНТАРОВІЧ Бейля, н. у 1900.
КАНТАРОВІЧ Іосіф, н. у 1924.
КАНТАРОВІЧ Літа, н. у 1895.
КАНТАРОВІЧ Соня, н. у 1918.
КАПУСТА Бася, н. у 1905.
КАПУСТА Верка, н. у 1901.
КАПУСТА Фаня, н. у 1937.
КАРЭЛЕК Гітля, н. у 1905.
КАРЭЛЕК Лёва, н. у 1934.
КАРЭЛЕК Франш, н. у 1900.
КАРЭЛЕК Цыля, н. у 1928.
КАЦЭНСКАЙБОГІШ Арон, н. у 1890.
КАЦЭНСКАЙБОГІШ Елка, н. у 1928.
КАЦЭНСКАЙБОГІШ Летка, н. у 1924.
КАЦЭНСКАЙБОГІШ Неха, н. у 1892.
КАЦЭНСКАЙБОГІШ Фаня, н. у 1924.
КОВЕНСКАЯ Двося, н. у 1905.
КОВЕНСКАЯ Маўка, н. у 1938.
КОВЕНСКАЯ Раша, н. у 1915.
КОВЕНСКАЯ Соня, н. у 1898.
КОВЕНСКАЯ Фрэйда, н. у 1937.
КОВЕНСКАЯ Фрэйза, н. у 1890.
КОВЕНСКІ Гірш, н. у 1912.
КОВЕНСКІ Мордуў, н. у 1885.
КОВЕНСКІ Рубін, н. у 1888.
КОВЕНСКІ Самуіл, н. у 1887.
КОВЕНСКІ Хава, н. у 1910.
КОВЕНСКІ Хаім, н. у 1939.
КОВЕНСКІ Цука, н. у 1941.
КОВЕНСКІ Янкель, н. у 1939.
КОВЕНСКІ Янкель, н. у 1940.
КОВЕНСКІ Янкель, н. у 1942.
КОС Альтэр, н. у 1865.
КОС Аўсей, н. у 1930.
КОС Гема, н. у 1929.
КОС Гілель, н. у 1926.
КОС Гілік, н. у 1925.
КОС Завель, н. у 1928.
КОС Златка, н. у 1890.
КОС Іосіф, н. у 1900.
КОС Матус, н. у 1895.
КОС Меер, н. у 1888.
КОС Рыва, н. у 1930.
КОС Рэля, н. у 1905.
КОС Міна, н. у 1867.
КОС Хайка, н. у 1918.
КОС Хая, н. у 1912.
КРАЎЧЫК Ента, н. у 1902.
КРАЎЧЫК Лея, н. у 1939.
КРАЎЧЫК Ліба, н. у 1935.
КРАЎЧЫК Хая, н. у 1937.
КРАЎЧЫК Юдэль, н. у 1900.
КРУПЕНЯ Гірш, н. у 1939.
КРУПЕНЯ Фраім, н. у 1916.
КРУПЕНЯ Шэйна, н. у 1922.
КРУПЕНЯ Элька, н. у 1895.
КУЗНЕЦ Гірш, н. у 1928.
КУЗНЕЦ Груна, н. у 1906.
КУЗНЕЦ Іосіф, н. у 1868.
КУЗНЕЦ Ітка, н. у 1912.
КУЗНЕЦ Моўша, н. у 1905.
КУЗНЕЦ Фейга, н. у 1940.
КУЗНЕЦ Фейсах, н. у 1895.
КУЗНЕЦ Янкель, н. у 1909.
КУЗНЕЦ Хая, н. у 1939.
КУТУН Іцка, н. у 1905.
КУТУН Нехема, н. у 1938.
КУТУН Пеша, н. у 1907.
ЛАЙКО Леон, н. у 1910.
ЛАЙКО Рэйзель, н. у 1912.
ЛАНЦЭВІЦКАЯ Геня, н. у 1925.
ЛАНЦЭВІЦКАЯ Дара, н. у 1895.
ЛАШЧЭЎСКАЯ Сара, н. у 1882.
ЛАШЧЭЎСКІ Абрам, н. у 1880.
ЛЕВ Ітка, н. у 1900.
ЛЕВ Халя, н. у 1895.
ЛЕВІН Давід, н. у 1905.
ЛЕВІНА Лея, н. у 1932.
ЛЕВІНА Малька, н. у 1909.
ЛЕВІНА Нафтэля, н. у 1930.
ЛЕЙВІНБУХ Ліба, н. у 1902.
ЛЕЙВІНБУХ Сара, н. у 1926.
ЛЕЙТ Абрам, н. у 1865.
ЛЕЙТ Хаім, н. у 1870.
ЛЕЙТ Хаім, н. у 1900.
ЛЕЙТ Хая, н. у 1912.
ЛЕЙТ Хіба, н. у 1938.
ЛІБЕРМАН Двейра, н. у 1895.
ЛІБЕРМАН Іосіф, н. у 1890.
ЛІБЕРМАН Сара, н. у 1926.

ЛІБЕРМАН Хаша, н. у 1922.
ЛІБЕРСКАЯ Дзінка, н. у 1892.
ЛІБЕРСКАЯ Хаімеля, н. у 1920.
ЛІБЕРСКАЯ Ханабейля, н. у 1923.
ЛІБЕРСКІ Арон, н. у 1890.
ЛІПЕЦ Абрам, н. у 1900.
ЛІПЕЦ Давід, н. у 1932.
ЛІПЕЦ Мерка, н. у 1900.
ЛІСАВІЦКАЯ Рахіль, н. у 1896.
ЛІСАВІЦКАЯ Рыўка, н. у 1900.
ЛІСАВІЦКІ Іосіф, н. у 1894.
ЛІСАВІЦКІ Паша, н. у 1938.
ЛІЎШЫЦ Ісак, н. у 1930.
ЛІЎШЫЦ Ітка, н. у 1897.
ЛІЎШЫЦ Ітка, н. у 1924.
ЛІЎШЫЦ Рахіль, н. у 1900.
ЛІЎШЫЦ Рэйзель, н. у 1920.
ЛІЎШЫЦ Сара, н. у 1895.
ЛІЎШЫЦ Хая, н. у 1922.
ЛІЎШЫЦ Цыля, н. у 1928.
ЛІЎШЫЦ Шлёма, н. у 1895.
ЛІЎШЫЦ Шэвель, н. у 1926.
ЛЮБЕТКІНА Буня, н. у 1917.
ЛЮБЕТКІНА Голда, н. у 1914.
ЛЮБЕТКІНА Ліба, н. у 1929.
ЛЮБЕТКІНА Хая, н. у 1875.
ЛЮБЕТКІН Іцка, н. у 1870.
ЛЮБЕТКІН Лейба, н. у 1931.
МАГІЛЯНСКАЯ Іда, н. у 1932.
МАГІЛЯНСКАЯ Эстэр, н. у 1875.
МАГІЛЯНСКАЯ Эстэр Дв., н. у 1907.
МАГІЛЯНСКІ Іосіф, н. у 1928.
МАЛІНА Борух, н. у 1900.
МАЛІНА Хая, н. у 1902.
МАЛІНА Эця, н. у 1938.
МАЛІНА Якаў, н. у 1925.
МАРКІН Абрам, н. у 1941.
МАРКІН Гуця, н. у 1892.
МАРКІН Мірыям, н. у 1930.
МАРКІН Моўша, н. у 1908.
МАРКІН Моўша, н. у 1939.
МАРКІНА Геша, н. у 1939.
МАРКІНА Кейла, н. у 1918.
МАРКІНА Сара, н. у 1939.
МАРКІНА Хана, н. у 1910.
МАЦЕЦКІ Ізя, н. у 1870.
МАЦЕЦКІ Ісак, н. у 1868.
МЕНДАЛЕВІЧ Бася, н. у 1900.
МЕНДАЛЕВІЧ Бейля, н. у 1903.
МЕНДАЛЕВІЧ Іаахім, н. у 1924.
МЕНДАЛЕВІЧ Лея, н. у 1932.
МЕНДАЛЕВІЧ Малка, н. у 1928.
МЕНДАЛЕВІЧ Міна, н. у 1905.
МЕНДАЛЕВІЧ Мірыям, н. у 1891.
МЕНДАЛЕВІЧ Моўша, н. у 1900.
МЕНДАЛЕВІЧ Роза, н. у 1930.
МЕНДАЛЕВІЧ Самуіл, н. у 1900.
МЕНДЗЕЛЕВІЧ Моўша, н. у 1936, на ўтрыманні.
МЕЯРОВІЧ Іцка, н. у. 1865.
МЕЯРОВІЧ Хана, н. у 1870.
МІНА Алекс, н. у 1914.
МІНДАЛЕВІЧ Года, н. у 1882.
МІНДАЛЕВІЧ Моўша, н. у 1880.
МІНКОВА Міра, н. у 1893.
МІНКОВІЧ Абрам, н. у 1930, навучэнец.
МІНКОВІЧ Бэрка, н. у 1934, навучэнец.
МІНКОВІЧ Геня, н. у 1900.
МІНКОВІЧ Гірш, н. у 1906.
МІНКОВІЧ Давід, н. у 1930, навучэнец.
МІНКОВІЧ Двейра, н. у 1890.
МІНКОВІЧ Лейба, н. у 1892.
МІНКОВІЧ Лейзер, н. у 1898, сталяр.
МІНКОВІЧ Ліба, н. у 1925, краўчыха.
МІНКОВІЧ Ліба, н. у 1929.
МІНКОВІЧ Меер, н. у 1912.
МІНКОВІЧ Меер, н. у 1912.
МІНКОВІЧ Мендаль, н. у 1885.
МІНКОВІЧ Мера, н. у 1906.
МІНКОВІЧ Мойша, н. у 1870, сталяр.
МІНКОВІЧ Мордух, н. у 1927, навучэнец.
МІНКОВІЧ Нісон, н. у 1923.
МІНКОВІЧ Рафіль, н. у 1928, навучэнец.
МІНКОВІЧ Рыва, н. у 1888.
МІНКОВІЧ Рыва, н. у 1928, навучэнка.
МІНКОВІЧ Рыўка, н. у 1900.
МІНКОВІЧ Сара, н. у 1900.
МІНКОВІЧ Фрума, н. у 1902.
МІНКОВІЧ Хаім, н. у 1931, навучэнец.
МІНКОВІЧ Хана, н. у 1908.
МІНКОВІЧ Шая, н. у 1930, навучэнец.
МІНКОВІЧ Янкель, н. у 1932, навучэнец.
МІНКОЎ Завель, н. у 1880.
МІНКОЎ Каўман.
МІНЬКОВІЧ Гірш, н. у 1933, навучэнец.
МІНЬКОВІЧ Куня, н. у 1927, навучэнец.
МІНЬКОВІЧ Фавель, н. у 1931, навучэнец.
МІНЬКОВІЧ Якаў, н. у 1929, навучэнец.
МІРСКАЯ Гітля, н. у 1924.
МІРСКАЯ Фейга, н. у 1930, навучэнка.
МІРСКАЯ Эстэр, н. у 1890.
МІРСКІ Айзік, н. у 1900.
МІРСКІ Моўша, н. у 1890.
МІРСКІ Моўша, н. у 1930, навучэнец.
МІРСКІ Рыўка, н. у 1900.
МІШЛЕР Арон, н. у 1913.
МІШЛЕР Ісак, н. у 1915.
МІШЛЕР Піня, н. у 1885.
МІШЛЕР Рыва, н. у 1910.
МІШЛЕР Сара, н. у 1920.
МІШЛЕР Хая, н. у 1888.
МУКАСЕЙ Броха, н. у 1910.
МУКАСЕЙ Бэрка, н. у 1905.
МУКАСЕЙ Фаня, н. у 1938, на ўтрыманні.
МУКАСЕЙ Янкель, н. у 1938, на ўтрыманні.

МІШКІН Лейба, н. у 1926, навучэнец.
МІШКІНА Мейта, н. у 1905.
НАЖНІЦКАЯ Бася, н. у 1920.
НАЖНІЦКАЯ Лея, н. у 1929, навучэнка.
НАЖНІЦКАЯ Хая, н. у 1927, навучэнка.
НАЖНІЦКІ Юдэль, н. у 1895.
НЕВАХОВІЧ Голда, н. у 1908.
НЕВАХОВІЧ Маўка, н. у 1942, на ўтрыманні.
НЕВАХОВІЧ Насон, н. у 1913.
НЕВАХОВІЧ Янкель, н. у 1938, на ўтрыманні.
ПАГАРЭЛЬСКАЯ Геня, н. у 1913.
ПАГАРЭЛЬСКАЯ Малкалея, н. у 1875.
ПАГАРЭЛЬСКІ Ісак, н. у 1870.
ПАГАРЭЛЬСКІ Хаім, н. у. 1928, навучэнец.
ПАЛАНЕЦКАЯ Сара, н. у 1912.
ПАЛАНЕЦКІ Гірш, н. у 1936, на ўтрыманні.
ПАТРЭБІН Аншэль, н. у 1930, навучэнец.
ПАТРЭБІН Зейдэль, н. у 1897.
ПАТРЭБІНА Сара, н. у 1896.
ПЕРАЧЫНСКАЯ Гуда, н. у 1870.
ПІЛАТОВІЧ Давід, н. у 1865.
ПІЛАТОВІЧ Ізраіль, н. у 1932, навучэнец.
ПІЛАТОВІЧ Лейба, н. у 1930, навучэнец.
ПІЛАТОВІЧ Малка, н. у 1890.
ПІЛАТОВІЧ Хаім, н. у 1890.
ПІЛАТОВІЧ Шая, н. у 1928, навучэнка.
ПІЛАТОВІЧ Шэйна Х., н. у 1892.
ПІЛАТОВІЧ Этэр, н. у 1926, навучэнка.
ПІНСКАЯ Бася, н. у 1900.
ПІНСКАЯ Маўка, н. у 1938, на ўтрыманні.
ПІНСКАЯ Рыўка, н. у 1890.
ПІНСКАЯ Рыша, н. у 1875.
ПІНСКАЯ Сара, н. у 1895.
ПІНСКАЯ Сара, н. у 1904.
ПІНСКАЯ Хава, н. у 1910.
ПІНСКАЯ Юдзіс, н. у 1875.
ПІНСКІ Аншэль, н. у 1925.
ПІНСКІ Залман, н. у 1890.
ПІНСКІ Лейба, н. у 1877.
ПІНСКІ Мордух, н. у 1870.
ПІНСКІ Якаў, н. у 1910.
ПІНСКІ Якаў, н. у 1908.
ПІНСКІ Янкель, н. у 1940, на ўтрыманні.
ПІТКОЎСКАЯ Геня, н. у 1932, навучэнка.
ПІТКОЎСКАЯ Двейра, н. у 1920.
ПІТКОЎСКАЯ Рыша, н. у 1880.
ПІТКОЎСКАЯ Фаня, н. у 1908.
ПІТКОЎСКІ Айзік, н. у 1877.
ПІТКОЎСКІ Лейма, н. у 1906.
ПІТКОЎСКІ Самуіл, н. у 1940, на ўтрыманні.
ПРУЖАНСКАЯ Мнуха, н. у 1900.
ПРУЖАНСКІ Мордух, н. у 1890, сталяр.
ФЯДКОВІЧ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1910, ваяваў у атрадзе імя Арджанікідзе, не вярнуўся з вайны.

ШЛЯЖКА Аляксей Майсеевіч, н. у 1924, загінуў у сакавіку 1945.

ШЛЯЖКА Сяргей Сцяпанавіч, н. у 1926, загінуў у лістападзе 1944 у Латвіі.

СВЯТАВОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЯ ГАЦЬ

БАСАЛАЙ Васіль Дзям'янавіч, н. у 1918, прапаў без вестак у 1941.

БАСАЛАЙ Іван Навумавіч, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

БАСАЛАЙ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1907, памёр ад ран 4.4.1945 у г. Пенза.

БАСАЛАЙ Мікалай Кірылавіч, загінуў 27.9.1944, пахаваны на хут. Цыркул Рыжскага пав., Латвія.

БАСАЛАЙ Міхаіл Навумавіч, н. у 1922, забіты 29.2.1945, пахаваны ў Пляшанцы, Польшча.

БАСАЛАЙ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1921, загінуў 7.1.1945, пахаваны ў в. Добралавув Люблінскага пав., Польшча.

БАСАЛАЙ Сяргей Дзям'янавіч, н. у 1909, загінуў 18.4.1945, пахаваны каля г. Клісен Брандэрбургскай прав., Германія.

БАСАЛАЙ Фёдар Ціханавіч, загінуў 24.11.1944, пахаваны каля школы с. Бахашыца Пулаўскага пав., Цалеўскай воласці, Польшча.

БРЫЧКАЛЕВІЧ Уладзімір Якаўлевіч, прапаў без вестак у 1944.

ВЕЛІКАСЕЛЕЦ Уладзімір Андрэевіч, н. у 1924, памёр ад ран 2.11.1944, пахаваны ў брацкай магіле каля г. Вайнедэ, Латвія.

ГАЛОЎЧЫК Раман Іванавіч, загінуў 27.3.1945, пахаваны на заходнім беразе р. Мёртвая Вісла каля г. Гданьск, Польшча.

ГАРБАВЕЦ Фёдар Фёдаравіч, загінуў 20.4.1944, пахаваны ў в. Нідэр-Езар Франкфурцкага пав. Брандэнбургскай прав., Германія.

ГАРБАВЕЦ Якаў Міхеевіч, прапаў без вестак у красавіку 1945.

ГАРДЗЕЙЧЫК Васіль Іванавіч, загінуў 14.4.1945, пахаваны ў в. Коханув Радомскага пав., Польшча.

ГАРДЗЕЙЧЫК Міхаіл Васільевіч, н. у 1919, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ДЗЯДОК Аляксей Ільіч, памёр ад ран 29.10.1944, пахаваны ў брацкай магіле каля г. Вайнедэ, Латвія.

КАВАЛЕВІЧ Іван Сільвестравіч, н. у 1910, памёр ад ран 3.5.1945, пахаваны на могілках у г. Фрыдрыхсвілш, Германія.

КАЛЯДА Мікалай Мікітавіч, памёр ад ран 2.11.1944, пахаваны ў м. Пэнкуле, Латвія.

ЛІШКО Марк Сцяпанавіч, н. у 1918, загінуў у 1944 ва Усх. Прусіі.

МАКАРСКІ Фёдар Сяргеевіч, н. у 1921, загінуў 27.7.1944, пахаваны ў г. Беласток, Польшча.

МІЦІН Мікалай Фёдаравіч, загінуў 8.2.1945, пахаваны ў с. Грынсберг, Памеранія.

ПАЛУЯНОВІЧ Аляксей Раманавіч, загінуў 21.4.1945, пахаваны ў в. Нідэр-Езар Брандэнбургскай прав., Германія.

ПАЛУЯНОВІЧ Барыс Сямёнавіч, н. у 1914, мал. сярж., прапаў без вестак у красавіку 1945.

ПАПЕКА Іван Іванавіч, н. у 1922, прапаў без вестак.

ПАПЕКА Рыгор Канстанцінавіч, загінуў 22.10.1944, пахаваны ў фальварку Таўкінен, Усх. Прусія.

ПУШЫЛА Іван Навумавіч, памёр ад ран 26.2.1945, пахаваны на ваенных могілках г. Нейтамішэль Пазнанскага ваяв., Польшча.

ПУШЫЛА Мікалай Андрэевіч, н. у 1926, прапаў без вестак у снежні 1944.

ПУШЫЛА Мікалай Іванавіч, н. у 1915, загінуў 20.2.1945, пахаваны ў г. Валаў, Усх. Прусія.

ТРУСЕВІЧ Мікалай Паўлавіч, памёр ад ран 12.3.1945, пахаваны ў в. Цэлаў Брандэнбургскай прав., Германія.

ВЁСКА ДОЎГАЯ

ВАСЮЦІЧ Аляксей Сямёнавіч, н. у 1922, партызан, на фронце з 1944, прапаў без вестак.

ВАСЮЦІЧ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1918, прапаў без вестак у ліпені 1941.

ГЛАДУН Аляксей Міхайлавіч, прапаў без вестак у 1941.

ГЛАДУН Ціхан Рыгоравіч, загінуў 1.2.1945, пахаваны ў с. Медаварцэ, Чэхаславаккія.

МАЛІНЧЫК Міхаіл Іванавіч, загінуў 14.1.1945, пахаваны ў в. Коханув Радомскага пав., Польшча.

САМУЙЛІК Аляксей Іванавіч, загінуў 23.1.1945, пахаваны ў г. Аўганеўзас, Усх. Прусія.

СТРАЛЬЧУК Аляксей Іванавіч, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ВЁСКА СВЯТАЯ ВОЛЯ

ГАЛОЎЧЫК Мікалай Антонавіч, н. у 1912, загінуў 14.1.1945, пахаваны ў в. Барановіца Радомскага пав., Польшча.

ГОЛУБАЎ Герасім Мацвеевіч, загінуў 27.1.1945, пахаваны ў 60 м паўднёва-усходней м. Найдорф, Польшча.

ГОЛУБАЎ Дзмітрый Мацвеевіч, загінуў 25.12.1944, пахаваны каля хут. Вільшчыні, Латвія.

ДЖЭЖОРА Мікалай Раманавіч, прапаў без вестак 1.5.1945.

ДЖЭЖОРА Ціхан Уладзіміравіч, н. у 1920, прапаў без вестак у красавіку 1945.

КАВАЛЕВІЧ Іван Савельевіч, н. у 1925, загінуў 23.10.1944 ва Усх. Прусіі.

КАВАЛЕВІЧ Сяргей Сяргеевіч, памёр ад ран 30.1.1945, пахаваны ў в. Залясева Пазнанскага ваяв., Польшча.

КАЗАК Васіль Васільевіч, загінуў 27.4.1945, пахаваны ў Покшніль, Польшча.

КАЛАНЧУК Аляксей Мікітавіч, н. у 1906, загінуў 19.3.1945, пахаваны ў в. Шонліндэ, Усх. Прусія.

КАЛЕНІК Іван Міхеевіч, прапаў без вестак 5.1.1945.

КАЛЕНІК Іван Фаміч, быў вывезены ў Германію, загінуў у красавіку 1945 у Берліне.

КАЛЕСНІКАЎ Кузьма Васільевіч, загінуў 14.1.1945, пахаваны ў в. Коханув Радомскага пав., Польшча.

КАМАРЭВІЧ Аляксандр Трафімавіч, ураджэнец в. Вёска Краснаслабодскага р-на Мінскай вобл., прапаў без вестак у 1941.

КАРПОВІЧ Іван Мацвеевіч, н. у 1920, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Коханув, Польшча.

ЛУКАШЭВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1923, быў у партызанах, на фронце з 1944, загінуў 31.1.1945, пахаваны ў брацкай магіле каля г. Кршад, Усх. Прусія.

ПАПЕКА Андрэй Міхайлавіч, н. у 1903, памёр ад ран 13.4.1945, пахаваны ў магіле №613 агульнашпітальных могілак г. Інстэрбург, Усх. Прусія.

ПУШЫЛА Мікалай Андрэевіч, загінуў 20.4.1945, пахаваны ў в. Нідэр-Езар Брандэнбургскай прав., Германія.

ПУШЫЛА Навум Андрэевіч, н. у 1905, прапаў без вестак у красавіку 1945.

СКАРУПІЧ Міхаіл Дзям'янавіч, н. у 1928, загінуў 18.1.1945, пахаваны ў в. Шталупінен, Усх. Прусія.

СЛЕСАРЧУК Дзмітрый Пракопавіч, н. у 1927, прапаў без вестак 19.4.1945.

СЫПУЧКІН Пётр Фёдаравіч, н. у 1915, ураджэнец с. Аўсорак Жыздрынскага р-на Калужскай вобл., ст. лейт., загінуў у 1942.

СЫПУЧКІН Сяргей Фролавіч, н. у 1918, ураджэнец с. Аўсорак Жыздрынскага р-на Калужскай вобл., мал. лейт., загінуў у 1942 пад Сталінградам.

ЦІХАНЧУК Аляксей Васільевіч, н. у 1926, загінуў 3.1.1945, пахаваны ў в. Шэнфельд Кёнігсбергскай акр., Усх. Прусія.

ЦІХАНЧУК Міхаіл Васільевіч, н. у 1911, прапаў без вестак у студзені 1945.

ЦІХАНЧУК Пётр Іванавіч, н. у 1919, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ЧЫРКО Іван Іванавіч, загінуў 11.2.1945, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Раміштэн, Усх. Прусія.

ШАБАЦЬКА Іван Сцяпанавіч, быў хірургам, загінуў 13.10.1944, пахаваны ў г. Сігулда, Латвія.

ВЁСКА ТУРНАЯ

БРУЙЛО Раман Іванавіч, загінуў 14.1.1945, пахаваны ў г. Баранавіца Радомскага пав., Польшча.

ВАСЮЦІЧ Аляксей Іванавіч, загінуў 5.2.1945, пахаваны ў г. Трэцінг, Германія.

ВАСЮЦІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1925, загінуў 23.4.1945, пахаваны ў с. Шоўшніцэ, Чэхаславакія.

ВАСЮЦІЧ Васіль Іванавіч, прапаў без вестак 12.1.1945.

ВАСЮЦІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1918, прапаў без вестак у снежні 1944.

ГАРБАВЕЦ Пётр Ціханавіч, н. у 1907, прапаў без вестак у сакавіку 1945.

ДЗЯДОК Аляксей Арцёмавіч, загінуў 5.2.1945, пахаваны ў фальварку Ной Кросэндорф, Германія.

ДЗЯДОК Гаўрыла Арцёмавіч, загінуў 2.2.1945, пахаваны ў г. Рэпен, Германія.

КУРАТНІК Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1925, прапаў без вестак у снежні 1944.

КУРАТНІК Сцяпан Іванавіч, загінуў 14.1.1945 у Польшчы.

МАМЧЫЦ Мікалай Сцяпанавіч, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў в. Філадэльфія, Германія.

МАМЧЫЦ Лявон Трафімавіч, н. у 1914, прапаў без вестак у маі 1945.

МАМЧЫЦ Кірыл Якаўлевіч, н. у 1909, загінуў 16.3.1945, пахаваны ў в. Трэцін, Усх. Прусія.

РАДЗІВОНАЎ Іван Якаўлевіч, расстраляны фашыстамі ў г. Хойнікі Гомельскай вобл., дзе працаваў дырэктарам МТС.

РАДЗІВОНАЎ Рыгор Фёдаравіч, прапаў без вестак у красавіку 1945.

РАДЗІВОНАЎ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1906, прапаў без вестак у сакавіку 1945.

РАДЗІВОНАЎ Яфім Якаўлевіч, н. у 1914, загінуў 30.4.1945 у с. Паіміту, Ніжняя Сілезія, Германія.

САГАНОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, мал. сярж., загінуў 7.2.1945, пахаваны ў в. Паршкайн, Усх. Прусія.

САГАНОВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1921, загінуў 23.10.1944 ва Усх. Прусіі.

САГАНОВІЧ Павел Дзям'янавіч, памёр ад ран 11.2.1945, пахаваны ў в. Залясева Пазнанскага ваяв., Польшча.

САГАНОВІЧ Фёдар Андрэевіч, н. у 1918, прапаў без вестак у верасні 1944.

СТАЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЯКСЕЙКІ

АНІШЧЫК Мікалай Іванавіч, н. у 1920, прапаў без вестак у красавіку 1945 ва Усх. Прусіі.

ДЗЕМІДОВІЧ Сяргей Піліпавіч, памёр ад ран 1.4.1945, пахаваны ў в. Добрэ Люблінскага ваяв., Польшча.

ДЫЛЮК Захар Фаміч, н. у 1907, загінуў 13.2.1945, пахаваны ў г. Швібус, Германія.

ПЯСЕЦКІ Васіль Сямёнавіч, н. у 1925, загінуў у 1944 ва Усх. Прусіі, пахаваны ў Несцераўскім р-не, саўгас «Чырвоная паляна», Калінінградская вобл.

СІТКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1907, загінуў пад Варшавай, Польшча.

УДОВІН Іван Ільіч, не вярнуўся з вайны.

УДОВІН Мікалай Максімавіч, прапаў без вестак у студзені 1945.

ВЁСКА АЎСТО

ВАРАБЕЙ Аляксандр Пятровіч, н. у 1920, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Грамэн, Усх. Прусія.

ВАРАБЕЙ Аляксей Іванавіч, н. у 1906, з ліпеня 1944 у Чырвонай Арміі, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў г. Аўрытц, Германія.

ГАЎРЫЛІК Аляксандр Кірылавіч, н. у 1900, член КПЗБ з 1925, загінуў у студзені 1945 ва Усх. Прусіі.

ГАЎРЫЛІК Гаўрыла Канстанцінавіч, н. у 1902, загінуў у 1945 на р. Одэр, Германія.

ЗАЎСЦІНСКІ Сяргей Мікалаевіч, н. у 1912, загінуў у Германіі.

МАРТУСЕВІЧ Пётр Навумавіч, н. у 1908, памёр ад ран 17.4.1945, пахаваны ў г. Цыбінген, Германія.

ШЫШ Аляксей Ульянавіч, н. у 1903, загінуў 15.1.1945 ва Усх. Прусіі.

ШЭЛЕСТ Іван Іванавіч, н. у 1923, загінуў у жніўні 1944, пахаваны ў в. Заздросцув, Польшча.

ЯГНЕШЫК Аляксандр Васільевіч, н. у 1923, загінуў на фронце.

ВЁСКА БЫЧ

АНДРЫЯШКА Мікалай Піліпавіч, н. у 1919, прапаў без вестак у студзені 1945 ва Усх. Прусіі.

ГАРБОЛІК Мікалай Іванавіч, н. у 1919, у Чырвонай Арміі з 1940, загінуў у верасні 1944, пахаваны ў в. Нова Варшаўскага ваяв., Польшча.

КАСПЯРОВІЧ Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1925, удзельнік антыфашысцкага падполля, з ліпеня 1942 у партызанскім атрадзе імя Чарткова, са жніўня 1944 на фронце, загінуў 11.2.1945, пахаваны ў фальварку Вальдхайм, Усх. Прусія.

З успамінаў былога партызана і франтавіка М. В. Банасевіча

У каторы раз за дзесяцігоддзе трымаю ў руках пажоўклы, спісаны роўным почыркам лісток паперы — пісьмо франтавіка Віктара Мышкоўскага бацьку сваяго баявога сябра.

«Добры дзень, паважаны Рыгор Захаравіч!

Вы, былы салдат, ваявалі, білі немцаў у мінулую вайну. Без літасці, не ведаючы страху, знішчаў фашыстаў Ваш сын Саша.

... Куля ворага разлучыла назаўсёды Вас з любімым сынам і нашым баявым таварышам. Выконваючы баявое заданне, ён загінуў героем 11 лютага 1944 года. За яго смерць мы адпомсцім, будзем біць ненавісных ворагаў да поўнага іх знішчэння. Высылаю Вам даведку аб узнагароджанні Аляксандра ордэнам Айчыннай вайны I ступені...».

Саша Каспяровіч быў і маім таварышам. Таму гэта пісьмо-рэліквія заўсёды хвалюе мяне.

...У вёсцы Бык, дзе жыў Саша, дзейнічала пры Польшчы ячэйка КПЗБ. Камуністы Рыгор Здановіч, Іван Андрыяшка, Іван Раўбецкі часта тайком гутарылі з сялянамі пра зямлю, свабоду, расказвалі аб савецкай краіне. Неяк выпадкова падслухалі гэтыя размовы і Саша з сябрам Валодзем Раўбецкім. І вырашылі хлапчукі падацца на ўсход. На граніцы іх затрымалі чырвонаармейцы. Іх уладкавалі ў дзіцячы дом.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР вярнуўся Саша дамоў і стаў вучыцца ў Косаўскай школе, дзе ў 1940-м годзе вучыўся і я. Наладжвалася новае жыццё ў нашым краі, Саша стаў камсамольцам, удзельнічаў у стварэнні калгаса ў роднай вёсцы.

Мірнае бурлівае жыццё абарвала вайна. Злачынствы фашыстаў выклікалі нянавісць ў сэрцах людзей. Саша ўключаецца ў падпольную барацьбу супраць акупантаў. Сустракаецца з надзейнымі людзьмі. Зімою 1941 г. становіцца членам падпольнага партыйна-камсамольскага камітэта па арганізацыі барацьбы з фашыстамі, які быў створаны ў вёсцы Сярадава ваеннаслужачым Фёдарам Бяляевым. Падпольшчыкі збіраюць зброю, звесткі аб размяшчэнні немцаў, гартуюць актыў.

А. Р. Каспяровіч.

Вясною 1943 г. абудзіліся лясы вакол Івацэвіч — з невялікіх груп пачалі ўтварацца партызанскія атрады. Першым з іх на Жытліншчыне быў атрад пад кіраўніцтвам лейтэнанта Аляксея Чарткова. З ім і наладзілі сувязь сярадаўскія патрыёты. А праз некалькі дзён Саша разам з бацькам Рыгорам Захаравічам, братамі Ільёй і Генадзем, сястрою Аленай пайшоў у партызанскі атрад — стала вядома, што паліцыя рыхтуе над імі крывавую расправу.

Вось што расказваюць аб Сашыным баявым жыцці скупыя радкі партызанскай характарыстыкі, падпісаныя былым начальнікам разведкі спецатрада Лінькова М. Х. Колтунам:

«...Пад кіраўніцтвам А. Р. Каспяровіча ў красавіку 1942 г. прыйшлі ў атрад № 112 з вёскі Руда — 7, з Сярадава — 15 чалавек.

У жніўні 1942 г. Каспяровіч быў назначаны камандзірам камсамольска-маладзёжнай дыверсійнай групы. Праявіў храбрасць і мужнасць у барацьбе з захопнікамі. На яго рахунку 10 знішчаных варожых эшалонаў і звыш 20 аўтамашын.

У маі 1943 г. Каспяровіча залічылі ў атрад асобнага прызначэння Героя Савецкага Саюза Лінькова, дзе ён таксама быў камандзірам дыверсійнай групы...

Вясною 1944 г. Каспяровіча накіроўваюць за лінію фронту. Выканаўшы заданне камандавання, вярнуўся назад у атрад. Калі адбылося злучэнне партызан з часцямі Чырвонай Арміі, стаў яе байцом. Загінуў 11 лютага 1945 г.».

Сталася так, што з лета 1942 г. нашы з Сашам шляхі разышліся. Сябар партызаніў у Жытлінскіх лясах, а я — у Гута-Міхалінскіх, у атрадзе імя Дзімітрова.

Апошні раз я сустрэўся з Сашам у жніўні 1944 г. на беразе Буга ў 27-м армейскім запасным палку. Чую знаёмы звонкі голас. Адразу пазнаў па ім сябра.

— Саша! — крычу. — Ты?

Абняліся. Пайшлі размовы, успаміны.

— Сёння з маршавай ротай адпраўляюся на фронт, — сказаў ён тады.

І зноў разышліся нашы дарогі. На гэты раз назаўсёды. Праз некалькі дзён трапіў на фронт і я. Ва-

А. А. Трацяк.

М. І. Жылка.

М. А. Літоўчык.

яваў ва Усходняй Прусіі, там, дзе і Саша. Пасля цяжкага ранення і працяглага лячэння вярнуўся дамоў. І тут даведаўся пра гібель Сашы.

...Пажоўклыя лісткі ваенных гадоў зноў напомнілі аб сябру горкага дзяцінства і вогненнага юнацтва.

А Аляксандр Каспяровіч застаўся заўсёды жывым у маім сэрцы, як і ў памяці нашчадкаў і землякоў. Прозвішча яго занесена ў Кнігу Народнай Славы калгаса імя Леніна, яго імем названа адна з вуліц вёскіБыч.

МІХНЮКЕВІЧ Макар Мар'янавіч, н. у 1910, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у маі 1945, пахаваны ў в. Розенталь, Германія.

ПЕТУХ Павел Іванавіч, н. у 1920, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў 23.2.1945, пахаваны ў г. Кібартай, Літва.

РАЎБЕЦКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1924, загінуў у красавіку 1945 пад Кёнігсбергам.

РАЎБЕЦКІ Пётр Аляксандравіч, н. у 1919, у Чырвонай Арміі з 1940, прапаў без вестак.

ТРАЦЯК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1898, старшыня калгаса імя Варашылава, у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у жніўні 1944 пад Варшавай, Польшча.

ТРАЦЯК Максім Мікалаевіч, н. у 1907, удзельнік польска-нямецкай вайны 1939, загінуў у савецкім канцлагеры Катынь, Смаленская вобл.

ВЁСКА ГОШЧАВА

АРЦЯШУК Іосіф Варфаламеевіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны на хут. Ежэцэ, Польшча.

АСТАПЧЫК Васіль Лявонавіч, н. у 1905, на фронце з ліпеня 1944, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў г. Бомст, Германія.

АСТАПЧЫК Павел Лявонавіч, н. у 1906, на фронце з ліпеня 1944, прапаў без вестак.

БАЗЫЛЮК Аляксандр Васільевіч, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў в. Кунітц, Германія.

БАНАСЕВІЧ Канстанцін Мікітавіч, н. у 1909, загінуў 16.4.1945 на Одэрскім плацдарме, пахаваны ў в. Пульверкруг, Германія.

БАНДАРЫК Георгій Васільевіч, н. у 1912, загінуў 31.12.1944 пад Варшавай, пахаваны ў в. Закрэнт, Польшча.

БАНДАРЫК Сямён Іванавіч, н. у 1925, загінуў 20.4.1945 на Одэрскім плацдарме, пахаваны ў г. Фюрстэнберг, Германія.

БАНДАРЫК Рыгор Васільевіч, н. у 1915, загінуў 28.12.1944 у Польшчы.

БЕЛЫ Аляксей Пятровіч, н. у 1910, загінуў у 1945 на Одэрскім плацдарме, Германія.

БЕЛЫ Емяльян Пятровіч, н. у 1907, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў фальварку Касен, Германія.

БЕЛЫ Іван Андрэевіч, н. у 1924, не вярнуўся з вайны.

БЕЛЫ Іван Рыгоравіч, н. у 1919, у Чырвонай Арміі з 1940, прапаў без вестак у жніўні 1944.

БЕЛЫ Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1924, з 1942 у партызанскім атрадзе «Савецкая Беларусь», з ліпеня 1944 на фронце, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Такінен, Усх. Прусія.

ВАЛОШЧЫК Антон Іларыёнавіч, н. у 1918, загінуў у сакавіку 1945.

ВАЛОШЧЫК Іларыён, н. у 1915, загінуў у красавіку 1945 пад Берлінам, Германія.

ВАЛОШЧЫК Мікалай Мікалаевіч, н. у 1925, загінуў у красавіку 1945 на р. Одэр, пахаваны ў г. Цыбінген, Германія.

ВАЛОШЧЫК Сямён Канстанцінавіч, н. у 1914, на фронце з ліпеня 1944, прапаў без вестак.

ГАРДЗЕЙЧЫК Аляксандр Канстанцінавіч, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Закрэнт, Польшча.

ГАРДЗЕЙЧЫК Аляксей Пятровіч, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, памёр ад ран 29.4.1945, пахаваны ў г. Штрэмберг, Германія.

ГОЙШЫК Аляксандр Барысавіч, н. у 1925, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Бжэсце пад Варшавай, Польшча.

ГОЙШЫК Іван Пятровіч, н. у 1925, загінуў 14.1.1945 пад Варшавай, Польшча.

ГОЙШЫК Міхаіл Іванавіч, н. у 1926, загінуў 2.2.1945 у Польшчы.

ДРОЗД Іван Канстанцінавіч, загінуў 24.1.1945.

Помнік загінуўшым землякам у в. Гошчава.

ЕРЧАК Георгій Андрэевіч, загінуў 12.3.1945, пахаваны ў в. Гарбард, Чэхаславакія.

ЕРЧАК Рыгор Рыгоравіч, н. у 1913, загінуў 26.4.1945 у баях за Берлін.

ЕЎТУХ Канстанцін Пятровіч, н. у 1926, загінуў 26.4.1945 пад Берлінам.

ЗЫБАЙЛА Іван Сцяпанавіч, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў в. Надыгі, Латвія.

ЖЫВІНЕВІЧ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1925, загінуў 28.4.1945 пад Берлінам, пахаваны ў с. Запцыг, Германія.

ЖЫЛКА Мікалай Ільіч, н. у 1926, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Аўрытц, Германія.

КОТ Аляксандр Ільіч, н. у 1914, у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у ліпені 1941 пад Мінскам.

КОТ Іван Іванавіч, н. у 1926, на фронце з ліпеня 1944, загінуў у сакавіку 1945 пад Кёнігсбергам.

КОТ Іван Мікалаевіч, н. у 1925, загінуў 7.2.1945, пахаваны ў г. Фюртэнберг, Германія.

КОТ Мікалай Іванавіч, н. у 1924, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у студзені 1945, пахаваны на хут. Ежыцэ, Польшча.

КРЫЦКІ Іпаліт Дзмітрыевіч, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Кольберг, Германія.

КУЛЕЦКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1923, загінуў 6.2.1945, пахаваны ў в. Бюрдэнвалд, Усх. Прусія.

КУРЫЛІК Аляксей Іосіфавіч, н. у 1915, загінуў 14.1.1945 пад Варшавай, пахаваны ў в. Люцына, Польшча.

КУРЫЛІК Віктар Канстанцінавіч, н. у 1926, загінуў 14.1.1945 пад Варшавай, пахаваны ў в. Дужэ, Польшча.

ЛІТОЎЧЫК Мікалай Аляксандравіч, н. у 1922, з ліпеня 1943 у партызанскім атрадзе імя Дзімітрова, у сакавіку 1944 пайшоў на фронт, загінуў 13.1.1945 пад Варшавай, Польшча.

ЛІТОЎЧЫК Рыгор Максімавіч, н. у 1909, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Ожыц, Польшча.

ЛІХАРАЙ Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1925, загінуў у красавіку 1945 на р. Одэр, пахаваны ў г. Цыбінген, Германія.

ЛЯШОК Мікалай Іванавіч, н. у 1908, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Бжэсце, Польшча.

ЛЯШОК Мікалай Іванавіч, н. у 1924, загінуў 26.4.1945 у Кёнігсбергу.

МАЙСЕЙЧЫК Канстанцін Мікалаевіч, н. у 1900, загінуў у красавіку 1945 у Венгрыі.

МАЙСЕЙЧЫК Фёдар Сяргеевіч, н. у 1925, загінуў у студзені 1945 пад Варшавай, Польшча.

МІХНЮКЕВІЧ Яўген Фёдаравіч, н. у 1924, загінуў 6.2.1945 у Польшчы.

НАРОЕК Іван Іванавіч, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, памёр ад ран 1.1.1945, пахаваны ў в. Касігоўцы, Чэхаславакія.

СОБАЛЬ Мірон, загінуў 16.4.1945 у Германіі.

СКІНДЗЕР, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, памёр у ваенным шпіталі.

ФЯДОСІК Іван Канстанцінавіч, н. у 1926, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, прапаў без вестак у маі 1945.

ФЯДОСІК Канстанцін Андрэевіч, н. у 1907, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Пульверкруг, Германія.

ФЯДОСІК Рыгор Андрэевіч, н. у 1926, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў г. Цыбінген, Германія.

К. К. Хацімка.

ХАРУЖЫ Сцяпан Лявонавіч, н. у 1910, загінуў 10.3.1945, пахаваны ў в. Пульверкруг, Германія.

ХАЦІМКА Канстанцін Канстанцінавіч, н. у 1922, загінуў вясной 1945, пахаваны ў г. Брандэнбург, Германія.

ШЫЯН Іван Мікалаевіч, н. у 1926, памёр ад ран 16.9.1944, пахаваны ў с. Левашова Някрасаўскага р-на, Яраслаўскай вобл.

ШЫЯН Максім Сямёнавіч, н. у 1914, загінуў 2.1.1945 у Польшчы.

ШЫЯН Мікалай Васільевіч, прызваны ў армію у 1940, прапаў без вестак.

ШЫЯН Мікалай Іванавіч, загінуў у студзені 1945 у Польшчы.

ШЫЯН Мікалай Ільіч, памёр ад ран у шпіталі у 1945.

ЮРАШЫК Павел Мікалаевіч, н. у 1926, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Аўрытц, Германія.

ВЁСКА МІХНАВІЧЫ

БЕЛЫ Васіль Несцеравіч, памёр ад ран 11.2.1945, пахаваны ў г. Швібус, Германія.

ЖАГАР Васіль Цімафеевіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Фураторгбург, Германія.

ЖЫГАР Ілья Бенядзіктавіч, н. у 1909, загінуў у 1944 у Польшчы.

ЛУКОЎСКІ Канстанцін Бенядзіктавіч, н. у 1909, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Рудкі, Польшча.

МУЛЬТАН Яўген Васільевіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Мілаў, Усх. Прусія.

ПАЎШКО Васіль Рыгоравіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Паўлікавіца, Польшча.

ПАЎШКО Уладзімір Несцеравіч, н. у 1921, загінуў у лютым 1945 пад Кёнігсбергам, пахаваны ў в. Бюргенвальд.

ТУРКІНЕВІЧ Мікалай Лук'янавіч, н. у 1905, прапаў без вестак у красавіку 1945.

Пры друкаванні ў раённай газеце спісаў загінуўшых на фронце жыхароў в. Міхнавічы Стайкаўскага сельсавета не было названа прозвішча Мікалая Лукіча Туркіневіча, 1905 года нараджэння. Яго сын Васіль Мікалаевіч прадставіў архіўныя дакументы, якія сведчаць аб яго гібелі на фронце ад ран, а таксама яго франтавыя пісьмы да сваёй жонкі Надзеі Несцераўны. Вось іх змест:

Пісьмо ад 7 лютага 1945 года. Яно пачыналася так:

«Пісьмо ад твайго мужа Мікалая да сваёй вельмі паважанай жонкі Надзі. Добры дзень, мая дарагая жонка Надзька. У першых словах майго пісьма паведамляю, што я да цяперашняга часу знаходжуся жывы і здаровы, і табе жадаю, дарагая мая жонка Надзька ад Госпада Бога добрага здароўя ў жыцці тваім. Паведамляю, дарагая мая жонка Надзька, што атрымаў ад цябе цяпер два пісьмы, і дзякую табе сардэчна за тое, што ты мяне не забываеш. Калі я атрымаў тваё пісьмо і даведаўся аб тым, што ты нарадзіла доўгачаканую дачку і ўсё абышлося добра, то я вельмі ўзрадаваўся і ўсхваляваўся. Хрэсьбіны рабі без мяне і назаві дачку так, як табе падабаецца. І няхай гадуецца і жыве сто гадоў...

...Можа, і не прыйдзецца больш убачыцца з табой і паглядзець на сваю доўгачаканую дачку і сына Ваську. Цяпер будзем ісці на Берлін. Прашу, паперы больш мне не шлі. Цяпер паперы ў мяне хапае. Пісьмаў цяпер пісаць няма калі. Гэта пісьмо пішу, седзячы ў акопе. Слаць мне вам, акрамя пісьма, больш няма чаго... У гэтым жа палку знаходзіцца з Міхнавіч Канстанцін Паўшко. Часам выпадае ўбачыцца...»

Другое пісьмо Мікалай Лукіч напісаў за тры дні да ранення — 13 красавіка 1945 года. І невядома за колькі да смерці.

«Пісьмо ад твайго мужа Мікалая да сваёй вельмі паважанай і дарагой жонкі Надзі. Добры дзень, дарагая мая жонка Надзька і дачка мая Валя. У першых словах майго пісьма спяшаюся паведаміць, што я да цяперашняга часу знаходжуся жывы і здаровы і вам жадаю, дарагая мая Надзька і дачка мая Валя, ад душы і ад Госпада Бога здароўя ў жыцці вашым. Дай Бог вам і мне перажыць гэту вайну і ўбачыцца з вамі і ўбачыць свайго сынка Ваську. І яшчэ паведамляю, дарагая мая жонка Надзька, што я з Паўшком Канстанцінам не бачыўся ўжо два месяцы, а сёння 13 красавіка ён зайшоў да мяне і, убачыўшы мяне, што я яшчэ жывы, кінуўся цалавацца, як да роднага брата, задаволены, што і ён, і я яшчэ жывыя. Як доўга нам прыйдзецца пажыць, не ведаю. Толькі адзін Бог ведае, што можа здарыцца з намі наперадзе, ці прыйдзецца перажыць гэту вайну. Яшчэ разам са мной знаходзіцца Іван Аляксеевіч з Размерак, Мар'яны Асіпікавай сын.

Дарагая мая жонка Надзька і дачка Валя, надыходзіць свята Пасхі Хрыстовай. Віншую вас, а таксама ўсіх маіх родных. Дай Бог вам шчасліва, добра і весела святкаваць Пасху Хрыстову і дачакацца другой...» Дарагая мая жонка Надзька, ужо прыйшла вясна. Трэба брацца за поле. Пасадзі крыху бульбы і пасей што-небудзь, па-магчымасці колькі можаш, каб мела што есці і аддаць дзяржаве падатак.

...Шлі прывітанні Сцяпанавай сям'і, Аксінні,

Нюры і Валодзі, і Надзькі, сваім братам і сёстрам, а таксама ўсім маім родным і знаёмым. А пакуль застаюся жывы і здаровы. Твой муж Туркіневіч Мікалай. Моцна цісну вашы правыя рукі і цалую вас, Надзька і дачка Валя. Смерць нямецкім акупантам!»

Не суджана было сустрэцца з роднымі салдату вайны Мікалаю Туркіневічу. Не дачакалася простая беларуская жанчына Надзея з фронту любімага і дарагога мужа, ні разу не ўбачыла бацьку дачка Валя. І толькі паляць сэрца салдацкія пісьмы...

Падрыхтаваў Л. Руціч.

С. Я. Глушэня.

ВЁСКА НЯХАЧАВА

БЕЛЬСКІ Франэк Альгердавіч, служыў у польскай арміі, загінуў у польска-нямецкую вайну.

БУКСА Мікалай Сямёнавіч, н. у 1919, у Чырвонай Арміі з 1940, загінуў у Польшчы.

ВЯРЫШКА Тумаш Піліпавіч, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў пад Варшавай, Польшча.

ГАРМАТНЫ Ціхан Уладзіміравіч, памёр ад ран 31.3.1945, пахаваны ў мяст. Надов, Германія.

ДЗЕМІДОВІЧ Аляксей Пятровіч, загінуў у 1945 пад Варшавай, Польшча.

МАЙСЯЕВІЧ Іван Пятровіч, загінуў у маі 1945, пахаваны ў с. Войшынг, Аўстрыя.

МАНЯКАЛА Уладзімір Сямёнавіч, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў в. Вайдэндорф, Аўстрыя.

ХМЯЛЕЎСКІ Баляслаў, у Чырвонай Арміі з 1940, загінуў у 1945 у Польшчы.

ХУТКА Васіль Міхайлавіч, н. у 1924, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у студзені 1945, пахаваны каля г. Каліша, Польшча.

ХУТКА Пётр Міхайлавіч, н. у 1926, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у студзені 1945, пахаваны каля г. Каліша, Польшча.

ВЁСКА РАЗМЕРКІ

АЛЕКСІЕВІЧ Васіль Францавіч, н. у 1900, загінуў 10.10.1944 на р. Нараў, Польшча.

ГОЙШЫК Антон Мікалаевіч, н. у 1901, загінуў 14.12.1944 на р. Вісла, Польшча.

ГОЙШЫК Іван Мікалаевіч, н. у 1908, загінуў 18.3.1945 у Германіі.

ЖЫГАР Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1913, загінуў 28.4.1945 пад Берлінам, Германія.

ЖЫГАР Аляксей Мікалаевіч, н. у 1911, загінуў 3.8.1944 у Польшчы.

ЖЫГАР Канстанцін Іванавіч, н. у 1922, у Чырвонай Арміі з 1940, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЖЫГАР Мікалай Максімавіч, н. у 1923, сярж. 692 сп, меў медаль «За адвагу», загінуў 27.4.1945, пахаваны ў г. Цыбінген, Германія.

СЛІНКА Аляксандр Іванавіч, н. у 1907, загінуў 10.10.1944 на р. Нараў, Польшча.

СЛЯСАРЧЫК Уладзімір Канстанцінавіч, н. у 1926, загінуў 15.2.1945,пахаваны ў г. Костэн, Германія.

ШУРУБЕЙКА Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1906, загінуў 9.5.1945 пад Берлінам, Германія.

ВЁСКА СТАЙКІ

ВАЛІНСКІ Іван Сцяпанавіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Жыхова-Велькі, Польшча.

ГЛУШЭНЯ Сцяпан Якаўлевіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Пальцых, Усх. Прусія.

ДОЎСТА Самуіл Якаўлевіч, н. у 1900, у Чырвонай Арміі з ліпеня 1944, загінуў у 1945 у Венгрыі.

ЕРЭМЧУК Іван Пятровіч, загінуў у студзені 1945.

КУРЫЛЬЧЫК Рыгор Рыгоравіч, н. у 1908, загінуў у 1945, пахаваны ў в. Ганя пад Варшавай, Польшча.

МІХНЮК Аляксей Майсеевіч, н. у 1922, загінуў у 1944 у Літве.

МІХНЮК Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1916, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Лаўціні, Латвія.

НІКАЛАЙЧЫК Міхаіл Дзям'янавіч, н. у 1908, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Бобы Варшаўскага ваяв., Польшча.

НОВІК Іван Міхайлавіч, н. у 1908, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Закрэнт, Польшча.

НОВІК Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1900, загінуў у 1945, пахаваны ў в. Грамэн, Усх. Прусія.

ПАРХОМІК Аляксандр Антонавіч, загінуў у снежні 1944.

ПАРХОМІК Рыгор Іванавіч, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Закрэнт, Польшча.

РАСТАРГУЕЎ Іван Іванавіч, загінуў у красавіку 1942 у Ленінградскай вобл.

РЫЖКО Павел Васільевіч, н. у 1912, загінуў 24.2.1945, пахаваны ў г. Франкфурт, Германія.

ФАЛІТАРЫК Сяргей Мікітавіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Рускія Бруды, Польшча.

ШАМЯРЭЙ Павел Фёдаравіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Грунаў, Усх. Прусія.

ШАМЯРЭЙ Кірыл Ягоравіч, н. у 1917, загінуў у 1944, пахаваны ў г. Чэрск, Польшча.

ШЫЛА Канстанцін Емяльянавіч, н. у 1918, загінуў у 1945.

ШЭЛЕСТ Пракоп Міхайлавіч, н. у 1918, загінуў у 1943 у Ленінградзе.

ЮХНАВЕЦ Павел Рыгоравіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Скаміе, Германія.

ВЁСКА ЮКЕВІЧЫ

АНДРЭЙЧЫК Ігнат Іосіфавіч, памёр ад ран 3.12.1944, пахаваны ў в. Поніка-Мала, Польшча.

ВАРАБЕЙ Канстанцін Пятровіч, н. у 1904, загінуў у 1944.

ВЫСОЦКІ Пётр Андрэевіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Бжэц, Польшча.

ЗАЛОГА Сцяпан Мікалаевіч, н. у 1910, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Закрэнт, Польшча.

КОТАЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1896, загінуў у лістападзе 1943.

МАКАРЧЭНЯ Барыс, прапаў без вестак.

НЕВЯРОЎСКІ Канстанцін Пракопавіч, н. у 1919, загінуў у 1944.

СІТКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, памёр ад ран у шпіталі ў 1944.

СУХАНОСІК Пётр Піліпавіч, н. у 1907, прапаў без вестак на Одэрскім плацдарме, Германія.

ХАРЭВІН Канстанцін Канстанцінавіч, загінуў у студзені 1945.

ЦЕЛЯХАНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА ВУЛЬКА-ЦЕЛЯХАНСКАЯ

ВАЛЧКЕВІЧ Фёдар Максімавіч, загінуў у 1945 на р. Одэр, Германія.

ГАПОНІК Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1924, загінуў у 1945 пад Берлінам, пахаваны ў в. Нойхардэнберг, Германія.

ДЗЯГЦЯРЫК Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1917, загінуў у 1944.

КАЛЕСНІКОВІЧ Сяргей Іванавіч, памёр ад ран 15.3.1945, пахаваны ў г. Ворандзіт, Усх. Прусія.

КОТ Аляксей Іванавіч, н. у 1914, прапаў без вестак у 1945.

КРЫНКА Яфім Андрэевіч, н. у 1910, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Кюстрын, Германія.

КУПРЫЯНЧЫК Павел Якаўлевіч, не вярнуўся з вайны.

КУПРЫЯНЧЫК Пётр Мікалаевіч, загінуў у 1945.

КУПРЫЯНЧЫК Фёдар Якаўлевіч, памёр ад ран 21.4.1945, пахаваны ў г. Дэбрэцэн, Венгрыя.

КУРАТНІК Мацвей Цімафеевіч, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў в. Мельнесдорф, Германія.

ЛАНЕЦ Аляксей Васільевіч, памёр ад ран 11.3.1945, пахаваны ў в. Галіц, Германія.

МАКАРСКІ Мікалай Платонавіч, памёр ад ран 30.1.1946.

МАКАРСКІ Платон Платонавіч, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Гута, Польшча.

МЯЛІК Аляксей Міхайлавіч, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

МЯЛІК Мікалай Мікалаевіч, загінуў у 1945.

МЯЛІК Міхаіл Васільевіч, н. у 1900, загінуў у 1945 у Польшчы.

МЯЛІК Рыгор Іванавіч, н. у 1927, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Хатвін, Венгрыя.

МЯЛІК Рыгор Мікалаевіч, н. у 1904, загінуў у снежні 1944 на р. Вісла, Польшча.

МЯЛІК Рыгор Мікалаевіч, н. у 1923, загінуў у жніўні 1944 каля р. Вісла, Польшча.

МЯЛІК Уладзімір Якаўлевіч, загінуў у 1945.

МЯЛІК Фёдар Васільевіч, н. у 1912, загінуў у 1944 у Польшчы.

МЯЛІК Фёдар Максімавіч, загінуў у 1945, пахаваны ў в. Бжэсце, Польшча.

МЯЛІК Якаў Сцяпанавіч, прапаў без вестак.

САЎЦІН Рыгор Рыгоравіч, н. у 1925, загінуў у лютым 1945.

САЎЦІН Уладзімір Сцяпанавіч, загінуў у красавіку 1945.

СТРУНЕЎСКІ Апанас Мікітавіч, н. у 1922, загінуў у студзені 1945,пахаваны ў в. Чанкі, Польшча.

СТРУНЕЎСКІ Мікалай Мікітавіч, н. у 1911, загінуў у 1945 на р. Одэр, Германія.

СТРУНЕЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1922, загінуў у 1945 у Германіі.

СТРУНЕЎСКІ Фёдар Мікалаевіч, загінуў у жніўні 1944.

ХАМУШКА Аляксей Пятровіч, н. у 1925, прапаў без вестак.

ХОМІЧ Павел Мікалаевіч, н. у 1923, загінуў 13.4.1945, пахаваны ў в. Ціфшофзэе, Германія.

ЮРКЕВІЧ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1921, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

ЮРКЕВІЧ Радзівон Фёдаравіч, н. у 1910, загінуў у 1945, пахаваны ў г. Нідэрзэе, Германія.

ВЁСКА ГОРТАЛЬ

АРЦЮХ Мікалай Каленікавіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

ВАКУЛЬЧЫК Майсей Ціханавіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Коханув Радомскага пав., Польшча.

ВІКТАРОВІЧ Мікалай Данілавіч, н. у 1922, загінуў у верасні 1944, пахаваны на хут. Нурлежы Рыжскага р-на, Латвія.

ГАЛАВАЧ Максім Рыгоравіч, загінуў у красавіку 1945.

ГАЛАВАЧ Павел Міхайлавіч, н. у 1927, загінуў у 1944, пахаваны ў г. п. Лагішын Брэсцкай вобл.

ГАПОНІК Васіль Васільевіч, прапаў без вестак у 1945.

ГАПОНІК Мікалай Васільевіч, н. у 1912, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

ГАПОНІК Мікалай Данілавіч, н. у 1912, загінуў у 1945, пахаваны ў г. Лізерытц, Германія.

ГУЛЯЙКА Пётр Ігнатавіч, загінуў у студзені 1945 ва Усх. Прусіі.

ДЗЯГЦЯРЫК Уладзімір Мікалаевіч, загінуў у 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

КАВАЛЕВІЧ Павел Тарасавіч, памёр ад ран 30.4.1945, пахаваны ў г. Інстэнбург, Германія.

КАЗЛОЎСКІ Фёдар Андрэевіч, н. у 1925, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Мізерытц, Германія.

КУРАТНІК Павел Купрыянавіч, н. у 1909, загінуў у 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

МІСЮРА Якаў Мікітавіч, н. у 1909, загінуў 21.11.1944, пахаваны ў г. Кікельнішкель, Усх. Прусія.

МЯЛІК Дзмітрый Сцяпанавіч, н. у 1918, загінуў 9.2.1945 пад Кёнігсбергам.

РАДЗЬКО Міхаіл Дзмітрыевіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Сільканова, Польшча.

РАК Мікалай Трафімавіч, н. у 1921, загінуў у 1944 пад г. Рыга.

САЎЧУК Мікалай Пятровіч, н. у 1905, загінуў у 1945, пахаваны ў в. Боят, Польшча.

ФЯДКОВІЧ Васіль Міхайлавіч, н. у 1927, загінуў 16.1.1945, пахаваны ў в. Колбасен, Усх. Прусія.

ФЯДКОВІЧ Сямён Іванавіч, н. у 1909, загінуў у 1945, пахаваны ў в. Піске, Германія.

ФЯДКОВІЧ Сцяпан Рыгоравіч, загінуў у лютым 1945 на р. Одэр, Германія.

ЮНЧЫК Павел Міхайлавіч, н. у 1919, прапаў без вестак у 1942.

ЮНЧЫК Рыгор Кузьміч, н. у 1927, загінуў у 1945, пахаваны ў в. Шыльгален, Усх. Прусія.

ЮНЧЫК Сяргей Сямёнавіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Ліпнікен, Усх. Прусія.

ЮНЧЫК Уладзімір Антонавіч, н. у 1923, загінуў у 1945 у Германіі.

ЯКІМОВІЧ Іван Дзмітрыевіч, загінуў у 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

ВЁСКА СОМІНА

АБРАМЧУК Мікалай Антонавіч, н. у 1918, загінуў у 1941 у Карэліі.

АБРАМЧУК Мікалай Васільевіч, н. у 1926, загінуў 14.1.1945, пахаваны ў в. Клікава Радомскага пав., Польшча.

АБРАМЧУК Міхаіл Антонавіч, загінуў 20.4.1945 у Германіі.

АБРАМЧУК Рыгор Аляксандравіч, н. у 1914, памёр ад ран 31.10.1944, пахаваны ў г. Каламуйжа.

АБРАМЧУК Уладзімір Васільевіч, н. у 1925, загінуў у 1944.

АЛЯКСЕЕВІЧ Васіль Мікалаевіч, н. у 1912, не вярнуўся з вайны.

АЛЯКСЯЕВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1924, загінуў у ліпені 1943, пахаваны ў в. Красны Бор Ленінградскай вобл.

Курган Памяці ў Целяханах.

КАЗЛОЎСКІ Павел Дзмітрыевіч, н. у 1919, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Шапаны, Венгрыя.

КАПЫЦІЧ Аляксей Іосіфавіч, н. у 1926, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Модры-Камень, Чэхаславакія.

КАРМАНОВІЧ Юрый Ігнатавіч, н. у 1925, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў г. Франкфурт, Германія.

КАРМАНОВІЧ Юрый Якаўлевіч, н. у 1924, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў в. Рудэрсдорф, Германія.

ЛЕАНОВІЧ Іван Кірылавіч, н. у 1914, не вярнуўся з вайны.

СІНКЕВІЧ Адам Васільевіч, н. у 1913, прапаў без вестак у 1944.

ХАЛАДОВІЧ Фёдар Іосіфавіч, н. у 1910, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Уладзімір-Валынскі.

ЮНЧЫК Іван Паўлавіч, памёр ад ран 7.11.1944 у Польшчы.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ЦЕЛЯХАНЫ

АБРАМЧУК Іван Рыгоравіч, н. у 1917, прапаў без вестак у красавіку 1945.

АНІСЬКА Вікенцій Данілавіч, н. у 1922, памёр ад ран 14.2.1945, пахаваны ў г. Познань, Польшча.

АНІСЬКА Міхаіл Аксенцьевіч, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў в. Пельгжымоўцы, Польшча.

БАГДАНОВІЧ Фёдар Зіноўевіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Ясініца, Польшча.

БАНДАРЭНКА Максім Мінавіч, н. у 1902, загінуў у 1943 у Ганцавіцкім р-не.

БІНКЕВІЧ Аляксей Адамавіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

БІНКЕВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1919, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Трэцін, Германія.

БІНКЕВІЧ Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1923, загінуў 3.1.1945, пахаваны ў в. Лясэк, Польшча.

ВАКУЛЬЧЫК Іосіф Лук'янавіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Кюстрын, Германія.

ВІКТАРОВІЧ Аляксандр Рыгоравіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Адамувка, Польшча.

ВІКТАРОВІЧ Зіновій Васільевіч, н. у 1922, загінуў у красавіку 1945 у Берліне, Германія.

ВІКТАРОВІЧ Зіновій Дзям'янавіч, н. у 1910, загінуў 8.5.1945 у Германіі.

ВІКТАРОВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1918, загінуў у сакавіку 1942, пахаваны на Пескароўскіх могілках у Ленінградзе.

ВІКТАРОВІЧ Мікалай Андрэевіч, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Гарбатка, Польшча.

ВІКТАРОВІЧ Мікалай Васільевіч, н. у 1912, загінуў 11.4.1945 у Германіі.

ВІКТАРОВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

ВІКТАРОВІЧ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1922, загінуў у 1945 у Германіі.

ВІКТАРОВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1925, прапаў без вестак у лютым 1945.

ВІКТАРОВІЧ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1919, загінуў у 1945 у Германіі.

ВІКТАРОВІЧ Рыгор Рыгоравіч, н. у 1924, загінуў у 1945 у Германіі.

ВІКТАРОВІЧ Уладзімір Зіноўевіч, н. у 1925, загінуў у лістападзе 1944, пахаваны на хут. Звіч (Звін?), Латвія.

ГАПАНОВІЧ Георгій Аляксандравіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў маёнтку Гедаў, Усх. Прусія.

ГЕРТАЛЬ Іван Іванавіч, прапаў без вестак у 1941.

ДАЛГОЎ Васіль Пятровіч, н. у 1913, прапаў без вестак у лістападзе 1941.

ЖУРАЎЛЁЎ Якаў Піліпавіч, н. у 1907 у г. Вялікія Лукі, загінуў у маі 1945 у Латвіі.

ЖЫВАЛОВІЧ Мікалай Максімавіч, н. у 1915, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў г. Лебус, Германія.

ІВАНОЎ Георгій Кузьміч, н. у 1919, загінуў у 1945 у Германіі.

ІВАНОЎ Міхаіл Кузьміч, н. у 1921, загінуў у лютым 1945 у Германіі.

КАВАЛЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1910, загінуў у 1944.

КАЛЕНІК Іван Міхеевіч, прапаў без вестак у студзені 1945.

КАПЫЦІЧ Ілья Андрэевіч, загінуў у красавіку 1945, пахаваны ў г. Фінцыхоў, Германія.

КЛІМОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, прапаў без вестак у лютым 1945.

КОТ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1911, загінуў у студзені 1945, пахаваны ў в. Піске, Германія.

КРЫЛОЎ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1911, прапаў без вестак у снежні 1942.

КРЫНЕЦ Васіль Сямёнавіч, н. у 1922, загінуў 10.8.1944, пахаваны ў в. Хадоры, Польшча.

КРЫНЕЦ Іван Міхайлавіч, н. у 1926, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Пуканец, Чэхаславакія.

КУДРАЎЦАЎ Мікалай Канстанцінавіч, н. у 1912, прапаў без вестак у верасні 1944.

КУЛІКОЎ Васіль Сідаравіч, н. у 1925, загінуў у 1944 каля Пінска.

ЛЕДЗЯНКОЎ Данііл Мікалаевіч, н. у 1895, загінуў 14.7.1944, пахаваны ў г. Лёзна Віцебскай вобл.

МАМЧЫЦ Ульян Сцяпанавіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Камаровіца, Польшча.

МІЛЕЎСКІ Мікалай Георгіевіч, загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Голіц, Германія.

МІХАЙЛАЎ Мікіта Міхайлавіч, н. у 1902, прапаў без вестак у верасні 1944.

МАЯКОЎ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1921 у в. Унічкава Калінінскай вобл., мал. сярж., загінуў у лютым 1945, пахаваны ў в. Бохнія, Польшча.

ПЯТРОЎ Іван Пятровіч, н. у 1903, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

РАК Васіль Сямёнавіч, н. у 1909, загінуў у 1945, пахаваны ў г. Кюстрын, Германія.

РАМАДАНАЎ Ілья Андрэевіч, н. у 1922, прапаў без вестак у лютым 1942.

САГАНОВІЧ Мікалай Ніканавіч, н. у 1925, загінуў у верасні 1944, пахаваны на хут. Гаранчы, Латвія.

ТУРЧЫК Аляксандр Іванавіч, н. у 1909, загінуў у 1945 у Германіі.

ФЯДКОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, загінуў у кастрычніку 1944, пахаваны ў в. Кігівульна, Польшча.

ХАЛАДОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1926, загінуў у 1945.

ХАЛАДОВІЧ Мікалай Мікалаевіч, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ХОМІЧ Васіль Рыгоравіч, н. у 1922, загінуў у сакавіку 1945, пахаваны ў г. Трэцін, Германія.

ЦІХАНЧУК Міхаіл Васільевіч, прапаў без вестак у студзені 1945.

ЮРКЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, прапаў без вестак у лютым 1945.

ВЁСКА КРАГЛЕВІЧЫ

БАНЧУК Мікалай Іванавіч, н. у 1924, загінуў у 1944 у Германіі.

БАНЧУК Міхаіл Купрыянавіч, н. у 1910, загінуў у 1945 у Польшчы.

ГАЛОЎЧЫК Іван Міхайлавіч, н. у 1919, загінуў у 1941 каля Ленінграда.

ГАЎРУСІК Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1925, прапаў без вестак.

ГАЦУКОВІЧ Пётр Пятровіч, н. у 1922, прапаў без вестак.

ДЗЯГЦЯРЫК Аляксей Аляксеевіч, н. у 1912, загінуў у 1943 у Германіі.

КАЗЛОЎСКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1920, загінуў у 1945 у Польшчы.

КАРМАНОВІЧ Іван Макаравіч, н. у 1924, загінуў у 1945 у Польшчы.

КАРПОВІЧ Пётр Мікалаевіч, загінуў у 1945 у Германіі.

КАТКАВЕЦ Аксенцій Фёдаравіч, загінуў у 1945 ва Усх. Прусіі.

ЛАДОДЗІК Міхаіл Рыгоравіч, загінуў у 1944 у г. Чэлябінск.

ЛАДОДЗІК Рыгор Навумавіч, н. у 1906, загінуў 27.1.1945 ва Усх. Прусіі.

СТРУНЕЎСКІ Аляксей Мікітавіч, загінуў у 1944 у г. Чэлябінск.

ЦІХАНЧУК Сямён Трафімавіч, загінуў у 1945 на р. Одэр, Германія.

ЮНЧЫК Харытон Іванавіч, не вярнуўся з вайны.

ЯРУТА Фёдар Міхайлавіч, н. у 1924, прапаў без вестак у 1945.

ЯГЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАЛЕНЧЫЦЫ

БУКШТА Рыгор Лявонцьевіч, рад., загінуў 23.10.1944 ва Усх. Прусіі.

КРАЎЧЭНЯ Міхаіл Васільевіч, н. у 1911, рад., загінуў 13.12.1944 у Чэхаславакіі.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Раманавіч, рад., загінуў 19.1.1945 ва Усх. Прусіі.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1924, загінуў у студзені 1945.

МАКАРЭВІЧ Андрэй Фёдаравіч, загінуў 21.10.1944 ва Усх. Прусіі.

МАКАРЭВІЧ Іван Фёдаравіч, рад., загінуў 22.3.1945 у Германіі.

МАКАРЭВІЧ Сямён Раманавіч, загінуў 1.2.1945 у Германіі.

МАКАРЭВІЧ Фёдар Раманавіч, мал. сярж., загінуў 3.9.1944 у Польшчы.

МІНЧУК Іван Іванавіч, загінуў у 1941.

МІНЧУК Мікалай Фадзеевіч, загінуў у 1943.

МОЛАШ Фёдар Андрэевіч, загінуў 26.1.1945, пахаваны ў Мінску.

МУЦА Павел Сямёнавіч, загінуў 24.3.1945.

ПІВАВАРАЎ Яфім Цімафеевіч, н. у 1913, сярж., загінуў у 1945, пахаваны ў г. Кракаў, Польшча.

ПЫТЛЯК Канстанцін Уладзіміравіч, загінуў у 1944.

ВЁСКА ГІЧЫЦЫ

БРЫЧ Васіль Кандратавіч, н. у 1911, загінуў 1.3.1945, пахаваны ў г. Цаптэн, Германія.

КУРАТНІК Пётр Барысавіч, н. у 1903, рад., загінуў 19.4.1945, пахаваны ў в. Унтэрдорф, Аўстрыя.

МІНЧУК Іван Іванавіч, прапаў без вестак у 1945.

МІХІНКЕВІЧ Канстанцін Іванавіч, рад., загінуў 20.2.1945, пахаваны ў г. Берштaль, Германія.

МОЛАШ Міхаіл Кузьміч, рад., загінуў 9.3.1945 у Германіі.

МОЛАШ Міхаіл Трафімавіч, загінуў 17.1.1945.

МУЦА Павел Сямёнавіч, загінуў 24.3.1945 у Германіі.

РЫЖКО Павел Васільевіч, н. у 1912, загінуў у 1945 пры фарсіраванні р. Одэр, Германія.

САЯВЕЦ Антон Міхайлавіч, н. у 1912, прапаў без вестак у 1945.

СЕГЯНЕВІЧ Васіль Васільевіч, прапаў без вестак у красавіку 1945.

ФЕДАРКЕВІЧ Андрэй Мікалаевіч, прапаў без вестак у 1944.

ЦІМАШЭВІЧ Сямён Герасімавіч, н. у 1900, загінуў у чэрвені 1941.

ВЁСКА ЯГЛЕВІЧЫ

АСІПІК Васіль Паўлавіч, н. у 1910, загінуў 18.1.1945 ва Усх. Прусіі.

АСІПІК Пётр Андрэевіч, н. у 1915, загінуў 2.2.1945, пахаваны ў г. Кінітаў, Германія.

АСІПІК Сцяпан Паўлавіч, рад., загінуў 27.4.1945 пад Берлінам, Германія.

БАХУР Васіль Іванавіч, н. у 1924, рад., загінуў 4.9.1944, пахаваны ў в. Залубіцы, Польшча.

БАХУР Васіль Паўлавіч, н. у 1918, прапаў без вестак у 1944.

ГОРБАЧ Аляксандр Фаміч, н. у 1921, загінуў у 1944 у Польшчы.

ГРУШЫК Іван Канстанцінавіч, н. у 1926, памёр ад ран у 1945.

ГРУШЫК Канстанцін Кандратавіч, н. у 1900, рад., загінуў у 1945 у Германіі.

ДАШЭВІЧ Міхаіл Максімавіч, рад., загінуў 16.4.1945 у Германіі.

ДАШЭВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1945.

ЗУЕЎ Аляксандр Венядзіктавіч, загінуў у верасні 1944.

МІНЧУК Мікалай Фёдаравіч, рад., загінуў 22.2.1945 ва Усх. Прусіі.

МОЛАШ Васіль Іосіфавіч, н. у 1921, мал. сярж., загінуў 18.9.1944 у Латвіі.

МОЛАШ Іосіф Рыгоравіч, н. у 1920, прапаў без вестак у лютым 1945.

МОЛАШ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1919, рад., загінуў у 1944.

МОЛАШ Фёдар Аляксандравіч, н. у 1919, загінуў у 1944.

ПЫТЛЯК Васіль Іванавіч, н. у 1924, рад., загінуў у 1945, пахаваны ў в. Славянская Гута, Чэхаславакія.

ПЫТЛЯК Дзмітрый Віктаравіч, н. у 1919, рад., загінуў на савецка-фінскай вайне 1939.

ПЫТЛЯК Уладзімір Кірылавіч, н. у 1925, рад., загінуў у 1944 у Польшчы.

ПЫТЛЯК Іван Фёдаравіч, рад., загінуў 23.1.1944 у Чэхаславакіі.

ПЫТЛЯК Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1926, рад., загінуў 1.9.1944, пахаваны ў г. Волагда.

ПЫТЛЯК Уладзімір Сяргеевіч, загінуў у 1944 пад Варшавай, Польшча.

ШЫБАЙКА Васіль Іванавіч, н. у 1925, загінуў у 1944.

ЯКАЎЛЕЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1914, рад., загінуў у 1945.

Воіны Чырвонай Арміі, якія выратаваліся з фашысцкага палону, пайшлі ў партызаны і ўдзельнічалі ў вызваленні Івацэвіцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

ГАЎРЫЛАЎ (АЛЯКСАШКІН) Пётр, часова жыў у в. Ёдчыкі, загінуў у партызанах.

ЖЫЛКІН Аляксандр Фёдаравіч, часова жыў у в. Ёдчыкі, загінуў у партызанах.

КАРЧАГІН Міхаіл, часова жыў у в. Квасевічы, загінуў у партызанах.

РАДЗІВОНАЎ Павел Іванавіч, часова жыў у в. Ёдчыкі, загінуў у партызанах.

СІВЫ (СЕРЫ) Мікалай, часова жыў у в. Ёдчыкі, загінуў у партызанах.

ЦЮЦЮМА (КАНАПЛЯНІК) Рыгор, часова жыў у в. Ёдчыкі, загінуў у партызанах.

Заўвага: названыя байцы разам з мясцовымі патрыётамі з'яўляюцца арганізатарамі партызанскага руху ў Гута-Міхалінскім лесе. Малаверагодна, што прозвішчы іх сапраўдныя.

АСНОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ, ЯКІЯ ПРЫНЯТЫ Ў СПІСАХ

авіяц. — авіяцыйны
арт. — артылерыйскі
в. — вёска
в/ч — вайсковая часць
вобл. — вобласць
г. — год, горад
г.п. — гарадскі пасёлак
гв. — гвардзейскі, гвардыі
інш. — іншыя
кав. — кавалерыйскі
кап. — капітан
лейт. — лейтэнант
мал. (мл.) — малодшы
н. — нарадзіўся
п/п — палявая пошта
палк. — палкоўнік
пас. — пасёлак
рад. — радавы
р-н — раён
с. — сяло
сд — стралковая дывізія
сп — стралковы полк
с/с — сельсавет
ст. — старшы, станцыя
старш. — старшына
сярж. — сяржант
танк. — танкавы
Чырв. — Чырвоная (Армія)
яфр. — яфрэйтар

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

І. У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Гады аднаўлення

На часова акупіраванай тэрыторыі былога Косаўскага раёна фашысты знішчалі савецкіх людзей, гналі іх на катаргу ў Германію, грабілі і разбуралі прадпрыемствы. У раёне захопнікі поўнасцю спалілі 11 вёсак, многія школы, клубы, бальніцы, знішчылі 2230 жылых дамоў і 2877 гаспадарчых пабудоў; 1969 сем'яў засталіся без жылля.

Старшыня Косаўскага райвыканкома М. Р. Шугаеў 1 мая 1946 года ў артыкуле «Перспектывы развіцця народнай гаспадаркі нашага раёна ў новай сталінскай пяцігодцы», надрукаваным у газеце «Чырвоная звязда», сведчыў: «За ўвесь перыяд акупацыі немцы спалілі або разбурылі ўсе буйныя і дробныя прадпрыемствы, а абсталяванне іх вывелі са строю. Сельскай гаспадарцы нанесены яшчэ большыя страты. Немцы абрабавалі і знішчылі ўвесь сельгасінвентар Івацэвіцкай МТС, адабралі ў сялян амаль усіх коней, кароў, дробную жывёлу і птушку».

Аднаўленчыя работы пачаліся з першых дзён вызвалення раёна. Патрэбна была вялікая напружаная дзейнасць, каб залячыць раны вайны і пайсці наперад. «За пяцігодку аднаўлення (1946—1950) трэба было, — пісаў М. Р. Шугаеў, — па лініі прамкамбіната ўвесці ў дзеянне лесапільны завод у Косаве, Квасевіцкі цагельны завод, цагельна-чарапічныя прадпрыемствы ў Альшаніцах, Бусяжы, Любішчыцах, Сенькавічах, бетонны завод у Косаве, завод безалкагольных напояў, крухмала-патачны і павідла-цукровы заводы ў Косаве, развіць на вёсцы бондарную, вяровачную, кавальскую, кравецкую і колавую вытворчасці. Прамкааперацыя намячала будаўніцтва цагельнага завода ў Заполлі, які ўжо ў 1949 годзе павінен быў даваць 6 мільёнаў штук цэглы. Пачалася здабыча торфу на паліва каля Гічыц і Гошчава.

Велізарная роля па аднаўленню разбураных прадпрыемстваў адводзілася райпрамкамбінату. За перыяд з 17 ліпеня 1944 года па 10 снежня 1947 года ім адноўлены млын і электрастанцыя ў Косаве, адрамантавана гарадская электрасетка. У жніўні 1944 года пры млыне быў зноў пабудаваны маслабойны цэх. Адноўлены вадзяны млын у Бусяжы, зноў пабудавана крупадзёрка. У тым жа годзе ў Косаве адноўлена майстэрня па выпуску чарапіцы. У наступным годзе ў Любішчыцах пабудавана кузня, у Хадаках — паравы млын, пры якім у наступным годзе ўстаноўлена

цыркулярная піла для распілоўкі лесу сялянам.

На трох цагельных заводах дзейнічалі печы па абпальванню. У 1947 годзе ў Косаве аднавіў работу лесапільны завод з піларамай і майстэрнямі: сталярнай, абутковай, швейнай, слясарнай, бляхарнай, рымарскай, абозна-колавай, кузняй. У Любішчыцах існавалі сталярная, абуткавая і швейная майстэрні, а таксама кузня, у Бусяжы — сталярня, у Квасевічах — гарбарня. Пры райпрамкамбінаце ўзнікла падсобная гаспадарка на 7 гектараў ворнай зямлі, з пяццю коньмі і трыма машынамі.

У першы пасля вызвалення год пачалі працаваць лесазавод № 13, лесазавод № 1, спіртзавод, смалакурны завод, нанава пабудаваны лесазавод ДСР-4, два цагельныя заводы з гофманскімі печамі (Квасевічы і Заполле) магутнасцю па 1,5 мільёна штук цэглы ў год.

З ліпеня 1944 г. па 25 лістапада 1947 года на прадпрыемствах працавала ўжо 1983 чалавекі. За гэты перыяд пабудавана і адноўлена 1234 жылыя дамы і 561 гаспадарчая пабудова, 27 культурна-бытавых будынкаў, у тым ліку 22 школы. У час нядзельнікаў нарыхтоўвалася драўніна, выраблялася цэгла і г. д. Для ўдоў-салдатак, якія жылі ў зямлянках, пабудавана бясплатна 11 дамоў. За гэты перыяд выплачана дзяржаўная дапамога мнагадзетным і адзінокім маці ў суме 2 318 103 рублі. Адбыліся значныя зрухі ў развіцці спажывецкай кааперацыі і сельскай гаспадаркі.

За вырашэнне задач першай пасляваеннай пяцігодкі ў раёне разгарнулася шырокае сацыялістычнае спаборніцтва. У Косаўскім райпрамкамбінаце слесар Іван Маставы, токар Георгій Карніеўскі, абоднік Васіль Бонда, сталяр Сцяпан Гаўрусік выконвалі дзённыя заданні на 125—140 працэнтаў. У сталярнай майстэрні пачалі выпуск мяккай мэблі. Дарэчы, з гэтага моманту ў Косаве пачалася вытворчасць мэблі і вырасла мэблевае вытворчае аб'яднанне. У 1949 годзе на Квасевіцкім цагельным заводзе механізавалі шматлікія працаёмкія працэсы. Пашырылася вытворчасць чарапіцы. На млыне № 2 у Косаве пачалі вырабляць высакаякасную пшанічную муку, а на крупадзёрцы — ячныя і грэцкія крупы, задзейнічалі сукнавальны цэх і воўначасалку.

Упоруч з актыўным аднаўленнем вытворчасці шырылася спаборніцтва за лепшыя вынікі працы на лесазаводзе № 13 у Івацэвічах, спіртзаводзе, прадпрыемствах хімлясгаса. На ўсіх майстэрскіх участках

Супрацоўнікі Косаўскага райваенкамата (РВК утвораны ў канцы ліпеня 1944 г.). Пасляваенны здымак.

хімлясгаса павялічылася здабыча жывіцы, смалы, на смалакурных заводах асвоена вытворчасць шкіпінару, вырабляўся драўняны вугаль для кузняў.

Выдатных вынікаў у 1949 годзе дабіліся ўчасткі: Буленскі (майстар Януш), Яблонкаўскі (майстар Семянчук), Сенькавіцкі (майстар Кухценя). Тут вытворчыя заданні па збору жывіцы перакрывалі ў 2—2,5 раза. Ужо ў 1949 завяршылі свае пяцігадовыя заданні рабочыя хімлясгаса Вера Зыбайла, Аляксандр Мошка і іншыя.

На лесапільным заводзе ў Івацэвічах былі не толькі адноўлены вытворчыя магутнасці даваеннага часу, але і ўстаноўлены новыя піларамы, узведзены тарны цэх. Расказваючы ў 1949 годзе пра аднаўленне гаспадаркі, рабочы лесазавода № 13 М. Ю. Мінюк адзначаў: «Лесазавод стаў маім домам. Разам з працоўным калектывам паднімаў яго з попелу і руін пасля выгнання немцаў. Тут працую і цяпер. У гэтым годзе я выканаў паўтары гадавыя нормы». Майстрам з залатымі рукамі звалі Міхаіла Юстынавіча завадчане. На гэтым заводзе слесар Уладзімір Кот, рамшчык Рыгор Рахавецкі і іншыя выконвалі вытворчыя заданні на 130—150 працэнтаў.

Першая пасляваенная пяцігодка для аднаўлення гаспадаркі патрабавала многа лесаматэрыялу: шахты — рудстойку, жыллёвае і вытворчае будаванне — брус, дошкі, пліты і іншы матэрыял. Івацэвіцкі раён — лясны. Таму тут былі створаны лесанарыхтоўчыя ўчасткі, якія выконвалі гэту важную задачу. Высокіх паказчыкаў па нарыхтоўцы і вывазцы драўніны дабіваліся Косаўскі і Яблонкаўскі лесаўчасткі. У 1947 годзе вызначылася камсамольска-маладзёжная брыгада вёскі Жытлін, якую ўзначальваў камсамолец Пётр Сівеня. 10 рабочых брыгад нарыхтавалі 3068 кубаметраў лесу, што склала 148 працэнтаў сезоннага плана. Высокай прадукцыйнасцю вызначаліся Іван Сівеня, Вера Міраноўская, Вольга Зайко, Мікалай Кулініч і Мікалай Сівеня. Сярод лесарубаў і возчыкаў Яблонскага лесаўчастка ў 1947 годзе вызначыліся Пётр і Уладзімір Пытлякі. Яны за сезон нарыхтавалі больш 2000 кубаметраў драўніны пры абавязацельстве 800. Перавыканалі сезоннае заданне па вывазцы драўніны лесавозчыкі Ілья Кузьміцкі, Рыгор Дашэвіч, Міхаіл Кронда.

Немцы знішчылі ў Косаўскім раёне вялікую колькасць сялянскіх двароў з жылымі дамамі і гаспадарчымі пабудовамі. Каля дзвюх тысяч сямей жылі ў зямлянках. Патрэбны былі велізарныя намаганні, каб ліквідаваць гэту бяду. І з руін і попе-

Дэлегаты 6-й раённай камсамольскай канферэнцыі, г. Івацэвічы, 28—29.1.1950 г.

лу ўздымаліся новыя дамы. Пакідаючы зямлянкі, у іх да 1947 года перасяліліся 880 сямей. За тры першыя гады ўпартай працы ў Жытлінскім сельсавеце, дзе былі спалены ўсе вёскі, з зямлянак перайшлі ў новыя дамы 209 сямей. Ім дапамагала дзяржава, сяляне суседніх вёсак. Для аднаўлення сёл Жытліншчыны дзяржава адпусціла бясплатна 3734 кубаметры будаўнічага лесу. Былі арганізаваны 4 нядзельнікі. У вёсцы Хадакі дом удаве Вользе Калевіч, муж якой загінуў на фронце, пабудавалі метадам народнай узаемадапамогі. Па гэтаму прыкладу пабудаваны дамы Софіі Клютко ў Корачыне, Ганне Кулініч у Жытліне. Тут ад лакамабіля Хадакоўскага млына ў хаты правялі электрычнасць.

У аднаўленчы перыяд вялікая ўвага ўдзялялася развіццю сельскай гаспадаркі. Акупанты адабралі ў сялян Косаўшчыны многія сотні гектараў зямлі, аднавілі на ёй памешчыцкія маёнткі, кулацкія ўладанні.

Ужо ў 1946 годзе сялянам было вернута 1700 гектараў зямельных угоддзяў, у тым ліку 1508 гектараў ворнай зямлі. Усяго зямлю атрымалі 1200 сялянскіх гаспадарак.

Але сялянскія гаспадаркі былі вельмі слабымі. На 1 студзеня 1946 года пагалоўе буйной рагатай жывёлы па параўнанню з даваенным скарацілася ў два разы і складала 13 690 галоў. Пагалоўе свіней складала 3188 галоў, авечак — 4208, што ў тры разы менш даваеннага. Коней засталося 6719.

Да пачатку вайны ў раёне было створана 5 калгасаў, якія фашысты разбурылі. Пасля вызвалення раёна ў 1944 годзе адноўлена 5 калгасаў і арганізаваны адзін новы. У іх уваходзілі 285 гаспадарак, якія валодалі 3857 гектарамі зямлі. У калектыўных гаспадарках налічвалася ў той час 189 коней, 13 кароў, 50 авечак, 47 свіней. Сярэдняя ўраджайнасць складала 7—8 цэнтнераў збожжа з гектара.

Хлебаробы раёна з энергіяй узяліся за ўздым вытворчасці. Асабліва ўзрасла працоўная актыўнасць з вяртаннем дамоў франтавікоў. Лепш стала апрацоўвацца зямля, аднаўляліся пасяўныя плошчы, нарошчвалася пагалоўе жывёлы. Але ўраджайнасць была яшчэ вельмі нізкай, метады работы на полі адсталыя, пераважала паўсюдна ручная праца з конскай цяглавай сілай. У 1949 годзе ўраджайнасць збожжавых складала ўсяго 6—7 цэнтнераў з гектара. І ўсё ж пагалоўе жывёлы расло. У 1950 годзе буйной рагатай жывёлы было ўжо 19 035 галоў, свіней — 10 527, авечак — 5492. На канец аднаўленчай пяцігодкі пасяўныя плошчы па раёну складалі 17 530 гектараў.

Дзяржава аказвала сялянам значную дапамогу ў аднаўленні вытворчасці. Створаная Івацэвіцкая МТС пачала аказваць дапамогу сялянам у сельскагаспадарчых работах. На канец 40-х гадоў у ёй было 10 трактароў і 3 грузавыя аўтамашыны. Пачалі працаваць курсы трактарыстаў.

У 50-я гады працягваўся рост сельскагаспадарчай вытворчасці. У гэты час з Івацэвіцкім злучылася большая частка Быценскага і Целяханскага раёнаў. У 1958 годзе пасяўныя плошчы склалі 37 950 гектараў.

У снежні 1958 года рэспубліканская газета «Калгасная праўда» пісала, што многія калгасы і саўгасы, якія рашуча прыняліся за асваенне лугоў і паш, ужо дасягнулі высокіх вынікаў. Гэта сельгасарцелі «Бальшавік» і імя Сталіна Івацэвіцкага раёна, імя Леніна і імя Сталіна Целяханскага раёна. Калгас «Бальшавік», якім кіраваў умелы арганізатар Васіль Рыгоравіч Мікуліч, ужо ў 1955 годзе меў 300 гектараў асвоеных зямель на балотах, дзе было ўведзена культурнае травасеянне і вырошчванне збожжавых культур. Акультураныя балоты сталі даваць столькі кармоў, што ўдосталь забяспечвалі сенам грамадскі статак і жывёлу калгаснікаў. Ужо ў той час у калгасе працавалі выдат-

ныя брыгадзіры паляводчых брыгад — Васілевіч, Мікалайчык, Гамаліцкі, звеняявая, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР В. Талочка. Вольга Сямёнаўна Талочка сабрала з кожнага гектара па 9,5 цэнтнера ільнасемя і столькі ж валакна.

Шырокі размах пачаў набываць рух за калектывізацыю вёскі. Яшчэ ў 1945 годзе група франтавікоў вёскі Сакоўцы арганізавала першы пасля вайны калгас «Перамога». У 1947 годзе аднавілі калектыўныя гаспадаркі, створаныя ў 1940—1941 гг. сяляне вёсак Любішчыцы, Яглевічы, Падстарынь, Быч. Праўда, у ходзе яго дзе-нідзе дапускаліся парушэнні прынцыпа добраахвотнасці, назіраліся выпадкі і непрыязных адносін да калектывізацыі некаторых сялян, мелі месца факты рэпрэсіўных мер да некаторых працаўнікаў калектывізацыі. Тым не менш да кастрычніка 1949 года ў былым Косаўскім раёне былі створаны 44 калектыўныя гаспадаркі сялян. Лепшыя з іх — імя Леніна, імя Сталіна, «Бальшавік».

Сяляне-аднаасобнікі, а ўслед за імі і арганізаваныя калгасы імкнуліся своечасова выконваць абавязацельствы перад дзяржавай. Сяляне вёскі Заполле ў 1947 годзе здалі дзяржаве звыш плана 793 пуды хлеба. Упарадзе здатчыкаў ішоў сельскі актыў. Першымі разлічыліся з дзяржавай па хлебапастаўках Іосіф Зайка, Антон Скуратовец, Міхаіл Ціток, Іван Шкурко, важак сельскай моладзі Антон Воўна.

У 1950 годзе калектывізацыя ў раёне была завершана. Пачаўся працэс арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў. Яны аб'ядноўваліся ў буйныя сельгасарцелі. На дапамогу ім прыйшла тэхніка Івацэвіцкай і новай Косаўскай МТС, пры якіх у 1950 годзе створаны палітаддзелы. Машынна-трактарныя станцыі папаўняліся трактарамі і рознай сельскагаспадарчай тэхнікай.

За перыяд акупацыі фашысты знішчылі ў раёне 31 школу, 3 бібліятэкі. А ўжо ў 1947 годзе працавала 53 школы, у тым ліку дзве сярэднія, 7 сямігадовых, 44 пачатковыя. У 1944/45 навучальным годзе кантынгент вучняў у школах склаў 5237, настаўнікаў — 137, у 1947/48 навучальным годзе — адпаведна 6420 і 209 чалавек. У 13 вячэрніх школах навучалася 474 вучні.

Адкрылася 14 хат-чытальняў і тры бібліятэкі, кінатэатр, прафсаюзны ДСК, два сельскія клубы, створаны дзве агітбрыгады, якія абслугоўвалі сялян. У час вайны была знішчана ўся лячэбная сетка раёна, а ўжо ў 1947 годзе дзейнічалі 20 медыцынскіх устаноў, у тым ліку тры бальніцы, тры амбулаторыі, дзве жаночa-дзіцячыя кансультацыі, дзяржсанстанцыя, эпідэміялагічная станцыя, пункт хуткай дапамогі, два пункты аховы здароўя, 6 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, дзіцячыя яслі. У медыцынскіх установах працавала 65 медработнікаў.

За гэты перыяд аднаўлення і далейшага развіцця дабіліся поспехаў і працоўныя Целяханскага і Быценскага раёнаў, якія ў 50-я гады ўвайшлі ў склад Івацэвіцкага раёна.

Што тычыцца Целяханскага раёна, то за гады вайны ён панёс велізарныя матэрыяльныя і людскія страты. Акупанты цалкам з людзьмі знішчылі вёскі Вяда, Тупічыцы, Красніца, амаль поўнасцю Бабровічы. Шмат шкоды панеслі і іншыя населеныя пункты раёна —у іх спалілі 1400 дамоў. Толькі людскія страты склалі каля трох тысяч забітых, замучаных, спаленых зажыва мірных грамадзян.

10 ліпеня 1944 года пасля трох жудасных год акупацыі Целяханскі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І адразу тут пачалася напружаная работа па аднаўленню разбуранага і будаўніцтву новага ў эканоміцы і культуры.

На пачатку 1945 года аднаўляюцца два калгасы з 6, у якіх аб'ядналася 54 гаспадаркі. Асноўнымі землекарыс-

тальнікамі былі сяляне-аднаасобнікі, 523 з якіх атрымалі ад дзяржавы дадаткова зямлю.

У адпаведнасці з землекарыстаннем размяжоўваліся і сялянскія гаспадаркі. У той час у раёне да аднаго гектара зямлі мелі 66 сялянскіх гаспадарак — ім належала 43,6 гектара. Ад 1 да 3 гектараў валодалі 737 сялян — ім належала 1602 гектары. Па 3—5 гектараў мелі 1072 гаспадаркі — ім належала 4283 гектары. Па 5—10 гектараў мелі 1102 гаспадаркі — ім належала 7924 гектары. Па 10—15 гектараў угоддзяў мелі 286 гаспадарак — ім належала 3476 гектараў. І больш 15 гектарамі валодалі 212 гаспадароў, якім належала 4579 гектараў. Так размяркоўваліся 127 178 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў у раёне. Вельмі слабай была цяглавая сіла ў вёсцы. З 3612 гаспадарак 1950 мелі па аднаму каню, а па два кані толькі 75 сялян. Адсутнасць коней адмоўна адбівалася на своечасовым правядзенні сельскагаспадарчых работ.

Цяжкім было становішча ў адноўленых калгасах. Як адзначалася ў пастанове бюро Целяханскага РК КП(б)Б ў лістападзе 1944 года, у калгасе імя Сталіна налічвалася толькі два кані, у калгасе «Серп і молат» — 9. Таму план сяўбы азімых той восенню гэтыя калгасы не змаглі выканаць.

Вялікія цяжкасці стаялі і перад дробнай мясцовай прамысловасцю.

Складанасці перажывала школьная справа. У 1944 годзе з 24 школ удалося аднавіць 20, а працу пачаць змаглі толькі 17. Астатнія з-за недахопу настаўнікаў не прынялі дзяцей. З 3811 дзяцей школьнага ўзросту наведвалі заняткі толькі 2381. Не было падручнікаў. Нават настаўнікі імі былі забяспечаны толькі на 20 працэнтаў. Патрэбнасць у наглядных дапаможніках забяспечвалася не больш чым на 5 працэнтаў. Для школ і кватэр настаўнікаў не хапала паліва.

Працоўным раёна прыйшлося прыкласці вялікія намаганні, каб узняць з руін і попелу вёскі, аднавіць паўсюдна вытворчасць, узняць яе прадукцыйнасць. І ў калгасах ураджайнасць не перавышала 7 цэнтнераў збожжавых з гектара. Таму адначасова з калектывізацыяй прымаліся меры па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. Да пачатку 1950 года ў вёсках раёна былі створаны калгасы, якія паступова ахапілі ўсіх сялян.

У цэлым Івацэвіцкі раён, залечваючы раны вайны, год за годам выходзіў на дарогу шырокага развіцця. Спрыяла гэтаму ў немалой ступені і актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця, высокі ўздым палітычнай і працоўнай актыўнасці. Людзі адчулі новы прыліў сіл. Ужо на першым раённым партыйным сходзе 25 лістапада 1944 года гучала заклапочанасць аб стане раёна. Распрацоўваліся меры па актывізацыі работы сярод людзей, па іх выхаванню і арганізацыі на актыўны ўдзел у грамадскім, палітычным і працоўным жыцці. На першай раённай камсамольскай канферэнцыі 18—19 лютага 1945 года ішла гарачая размова аб шляхах палітычнай і працоўнай актывізацыі моладзі.

Работу партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый узначалілі актывісты антыгітлераўскай вайны, былыя партызаны і падпольшчыкі, франтавікі. У Косаўскім раёне гэта першы сакратар РК КП(б)Б П. Кавалёў, затым С. Маркушын, старшыня райвыканкома В. Манахаў, затым М. Шугаеў, сакратар райкома камсамола Ф. Савін. Сельскія Саветы ўзначалілі А. Бандарык (Гошчава), А. Кулецкі (Стайкі), М. Крываль (Косава), М. Колтун (Яглевічы), М. Крокас (Грыўда), Г. Борсук (Яблонка), С. Дземідовіч (Бялавічы), К. Дрэнь (Волька) і іншыя. У б. Быценскім раёне гэта І. Я. Пархоўчанка, В. З. Іваноў, у Целяханскім — Пяроў, Хацкевіч і др.

У лютым 1946 г. адбыліся першыя пасляваенныя выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Працоўныя раёна абралі сваімі

дэпутатамі Краштафовіча Мірона Емяльянавіча, былога камісара партызанскай брыгады імя Панамарэнкі і Федасюк Аляксандру Іванаўну, актыўную ўдзельніцу арганізацыі партызанскага руху на Брэстчыне.

9 студзеня 1947 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы. Тады дэпутатамі Вярхоўнага органа ўлады рэспублікі ад раёна сталі старшыня райвыконкома М. Шугаеў і старшыня Быценскага сельсавета Е. Суржынская. На выбарах у Вярхоўны Савет БССР наступных скліканняў ад раёна выбіраліся галоўны заатэхнік калгаса імя Леніна І. Гойшык, аператар ВА «Івацэвічдрэў» Н. Палячок, галоўны аграном калгаса «Бальшавік» А. Сазончык, станочніца лыжнай фабрыкі М. Ціханчык.

Аднак першыя пасляваенныя гады не былі пазбаўлены памылак, парушэнняў законнасці. Як і да вайны, былі рэпрэсіраваны сотні невінаватых людзей. Сярод іх З. Мялік — загадчык базы райспажыўсаюза ў Целяханах, М. Лешка з Даманава, П. Гардзейчык з Гошчава і іншыя. Частка з іх выступала супраць калектывізацыі. Большасць рэпрэсіраваных у пазнейшыя часы былі рэабілітаваны.

Сур'ёзныя змены ў грамадска-палітычнае жыццё раёна, як і ўсёй краіны, прынеслі рашэнні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС 1953 года і наступных партыйных форумаў. Больш мэтанакіраванай і дзелавой станавілася дзейнасць мясцовых партыйных, савецкіх. камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

М. Банасевіч.

Аб чым пісала раёнка

Па старонках газеты «Чырвоная Звязда» за 1945—1946 гг.

1945 год

7 студзеня. За час крывавага «гаспадарання» на тэрыторыі раёна, паведамляла газета ў перадавым артыкуле, нямецка-фашысцкія разбойнікі расстралялі і спалілі жывымі 1975 чалавек. З іх 809 дзяцей, 760 жанчын, 406 старых. Вывезена на катаргу ў Германію 4405 чалавек.

Насельніцтва раёна вытрымала ўсе выпрабаванні і прынялося за аднаўленне разбуранага. Людзі аказалі і аказваюць усямерную дапамогу Чырвонай Арміі. У 1944 годзе ў фонд яе здадзена сялянамі 29 тысяч пудоў хлеба, 40 500 пудоў бульбы. Вялікая дапамога аказваецца падшэфным шпіталям. Задача на 1945 год — поўнасцю ліквідаваць вынікі нямецкай акупацыі.

16 студзеня. У сакавіку 1943 года быў спалены Жытлін. З прыходам з лесу жытлінцы тут жа ўзяліся за адбудову вёскі. На сённяшні дзень пабудавана 38 новых хат і 293 зямлянкі, а таксама новае памяшканне школы, у якім вучацца 104 вучні. З надыходам вясны жыхары вёскі возьмуцца за аднаўленне з новай сілай, каб да наступнай зімы ўсе жылі ў новых светлых дамах. У бібліятэцы Жытлінскай хаты-чытальні ўжо ёсць 106 кніжак.

14 лютага. У раёне распачата тэлефанізацыя сельсаветаў. Першымі тэлефанізавалі Альбінскі, Яглевіцкі і Гошчаўскі сельсаветы.

З кожным днём папаўняецца кніжны фонд Косаўскай бібліятэкі, у якой ужо размяшчаецца звыш паўтары тысячы кніг мастацкай, палітычнай і навуковай літаратуры, а пастаянны чытацкі актыў налічвае 150 чалавек рабочых, служачых, вучняў, сялян.

Камсамольцы і моладзь Івацэвіцкай дыстанцыі пуці сабралі 1781 рубель на пабудову танкавай калоны «Брэсцкі камсамолец».

18—19 лютага. У Косаўскім клубе прайшла першая раённая камсамольская канферэнцыя. У перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі, сказаў у дакладзе на канферэнцыі сакратар РК ЛКСМБ Ф. Савін, камсамольцы і перадавая несаюзная моладзь ішлі ў першых радах барацьбітоў. Звыш адной тысячы чалавек, сярод якіх 400 камсамольцаў, з'яўляліся байцамі партызанскіх атрадаў. 33 падпольныя

камсамольскія арганізацыі аказвалі партызанам неацэнную дапамогу разведкай і зборам неабходнай інфармацыі аб праціўніку. Цяпер камсамольцы і моладзь з'яўляюцца ініцыятарамі рамонту дарог і мастоў, аднаўлення школ і хат-чытальняў.

28 лютага. Праведзена раённая алімпіяда мастацкай самадзейнасці. Лепшыя вынікі паказалі самадзейныя артысты в. Скураты. Тры лепшыя нумары адабраны на абласную алімпіяду.

Тут жа расказваецца аб удзеле 60 юнакоў і дзяўчат у пераходзе па маршрутах Івацэвічы — Гошчава — Івацэвічы і Косава — Гошчава — Косава, прысвечаным 27-й гадавіне Чырвонай Арміі. Лепшых вынікаў дабіліся Антаніна Асіпік з Яглевіч і Ніна Рэкіш з Івацэвіч, якія пераадолелі адлегласць у 15 кіламетраў за 2 гадзіны 20 мінут.

Сакавік. Сяляне в. Любішчыцы выступілі з патрыятычным пачынам — не пакінуць пуставаўшым ніводнага кавалка зямлі. З гэтай мэтай разгорнуты збор насення ў фонд дапамогі сем'ям воінаў Чырвонай Арміі і партызан. 28 асабістых гаспадарак ужо сабралі 170 пудоў зерня. Гаўрыла Андрэевіч Бахур унёс у фонд дапамогі 25 пудоў, Якаў Карпавіч Бахур — 10 пудоў, Васіль Васільевіч Макар — 7, а Ганна Сцяпанаўна Макар, муж якой змагаецца на фронце, — 6 пудоў насення.

Добра падрыхтаваліся да сяўбы ў Грыўдзенскім сельсавеце. Тут хутка ідзе рамонт сельгасінвентару і ачыстка насення. Адрамантаваны 121 плуг, 120 барон, 27 культыватараў.

Пачынаючы з ліпеня 1944 года, сяляне раёна атрымалі з рук савецкай улады 863 гектары зямлі, у тым ліку сяляне Стайкаўскага сельсавета — 100, Любішчыцкага — 60, Сенькавіцкага і Яблонкаўскага — па 30 гектараў. Сялянцы вёскі Стайкі Таццяне Доўста, у якой зусім не было зямлі, выдзелена 3 гектары. Столькі ж атрымаў і Антон Пархомчык з гэтай жа вёскі.

Май. 1400 сем'яў франтавікоў і партызан атрымалі грашовую дапамогу, хлеб, бульбу. Ім адпушчана бясплатна 7,5 тыс. кубаметраў лесу, пабудавана 538 новых дамоў, 657 сем'ям воінаў прадастаўлены кватэры.

19 ліпеня. У раён ранішнім поездам прыбылі першыя дэмабілізаваныя воіны — Якаў Гаўрылавіч Палонскі і Павел Рыгоравіч Молаш з в. Панкі. Сустракалі іх прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў.

Аднавілася Косаўская вопытна-балотная станцыя, у распараджэнне якой выдзелена 650 гектараў зямлі, 10 жылых дамоў.

23 ліпеня. З перамогаю вярнуліся з фронту дамоў жыхары в. Рацкевічы Сямён Лук'янавіч і Лявон Рыгоравіч Гардзейкі, Фёдар Макаравіч Акавіты з Хадорак, якіх прынялі ў райкоме партыі.

У раёне пачаліся масавыя ўборачныя работы. І хоць з-за вайны значна скараціласа колькасць уборачных машын, не хапае цяглавай сілы, жніво праводзіцца дружна, хуткімі тэмпамі. Дарэчы, правядзенню гэтай кампаніі быў прысвечаны сход жанчын-сялянак раёна, які праходзіў у клубе Івацэвіцкага лесазавода. Сялянка з в. Галенчыцы Алена Макарэвіч сказала ў сваім выступленні: «Жанчыны павінны адыграць рашаючую ролю на ўборцы. Як ні прыйдзецца цяжка, няхай моцна будуць балець нашы рукі, але сэрцы нашы не ўтомяцца — будзем працаваць дзеля ўраджаю, які так патрэбен цяпер». Сялянкі вёскі Сенькавічы Алена Гегеня і Марыя Кузьменя, Люба Панашчык з Размерак адправілі прывітальную тэлеграму ў Крэмль, у якой запэўнілі ўрад, што жанчыны раёна на высокім узроўні правядуць жніво.

У в. Скураты першымі выйшлі на свае збожжавыя надзелы Таццяна Кароль, Марыя Мажэйка і Настасся Казімірчык, якія ўжо праз некалькі дзён закончылі ўборку жыта і тут жа разлічыліся з дзяржавай па збожжанарыхтоўках. У вёсцы разгорнута шырокая дапамога па ўборцы ўраджаю мнагадзетным удовам, сем'ям загінуўшых, гаспадаркам воінаў, якія яшчэ не дэмабілізаваліся з арміі.

У в. Дубітава сяляне заслухалі на сваім сходзе справаздачу дэлегатак раённага сходу — Дуню Радзюк, Надзею Кулецкую, Альжбету Турчык і пастанавілі ў гонар гадавіны вызвалення вобласці арганізаваць чырвоны абоз з хлебам новага ўраджаю ў лік дзяржаўных паставак.

За парты села 6 тысяч дзяцей, на тысячу больш, чым у 1944 годзе. Для вядзення навучальнага працэсу ў раён прыслана звыш 40 настаўнікаў з сярэдняй педагагічнай адукацыяй, 64 настаўнікі прайшлі курсы

перападрыхтоўкі, 11 настаўнікаў павысілі кваліфікацыю шляхам завочнай вучобы. Агульная колькасць іх павялічылася ў раёне на 50 чалавек.

Сіламі Івацэвіцкай МТС узнята 330 гектараў зяблівa. Лепшая трактарыстка Вольга Крывуша сваё гадавое заданне па ворыву выканала на 235 працэнтаў, Аляксандр Трацяк — на 145 працэнтаў.

Не адстаюць ад сялян і рабочыя. Па-ўдарнаму працуюць бондар прамкамбіната Г. О. Гардзейка, які план трэцяга квартала перавыканаў у пяць разоў. Рабочыя лесазавода М. У. Мінюк, І. Ф. Вярстак, І. В. Смірноў, К. А. Белы пастаянна перавыконваюць свае вытворчыя заданні.

Снежань. Сяляне ўжо атрымалі 26 218 кубаметраў лесу, 9596 кубаметраў з якіх выдзелена для будаўніцтва дэмабілізаваным воінам. Амаль 15 тысяч кубічных метраў драўніны адпушчана сяльчанам бясплатна.

1946 год

Студзень. Сяляне вёскі Жытлін вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР былую падпольшчыцу на тэрыторыі Заходняй Беларусі, сакратара Брэсцкага абкома партыі А. І. Федасюк. Вядомага партызанскага камандзіра, а затым старшыню Пружанскага райвыканкома М. Е. Крыштафовіча назвалі сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР рабочыя, ІТР і служачыя Івацэвіцкай дыстанцыі пуці.

Люты. На Панкоўскім выбарчым участку першым прагаласаваў 66-гадовы Клім Ульянавіч Бахур, на Гошчаўскім — маці семярых дзяцей Алена Герасімаўна Кот. А ў в. Сенькавічы першым прыйшоў на выбарчы ўчастак 104-гадовы Лявон Марцінавіч Алізарчык.

У вёсцы Сенькавічы ўсё больш актывізуецца грамадска-палітычнае жыццё. Так, камсамольцы і моладзь на сваім сходзе прынялі рашэнне аб шэфскай дапамозе кожнай 10-й сялянскай гаспадарцы, вызначылі для сябе так званае камсамольска-маладзёжнае поле і абавязаліся вырашчаны на ім ураджай перадаць у фонд хутчэйшага аднаўлення народнай гаспадаркі. У Сенькавічах, Косаве і Івацэвічах пачалі работу першыя ў раёне палітшколы для савецкага актыву.

Выканком райсавета і райком партыі зацвердзілі план электрыфікацыі раёна. Вядучае месца ў ім зойме будаўніцтва электрастанцыі на рацэ Грыўда ля в. Руда. Магутнасць яе складзе 150 кілават, што дазволіць даць святло Івацэвічам, Азярцу, Рудзе, Кушнярам, Сенькавічам, Падстарыні, Стайкам, Размеркам і некаторым іншым населеным пунктам.

У в. Хадакі на базе млына ўстаноўлена дынама-машына ў 5 кілават і 19 мая ў Хадаках загарэліся першыя 5 лямпачак. Асветлены школа, сельсавет, дзве лямпачкі з'явіліся на сельскай вуліцы. У бліжэйшы час, паведамляе газета, 120 электралямпачак засвецяцца ў жыхароў Жытліна і Корачына.

Май. У школах пачаліся экзамены за курс пачатковай і сямігадовай школы і пераводныя іспыты ў 5, 6 і 8-х класах. Добрыя веды паказваюць вучні Івацэвіцкай сярэдняй, Косаўскай, Гошчаўскай няпоўных сярэдніх, Юкавіцкай і Боркаўскай пачатковых школ.

Чэрвень. Райваенкамат арганізаваў у Івацэвіцкім клубе першую канферэнцыю дапрызыўнікаў.

Працягваецца будаўніцтва гідрастанцыі ў Рудзе. Жыхар гэтай вёскі Іван Хаванскі авалодаў кваліфікацыяй чыгуначніка і ўмела працуе на пракладцы вузкакалейкі. На сваім матавозе ён робіць за дзень па 15 рэйсаў, перавозячы да будаўнічай пляцоўкі будучай электрастанцыі больш 130 кубічных метраў зямлі. Штодзённа працуюць на гэтай рабоце і фурманкі з навакольных вёсак. Вызначаюцца ў працы сяляне Уладзімір Мароз, Кастусь Шэлест, Уладзімір Гладун.

25 чэрвеня ў раёне прайшоў чарговы партыйны сход. У сваім выступленні на ім сакратар райкома партыі С. Маркушын назваў такія лічбы: сяляне раёна з часу вызвалення яго атрымалі 1762 гектары зямлі, у тым ліку 1508 гектараў — ворнай. У 1946 годзе 36 салдацкіх гаспадарак атрымалі 61 га зямлі, што, па прызнанню сакратара, вельмі мала. Марудна, зазначыў ён, ідзе ў раёне і высяленне людзей з зямлянак, у якіх працягваюць жыць 223 сям'і. Яшчэ больш сем'яў — 325 — пражывае на прыватных кватэрах... На месцы спаленых і разбураных вёсак узведзена 739 зрубаў і 389 халодных пабудоў. Пацярпеўшым адпушчана 24 928 кубаметраў будаўнічага лесу, 425-ці гаспадаркам ён выдзелены бясплатна.

У апошні дзень чэрвеня сем сельскіх самадзейных калектываў прынялі ўдзел у раённай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці. Адначасова ў Бялавічах пад кіраўніцтвам нядаўняга воіна Аляксея Бянько ўзнік харавы гурток, у які запісалася 20 чалавек.

Ліпень. Праведзены нядзельнік па дапамозе ў адбудове вёсак, знішчаных фашыстамі. Аказана дапамога 40 інвалідам вайны, 20 сем'ям воінаў і партызан. У нядзельніку прынялі ўдзел 130 чалавек, 358 фурманак і 5 аўтамашын.

14 ліпеня 120 чалавек сабраліся на раённы сход агітатараў і загадчыкаў хат-чытальняў.

Пачалася здача збожжа ў лік нарыхтовак 1946 года. Квітанцыю пад нумарам «1» атрымаў сялянін з Халап і Мікалай Васільевіч Крот, які здаў 108 кілаграмаў зерня. У райцэнтр прыбыў першы чырвоны абоз з хлебам новага ўраджаю. Арганізавалі яго сяляне вёскі Яглевічы.

Ідзе далейшае аднаўленне прамысловасці раёна. На Івацэвіцкім лесазаводе вядзецца ўдасканаленне вытворчага працэсу, прадугледжваецца ўвядзенне тарнага цэха, а таксама цэха па вырабу і рамонту мэблі, машыннага аддзялення з лакамабілем магутнасцю 200 конскіх сіл. Для рабочых плануецца пабудаваць 15 індывідуальных і адзін чатырохкватэрны дом, інтэрнат на 150 чалавек, сталоўку і лазню.

Верасень. Гошчаўская хата-чытальня была радыёпрыёмнік «Радзіма». 30 жніўня сяляне сабраліся разам, каб праслухаць навіны па нашай краіне і за яе межамі. Затым адбылося бурнае абмеркаванне праслуханага.

Новы навучальны год івацэвіцкія школьнікі пачалі ў новай школе. За парты дзесяці светлых класаў селі 440 вучняў. А ў Косаве 1 верасня адкрылася вячэрняя школа рабочай моладзі. 67 юнакоў і дзяўчат, якія працавалі на прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах, пачалі атрымліваць адукацыю, паступіўшы ў 1—8 класы.

Лістапад. У гэтым годзе 257 сямей у раёне перайшлі з зямлянак у новыя дамы, а да канца года будзе закончана яшчэ 250 зрубаў.

У Івацэвічах па вуліцы Леніна адкрыты магазін культтавараў, дзе людзі атрымалі магчымасць набыць мастацкую літаратуру, падручнікі, дзіцячыя цацкі.

Калектыў Косаўскага райпрамкамбіната выйшаў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве і ўзнагароджаны пераходным чырвоным сцягам абкома партыі і абласнога савета.

Снежань. У вёсцы Руда настаўнік Уладзімір Дзеравянка стварыў драматычны гурток. 8 снежня самадзейныя артысты з Руды выступілі з пастаноўкай п'есы К. Крапівы «Партызаны».

М. Банасевіч.

Першыя пасляваенныя школы

З успамінаў былога намесніка дырэктара Косаўскай СШ А. Рамашчанкі

Косаўскі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 11 ліпеня 1944 года. Партызанскія атрады, якія дыслацыраваліся на яго тэрыторыі, пачалі расфарміроўвацца. Большасць народных мсціўцаў улілася ў рэгулярныя часці Чырвонай Арміі. Многія ж, у тым ліку і я, былі накіраваны на аднаўленне савецкай улады.

У райвыканкоме Косава мне, як былому настаўніку, а таксама і Івану Цімафеевічу Чысцякову прапанавалі арганізаваць раённы аддзел народнай асветы. І. Ц. Чысцякова, які меў вышэйшую адукацыю, прызначылі загадчыкам, мяне — школьным інспектарам. Пачалі шукаць памяшканне. Па дамоўленасці з гаспадаром аднаго дома занялі два невялікія пакоі. Там і размясцілі райана.

Якую ж першую задачу трэба было вырашаць? У населеных пунктах адкрыць да пачатку навучальнага года школы, укамплектаваць іх настаўнікамі і першага верасня пачаць заняткі.

Справіцца з адказным даручэннем было вельмі складана. Не хапала падрыхтаваных педагагічных кадраў. Вымушаны былі пасылаць у школу людзей, якія закончылі дзесяць, сем класаў. Зрэдку накіроўвалі і з незакончанай сямігадовай адукацыяй. Яны, безумоўна, мелі вялікую патрэбу ў дапамозе. Інспектары райана П. Ф. Разумейчык, М. П. Камісарава і іншыя пехатой (транспарта тады не было) ішлі ў вёскі. У іх абавязкі ўваходзілі пошукі прыватных памяшканняў для школ, бо тыпавых засталося зусім мала. На месцах дамаўляліся

аб вырабе самай простай мэблі, рашалі іншыя гаспадарчыя пытанні.

З энтузіязмам, аддаючы жар душы, працавала першы дырэктар Косаўскай сярэдняй школы Фаіна Пятроўна Карабяцян. Дарэчы, гэта жанчына навучала дзяцей у сямейным лагеры партызанскага атрада імя Калініна. У лясной школе займалася тады 50 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Сярэдняя школа. Яна была іншай, чым цяпер. Размясцілася ў цагляным аднапавярховым доме, дзе ў час вайны жылі паліцаі і іх памагатыя. Пасля выгнання фашыстаў будынак быў у самым непрыглядным стане. Да 25 жніўня 1944 года яго адрамантавалі і падрыхтавалі да прыёму вучняў. Шэсць класных пакояў, цёмны вузкі калідор. Для залы падрыхтавалі паддашак. Тут 25 жніўня крыху больш сотні настаўнікаў раёна сабраліся на сваю першую пасляваенную канферэнцыю. Даклад зрабіў І. Ц. Чысцякоў. Выступіўшыя выказалі шмат карысных прапаноў па пераадоленню цяжкасцей у той яшчэ ваенны час.

Першага верасня школьнікі селі за парты. Шмат чаго не ставала. Не хапала падручнікаў. Таму часта вучыліся чытаць па дробязнаму газетнаму шрыфту. Шпалеры, каляровая, абгортачная і іншая папера — усё ішло ў справу.

У складаных умовах дзеці настойліва авалодвалі асновамі ведаў. Прыемна сказаць, што потым многія з іх сталі інжынерамі, настаўнікамі, урачамі, аграномамі, вучонымі — высокакваліфікаванымі спецыялістамі розных галін народнай гаспадаркі.

Чырвоная Армія вызваляла народы Еўропы ад фашысцкіх рабавальнікаў. Фронту патрэбны былі салдаты. Але наш урад праяўляў асаблівы клопат аб навучанні і выхаванні дзяцей, трымаў на броні настаўніцкія кадры, накіроўваў у Заходнюю Беларусь папаўненне. Так, у лістападзе 1944 года ў раён прыехалі майстры педагагічнай справы Г. С. і К. А. Арловы, а ў верасні наступнага — вопытны выкладчык матэматыкі і добры метадыст З. М. Барысаў. Яны былі накіраваны ў Косаўскую СШ.

Школы раёна з улікам умоў таго часу працавалі. Усе дзеці, якія належалі ўсенавучу, займаліся. Жыццё ўваходзіла ў нармальную каляіну.

Больш, чым родны дом

З успамінаў Вікенція Іванавіча Мароза, дырэктара Косаўскага дзіцячага дома ў 1950—60-я гады

Цяжкім складваўся лёс тысяч дзяцей у пасляваенны час. Адны з іх страцілі бацькоў у ваенным водавароце, другіх недарэчныя бацькі кінулі на выжыванне, некаторыя збеглі з дому з-за бязглуздасці маці ці бацькі, якія не ўмелі жыць, п'янствавалі, дэбашырылі, здзекаваліся з тых, каго нарадзілі. Сэрца поўніцца болем за такіх хлопчыкаў і дзяўчынак, якіх лёс пазбавіў бацькоўскай ласкі, цеплыні роднага дому, чуласці, клопату, разважлівасці родных людзей.

На іхнім цяжкім бяздомным шляху стала дзяржава і чулыя добрыя людзі. Дзяржава стварыла ўмовы, каб быў дом і дастатак, а людзі з дапамогаю дзяржавы акружылі іх клопатам, заняліся навучаннем і выхаваннем. Больш, чым родным домам для многіх з іх сталі і нашы дзіцячыя дамы.

У Косаве ў 1944 годзе былі створаны два дзіцячыя дамы, у якіх уладкаваліся дзеці ў асноўным бацькоў, якія загінулі на вайне, тыя, каго лёс адарваў ад сваіх сем'яў і раскідаў па розных краях. Неўзабаве абодва дзіцячыя дамы аб'ядналіся ў адзін. Праўда, умовы былі цяжкія — дзетдом размяшчаўся ў 9 прыстасаваных будынках па вуліцы М. Горкага. Вучыцца хадзілі дзеці ў Косаўскую школу. Дзіцячы калектыў склаўся шматнацыянальны: беларусы, рускія, украінцы, палякі, румыны, французы — вайна раскідала іх па свеце, а надышоўшы мірны час з'яднаў. І сталі жыць яны адзінаю дружнаю сям'ёю. Вучыліся спачатку з 1 да 7 класса, а пазней да 10-га — канчалі курс сярэдняй школы (гэта ўжо ў канцы 50-х гг.).

Атрымаўшы атэстаты сталасці, адны ішлі працаваць, другія — прадаўжалі вучобу. З першых выпускнікоў-дзетдомаўцаў паступілі: Сіроціна Іна у медвучылішча, Молаш Валя — у Маскоўскі тэхналагічны інстытут, Кірылаў

Л. С. Екель.

Ваня, Тыцык Саша, Молаш Марыя — у тэхнікумы.

Пры дзіцячым доме, які спачатку налічваў 120 дзяцей, а потым 150, была свая падсобная гаспадарка. Даглядалі яе дзеці разам з дарослымі. Адміністрацыя клапацілася, каб дзеці былі добра апрануты, накормлены, каб для іх былі створаны максімальна ўтульныя абставіны для жыцця і вучобы.

Працавалі ў нас і дзве майстэрні — кравецкая (майстар Кірык Раіса Андрэеўна) і сталярная (майстар Акавіты Дзмітрый Сцяпанавіч). Тут выхаванцы атрымлівалі навыкі дзейнасці па гэтых спецыяльнасцях, што потым дапамагала ім у асабістым жыцці.

Не хлебам адзіным жылі нашы выхаванцы. Многія на канікулы выязджалі да сваякоў, у вольны час карысталіся бібліятэкай, для іх арганізоўваліся экскурсіі па гарадах рэспублікі, турпаходы па родных мясцінах, паходы ў кіно, на канцэрты.

У дзетдоме працавалі людзі чулыя і добразычлівыя, клапатлівыя. Узначальвалі калектыў у розныя часы Астроўскі, Мыслівец А. Р., Ермакоў М. Н., Мароз В. І., Салавейка І. Ф., Камоска Л. Е. Многа гадоў працавалі выхавацелямі Клушына Л. В., Гурко Е. І, Худзінская С. П., Юшкевіч Л. Ц., Кільчанкова Л. Д., Усовіч І. А., Карніеўсая Н. І. і іншыя. Працяглы час медсястрой працавала Яромчык Э. П. (Касько). Медыцынскі нагляд ажыццяўлялі ўрачы Косаўскай бальніцы на чале з галоўным урачом Талкачовым У. М. Шэфам дзетдома быў калектыў Косаўскага прамкамбіната.

З цягам часу дзіцячыя дамы былі рэарганізаваны ў школы-інтэрнаты. Косаўскі быў расфарміраваны.

Слова пра бацькоў

ЕКЕЛЬ Леанід Сямёнавіч. Беларускі журналіст і грамадскі дзеяч. Нарадзіўся 1 сакавіка 1947 г. у в. Заполле ў сям'і патомных хлебаробаў. Пасля заканчэння Косаўскай дзесяцігодкі па камсамольскай пуцёўцы паехаў на Поўнач. Працаваў на будоўлі мулярам. З Архангельска быў прызваны на Паўночны флот. Праходзіў службу на Новай Зямлі ў флоцкай газеце «За Радзіму!» фотакарэспандэнтам. Звольніўшыся ў 1968 г. у запас, год працаваў у маларыцкай газеце «Сельскае жыццё», а потым паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт на факультэт журналістыкі. У 1973 перайшоў на завочнае аддзяленне. Працаваў у прэс-службе Рэспубліканскага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

З 1977 па 1988 — у рэдакцыі газеты «Знамя юности». Напачатку загадчык аддзела, потым — адказны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара. Апошнія 4 гады — галоўны рэдактар газеты.

Калі ўзнікла магчымасць стварыць друкаваныя органы з нуля, перайшоў на пасаду намесніка галоўнага рэдактара часопіса «Крыніца», дзе працаваў 5 гадоў. З 1990 г. — старшыня Беларускага саюза журналістаў і галоўны рэдактар газеты Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў «Натхненне».

Аўтар трох кніг мастацкай публіцыстыкі: «Таварыш райкам», «Дарога да хлеба», «Час — гэта мы». Лаўрэат рэспубліканскіх прэмій за лепшыя журналісцкія работы.

СВЕТЛОЙ ПАМЯТИ МОИХ РОДИТЕЛЕЙ
СЕМЕНА ФЕДОРОВИЧА И ВЕРЫ НИКОЛАЕВНЫ ЕКЕЛЬ
ПОСВЯЩАЕТСЯ

КОСТЕР НА ВЕТРУ

Детская память, что костер на ветру. То внезапно полыхнет, разогнав темень и осветив землю так, что видна каждая травинка, то замрет, затухнет: и сколько ни жди, ни надейся — не оживет сбитое пламя. Лишь горький дымок закурится, да и тот вскоре исчезнет бесследно. И наступит темнота, плотная и беспросветная.

Но что помнится — над тем ни люди, ни годы не имеют власти.

«Я — НЕ КАЛЬХОЗНИК!»

Когда в нашем селе организовали колхоз

имени Сталина, мне не было и трех лет. Но неясная, темная тревога тех дней вошла и в мою душу. Через четыре года после войны она опять пришла к моим землякам. Без крови и смерти, хотя, как знать, не было ли это для крестьянина духовной гибелью — отказаться от земли, пропитанной тем же потом, что и собственная рубаха; свести на общий двор коня и весь немудреный инвентарь; отдать корову; позволить разметать по бревнышку гумно и амбар. Нет, не с песней строилась новая жизнь, а с кровью открывалось привычное, то единственное, что крестьянина делало крестьянином. Где «мое» было действительно «моим», а не мифическим нашим. Где земля-кормилица имела истинную цену и смысл.

Наша семья никогда не была зажиточной. Да и откуда она могла быть таковой? Едва переселились на хутор, как началась война. Пятеро моих братьев и сестер, двоих из которых мне не суждено было увидеть, родители да дед с бабкой жили в кое-как приспособленном хлеву. Дом построили уже после войны.

Сколько раз потом, отвечая на вопросы анкет «где были родители во время войны?», так и подмывало написать: «А какое ваше собачье дело?». Разве есть вина моих родителей в том, что земля стала оккупированной территорией? Разве не они отдавали партизанам последний кусок хлеба? Впрочем, те особенно и не спрашивали: брали, как свое. На коленях умоляла мама не забирать корову — дети мал мала меньше. Оттолкнули прикладом: «Вы тут на печи сидите, а нам что, в лесу кору жрать?..»

После освобождения Белоруссии отца взяли на фронт. Домой он вернулся с покалеченной рукой.

А лихие красные партизаны стали сельсоветчиками и сознательным активом. Не просыхая от самогона, с мрачными лицами, не предвещавшими ничего хорошего, ходили они из хаты в хату, принуждая сельчан вступить в счастливую колхозную жизнь. Когда уговоры не действовали, начинались угрозы. И люди понимали, что от этих можно ждать всего. Что они знают все про всех и никому не дадут спуску.

Стон стоял по селу. Но что могли сделать сельчане? Кому пожаловаться? Да и кто стал бы слушать этих «темных недоумков, не желающих для себя счастья»? Правда, несколько стойких душ все-таки нашлось среди моих земляков. Они так и умерли «единоличниками». Но сколько проклятий, сколько презрения и вражды досталось на их долю! Даже от близких людей и соседей, не говоря уже о колхозном, а позднее — совхозном начальстве...

Некоторое время Бог миловал отца от встречи с колхозными агитаторами. Маму они всерьез не принимали — что взять с неграмотной крестьянки, не умеющей даже расписаться. Но однажды этот день пришел. Отец, взятый в кольцо злорадствующими активистами, вынужден был написать заявление о «добровольном и сознательном» вступлении в колхоз.

Оглушенный случившимся, он так и сидел за столом, где под диктовку сочинил заявление, когда в хату зашла соседка. Она поняла все без слов и, видимо, желая как-то разрядить обстановку, стала шутить со мной:

— Ну что, колхозничек, записался в колхоз? Теперь все заберут. И коника, и коровку, и тебя заберут.

— Я — не кальхозник! Я — не кальхозник! — завопил я, захлебываясь слезами.

— Пабойся, Маня, Бога — ну што ты дзіця дражніш! Які ж ён калхознік? — вступилась за меня мама.

... Когда бываю дома и встречаюсь с моей веселой теткой, она нет-нет да и спросит: «А помнишь, как ты кричал: «Я — не кальхозник, я — не кальхозник!»...

Не помню, милая моя тетушка, не помню. И пишу со слов мамы. А вот другое помнится хорошо...

ВЕРА И ОТЕЦ

Желтый свет керосиновой лампы. Тени по углам. Тени на лице отца, на лицах братьев и сестры. Уже которое время в колыбели, подвешенной к балке, плачет братик. Ему нет и года. Сестра не раз подходила к нему, колыхала, но плач не прекращался.

Стукнет калитка — и все с надеждой смотрят на дверь. Вот она распахнется — и на пороге появится мама. Но нет — это ветер и дождь...

Лето выдалось на редкость дождливым, и

бульба, посаженная в низине, вымокла. Ни хлеба, ни картошки. Чем кормить семью? Как пережить зиму? Вечные крестьянские боль и страх, похоже, не знали просвета. А «счастливая колхозная жизнь» только усугубила их, довела до полной безнадежности.

Колхозную картошку убрали, поле распахали. И там-сям, промытые дождем, забелели клубни. День-другой, и бульба сгниет. А не сгниет — так мороз доконает. Могла ли допустить крестьянская душа, чтобы добро гибло на глазах?.. Вот на это поле с кошами в руках и направились хуторяне. Мама — в их числе.

Председательский тарантас коршуном налетел на женщин. Кто был подальше, на краю поля, побросав все, разбежались. А мама с соседкой оказались ближе всех. Председатель схватил их, затолкав в тарантас, и повез к шоссе, где ждала крытая машина...

— Ой, Семен, повезли твою Веру в тюрьму! — принесла нам хуторянка недобрую весть.

Веру увезли в тюрьму. Веру и в прямом, и в переносном смысле...

Отец легко поддавался убеждениям. Да, он сомневался, мучился — ведь непросто вот так круто, одним росчерком пера изменить жизнь. Но когда стал колхозником, каждое слово своих или заезжих начальников брал на веру и добросовестно повторял их маме, хотя та к его агитации относилась, как к бабкиным сказкам.

Какую бы работу отцу ни давали, он делал ее на совесть, выкладываясь до последнего. Всегда спокойный, отец выходил из себя и распалялся не на шутку, когда видел, как что-то бросалось, ломалось, уродовалось, калечилось. Его всегда мучил вопрос, почему хороший хозяин на своем подворье, в колхозе — никудышный работник? Что происходит с людьми? Как можно тащить в свой хлев, воруя у колхоза? Это же красть у самого себя...

Сколько раз, бывало, мама просит: «Семен, сходи к скирде, принеси соломы. В хлев не зайти». Молчание. Или: «Не можно». И весь ответ.

Отцовское «не можно» вмещало в себя, пожалуй, не меньше библейских заповедей. Не знаю, помогло ли это ему в жизни, но, очертив однажды свой моральный круг, он так и не выходил из него. Вот за эти «чудачества» прослыл отец на селе человеком бесхарактерным и безобидным. И этим откровенно пользовались: обделяли, обходили, забывали. Понимая, что отца не исправить ни слезами, ни криком, мама, чтобы хоть как-то свести концы с концами, порой впрягалась за двоих.

Мне никогда уже не узнать, что происходило в отцовской душе в тот осенний слякотный вечер. О чем передумал он за мучительную и бессонную ночь. Что-то мешало спросить у него об этом. Что-то сдерживало. Может быть, предчувствие вопроса на мой вопрос: «Неужели, сынок, прожив со мной столько лет, ты этого так и не понял?..».

Я был уверен, что все знаю об отце. Что прекрасно его понимаю. Но вот не стало его — и все неспрошенное, невысказанное ношу в себе, как боль. И тщетно пытаюсь найти ответы на вопросы, которые не задал отцу вовремя...

Маму отпустили на следующий день. Как только переступила она порог, бросилась к колыбели, выхватила братика, прижала к себе, плакала и все приговаривала: «Спаситель ты мой! Спаситель...».

Я часто вспоминаю этот горький эпизод далекого детства и с содроганием думаю: а что было бы со всеми нами, если бы маму отдали под суд? Как жили бы на «вольной колхозной» земле, отправившей в неволю самого родного человека? Удивительно, но этот случай не заставил отца изменить свое отношение ни к колхозной собственности, ни к коллективному труду. Терпеливо перенося одно испытание за другим, обман и издевательства, он до последнего своего часа оставался крестьянином. Так не на огромном ли терпении таких вот крестьян, не на их ли беззаветной вере в зажиточное завтра держалось и держится наше многострадальное сельское хозяйство? Но ведь всему есть предел: и терпению, и вере, и самой жизни, наконец...

И все-таки у отца, думаю, на самом дне души жила тоска по своей земле. Эта великая, ничем не излечимая тоска, наверно, и меня коснулась своим крылом. Не она ли звала меня на бывший наш хутор, где, стоя на обочине гравийки, я подолгу смотрел на ровное поле. То свежевспаханное, то в зеленях, то в спелой ржи. А видел: хату под соломенной крышей, хлев и гумно. Вишни и яблони. Лесочек — маленький, уютный, насквозь пронизанный светлом и солнцем.

Однажды отец подвел меня к небольшому полю и сказал внезапно дрогнувшим голосом: «Смотри, сынок, эта была наша земля...». Я видел, как обхаживал он гнедую лошаденку, помнившую и хозяина, и свой хлев; как молча страдал он, когда ее, вконец замордованную, закопали на Лысой горе. Я помню, как отрешенно ходил он вокруг уже не своего гумна и чуть не плакал, когда сдирали стреху и ломали стены. Крепкие еще бревна, свезенные на колхозный двор, не найдя применения, под дождем и снегом превратились в труху. Вот так же не нашли своего применения в колхозной жизни хозяйственная бережливость, крестьянская мудрость, человеческая совестливость. Не ходовой оказались они монетой, не пришлись ко двору. Всех и все заменил аппарат. Он, как молотилка на току, ломал, мял и потрошил крестьянские души, отсеивал и сортировал их, превращая в безликую массу. И трудно, нечеловечески трудно было устоять перед этой тупой и равнодушной машиной...

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

У 1960—80-я гады ў раёне ішло інтэнсіўнае развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі. Кожная пяцігодка адзначана важнай вяхой у стварэнні і росце эканамічнага дабрабыту. Узнікалі і развіваліся прамысловыя прадпрыемствы, ішла рэканструкцыя і абнаўленне, рост вытворчых магутнасцей на старых фабрыках, заводах, майстэрнях. У сельскай гаспадарцы поруч са структурнай перабудовай абнаўляліся тэхналогіі, укаранялiся новыя гатункі культур, новыя пароды жывёлы, насычаліся сельскагаспадарчыя прадпрыемствы тэхнікай. Развіваліся сродкі сувязі, транспарт, шырылася сфера гандлю і паслуг насельніцтву, узнікалі будаўнічыя арганізацыі, жылыя дамы. Мацнела духоўнае жыццё раёна — народная адукацыя, культурна-асветніцкая работа, самадзейнае мастацтва, друк. Значных поспехаў дасягнулі ахова здароўя і сацыяльная забяспечанасць насельніцтва, фізкультура і спорт. Стабільным было грамадска-палітычнае жыццё. Усё гэта сёння таксама ўжо гісторыя, хаця і недалёкая, усё гэта — наша памяць.

Тэрыторыя і насельніцтва. Івацэвіцкі раён займае тэрыторыю 2998 кв. км. На ёй размяшчалася ў 1960 годзе 81 929 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, якія к 1995 году пашырыліся да 101 448 гектараў. З іх пад ворывам было занята ў 1960 годзе 38 615 гектараў, сенакосамі — 30 743, пашамі — 10 815 гектараў. Да 1996 г. структура сельгасугоддзяў змянілася: ворыва стала займаць 57 995 гектараў, сенажаці — 23 629, пашы — 19 121 гектар. Лясы ў 1996 годзе займалі 147 198 гектараў. Рэзка расшырыліся зноў асвоеныя меліяраваныя землі. Калі ў 1960 годзе іх было 10 021 гектар, то ў 1975 годзе — 45 217, а ў 1996 годзе — 54 548 гектараў.

Рэльеф раёна прадстаўляе слабахвалістую аднастайную раўніну. Некалькі павышаная ў паўночнай частцы раёна. Паўднёвая частка ўпіраецца ў Пінскія балоты. З карысных выкапняў у раёне ёсць торф, на базе якога працуе торфапрадпрыемства «Беразоўскае», торфакрошка якога выкарыстоўваецца калгасамі і саўгасамі для вытворчасці тарфагнойных кампостаў. Наяўнасць месцанараджэнняў гліны спрыяла развіццю вытворчасці цэглы (Амяльная, Квасевічы, Даманава, Любішчыцы, Заполле). Ёсць залежы пяску, які выкарыстоўваецца для вырабу шкла, невялікія запасы вапны. Лясы даюць драўніну для развіцця лесаперапрацоўчай вытворчасці. Для гаспадарчага развіцця раёна пэўнае значэнне маюць рэкі Шчара і Грыўда, у якія ўпадаюць рэчкі Бусяж, Брадок, Руднянка, Мышанка. Жыгулянка на захадзе раёна ўпадае ў Ясельду. Па ўсходу працякае Агінскі канал, які, праўда, пасля вайны страціў сваё суднаходнае значэнне, бо разбураны ўсе яго шлюзы. З пачаткам 90-х

гадоў пачалося аднаўленне канала, але з-за недахопу сродкаў работы вядуцца марудна. У раёне сем азёр: Выганашчанскае, Бабровіцкае, Гошчанскае, Сомінскае, Галенчыцкае, Вулька-Целяханскае, Корачынскае.

У рэках і азёрах водзіцца рыба: шчупак, акунь, сом, лешч, карась, карп, плотка, ёрш і іншая.

У лясах, якія займаюць каля 45 працэнтаў плошчы раёна, расце сасна, елка, дуб, бяроза, вольха, асіна. Летам і восенню яны багаты ягадамі, грыбамі. Тут водзяцца ласі, дзікія вепры, ваўкі, лісы, рысі, козы, зайцы.

Глебы па свайму складу — дзярнова-падзолістыя, тарфяна-балотныя, рознай катэгорыі якасці.

На тэрыторыі раёна ў сучасных межах па перапісу насельніцтва ў 1970 г. пражывала 73 700 чалавек, у 1979 — 69,6 тысячы чалавек і ў 1989 г. — 67 743 чалавек. На 1 студзеня 1997 года ў раёне пражывала 67,8 тысячы жахароў. Як бачым, ідзе не прырост насельніцтва, а наадварот. Змяніліся і суадносіны паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам. Калі ў 1970 годзе гарадское насельніцтва складала 14,1 тыс. чалавек, а сельскае 59,6 тыс., то ў 1989 годзе ў горадзе жыло ужо 24,3 тыс. чалавек, а ў сельскай мясцовасці — 43,3 тыс. чалавек. У 1989 годзе мужчын налічвалася 32 540 чалавек, а жанчын 35 203 чалавек. Гарадское насельніцтва расло за кошт расшырэння Івацэвіч, якія выраслі з рабочага пасёлка ў 1945 годзе да гарадскога пасёлка (1947) і затым горада (1966). Насельніцтва ў Івацэвічах расло так: 1945 год — 6,7 тыс. чалавек, 1979 — 10 870 чалавек, 1981 — 12 600 чалавек. На 1 студзеня 1997 года — 19,7 тыс. чалавек. У Целяханах жыве 4800 чалавек, у Косаве — 2,7 тыс. чалавек. У апошнія гады дэмаграфічная сітуацыя ў раёне складаная — памяншаецца нараджальнасць.

Такія прыродныя і дэмаграфічныя ўмовы развіцця эканомікі раёна пасля завяршэння аднаўленчага перыяду.

Прамысловасць, будаўніцтва. У раёне ў 60—80-я гады даволі шпарка развівалася прамысловая вытворчасць. Некаторыя дробныя прадпрыемствы перарасталі ў буйныя. За дзесяць гадоў (1967—1977 гг.) лесазавод № 13 вырас у вядомае прадпрыемства ў рэспубліцы. Выпуск прадукцыі тут павялічыўся на 264 працэнты, узрасла і яе рэалізацыя. Калі ў 1975 г. выпушчана прадпрыемствам прадукцыі на 17 910 тыс. рублёў,* то ў 1990 г. ужо на 60 891 тыс. рублёў.

У 1973 г. у Івацэвічах пабудаваны ільнозавод. З 1988 г. ён стаў арэндным прадпрыемствам. З 1973 да 1990 гг. завод працаваў у трохзменным рэжыме, на ім было занята 155 чалавек. Завод даў валакна: ў 1976—1980 гг. — 4229,8 тоны, у 1981—1985 гг. —4747 тон, у 1986—1990 гг. — 5661 тону. З 1991 года пачаўся спад вытворчасці.

Для патрэб будаўніцтва ў Івацэвічах быў створаны завод жалезабетонных вырабаў. Галоўная яго прадукцыя — панэлі і жалезабетонныя канструкцыі для будаўніцтва жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў.

Больш чым у паўтары разы павялічыў выпуск прадукцыі спіртзавод. Пашырыліся вытворчыя працэсы на прадпрыемствах лесанарыхтоўчага аб'яднання, удасканальвалася тэхналогія вытворчасці, шырока ўкаранялася механізацыя працы.

Былы Косаўскі райпрамкамбінат са сталярнымі, вобаднымі, колавымі майстэрнямі пераўтварыўся ў буйное мэблевае вытворчае аб'яднанне. Ён пачаў выпускаць якасную мэблю, якая карысталася попытам у спажыўцоў не толькі Беларусі, але і далёка за яе межамі. Выпуск прадукцыі на прадпрыемствах аб'яднан-

* Тут і далей лічбы прыводзяцца ў тагачасных цэнах.

ня за 10 гадоў (1967 – 1977) павялічыўся больш чым у тры разы, а мэблі – амаль у чатыры разы. У 1977 годзе мэблі было рэалізавана на 7200 тысяч рублёў. У 1990 годзе таварная прадукцыя аб'яднання ацэньвалася ўжо ў 16 552 тыс. рублёў. Аб'яднанне пабудавала ў Косаве адміністрацыйны будынак, новы цэх па вытворчасці мэблі, сталовую, універмаг, шматкватэрныя жылыя дамы для рабочых, спартыўны комплекс, дзіцячы садок, правяло газіфікацыю горада і добраўпарадкаванне вуліц.

Узніклі новыя вытворчасці. Побач з вёскай Няхачава пабудавана торфапрадпрыемства «Беразоўскае» з двума заводамі і з жылым пасёлкам Зялёны Бор. Яно стала выпускаць торфабрыкет, забяспечваючы ім паліўныя патрэбы не толькі Івацэвіцкага, але і суседніх раёнаў.

У Даманаве ўзнікла прадпрыемства будаўнічых матэрыялаў па выпуску цэментных блокаў, шыферу і іншай прадукцыі для будоўляў. Тут вырас шклозавод па выпуску тэхнічных бутляў. У паўднёвай частцы райцэнтра размясціліся вытворчыя аб'екты прыборабудаўнічага завода, Івацэвіцкага лясгаса, «Сельгастэхнікі».

У Быцені расшырылі вытворчасць цэхі Косаўскага мэблевага аб'яднання.

Целяханскі райпрамкамбінат перарос у буйную лыжную фабрыку. Яе прадукцыя карысталася попытам не толькі ў СССР, але і за яго межамі. У 1948 годзе, тады яшчэ райпрамкамбінат, выпусціў першую партыю лыж – 500 пар, а ўжо ў 1955 г. – 110 тысяч пар лыж, у 1990 – 427 тысяч пар лыж. На шматлікіх усесаюзных выставах целяханскія лыжы заваёўвалі прызы і медалі: у 1979 г. у г. Пярну на выставе лыж – два бронзавыя медалі, у 1989 г. – 5 медалёў. К таму часу выпускаліся ўжо шматслойныя лыжы. У 1983 годзе асвоены выпуск лыж «Журавінка», якія сталі вядомы не толькі сярод лыжнікаў СССР, але і іншых краін. У розныя часы фабрыку ўзначальвалі Козік М. Я., Амяляшчык, Міхнюк Б. М., Протас А. А. Выраслі на фабрыцы і выдатныя майстры лыжнай вытворчасці.

У Целяханах на базе міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі, якая перамясцілася ў Івацэвічы, сталі працаваць цэх будаўнічых матэрыялаў, затым цэх дрэваапрацоўкі. У 1980 годзе ён вырас у завод сталярных вырабаў. Нязменна гэтай вытворчасцю ўжо больш 30 гадоў кіруе Віктаровіч Сцяпан Аляксандравіч.

Да канца 80-х гадоў на тэрыторыі раёна працавала 13 прамысловых прадпрыемстваў, на якіх было занята больш васьмі тысяч рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых. Акрамя пералічаных, далёка за межамі вобласці і рэспублікі атрымала вядомасць прадукцыя Квасевіцкай фабрыкі пяро-пуховых вырабаў, установы 15/5. ВА «Івацэвічдрэў» наладзіла выпуск пліт з адыходаў драўніннай вытворчасці, якія пасля

Целяханскія лыжы добра вядомыя як па ўсёй Беларусі, так і за яе межамі.

ламінірования станавіліся выдатным матэрыялам для вытворчасці мэблі. На Даманаўскім камбінаце наладжаны выпуск абліцовачнай пліткі, у Косаве — выраб шафаў з антрэсолямі, спальных гарнітураў.

Аб хуткіх тэмпах развіцця прамысловасці сведчаць такія лічбы: у 1956 годзе выпушчана прадукцыі на 6,1 мільёна рублёў, а ў канцы 80-х гадоў яе аб'ём перавысіў 120 мільёнаў рублёў — рост у 20 разоў.

Вырас вялікі атрад камандзіраў вытворчасці, якія ў гады станаўлення і развіцця сацыялістычнай эканомікі не шкадавалі сіл і энергіі для росквіту раёна. Сярод іх — былы дырэктар лесазавода № 13, а пазней аб'яднання «Івацэвічдрэў» Уладзімір Амплееў. Затым па выхадзе на пенсію яго замяніў выдатны арганізатар вытворчасці Барыс Міхнюк. Да таго Б. Міхнюк шмат гадоў працаваў дырэктарам Целяханскай лыжнай фабрыкі і зрабіў нямала для ўздыму яе вытворчасці. Ад радавога рабочага райпрамкамбіната ў Косаве да дырэктара мэблевага вытворчага аб'яднання вырас Сяргей Адамавіч Філіповіч. Разам з ім расло і прадпрыемства, шырылася жыллёвае будаўніцтва ў горадзе, які добраўпарадкоўваўся і прыгажэў. Шмат энергіі ўклаў у станаўленне і развіццё ільнозавода Уладзімір Аляксандравіч Мяцечка, а ў станаўленні і развіцці Даманаўскага камбіната Уладзімір Іванавіч Шлык. Многія гады ўзначальваў леспрамгас Піскароў Аляксей Іванавіч.

Буйное вытворчае і жыллёвае будаўніцтва патрабавала росту будаўнічых арганізацый. Калі ў 50-я гады будаўніцтвам у раёне займаўся ў асноўным «Міжкалгасбуд», кіраваў якім Кісялёў М. І., то к канцу 80-х гадоў працавалі ўжо 9 будаўнічых арганізацый. За год яны асвойвалі больш 20 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. Гэта МПМК-11, ПМК-12, ПМК-28, ПМК-2, ПМК-60, БУ-215, МДБК ПМК аблспажыўсаюза і іншыя. Няма ў раёне такога населенага пункта, дзе б працалюбівымі рукамі будаўнікоў не ўзводзіліся сучасныя аб'екты вытворчасці, сацыяльна-культурнага прызначэння, быту і жыллё. Толькі за гады адзінаццатай пяцігодкі пабудавана больш 470 такіх аб'ектаў, у тым ліку 86 тысяч квадратных метраў жылля, што дазволіла 1300 сем'ям усяліцца ў новыя кватэры.

Перасоўная механізаваная калона № 28, створаная ў 1966 годзе, пабудавала ў Івацэвічах кінатэатр «Партызан», Дом Саветаў, гасцініцу, рэстаран «Шчара», раённую бальніцу, сярэднія школы № 2 і № 3, ільнозавод, вытворчыя цэхі ВА «Івацэвічдрэў», дзіцячыя садкі «Солнышко», «Искорка», «Алеся», «Церамок», «Каласок», «Бярозка», шматкватэрныя жылыя дамы. Акрамя гэтага, былі ўзведзены многія будынкі ў сельскай мясцовасці: школы ў вёсках Быщень, Святая Воля, Вялікая Гаць, Сасновы Бор, Дабромысль, Любішчыцы, Выганашчы, жывёлагадоўчыя фермы ў калгасах «Зара», «Мілейкі», «Пагор'е», цэх «Пенадэкор» у Даманаве, фабрыка пяропуховых вырабаў у Квасевічах, АЗС і база ДЭУ ў Яглевічах. За 20 гадоў існавання ПМК-28 (1966—1986) на будаўнічых аб'ектах асвоіла звыш 50 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. У 1986 годзе ПМК-28 пераўтворана ў дарожную будаўніча-перасоўную механізаваную калону № 34 Брэсцкага аблсельбуда. З гэтага часу яе калектыў павёў будаўніцтва міжгаспадарчых і лесагаспадарчых дарог, добраўпарадкаванне вуліц у г. Івацэвічы, вёсках раёна, пад'язных дарог да ферм, добраўпарадкаванне тэрыторый ферм, школ, заводаў, дзіцячых садкоў і другіх аб'ектаў. Для гэтых мэт выраблена і ўкладзена за 10 гадоў больш 369 041 тонн асфальтабетону. Калі ў 1986 годзе пачыналі з 204 тон асфальтабетону, то ў 1990 годзе яго вырабілі 85 270 тон.

За справамі ПМК-28 і ДБПМК-34 стаяць людзі. Кіраўнікамі яе ў розныя гады былі Сярэнка А. Я., Сянчук Я. П., Крот І. Ф., Раўнейка А. С., Пукала А. М. і другія. Па 20—30 гадоў свайго жыцця аддалі працоўнай дзейнасці на прадпрыемстве інжынер-дыспетчар Галата А. В., рабочыя Шут А. М., Мікалайчык І. Д., Грыбоўскі К. С., Бурвін Н. С., майстар Слясарчык В. І., тэхнік Басік Г. І. і іншыя.

Вялікі аб'ём работ выканалі ў раёне меліяратары. Імі перададзена ў карыстанне і ўведзена ў сельскагаспадарчае абарачэнне 32,8 тыс. гектара меліяраваных зямель.

У гэтых дасягненнях вялікі ўклад Целяханскай перасоўна-механізаванай калоны № 60. Яе гісторыя бярэ карані з лета 1944 года, калі ў Целяханах была створана МТС. У ёй тады быў усяго адзін трактар, які перадалі партызаны. Два трактары ўзялі з баўэрскай гаспадаркі ў Целяханах, створанай нямецкімі акупантамі. Адзін гусенічны трактар-цягач падарыла вайсковая часць. Першымі трактарыстамі з 1944 года былі Сцяпан Бінкевіч, Сяргей Аніська, Сцяпан Віктаровіч, Мікалай Дзямчыла. У 1958 г. МТС рэарганізавана ў РТС, а ў 1961 годзе РТС — у БМУ меліярацыі. Першым начальнікам яе стаў Ф. Ф. Нікіцік. Затым узначальвалі С. А. Шахновіч, В. В. Кірылка, П. В. Серы. У 1980 годзе БМУ загадам «Галоўпалессеводбуда» пераўтворана ў ПМК-60, якую ўзначальвалі П. Т. Юнчык, А. І. Токар.

У 1962 годзе пабудавана механічная майстэрня ПМК-60 на 400 умоўных рамонтаў, дзе праявілі сябе матарысты Сауцін А. А., Гапонік В. В., слесар Багдановіч П. К. і іншыя. Пабудаваны аўтагараж на 25 машын.

Целяханскія меліяратары правялі вялікі аб'ём работ. З 1961 г. да 1983 г. яны здалі ў эксплуатацыю звыш 50 000 гектараў асушаных зямель, пабудавалі 5 помпавых станцый, больш 700 шлюзаў, мастоў, трубапераездаў, шмат дарог і іншых гідратэхнічных збудаванняў.

Лепшыя работнікі калоны, удасканальваючы вытворчыя працэсы, уносілі шматлікія рацыяналізатарскія прапановы. Сярод іх Калесніковіч І. І., Дзем'янец І. А., Сігневіч М. М., Кудзін В. М. і інш. Усё сваё працоўнае жыццё, больш 40 гадоў, аддаў прадпрыемству Галоўка Васіль Іванавіч. За працоўную адданасць ён узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Сярод рабочых вызначыліся машыніст бульдозера Кандратовіч І. А., зваршчык Фядковіч М. Р., трактарыст Мялік Р. М., машыніст экскаватара Дзядок І. Е. і іншыя.

У раёне актыўна ўкаранялася эксперыментальнае будаўніцтва ў вёсцы. Па тыпавых праектах забудаваны пасёлкі ў саўгасах імя Мічурына, «Зара», імя Чапаева. Панэлі і гатовыя канструкцыі, якія вырабляў Івацэвіцкі міжкалгасны домабудаўнічы камбінат, шырока выкарыстоўваліся пры ўзвядзенні новых двухкватэрных катэджаў у калгасах «Расія», імя Чарткова, «Быценскі» і другіх гаспадарках раёна. Толькі за 10 гадоў (1967—1977) у калгасе імя Чапаева пабудаваны комплексная МТФ на 400 галоў, свінагадоўчы комплекс, ветамбулаторыя, два зернясховішчы, аўтатрактарныя майстэрні, гараж, заправачная станцыя.

У МПМК-11 амаль 40 гадоў прапрацаваў шафёрам, а затым майстрам Янковіч Міхаіл Гаўрылавіч, выдатнай працай вызначаліся Дзяйкун Уладзімір Мікалаевіч, Куратнік Васіль Паўлавіч, Паўлоўскі Міхаіл Іванавіч, Лях Іван Паўлавіч і іншыя.

Калектывы прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічых арганізацый вялі рытмічную працу, не мелі значных збояў у выкананні заданняў і рэалізацыі прадукцыі, хаця гэта быў перыяд, як пазней яго абазначылі, застоя.

Сельская гаспадарка. У 60—80-я гады эканамічна выраслі і ўмацаваліся калгасы і саўгасы. Калі ў першыя пяць пасляваенных гадоў створаная ў Косаўскім раёне машынна-трактарная станцыя налічвала да дзесятка трактароў і тры грузавыя паўтаратонкі, то ў васьмідзесятыя гады калгасы і саўгасы, эксперыментальная база «Майск» мелі 1360 трактароў і больш за 300 зернеўборачных камбайнаў, амаль 700 грузавых аўтамабіляў, вялікую колькасць іншай тэхнікі і інвентару.

У саўгасе «Косава» было 70 трактароў, 45 аўтамабіляў, 16 камбайнаў. Яшчэ большую колькасць тэхнікі мелі саўгасы імя Чапаева, «Зара». Толькі за гады адзінаццатай пяцігодкі асноўныя вытворчыя фонды гаспадарак выраслі ў паўтара раза і склалі 148 мільёнаў рублёў. Наяўнасць асноўных фондаў сельскагаспадарчага прызначэння ў 1985 годзе складала на 100 гектараў сельгасугоддзяў 161,7 тысячы рублёў, а энергаўзброенасць аднаго працуючага — 29,3 конскай сілы. У структуры пасяўных плошчаў у 80-я гады 50 працэнтаў займалі збожжавыя культуры, 4 працэнты — тэхнічныя, 6 — бульба і 40 працэнтаў — кармавыя культуры. У 1986 г. вытворчасць валавой прадукцыі ў калгасах і саўгасах склала 82,5 мільёна рублёў. Тады ж з кожнага гектара сабрана збожжа па 25,8 цэнтнера, бульбы — 249 цэнтнераў, цукровых буракоў — 307 цэнтнераў, кармавых караняплодаў — 454 цэнтнеры. Валавы збор збожжа ў 1975 г. склаў 293 тысячы тон, у 1985 г. — 557 тысяч тон, у 1990 годзе — 747 тысяч тон. Жыта сабрана ў 1990 г. 216 тысяч тон, ячменю — 400 тысяч тон (у чатыры разы больш, чым у 1975 г.), аўса — 77,9 тысячы тон, цукровых буракоў — 289 тысяч тон, бульбы — 434 тысячы тон (крыху менш, чым у 1975 годзе). У выніку паляпшэння агратэхнікі расла ўраджайнасць сельгаскультур. Кожны гектар збожжа ў 1975 г. даў 18,7 цэнтнера, у 1985 г. — 22, у 1987 г. — 31,4 цэнтнера. Адпаведна ўраджайнасць жыта склала: 20,3, 35, 39,5 цэнтнера, ячменны гектар даў у 1975 г. 19 цэнтнераў і ў 1987 — 41,7 цэнтнера. Ураджайнасць бульбы выросла са 148 да 241 цэнтнера з гектара.

У гэтых поспехах важкі ўклад механізатараў Букшты М. В. (калгас «Бальшавік»), Фядковіча А. М. (калгас імя Куйбышава), Самсановіча У. Р. (калгас імя Леніна), Брычкаловіча А. М. (калгас імя Калініна), Юхнік А. А. (калгас «Расія»), Саявец П. І. (Козікі), Цімашэвіч Р. М. (саўгас «Перамога»), Мошка А. І. (калгас «Савецкая Беларусь»), паляводаў Віктаровіч В. Р. (калгас «Расія»), Суханосік А. І. (калгас імя Леніна), Цівончык Т. М. (калгас імя Калініна), Саўчук Т. М. (калгас імя Куйбышава) і многіх іншых, якія за сваю працу адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі.

Выросла і прадукцыйнасць

Удзельнікі семінара сакратароў камсамольскіх арганізацый калгасаў і саўгасаў, г. Івацэвічы, сакавік 1964 г.

жывёлагадоўлі. У 1986 годзе надоі малака ад каровы склалі 2580 літраў. На 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў атрымана 549 цэнтнераў малака і 129 цэнтнераў мяса. У калгасе «Расія» надоі малака ад каровы перавысілі 3 тысячы літраў. У раёне разгарнулася спаборніцтва даяркатрохтысячніц і пачаўся рух за надой 4-х тысяч літраў малака ад каровы. Значна выраслa пагалоўе жывёлы: калі ў 1965 годзе ў раёне было 63 255 галоў буйной рагатай жывёлы, то ў 1990 г. — 85 240 галоў.

У гэтыя дасягненні значны ўклад унеслі даяркі Шэлест А. В. (калгас «Савецкая Беларусь»), Стась Л. В. (калгас «Косава»), Каспяровіч В. І. (аграфірма «Беларусь»), свінаркі Каспяровіч Д. Р. (калгас «Мілейкі»), Якімовіч С. Д. (калгас імя Куйбышава), пастух і даглядчык жывёлы Струнеўскі Р. Ф. (калгас імя Куйбышава), цялятнікі Куісы Яўген і Алена з калгаса імя Леніна і іншыя. Усяго за старанную працу ў сельскай гаспадарцы больш за 170 працаўнікоў раёна ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці дазваляла павялічваць продаж прадукцыі дзяржаве. У 1986 годзе было прададзена 15 тысяч тон збожжа, 21,2 тысячы тон бульбы, 34,5 тысячы тон цукровых буракоў, 11,5 тысячы тон мяса, 51 тысяча тон малака.

У сельскагаспадарчай вытворчасці выраслa выдатная кагорта ўмелых арганізатараў. Сярод іх старшыні калгасаў «Бальшавік» — В. Мікуліч, «Любішчыцы» — Ц. Галавенка і І. Чымбар, «Расія» — У. Яскевіч і І. Чырка, «Даманава» — І. Коканаў і М. Палячок, імя Леніна — С. Уласаў і В. Беразавік, «Косава» — Ф. Савін, «Зара» — С. Вярэніч і іншыя. Пры іх кіраўніцтве гаспадаркі няспынна ішлі ўгару, нарашчваючы вытворчасць, забяспечваючы нармальнае жыццё людзей.

За 10 гадоў (1985—1995) адбыліся пэўныя пераўтварэнні сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. У 1985 г. у раёне было 15 буйных калгасаў і 9 саўгасаў. У выніку перабудовы ў 1993 г. было ўжо толькі 12 калгасаў, затое саўгасамі сталі 15 гаспадарак. У 1995 г. многія саўгасы зноў ператвораны ў калгасы — у раёне засталіся толькі два саўгасы і сталі дзейнічаць 24 калгасы. Пачаўся рух за стварэнне фермерскіх гаспадарак.

Служба быту і гандлю. У 1987 г. у раёне працавалі 4 дамы быту, адно швейнае атэлье, 26 комплексных прыёмных пунктаў, 170 магазінаў і 72 прадпрыемствы грамадскага харчавання.

Спажывецкая кааперацыя за пасляваенны час выраслa ў буйную сістэму па забеспячэнні насельніцтва прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі. У канцы 60-х гадоў у раёне было ўсяго крыху больш за 100 прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Аўтапарк налічваў 45 адзінак транспарту. У будаўнічай брыгадзе працавала толькі 9 чалавек. Прамысловасць кааперацыі выпускала ў асноўным хлебабулачныя вырабы і безалкагольныя напоі. У райспажыўсаюзе сярод 902 працуючых толькі два чалавекі мелі вышэйшую адукацыю. У 1996 г. у спажывецкай кааперацыі было занята звыш 1700 чалавек, сярод іх 80 чалавек з вышэйшай і 379 — з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Гандлёвую сетку складалі 132 прадпрыемствы гандлю, 43 — грамадскага харчавання, у тым ліку 28 прадуктовых магазінаў, 21 — прамысловых тавараў, 83 магазіны паўсядзённага попыту, 16 ларкоў. Сярод 43 прадпрыемстваў грамадскага харчавання — рэстаран, 5 кафэ, 16 сталовых, 10 буфетаў і кафетэрыяў, піражковая, бутэрбродная. Райспажыўсаюз мае свае каўбасны і рыбны цэхі, два цэхі безалкагольных напояў, 5 кандытарскіх цэхаў, сховішча для агародніны, халадзільнік на 230 тон прадукцыі, 5 хлебапякарняў. Яны прапануюць насельніцтву да 15 найменняў каўбасных вырабаў, 6 найменняў безалка-

гольных напояў, рыбу вэнджаную і салёную. У 1995—1996 гг. асвоены выпуск кісялю, мукі бліннай, гарчыцы, сыру дамашняга, фірменнага хлеба, разнастайных кандытарскіх вырабаў.

За першае паўгоддзе 1996 г. спажывецкая кааперацыя раёна рэалізавала тавараў больш чым на 70 мільярдаў рублёў. Выручка прадпрыемстваў грамадскага харчавання склала 5,5 мільярда рублёў. Работнікамі прадпрыемстваў і цэхаў кааператыўнай прамысловасці выпрацавана за паўгоддзе 360 тон хлеба, больш за 100 тон кандытарскіх вырабаў, перапрацавана 54 тоны рыбы.

З прыбыткам працуе аўтакалона, якая мае 115 транспартных адзінак. Паляпшалася транспартнае абслугоўванне насельніцтва. Усе населеныя пункты былі ахоплены аўтобусным сервісам. Шмат увагі ўдзяляецца дарогам, большасць якіх, асабліва ў населеных пунктах, заасфальтаваны. Шмат зроблена па добраўпарадкаванні ўнутрыгаспадарчых дарог у калгасах і саўгасах.

У гады ўздыму шырылася магутнае сацыялістычнае спаборніцтва, якое ўнесла важкі ўклад у рост прадукцыйнасці працы, памнажэнне выпуску прадукцыі і павышэнне яе якасці. У ім раслі людзі, праяўляўся працоўны гераізм. Перадавікі былі адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Народная адукацыя і навука. З ліпеня 1944 г. мясцовымі органамі ўлады і грамадскасцю былі зроблены рашучыя крокі па арганізацыі дзейнасці школ. Дзе была магчымасць, рамантаваліся старыя памяшканні, а большасць іх размяшчалася ў розных будынках, вышуквалася і рамантавалася школьная мэбля, выраблялiся вучнёўскія парты і лаўкі, збіраліся падручнікі, сшыткі і розная папера, якая замяняла іх для пісьма. І першага верасня 1944 г. пачаліся заняткі ў большасці пачатковых і сямігадовых школ на тэрыторыі былых Косаўскага, Быценскага і Целяханскага раёнаў, якія пазней склалі Івацэвіцкі раён.

Цяжкасці былі неймаверныя — не было належнай матэрыяльнай базы і кадраў настаўнікаў. У некаторыя школы для навучання дзяцей прыцягваліся людзі нават без сямігадовай адукацыі. Так, у Размеркаўскай пачатковай школе, а затым Стайкаўскай настаўніцай працавала Надзея Бандарык з шасцю класамі сямігодкі, у Грыўдзе — Мікалай Бароўскі, у Бычы — Вера Паляшчук і інш.

Пад школы занімалі будынкі, кінутыя ўцёкшымі здраднікамі, арандавалі хаты ў сялян. Так, у вёсцы Гошчава заняткі ў сямігадовай школе праводзіліся ў шасці хатах, раскіданых на немалой адлегласці адна ад адной. У вёсцы Грыўда 4-класная пачатковая школа размясцілася ў хаце з двух пакойчыкаў. У прыватных хатах вяліся заняткі ў Выганашчах, Святой Волі, Хадаках і іншых вёсках раёна.

Але гэтыя цяжкасці, якія дзяржава трымала пад найбольш пільным наглядам, паступова ліквідаваліся. Ішло будаўніцтва школьных пакояў, куды пераводзіліся заняткі з наёмных і прыстасаваных сялянскіх хат. Ішло папаўненне кваліфікаванымі настаўніцкімі кадрамі за кошт моладзі, якая заканчвала педвучылішчы, настаўніцкія і педагагічныя інстытуты. Большасць з тых, хто прыйшоў працаваць у школу пасля вайны без адпаведнай адукацыі, завочнай вучобай замацавалі сябе на гэтай рабоце. Многія сталі выдатнымі педагогамі. Сярод іх — Мікалай Данілавіч Куіс, які з сямігадовай адукацыяй пачаў працаваць у Гошчаўскай, затым Запалянскай і Косаўскай школах. Ён завочна закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і стаў выдатным матэматыкам. Пётр Лявонавіч Ярчак завочна закончыў спачатку настаўніцкі інстытут як гісторык, а затым Мінскі педагагічны інстытут замежных моў як выкладчык

нямецкай мовы. Такім чынам удасканальвалі свае веды і набывалі педагагічнае майстэртва Леанід Сцяпанавіч Харытановіч, які настаўнічаў у Косаўскай, а затым Быценскай школах, Дзіна Канстанцінаўна Мароз, спачатку настаўніца Скуратоўскай пачатковай, а затым Косаўскай і Даманаўскай сярэдніх школ. Можна прывесці дзесяткі іншых прыкладаў.

Варта адзначыць вялікі ўклад у станаўленне пасляваеннай школы ў нашым раёне педагагоў-арганізатараў, загадчыкаў райана Дзіковіча, Шчаранкова, Сіраша, В. Беразавіка, дырэктараў школ М. Грушэвіч, Я. Янчанка, М. Случаноўскага, Я. Волкава, А. Зайца, В. Дзебліка, М. Кохава, М. Дзядка і інш. Гэта яны, не ведаючы адпачынку, без належнага фінансавання і матэрыялаў, але з дапамогаю дзяржавы і пры апоры на грамадскасць ужо ў другой палове 40-х і ў 50-я гады ўзвялі першыя будынкі школ у Косаве, Івацэвічах, Гошчаве, Бусяжы, Квасевічах, Даманаве, Бьщені, Целяханах, Выганашчах, Святой Волі і ў многіх іншых вёсках раёна. Іх справу ў 60—80-я гады прадоўжылі загадчыкі райана М. Мельнікаў, М. Цярэшка, А. Пархута, М. Крываль, В. Басалай, дырэктары школ В. Фокін, М. Банасевіч, І. Глушэня, К. Папова, В. Молаш, Г. Трубенка, В. Курзаў, Я. Буравін, Я. Ляўчук, Ж. Гардзейка, М. Суханосік, М. Баркоўскі, Ф. Лемяшэўскі, Р. Шэляговіч і інш.

Захапляе мужная праца педагагічных работнікаў школ. Без належных жыллёвых і бытавых умоў (не заўсёды было чым газоўку заправіць ці пакой пратапіць), без наглядных друкаваных дапаможнікаў і пісьмовых прылад яны навучалі дзяцей і навучалі добра. Многія з вучняў першых пасляваенных гадоў, а ў большасці яны былі пераросткамі, сталі пазней педагогамі, інжынерамі, вучонымі, выдатнымі рабочымі, хлебаробамі. Добрую памяць аб сабе аставілі настаўніца пачатковых класаў Косаўскай сярэдняй школы Арлова Ксенія Аляксандраўна, якой першай у раёне Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 21 студзеня 1949 г. было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР», настаўнікі Ф. Кароль, Г. Сяргейчык, М. Котава, Б. Варанковіч, В. Харкоў, Ф. Быкаў, А. Лебедзева, Я. Бабуліна, А. Апрышка, К. Зуфцянкова і многія інш.

Ужо ў 1947 г. толькі ў Косаўскім раёне працавалі дзве сярэднія, 6 няпоўных сярэдніх і 44 пачатковыя школы, дзе навучаннем былі ахоплены каля сямі тысяч дзяцей. Нагадаем, што пры панскай Польшчы існавала толькі 20 школ, у якіх навучацца маглі 1500 дзяцей.

Ішоў час. Расла сетка школ, умацоўвалася іх матэрыяльна-тэхнічная і вучэбная база, папаўняліся яны кадрамі высококваліфікаваных настаўнікаў і выхавацеляў. Школа перажыла цэлы рад рэарганізацый і рэформ. Адны з іх спрыялі лепшай рабоце, другія — толькі ліхарадзілі. Але школа мацнела і стала сапраўднай базай і кузняй у выхаванні маладых людзей, узбагачэнні іх ведамі, патрэбнымі ім і краіне.

З канца 60-х да пачатку 80-х гадоў школа была агульнаадукацыйна-прафесійнай. Навучанне ў ёй доўжылася 11 гадоў. Вялікая ўвага ўдзялялася павышэнню якасці навучання, працоўнаму выхаванню і прафесійнай падрыхтоўцы навучэнцаў. У сярэдніх школах ствараліся ўмовы для гэтага. У Івацэвіцкай СШ № 1, Гошчаўскай, Даманаўскай, Любішчыцкай, Целяханскай і іншых былі створаны спецыяльныя кабінеты па прафесійнай падрыхтоўцы шафёраў, трактарыстаў, краўчых і іншых спецыялістаў. У пачатку 80-х гадоў замест класаў працоўнай спецпадрыхтоўкі ў школах раёна былі створаны тры міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты (Косава, Любішчыцы, Целяханы), дзе вучні 10—11-х класаў навучаліся розным прафесіям.

У тыя гады ў школах уводзілася кабінетная сістэма навучання, у вучэбны працэс шырока ўкараняліся тэхнічныя сродкі навучання. Значна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база школ. Рос метадычны ўзровень працы настаўнікаў, што давала станоўчыя вынікі ў павышэнні ведаў вучняў і іх выхаванасці. Звычайна больш палавіны выпускнікоў такіх школ, як івацэвіцкія сярэднія № 1 і № 2, Любішчыцкая, Даманаўская, Гошчаўская, Косаўская, Целяханская, прадаўжалі вучобу ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

У 1984 г. у раёне працавалі 23 сярэднія, 23 васьмігадовыя, 14 пачатковых школ, тры спецшколы-інтэрнаты. Пры сямі школах, у якіх навучаліся дзеці з аддаленых вёсак, працавалі інтэрнаты, дзе жылі 250 вучняў. Харчаванне дзяцей у школах ажыццяўлялі 43 сталовыя і буфеты. Любішчыцкая і Падстарынская школы працавалі з прадоўжаным днём для ўсіх вучняў, а ў астатніх працавала 106 груп прадоўжанага дня, якія ахоплівалі 3935 вучняў. З вёсак, аддаленых ад школ больш чым на тры кіламетры, ажыццяўляўся падвоз дзяцей транспартам калгасаў або маршрутнымі аўтобусамі. У школах працавалі вучнёўскія вытворчыя брыгады, у якіх было 1940 вучняў. У трох вучэбна-вытворчых камбінатах навучэнцы займаліся па 14 спецыяльнасцях, атрымліваючы прафесійныя навыкі для працы пасля школы. У Целяханскім ВВК 679 вучняў авалодвалі 9 спецыяльнасцямі: трактарыст-машыніст, аператар машыннага даення, плодаагароднік, прадавец, дрэваапрацоўшчык, аўтавадзіцель, мастак-афарміцель і інш. У Косаўскім ВВК былі ўведзены спецыяльнасці: трактарыст-машыніст, шафёр, краўчыха, мэбельшчык, па якіх навучаліся 360 вучняў.

Усяго ў 1983/84 навучальным годзе ў школах раёна займалася 11 956 дзяцей, з якіх 1226 атрымалі васьмігадовую, а 932 — сярэднюю адукацыю. 546 выпускнікоў з сярэдняй адукацыяй прадоўжылі вучобу ў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных установах і прафесійна-тэхнічных вучылішчах. Астатнія былі працаўладкаваны. У падрыхтоўцы моладзі да жыцця стала адыгрываць прыкметнае месца сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 162 у Івацэвічах, дзе выпускнікі дзевятых класаў тры гады, а 11-х — адзін год навучаліся прафесіям трактарыста, камбайнера, шафёра, слесара, газаэлектразваршчыка, кінамеханіка.

У гэты час вырасла кагорта выдатных педагогаў, адданых справе навучання і выхавання дзяцей усёй душой, усім сэрцам. Многім з іх прысвоены званні настаўнік-метадыст, старшы настаўнік. Сярод іх Белая Я. П., Кот Г. П. (Гошчаўская СШ), Варчанка С. Н., Шаўчук С. А. (Івацэвіцкая СШ № 2), Мартысюк А. Н. (Целяханская СШ), Дагель Г. М. (Любішчыцкая СШ), Еўтух А. І. (Запалянская ВШ), Аўласевіч З. П. (Няхачаўская СШ), Акуліч З. І. (Быценская школа-інтэрнат) і інш.

Наступіў 1995/96 навучальны год. У раёне працавалі 29 сярэдніх, 15 базавых, 7 пачатковых школ, 3 спецшколы-інтэрнаты, санаторная школа, у якіх навучалася 10 946 дзяцей. Іх навучаннем і выхаваннем займаліся 1956 настаўнікаў, з якіх больш за 80 працэнтаў мелі вышэйшую педагагічную адукацыю, астатнія — сярэднюю педагагічную. У 36 дашкольных дзіцячых установах выхоўваліся 2735 дзяцей (46 працэнтаў дзяцей дашкольнага ўзросту).

З сярэдзіны 90-х гадоў школа ўступіла ў паласу новага рэфармавання. Яе дзейнасць закранаюць тыя падзеі, якія адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Ва ўмовах разнастайных палітычных захапленняў, сур'ёзных эканамічных цяжкасцей, заняпаду маральнасці педагагічным калектывам патрэбна вялікае напружанне сіл, каб

навучыць і выхаваць годных грамадзян незалежнай Беларусі.

Даволі паспяхова вырашаліся многія праблемы ў школе-гімназіі № 3 г. Івацэвічы (дырэктар Гардзейка Ж. Г.), Аброўскай, Целяханскай сярэдніх школах, Магіліцкай, Падстарынскай, Краглевіцкай і іншых базавых школах з 9-гадовым навучаннем. І тут добра праяўляюць сябе многія настаўнікі, майстры сваёй справы. Гэта Парфяновіч А. А. (Воленская СШ), настаўніцы пачатковых класаў Завадская Н. В. (СШ № 3 г. Івацэвічы), Брыль Л. В. (Любішчыцкая СШ), матэматыкі — Якубец Л. А. (СШ № 3), Рэгес Р. П. (СШ № 1), рускай мовы і літаратуры — Шабаловіч Т. У. (Целяханская СШ), Калінка Н. Я. (Гошчаўская СШ), біялогіі — Клімава М. Л. (Целяханская СШ), фізікі — Саўчык М. В. (СШ № 1) і інш.

Многія настаўнікі Івацэвіцкага раёна за сваю выдатную педагагічную дзейнасць адзначаны дзяржавай: 16 атрымалі званне «Заслужаны настаўнік БССР», больш за 130 атрымалі значкі «Выдатнік народнай адукацыі БССР», 56 узнагароджаны ордэнамі і медалямі, граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

У выхаванні дзяцей важнае месца займалі спецыяльныя дашкольныя і пазашкольныя дзіцячыя ўстановы. Адразу пасля вызвалення раёна ў Косаве адкрыўся дзіцячы дом, у які былі залічаны дзеці-сіроты загінуўшых франтавікоў і партызан. У ім працавалі выдатныя педагогі-выхавацелі Гурко Л. І., Худзінская З. П., Карніеўская Н. І. Узначальвалі яго Ермакоў М. Н., Мароз В. І., Салавейка І. Ф., Камоска Л. Я.

У пазнейшы час важнае месца ў выхаванні і навучанні дзяцей занялі школы-інтэрнаты, дзе жылі і займаліся дзеці са складаных сем'яў. Гэта Целяханская школа-інтэрнат, якою доўгі час кіравалі выдатныя педагогі О. Зімак, Н. Тамарава, П. Ячнік, Югалінская школа-інтэрнат (дырэктары М. Случаноўскі, Л. Кузьміч, І. Сяледчык, В. Каброў), Быценская школа-інтэрнат (дырэктары І. Жыватчэня, В. Аскіра, А. Пархута).

Целяханская школа-інтэрнат была створана ў 1961 г. на базе дзіцячага дома. Першыя тры гады яна была сямігадовай, а з 1965 г. стала сярэдняй у асноўным для дзяцей сірот і паўсірот. Тады ў ёй навучалася 350 чалавек. Шмат сіл і энергіі ў яе станаўленне ўклаў дырэктар Зімак Захар Ашэравіч. Паслядоўнік выдатных педагогаў Макаранкі і Сухамлінскага, ён укараняў у жыццё дзіцячага і педагагічнага калектываў выдатныя традыцыі выхаваўчага працэсу. Пазней ён стаў кандыдатам навук і выкладаў у Брэсцкім тэхналагічным інстытуце. У 1965 г. у школе працавалі 12 настаўнікаў і 23 выхавацелі. Завучам з першых дзён існавання школы-інтэрната была Тамарава Ніна Мітрафанаўна, якая затым у 1971 г. стала яе дырэктарам. У школе працавалі выдатныя педагогі — Кошаль А. С., Ляўчук І. І., Калбаска А. І. У 1971 г. школе прысвоена імя Героя Савецкага Саюза В. З. Харужай.

Да 1980 г. Целяханская школа-інтэрнат была сярэдняй агульнаадукацыйнай. З 1980 г. рашэннем Міністэрства адукацыі Беларусі яе рэфармавалі ў школу-інтэрнат для дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця.

За выдатную педагагічную працу двум настаўнікам — Бандарэнка В. М. і Тамаравай Н. М. — прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР», сем педагогаў адзначаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі БССР».

Вялікае значэнне ў выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту мелі дзіцячыя сады і яслі. Калі ў 1950—1955 гг. у раёне было ўсяго 5 дашкольных дзіцячых устаноў, то колькасць іх няспынна расла: у 1975 г. — 23, 1985 — 35, 1993 г. — 41. Праўда, у сярэдзіне 90-х гадоў сетка дзіцячых сад-

коў пачала скарачацца, у 1996 г. іх было ўжо 36. Сказалася не толькі дэмаграфічная сітуацыя, але і ўмовы жыцця некаторых сем'яў, чый сямейны бюджэт не дазваляў утрымліваць дзяцей у садку.

У рабоце з дзецьмі дашкольнага ўзросту вызначаліся выхавацелі Букшта В. В., Собалева Г. А., Вайцюк Т. А., Зубель І. М., Казак Н. Р., Мамчыц Т. М. і інш.

У выніку глыбокай навучальна-выхаваўчай работы школ выявіліся здольныя і таленавітыя людзі, якія затым, паглыбіўшы свае веды ў вышэйшых навучальных установах, заняліся навуковай дзейнасцю.

Культурна-асветніцкая работа. Пасля выгнання акупантаў у раёне павінна была правесціся значная работа па аднаўленні і развіцці дзейнасці культурна-асветніцкіх устаноў. Ужо ў 1946 г. на Косаўшчыне разгарнулі работу 13 хат-чытальняў, 3 бібліятэкі, чырвоныя куткі. Гэта быў пачатак ажыўлення культурна-асветніцкай дзейнасці. У хатах-чытальнях гуртаваліся любіцелі мастацкай самадзейнасці, якая намаганнямі моладзі стала ўсё больш прыкметнай.

Паступова ў буйных населеных пунктах узнікаюць клубы, дамы культуры, бібліятэкі, павялічваецца іх кніжны фонд, якім карысталася ўсё большая колькасць людзей. У 1991 г. у раёне працавалі 52 бібліятэкі, 51 установа клубнага тыпу, 6 музычных школ.

Важным сродкам асветніцкай работы з'яўляецца дзейнасць бібліятэк. Самай буйной з'яўляецца цэнтральная бібліятэка ў г. Івацэвічы імя П. Пестрака, дзе кніжны фонд складае 55 тысяч экземпляраў. Яе паслугамі карыстаецца больш за 3 тысячы чытачоў. Тут часта наладжваюцца чытацкія канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы. Кіруе яе дзейнасцю Ашкала Ганна Якаўлеўна, а цэнтральную бібліятэчную сістэму раёна ў 1996 г. узначальвала Янковіч Марыя Фёдараўна. Усяго бібліятэкі раёна абслугоўваюць больш за 31 тысячу чытачоў. У іх працуе 20 спецыялістаў з вышэйшай і 37 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. За ўмелую і актыўную работу павагай і аўтарытэтам карыстаюцца работнікі бібліятэк Чаплінская М. С., Голубева Т. В., Краўцэвіч В. Г., Казак В. М. і іншыя.

Колькасны рост клубных устаноў суправаджаўся павышэннем зместу і аб'ёму іх работы. Прыкметнай падзеяй культурнага жыцця стала адкрыццё ў 1990 г. Дома

Хор Гошчаўскай СШ. 1987 г.

культуры ў райцэнтры, які ўзначальвае Кулецкі Юрый Пятровіч. Да паслуг жыхароў горада ў ім ёсць глядзельная зала на 500 месц, танцавальная зала, 15 пакояў для заняткаў гурткоў і любіцельскіх аб'яднанняў.

У Івацэвіцкім гарадскім Доме культуры працуюць чатыры народныя калектывы. Гэта аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам Н. Бусяцкай, народны тэатр (рэжысёр Ю. Кулецкі), духавы аркестр, якім даўно кіруе А. Юркевіч, і клуб кветкаводаў (кіраўнік Ж. Галашкевіч).

Ва ўсіх клубных установах раёна працуюць 20 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і 56 — з сярэдняй спецыяльнай. У дзейнасць Косаўскага ГДК шмат сіл уклаў Клімуш, Целяханскага — Крынец М. М., Аляксандраў А. П. і Курачкін В. В., Івацэвіцкага — Пархомік І. А. і Бянько А., Гошчаўскага СДК — Ярчак Т. Я., Амяльнянскага ДК — Краснікава Г. С., Быценскага ДК — Фядосік В. М., Грыўдзенскага ДК — Лушчык Т. У. і іншыя.

Важнае месца ў дзейнасці клубных устаноў адводзіцца мастацкай самадзейнасці. У 1995 г. у раёне налічвалася 304 калектывы самадзейных артыстаў, у якіх занята было 3206 чалавек. Сем калектываў удастоены ганаровага звання народных. Здаўна добрай славай у раёне і за яго межамі карыстаецца Целяханскі народны тэатр, які быў утвораны ў 1957 г. з драмгуртка, а ў 1967 г. яму прысвоена званне народнага. Рэжысёрамі і кіраўнікамі гэтага тэатра ў розныя часы былі Уліціна Лідзія Данілаўна, Сонцава Ганна Мікалаеўна. З 1984 г. яго ўзначальвае Кузняцова Данута Восіпаўна.

Тэатр паставіў нямала цікавых спектакляў. Гэта — «Папараць-кветка» Івана Козела, «Змоўклі птушкі» і «Не верце цішыні» Івана Шамякіна, «Страпуха» Анатоля Сафронава, «Трыбунал» Андрэя Макаёнка і іншыя. У 1996 г. тэатр выступіў з новым спектаклем «Мора, аддай пярсцёнак» Г. Каржанеўскага.

У тэатры артыстамі-аматарамі выступалі Віктаровіч М. А., Гарбачоў С. Ф., муж і жонка Капыщічы, Струнеўская В. І., Гертэль А. І., Юра Харужы і іншыя.

У перыяд станаўлення народнага тэатра дзейсную дапамогу яму аказаў артыст Брэсцкага абласнога драмтэатра заслужаны артыст БССР А. М. Самараў.

У 80—90-я гады шырокую вядомасць набылі ансамбль народных інструментаў «Гоман» Косаўскага ГДК (кіраўнік Е. Шчарбіна), ансамбль народных інструментаў «Іванічы» Івацэвіцкага арганізацыйна-метадычнага цэнтра культуры (кіраўнік В. Кулініч), фальклорны ансамбль Коланскага сельскага Дома культуры (кіраўнік Н. Заяленчыц).

Спецыфічнай формай адпачынку насельніцтва з'явіліся аматарскія аб'яднанні. Гэтай дзейнасцю ў 1995 г. было ахоплена больш за тысячу чалавек, якія былі згуртаваны ў 56 аматарскіх аб'яднаннях, два з якіх носяць званне народнага. Гэта клуб аматараў народнай песні «Спадчына» Даманаўскага СДК (кіраўнік Т. Сіманчук) і клуб кветкаводаў «Віёла» Івацэвіцкага ГДК.

Калектывы, якім прысвоена званне народнага, ажыццяўляюць актыўную канцэртную дзейнасць, шмат разоў удзельнічалі ў тэлевізійных праграмах. Даманаўскі народны калектыў «Спадчына» прымаў удзел у праграме Беларускага тэлебачання «Запрашаем на вячоркі», там жа выступіў і фальклорны калектыў «Каланянка» Коланскага сельскага клуба. Самадзейныя артысты раёна ўдзельнічалі ў праграмах Брэсцкага тэлебачання.

Задача адраджэння традыцыйнай культуры выклікала да жыцця праблему стварэння школ народнай творчасці. Дзеці з Любішчыц, Целяхан, Аброва, Горталя, Стаек, дзе адкрыліся класы народнай творчасці, маюць магчымасць дакрануцца да крыніц народных мастацкіх промыслаў.

Новая школа з'явілася ў раённым цэн-

тры. Гэта школа эстэтычнага выхавання пры Івацэвіцкім ГДК (дырэктар В. Кулецкая), якая створана ў 1990 г. У ёй за час існавання больш за 300 дзяцей пазнаёміліся з асновамі тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага мастацтва.

У 1989 г. сфарміраваны раённы арганізацыйна-метадычны цэнтр культуры, які вядзе доследную работу, інфармацыйнае забеспячэнне дзейнасці ў сферы культуры, запісвае ўзоры абрадаў і фальклору.

У культурным абслугоўванні насельніцтва важнае месца займае кіно. У Івацэвічах дзейнічае стацыянарны кінатэатр «Партызан» з глядзельнай залай на 250 месц, з прасторным фае, сцэнай, падсобнымі памяшканнямі. Кінатэатры пабудаваны ў Косаве, Целяханах, Быцені. У сельскіх населеных пунктах кінаўстаноўкі размешчаны на базе клубных устаноў. Усяго ў раёне ў 1989 г. працавалі 78 стацыянарных кінаўстановак. У 1991 г. яны абслужылі больш за 800 тысяч гледачоў. Кіно ў раёне развівалася ад кінаперасовак у 40—50-я гады, якія перамяшчаліся з вёскі ў вёску на конных павозках да стацыянараў з добрай апаратурай. У 1991 г. у кінасетцы раёна працавала 126 чалавек.

Праўда, з шырокім укараненнем тэлебачання ў быт кожнай сям'і зменшыўся паток кінагледачоў. У 1995 г. было ўсяго 98 тысяч гледачоў. Але і сёння кіно займае важнае месца ў выхаванні працоўных і задавальненні іх духоўных запатрабаванняў.

Тэлебачанне і радыё таксама аказваюць значны ўплыў на духоўны стан чалавека. Усё часцей радыёкропкі ўступаюць месца радыёпрыёмнікам. Падрыхтаваны і праведзены першыя перадачы мясцовага радыёвяшчання.

Мастацтва. Лічаць, што душа чалавека найбольш яскрава праяўляецца праз яго мастацкую творчасць, у якой адлюстраваны побыт, мары, імкненні, справы пакалення, яго духоўны свет.

Наш раён даў беларускаму народу мо і не так шмат вядомых літаратараў, мастакоў, журналістаў, але нельга не сказаць добрага слова аб тых людзях, якія праз свае душы вынеслі на жыццёвы прастор калярыт роднага краю, яго бурлівае жыццё з глыбокімі і шчырымі пачуццямі любві да роднай зямлі, свайго народа, яго шчасця.

Адным з даўнейшых паэтаў нашага раёна быў Кандрат Тодаравіч Лейка, які з 1879 г. пасля заканчэння Свіслацкай настаўніцкай семінарыі пяць гадоў працаваў настаўнікам у Косаўскім народным вучылішчы. Вось тут і распачаў ён сваю літаратурную творчасць. У 1912 г. у Вільні была надрукавана яго п'еса-казка «Снатворны мак» (Сцэна для дзіцячых тэатраў). Друкаваліся яго шматлікія вершы аб прыродзе роднага краю, яго прыгажосці, дабрыні людзей. На жаль, многія яго творы загінулі.

Адметнае месца ў літаратуры нашай краіны займае Піліп Сямёнавіч Пестрак, які нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Сакоўцы Мілейкаўскага сельсавета. Прыкметны след у беларускай літаратуры пакінуў ураджэнец в. Мілейкі з-пад Косава Яраслаў Сільвестравіч Пархута. Членамі саюза пісьменнікаў Беларусі з'яўляюцца таксама нашы землякі Мікалай Міхайлавіч Грынчык, Аляксей Антонавіч Майсейчык, Уладзімір Вікенцьевіч Мароз, Сцяпан Антонавіч Крываль.

Нарадзіўся на Рагачоўшчыне, але скончыў Івацэвіцкую дзесяцігодку беларускі паэт Мікалай Сымонавіч Купрэеў. Пасля Брэсцкага педінстытута працаваў у школах Высокаўскага, Камянецкага, Пружанскага раёнаў. Выйшлі з друку тры зборнікі вершаў Міколы Купрэева. У 1995 г. убачыў свет зборнік «Правінцыяльныя фантазіі». З гэтай нагоды выступіў з артыкулам «Споведзь душы» ў газеце «ЛІМ» прафесар Брэсцкага педагагічнага

універсітэта А. А. Майсейчык. Ён піша: «Мікола Купрэеў прыйшоў у беларускую паэзію ў 60-я гады на хвалі паэтычнага ўздыму Берасцейшчыны, якая ў тыя гады вылучыла шмат паэтычных імёнаў...

Помню, першы зборнік М. Купрэева «Непазбежнасць» мяне моцна ўразіў. Матывы яго вершаў былі блізкія чытачам майго пакалення, якое ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ўступала ў актыўнае грамадскае жыццё і хацела вызначыць у ім сваё месца. Вершы ж М. Купрэева якраз і вызначаліся роздумам над сутнасцю жыцця, яго маральных асноў. Малады паэт, што ў дзіцячыя гады перажыў жахі вайны, асмельваўся асэнсоўваць катэгорыі трагічнага і гераічнага, абапіраючыся на ўласны жыццёвы вопыт і вопыт сваіх аднагодкаў. Ужо тады ў яго вершах можна было адчуць выразную схільнасць да філасофскага роздуму, медытацыі...

І вось пасля перапынку амаль у 30 гадоў новая сустрэча з паэтам: з друку выйшаў другі па ліку яго зборнік — «Правінцыяльныя фантазіі». У ім змешчаны зусім не вершы-летуценні. Зусім не правінцыяльныя яны і па зместу. Амаль кожны твор з новага зборніка М. Купрэева ўяўляе сабою глыбокі роздум паэта над сваім лёсам, які склаўся мо і нешчаслівa, але даў жыццё непаўторна адметнай яго паэзіі...».

Настаўнік літаратуры Івацэвіцкай СШ № 1 Віктар Касько, разглядаючы творчасць М. Купрэева ў артыкуле «У двух вымярэннях», надрукаваным у раённай газеце «Івацэвіцкі веснік» 28 ліпеня 1996 г., піша, што паэзія яго каранямі прарастае ў родную беларускую зямлю, складае жывую плоць, дасягаючы вышынь піменаўскай маланкі:

Быў я ант, быў я смерд,
Быў радзіміч, крывіч, дрыгавіч.
Раскосым не стаў ад татара-манголаў,
ад туркаў не стаў гарбаносым,
не стаў уніятам,
а хацеў я — і стаў
непакорлівым,
мірным,
бела-русавалосым...

Міколу Купрэеву ў 1997 г. прысуджана літаратурная прэмія імя Аркадзя Куляшова Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Акрамя іх, у 70—90-я гады ўваходзіць у літаратуру моладзь. Няхай невядомы яны шырокай грамадскасці, але іх творы сведчаць аб значных літаратурных здольнасцях, што дае ім права на цікавасць да сваёй творчасці і вядомасць. Сярод іх варта адзначыць Аляксея Белага з Міхнавіч, які нядаўна выпусціў свой першы паэтычны зборнік, мясцовых паэтаў, якія часта выступаюць у раённым, абласным і рэспубліканскім друку, — Якава Янчанку з Косава, Пятра Валінскага са Стаек, Сцяпана Кухарчука і Віктара Рэчыца з Івацэвіч, Івана Белага з Гошчава і многіх маладых здольных пачынальнікаў літаратурнай творчасці.

Хочацца назваць і мастака Віктара Такарчука. Адразу пасля вызвалення на тэрыторыі раёна пачалі выдавацца тры мясцовыя газеты — «Чырвоная звязда» (Косава), «Новае жыццё» (Быцень), «Перамога» (Целяханы). Тады яны былі органамі адпаведных райкомаў партыі і райвыканкомаў. На іх старонках расказвалася, як ішло аднаўленне гаспадаркі і культуры, узводзіліся новыя прадпрыемствы, мянялася жыццё вёскі. З разгортваннем масавай калектывізацыі сялянскіх гаспадарак у 1950 г. пры машынна-трактарных станцыях былі ўтвораны палітаддзелы, якія пачалі выпускаць свае газеты: «Бальшавіцкая праўда» (Косава), «Новае жыццё» (Івацэвічы), «Бальшавіцкі шлях» (Целяханы). Выканаўшы роль садзейнічання арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, у 1953 г. яны спынілі сваё існаванне.

Пасля аб'яднання Косаўскага (Івацэвіцкага), Быценскага і Целяханскага раёнаў у адзін, Івацэвіцкі, у ім выдавалася павялічаным фарматам газета «Зара камунізму». У другой палове 60-х гадоў яна стала называцца «Кастрычнік».

У той час вельмі хутка расла падпіска на абласныя, рэспубліканскія і цэнтральныя друкаваныя выданні. У 1990 г. у раёне выпісвалася больш за 10 тысяч экземпляраў газет і часопісаў. Шпарка рос попыт і на кнігі, якія распаўсюджваліся праз кнігарні ў Івацэвічах, Косаве, Быцені і Целяханах, а таксама кіёскі «Саюздруку».

У пасляваенны час хутка ішло развіццё радыёсеткі. Ужо ў 50-я гады былі радыёфікаваны ўсе населеныя пункты раёна. Радыё прыйшло амаль у кожны вясковы дом. Вяло перадачы і мясцовае радыёвяшчанне, якое знаёміла жыхароў з навінамі мясцовага жыцця.

У 90-я гады пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь у раёне выдаваліся газеты «Кастрычнік» (пазней названа «Івацэвіцкі веснік»), «Наш голас» (газета мясцовай рады БНФ, выйшла 5 нумароў) і з 1995 г. «Газета Уладзіміра Кудзінава» (пазней «Газета для вас»). «Івацэвіцкі веснік» выдаецца раённым Саветам і райвыканкомам, а «Газета для вас» — камерцыйнай фірмай «Івацэвічы». Больш шырокім стаў дыяпазон асвятлення праблем грамадскага, гаспадарчага і палітычнага жыцця раёна, выказваліся розныя погляды на тыя ці іншыя з'явы.

Разам з тым значна скарацілася падпіска на газеты і часопісы. Гэта тлумачыцца высокімі падпіснымі цэнамі пры зніжэнні грашовых даходаў большасці жыхароў раёна. Скарацілася і колькасць радыёкропак.

Гаворачы аб развіцці друку і радыё ў раёне, трэба назваць і журналістаў, якія зрабілі пэўны ўклад у іх станаўленне і дзейнасць. Гэта рэдактары і супрацоўнікі газет Рудой А. П., Каваленка І. А., Хаванскі Ф. І., Радзюк Р. М., Банасевіч М. В., Марчанка С. Ц., Радзюк М. С., Рымач М. М., Рэчыц В. Ц., Мергес П. А., рабочыя і сельскія карэспандэнты М. Багайчук, В. Булыка, В. Мароз, Г. Трубенка, В. Каленік і многія іншыя актывісты друкаванага слова.

Вяртанне да рэлігіі. У раёне найбольш распаўсюджана праваслаўе. Да яго прымыкаюць хрысціяне-евангелісты, баптысты. Нешматлікая група людзей, у асноўным палякі, прытрымліваюцца каталіцтва. Нязначныя спробы ажывіць уніяцтва

Новая царква ў в. Святая Воля. 1995 г.

падтрымкі не атрымліваюць. На працягу амаль паўстагоддзя з боку кіруючай у той час камуністычнай партыі і органаў улады пад сцягам атэізму ішоў наступ на рэлігію. Было імкненне прыкрыць цэрквы, камуністы і камсамольцы караліся за ўдзел у выкананні рэлігійных абрадаў.

З гарбачоўскай перабудовай пачалося новае стаўленне да рэлігіі, поўнае ажыццяўленне канстытуцыйнай свабоды сумлення. Рэлігіі аддалі яе ролю ў духоўным жыцці веруючых людзей. Ажывіліся праваслаўныя цэрквы, малітоўныя дамы хрысціян-евангелістаў, больш актыўна стаў дзейнічаць каталіцкі касцёл у Косаве.

Пачалі адраджацца і абнаўляцца цэрквы. У вёсцы Святая Воля пабудаваны новы храм. Ідзе будаўніцтва новага храма ў Івацэвічах. Адрамантаваны будынкі цэркваў у Бялавічах, Быцені.

Рэлігійная духоўнасць паступова аказвае ўсё большы ўплыў на маральнае станаўленне асобы.

Ахова здароўя. Нямецка-фашысцкая акупацыя нанесла непамерна цяжкі ўдар па медыцынскаму абслугоўванню насельніцтва. Былі знішчаны бальніцы ў Косаве, Быцені, Целяханах, усе фельчарска-акушэрскія пункты (фапы). Трэба было нанава аднаўляць усю сетку медыцынскіх устаноў. Органы ўлады, грамадскасць горача ўзяліся за гэту справу. У былым Косаўскім раёне на 1 студзеня 1947 г. ужо працавалі дзве бальніцы, амбулаторыя, 6 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, у якіх было занята 25 медыцынскіх работнікаў. У станаўленне раённай медыцыны адразу пасля выхаду з лесу ўключыўся партызанскі ўрач Уладзімір Міхайлавіч Талкачоў, загадчык раённага аддзела аховы здароўя Андрэй Якаўлевіч Грынгаўс. У гады першай пасляваеннай пяцігодкі вызначыліся ўрачы Корзан, Грынчык, Глушанкоў, Папова, Падошвелеў, Новік і іншыя. Былі адкрыты ўрачэбныя ўчасткі ў Грыўдзе, Святой Волі, Хадаках, Любішчыцах, сталі працаваць 8 фапаў, радзільны дом. У былым Целяханскім раёне да 1955 г. сталі функцыянаваць дзве бальніцы, радзільны дом, сем фапаў.

На працягу 60—80-х гадоў шырылася сетка медыцынскіх устаноў, якія папаўняліся кваліфікаванымі кадрамі, рос аб'ём аказваемых медыцынскіх паслуг у шматлікіх аддзяленнях бальніц і паліклінік, фапах, здраўпунктах. Паўсюдна медыцынская дапамога аказвалася бясплатна ўсім катэгорыям насельніцтва.

Пад канец 80-х гадоў у раёне функцыянавала шэсць бальніц на 760 ложкаў, 8 здраўпунктаў, 3 урачэбныя амбулаторыі, 40 фельчарска-акушэрскіх пунктаў і 7 аптэк. На варце аховы здароўя людзей стаялі больш за 110 урачоў, 505 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. Была пабудавана новая добраўпарадкаваная бальніца ў г. Івацэвічы з тэрапеўтычным, неўралагічным, хірургічным, траўматалагічным, інфекцыйным, дзіцячым, радзільным, вочным аддзяленнямі з паліклінікай і лячэбнымі кабінетамі, станцыямі хуткай дапамогі і пералівання крыві. У горадзе ўзведзена дзіцячая паліклініка, дзе працуюць кваліфікаваныя дзіцячыя ўрачы.

Новая бальніца пабудавана ў г. Косава, галоўным урачом якой з 1949 г. да 1973 г. працаваў У. М. Талкачоў — заслужаны ўрач БССР. Пабудаваны бальніцы ў Целяханах, Быцені, Святой Волі, фапы ў Гошчаве, Квасевічах, Горталі, Даманаве, Стайках, Аброве, Любішчыцах і іншых населеных пунктах. Прыкметны ўклад у медыцынскае абслугоўванне насельніцтва ўнеслі ўрачы Новікава, Кернажыцкі, Тормасаў, Чаркасада, Паўлік, Сарокіна, Дылько, Ляпешка, Корзан, Каравай, Касмін, Навіцкі, Рыжко, Афіцэраў, Грынчык, Януш, Амяляшчык і інш.

На вясковых фапах стараннасцю вызначыліся фельчары Засюк Е. І. (Гор-

таль), Сухадольская Л. М. (Зялёны Бор), Собка А. А. (Коланск), Лінкевіч Н. С. (Рудня), Мялік З. І. (Яглевічы), Макарэвіч Н. А. (Доўгая) і інш.

Для лячэння і навучання дзяцей працуе санаторная школа ў п. Сасновы Бор. Для летняга адпачынку дзяцей дзейнічае ў Быцені піянерскі лагер «Дубравушка». У г.п. Целяханы функцыянуе санаторый «Палессе», дзе могуць падмацаваць здароўе не толькі жыхары Івацэвіцкага раёна, але і ўсёй Рэспублікі Беларусь. Для адзінокіх састарэлых працуе Косаўскі дом-інтэрнат.

Аднак у 90-я гады медыцынскія ўстановы аказаліся ў даволі складаным становішчы. Бюджэтныя асігнаванні на іх утрыманне, лякарствы, харчаванне хутка скарачаліся. У 1995—1996 гг. медыкі ўжо не атрымлівалі своечасова зарплату, а самі хворыя значную частку лякарстваў павінны былі здабываць у розных камерцыйных установах па высокіх цэнах. Пагоршылася харчаванне.

Мясцовыя органы ўлады ў пошуках выхаду з крытычнага становішча прынялі праграму «Здароўе». Але гэта не прыбавіла сродкаў. Такая сітуацыя ў 1996 г. прывяла да того, што з мясцовага бюджэту недаатрымана на ахову здароўя каля 5 мільярдаў рублёў.

У медыцынскіх калектывах ёсць на каго раўняцца, ёсць з каго браць прыклад. Сярод іх — рэцэптар аптэкі Кавецкая Паліна Антонаўна, узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга; медсястра Захараджан Надзея Рыгораўна, узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга; загадчыца Грыўдзенскім фапам Пытляк Надзея Рыгораўна — ордэнам «Знак Пашаны»; упраўляючая раённай аптэкай Вабішчэвіч Людміла Васільеўна — ордэнам «Знак Пашаны», урач паліклінікі Канашук Мікалай Сямёнавіч — ордэнам Дружбы народаў.

Узровень жыцця. У 60—80-я гады расла матэрыяльная забяспечанасць людзей, паляпшаліся бытавыя ўмовы жыцця. У раён прыйшоў газ. Ва ўсе вёскі пастаўляецца вадкі газ. У дамах і кватэрах жыхароў раёна ўстаноўлена больш за 7 тысяч газавых пліт. Будуюцца кацельні, у якіх вугаль і дызпаліва замяняюцца газам. Праўда, з сярэдзіны 90-х гадоў ён стаў вельмі дарагім таварам, як і іншыя віды паліва.

Важным фактарам, які характарызуе рост дабрабыту людзей, з'яўляецца наяўнасць у асабістым карыстанні рэчаў доўгатэрміновага ўжытку. Жыхары раёна мелі ў 1996 г. 5309 легкавых аўтамабіляў, больш за 19 тысяч матацыклаў, амаль у кожным доме тэлевізары. Ужо ў 1977 г. у асабістым карыстанні жыхароў Аброва было 8 легкавых аўтамабіляў і 130 матацыклаў. У Гортальскім сельсавеце — 18 аўтамабіляў і 220 матацыклаў, у Рэчкаўскім — 20 аўтамабіляў і 603 матацыклы, у Святавольскім — 20 аўтамабіляў і 407 матацыклаў.

Патрэбнасці сувязі ў 1975 г. забяспечвалі 43 прадпрыемствы. Для паслуг насельніцтва ўстаноўлены 2725 тэлефонных апаратаў, 17 760 радыёкропак.

Спатрэбілася шмат намаганняў, каб вырашыць жыллёвую праблему. У вёсках ужо ў 50-я гады зніклі зямлянкі, сяляне перабраліся ў пабудаваныя хаты. Затым у калгасах і саўгасах разгарнулася будаўніцтва сучаснага жылля — узніклі двух-, чатырох- і васьмікватэрныя дамы, сталі будавацца катэджы. У 90-я гады паўстала праблема расшырэння жылля, забеспячэння яго камунальнымі дабротамі: ацяпленнем, газіфікацыяй, водазабеспячэннем. Горад Івацэвічы за пасляваенныя гады фактычна вырас на голым месцы. У 1945 г. ён уяўляў сабой невялікі пасёлак каля Брэст-Маскоўскай шашы. У ім пражывала да 2 тысяч чалавек. У 1990 г. ён разбудаваўся на вялікай тэрыторыі. На поўнач ад Брэст-Маскоўскай шашы выраслі жылыя мікрараёны са шматкватэрнымі

дамамі, на поўдзень раскінулася вытворчая зона.

Сацыяльнае забеспячэнне насельніцтва. У пасляваенныя гады няспынна расла ўвага дзяржавы да стану яе насельнікаў. Ужо ў 1944—1946 гг. сем'ям ваеннаслужачых і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, інвалідам вайны былога Косаўскага раёна аказана грашовая дапамога ў выглядзе пенсій і выплат, аднаразовай дапамогі. У 1947 г. у раёне было 788 мнагадзетных маці, якім таксама выдана грашовая дапамога. У органах сацыяльнага забеспячэння працавалі людзі, якія вельмі чула адносіліся да патрэб насельніцтва, — Г. Пытлякоў, Л. Коршунава, С. Пархомік, Т. Якаўлева.

У 60—80-я гады сістэма сацыяльнага забеспячэння ўдасканальвалася. Дзяржава ўвяла пенсійнае забеспячэнне ўсіх катэгорый людзей. Больш клопатаў стала праяўляцца аб інвалідах і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны, ахвярах фашысцкага генацыду. Расшыралася сфера пенсійнага і сацыяльна-бытавога абслугоўвання пенсіянераў. На канец 1995 г. у раёне пражывала 19 605 атрымальнікаў пенсій і дапамог. Гэта амаль кожны трэці жыхар раёна. З іх 15 607 чалавек з'яўляюцца пенсіянерамі па ўзросту, 2261 — па інваліднасці, 942 — па страце карміцеля, 22 — за выслугу гадоў, 24 — за асобныя заслугі перад Радзімай і 481 чалавек атрымлівае сацыяльную пенсію. Мінімальная пенсія ў першай палове 1996 г. складала 247 050 рублёў, а максімальная — 571 837 рублёў. У 1996 г. 1839 пенсіянераў прадаўжалі працаваць на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях, у калгасах і саўгасах.

На 1 студзеня 1996 г. у раёне пражывала 625 інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку 112 — першай групы, 500 — другой групы і 13 — трэцяй групы, 753 удзельнікі вайны, 547 сем'яў загінуўшых ваеннаслужачых, 304 непаўналетнія вязні фашызму, 25 сем'яў загінуўшых ваеннаслужачых у мірны час.

Раённы аддзел сацыяльнай абароны, які ў 90-я гады ўзначальваў Барысік А. К., рабіў вельмі многа для правільнага налічэння пенсій, іх своечасовай выплаты. У гэтым заслуга работнікаў аддзела Голуб Г. А., Мажэйка Т. Е., Замкінай Е. І. і інш.

У 90-я гады былі прыняты розныя пастановы і законы па паляпшэнні ўмоў жыцця і быту ветэранаў вайны і працы, сем'яў загінуўшых і другіх катэгорый насельніцтва. Штогод праводзіцца абследаванне матэрыяльна-бытавых і жыллёвых умоў ветэранаў вайны і сем'яў загінуўшых і прымаюцца меры па іх паляпшэнні.

Для падтрымкі здароўя пенсіянерам выдзелена ў 1995 г. 89 пуцёвак на курортна-санаторнае лячэнне, а 484 чалавекі атрымалі кампенсацыю за нявыкарыстаныя пуцёўкі. Ветэранам вайны і працы ў 1995 г. устаноўлена 57 тэлефонаў. 134 інваліды вайны маюць у сваім карыстанні бясплатна атрыманыя аўтамабілі «Запарожац» або «Таўрыя», 13 інвалідаў працы атрымалі аўтамабілі па льготных цэнах, 34 маюць мотакаляскі. На выплату кампенсацыі на рамонт, бензін і тэхнічнае абслугоўванне выдаткавана 27 825 тысяч рублёў. Да 50-годдзя Перамогі 1912 удзельнікаў вайны атрымалі матэрыяльную падтрымку.

Асаблівыя клопаты праяўляюцца аб адзінокіх непрацаздольных грамадзянах, за якімі патрэбны догляд. Іх у раёне 1500 чалавек, 435 з іх ахоплены надомным абслугоўваннем.

Значную дапамогу інвалідам і ўдзельнікам вайны, непрацаздольным пенсіянерам аказваюць сельскія Саветы, калгасы, прадпрыемствы. Калгасы «Бальшавік», «Перамога», «Расія», імя Леніна па льготнай цане адпускаюць пенсіянерам збожжа і іншыя прадукты.

М. Банасевіч.

Раённыя газеты пісалі

«ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА»

27 ліпеня 1944 г.

МЛЫН ПУШЧАНЫ Ў ХОД

Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй г. Косава насельніцтва адразу ж прыступіла да аднаўлення народнай гаспадаркі. Першай справай было наладжванне работы млына. Загадчык млына Трында Фама энергічна ўзяўся за даручаную справу.

22 жніўня 1944 г.

ПЕРШАЯ ПОШТА

15 жніўня ў раён прыйшла першая пошта — звыш 400 пісьмаў і многа газет. Пасля трох гадоў акупацыі жыхары раёна атрымалі магчымасць мець сувязь са сваімі роднымі, якія жывуць у розных мясцінах Савецкага Саюза.

22 жніўня 1944 г.

ПУШЧАНА Ў ХОД ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

У горадзе Косава электрасвятлом забяспечаны ўсе ўстановы і большасць жылых кватэр. На рамонце і пуску ў ход электрастанцыі добра працавалі Трында Фама, Шчурко Ілья, Шчурко Матвей і механік Глінскі Т. Г.

26 жніўня 1944 г.

ВЫПРАЦОЎКА ДРАЎЛЯНАГА ВУГАЛЮ

Пры Косаўскім смалакурным заводзе арганізавана арцель па выпрацоўцы драўлянага вугалю. У арцелі працуе тры чалавекі. Арцель выпрабіла 780 кг дабраякаснага вугалю. На ім працуюць усе кузні райпрамкамбіната.

29 верасня 1944 г.

АДКРЫТЫ МАГАЗІН ГАРПО

У яго ўжо паступіла першая партыя прамтавараў, сярод якіх трыкатажныя вырабы, абутак, мануфактура і другія.

29 верасня 1944 г.

СМАЛАКУРНЫ ЗАВОД УСТУПІЎ У СТРОЙ

Пасля двухмесячнага рамонту ўступіў у строй смалакурны завод Белхімлеса ў г.п. Івацэвічы. Зроблена першая закладка карчоў у дзвюх печах, у якіх мяркуецца атрымаць 100 кг смалы. Адначасова рамантуецца трэцяя печ.

3 кастрычніка 1944 г.

МАСЛАБОЙНЫ ЦЭХ

Пры Косаўскім паравым млыне абсталяваны цэх па вырабу масла з ільносемя і канапель. У бліжэйшы час цэх будзе пушчаны ў эксплуатацыю.

12 кастрычніка 1944 г.

У ПАСЯЛКОВЫМ КЛУБЕ

Аднавіў сваю работу клуб у г. п. Івацэвічы. У ім ужо прачытаны дзве лекцыі для насельніцтва. Зараз пры клубе арганізуецца мастацкая самадзейнасць.

14 лютага 1945 г.

НА ТАНКАВУЮ КАЛОНУ

Камсамольцы і моладзь Івацэвіцкай дыстанцыі пуці сабралі 1781 рубель на пабудову танкавай калоны «Брэсцкі камсамолец». Збор сродкаў працягваецца.

26 красавіка 1945 г.

ДАПАМОГА БЯСКОННЫМ ГАСПАДАРКАМ

532 бясконным гаспадаркам аказана ўзаемная дапамога сялянамі, якія маюць коней. У выніку бясконныя ўжо засеялі 474 га яравога кліна.

45 бясконным гаспадаркам аказана дапамога трактарам Івацэвіцкай МТС. Засеяна каля 60 гектараў.

28 ліпеня 1945 г.

НОВЫЯ ДАМЫ

На тэрыторыі Гошчаўскага сельсавета нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 130 дамоў сялян. Зараз на іх месцы сяляне будуюць новыя. Закончылі будаўніцтва новых дамоў Гардзейчык Пётр, Пархомік Ілья, Майсейчык Андрэй, Бусяцкі Міхаіл, Літоўчык Рыгор і іншыя.

29 кастрычніка 1945 г.

КАЛГАС «ПЕРАМОГА»

Сяляне вёскі Сакоўцы Бусяжскага сельсавета аб'ядналіся ў калгас «Перамога». У склад

праўлення выбраны актывісты вёскі Пястрак Аляксандр Сямёнавіч, Дземідовіч Ілья Рыгоравіч і Барысік Кандрат Міхайлавіч. Старшынёю праўлення выбраны Пястрак А. С.

22 сакавіка 1946 г.

ГАСЦІНІЦА Ў ІВАЦЭВІЧАХ

У г. п. Іванэвічы на Таварнай вуліцы адкрыта гасцініца для прыезджых. Яна разлічана на 6 чалавек. У памяшканні гасцініцы чыста, цёпла, утульна.

5 снежня 1946 г.

КОСАЎСКАМУ РАЙПРАМКАМБІНАТУ ЎРУЧАНЫ ПЕРАХОДНЫ ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Прадпрыемствы Косаўскага райпрамкамбіната ўвесь час трымаюць першынство ў вобласці па выкананню вытворчай праграмы. За дасягнутыя поспехі райпрамкамбінату (дырэктар т. Саменка) уручаны пераходны Чырвоны сцяг абкома КП(б)Б і выканкома абласнога Савета дэпутатаў.

7 студзеня 1948 г.

ПАНІЖЭННЕ ЦЭН НА РЫНКАХ РАЁНА

Пасля правядзення грашовай рэформы і адмены картак на харчовыя і прамысловыя тавары значна панізіліся цэны на рынках у Івацэвічах і Косаве.

Цэны на хлеб, бульбу, сала, мяса і масла знізіліся амаль напалавіну, прычым гэта было да адмены картачнай сістэмы.

Рэзка знізіліся цэны на малако, яйкі, табак і на другія прадукты.

20 мая 1948 г.

МЕТАДАМ НАРОДНАЙ БУДОЎЛІ

Сяляне вёскі Верашкі Альбінскага сельсавета метадам народнай будоўлі заканчваюць будаўніцтва пачатковай школы. Складзены зруб, пакрыты чарапіцай, укладзена столь, усцілаецца падлога. Для ўнутранага абсталявання распілена 16 кубаметраў лесу.

17 верасня 1948 г.

НОВЫЯ КАЛГАСЫ

75 сялянскіх гаспадарак вёскі Куляшы Альбінскага сельсавета аб'ядналіся ў сельскагаспадарчую арцель імя Дзяржынскага. Старшынёю выбраны Голуб Фёдар Рыгоравіч.

Сяляне вёскі Аўсто Стайкаўскага сельсавета арганізавалі сельскагаспадарчую арцель «Савецкая Беларусь». У арцель уступіла 29 гаспадарак. Старшынёю арцелі абраны Шыш Мікалай Якаўлевіч.

Звыш 40 сялянскіх гаспадарак вёскі Руда Сенькавіцкага сельсавета аб'ядналіся ў сельгасарцель імя Жданава. Старшынёю абраны Бульскі Канстанцін Іосіфавіч.

Перадавыя сяляне і сялянкі вёскі Скураты Альшаніцкага сельсавета аб'ядналіся ў калгас, які назвалі «30 год камсамола». У калгас уступіла 21 гаспадарка. Старшынёю калгаса абраны Казімірчык Іван Ігнатавіч.

12 студзеня 1950 г.

НОВЫЯ КАЛГАСЫ

9 студзеня сяляне вёскі Жытлін арганізавалі калгас імя Якуба Коласа. Старшынёю калгаса выбраны Сівеня Мікалай Піліпавіч.

Сяляне вёскі Старажоўшчына стварылі сельскагаспадарчую арцель «Памяці Леніна». Старшынёю калгаса выбраны Варабей Іван Аврамавіч.

Сяляне вёскі Міхнавічы стварылі калгас імя Васілеўскага.

Сяляне вёскі Халап'я аб'ядналіся ў сельскагаспадарчую арцель імя Мічурына.

Сяляне вёскі Рацкевічы стварылі калгас імя Суворава.

Сяляне горада Косава аб'ядналіся ў калгас імя Ракасоўскага.

У вёсцы Бялавічы сяляне ўтварылі калгас «8 сакавіка».

«ЗАРА КАМУНІЗМУ»

1 студзеня 1957 г.

КАЛГАС ЭЛЕКТРЫФІКУЕЦЦА

У калгасе імя Леніна (Гошчава) закончан мантаж абсталявання цеплавой электрастанцыі магутнасцю 80 кВт. Побач са станцыяй будуюцца вытворчыя цэхі.

19 ліпеня 1957 г.

З ХУТАРОЎ У ВЁСКУ

На тэрыторыі Яглевіцкага сельсавета цяпер ідзе працэс перасялення хутароў у вёску. Ужо пераселена 5 гаспадарак. Рыхтуюцца яшчэ 20.

«ПЕРАМОГА»

14 студзеня 1954 г.

КІНАФЕСТЫВАЛЬ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ФІЛЬМАЎ

У Целяханскім раёне доўжыцца кінафестываль сельскагаспадарчых фільмаў. Амаль ва ўсіх сельгасарцелях прадэманстраваны кінафільмы «Калгас «Рассвет», «Механізацыя працаёмкіх работ на жывёлагадоўчых фермах», «Квадратна-гнездавая пасадка бульбы» і іншыя.

18 лютага 1954 г.

АЧЫСТКА ЗЯМЕЛЬ АД ХМЫЗНЯКОЎ

У зямельным масіве калгаса імя Кірава (Целяханскі раён) вельмі многа хмызнякоў, якія перашкаджаюць выкарыстанню машыннай тэхнікі. У зімовы час хлебаробы калгаса поўным ходам вядуць ачыстку зямель ад хмызнякоў. Штодзённа занята на гэтай рабоце 20—25 чалавек.

25 снежня 1954 г.

СВОЙ ЛЕСАПІЛЬНЫ ЗАВОД

Калгас «Перамога» (Целяханскі раён) мае свой лесапільны завод. Тут устаноўлены два гонтарэзныя станкі і цыркулярная піла. Прыводзяцца ў рух станкі і піла невялікім рухавіком.

«КАСТРЫЧНІК»

1970 г., № 3

ДЫПЛОМЫ АДНОЙ СЯМ'І

Настаўнікі Гошчаўскай сярэдняй школы Зінаіда Уладзіміраўна і Міхаіл Мікалаевіч Майсейчыкі адначасова паступілі на завочныя аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў. Яна — у Беларускі дзяржаўны універсітэт, ён — у Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Праз пяць гадоў вучоба скончана. У 1969 годзе муж і жонка Майсейчыкі атрымалі дыпломы аб вышэйшай адукацыі.

Сёлета заканчвае вучобу ў Гродзенскім медыцынскім інстытуце Аркадзь Майсейчык, малодшы брат Міхаіла Мікалаевіча. Ёсць у гэтай сям'і і яшчэ адзін уладальнік інстытуцкага дыплома — Сцяпан, інжынер. Гэта старэйшы з трох братоў.

Чатыры дыпломы аб вышэйшай адукацыі ў адной сям'і. У сям'і, дзе маці і бацька ледзь скончылі тры класы царкоўнапрыходскай школы, дзе хлопцы гадаваліся без бацькі, які рана памёр пасля ваенных нягод. У вёсцы, дзе да 1939 года не было ні аднаго чалавека, які меў хаця б сярэднюю адукацыю.

М. Банасевіч.

ЗАПОЛЕНСКІЯ СПЕВАКІ

Мы не чулі іх голасу ні ў полі, ні на лузе летам, ні на клубнай сцэне. Упершыню сустрэліся з імі ў іх жа хаце...

Нечаканасць нашай сустрэчы, хатняя абстаноўка зрабілі іх спеў нячутным, даверлівым, мілагучным у сваім спакоі. І тады здавалася, што спеў іх — не проста вынік работы лёгкіх і галасавых звязак, а біццё, дыханне сэрца. Спявалі яны народныя песні — рускія, бѐларускія, украінскія, польскія. Спявалі і сучасныя. Спевакі гэтыя — муж і жонка Фама Якаўлевіч і Аляксандра Пятроўна Зайкі, што жывуць у Заполлі. Яму — 62 гады, ёй — 58. Працуюць у саўгасе «Косава»...

У час вясельных застолляў ці радзін Зайкі, бадай, самыя паважаныя госці. А паважаюць іх не толькі за песню: яны працавітыя людзі, добрыя суседзі, спагадлівыя і самі людзей паважаюць. І — сціплыя. У час нашай гутаркі яны не-не ды і завядуць гаворку пра іншых спевакоў-заполенцаў. А іх тут, аказваецца, нямала. Грыша Воўна любіць беларускую песню... Цёпла расказваюць Зайкі пра Тэклю Мігель. Прыгожа спявае яна. Асабліва купальскія песні («Ой, рана, рана на Івана» і іншыя).

... У жыцці Зайкоў не было выключных выпадкаў. І ўсё-такі ў іх біяграфіі ёсць даволі цікавая старонка. Цікавая і павучальная для нашай моладзі, для нашага настаўніцтва.

Калісьці, у часы акупацыі нашай зямлі белапалякамі, заполенскія хлопцы і дзяўчаты змаглі арганізаваць драматычны гурток і некалькі разоў паказаць простаму люду камедыю Янкі Купалы «Паўлінка». Змест яе зараз агульнавядомы. Сімпатыі аўтара, які ў той час жыў і тварыў у Савецкай Беларусі, на баку простых сялян-беларусаў. Ён з'едліва намаляваў вобраз пыхлівага, ганарлівага падпанка Быкоўскага. Маладыя заполенцы (у іх ліку

былі і Зайкі) змаглі «абвесці» мясцовыя польскія ўлады. Яны, каб атрымаць дазвол на пастаноўку, паказвалі ім тэкст камедыі на польскай мове. Ігралі ж яе ў Гошчаве, Косаве — на роднай беларускай мове...

Дзякуючы вось такім хлопцам і дзяўчатам, тысячам такіх, не змаглі акупанты задушыць народны дух, народную культуру на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі...

М. Купрэеў.

1970 г., № 23

КРОЎ — ХВОРАМУ

Для выратавання жыцця трактарыста саўгаса «Мілейкі» Васіля Джэйгала неадкладна спатрэбілася кроў. Не раздумваючы, яе аддалі хвораму трактарысты Аляксандр Кукса, Аляксандр Ганчар і Уладзімір Мельнік, рабочыя Надзея Дробат і Рыгор Джэйгала, механік Мікалай Лушчык, упраўляючы першага аддзялення саўгаса Рыгор Пархута.

1971 г., № 74

КОСАЎСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА

Пакуль такой шыльды няма ў Косаве, але з першага верасня сёлетняга навучальнага года яна з'явіцца на будынку былой паліклінікі. Гэта цудоўны падарунак дзецям горада і ўсіх навакольных вёсак. У школу будзе прынята 67 хлопчыкаў і дзяўчынак. Урокі музыкі яны змогуць атрымліваць па чатырох класах: фартэпіяна, баян, акардэон, цымбалы...

М. Турчын.

10 сакавіка 1974 г.

БУДУЕЦЦА ДАРОГА

Шмат нязручнасцей у рабоце аўтатранспарту стварае дарога Івацэвічы — Косава. З-за дрэннага дарожнага пакрыцця яна зачастую зусім не эксплуатуецца. Каб ліквідаваць гэты недахоп, будаўнікі ДБР-33 пачалі нядаўна пакрыццё гэтай дарогі асфальтабетонам. Працягласць яе шаснаццаць з палавінаю кіламетраў. У гэтыя дні на будаўніцтве новай дарогі працуюць ужо экскаватары, бульдозеры, аўтамашыны.

10 кастрычніка 1974 г.

ІДЗЕ НОВАЯ ПЛІТКА

Новы цэх па выпуску шкляной дэкаратыўнай абліцовачнай пліткі працуе на Дамаңаўскім шклозаводзе толькі з красавіка бягучага года, але ўжо вызначыўся сваімі поспехамі. Рабочыя цэха выпусцілі 1450 тысяч штук пліткі.

19 кастрычніка 1974 г.

ДАРЫ «БЛАКІТНАЙ НІВЫ»

На 130 гектарах раскінуліся водныя ўгоддзі Даманаўскага участка «Шчара» рыбакамбіната «Азёрнае». Калектыў яго гадуе тут карпаў, карасёў, таўсталобікаў, белага амура.

Зараз заканчваецца асенняя пуціна. У гандлёвую сетку Баранавічаў, Гродна, Мінска з нашага раёна адпраўлены дзесяткі тон свежай рыбы, а ўсяго яе будзе адлоўлена звыш 140 тон.

24 студзеня 1987 г.

«ПАЛЕССЕ» ДОРЫЦЬ ЗДАРОЎЕ

У пачатку студзеня першых пацыентаў прыняў санаторый «Палессе», які адкрыўся ў Целяханах. Ён разлічаны на 200 месцаў. Тут будуць папраўляць сваё здароўе людзі, якія хварэюць сардэчна-сасудзістымі і нярвовымі захворваннямі.

І. Лаўроўскі.

27 чэрвеня 1987 г.

РЭХА ВАЙНЫ

На аптовай базе райспажыўсаюза пры будаўніцтве склада былі знойдзены боепрыпасы, якія праляжалі ў зямлі 45 гадоў... Былі вывезены і знішчаны пяцьдзесят артылерыйскіх снарадаў, 42 супрацьпяхотныя міны.

П. Мергес.

31 мая 1988 г.

ПРАДУКЦЫЮ — НА ЭКСПАРТ

Прадукцыя, якую выпускаюць прадпрыемствы вытворчага аб'яднання «Івацэвічдрэў», экспартуецца ў шматлікія дзяржавы свету. У Пакістан і Мангольскую Народную Рэспубліку адпраўлена мэбля для школьных устаноў. Швецыя закупіла 35 тон смалы сасновай, Канада — 36 тысяч штук вешалак-плечыкаў.

І. Сімакоў.

Ахвяры далёкай вайны

Больш за 170 юнакоў з Івацэвіцкага раёна, якія служылі ў радах Савецкай Арміі, лёс закінуў у далёкі Афганістан. Яны мужна выконвалі загады камандавання, праявілі салдацкую доблесць, вярнуліся дадому, адзначаныя ўзнагародамі за праяўленыя гераізм і адвагу, але многія — параненымі і пакалечанымі. Сярод іх: Коваль Васіль Пятровіч з Заполля — кавалер ордэна Чырвонай Зоркі; Вясна Мікалай Мікалаевіч, кулямётчык з Заполля, узнагароджаны медалём «За адвагу»; Мохар Канстанцін Канстанцінавіч з Целяхан адзначаны медалём «За адвагу»; Каверчык Юрый Уладзіміравіч з Глінная — ордэнам Чырвонай Зоркі; сяржант Каленік Сяргей Мікалаевіч з Івацэвіч адзначаны медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі»; капітан Максімовіч Іван Іванавіч з Івацэвіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі; Харужы Мікалай Уладзіміравіч з Косава і сяржант Акавіты Віктар Міхайлавіч з Івацэвіч адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі; Новік Вячаслаў Уладзіміравіч з Падстарыні, малодшы сяржант Рабцэвіч Сяргей Сяргеевіч з Целяхан узнагароджаны медалямі «За адвагу». Сярод воінаў, адзначаных узнагародамі, лётчыкі Юмашаў Сяргей Станіслававіч і Рыжко Андрэй Амбросьевіч з Івацэвіч, сапёр Макарэвіч Рыгор Уладзіміравіч, малодшы сяржант Саўчук Сяргей Міхайлавіч, старшына Чуйко Міхаіл Міхайлавіч, падпалкоўнік Матонін Сяргей Аляксандравіч, Цымбаліст Міхаіл Фёдаравіч з Аброва і іншыя.

Але гэтая вайна прынесла і горыч страт у некаторыя сем'і Івацэвіцкага раёна. У жорсткіх баях пры выкананні салдацкага абавязку смерцю храбрых загінулі нашы землякі.

Воіны-інтэрнацыяналісты з Івацэвіцкага раёна, якія загінулі ў Афганістане

В. М. Баярчук прымае прысягу.

АНОДЗІН Пётр Іванавіч, радавы, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 24.7.1964 г. у вёсцы Вялікая Гаць Івацэвіцкага раёна. У 1981 г. закончыў Вялікагацкую сярэднюю школу. Да службы ў Савецкай Арміі працаваў механізатарам у калгасе імя Калініна. Там жа працавалі і яго бацькі — маці Вольга Ігнатаўна і бацька Іван Пятровіч Анодзіны. Прызваны ў Савецкую Армію 29.9.1982 г. Івацэвіцкім РВК. Загінуў 12.7.1983 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны на могілках вёскі Вялікая Гаць.

БАЯРЧУК Віктар Міхайлавіч, радавы, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 23.9.1964 г. у вёсцы Быцень Івацэвіцкага раёна. У 1981 г. закончыў Быценскую СШ. Працаваў станочнікам у цэху шырспажыву Косаўскага МВА. Вучыўся ў школе ДТСААФ. Прызваны ў Савецкую Армію 29.9.1982 г. Івацэвіцкім РВК. Загінуў 9.2.1984 г. у баю з душманамі пры перавозцы калонай аўтамашын ГЗМ. Атрымаўшы цяжкае раненне, памёр. Пахаваны на могілках вёскі Быцень. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ГАРДЗЕЙЧЫК Пётр Іванавіч, радавы, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 19.7.1964 г. у вёсцы Вялікая Гаць Івацэвіцкага раёна. У 1981 г. закончыў Велікагацкую СШ. Працаваў механізатарам у калгасе імя Калініна. Закончыў школу ДТСААФ. Прызваны ў Савецкую Армію 29.9.1982 г. Івацэвіцкім РВК. Загінуў 13.1.1984 г., калі аўтамабіль у час рэйса падарваўся на міне. За час службы ў Афганістане зрабіў 46 рэйсаў з агульным прабегам 48 тыс. кіламетраў. Пахаваны ў вёсцы Вялікая Гаць. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу».

ГУК Уладзімір Уладзіміравіч, старшы сяржант, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 3.1.1968 г. у вёсцы Халап'я Івацэвіцкага раёна. Закончыў 8 класаў івацэвіцкай СШ № 1 у 1983 г. і затым у 1983—1986 гг. вучыўся ў СПТВ-162 г. Івацэвічы. Прызваны ў Савецкую Армію 13.11.1986 г. Івацэвіцкім РВК. Загінуў у баі з душманамі 13.5.1988 г. Пахаваны на могілках у Івацэвічах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За баявыя заслугі».

ДЗЯГЦЯРЫК Сяргей Антонавіч, нарадзіўся ў 1968 г. у вёсцы Гутка Івацэвіцкага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе «Рассвет». Пасля прызыву ў Савецкую Армію накіраваны ў Афганістан, дзе пры выкананні воінскага абавязку захварэў і памёр. Пастаўлены помнік у 1990 г.

КАНАНОВІЧ Віктар Міхайлавіч, радавы, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 13.2.1959 г. у вёсцы Краі Івацэвіцкага раёна. У 1977 г. закончыў Крайскую сярэднюю школу. Працаваў рамшчыкам лесацэха ВА «Івацэвічдрэў». У Савецкую Армію прызваны Івацэвіцкім РВК 9.5.1979 г. Загінуў 23.6.1980 г. у баі пры выратаванні параненых байцоў. Пахаваны ў вёсцы Краі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАСЯНІК Віктар Пятровіч, малодшы сяржант, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 10.1.1966 г. у вёсцы Магіліцы Івацэвіцкага раёна. У 1983 г. скончыў Волькаўскую СШ. Вучыўся ў школе ДТСААФ. Прызваны ў Савецкую Армію 15.4.1984 г. Загінуў 5.5.1986 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў вёсцы Магіліцы. На магіле на сродкі калгаса «Іскра» пастаўлены помнік. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СТРАКОВІЧ Генадзь Іванавіч, радавы, беларус, член ВЛКСМ, нарадзіўся 1.9.1966 г. у вёсцы Вуглы Івацэвіцкага раёна. У 1983 г. закончыў Быценскую СШ. Вучыўся ў школе ДТСААФ. Прызваны ў Савецкую армію 14.10.1984 г. Загінуў 24.11.1985 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў вёсцы Вуглы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

П. І. Анодзін.

П. І. Гардзейчык.

У. У. Гук.

В. М. Кананович.

В. П. Касянік.

Г. І. Страковіч.

Ваеннаслужачыя — ураджэнцы Івацэвіцкага раёна, якія загінулі ў час праходжання службы ў Савецкай Арміі ў пасляваенны перыяд

БАХУР Сяргей Вітальевіч, н. у 1966 у в. Турная.

БОЛТАЧКА Генадзь Данілавіч, н. у 1965 у в. Заполле, ст. механік-вадзіцель, загінуў 12.4.1985.

ВАСІЛЕВІЧ Ігар Віктаравіч, н. у 1972 у в. Падстарынь, мал. сярж., памёр 24.2.1992.

ВЯСНА Мікалай Мікалаевіч, н. у 1965 у в. Заполле, кулямётчык, памёр ад ран. Узнагароджаны медалём «За адвагу».

ГАРБАВЕЦ Васіль Сямёнавіч, н. у 1954 у в. Вялікая Гаць, радавы, загінуў 20.5.1974 на службе.

ГВОЗДЗЕЎ Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1962 у г. Івацэвічы, памёр 21.8.1982 на службе.

ГРЭЧНЫ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1955 у в. Аброва, сярж., памёр ад ран пры выкананні службовых абавязкаў 1.9.1975.

КАНАНОВІЧ Анатоль Сцяпанавіч, н. у 1961 у в. Рудня, радавы, загінуў 26.4.1982.

КАСПЯРОВІЧ Юрый Рыгоравіч, н. у 1971 у г. Івацэвічы, сярж., загінуў 14.3.1991.

КУРАТНІК Сяргей Васільевіч, н. у 1957 у в. Святая Воля, радавы, памёр 13.6.1980.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1966 у в. Гічыцы, мал. сярж., загінуў у 1985.

МАДЗЯРСКІ Анатоль Максімавіч, н. у 1962 у в. Любішчыцы, радавы, загінуў 16.5.1982.

МОЛАШ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1948 у г. Івацэвічы, радавы, загінуў 11.10.1967.

НАЛІЎКА Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1972 у в. Міронім, сярж., загінуў 17.4.1993.

РАК Мікалай Сямёнавіч, н. у 1954 у в. Выганашчы, радавы, загінуў 29.1.1977.

ШЛЯЖКО Мікалай Адамавіч, н. у 1970 у в. Рудня, старшына 2-й ст., загінуў 16.10.1990.

ШУРУБЕЙКА Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1969 у в. Воля, памёр 5.8.1988.

ШЫМАНЧЫК Аляксандр Яўгенавіч, н. у 1964 у г. Івацэвічы, мал. сярж., загінуў 4.10.1985.

Расказалі афганскія пісьмы

З артыкула Л. Руціч у івацэвіцкай раённай газеце «Кастрычнік» ад 7 чэрвеня 1988 г.

Вось яны, амаль усе перада мною, пісьмы сына, даваныя мне ягонай маці, крыху пакамечаныя, зацёртыя па краях ад таго, што да іх часта цягнуліся рукі; пісьмы з голасам і думкамі 18-гадовага юнака, якога ўжо няма на свеце; пісьмы, прапахлыя спёкай і пылам Афганістана, нялёгкімі салдацкімі буднямі. Пісьмы, у якіх характар салдата, які да канца выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак, прадоўжыўшы подзвіг герояў Вялікай Айчыннай.

І памяць аб гэтым подзвігу павінна жыць вечна.

На службу ў армію адыходзілі ў адзін дзень — Валодзя Гарбавец, Коля Галінскі, Федзя Каланчук, Пеця Анодзін і Пеця Гардзейчык. Усе аднагодкі, поўныя сіл і энергіі. Праводзілі рабят усёй вёскай. Шмат было моладзі. На памяць аб тым дні засталася фотакартка, якая назаўсёды захавала жыццярадасную ўсмешку прыгожага чарнявага Пеці Анодзіна, строгі і адкрыты погляд Пеці Гардзейчыка, непрыхаваны сум на тварах іх маці.

Амаль усе хлопцы трапілі ў Афганістан. Потым былі пісьмы, якія з хваляваннем і трывогай чакалі ў кожнай хаце. Калі служыць сын, мацярынскае сэрца ніколі не бывае спакойным. А калі ён там, у самай гарачай кропцы, тады яшчэ даўжэйшымі здаюцца дні і ночы, вастрэйшымі ўспаміны тых гадоў, калі сын быў побач, рос на вачах.

Хвалявалася сэрца Вольгі Ігнатаўны Анодзінай. Неспакойнай была душа Надзеі Васільеўны Гардзейчык. Вось ужо два месяцы няма побач з імі іх сыноў. Восень сарвала з яблынь апошняе пажаўцелае лісце, пакінуўшы голымі на пранізлівыя ветры надыходзячай зімы разгалістыя вершаліны, сіратлівыя і халодныя. А хутка закружылі ў настылым паветры першыя сняжынкі, напусціўшы на сэрца яшчэ большую журботу.

Як там сын? Неспакойнымі рукамі Надзея Васільеўна даставала паперу і пісала. Аб ім, аб сваяках, аб усім, чым жыла родная Вялікая Гаць. Падтрымаць, сагрэць пяшчотным словам, гарачым сэрцам на далёкай чужыне, зрабіць усё, каб менш адчуваў сын горкае пачуццё адлучанасці ад роднага кутка — чым яна маг-

ла яшчэ дапамагчы яму? І, вядома, верай. У тое, што міне час, і сынок вернецца, жывым і здаровым. Яна, яе мацярынская любоў зберажэ яго там. Вось і пісьмы ад Пятра ідуць неблагія, спакойныя, быццам знаходзіцца ён там, дзе нічога дрэннага не павінна здарыцца.

Пісьмы з Афганістана. Я бачыла іх шмат. І амаль усе яны, каму б ні былі адрасаваны, пачыналіся кароткім надпісам уверсе: «Прывет з ДРА». Пеціны таксама пачыналіся так, часам абазначалася і канкрэтнае месца. Некалькі разоў Кушка, часцей Шынданд. «Тут мы і будзем служыць два гады», — пісаў ён у пісьме ад 22 снежня 1983 г. Паведамляў аб тым, што разам з ім трапілі ў адну часць Федзя Каланчук і Коля Галінскі, альбо Галка, як ён коратка называў свайго аднавяскоўца, што пасля новага года атрымаюць новыя машыны. Прасіў брата Янека даведацца, куды трапіў Пеця Анодзін, бо перапіска іх спынілася.

Пісьмы... Колькі разоў перачытала іх. Заўважыла: чым далей, тым больш узрастаў іх напал, шырэй раскрываліся душа і характар юнака. Стрыманыя і кароткія напачатку, яны станавіліся трапяткімі, гарачымі, у некалькі старонак — пазней. І гэта было зразумела: пазнавалася штосьці новае, пераглядваліся былыя ўяўленні, пераацэньваліся каштоўнасці. Чым далей, тым больш дыхалі яны гулкімі, як пісталетны стрэл, словамі «экстрэмальныя ўмовы». І ўсё ж у кожным пісьме: служба ідзе нармальна, навіны адны і тыя ж, ездзім у рэйсы, адно толькі і цікава, што ездзім. «Машыны, колькі іх?», — трывожылася Надзея Васільеўна. «Не 5, а 50 у калоне», — цёпла, без іроніі тлумачыў сын. «А хто яшчэ з табой ездзіць у машыне?», — «Камандзір, мама, вельмі цудоўны чалавек, мы з ім мяняемся за рулём».

Ішоў час. «Вось і служыць засталося зусім мала — адзін год. Усе цяжкасці пераадолены», «Калі пісем ад мяне няма, то ты, мама, пытаешся ў Нінкі. Адкуль ты ведаеш, што я ёй пішу? Проста пішу па старой дружбе, мы ж калісьці з ёй добра сябравалі».

Радкі, радкі, напоўненыя любоўю і павагай да маці, родных і сяброў. Пісьмы так і стракацяць шматлікімі прозвішчамі і імёнамі. Пецю цікавіла ўсё: чым займаюцца сябрукі, колькі вяселляў справілі ў вёсцы. І ў ніводным радку — цынізму, выхваляння, наракання на лёс. Кожнае слова падкупляе прастатой, шчырасцю і сціпласцю. Нікога не забываў Пеця. Пісаў малодшаму брату Янеку. Прасіў яго падцягнуцца ў вучобе, больш дапамагаць бацькам. «Калі вярнуся дамоў, мы з табой абавязкова купім новы матацыкл», — пісаў ён. Такія шчырыя, даверлівыя пісьмы ішлі і сярэдняму брату — Уладзіміру. А часцей звяртаўся да іх усіх: «Разумею, мама, тата, Вова і Янек, што вам цяпер вельмі цяжка, але нічога не зробіш, камусьці трэба служыць і тут. Не хвалюйцеся за мяне. Я не падвяду... А бацьку, мама, перадай, каб крыху менш курыў. Я вось з камандзірам езджу. Ён не курыць і я таксама, і нам добра...», «...Вось мы часта ўспамінаем тое, што ўжо вярнуць нельга. Шмат было памылак у мяне да арміі, і толькі цяпер пачаў



Помнік землякам, загінуўшым у Афганістане. Пастаўлены ў Івацэвічах у 1991 г.

гэта разумець... Але гэта яшчэ нічога не азначае. Калі я, мама, вярнуся з арміі, то нам будуць зайздросціць. Я вас не падвяду. Яшчэ год, і мы будзем дома разам. Дзякуй, мама, за тое, што ты мяне разумееш».

«Вось і адгуляў Янек свае канікулы. Час праляцеў хутка. Цяпер дома хапае ўсяго ў агародзе і ў садзе, толькі еш». Надзея Васільеўна, прачытаўшы гэтыя радкі, праз слёзы паглядзела ў акно. Там пад цяжарам сакавітых пладоў адвіслі галіны яблыні, той самай, пад якой Пеця так любіў збіраць антонаўкі. Як не зразумець яе мацярынскаму сэрцу сынаву тугу па родным куточку. Вось і ён у кожным пісьме цікавіцца, як дом, гаспадарка, ці сена зграблі, калі буракі і бульбу будуць убіраць, успамінае, як сам любіў ездзіць па духмянае сена. Як ёй, маці, не разумець гэтыя сынавы радкі: «Калі ўсюды гараць ліхтары, калі вакол цішыня, мне здаецца, што ў гэты час знаходжуся дома... Да спякоты мы прывыклі. Вы дома ўжо, пэўна, ходзіце ў ягады. Успомніш пра дом, і так дамоў захочацца». І далей словы шчырага разумення таго, што і маці дома вельмі цяжка. І просьба нічога не ўтойваць, пісаць толькі праўду, як ён сам.

Так, Пеця Гардзейчык пісаў праўду. Аб тым, што няпроста ездзіць па пясках. Усе шыбы ў кабіне паадкрываеш, усё роўна невыносна горача. Дзьме вельмі пякучы вецер, пот цячэ градам. Ды, відаць, не толькі ў гэтым былі цяжкасці. Гэта маці адчувала сваім сэрцам. Вось і падзячнае пісьмо атрымалі. А ў ім: «Ваш сын узорна і добрасумленна выконвае свой воінскі і інтэрнацыянальны абавязак па аказанні дапамогі афганскаму народу, праяўляючы пры гэтым мужнасць і адвагу ў ходзе выканання баявых задач. Сардэчна дзякуем за тое, што вы выхавалі такога цудоўнага сына, вернага абаронцу нашай Савецкай Радзімы». Былі цяжкасці. Была рызыка, толькі аб гэтым Пеця не пісаў. Дзяліўся тым, аб чым марылася: «Адслужу — буду вучыцца ў сталіцы. Стану лейтэнантам міліцыі. Мы тут з адным хлопцам разам збіраемся паступаць... Памятаеш, мама, Мішку з Мінска, усе яго ведаюць і паважаюць. Вось і я таксама хачу быць такім чалавекам, як ён. Не ведаю, ці атрымаецца з мяне такі чалавек, але я буду вельмі старацца...»

Марыў Пеця Гардзейчык вярнуцца дамоў, як і лепшы ягоны сябрук Пеця Анодзін. Адзін і другі вельмі шкадавалі, што ім выпаў лёс разлучыцца. Абодва сумавалі, але спадзяваліся, што хутка зноў будуць разам. Ды гэтым спадзяванням не суджана было збыцца. Лёс распарадзіўся інакш. Пеця Анодзін загінуў 12 лістапада 1983 года, выконваючы баявое заданне. Хавалі Пецю ўсёй вёскай 19 ліпеня, і як зноў распарадзілася жыццё, у дзень нараджэння яго сябра Пеці Гардзейчыка. Пасля таго жудаснага дня даўжэйшымі сталі дні, мацней балела сэрца ў Надзеі Васільеўны. Напісала сыну аб страшнай вестцы. З жніўня 1983 года ён прыслаў пісьмо: «Добры дзень, дарагія родныя! З чыстым армейскім прывітаннем да вас ваш сын Пётр... Няма больш майго лепшага сябра. Калі прачытаў ваша пісьмо, доўга не мог супакоіцца. Успамінаю, як мы сябравалі з ім, куды я, туды і ён, і наадварот. Вось ужо трэці дзень чытаю пісьмо пра яго і плачу доўга, не магу ўзяць сябе ў рукі. Я нават не ведаю, што я буду рабіць без яго, як жыць. Вельмі шкада, што загінуў Пеця ў такія маладыя гады. Але хто ведае, хто калі загіне... Памятаеш, мама, ты казала аб лёсе чалавека... Ты, мама, у пісьме вінаваціш сябе за многае: за тое, што крыўдзіла мяне раней, сварылася, калі я браў увечары матацыкл. Ты сябе, калі ласка, не вінаваць ні ў чым. Я сапраўды ні завошта не крыўдую. Пройдзе час, і мы будзем усе разам. Прыедзем дамоў, наведаем Пецькаву магілу і, вядома, не вытрымаем і будзем плакаць, і больш за ўсіх буду плакаць я, бо ён мой самы лепшы сябра і застанецца ім назаўсёды». Не, ніколі не суджана будзе Пятру Гардзейчыку з яго гарачым дружалюбным сэрцам прыйсці на магілу сябра. 19 студзеня 1984 года цынкавую труну з яго целам апусцяць у мёрзлую зямлю побач з яго так і не наведаным сябрам. Нельга перадаць гора маці, усяе вёскі. Прыйшоў журботны ліст з далёкага Афганістана: «Нам цяжка пісаць аб гібелі Пеці. З першых дзён ён з гонарам нёс службу, і яму хутка пачалі давяраць баявыя задачы, якія яўлялі сабой небяспеку і рызыку для жыцця. Толькі мужныя ведаюць сапраўдную цану гэтым задачам. Нам цяжка перадаць, якія пачуцці мы перажылі. Аб гэтым не напісаць. На тым месцы, дзе загінуў Пеця, рукамі яго баявых сяб-

роў пастаўлены абеліск, і кожны раз, калі праязджаюць калоны, яму салютуюць і аддаюць чэсць. Прыміце наш боль. Мы ніколі не забудзем Пятра і тое, што ён не паспеў зрабіць для нашай Савецкай дзяржавы, у жыццё ператвораць яго таварышы». На невялікай фатаграфіі бачна: каля дарогі на голай афганскай зямлі замёр воінскі абеліск.

У той дзень Пётр Гардзейчык у складзе аўтамабільнай калоны следаваў па маршруце Шынданд — Кандагар. Пры праходжанні ўчастка каля «чорнай» гары галаўная машына была абстраляна душманамі. Быў бой, апошні яго бой...

15 лістапада 1983 года Пётр Гардзейчык быў узнагароджаны медалём «За адвагу». 27 верасня 1984 года — ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

...Памятаю, як кожны з нас, хто сядзеў у машыне, — сакратар райкома камсамола Л. Плескацэвіч, былыя воіны-афганцы В. Гапонік і І. Саявец і я, карэспандэнт, — па-свойму хваляваліся, едучы ў той лютаўскі дзень у Вялікую Гаць, на зямлю, якая навечна і так рана прытуліла сваіх сыноў, на сустрэчу з іх маці. Домік Надзеі Васільеўны, прымошчаны на ўскрайку вёскі, невялічкі, з двума пакойчыкамі, сустрэў утульнай цішынёй. Сюды так марыў вярнуцца Пеця. Няхітрыя эпізоды з яго дзяцінства ажывалі з усхваляванага расказу Надзеі Васільеўны. Чулым і спагадлівым, добрым і працавітым памятае яна яго. І ў арміі не агрубела яго душа. Маці адчыніла шафу і дастала адтуль квацістую хустку, адрэз на сукенку — гэтыя падарункі Пеця перадаў ёй з Афганістана праз афіцэра, які ехаў у Брэсцкую вобласць. Доўга ў той незабыўны вечар гаварылі яны...

Калі пачынаўся вывад абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў з Афганістана, міжволі ўсплывала пытанне: а ці недарэмна нашы салдаты былі там, ці недарэмна гінулі? Мы прыйшлі туды па просьбе законнага ўрада ДРА з гуманнымі мэтамі, кіруючыся прынцыпамі добрасуседства, прынцыпамі пралетарскага інтэрнацыяналізму. Пеця Гардзейчык і Пеця Анодзін выканалі свой абавязак перад Радзімай. Думаючы аб іх, мы думаем аб сабе, аб сваім жыцці і, думаючы, памятаем.

З такімі думкамі мы накіроўваемся да вясковых могілак, што размясціліся каля дарогі. Зайшлі да Вольгі Ігнатаўны Анодзінай. Уручылі ёй кветкі. Папрасілі таксама расказаць пра сына. На вачах жанчыны з'яўляюцца слёзы. Вокны яе дома глядзяць прама на помнік сыну. Ён зусім побач. Застылы на мармуровым пастаменце, як жывы, здаецца, сыйдзе з яго. Ідзем да помнікаў, з якіх велічна і журботна глядзяць на вуліцу, на свет застылыя ў мармуры два салдаты, два сябры. Цішыня пад высокімі соснамі. Лёгкі рэдкі снег імжыць на галовы, тонкай аксаміцістай прасціной кладзецца на халодныя чырвонакарычневыя пліты. Удзячна кладуцца на халодны мармур чырвоныя гваздзікі. «Дорогой сыночек, так много в жизни ты хотел, как мало жизнь тебе дала. Тревожно бьётся сердце і горю нет конца», — эпітафіі ўскалыхваюць сэрца.

— Такім быў шчодрым: усялякую дробязь — гэта табе, мама, табе, бабуля, — Вольга Ігнатаўна Анодзіна выцірае хусцінкай вочы. — Вельмі ў шашкі любіў гуляць... Напісала яму некалькі пісем, так і прывезлі мне іх не расклеенымі.

Чым вымераць гора гэтых простых вяскóвых жанчын, чым аблегчыць іх смутак? Памяць — гэта адзінае, што застаецца ў жыцці. А ў ім таксама не ўсё бывае гладка.

Як важна цяпер зразумець, акружыць увагай і канкрэтным клопатам сем'і загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў. Але, здараецца, дзесьці ў мітусні дзён, а можа у якога-небудзь чынушы, не затрымліваюцца гэтыя святыя паняцці. Маці загінуўшых сыноў жывуць. Ёсць у іх свае патрэбы, свае праблемы, якія ім трэба дапамагаць вырашаць. І раўнадушша яшчэ ёсць. Вось ужо колькі часу, як выканком мясцовага сельскага Савета народных дэпутатаў прыняў рашэнне назваць вуліцы ў Вялікай Гаці імёнамі загінуўшых юнакоў, але да гэтага часу не зроблены шыльды. Ніхто, акрамя асабістага сумлення, не прымусіць спачуваць, цалкам гарантаваць права на льготы, дадзеныя такім сем'ям дзяржавай. У любым выпадку мы ніколі не павінны забываць: не дзеля асабістага шчасця нарадзілі, расцілі і выхоўвалі сваіх сыноў маці. Яны расцілі іх і для Радзімы.

ЖЫЦЦЁ РАЁНА Ў 1990-я ГАДЫ

Паласа перабудовы прывяла да карэннай ломкі ўсяго грамадскага і палітычнага жыцця. На выбарах у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, якія праводзілі ў 1996 г., дэпутатамі ад раёна былі абраны незалежныя кандыдаты — Леанід Юнчык, намеснік рэдактара рэспубліканскай газеты «Рэспубліка», ураджэнец Целяханскага сельсавета (в. Краглевічы), і Уладзімір Кудзінаў, кіраўнік гандлёва-прамысловай фірмы «Івацэвічы».

Былі абраны і мясцовыя Саветы. Дэпутатамі ў абласны Савет ад раёна сталі загадчык гінекалагічнага аддзялення райбальніцы Бадзей С. П., старшыня калгаса «Косава» Лукашэвіч В. М., старшыня райкома прафсаюза аграпрамысловага комплексу Качан М. А., дырэктар Целяханскага завода сталярных вырабаў Віктаровіч С. А. — усе беспартыйныя. У раённы Савет былі абраны генеральны дырэктар АТ «Івацэвічдрэў» Міхнюк Б. М., дырэктар СШ № 4 г. Івацэвічы Скіндзер Л. К., настаўнік Косаўскай СШ Дылько В. М., галоўны ўрач Целяханскай участковай бальніцы Амяльянчык С. І., прараб калгаса «Радзіма» Шыкалай С. С., старшыня калгаса імя Леніна Маліч М. М., галоўны санітарны ўрач раёна Баранчык Р. Д., загадчык лабараторыі эксперыментальнай базы «Майск» Лашкевіч І. П. і іншыя — усяго 40 дэпутатаў. Сярод іх 2 члены Аграрнай партыі і адзін член Партыі камуністаў беларускай, астатнія — беспартыйныя.



Кіраўніцтва Івацэвіцкага раёна і члены раённай камісіі па стварэнні кнігі «Памяць». 1997 г. Сядзяць (злева направа) В. І. Мароз, І. А. Тарасевіч, В. П. Касько — члены раённай камісіі. Стаяць (злева направа) Р. М. Радзюк, рэдактар «Івацэвіцкага весніка», М. М. Валковіч, старшыня Івацэвіцкага райсавета, П. Г. Жышка, старшыня Івацэвіцкага райвыканкома, У. М. Макар, намеснік старшыні райвыканкома.

Старшынямі сельвыканкомаў былі абраны Сяўко М. І. (Быцень), Лінкевіч П. А. (Волька), Данілевіч П. М. (Выганашчы), Міхневіч Л. М. (Даманава), Крыцкі А. А. (Жытлін), Пропер І. І. (Квасевічы), Пякарскі Г. А. (Падстарынь), Шыш Я. К. (Стайкі), Мігно М. М. (Аброва) і іншыя. Старшынёй Косаўскага гарсавета абрана Хінко Т. П., Целяханскага пасялковага Савета — Крэк С. А., раённага Савета — Валковіч М. М. Потым раённы Савет узначаліў Баранаў Канстанцін Паўлавіч. Старшынёй райвыканкома па прэзідэнцкай вертыкалі застаўся Жышка Пётр Георгіевіч, яго намеснікамі — Чырка І. А. і Макар У. М.

На долю новых органаў улады, іх кіраўнікоў дасталася нялёгкая справа — вывад з крызісу эканомікі, ажыўленне і аздараўленне дзейнасці асветных, культурных, медыцынскіх, бытавых, гандлёвых структур, паляпшэнне жыцця народа.

Калі ў 1991 г. адбыўся распад СССР і Рэспубліка Беларусь стала на шлях незалежнага развіцця, панавалі надзеі, што неўзабаве адбудзецца эканамічны рост яе вытворчых магчымасцей. Але гэтага не адбылося. Адмоўна адбіўся на яе развіцці разрыў эканамічных сувязей паміж прадпрыемствамі і рынкамі Беларусі, Расіі і іншых краін былога СССР. Пачаўся спад вытворчасці. Выпуск таварнай прадукцыі прамысловымі прадпрыемствамі раёна ў

1995 г. склаў толькі 80,9 працэнта да ўзроўню 1975 г. Калі прааналізаваць выпуск асобных відаў прадукцыі, то карціна тут зусім несуцяшальная. Напрыклад, у 1989 г. на прадпрыемствах раёна было выраблена 76,8 тысячы кубічных метраў піламатэрыялаў, а ў 1995 г. — толькі 44,8 тысячы. Вывазка драўніны за гэты час упала з 213,9 тысячы кубічных метраў да 136,4 тысячы. У 1991 г. выраблена 56 тысяч тон паўбрыкету, а ў 1995 г. — 38 тысяч. Рэзка знізілася вытворчасць цэглы, драўнянастружкавых пліт, мэблі, ільновалакна. Буйны крызіс ахапіў прыборабудаўнічы завод. У новых умовах прамысловым прадпрыемствам трэба было шукаць шляхі павышэння вытворчасці, рэалізацыі гатовай прадукцыі, забеспячэння сыравінай, камплектуючымі дэталямі і энергарэсурсамі. Плата за апошнія неймаверна выросла.

Намаганні працоўных калектываў далі плённыя зрухі. У 1996 г. большасць прадпрыемстваў спыніла спад вытворчасці і забяспечыла пэўны рост у параўнанні з папярэднім годам. Прырост склаў 4,4 працэнта, а ў вытворчасці тавараў народнага ўжытку — 8,9 працэнта. Найбольшы прырост таварнай прадукцыі далі Квасевіцкая фабрыка пуху і пер'я, АТ «Косаўскае МВА», райаграпрамтэхніка, Даманаўскі гандлёва-прамысловы камбінат, прыборабудаўнічы завод. І ўсё ж засталіся прадпрыемствы, якія не дасягнулі нават узроўню папярэдняга года, хоць ён таксама невысокі. Сярод іх — флагман прамысловасці раёна АТ «Івацэвічдрэў», завод ЖБВ, леспрамгас, а па таварах народнага ўжытку — Целяханскі завод сталярных вырабаў, малаказавод, торфапрадпрыемства «Беразоўскае». Па галаўным прадпрыемстве «Івацэвічдрэў» за 1996 г. недаатрымана прадукцыі ў супастаўных цэнах на 7,2 мільярда рублёў.

Прадпрымаліся меры па выхадзе ўсіх прадпрыемстваў з крызісу. Так, у 1996 г. асартымент выпускаемых тавараў павялічыўся на 19 найменняў. Новае абсталяванне ўстаноўлена на прадпрыемствах АТ «Івацэвічдрэў», АТ «Косаўскае МВА», Даманаўскім ГПК.

Развіццё прамысловасці стрымліваў і такі фактар, як памеры рэалізацыі гатовай прадукцыі. Запасы яе на складах вялікія. Асабліва ў АТ «Івацэвічдрэў», на Целяханскай лыжнай фабрыцы, установы 15/5. Значныя лічбы складаюць страты рабочага часу.

Справіліся ў 1996 г. з даведзенымі аб'ёмамі і некалькі павялічылі выкананне падрадных работ у параўнанні з 1995 г. большасць будаўнічых арганізацый: ПМК-11, ПМК-60, СПМК-21, СПМК-23. За 1996 г. узведзена 16 901 квадратны метр жылля, што ў паўтара раза больш, чым у 1995 г. Здадзены ў эксплуатацыю новая сярэдняя школа ў Івацэвічах на 1251 вучня з блокам для шасцігодак на 75 месцаў, інжынерныя сеткі да раду жылых дамоў, водаправод на вул. Чырвонаармейскай у Івацэвічах і іншыя аб'екты. Вялася газіфікацыя ў калгасах «Любішчыцы», «Івацэвіцкі», імя Кірава, саўгасе «Перамога», працягвалася ўзвядзенне ачышчальных збудаванняў. Пачалося будаўніцтва станцыі абезжалязнення вады ў Івацэвічах. Шмат зроблена па добраўпарадкаванні населеных пунктаў.

Па выніках 1996 г. забяспечаны прырост аб'ёмаў рознічнага тавараабароту на 6,1 працэнта. Павялічыліся пасажырскія перавозкі па аўтапарку № 14 на 17,2 працэнта. Раённы вузел сувязі ўвёў у эксплуатацыю сельскія тэлефонныя станцыі ў вёсках Бусяж і Краглевічы. Развіваліся рыначныя адносіны.

У 1997 г. працоўныя калектывы ў прамысловасці і будаўніцтве пашырылі намаганні на далейшае развіццё вытворчасці, вывад яе з крызісу. Хоць праблем многа і цяжкасці вельмі значныя.

Пэўны застой і замаруджанне

развіцця ў першай палове 1990-х гадоў наглядаліся ў сельскай гаспадарцы раёна. І зноў тыя ж прычыны: розніца ў цэнах на энерганосьбіты, прамысловую прадукцыю і прадукцыю сельскай гаспадаркі. Адсюль цяжкае фінансавае становішча калгасаў і саўгасаў. Несвоечасовая аплата спажыўцамі за пастаўленую прадукцыю вяла да запазычанасці па падатках і крэдытах, несвоечасовай выплаты зарплаты. І тым не менш працаўнікі вёскі не зніжалі намаганняў па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У раёне дапушчана толькі нязначнае паніжэнне пасяўных плошчаў пад збожжавымі і зернебабовымі культурамі, бульбай і лёнам. У 1996 г. у раёне з кожнага гектара атрымана па 26,6 цэнтнера збожжа, 225 — цукровых буракоў, 177 — бульбы, 308 цэнтнераў кармавых караняплодаў. Аднак у радзе гаспадарак гэтыя паказчыкі ніжэйшыя.

У жывёлагадоўлі наглядалася зніжэнне пагалоўя. Калі ў 1990 г. у раёне было 85 240 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 30 091 карова, то ў 1995 г. пагалоўе знізілася да 65 443 галавы, а кароў — да 26 769. На 10 тысяч галоў зменшылася пагалоўе свіней. Менш стала і кармоў для жывёлы. Адсюль і зніжэнне вытворчасці малака і мяса. Калі ў 1990 г. вытворчасць малака склала 634 581 тону, то ў 1995 г. — 374 256 тон. Знізілася і вытворчасць мяса. У 1995 г. атрымана на 11 тыс. тон менш, чым у 1990 г. Зменшыўся і продаж прадукцыі сельскай гаспадаркі. У 1996 г. рэалізавана жывёлы на забой на 15 працэнтаў менш, чым у 1995 г. На 7 працэнтаў зменшыўся валавы надой малака, а надой ад каровы на 60 кілаграмаў. Амаль у трэці гаспадарак надой малака ад каровы не дасягнуў і 2000 літраў. У іх ліку — калгасы «Савецкая Беларусь», «Косава», «Іскра», «Дамановa», «Радзіма».

Райвыканком, гаспадарчыя службы раёна, працаўнікі вёскі робяць намаганні, каб дабіцца стабілізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і павысіць выхад прадукцыі.

Больш аптымістычна раён сустрэў 1997 г. Прамысловасць павялічыла прырост прадукцыі, вытворчасць малака, мяса. Ёсць пэўныя поспехі ў газіфікацыі. На ўзроўні працуюць камунальнікі, спажыўкааперацыя. Амаль 40 працэнтаў у тавараабароце займае ўласная прадукцыя раёна, да таго ж даволі высокай якасці. Івацэвіцкая каўбаса «салямі» лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы і самай таннай. На малаказаводзе вырабляецца добры кефір, пастаянна асвойваюцца новыя віды прадукцыі. Высакаякаснай з'яўляецца мінеральная вада, што вырабляецца ў калгасе «Бусяжскі».

Ідзе зрух і ў сельскай гаспадарцы, нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці. Ідзе пошук новых тэхналогій і абсталявання для больш эфектыўнага гаспадарання. Напрыклад, пераход на дантэкаўскія ацяпляльныя катлы прынёс не толькі нармальнае ацяпленне, але і мільярдную эканомію ў параўнанні са звычайнымі. Своечасова выплачваюцца пенсіі. Намецілася зніжэнне беспрацоўя, якое складае 2,5 працэнта.

Тым не менш цяжкасці і праблемы застаюцца. Слаба ідзе папаўненне даходнай часткі раённага бюджэту. Многія суб'екты гаспадарання маюць нізкую рэнтабельнасць, асобныя галіны ў сельскай гаспадарцы стратныя. Існуюць праблемы занятасці насельніцтва. Патрабуюць вырашэння праблемы медыцыны, народнай адукацыі. У цэлым жыццёвы ўзровень людзей знізіўся, а смяротнасць пакуль што перавышае нараджальнасць.

Вырашэннем усіх гэтых праблем займаецца ўлада разам з усімі жыхарамі раёна.

М.Банасевіч.

На лясных абшарах

Івацэвіцкі раён лічыцца лясным. Яго зялёныя масівы займаюць 148 479 гектараў, што складае амаль палавіну тэрыторыі раёна. Тут дзейнічаюць два лясгасы — Івацэвіцкі і Целяханскі. У іх уваходзяць лясныя абшары Гута-Міхаліна, Гуліна, паўднёвай часткі раёна, якая ахоплівае лясы Целяханшчыны і Жытліншчыны. Дзякуючы гэтаму, раён у перыяд Вялікай Айчыннай вайны быў сапраўдным партызанскім краем. Яго лясы ўкрывалі шматлікія партызанскія атрады і брыгады.

У мірны ж час лясы сталі базай для актыўнай гаспадарчай дзейнасці.

Уладанні Целяханскага лясгаса складаюць 76 112 гектараў. На іх размясціліся 11 лясніцтваў. Калектывы зялёных гаспадароў вядуць пасадкі лесу, догляд за ім, яго ахову, кантроль за вырубкамі, займаюцца падсобнай гаспадаркай. Безумоўна, і ў іх дзейнасці ў 1990-я гады паявіліся пэўныя цяжкасці і праблемы, як і ва ўсёй народнай гаспадарцы — неплацяжы заказчыкаў, высокія цэны на паліва, дэталі для машын і на тэхніку, значныя падаткі. Але абаронцы зялёнай коўдры, дзякуючы напружанай працы і прадуманаму кіраўніцтву, паспяхова вядуць увесь комплекс лясных работ. Год ад года расце выпуск дрэвапрадукцыі, сыравіны, тавараў народнага спажывання.

Добра клапоцяцца тут і аб пабочным карыстанні лесам. Толькі за лета 1996 г. нарыхтавана і пастаўлена кансервавым заводам 148 тон чарніц. А ўсяго прадукцыі пабочнага карыстання лесам адпраўлена на 1270 мільёнаў рублёў. Гэта вынік працы дзесяткаў самаадданых работнікаў лесу — галоўнага ляснічага І. А. Ката, ляснічых П. П. Каралевіча, Я. М. Валаха, леснікоў А. І. Капыщіча, Ф. М. Кананoвіча, А. М. Лішко, М. С. Радзівона, В. А. Юркевіча.

Для выканання работ у гаспадарцы лясгас мае неабходную тэхніку, на якой працуюць вопытныя спецыялісты. Вадзіцель лесавоза П. К. Мялік за месяц вывозіць па 700—800 кубічных метраў драўніны. Гэта значна больш нормы. Не адстае ад яго і А. М. Юркевіч. Вадзіцель І. С. Барсук адвозіць гатовую прадукцыю на чыгуначную станцыю, дзе яна адгружаецца на экспарт.

Ужо больш за 35 гадоў у лясгасе дзейнічае дрэваапрацоўчы ўчастак. У ім тры аддзяленні: лесапільнае, такарных і струганых вырабаў, паркетнае. Адсюль драўніна, піламатэрыялы, рудстойка бяруць дарогу ў Германію, Польшчу, на Украіну. Акрамя гэтага, з цэхаў лясгаса на мясцовыя будоўлі адпраўляюцца піламатэрыялы абразныя і неабразныя, дошкі для падлогі, абшыўка для сцен, паркет і другія вырабы. У работу гэтага цэха важкі ўклад уносяць галоўны інжынер І. С. Саўчук і начальнік цэха С. В. Зубараў, рамшчыкі і станочнікі М. М. Кананoвіч, В. В. Багдановіч, Н. Р. Струнеўская, В. М. Абрамчук, Н. З. Мялік, слесар М. А. Дзягцярык, тачыльшчык інструменту В. М. Струнеўскі, токар С. Куратнік і іншыя. Другі лясгас — Івацэвіцкі — таксама працуе рэнтабельна, мае добрыя паказчыкі (дырэктар Е. М. Ліпскі). 12 лясніцтваў працуюць на 84,2 тыс. гектарах лесу, наладжваюць сувязі не толькі з гаспадаркамі Беларусі, але і з замежжам. Пабывалі ў лясгасе спецыялісты са Швецыі, Фінляндыі.

Калектыў гэтага лясгаса толькі ў 1996 г. пашырыў плошчу лясоў на 226 гектараў і выпусціў прадукцыі на 5,3 мільярда рублёў.

Г. Трубенка.

На абласной нарадзе работнікаў лясной гаспадаркі ў Івацэвіцкім лясгасе. 1997 г.

У сувязі з навукай

Здаўна людзі шукалі шляхі лепшага выкарыстання акружаючых іх зямель. А ў нас было над чым думаць: у раёне шмат балотных масіваў, асабліва ў поймах рэк Шчары і Грыўды, дзе праходзіць водападзел Шчары і Ясельды.

Яшчэ ў 1885—1898 гг. тут пачаліся меліярацыйныя работы — быў выкапаны магістральны канал з мэтай меліярацыі сенакосных угоддзяў і паляпшэння ўмоў лесасплаву. У 1923—1927 гг. невялікая плошча балотнага масіву ў пойме р. Грыўды была асушана сеткаю каналаў і ўведзена ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Так нарадзілася Станевіцкае доследнае поле.

Сур'ёзныя падыходы да выкарыстання балотных зямель пачаліся з устанаўленнем у нас савецкай улады. У 1939 г. пастановай урада БССР створана Косаўская балотна-доследная станцыя Беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і воднай гаспадаркі.

Для станцыі выбралі плошчу вялікага балотнага масіву непадалёку ад в. Любішчыцы. Пачаліся ірыгацыйныя работы, ствараліся лабараторыі. Усё гэта спыніла нашэсце нямецка-фашысцкіх акупантаў (25 чэрвеня 1941 г. станцыя была занята немцамі).

Толькі ў 1945 г. аднавіліся работы доследнай станцыі. У 1946 г. у дадатак стварылі метэастанцыю і аграхімічную лабараторыю. Узначаліў яе тады кандыдат сельскагаспадарчых навук Аляксандр Міхайлавіч Ахрамейка.

У 1960 г. выдавецтва Акадэміі навук выпусціла першы зборнік навуковых работ Косаўскай доследнай балотнай станцыі. У ім падрабязна паведамляецца аб праведзеных даследаваннях у галіне травасеяння і вытворчасці кармавых культур на балотных меліяраваных землях, аб выведзеных новых раянаваных гатунках бульбы і іншых.

У 1987 г. калектыў супрацоўнікаў пайшоў далей — на базе станцыі створана эксперыментальная база «Майск», якую ўзначаліў Віктар Рыгоравіч Асіпік. Яе галоўная задача — вырошчванне гатунковага насення збожжавых культур, бульбы і шматгадовых траў.

В. Касько.

Запаведныя мясціны

Наш Івацэвіцкі край багаты цудоўнымі запаведнымі мясцінамі, якія вызначаюцца прыгажосцю прыроды з яе разнастайнай флорай і фаунай.

Гідралагічны заказнік «Выганашчанскае!» займае плошчу 43 000 гектараў на землях Даманаўскага ваеннага лясгаса. У ім налічваецца 12 відаў раслін і жывёл, якія занесены ў Чырвоную кнігу.

Цікавы сваім раслінным светам мікразаказнік лекавых раслін «Вялікі Ямінец». Ён размешчаны за 3 кіламетры на захад ад вёскі Турная Святавольскага сельсавета. Плошча заказніка — 75 гектараў.

Для захавання запасаў торфу і акумуляцыі вільгаці ў пойме ракі Грыўда створаны заказнік «Грыўда — Урач». Ён займае 180 гектараў.

У Барэцкім лясніцтве створаны заказнік рэспубліканскага значэння «Чыстая дубрава». У ім праводзіцца работа па захаванні каштоўных відаў дрэў і раслін.

Пад ахову дзяржавы і рэстаўрацыю ўзяты старынны парк «Грудопаль», у якім знаходзіцца каля 20 відаў раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу.

Прывабнымі мясцінамі адпачынку радуюць жыхароў раёна створаныя ў апошнія дзесяцігоддзі зоны каля штучных вадаёмаў бліз вёсак Яглевічы, Няхачава, уздоўж магістралі Брэст — Масква.

В. Краўчэня.

Быць здаровымі, моцнымі, вынослівымі

Лічы, што ў 1945 г. усё пачыналася на голым месцы — са спартыўных пляцовак у школах, каля клубаў. У буйнейшых населеных пунктах абсталёўваліся стадыёны, у школах ціры, у кожнай вёсцы спартыўныя пляцоўкі. І самае, бадай, важнае, што на іх заўсёды было шматлюдна. Наладжваліся спаборніцтвы, спартыўныя гульні, турыстычныя паходы і злёты.

І вось вынік. У 1996 г. у раёне працавалі 4 стадыёны, 41 спартыўная зала, 98 спартыўных

пляцовак для гульняў. На іх працуе 61 спецыяліст па фізічнай культуры і спорце — усе яны маюць спецыяльную падрыхтоўку. Сярод іх заслужаны настаўнік РБ Іван Васільевіч Капуста, выдатнік адукацыі РБ Станіслаў Сяргеевіч Юмашаў. У свой час заслужаным трэнерам РСФСР стаў выпускнік Гошчаўскай СШ Аляксандр Гойшык, які падрыхтаваў чэмпіёнку Маскоўскай алімпіяды 1980 г. у эстафетным бегу 4х400 м.

Многія нашы спартсмены — гадаванцы дзіцячай спартыўнай школы паспяхова выступалі на рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных спаборніцтвах. Так, Валерый Ярац — майстар спорту міжнароднага класа, быў неаднаразовым чэмпіёнам БССР, членам зборнай СССР у спартыўнай хадзьбе на 50 км; Валянціна Пархута — майстар спорту міжнароднага класа, неаднаразовая чэмпіёнка БССР у бегу на 800 м; Віктар Глушэня — пераможца першынства СССР сярод юнакоў у бегу на 100 м; Валянцін Шлык — пераможца міжведамасных спаборніцтваў СССР у кіданні кап'я; Уладзімір Хацімка — майстар спорту міжнароднага класа, заняўшы 3-е месца на другім чэмпіянаце свету па завочнай ігры ў рускія шашкі; Васіль Серцаў — майстар спорту ў бегу на 3000 м з перашкодамі; Уладзімір Юмашаў — майстар спорту ў ваенным трохбор'і; Вячаслаў Юркевіч — прызёр першынства СССР сярод юнакоў у бегу на 800 м; Валянціна Страковіч — майстар спорту, неаднаразовая чэмпіёнка БССР у кіданні кап'я і іншыя.

Пераможцамі рэспубліканскіх спаборніцтваў сталі Іван Кананоўіч, Віктар Акавіты, Галіна Зыбайла, Валерый Глушэня, Сяргей Жаўраў, Таццяна Шайкова, Тамара Міраноўская, Уладзімір Міцлер, Юрый Балакір.

У падрыхтоўку пераможцаў унеслі ўклад трэнеры Іван Васільевіч Капуста, Георгій Георгіевіч Саплеў, Міхаіл Сямёнавіч Швед, Міхаіл Іосіфавіч Сяргейчык, Мікалай Ігнатавіч Роік. У розныя гады значны ўклад у развіццё фізкультуры і спорту ў раёне ўнеслі Васіль Шчукін, Аляксандр Жыгар, Мікалай Кот, Мікалай Мулярчык і іншыя энтузіясты фізкультурна-спартыўнай работы.

М. Швед.

Ветэранскі рух у раёне

Іван Адамавіч Тарасевіч у гады Вялікай Айчыннай вайны перанёс шмат пакут. Немцы знішчылі сям'ю, сам змагаўся з акупантамі ў радах народных мсціўцаў. Пасля вайны працаваў у дзяржаўных органах. Актыўна ўдзельнічаў у ветэранскім руху ў раёне, а ў 1990-я гады ўзначаліў Івацэвіцкую раённую ветэранскую арганізацыю. Ён дзеліцца сваім роздумам аб ветэранскім руху ў раёне.

Ветэранскі рух узнік адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны. Ён пачаўся ў форме сустрэч аднапалчан, змагаўшыхся супраць фашызму на франтах вайны, і партызан з атрадаў і брыгад, якія ваявалі ў тыле ворага. Салдацкая і партызанская дружба — асобая дружба, загартаваная на пралітай крыві ў змаганні за свабоду і незалежнасць Бацькаўшчыны.

Сустрэчы ветэранаў потым сталі традыцыйнымі. Прыкладам гэтаму служаць штогадовыя мерапрыемствы ў вёсцы Жытлін і Гута-Міхалінскім лесе. Яны праводзяцца як раённыя мерапрыемствы. Акрамя жыхароў Івацэвіцкага раёна сюды прыязджаюць удзельнікі партызанскага руху са Слонімскага, Бярозаўскага, Пружанскага і іншых раёнаў, краін блізкага і далёкага замежжа. Івацэвіцкі раён па праве лічыцца партызанскім. Сюды для сустрэч збіраюцца былыя партызаны і партызанкі Брэсцкага партызанскага злучэння, бо ў гады вайны штаб гэтага злучэння размяшчаўся ў нашым раёне, ва ўрочышчы Хаваншчына на Жытліншчыне.

Ветэранаў вайны з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Аднак, нягледзячы на гэта, традыцыйныя сустрэчы прадаўжаюцца. Разам з ветэранамі вайны ў мерапрыемствах удзельнічаюць і ветэраны працы. Перамога над фашызмам і аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі здзейснена намаганнямі, воляй і працай усіх ветэранаў.

На сустрэчах заўсёды ўзнімаліся пытанні паляпшэння жыцця ветэранаў, увекавечання памяці загінуўшых у баях воінаў і ахвяр фашызму. Узнікла неабходнасць арганізацыйнага афармлення ветэранскага руху, замацавання

яго юрыдычна. Гэта адбылося ў 1986 г., калі 17 снежня ў Маскве прайшла ўстаноўчая канферэнцыя Усесаюзнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы.

Першы пленум Івацэвіцкай раённай арганізацыі ветэранаў адбыўся 17 лютага 1987 г. На ім былі абраны савет ветэранаў раёна, яго прэзідыум, камісіі. У стварэнне раённай арганізацыі ветэранаў, яе першых гадах дзейнасці вялікі ўклад унеслі актывісты руху, многіх з якіх, на вялікі жаль, ужо няма з намі. Сярод іх — Кавецкі Ціхан Мікітавіч (былы яе старшыня), Казімірэнка Андрэй Нікіфаравіч, Калінка Мікалай Платонавіч, Ільюкевіч Аляксей Пятровіч, Талалуеў Аляксандр Сяргеевіч, Мікуліч Васіль Рыгоравіч, Гойшык Вольга Андрэеўна, Калеснікаў Іван Ягоравіч, Вайцяхоўскі Андрэй Міхайлавіч, Серада Пётр Сяргеевіч, Гаўрылік Мікалай Канстанцінавіч, Канявега Іван Аляксеевіч, Міхееў Георгій Васільевіч, Тамарава Ніна Мітрафанаўна, Дзеблік Васіль Захаравіч.

Першымі крокамі раённай ветэранскай арганізацыі было суцэльнае абследаванне матэрыяльна-бытавых умоў інвалідаў вайны і працы, адзінокіх і старых грамадзян раёна. Вынікі абследавання мы абагульнілі і давялі да ведама органаў улады, якія, дзякуй ім, адклікнуліся і аказалі, каму было неабходна, матэрыяльную падтрымку, дапамогу ў рамонце жылля. Жыццё паказала, што дзейнасць ветэранскіх арганізацый немагчыма без падтрымкі органаў дзяржаўнай улады, прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, арганізацый і ўстаноў. І гэту падтрымку мы адчуваем. Вялікую дапамогу ў вырашэнні пытанняў дзейнасці ветэранскай арганізацыі раёна аказвае старшыня райвыканкома Жышка Пётр Георгіевіч. З яго бяруць прыклад і старшыні гарадскіх, пасялковага, сельскіх Саветаў.

Ветэраны раёна ўдзельнічаюць у рабоце па маральным і патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення, яны выступаюць у школах перад вучнямі, сустракаюцца з прызыўнікамі, воінамі гарнізона, навучэнцамі СПТВ і курсантамі школы ДТСААФ.

Сярод ветэранаў многа энтузіястаў, якія не могуць жыць толькі сваімі хатнімі справамі. Іх цягне да людзей, да справы. Актыўныя члены савета ветэранаў — Булыка В. П., Банасевіч М. В., Мароз В. І., Трубенка Г. А., Касько В. П. з'яўляюцца пазаштатнымі карэспандэнтамі раённай газеты «Івацэвіцкі веснік». Акрамя таго, Банасевіч М. В., Мароз В. І. і Касько В. П. працуюць над матэрыяламі для раённай кнігі «Памяць».

У Быценскай ветэранскай арганізацыі вялікую работу з непаўналетнімі праводзіць Булыка Вольга Пятроўна. Па сутнасці, яна з'яўляецца прызнаным у Быцені грамадскім выхавацелем.

Ветэраны-жанчыны г. Івацэвічы арганізавалі фальклорны ансамбль «Вербіца», якому прысвоена званне народнага. Дзейнічаюць хоры ветэранаў у Івацэвічах і Целяханах.

Прэзідыум Івацэвіцкай раённай арганізацыі ветэранаў. 1997 г.

На тэрыторыі раёна пастаўлена больш за 70 помнікаў загінуўшым воінам і ахвярам фашызму. Работа над ушанаваннем памяці загінуўшых праводзіцца і цяпер. Так, у апошнія гады ў г. Івацэвічы пастаўлены помнік воінам-інтэрнацыяналістам, на 10-м шлюзе Агінскага канала — помнік 13 партызанам атрада імя Шчорса, якія загінулі ў баі з карнікамі ў верасні 1942 г. Узведзены помнік ахвярам фашызму ў Сярадаве. Вядзецца падрыхтоўка да ўзвядзення помніка ахвярам фашызму ў Івацэвічах на месцы расстрэлаў савецкіх людзей каля дарогі на Косава.

У раёне дзейнічаюць 38 пярвічных ветэранскіх арганізацый. Усе яны ў меру сваіх сіл імкнуцца абараняць і адстойваць інтарэсы ветэранаў у адпаведнасці з Законам «Аб ветэранах Рэспублікі Беларусь».

У лютым 1997 г. мы адзначылі 10-годдзе ўтварэння раённай арганізацыі ветэранаў вайны, працы, узброеных сіл і праваахоўных органаў. Ёсць яшчэ сілы, імкненні дзейнічаць у інтарэсах ветэранаў і спадзяёмся на падтрымку і дапамогу ў гэтым органаў улады і грамадскасці.

Мэбля на ўсе густы

З гісторыі вядома, што пачатак развіцця г. Косава як прамысловага цэнтра ў Івацэвіцкім раёне адносіцца да першай палавіны 19 ст. Тады памешчыкі Пуслоўскія, якім належала Косава і навакольныя вёскі, адкрылі ў горадзе суконную мануфактуру, фабрыку дываноў і вінакурню. На гэтых прадпрыемствах у 1845 г. працавала каля 200 прыгонных сялян.

У гады гаспадарання на землях Заходняй Беларусі ўлад буржуазна-памешчыцкай Польшчы ў Косаве дзейнічалі млын, дзве лесапільні, маслабойня, воўначасалка, прадзільная, суконная і скураная вытворчасці, шавецкія майстэрні, вытворчасць чарапіцы, каўбасная, пякарная і кандытарскія прадпрыемствы. Усе яны былі прыватнымі прадпрыемствамі, на якіх працавалі ад 2 да 50 чалавек. Пераважная большасць мяшчан і яўрэйскага насельніцтва займалася гандлем, лесапарапрацоўкай, рамізніцтвам, працай у сельскай гаспадарцы на сваёй зямлі і на сезонных работах у памешчыкаў і асаднікаў.

Пры ўстанаўленні савецкай улады ў Заходняй Беларусі ўсе прыватныя прадпрыемствы былі нацыяналізаваны і на іх базе быў створаны Косаўскі райпрамкамбінат.

25 чэрвеня 1941 г. у выніку фашысцкага артабстрэлу быў поўнасцю знішчаны цэнтр горада і ўсе прамысловыя забудовы. Летам 1942 г. акупанты і іх памагатыя спрабавалі арганізаваць выпуск калодзежных кольцаў і чарапіцы. Але пасля разгрому партызанамі косаўскага гарнізона гаспадары «новага парадку» адмовіліся ад арганізацыі якой-небудзь вытворчасці.

11 ліпеня 1944 г. пасля вызвалення г. Косава прыйшлося ўсё пачынаць з нуля, ва ўмовах, калі не хапала рабочых рук (мужчыны былі ў дзеючай арміі), аднаўленне райпрамкамбіната даручылі былому партызану Івану Сцяпанавічу Сяменку, які быў прызначаны дырэктарам.

Напачатку ўдалося аднавіць работу млыноў на коннай цязе ў Косаве, Хадорках, Верашках, Бусяжы, Любішчыцах. Пуск млыноў дыктаваўся вастрэйшай неабходнасцю, бо там выраблялася мука для спажывання жыхарамі раёна.

У маі 1946 г. у Косаве закончылі будаўніцтва лесазавода. За аднаўленне і пуск піларамы былі прэміраваны механік-самавучка Глінскі Ц. Р., слесары Пропер В. І., Карповіч А. І., піларамшчыкі Раманоўскі П. М. і Зыбайла А. І. Больш года райпрамкамбінат працаваў толькі на давальніцкай сыравіне. Толькі з 5 верасня 1946 г. камбінат пачаў атрымліваць метал і другія матэрыялы па цэнтралізаваным забеспячэнні.

Ужо ў пачатку 1948 г. механіку Глінскаму Ц. Р. удалося аднавіць газагенератарны рухавік, а Шчурко Мацвей і Шчурко Ілья ўстанавілі электраразмеркавальны шчыт, які знайшлі на звалцы. Такім чынам пачала дзейнічаць маленькая электрастанцыя. Працавалі ўжо млыны, сталярныя, абозныя, шавецкія, аўчынныя майстэрні, воўначасалка і валяльны цэх.

Вытворчы план за 1949 г. быў выкананы на 108,7 працэнта.

У жніўні 1963 г. райпрамкамбінат перапрафіліравалі ў Івацэвіцкі дрэваапрацоў-

А. П. Дылько.

С. А. Філіповіч.

чы камбінат (ДАК). У студзені 1971 г. ён стаў Косаўскім мэблевым вытворчым аб'яднаннем (МВА) з цэхамі ў Кобрыне, Быцені і Броннай Гары. З 22 сакавіка 1994 г. гэта ўжо акцыянернае таварыства з аддзяліўшыміся ад яго цэхамі ў Кобрыне і Быцені.

Камбінат увесь час свайго існавання будаваўся. Гаспадарчым спосабам у 1945—1949 гг. пабудаваны лесапільны завод, воўначасальны і валяльны цэхі, электрастанцыя, кацельня, цэх мяккай мэблі. На руінах былой дыванова-суконнай фабрыкі ўзведзены 2-павярховы будынак карпусной мэблі плошчай 2100 кв.м, у 1950—1957 гг. пабудавана памяшканне па раскроі і нарыхтоўцы дэталей плошчай 1150 кв.м, прэсафанеровачны цэх, 8-камерная сушыльня, гаражы, чарапічна-бетонны цэх, воданапорная вежа, падстанцыя, бандарны цэх, склад мэблі, артсвідравіна і помпавая, рэканструяваны будынак упраўлення; у 1975 г. здадзены будынак цэха № 5; у 1982 г. пабудаваны 4-павярховы будынак лабараторна-інжынернага корпуса, потым былі пабудаваны і рэканструяваны цэхі № 1, 2, 3, 4.

Былі наладжаны ўстойлівыя эканамічныя сувязі са многімі гарадамі і прадпрыемствамі СССР. МВА атрымлівала сыравіну, камплектуючыя матэрыялы і абсталяванне з Масквы, Яраслаўля, Свярдлоўска, Херсона, Кіева, Сыктыўкара, Мінска, Гомеля, Магілёва, Віцебска, Брэста, Бабруйска, Рэчыцы, Мазыра, Пінска, Вільнюса, Рыгі і іншых гарадоў. У той жа час прадукцыя мэблевага аб'яднання мела попыт і збыт не толькі на тэрыторыі Беларусі, а і ў шмат якіх гарадах былога СССР. Гэта — Петрапаўлаўск, Саранск, Ташкент, Джамбул, Курск, Цалінаград, Алма-Ата, Паўладар, Баку, Самарканд, Ашхабад, Калінінград, Кіеў, Палтава, Чарнігаў і дзесяткі іншых гарадоў.

Выпуск валавой прадукцыі няспынна рос з пяцігодкі да пяцігодкі. За перыяд ад 1965 г. да 1995 г. вытворчасць прадукцыі выраслa ў 16 разоў, а колькасць персаналу павялічылася крыху больш чым у 2 разы.

Разам з расшырэннем вытворчых магутнасцей памнажалася і сацыяльна-бытавая база прадпрыемства. Да перабудовы было ўзведзена 11 4- і 5-павярховых дамоў з 385 добраўпарадкаванымі кватэрамі. У цэхах наладжаны бытоўкі і пакоі адпачынку, пабудавана рабочая сталоўка на 140 месцаў, арганізавана падсобная гаспадарка, дзе працуюць цяпліцы і ферма па вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы. Разам з мясцовым саўгасам каля

Жылы масіў Косаўскага МВА.

горада пабудавана штучнае возера з люстраной паверхняй 30 гектараў.

Да перабудовы прадпрыемства працавала стабільна. Яно неаднаразова адзначалася ўзнагародамі, славілася сваімі работнікамі, многія з якіх былі ўдастоены высокіх дзяржаўных узнагарод. Генеральны дырэктар МВА Філіповіч С. А. узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Дружбы народаў. Ордэнам «Знак Пашаны» адзначана праца начальніка цэха Дылько Аляксандра Паўлавіча. Такую ж узнагароду атрымаў і слесар-наладчык Ганчарук Іван Антонавіч. Рабочая аддзелкі мэблі Шчасная Марыя Восіпаўна ўзнагароджана медалём «За працоўную доблесць», а брыгадзір каменшчыкаў Дылько Іван Мікалаевіч і шліфавальшчыца Дзюрыч Сцепаніда Іванаўна ўдастоены ордэнаў Працоўнай Славы.

Першым дырэктарам райпрамкамбіната пасля выгнання акупантаў быў Іван Сцяпанавіч Сяменка (1944—1948). Яго змяніў Мікалай Лаўрэнавіч Тарасаў. Затым камбінат узначальвалі Сяргей Фёдаравіч Арсеньеў і Мікалай Сямёнавіч Лук'янаў. З 1961 г. нязменным дырэктарам прадпрыемства працаваў Сяргей Адамавіч Філіповіч.

Трэба адзначыць, што ў 1990-я гады прадпрыемства сутыкнулася з многімі праблемамі і цяжкасцямі — поўнасцю парушаны эканамічныя сувязі як унутры рэспублікі, так і з краінамі СНД. Вырасла запазычанасць прадпрыемству гандлёвых арганізацый, не хапае сыравіны і камплектуючых вырабаў. Усё гэта вымушае прадпрыемства працаваць з вялікімі перабоямі.

Я. Янчанка.

На малочным заводзе

Івацэвіцкі малаказавод створаны ў 1945 г. Спачатку ён прызначаўся для прыёму малакапрадукцыі ад насельніцтва, у асноўным ад сялян, якім даводзіліся дзяржаўныя заданні на здачу малака. Лабараторыя вызначала ўтрыманне тлушчу ў малацэ. Затым узвялі будынак, у якім наладзілі перапрацоўку да 20 тон малака ў змену. Спачатку сепарыравалі малако ручнымі сепаратарамі. У 1949 г. іх электрыфікавалі. Пачалі выпускаць масла сметанковае. Потым дайшла справа да марожанага. Праца тады была цяжкая. Большасць аперацый выконваліся ўручную. Выпрабленую прадукцыю, асабліва топленае масла, вывозілі ў бочках у сховішчы, якія размяшчаліся ў руінах Брэсцкай крэпасці.

У 1963 г. правялі рэканструкцыю завода, прыбудавалі цэх, дзе выпускалі ўжо малако біклажнае і бутэлечнае, кефір у бутэльках, масла сметанковае ў скрынках, марожанае ў стаканчыках. Пабудавалі кацельню і кампрэсарную.

Намячалася і далей расшыраць завод і выпускаць на ім розную малочную прадукцыю. Але ў 1969 г. пабудавалі масласырзавод у г.



У цэху Косаўскага МВА.

Бяроза і івацэвіцкае прадпрыемства зарыентавалі толькі на пярвічную апрацоўку малака і выпуск казеіну. Малако, якое праходзіла першасную апрацоўку, і смятанку адпраўлялі на Бярозаўскі масласырзавод.

З 1985 г. завод стаў самастойным прадпрыемствам. Праведзена рэканструкцыя казеінавага цэха, пабудавана новая прыёмачная малака і бытавыя памяшканні.

У 1990-я гады завод стаў перапрацоўваць да 90 тон малака ў суткі. Павялічылася вытворчасць казеіну да 1,2 тоны за 2 змены. Расшыраны экспарт казеіну. Асвоены выпуск малака, кефіру, смятаны ў пакетах, тварагу, сыркоў тварожных. Адкрыты ў Івацэвічах фірменны магазін «Верас», дзе рэалізуецца прадукцыя, якую выпускае завод.

Мы — акцыянеры

Івацэвіцкі лесазавод (цяпер галаўное прадпрыемства АТ «Івацэвічдрэў») быў заснаваны ў 1920-я гады як прыватнае прадпрыемства. У 1939 г. ён стаў дзяржаўным. У 1944 г. пачаў аднаўляцца пасля ваеннай разрухі і ўвесь час пашыраўся: у 1951—1960 гг. пабудаваны цэх дрэваапрацоўкі, у 1966—1971 гг. уведзены ў строй цэх смол, кацельня, цэх ДСП, у 1976 г. пачынае працу цэх ламініравання. З 1971 г. — галаўное прадпрыемства ВА «Івацэвічдрэў», з 1993 г. — акцыянернае таварыства «Івацэвічдрэў». Яно аб'ядноўвае Івацэвіцкі лесазавод, леспрамгас, Целяханскую лыжную фабрыку, мэблевыя фабрыкі ў Ружанах, Брэсце, Баранавічах. Выпускае піламатэрыялы, драўнянастружкавыя пліты, ламініраваны матэрыял, мэблю, вугаль драўняны, жывіцу сасновую, круглы лес і іншую прадукцыю, якая пастаўляецца спажыўцам Беларусі, Расіі, Францыі, Германіі, Польшчы.

Аб рабоце АТ «Івацэвічдрэў» у новых умовах расказвае старшыня яго праўлення Міхаіл Белямук:

— З 25 жніўня 1993 г. вытворчае аб'яднанне «Івацэвічдрэў» юрыдычна стала акцыянерным таварыствам. Мэта акцыяніравання — выкуп аб'яднання калектывам у сваю ўласнасць і павышэнне эфектыўнасці вытворчасці.

За тры гады, якія прайшлі ў новых умовах гаспадарання, шмат што зроблена і па інтэнсіфікацыі і па эканомным вядзенні гаспадаркі, па фарміраванні ў работнікаў пачуцця гаспадара прадпрыемства, які ў адказе і за поспехі, і за пралікі працоўнага калектыву. Вядома ж, працэс змены формы ўласнасці не заўсёды ідзе гладка. Ёсць праблемы, цяжкасці. Але ж мы паступова рухаемся па выбраным шляху.

Да акцыяніравання наша аб'яднанне дзесьці каля года працавала на арэндзе. Увесь атрыманы прыбытак за гэты перыяд накіроўвалі на пакупку акцый, кошт адной з іх тады складаў 50 000 рублёў. Набылі за прыбытак 22,3 працэнта акцый. Работнікі аб'яднання купілі акцыі і за свае грошы. За чэкі «Маёмасць» набывалі іх і тыя, хто ў нас не працуе. Тут трэба сказаць, што пры акцыяніраванні дзяржава нам дала пэўную льготу. Работнікі аб'яднання змаглі набываць акцыі на 20 працэнтаў ніжэй іх рэальнага кошту. А складаў ён на дату пачатку акцыяніравання 408 мільёнаў рублёў.

Аднак і ў гэтых умовах мы не здолелі ва ўстаноўлены тэрмін выкупіць у дзяржавы ўсе акцыі аб'яднання. На верасень 1996 г. мелі 56,6 працэнта акцый. І хоць акцыянерамі з'яўляюцца больш за 90 працэнтаў сваіх работнікаў, а Ружанская і Баранавіцкая мэблевыя фабрыкі выкупілі ўсе 100 працэнтаў акцый, мы фактычна не маем кантрольнага пакета. Каб ім валодаць, неабходна мець 75 працэнтаў акцый.

У апошні час працэс акцыяніравання ў нас амаль што прыпынены, як і ў цэлым у рэспубліцы. Нам удалося выкупіць толькі каля 5 працэнтаў акцый. Няма сродкаў, патрэбных на гэта, пакуль што ні ў прадпрыемства, ні ў яго работнікаў асабіста. Між тым невыкупленыя акцыі нашага прадпрыемства за чэкі «Маёмасць» будуць выстаўлены ў Мінску. Гэта робіць дзяржава, паколькі мы не здолелі ва ўстаноўлены тэрмін іх выкупіць. Купіць хто гэтыя акцыі ці не — пакажа час (кошт акцыі складае цяпер 700 000 рублёў). Мы ж хацелі б , каб іх не купілі і далі магчымасць нам паступова іх выкупіць самім. Бо работнікі нашы ў гэтым зацікаўлены.

Два гады запар яны мелі дывідэнды, хай

сабе і невялікія. Думаю, што атрымаюць іх і ў 1997 г. (тэрмін іх выдачы перанесены на снежань у сувязі са складаным фінансавым становішчам прадпрыемства). Нашы акцыянеры падтрымліваюць праўленне таварыства, якое лічыць, што пакуль нельга накіроўваць на дывідэнды больш чым 5 працэнтаў ад прыбытку. Па-першае, усё роўна большая сума яго тады пойдзе не калектыву, а па-другое, трэба абнаўляць асноўныя фонды прадпрыемства, якія ўжо моцна знасіліся. Інакш у аб'яднання не будзе будучага. Таму ў апошнія гады ў фонд накаплення ідзе 50 працэнтаў ад прыбытку, а ў фонд спажывання — 40 працэнтаў. У 1994 г., напрыклад, прыбытак у нас склаў 12 мільярдаў 813 мільёнаў рублёў. З іх 495 мільёнаў накіравана на дывідэнды, 56,5 працэнта ад іх у дзяржкаммаёмасць (у 1993 — 83,7 працэнта). Так што дывідэнды яшчэ ў многім залежаць і ад таго, колькі выкуплена акцый.

Стаўшы акцыянерамі, мы пачалі больш эканомна і рацыянальна гаспадарыць. Калі раней, напрыклад, смецце з цэха ДСП мы вывозілі на звалку, то цяпер яго выкарыстоўваем у якасці паліва, не забруджваем навакольнае асяроддзе і значна эканомім газ, які сёння не танны. Вядома, на ўсё гэта былі затрачаны пэўныя сродкі. Але ж яны ўжо акупіліся.

У мэтах эканоміі энергарэсурсаў пачалі будаўніцтва і камплектацыю кацельні «ВОТ» для цэха ДСП. Здалі ў эксплуатацыю новую помпава-акумулятарную станцыю, якая дасць магчымасць цэху ДСП павысіць якасць выпускаемай прадукцыі.

Павысілася дысцыпліна. І галоўнае, змяніліся адносіны работнікаў да маёмасці. Яны ўсё больш усведамляюць, што гэта цяпер іхняя маёмасць. Устанавілі ліміт на тэлефонныя размовы. І што вы думаеце, калі раней на іх траціл 22 мільёны рублёў, то цяпер — удвая менш.

Кіруе АТ «Івацэвічдрэў» праўленне ў складзе 9 чалавек. Яно працуе на грамадскіх пачатках. Праўленне заключае кантракт з генеральным дырэктарам, які штогод трымае справаздачу на сходзе акцыянераў. Пасяджэнні праўлення праводзяцца не радзей аднаго раза ў квартал, а калі трэба — то і часцей.

Мы ўпэўнены, што за акцыяніраваннем — будучае не толькі нашага прадпрыемства.

Сіла прыроды і моц людская

Ураган, які пранёсся над Беларуссю 23 чэрвеня 1997 г., сваім крылом накрыў і Целяханшчыну. Увечары таго дня шквальны вецер з ліўнем і градам працягваўся каля 45 хвілін. Сам жа ўраган хвілін сем крышыў усё жывое і нежывое — валіў дрэвы, зрываў дахі з пабудоў, развальваў сцены дамоў. Тры чалавекі атрымалі траўмы. Пацярпела жывёла. Зазналі бяду 18 населеных пунктаў. Былі разбураны 22 жылыя дачы і сур'ёзна пашкоджаны больш за 2000. Разбураны 8 вытворчых памяшканняў і пашкоджаны 176. Гэта школы, бальніцы, фермы ды іншыя будынкі. Выведзена са строю больш за 100 кіламетраў ліній электраперадач. Стыхія паваліла 106 апор нізкавольтнай і 92 апоры высакавольтнай ліній электраперадач. Пры аднаўленні манцёры налічылі 870 абрываў. У агульнай колькасці завалы на дарогах склалі 136 кіламетраў. Амаль цалкам быў спляжаны лес вакол Целяхан, а гэта прыкладна 800 гектараў. Усяго ж ураган пашкодзіў лес амаль на 12 000 гектараў. Гэта, прыкладна, 400 тысяч кубаметраў. На плошчы больш за 7 тысяч гектараў пацярпелі пасевы і сенажаці.

Для ўзнаўлення разбуранага аднаго толькі шыферу спатрэбілася каля 100 тысяч лістоў, 120 тысяч квадратных метраў рубероіду, 4500 квадратных метраў шкла. Усе страты ад урагана склалі звыш 116 мільярдаў рублёў.

Адразу ж пасля стыхіі пачаліся аднаўленчыя работы. У першыя ж дні пасля ўрагану з розных працоўных калектываў раёна на дапамогу Целяханшчыне прыйшло каля 6000 чалавек, 230 адзінак тэхнікі. З рэспубліканскага бюджэту было выдаткавана больш за 20 мільярдаў рублёў.

І ўжо да 3 ліпеня практычна ўсё жыллё тут было адноўлена, актыўна пачалася работа па рамонце вытворчых памяшканняў, па ўборцы паваленага лесу. Целяханскі лясгас найбольш пацярпеў. На яго прыйшлося больш за 50 працэнтаў усяго паваленага лесу ў рэспубліцы ў

выніку ўрагану. На дапамогу лясгасу прыйшлі сотні людзей з прамысловых і будаўнічых арганізацый суседніх раёнаў, горада Брэста. Да канца ліпеня наступствы стыхіі былі амаль што пераадолены. Хоць зрабіць гэта было нялёгка і няпроста.

Целяханы, якія найбольш пацярпелі на Брэстчыне ад урагану, 28 чэрвеня наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, а таксама прадстаўнікі адміністрацыі Прэзідэнта і ўрада.

На пяты дзень пасля стыхіі пасёлак быў расчышчаны ад завалаў. Адрамантаваны многія дамы. Поўным ходам ішлі работы па аднаўленні ўсяго разбуранага, як сіламі саміх жыхароў, так і тых, хто прыехаў на дапамогу. І толькі асобныя месцы ў Целяханах і ваколіцах (найбольш разбураныя дамы, спляжаны і паламаны лес каля санаторыя «Палессе», перакулены і літаральна скручаны саракатонны вежавы кран на тэрыторыі завода сталярных вырабаў) па-ранейшаму нагадвалі аб страшэннай сіле ўрагану.

Р. Радзюк.

Вызначыліся працай

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

АГЕЙЧЫК Сяргей Пракопавіч, нарадзіўся 17.7.1924 г. у в. Любішчыцы. Удзельнік Айчыннай вайны. У 1947—1954 гг. шафёр будаўнічага ўпраўлення № 10 у Стоўбцах, з 1957 шафёр мостабудаўнічага раёна № 3 у Баранавічах. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г. за паспяховае выкананне плана будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог.

БУКШТА Мікалай Васільевіч, нарадзіўся ў 1931 г. у вёсцы Азярцо Івацэвіцкага раёна. Усё яго жыццё звязана з зямлёю. У дзяцінстве дапамагае бацькам, а пасля іх смерці сам вядзе гаспадарку. У 1948 г. вучыцца на трактарыста і з 1949 г. працуе ў Івацэвіцкай МТС у брыгадзе, якая абслугоўвала калгас імя Жданава, што ў роднай вёсцы. З 1951 г. да 1954 г. служыў у арміі, а, вярнуўшыся дамоў, у 1955 г. зноў працуе трактарыстам у Івацэвіцкай МТС. Пасля рэарганізацыі МТС у РТС вяртаецца трактарыстам у свой калгас. Працуе самаахвярна, уносіць шмат удасканаленняў у сельскагаспадарчую тэхніку.

У 1966 годзе яму прысвойваецца ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы, а ў 1978 г. узнагароджваецца ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. У 1984 г. Букшту М. В. прызначаюць брыгадзірам трактарнай брыгады.

Памёр 15.7.1994 г.

Н. Ждановіч.

САЛЕНІК Канстанцін Паўлавіч, нарадзіўся 30 жніўня 1931 г. у в. Дабрынёва Івацэвіцкага раёна. Да 1951 г. жыў у вёсцы, працаваў у калгасе. Пасля службы ў арміі паехаў на работу ў Мінск, дзе авалодаў спецыяльнасцю шліфавальшчыка, з 1958 г. і да выхаду на пенсію працаваў на заводзе аўтаматычных ліній у Мінску. Ён вынаходнік і рацыяналізатар, настаўнік моладзі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалём «За доблесную працу», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Быў дэпутатам і членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1975—1980). Дэлегат XXV з'езда КПСС і XIX партканферэнцыі.

За працоўныя поспехі ў восьмай пяцігодцы (1965—1970) яму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

В. Мароз.

АРДЭНАНОСЦЫ

Узнагароджаны ордэнам Леніна

БАНДАРЫК Пётр Андрэевіч, брыгадзір калгаса імя Леніна.

БЕЛЫ Іван Пятровіч, старшыня калгаса «Бальшавік».

ВАСІЛЕВІЧ Гаўрыла Васільевіч, брыгадзір калгаса «Бальшавік».

ГАЛОЎЧЫК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1932, з калгаса «Расія».

КАЛАНЧУК Міхаіл Парамонавіч, н. у 1922, каваль калгаса імя Калініна.

КАСПЯРОВІЧ Домна Рыгораўна, н. у 1923, свінарка калгаса «Мілейкі».

КОТАВА Анастасія Іванаўна, звеннявая калгаса «Даманава».

МАРТЫНЕНКА Кацярына Сідараўна, н. у 1926, галоўны аграном калгаса імя Калініна.

МАЛАШЧУК Павел Якаўлевіч, н. у 1935, механізатар калгаса «Расія».

ПЕТРУКОВІЧ Ганна Данілаўна, н. у 1931, даярка калгаса «Расія».

САРОКА Фёдар Васільевіч, намеснік старшыні калгаса «Бальшавік».
СТАСЬ Любоў Фамінічна, н. у 1939, даярка саўгаса «Косава».
ФЯДКОВІЧ Адам Мікалаевіч, н. у 1930, трактарыст калгаса імя Куйбышава.
ЧЫРКА Іван Мікалаевіч, н. у 1940, старшыня калгаса «Расія».
ШЭЛЕСТ Ганна Васільеўна, н. у 1920, даярка калгаса «Савецкая Беларусь».
СУХАНОСІК Алена Іванаўна, н. у 1930, свінарка і палявод калгаса імя Леніна.

К. П. Саленік.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

КАЛГАС «БАЛЬШАВІК»:
БАХУР Іван Іосіфавіч, н. у 1925, брыгадзір паляводчай брыгады.
САЛОМЕНІК Вольга Васільеўна, н. у 1931, звеннявая па ільну.
САЗОНЧЫК Алена Васільеўна, н. у 1932, аграном.
САЗОНЧЫК Васіль Пятровіч, н. у 1932, трактарыст.
СТУПАК Вольга Мікалаеўна, н. у 1938, палявод.
ХАВАНСКІ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1931, шафёр.
ШЭЛЕСТ Іван Георгіевіч, н. у 1929, брыгадзір паляводчай брыгады.

КАЛГАС ІМЯ КАЛІНІНА:
БРЫЧКАЛЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1934, трактарыст.
КОРЗАН Сцяпан Архіпавіч, н. у 1933, трактарыст.
КОРЗАН Іван Іванавіч, н. у 1946, брыгадзір, трактарыст.
БАСАЛАЙ Ніна Карпаўна, н. у 1929, палявод.

КАЛГАС ІМЯ КУЙБЫШАВА:
ДЗЯГЦЯРЫК Павел Адамавіч, н. у 1937, трактарыст.
КРЫЎША Сцяпан Адамавіч, н. у 1930, шафёр.
СТРУНЕЎСКІ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1941, пастух, даглядчык.
СТРУНЕЎСКІ Сяргей Верамеевіч, брыгадзір трактарнай брыгады.
ЯКІМОВІЧ Соф'я Дзмітрыеўна, н. у 1923, свінарка.

КАЛГАС ІМЯ ЛЕНІНА:
БЕЛЫ Рыгор Ільіч, н. у 1923, загадчык свінафермы.
ВАЛОШЧЫК Міхаіл Пятровіч, н. у 1934, трактарыст.
ЖЫВІНЕВІЧ Іван Андрэевіч, н. у 1930, брыгадзір.
САМСАНОВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1948, трактарыст.

КАЛГАС «МІЛЕЙКІ»:
КАСПАРОВІЧ Вера Ільінічна, н. у 1942, даярка.
ЛЯХОВІЧ Пётр Уладзіміравіч, н. у 1934.

КАЛГАС «КОСАВА»:
ГАЛАБУРДА Ганна Паўлаўна, н. у 1932, даярка.
МІГЕЛЬ Алена Антонаўна, н. у 1921, даярка.
ПАТОЦКІ Іван Філімонавіч, н. у 1928, трактарыст.
ЦІТОК Ірына Рыгораўна, н. у 1947, брыгадзір.

САЎГАС «ПЕРАМОГА»:
КРАЎЧЭНЯ Фёкла Іванаўна, н. у 1933, цялятніца.
САЯВЕЦ Пётр Іванавіч, н. у 1935, трактарыст.
ЦІМАШЭВІЧ Рыгор Мікалаевіч, н. у 1939, трактарыст.

КАЛГАС «РАСІЯ»:
ВІКТАРОВІЧ Вольга Раманаўна, н. у 1929, звеннявая.
ГАЛОЎЧЫК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1932, брыгадзір.
ГАЎРУСІК Кацярына Аляксееўна, н. у 1932, свінарка.
ДЗЯГЦЯРЫК Аркадзь Васільевіч, н. у 1937, трактарыст.
КАЗЛОЎСКІ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1935, трактарыст.
ЮРКЕВІЧ Вера Сцяпанаўна, н. у 1920, даярка.
ЮХНІК Максім Зіноўевіч, н. у 1932, трактарыст.
ЮХНІК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1944, трактарыст.

КАЛГАС «РАССВЕТ»:
КАНАНОВІЧ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1939, трактарыст.
ЛАТЫШЭВІЧ Вольга Васільеўна, н. у 1929, цялятніца.
РАБОТНІКІ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ:
КАВЕЦКАЯ Паліна Антонаўна, рэцэптар аптэкі.
ЗАХАРАДЖАН Надзея Рыгораўна, медсястра.

Заслужаныя работнікі Беларусі

ЗАСЛУЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ

АЗАРАВА Надзея Фамінічна, нарадзілася ў 1931 г. у м. Быцень. Завочна скончыла Навагрудскае педвучылішча ў 1953 г. Працоўную дзейнасць пачала з верасня 1949 г. у пачатковай школе в. Рагачы Ляхавіцкага раёна, затым у вёсках Гавенавічы і Заполле Быценскага раёна і ў Быценскай СШ. З 1958 г. да 1993 г. працавала настаўніцай матэматыкі Быценскай школы-інтэрната. Адзначана знакам «Выдатнік народнай асветы БССР» (1962) і юбілейным медалём «За доблесную працу» (1970). Ганаровае званне прысвоена ў 1967 г.

АРЛОВА Ксенія Аляксандраўна, нарадзілася ў 1900 г. у сялянскай сям'і. У 1916 г. скончыла Полацкае епархіяльнае шасцігадовае вучылішча і атрымала званне дамашняй настаўніцы. 21 год працавала ў школах Расонскага раёна. У перыяд вайны была ў эвакуацыі ў Свярдлоўскай вобласці, дзе працавала ў калгасе. Пасля вызвалення Беларусі вярнулася ў разбураны вайною родны край і з 1946 г. стала працаваць настаўніцай пачатковых класаў Косаўскай сярэдняй школы. Праявіла сябе выдатным педагогам. 21 студзеня 1949 г. ёй першай у Івацэвіцкім раёне прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

БАНДАРЭНКА Валянціна Максімаўна, нарадзілася ў 1931 г. У 1961 г. скончыла Брэсцкі педагагічны інстытут. Працавала піянерважатай, выхавальніцай Целяханскага дзіцячага дома, а з 1955 г. і да выхаду на пенсію ў 1987 г. — настаўніцай біялогіі ў Аброўскай, Крайскай, Целяханскай СШ. Апошнія 20 гадоў — у Целяханскай школе-інтэрнаце. У 1971 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР».

БАРКОЎСКАЯ Галіна Францаўна, нарадзілася ў 1924 г. у сялянскай сям'і на Віцебшчыне. У 1939 г. скончыла сямігодку і паступіла ў педвучылішча, два курсы якога скончыла амаль перад вайной. У вайну жыла ў сваякоў у роднай вёсцы, а пасля выгнання фашыстаў і заканчэння ў 1944 г. курсаў удасканалення пайшла працаваць настаўніцай пачатковых класаў. У снежні паступіла на трэці курс Мінскага педвучылішча, пасля заканчэння якога была накіравана ў Івацэвіцкі раён, дзе працавала настаўніцай пачатковых класаў спачатку ў Запалянскай і Яглевіцкай, а з 1953 г. і да выхаду на пенсію — у Верашкоўскай школе. За выдатную педагагічную працу ўзнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы БССР» (1955), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1958), ордэнам «Знак Пашаны» (1971). У 1972 г. ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

БАШЧУК (САМУСІК) Антаніна Васільеўна, нарадзілася ў 1931 г. у в. Быцень у сялянскай сям'і. Скончыла Брэсцкі педагагічны інстытут (1955). Працавала настаўніцай беларускай мовы ў СШ № 16 г. Брэста да 1997 г. З 1964 г. загадвала школьным музеем народнай славы і кіравала групай «Пошук». Званне прысвоена ў 1980. Жыве ў в. Быцень.

ГРЫНЧЫК Антаніна Антонаўна, нарадзілася ў 1930 г. у вёсцы Зарэчча Івацэвіцкага раёна. Пасля заканчэння з медалём Быценскай СШ і Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1954) працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў школах Івацэвіцкага раёна. Праявіла сябе як сапраўдны майстар педагагічнай справы. 22 сакавіка 1968 г. ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

ДЗЕНІСЮК Вольга Міхайлаўна, нарадзілася ў 1929 г. Працавала настаўніцай пачатковых класаў у Івацэвіцкай СШ № 1. Старалася даць вучням добрыя веды і дабівалася выдатных вынікаў. Клас яе быў заўсёды арганізаваным, дзеці цягнуліся да ведаў.

МАЛЫШКА Аляксандр Міхайлавіч, пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (1954) да выхаду на пенсію ў 1988 г. працаваў настаўнікам замежнай мовы Дабромысленскай СШ Івацэвіцкага раёна. За 34 гады педагагічнай дзейнасці праявіў выдатныя здольнасці ў навучанні і выхаванні дзяцей. У 1967 г. яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

МІНЧУКОВА Лідзія Пятроўна, нарадзілася ў 1928 г. на Магілёўшчыне. З 1946 г. да 1949 г. вучылася ў Барысаўскім рускім педвучылішчы, пасля заканчэння якога была накіравана ў Івацэвіцкі раён. Першы год працавала настаўніцай Бялавіцкай пачатковай школы, затым год у Сенькавіцкай сямігодцы, а з 1951 г. і да выхаду на пенсію ў 1988 г. — загад-

чыцай Руднянскай пачатковай школы. У 1960 г. была дэлегатам з'езда настаўнікаў Беларусі. Мае рад дзяржаўных узнагарод. Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» ёй прысвоена 1 кастрычніка 1976 г.

КАПУСТА Іван Васільевіч, нарадзіўся 7 красавіка 1924 г. у в. Боханы Стаўбцоўскага раёна. Перад пачаткам вайны скончыў сярэднюю школу. У перыяд нямецкай акупацыі быў сувязным партызанскага атрада «Мсцівец», пасля вызвалення ваяваў на фронце. Дзень Перамогі сустрэў у Берліне. Узнагароджаны медалём «За адвагу». У 1950 г. скончыў Мінскі інстытут фізкультуры і стаў працаваць у Быценскай СШ, адкуль і пайшоў на пенсію. Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства асветы БССР, знакам «Выдатнік народнай асветы БССР», «Выдатнік фізічнай культуры БССР». У 1974 г. яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

ПАПОВА Кацярына Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1922 г. Працоўную дзейнасць пачала ў 15 гадоў справаводам школы. З 1943 г. працавала ў партыйных арганізацыях КПБ на розных пасадах. Завочна закончыла Мінскі педагагічны інстытут і накіравана дырэктарам СШ № 1 г. Івацэвічы. Праявіла арганізатарскія здольнасці, выкладала гісторыю і грамадазнаўства. У 1968 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

САГАНОВІЧ Мікалай Давыдавіч, нарадзіўся ў 1929 г. у в. Турная, дзе скончыў пачатковую школу, затым у 1951 г. — Целяханскую СШ. З 1951 г. да 1961 г. вучыўся завочна ў Брэсцкім настаўніцкім, затым педагагічным інстытуце на факультэце матэматыкі. У 1952—1989 гг. працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара Целяханскай СШ.

ТАМАРАВА Ніна Мітрафанаўна, нарадзілася 26 красавіка 1926 г. У 1947 г. закончыла Пінскі настаўніцкі інстытут, а затым завочна ў 1953 г. Магілёўскі педагагічны інстытут. Усё сваё жыццё прысвяціла школе. Дзесяць гадоў (1947—1957) вучыла дзяцей геаграфіі ў Парэчскай СШ Пінскага раёна, затым да 1961 г. працавала дырэктарам Табульскай сямігодкі на Піншчыне, а з 1961 г. да 1994 г. працавала ў Целяханскай школе-інтэрнаце намеснікам дырэктара, дырэктарам, настаўнікам геаграфіі.

Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны», юбілейным

Н. Ф. Азарава.

Г. Ф. Баркоўская.

В. М. Бандарэнка.

А. В. Башчук.

А. А. Грынчык.

А. М. Малышка.

Л. П. Мінчукова.

І. В. Капуста.

М. Д. Сагановіч.

Н. М. Тамарава.

М. Ф. Харэвіна.

Я. Д. Янчанка.

медалём «За доблесную працу», знакам «Выдатнік народнай асветы БССР». Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1976 г.

ХАРЭВІНА (ЛЕВАНОВІЧ) Марыя Фёдараўна, нарадзілася ў 1924 г. у в. Юшкі Мсціслаўскага раёна. У 1941 г. скончыла Мсціслаўскае педвучылішча. Пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі з кастрычніка 1943 г. да канца 1944 г. працавала настаўніцай пачатковых класаў Мазалоўскай школы свайго раёна. У 1945 г. накіравана на работу ў Івацэвіцкі раён. Год працавала настаўніцай Юкевіцкай пачатковай школы. З 1946 г. назначана загадчыцай Грыўдзенскай пачатковай школы, дзе правучыла дзяцей 33 гады. Акрамя педагагічнай работы вяла вялікую грамадскую дзейнасць. У 1966 г. ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

ЦЫРКУНОВА (БАТАЛКА) Таццяна Якаўлеўна, нарадзілася ў 1923 г. на Віцебшчыне. Пасля заканчэння ў 1940 г. Бешанковіцкай СШ паступіла ў Ленінградскі дзяржаўны інстытут імя Герцэна на прыродазнаўча-геаграфічны факультэт. Вайна перарвала вучобу. Пасля заканчэння вайны ў 1945 г. пайшла працаваць у школу і вучылася завочна ў тым жа інстытуце. Да 1956 г. працавала ў школах Бешанковіцкага раёна, а потым была накіравана настаўніцай хіміі і біялогіі ў Целяханскую сярэднюю школу, дзе працавала да выхаду на пенсію ў 1978 г. 2 кастрычніка 1970 г. ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

ЦЯРЭШКА Мікалай Платонавіч, нарадзіўся 15 лістапада 1928 г. у в. Тухноўка Стаўбцоўскага павета Навагрудскага ваяводства ў сялянскай сям'і. У 1944 г. паступіў у Нясвіжскае педагагічнае вучылішча, якое закончыў у 1947 г. на выдатна і быў рэкамендаваны на вучобу ў Мінскі педагагічны інстытут, які скончыў у 1951 г. Увесь час пасля вучобы працаваў у школах і органах народнай адукацыі Брэсцкай вобласці. З 1967 г. да выхаду на пенсію ў 1994 г. працаваў у Івацэвіцкім раёне — загадчыкам райана, дырэктарам СШ № 2 г. Івацэвічы, настаўнікам. У 1994 г. яму назначана пенсія за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь. Узнагароджаны дзвюма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалём «За працоўную доблесць»; ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г.

ЯНЧАНКА Якаў Дзмітрыевіч, нарадзіўся 6 кастрычніка 1923 г. на Магілёўшчыне ў маленькай вёсачцы Клоў. У тых краях скончыў сярэднюю школу, а праз два дні пачалася вайна. Капаў акопы, адыходзіў на ўсход, дзе быў залічаны ў армію ў кавалерыю. Упершыню ў баях удзельнічаў у коннай арміі генерала Бялова. Быў паранены, папаў у шпіталь, адтуль у кавалерыйскае вучылішча, з якога малодшым лейтэнантам у кастрычніку 1942 г. папаў пад Сталінград — камандаваў узводам палкавой разведкі, кавалерыйскім эскадронам. 11 чэрвеня 1943 г. у баі страціў кісць правай рукі.

Пасля вайны скончыў Казанскі універсітэт і прыехаў працаваць у родную Беларусь. Працаваў настаўнікам, завучам у школах Шарашова і Івацэвіч, а з 1954 г. да 1979 г. дырэктарам Косаўскай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За доблесную працу» і іншымі. Яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

* * *

ВІКТАРОВІЧ Аляксандр Раманавіч, нарадзіўся ў 1925 г., удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, з 1945 г. да 1963 г. працаваў раймеліратарам пры Целяханскім і Лагішынскім райвыканкомах, а з 1963 г. да выхаду на пенсію — тэхнікам-гідратэхнікам, прарабам участка, майстрам-гідратэхнікам. Усё сваё жыццё прысвяціў меліярацыі і ўнёс важкі ўклад у асваенне тарфяна-балотных масіваў на Целяханшчыне. Мае шматлікія ўзнагароды. Яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны меліяратар БССР».

КАВЕЦКАЯ Паліна Антонаўна, нарадзілася ў 1918 г. у в. Прудкі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны работнік аховы здароўя БССР (1972). У Вялікую Айчынную вайну адна з актыўных удзельніц Круглянскай дыверсійна-падпольнай групы пад кіраўніцтвам П. С. Новікава. Са снежня 1943 г. партызанка атрада № 8 Круглянскай ваенна-аператыўнай групы Магілёўскай вобласці. Зрабіла значны ўклад у медыцынскае абслугоўванне Івацэвіцкага раёна. Працавала з 1957 г. загадчыцай цэнтральнай раённай аптэкі. Пры яе актыўным удзеле пабудаваны сучасныя будынкі аптэк у г. Івацэвічы, Косава, г. п. Целяханы, в. Святая Воля. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, баявыя ўзнагароды — медаль «За адвагу» і ордэн Айчыннай вайны II ступені.

В. Касько.

КАЛАНЧУК Міхаіл Парамонавіч, нарадзіўся ў 1922 г. у в. Святая Воля Івацэвіцкага раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1943 г. да ліпеня 1944 г. змагаўся ў партызанскім атрадзе імя Баруцкага брыгады імя Куйбышава, а пасля вызвалення раёна — на фронце ў радах дзеючай арміі. Быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі». Пасля вайны больш за 22 гады працаваў кавалём у калгасе імя Калініна. Праца яго адзначана ордэнам «Знак пашаны», медалём «За доблесную працу», яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР».

КОРЗАН Надзея Апанасаўна, нарадзілася 25 снежня 1921 г. у сялянскай сям'і в. Галабалаўка на Магілёўшчыне. У 1935 г. скончыла сямігодку, а ў 1938 г. сярэднюю школу і паступіла ў Віцебскі медыцынскі інстытут. У 1941 г. вайна перарвала вучобу, і толькі ў 1944 г. дзяўчына яе аднавіла ў Мінскім медыцынскім інстытуце. У 1946 г. накіравана на работу ў Целяханскі раён загадчыкам Святавольскага ўрачэбнага ўчастка, які затым стаў участковай бальніцай. Дзякуючы яе намаганням у Святой Волі пабудавана бальніца, галоўным урачом якой была яна ўвесь час. Як сельскі ўрач працавала вельмі многа па ўсіх напрамках медыцынскай практыкі, таму праходзіла розныя перападрыхтоўчыя курсы па тэрапіі, акушэрству і іншых напрамках урачэбнай дзейнасці. У 1960 г. Корзан Надзея Апанасаўна ўдастоена ганаровага звання «Заслужаны ўрач БССР».

П. А. Кавецкая.

М. П. Каланчук.

Н. А. Корзан.

Р. В. Рак.

РАК Раіса Васільеўна, нарадзілася 2 лютага 1934 г. у г. п. Целяханы. У 1950 г. прыйшла працаваць на Целяханскую хлебапякарню і прарабіла там да 1990 г., апошнія 30 гадоў — майстрам змены. У 1970 г. узнагароджана медалём «За доблесную працу», а ў 1974 г. — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1978 г. ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік прамысловасці БССР».

С. П. Саўчук.

У. М. Талкачоў.

САЎЧУК Софія Пятроўна, нарадзілася ў 1932 г. у в. Жытлін Івацэвіцкага раёна ў сялянскай сям'і. Страціла бацьку ў 1939 г. — быў рэпрэсіраваны, а сям'ю (маці, яе і сястру 4 гадоў) у 1940 г. выслалі ў Архангельскую вобласць. У 1946 г. разам са ссыльнымі палякамі былі вывезены ў Польшчу. Але родная кроў перамагла, і яны вярнуліся ў сваю вёску. Жылі ў чужых людзей. Софія пасвіла жывёлу, зарабляла на хлеб. Купілі хатку ў Зыбайлах, дзе ў 1951 г. арганізаваўся калгас, у ім працавалі. У 1954 г. у Івацэвічах пачалі будаваць пякарню. Сюды дзяўчына і прыйшла на работу. Стала будаўніком, з 1958 г. — у Міжкалгасбудзе. З кельмай у руках узводзіла шматлікія будынкі, вучылася майстэрству. Прызначылі брыгадзірам. Яе невялікі калектыў адзначаўся прэміямі, граматамі. Софія Пятроўна ўзнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1974), медалём «За доблесную працу» (1970). Прысвоена званне «Майстар залатыя рукі» (1968). У 1974 г. удастоена ганаровага звання «Заслужаны будаўнік БССР». У 1977 г. выбіралася членам Белсаўпрофа.

В. Мароз.

ТАЛКАЧОЎ Уладзімір Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1918 г. у в. Ветухны Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння ў 1934 г. сямігодкі паступіў на фельчарскае аддзяленне Магілёўскага медпалітэхнікума, скончыўшы які паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут. Пасля двух курсаў прызвалі ў армію. Вайна застала ў г. Ліда, дзе служыў фельчарам у ваенным шпіталі. Папаў у палон, з якога ў маі 1942 г. уцёк і дабраўся ў родныя краі, дзе стаў партызанам, начальнікам санітарнай службы атрада імя Сільніцкага, з якім восенню 1943 г. аказаўся ў Косаўскім раёне. Пасля вызвалення з 25 ліпеня 1944 г. працаваў санітарным урачом, загадчыкам амбулаторыі, а з 1948 г., пасля заканчэння медыцынскага інстытута, галоўным урачом Косаўскай бальніцы. У 1978 г. выйшаў на пенсію, але працягваў працаваць да 1990 г. У 1968 г. яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны ўрач БССР».

Нашы славутыя землякі

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

Мікола Грынчык

Грынчык Мікалай Міхайлавіч нарадзіўся 1.8.1923 г. у вёсцы Быцень Івацэвіцкага раёна ў сялянскай сям'і. З сакавіка 1943 г. — агентурны разведчык партызанскага атрада «Савецкая Беларусь» Брэсцкага злучэння. З ліпеня 1944 г. — у Савецкай Арміі, на фронце. Быў цяжка паранены. Пасля вайны працаваў загадчыкам Быценскага раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння. У 1952 г. скончыў літаратурны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута. Настаўнічаў на Гродзеншчыне. Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР у 1957 г., затым — навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. З 1970 г. — загадчык кафедры беларускай літаратуры Гомельскага універсітэта. Адначасова ў 1973—1985 гг. — галоўны рэдактар рэспубліканскага міжведамаснага зборніка «Беларуская літаратура». З 1980 г. — загадчык кафедры літаратуры Мінскага інстытута культуры. Доктар філалагічных навук. Прафесар. Член СП Беларусі з 1971 г. Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1977). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Выступае як крытык і літаратуразнавец з 1957 г. Аўтар манаграфій «Максім Багдановіч і народная паэзія» (1963), «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» (1969), «Шляхі беларускага вершаскладання» (1973), крытыка-біяграфічнага нарыса «Аркадзь Куляшоў»

(1964), адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1966), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977), падручнікаў для студэнтаў філфака пединстытутаў «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры 1917—1940 гг.» (1981), «Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст.» (1982) і «Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд». (1985). Жыве ў Мінску.

В. Мароз.

М. М. Грынчык.

З аўтабіяграфіі Міколы Грынчыка

Нарадзіўся я 1 жніўня 1923 г. у Быцені ў вялікай па тым часе патрыярхальнай сям'і (усяго было 11 душ, а зямлі — 2,2 гектара). Жылося, хоць і не заўсёды сытна, але затое весела, цікава, дружна. Пасля трэцяга вясельля засталіся без каровы — прыйшлося мне па свіць малое цялятка, пакуль выгадавалі з яе маладую кароўку Лысуху.

Пачатковую адукацыю атрымаў у польскай школе — вучоба ў чужой акупацыйнай школе была нуднай, нецікавай, цяжкай. Прыход нашых у верасні 1939 г. віталі ўсе з радасцю, не ведаючы, што гэта быў па сутнасці пачатак другой сусветнай вайны. Гэтыя два няпоўныя гады вучыўся ў Слонімскай беларускай школе № 1, а затым перавёўся ў Косаўскую сярэднюю школу (там жыла мая цётка Марыя). 19 чэрвеня 1941 г. праводзілі свайго дырэктара ў артылерыйскі полк, які стаяў у Мерачоўшчыне ў замку Пуслоўскіх. 22 чэрвеня 1941 г. у 12.00 дня я паспеў завезці свайму дзяцьку Паўлу Ануфрыевічу Філіповічу бохан хлеба і кавалак сала ў той жа замак. Полк разгортваўся ў баявы паход супраць танкаў Гудэрыяна пад Бярозай Картузскай. З-пад Бярозы дзядзька Паўлуша выйшаў жывым, а загінуў пазней ва Усходняй Прусіі пры абароне штаба генерала Чарняхоўскага.

Партызанская барацьба, актыўнае супраціўленне ворагу на Брэстчыне, асабліва ў Белавежскай і Ружанскай пушчах, разгарнулася з першых дзён вайны — салдаты-акружэнцы пачалі змагацца задоўга да афіцыйных дырэктыў — гэта быў часта стыхійны патрыятычны рух, абуджаны сваёй нацыянальнай свядомасцю, сваім асабістым гонарам чалавека і грамадзяніна. Да адной з іх (груп) прымкнуў я восенню 1942 г., выконваў яе даручэнні па зборы трафейнай зброі на берагах Шчары, зборы інфармацыі, агітацыйнай рабоце сярод насельніцтва. У яе складзе былі жыхары Быцені: І. І. Козел, М. Ц. Макарэвіч, К. А. Макарэвіч, В. І. Козел, І. Ц. Машко. Узначальваў групу Саленік Мікалай Аляксандравіч, які пазней стаў сакратаром раённага антыфашысцкага камітэта. Камандаваннем атрада «Савецкая Беларусь», што дыслацыраваўся ў Воўчых Норах, я быў скіраваны на разведвальную работу і выконваў канкрэтныя баявыя даручэнні па нашай партызанскай зоне (Слонім—Баранавічы—Косава).

Пасля вызвалення ў ліпені 1944 г. быў абраны сакратаром Быценскага сельскага Савета, а затым добраахвотна пайшоў на фронт, баяўся, каб без мяне, без майго ўдзелу не скончылася вайна. Паспеў у час, але пад Варшавай атрымаў цяжкае раненне ў галаву і вярнуўся інвалідам I групы. Асколькі нямецкага «фердынанда» нашу і цяпер у галаве... У канцы 1945 г. працаваў пэўны час загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння Быценскага райвыканкома, затым здаў экстэрнам выпускныя экзамены ў СШ і паступіў на філфак Гродзенскага пединстытута (1948). Пасля заканчэння яго атрымаў рэкамендацыю ў аспірантуру, аднак па матэрыяльных прычынах два гады працаваў у Вяліка-Бераставіцкай СШ Гродзенскай вобласці.

У 1954 г. паступіў у аспірантуру Інстытута літаратуры АН БССР, а ў канцы 1958 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Па матэрыялах дысертацыі ў 1963 г. выйшла манаграфія «М. Багушэвіч і народная паэзія», затым — доктарская «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» (1969)...

А. А. Майсейчык.

С. А. Крываль.

Аляксей Майсейчык

Майсейчык Аляксей Антонавіч нарадзіўся 1.10.1936 г. у вёсцы Гошчава Івацэвіцкага раёна ў беднай сялянскай сям'і. Бацька Антон Данілавіч вярнуўся з Вялікай Айчыннай вайны інвалідам і ў 1948 г. памёр. Выхаваннем дзяцей займалася маці Вольга Мікалаеўна. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1955) паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага педінстытута. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці інстытута, быў рэдактарам факультэцкай газеты. Атрымаўшы дыплом, працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў роднай вёсцы (1960—1962). З 1961 г. намеснік дырэктара Гошчаўскай школы па вытворчаму навучанню, адначасова выкладаў рускую мову і літаратуру ў Няхачаўскай васьмігадовай школе рабочай моладзі. У 1962—1966 гг. вучыўся ў аспірантуры Інстытута літаратуры АН БССР, пасля заканчэння якой накіраваны на кафедру беларускай літаратуры Брэсцкага педінстытута. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Праблемы народнасці ў перыяд станаўлення сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры». Працаваў дэканам філалагічнага факультэта (1975—1980). У 1992 г. яму прысвоена званне прафесара. З чэрвеня 1991 г. загадвае кафедрай беларускай мовы і літаратуры.

Друкавацца А. Майсейчык пачаў з 1961 г. у івацэвіцкай раённай газеце «Зара камунізму». З 1962 г. выступае ў рэспубліканскім друку з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі. Аўтар дапаможнікаў «Уводзіны ў літаратуразнаўства. Практыкум», «Тэорыя літаратуры», адзін з аўтараў падручнікаў «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры (1941—1980)», «Метадыкі выкладання беларускай літаратуры», падручнікаў «Родная літаратура» для 6 і 7 класаў. У сааўтарстве з В. Я. Ляшук ім напісаны метадычныя рэкамендацыі да падручніка «Родная літаратура. 7 клас», складзены зборнік даследчых і крытычных матэрыялаў «Паўлюк Багрым». Настаўнікам роднай літаратуры адрасаваны яго працы «Паэтычныя галасы Брэстчыны» і «З любоўю да вытокаў». Аўтар шэрагу артыкулаў у энцыклапедычных выданнях «Янка Купала», «Беларускія пісьменнікі», «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі», «Максім Багдановіч». У некаторых працах А. А. Майсейчыка асвятляюцца вытокі і рэгіянальныя асаблівасці творчасці пісьменнікаў-землякоў П. Пестрака, С. Крываля, М. Грынчыка, паэтаў А. Гаруна, М. Купрэева, якія пэўны час знаходзіліся на Івацэвіччыне. Жыве ў Брэсце.

В. Ляшук.

Сцяпан Крываль

Крываль Сцяпан Антонавіч нарадзіўся 1.7.1935 г. у в. Гутка Івацэвіцкага раёна ў сялянскай сям'і. Сярэднюю адукацыю атрымаў у школе в. Краі. Пасля службы ў войску (1954—1957) працаваў у той жа школе выкладчыкам дапрызыўнай падрыхтоўкі і фізкультуры (1958—1960). З 1960 г. вучыўся завочна на факультэце журналістыкі БДУ. На 3-м курсе вучобу перапыніў. Быў літсупрацоўнікам маларыцкай раённай газеты «Сцяг Перамогі» (1960—1962), старшым рэдактарам на Брэсцкай тэлестудыі і абласным радыё (1962—1966), карэспандэнтам-арганізатарам Жабінкаўскага радыё (1966—1967), у талачынскай газеце «Сцяг Ільіча» (1968—1969). Працаваў і ў іншых месцах. З 1981 г. на творчай працы.

Друкавацца С. Крываль пачаў у 1961 г. Першае яго апавяданне «Рэвізор» надрукавана ў газеце «Зара» ў 1962 г. Пазней яго пародыі, гумарыстычныя мініяцюры, апавяданні, вершы, байкі з'яўляліся ў часопісах «Вожык», «Маладосць», «Полымя», «Беларусь», газеце «Літаратура і мастацтва» і іншых, гучалі па радыё. Выдаў зборнікі «Аднойчы летам» і «Чмяліная вясна». С. Крываль перакладаў з украінскай і іншых моў. Яго апавяданне «Медаль «За адвагу» было інсцэніравана на тэлебачанні ў 1987 г.

Член СП Беларусі з 1993 г. Жыве ў г. Маларыта Брэсцкай вобласці.

Уладзімір Мароз

Мароз Уладзімір Вікенцьевіч нарадзіўся 11.6.1953 г. у горадзе Косава, у сям'і настаўнікаў. Дзесяцігодку скончыў у вёсцы Даманава. Пасля школы скончыў архітэктурны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1975). Працаваў інжынерам на «Інтэграле», архітэктарам у інстытуце «Мінскпраект», старшым рэдактарам Дзяржкіно БССР. З 1988 г. — вядучы рэдактар студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм».

Скончыў завочна Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага СП СССР (1983). Першыя вершы надрукаваны ў івацэвіцкай раённай газеце «Кастрычнік» у 1978 г. Вершы друкаваліся ў рэспубліканскай перыёдыцы, альманаху «Дзень паэзіі». Аўтар нізкі вершаў «Пяшчотны дотык» у калектыўным зборніку «Крыло» (1984), паэтычных кніг «Голас» (1993) і «Рэй» (1993 г.), эсэ пра Кірылу Тураўскага «Златоуст, паче всех воссиявший» у кнізе «Из тьмы веков светлеющие лики» (1994).

Аўтар сцэнарыяў каля 40 дакументальных, навукова-папулярных і вучэбных кінафільмаў, асноўныя з якіх звернуты да гісторыі і культуры Беларусі: «Кірыла Тураўскі», «Роздум ля палітры», «Уз'яднанне» (1990), «Іван Насовіч», «Філамат Тамаш Зан» (1991), «Беларусь. Свята праваслаўя», «Леў Сапега, канцлер», «Рэха збройнага чыну» (1992), «Браты Ермаловічы», «Успамін пра Міколу Равенскага» (1993), «За брамай забытых мелодый», «Крыж ля дарогі» (1994), «Сымон Будны. Паэма» (1995), «Крэва» (1996).

Член СП Беларусі з 1997 г. Жыве ў Мінску.

ЗНАКІ ГІСТОРЫІ

Аўтабіяграфічнае эсэ Уладзіміра Мароза

Чамусьці мне, ужо пасталеламу, пэўны час здавалася, што я памятаю жалобны дзень смерці Сталіна. Я на руках у мамы, наўкола мноства людзей. У сапраўднасці «бацька народаў» сканаў недзе вясной, а я нарадзіўся 11 чэрвеня таго ж 1953 года. Хутчэй мая дзіцячая карцінка з людствам — гэта з нейкага пазнейшага першамайскага ці кастрычніцкага збору. Але ж сам год — сёння знак гісторыі.

У гарадок Косава бацькі мае Вікенцій Іванавіч і Дзіна Канстанцінаўна трапілі пасля

У. В. Мароз.

Нясвіжскай педагагічнай вучэльні, якую скончылі ў 1948 годзе. Настаўнічалі яны спачатку ў недалёкай вёсачцы Скураты, дзе пабраліся шлюбам. Неўзабаве перабраліся ў самое мястэчка. Маці выкладала беларускую мову і літаратуру ў Косаўскай школе, а бацька працаваў у дзетдоме завучам, пэўны час нават дырэктарам.

Дык вось гэты самы дзетдом — ці не першы мой косаўскі ўспамін. Была ў нас ужо палова хаты побач з ім, былі ў нас са старэйшым амаль на два гады братам Алегам нават нянькі і, натуральна, — ніякіх цяжкасцей у жыцці. Культ асобы выкрываўся пакуль для нашых бацькоў і дзядоў, а нашае маленства цякло нязмушана, як таму і патрэбна быць. Сапраўды маленства, бо пражыў я ў Косаве ад нараджэння роўна сем гадоў. У памяці засталося не так і шмат ад таго часу, толькі самае яркае і адметнае. Памятаю, як з братам і дзетдомаўскімі хлопцамі гулялі на пляцы перад будынкам у лапту, як, хаваючыся, гулялі ў карты. Але самым цікавым было глядзець дыяфільмы ў дзетдоме. Зараз думаецца, ці не адтуль у мяне нечакана потым спраўджаная ў жыцці любоў да светлага экрана ў цёмнай зале?

Маленькая рачулка Мальвінка, што цякла ўнізе за агародамі. Праз яе па кладцы мы хадзілі на горку, дзе быў дзетдомаўскі інтэрнат, каб памыцца ў лазні. Аднойчы, гуляючы, я скінуўся ў гэтую рэчачку, праплыў у бязважкасці пад вадою некаторы час, яшчэ не паспеўшы спалохацца. Галоўнае — з расплюшчанымі вачыма. Дзякаваць Богу, там было неглыбока, так што ўратаваўся сам.

Косаўскі паваенны дзетдом, якога даўно ўжо няма, сёння таксама знак гісторыі. Яшчэ

адзін знак такі стаяў праз брукаваную вуліцу насупраць дзетдома. Касцёл. Ён здаваўся мне высокім, змрочным, непадступным. Мы вельмі любілі лазіць па цвінтары, абыходзіць будыніну з усіх бакоў. Я быў упэўнены, што касцёл увесь час зачынены. Па словах бацькі, гэта было не так, зрэдчас ён працаваў, але памяць не захавала мяне малога ўнутры храма, напэўна, каб не парушыць стан містычнага рамантызму, у якім трымаў касцёл хлапчука сваёй закінутасцю. А недалёка, на ўездзе ў горад, ля брукаванкі стаяла каплічка з абразам Маці Божай, зусім дзіўнае для дзіцяці збудаванне.

Была ў Косаве і царква, уверх па вуліцы, у цэнтры горада. Памятаю, што па нядзелях там было людна, базарны дзень, а вось самой царквы не памятаю. Потым ужо разабраўся, што гэта далёка не лепшы ўзор мураўёўскай архітэктуры, але добра тое, што яна была.

Што тут ля Косава, у Мерачоўшчыне, нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, уведаў значна пазней. Невысокі пагорак, радок камянёў ад былога падмурку, невялічкае дрэўца — глог, чырвоныя ягады, ужо напалову паабсыпаныя на зямлю. Ляжаць, нібыта кропелькі крыві. Асоба сусветнага маштабу — і твой зямляк.

А вось палац побач на горцы — казка дзяцінства. Ён зачароўваў сваім нязвыклым выглядам, таямнічасцю, закінутасцю, напаўразбуранасцю. Пабудаваў яго ў 1838 годзе беларускі шляхціц граф Войцэх Пуслоўскі. Дасталося палацу пад час першай сусветнай вайны, а пасля другой — засталіся адны сцены. Сядзіба Касцюшкі таксама згарэла.

Яшчэ больш маляўнічыя руіны ўяўляў сабою палац Сапегаў у Ружанах, не такіх далёкіх ад Косава. Там працавалі знаёмыя бацькоў. Лёс палаца аналагічны косаўскаму, дабіты дашчэнту быў у апошнюю вайну. І ўсё ж нават гэтыя руіны трымалі даўнюю веліч палаца, асабліва паўкруглыя аркады, што ўводзілі ў рытм нейкага ўрачыстага бальнага танца. З асобаю заснавальніка палаца, нашага знакамітага Льва Іванавіча Сапегі, я пазнаёмлюся значна пазней, нават зраблю пра яго дакументальны фільм.

Наогул з месцамі нараджэння мне пашанцавала. Кажу «месцамі», таму што з груднога ўзросту мы з братам кожнае лета, а то і ў іншы час, гадаваліся то ў адной бабы, то ў другой. Бацькі вучыліся завочна ва універсітэце і, прыкладам, на сесію ну аніяк не маглі ўзяць нас у Мінск. Мама мая родам з Мікалаеўшчыны, а папа — з вёскі Цякалаўшчына, што кіламетраў за чатырнаццаць ад Нясвіжа.

Так і атрымлівалася: Касцюшка — зямляк, найбліжэйшы зямляк і Якуб Колас. Мікалаеўцы патрыятычна лічаць, што нарадзіўся наш вялікі пясняр якраз тут, а не ў недалёкіх Акінчыцах, як прынята лічыць афіцыйна. Хаця гэта ўжо зусім не прынцыпова. Да таго ж і дзявочае прозвішча маці — Міцкевіч. Да Нясвіжа таксама каментарыі не патрэбны — пра Радзівілаў чулі ўсе.

У Мікалаеўшчыне на самым высокім пагорку над Нёманам, як тое і павінна быць, стаяла прыгожая драўляная царква. Ажно сем купалаў узлятала ў неба, царковішча было з мяккай зялёнай муравою і высокімі дрэвамі. Мая баба Маня, Марыя Антонаўна, спявала ў царкоўным хоры, брала мяне на набажэнствы. З таго часу засталося адчуванне спакою, цеплыні, дабрыні, лагоды. І гэта якраз уражанне маленства да сямі гадоў, бо недзе напрыканцы 60-х камуністы царкву разбурылі. Ужо студэнтам-архітэктарам па просьбе бабы Мані я зрабіў малюнак царквы з фотаздымка, пяром і тушшу на даволі вялікім аркушы ватмана. Добрая памяць засталася, але малюнак знік у пажары, калі бабіна хата гарэла.

Хрысціў нас з братам малым святар той мікалаеўскай царквы. Баба клікала яго, адбывалася гэта дома, да таго ж і ў адсутнасць нашых бацоў. Каб ніхто не ведаў. Думаю, што тата і мама мае сапраўды да пары не ведалі, а потым не гаварылі. Такі час. А мне баба Маня сказала, што я хрышчаны, бадай ужо ў студэнцкія гады.

А Нясвіж! Суцэльныя знакі гісторыі, нібы трапляеш у іншы свет. Гандлёвыя рады з ратушай на плошчы, Слуцкая брама, фарны касцёл, нарэшце, сам замак Радзівілаў на выспе, абкружанай непераходным ровам. Мост да ўязной брамы быў калісьці пад'ёмным. Старадаўні парк, які так і веяў рамантызмам, паэзіяй. Велізарныя штучныя вадаёмы наўкола парку і палаца. Усё гэта, праўда, было ў даволі дагледжаным выглядзе.

А вось Мірскі замак стаяў напаўразбураным. Але затое веліч якая, магутнасць, грунтоўнасць. Адчувалася, што тут сапраўды можна

схавацца ад ворагаў, абараніцца. Як хацелася лазіць па гэтых мурах, вежах. Зразумела, гісторыі сваёй айчыны ад дзяцінства мы не ведалі, але такімі вось знакамі сваімі ўваходзіла яна ў свядомасць і падсвядомасць, выклікала неакрэсленыя пачуцці, што людзі жылі на гэтай зямлі спрадвеку.

Але вернемся ў Косава. Там яшчэ паспеў нарадзіцца трэці сын у сям'і, мой малодшы брат Коля. Летам 60-га мы пераехалі ў вёску Даманава таго ж Івацэвіцкага раёна. Тут я пайшоў у першы клас, тут жа правучыўся ўсе дзесяць гадоў. Бацька працаваў завучам у школе, мама настаўніцай. Жылі мы гадоў восем проста ў будынку школы, мелі два пакойчыкі і кухню. Таму можна сказаць, што я не толькі вучыўся, але і вырас у школе. У Даманаве ў маё жыццё ўвайшла чыгунка, якая праходзіла метраў за сто ад школы. Пасля ціхага Косава, які месціўся крыху наўзбоч магістральных шляхоў, тыдні са два, а то і месяц заснуць на новым месцы было вельмі цяжка. Здавалася, што літаральна ля вуха грукочуць начныя цягнікі, што імчаць з Масквы некуды ў Еўропу. Станцыя была крыху воддаль, а ля школы ўздоўж чыгункі ішла рампа, разгружалі розныя грузы. Былі моманты разгрузкі нечага незразумелага і ноччу. Салдаты ачаплялі прылеглую тэрыторыю, людзей не прапускалі. Стаяў грукат, раўлі маторы магутных ваенных машын. А ўсё было проста — разгружалі ядзерныя ракеты, а найчасцей паліва для іх, везлі потым па Дражэнскай дарозе ў лес, у Воўчыя Норы, дзе была ядзерная база. Радыяцыя з-за ўсяго гэтага ў Даманаве і ў бліжэйшых Каханове ды Гнойным была павышаная. Але хто калі яе мераў? Вядома пра павышаны фон стала толькі пасля Чарнобыля, тут знайшлі пляму. Нават і тады не сказалі, што катастрофа на атамнай станцыі да гэтай плямы адносінаў не мае.

Дзякаваць Богу, сёння гэтай ядзернай базы тут няма. Як няма іх і наогул у Беларусі, павывозілі ўсе ракеты ў Расію, ачысцілі нарэшце самую нашпігаваную ядзернай зброяй рэспубліку. Прытым маецца на ўвазе, што не толькі ў былым Саюзе, але і нідзе ў Еўропе такой колькасці ракет, як у Беларусі, не было. Няхай гэтыя закінутыя цяпер базы назаўсёды застануцца знакамі гісторыі.

З часам сталення чыгунка ўсё больш клікала ў шлях, вабіла абяцаннем новых краёў і земляў, новых уражанняў. Пасля ў жыцці хапіла дарог і вандровак, а зараз была проста вучоба ў школе, кнігі, гульні, догляд самага малодшага брата Ігара, які нарадзіўся ў Даманаве.

Апроч чыгункі і ядзернай базы, іншых фармальных знакаў гісторыі ў вёсцы не было. Ды і саму гісторыю Беларусі ў школе практычна не вучылі. Аднак усё роўна яна не пакідала ў спакоі, нагадвала пра сябе часам незвычайным чынам. Школьнікамі ці не кожны год мы хадзілі на буракі, моркву ці бульбу на Пагоню. Чаму так называлася гэтае асушанае тарфяное балота, я тады не ведаў, што Пагоня — старажытны беларускі герб, але слова прыцягвала сваёй прыхаванай эмацыянальнай сілай, заварожвала. Пагоня!..

Пазней, ужо ў перабудовачныя часы, калі пачалі прадаваць дробнамаштабныя дакладныя ваенныя карты, я ўбачыў (карта «Слонім»), што балота Пагоня — вялізны абшар, які ідзе ад Даманава на паўднёвы ўсход да Выганаўскага возера. У другі бок, на паўночны захад і на захад ад Даманава — лес Літва. Так і напісана: «лес Літва». Стала ўсё зразумелым — гэта і ёсць паўднёвая мяжа той летапіснай Літвы, акрэсленай нашым гісторыкам Міколай Ермаловічам. Толькі яшчэ больш на поўдзень ад Слоніма. Што тычыцца ўласна майго Івацэвіцкага раёна, то яго ўмоўна дзеліць уяўная мяжа — тут ліцвіны, а тут ужо палешукі, пачатак Палесся. Прыслухайцеся — і сёння ёсць адбітак у гаворках.

Уся гэтая гісторыя з геаграфіяй яшчэ раз асабіста мяне ўпэўніла, што старажытная Літва была тут, практычна ў цэнтры беларускіх земляў, адсюль, ад ліцвінаў, пачыналася Вялікае княства Літоўскае, наша старабеларуская дзяржава.

Апошнім, ужо свядомым штуршком да выбару прафесійнага шляху пасля школы быў набор паштовак з выявамі помнікаў дойлідства. Нешта, як відаць з папярэдняга аповеду, я ўжо бачыў на свае вочы, астатняе толькі на гэтых картках. Рамантызм занядбання, але разам з тым прыгажосці і велічы нараджаў жаданне самому пабудаваць хоць калі такое ж прыгожае і каб на вякі. Я вырашыў стаць архітэктарам. Напэўна, перадумовы для гэтага былі — нядрэнна маляваў. З другога боку, на пачатку дзевятага класа я стаў весці дзённік,

вольны запіс сваіх думак даваў мне вялікае задавальненне.

На жаль, тыя тры тоўстыя агульныя сшыткі школьных запісаў згарэлі з хатай у Мікалаеўшчыне, студэнтам я іх хаваў там. А як цікава было б сёння сустрэцца з сабою 16—17-гадовым!

Спрабаваў я пісаць і вершы. Для поўнай карціны засталося дадаць, што скончыў яшчэ і музычную школу ў Івацэвічах па класу баяна. А Даманаўскую дзесяцігодку закончыў з залатым медалём.

Зрэшты, планы мае так і спраўдзіліся — скончыў архітэктурны факультэт БПІ і стаў архітэктарам, працаваў у праектным інстытуце. Праўда, праз два гады паступіў на завочнае аддзяленне Літаратурнага інстытута ў Маскве, літаратура пакрысе перамагла. Таму на заканчэнне гэтага інстытута я ўжо працаваў рэдактарам у Дзяржкіно БССР. Паварот да кіно бачыўся на той час выпадковым, але сёння ўсё выглядае інакш, думаецца, што мая праца рэдактарам студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» (пасля Дзяржкіно) — заканамернае ўвасабленне ў кінавобразах тых знакаў гісторыі, што ўвайшлі ў свядомасць з дзяцінства. Перадусім маю тут на ўвазе аўтарскую работу — практычна ўсе мае сцэнарыі дакументальных фільмаў звернуты да гісторыі Беларусі. Ды і вершы ў большасці сваёй таксама неад'емныя ад гэтага.

Паглядзіце наўкола — і вы самі знойдзеце шмат знакаў гісторыі, толькі трэба ўспомніць, што мы беларусы, і адкрыць душу. І тады адчуеце непарыўную повязь падзей, часоў і людзей, тады адчуеце сапраўдную адказнасць за нашу дзяржаву, за мінулае і будучыню цудоўнага куточка зямлі, які завецца Беларуссю.

З вершаў Уладзіміра Мароза

ЗГАДКІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Час у руху зваротным кране —
На шалёным сарвешся адхоне.
Як свайго, сустракае мяне
Лес Літва і балота Пагоня*.

Я папраўдзе тутэйшы і свой,
Я на гэтай зямлі нарадзіўся,
Дзе мой продак збіраўся на бой,
На каня варанога садзіўся.

Гэта тут, ты вакол паглядзі:
Як ад Шчары — на захад і поўдзень.
Лес такі, што загінеш адзін,
А балота — не згледзіш, не пройдзеш.

Падзяляе іх Грыўда-рака,
Каля Гнойнага ў Шчару ўпадае.
З похваў меч вынімае рука,
За дзяржальна без страху трымае.

У Заводны заблытаны Лес
Воі коней нястомных заводзяць.
Старажоўшчына знак падае,
Калі вораг знянацку прыходзіць.

А прыпрэцца на голаў сваю —
У Магіліцах знойдзе магілу.
За свабоду адчайна ваюй,
На ахвярнік кладзі сваю сілу.

Занатуе трывожная вязь,
Камень скажа, што ўрос ва ўзбярэжжа.
Гэта Выгані-возера князь
Гнаў пагоняй чужынцаў за межы.

Кроплі поту і кроплі расы,
Слёзы смутку, вясёлка над светам.
Я літвін-беларус, волі сын —
Волька-вольная сведчыць аб гэтым.

Перамога ў надзейных руках,
Прагне любасці ўзброены вершнік.
Дык вяртайся хутчэй пад свой дах
У Загор'е, Залессе, Заверш'е.

Ці на баль да Сапегі патрап
У палац у Ружанах шыкоўны,
Дзе аркада прытупвае ў такт,
Пераможныя келіхі поўны.

А ў Жыровічах клічуць званы
За Айчыну малітву прынесці.
Звоняць поклічна й сёння яны,
Будзяць памяць сваім Дабравесцем.

Мо і сыдзе на нас Дабрадаць,
І пачуемся ўрэшце народам.
Больш не будзем у скрусе пытаць:
Хто мы, што мы, адкуль будзем родам.

* Геаграфічныя назвы ў Івацэвіцкім і Слонімскім раёнах.

Яраслаў Пархута

Пархута Яраслаў Сільвестравіч, нарадзіўся 8.3.1930 г. у вёсцы Мілейкі Івацэвіцкага раёна ў сялянскай сям'і. У 1949 г. скончыў Ружанскую сярэднюю школу і паступіў на аддзяленне журналістыкі філфака БДУ. З трэцяга курса ў сувязі з цяжкімі матэрыяльнымі ўмовамі перайшоў на працу. З 1952 г. працаваў уласным карэспандэнтам газеты «Сталинская молодежь», адказным сакратаром палітаддзелаўскай газеты «Сцяг камунізма» пры Поразаўскай МТС. У 1953—1956 гг. служыў у Савецкай Арміі. З 1956 г. літаратурны супрацоўнік, загадчык аддзела поразаўскай раённай газеты «Ленінскі шлях», з 1959 г. намеснік рэдактара ружанскай раённай газеты «Запаветы Леніна», з 1961 г. рэдактар гарадзішчанскай раённай газеты «Советская Родина», з 1962 г. намеснік рэдактара, загадчык аддзела міжраённай газеты «Знамя коммунизма» (г. Баранавічы). У 1965 г. старшы рэдактар студыі тэлебачання (г. Брэст), у 1965—1969 гг. загадчык аддзела, намеснік рэдактара маларыцкай раённай газеты «Сельскае жыццё». У 1969—1973 гг. слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы. З 1973 г. намеснік рэдактара і рэдактар аддзела часопіса «Вожык», з 1978 г. рэдактар аддзела часопіса «Родная прырода». З 1982 г. на пенсіі. Член СП Беларусі з 1982 г. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага за кнігу «Зямля бацькоў нашых» (1992).

Друкавацца пачаў у 1946 г. у івацэвіцкай раённай газеце «Чырвоная звязда». Першыя вершы апублікаваў у 1949 г. у брэсцкай газеце «Заря». Апавяданні, нарысы, гумарэскі, казкі, лірычныя аповесці, навелы, вершы, краязнаўчыя матэрыялы Я. Пархуты змяшчаліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Вясёлка», «Работніца і сялянка», «Родная прырода» і інш. Аўтар кніг вершаваных казак «Казка зялёнай дубровы», «Перапёлачка», прозы — «Ты пайшла ў сонца», «Мудрая цялушка», «Там, дзе жыве Юлька», «Жаваранак над полем», «Пад высокім сонцам», «Зямля бацькоў нашых», «Дарогамі надзеі і трывог». Яму належыць эсэ «Па мясцінах славутых землякоў».

Памёр у 1996 годзе.

М. Банасевіч.

Я. С. Пархута.

З вершаў Яраслава Пархуты

КУЗНЯ

Калісьці да яе ўсё сяло
Сыходзілася, ледзь займецца золак.
У горне пеклам полымя гуло,
І выбіваў чачотку спрытны молат.

Аратыя прыносілі сюды
Злізаныя нарогі і падковы.
Падвязваў бацька свой фартух руды
І нанава ўсё гэта перакоўваў.

Не крыўдавалі на яго й жанкі.
З пілы падоўжнае не раз, бывала,
Рабіў ён серп — і зграбны, і такі,
Што баба ім гадоў чатыры жала.

Іванавіч! — хвалілі мужыка
Ды запрашалі завітаць у госці.
Зайздросціў кожны бацькавым рукам,
Яго ўмельству рэдкаму зайздросціў...

Прайшлі гады. Сівым стаў бацька мой.
Старую кузню разабраў на дровы.
Бо рукі ўжо не маюць сілы той,
Што справілася б з молатам пудовым.

Але сваім яму да скону жыць
Уседзець дома аніяк не можа —
Гадзінамі задумліва глядзіць,
Як хлопцы каля трактараў варожаць.

Я разумею бацькаву тугу —
Не перадаў, маўляў, майстэрства сыну...
Ды з гэтым пагадзіцца не магу —
У спадчыну ён большае пакінуў.

П. С. Пестрак.

На лёс ніколі не крыўдую свой.
Як гарту мой народ не паддаецца —
Да раніцы гарачаю крывёй
Пераплаўляю той метал у сэрцы.

Шчаслівы буду, калі хоць адну
Узніме баразну ў нашым полі.
Для гэтага мо толькі і жыву.
І горан свой я не тушу ніколі.

1970 г.

Піліп Пестрак

Пестрак Піліп Сямёнавіч нарадзіўся 27 лістапада 1903 г. у вёсцы Сакоўцы Івацэвіцкага раёна ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў двухкласным вучылішчы. У 1914 г. разам з бацькам эвакуіраваўся ў сяло Максімаўка Бузулукскага павета Самарскай губерні. Працаваў памочнікам справавода крэдытнага таварыства, вучыўся ў гімназіі. У 1919 г. — памочнік бухгалтара ў валасным выканкоме. Пасля вучобы на рабфаку ў 1920 г. паступіў на гістарычны факультэт Самарскага універсітэта. Увосень 1921 г. разам з бацькамі вярнуўся на радзіму. Працаваў рабочым на лесапільні, лесніком. Служыў у польскім войску (1924-1926). У 1926 г. уступіў у члены КПЗБ і стаў членам павятовага камітэта Беларускай сялянска-рабочай Грамады ў мястэчку Косава. З 1927 г. — сакратар Косаўскага падпольнага райкома, член Слонімскага акружкома КПЗБ, у 1933—1934 гг. — інструктар ЦК КПЗБ. Амаль 11 гадоў сядзеў у турмах буржуазнай Польшчы. Вызвалены Чырвонай Арміяй у верасні 1939 г. з гродзенскай турмы. Працаваў сакратаром Гродзенскага гаркома (1939—1940). Быў абраны дэпутатам Народнага схода Заходняй Беларусі ў Беластоку (1939). У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху. Працаваў начальнікам упраўлення па справах мастацтваў пры Саўнаркоме БССР (1943—1945), навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1945—1947). Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1940—1946), а таксама дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1971—1975). Член СП СССР з 1939 г. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума — Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалямі. Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1968).

Творчую працу пачаў з вершаў у гады падпольнай рэвалюцыйнай дзейнасці ў Заходняй Беларусі. У друку выступіў у 1927 г. пад псеўданімам Звястун. Першы зборнік вершаў «На варце», надрукаваў у 1940 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «За сваю Айчыну» (1946), «Падарожнае» (1962), паэма «Слова пра Мінск» (1968).

У пасляваенныя гады выступаў пераважна ў галіне прозы. Выдадзены зборнікі апавяданняў «Першыя ўсходы» (1951), «Неспадзяванак». (1957), «Лясная песня» (апавяданні і нарысы), апавяданне «Камень» (1960), «Сярод чаротаў» (1964), «Апавяданні» (1970), раманы «Сустрэнемся на барыкадах» (1954), «Серадзібор» (1963). У 1947 г. выйшлі «Выбраныя творы», у 1969—1971 гг. — Збор твораў у 4 тамах, у 1984—1986 гг. — Збор твораў у 5 тамах. Перакладаў творы польскіх, украінскіх, латышскіх, літоўскіх пісьменнікаў. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1964) за раман «Серадзібор». Памёр 22.8.1978 г.

Ф. Хаванскі.

З вершаў Піліпа Пестрака

МАЦУЙСЯ

Мацуйся, мой браце, у крывавым змаганні
За волю Радзімы — забітай зямлі.
Няўжо нам заўсёды бадзяцца ў стагнанні,
Жыць там, што вякі падняволля далі?

Змагайся, мой браце, — не здайся ніколі, —
За свой пад'ярэмны і змучаны люд,
Што ў цемры абдоран кайданнаю доляй
Аплакваў у немачы бедны свой кут...

Па-новаму свеціць зара небасхіла,
Нясе нам прыгожыя, новыя дні,
І мы — маладая, паспеўшая сіла,
І мы — светазорныя бліскі-агні.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ І ГРАМАДСКІЯ ДЗЕЯЧЫ, НАВУКОЎЦЫ

АКАВІТЫ Анатоль Уладзіміравіч, кандыдат тэхнічных навук, старшы выкладчык кафедры «Металічныя і драўляныя канструкцыі» Беларускага політэхнічнага інстытута. Выпускнік Косаўскай СШ.

БЕЛЫ Віктар Пятровіч, кандыдат хімічных навук, супрацоўнік універсітэта г. Уфы, РФ. Выпускнік Гошчаўскай СШ.

ВІШЧУК Віктар Адамавіч — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне навукі і тэхнікі. Нарадзіўся 8 красавіка 1947 г. на станцыі Даманава ў сям'і чыгуначніка. У 1963 годзе паспяхова закончыў Даманаўскую СШ. У тым жа годзе паступіў і ў 1968 г. скончыў Мінскае вышэйшае радыётэхнічнае інжынернае вучылішча. Далей служба ў Савецкай Арміі ў ракетных войсках. Палкоўнік. Жанаты, двое дзяцей. Старэйшы сын афіцэр УС Беларусі, скончыў тое ж вучылішча, што і бацька. Малодшы вучыцца ва універсітэце ў Маскве. Дзяржаўная прэмія РФ уручана Вішчуку В. А. 11 сакавіка 1996 г. прэзідэнтам Расіі Б. М. Ельцыным у Вялікім Крамлёўскім палацы. Вішчук В. А. мае дзяржаўныя ўзнагароды. Па службе шмат ездзіў за мяжу. Яго заўсёды вылучае працавітасць, сумленнасць, службовая дысцыпліна. Карыстаецца павагай у калектыве. Наведвае сваіх бацькоў, якія цяпер на пенсіі, жывуць на станцыі Даманава. Бацька — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, інвалід І групы.

В. Мароз.

ГАГАРЫНА (ДУДАРАВА) Святлана Фёдараўна, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзілася 1 студзеня 1945 г. у мястэчцы Быцень. Там жа ў 1961 г. закончыла сярэднюю школу, пасля чаго паступіла ў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага (цяпер

С. Ф. Гагарына.

М. У. Горбач.

педагагічны універсітэт імя М. Танка). Пасля інстытута працавала тры гады настаўніцай у Рудзенскай школе-інтэрнаце, затым сем гадоў у Мінскай школе № 35. Са школы запрасілі працаваць у гарадскі Інстытут удасканалення настаўнікаў загадчыцай кабінета пачатковых класаў, затым у Мінскі педінстытут на кафедру педагогікі і методыкі пачатковага навучання, дзе працавала да 1995 г. Потым назначана загадчыцай кафедры методыкі выкладання інтэгрыраваных школьных курсаў факультэта даінстытуцкай падрыхтоўкі Мінскага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. У 1985 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па педагогіцы. У 1986 г. прысвоена званне дацэнта.

ГОЛУБ Міхаіл Уладзіміравіч, кандыдат тэхнічных навук, загадчык кафедры металарэжучых станкоў і прамысловых робатаў Брэсцкага політэхнічнага інстытута. Выпускнік Косаўскай СШ.

ГОРБАЧ Міхаіл Уладзіміравіч, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Нарадзіўся 26.10.1954 г. у в. Даманава Івацэвіцкага раёна ў сям'і рабочага. Пасля заканчэння Даманаўскай СШ (1971) вучыўся ў Мінскім тэхнічным вучылішчы № 77 па спецыяльнасці слесара. Пасля вучобы працаваў на Мінскім аўтамабільным заводзе слесарам, брыгадзірам, наладчыкам. 1.11.1984 г. пастановай ЦК КПСС і СМ СССР яму прысуджана Дзяржаўная прэмія за вынаходніцтва і ўкараненне ў машынабудаванні комплекса новых метадаў і аўтаматызаванага абсталявання для дакладнага халоднага формаўтварэння даўленнем валоў і восей.

ГОРБАЧ Раман Мікалаевіч, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся 7 студзеня 1935

Р. М. Горбач.

М. М. Грынчык.

І. Ц. Кавецкі.

года ў в. Гнойна (цяпер Вішнёўка) Івацэвіцкага раёна ў сем'і селяніна. Скончыў Даманаўскую сямігодку (1949), Быценскую СШ (1952), механічны факультэт Львоўскага політэхнічнага інстытута па спецыяльнасці «Рухавікі ўнутранага згарання». Працаваў старшым інжынерам Свярдлоўскага турбаматорнага завода (1957—1963), вучыўся ў аспірантуры ў Маскоўскім навукова-даследчым інстытуце рухавікоў (1960—1963) і працаваў у ім намеснікам начальніка інстытута (1964—1970).

У 1967 г. абараніў дысертацыю на званне кандыдата тэхнічных навук на тэму «Распрацоўка і ўдасканаленне сістэмы рэгулявання і ўпраўлення работы рухавікоў унутранага згарання». З 1970 г. працуе ў навукова-даследчым Інстытуце рухавікоў (г. Масква) вучоным-сакратаром, старшым навуковым супрацоўнікам. З 1991 года выконваў работы па распрацоўцы новай тэхнікі: дызель-генератараў, грунтаўшчыльняльных машын, машын ваеннага прызначэння, новых рухавікоў народнагаспадарчага прызначэння. Яго распрацоўкі завяршыліся ўкараненнем гэтых машын у вытворчасць.

У службовай характарыстыцы сказана: «Асноўныя работы Горбача Р. М. прысвечаны даследаванню сістэм паліванадачы і рэгулявання рухавікоў. Праведзеныя ім даследаванні па паляпшэнню стабільнасці работы рэгулятараў на неўсталяваных рэжымах не толькі расшырылі нашы прадстаўленні аб працэсах работы рухавіка і рэгулятара, але і дазволілі правесці ўдасканаленне рэгулятараў серыйных рухавікоў».

Горбач Р. М. — аўтар 60 друкаваных работ, у тым ліку адной кнігі, дзвюх брашур і 53-х аўтарскіх пасведчанняў. У перыяд 1976—91 гг. паспяхова выконваў работы па каардынацыі і фарміраванню планаў сумесных работ інстытута з заводамі галіны па ўхіленню дэфектаў серыйных рухавікоў.

В. Мароз.

ГРЫНЧЫК Мікалай Мікалаевіч, доктар фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся 15.2.1950 у м. Быцень Івацэвіцкага раёна. У 1967—1972 вучыўся на фізічным факультэце БДУ, а затым працаваў у Інстытуце цепла- і масаабмену АН РБ. У красавіку 1995 у Інстытуце цеплафізікі Сібірскага аддзялення АНР у Новасібірску абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. Працуе ў галіне малекулярнай фізікі і цеплафізікі. Напісана манаграфія, больш 50 публікацый змешчана ў айчынных часопісах і 10 публікацый у міжнародных. Мае адзін еўрапатэнт і 8 патэнтаў на вынаходніцтвы.

ГУЛЯЙ Павел Дзянісавіч, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, загадчык кафедры кожных і венерычных хвароб Гродзенскага медыцынскага інстытута. Выпускнік Косаўскай СШ.

ДАВЫДЗІК Іван Іванавіч, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся 15 лютага 1944 г. у в. Заполле Быценскага раёна, як запісана ў дакументах, а на самай справе нарадзіўся ў лесе ў партызанскім атрадзе «Савецкая Беларусь» у Воўчых Норах. Бацькі былі партызанамі. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Закончыў аспірантуру і абараніў кандыдацкую дысертацыю (1971). У 1973 г. перайшоў на работу ў Белдзіпраторф (цяпер Беларускі навукова-даследчы і праектны інстытут паліўнай прамысловасці). З 1976 года яго дырэктар. У 1979 паступае на вучобу ва Усесаюзную акадэмію замежнага гандлю. Пасля заканчэння яе ў 1982 быў абраны генераль-

ным сакратаром міжнароднага таварыства па торфе і працаваў у Фінляндыі да 1987. У1991 сумесна з ірландскімі акцыянернымі фірмамі ўтварыў акцыянернае таварыства «Імпэт», якое ставіць задачай стварыць танную цеплавую энергію.

ЗУБЕЛЬ Віктар Рыгоравіч, доктар сельскагаспадарчых навук. Выпускнік Гошчаўскай сярэдняй школы.

КАВЕЦКІ Ігар Ціханавіч, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся ў 1946 г., скончыў Івацэвіцкую СШ (1963) і Беларускі політэхнічны інстытут у Мінску. Працуе ў Беларускай політэхнічнай акадэміі.

КАВЕЦКІ Святаслаў Ціханавіч, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1953 г. Скончыў СШ № 1 г. Івацэвічы. Працуе ў Брэсцкім педагагічным універсітэце.

КАСЬКО Ігар Віктаравіч, доктар фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся ў 1960 г. Скончыў СШ № 1 г. Івацэвічы (1976) і БДУ (1981). Тры гады вучыўся ў аспірантуры Йенскага універсітэта (ГДР) і ў 1986 г. абараніў дысертацыю па тэарэтычнай фізіцы. Працаваў у БДУ выконваючым абавязкі дэкана (1987—1988). Накіраваны на работу ў Нюрнбергскі універсітэт на год. Пасля заключыў кантракт на работу ў гэтым універсітэце гасцявым навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага інстытута універсітэта.

КОТ Мікалай Аляксеевіч, кандыдат тэхнічных навук, супрацоўнік Інстытута торфу АН РБ. Выпускнік Гошчаўскай сярэдняй школы.

КОТАЎ Яўген Васільевіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Інстытута фізікі цвёрдых цел АН РБ. Скончыў Целяханскую сярэднюю школу.

КУЗЬМІЧ Васіль Восіпавіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт. Нарадзіўся 6 лютага 1929 г. у в. Заполле Быценскага сельсавета Івацэвіцкага раёна ў сялянскай сям'і. У 1948 г. скончыў Быценскую сярэднюю школу з сярэбраным медалём, у 1953 г. фізіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (з адзнакай), а ў 1956 г. аспірантуру пры Белдзяржуніверсітэце па спецыяльнасці «Тэарэтычная фізіка». Адначасова ў 1953—1956 гг. працаваў выкладчыкам фізікі ў сярэдняй школе пры Мінскім акруговым Доме афіцэраў. Кандыдат фізіка-матэматычных навук з

В. О. Кузьміч.

Ф. Ф. Мажэйка.

1956 г., дацэнт з 1960 г. З 1956 г. на выкладчыцкай рабоце ў Белдзяржуніверсітэце. У 1965—75 гг. — намеснік дэкана фізічнага факультэта, у 1976—92 гг. — загадчык кафедры фізікі факультэта радыёфізікі і электронікі. Апублікаваў больш за 50 навуковых работ па статыстычнай фізіцы і методыцы выкладання фізікі ў ВНУ. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, ганаровымі граматамі мінвузаў СССР і БССР.

КУКСА Мікалай Барысавіч, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Нарадзіўся ў вёсцы Куляшы Івацэвіцкага раёна. У 1954 г. скончыў Косаўскую сярэднюю школу і пайшоў служыць на флот. Пасля дэмабілізацыі ў 1959 г. паступіў вучыцца на агранамічны факультэт Луганскага інстытута, які закончыў у 1964 г. Працаваў па спецыяльнасці ў Луганскай і Варашылаўградскай абласцях. У 1968 г. паступіў у аспірантуру Украінскай сельскагаспадарчай акадэміі (г. Кіеў), якую закончыў у 1971 г. і абараніў дысертацыю на званне кандыдата сельскагаспадарчых навук. Застаўся працаваць у Варашылаўградскім сельскагаспадарчым інстытуце. Дацэнт. Загадчык кафедры.

МАЖЭЙКА Фама Фаміч, член-карэспандэнт АН РБ, доктар хімічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ. Нарадзіўся ў в. Скураты Альшаніцкага сельсавета Івацэвіцкага раёна 7.10.1936 г. у сям'і селяніна. Калі яму было паўтара года, памерла маці, у 10 гадоў страціў бацьку. Астаўся сіратою — гадаваўся ў бабулі і сясцёр Жэні і Веры. Скончыў Скуратоўскую пачатковую школу (1948), Альшаніцкую сямігодку (1951), Косаўскую сярэднюю школу (1954). Затым 5 гадоў вучобы на хімічным факультэце Белдзяржуніверсітэта.

Гады дзяцінства, якое апаліла вайна і разруха, выявілі выдатныя здольнасці і мэтанакіраванасць беларускага сельскага хлопца. Універсітэт стаў добрай школай, якая выпрацавала ў яго характары адказнасць і працавітасць, так неабходныя вучонаму-даследчыку. Усе гэтыя якасці плюс шырыня навуковых інтарэсаў і патрэбы да творчага пошуку вызначылі яго поспех у навуцы.

Мажэйка Ф.Ф. з'яўляецца вядучым вучоным-хімікам РБ. Яго станаўленне як вучонага адбылося ў Акадэміі навук РБ, у сценах Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі, дзе ён 37 гадоў творча і вынікова працуе на навуковай рабоце, дзе прайшоў шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка да члена-карэспандэнта АН, прафесара, загадчыка лабараторыі.

Навуковая грамадскасць ведае Мажэйку Ф. Ф. як вучонага, прысвяціўшага сваю дзейнасць адной з важнейшых для Беларусі праблем — інтэнсіфікацыі тэхналагічнага працэсу абагачэння калійных руд Старобінскага месцанараджэння. Мажэйка Ф.Ф. мае больш за 150 навуковых вынаходніцтваў, 300 навуковых прац. Пяць яго вучняў абаранілі кандыдацкія дысертацыі. 7 кастрычніка 1996 г. грамадскасць адзначыла 60-годдзе яго нараджэння і 37-годдзе навуковай дзейнасці.

В. Мароз.

МАЙСЕЙЧЫК Яўген Аляксеевіч, кандыдат тэхнічных навук. Выпускнік Гошчаўскай СШ.

МАЛАФЕЕЎ Вячаслаў Міхайлавіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся ў 1959 г. Скончыў СШ № 1 г. Івацэвічы (1977), факультэт радыёфізікі БДУ (1982) і аспірантуру пры БДУ (1985). Працуе намеснікам дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі.

МУРАШКА Мікалай Мікалаевіч, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Закончыў у 1958 г. Косаўскую сярэднюю школу, у 1962 г. — Мінскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, у 1967 г. — будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. Тры гады працаваў у праектным інстытуце «Белкааппраект», два гады — старшым выкладчыкам кафедры будаўнічых канструкцый Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. У 1973—75 гг. навучаўся ў вочнай мэтавай аспірантуры Маскоўскага інжынерна-будаўнічага інстытута імя Куйбышава. У 1976 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па даследаванню стальных трубчастых канструкцый у будаўніцтве, за што прысвоена вучоная ступень кандыдата тэхнічных навук. У 1980 г. прысвоена вучонае званне дацэнта. Працуе загадчыкам кафедры будаўнічых канструкцый Брэсцкага політэхнічнага інстытута. Апублікавана 59 навуковых прац. Частка іх выдадзена за рубяжом.

ПАПЕЧЫЦ Уладзімір Іванавіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся ў 1947 г. у Целяханах. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце. Там абараніў кандыдацкую дысертацыю. Дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

ПАПКО Іосіф Міхайлавіч, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт. Нарадзіўся 9 чэрвеня 1935 г. у в. Рацкевічы Івацэвіцкага раёна ў сям'і селяніна. У 1954 г. скончыў Косаўскую сярэднюю школу і паступіў у Чарнавіцкі медыцынскі інстытут на лячэбны факультэт, які закончыў у 1960 г. Два гады працаваў загадчыкам хірургічнага аддзялення медсанчасці пасёлка Лоцікава Камунарскага раёна Варашылаўградскай вобласці. З 1962 г. да 1964 г. навучаўся ў клінічнай ардынатуры Чарнавіцкага мединстытута. У 1964 г. выбраны па конкурсу на пасаду выкладчыка кафедры хвароб вуха, горла і носа. У 1968 г. абараніў дысертацыю на вучоную ступень кандыдата медыцынскіх навук. У 1970 г. прысвоена вучонае званне — дацэнт. З 1974 г. загадчык кафедры хвароб вуха, горла і носа Чарнавіцкага медыцынскага інстытута. Апублікавана больш за 50 навуковых работ, атрымана 20 рацыяналізатарскіх пасведчанняў і 3 аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы. Праведзена больш за 5000 аперацый, пракансультавана больш за 50 000 хворых, падрыхтавана 10 высокакваліфікаваных спецыялістаў праз клінічную ардынатуру. З'яўляецца членам праўлення ўкраінскага рэспубліканскага таварыства оталарынголагаў, старшынёю праўлення абласнога навуковага таварыства.

ПАСЕДЗЬКА Валерый Сяргеевіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся ў 1959 г. Скончыў Івацэвіцкую СШ № 1, факультэт радыёфізікі і аспірантуру БДУ.

ПАШКЕВІЧ Генадзь Андрэевіч, кандыдат фізічных навук. Выпускнік Гошчаўскай сярэдняй школы.

ПІСКАРОЎ Віктар Аляксеевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі. Нарадзіўся 26.1.1929 г. у в. Красная Горка Юхнаўскага раёна Калужскай вобл. Пасля вайны разам з бацькамі пераехаў у Івацэвіцкі раён, скончыў сярэднюю школу ў Івацэвічах. Працоўную дзейнасць пачаў з 1946 г.: працаваў токарам, слесарам, вучыўся ў Маскоўскім электрамеханічным вучылішчы. У 1950—1951 гг. — сакратар Тураўскага РК ЛКСМБ Палескай вобл.

У 1951—1954 гг. — ва ўпраўленні міліцыі Палескай вобл., затым — у апараце МУС БССР. Скончыў вышэйшую школу Міністэрства аховы грамадскага парадку РСФСР (1961). З ліпеня 1967 г. — намеснік начальніка Упраўлення Міністэрства аховы грамадскага парадку БССР, начальнік упраўлення аховы грамадскага парадку Мінскага гарвыканкома, намеснік міністра ўнутраных спраў БССР, начальнік (1983—1984) Галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС СССР. У 1984—1990 гг. — міністр унутраных спраў БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі ў 1990—1995 гг. Кандыдат юрыдычных навук. Узнагароджаны двойчы ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967 і 1976), медалямі. Мае званне заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь.

В. А. Піскароў.

У. В. Русакевіч.

С. І. Русан.

ПЯСЕЦКІ Сцяпан Сцяпанавіч, доктар хімічных навук, супрацоўнік Гомельскага універсітэта. Выпускнік Гошчаўскай СШ.

РУСАКЕВІЧ Уладзімір Васільевіч. Дзяржаўны дзеяч Беларусі. Нарадзіўся 13.9.1947 г. у в. Выганашчы. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут (1970) і Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (1983), Мінскую ВПШ (1983). Працоўную дзейнасць пачаў у 1963 г. У 1970 г. пасля заканчэння інстытута працаваў дырэктарам Турнянскай васьмігадовай школы Івацэвіцкага раёна. У 1971—72 праходзіў службу ў Савецкай Арміі. У 1972—86 знаходзіўся на камсамольскай, савецкай і партыйнай рабоце ў Брэсцкай вобласці. У 1986 г. узначаліў выканком Ганцавіцкага раённага Савета народных дэпутатаў, а ў 1990 быў назначаны намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкома. Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі з 1990 г.

У сакавіку 1994 выбраны намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. У снежні 1994 г. прызначаецца намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. З ліпеня 1997 г. — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РУСАН Сяргей Іванавіч, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся 26.3.1933 у в. Сялец Дабромысленскага сельсавета ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1952 г. паступіў у Львоўскі політэхнічны інстытут на інжынерна-будаўнічы факультэт. Пэўны час працаваў інжынерам на аб'ектах трэста «Новавалынсквугаль», быў выкладчыкам інстытута. У 1961—1963 займаўся ў аспірантуры інстытута механікі АН УССР. Абараніў дысертацыю і працаваў на даследчыцкай рабоце ў Інстытуце механікі, а з 1970 г. — дацэнтам кафед ры тэхнічнай механікі ў Жытомірскім філіяле Кіеўскага політэхнічнага інстытута. У 1980 вярнуўся ў Беларусь і стаў працаваць на кафедры тэхнічнай механікі Гомельскага політэхнічнага інстытута.

Г. М. Сагановіч.

М. У. Студзянічнік.

САГАНОВІЧ Генадзь Мікалаевіч, н. 13.1.1961, в. Турная. Кандыдат гістарычных навук (1990). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1984). З 1987 малодшы, з 1991 навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі. Даследуе археалогію і ваенна-палітычную гісторыю Беларусі і Вялікага княства Літоўскага. Складальнік і адзін з аўтараў зборніка «Імя тваё Белая Русь» (1991). Аўтар кніг «Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі» (1992), «Невядомая вайна» (1995). Аўтар (сумесна з У. Арловым) працы «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі», якая друкавалася ў перыёдыцы.

СТУДЗЯНІЧНІК Мікалай Уладзіміравіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, супрацоўнік Дзяржаўнага навуковага цэнтра АН Расійскай Федэрацыі.

Нарадзіўся 20.5.1929 г. у м. Быцень. У 1948 г. закончыў Быценскую сярэднюю школу. У 1953 скончыў фізіка-матэматычны факультэт БДУ, па размеркаванню накіраваны ў Маскву ў Фізічны інстытут АН СССР, дзе працаваў у акустычнай лабараторыі — сусветна вядомым цэнтры фізічнай навукі. З 1954 г. — самастойны Акустычны інстытут АН СССР. Цяпер — Дзяржаўны навуковы цэнтр АН Расіі.

Напачатку навуковай працы займаўся рэзанансным паглынальнікамі гуку ў марскім асяроддзі, потым — распаўсюджваннем гуку ў морах і акіянах дзеля мэт бяспекі планавання і падводнай сувязі. Прытым акрамя фізічных працэсаў даследаваліся гідролага-геалагічныя і геаграфічныя ўласцівасці воднай тоўшчы акіяна, уласцівасці паверхні і характарыстыкі дна і яго пабудовы, якія значна ўплываюць і абумоўліваюць заканамернасці фармавання гукавых палёў.

У 1966 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў намеснікам загадчыка лабараторыі, начальнікам сектара, старшым навуковым супрацоўнікам. З 1966 па 1994 быў навуковым кіраўніком шэрагу буйных урадавых навукова-даследчых работ, у выкананні якіх удзельнічалі шмат якія навуковыя калектывы рознага профілю. Ім напісана звыш 160 навуковых справаздач і артыкулаў, у сааўтарстве адна манаграфія, мае 6 вынаходніцтваў. Быў навуковым кіраўніком Усесаюзнага семінара і навуковым рэдактарам прац Акустычнага інстытута па даследуемай праблеме.

У працэсе выканання навуковых даследаванняў быў у шмат якіх марскіх і акіянічных экспедыцыях на спецыяльных навукова-даследчых караблях Акустычнага інстытута і іншых ведамстваў у якасці начальніка і намесніка начальніка экспедыцыі. Экспедыцыйныя работы выконваліся як ва ўнутраных морах, так і ў розных акваторыях Сусветнага акіяна з заходамі ў замежныя парты амаль усіх кантынентаў і шэрагу выспаў. За гэты час, акрамя атрымання навуковых вынікаў, М. У. Студзянічнік пазнаёміўся з прыродай, навукай, некаторымі тэхналагічнымі дасягненнямі, культурай, архітэктурай, звычаямі розных народаў і ў цэлым з жыццём вялікіх і малых гарадоў свету.

В. Мароз.

ЦЫРКУНОЎ Уладзімір Максімавіч, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1953 г. у Целяханах. Там жа скончыў сярэднюю школу. Адтуль у 1971 г. прызваны ў армію. Пасля вайсковай службы ў 1973 г. паступіў на вучобу ў Гродзенскі медыцынскі інстытут, які паспяхова закончыў, стаў працаваць у ім, займацца ў аспірантуры. У 1986 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1992 г. — доктарскую. У 1990 г. атрымаў званне прафесара. У 1994 г. стаў лаўрэатам прэміі доктара Сораса. З'яўляецца дырэктарам рэспубліканскага гепаталагічнага цэнтра, членам еўрапейскай і сусветнай асацыяцыі гепатолагаў. Апублікаваны тры яго навуковыя кнігі, больш 200 навуковых работ. Ён аўтар 50 рацыяналізатарскіх прапаноў і 6 вынаходніцтваў. Жыве ў Гродна.

ШАЎЧУК Ігар Іванавіч, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1959 г. Скон-

чыў Івацэвіцкую СШ № 1 у 1976 г., затым факультэт гісторыі Калінінскага універсітэта і аспірантуру пры АН БССР. Працуе ў Брэсцкім педагагічным універсітэце загадчыкам кафедры гісторыі славянскіх народаў.

ЯНКОВІЧ Аляксандр Вячаслававіч, кандыдат тэхнічных навук, нарадзіўся ў 1959 г., працуе ў Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце. Выпускнік Целяханскай сярэдняй школы.

ЯРЧАК Дзмітрый Пятровіч, кандыдат фізічных навук. Пасля сканчэння ў 1965 г. 11 класаў Гошчаўскай сярэдняй школы паступае ў БДУ на фізічны факультэт. Вучыцца ў аспірантуры пры універсітэце, дзе затым працуе ў лабараторыі фізікі паўправаднікоў.

ЯРЧАК Мікалай Пятровіч, доктар хімічных навук. Нарадзіўся ў 1950 г. у в. Гошчава Івацэвіцкага раёна ў сям'і настаўніка. Там жа ў 1966 г. закончыў сярэднюю школу і паступіў у БДУ на факультэт хіміі. У 1971 г. пасля заканчэння універсітэта накіраваны на працу ў Інстытут фізіка-арганічнай хіміі АН БССР. Аднак неўзабаве па сямейных абставінах перавёўся на работу ў Рыгу, дзе паступіў у аспірантуру пры Інстытуце арганічнага сінтэзу АН Латвійскай ССР. У 1975 г. абараніў дысертацыю і атрымаў званне кандыдата хімічных навук. З 1975 г. да 1988 г. працаваў навуковым супрацоўнікам. Званне доктара хімічных навук прысвоена ў 1992 г. Мае шэраг навуковых распрацовак па хіміі арганічнага сінтэзу. Зрабіў адкрыццё новага хіміка-біялагічнага элемента, якому па яго прапанове надана назва «гошчава» па назве роднай вёскі. З 1996 г. працуе ў Брэсцкім педагагічным універсітэце.

ЯРЧАК Мікалай Цімафеевіч, доктар псіхалагічных навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1944 годзе ў в. Гошчава Івацэвіцкага раёна ў сям'і селяніна. У 1961 г. скончыў Гошчаўскую сярэднюю школу з залатым медалём і паступіў у Мінскі інстытут замежных моў. Вучоба ў інстытуце была перарваная службай у арміі. Яму прапанавалі паехаць на работу ў Арабскую Рэспубліку Егіпет. На берагах Ніла працаваў больш года. Вярнуўшыся дамоў, скончыў інстытут і працаваў выкладчыкам англійскай мовы ў Любішчыцкай СШ Івацэвіцкага раёна. Адсюль паступае ў аспірантуру, абараняе дысертацыю на званне кандыдата псіхалагічных навук і застаецца працаваць на кафедры псіхалогіі свайго інстытута. Мае навуковыя працы, друкаваўся ў шматлікіх выданнях РБ і былога СССР. У 1991 г. абараніў доктарскую дысертацыю.

Рыхтавалі М. Банасевіч, В. Касько, В. Мароз.

Лёс краіны — яго лёс

На ціхай вулачцы Івацэвіч, якая калісь называлася Першамайскай, а цяпер носіць назву Савецкай, у доме нумар восем жыў каля сарака гадоў Пётр Васільевіч Зыбайла. Нарадзіўся ён у 1906 г., памёр у 1991 г. Гэты чалавек быў сціплым, негаваркім, працавітым. І нікому, хто з ім сустракаўся, і ў галаву не прыходзіла, што юнаком, як член КПЗБ, паспытаў ён бізуноў польскай дэфензівы ў пастарунку г. Косава, што ў 1937 г. яму выпала доля трапіць на допыт да чэкістаў Масквы як «шпіёну-перабежчыку» граніцы, што атрымаў ён 10 гадоў выпраўленча-працоўных лагераў, а ў 1955 г. быў рэабілітаваны Ваеннай Пракуратурай СССР.

Аб усім гэтым можна даведацца са шматлікіх дакументаў, якія, як рэліквіі, як шчымлівую памяць захоўвае яго жонка Ніна Фёдараўна Зыбайла. Акрамя гэтага, Пётр Васільевіч падрабязна апісаў сваё жыццё ў надрукаванай на машынцы брашуры, якая налічвае 19 старонак. Называецца яна «Васьмідзесяцігадовае жыццё, напісана ўласнаручна да 80-гадовага юбілею, у 1986 годзе». Аўтар прысвяціў напісанае сваім нашчадкам: сынам, іх жонкам, унукам і праўнукам.

Можа, з цягам часу сыны Пятра Васільевіча ці яго ўнукі перададуць яе на захаванне ў краязнаўчы музей, які ствараецца ў райцэнтры. Бо, на мой погляд, рукапіс мае не толькі сямейнае, але і грамадскае значэнне. Пётр Васільевіч у сваіх запісках адкрывае сэрца дабрыні, напаўняе свае будні радасцю працы на роднай зямлі, адчувае сябе шчаслівым ў асяроддзі блізкіх і родных пад дахам свайго дома. Ён любіць сваю Радзіму, нікога не абвінавачвае, проста імкнецца праз сямейную хроніку аб'ектыўна адлюстраваць час, жыццё дзяржавы, эпоху. Ён як бы

М. В. Банасевіч.

абмяжоўваецца ад палітычных супрацьстаянняў, азлаблення, якія растрачваюць душу, не заклікае да помсты, не выдзяляе ідэю, якой павінны аддаць перавагу нашчадкі. Заклікае да захавання агульначалавечых каштоўнасцей, на якіх павінна выхоўвацца моладзь.

Слова пра сябра

Цяжка ўсведамляць, што сярод нас няма найбольш актыўнага аўтара і ўкладальніка гэтай кнігі Мікалая Васільевіча Банасевіча. Ён памёр пасля таго, як рукапіс быў здадзены ў выдавецтва (у красавіку 1997 г.). Нарадзіўся Мікалай Васільевіч 22 снежня 1925 г. у вёсцы Гошчава ў беднай сялянскай сям'і, якая не мела нават свайго каня на падвор'і. Дзяцінства хлопчыка было цяжкім і няпростым. Больш дбаў аб працы, чым аб вучобе. Тым не менш сям'я прыклала ўсе намаганні, каб Мікола вучыўся, бо бачыла, што хлопчык тал енавіты. Спачатку заканчвае гімназію, а затым паступае ў педагагічны тэхнікум. Вучобу перарвала вайна. Юнак становіцца падпольшчыкам, а затым ідзе ў партызаны. Пры выкананні баявога задання на чыгункі непадалёку ад вёскі Няхачава паранены.

У ліпені 1944 г. Мікалай Банасевіч ужо франтавік, ваюе ва Усходняй Прусіі. Пад г. Інстэрбургам атрымлівае цяжкае раненне. Шпіталь,працяглае лячэнне і інваліднасць 2 группы. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу», іншымі медалямі. Дарэчы, Мікалай ваяваў на фронце разам са сваім бацькам Васілём Антонавічам Банасевічам, дайшоўшым да Берліна. І сыну, і бацьку пашчасціла выжыць у крывавай бойні.

Успамінаюцца радкі Р. Гамзатава:

Мы все умрем; людей бессмертных нет,
И это всем известно и не ново:
Но мы живём, чтобы оставить след,
Дом иль тропинку, дерево иль слово...

Пётр Васільевіч Зыбайла пакінуў гэты след. І дзякуючы рэабілітацыі, яго чэснае імя, як і імёны соцень іншых рэабілітаваных землякоў, вяртаецца да нас.

Персанальную пенсію ён атрымаў не за тое, што быў членам КПЗБ, а за паўвекавую самаадданую працу. У Маскве працаваў 12 гадоў, без адрыву ад вытворчасці вучыўся, атрымаў вышэйшую адукацыю. І ў лагеры працаваў добрасумленна. Зрабіў ён свой уклад і ў эканоміку раёна, 21 год быў галоўным бухгалтарам хімлясгаса.

В. Касько.

Падлячыўшыся, М. Банасевіч паступае на работу ў рэдакцыю раённай газеты «Чырвоная звязда» адказным сакратаром.

Мусіць, успомнілі, што юнак у партызанах выпускаў насценную газету і пісаў вершы. «Са студзеня 1946 г. стаў газетчыкам, — успамінаў М. В. Банасевіч. — Дваццаці гадоў ад роду, з сямігадовай адукацыяй, без аніякай спецыяльнасці за плячыма, калі не лічыць партызана і салдата. Пачыналася мірная дзейнасць».

Яна працягвалася ў газеце да 1962 г., да аб'яднання Івацэвіцкага і Бярозаўскага раёнаў і зліцця адпаведна дзвюх рэдакцый. Завочна закончаны факультэт журналістыкі БДУ. З 1962 г. — намеснік дырэктара, а з 1968 г. — дырэктар Гошчаўскай СШ. На гэтай пасадзе працуе да выхаду на пенсію.

Мікалай Васільевіч увесь час вёў вялікую грамадскую работу. На працягу васьмі гадоў з'яўляўся сакратаром партыйнай арганізацыі мясцовага калгаса, пэўны час гэтыя абавязкі выконвае і ў школе. Робіць справу прапагандыста. Ужо на пенсіі Мікалай Васільевіч выконвае абавязкі старшыні савета пярвічнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы, старшыні рэвізійнай камісіі Прыгараднага спажывецкага таварыства. Але галоўны яго клопат у апошнія гады — кніга «Памяць».

Усюды ён паспяваў, на ўсё яго хапала, усё

рабіў акуратна, з душой. Самай высокай сваёй узнагародай ён лічыў аўтарытэт сярод аднавяскоўцаў, калег па працы, усіх жыхароў раёна.

І яшчэ Мікалай Васільевіч Банасевіч напісаў, так бы мовіць, сямейную кнігу, якую назваў «Сцежкамі жыцця» (сельская хроніка).

Вось і выйшла з друку кніга «Памяць». Гэта была твая найвялікшая мара, якая здзейснілася, на жаль, тады, калі цябе не стала. Пры жыцці ты так шчыра, самаддана імкнуўся ўвекавечыць памяць тваіх землякоў, баявых і франтавых сяброў. Няхай кніга будзе і тваім нерукатворным помнікам, які ты сам сабе стварыў.

В. Касько, В. Мароз.

З рукапіснай кнігі Мікалая Банасевіча «Сцежкамі жыцця»

Што мяне прымусіла ўзяцца за пяро, каб пачаць гэтыя запіскі? Не ведаю. Але ўжо многія гады адчуваю нейкую патрэбу расказаць аб перажытым, падзяліцца ўспамінамі і сваімі думкамі. Пішу гэта не для шырокага кола людзей, а для сваіх унукаў і праўнукаў, каб яны змаглі неяк ацаніць тое месца, якое ў дадзены момант (калі чытаць гэтыя радкі) займаюць у жыцці. Мне ўжо ў гэты сталы час (ідзе сёмы дзесятак гадоў) хочацца нешта асэнсаваць у жыцці, а то і проста паведаміць аб маім часе, маёй маладосці, маёй сталасці, маёй, нарэшце, старасці. Дык вось, пачынаю сваю хроніку.

НАША МІНУЛАЕ

...Настаўнікі ўсімі сродкамі імкнуліся выбіць з нас беларускі дух. Але гэта было нялёгка, бо жыў ён у кожнай хаце. Запомніўся вершык, які прымусілі вывучыць на памяць:

« — Кто ты естэсь?
— Поляк малы.
— Які знак твуй? — Ожэл бялы.
— Гдзе ты мешкаш?
— В польскей земі...» і г.д.

Неяк дома пілавалі мы з бацькам дровы. Вазьмі ды і раскажы яму я гэты вершык. А ён кажа паціху:

— Ніякі ты не паляк, мы беларусы, і знак наш не арол, а чырвоная зорка, серп ды молат, і жывём мы на нашай беларускай зямлі. Паны яе прысвоілі...

ПРАЦОЎНЫ ЛЮД БУДУЕ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

...Вакол сялянскіх уладанняў нашай вёскі, якія вузкімі палоскамі цягнуліся ад лесу да лесу з поўдня на поўнач, размяшчаліся ўгоддзі памешчыка Ігнатовіча, папа Дземіяновіча, асаднікаў-пілсудчыкаў — усяго больш за 700 гектараў. Не стала панскай улады, і сялянебеднякі са спадзяваннем чакалі, калі гэтыя землі пяройдуць да іх. Зямля ж павінна належыць тым, хто яе апрацоўвае.

Нарэшце часовыя органы ўлады прынялі рашэнне пачаць раздачу сялянам зямлі эксплуататараў. У Гошчаве была створана спецыяльная камісія па надзяленню беднаты зямлёю, увайшоў у яе і мой бацька. Дапамагаў яму і я складаць спісы сялянскіх гаспадарак (спатрэбілася ўменне пісаць па-руску), дзе ўказвалася, колькі ў каго зямлі і колькі патрэбна яму нарэзаць...

Творчыя калектывы раёна

Аматарскае аб'яднанне «Вербіца» Іванцэвіцкага ГДК. Створана ў 1979 г. Кіраўнік — Т. Я. Волк. «Вербіца» аб'ядноўвае прыхільнікаў народнай песні. Галоўны напрамак — вывучэнне і выкананне абрадаў, якія бытуюць у раёне, беларускіх народных песень і танцаў. Ансамбль — удзельнік раённых і абласных аглядаў-конкурсаў, народных і каляндарных свят.

Аматарскае аб'яднанне «Віёла» Іванцэвіцкага ГДК. Створана ў 1979 г. Кіраўнік — В. П. Кулецкая. У аб'яднанні займаюцца аматары-кветкаводы. Штогод у канцы лета калектыў ладзіць выставы, да кожнага мерапрыемства ў горадзе кветкаводы рыхтуюць кампазіцыі. У час свят праводзяцца выставы-продажы. За высокае майстэрства калектыў неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі, дыпломамі, каштоўнымі падарункамі, прэміямі.

Аматарскае аб'яднанне «Спадчына» Даманаўскага ДК. Створана ў 1988 г. Кіраўнік — Т. С. Сімончук. Усе ўдзельнікі — выхадцы са сваёй вёскі. «Спадчына» аб'ядноўвае чатыры секцыі: кожная мае свой накірунак. Першая — секцыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Даманаўскі ўмелец». Мае на мэце захоўваць,

развіваць, адраджаць і прапагандаваць народнае мастацтва. Удзельнікі займаюцца ткацтвам, вышыўкай, вязаннем, вырабам музычных шумавых інструментаў.

Другая — аматараў фальклора «Вечарніца». Удзельнікі займаюцца пошукам даўніх песень, прыпевак, прыказак, працуюць над адраджэннем народных свят і абрадаў.

Трэцяя — развіцця сямейнай творчасці «З песняй па жыцці». Асноўны напрамак работы — прапаганда песні. Чацвёртая — ветэранаў вайны і працы. Галоўная мэта — арганізацыя вольнага часу.

Ансамбль народных інструментаў «Гоман» Косаўскага ГДК. Створаны ў 1979 г. З 1992 г. ім кіруе А. Г. Шчарбіна. У рэпертуары ансамбля творы беларускіх, рускіх і замежных кампазітараў. Акрамя інструментальных твораў, ансамбль працуе з вакальнай групай, салістамі-вакалістамі і салістамі-інструменталістамі. Пастаянны ўдзельнік гарадскіх, раённых і абласных аглядаў-конкурсаў, фестываляў. У 1994 г. ансамбль прымаў удзел у абласным фестывалі «Возьмемся за рукі, сябры» ў горадзе Чачэрску Гомельскай вобласці. Удзельнікі ансамбля — работнікі Косаўскага МВА, дзіцячага садка, музычнай школы, сярэдняй школы, Дома культуры.

Ансамбль народнай музыкі «Іванічы». Мастацкі кіраўнік — В. Г. Кулініч. Створаны ў 1992 г. пры РАМЦ аддзела культуры Івацэвіцкага райвыканкома. Спачатку існаваў як акампаніруючая група народнага фальклорнага калектыва «Каланянка», потым пачаў весці самастойную канцэртную дзейнасць. За кароткі час стаў адметнай з'явай у культурным жыцці раёна. У рэпертуары — творы беларускіх аўтараў, ёсць фальклорныя песні і танцы, творы ў стылі «рэтра» 1950—1960-х гадоў. Ансамбль — удзельнік і міжнароднага фестывалю фальклору ў г. Пінску, «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, фестывалю ў памяць Тадэвуша Касцюшкі ў Кракаве, удзельнік рэспубліканскіх тэлевізійных праграм «Аброўскі сундук», «Валачобнікі».

Аркестр народных інструментаў Івацэвіцкага ГДК. Заснаваны ў 1977 г. Кіраўнік аркестра — Н. І. Бусяцкая. У калектыве працуюць 25 чалавек, у асноўным выкладчыкі ДМШ. Рэпертуар калектыва складваецца з твораў беларускіх і рускіх кампазітараў. Аркестр прымаў актыўны ўдзел у раённых і абласных аглядах-конкурсах і неаднаразова з'яўляўся пераможцам.

Вакальны ансамбль «Натхненне» Быценскага СДК. Створаны ў 1991 г. Кіраўнік — І. Д. Дзюрыч. Рэпертуар складаецца з царкоўнаславянскага песнапення, апрацовак народнай музыкі, музыкі беларускіх і замежных кампазітараў. Ансамбль вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. У 1994 г. на конкурсе «Усе мы родам з дзяцінства» адзначаны як лепшы калектыў. У 1995 г. паспяхова выступіў на фестывалі духоўнай музыкі «Магутны Божа» ў Магілёве. Ансамбль спявае на нядзельных літургіях, у святочных царкоўных службах у Быцені, у Свята-Успенскім Жыровіцкім манастыры і ў Свята-Серафімаўскай царкве г. Белаазёрска.

Дзіцячы фальклорны калектыў «Чарнічка» Вялікагацкага сельскага клуба. Створаны ў 1991 г. Кіраўнік — Г. У. Скарупіч. У 1997 г. калектыву прысвоена званне ўзорнага. У ансамблі 24 хлопчыкі і дзяўчынкі, вучні Вялікагацкай СШ. Галоўная мэта — захаванне культурнай спадчыны сваёй вёскі. У рэпертуары — народныя песні каляндарна-абрадавага цыкла. Ансамбль імкнецца максімальна наблізіцца да аўтэнтычнасці, захаваць жывую натуральную пластыку. Навучанне песень ідзе непасрэдна «з голасу» народных спявачак.

Дзіцячы хор «Ліра» Івацэвіцкага ГДК. Сваю дзейнасць пачаў у 1966 г. Кіраўнік — В. В. Лайма. Рэпертуар складаюць народныя беларускія творы і творы замежных кампазітараў. З удзельнікаў хору створаны вакальны ансамбль, ёсць салісты. У калектыве займаюцца навучэнцы музыкальнай школы. Хор — пастаянны ўдзельнік раённых і абласных аглядаў-конкурсаў, прымае ўдзел у раённых мерапрыемствах.

Драматычны калектыў Івацэвіцкага ГДК. Створаны ў 1990 г. Кіраўнік — Ю. П. Кулецкі. Прыярытэтным напрамкам з'яўляецца заха-

ванне і развіццё нацыянальнай культурнай спадчыны, зберажэнне і аднаўленне гістарычных культурных помнікаў.

У рэпертуары значнае месца займаюць творы беларускіх пісьменнікаў. Калектыў мае сваю аркестравую і фальклорную групу. Прымае актыўны ўдзел у раённых і абласных аглядах-конкурсах. Сваё майстэрства ўдзельнікі яго дэманстравалі жыхарам Бярозаўскага і Пружанскага раёнаў, гарадоў Баранавіч і Пінска.

Драматычны калектыў Целяханскага ГДК. Створаны ў 1957 г. Званне народнага атрымаў у 1967 г. Вялікі ўклад у развіццё тэатра ўнеслі Л. Д. Уліцін і А. Н. Сонцава. З 1984 г. з тэатрам працуе Д. І. Кузняцова. Рэпертуар складаецца ў асноўным з твораў беларускіх пісьменнікаў. Плённа і самаадданa працуюць зараз у калектыве С. Ф. Гарбачоў і М. А. Віктаровіч. Калектыў за час свайго існавання паставіў шмат спектакляў, удзельнічаў у многіх раённых і абласных конкурсах, выступаў з гастролямі па вобласці і за мяжой. У 1966 г. на конкурсе тэатральных калектываў у Брэсце быў узнагароджаны дыпломам 2 ступені і атрымаў прыз за лепшую жаночую ролю.

Духавы аркестр Івацэвіцкага ГДК. Створаны ў 1956 г. Першы кіраўнік — І. П. Стральцоў. З 1960 г. мастацкі кіраўнік — А. А. Юркевіч, выхаванец гэтага аркестра. З 1973 г. аркестр пастаянна ўдзельнічае ў абласных аглядах-конкурсах, займае прызавыя месцы. Пяць разоў аркестр займаў І месца, пакінуўшы ў сябе назаўсёды кубак вобласці. Аркестр з'яўляецца лаўрэатам І Усесаюзнага фестывалю самадзейных духавых аркестраў 1975—1977 гг., узнагароджаны малымі залатымі медалямі. У 1977 годзе калектыву прысвоена званне народнага. У аркестры ёсць свае ветэраны — Л. Плотнікаў, Ул. Крывецкі ды іншыя.

Фальклорна-этнаграфічны калектыў «Каланянка» Коланскага сельскага клуба. Створаны ў 1975 г. Кіраўнік — Н. В. Засленчыц. У 1994 г. калектыву прысвоена званне народнага. Удзельнікі — жанчыны-паляводы рознага ўзросту. У рэпертуары калектыву — вячоркі, абрады, беларускія, рускія і ўкраінскія песні. Галоўная мэта калектыву — адраджэнне, захаванне і развіццё нацыянальнай культурнай спадчыны сваёй вёскі. Калектыў прымае ўдзел у раённых святах, абласных аглядах-конкурсах, прымаў удзел у рэспубліканскім народным свяце «Купалле» ў г. Заслаўі Мінскай вобласці, на фестывалі беларуска-польскай дружбы ў Брэсце, а таксама на фестывалі памяці Тадэвуша Касцюшкі ў Кракаве.

Фартэпіянны квінтэт РАМЦ Івацэвіцкага раёна. Мастацкі кіраўнік — Г. П. Салаўёва. Створаны ў 1992 г. Праграма складаецца з твораў беларускіх і рускіх аўтараў. Музычны напрамак калектыву — класічная і эстрадная музыка. Квінтэт прымае ўдзел у шматлікіх канцэртах у горадзе. У 1997 г. удзельнічаў у тэлевізійнай праграме БТ «Крок».

Р. Дзенісюк.

Хор Коланскага сельскага клуба. 1977 г.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ РАЁНА

АБРОВА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Чапаева. За 38 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 175 км ад Брэста. 1558 ж., двароў 603 (1.1.1997). Сярэдняя школа, клуб, ФАП, магазін, аддзяленне сувязі.

Згадваецца ў Літоўскай метрыцы пачатку XVI ст. у сувязі з пагранічнай спрэчкай паміж жыхарамі вёсак Аброва і Гічыцы Слонімскага павета, уладанне абата трокскага (1559). Каля вёскі выяўлены запасы бурштыну. У школе ёсць краязнаўчы музей. Каля Дома культуры — помнік Чапаеву.

У 1860 пабудавана з дрэва праваслаўная Міхайлаўская царква. Складаецца з асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму з трохгранай алтарнай часткай і шатровай вежы-званіцы, злучаных нізкім бабінцам. Помнік народнага драўлянага дойлідства.

...Назва вёскі Аброва сваімі вытокамі ўваходзіць у далёкую гісторыю. У сярэдзіне VI ст. з глыбіні еўрапейскіх стэпаў рухаўся шматлікі ваяўнічы народ. Гэта былі авары ці обры, як называе іх старажытнейшы летапіс «Повесть временных лет». Прышэльцы, якія дайшлі да Дняпра, пакарылі славянскія плямёны дулебаў, што жылі ў раёне сучаснай Валыні. Былі гэтыя «обры» «целам магутныя і вялікія ростам». Але ўжо ў VIII ст. яны знікаюць са старонак гісторыі. У Старажытнай Русі паданні аб нашэсці обраў былі хаця і далёкім, але рэальным водгаласам мінуўшчыны. Потым нават старажытныя легенды засталіся ў былым. І толькі некалькі моўных фактаў у своеасаблівым зашыфраваным выглядзе напамінаюць аб старажытнасці. У польскай і чэшскай мовах обры пакінулі памяць аб сабе ў двух цікавых словах, якія азначаюць велікан, гігант, багатыр.

Вучоныя даўно звярнулі ўвагу на цікавую і не зусім зразумелую для многіх назву —

Аброва. Усё гаварыла, як быццам, аб яўным адлюстраванні ва ўказаным геаграфічным факце імені абраў. І толькі акалічнасці з'яўлення ў палескіх раёнах Беларусі назвы гэтага старажытнага народа засталіся загадкавымі. Справа ў тым, што ўласна авары ў час свайго нашэсця не былі ў межах сучаснай Беларусі.

І ўсё ж, пэўна, назва вёскі ідзе якраз ад летапісных абраў. На карысць гэтага гаворыць старажытнасць паселішча. Нягледзячы на балоты, лясы і нязначныя плошчы прыдатнай для апрацоўкі зямлі, месца вакол Аброва заселена з самых глыбокіх часоў. Тут неаднойчы знаходзілі рэшткі каменных прылад эпохі неаліту. Дакументальна ж пацверджаная гісторыя Аброва ўзыходзіць да часоў Вялікага княства Літоўскага. Да рэвалюцыі ў мясцовай царкве вялася хроніка вёскі, старанна фіксаваліся падзеі, здарэнні і факты. Але, на жаль, у 1939 годзе па распараджэнню ўлад «непатрэбнаму і шкоднаму» летапісанню быў пакладзены канец, летапіс быў знішчаны. Адзін стары селянін з Пружанскага раёна ўспамінаў, што пад час службы ў польскай арміі ён быў знаёмы з салдатамі — ураджэнцамі вёскі Аброва. Ён выказваўся аб іх так: «Усе вялікага росту, здаровыя, абутак насілі 43—45 памераў».

Магчыма, усё гэта выпадковасць, але наводзіць на думку: а ці не магло быць так, што жыхары Аброва ў мінулым называліся суседзямі-обрамі, г. зн. магутнымі людзьмі, гігантамі? Не выключана, што слова «обр» («обры») магло існаваць у мясцовых гаворках у самастойным ужыванні так, як існуе ў польскай і чэшскай мовах. З цягам часу яно знікла, забылася, выпала з мовы, але ў геаграфічнай назве зафіксавалася назаўсёды. Слова «обры» маглі прынесці з сабою і перасяленцы з іншых месцаў, тым больш, што за шмат якія дзесяцігоддзі і стагоддзі іх было нямала. У прыватнасці, гэта і групы перасяленцаў з Валыні — нашчадкі гістарычных дулебаў, «прымучаных» аварамі-обрамі. Перасяленцы яшчэ ў IX—XI ст. мігрыравалі да поўначы ў так званую Чорную Русь, г. зн. у раёны Верхняга і Сярэдняга Панямоння. Дарэчы, валыняне-дулебы маглі прынесці з сабою не толькі імя абраў, але і старыя паданні аб іх нашэсці. Калі прыняць яшчэ на ўвагу, што вёска з назвай Аброва, ці падобная да яе, на Беларусі ёсць яшчэ не адна, то можна лічыць, што назва гэтая якраз і захавала ў сабе памяць пра старажытных абраў (паводле матэрыялу А. Рогалева).

АЗЯРЦО, вёска ў Падстарынскім сельсавеце, за 4 км на поўнач ад Івацэвіч, каля р. Грыўда. 169 ж., двароў 76 (1.1.1997). Брыгада калгаса «Бальшавік». У XIX ст. вёска адносілася да маёнтка Івацэвічы.

АЛЬБА, вёска ў Квасевіцкім сельсавеце, за 23 км на захад ад Івацэвіч, на шашы Косава — Ружаны. 100 ж., двароў 55 (1.1.1997). У 30-я гады XX ст. вёска была расселена на хутары. У 50-я — жыхары перабраліся ў вёску і арганізавалі калгас. Цяпер у калгасе «Зара».

Помнік архітэктуры — Юр'еўская праваслаўная царква. Пабудавана ў 1790 г. з дрэва на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі побач з могілкамі. Званіца прыбудавана ў пачатку XX ст. Прамавугольны ў плане асноўны аб'ём і пяцігранны алтарны зруб накрыты агульным двухсхільным дахам з валькамі над алтарнай часткай. Дах над алтаром завяршаецца



Юр'еўская царква ў в. Альба.

шасцігранным барабанам з галоўкаю. З заходняга боку да асноўнага аб'ёму прымыкае зрубная чацверыковая вежа-званіца, убудаваная ў яго на палову сваёй шырыні. Званіца завершана шатровым дахам з галоўкаю. Аконныя праёмы арачныя. Сцены гарызантальна абшыты дошкамі. Асноўны зальны аб'ём мае скляпеністае перакрыцце. Хоры раскрыты ў прастору галоўнага памяшкання складаным па канфігурацыі праёмам. Алтарная частка аздоблена разным іканастасам. Царква належыць да пераходнага ад двухзрубнага да трохзрубнага тыпу храма. У ёй адлюстраваліся тэндэнцыі выкарыстання ў драўляным дойлідстве формаў манументальнай каменнай архітэктуры.

АЛЬШАНІЦА, вёсқа ў Квасевіцкім сельсавеце, за 6 км на захад ад Косава. 134 ж., двароў 75 (1.1.1997). У 1949 тут створаны калгас, які ўвайшоў ва ўзбуйненую гаспадарку «Зара». Да 1990 працавала пачатковая школа.

Каля вёскі выяўлены помнікі археалогіі — два курганныя могільнікі. Могільнік-1 размешчаны на ўсходняй ускраіне, справа ад дарогі на Бялавічы. З насыпы вышынёю 1,2—2 м, дыяметрам 6—12 м. Выявіў у 1960 г. Ю. В. Кухарэнка, даследаваў у 1970 г. П. Ф. Лысенка . Раскопкі не праводзіліся. Могільнік-2 знаходзіцца за 0,7 км на ўсход ад вёскі, у лесе, каля дарогі на Бялавічы. 7 авальных курганоў вышынёю 0,7 м, дыяметрам 5—6 м. Выявіў у 1960 г. Ю. В. Кухарэнка, даследаваў у 1970 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

АЛЯКСЕЙКІ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, за 5 км на захад ад Івацэвіч, на шашы Івацэвічы — Косава. 140 ж., двароў 61 (1.1.1997). У Айчынную вайну каля вёскі двойчы ішлі баі (у 1941 і 1944) — былі ахвяры. Да 1997 г. існавала пачатковая школа; ёсць магазін, праведзены газ. Праваслаўная царква, якая была пабудавана ў XIX ст., згарэла ў 1941 г.

АМЯЛЬНАЯ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Мічурына. За 43 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 178 км ад Брэста. 453 ж., двароў 173 (1.1.1997). Цагельня, клуб, ФАП, магазін, сярэдняя школа. У Айчынную вайну спалена немцамі. Насыпаны курган Славы.

АЎСТО, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце побач з Аляксейкамі. 42 ж., двароў 28 (1.1.1997). Згадваецца ў пачатку XVII ст. як паселішча маёнтка Гошчава, калі яго ўладарніца падарыла тут тры валокі зямлі Гошчаўскай царкве. Уваходзіць у калгас «Савецкая Беларусь». Жыхар вёскі Міхаіл Еўтух быў забіты польскай паліцыяй 3 лютага 1927 у час дэманстрацыі ў Косаве. На яго доме ўстаноўлена памятная дошка.

БАБРОВІЧЫ, вёска ў Выганашчанскім сельсавеце, за 10 км на захад ад Выганашчаў, на беразе Бабровіцкага возера. 100 ж., двароў 45 (1.1.1997). У 1940 тут быў створаны калгас імя Сталіна. У Айчынную вайну немцы спалілі вёску і 676 яе жыхароў. Часткова адноўлена. Брыгада калгаса «Радзіма». Васьмігадовая школа закрылася, дзеці ходзяць у в. Выганашчы. Каля клуба пастаўлены помнік ахвярам фашызму. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

Каля вёскі выяўлены помнік археалогіі — стаянка 10—6-га тысячагоддзяў да н. э. Размешчана на паўночна-ўсходнім беразе воз. Бабровіцкае (у мінулым Вядскае), на марэнным узвышшы. Акружаная з усіх бакоў балотам. Даўжыня 300 м. Частка стаянкі моцна пашкоджана. Выявіў у 1963 г. і даследаваў у 1971 В. Ф. Ісаенка. Выяўлены рэшткі 6 вогнішчаў, абкладзеных камянямі. Вакол іх сабрана больш 100 крамянёвых прылад працы і 600 апрацаваных крэменяў, у тым ліку лістападобныя наканечнікі стрэл, свердлы і сярэдзінныя праколкі, зробленыя з пласцінак, нажы з пласцінак з бакавой рэтушшу і паглыбленнямі, завужаныя на канцы, папярочна рэтушаваныя разцы, масіраваныя канцавыя скрабкі, скоблі, якія адносяцца да свідэрскай культуры. Сустракаюцца таксама тыповыя для макралітычнай культуры масіўныя грубыя разцы, прыстасаваныя для сячэння, міндалепадобныя сякеры або разакі, вастрыі яніславічнага тыпу. Адносяцца да 10—6-га тысячагоддзяў да н. э. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АНБ.

БАРАНЫ, вёска ў Яглевіцкім сельсавеце на дарозе Івацэвічы—Жытлін. 359 ж., двароў 118 (1.1.1997). Дзейнічае лясніцтва. Прымыкае да ўскраін Івацэвіч.

БОРКІ, вёска ў Падстарынскім сельсавеце. 178 ж., двароў 98 (1.1.1997). У 1880 называлася вёскай пры гандлёвым шляху Пінск—Слонім. У Айчынную вайну згарэла. Адноўлена. Брыгада калгаса «Бальшавік».

БУЛА, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 8 км на поўнач ад Косава. 154 ж., двароў 87 (1.1.1997). Згадваецца ў «Рэвізіі пушч і пераходаў звярыных...» як пушча Бульская Слонімскага павета. Быў фальварак. У 1920—1939 у складзе Косаўскага павета, была сямігадовая школа. У Айчынную вайну вёска спалена. Адноўлена. У 1949 створаны калгас. З 1990 у калгасе «Грыўдзенскі».

БУСЯЖ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Бусяжскі». 207 ж., двароў 81 (1.1.1997). Размешчана на поўначы раёна, за 7 км ад Косава, 22 км ад Івацэвіч. Базавая школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, магазін. Пры апісанні пушчы Перавалоцкай (1559) называлася маёнткам пана Юндзіла Бусескі. За 3 км на поўнач ад вёскі магіла ахвяр фашызму.

У паўднёва-заходняй частцы вёскі размешчана Успенская царква. Пабудавана ў 1779 з каменю. Складаецца з прамавугольнага ў плане галоўнага аб'ёму, накрытага двусхільным дахам, і прыбудаванай да яго з поўначы апсіды. Галоўны (паўднёвы фасад) раздзелены развітым антаблементам на 2 ярусы. Над парталам галоўнага ўвахода — лучковае акно, вакол якога дзве глыбокія нішы. Верхні ярус завяршаецца гранёнай невялічкай вежай. Сцены бакавых фасадаў раздзелены слаістымі пілястрамі і прарэзаны аконнымі праёмамі з лучковым завяршэннем. Над уваходам невялікія хоры. Царква — помнік архітэктуры барока.

БЫЦЕНЬ, вёска на рацэ Шчара. Цэнтр сельсавета і калгаса «Быценскі». За 25 км на паўночны ўсход ад Івацэвіч, 159 км ад Брэста, 7 км ад чыгуначнай станцыі Даманава. 1947 ж., двароў 810 (1.1.1997). Камбінат бытавога абслугоўвання, цэх камбіната будаўнічых матэрыялаў. Сярэдняя агульнаадукацыйная школа і васьмігадовая школа-інтэрнат. Дом культуры, бібліятэка, бальніца, паліклініка, аптэка, дзіцячы сад-яслі, аддзяленне сувязі, 15 магазінаў. Помнік воінам і партызанам Вялікай Айчыннай вайны, брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік Леніну.

У пісьмовых крыніцах XVI ст. упамінаецца як двор і мястэчка Слонімскага павета ВКЛ. Належала Марціну Пяткевічу, князям Сямёну Адзінцэвічу і Фёдару Галаўні, Яршу Карыцкаму. У 1570 налічвалася 25 дамоў. Быцень належаў старосце жамойцкаму маршалку земскаму ВКЛ Яну Хадкевічу. У 1640 уладальнік Быценя падскарбій ВКЛ Мікалай Трызна перадаў маёнтак і мястэчка манастыру базыльян, заснаванаму ў 1607 яго бацькам Рыгорам Трызнам. Моцна разбураны ў час вайны Масковіі з Рэччу Паспалітай 1654—1657. Між 1708 і 1710 вялікую царкву пабудаваў Юзаф Пяткевіч (не збераглася). У 1766—1914 у Быцені працавала суконная фабрыка. У час паўстання 1794 разбурана, але пазней адноўлена і значна пашырана (80 рабочых у 1896). Пасля працяглых судовых працэсаў Быцень перайшоў у 1779 у валоданне нашчадкам Трызнаў — Тызенгаўзам. З 1795 Быцень — мястэчка Слонімскага павета ў складзе Расійскай імперыі. У 1858 у мястэчку было 1344 двары, 975 жыхароў, а ўжо ў 1880 — 1926 ж., з іх 900 мужчынскага полу і 1026 жаночага, у тым ліку 1500 яўрэяў. У Быцені было паліцэйскае ўпраўленне, праваслаўны дэканат, прыстань на рацэ, у канцы чэрвеня праводзіліся ярмаркі. У 1856—1858 тут адбыліся антыфеадальныя выступленні сялян мястэчка. У першую сусветную вайну акупіравана немцамі, у 1919—1920 — польскімі войскамі. З 1921 у складзе Польшчы, з 1939 — у БССР.

Помнікі архітэктуры — царква ў стылі барока. Пабудавана ў пачатку XVIII ст. (асвячона ў 1710). Уваходзіла ў комплекс уніяцкага манастыра базыльян. У архітэктуры царквы своеасабліва спалучаліся формы каталіцкага і праваслаўнага дойлідства. Цэнтральная прастора храма, пазбаўленая дэкору, была акружана з 4 бакоў памяшканнямі і завершана ўсярэдзіне драўляным шатром, а звонку — цагляным купалам. Выразнасць цэнтра дасягалася пластыкай ліній паўкруглых апсід, купала і высокага ліхтара. Царква мела высокі двухверхавы фасад. Разбурана ў 1914.

Касцёл размешчаны ў цэнтры вёскі. Пабудаваны ў канцы XIX ст. з сасновага бруса. Прамавугольны зруб накрыты высокім гонтавым дахам з паўвальмай над алтарнай часткай.

Верхняя частка галоўнага фасада прарэзана двума сіметрычна размешчанымі стральчатымі вокнамі, што асвятляюць хоры ў інтэр'еры. Тры пары падобнай формы аконных праёмаў і вертыкальныя брусы-сцяжкі дзеляць бакавыя фасады. Уваход арганізаваны праз нізкі прытвор, франтон якога рытмічна спалучаецца з высокім франтонам даху. Касцёл — помнік народнага драўлянага дойлідства з элементамі неаготыкі.

Успенская царква пабудавана ў 1654 з каменю як капліца базыльянскага манастыра. Кампактны прамавугольны ў плане, накрыты вальмавым дахам з васьмігранным барабанам. Галоўны (заходні) фасад раздзелены лапаткамі на тры роўныя часткі. У цэнтры над уваходам размешчана акно з паўцыркульным завяршэннем, па баках — дзве плоскія прамавугольныя нішы. У царкве ўвасоблены рысы архітэктуры рэнесансу і ранняга барока.

Цікавае сведчанне на прыкладзе Быценя, як шанаваліся маёмасныя правы ў Вялікім княстве Літоўскім, маецца ў 3-м томе «Живописной России» (СПб.; М., 1882):

«Паблізу Жыровіч і Слоніма знаходзіўся другі багаты базыльянскі манастыр, сярод глыбокіх лясоў, на рацэ Шчары, у Быцені. Манастыр заснаваны быў напачатку XVII ст. Рыгорам Трызнам. Пасля смерці сына яго, падскарбія Мікалая Трызны, які не пакінуў прамых нашчадкаў, багатымі валасцямі Быценя завалодалі базыльяне. Прайшло шмат гадоў. Базыльяне валодалі бясспрэчна, на праве ўласнасці. У вядомых народных спеўніках (кантычках) друкавалася нават песня, дзе гаварылася: «што пан Трызна аддае (даруе) манастыру Быцень». Глухі розгалас сцвярджаў, што базыльяне няправільна завалодалі багатым маёнткам, але ніхто афіцыйна не аспрэчваў. У XVII стагоддзі далёкая сваячка Трызнаў, уроджаная Шэмет, узяла шлюб з Казімірам Тынзенгаўзам, старостам дыямянтоўскім, братам знакамітага падскарбія Антонія Тызенгаўза. Здарылася, што апошні, калі быў у Навагрудку, зайшоў у касцёл ды сеў на лаўку. Наперадзе перад ім нейкая жанчына напаўголаса прачытвала нейкую песню з кантычкі. Ён прыслухоўваецца, і што ж, замест звычайнага выраз у, вядомага яму з хвалебнай песні пра Трызну, менавіта, што ён даруе Быцень манастыру, жанчына вымаўляе: Быцень «дае ў заставу», гэта значыць пад заклад. Уражаны гэтым, ён просіць дазволу разгледзець кнігу і знаходзіць, што тая кантычка вельмі даўняга выдання, былога веку, дзе сапраўды ідзе размова не пра «дар», а пра «заставу». Гэты выпадак наводзіць яго на думку, што выраз пра «заставу» ў наступных выданнях заменены на «дар», «ахвяраванне». Пачаліся пошукі ў актах ды архівах, якія высветлілі, што сапр аўды Быцень аддадзены быў базыльянам толькі пад заклад. Пачаўся працэс, і ў 1779, згодна рашэнню трыбунала, маёнтак забраны быў у базыльян ды аддадзены законным нашчадкам». (Пераклад У. Мароза.)

БЫЧ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, за 5 км на захад ад Івацэвіч, уваходзіць у калгас імя Леніна. 80 ж., двароў 48 (1.1.1997). Згадваецца ў царкоўным летапісе XIX ст. як невялікае пасяленне. У 1940 створаны калгас імя Варашылава, у час акупацыі ён быў разрабаваны немцамі. Адноўлены ў 1947. Пачатковая школа зачынілася ў 1980. На могілках — брацкая магіла партызан.

БЯЛАВІЧЫ, вёска ў Косаўскім сельсавеце, за 5 км ад Косава, расцягнулася на 1,5 км з усходу на захад. 360 ж., двароў 180 (1.1.1997). У цэнтры вёскі клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, далей — сучасны магазін. Таксама ў цэнтры — абеліск са сцяной Памяці. Помнік Баброву Івану Іванавічу, Талочка Канстанціну Дзям'янавічу і землякам. У Айчынную вайну Бялавічы — важны пункт партызанскага краю. За вёскай — пачатак Гута-Міхалінскага лесу, месца базіравання многіх партызанскіх атрадаў. Адзін канец вёскі называецца Шчарбавічамі.

У 1485 уладальнікам Бялавіч быў вялікі князь цвярскі Міхаіл Барысавіч, які ў час барацьбы з маскоўскім князем Іванам III уцёк у Літву і там атрымаў ва ўладанне маёнткі Бялавічы, Гошчава і Ласасін. У 1505 пасля яго смерці маёнтак стаў належаць княжацкім памесцям Слонімскага староства. У кн. «Рэвізія пушч і пераходаў звярыных у Вялікім княстве Літоўскім...» адзначана, што «людзі і бялавіцкія жывуць у пушчы Бялавіцкай на пераходзе звярыным. На рэчцы Альшаніцы жыве чалавек па імю Піліп. На Федзюсцы некалькі сем'яў пад імем Пятра і Лаўрэна

Хрышчонавічы. На Ятвезі некалькі ласасінскіх сем'яў жывуць дамамі».

22 лістапада 1791 у Бялавічах у сям'і уніяцкага святара нарадзіўся Міхаіл Лявонавіч Гамаліцкі, у будучым беларускі вучоны-медык, гісторык, літаратар, доктар медыцыны (1815), прафесар (1824). Скончыў Віленскі універсітэт (1815), узначальваў у ім кафедру медыцыны, даследаваў фізіялогію чалавека, займаўся старажытнай гісторыяй і літаратурнай дзейнасцю. З Бялавічамі звязана імя Івана Мікалаевіча Грэцкага, удзельніка рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі пад час буржуазнай Польшчы.

У Брэсцкім археалагічным музеі, на тэрыторыі старажытнага Бярэсця, сярод экспанатаў ёсць — наканечнік кап'я эпохі неаліту з надпісам «знойдзены ў вёсцы Бялавічы Івацэвіцкага раёна». Каля вёскі знаходзяцца помнікі археалогіі — курганныя могільнікі, якія выявіла і абследавала ў 1980 В. С. Вяргей. Могільнік-1 размешчаны за 0,3 км на паўночны захад ад царквы. 4 паўкруглыя ў плане, паўсферычныя па форме насыпы вышынёй 0,5—0,8 м дыяметрам 6—9 м. Раскопкі не праводзіліся. Могільнік-2 — на сельскіх могілках . 4 насыпы вышынёю 0,7—1,1 м дыяметрам 6—10 м. Вядомы з канца XIX ст. Абследаваны ў 1980. Раскопкі не праводзіліся. Таксама маецца курган. За 2 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Хвойня. Вышыня 2,1 м, дыяметр 16—17 м.

Помнік архітэктуры — Ільінская царква. Знаходзіцца ў паўночнай частцы вёскі. Пабудавана у другой палове XVIII ст. з дрэва на месцы ўзведзенай у 1630 царквы, каменная званіца — 1885. Царква — адназрубны прамавугольны ў плане аб'ём з двухграннай алтарнай часткай, накрытая двусхільным дахам з вальмамі над алтаром. Франтон галоўнага (заходняга) фасада завяршае невысокая квадратная ў плане вежа з васьмігранным невялікім купалам і галоўкай. З боку ўвахода да асноўнага зруба прымыкае аднолькавы з ім па вышыні тамбур. Звонку сцены вертыкальна абшыты дошкамі з нашчыльнікамі, умацаваны сцяжкамі і прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Інтэр'ер зальны, з бэлечным перакрыццем. Бакавыя сцены раскрапаваны вузкімі пілястрамі з маленькімі капітэлямі. У заходняй частцы над уваходам размешчаны хоры. Перад царквой стаіць каменная трох'яруская брама-званіца, накрытая шатровым дахам. У архітэктурным афармленні званіцы выкарыстаны элементы класіцызму: лапаткі, русцікі, філёнкі і лучковыя праёмы. У архітэктуры помніка спалучаюцца рысы народнага дойлідства і асобныя элементы барока і класіцызму.

ВЕРАШКІ, вёска ў Квасевіцкім сельсавеце, за 8 км на захад ад Косава, непадалёку ад шашы Косава—Ружаны. 122 ж., двароў 76 (1.1.1997). Базавая школа, магазін. Уваходзіць у калгас «Зара». Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. За 13 км ад вёскі на поўдзень ва ўрочышчы Гута-Міхалін брацкія могілкі партызан і савецкіх воінаў.

ВОЛЬКА, вёска на левым беразе Шчары, цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 25 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 160 км ад Брэста, 19 км ад чыгуначнай станцыі Даманава. 769 ж., двароў 344 (1.1.1997). Сярэдняя школа,



Ільінская царква ў в. Бялавічы.

бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, магазін. Помнік баявой славы ў гонар злучэння партызан і Чырвонай Арміі 9.7.1944. За 1,5 км на ўсход ад вёскі, з правага боку дарогі на Дабромысль, брацкая магіла савецкіх воінаў.

ВОЛЯ, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Кірава. За 7 км на поўдзень ад Івацэвіч, 130 км ад Брэста. 572 ж., двароў 255 (1.1.1997). Сярэдняя школа, клуб, дзіцячыя яслі-сад, ветэрынарны пункт, ФАП, аддзяленне сувязі, магазін. Па пісьмовых крыніцах знаходзілася ў Косаўскай гміне Слонімскага павета, за 57 вёрст ад Слоніма; мелася 430 дзесяцін сялянскай зямлі (191 лугоў і пашы, 10 лесу, 27 няўдобіц, 1880).

ВУГЛЫ, вёска ў Быценскім сельсавеце. 166 ж., двароў 106 (1.1.1997). Клуб, ФАП, бібліятэка, магазін. Каля вёскі, на беразе р. Шчара, знойдзены рэчы далёкіх прашчураў.

ВУЛЬКА-АБРОЎСКАЯ, вёска ў Козіцкім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Перамога». 817 ж., двароў 308 (1.1.1997). За 28 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 164 км ад Брэста. Базавая школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, магазін. У 1942 нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 21 жыхара вёскі. Па пісьмовых крыніцах (1880) значыцца як сяло ў Слонімскім павеце Гічыцкай гміны за 77 вёрст ад Слоніма; было 48 двароў, 375 жыхароў, царква, 818 дзесяцін зямлі сялянскай, 45 дзесяцін царкоўнай.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства. Пабудавана ў цэнтры вёскі ў XIX ст. з сасновага бруса. Адназрубнае з трохгранай апсідай збудаванне, накрытае двусхільным дахам з вальмамі над апсідай. З паўднёвага боку да алтарнай часткі прымыкае прыруб рызніцы. Над галоўным фасадам узвышаецца ўрэзаны ў канёк даху васьмігранны барабан з цыбулепадобным купалам. Франтон зашыты «ў ёлку» і аперазаны ў аснове шырокім гонтавым адлівам. Фасады вертыкальна абшыты дошкамі, прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў простых налічніках. Аналагічныя праёмы на гранях апсіды чаргуюцца з ромбападобнымі. Уваход зроблены праз нізкі прытвор, трохвугольны франтон якога рытмічна паўтарае форму франтона асноўнага аб'ёму. Перад царквой чацверыковая званіца, якая завершана чатырохсхільным гонтавым дахам з макаўкай. Верхні ярус — з арачнымі праёмамі.

ВУЛЬКА-ЦЕЛЯХАНСКАЯ, вёска ў Целяханскім сельсавеце. 756 ж., двароў 242 (1.1.1997). Базавая школа, ФАП, магазін. Па пісьмовых крыніцах 1880 адзначаецца, што яна знаходзіцца ў Пінскім павеце Целяханскай гміны на беразе возера Вулька (Волянскае), якое мела даўжыню больш 1 вярсты, шырыню 3/4 вярсты, даволі глыбокае, мела даступныя берагі і ўваходзіла ў сістэму Агінскага канала. Вулька-Целяханская мела тады 57 двароў і 209 ж. Мясцовасць нізінная, багатая на лугі і рыбу. Людзі займаліся ў асноўным сплавам лесу. Належала Пуслоўскім. Цяпер у калгасе імя Куйбышава.

...У Івацэвіцкім раёне ажно пяць блізкіх тапонімаў — назваў вёсак Волька, Воля, Вулька-Аброўская, Вулька-Целяханская, Святая Воля. Адкуль пайшла назва? Вядома, што ўвогуле такіх тапонімаў на Беларусі шмат і што ўзніклі яны адразу пасля 1557, не раней. У тым годзе быў прыняты заканадаўчы акт «Устава на валокі», паводле якога вялася зямельная рэформа. Сутнасць заключалася ў тым, што ўся зямля, як памешчыцкая, так і сялянская падзялялася на так званыя валокі. Памер валокі вагаўся ад 30 да 46 маргоў і залежаў ад якасці самой зямлі. У пераліку на сучасныя зямельныя меры гэта адпавядала 21—32 гектарам. Валока мусіла мець прыблізна чатырохвугольную форму і падзялялася на тры роўныя кавалкі, якія ў сваю чаргу дзяліліся на аднолькавую колькасць «резов».

Усе сяляне асноўных формаў феадальных павіннасцей дзяліліся на цяглых — за карыстанне зямлёй яны мусілі адрабляць паншчыну, асадных — плацілі чынш і былі вольныя ад павіннасцей, сялян-слуг, якія жылі пры панскім фальварку і апрацоўвалі выключна панскія валокі, для сваёй патрэбы мелі толькі агароды.

Звычайна зямля па гэтай форме давалася так: адна валока — адзін двор ці дым, часам удовы ці нямоцныя гаспадары бралі валоку на дваіх, больш рэдка на траіх; былі выпадкі, калі вялікія сем'і, якія былі багатымі на дужыя мужчынскія рукі, бралі па дзве валокі. Былі і такія, якія за пэўныя заслугі (здатны каваль,

бортнік і інш.) надзяляліся звыш чыншавай валокі «вольнай» валокай. Па акту 1557 для апрацоўкі адной валокі фальваркой зямлі вызначалася сем сялянскіх хат. Граніцы валок называліся «сценамі».

І, нарэшце, за «сценамі» валок акрамя пустак, выганаў, сенажацей ды інш. знаходзіўся «обруб», які меў пэўную колькасць вымераных валок і рэзаў у трох палях, які яшчэ толькі прызначаўся для раздачы. Ён называўся «воля». У артыкуле 34 «Уставы на валокі» гаворыцца: «Возде пры сёлах нашых валокі пустые альбо непрынятые і раздробленые врад і ревізор прыбытноści своей людмі добрымі осажаті маеть і пісаті в рейестр, которого дня і часу прыймуть». Далей у гэтым артыкуле гаворыцца аб тым, што селянін-пасяленец на вольных валоках «до лет двух альбо трох не маеть большей даті за всі повінності, толькі грошей 42, снявши жито і ярыну, а работы і подвод, ані которых потяглей не тягнуті, поколь ся побудуеть...»

На карысць таго, што новыя пасяленцы былі зусім недалёка ад «старых» вёсак, гавораць і двайныя назвы — Вулька-Аброўская, Вулька-Целяханская, г. зн. вёскі, якія размясціліся на вольных валоках паблізу вёсак Аброва і Целяханы. Што датычыць вёскі Святая Воля, то гэтыя вольныя землі, напэўна, былі аддадзены памешчыкам-магнатам манастыру, што здаралася ў той час вельмі часта. І ўвогуле пасля гэтай зямельнай рэформы пачалося «вялікае перасяленне», бо ў вёскі пачалі засяляцца звычайна на сярэднім полі валокі ў адзін рад, «одною полотью», прычым другую<-полоть» на супрацьлеглым складалі хлявы і гумны. (Паводле А. Зайкі.)

ВЫГАНАШЧЫ, вёска на ўсходнім беразе Агінскага канала. Цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». За 57 км на ўсход ад Івацэвіч, 193 км ад Брэста. 963 ж., гаспадарак 380 (1.1.1997). Лясніцтва, філіял запаведніка «Белавежская Пушча». Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 2 магазіны. Помнік савецкім грамадзянам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Помнік партызанам, якія загінулі ў баі з карнікамі на 10-м шлюзе Агінскага канала ў верасні 1942. У геаграфічным слоўніку 1890 (т. XIV) адзначаецца, што ляжаць Выганашчы на дарозе з Бабровіч у Разджалава ў Целяханскай гміне за 9 міль ад Пінска, мае 97 двароў. Некалі была ўласнасцю гетмана Міхала Агінскага, які быў фундатарам будаўніцтва тут у 1775 царквы. Святыня мела з даўняга запісу 3 валокі зямлі, каля 1000 парафіян (згарэла ў вайну). Мясцовасць нізінная, малалюдная, але багатая на дары прыроды, многа лугоў. Людзі акрамя земляробства займаліся сплавам лесу і рыбалоўствам; глебы пясчаныя. У 1558 Выганашчы належалі нейкаму Кішчыне ці Кішцы. Перад распрыгоньваннем сялян уласнасць Пуслоўскіх.

На тэрыторыі Выганашчанскага сельсавета знаходзяцца два буйныя возеры. Выганаўскае (Выганашчанскае) возера ляжыць у басейне рэк Ясельды і Шчары на мяжы Івацэвіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. Плошча 26



На Выганаўскім возеры.

кв. км. Даўжыня 6 км, найбольшая шырыня 4,8 км, сярэдняя — 3,7 км, найбольшая глыбіня 2,3 м, сярэдняя — 1,2 м. Катлавіна авальная, выцягнутая з захаду на ўсход. Берагі нізкія, паўднёвыя забалочаныя. Плоскае дно ўслана карычневымі грубадэтрытавымі сапрапелямі. Вадазбор слаба выражаны. Возера знаходзіцца на граніцы водападзелу паміж басейнамі Балтыйскага і Чорнага мораў. Агінскі канал перасякае возера з поўначы на поўдзень. Летам амаль усё заросшае чаротам, трыснягом, белымі і жоўтымі гарлачыкамі, разаком, урэчнікам, эладэяй, шышняком. Водзяцца карась, шчупак, плотка, лешч, язь, лінь. Ад недахопу кісларoду ў вадзе зімой колькасць рыбы значна меншае (зімой 1996 з-за глыбокага прамярзання вады амаль уся рыба загінула; вясной былі запушчаны новыя касякі малькоў). Філіял запаведніка «Белавежскай Пушчы». У бязлёдавы перыяд шмат вадаплаўных птушак.

Бабровіцкае возера, як і Выганаўскае, ляжыць на Выганашчанскім нізінным балоце. Плошча 9,47 кв. км. Даўжыня 4,9 км. Найбольшая шырыня 3,5 км, сярэдняя — 1,9 км, найбольшая глыбіня 8 м, сярэдняя — 2 м. Катлавіна нагадвае трохвугольнік. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя. Возера праточнае, у яго ўпадаюць дзве канавы, выцякае канал дзевяты. Заходняя і паўночная часткі вельмі зарастаюць трыснягом, чаротам, белымі гарлачыкамі. Водзіцца серабрысты карась, карп, шчупак, акунь, лешч.

Старонкі гісторыі вёскі Выганашчы дапаўняюць успаміны яе былога жыхара Гаўрылы Лукашэвіча з расказаў продкаў. Вёска ўзнікла пасля таго, як быў выкапаны Агінскі канал (1768—1783). Тады ён называўся ровам і яго капалі людзі, якіх сагналі з розных месцаў. Там, дзе зараз стаіць сярэдняя школа, было невялікае азярцо, на беразе якога быў разбіты лагер, дзе жылі будаўнікі канала. Пад час будоўлі былі выяўлены лясныя жыхары, якія сяліліся на ўсход ад цяперашняй вёскі Выганашчы. Калі канал пракапалі, спатрэбіліся людзі для яго эксплуатацыі. А жыло іх нямнога ў Вульцы-Целяханскай і Сяльцы, 45 км паміж вёскамі былі бязлюднымі, а канал пачаў жыць, яму трэба быў догляд. Вось і вырашыў царскі ўрад выгнаць лясных жыхароў на вышыню 160 м і пабудаваць там вёску. Зрабіць гэта было нялёгка. Лесавікі ў асноўным не былі ў кантакце з уладамі — жылі ў лесе самі па сабе, дзесяцігоддзямі заводзілі сем'і, разводзілі жывёлу, нават аралі зямлю. Тады ўлады выкарысталі праваслаўную царкву як прыцягальную сілу. Будынак яе ўзвялі ў метрах ста ад канала на ўсход. І ўрэшце лясныя жыхары былі пераселены ў новае месца, выгнаны з лясоў, таму і вёска атрымала назву — Выганашчы. Лясныя жыхары пабудавалі ў вёсцы курныя хаткі, разаралі бліжэйшыя землі, сталі іх апрацоўваць і абслугоўваць Агінскі канал, лавіць рыбу на Свяціцкім возеры, якое стала звацца Выганаўскім (легенда пра паходжанне назвы — мясцовага характару, на самай справе, вёска Выганашчы вядома з XVI ст.)...

Гаротнае жыццё выганашчан яшчэ больш пагоршылася з пачаткам першай сусветнай вайны. Калі ў 1915 немцы набліжаліся да сяла, тут раскватаравалася і заняла абарону кавалерыйская часць. Сялян прымусілі ўтрымліваць коней. З набліжэннем фронту жыхароў адправілі ў бежанства, а маёмасць расцягнулі. Частка людзей у Ганцавічах была пагружана ў вагоны і адпраўлена ў глыб Расіі, а дзесяць сямей прадоўжылі шлях на конях. Як успамінаў выганашчанін Павел Трафімавіч Сауцін, калі яны з абозам спыніліся ў Старых Дарогах, над імі з'явіўся рускі самалёт, які там прызямліўся. Лётчыкам аказаўся выхадзец з Выганашчаў Лукашэвіч Дзмітрый Клементавіч, які пазнаў там свайго брата Васіля, радасна павітаўся з усімі, а пасля адляцеў...

У канцы жніўня 1915 услед за адступаўшымі царскімі войскамі ў вёску Выганашчы прыйшлі войскі кайзераўскай Германіі. Адразу ж яны прыняліся за будаўніцтва лініі абароны на заходнім беразе Агінскага канала. Яна была разлічана на працяглы час як частка лініі Пінск—Баранавічы. Па ёй было ўзведзена сотні жалезабетонных бліндажоў (рэшткі многіх стаяць і да сённяшняга дня). Толькі на ўчастку Выганашчы—Целяханы іх было больш за пяцьдзесят — штабныя, баявыя, гаспадарчыя. Працягнулася суцэльная лінія акопаў вышэй чалавечага росту. Там, дзе Агінскі канал праходзіў па цвёрдай мінеральнай глебе, пасярэдзіне яго русла была працягнута драцяная сетка вышынёю два метры на металічных слупах-апорах, разлічная на абарону ад пранікнення рускай кавалерыі. Лінія абароны рускай арміі праходзіла паралельна Агінскаму каналу на

адлегласці прыкладна 1 км. Між першымі лініямі абароны праціўнікаў былі загароды з калючага дроту.

На акупіраванай тэрыторыі да Агінскага канала немцы займаліся актыўнай гаспадарча-рабаўніцкай дзейнасцю. Ад чыгуначнай станцыі Івацэвічы была пракладзена вузкакалейка праз Святую Волю і Доўгую на Іванава і другая — праз Святую Волю на Шырокае поле, дзе пазней узнікла вёска Красніца. Адтуль вузкакалейкі працягнуліся — адна да Выганашчаў, другая да Целяхан, трэцяя — у бок Баранавіч да Выганаўскага возера. На затоцы Выганаўскага возера былі забіты палі. У Красніцы працавала электрастанцыя, былі ўстаноўлены цыркулярныя пілы, пабудаваны дыхтоўныя баракі. Тут немцы наладжвалі перапрацоўку драўніны для вывазу ў Германію.

На выганашчанскім полі ва ўрочышчы Ганя немцы арганізавалі падсобную гаспадарку — вырошчвалі жыта, гадавалі жывёлу. Ва ўрочышчы Нога нарыхтоўвалі сена. Усе гэтыя дзеянні акупантаў сведчылі пра тое, што кайзераўская Германія не думала пакідаць захопленыя землі. Аднак усё гэта перакрэсліла Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі і лістападаўская 1918 года рэвалюцыя ў Германіі. Немцы пакідалі нашыя землі. Іх сталі абяззбройваць палякі ды ўстанаўліваць на нашай зямлі ўладу Польскай дзяржавы.

Першыя бежанцы пачалі вяртацца ў Выганашчы восенню 1918 і рассяляцца ў нямецкіх бліндажах і рускіх зямлянках. Вёска ж была спаленая. Першыя рубленыя сялянскія хаты пачалі будавацца толькі пасля 1922. Доўга аднаўлялася вёска, жабрацкім было жыццё выганашчан пры панскай Польшчы (паводле матэрыяла М. Банасевіча).

ВЯДА, вёска ў Выганашчанскім сельсавеце. Існавала да 1942, спалена нямецкімі карнікамі разам з жыхарамі 15.9.1942, не адноўлена, увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатыні». На месцы вёскі пастаўлены абеліск. Вёска мае старажытную гісторыю. Згадваецца ў XVI ст. як буйное ўладанне ў складзе Вялікай воласці, размешчанае на беразе Бабровіцкага возера (тады называлася Вядскае). У в. Вяда знаходзілася валасная ўправа (1555). У XIX ст. уваходзіла ў Гічыцкую гміну Слонімскага павета, разам з в. Тупічыцы мела 1090 дзесяцін уласніцкай зямлі (364 лугоў і паш, 85 лесу, 25 няўдобіц).

ВЯЛІКАЯ ГАЦЬ, вёска ў Святавольскім сельсавеце за 30 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, на шашы Івацэвічы — Пінск. Уваходзіць у калгас імя Калініна. 908 ж., двароў 397 (1.1.1997). Згадваецца ў 1556 пры апісанні пушчы Гацкай у «Рэвізіі пушч і пераходаў звярыных у Вялікім княстве Літоўскім...» Пушча «села Гати» мела ўздоўж чатыры мілі, упоперак тры мілі, межавала з Целяханамі, Абровам, Гнойным, Любішчыцамі і Свяціцкім возерам (цяпер Выганашчанскае). У 1920 у вёсцы жыло 105 мужчын, 124 жанчыны, 129 дзяцей. Сяляне мелі 57 коней, 47 кароў, 8 свіней і 8 авечак. У вёсцы ёсць сярэдняя школа, магазін, дзіцячы сад. Ва ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, помнік.

ГАЛЕНЧЫЦЫ, вёска ў Яглевіцкім сельсавеце, за 5 км на ўсход ад Івацэвіч у калгасе «Івацэвіцкі». 179 ж., двароў 79 (1.1.1997). Магазін.

ГАЛІК, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце. 87 ж., двароў 50 (1.1.1997). У 1924—1939 дзейнічала камуністычна-камсамольскае падполле. У 1949 створаны калгас, які ўвайшоў у калгас «Бусяжскі». Працуе магазін.

ГАЛЫНКА, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, уваходзіць у калгас «Бусяжскі». 17 ж., двароў 9 (1.1.1997).

ГІЧЫЦЫ, вёска ў Яглевіцкім сельсавеце, за 5 км на ўсход ад Івацэвіч пры шашы Івацэвічы — Пінск. Брыгада калгаса «Івацэвіцкі». 247 ж., двароў 115 (1.1.1997). Каля вёскі выяўлены тры археалагічныя помнікі. У XVI—XIX ст. — цэнтр воласці Слонімскага павета. Васьмігадовая школа ператворана ў пачатковую. Магазін. Помнік ахвярам фашызму.

ГЛАДЫШЫ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 10 км на поўнач ад Косава, у АПК «Беларусь». 36 ж., двароў 25 (1.1.1997).

ГЛІНІШЧА, вёска ў Целяханскім сельсавеце, калгас «Расія». 130 ж., двароў 64 (1.1.1997).

ГЛІННАЯ, вёска ў Амельнянскім сельсавеце, за 46 км на паўночны ўсход ад Івацэвіч. 765 ж., двароў 265 (1.1.1997). У 1915 жыхары выязджалі ў бежанства перад наступленнем немцаў. У 1920 у вёсках Глінная-1 і Глінная-2 (цяпер разам) пражывала 27 мужчын, 43 жанчын, 53 дзіцяці. Сяляне мелі 11 коней, 15 кароў і 13 свіней. У 1940 створаны калгас. Цяпер брыгада калгаса імя Калініна. Пачатковая школа, магазін.

У цэнтры вёскі — Прачысценская царква. Пабудавана ў 1925 г. з сасновага бруса. Адназрубны прамавугольны ў плане аб'ём накрыты вальмавым гонтавым дахам. На галоўным фасадзе канёк даху прарэзаны барабанам з цыбулепадобным купалам. Уваход зроблены праз прытвор. Франтон прытвора завершаны разнымі падзорамі і дэкарыраваны фігурнаю шалёўкаю з выкарыстаннем салярных матываў. Фасады ашаляваны гарызантальна, цокальная частка — вертыкальна. Перад царквою — двух'ярусная шатровая званіца каркасназрубнай канструкцыі. Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства.

Крыжаўзвіжанская царква ў в. Гошчава.

ГЛЯДЗЕННЕ, вёска ў Дабромысленскім сельсавеце, калгас «40 год Кастрычніка». 120 ж., двароў 66 (1.1.1997).

ГНОЙНАЕ (цяпер ВІШНЁЎКА), вёска ў Даманаўскім сельсавеце на беразе ракі Шчары. 398 ж., двароў 167 (1.1.1997). Згадваецца ў 1559. У 1856 сяляне бунтавалі супраць уціску памешчыкаў. Цяпер брыгада калгаса «Даманава».

ГОРТАЛЬ, вёска ў Целяханскім сельсавеце, за 50 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 186 км ад Брэста. 1135 ж., двароў 340 (1.1.1997). Цэнтр калгаса імя Куйбышава. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, 2 магазіны. Помнік загінуўшым землякам.

ГОШЧА, вёска ў Амяльнянскім сельсавеце, на беразе Гашчанскага возера. 88 ж., двароў 42 (1.1.1997). У 1880 адносілася да Святавольскай гміны Пінскага павета, была ўласнасцю Красноўскага; пражывала 24 жыхары. Брыгада калгаса імя Мічурына.

ГОШЧАВА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 10 км на захад ад Івацэвіч, 130 км ад Брэста, 5 км ад чыгуначнай станцыі Косава — Палескае. 948 ж., двароў 390 (1.1.1997). Помнік сяльчанам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярэдняя школа, клуб, ФАП, аддзяленне сувязі, майстэрні КБА, 3 магазіны.

У кн. «Рэвізія пушч і пераходаў звярыных у Вялікім княстве Літоўскім...» згадваецца як уладанне Льва Абразцова, якому перайшло пасля смерці цвярскога князя Міхаіла Барысавіча, што валодаў Гошчавам з 1485. Яшчэ раней яно належала князям Чартарыйскім. У пачатку XVII ст. ім валодалі Тышкевічы. Альжбета Тышкавічова-Савіцкая ў 1614 пры падзеле маёнтка Гошчава паміж сынамі «дзельчым актам» замацавала тры валокі зямлі за гошчаўскай царквой, якую пабудавала ў 1596 (пазней згарэла). Замест яе ўнук кашталян смаленскі Мікалай Тышкевіч у 1692 пабудаваў дамініканскі кляштар і каталіцкі касцёл. У 1776 івацэвіцкі ўласнік пан Глухоўскі спаліў кляштар і адабраў гэты падарунак. Перад гэтым прыёр кляштара Раймунд Корсак хрысціў у ~~Кіеўскім~~ касцёле ў 1746 Тадэвуша Касцюшку.

У першую сусветную вайну ўсё насельніцтва выязджала ў бежанства. Вярнуліся ў 1920—1921. У Вялікую Айчынную вайну 56 гошчаўцаў змагаліся ў партызанскіх атрадах, больш за 200 на фронце. 87 загінулі ў барацьбе з немцамі. Нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 40 мірных жыхароў вёскі.

Каля дарогі на Косава — Крыжаўзвіжанская царква. Пабудавана ў 1838 з дрэва. Складаецца з квадратнага ў плане аб'ёму з трохграннай алтарнай часткай і прамавугольнага прытвора, да якога прымыкае тамбур. Асноўны аб'ём накрыты двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і васьмігранным барабанам з купалам у цэнтры. Над прытворам узвышаюцца васьмігранная званіца і дзве чацверыковыя вежы па баках. Сцены гарызантальна абшыты дошкамі і дэкарыраваны разьбою. Аконныя праёмы прамавугольныя, на галоўным (заходнім) фасадзе — паўцыркульныя. Уваход падкрэслены здвоенымі слупкамі ганка. Інтэр'ер зальны, перакрыцце бэлечнае, у заходняй частцы размешчаны вузкія хоры на 4 калонках. Пад асноўным аб'ёмам — каменная крыпта. Царква — помнік архітэктуры, які вылучаецца своеасаблівай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй, з элементамі драўлянага народнага дойлідства.

...Паводле звестак Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы ў Гошчаве існавала таксама грэка-уніяцкая царква. Як значыцца ў кнізе візітацыі касцёлаў Слонімскага і Лідскага дэканатаў, гэта царква да 1794 была ўжо вельмі старая, дах працякаў. Звяртае ўвагу апісанне цэнтральнага алтара. Мабыць, ён быў вялікай каштоўнасці, мясцовай сталярнай работы. На ім вісела старажытная ікона з лікам Хрыста, маляваная на дошцы. На маленькім алтары вісела срэбрам і золатам маляваная (упрыгожаная) ікона св. Марыі. У спісе інвентара царквы звяртае ўвагу ўпамінанне вельмі каштоўнага кубка, які падаравалі царкве манахі-дамініканцы. У Гошчаўскі грэка-уніяцкі прыход уваходзілі сяляне вёсак Гошчава, Аўсто, Размеркі, Быч, Воля, Сярадава. Царква валодала пяццю валокамі зямлі, якую апрацоўвалі царкоўныя сяляне. Пасля закрыцця грэка-уніяцкіх цэркваў у 1839 г. сяляне перайшлі ў праваслаўную веру, сталі наведваць праваслаўную царкву, пабудаваную на месцы былога каталіцкага касцёла. Такі пераход, напэўна, адбываўся і да закрыцця грэка-уніяцкай царквы ў Гошчаве. Далей яна прыйшла ў заняпад, у больш пазнейшых дакументах згадваюцца руіны старой царквы. Там цяпер знаходзяцца могілкі. Пры капанні можна наткнуцца на фундамент той царквы (паводле М. Банасевіча).

ГРУДОПАЛЬ, маёнтак, існаваў з XVIII ст., паступова заняпаў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тут быў санаторый для хворых туберкулёзам. Закрыты. Захаваўся старажытны парк як помнік прыроды.

ГРЫЎДА, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, на беразе ракі Грыўда. Цэнтр калгаса «Грыўдзенскі». За 25 км на паўночны захад ад Івацэвіч, 146 км ад Брэста. 258 ж., двароў 115 (1.1.1997). Пачатковая школа, клуб, бібліятэка, амбулаторыя, аддзяленне сувязі, магазін . Сяло Грыўда ў XVI ст. належала панам Храптовічам. У вайну нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 10 жыхароў. За 1 км на ўсход — магіла ахвяр фашызму ў памяць аб расстраляных у 1942 22 жыхарах в. Була.

ГУТА-МІХАЛІН, паселішча ў цэнтры Гута-Міхалінскага лесу, за 12 км на поўдзень ад шашы Косава — Ружаны. Да першай сусветнай вайны тут была гута, непадалёку смалакурня, леснічоўка. Гута знішчана ў 1915. У час акупацыі немцамі з 1915 да 1918 сюды была пракладзена вузкакалейка, па якой вывозілі лес. У Вялікую Айчынную вайну — цэнтр партызанскага руху на Косаўшчыне. Немцы спалілі ўсе пабудовы. Партызаны брыгады імя Панамарэнкі і інш. жылі ў зямлянках. Тут размяшчаўся Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт. Знаходзяцца партызанскія могілкі, дзе пахаваны больш за 150 партызан і воінаў Чырвонай Арміі. Магіла сакратара Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта Іосіфа Урбановіча.

ГУТКА, вёска у Рэчкаўскім сельсавеце. 179 ж., двароў 70 (1.1.1997). Вядома як адзін з цэнтраў барацьбы за савецкую ўладу з палякамі ў 1919. Брыгада калгаса «Рассвет».

ДАБРОМЫСЛЬ, вёска на беразе ракі Шчары. Цэнтр сельсавета і калгаса «40 год

Кастрычніка». За 38 км на паўночны ўсход ад Івацэвіч, 174 км ад Брэста, 28 км ад чыгуначнай станцыі Даманава. 688 ж., двароў 309 (1.1.1997). Лясніцтва, майстэрні КБА. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, амбулаторыя, аптэка, ветпункт, аддзяленне сувязі, 2 магазіны. Вучоны П. Ф. Лысенка выявіў на поўдні вёскі каля Шчары ва ўрочышчы Вал гладкасценную кераміку раннефеадальнага часу. У 1559 згадваецца пушча Дабромысленская як уладанне Хадкевічаў. У XIX ст. — цэнтр воласці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пастаўлены помнік землякам, якія загінулі на вайне.

На ўскраіне вёскі — Мікалаеўская царква. Пабудавана ў 1874 з цэглы па тыпавым праекце. Храм чатырохчасткавы падоўжна-восевай кампазіцыі, які ўключае двух'ярусную званіцу, прамавугольную ў плане трапезную, папярочны асноўны аб'ём і апсіду. Сферычны купал званіцы і двухсхільны дах асноўнага аб'ёму завершаны цыбулепадобнымі галоўкамі на васьмігранных барабанах. Фасады прарэзаны арачнымі аконнымі праёмамі. У дэкоры фасадаў выкарыстаны прамавугольныя філёнкі, зубчатыя фрызы, прафіляваныя карнізы. Зала храма аддзелена ад апсіды двух'ярусным іканастасам. Помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

ДАБРЫНЁВА, вёска ў Даманаўскім сельсавеце. 143 ж., двароў 81 (1.1.1997). Развівалася як сельскае пасяленне. У 1950 арганізаваны калгас, які затым увайшоў у калгас «Даманава». За 3 км на захад ад вёскі магіла ахвяр фашызму, дзе пахаваны 19 савецкіх грамадзян, расстраляных немцамі ў 1942 г.

Помнік археалогіі — стаянка эпохі неаліту і мезаліту. За 0,3 км на паўднёвы-захад ад вёскі, на правым беразе ракі Грыўда, на пясках. Даўжыня каля 1 км, шырыня 100 м. Выявіў у 1963—1964 В. Г. Супрун, даследаваў у 1967 М. М. Чарняўскі. На непашкоджаных участках помніка выяўлены культурны пласт шэрага колеру (0,35—0,4 м). Сярод знаходак — розныя нуклеусы, крамянёвыя прылады працы (мікраліты, пласцінчатыя стрэлы, канцавыя скрабкі, праколкі і інш.), а таксама абломкі арнаментаваных гліняных гаршкоў з раслінными рэшткамі на іх сценках. Стаянка адносіцца да мезаліту і ранняга этапу нёманскай культуры. Датуецца 9—5-м тысячагоддзямі да н. э. Матэрыялы раскопак знаходзяцца ў Інстытуце гісторыі АНБ.

ДАМАНАВА, вёска на левым беразе р. Грыўды; станцыя на чыгункі Брэст — Баранавічы. Цэнтр сельсавета і калгаса «Даманава». За 17 км на паўночны ўсход ад Івацэвіч, 151 км ад Брэста. 1348 ж., двароў 541 (1.1.1997). Згадваецца ў некалькіх данясеннях царскіх чыноўнікаў у сярэдзіне XIX ст. у сувязі з хваляваннямі сялян. У першую сусветную вайну сяляне выехалі ў бежанства. У 1920—1939 дзейнічалі падпольныя камуністычныя і камсамольскія арганізацыі, групы Грамады і ТБШ. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх акупантаў — цэнтр прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, транспартных шляхоў. Працуюць гута, цагельня, шыферны завод, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, сталовая, 4 магазіны. Узведзены 2 помнікі на магілах савецкіх воінаў, партызанаў і землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ДАРГУЖЫ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 8 км на поўнач ад Косава, 19 ж., двароў 14 (1.1.1997).

ДОЎГАЕ, вёска ў Быценскім сельсавеце, за 28 км на паўночны ўсход ад Івацэвіч. 180 ж., двароў 101 (1.1.1997). Каля вёскі выяўлена селішча жалезнага веку, непадалёку ад Шчары. Да савецкай улады лепшыя землі належалі пану Кралецкаму пры маёнтку «Плянт». Тут нарадзіўся ўдзельнік дзвюх войнаў — грамадзянскай і Вялікай Айчыннай — генерал-лейтэнант танкавых войскаў Мацвей Лук'янавіч Ермачок.

ДОЎГАЯ, вёска ў Святавольскім сельсавеце, за 37 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, на шашы Івацэвічы — Пінск. 95 ж., двароў 47 (1.1.1997). Брыгада калгаса імя Калініна.

ДУБІТАВА, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 4 км на поўнач ад Косава, у калгасе «Грыўдзенскі». 95 ж., двароў 55 (1.1.1997).

ЁДЧЫКІ, вёска ў Квасевіцкім сельсавеце. 244 ж., двароў 120 (1.1.1997).

ЁЛКІ, вёска ў Яглевіцкім сельсавеце, за 44 км ад Івацэвіч, каля шашы Івацэвічы — Пінск. 23 ж., двароў 10 (1.1.1997).

ЖАМАЙДЗЯКІ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце. 116 ж., двароў 72 (1.1.1997). Згадваецца ў «Геаграфічным слоўніку 1880» як вёска і фальварак у Слонімскім павеце Косаўскай гміны за 43 вярсты ад Слоніма. Фальварак з'яўляўся ўласнасцю Заградзіных, меў 194 дзес. зямлі (50 лугоў і пашы, 6 няўдобі ц).

ЖЫТЛІН, вёска за 22 км на поўдзень ад Івацэвіч, 158 км ад Брэста. Цэнтр сельсавета. 182 ж., двароў 92 (1.1.1997). Лясніцтва, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. 14.3.1943 нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску. У вайну непадалёку, ва ўрочышчы Хваншчына, размяшчаўся Брэсцкі абласны камітэт КП(б)Б, штаб Брэсцкага партызанскага злучэння, абком камсамола, рэдакцыя абласной газеты «Заря». Там афармлены мемарыяльны комплекс. У вёсцы помнік на брацкай магіле партызан і воінаў Чырвонай Арміі. Тут пахаваны адзін з арганізатараў партызанскага руху ў раёне камандзір партызанскага атрада Чарткоў Аляксей Пятровіч. Яго імем названы мясцовы калгас (цэнтр в. Хадакі).

ЗАКАПЛІЧЧА, вёска ў Дабромысленскім сельсавеце, за 40 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч. 110 ж., двароў 58 (1.1.1997). Згадваецца ў сярэдзіне XIX ст. як вёска ў Слонімскім павеце Дабромысленскай гміны. У валоданні сялян было 207 дзесяцін зямлі. З 1950 у калгасе «40 год Кастрычніка».

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў Косаўскім сельсавеце. 839 ж., двароў 357 (1.1.1997). Сярэдняя школа, клуб, 2 магазіны. Згадваецца ў «Геаграфічным слоўніку 1880» як вёска і маёнтак у Слонімскім павеце Косаўскай гміны пры Брэст-Маскоўскай шашы. Мела 816 ж., 83 двары, 1620 дзес. сялянскай зямлі (424 лугоў і пашы, 3 няўдобіцы), паштовая станцыя такой жа назвы на шашы (цяпер в. Няхачава) за Бярозай-Картузскай (за 20 вёрст). Маёнтак належаў да ўладанняў Зянопаль Палубінскага. Абеліск на магіле ахвяр фашызму.

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў Быценскім сельсавеце. 150 ж., двароў 86 (1.1.1977). Называецца ў дакументах мінулага як вёска Слонімскага павета Быценскай гміны, за 28 вёрст ад Слоніма. Разам з вёскай Рудня мела 816 дзес. сялянскай зямлі і 11 дзес. ворнай зямлі і належала царкве (1880).

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Быценскім сельсавеце, на р. Шчары, за 26 км ад Івацэвіч, у калгасе «Быценскі». 186 ж., двароў 70 (1.1.1977). У 1856 сяляне бунтавалі супраць памешчыцкага ўціску.

ЗАЦІШША, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, спалена нямецкімі карнікамі ў 1942. Не адноўлена. Увекавечана ў Хатыні. Помнік ахвярам фашызму. У 1880 урочышча ў Слонімскім павеце Косаўскай гміны за 55 вёрст ад Слоніма, было ўласнасцю Саковічаў; 130 дзес. зямлі (39 лугоў і пашы, 26 лесу, 25 няўдобіцы). На месцы вёскі расце лес.

ЗЫБАЙЛЫ, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, спалена нямецкімі акупантамі разам з жыхарамі ў 1943. Адноўлена 11 гаспадарак, пражывае 18 чалавек (1.1.1997). Называецца ў «Геаграфічным слоўніку 1880» як вёска ў Слонімскім павеце Гічыцкай гміны за 59 вёрст ад Слоніма, 482 дзес. сялянскай зямлі. У цэнтры вёскі магіла ахвяр фашызму, дзе пахавана больш за 200 жыхароў, якіх знішчылі гітлераўцы 10.3.1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ЗЯЛЁНЫ БОР, пас. у Стайкаўскім сельсавеце, на поўдзень ад чыгункі Брэст — Масква, каля станцыі Косава-Палескае. Пабудаваны ў 60-я гады XX ст. у сувязі з узвядзеннем торфапрадпрыемства «Беразоўскае». 1047 ж., 353 гаспадаркі (1.1.1997). Працуюць паўбрыкетны і асфальтавы заводы, сярэдняя школа, ФАП з зубным кабінетам, клуб, бібліятэка, 2 магазіны, сталоўка, аддзяленне сувязі і «Беларусбанка». У цэнтры пасёлка магіла савецкіх воінаў.

ЗЯНОПАЛЬ, былое ўладанне ў Косаўскай гміне Слонімскага павета, за 46 вёрст ад Слоніма. У 1880 мела 156 дзес. сялянскай зямлі і 617 дзес. зямлі памешчыка Палубінскага разам з асадаю Заполле. У часы буржуазнай Польшчы (1920—1939) тут размяшчаліся

маёнткі польскіх легіянераў Марачкоўскага, Кучынскага і інш. Пасля Вялікай Айчыннай вайны перастала існаваць. Землі адышлі да в. Заполле, а пасля да калгаса «Косава».

ІВАЦЭВІЧЫ, горад (з 1966), цэнтр раёна, на правым беразе ракі Грыўда. Чыгуначная і аўтобусная станцыі на лініі Мінск — Брэст, на перакрыжаванні дарог на Мінск, Брэст, Гродна, Пінск. За 136 км на паўночны ўсход ад Брэста. 8 тыс. жыхароў у 1971, 17 тыс. у 1995, 19,7 тыс. на 1.1.1997.

Прамысловыя прадпрыемствы: АТ «Івацэвічдрэў», спіртзавод, ільнозавод, прыборабудаўнічы завод, малаказавод, завод ЖБВ, камбінат кааператыўнай прамысловасці, камбінат бытавога абслугоўвання, лясгас, райсельгастэхніка, станцыя тэхнічнага абслугоўвання, будаўнічыя арганізацыі: МПМК-11, ПМК-12, ПМК-60, ПМК-18, ДБМПК-34, ПМК аблспажыўсаюза, СПМК-21, СПМК-23, гаспадарча-разліковы рамонтна-будаўнічы ўчастак, 4 сярэднія школы, музычная і дзіцяча-спартыўная школы, 3 дзіцячыя сады, Дом піянераў, кінатэатр, 2 клубы, 3 масавыя бібліятэкі, дзіцячая паліклініка, аптэка, бальніца. На двух брацкіх магілах помнікі воінам і партызанам Вялікай Айчыннай вайны. Каля Івацэвіч на шашы Брэст — Мінск помнік піянеру-герою Мікалаю Гойшыку. Абеліск на месцы пакарання смерцю нямецка-фашысцкімі акупантамі партызанскага сувязнога Віктара Клютко. Помнік воінам-афганцам, помнік Леніну. Новая праваслаўная царква. Рэшткі старой каталіцкай капліцы.

У кнігах рэгістрацыі дакументаў ВКЛ (т. зв. Літоўскай метрыцы) за 1519 ёсць акт аб перадачы гарадзенскім купцам за даўгі маёнтка Івацэвічы. Маёнтак Івацэвіцкі двойчы згадваецца пры апісанні граніц пушчаў і пераходаў звярыных ВКЛ, складзеных у 1559. З другой паловы XVI ст. у Слонімскім павеце Навагрудскага ваяводства ВКЛ; з 1654 маёнтак; у канцы XVIII ст. тут пабудаваны бровар і смалакурня. З 1795 у складзе Расійскай імперыі. За 100 сажняў ад маёнтка на поўнач старажылы паказвалі месца, дзе стаяла мястэчка Івацэвічы, спаленае шведамі. У XIX ст. тут была станцыя на шашы Брэст — Мінск (за 13 вёрст ад станцыі Заполле). Уласнасць Юндзіла. З будаўніцтвам чыгункі Брэст — Масква (1871) побач з маёнткам узнікла невялікае пасяленне, якое расло з развіццём лесараспрацовак. Узнік чыгуначны паўстанак. У канцы XIX ст. тут былі ўжо бровар, цагельня (200 раб.), сукнавальня, вадзяны млын. У першую сусветную вайну акупіраваны немцамі (1915—1918). Тады ж пракладзена вузкакалейка на Целяханы. У 1919—1920 акупіраваны польскімі войскамі, у ліпені — жніўні 1920 — савецкая ўлада, з 1921 да 1939 у складзе Польшчы. У 1935 — 1500 ж. 24 чэрвеня 1941 акупіраваны нямецкімі войскамі, 12 ліпеня вызвалены Чырвонай Арміяй. За пасляваенныя гады вёска ператварылася ў горад.

... У гістарычнай навуцы прынята лічыць «днём нараджэння» горада, вёскі іх першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах. Па гэтай прычыне доўгі час датай заснавання горада Івацэвічы лічыўся 1654 год, калі горад упамінаўся як маёнтак, які належаў Юндзілам, аб чым і паведамлялася ў БелСЭ.

Але ў трэцім томе «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», які пабачыў свет у 1996, даецца другая дата — 1519. Як бачым, Івацэвічы «пастарэлі» амаль на паўтара стагоддзя. Павінны адзначыць, што гэта дата вельмі блізкая да ісціны, але, на жаль, мы з ёй вымушаны не пагадзіцца, і вось чаму.

Сапраўды, у Літоўскай метрыцы ў трэцяй кнізе судовых спраў 26 мая 1519 года зроблены запіс здзелкі Мікалая Мікалаевіча Іллініча з гарадзенскімі яўрэямі Ісакам і Лазарам, якія атрымалі ад Іллініча за доўг у трыманне за 500 коп грошаў маёнтак, як тады пісалі, Івацэвічы. Бацька яго Мікалай Іванавіч Іллініч быў жанаты на дачцэ Міхала Паца Ганне, спадчынніцы Зэльвы і іншых маёнткаў, у тым ліку і двара Івацэвічы.

Калі ў 1500 памірае яе муж Мікалай, Ганна, шчырая каталічка, у 1508 запісвае на Зэльвенскую алтарню 4 сялянскія службы з іх сямействамі і землямі, назначае з Шылавіцкага і Івацэвіцкага двароў пэўную колькасць мёду і воску і дае права сеяць 6 бочак хлеба (мера плошчы) на зямлі, якая належыць названым дварам. Гэты запіс зроблены на лацінскай мове і анатацыя яго змешчана ў кнізе, якая называецца так: «Описание рукописного отделения Виленской публичной библиотеки». Кніга гэта выдадзена ў Вільні на пачатку 20 стагоддзя.

Так што датай заснавання горада Івацэвічы трэба лічыць 1508 год. Гэта значыць, што ў 1998 г. Івацэвічам будзе ўжо 490 гадоў.

Наступным вядомым уладальнікам маёнтка Івацэвічы стаў Ян Віктарын, суддзя слонімскі, староста скідзельскі і мастоўскі.

А.Зайка.

КАРАННАЯ, вёска ў Амельнянскім сельсавеце. 26 ж., двароў 16 (1.1.1997). У калгасе імя Мічурына.

КАСІНОВА, у інвентары 1845—1848 маёнтка Івацэвічы называецца як паселішча фальварка. Пасля першай сусветнай вайны перастала існаваць.

КВАСЕВІЧЫ, вёска ў 20 км на захад ад Івацэвіч, 140 км ад Брэста. Цэнтр сельсавета і калгаса «Зара». Аўтамабільнай дарогай злучаны з Івацэвічамі і Ружанамі. 695 ж., двароў 300 (1.1.1997). Фабрыка пуху і пер'я (1995). Сярэдняя школа (новы будынак узведзены ў 1994), амбулаторыя, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, сталовая, 2 магазіны. У ліпені 1944 нямецкія акупанты спалілі 50 двароў вёскі, расстралялі 12 жыхароў. Помнік загінуўшым землякам.

КЛЯШЫ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце. 118 ж., двароў 74 (1.1.1997). У 1880 значылася як вёска Слонімскага павета на захад ад в. Мілейкі. У АФК «Беларусь».

КОЗІКІ, вёска за 18 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 153 км ад Брэста. 347 ж., двароў 141 (1.1.1997). Цэнтр сельсавета, на аўтадарозе Івацэвічы — Пінск. Лясніцтва, базавая школа, клуб, ФАП, аддзяленне сувязі, магазін. У цэнтры вёскі помнік 27 жыхарам, замучаных фашыстамі ў 1944, і 26 сяльчанам — воінам і партызанам.

КОЗІНА, вёска ў Быценскім сельсавеце. 345 ж., двароў 168 (1.1.1997). На ўціхамірванне сялянскага бунту ў 1856 царскія ўлады прысылалі сюды войскі. Брыгада калгаса «Быценскі». Ёсць магазін.

КОЛАНСК, вёска ў Амельнянскім сельсавеце за 46 км ад паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 181 км ад Брэста, аўтамабільнай дарогай злучаны з Целяханамі. 425 ж., двароў 194 (1.1.1997). Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, ФАП. Згадваецца ў 1559 пры апісанні пушчаў ВКЛ.

КОРАЧЫН, вёска ў Жытлінскім сельсавеце. 60 ж., двароў 35 (1.1.1997). У гады Вялікай Айчыннай вайны каля вёскі ва ўрочышчы Хаваншчына размяшчаўся Брэсцкі абком КП(б)Б і ЛКСМБ, рэдакцыя абласной газеты «Зара», штаб Брэсцкага партызанскага злучэння. Брыгада калгаса імя Чарткова. Ва ўрочышчы Боркі знаходзіцца курганны могільнік. 2 курганы вышынёю 1,5 і 1,8 м. Вядомы з канца XIX ст. Абследаваны ў 1970 Г. В. Штыхавым. Раскопак не праводзілася.

КОСАВА (КОСАЎ), горад за 151 км ад Брэста, 13 км ад чыгуначнай станцыі Косава-Палескае (на лініі Баранавічы — Брэст). 2,7 тыс. ж. (1.1.1997). У Косаве АТ «Косаўскае МВА», камбінат бытавога абслугоўвання, пякарня, лясніцтва. Сярэдняя школа, музычная школа, вучнёўскі вучэбны камбінат, дзіцячы сад, бібліятэка, Дом культуры, спартыўны комплекс, бальніца, аптэка, вузел сувязі, сталовая, 3 магазіны. Мемарыяльны знак на месцы дома ў былым фальварку Мерачоўшчына, дзе нарадзіўся ў 1746 Тадэвуш Касцюшка. Абеліск на ўшанаванне ахвяр дэманстрацыі 3 лютага 1927 г. Манумент на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан Айчыннай вайны, помнік

Капліца пры ўездзе ў г. Косава.

партызанскай славы ў памяць разгрому ў Косаве гітлераўскага гарнізона 2.8.1942. Мемарыяльная дошка на доме, у якім праходзілі пасяджэнні антыфашысцкага камітэта. У скверы — магілы загінуўшых ад рук фашыстаў членаў камітэта У. Палешчука і М. Трынды; магіла маёра Бяззубава, які загінуў пры вызваленні Косава ў ліпені 1944.

Косава ў пісьмовых крыніцах згадваецца з 1494 як уладанне Храптовіча, якое падараваў яму князь літоўскі Аляксандр. Затым належала Сангушкам, Сапегам, Пуслоўскім. З 1795 мястэчка Слонімскага павета Гродзенскай губерні ў складзе Расіі. Каля Косава ў фальварку Мерачоўшчына Войцэх Пуслоўскі пабудаваў палац у неагатычным стылі. Пуслоўскія заклалі ў Косаве промыслы — 2 суконныя мануфактуры. Найбольш буйная налічвала 200 рабочых (1845). На ёй была ўстаноўлена першая ў Беларусі паравая машына. У сярэдзіне XIX ст. было 750 ж., 3 цагляныя і 101 драўляны будынак. У 1878—2030 ж., з іх 1279 яўрэяў, а ў 1897—3092 ж., 64 цагляныя, 807 драўляных будынкаў, з іх 643 жылыя. Было сельскае народнае вучылішча, прыёмны пакой для хворых, аптэка. На чатырох паравых млынах працавалі 13 рабочых. У 1878 была паліцэйская ўправа, якая ахоплівала 4 гміны — Косава, Любішчыцы, Ёлкі, Н. Пескі. Тут склалася старажытная рымска-каталіцкая парафія Слонімскага дэканату. Першы касцёл тут у 1526 пабудаваў трокскі ваявода Ежы і яго жонка Ганна; у 1626 віленскі ваявода Л. Сапега заснаваў новы касцёл, які згарэў у 1872, у 1878 адбудаваны на сродкі парафіян і Вандаліна Пуслоўскага. Каталіцкая парафія мела 1461 душу і філіял у Івацэвічах, капліцу ў Мерачоўшчыне. Косаўскі праваслаўны дэканат налічваў 11 парафій і 20 563 вернікі (1857). У Мерачоўшчыне фальварак, які трымаў у закладзе Людвік Касцюшка (бацька Тадэвуша Касцюшкі).



Капліца на каталіцкіх могілках у г. Косава.

У буржуазнай Польшчы (1921—1939) — цэнтр павета Палескага ваяводства. У 1939—1949 — цэнтр раёна ў складзе Брэсцкай вобласці. З 25.6.1941 да 11.7.1944 акупіраваны немцамі. 2.8.1942 вызвалены партызанамі, якія ўтрымлівалі яго на працягу месяца. Пры Косаўскім МВА ёсць гісторыка-краязнаўчы музей.

КОСАЎСКІ ПАЛАЦ — помнік архітэктуры. Размешчаны за 1,5 км на захад ад Косава ва ўрочышчы Мерачоўшчына. Быў акружаны паркам (захаваўся часткова), які вызначаўся дакладнай планіроўкай і каштоўным дэндралагічным складам. Праекты палаца і парка распрацаваны архітэктарам Ф. Яшчолдам у 1838 г. У будаўніцтве прымаў удзел архітэктар У. Марконі. Палац складаецца з цэнтральнага двухпавярховага корпуса, які з'яўляецца яго кампазіцыйным ядром, і 2 бакавых крылаў, якія злучаны з ім вузкімі галерэямі, прарэзаны высокімі стральчатымі аркамі. Вуглы цэнтральнага корпуса фланкіраваны гранёнымі вежамі рознай вышыні, вуглы бакавых крылаў — падобнымі на вежы контрфорсамі. Фасады рытмічна дзеляцца стральчатымі аркамі, аконнымі праёмамі, перспектыўнымі нішамі, машыкулямі. Унутраная планіроўка сіметрычная, характэрная для дварцовай архітэктуры класіцызму. У галоўным корпусе памяшканні згрупаваны вакол цэнтральнага вестыбюля і параднай залы на 2 паверсе, упрыгожаных роспісамі мастака Жмуркі. У бакавых карпусах размяшчаліся службовыя памяшканні. Палац — помнік архітэктуры, дзе прыёмы класіцызму ў планіроўцы і кампазіцыі спалучаюцца з

элементамі неаготыкі ў архітэктурным афармленні.

АНТОНАЎСКАЯ ЦАРКВА. У цэнтры горада. Пабудавана ў 1868 з цэглы. Храм чатырохчасткавы падоўжна-восевай кампазіцыі, які ўключае двух'ярусную чацверыковую званіцу, прамавугольныя ў плане трапезную, папярочны асноўны аб'ём і апсіду. Званіца накрыта гранёным сферычным купалам з ліхтаром і макаўкай у завяршэнні. Асноўны аб'ём увенчаны цыбулепадобным купалам на васьмігранным барабане. Галоўны ўваход (арачны праём) афармлены двухсхільным навесам на двух калонах. Фасады прарэзаныя арачнымі аконнымі праёмамі. У дэкоры фасадаў выкарыстаны руставаныя налічнікі, зубчатыя фрызы, прамавугольныя філёнкі. Памяшканні царквы аб'яднаны прасветамі, маюць бэлечныя перакрыцці, пазбаўлены архітэктурнага дэкору. Царква — помнік рэтраспектыўна-рускага стылю.

ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ. Размешчаны у цэнтры горада. Пабудаваны ў 1878 з цэглы. Складаецца з аднанефнага прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і больш нізкай пяціграннай алтарнай апсіды з дзвюма сакрысціямі. Асноўны аб'ём завершаны вежай званіцы з высокім шатровым пакрыццём, якая фармуе галоўны (паўднёва-заходні) фасад. Ён афармлены плоскімі нішамі розных формаў і акном-ружай у складаным прафіляваным стральчатым абрамленні. Партал увахода адзначаны вімпергам. Сцены бакавых фасадаў рытмічна дзеляцца ступенчатымі контрфорсамі. Будынак мае вузкія стральчатыя вокны з вітражамі. Неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі і падпружнымі аркамі, якія дэкарыраваны арнаментальным роспісам. Над уваходам — хоры на 2 калонках. Касцёл — помнік архітэктуры неагатычнага стылю.

ЦАРКВА НА МОГІЛКАХ. Пабудавана ў XIX ст. з сасновага бруса. Адназрубны храм з трохграннай апсідай. Помнік народнага драўлянага дойлідства.

Каля Косава, ва ўрочышчы Мерачоўшчына, за 0,2 км на захад ад палаца знаходзіцца гарадзішча — помнік археалогіі. У 1871—1872 невялікія раскопкі праводзіў Я. Завіша. Пасля Вялікай Айчыннай вайны гарадзішча даследавалі Ю. В. Кухарэнка, П. Ф. Лысенка, Л. Д. Побаль, П. А. Рапапорт. Гарадзішча авальнае ў плане (60х42 м), зарасло сасняком. Умацавана 2 валамі вышынёю больш за 2 м. Культурны пласт 0,3 м. Знойдзены рэшткі вогнішчаў на каменных вымастках і фрагменты ляпных пасудзін. На паверхні гарадзішча сустракаюцца рэшткі сярэдневяковай керамікі, выраблены на ганчарным крузе, з хвалевым арнаментам. Па археалагічных матэрыялах, гарадзішча можна аднесці да жалезнага веку і раннефеадальнага перыяду (XI — XII ст.). Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АНБ.

...Гісторыя Косава мае шмат цікавых старонак. Прывілей вялікага князя літоўскага Аляксандра аб дараванні Косава маршалку Яну Літавору Храптовічу датаваны 11 чэрвеня 1494. Наступны ўладар Жыгімонт I сваім прывілеем 1510 дазволіў праводзіць у мястэчку таргі і кірмашы. Пазней фальварак Мерачоўшчыну Храптовіч аддаў у пасаг сваёй дачцы, па мужу Аборскай, аб чым сведчыць запіс у актах за 1529. Але валодалі Храптовічы маёнткам, відаць, нядоўга. Дакладна вядома, што ў 1559 ён належаў Мікалаю Осціку. Перад смерцю ён завяшчае двор і мястэчка сваёй дачцы Ганне, якая ў сваю чаргу, калі пабралася шлю-

Антонаўская царква ў г. Косава.

бам з Львом Аляксандравічам Сангушкам-Кашырскім, 11 мая 1569 запісвае за ім маёнтак. Самае поўнае апісанне маёнтка Косава маецца за кастрычнік 1597, калі была праведзена падрабязная інвентарызацыя з выпадку падзелу яго паміж князем Рыгорам Сангушкам, сынам Льва Кашырскага, і Мікалаем Кішкам. У 1611 уладальнікамі Косава сталі Сапегі. Л. Сапега ў 1626 пабудаваў у Косаве касцёл.

Наступным уладальнікам фальварка Мерачоўшчына стаў Людвіг Тадэвуш Касцюшка, бацька кіраўніка паўстання Тадэвуша. У 1729 ён, каб сплаціць спадчынны доўг, вымушаны быў прадаваць сваю радавую вёску Сяхновічы ды яшчэ некалькі вёсак дзядзьку Фаўстыну Бенядзікту Касцюшку, а сам, выйграўшы судовую справу ў Сапегаў, пераехаў у Мерачоўшчыну. У 1740 ажаніўся з Тэкляй Ратомскай, сіратой, якая выхоўвалася ў доме стрыечнай сястры. Тут, у Мерачоўшчыне, у іх нарадзіліся дзеці. Ганна — у 1741, у 1743 — сын Юзаф, у 1744 — дачка Катажына і ў 1746 — Тадэвуш. У Косаўскім касцёле захоўваецца фотакопія метрычнага запісу хрышчэння Тадэвуша Касцюшкі. А хрысціл яго 12 лютага 1746 г. Запіс у касцёльнай кнізе — № 478. Пасля смерці ў 1758 мужа аўдавелая Тэкля да красавіка 1764 разам з дзецьмі жыве тут у Мерачоўшчыне. У тым жа годзе пераязджае назад у Сяхновічы. Новы ўладальнік маёнтка Косава Іржы Флемінг купляе ў маці Касцюшкі Мерачоўшчыну за 5450 злотых, што і дазволіла ёй адкупіць Сяхновічы.

Крыху пазней Косаўскі маёнтак дастаўся дачцы Флемінга Ізабэле Чартарыйскай у пасаг. Наступным уладальнікам Косава і Мерачоўшчыны стаў Войцэх Пуслоўскі, маршалак слонімскі, адкупіўшы яго ў Софіі Замойскай з Чартарыйскіх. Пуслоўскі значна развіў горад. Тут была пабудавана суконная фабрыка, цагельня, гута, бровар, млын. У 1815 на суконнай фабрыцы працавала 115 рабочых, у тым ліку 65 жанчын. Праз 40 гадоў фабрыка перайшла ва ўласнасць купцоў-яўрэяў братоў Пінесаў. Вытворчыя плошчы займалі два каменныя будынкі. Выраблялі сукно рознае ды 15 тысяч штук у год коўдраў. Рабочым плацілі па 20—30 капеек за дзень, майстру — да 8 рублёў у месяц. Яшчэ да прыкладу, на цагельні ў 1883 было выраблена 192 тысячы штук цэглы. У Косаве працаваў паравы вальцавы млын, вытворчасць якога даходзіла да 32 тысяч пудоў мукі ў год, і коўдраткацкая фабрыка з паравымі машынамі па 20—30 конскіх сіл.

У Мерачоўшчыне Пуслоўскі пабудаваў цудоўны палац. Гісторык архітэктуры В. Чантурыя так характарызаваў яго: «Манументальны палац у Косаве... маючы сіметрычную і шырока разгорнутую кампазіцыю, уласцівую класіцызму, захаваў крапасныя вежы. У архітэктуры бачны прыкметы эклектыкі і пераймальнасці мастацкіх стыляў мінулых

Троіцкі касцёл у г. Косава.

эпох. Зубчатыя завяршэнні высокіх шматгранных вежаў, вокны стральчатага абрысу, карнізы... былі штучным вяртаннем да архітэктурных формаў сярэднявечча». Па спадчыне маёнтак Мерачоўшчына перайшоў да сына Войцэха Вандаліна, яго сын Лявон прадаў замак за семсот тысяч рублёў купцу Аляксандраву. Затым уладарамі палаца былі княгіня Абамелек і прынц Пётр Альдэнбургскі. І ўрэшце палац стаў маёмасцю казны.

Цікавасць уяўляюць і такія факты. У 1860 было ў Косаве 205 двароў з 538 жыхарамі, дзейнічалі праваслаўная царква, касцёл, яўрэйская сінагога, тры яўрэйскія малітоўныя школы. Наладжвалася штогод не менш шасці кірмашоў, былі і штотыднёвыя базары па нядзелях. Праз 21 год у мястэчку было 555 чалавек (110 двароў), дзейнічала школа, паштовая станцыя, дзесяць заезных дамоў. Праз 16 гадоў, па перапісе 1897, у горадзе пражывала 3092 чалавекі. З іх праваслаўных — 725, католікаў — 321, яўрэяў — 2028. У час першай сусветнай вайны палац у Мерачоўшчыне быў моцна пашкоджаны, але затым адноўлены. Пры панскай Польшчы ў ім месцілася адміністрацыя Косаўскага павета. Домік Касцюшкі ўцалеў, у 1936 у ім быў адчынены музей. І дом Касцюшкі, і палац (засталіся толькі сцены) згарэлі ў канцы чэрвеня 1944 (паводле А. Зайкі, М. Болбаса).

КОСАВА-ПАЛЕСКАЕ, чыг. станцыя на лініі Баранавічы — Брэст у в. Няхачава Стайкаўскага сельсавета, за 12 км на паўднёвы захад ад Івацэвіч, 123 км ад Брэста. Побач пас. Зялёны Бор.

КОХАНАВА, вёска ў Даманаўскім сельсавеце, брыгада калгаса «Даманава». 113 ж., двароў 59 (1.1.1997). У 1856 сяляне вёскі бунтавалі супраць царскага ўціску.

КРАГЛЕВІЧЫ, вёска ў Целяханскім сельсавеце. 289 ж., двароў 118 (1.1.1997). Згадваецца ўпершыню ў 1559 пры апісанні граніц Вядскае пушчы. У 80-я гады XIX ст. мела 150 ж., належала Пуслоўскаму. Помнік вызваліцелям за 1,5 км на поўдзень ад вёскі каля шашы Целяханы — Пінск і помнік у гонар воінаў 48-й гв. стр. дывізіі і партызан атрада імя Баруцкага, якія 11.7.1944 вызвалілі Краглевічы.

КРАІ, вёска ў Рэчкаўскім сельсавеце. 774 ж., двароў 308 (1.1.1997). Згадваецца ў 1559 як маёнтак ваяводы Троцкага. У 80-я гады XIX ст. належала Пуслоўскаму, мела 77 ж., у ёй была праваслаўная царква. Сярэдняя школа, магазін. Брыгада калгаса «Рассвет».

КРАСНІЦА, былая вёска ў Выганашчанскім сельсавеце, за 5 км на захад ад Выганашчаў. У 1915—1918 у час нямецкай акупацыі была пунктам перапрацоўкі і вывазу драўніны для Германіі. 12.9.1942 немцы спалілі вёску разам з жыхарамі — 90 чалавек. Не адноўлена. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь». Устаноўлены помнік.

КУШНЯРЫ, вёска ў Падстарынскім сельсавеце. 85 ж., двароў 37 (1.1.1997). У XIX ст. належала маёнтку Івацэвічы пана Юндзіла. У калгасе «Бальшавік». За 18 км на паўночны ўсход, ва ўрочышчы Чыжыкі, брацкая магіла партызан.

ЛАЗАЎЦЫ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 3 км на поўнач ад Косава. 67 ж., двароў 41 (1.1.1997). Непадалёку ад Косаўскага палаца і старажытнага Косаўскага гарадзішча. У складзе АФК «Беларусь».

ЛЮБІШЧЫЦЫ, вёска на левым беразе р. Грыўда. Цэнтр сельсавета і калгаса «Любішчыцы». За 8 км на паўночны ўсход ад Івацэвіч, 143 км ад Брэста на шашы Брэст — Баранавічы. 1349 ж., двароў 574 (1.1.1997). Майстэрня КБА, сярэдняя школа і міжшкольны вытворча-навучальны камбінат, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, ФАП, аддзяленне сувязі, 3 магазіны. Помнік на двух брацкіх магілах воінаў і партызан. Згадваецца ў кн. «Рэвізія пушч і пераходаў звярыных...» як цэнтр Любішчыцкай пушчы, якая была каралеўскай уласнасцю. У 80-я гады XIX ст. называлася як самая буйная вёска ў Слонімскім павеце, дзе было 1076 ж. і 118 двароў.

Каля шашы — праваслаўная царква Св. Ганны. Пабудавана ў 1845 з цэглы. Да квадратнага ў плане аб'ёму з бакавымі прыдзеламі далучана пяцігранная апсіда і драўляны тамбур. Асноўны аб'ём на 2-м ярусе пераходзіць

у васьмігранны са шчыпцамі, завершаны шатром і 5 галоўкамі. Прамавугольныя аконныя праёмы абрамлены прафіляванымі налічнікамі. Вуглы бакавых прыдзелаў дэкарыраваны пілястрамі. Царква — помнік архітэктуры, у якой увасоблены стылізаваныя формы старажытнарускага дойлідства.

Помнік археалогіі эпохі неаліту — стаянка. Знаходзіцца на паўночны ўсход ад Любішчыц, на правым беразе р. Грыўда, ва ўрочышчы Сежня. Выявіў і даследаваў у 1967 У. Ф. Ісаенка. Памеры 50х150 м. Усходні бок стаянкі зарос сасняком. Захаваўся культурны пласт таўшчынёю да 1 м. Сярод знаходак — рашчэпленыя неапрацаваныя крамяні і разнастайныя крамянёвыя прылады працы: лінзападобныя сякеры, скрабкі, разцы і праколкі. Выяўлены аднапляцовачныя нуклеусы, аскепкі глінянага посуду, у асноўным ад вастрадонных ляпных гаршкоў, для прыгатавання якіх у гліну дамешвалася дрэва ды іншыя раслінныя рэшткі. Пад венчыкам посуд упрыгожвалі глыбокімі ямкамі, сценкі — накольчатым арнаментам. Пасяленне адносіцца да нёманскай культуры (2-я палова 3-га тысячагоддзя да н. э., позні неаліт). Яго бліжэйшыя аналагі знаходзяцца на р. Шчара (в. Добры Бор Баранавіцкага раёна, в. Русакова Слонімскага раёна) і ў басейне верхняга цячэння Прыпяці (в. Камень Пінскага раёна). Матэрыялы даследавання знаходзяцца ў Інстытуце гісторыі АНБ.



Царква Св. Ганны ў в. Любішчыцы.

МАГІЛІЦЫ, вёска ў Волькаўскім сельсавеце. Цэнтр калгаса «Іскра». За 22 км на ўсход ад Івацэвіч, 157 км ад Брэста. 548 ж., 215 двароў (1.1.1997). Базавая школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, ветучастак, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Айчынную вайну.

МАЙСК, новае паселішча ў Любішчыцкім сельсавеце, дзе ў 1940 на балотах была заснавана Косаўская вопытна-балотная станцыя. Тут эксперыментальная база. Дзейнічаюць лабараторыі па даследаванні гатункаў бульбы і развядзенні жывёлы. 397 ж., 138 гасп. (1.1.1997).

МАНЦЮТЫ, вёска ў Быценскім сельсавеце, ФАП, клуб. 155 ж., 86 двароў (1.1.1997). Салдацкія могілкі.

МАЦІЕЎКА, вёска ў Падстарынскім сельсавеце. 1 ж., 1 двор (1.1.1997).

МЕРАЧОЎШЧЫНА, сядзіба за 2 км ад Косава. У XVII ст. фальварак у Слонімскім павеце Косаўскай парафіі. Тут 12 лютага 1746 быў ахрышчаны Тадэвуш Касцюшка, бацька якога брэсцкі мечнік меў названы фальварак у закладзе ад Сапегаў. Тут была каталіцкая капліца. У доміку, дзе нарадзіўся Касцюшка, у 30-я гады XX ст. быў музей. Згарэла сядзіба ў 1944. Тут у XIX ст. быў пабудаваны Пуслоўскім палац, які таксама згарэў у вайну. На месцы дома Касцюшкі ўстаноўлены памятны знак. Землі былога фальварка ўваходзяць у калгас «Косава».

МІЛЕЙКІ, вёска за 5 км ад Косава, за Мерачоўшчынай. 611 ж., двароў 221 (1.1.1997). Цэнтр АФК «Беларусь». Базавая школа, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. Згадваецца ў XIX ст. як вёска Слонімскага павета.

МІРОНІМ, вёска ў Быценскім сельсавеце, на мяжы са Слонімскім раёнам, за 10 км на поўнач ад Быцені. 296 ж., двароў 152 (1.1.1997). У

1880 адзначалася як дарожная станцыя на шляху паміж Слонімам і Чамяламі за 19 вёрст ад Слоніма. Размешчана на ўзвышшы. Тут б'е цудоўная крыніца. Уваходзіць у склад калгаса «Быценскі». Бібліятэка, клуб, ФАП. Царква, пабудаваная ў 2-й палове XIX ст. з бутавага каменя і цэглы. З'яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

МІХАЛІН, месца былой вёскі на тракце Ружаны — Бяроза на мяжы Ружанскай пушчы і Гута-Міхалінскага лесу. У XIX ст. тут была шкіпінарная фабрыка і смалакурня, якія належалі Пуслоўскаму. На іх працавалі 20 рабочых. Выраблялі шкіпінар і смалу. У 1907 дзейнічала сацыял-дэмакратычная арганізацыя. Адбываліся частыя забастоўкі лесарубаў і возчыкаў. У Айчынную вайну немцы спалілі вёску. Не аднавілася. У 1943 на яе полі быў партызанскі аэрадром.

МІХНАВІЧЫ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, прымыкае да заходніх ускраін Івацэвіч, на шашы Брэст — Масква, побач з Брэсцка-Маскоўскай чыгункай. 170 ж., двароў 76 (1.1.1997). У перыяд Вялікай Айчыннай вайны тут дзейнічала падпольная партызанская радыёстанцыя, з якой радыстка Цянутава перадавала звесткі аб руху па магістралях ваеннай тэхнікі і жывой сілы. На доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У вёсцы помнік герою-партызану Мікалаю Гойшыку.

НАЛІЎКІ, вёска ў Быценскім сельсавеце, каля Шчары. 221 ж., двароў 71 (1.1.1997). Выяўлена селішча каменнага веку. Ёсць базавая школа, магазін. У складзе калгаса «Пагор'е».

НЯКРАСАЎШЧЫНА, пасяленне было непадалёку ад Івацэвіч. Зараз не існуе. Тут нарадзіўся Герой Савецкага Саюза генерал-лейтэнант Мультан Мікалай Мікалаевіч (1900—1975).

НЯХАЧАВА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, за 123 км ад Брэста на шашы Брэст — Масква. 270 ж., двароў 142 (1.1.1997). У 1915—1918 дзейнічалі лесапілкі, дзе перапрацоўваўся лес для адпраўкі ў Германію. У Айчынную вайну дзейнічала моцная антыфашысцкая арганізацыя. Помнік землякам, воінам і партызанам.

Каля шашы, што праходзіць праз вёску, знаходзіцца паштовая станцыя Заполле. Пабудавана ў 1840-я гады з цэглы. П-падобная ў плане кампазіцыя комплексу складаецца з 3 аднапавярховых карпусоў: цэнтральнага і 2 бакавых, злучаных сценкамі з арачнымі праёмамі, якія вядуць ва ўнутраны двор. Цэнтральны, квадратны ў плане і падоўжаныя бакавыя карпусы пакрыты вальмавымі дахамі. Галоўны (паўднёвы) фасад, які арыентаваны на шашу, выдзелены ў цэнтры плоскім рызалітам, які завершаны ступенчатым атыкам. Сцены будынка апрацаваны рустыкай. Аконныя праёмы афармлены паўцыркульнымі і лучковымі аркамі. Унутраная планіроўка аб'ёмаў адпавядала іх прызначэнню: у цэнтральным знаходзіліся службовыя і жылыя памяшканні для прыезджых, бакавыя карпусы выкарыстоўваліся для гаспадарчых патрэб і канюшняў. Будынак станцыі — помнік грамадзянскай архітэктуры позняга класіцызму.

ПАГОР'Е, вёска ў Быценскім сельсавеце, у калгасе «Пагор'е». 83 ж., двароў 50 (1.1.1997).

ПАДСТАРЫНЬ, вёска за 7 км на поўнач ад Івацэвіч, цэнтр сельсавета і калгаса «Бальшавік». 821 ж., двароў 309 (1.1.1997). Базавая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, ФАП, магазін. Помнік землякам. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці камсамольца-падпольшчыка А. А. Гулевіча. Мемарыяльная дошка камдыву І. І. Васілевічу. Тут працаваў Герой Сацыялістычнай Працы Букшта Мікалай Васільевіч.

ПАНКІ, вёска ў Любішчыцкім сельсавеце, брыгада калгаса «Любішчыцы», за 2 км ад Івацэвіч каля р. Грыўды. 261 ж., двароў 110 (1.1.1997).

ПЕРАДЗЕЛЫ, фальварак у Пінскім павеце Целяханскай гміны пры дарозе з Амяльной да Святой Волі ў XIX ст. Мясцовасць адасобленая, нізінная. Цяпер не існуе.

ПЛЕХАВА, вёска ў Любішчыцкім сельсавеце, за 8 км ад Івацэвіч над р. Грыўдай. 61 ж., двароў 35 (1.1.1997). У калгасе «Любішчыцы».

ПРЫБАРАВА, вёска ў Быценскім сельса-

веце, за 3 км ад Быцені, каля р. Шчары. 176 ж., двароў 109 (1.1.1997). Каля вёскі выяўлена кераміка 1-га тысячагоддзя н. э. Уваходзіць у калгас «Пагор'е». Ёсць магазін.

РАЗМЕРКІ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, за 7 км на захад ад Івацэвіч. 116 ж., двароў 50 (1.1.1997). Заснавана ў XIX ст. на ўсход ад маёнтка Гошчава. Паміж в. Гошчава і в. Размеркі ў 1920 утвораны асады легіянераў Пілсудскага-Трамбіцкага, Марачкоўскага, Тымінскага, Баргілоўскага і інш. пад назвай БЕЛЫ ДВОР. Скасаваны ў 1939. Землі ўваходзяць у калгас імя Леніна.

РАЦКЕВІЧЫ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 4 км ад Косава, у калгасе «Бусяжскі». 142 ж., двароў 81 (1.1.1997). Дзейнічае свідравіна мінеральнай вады.

РУДА, вёска ў Падстарынскім сельсавеце каля р. Грыўды. 151 ж., двароў 66 (1.1.1997). Брыгада калгаса «Бальшавік». Пачатковая школа, магазін.

РУДНЯ, вёска ў Быценскім сельсавеце. 10 ж., двароў 6 (1.1.1997). Магіла ахвяр фашызму за 0,8 км на ўсход ад вёскі, пахавана 2 тыс. савецкіх грамадзян з в. Быцень, расстраляных у 1941—1942 нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

РУДНЯ, вёска ў Рэчкаўскім сельсавеце. 711 ж., двароў 280 (1.1.1997). Вядома як адзін з цэнтраў барацьбы за савецкую ўладу на Целяханшчыне ў 1919. У калгасе «Рассвет».

РЭЧКІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Рассвет». За 65 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 200 км ад Брэста, аўтамабільнай дарогай злучаная з Івацэвічамі. 997 ж., двароў 316 (1.1.1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, урачэбная амбулаторыя, ветучастак, аддзяленне сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

САКОЎЦЫ, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце. 41 ж., двароў 23 (1.1.1997). Упамінаецца ў XIX ст. як вёска ў Слонімскім павеце Косаўскай гміны. Тут нарадзіўся вядомы беларускі пісьменнік Піліп Сямёнавіч Пестрак.

САСНОВЫ БОР, пас. у Дабромысленскім сельсавеце, у лесе, на развілцы дарог на Мінск і Слуцк; за 20 км на ўсход ад Івацэвіч. 106 ж., гасп. 40 (1.1.1997). Узнік пасля вайны як месца размяшчэння дзіцячага аздараўленчага санаторыя «Сасновы Бор».

СВЯТАЯ ВОЛЯ, вёска за 33 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 170 км ад Брэста, 34 км ад чыгун. ст. Івацэвічы, на аўтамабільнай дарозе Івацэвічы — Пінск. 612 ж., двароў 274 (1.1.1997). У 1920 у вёсцы жыло 66 м., 73 ж., 93 дзіцяці. Яны мелі 20 коней, 4 каровы, 8 свіней. Цяпер ёсць лясніцтва, камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, бальніца, аптэка, ветучастак, аддзяленне сувязі, 3 магазіны, новая праваслаўная царква, пабудаваная ў 1994 на месцы старой драўлянай, якая была збудавана гетманам Міхалам Агінскім у 1794. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. У 1944 нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 137 дамоў, загубілі 413 мірных жыхароў. Помнік жыхарам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У «Геаграфічным слоўніку 1880» упамінаецца як мястэчка Пінскага павета, у якім было каля 70 двароў і больш за 600 ж., управа гміны, сельская школка. Святавольская гміна складалася з 8 вясковых акруг (старостваў), налічвала 386 двароў, 2080 уласнікаў зямлі мужч. полу, якія былі надзелены 7849 дзес. зямлі. У склад гміны ўваходзілі вёскі Бабровічы, Доўгая, Вялікая і Малая Гаць, Глінная, Гошча, Коланск, Аброва, Амяльная і Плянта. Уласнасць некалі князёў Дольскіх, Вішнявецкіх, Агінскіх, у 1880 Пуслоўскіх. Кароль Аўгуст II прывілеем ад 23 ліст. 1724 надаў Святой Волі гарадскі статус з штотыднёвымі таргамі. У 1978 пражывала 967 ж., было 308 гаспадарак.

За 1 км ад Святой Волі, справа ад дарогі на в. Доўгая выяўлены курганны могільнік. 9 насыпаў вышынёю 1—1,5 м, дыяметрам 6—10 м. Выявіў у 1968 В. Г. Супрун, даследаваў у 1970 В. Р. Выржыкоўскі. Раскопкі не праводзіліся.

СЕНЬКАВІЧЫ, вёска ў Падстарынскім сельсавеце, за 7 км на поўнач ад Івацэвіч. 264 ж., двароў 120 (1.1.1997). У XIX ст. адносілася да маёнтка Івацэвічы, якім валодалі Юндзілы. Брыгада калгаса «Бальшавік». Базавая школа, клуб, магазін.

Помнік археалогіі — курганны могільнік. Мясцовая назва — Шведскія капцы. На могілках 5 насыпаў вышынёю 0,4—0,8 м, дыяметрам 4—6 м. На некаторых растуць дрэвы. Вядомыя з канца XIX ст. У 1965 П. Ф. Лысенка раскапаў 4 курганы. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Памерлага хавалі ў падкурганнай яме глыбінёю 0,7—1,3 м, клалі галавою на захад, рукі — ўздоўж цела. Выяўлены месцы, насычаныя попелам і дробным вугалем. Гэта, магчыма, вогнішчы. Пахавальны інвентар нешматлікі. Лічачы па абраду пахавання і інвентару, могільнік адносіцца да XI—XIII ст. Матэрыялы раскопак знаходзяцца ў Інстытуце гісторыі АНБ.

СКУРАТЫ, вёска ў Квасевіцкім сельсавеце, за 2 км на захад ад Косава. 262 ж., двароў 139 (1.1.1997). Згадваецца ў «Геаграфічным слоўніку 1880» як вёска ў Слонімскім павеце Косаўскай гміны. Брыгада калгаса «Зара».

СОМІНА, вёска ў Целяханскім сельсавеце каля воз. Соміна. 510 ж., двароў 169 (1.1.1997). У сярэдзіне XIX ст. была ўладаннем Пуслоўскіх, мела 15 двароў. З 1950 у калгасе імя Куйбышава.

СТАЙКІ, вёска за 2 км на захад ад Івацэвіч, 138 км ад Брэста. Цэнтр сельсавета і калгаса «Савецкая Беларусь». 1074 ж., двароў 395 (1.1.1997). Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін. Абеліск у памяць землякам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

СТАРАЖОЎШЧЫНА, вёска ў Косаўскім сельсавеце, за 1 км ад Косава. 375 ж., двароў 154 (1.1.1997). У 1880 вёска ў Слонімскім павеце. У калгасе «Косава».

СЯЛЕЦ, вёска ў Дабромысленскім сельсавеце, непадалёку ад Шчары. У складзе калгаса «40 год Кастрычніка». 506 ж., двароў 223 (1.1.1997). Згадваецца ў сяр. XIX ст. як вёска Слонімскага павета Дабромысленскай гміны. Ёсць базавая школа, магазін.

СЯРАДАВА, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, за 5 км на захад ад Івацэвіч. 185 ж., двароў 102 (1.1.1997). Вучэбная гаспадарка Івацэвіцкага ПТВ-162. Магазін. Помнік ахвярам фашызму за 0,5 км на поўдзень ад вёскі. У памяць знішчэння нямецкімі захопнікамі в. Зацішша і 125 яе жыхароў.

ТУПІЧЫЦЫ, былая вёска ў Выганашчанскім сельсавеце за 4 км ад в. Бабровічы. У XVI ст. сяленне Вядскай воласці на беразе Бабровіцкага возера, у XIX ст. у складзе Гічыцкай воласці. У 1942 было 143 ж. і 43 двары. Нямецкія фашысты 15.9.1942 спалілі вёску і ўсіх жыхароў. Не аднавілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь». Устаноўлены абеліск.

ТУРНАЯ, вёска ў Святавольскім сельсавеце, за 40 км ад Івацэвіч. 280 ж., двароў 132 (1.1.1997). Згадваецца ў сярэдзіне XIX ст. як вёска ў Пінскім павеце Целяханскай гміны і парафіі Святой Волі, мела 22 жыхары. У 1920 пражывала 200 чал. Цяпер брыгада калгаса імя Калініна. Пачатковая школа, магазін.

УЛАСАЎЦЫ, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, за 18 км на поўдзень ад Івацэвіч, 86 ж., двароў 51 (1.1.1997). Вядома актыўнасцю рэвалюцыйнага руху ў 1922—1939 супраць улад буржуазнай Польшчы. У 1949 арганізаваны калгас, цяпер брыгада калгаса імя Чарткова. Ёсць магазін.

ЧАМЯЛЫ, вёска ў Вольскаўскім сельсавеце, на р. Шчара. 250 ж., двароў 112 (1.1.1997). У 1880 згадваецца як вёска Слонімскага павета, у якой была паштовая станцыя на шашы Варшава — Масква. З 1950 у калгасе «Іскра».

ХАДАКІ, вёска ў Жытлінскім сельсавеце. Цэнтр калгаса імя Чарткова. За 17 км на поўдзень ад Івацэвіч, 153 км ад Брэста. 513 ж., двароў 174 (1.1.1997). Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, 2 магазіны. Нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску, загубілі 92 мірных жыхароў. Магіла ахвяраў фашызму. Згадваецца пры апісанні граніц пушчы Здзітаўскае (1559) як сяло Хадакоўцы Слонімскай воласці, якое ад Здзітава «знаходзіцца за дзве мілі і там людзей чатыры службы, пад самаю пушчай Здзітаўскаю на пераходзе звярыным сядзяць».

ХАДОРКІ, вёска за 3 км ад Косава. 100 ж., двароў 59 (1.1.1997). У калгасе «Косава».

ХАЛАП'Я, вёска ў Падстарынскім сельсавеце, за 1 км ад Івацэвіч. 139 ж., двароў 52 (1.1.1997). Венералагічны дыспансер бальніцы.

ХАРОШЧА, вёска ў Мілейкаўскім сельсавеце, за 10 км на поўнач ад Івацэвіч. У сяр. XVI ст. называецца ўладаннем Андрушэвіча. У XVII ст. маёнтак Харошча належаў Сцяпану Кандзіжэўскаму, а затым — Марыне Халецкай. З 1950 у калгасе «Грыўдзенскі».

ХРЫШЧОНАВІЧЫ, вёска ў Квасевіцкім сельсавеце. 34 ж., двароў 24 (1.1.1997). У 1556 пры р. Федзюсцы на пераходзе звярыным жылі два селяніны Пётр і Лаўрэн Хрышчонавічы. Яны і заклалі вёску. У цэнтры помнік партызанам.

ЦЕЛЯХАНЫ, г. п. на Агінскім канале. Цэнтр калгаса «Расія». За 45 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 181 км ад Брэста, на аўтамабільнай дарозе Івацэвічы — Пінск. 4,8 тыс. ж. (1.1.1997). Лыжная фабрыка, завод сталярных вырабаў, участак леспрамгаса і лясгаса, КБА, спецыялізаванае аддзяленне сельгастэхнікі. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, музычная школа, навучальна-вытворчы камбінат, Дом культуры з народным тэатрам, кінатэатр, Дом піянераў, 4 дашкольныя ўстановы, 2 масавыя бібліятэкі, бальніца, аптэка, лясніцтва. Помнік Леніну, курган Славы на ўшанаванне памяці савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні Целяхан, абеліск у гонар партызанскіх брыгад, якія ў студзені 1944 разгромілі нямецкі гарнізон у Целяханах. Дзве мемарыяльныя дошкі на дамах, дзе ў 1939—1940 гадах жыла Герой Савецкага Саюза В. З. Харужая.

Целяханы ў пісьмовых крыніцах упамінаюцца з XVI ст. Належалі Дольскім, Вішнявецкім, Агінскім, Пуслоўскім. У 1768—1783 пабудаваны Агінскі канал даўжынёю 54 км, меў 10 шлюзаў, злучыў рэкі Шчару і Ясельду, а праз іх два моры. Па ім перавозілі пераважна лес, збожжа і сыравіну на вотчынныя мануфактуры. Упачатку канал называўся Целяханскім. У першую сусветную вайну па ім праходзіла лінія фронту. Захаваліся астаткі многіх нямецкіх дотаў. Гетманам Агінскім у Целяханах пабудавана царква Св. Тройцы і надзелена 4 валокамі зямлі. У 1817 Пуслоўскім пабудавана каталіцкая капліца. Былі дзве яўрэйскія сінагогі, гандлёвая прыстань, шпіталь, управа воднай камунікацыі, школа дарожных кандуктараў. Целяханская гміна складалася з 8 сельскіх акруг, мела 451 асаду ўласнікаў. 2460 уласнікаў мужч. полу былі надзелены 9390 дзес. зямлі. У межах гміны знаходзіліся Целяханы, 13 сёл і вёсак, 3 маёнткі, 4 фальваркі. Міхал Агінскі заснаваў тут фаянсавую фабрыку. Вырабы яе былі шырока вядомы, але страцілі на вартасці, калі фабрыка перайшла ў рукі яўрэяў. Каля 1819 валодаў ёю Шэвель Левін, пазней заняпала і была закрыта. У 1880 вялікі пажар знішчыў мястэчка, але яно хутка адбудавалася. Ключ Целяханскі займаў 41 378 дзес. зямлі (1880), пераважна ў пушчах і багнах.

У цэнтры пасёлка — Троіцкая царква. Пабудавана ў 1934 з драўлянага бруса. Храм складанай шматпланавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі: па падоўжнай восі размешчаны званіца, кароткі бабінец, кубавідны асноўны аб'ём, пяцігранная апсіда. У сілуэце пабудовы дамінуюць цыбулепадобныя купалы на гранёным шатры званіцы (два васьмерыкі на чацверыку) і васьмігранным барабане асноўнага аб'ёму. Пірамідальны характар асноўнага аб'ёму вызначае двух'ярусны нахільны шатровы дах, прарэзаны цэнтральным чацверыком «другога свету» з шэрагам паўарачных люкарн па перыметру. Да бакавых фасадаў асноўнага аб'ёму прымыкаюць пяцігранныя прыдзелы, якія абумоўліваюць крыжападобнае развіццё плана пабудовы. Галоўны ўваход аблямаваны двусхільным навесам на чатырох слупах з макаўкай у завяршэнні. Фасады гарызантальна ашалёваныя, прарэзаныя высокімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў простых налічніках. Інтэр'ер зальны з перакрыццем на вуглавых ветразях. Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства.

... З імем Міхала Казіміра Агінскага, гетмана Вялікага княства Літоўскага, звязаны не толькі знакаміты канал, але і тое, што ім у Целяханах былі пабудаваны ў 1779 фаянсавы завод, а пазней шклаварны. 30 мая 1880 года М. К. Агінскі памёр, але гута працягвала выпускаць сваю прадукцыю. Апошні раз згадваецца ў 1814 г. Відаць, напалеонаўскае нашэсце 1812 года нанесла пэўныя страты шкляному і фаянсаваму промыслу. Але на гэтым

гісторыя шкларобства ў Целяханах не закончылася. У 1895 на былой вуліцы Касцёльнай на зямлі памешчыка Ф. У. Пуслоўскага быў заснаваны новы завод, дзе прымяняліся найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі ў гутнай справе таго часу. У 1895 набыты паравы рухавік для шліфавальнага аддзялення, у 1899 устанавілі шклоплавільныя печы, а ў 1911 падключылі электрасвятло, што дало магчымасць электрыфікаваць гравіравальныя і шліфавальныя станкі. Прымяняліся пнеўматычныя прыстасаванні для выдзімання вырабаў са шкла пры дапамозе пары, на заводзе пачалі ўкараняць спецыяльныя станкі для нанясення дэкору на вырабы.

З самага пачатку арандавала завод у памешчыка Пуслоўскага акцыянернае таварыства ў складзе буйных шклозаводчыкаў Турука, Розенблюма, братоў Чарніховых, а пазней Ю. Столе і В. Краеўскага. Канцэнтрацыя капіталу і дазволіла, відаць, ім укараняць у вытворчасць новую тэхніку. У хуткім часе целяханскі завод стаў буйнейшым у Беларусі і ўжо ў 1910 выпускаў прадукцыі на 156 тысяч рублёў. Калі колькасць рабочых напачатку склала 146 чалавек, то ў 1900 тут працавала 300 рабочых, а ў 1910 колькасць павялічылася на 171 чалавека. Целяханцы і сяляне навакольных вёсак асвойвалі новыя для сябе прафесіі фармоўшчыкаў, шліфоўшчыкаў, гравіроўшчыкаў. А прадукцыю выпускалі самую разнастайную: аконнае шкло, графіны, бутлі, бутлікі, шклянкі, кварты, кілішкі, кухлі, бакалы, лямпавае і аптэчнае шкло. Шмат выпускалася пляшак, асабліва пасля таго, як вінная дзяржаўная манаполія загадала прадаваць гарэлку і віно толькі ў шкляной тары. Але найбольшую славу целяханская гута прыдбала сабе за вырабы з крышталю і каляровага шкла і высокі мастацкі ўзровень і якасць. Камітэт усерасійскіх сельскагаспадарчых выставак узнагародзіў завод залатым медалём «За працавітасць і мастацтва». І што самае дзіўнае, сыравінай для вырабу крышталю служыў мясцовы пясок, які пасля чатырохразовай прамыўкі быў годны нават для выпуску багемскага шкла, якім так ганарыліся чэшскія майстры. Салетру ж пачалі завозіць з Чылі, фарбавальнікі шкла атрымлівалі з Германіі, Аўстрыі, Англіі.

Прадукцыя целяханскага завода ахвотна куплялася на Каўказе, у Крыме, Туркестане, Сібіры, Паволжы, Растове-на-Доне, Баку, Маскве, Саратаве, у гарадах Польшчы, Прыбалтыкі, у многіх краінах Заходняй Еўропы. Асаблівым попытам за мяжой карысталіся лямпы «венскія» і «берлінскія», а таксама сервізы з крышталю і каляровага шкла. Да прыкладу, можна прывесці пералік прыбораў, якія ўваходзілі ў сервіз пад гучнай назвай «Алівер стары фасон», — графін з ручкай, графін без ручкі, шклянкі «роўныя» і шклянкі «падцёс», кілішкі, бакалы для шампанскага, кілішкі для крэму, шампанкі, паўшампанкі, кілішкі для каньяку, сподкі, талеркі на трох ножках, ваза для садавіны, масленка, малочнік, жбан, кілішак для лімона. І ўсе гэтыя рэчы былі аздоблены тонкім дэкорам, а пэўныя часткі пакрываліся серабрыстай плёнкай, золатам, эмалямі.

На жаль, тым майстрам і рабочым, чыімі рукамі ствараліся прыгажосць, такі сервіз быў не па кішэні. Цяжкія ўмовы працы, мізэрны заробак, самавольства адміністрацыі згуртоўвалі працоўны люд на барацьбу за свае правы. Асаблівай вастрынёй класавая барацьба вызначылася пад час першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Баставалі тады і рабочыя-гутнікі з Целяхан. Першая імперыялістычная вайна прыпыніла працу, шклозавод перастаў існаваць (паводле А. Зайкі).

ЮГАЛІН, вёска ў Дабромысленскім сельсавеце. 104 ж., двароў 41 (1.1.1997). Школа-інтэрнат. Магазін. У XIX ст. сядзіба Юндзіла — удзельніка паўстання Кастуся Каліноўскага. Старажытны парк. Сядзіба нашчадкаў А. С. Пушкіна Варанцовых-Вельямінавых.

... Легенду аб паходжанні назвы Югалін расказаў у 1953 годзе жыхар суседняй вёскі Сялец Голуб Мікалай Восіпавіч (дзед Шуляк). У пачатку XIX ст. тут быў хутар, дзе жылі дзве сястры — Югаля і Наталля. Людзі і называлі хутар Югалін, Наталлін. Але першай памерла Наталля, і за хутарам засталася назва Югалін. У першай палове XIX ст. у Югаліне стаў жыць памешчык Юндзіл, бо гэта былі яго ўладанні. Ён жыў тут да 1863. У сям'і Уладзіслава Юндзіла і Багуліны Сухадольскай у 1825 нарадзіўся сын Францішак. Бацькі выбралі яму кар'еру ваеннага, і ён служыць у царскай арміі. Фальварак Югалін уваходзіў тады ў Слонімскі павет. Пакінуў Францішак службу ў царскай арміі ў чыне ротмістра ў 1858.

У гэты час назіраецца абуджэнне нацыянальных рухаў у Польшчы, на Беларусі і Літве. На Беларусі гэты рух узначаліў К. Каліноўскі. Вясною 1861 Каліноўскі прыступіў да стварэння Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Вядома, што Францішак Юндзіл пасля адстаўкі месцам свайго жыхарства выбраў Гродна. Яго дом стаў прытулкам для маладых рэвалюцыянераў, дзе яны абмяркоўвалі план паўстання. Гэта быў пэўны каардынацыйны цэнтр па аб'яднанню патрыятычных сіл краіны. З'явіліся першыя паўстанцкія атрады. Ф. Юндзіла прызначаюць на пост ваеннага начальніка Слонімскага павета і камандзірам атрада, які фарміраваўся паблізу Югаліна ва ўрочышчы Старынка. У хуткім часе да атрада Юндзіла, які налічваў ужо 300 касіянераў, далучыўся атрад Ісідара Лукашэвіча, які быў сфарміраваны ў Мілавідах.

28 мая 1863 года адбылася першая сутычка пад Літвінавым. Будучы ў цяжкім становішчы, Ф. Юндзіл выклікаў найбліжэйшы атрад Аляксандра Лянкевіча, з якім злучыўся 1 чэрвеня. Колькасць усіх паўстанцаў складала 700—750 чалавек. Камандаванне аб'яднанымі сіламі ўзяў на сябе А. Лянкевіч. Свой лагер яны разбілі паблізу В. Мілавіды. 3 чэрвеня адбыўся вялікі бой з рэгулярнымі царскімі войскамі (чатыры роты пяхоты, дзве гарматы) пад камандаваннем палкоўніка Булгарына. Бой працягнуўся некалькі гадзін. Хоць паўстанцы былі слаба ўзброены, яны ўсё ж змаглі адбіць усе атакі, нанеслі карнікам вялікія страты. Царскім войскам прыйшло на дапамогу падмацаванне. Паўстанцы на той час пакінулі ўжо лагер. Пасля адыходу паўстанцы падзяліліся. Юндзіл са сваім войскам, пасля сутычкі з непрыяцелем пад Сяльцом, падаўся праз балоты ў накірунку Целяхан. За ім гналіся ворагі. 13 чэрвеня Юндзіл атрымаў загад перайсці ў палескія балоты і далучыць свой атрад да атрада Калупайкі. 30 жніўня Юндзіл прыняў ўдзел у баі пад Глыбокім кутам.

З выпадку заняпаду паўстання на Беларусі Ф. Юндзіл пераправіўся праз Буг і ўжо 29 кастрычніка быў у Кракаве, дзе прызначаецца камендантам гэтага горада. 20 студзеня 1864 ён прызначаны арганізатарам Кракаўскай ваеннай акругі. 12 лютага 1864 яму было нададзена званне падпалкоўніка. У пачатку сакавіка з-за дрэннага здароўя выехаў у Францыю, дзе лячыўся ў Парыжскім шпіталі. Але адолець хваробу не змог. Памёр Францішак Юндзіл, мужны кіраўнік паўстанцаў, 13 ці 14 лютага 1865 года (з газеты «Октябрь», 1990).

...У Югаліне жыла некалі сям'я Варанцовых-Вельямінавых, нашчадкаў роду вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна. Гэтая галіна магутнага генеалагічнага дрэва ўзыходзіць да сына паэта Аляксандра. Ён пайшоў па ваеннай лініі, камандаваў Нарвскім гусарскім палком, даслужыўся да генеральскага чыну. Удзельнічаў у руска-турэцкай вайне 1877—1878 гадоў і вызваленні Балгарыі ад турэцкага іга, узнагароджаны залатою зброяй «За храбрость». Імя А. А. Пушкіна глыбока паважаецца ў Балгарыі. У Аляксандра Аляксандравіча было 13 дзяцей. Дзве дачкі выйшлі замуж за падначаленых свайго бацькі, афіцэраў гусарскага палка. Наталля стала жонкаю Паўла Аркадзьевіча Варанцова-Вельямінава, а Марыя — жонкаю Мікалая Уладзіміравіча Быкава (пляменніка М. В. Гогаля).

Павел Аркадзьевіч пасля жаніцьбы падаў у адстаўку і паехаў з маладою жонкаю ў свой маёнтак, які знаходзіўся непадалёку ад Бабруйска. У яго сям'і было шасцёра дзяцей. Соф'я Паўлаўна, праўнучка вялікага паэта, жыла ў Маскве. Марыя Паўлаўна выйшла замуж за Яўгена Іпалітавіча Кліменку. У іх таксама было шасцёра дзяцей. Наталля Яўгенаўна стала жонкаю Уладзіміра Іванавіча Варанцова-Вельямінава, свайго стрыечнага дзядзькі, і стала гаспадыняй Югаліна. Здарылася гэта так. У пачатку 1921 яна, яшчэ дзяўчына-падлетак, паехала з Бабруйска ў госці да родных, якія жылі ў Заходняй Беларусі, у Югаліне. У сакавіку таго ж года Заходняя Беларусь адышла па Рыжскаму дагавору да Польшчы. Наталля Яўгенаўна пражыла ў Заходняй Беларусі да ўз'яднання яе з БССР, тут і пабралася шлюбам з Уладзімірам Іванавічам. Тут, у Югаліне, у іх нарадзілася двое дзяцей — Георгій і Вера, прапраўнукі Пушкіна. Георгій у школу не хадзіў, атрымаў хатняе выхаванне. Ахвотна гуляў з вясковымі хлопчыкамі. Бацька заахвочваў такія гульні. У сям'і добра ведалі французскую і польскую мовы, але дома размаўлялі толькі па-руску. Уладзімір Іванавіч, як сцвярджаюць старажылы вёсак Югалін, Глядзенне, Сялец, Ямічна, быў чалавекам чулым, дапамагаў сялянам.

На жаль, дакладна не ўстаноўлена, калі Варанцовы-Вельямінавы пасяліліся ў Югаліне. Але вядома, што жылі яны тут да першай сусветнай вайны. У час вайны эвакуіраваліся ў Расію, потым зноў вярнуліся ў Югалін. Дзед Георгія Іван Варанцоў-Вельямінаў служыў палкоўнікам у царскай арміі. У 1938 ён памёр і пахаваны ў вёсцы Дабромысль каля царквы. Яго жонка пакінула пасля сябе добрую памяць, яна лячыла людзей травамі, была ўважлівая да іх і дапамагала. Сям'я Варанцовых-Вельямінавых жыла ў драўляных дамах, якія потым згарэлі. Засталіся толькі сыраварня і малочня.

Варанцовы-Вельямінавы пакінулі Югалін у 1939, выехалі ў Казахстан. Уладзімір Іванавіч па дарозе памёр. Яго сын Георгій у 1944 быў мабілізаваны ў армію. Вясною 1945 вызваляў Венгрыю і Аўстрыю, праз Вену дайшоў да Лінца, дзе нашы часці сустрэліся з амерыканскімі войскамі. Калі пачалася вайна з Японіяй, часць, дзе служыў Георгій, была перакінута на ўсход. Але ваенныя дзеянні хутка скончыліся, Японія капітулявала. Армейскую службу Георгій завяршыў у Іркуцку. Там і застаўся пасля мабілізацыі. Жаніўся. Мясцовых жыхароў здзіўляла яго надзвычайнае падабенства са сваім праслаўленым продкам — курчавыя валасы, працяглы твар, смуглы колер скуры. Маці Георгія Уладзіміравіча і сястра Вера (па мужу Сванідзэ) жывуць у Тбілісі (паводле В. Мароза).

...Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Югаліне быў утвораны дзіцячы дом для дзяцей-сірот. Ён меў назву — Быценскі дзіцячы дом № 1. У дзетдоме было 90 сірот ад 7 да 15 гадоў. Вучыцца яны хадзілі ў Сялецкую школу. У 1961 на базе дзетдома была адкрыта Югалінская школа-інтэрнат. Спачатку яна была сярэдняй. У 1864 адбыўся яе першы выпуск. А пасля гэтага да 1970 школа была толькі васьмігадовай. У верасні 1970 яна стала дапаможнай. Дырэктарам школы-інтэрната доўгі час быў Случаноўскі Мікалай Уладзіміравіч, завучам — Міхееў Георгій Васільевіч, арганізатарам выхаваўчай работы — Кульчыцкі Раман Якаўлевіч.

У 1996 у Югалінскай школе вучылася 132 вучні. У школе працуе 46 педагогаў і 40 чалавек абслугоўваючага персаналу. У 1989 быў здадзены ў эксплуатацыю новы спальны корпус для дзяцей, сталовая. Быў пабудаваны 9-кватэрны жылы дом. У 1994 узведзены яшчэ 6 двухкватэрных катэджаў. На тэрыторыі Югаліна ёсць воданапорная вежа, пральня, магазін (паводле У. Каброва).

ЮКЕВІЧЫ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, непадалёку ад шашы Косава — Івацэвічы. 54 ж., двароў 32 (1.1.1997). У XIX ст. быў маёнтак. У 1949 праведзена калектывізацыя. Уваходзіць у калгас «Савецкая Беларусь». Працуе магазін.

ЯБЛОНКА, вёска ў Жытлінскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. 163 ж., двароў 73 (1.1.1997).

ЯГЛЕВІЧЫ, вёска за 2 км на паўднёвы ўсход ад Івацэвіч, 138 км ад Брэста, на аўтастрадзе Брэст — Масква, 3 км ад чыгуначнай ст. Івацэвічы. Цэнтр сельсавета і калгаса «Івацэвіцкі». 1528 ж., двароў 527 (1.1.1997). У 80—90-я гады значна разбудавалася. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзетсад, урачэбная амбулаторыя, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін. У 1944 вёску часткова спалілі немцы. Помнік на брацкай магіле воінаў і партызанаў Вялікай Айчыннай вайны. Помнік В. С. Клютко. У 1760 была пабудавана з дрэва Юр'еўская царква, не збераглася.

ЯНАВА, б. фальварак Юндзіла ў Івацэвічах. Цяпер не існуе. Землі адышлі да калгаса «Бальшавік».

ЯТВЕЗЬ, вёска ў Квасевіцкім сельсавеце, на мяжы з Пружанскім раёнам у Гута-Міхалінскім лесе. 13 ж., двароў 7 (1.1.1997). Вядома з XVI ст., калі тут было «25 службаў, што жылі сваімі дамамі».

Падрыхтавалі М. В. Банасевіч, В. І. Мароз, У. В. Мароз.

462
Розникало
библиотечная

ЗМЕСТ

ДА ЧЫТАЧА 17

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ — 1917

Зямля нашых продкаў 21
У складзе Кіеўскай Русі, Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 24
У складзе Расійскай імперыі 47

1917—1941

На зломе часу 69
У складзе польскай дзяржавы 86
Да жыцця новага, савецкага 131

1941—1945

Ішла вайна народная 149
Ахвяры вайны 274
Партызаны, падпольшчыкі, удзельнікі антыфашысцкага руху,
асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю,
члены іх сем'яў і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору 274
Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі пры абароне
і вызваленні Івацэвіцкага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі 324
Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак
у гады другой сусветнай вайны 336

1945 — ДА НАШЫХ ДЗЁН

У мірнай працы 385
З гісторыі населеных пунктаў раёна .....

У ПОШУКУ, ЗБОРЫ І ПАДРЫХТОЎЦЫ МАТЭРЫЯЛАЎ І ДАКУМЕНТАЎ ДЛЯ КНІГІ «ПАМЯЦЬ» ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ:

Н.Я.Асіпенка, М.В.Банасевіч, А.Ф.Велікаселец, М.А.Гармаш, Дз.С.Дзмітрыеў, В.І.Жывіневіч, А.І.Зайка, Е.Іванец (Польшча), В.П.Касько, С.А.Крэк, В.Ф.Курзаў, В.І.Мароз, У.В.Мароз, Р.М.Радзюк, А.І.Русенка, А.І.Самсановіч, А.В.Самусік, П.І.Сітнік, Г.А.Трубенка, Ф.І.Хаванскі, А.В.Церабунь, Я.Дз.Янчанка.

ДАПАМОГУ І САДЗЕЯННЕ Ў ЗБОРЫ І ПАДРЫХТОЎЦЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ДЛЯ КНІГІ «ПАМЯЦЬ» АКАЗАЛІ:

В.М.Басалай, М.М.Валковіч, У.М.Васілеўскі, Н.А.Голуб, Л.М.Еўдакіменка, Н.К.Еўтух, Г.У.Крынец, Ю.В.Кулініч, В.М.Любімава, Г.М.Навумовіч, С.А.Папко, С.Р.Пархомік, Т.У.Рымашэўская, С.У.Сцепанчук, І.А.Тарасевіч, В.М.Уласава.

Старшыні гарадскіх, пасялковага і сельскіх Саветаў: Г.І.Алексяевіч, І.М.Арцюх, П.М.Данілевіч, К.І.Дзенісюк, В.С.Кірчук, А.А.Крыцкі, С.А.Крэк, П.А.Лінкевіч, В.Ф.Лушчык, М.М.Мігно, Л.М.Міхневіч, М.П.Муха, Г.А.Пякарскі, І.І.Пропер, М.І.Сяўко, Ф.Ф.Трафімчык, Н.І.Упяравец, Т.П.Хінко, Э.В.Цвірко, Л.С.Шыш, Я.К.Шыш.

Фота: У.А.Калашнікава (каляровыя здымкі), І.Шыманчыка (Польшча), з фотатэкі БЕЛТА, з архіва раённай газеты, грамадскіх музеяў і асабістых архіваў.

Картограф: Г.Р.Шыкунова.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Івацэвіцкага р-на. – Мн.: БЕЛТА, 1997. – 496 с.: іл.
П15 ISBN 985-6302-06-4

У кнізе асветлены падзеі і факты гісторыі Івацэвіччыны са старажытнасці да нашых дзён. У хроніку ўключаны гістарычныя і біяграфічныя нарысы, артыкулы пра знакамітых людзей — ураджэнцаў і жыхароў гэтага краю. Выкарыстаны шматлікія дакументы і матэрыялы з архіўных і друкаваных крыніц, газетныя публікацыі розных гадоў, успаміны.

Асаблівая ўвага нададзена ў кнізе ўвекавечанню памяці загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну: партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, воінаў Чырвонай Арміі, што пахаваны на тэрыторыі раёна, воінаў-землякоў. Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў раёна, якія сталі ахвярамі неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій і якія загінулі ў Афганістане.

Вялікі раздзел кнігі прысвечаны гісторыі населеных пунктаў раёна і апісанню помнікаў гісторыі і культуры.

Кніга будзе карыснай для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй свайго краю.

ББК 63.3 (4 Беи)

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Івацэвіцкага раёна

Адказны за выданне
Г.К. Кісялёў
Рэдактары:
М.З. Башлакоў, Ф.І. Кітаева,
У.І. Лемяшонак, А.Л. Петрашкевіч,
А.Т. Сімураў
Мастацкі рэдактар:
А.В. Кажухар
Карэктары:
В.І. Багдановіч, Н.А. Дзянісава,
Л.І. Кароткіх, Л.І. Рудніцкая,
Л.А. Сівалобчык
Падрыхтоўка арыгінал-макета:
А.В. Маісеенка,
М.Э. Малярэвіч
Камп'ютэрны набор:
Т.В. Бурачэўская, А.В. Дарчук,
С.А. Долгая, З.У. Марцінчык

Выданне падрыхтавана камп'ютэрна-выдавецкім цэнтрам БЕЛТА.
Падпісана да друку з арыгінал-макета 28.11.97.
Фармат 70x100 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Кудрашоўская энцыклапедычная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 40,0. Ум. фарб.-адб. 46,4.
Ул.-выд. арк. 49,6. Тыраж 3000 экз. Заказ 2624.
Беларускае тэлеграфнае агенцтва.
Ліцэнзія ЛВ № 228. Рэспубліка Беларусь.
220600, Мінск, вул. Кірава, 26.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга
паліграфкамбінат МВПА імя. Я.Коласа.
220005, г. Мінск, Чырвоная, 23.